А. А. Мяцельскі

МСЦІСЛАЎСКАЕ КНЯСТВА І ВАЯВОДСТВА Ў XII–XVIII стст.



НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
Інстытут гісторыі

А. А. Мяцельскі

МСЦІСЛАЎСКАЕ КНЯСТВА І ВАЯВОДСТВА Ў XII–XVIII стст.

2-е выданне, выпраўленае

Мінск
«Беларуская навука»
2014

УДК 94(476)"11/17"
ББК 63.3.(4Беи)4
М 99

Р э ц э н з е н т ы:

доктар гістарычных навук, дацэнт *Ю. М. Бохан*,
доктар гістарычных навук, дацэнт *С. А. Піваварчык*,
доктар гістарычных навук, дацэнт *І. А. Марзалюк*,
кандыдат гістарычных навук *В. М. Цемушаў*

Мяцельскі, А. А.

М 99 Мсціслаўскае княства і ваяводства ў XII–XVIII стст. / А. А. Мяцельскі. – 2-е выд., выпр. – Мінск : Беларус. навука, 2014. – 664 с.: іл.
ISBN 978-985-08-1663-4.

Дадзеная манаграфія прысвечана гісторыі Мсціслаўскага княства і ваяводства XII–XVIII стст. Разглядаецца сацыяльна-эканамічнае развіццё рэгіёна, гістарычная геаграфія, урбанізацыйныя працэсы, канфесійнае жыццё.

Разлічана на навуковых супрацоўнікаў, выкладчыкаў, студэнтаў, усіх, хто цікавіцца гістарычным мінулым Беларусі.

УДК 94(476)"11/17"
ББК 63.3.(4Беи)4

ISBN 978-985-08-1663-4

© Мяцельскі А. А., 2010
© Мяцельскі А. А., 2014, са змяненнямі
© Афармленне. РУП «Выдавецкі дом «Беларуская навука», 2014

УВОДЗІНЫ

У канцы XIX ст. у Кіеўскім універсітэце былі распачаты рэгіянальныя даследаванні па гісторыі Старажытнай Русі, у выніку якіх з'явіўся шэраг гістарычных прац па старажытным перыядзе Разанскага, Цвярскога, Чарнігаўскага, Полацкага, Смаленскага і іншых княстваў[1]. Абапіраючыся выключна на пісьмовыя крыніцы, тагачасныя даследчыкі не карысталіся звесткамі і матэрыяламі археалагічных даследаванняў, якія ў той час атрымалі даволі шырокае распаўсюджанне ў Расіі. Гэта ў пэўным сэнсе прывяло да аднабаковасці даследаванняў, якія выкладалі толькі палітычную гісторыю асобных тэрыторый.

Назапашванне новага матэрыяла, у першую чаргу археалагічнага, прывяло ў другой палове XX ст. да неабходнасці паўтарэння гэтага круга даследаванняў. У выніку з'явілася серыя новых прац[2], у якіх, у адрозненне ад па-

---

[1] Андрияшев А. М. Очерк истории Волынской земли до конца XIV столетия. – Киев: Тип. ун-та Св. Владимира, 1887. – 232 с.; Голубовский П. В. История Северской земли до половины XIV в. – Киев: Тип. Императорского ун-та Святого Владимира, 1881. – 201 с.; Яго ж. История Смоленской земли до начала XV в. – Киев: Тип. Императорского ун-та Святого Владимира, 1895. – 335 с.; Данилевич В. Е. Очерк истории Полоцкой земли до конца XIV столетия – Киев: Тип. Императорского ун-та Святого Владимира, 1896. – 264 с.; Багалей Д. И. История Северской земли до половины XIV столетия. – Киев: Унив. тип., 1882. – 310 с.; Грушевский А. С. Очерк истории Турово-Пинского княжества XI–XIII вв. – Киев: Тип. Императорского ун-та Святого Владимира, 1901. – 78 с.; Грушевский, М. С. Очерк истории Киевской земли от смерти Ярослава до конца XIV столетия. – Киев: тип. Императорского ун-та Святого Владимира, 1891. – 520 с.; Довнар-Запольский М. В. Очерк истории Кривичской и Дреговичской земель до конца XII столетия. – Киев: Тип. Императорского ун-та Святого Владимира, 1891. – 170 с.; Иванов П. А. Исторические судьбы Волынской земли с древнейших времен до конца XIV в. – Одесса: Универ. тип., 1895. – 435 с.; Иловайский Д. И. История Рязанского княжества. – М.: Универ. тип., 1859. – 329 с.; Ляскоронский В. Г. История Переяславской земли с древнейших времен до половины XIII столетия. – 2-е изд. – Киев: Тип. ун-та Св. Владимира, 1903. – 422 с.

[2] Пашуто В. Т. Очерки по истории Галицко-Волынской Руси. – М.: Изд-во Акад. наук СССР, 1950. – 331 с.; Монгайт А. Л. Рязанская земля. – М.: Изд-во Акад. наук СССР, 1961. – 400 с.; Алексеев Л. В. Полоцкая земля в IX–XIII вв. Очерки истории Северной Белоруссии. – М.: Наука, 1966 – 295 с.; Яго ж. Смоленская земля в IX–XIII вв. Очерки истории Смоленщины и Восточной Белоруссии. – М.: Наука, 1980. – 264 с.; Никольская Т. В. Земля вятичей. К истории населения бассейна верхней и средней Оки в IX–XIII вв. – М.: Наука, 1981. – 295 с.; Юшко А. А. Московская земля IX–XV вв. – М.: Наука, 1991. – 192 с.; Лысенко П. Ф. Туровская земля IX–XIII вв. – Минск: Беларус. навука, 1999. – 268 с.; Зайцев А. К. Черниговское княжество X–XIII в.: избр. труды. – М.: Квадрига, 2009. – 226 с. + карты.

пярэдніх, ужо значна больш увагі было ўдзелена пытанням этнічнай гісторыі, эканамічнаму і культурнаму жыццю асобных княстваў.

У той жа час, вывучаючы буйныя адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі X–XIII стст., гісторыкі значна менш увагі надавалі гісторыі асобных зямель і ўдзельных княстваў другой паловы XIII–XVIII стст. Толькі ў апошнія часы пачалі з'яўляцца працы, у якіх робяцца спробы даследаваць гэтыя тэрытарыяльныя адзінкі[3].

У пэўным сэнсе не з'яўляецца ў гэтым плане выключэннем і Мсціслаўскае княства, добра вядомае па пісьмовых крыніцах канца XIV – пачатку XVI ст., і сфарміраванае на яго аснове ў сярэдзіне XVI ст. Мсціслаўскае ваяводства Вялікага Княства Літоўскага. Нягледзячы на тое, што час ад часу тыя ці іншыя пытанні з іх гісторыі прыцягвалі ўвагу розных даследчыкаў, абагульняючая праца па гісторыі гэтага рэгіёна да сённяшняга дня адсутнічае.

Таму задачай дадзенай працы з'яўляецца гістарычная рэканструкцыя засялення і асваення, урбанізацыйных працэсаў і канфесійных узаемаадносін на тэрыторыі канкрэтнага гістарычнага рэгіёна – Верхняга і Сярэдняга Пасожжа, яго палітычнай гісторыі на працягу васьмі стагоддзяў, якую плануецца стварыць на аснове міждысцыплінарнага падыходу да аналізу крыніц рознага тыпу.

Аб'ектам даследавання ў дадзенай працы з'яўляецца невялікі гістарычны рэгіён – Верхняе і Сярэдняе Пасожжа, на тэрыторыі якога ў XII–XVIII стст. існавалі Мсціслаўскае княства і ваяводства. Цікавасць да гісторыі Мсціслаўскага княства і ваяводства выклікана тым, што пачынаючы з XVI ст. яно апынулася на памежжы з Рускім царствам і на працягу амаль двух стагоддзяў знаходзілася на вастрыі баявых дзеянняў паміж Рэччу Паспалітай і Рускім царствам, што не магло не адлюстравацца на гісторыі гэтага краю: на ступені яго засялення, этнічным складзе насельніцтва, урбанізацыйных працэсах, што адбываліся тут, канфесійных адносінах.

Храналагічна дыяпазон даследавання займае восем стагоддзяў і ахоплівае гісторыю рэгіёна ў розныя перыяды яго гісторыі: XI – першая палова XIV ст., XIV – сярэдзіна XVI ст. – гісторыя рэгіёна (Мсціслаўскага княства) ў складзе ВКЛ і з сярэдзіны XVI–XVIII стст. – перыяд Мсціслаўскага ваяводства ў складзе Рэчы Паспалітай. Верхняя храналагічная мяжа вызначаецца 1772 г. – першым падзелам Рэчы Паспалітай і інкарпарацыяй яе ўсходніх раёнаў у склад Расійскай імперыі.

---

[3] Шеков А. В. Верховские княжества (Краткий очерк политической истории XIII – середина XVI вв.) // Труды Тульской археологической экспедиции. – Тула, 1993. – Вып. 1. – 100 с.; Русина О. Сіверська земля у складі Великого князівства Литовського. – Київ: Наук. думка, 1998. – 243 с.; Кулаковський П. Чернігово-Сіверщина у складі Речі Посполитої (1618–1648). – Київ: Темпора, 2006. – 496 с.; Темушев В. И. Гомельская земля в конце XV – первой половине XVI в. Территориальные трансформации в пограничном регионе. – М.: Квадрига, 2009. – 192 с. + карты.

Гістарыяграфія

Гісторыя вывучэння Мсціслаўскага княства і ваяводства на сённяшні дзень яшчэ не дастаткова распрацавана, хаця гісторыкаў гэтыя адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі пачалі цікавіць даўно.

Ужо пачынаючы з XIX ст. гісторыкаў у першую чаргу цікавіла генеалогія роду мсціслаўскіх князёў, і таму першыя працы, якія закраналі гісторыю Мсціслаўскага княства, былі прысвечаны гэтай праблематыцы і з'явіліся ўжо ў сярэдзіне XIX ст., калі ў Магілёўскіх губернскіх ведамасцях некалькі разоў друкаваліся артыкулы С. Сакалова. Праз некаторы час гэтыя ж артыкулы былі апублікаваны ў аб'яднаным выглядзе ў Памятнай кніжцы Магілёўскай губерні за 1868 год[4].

Некаторыя звесткі па генеалогіі мсціслаўскіх князёў сустракаюцца ў манаграфіі А. Б. Лабанава-Растоўскага, прысвечанай радаслоўю рускіх дваранскіх родаў[5]. Змястоўны нарыс, прысвечаны мсціслаўскім князям, што былі на вялікакняскай службе як у Вялікім Княстве Літоўскім, так і ў Рускім царстве, ёсць у выдадзенай ў сярэдзіне 90-х гадоў XIX ст. манаграфіі Е. Вольфа[6].

Пытанні генеалогіі мсціслаўскіх князеў напрыканцы XIX – у пачатку XX ст. разглядалі А. П. Барсукоў і Н. Мятлеў[7]. У сярэдзіне XX ст. свет убачыла публікацыя П. М. Раеўскага, прысвечаная роду князёў мсціслаўскіх, але яна значна саступае па інфармацыйнасці ўсім папярэднім і фактычна з'яўляецца кароткім храналагічным пераказам жыццядзейнасці мсціслаўскіх князёў[8].

Акрамя генеалогіі роду мсціслаўскіх князёў даволі рана пачаў прыцягваць да сабе ўвагу цэнтр княства і ваяводства – Мсціслаў. Яго старажытнасці пачалі выклікаць цікавасць яшчэ напрыканцы XVIII ст. Першыя звесткі пра старажытнасці Мсціслава – згадку пра існаванне ў ім замка – мы сустракаем ў апісаннях падарожжа імператрыцы Кацярыны II у Беларусь і на поўдзень[9]. У пачатку XVIII ст. У. Севергін, абапіраючыся на звесткі В. М. Тацішчава, звязаў час узнікнення Мсціслава з першым вядомым мсціслаўскім князем Мсціславам Раманавічам[10].

---

[4] Соколов С. Род князей Мстиславских // Могилевские губернские ведомости. – 1857. – № 1–3; 1869. – № 34–38.

[5] Русская родословная книга. – СПб.: Изд-во Русской старины, 1873. – 373 с.

[6] Wolff J. Kniazowie litewsko-ruscy od konca czternastego wieku. – Warszawa: Gebethner, Wollf, 1895. – № 2. – S. 263–273.

[7] Барсуков А. П. Сведения об Юхотской волости и ее прежних владельцах князьях Юхотских и Мстиславских. С приложением статьи об Юхотских сокольих повытчиках. – СПб., 1894. – 78 с.; Мятлев Н. К родословию князей Мстиславских. – М., 1915. – 17 с.; Яго ж. К родословию князей Мстиславских // Сб. статей, посвященных Л. М. Савелову. – М., 1915. – С. 300–317.

[8] Раевский П. М. Род царя и царевен и князей Шуйских и угасший род князей Мстиславских и Ижеславских. – Париж, 1957. – 33 с.

[9] Топографические примечания на знатнейшие места путешествия ее императорского величества в Белорусские наместничества; сост. И. И. Лепехин [и др.]. – СПб.: Имп. Акад. наук, 1780. – С. 99; Путешествие Ее императорского величества в полуденный край России предпринемлимое в 1786 году. – СПб.: Печ. при Горном училище, 1787. – С. 18.

[10] Севергин В. М. Продолжение записок путешествия по западным провинциям Российского государства. – СПб.: Изд-во Имп. Акад. наук, 1805. – С. 56.

У XIX ст. з'яўляюцца першыя аналітычныя агляды археалагічных помнікаў горада. Так, першы гісторык горада В. І. Прахаў лічыў Дзявочую і Замкавую гару абарончымі збудаваннямі, якія ў старажытнасці падпарадкоўваліся адзінай сістэме абароны горада ад Маскоўскага княства. У 1910 г. Яўсеевым быў апісаны адзін з археалагічных помнікаў Мсціслава – гарадзішча Дзявочая гара[11]. Аднак археалагічныя раскопкі ў самім горадзе ў канцы XIX – пачатку XX ст. не праводзіліся. Тады ж фатаграфаванне і апісанне старажытнасцяў горада для дзявятага тома «России» П. П. Сямёнава-Цянь-Шанскага рабіў М. М. Астанковіч.

У 1912 г. нарэшце выходзіць першая грунтоўная праца па гісторыі старажытнага і сучаснага Мсціслава, якая належыць пяру мясцовага настаўніка гімназіі – В. Г. Краснянскага[12]. І хаця яе аўтара не цікавілі помнікі археалогіі, у кнізе ўпершыню былі сабраны і сістэматызаваны звесткі па гісторыі горада XII – пачатку XX ст.

У сярэдзіне 70-х гадоў XX ст. выходзіць другая кніга, прысвечаная гісторыі Мсціслава, аднак яе большая частка адносіцца да падзей XIX–XX стст., а больш ранні перыяд у ёй закрануты нязначна[13]. У пачатку 90-х гадоў XX ст. выйшла з друку новая кніга, прысвечаная Мсціславу, у якой таксама ёсць асобныя сюжэты, што адлюстроўваюць гісторыю Мсціслаўскага княства і ваяводства XIV–XVIII стст.[14]

Акрамя назапашвання пісьмовых матэрыялаў па гісторыі Мсціслава, з канца 50-х гадоў XX ст. пачаліся яго археалагічныя даследаванні, якія на працягу 30 гадоў з перапынкамі праводзіў Л. В. Аляксееў. Ім быў даследаваны размешчаны на тэрыторыі горада помнік археалогіі перыяду жалезнага веку – гарадзішча Дзявочая гара, але асноўная ўвага ім надавалася вывучэнню дзядзінца сярэдневяковага горада – Замкавай гары. Вынікам яго работ стала серыя публікацый, прысвечаных гісторыі і археалогіі Мсціслава XII–XVII стст., аднак зрабіць скразную працу па выніках археалагічнага даследавання дзядзінца Мсціслава Л. В. Аляксееў не паспеў[15].

---

[11] Прахов В. И. Остатки древних укреплений в Мстиславле // Могилевские губернские ведомости. – 1847. – № 8; Евсеев Н. Город Мстиславль (Девичья гора) // Могилевский вестник. – 1910. – № 68.

[12] Краснянский В. Г. Город Мстиславль. – Вильня, 1912. – 99 с.

[13] Ясинский О. А., Гасенков В. Л. Мстиславль. Историко-экономический очерк. – Минск: Беларусь, 1975. – 110 с.

[14] Ткачоў М. А., Трусаў А. А. Старажытны Мсціслаў. – Мінск: Полымя, 1992. – 110 с.

[15] Алексеев Л. В. Городище «Девичья гора» в Мстиславле // КСИА. – 1963. – Вып. 94. – С. 73–79; Яго ж. Устав Ростислава Смоленского 1136 г. и процесс феодализации Смоленской земли // Słowianie w dzeijach Europy. – Poznań. – 1974. – S. 85–113; Яго ж. Древний Мстиславль (по материалам раскопок 1959–1964, 1968 и 1969 гг.) // КСИА. – 1976. – Вып. 146. – С. 44–52; Яго ж. Смоленская земля в IX–XIII вв.; Яго ж. Проблемы становления культово-оборонного зодчества Руси в свете раскопок в Мстиславле (Беларусь) // РА. – 1993. – № 4. – С. 217–238; Яго ж. Мстиславский детинец в XII–XIV веках // РА. – 1995. – № 3. – С. 60–76; Яго ж. Детинец Мстиславля в XIV–XVII вв. // РА. – 2000. – № 2. – С. 94–113; Яго ж. Западные земли домонгольской Руси. Очерки истории, археологии, культуры: в 2 кн. – М.: Наука, 2006. – Кн. 1. – 289 с.; Кн. 2. – 167 с.

У дапаўненне да прац, якія праводзіліся Л. В. Аляксеевым на Замкавай гары, у 80-я гады XX ст. буйнамаштабныя архітэктурна-археалагічныя даследаванні на пасадзе Мсціслава і вакол яго архітэктурных помнікаў розных часоў праводзіў А. А. Трусаў. Вынікам гэтых прац сталі шматлікія артыкулы, што адлюстроўваюць розныя бакі матэрыяльнай культуры сярэднявечнага горада, а таксама была зроблена першая спроба вызначэння тэрыторыі вакольнага горада Мсціслава[16]. Акрамя таго, вынікі гэтых даследаванняў сталі шырока выкарыстоўваць у сваіх працах гісторыкі архітэктуры, у выніку чаго з'явіліся шматлікія працы, прысвечаныя працэсам фарміравання горада і будаўніцтву яго асобных архітэктурных дамінантаў[17], хаця першыя працы, прысвечаныя гісторыі мсціслаўскага кармеліцкага кляштара і яго фрэскам, з'явіліся яшчэ ў пачатку XX ст. Падобная мастацтвазнаўчая праца па апісанні фрэсак Тупічэўскага манастыра Мсціслава была праведзена ў 20-я гады XX ст. Т. Ржавускай[18].

Нягледзячы на вялікую працу, праведзеную Л. В. Аляксеевым і А. А. Трусавым па археалагічным даследаванні Мсціслава, трэба адзначыць, што па-за іх увагай застаўся вялікі раён горада, размешчаны ўздоўж плыні р. Віхра, –

---

[16] Здановіч Н. І., Трусаў А. А. Мсціслаўскі посуд XV–XIX стст. // Помнікі культуры. Новыя адкрыцці. – Мінск: Навука і тэхніка, 1985. – С. 195–201; Яніцкая М. М., Сташкевіч А. Б. Мсціслаўскае шкло XVI–XIX стст. // Помнікі культуры. Новыя адкрыцці. – С. 83–93; Ганецкая І., Здановіч Н., Трусаў А. Вытокі беларускага фаянсу // Мастацтва Беларусі. – 1988. – № 6. – С. 58–61; Сагановіч Г. М. Кавальскія вырабы сярэднявечнага Мсціслава // Помнікі мастацкай культуры Беларусі. Новыя даследаванні. – Мінск: Навука і тэхніка, 1989. – С. 183–189; Сташкевіч А., Трусаў А. Дрыготкія водбліскі даўніны // Мастацтва Беларусі. – 1989. – № 4. – С. 64–69; Трусаў А. Мсціслаўская касцярэзная майстэрня // ПГКБ. – 1989. – № 1. – С. 18–19; Трусов О. А. Мстиславльские изразцы // Памятники культуры. Новые открытия : Ежегодник. 1989. – М.: Наука, 1990. – С. 334–340; Ганецкая І. У. Мастацкая кераміка Мсціслава // Вес. Акад. навук БССР. Сер. грамад. навук. – 1990. – № 1. – С. 75–80; Трусаў А. А., Ткачоў М. А., Мяцельскі А. А. Некаторыя вынікі археалагічнага вывучэння акольнага горада Мсціслава XII–XVIII стст. // Вес. Акад. навук БССР. Сер. грамад. навук. – 1990. – № 2. – С. 80–88; Сташкевіч А. Развіццё шкларобства на Магілёўшчыне. Спроба рэтраспектыўнага аналізу // З глыбі вякоў. Наш край: Гіст.-культуралаг. зб. – Вып. 1. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – С. 89–109.

[17] Трусаў А. А., Баравы Р. В. Помнікі старажытнасці Мсціслава: Да 850-годдзя горада. – Мінск: Полымя, 1985. – 19 с.; Боровой Р. В. Развитие планировочной структуры Мстиславля (XII–XIX вв.) // Строительство и архитектура Белоруссии. – 1989. – № 4. – С. 2–4; Габрусь Т. В. Мураваныя харалы. Сакральная архітэктура беларускага барока. – Мінск: Ураджай, 2001. – С. 157–158; Кішык Ю. Н. Сілуэтныя кампазіцыі Мсціслава // ПГКБ. – 1972. – № 3. – С. 27–29; Пятровіч Н. Мсціслаўскі кляштар бернардзінцаў // ГАЗ. – Мінск, 1996. – № 8. – С. 189–193; Слюнькова И. Н. Архитектурные памятники Мстиславля // Архитектурное наследство. – М., 1988. – Вып. 36. Русская архитектура. – С. 245–249; Слюнькова И. Н. Архитектура городов Верхнего Приднепровья XVII – середины XIX в. – Минск: Наука и техника, 1992. – С. 25–28.

[18] Obst J. Freski w kościele Mścisławskim // Litwa i Ruś. – 1912. – T. 2. – Zesz. 1. – S. 28–33; Smora. Kilka słow o karmelitach a. r. oh. w Mścisławiu // Litwa i Ruś. – 1912. – T. 3. – S. 186–190; Ржавуская Т. Насьценныя росьпісы ў царкве б. Тупічэўскага манастыра ў Мсьціслаўлі // Запіскі аддзелу гуманітар. навук. – Кн. 6. Працы камісіі гісторыі мастацтва. – Т. 1. – Сш. 1. – Мінск: Інбелкульт, 1928. – С. 141–166.

Падол. І трэба прызнаць, што абагульняючая праца па развіцці тапаграфічнай структуры Мсціслава і яго архітэктурных помнікаў да сённяшняга дня адсутнічае.

Пры вывучэнні генеалагічнага дрэва мсціслаўскіх князёў і гісторыі Мсціслава ў XIX ст. значна меншую увагу прафесійных даследчыкаў прыцягвалі пытанні гісторыі Мсціслаўскага княства. Толькі напрыканцы XIX ст. у працах М. К. Любаўскага і Ф. Леантовіча былі ўзняты некаторыя пытанні, звязаныя з гісторыяй яго фарміравання і тэрытарыяльнага развіцця: імі упершыню было выказана меркаванне, што Мсціслаўскае княства займала не толькі тэрыторыю, прылеглую да Мсціслава, але тэрыторыя княства ахоплівала землі, размешчаныя на захад ад Дняпра. Тады ж імі былі зроблены і спробы разгледзець некаторыя пытанні, прысвечаныя палітычнай гісторыі Мсціслаўскага княства XIV – пачатку XVI ст.[19]

У больш познія часы Мсціслаўскае княства не цікавіла рускіх і савецкіх гісторыкаў. Толькі асобныя сюжеты, звязаныя з гісторыяй мсціслаўскіх князёў і Мсціслава, усплывалі ў працах некаторых даследчыкаў, прычым яны тычыліся выключна ваенных падзей першай паловы XVI ст.[20]

Некалькі больш увагі ў XIX–XX стст. надавалася Мсціслаўскаму княству ў польскай гістарыяграфіі. Асобныя сюжэты з яго гісторыі мы сустракаем ўжо ў працы М. Балінскага і Т. Ліпінскага. Кароткая, але даволі змястоўная інфармацыя па гісторыі Мсціслаўскага княства і ваяводства, якая ў значнай ступені не страціла сваёй актуальнасці, сустракаецца ў «Польскім слоўніку геаграфічным...» Напрыканцы XIX ст. ў «Газеце Варшаўскай» быў надрукаваны артыкул Марэка Гадзавы, прысвечаны Мсціслаўскаму княству[21].

У 30-я гады XX ст. гісторыя Мсціслаўскага княства прыцягнула ўвагу М. Бараноўскай, якая падрыхтавала дысертацыю на гэту тэму[22], але яна, на вялікі жаль, не была надрукавана і разам з аўтарам загінула ў гады Другой сусветнай вайны.

Асобныя сюжэты, звязаныя з гісторыяй Мсціслаўскага княства, закраналіся ў працах даследчыкаў, што вывучалі розныя пытанні гісторыі ВКЛ і Рэчы

---

[19] Любавский М. К. Областное деление и местное управление Литовско-Русского государства ко времени издания Первого Литовского статута. – М.: Университет. тип., 1892. – С. 13–15, 136–139; Леонтович Ф. Очерки истории Литовско-русского права. Образование территории литовского государства – СПб.: Тип. В. С. Балашова и К°, 1894. – С. 110–118.

[20] Кром М. М. Меж Русью и Литвой. Западно-русские земли в системе русско-литовских отношений конца XV – первой трети XVI в. – М.: Археографический центр, 1995. – С. 101–105; Ткачев М. А. Замки Беларуси. – Минск : Беларусь, 2002. – С. 86–101.

[21] Balinski M., Lipinski C. Starozytna Polska pod wzglendem historycznym, geograficznym i starozytnym. – Warszawa : Nakladem i drukiem S. Orgelbrunda. – 1846. – T. 3. – S. 801–810; Słownik geograficzny Królewstwa Polskiego i innych krajow słowianskich. – Warszawa: «Wieku», 1885. – T. VI. – S. 774–778; Godzawa M. (Giżycki J. M.). Terytorjum i losy księstwa Mścisławskiego // Gazeta Warszawska. – 1897. – № 273, 275.

[22] Jablonski A. Atlas historyczny Polski w opracowaniu komisji atlasu historycznego Polski. Serja B: Mapy przeglądowe. – Kraków: Naklad PAU, 1928. – S. 9.

Паспалітай, асабліва іх усходніх раёнаў[23], але цэльнай працы, якая б асвятляла розныя бакі гісторыі Мсціслаўскага княства, польская гістарычная навука таксама не ведае. Выключэннем з'яўляецца вялікі і даволі цікавы артыкул, прысвечаны гісторыі Мсціслаўскага княства, які падрыхтавала А. Крупска[24] ў пачатку 70-х гадоў XX ст.

Гэтым на сённяшні дзень, фактычна, і абмяжоўваецца гістарыяграфія, прысвечаная Мсціслаўскаму княству. Толькі ў апошнія часы з'явілася серыя публікацый аўтара манаграфіі, прысвечаных гістарычна-геаграфічным даследаванням на тэрыторыі Мсціслаўскага княства і ваяводства, развіццю ўрбаністычных працэсаў на яго тэрыторыі і асобным сюжэтам, звязаным з канфесійным жыццём[25].

Акрамя гістарычных прац, прысвечаных тым ці іншым пытанням, якія закранаюць тэрыторыю Мсціслаўскага княства і ваяводства, з канца XIX ст. да вывучэння гэтага рэгіёна актыўна падключыліся і археолагі.

Ужо з канца XIX ст. увагу даследчыкаў пачалі прыцягваць помнікі археалогіі, размешчаныя ў непасрэдных наваколлях Мсціслава. Тут першыя навуковыя археалагічныя даследаванні былі распачаты Е. Р. Раманавым, верагодна, у 1884 г. і працягнуты ў 90-я гады XIX ст. М. В. Фурсавым і С. Ю. Чалоўскім. У 1889 г. М. Е. Брандэнбург праводзіў пошукавыя працы пад Мсціславам на месцы бітвы 1386 г. войскаў ВКЛ і смаленскіх князёў. А ў пачатку XX ст. (1902 г.) ён праводзіў археалагічныя абследаванні помнікаў у наваколлях горада[26].

---

[23] Kolankowski L. Dzieje Wielkiego Księnstwa Litewskiego za Jagełłonów. – T. 1. 1377–1499. – Warszawa : Skład główny. Kasa im. Mianowskiego, 1930. – 474 s.; Kuczyński S. Ziemie czernihowsko-siewierskie pod rządami Litwy // Prace ukraińskiego instytutu naukowego. – Warszawa, 1936. – T. 33. – 412 s.

[24] Krupska A. Udzielnie księstwo Mścisławskie pod rządami Litwy // Prace historiców Uniwersitetu Sląskego. – Katowice, 1971. – T. 2. – S. 35–55.

[25] Мяцельскі А. Некаторыя пытанні гістарычнай геаграфіі Смаленскай зямлі XII–XIII стст. // Гістарычна-археалагічны зборнік. Памяці Міхася Ткачова.: у 2 ч. – Мінск, 1993. – Ч. 2. – С. 60–76; Яго ж. Смаленска-чарнігаўскае памежжа XII стагоддзя ў міжрэччы Дзясны і Дняпра // ГАЗ. – Мінск, 1994. – № 4. – С. 140–160; Яго ж. Хоцімск: да пытання пра час узнікнення // Вес. НАН Беларусі. Сер. гуманітар. навук. – 1999. – № 4. – С. 20–24; Яго ж. Лучыцкая воласць XV–XVIII стагоддзяў // Вес. НАН Беларусі. Сер. гуманітар. навук. – 2000. – № 4. – С. 59–66.; Яго ж. Воласць Крычава ў XII–XVIII стст.: тэрыторыя, адміністрацыйна-гаспадарчы падзел, паселішчы // ГАЗ. – Мінск, 2000. – № 15. – С. 81–92.; Яго ж. Фарміраванне і тэрытарыяльнае развіццё Мсціслаўскага княства сярэдзіны XII – пачатку XVI ст. // МАБ. – Мінск, 2001. – № 3. – С. 22–43; Яго ж. Мястэчкі Крычаўскага староства // Castrum, urbis et bellum: нав. рэд. Г. Семянчук і А. Мяцельскі. – Баранавічы, 2002. – С. 286–295.; Яго ж. Мястэчкі Мсціслаўскага ваяводства XVI–XVIII стст. // ГАЗ. – Мінск, 2008. – № 23. – С. 66–81; Яго ж. Заснаванне Пустынскага Свята-Успенскага манастыра: загадкі гісторыі // Бел. гіст. часоп. – 2009. – № 11. – С. 47–49.

[26] Сементовский А. М. Белорусские древности. – СПб., 1890. – Вып. 1. – С. 22; Дневник курганных раскопок, произведенных по поручению Почетного члена IX Археологического Съезда, Тайного Советника А. С. Дембовецкого, в течение июня 1893 года, в трех уездах Могилевской губернии. – Могилев губернский: Тип. Губ. ком, 1893. – 16 с.; Бранденбург Н. Е. Журнал раскопок 1888–1902 гг. Работы в губерниях: Киевской, Полтавской, Харьковской, Каменец-Подольской, Екатеринославской, Таврической, Черниговской, Могилевской, Новгородской, Смоленской и в Области Войска Донского. – СПб.: Т-во Р. Голике и А. Вильборк, 1908. – С. III.

Акрамя прац у бліжэйшых наваколлях Мсціслава, з канца XIX ст. даследчыкі паступова пачалі назапашваць археалагічныя матэрыялы, якія асвятляюць гісторыю тэрыторыі, што займала Мсціслаўскае княства. У 90-я гады XIX ст. курганы на Пасожжы актыўна даследавалі М. В. Фурсаў і С. Ю. Чалоўскі. Уздоўж р. Іпуць даследаванні курганоў на землях радзімічаў праводзілі А. А. Спіцын і П. М. Яроменка. Археалагічныя матэрыялы, сабраныя ў пачатку XX ст. настаўнікам Рослаўскай гімназіі С. М. Сакалоўскім, што адносяцца да гісторыі рэгіёна нашага даследавання, былі надрукаваны Л. М. Ляўданскім у пачатку 30-х гадоў XX ст. Тады ж А. М. Ляўданскім у наваколлях Мсціслава было даследавана гарадзішча і селішча каля в. Каўшарава на р. Сож. У 1930 г. невялікія даследаванні на замчышчы ў Радамлі правёў І. А. Сербаў. У 1936 г. падчас экспедыцыі па Сожы археалагічныя помнікі Крычава і Прупоя абследавалі С. А. Дубінскі, А. М. Ляўданскі і Д. А. Каваленя, тады ж імі ўпершыню былі зняты планы археалагічных помнікаў Крычава[27].

Назапашванне пэўнага археалагічнага матэрыялу ў спалучэнні з пісьмовымі данымі, дазволіла ў канцы 60-х – пачатку 70-х гг. XX ст. перайсці да гістарычна-геаграфічнага агляду Смаленскай зямлі, састаўной часткай якой былі паўночныя землі Пасожжа, на якіх размяшчалася Мсціслаўскае княства. У першую чаргу гэта адносіцца да работ В. В. Сядова[28].

У канцы 60-х гадоў XX ст., акрамя Мсціслава, пачаліся археалагічныя даследаванні іншых гарадскіх цэнтрах Сярэдняга і Верхняга Пасожжа. Невялікія даследаванні на археалагічных помніках Крычава праводзіў Г. В. Штыхаў, але

---

[27] Фурсов М. В., Чоловский С. Ю. Дневник курганных раскопок произведенных по поручению г. Начальника Могилевской губернии, Александра Станиславовича Дембовецкого, в течении лета 1892 г., в уездах Рогачевском, Быховском, Климовичском, Чериковском и Мстиславском. – Могилев на Днепре, 1892. – 37 с.; Спицын А. А. Обозрение некоторых губерний и областей России в археологическом отношении. I и II. Могилевская и Черниговская губернии // Записки Императорского русского археолог. общества. – Т. 8. – Вып. 1–2. – Новая серия. – Труды отделения русской и славянской археологии. – СПб., 1896. – С. 114–132; Еременко П. М. Могильники и городища Глуховского и Суражского уездов // Труды Московского предварительного комитета по устройству XIV Археологического съезда. – М.: Тип. об-ва распростр. полез. книг аренд. В. И. Вороновым, 1906. – Вып. 1. – С. 96–106; Ляўданскі А. М. Археалагічныя досьледы у Смаленшчыне. Археалагічныя досьледы С. М. Сакалоўскага ў былым Рослаўскім павеце. Дробныя звесткі аб курганных знаходках і гарадзішчах былой Смаленскай губерніі // Працы секцыі археалогіі Ін-та гісторыі Бел. акад.навук. – Мінск, 1932. – Т. 3. – С. 5–68; Дубінскі С. А. Археалагічная праца на Беларусі за 1919–1928 гг. // Запіскі аддзелу гуманітар. навук. – Кн. 5. Працы кафедры археалогіі. – Мінск, 1928. – Т. 1. – С. 280; Лявданский А. Н. Некоторые данные о городищах Смоленской губернии // Науч. изв. Смолен. гос. ун-та. – Т. 3. – Вып. 3. – Смоленск, 1926. – С. 225–251; Сербаў І. А. Археалагічныя абследаванні ў вадазборах рэк Проні – Ухлясьці ў былой Магілёўшчыне // Працы секцыі археалогіі Ін-та гісторыі БАН. – Мінск, 1932. – Т. 3. – С. 240–241; Коваленя Д. С. Дневник экспедиции 1936 г. по Сожу // Архіў Інстытута гісторыі НАН Беларусі. – Адз. зах. 457.

[28] Седов В. В. К исторической географии Смоленской области // МИСО. – Смоленск, 1961. – Вып. 4. – С. 317–347; Яго ж. Смоленская земля // Древнерусские княжества X–XIII вв. – М.: Наука, 1975. – С. 240–259.

сістэматычнае вывучэнне яго археалагічных старажытнасцей распачаў у пачатку 1970-х гадоў М. А. Ткачоў. Тады ж былі праведзены невялікія даследаванні ў старажытным Прупоі і Радамлі, што дало магчымасць зрабіць першыя напрацоўкі па вызначэнні часу іх узнікнення і развіцця тапаграфічнай структуры[29].

У 70–90-я гады XX ст. вывучэннем сельскіх паселішчаў IX–XIII стст. на Магілёўшчыне, і ў тым ліку на Пасожжы, займаліся Я. Р. Рыер і аўтар[30]. У гэтыя ж гады аўтар праводзіў даследаванні ў Мсціславе, Крычаве, Слаўгарадзе (летапісным Прупоі), на гарадзішчы каля в. Горы, вынікам якіх сталі шэраг артыкулаў, прысвечаных археалогіі і гісторыі гэтых гарадоў, і манаграфія, прысвечаная Крычаву[31].

Важную інфармацыю пра археалагічныя помнікі X–XIII стст., размешчаныя на тэрыторыі Мсціслаўскага княства, сустракаем у зборах помнікаў гісторыі і культуры, што былі падрыхтаваны ў 70–80-я гады XX ст. Некалькі пазней гэту працу, але на больш высокім навуковым узроўні, па падрыхтоўцы і выданні археалагічных карт розных раёнаў Магілёўскай вобласці правёў В. Ф. Капыцін. Менавіта ў гэтых выданнях знаходзіцца найбольш поўная на сённяшні час інфармацыя. З расійскага боку гэту працу падмацоўваюць работы Я. А. Шмідта і археалагічныя карты Смаленскай і Бранскай абласцей,

---

[29] Очерки по археологии Белоруссии. Ч. 2.; под ред. Г. В. Штыхова и Л. Д. Поболя. – Минск : Наука и техника, 1972. – С. 127; Ткачев М. А. Работы в Белорусском Посожье // АО 1975 года. – М.: Наука, 1976. – С. 427–428; Яго ж. Работы Посожского отряда // АО 1976. – М.: Наука, 1977. – С. 417–418; Мельниковская О. П. Обследование древнего Радомля // КСИА. – 1976. – Вып. 146. – С. 60–62; Ткачоў М. А., Мяцельскі А. А. Старажытны Прупой // Магілёўская даўніна. – Магілёў, 1997. – Вып. 5. – С. 60–65.

[30] Риер Я. Г. Феодальная деревня в Могилевском Поднепровье в X–XIII вв.: автореф. дис. … канд. ист. наук: 07. 00. 06; Ин-т истории АН Лит. ССР. – Вильнюс, 1979. – 28 с.; Яго ж. Характер размещения сельского населения в Могилевском Поднепровье в X–XIV вв. // СА. – 1982. – № 4. – С. 107–118; Яго ж. Некоторые вопросы развития феодальной деревни Могилевского Поднепровья в X–XIV вв. // Древности Белоруссии и Литвы. – Минск : Наука и техника, 1982. – С. 137–144; Яго ж. Природная среда и система сельского расселения в восточной Белоруссии // Методы естественных наук в археологии. – М.: Наука, 1987. – С. 50–55; Яго ж. Вясковае паселішча ў г. Чавусы // ГАЗ. – Мінск, 1994. – № 3. – С. 202–227; Мяцельскі А. А. Шаўнеўскае гарадзішча XII–XIII стст. // ГАЗ. – Мінск, 1996. – № 10. – С. 65–71.

[31] Мяцельскі А. А., Ткачоў М. А. Зброя і рыштунак вершніка з раскопак Крычава // ГАЗ. – Мінск, 1994. – № 4. – С. 187–200; Іх жа. Гарадзішча каля в. Горы Горацкага раёна // З глыбі вякоў. Наш край. Гіст.-культуралаг. зб. – Вып. № 1. – Мінск : Навука і тэхніка, 1996. – С. 187–197; Ткачоў М. А., Мяцельскі А. А. Старажытны Прупой; Мяцельскі А. А. Замак Крычава ў XII–XVIII стст: фартыфікацыйныя збудаванні // Zamak i dwór w średniowieczu od XI do XV wieku = The castle and the court in the middle age from 11th until the 15th century. Materialy XIX Seminariuma Mediewistycznego / Poznańskie tow-wo przyjaciol nauk: pod. red. J. Wiesiołowskiego przy wspolpr. J. Kowalskiego. – Poznań, 2001. – S. 98–103; Яго ж. Старадаўні Крычаў: гістарычна-археалагічны нарыс горада ад старажытных часоў да канца XVIII ст. – Мінск: Беларус. навука, 2003. – 168 с.

падрыхтаваныя іншымі даследчыкамі[32]. Адносна нядаўна выйшла з друку манаграфія У. У. Багамольнікава, прысвечаная радзімічам, у якой ёсць матэрыялы і з рэгіёна нашага даследавання[33].

Такім чынам, археолагамі праведзена вялікая работа па зборы матэрыялаў з сярэдневяковых помнікаў цікавага для нас рэгіёна, якія, у спалучэнні з пісьмовымі крыніцамі, дазваляюць рабіць рэканструкцыю гістарычнага развіцця Мсціслаўскага княства.

Такая даволі сціплая бібліяграфія па гісторыі Мсціслаўскага княства выклікана перш за ўсё тым, што яно праіснавала толькі да пачатку XVI ст. і вельмі слаба аблюстравана ў пісьмовых крыніцах. Фактычна захаваліся адзінкавыя крыніцы, звязаныя з яго гісторыяй, на падставе якіх даволі цяжка ўзнавіць падзеі, што адбываліся тут.

Далейшым развіццём Мсціслаўскага княства стала сфарміраванае ў сярэдзіне XVI ст. на яго землях Мсціслаўскае ваяводства. Пытанні развіцця і гістарычных падзей, што адбываліся на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства, за выключэннем асобных сюжэтаў ваеннай гісторыі XVII–XVIII стст.[34], пакуль застаюцца па-за ўвагай даследчыкаў. Выключэннем з'яўляюцца пытанні развіцця сельскай гаспадаркі ў другой палове XVII – пачатку XVIII ст. і паўстання 1740–1744 гг. на тэрыторыі Крычаўскага староства, што размяшчалася на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства, разгледжаныя В. І. Мялешкам[35].

---

[32] Шмидт Е. А. Древнерусские археологические памятники Смоленской области. Ч. 1. – М.: Московский рабочий, 1982. – 193 с.; Яго ж. Древнерусские археологические памятники Смоленской области. Ч. 2. – М.: Московский рабочий, 1983. – 184 с.; Копытин В. Ф. Археологические памятники Чаусского района Могилевской области. – Могилев, 1992. – 105 с.; Яго ж. Археологические памятники Шкловского района Могилевской области. – Могилев, 1993. – 97 с.; Яго ж. Археологические памятники Чериковского района Могилевской области. – Могилев, 1994. – 64 с.; Яго ж. Археологические памятники Костюковичского района Могилевской области. – Могилев, 1996. – 176 с.; Яго ж. Археологические памятники Климовичского района Могилевской области. – Могилев: Изд-во Мог. гос. ун-та, 1998. – 112 с.; Яго ж. Свод памятников археологии Чернобыльской зоны Могилевской области. – Могилев: Изд-во Могил. гос. ун-та, 1998. – 241 с.; Яго ж. Археологические памятники Хотимского района Могилевской области. – Могилев: Изд-во Мог. гос. ун-та, 1999. – 85 с.; Археологические памятники Кричевского района Могилевской области. – Могилев: Изд-во Мог. гос. ун-та, 1999. – 109 с.; Археологическая карта России. Брянская область. – М., 1993. – 303 с.; Археологическая карта России. Смоленская область. – М., 1997. – Ч. 1. – 297 с.; Археологическая карта России. Смоленская область. – М., 1997. – Ч. 2. – 264 с.

[33] Богомольников В. В. Радимичи (по материалам курганов X–XII вв.). – Гомель: Гомель. гос. ун-т им. Ф. Скорины, 2004. – 226 с.

[34] Сагановіч Г. Невядомая вайна 1654–1667 гг. – Мінск: Навука і тэхніка, 1995. – 145 с.; Анішчанка Я. К. Народжаны рабалепнічаць. Беларускія землі пры першым падзеле Рэчы Паспалітай. – Мінск: Выдавец В. Хурсік, 2007. – 452 с.

[35] Мелешко В. И. Из истории аграрных отношений в Восточной Белоруссии в период упадка Речи Посполитой (с середины XVII в. до 1772 г.) // Acta baltiko-slavika. – Białystok, 1967. – № 5. – S. 41–92; Яго ж. Положение и классовая борьба крестьян в Кричевском старостве в конце XVII – первой половине XVIII вв. // Acta baltiko-slavika. – Białystok, 1970. – T. VII. –

Тым не менш, матэрыялы па яго гісторыі прадстаўлены значна большай крыніцазнаўчай базай. Інфармацыя па гісторыі Мсціслаўскага ваяводства другой паловы XVI–XVIII стст. знаходзіцца як у летапісах, так і ў шматлікіх выданнях архіўных матэрыялаў, якія тычацца перыяду вайны Рэчы Паспалітай і Расіі 1654–1667 гг., апублікаваных яшчэ ў канцы XIX – пачатку XX ст. Вельмі цікавая крыніца, што адносіцца да гісторыі Мсціслаўскага ваяводства, – «Падымны тарыф 1667 г.» – адносна нядаўна была апублікавана ў Польшчы[36].

Шматлікія крыніцы, што адносяцца да гісторыі Мсціслаўскага княства і ваяводства, захоўваюцца ў фондзе Літоўскай метрыкі (фонд КМФ-18), Мсціслаўскага (ф. 1729) і Аршанскага гродскага судоў (ф. 1730) і іншых фондах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (фф. 1781, 2001, 2151, 2308, 2310, 2311, 3421 і інш.). Гісторыя мсціслаўскага езуіцкага калегіума, напісаная самімі мсціслаўскімі езуітамі, ёсць у архіве таварыства Езуса ў Кракаве. У Кракаве ж, у архіве ордэна кармелітаў, яшчэ ў пачатку XX ст. захоўваўся рукапіс гісторыі мсціслаўскага кармеліцкага кляштара.

У той жа час трэба адзначыць, што ў параўнанні з заходнімі землямі ВКЛ матэрыялы па гісторыі Мсціслаўскага княства таксама нешматлікія. Выключэнне складаюць толькі дакументы, што адносяцца да Крычаўскага староства. Дзякуючы таму, што на працягу 90 гадоў яно знаходзілася ў дзяржанні княжацкага рода Радзівілаў, захаваліся шматлікія інвентары староства і горада, якія дазваляюць ясвятліць яго гісторыю. Яны ўтрымліваюцца ў фондах №№ 694, 1812 і КМФ-5 Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі.

Нешматлікія матэрыялы па гісторыі Мсціслаўскага і Крычаўскага старостваў Мсціслаўскага ваяводства ёсць таксама ў фондах Старажытных актаў, Радзівілаўскім фондзе (ф. 1280) і фондзе для разбору даўгоў князей Радзівілаў (ф. 459) Дзяржаўнага гістарычнага архіва Літвы.

Значная колькасць матэрыялаў, што адносяцца да канца гісторыі Мсціслаўскага ваяводства канца XVIII ст., назапашаны ў Расійскім дзяржаўным архіве Старажытных актаў, у фондах, звязаных з Генеральным межаваннем (ф. 1319, 1350, 1355, 1356), якое праводзілася ў 80-я гады XVIII ст.

Планы Мсціслава і Крычава, складзеныя ў 1777–1778 гг., на якіх адлюстравана больш ранняя планіроўка гэтых гарадоў, ёсць у фондзе № 846 Расійскага дзяржаўнага ваенна-гістарычнага архіва. Цікавай крыніцай па гісторыі Крычава з'яўляецца акварэль М. М. Іванова з выявай горада 1784–1785 гг., што захоўваецца ў Дзяржаўным Рускім музеі ў Санкт-Пецярбургу.

S. 109–197; Яго ж. Очерки аграрной истории Восточной Белоруссии. – Минск: Наука и техника, 1975. – 247 с.; Мялешка, В. І., Лойка П. А. Паўстанне сялян пад кіраўніцтвам Вашчылы. – Мінск: Народная асвета, 1988. – 95 с.; Іх жа. Узняўся люд просты. Да 300-годдзя з дня нараджэння Васіля Вашчылы – кіраўніка Крычаўскага паўстання 1740–1744 гадоў. – Мінск: Беларусь, 1992. – 80 с; Lech M. Powstanie chłopów białoruskich w starostwie krzyczewskim (1740 r.) // Pregląd historyczny. – 1960. – T. 51. – Zesz. 2. – S. 314–330.

[36] Metryka Litewska. Rejestry podymnego Wielkiego Księstwa Litewskiego. Województwo Mścisławskie 1667 r. – Warszawa: Wydawninictwo DiG, 2008. – 96 s.

Нягледзячы на адносную нешматлікасць матэрыялаў па гісторыі Мсціслаўскага ваяводства, назапашванне пэўнай колькасці археалагічнага і пісьмовага матэрыялу па гісторыі рэгіёна, дзе сфарміравалася і існавала Мсціслаўскае княства, а потым Мсціслаўскае ваяводства, дазваляе нам зрабіць першыя крокі ў асвятленні яго гісторыі на працягу шырокага храналагічнага перыяду – з XI па канец XVIII ст.

Аўтар выказвае шчырую падзяку А. А. Трусаву за дазвол карыстацца неапублікаванымі матэрыяламі, А. Б. Доўнару, В. С. Пазднякову, В. І. Цемушаву за дапамогу і карысныя парады ў працы над дадзеным даследаваннем, мастаку З. Ф. Краўчанка і лабаранту В. А. Блашко за выкананы ілюстрацыйны матэрыял і падрыхтаваныя карты, а таксама ўсім супрацоўнікам аддзела гісторыі Беларусі Сярэдніх вякоў і пачатку Новага часу Інстытута гісторыі НАН Беларусі.

ФІЗІЧНА-ГЕАГРАФІЧНЫ НАРЫС РЭГІЁНА. ШЛЯХІ ЗНОСІН

Фізічна-геаграфічная характарыстыка рэгіёна даследавання з'яўляецца неабходнай умовай для разумення асаблівасцей размяшчэння грамадства на мясцовасці. Залежнасць насельніцтва ад навакольнага асяроддзя выражалася ў адметнасцях гаспадаркі: выбар гаспадарчых стратэгій вызначаўся як узроўнем развіцця вытворчых сіл, так і наяўнасцю пэўных прыродных рэсурсаў. Месца жыхарства павінна было знаходзіцца ва ўмовах, якія забяспечвалі максімальную эксплуатацыю прыродных рэсурсаў з найменшай затратай сіл. На выбар месца для паселішча аказвала ўплыў і традыцыя: сяліліся там, дзе раней ужо жылі людзі, хаця зменлівыя ўмовы (сацыяльныя, экалагічныя) вымушалі некалькі мадэрнізаваць гаспадарку. Узнікненне і рост паселішчаў вызначаліся мноствам фактараў, якія былі звязаны паміж сабой лабірынтам дробнамаштабных прычынных сувязяў[1].

Найбольш уплывовымі фактарамі былі клімат, рэльеф, глебаўтваральныя пароды (якасць глебы), біялагічныя фактары (раслінны, жывёльны свет), гідралагічная сетка.

Мсціслаўскае княства, а потым ваяводства ў розныя часы свайго існавання ўваходзіла ў склад іншых, больш буйных дзяржаўных аб'яднанняў. У сярэдзіне XII – сярэдзіне XIV ст. Мсціслаўскае ўдзельнае княства ўваходзіла ў склад Смаленскай зямлі, знаходзілася на яе паўднёвым захадзе і межавала з Чарнігаўскім, а потым Бранскім княствам на поўдні. На поўначы, захадзе і ўсходзе да яго зямель прылягалі ўнутраныя раёны Смаленскай зямлі.

Тэрыторыя Мсціслаўскага княства не мела выразна акрэсленых геаграфічных межаў. З захаду ў XII – сярэдзіне XIV ст. яго межы ішлі прыкладна па плыні р. Проня, з усходу і поўдня – уздоўж плыні р. Іпуць. На поўначы мяжой Мсціслаўскага княства з'яўлялася рэчышча р. Рамяство і яе правых прытокаў, адкуль яна ішла ў напрамку р. Гародня, па апошняй мяжа ішла ў р. Віхра, падымалася па ёй прыкладна да сучаснага г. Манастыршчына і далей паварочвала на ўсход у бок р. Сож, а потым на р. Іпуць. Агульная плошча Мсціслаўскага княства да пачатку XVI ст. складала не меней за 20 000 кв. км.

З сярэдзіны XIV ст. Мсціслаў увайшоў у склад Вялікага Княства Літоўскага, у якім і заставаўся да 1772 г. У пачатку XVI ст. ўсходнія і паўднёвыя землі Мсціслаўскага княства, а з сярэдзіны XVI ст. – ваяводства апынуліся на

[1] Хаггет П. Пространственный анализ в экономической географии: пер. с англ. – М.: Прогресс, 1968. – С. 42.

памежжы з Рускім царствам. У выніку войнаў першай паловы XVI ст. тэрыторыя былога Мсціслаўскага княства скараціласа за кошт захопленых Масквой паўднёвых зямель, і паўднёвая дзяржаўная мяжа, якая з'яўлялася адначасова і паўднёвай мяжой утворанага ў другой палове XVI ст. Мсціслаўскага ваяводства, праходзіла па сучаснай расійска-беларускай мяжы.

У часы свайго найбольшага тэрытарыяльнага развіцця Мсціслаўскае ваяводства займала абшары Горацка-Мсціслаўскай і заходняй часткі Смаленска-Ельненска-Краснянскай раўніны і ахоплівала плошчу каля 11 000 кв. км. Рэльеф гэтага абшару мае выгляд хвалістай паверхні з пакатымі схіламі. На поўнач ад Сожа тэрыторыя моцна рассечана балкамі і далінамі рэк і ручаёў, а на поўдзень ад яго рэльеф хаця і мае хвалісты характар, але тут даліны невялікіх рачулак нешматлікія. Бліжэй да Іпуці рэльеф становіцца ўсё менш рассечаным і паступова пераходзіць у Палескую нізіну.

Акрамя таго, на паўднёвым усходзе вывучаемага рэгіёна сустракаецца града не звязаных паміж сабой ўзвышшаў – Пятровіцкая, Шумяцкая, Рослаўская, Крывалеская, Асельская[2].

Гідраграфічная сетка Мсціслаўскага княства і ваяводства абапіралася на р. Сож і яго буйныя прытокі – Беседзь, Іпуць, Асцёр, Проню. Асноўная маса як вялікіх, так і малых рэк мае мерыдыянны кірунак свайго рэчышча і накіравана з поўначы на поўдзень.

Вялікія дрыгвы на Верхнім Пасожжы адсутнічаюць. Калі тут і сустракаюца балоты, то яны невялікія па плошчы і размешчаны ў асноўным ўздоўж плыні рэк – на Стомячы, уздоўж Іпуці. У іншых месцах вывучаемага рэгіёна яны ўяўляюць сабой асобныя дробныя ўкрапленні. Улічваючы іх нязначнасць, адносна іх нават у крыніцах гаворыцца – «болотцы»[3]. Фактычна гэтым тлумачыцца і амаль поўная адсутнасць тут тапонімаў, якія б сведчылі пра іх знаходжанне каля ці за балотам, дрыгвой. Існуюць толькі два тапонімы такога тыпу – Забалацце ў Мсціслаўскім раёне Магілёўскай вобласці і Балотнае ў Хіславіцкім раёне Смаленскай вобласці.

Яшчэ адным значным элементам фізічна-геаграфічнага апісання рэгіёна, які не змяняўся на працягу вывучаемага перыяду, з'яўляецца карта распаўсюджання глеб. Асноўны тып глеб, што распаўсюджаны ў Верхнім Пасожжы, як на тэрыторыі сучаснай Беларусі, так і Расіі, гэта рознага тыпу дзярнова-падзолістыя альбо дзярнова-падзоліста-паліявыя глебы, якія адносяцца да найбольш урадлівых у гэтым рэгіёне. Толькі на тэрыторыі сучасных Хіславіцкага і Шумяцкага раёнаў Смаленскай вобласці вылучаюцца бура-лясістыя глебы[4], якія

---

[2] Почвы Белоруской ССР. – Мінск: Ураджай, 1974. – С. 243, 244, 251, 252; Шевченко П. Г. Рельеф Смоленской области // Природа Смоленской области (Геология, рельеф, почвы). – Смоленск, 1973. – Ч. 1. – С. 98.

[3] ИЮМ. – Вып. 17. – С. 219.

[4] Почвы Белоруской ССР. – С. 243, 244, 251; Маймусов Д. Ф. Почвы Смоленской области // Природа Смоленской области (Геология, рельеф, почвы). – Ч. 1. – С. 28.

сведчаць пра тое, што яшчэ не так даўно гэтыя землі былі заняты лясамі. У нізінах, у першую чаргу ў далінах буйных рэк – Сожа, Іпуці, Беседзі, Астра, Стомячы – у невялікай колькасці сустракаюцца забалочаныя торфападобныя глебы.

Калі вышэйпералічаныя натуральна-геаграфічныя элементы – гідраграфія і глебы – мелі даволі ўстойлівы характар і амаль не змяняліся на працягу стагоддзяў, то існавалі і іншыя натуральныя фактары, якія змяняліся на працягу вывучаемага перыяду – XII–XVIII стст. і адыгрывалі значную ролю ў гісторыі рэгіёна. Перш за ўсё гэта адносіцца да вывучэння лясістасці тэрыторыі.

Безумоўна, у эпоху Сярэднявечча большая частка тэрыторыі Мсціслаўскага княства і ваяводства была пакрыта лясамі. Узнавіць карціну лясістасці вывучаемага рэгіёна можна з дапамогаю картаграфавання «лясных» тапонімаў. Спроба такой працы, якая абапіралася на «лясныя» тапонімы, размешчаныя на тэрыторыі Магілёўскай вобласці, была зроблена Я. Г. Рыерам[5]. Аднак, на жаль, па-за ўвагай даследчыка застаўся храналагічны фактар. Аўтар не ўлічваў тэрмін узнікнення таго ці іншага паселішча, а на падставе прыналежнасці яго да «лясных» тапонімаў цалкам адносіў іх да XII–XIII стст. Але, як паказваюць пісьмовыя крыніцы, большая частка згаданых аўтарам «лясных» тапонімаў узнікла толькі ў XVII–XVIII стст.

Акрамя таго, улічваючы, што Мсціслаўскае княства і ваяводства XII–XVIII стст. ахоплівала не толькі тэрыторыю сучаснай Магілёўскай вобласці, але і частку тэрыторый Смаленскай і Бранскай абласцей Расіі, нам неабходна разглядзець у плане наяўнасці лясоў і гэтыя землі.

Адным з тыпаў першакрыніц, якія паказваюць нам Пасожжа XVI ст. як тэрыторыю, пакрытую лясамі, з'яўляюцца геаграфічныя карты, якія захаваліся да нашага часу. Так, на карце Польшчы і Венгрыі з «Геаграфіі» Пталамея, перавыдадзенай ў 1540 г., лясы паказаны на поўнач ад Паповай Гары, Старадуба, у міжрэччы Сожа і Дняпра. Вялікія лясы паказаны ў міжрэччы Сожа і Дзясны і на карце Еўропы Г. Меркатора 1554 г. Лясы на поўнач ад Крычава ў напрамку Оршы паказаны на карце Еўропы К. Фопеля 1566 г. Вялікія лясы на Пасожжы, уздоўж усходняй мяжы Рэчы Паспалітай паказаны на перавыдадзенай ў 1576 г. карце Еўропы Г. Меркатора і на карце Скрутэна 1592 г. Лясы за Сожам, на поўнач і на ўсход ад Крычава і Мсціслава, паказаны і на карце Расіі І. Маса 1633 г.[6] Тут на мяжы Рускага царства і Рэчы Паспалітай у пачатку

[5] Риер Я. Г. Характер размещения сельского населения. – С. 107–118; Яго ж. Природная среда и система сельского расселения. – С. 50–55.

[6] Buczek K. Dzieje kartografii Polskiej od XV do XVIII wieku. – Warszawa-Wrocław-Kraków: Wyd. PAN, 1963. – Tabl. 9; Katalog dawnych map Rzeczypospolitej Polskiej w kollekcji Emeryka Hutten Czapskiego i w innych zbiorach. – T. 1. Mapy XV–XVI wieku. – Wrocław: Wyd. PAN, 1978. – Mapy № 5, 23b, 25b, 27b; Alexandrowicz S. Rozwój kartografii Wielkiego księstwa Litewskiego od XV do połowy XVIII wieku. – Wyd. 2-e. – Poznań: Wyd-wo Uniw-ta im. Adama Mickiewicza, 1989, cz. 2. – Mapy № 9, 10; Кордт В. И. Материалы по истории русской картографии. – Киев, 1910. – Вып. 2. Карты всея России и западных ее областей до конца XVIII в. – Табл. XLIV, с. 30.

XVII ст. былі такія густыя лясы, што не дазвалялі дакладна правесці дзяржаўную мяжу, і час ад часу ўзнікалі спрэчкі пра размяшчэнне лясных будаў той ці іншай дзяржавы. Так, у 1621 г. бранскі ваявода скардзіўся, што жыхары Мсціслаўскага ваяводства арганізоўваюць буды ў Варанянскай воласці, у Афанасьеўскім лесе, каля в. Талкачова і Касцюшкава[7].

Картаграфічны матэрыял пра наяўнасць тут лясоў дапаўняюць і пісьмовыя крыніцы. Так, у першай палове XVII ст. вялікія пушчы адзначаюцца на тэрыторыі Прапойскага староства, а ў наваколлях Шумячаў згадваецца «пушча Шумяцкая». У наваколлях Мсціслава вялікія лясы згадваюцца каля вёсак Жукава і Кажуховічы, на поўнач і паўночны ўсход ад горада. Вялікія лясы і пушчы адзначаюцца за Віхрой і Сожам у сярэдзіне XVII ст.[8] Пушча Крычаўская згадваецца ва ўсіх інвентарах Крычава XVII–XVIII стст.

На паўночным захадзе вывучаемага рэгіёна тэмпы знішчэння лясоў, верагодна, былі больш хуткімі ў XVII–XVIII стст., таму землі, размешчаныя паміж Мсціславам і Оршай, у пачатку XIX ст. былі ўжо амаль бязлесістымі[9]. Тым не менш, яшчэ у 1632 г. згадваецца Дрыбінская пушча, а ў сярэдзіне XVII ст. у гэтай пушчы існаваў дрэваапрацоўчы промысел, пра што сведчыць тапонім Паташня[10]. Лес вакол Дрыбіна існаваў яшчэ ў канцы XVIII ст.[11], а невялікія яго фрагменты захаваліся ў гэтым раёне і да сённяшніх дзён.

Вялікія лясы і пушчы ў Прапойскім старостве адзначаюцца яшчэ ў першай палове XVIII ст. Лясістасць памежных раёнаў адзначаюць і рускія крыніцы канца XVIII ст. Так, вялікія пушчы, лясы і гаі адзначаюцца ў Суражскім павеце Ноўгарад-Северскага намесніцтва ў 1779–1781 гг. і ў цэлым на Бранскім участку мяжы паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай[12]. У цэлым лясы былі своеасаблівай памежнай паласой паміж ВКЛ і Рускім царствам на працягу XVI–XVII стст. і нават у больш позні час.

У цэнтральных раёнах Мсціслаўскага ваяводства лясы знішчаліся значна хутчэй, чым на мяжы, і таму тут колькасць лясных тапонімаў значна меншая. Аднак трэба прызнаць, што антрапагенны ўплыў на працэс змяншэння памераў лясоў, як у Рэчы Паспалітай, так і ў цэнтральнай частцы Расіі пачаў значна сказвацца толькі ў XVII–XVIII стст.[13] Гэта знаходзіць сваё пацверджанне і на прыкладзе Мсціслаўскага ваяводства.

---

[7] Русско-белорусские связи. Сборник документов 1570–1667 гг. – Минск : Высш. шк., 1963. – С. 75–76.

[8] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 114. – Арк. 301; Тамсама. – Адз. зах. 121. – Арк. 248–248 адв.; АВК. – Т. 34. – С. 325, 349.

[9] Грыцкевіч В., Мальдзіс А. Шляхі вялі праз Беларусь: Нарыс. – Мінск: Маст. літ., 1980. – С. 113.

[10] Sapiehowie. Materiały historyczno-genealogiczne i majątkowe. Wydanie nakładem rodziny. – Petersburg: Druc. Trenka i Fusno. – T. 1. – 1890. – S. 404; АВК. – Т. 34. – С. 349.

[11] РДАСА. – Ф. 1355. – Воп. 1. – Адз. зах. 732. – Арк. 132.

[12] Опис Новгород-Сіверьского намісництва (1779–1781) / Всеукраінська Акад. наук, Археограф. ком. – Кіев, 1931. – С. 204–206, 208, 215–217; Анішчанка Я. К. Народжаны рабалепнічаць. – С. 23.

[13] Старкель Л., Хотинский Н. А. Природные антропогенные рубежи на территории центра Европейской части СССР и Польши // Изв. АН СССР. Сер. геогр. – 1985. – № 5. – С. 37.

Пра імклівыя тэмпы вынішчэння лясоў менавіта ў XVII–XVIII стст. сведчаць і тыя факты, што на тэрыторыі воласці Крычава ў сярэдзіне XVI ст. фіксуецца толькі 7 тапонімаў, якія адлюстроўваюць спосабы знішчэння лясоў – 3 ў старостве і 4 сярод шляхетскіх ўладанняў. Напрыканцы XVII ст. ужо толькі ў старостве было 7 населеных пунктаў з такімі назвамі, у 20-я гады XVIII ст. узнікла яшчэ 10, а ў 40-я гады XVIII ст. – яшчэ 11.

На тэрыторыі Магілёўскай губерні лясы па-варварску высякаліся яшчэ напрыканцы XVIII ст. Справа набыла такі размах, што расійская імператрыца Кацярына II вымушана была выдаць спецыяльны указ, якім забараняла выруб тут лясоў[14].

Тым не менш, тэрыторыя на поўдзень ад р. Сож заставалася лясістай яшчэ ў канцы XVIII – пачатку XIX ст., пра што сведчыць А. Мейер у сваім апісанні Крычаўскага староства 1786 г., С. Севяргін, П. Пінкертон і П. Кампенгаўзен[15]. Сасновыя бары адзначаюцца пры апісанні амаль кожнай вёскі на ўсход ад Сожа ў Крычаўскім старостве яшчэ ў 1757 г.[16]

І да сённяшніх дзён маўклівымі сведкамі існавання тут лясоў з'яўляюцца шматлікія тапонімы, у якіх захавалася ўказанне на размешчаныя побач лясы, лясных жывёл, што вадзіліся ў лясах каля паселішчаў, спосабы знішчэння лясоў.

Прасачыць відавы склад старажытнага лесу (не пазней канца XVIII ст.) дазваляе знаёмства з ляснымі тапонімамі, якія захаваліся да нашых дзён. Так, даволі вялікую колькасць складаюць «хваёвыя» тапонімы – «Сасновец», «Ельня», «Бор» і вытворныя ад іх. Другімі па колькасці ідуць тапонімы, якія вядуць сваё паходжанне ад дуброў. Менш сустракаюцца «лісцевыя» тапонімы – «Бярозаўкі», «Ліпаўкі», «Ясень», «Вярба». «Ягадныя» тапонімы прадстаўлены адзінкавымі экзэмплярамі – «Малінаўка», «Калінаўка».

Відавы склад тапонімаў адлюстроўвае вялікую колькасць дубовых урочышчаў – 7. На другім месцы стаяць ельнікі – 5. Трэцяе месца дзеляць паміж сабой ліпаўкі і бары – па 2, па адным тапоніме прыходзіцца на бярозы і вербаўкі. Усё гэта сведчыць пра тое, што на Пасожжы хваёвыя лясы былі распаўсюджаны значна больш за лісцевыя.

Нашы веды пра відавы склад лясной фаўны рэгіёна нашага даследавання дапаўняюць як пісьмовыя крыніцы, так тапонімы і гідронімы. Але ў адрозненне ад тапонімаў, гідронімы захоўваюцца больш устойліва і менш схільныя да змяненняў у залежнасці ад тых ці іншых падзей: паселішча магло знікнуць, і адпаведна знікаў індыкатар, які фіксаваў прадстаўнікоў лясной фаўны, што вадзілася ў яго наваколлях.

Знаёмства з «ляснымі» гідронімамі паказвае, што ў гэтым рэгіёне сярод 15 звярыных гідронімаў 6 паходзяць ад слова «вепр» і яго вытворных. Чатыры

---

[14] Полное собрание законов Российской империи повелением государя императора Николая Павловича составленное. – Собр. 1-е. – 1830. – Т. XIX. – С. 895–896.

[15] Мейер А. Описание Кричевского графства или бывшего староства 1786 г. // Могилевская старина. – Могилев, 1901. – Вып. 2. – С. 117; Грыцкевіч В., Мальдзіс А. Шляхі вялі праз Беларусь. – С. 112.

[16] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1937. – Арк. 37, 38, 45, 50, 76.

гідронімы звязаны са словам «мядзведзі», два – са словам «выдра» і па аднаму – з сабалямі, зубрамі, турамі і расамахай.

Безумоўна, пад уплывам дзейнасці чалавека лясы ўвесь час скарачаліся, а тапонімы, якія захаваліся да нашых дзён, адлюстроўваюць толькі пэўную статычную сітуацыю.

У вызначэнні часу знішчэння лясоў у пэўным рэгіёне перш за ўсё дапамагаюць пісьмовыя крыніцы, у якіх зафіксаваны час узнікнення альбо першага згадвання паселішча. Акрамя таго, у некаторых выпадках нам могуць дапамагчы пэўныя тапонімы, якія сведчаць пра наяўнасць у іх наваколлях таго ці іншага віда жывёл.

Так, напрыклад, апошні тур у Рэчы Паспалітай быў забіты ў 1626 г.[17] Гэта дае падставу сцвярджаць, што адносна шматлікія паселішчы тыпу «Турышчава» і вытворных ад яго ўзніклі не пазней за пачатак XVII ст., а да гэтага часу тут былі вялікія лясы, у якіх вадзіліся туры. Гэта пацвярджаюць і пісьмовыя крыніцы, якія фіксуюць наяўнасць тураў у міжрэччы Сожа і Беседзі напрыканцы XVI ст.[18]

Астэалагічныя рэшткі зброю сустракаюцца апошні раз сярод археалагічных матэрыялаў з Замкавай гары Крычава ў XVII ст., што сведчыць пра іх наяўнасць у Крычаўскай пушчы ў гэты час. Пацверджаннем наяўнасці зброю ва ўсходніх раёнах Рэчы Паспалітай яшчэ ў XVI–XVII стст. сведчыць і адзіны тапонім з такой назвай – «Зубры», што захаваўся ў Горацкім раёне Магілёўскай вобласці. Ён, верагодна, узнік не пазней канца XVI – пачатку XVII ст. Ва ўсякім выпадку, у 1647 г. ён ужо існаваў як мястэчка Зубрэвічы Шклоўскага старостваАршанскага павета Віцебскага ваяводства[19].

Існаванне вялікіх і густых лясоў на Пасожжы як мінімум да XVIII ст. пацвярджаюць і даволі распаўсюджаныя тапонімы «Мядзведаўка» і вытворныя ад іх. А на тэрыторыі Крычаўскага староствана мядзведзяў палявалі яшчэ напрыканцы XVIII ст.[20]

Яскравым сведчаннем паскоранага антрапагеннага ўплыву на памяншэнне плошчы лясоў з'яўляецца ўзнікненне менавіта ў XVIII ст. значнай часткі паселішчаў, што мелі назвы, якія адлюстроўваюць занятак іх насельніцтва рамяством, звязаным з апрацоўкай лесу і вырабам з яго розных тавараў, – Буда, Смолкі, Паташня і г. д., альбо іх размяшчэнне каля пэўнага віду лесу – Дубраўка, Ліпаўка, Бароўка, Вялікі Бор і г. д. На тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства ў гэты перыяд вядома 21 паселішча, якое адлюстроўвае вядзенне лясных промыслаў, а колькасць узнікшых лясных тапонімаў дасягае 32.

У жыцці кожнага рэгіёна вялікую ролю іграюць шляхі зносін. Яны садзейнічалі не толькі паскарэнню асваення пэўнай тэрыторыі, але і спрыялі больш

---

[17] Каліноўскі П. Ф. Першабытны бык // Беларуская энцыклапедыя ў 18 т. – Т. 12. – Мінск: БелЭн, 2001. – С. 307.

[18] Мяцельскі А. А. Старадаўні Крычаў. – С. 89.

[19] ИЮМ. – Вып. 25. – С. 420–421.

[20] Мяцельскі А. А. Старадаўні Крычаў. – С. 89.

хуткай кансалідацыі яе розных частак у адзіны гаспадарчы арганізм і, у рэшце рэшт, фарміраванню эканамічных сувязяў паміж рознымі рэгіёнамі дзяржавы. На вялікі жаль, у расійскай і савецкай гістарыяграфіі гэтаму пытанню ўдзялялася мала ўвагі[21]. Толькі ў апошні час пачалі з'яўляцца спецыяльныя працы, прысвечаныя праблематыцы праходжання галоўных гандлёва-камунікацыйных шляхоў на пэўных тэрыторыях[22]. Між тым у польскай гістарыяграфіі гэта пытанне даўно распрацоўваецца[23]. У працах, прысвечаных гандлёвым сувязям тых ці іншых рэгіёнаў Польскай кароны і Рэчы Паспалітай, пытанні праходжання напрамкаў дарожнай сеткі, як правіла, разглядаюцца.

У ранні перыяд гісторыі Мсціслаўскага княства (XII–XIV стст.) галоўную ролю ў якасці камунікацый, безумоўна, адыгрывалі водныя шляхі і перш за ўсё – іх мерыдыяльныя дамінанты – рэкі Сож, Проня, Іпуць і Беседзь. Гэта было выклікана знаходжаннем Пасожжа ў бассейне Дняпра, на летапісным шляху «з варагаў у грэкі», які стварaў спрыяльныя ўмовы для ўключэння Пасожжа ў сістэму міжнароднага гандлю. Шматлікасць курганных могільнікаў X–XIII стст. уздоўж рэк сведчыць, што іх берагі ўжо былі шчыльна заселены ў гэты час, а самі яны з'яўляліся галоўнымі гандлёвымі шляхамі і шляхамі зносін.

Знаходкі скарбаў арабскага срэбра сведчаць, што з пачатку IX ст. Сож актыўна выкарыстоўваўся як шлях для прасоўвання ўсходняга імпарту ў Еўропу. Блізкасць вытокаў Сожа і Проні да Дняпра стварала спрыяльныя ўмовы для арганізацыі волакавых пераходаў з адной ракі ў другую.

Першы з іх пачынаўся ў раёне сучаснага Смаленска, каля якога знаходзяцца вытокі Сожа, пераход на які з Дняпра не складаў цяжкасці. Курганы VIII–IX стст.,

---

[21] Данилевич В. Е. Пути сообщения Полоцкой земли до конца XIV века. – Юрьев: Тип. К. Миттисена, 1898; Алексеев Л. В. Полоцкая земля. в IX–XIII вв. – С. 83–100; Жучкевич В. А. Дороги и водные пути Белорусии. Историко-географический очерк. – Минск: Изд-во БГУ, 1977; Сардаров А. С. История и архитектура дорог Белоруссии. – Минск: Высш. шк., 1978; Алексеев Л. В. Смоленская земля в IX– XIII вв. – С. 64–71.

[22] Таўлай Д. А. Старажытныя дарогі беларускага Палесся // Зб. навук. прац, прысвечаны 25-годдзю стварэння музея і 15-годдзю экспазіцыі беларускага скалцена. – Мінск: УП «ІВЦ Мінфіна», 2003. – С. 85–89; Селин А. А. Магистральные дороги Северо-Запада Новгородской земли в XVI–XVII вв. // Очерки исторической географии. Северо-Запад России. Славяне и финны. – СПб.: Изд-во СПб. ун-та, 2001. – С. 86–99; Сардараў А. С. Архітэктура шляхоў зносінаў XV – першай паловы XVIII ст. // Архітэктура Беларусі: нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце: у 4 т. – Т. 2. Другая палова XV – сярэдзіна XVIII ст. / А. І. Лакотка [і інш.]. – Мінск: Беларус. навука, 2006. – С. 600–619.

[23] Wyslouch S. Posługi komunikacyjne w miastach W. K. Litewskiego na prawe magdeburgskim do połowy XVI w. – Wilno, 1936. – № 2. – 209 s.; Яго ж. Dawnie drogi Polesia w XVI–XVIII ww. // Ateneum Wilenskie. – Wilna, 1937. – № XII. – S. 22–67; Kowalczyk E. Szłaki drogowe w puszczy na pograniczu mazowiecko-pruskim w sredniowieczu // Kwartalnik historyczny. – 1991. – № 1. – S. 3–12; Janeczek A. Osadnictwo pogranicza polsko-ruskiego. Województwo Belskie od schyłku XIV do początku XVII w. – Warszawa, 1993. – S. 63–68; Kowalczyk-Heyman E. Kamień, Kamienne Brody. Przyczynek do organizacji szłaków drogowych w średnioweczu (na przykładzie Mazowsza) // Archeologia. Historica Polona. – 2005. – T. 15/2. – S. 87–107.

размешчаныя на шляху з Дняпра на Сож (Немыкары, Калупаева, Арэфіна, Янава, Пуцяцінкі і інш.), сведчаць пра існаванне тут волака, што пацвярджае і тапонім Валахоўшчына (Валакоўшчына).

Другі шлях з Дняпра на Сож быў паміж Гнёздавам і Оршай і праходзіў па кірунку рэк Днепр – Расасёнка – Перавалочня – Паросіца – Проня і з апошняй ўжо выводзіў у р. Сож. Уздоўж гэтага волака ёсць шэраг археалагічных помнікаў і знаходак, якія сведчаць пра яго фукцыянаванне ўжо ў канцы 1 тыс. н. э.

Гэта гарадзішча каля в. Сухіна, знаходка сасанідскага дырхема Хазроя II (в. Людзінавічы, 590–628 гг.), знаходка Сабалёўскага грашова-рэчавага скарбу другой паловы X – пачатку XI ст. (малодшая манета 862/863 гг., але скарб быў знойдзены ў ганчарным гаршку). Шлях з басейна Сожа выводзіў на Дняпро ў тым месцы, дзе пачынаўся волак даўжынёю 10 км з Дняпра на р. Вярхіта, з якой быў выхад у р. Лучоса, а адтуль далей – у р. Заходняя Дзвіна. Магчыма, існаваў і яшчэ адзін шлях з р. Проня ў р. Дняпро. Ён вёў у левы прыток Проні – р. Быстрая, а адтуль волакам у р. Мярэя, левы прыток Дняпра.

Тапаграфія скарбаў арабскага срэбра ў Верхнім Пасожжы сведчыць, што яны прывязаны альбо да саміх волакаў, альбо да межаў зямлі радзімічаў (скарбы каля вёсак Стайкі, Стараселле, Стары Дзедзін), што дазваляе выказаць меркаванне пра існаванне тут пэўных пагостаў, куды дастаўлялася даніна ў час палюддзя з зямлі радзімічаў[24].

Акрамя знаходак скарбаў арабскага срэбра, індыкатарам шырокага выкарыстоўвання басейна Сожа ў якасці гандлёвага шляху з'яўляюцца і асобныя знаходкі арабскіх манет у курганах X–XI стст. – Бацвінаўка, Крычаў, Васільева, Янава, Папоўка[25].

З паўночнага ўсходу на Пасожжа паступалі і іншыя рэчы. Так, у Мсціславе і Рослаўлі знойдзены самшытавыя грабяні. На гэтых жа помніках знойдзены ракавіны каўры, якія вядуць сваё паходжанне з берагоў Індыйскага акіяна. У Мсціславе, Рослаўлі і на гарадзішчы каля в. Шаўнева Горацкага раёна знойдзены фрагменты арабскіх распісных шкляных бакалаў[26].

Акрамя гандлёвых сувязяў з усходам, землі Пасожжа мелі такія ж стасункі і з візантыйскім светам, пра што сведчаць знойдзеныя ў Старадзедзінскім скарбе візантыйскія манеты. Візантыйскае паходжанне, верагодна, мелі і фрагменты амфар, знойдзеныя ў Мсціславе і на гарадзішчы каля в. Горы Горацкага раёна.

Кантакты з Заходняй Еўропай насельніцтва Пасожжа пацвярджае знаходка ў кургане каля в. Калодзецкая бронзавай літой фігуркі з выявай прывязанага да каня чалавека, якая належыць да скандынаўскіх старажытнасцей. Скан-

---

[24] Мяцельскі А. Тапаграфія скарбаў куфіцкіх дырхемаў IX – пачатку XI стст. на Пасожжы // Беларусь у сістэме трансеўрапейскіх сувязяў у 1 тысячагоддзі н. э.: тэз. дакл. і паведамл. міжнар. канф., Мінск 12–15 сак. 1996 г. – Мінск: НВФ VAUKALAKA, 1996. – С. 61–63.

[25] Равдина Т. В. Погребения X–XI вв. с монетами на территории Древней Руси. Каталог. – М., 1988. – С. 7, 31, 32, 104.

[26] Алексеев Л. В. Древний Ростиславль // КСИА. – 1974. – Вып. 139. – С. 81–92; Алексеев Л. В. Смоленская земля в IX– XIII вв. – С. 64–71; Мяцельскі А. А. Шаўнеўскае гарадзішча. – С. 67.

дынаўскае альбо прыбалтыйскае паходжанне маюць і падвескі-турыцы, знойдзеныя ў курганным могільніку каля в. Улазавічы і выпадкова ў Дрыбінскім раёне на р. Проня[27]. Па сваёй форме апошняя вельмі падобна на турыцу, знойдзеную ў радзіміцкім курганным могільніку каля в. Борчы[28].

Заходнееўрапейскае паходжанне мае знойдзены на поўнач ад Рослаўля, каля в. Сямёнаўка, франкскі меч IX–X стст. У Старадзедзінскім скарбе вядомы манеты Атона I і Генрыха II. Манеты XI ст., якія вядуць паходжанне з Заходняй Еўропы, вядомы і ў наваколлях Прупоя[29].

Сож як буйны камунікацыйны шлях выкарыстоўваўся і пазней. Менавіта па ім ехаў у 1168 г. з Кіева ў Ноўгарад князь Расціслаў Мсціславіч[30], пра што сведчыць яго знаходжанне ў Чачэрску і сустрэча са смалянамі на мяжы Смаленскай зямлі. Пра сувязі Мсціслава з паўночнай Руссю, на думку Л. В. Аляксеева, сведчыць і знаходка ў горадзе берасцяной граматы. На апошняй захаваўся надпіс «... пшеницы четыре с половиной гривны ... заплатил Семен», які даследчык інтэрпрэтаваў як спробу куплі зерня на поўначы ў неўраджайны 1219–1220 год[31].

На Сожы, у Прупоі, першым населеным пункце Смаленскай зямлі, існавала карчма і збіралася мыта ў памеры 10 грыўняў. І на іншых буйных рэках, якія працякалі недалёка ад Сожа, – Дняпры і Дзясне – таксама існавалі пункты, дзе збіралася рознае гандлёвае мыта. Так, крыніцы згадваюць пра існаванне смаленскіх мытняў у Копысі, Лучыне і Пацыні[32].

Пра выкарыстанне басейна Сожа як гандлёвай артэрыі сведчаць і знаходкі складаных вагаў, знойдзеных пры зборы матэрыялаў з разбураных курганоў у курганнай групе № 24 каля в. Сукромля на р. Іпуць. Побач, у курганнай групе № 29, размешчанай каля в. Крастовая, знойдзены тры бочкападобныя, часткова пашкоджаныя гіркі вагой адпаведна 36,2 і 20 г. Трэцяя, моцна пашкоджаная, важыць 21,25 г[33].

---

[27] Риер Я. Г. Изучение курганов в Могилевском Поднепровье. – С. 179–191; Рыбакоў Б. А. Радзімічы // Працы секцыі археалогіі. Ін-т гісторыі. БАН. – Мінск, 1932. – Т. 3. – С. 92, табл. VI:4; Дучыц Л. У., Лосева Т. У. Набор упрыгожванняў з фондаў Дрыбінскага краязнаўчага музея // МАБ. – Мінск, 2001. – Вып. 3. – С. 259–260.

[28] Шинаков Е. А., Гурьянов В. Н., Миненко В. В. Радимичи и вятичи на Десне // ГАЗ. – Мінск, 1998. – № 13. – С. 149, мал. 5.

[29] Алексеев Л. В. Смоленская земля в IX–XIII вв. – С. 86; Харламповіч П. Манэтныя скарбы, знойдзеныя ў Беларусі, у зборах Беларускага дзяржаўнага музею // Гістарычна-археалагічны зборнік (Даклады і рэфераты 1926–1927 гадоў). – Мінск: Інбелкульт, 1927. – № 1. – С. 317; Рыбакоў Б. А. Радзімічы. – С. 113.

[30] ПСРЛ. – Т. 2. – Стб. 528.

[31] Алексеев Л. В. Берестяная грамота из Мстиславля // СА. – 1983. – № 1. – С. 204–212.

[32] Древнерусские княжеские уставы XI–XV вв. / Изд. подг. Я. Н. Щапов. – М.: Наука, 1976. – С. 142, 143, 146.

[33] Ляўданскі А. М. Археалагічныя досьледы у Смаленшчыне. Археалагічныя досьледы С. М. Сакалоўскага ў былым Рослаўскім павеце. Дробныя звесткі аб курганных знаходках і гарадзішчах былой Смаленскай губерніі // Працы секцыі археалогіі Ін-та гісторыі БАН. – Мінск, 1932. – Т. 3. – С. 16, мал. X:7–9.

Верагодна, поўная вага першай гіркі адпавядала 38 г. Калі лічыць яе кратнасць роўнай 10, то яе вагавая адзінка аказваецца роўнай 3,8 г, што блізка да вагі арабскага дырхема – 3,9 г. Падобныя гіркі знойдзены на Маскавіцкім гарадзішчы і ў скарбе каля в. Падбароўка Наўгародскай вобласці і датуюцца X–XII стст.[34]

Другая, нязначна пашкоджаная гірка вагой 20 г мае на адным баку пазначаную кружочкамі па перыметры тарцавога боку лічбу кратнасці 21. Верагодна, поўная вага гіркі складала 21,5–22 г. Падчас вызначэння вагавай адзінкі атрымліваем 1,04 г, што прыкладна адпавядае вазе дынарыяў асобных германскіх гарадоў пачатку XI ст. Гэта гірка, верагодна, адлюстроўвае пераход грашовай сістэмы ад куфічнага дырхема да еўрапейскага дынарыя, што адбывалася з сярэдзіны XI ст. да пачатку XII ст.

Акрамя гэтага, пра выкарыстоўванне басейна Сожа ў XI–XIII стст. у якасці гандлёвага шляху сведчаць розныя рэчавыя скарбы, знойдзеныя ўздоўж яго. Яны, перш за ўсё, картаграфуюцца на яго адгалінаванні, што вядзе на Дняпро праз р. Проня.

Так, у 1846 г. у маёнтку Паляшчыцы (сучасная аднайменная вёска Горацкага раёна) быў знойдзены скарб з 8 срэбных грывень агульнай вагой 3 фунта 72 залатніка (1535,616 г). Сярэдняя вага кожнай грыўні – 191,952 г, што дазваляе атаясамліваць іх з грыўнямі наўгародскага тыпу[35]. У дзвюх вярстах ад Горскага гарадзішча, каля в. Студзянец, знойдзена срэбная грыўня з надпісам «княз Волод» вагой 153,48 г, што па вагавай норме адпавядае кіеўскай грыўне, якія мелі вагу каля 160 г[36]. Скарб «великокняжеской эпохи (серьги, пряжки, браслеты и гривны византийской работы)» ў канцы XIX ст. быў знойдзены на гарадзішчы каля в. Шаўнева[37].

Далей на поўнач, грашова-рэчавы скарб знойдзены ў XIX ст. на р. Лупа ў Звяровіцкай воласці Краснянскага ўезда[38] (37 фунтаў і 77 залатнікоў – 15 кг 505 г)[39]. Наяўнасць у басейне р. Проня грыўняў, якія адпавядаюць як наўгародскай, так і кіеўскай грашова-вагавай сістэме, пацвярджае шырокае выкарыстоўванне гэтай ракі ў якасці скразнога гандлёвага шляху.

---

[34] Бектинеев Ш. И. Весы и гирьки-разновесы X–XIV веков из Белоруссии // СА. – 1987. – № 1. – С. 233.

[35] Рябцевич В. Н. Денежные депозиты Полоцкой земли конца X – начала XIV вв. // ГАЗ. – Мінск, 2000. – № 15. – С. – С. 70–71.

[36] Ильин И. И. Топография кладов серебрянных и золотых слитков. – Пг.: Тип ГАИМК, 1921. – С. 36; Древняя Русь. Город, замок, село. / Борисевич Г. В. [и др.]. – М.: Наука, 1985 – С. 385.

[37] Россия. Полное географическое описание нашего Отечества. – Т. 9. Верхнее Поднепровье и Белоруссия / Сост. В. П. Семенов [и др.]. – СПб.: Изд. А. Ф. Девриена, 1905. – С. 393; Мяцельскі А. А. Шаўнеўскае гарадзішча. – С. 65.

[38] Аўтар свядома размяжоўвае тэрміны «ўезд» – адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка Расійскай імперыі і «павет» – адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка ВКЛ.

[39] Ильин И. И. Топография кладов серебрянных и золотых слитков. – С. 46.

Акрамя гэтых магістральных шляхоў, безумоўна, існавалі і шматлікія ўнутраныя водныя дарогі, якімі карысталася насельніцтва Верхняга Пасожжа. Шлях са Смаленска, Мсціслава, Крычава па Сожы прыводзіў у вусце р. Лабжанка. Падняўшыся па апошняй да сучаснай в. Ціманава Клімавіцкага раёна Магілёўскай вобласці ён, верагодна, зварочваў у правы бок у невялікую рэчку з характэрнай назвай – Перавалочня. Тут пачынаўся волак у р. Жадунька, якая, у сваю чаргу, выводзіла на р. Беседзь.

Другі шлях з Беседзі вёў па р. Суроў у бок Рослаўля. З р. Суроў пачынаўся волак ў р. Перавалочня, якая ўпадае ў р. Іпуць. З Іпуці па р. Калпеніца адкрываўся шлях на Рослаўль.

Нельга выключыць, што існаваў яшчэ адзін волакавы пераход на гэтых землях – з р. Беседзь ў р. Іпуць. Вярхоўі р. Зубар (левы прыток Беседзі) вельмі блізка падыходзяць да вытокаў р. Клінкі (прыток Іпуці), якія падзяляліся балоцістай нізінай. З р. Клінкі праз волак адкрываўся прамы шлях у р. Іржач – прыток р. Іпуць. На гэтым шляху раней існавалі курганныя могільнікі каля в. Разрытая, а рэшткі селішча эпохі Старажытнай Русі прасочваюцца ў вёсцы і зараз.

Водныя шляхі шырока выкарыстоўваліся і ў больш познія часы – XVI–XVIII стст. Галоўнай воднай артэрыяй, як і раней, заставаўся Сож, які выконваў функцыю сплаўной ракі. Навігацыя па Сожы ў гэты час, верагодна, пачыналася ад Крычава. Ва ўсякім выпадку, вялікі князь Жыгімонт Аўгуст у сакавіку 1567 г. даў крычаўскім купцам грамату на права вольнага гандлю ў Кіеўскай і Валынскай землях. У якасці водных шляхоў, якімі карысталіся крычаўскія купцы, у грамаце Жыгімонта Аўгуста згадваюцца рэкі Сож, Дняпро, Прыпяць[40]. Гэтая ж грамата і шляхі былі пацверджаны і больш познімі прывілеямі каралёў Стэфана Баторыя і Жыгімонта Вазы[41]. Больш таго, у Прапойску нават у 1547 г. працягваў існаваць звычай, закладзены яшчэ смаленскім князем Расціславам Мсціславічам збіраць воднае мыта з гасцей, якое «завжды на замак бирали»[42], што таксама сведчыць пра выкарыстанне Сожа як гандлёвай артэрыі. Прычым у грамаце падкрэсліваецца, што прызначэнне воднага мыта – гэта выключная прэрагатыва вялікага князя. Па Сожы нават у сярэдзіне XVIII ст. з Украіны ў Чэрыкаў пастаўлялі соль і вэнджаную рыбу[43].

Безумоўна, і Дняпро шырока выкарыстоўваўся ў якасці гандлёвай артэрыі. На ім стаяла Копысь, якая яшчэ ў 1136 г. акрамя даніны, выплочваемай смаленскаму князю, плаціла і «гостевое» – верагодна, спецыяльную плату з купцоў, якія праязджалі праз яе. У крыніцы згадваецца і пра існаваўшыя тут перавоз і карчму, за карыстанне якімі купцы таксама павінны былі плаціць падаткі[44].

---

[40] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 49. – Арк. 31 адв.–32.

[41] АЮЗР. – Т. 1. – С. 179–180; НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 58. – Арк. 254–255 адв.; Тамсама. – Адз. зах. 74. – Арк. 273–274.

[42] НГАБ. – Ф. 694. – Воп. 4. – Адз. зах. 1556. – Арк. 6–7.

[43] БЭФ. – Т. 2. – С. 352.

[44] Древнерусские княжеские уставы. – С. 143.

І ў больш познія часы Дняпро выкарыстоўваўся ў якасці гандлёвай артэрыі для сувязі зямель Вялікага Княства Літоўскага са Смаленскам і Масквой. Пра гэта адзначаў у сваім дзённіку М. Варкочы, саветнік пры пасольстве рымскага імператара ў Маскву ў 1593 г. Ён і сам адправіў з Оршы у Смаленск частку маёмасці пасла Дняпром[45]. У 1661 г. барон Аўгусцін Майербург ад Смаленска да Магілёва плыў на лодцы[46]. Нават у канцы XVIII ст. (1772 г.) Дняпро і Дзвіна разглядаліся як гандлёвыя шляхі для пастаўкі тавараў з Магілёўскай губерні ў Рыгу. А ў зімні перыяд шлях у гэтым кірунку ішоў па замерзлым рэкам.

Сухапутныя камунікацыі XII–XIII стст., верагодна, часткова паўтаралі водныя шляхі (уздоўж берагоў рэк, узімку – па іх замерзлым рэчышчы), а часткова пралягалі самастойна. Аднак іх вывучэнне на Верхнім Пасожжы па напрамку «стужкавых» скапленняў курганных могільнікаў вельмі праблематычнае з-за адносна малой колькасці могільнікаў, якія захаваліся да нашых дзён.

Больш спрыяльная сітуацыя з вывучэннем сухапутных камунікацый Мсціслаўскага княства і ваяводства XVI–XVIII стст. Прычым крыніцы, што адносяцца нават да пачатку XV ст., сведчаць пра тое, што на землях ВКЛ у гэты час існавала даволі развітая сетка транспартных артэрый і іх падтрымка ў добрым стане была адным з абавязкаў жыхароў той ці іншай воласці.

Так, у Гарадзельскім прывілеі 1413 г. гаворыцца пра абавязак шляхты трымаць у добрым стане дарогі, прычым падкрэсліваецца, што гэта яны павінны рабіць «по старинному обычаю». Падобны абавязак быў зафіксаваны і ў пацвярджальным прывілеі на вольнасці караля Жыгімонта Кейстутавіча 1434 г., у Статуце на валокі 1557 г. і ў Статутах ВКЛ 1566 г. і 1588 г.[47] Добра разумеючы ролю транспартных артэрый у жыцці дзяржавы, у прывілеі 1434 г. падкрэсліваецца, што без добрага стану дарог «не могут быть в хорошем состоянии нашы земли», а ў прывілеі 1588 г. ужо нават адзначаецца, што шырыня дарог павінна быць «водле стародавного обычаю» – па паўтара прута (7,3 м), указваецца прыярытэт праезду гружонага транспарту перад парожнім і арганізацыя руху зімой[48]. Усё гэта сведчыць пра тое, што сухапутныя шляхі зносін пачалі фарміравацца даволі рана і зафіксаваны ў пачатку XV ст. абавязак трымаць іх у добрым стане быў ужо сталай традыцыяй і добра зразумелай неабходнасцю.

Нават у прывілеях гарадам адзначаўся абавязак гараджан сачыць за станам дарог і вуліц у саміх гарадах. Так, напрыклад, гэты абавязак зафіксаваны ў прывілеі Мсціславу на Магдэбургскае права 1634 г.[49]

---

[45] Описание путешествия в Москву Николая Варкочи, посла римского императора в 1593 году // ЧИОИДР. – 1874. – Кн. 4. – С. 9.

[46] Путешествие в Московию барона Августина Майерберга и Горация Винцента Кальвучи послов императора Леопольда к царю и великому князю Алексея Михайловича в 1661 г. // ЧИОИДР. – 1874. – Кн. 1. – С. 201.

[47] БЭФ. – Т. 1. – С. 116, 120, 228; Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588 года. Тэксты. Даведнік. Каментарыі. – Мінск: БелСЭ, 1989. – С. 98–99; Статут Вялікага Княства Літоўскага 1566 года / Пад рэд. Т. І. Доўнар [і інш.]. – Мінск: Тэсей, 2003. – С. 66.

[48] Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588 года. – С. 269.

[49] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 111. – Арк. 154.

Для ўтрымання ў належным стане інжынерных збудаванняў на дарогах у ВКЛ існавала спецыяльная пасада – мастаўнічыя, якія назіралі за станам мастоў. У Мсціслаўскім ваяводстве крыніцы захавалі імёны мастаўнічых пачатку XVII ст. і сярэдзіны XVIII ст. Імі былі Фёдар Галкоўскі, Ян Гаўрыловіч Пірагоўскі, Леон Хадкевіч, Пётр Дубіза і Пётр Дубінка[50].

Непасрэдна за стан саміх дарог адказваў уладальнік альбо трымальнік маёнтка. Самі ж работы па ўпарадкаванні дарог выконваліся насельніцтвам маёнткаў. А ў дзяржаўных уладаннях існавала нават спецыяльная катэгорыя насельніцтва, якая спецыялізавалася на будоўлі і рамонце мастоў, – борці.

У той жа час заходнееўрапейскія вандроўнікі XVI–XVIII стст. былі вельмі не задаволены станам камунікацый нават на захадзе Рэчы Паспалітай, не кажучы пра ўсходнія раёны краіны. Так, яны, параўноўваючы мясцовыя дарогі са станам камунікацый ў сваіх краінах, сцвярджалі, што дарогі ў Польшчы мала чым адрозніваліся ад звычайных сцежак, «якія віюцца праз густы лес без ніякага знаку»[51].

Крыніцамі для вывучэння камунікацыйнай сеткі XV–XVIII стст. з'яўляюцца шматлікія прывілеі і абмежаванні «добр», у якіх у якасці геаграфічных элементаў для вызначэння межаў маёнткаў згадваюцца гасцінцы і дарогі. Акрамя таго, кірункі асобных шляхоў мы сустракаем у апісаннях паслоў і іншых дзяржаўных і царкоўных дзеячаў, якія ездзілі не толькі з Еўропы ў Маскву, але і перасякалі Пасожжа з поўначы на поўдзень. Для больш позніх часоў захаваліся і спецыяльныя апісанні шляхоў.

Сухапутныя камунікацыі ў XVI–XVIII стст. маюць розныя назвы. Сустракаюцца назвы «дарога», «гасцинец», «шлях». У XVIII ст. пры апісанні напрамку камунікацый шырока выкарыстоўваўся тэрмін «тракт» – «тракт з Мсціслава да Любавічаў» і г. д. Аднак дакладнай розніцы паміж гэтымі назвамі крыніцы не даюць. Для аднаго і таго ж кірунку ў крыніцах ужываюцца як адна, так і другая назва. Выключэнне складаюць толькі камунікацыі паміж вёскамі. Яны заўжды называюцца ў крыніцах «дарогамі».

Праз тэрыторыю Мсціслаўскага княства і воласці Крычава праходзіў шлях з Оршы на поўдзень у раён Гомеля. Пра гэта сведчыць грамата (27.01.1509 г.) аб вольным пропуску аршанскіх святароў за мяжу краіны для збору даніны, якую вялікі князь Жыгімонт Стары паслаў да мсціслаўскага князя Міхаіла Іванавіча і крычаўскага намесніка Васіля Ашушкіна[52]. Верагодна, шлях святароў з Оршы на Гомель праходзіў праз Горы, Мсціслаў, Крычаў, Касцюковічы, Бялынкавічы, Сураж, Старадуб, Навазыбкаў. Ва ўсякім выпадку, у XIX ст. менавіта праз гэтыя населеныя пункты ішоў шлях з Оршы на Старадуб і з апошняга на Гомель[53].

---

[50] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 98. – Арк. 12–13; Тамсама. – Адз. зах. 170. – Арк. 316–317; Тамсама. – Адз. зах. 181. – Арк. 161–162.

[51] Камунтавічус Р. Падарожжы па Літве ў XVI–XVII ст.; досвед італьянцаў і французаў // Беларус. гіст. агляд. – 2003. – Т. 10, сшытак 18–19. – С. 67.

[52] АЗР. – Т. 2. – С. 59–60.

[53] Дембовецкий А. С. Опыт описания Могилевской губернии в историческом, физико-географическом, этнографическом, промышленном, сельскохозяйственном, лесном, учебном, медицинском и статистическом отношении. – Могилев, 1884. – Кн. 2. – С. 637–638.

Крыніцы фіксуюць, што як мінімум пачынаючы з першай паловы XVI ст. праз Пасожжа ішлі шляхі з Мінска на Севяршчыну. Прычым адзін з іх ішоў праз Крычаў на Алучыцы – Дрокаў – Мглін, а другі з Крычава ішоў на Папову Гару[54]. У прывілеі 1505 г. смаленскім баярам і мяшчанам на правы і вольнасці гаворыцца пра купцоў, якія прыязджаюць у Смаленск з Крычава і Мсціслава, што пацвярджае існаванне гандлёвых шляхоў[55] паміж гэтымі гарадамі.

Пасожжа актыўна выкарыстоўвалася і для шляхоў, што вялі з захаду на ўсход. Нягледзячы на тое, што асноўны напрамак шляху на Маскву паслоў з еўрапейскіх краін праходзіў далёка ад тэрыторыі Мсціслаўскага княства і ваяводства, некаторыя вандроўнікі ездзілі ў Рускае царства менавіта праз міжрэчча Сожа і Дняпра.

Так, у 1575 г. І. Кобленц ехаў у Маскву праз Оршу, Дуброўну і в. Баева[56]. Гэтым жа шляхам ехала і пасольства імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі ў Маскву ў 1593 г. – з Оршы, праз Дуброўну, в. Іванаўка на в. Баева. Далей шлях ішоў на маскоўскую вёску Васілевічы. Такі ж кірунак трымала і пасольства Рэчы Паспалітай ў Маскву ў 1606 г. – з Оршы яго шлях на ўсход вёў праз вёскі Святашчыцы і Баева[57].

Некалькі на поўдзень на Маскву ехала пасольства Рэчы Паспалітай да цара Міхаіла Фёдаравіча ў 1635 г. Пётр Вяжэвіч фіксуе яго наступнымі кропкамі: Галачын – Стараселле – Копысь – Сялец – Горкі – Звяровічы[58].

Пэўныя высновы пра існаванне дарог паміж гарадамі міжрэчча Сожа і Дняпра захаваліся ў кнізе Вялікага чарцяжа, складзенай ў Расіі ў 1627 г. Кніга называе адлегласць паміж гарадамі, што пацвярджае існаванне паміж імі дарог. Так, згодна з прыведзенымі там данымі, Магілёў і Шклоў аддзялялі 50 вёрст, Магілёў і Быхаў знаходзіліся на адлегласці 40 вёрст, ад Магілёва да Радамлі было 30 вёрст. А дарога «вялікая» з Радамлі да Магілёва згадваецца яшчэ ў 1588 г.[59] Магчыма, далей гэта дарога з Магілёва да Радамлі вяла на Смаленск, бо ў в. Пацкава, на шляху з Магілёва ў Смаленск атрымаў у канцы XVII ст. права на маставое праз рэкі Рамяство, Свіная і Драгіза Крыштаф Станіслаў Цеханавецкі[60]. Гэтым шляхам у сярэдзіне XVII ст. (1654 г.) ехалі са Смаленска

---

[54] Памятники истории Восточной Европы. Источники XV–XVII вв. Т. VI. Радзивилловские акты из собрания Российской национальной библиотеки. Первая половина XVI в. – М.; Варшава: Древнехранилище, 2002. – С. 71.

[55] Литовская метрика. Книга записей № 5 (1427–1506) / par. E. Banionis. – Vilnius : Mokslo ir enciklopediju leidykla, 1993. – P. 273.

[56] Алексеев Л. В. Полоцкая земля. в IX–XIII вв. – С. 96–97.

[57] Описание путешествия в Москву Николая Варкочи. – С. 9, 11; Акты исторические, относящиеся к России извлеченные из иностранных архивов и библиотек д. ст. с. А. И. Тургеневым. Выписки из ватиканского тайного архива и других римских библиотек и архивов с 1584 по 1719 год. Прибавление, содержащие в себе акты относящиеся до древностей славянских земель с 1231 по 1508 гг. – Спб., 1842. – Т. 2. – С. 159.

[58] АСДОИСЗР. – Т. 4. – С. 92–93.

[59] НГАБ. – Ф. 1729. – Воп. 1. – Адз. зах. 33. – Арк. 357–358.

[60] Dumin S., Rachuba A., Sikorska-Kulesza J. Ciechanowieccy herbu Dąbrowa. – Warszawa: Wyd. DiG., 1997. – S. 40.

ў Запарожскую Сеч рускія дыпламаты, і іх шлях маркіруецца наступнымі кропкамі: Смаленск – Дасугава – Мігнавічы – Радамля – Магілёў[61].

У інвентары Магілёўскага староства 1560 г. пры апісанні межаў в. Даманы згадваецца дарога Мсціслаўская[62], якая вяла з Магілёва на Мсціслаў. Яна, верагодна, вяла па сучасным напрамку дарогі з Магілёва на Мсціслаў праз Расну, на якім і зараз стаіць в. Даманы. Ва ўсякім выпадку, в. Быковічы, якая таксама зараз стаіць на дарозе з Мсціслава на Магілёў, і ў 1709 г. стаяла на «мсціслаўскім гасцінцы»[63].

Вялікая дарога на поўдзень ад Магілёва вяла як па правым, так і па левым баку Дняпра. На левым баку яна фіксуецца ў крыніцах сярэдзіны XVI ст. і ішла праз вёскі Вейна, Вільчыцы, Следзюкі, Сідараўка. Праз в. Хварасцяны ішла «дарога Прапойская» з Магілёва[64]. Значна больш звестак пра шляхі ў міжрэччы Сожа і Дняпра захавалася ў крыніцах другой паловы XVII–XVIII стст.

У 1678 г. пасольства Рэчы Паспалітай ехала ў Маскву з Магілёва праз в. Макарынцы, горад Васілевічы, гарадок «Hubarin» (верагодна, суч. в. Сухары), вёскі Жданавічы, Губінаў, горад Горкі, вёскі Сакалова, Шаўнева, Першыно (суч. вёскі Горацкага р-на), Дзянісаўка, Beresawo (не лакалізуецца), Цішкоўка, Virisabi (суч. в. Веразубы) і г. Кадзін (вёскі Манастыршчынскага раёна Смаленскай вобласці). За Кадзінам пачыналася Рускае царства і ў бок Смаленска паслы ехалі праз вёскі Дасугава і Грыгор'ева. На зваротным шляху пасольства ехала праз Баева, Чырын, Дуброўну і Оршу[65].

У 1697 г. маскоўскі стольнік П. А. Талстой, едучы з Масквы ў Варшаву, свой кірунак ад памежнага сяла Раманава ў бок Магілёва трымаў праз в. Кацялёва, потым праз в. Горкі, с. Гарадзецкае (суч. в. Гарадзецк), вёскі Губіна, «Губарі» (в. Сухары), Жданавічы, Воінава (суч. в. Вейна?), Лупалава. На зваротным шляху князь П. А. Талстой з Оршы ехаў на Маскву праз Дуброўну, в. Баева і на р. Івата пераехаў мяжу Рэчы Паспалітай з Рускім царствам[66].

Каштоўную інфармацыю для вывучэння напрамку сеткі галоўных дарог ў міжрэччы Сожа і Дняпра сярэдзіны XVIII ст. мы сустракаем у «Рэвізіі трактаў ваяводства Мсціслаўскага» і ў «Рэвізіі трактаў ваяводства Віцебскага», складзеных ў 1765 г. Аднак нягледзячы на тое, што самі крыніцы адносяцца да XVIII ст., трэба прызнаць, што згаданыя ў іх «гасцінцы старыя» альбо гасцінцы, якія «здаўна» ідуць у тым ці іншым кірунку, маюць вельмі істотнае значэнне для рэканструкцыі шляхоў зносін і пацвярджаюць іх існаванне з даўніх часоў.

---

[61] АЮЗР. – Т. 14. – С. 91.

[62] АСДОИСЗР. – Т. 3. – С. 255.

[63] НГАБ. – Ф. 1729. – Воп. 1. – Адз. зах. 11. – Арк. 538–542.

[64] АСДОИСЗР. – Т. 3. – С. 249, 253, 261, 275.

[65] Таннер Б. Описание путешествия польского посольства в Москву в 1678 г. // ЧИОИДР. – 1891. – Кн. 3. –С. 26, 119.

[66] Путешествие стольника П. А. Толстого по Европе 1697–1699 гг. – М.: Наука, 1992. – С. 10–11, 248.

У Віцебскім ваяводстве тут апісваюцца некалькі шляхоў. Так, дарога са Шклова на Чавусы ішла праз вёскі Chwaszczowky – Saczkowky – Dymanie – Sinkowszczyzny – Buszkowo, у назвах якіх пазнаюцца сучасныя вёскі Фашчаўка – Саськаўка – Даманы – Цінькаўшчына – Бушкава. Далей шлях выводзіў на нелакалізаваную Бракевіцкую карчму, і адтуль ужо ехалі ў Чавусы[67].

Шлях з Чавусаў на Оршу ў значнай ступені паўтараў шлях на Шклоў. Але з Саськаўкі ён зварочваў на в. Czemedony (сучасная в. Ст. Чамаданы) і адтуль вёў на Оршу праз карчму Акунёўка, вёскі Казловічы і Чорнае[68] – сучасныя аднайменныя вёскі.

Мсціслаў, як ваяводскі цэнтр, быў звязаны прамымі шляхамі зносін са многімі гарадамі і мястэчкамі ваяводства. Ён быў звязаны прамымі дарогамі са Смаленскам (80 вёрст), Крычавам (40 вёрст), Радамляй (50 вёрст). З Радамлі была прамая дарога на Смаленск (110 вёрст) і Шклоў (30 вёрст). Уздоўж Сожа з Крычава ішла дарога ў бок Прапойска (60 вёрст)[69].

У пачатку XVIII ст. (1705 г.) «гасцінец Крычаўскі» з Мсціслава ішоў праз в. Каробчына[70] і далей, верагодна, праз в. Кудрына выводзіў на в. Міцкаўшчына.

У сярэдзіне XVIII ст. (1765 г.) ён ішоў праз вёскі Рылаўшчына (суч. в. Чырвоная Горка), Міцкаўшчына, Ануфрыева, Лабковічы, Бель, Зуі, Варанева[71] і амаль цалкам супадае з сучасным напрамкам дарогі паміж гэтымі цэнтрамі. Безумоўна, па гэтай жа лініі можна маркіраваць шлях паміж Мсціславам і Крычавам і для больш ранняга часу. Тым болей што падставы для гэтага ёсць. Так, напрыклад, у 1536 г. в. Бель згадваецца ў якасці ключавога пункта, адкуль рускія войскі, што падышлі з пад Рослаўля, маглі ісці як на Мсціслаў, так і на Крычаў[72].

Другі буйны шлях вёў з Мсціслава ў бок Дрыбіна. Ён праходзіў праз вёскі Сутокі, Быковічы, Вітранка, Кокатава, Быстрыца, Басценавічы, Казіно, Чарнавусы, Вярба, Паташня, якія вядомы і зараз. З апошняй вёскі траплялі ў мястэчка Дрыбін. Некаторыя ехалі з Кокатава на Расну і адтуль ужо зварочвалі на Дрыбін[73]. З в. Расна праз в. Сусловічы, мястэчка Сухары і в. Брылі тракт, згодна з апісаннем 1784 г., прыводзіў у Магілёў[74]. Верагодна, у больш ранні час магілёўскі шлях меў некалькі іншы напрамак, бо ў інвентары Магілёўскага староства пачатку XVII ст. згадваецца карчма ў в. Іванавічы, якая стаяла па

---

[67] НГАБ. – Ф. КМФ-19. – Воп. 1. – Адз. зах. 7. – Арк. 62 адв.–63.

[68] Тамсама. – Арк. 64.

[69] Книга Большому Чертежу. Памятник 17 в. – М.; Л.: Изд-во Акад. наук СССР, 1950. – С. 100, 185.

[70] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 153. – Арк. 393–394.

[71] LVIA. – F. SA. – Ap. 1. – Bib. 3810. – P. 47–47 v.

[72] Грали И., Эскин Ю. М. Литва и Русь в 1534–1536 гг. Новые документы // Вестн. Моск. ун-та. – Сер. 8. История. – № 4. – 1999. – С. 75–76.

[73] LVIA. – F. SA. – Ap. 1. – Bib. 3810. – P. 47 v., 98 v.

[74] РА БАН Літвы. – Ф. 16. – Адз. зах. 127. – Арк. 39 адв.

«гасцінцы Мсціслаўскім»[75]. Сучасная ж аднайменная вёска знаходзіцца ў Чавускім раёне некалькі ўбаку ад прамога шляха з в. Брылі на в. Сухары.

З боку Мсціслава ў Магілёў уязджалі Мсціслаўскай вуліцай (1577, 1578 гг.), што вяла на перавоз праз Дняпро і была ў левабярэжным магілёўскім прыгарадзе Лупалаве[76]. У 1560 г. «дарога мсціслаўская» адзначаецца пры апісанні зямельных уладанняў в. Даманова Магілёўскага староства[77].

З Мсціслава праз Любавічы ішоў шлях на Віцебск. Ён пачынаўся ў в. Бобрыкі (цяпер не існуе), далей ішоў праз вёскі Дзеснакіта, Дубасна, Рай, Отракі (цяпер не існуе), якая мясцілася паміж вёскамі Рай і Лужкі. З Лужкоў шлях вёў праз мястэчка Шамава, вёскі Беразетня, Горы, Раманава, Сабалёва, Баева, Залатавічы, Хоцебрна (цяпер не існуе) на Дняпры[78]. Верагодна, менавіта гэтым шляхам у 1605 г. мсціслаўскі купец Матвей Іванавіч на 8 падводах вёз з Віцебска ў Мсціслаў 17 дзежак селядцоў. Мсціслаўская дарога ў раёне в. Баева згадваецца і ў крыніцы 1633 г.[79]

Зараз гэты шлях не функцыянуе. Аднак гэта звязана выключна з сучасным адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзелам: часткова шлях праходзіць па тэрыторыі розных дзяржаў – Расіі і Беларусі. А сучасная дарога з Оршы ў Мсціслаў праходзіць некалькі ўбаку ад старога шляху. У той жа час, яшчэ і сёння асобныя участкі гэтай былой дарогі мясцовае насельніцтва называе «старым мсціслаўскім шляхам». Так, у наваколлях в. Беразетня Мсціслаўскага раёна называюць палявую дарогу, што вядзе з в. Быстрыца Горацкага раёна ў в. Заходы Мсціслаўскага раёна.

З Мсціслава, цэнтра памежнага ваяводства, існавала некалькі шляхоў за межы Рэчы Паспалітай – у Расію. Адзін з іх вёў у пагранічны горад «Хославічы». Ён ішоў праз в. «Косково» (суч. в. Каськова Мсціслаўскага раёна), потым праз вёскі Гразі і Мазыкі выводзіў да в. «Поплетино», дзе была карчма на Сожы. Усе пералічаныя вёскі мы сустракаем і зараз у Хіславіцкім раёне Смаленскай вобласці на сучасным шляху з Мсціслава ў Хіславічы. Далей праз не лакалізаваную в. Рося-Гайкаўка шлях прыводзіў непасрэдна ў Хіславічы[80].

Шлях з Мсціслава на Смаленск, які сфарміраваўся, верагодна, у XII ст., працягваў сваё існаванне і ў больш позні перыяд. Ён на сваім пачатку ў Мсціславе меў два варыянты. Адзін пачынаўся за Афанасьеўскай брамай вакольнага горада Мсціслава. Тут за мсціслаўскімі прадмесцямі была развілка на Магілёў і Смаленск. Далей «смаленскі гасцінец» фіксуецца на поўнач ад Мсціслава, каля сяла Кандратаўскае[81], і ішоў, верагодна, у напрамку мястэчка Манастыршчына. А другі шлях на Смаленск з Мсціслава мог пачынацца на гарадскім

---

[75] РА НБВУ. – Ф. 4. – Адз. зах. 4914. – Арк. 616.
[76] ИЮМ. – Вып. 32. – С. 203–204, 248, 249, 284.
[77] АСДОИСЗР. – Т. 3. – С. 255.
[78] LVIA. – F. SA. – Ap. 1. – Bib. 3810. – P. 78–78 v., 97–98.
[79] БЭФ. – Т. 1. – С. 314; АМГ. – Т. 1. – С. 442.
[80] LVIA. – F. SA. – Ap. 1. – Bib. 3810. – P. 73 v.
[81] ИЮМ. – Вып. 25. – С. 482; АВК. – Т. 34. – С. 288.

падоле і потым ішоў праз р. Віхра ў напрамку больш позняга Пустынскага манастыра і далей на Любавічы, а адтуль адкрываўся шлях на Манастыршчыну. На рускіх землях шлях з Мсціслава на Смаленск не фіксуецца, але ўлічваючы, што гэты кірунак на поўнач ад Мсціслава быў самым кароткім шляхам да Смаленска, ён, верагодна, дзейнічаў увесь час.

Мсціслаў быў звязаны прамым шляхам і з мястэчкам Шумячы. З Шумячаў шлях прыводзіў у в. Мікуліна (суч. в. Мікулічы Шумяцкага раёна) на Астры. З Мікуліна ехалі праз не лакалізаваную в. Юрава на в. Студзянец. Адтуль шлях ішоў уздоўж р. Сожанка праз в. Селішча і Карнілаўку і выводзіў у раёне в. Каўшова на Сож. Тут дзейнічаў паром, пераехаўшы на якім Сож, вандроўнік ужо знаходзіўся на прамым шляху з Крычава на Мсціслаў[82].

Два шляхі вялі з Мсціслава на поўдзень ваяводства ў напрамку дзяржаўнай мяжы з Расіяй, мінуючы Крычаў. Адзін з іх першапачаткова ішоў праз нейкую «Сухую карчму» у в. Людагошча, адкуль зварочваў на в. Каменка, якая зараз не існуе. Яе, верагодна, трэба шукаць на Сожы ў раёне ўпадзення ў яго р. Белая Натапа, дзе зараз знаходзіцца ўрочышча Каменны Брод. Тут на Сожы дзейнічаў перавоз.

З Каменкі шлях вёў на р. Асцёр на в. Стрыкайлава, якая зараз не існуе, дзе таксама быў перавоз праз раку. Вёска Стрыкайлава раней размяшчалася каля сучаснай в. Зімоніна Шумяцкага раёна, дзе і зараз ёсць урочышча з сугучнай назвай – Стракайлава. Са Стрыкайлава шлях вёў праз вёскі Дрышчаў (суч. в. Зарубец Крычаўскага раёна), Барысаўка, Царковішча, Хацень, Клімавічы, мястэчка Лазовіца, в. Зарой. За Зароем шлях зварочваў на поўдзень і праз вёскі Сямёнаўка, Царковішча (суч. в. Пралетарскае Касцюковіцкага раёна) і Асінаўка прыводзіў у мястэчка Касцюковічы. З мястэчка Касцюковічы праз вёскі Ліпаўка, Бялынкавічы і Смолькі дарога прыводзіла ў Бяляны, на дзяржаўную мяжу[83].

Другі шлях з Мсціслава на Бялянскую мытню першапачаткова, верагодна, паўтараў шлях на Шумячы. Толькі ў в. Бабылічы (сучасная в. Бабічоўка Шумяцкага раёна паміж вёскамі Селішчы і Студзянец) ён паздзяляўся. З в. Бабылічы ехалі на в. Куляшоўка, а пераехаўшы раку Асцёр, бралі курс на сучасную в. Канахоўка.

З яе ехалі на Родню, дзе шлях зварочваў на поўдзень, і праз вёскі Печанеж, Тупічын, Клін, Вітунь, мястэчка Канічы ехалі ў бок р. Беседзь. За Беседдзю дарога ішла праз в. Крапіўна (суч. в. Вялікая Крапіўна Касцюковіцкага раёна). Потым праз не лакалізаваную в. Роскаш ехалі ў напрамку вёсак Журбін, Буда (суч. в. Журбінская Буда Касцюковіцкага раёна) і траплялі ў памежную в. Бяляны, дзе была мытня[84].

З Мсціслава вёў тракт і на паўночны захад ваяводства, на мястэчка Кадзіна. Ён ішоў уздоўж р. Віхра праз не лакалізаваную в. Бобрыкі, потым на вёскі Вір-

---

[82] LVIA. – F. SA. – Ap. 1. – Bib. 3810. – Арк. 73 v.–74.

[83] Тамсама. – Арк. 71 v.–72 v.

[84] Тамсама. – Арк. 72 v.– 73.

ная (суч. в. Вяроўна Манастыршчынскага раёна), Крупец, Зубаўшчына і прыводзіў у мястэчка Татарск. Адтуль адкрываўся прямы шлях на Кадзіна[85].

Безумоўна, існаваў стары шлях і ў паўднёва-заходнім напрамку, у бок Ходасаў і «двара Краснага». Дарога «гасціная» з Мсціслава на в. Усполле згадваецца пры апісанні граніц дзяржавы Струпені[86]. Гэта дарога, верагодна, далей выводзіла на Чавусы і захавалася да сённяшняга дня.

Другім буйным гарадскім цэнтрам ваяводства быў Крычаў, які, як і Мсціслаў, таксама сцягваў да сябе розныя гандлёвыя шляхі.

Магілёўская дарога, якая пачыналася адразу за крычаўскім астрогам, згадваецца яшчэ ў XVI ст. На «Крычаўскім тракце» знаходзілася ў пачатку XVII ст. карчма в. Гарбавічы Магілёўскага староства[87]. Гэта вёска і зараз знаходзіцца на дарозе, якая праз Чавусы і Чэрыкаў звязвае Магілёў з Крычавам, што дазваляе меркаваць пра яе функцыянаванне як мінімум з пачатку XVII ст.

Далей шлях з Гарбавічаў у бок Чавусаў вёў праз в. Благавічы, дзе таксама ў канцы XVI ст. стаяла карчма[88]. А з Чавусаў на Чэрыкаў ехалі праз вёскі Пятровічы, Рыменно (суч. в. Рымінка Чэрыкаўскага раёна), Чэрыкаў[89]. З Чэрыкава на Крычаў ехалі ўздоўж Сожа.

Магілёўскі, Мсціслаўскі і нейкі «Зуеўскі» тракт, якія выходзілі з Крычава, згадваюцца ў 1754 г. [90] Апошні, мяркуючы па назве, магчыма, вёў на в. Зуі і часткова павінен быў супадаць з Мсціслаўскім.

У вёсцы Гарбавічы, верагодна, шлях з Крычава на Магілёў меў адгалінаванне на в. Смолькі, што стаяла на «грунце» Хацкавіцкім (сучасныя аднайменныя вёскі Чавускага раёна). У Смольках адзначаецца карчма, якая стаяла на тракце з Магілёва ў Прапойск і на Чавускім тракце[91].

Другім значным шляхам, які звязваў Крычаў з паўднёвымі часткамі ваяводства і замежжам, быў «Алучыцкі шлях». Ён пачынаўся на Забялышчынскім пасадзе, ніжэй якога, каля в. Задабрасць, на Сожы быў «Алучыцкі перавоз». Ім з сярэдзіны XVI ст., згодна з прывілеем крычаўскага дзяржаўцы Канстанціна Шалухі, валодалі святары крычаўскай Іллінскай царквы[92]. Гэты шлях даволі добра паддаецца рэканструкцыі на падставе крыніц пачатку XVIII ст., аднак, улічваючы наяўнасць у Крычаве ў сярэдзіне XVI ст. вуліцы «Почепской», якая, верагодна, выводзіла на дарогу, што вяла ў бок горада Пачэпа[93], існаваў ён ужо ў больш раннія часы. За Сожам на «гасцінцы Лу-

---

[85] LVIA. – F. SA. – Ap. 1. – Bib. 3810. – Арк. 74 v.

[86] Тамсама. – Bib. 3806. – Арк. 14 v.

[87] РА НБВУ. – Ф. 4. – Адз. зах. 4914. – Арк. 636.

[88] ИЮМ. – Вып. 30. – С. 5.

[89] РА БАН Літвы. – Ф. 16. – Адз. зах. 127. – Арк. 40 адв.

[90] ИЮМ. – Вып. 17. – С. 329.

[91] Тамсама. – Вып. 30. – С. 338.

[92] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1928. – Арк. 14; Тамсама. – Адз. зах. 1931/2. – Арк. 4; Тамсама. – Адз. зах. 1932. – Арк. 17.

[93] Тамсама. – Ф. 694. – Воп. 4. – Адз. зах. 1155. – Арк. 38–39.

чыцкім», які ішоў «з Украіны», у пачатку XVIII ст. стаяла вёска «Гута Стара»[94] – сучасная в. Гута Клімавіцкага раёна. З яе шлях вёў на в. Жадунька, потым на в. «Красевічы» (суч. в. Красавічы Клімавіцкага раёна) і праз в. Рысін прыводзіў у мястэчка Міхалаў[95]. У апошняе з боку Крычава, верагодна, ўязджалі па вуліцы «Крычаўскай». Далей на поўдзень у бок Касцюковічаў з Міхалава выводзіла «Касцюковіцкая» вуліца[96].

Шлях на Касцюковічы пралягаў праз мястэчка Негін, а далей з Касцюковічаў дарога на поўдзень ішла ў кірунку мястэчка Студзянец, у якое вандроўнік уязджаў па «Касцюковіцкай» вуліцы. У Студзянцы шлях раздвойваўся: адзін вуліцай Старадубскай вёў далей на поўдзень, верагодна, зварочваючы на в. Ліпаўка, а другі безыменнай вуліцай выводзіў на дарогу на в. Белая Дубрава[97].

Дарога «гасціна» з «Украіны» праз Касцюковічы, якая «здаўна ідзе», згадваецца ў крыніцах сярэдзіны XVIII ст. «Гасцінец» з Касцюковічаў на в. Белая Дубрава далей ішоў праз в. Кавычыцы на в. Мокрая[98] і таксама выводзіў на мяжу з Расіяй.

З-за таго, што ў Крычаве існаваў прыкаморак, частка купцоў, не жадаючы плаціць мытных збораў, спрабавалі аб'ехаць горад. Таму з в. Красавічы яны ехалі на вёскі Буда Высоцкая, Жаркі, Ігнатаўка. Раку Сож пераязджалі каля в. Паклады і адтуль, мінуючы Крычаў і Мсціслаў, ехалі на Дрыбін[99].

Прыватнаўласніцкае мястэчка Негін, якое належала панам Свадкоўскім, было тым пунктам, дзе пачыналася адгалінаванне ад Алучыцкага шляху другога шляху ў бок Чэрыкава. Дарога ішла на вёскі Восаў, Прудок, «Ститовку» (суч. в. Цітаўка Клімавіцкага раёна), Зябін Прапойскага староства (суч. в. Зябень Чэрыкаўскага раёна), а адтуль зварочвала на Чэрыкаў. Пераправа праз р. Сож была пад самым горадам[100]. Гэты шлях з Севершчыны на Чэрыкаў існаваў ужо ў 1648 г. і крыніцы адзначаюць пра пачатак яго існавання з даўніх часоў[101].

Дарога з Крычава на Рослаўль згадваецца ў крыніцы 1634 г.[102] Яна пачыналася з перавоза праз Сож. Ён быў каля Іллінскай царквы і ім, як і Алучыцкім перавозам, таксама валодалі Іллінскія святары[103]. Па левым, забалочаным беразе Сожа, у напрамку в. Міхеевічы вяла гаць. З в. Міхеевічы на в. Мілаславічы шлях ішоў праз в. Каняхоўка[104]. Каля в. Каняхоўка шлях раздвойваўся. Адна дарога вяла ў мястэчка Шумячы, а другая ў мястэчка Ганна. З мястэчка Ганна

---

[94] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1932. – Арк. 43.
[95] LVIA. F. SA. – Ap. 1. – Bib. 3810. – P. 75 v.
[96] НГАБ. – Ф. КМФ-5.– Воп. 1. – Адз. зах. 1932. – Арк. 150–151.
[97] Тамсама. – Адз. зах. 1936. – Арк. 107, 108.
[98] Тамсама. – Ф. 694. – Воп. 2. – Адз. зах. 3982. – Арк. 6, 256.
[99] LVIA. – F. SA. – Ap. 1. – Bib. 3810. – P. 76.
[100] Тамсама. – P. 75.
[101] ИЮМ. – Вып. 13. – С. 254.
[102] АМГ. – Т. 1. – С. 651.
[103] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1928. – Арк. 14.
[104] Тамсама. – Адз. зах. 1936. – Арк. 221, 205.

ў бок Шумячаў дарога пачыналася на вуліцы «Шумяцкай»[105]. Нейкая «дарога вялікая» з Крычава і Мсціслава праходзіла паўз в. Ст. Дзедзін[106].

З Крычава вяла прамая дарога і на Дрыбін. «Дрыбінская вялікая дарога» згадваецца ў крыніцах сярэдзіны XVIII ст.[107] Яна пачыналася ў горадзе на вуліцы Дрыбінскай, адтуль вяла на нейкае нелакалізаванае Zarekie, потым праз вёскі Дарлівая, Камароўка выходзіла на нелакалізаваныя вёскі Прудок і Глінка. Адтуль дарога прыводзіла ў в. «Сорочін» – сучасную в. Сарочына Крычаўскага раёна. Наступнымі кропкамі на гэтай дарозе былі вёскі Юшкавічы, Ходасава (суч. в. Ходасы Мсціслаўскага раёна), Краснае, Старынка, Доўгавічы, Малькаўка. Наступны пункт на гэтай дароге – Гарадок – зараз не лакалізуецца. Але за ім дарога XVIII ст. зноў трасіруецца на сучасным шляху ад в. Краснае на Дрыбін. Як і зараз, яна ішла праз мястэчка Расна і в. Драздоўка[108].

Акрамя буйных цэнтраў ваяводства – Мсціслава і Крычава, і іншыя гарады і мястэчкі таксама былі звязаны паміж сабой прамымі шляхамі. Так, люстрацыя трактаў Мсціслаўскага ваяводства згадвае прамую дарогу з Шумячаў на Хоцімск і далей на Касцюковічы. Улічваючы даволі позняе ўзнікненне Хоцімска, і ўзнікненне самога тракту да яго трэба адносіць да першай паловы XVIII ст. З Шумячаў на Хоцімск ён, верагодна, ішоў уздоўж дзяржаўнай мяжы Рэчы Паспалітай з Расіяй, і, магчыма, яго трасіроўка ішла праз сучасныя вёскі Глушкава, Макеевічы, Перавалочня, Галічы, Фядотава Буда, Забялышын, Трасціно.

З Хоцімска на Касцюковічы тракт, верагодна, супадаў з напрамкам сучаснай дарогі, што звязвае гэтыя цэнтры – вёскі Баханы, Бярозкі, Дзямідавічы. Улічваючы, што большасць гэтых вёсак вядома па крыніцах XVI ст., безумоўна, частка гэтага сухапутнага шляху да згаданых вёсак існавала ўжо ў той час.

У пачатку XVIII ст. (1709 г.) згадваецца дарога Хоцімская, якая вяла паўз в. Родня[109]. Гэты шлях схематычна супадае з кірункам сучаснай дарогі з Клімавічаў на Хоцімск, таму можна меркаваць, што і гэты шлях пачаў фарміравацца значна раней, чым трапіў на старонкі пісьмовых крыніц.

Акрамя вялікіх шляхоў, трактаў, гасцінцаў і дарог, якія звязвалі паміж сабой гарады і мястэчкі, крыніцы згадваюць і вялікую колькасць больш дробных дарог, якія ішлі паміж вёскамі.

Так, адна з крыніц 1566 г. згадвае ў наваколлях сучаснай в. Судзілы Клімавіцкага раёна «дарогу Хотимецкую»[110]. У пачатку XVII ст. (1611 г.) у Мсціслаўскім ваяводстве згадваецца Ларынаўская дарога, якая вяла з Мсціслава ў бок в. Ларынава[111]. У прывілеі 1615 г. Івану Івановічу, папу мсціслаўскага саборнага Троіцкага храма, на сяло Кастровічы падкрэсліваецца, што яно ляжыць

---

[105] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1936. – Арк. 173–174.
[106] Тамсама. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 246. – Арк. 464.
[107] ИЮМ. – Вып. 17. – С. 347.
[108] LVIA.– F. SA. – Ap. 1. – Bib. 3810. – P. 76 v.
[109] НГАБ. – Ф. 1729. – Воп. 1. – Адз. зах. 11. – Арк. 548–550 адв.
[110] ИЮМ. – Вып. 28 – С. 125.
[111] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 89. – Арк. 273–273 адв.

паміж дзвюх дарог – Пірагоўскай і Ларынаўскай[112]. У 1662 г. згадваецца дарога якая вяла з в. Вахор на в. Воўчас паўз в. Рэдчыца[113].

У крыніцах XVII ст. фіксуюцца некаторыя дарогі, якія функцыянуюць і ў наш час. Так, з в. Пацолтава на Мсціслаў дарога ішла, верагодна, па сённяшнім кірунку. У гэтай жа крыніцы згадваюцца дарогі з Пацолтава на Мігнавічы, з в. Данілаўка праз в. Занькаўшчына на Мсціслаў і з в. Занькаўшчына на в. Вялікая Слабодка[114]. З в. Добрае праз в. Мушына ішла дарога на в. Пірагова і далей на Мсціслаў. Верагодна, у Пірагове начыналася адгалінаванне на в. Валоўнікі, якая стаяла на малячыцкім тракце[115]. Крыніцы ж XVIII ст. ужо называюць вялікую колькасць дарог паміж вёскамі, што сведчыць пра іх шырока развітую сетку на той час.

Так, у 1788 г. згадваецца дарога, якая ішла з в. Данілаўка праз фальварак Занькоўшчызна на Мсціслаў. У інвентары маёнтка Пнева (1771 г.) згадваецца «тракт Карнілаўскі», які ідзе з в. Бабынічы[116]. У адной з крыніц сярэдзіны XVII ст. згадваецца дарога з сяла Добрага ў в. Пірагова[117]. У апісанні абмежавання зямельных уладанняў в. Горня Крычаўскага староства мы сустракаем згадванне «Боханаўскага гасцінца», які ішоў праз «балота Гарохавае»[118]. Улічваючы, што сугучнае па назве урочышча Гарохаўшчына існуе і ў наш час на расійска-беларускім памежжы, можна сцвярджаць, што гэты «Боханаўскі гасцінец» функцыянуе і зараз і вядзе з сучаснай в. Жасткова Мглінскага раёна Бранскай вобласці праз пас. Пагранічны, урочышча «Гарохаўшчына», в. Юзафоўка у в. Баханы Хоцімскага раёна Беларусі.

Сярод мясцовых дарог інвентар Крычаўскага староства 1747 г. згадвае дарогу з в. Стары Стан у в. Тарасавічы. Дарога на в. Тарасавічы вяла і з в. Пуцімель, з в. Пуцімель – у в. Недзведзь, а з апошняй праз р. Іпуць быў шлях на в. Пожар[119]. З в. Валынцы вяла дарога на в. Ельня. Праз в. Валынцы праходзіў і «стары гасцінец Бярозкаўскі», які, верагодна, вёў з поўначы староства ў бок в. Бярозкі[120].

Напрамкі старых дарог прасочваюцца і дзякуючы захаваўшымся тапонімам, якія паказваюць умовы пераадольвання перашкод, якія там існавалі. Існаванне дарог, якія шлі праз балоты, пацвярджаюць тапонімы тыпу «Гаць», «Гацішча». У рэгіёне нашага даследвання падобныя тапонімы нешматлікія. Гэта выклікана перш за ўсё невялікай колькасцю багнаў у гэтай мясцовасці. Падобныя тапонімы сустракаюцца пераважна на поўдні Мсціслаўскага княс-

---

[112] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 91. – Арк. 291–291 адв.

[113] ИЮМ. – Вып. 17. – С. 196–197.

[114] Тамсама. – Вып. 24. – С. 466–468.

[115] АВК. – Т. 34. – С. 159; Тамсама. – Т. 35. – С. 522; НГАБ. – Ф. 1729. – Воп. 1. Адз. зах. 10. – Арк. 382–382 адв.

[116] АВК. – Т. 35. – С. 194–198, 522.

[117] Тамсама. – Т. 34. – С. 257.

[118] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1936. – Арк. 154.

[119] Тамсама. – Арк. 201, 202.

[120] Тамсама. – Арк. 165–166.

ина і ваяводства. Так, тапонімы Гацкевіч і Гатавец існуюць у Краснапольскім раёне, тапонім Гаць ёсць у Касцюковіцкім раёне, а два тапонімы – Гацішча і Гатная Слабодка вядомы ў Чавускім раёне. На поўнач падобныя тапонімы не сустракаюцца, што выклікана адсутнасцю там вялікіх багнаў.

Для перапраў праз буйныя рэкі рабілі паромы. Паром праз Дняпро ў Оршы згадвае ў сваіх мемуарах 1593 г. Мікалай Варкочы[121]. Перавозы праз Дняпро існавалі ў канцы XVI – XVIII ст. у магілёўскім прыгарадзе Лупалава, каля вёсак Любуж, Вародзчыкава, Дзяцькавічы. Дзейнасць некаторых з іх прыпадае на пачатак XVI ст. У пачатку XVII ст. (1606 г.) перавоз праз Сож ў бок сяла Непрын быў недалёка ад в. Рэдчыца (суч. в. Рэчыца Чэрыкаўскага раёна)[122].

Значна больш звестак пра перавозы захавалася ў крыніцах XVIII ст. Так, паром праз р. Сож існаваў з в. Лабковічы ў напрамку в. Ціхіль[123]. Яшчэ адзін паром на Сожы дзейнічаў недалёка ад Мсціслава, каля в. Каўшова, і абслугоўваў перавоз на дарозе з Мсціслава ў Шумячы[124]. Перавоз праз р. Сож быў недалёка ад Панарскай Слабады[125], верагодна, ён звязваў сучасныя вёскі Панар Хіславіцкага раёна Смаленскай вобласці і Ст. Віхраны Мсціслаўскага раёна. На шляху з Мсціслава ў Магілёў перавоз праз Проню быў у в. Расна[126].

Як адзначалася вышэй, два перавозы праз Сож былі ў Крычаве. Згодна з пісьмовымі крыніцамі, яны функцыянавалі як мінімум з XVI ст. Перавоз праз р. Беседзь існаваў і на шляху з в. Крапіўна ў мястэчка Канічы[127].

Акрамя паромаў і перавозаў, для пераадольвання рэк служылі масты. Яны часта згадваюцца пры апісанні розных шляхоў. Праз вялікія рэкі час ад часу рабілі і наплаўныя масты, якія абапіраліся на лодкі, і іх можна было хутка разабраць. Такі мост у Оршы праз р. Аршыца згадвае ў сваіх успамінах Аўгусцін Майербег. Наплаўны мост існаваў праз Дняпро і ў Магілёве[128].

На больш дробных рэках, верагодна, стаялі звычайныя масты, якія абапіраліся на палі. Мост праз р. Віхра існаваў ў Мсціславе на шляху, які вёў у Пустынскі манастыр. Акрамя таго, мост праз Віхру быў і ў в. Кісловічы[129].

На падставе пісьмовых крыніц цяжка ўявіць іх канструкцыйныя асаблівасці, але Б. Танер адзначае, што «по обыкновению» яны знаходзіліся ў вельмі дрэнным стане[130]. Тым не менш, на шляхах час ад часу сустракаліся і масты з пад'ёмным звяном – узводам. Такі мост згадваецца на дарозе праз стаў двара Атоцкага[131].

---

[121] Описание путешествия в Москву Николая Варкочи. – С. 11.

[122] ИЮМ. – Вып. 15. – С. 358–362; НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 88. – Арк. 241.

[123] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1932. – Арк. 166.

[124] LVIA. F. SA. – Ap. 1. – Bib. 3810. – P. 74.

[125] Тамсама. – Bib. 3806. – P. 25 v.

[126] НГАБ. – Ф. 2544. – Воп. 1. – Адз. зах. 1. – Арк. 2, 6 адв., 58–58 адв.

[127] Тамсама. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1936. – Арк. 163.

[128] Путешествие в Московию барона Августина Майерберга. – С. 202; ИЮМ. – Вып. 30. – С. 168–169.

[129] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 162. – Арк. 116–117.

[130] Таннер Б. Описание путешествия польского посольства в Москву. – С. 27.

[131] НГАБ. – Ф. 1729. – Воп. 1. – Адз. зах. 44. – Арк. 232–237 адв.

Для будаўніцтва і падтрымкі мастоў у добрым стане на гасцінцах асобымі каралёўскімі прывілеямі, згодна са Статутам ВКЛ 1588 г., дазвалялася арганізоўваць збор мыта[132]. У адрозненне ад заходняй і цэнтральнай часткі дзяржавы адносна маставых мытаў на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства XVI–XVII стст. захавалася мала звестак.

Так, у 1645 г. каралеўскім прывілеем Пятру Баноўскаму было дазволена «на гастинцу до розных мест и местечек» пабудаваць мост праз р. Малатоўка і збіраць мыта для яго падтрымкі ў добрым стане ў маёнтку яго дзедзічным Пірагова. Згодна з прывілеем за праезд праз мост павінны былі плаціць «...купцы, фурманы и жыды ад возу товаров наложоного по грошу одному, ад быдла рогатого по шелегу одному». Духоўным і свецкім феадалам, згодна са Статутам 1588 г. і каралеўскімі прывілеямі, дазвалялася праязджаць без выплаты мыта[133].

У 1646 г. Казімір Парчэўскі атрымаў прывілей на мыта маставое на р. Альшоўка ў сваім маёнтку Княжычава (суч. в. Князішчава Мсціслаўскага раёна) «на гасцинцу з розных мест и мястэчак». За праезд бралі з воза па палове гроша[134].

У 1666 г. мсціслаўскі стольнік С. Сухадольскі атрымаў права на збор мыта на перавозе праз р. Белая Натапа ў «маетнасці сваёй дзедзічнай Мазалаўшчызне». За праезд з купцоў за воз тавараў бралася плата «по пултараку», а з «быдла рагатага» і коней, якіх вялі на продаж, бралася «па шэлягу». Паміж рэкамі Белая і Чорная Натапа збіралася мыта ў маетнасці Катлова, на шляху ў Крычаў[135].

Шляхта звярталася да каралеўскай улады не толькі за дазволам збору мыта маставога ў сваіх уладаннях. Дзяржаўцы і арандатары былі ініцыятарамі збору мыта і ў дзяржаўных уладаннях. Так, у 1648 г. Алешка Дамагацкі быў ініцыятарам арганізацыі збору маставога мыта на р. Балотня каля в. Русінаўка і на р. Проня на тракце радамлянскім, на перакрыжаванні шляхоў з Крычава на Расну і з Мсціслава на Магілёў[136].

Інфляцыя рабіла сваю справу, і ў 1718 г., калі «маставое» было дазволена збіраць у Пятровічах на р. Немка і ў «Стайове», то за праезд па масту бралася плата ў памеры «па 2 грошы з воза купецкага, па шелягу ад быдла і каня», што вялі на продаж[137]. У сярэдзіне XVIII ст. мыта, згодна з рэвізіяй «Трактаў Мсціслаўскага ваяводства 1765 года», збіраў амаль кожны шляхціч пры наяўнасці на яго землях маста праз раку.

Як і раней, узімку працягвалі карыстацца «зімовымі дарогамі», у якасці якіх, верагодна, трэба бачыць замёрзлыя рэчышчы рэк і балоты. Ва ўсякім

---

[132] Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588 года. – С. 98–99, артыкул 29.

[133] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 119. – Арк. 60 адв.; Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588 года. – С. 98–99, артыкул 30.

[134] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 119. – Арк. 652 адв.

[135] Тамсама. – Адз. зах. 132. – Арк. 722; Тамсама. – Адз. зах. 124. – Арк. 281 адв.–282.

[136] Тамсама. – Адз. зах. 125. – Арк. 346 адв.–347.

[137] Metryka Litewska. Księga Sigillat. 1709–1719 = Литовская метрика. Книга Сигиллат. 1709–1719 / oprac. A. Rachuba. – Warszawa : PAW, 1987. – S. 171.

выпадку, яшчэ ў 1727 г. у наваколлях Мсціслава згадваецца дарога «зімовая» і в. Шэневічы ў в. Кудрычы, якая ішла «вниз да балота». Зімой па льду пераязджалі і Дняпро на шляху са Шклова ў Чавусы[138].

Рэкі пераадольвалі і праз броды, месца знаходжання некаторых з якіх зафіксавала тапанімія. Так, вёска Каменны Брод існавала яшчэ ў канцы XVIII ст. ў Сожам, насупрацьАнуфрыеўскага манастыра і стаяла, верагодна, на шляху, які вёў з Мсціслава на поўдзень ваяводства. Сваю назву гэты населены пункт атрымаў альбо ад камяністага дна брода, альбо, як адзначаюць некаторыя даследчыкі, такую назву мелі броды, з'езды да якіх былі вымураваны каменем[139].

Падобны тапонім – в. Брадок, які фіксуе стары шлях з Крычава на Маляцічы, існуе і зараз на р. Рышта. Вёска Броды існуе на старым шляху з Чавусаў на Прапошаск на р. Вілейка. Верагодна, ад броду, які існаваў раней на р. Чарніцы, вядзе сваё паходжанне і назва в. Забродзе Шклоўскага раёна.

Мяркуючы па крыніцах, сухапутныя шляхі зносін пачалі фарміравацца ў XII–XV стст., а ужо праз адно-два стагоддзі пакрылі ўсю краіну і звязвалі паміж сабой усе гарадскія цэнтры. Не адставалі ад гэтага працэсу і ўсходнія раёны ВКЛ. Ужо ў сярэдзіне XVI ст. галоўныя дарогі прынялі больш-менш сучасныя напрамкі, а ў канцы XVIII ст. (1788 г.) дарогі ўсходніх уездаў Магілёўскай губерні фактычна супадаюць з сучаснымі[140].

У цэлым назіранні за трасіроўкай сучасных галоўных камунікацый ў міжрэчы Сожа і Дняпра паказваюць, што яны ў сваёй аснове паўтараюць кірункі гандлёвых шляхоў, якія існавалі ў XVI–XVIII стст. і, верагодна, пачалі фарміравацца ў больш ранні час. Даволі часта назіраецца невялікі люфт на 2–6 км у бок ад старых шляхоў, што ў большасці выпадкаў звязана з абыходам сучасных населеных пунктаў і сучаснымі адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі зменамі. У рэдкіх выпадках старыя гандлёвыя шляхі страцілі сваю значнасць і трансфармаваліся ў не звязаныя паміж сабою ў адзінае цэлае мясцовыя дарогі. Аднак і яны да сённяшняга дня працягваюць сваё функцыянаванне.

---

[138] НГАБ. – Ф. 1729. – Воп. 1. – Адз. зах. 33. – Арк. 352 адв.; Ф. КМФ-19. – Воп. 1. – Адз. зах. 7. – Арк. 62 адв.

[139] Kowalczyk-Heyman E. Kamień, Kamienne Brody. – S. 87–107.

[140] АР БАН Літвы. – Ф. 16. – Адз. зах. 127. – Арк. 39 адв.–40 адв.

ЗЕМЛІ СЯРЭДНЯГА І ВЕРХНЯГА ПАСОЖЖА Ў IX–XIII стст.

2.1. Этнічная сітуацыя ў Сярэднім і Верхнім Пасожжы ў IX–XIII стст.

Сярэдняе і Верхняе Пасожжа ў VII–VIII стст. было заселена носьбітамі калочынскай культуры і культуры тыпу верхняга слоя гарадзішча Тушамля, мяжа паміж якімі праходзіла прыкладна па лініі Быхаў – Слаўгарад – міжрэчча Сожа і Беседзі – Іпуць. У VIII–X стст. тут адбываецца змена насельніцтва: з поўначы сюды пранікала насельніцтва культуры тыпу смаленскіх доўгіх курганоў, а з поўдня Пасожжа пачынала асвойваць роменскае насельніцтва.

На сённяшні дзень помнікаў VIII–IX стст. у Верхнім Пасожжы, якое асвойвалі носьбіты культуры смаленскіх доўгіх курганоў, выяўлена мала. Паселішчы гэтага часу вядомы толькі ў раёнах, што прымыкаюць да Дняпра, – каля вёсак Буянава, Раманаўка, Смілава Краснянскага раёна Смаленскай вобласці. У Пачынкаўскім раёне, на Дняпры, селішчы і курганы гэтага часу вядомы каля вёсак Арэфіна, Беларучча, Агаркава. У бліжэйшым наваколлі Смаленска помнікі культуры смаленскіх доўгіх курганоў вядомы каля вёсак Бярэзінка (селішча і курганы), Барышчаўшчына (селішча), Міціна (курганы), Кушляншчына (селішча і курганы)[1].

Блізкасць да Дняпра вытокаў Сожа спрыяла таму, што ўздоўж плыні апошняга носьбіты культуры смаленскіх доўгіх курганоў актыўна пранікалі і ў больш паўднёвыя раёны. Селішчы гэтага тыпу на Сожы выяўлены каля вёсак Вярхнедава, Фралова. У гэтым жа раёне выяўлены і курганныя могільнікі гэтай культуры. Яны вядомы каля вёсак Цуркоўка, Васільева, Слабада-Глушыца, Елаўцы[2]. Прычым, згодна з новым аналізам інвентара з гэтых пахаванняў, каля Дняпра могільнікі з доўгімі курганамі ўзнікаюць у другой палове VIII ст., а на Пасожжа культура смаленскіх доўгіх курганоў пранікае некалькі пазней – у канцы VIII – першай палове IX ст.[3]

Самыя паўднёвыя помнікі культуры смаленскіх доўгіх курганоў (селішчы, курганы) на Пасожжы сустракаюцца ў раёне вёсак Фралова, Слабада-Глушыца, Елаўцы. У некаторым аддаленні ад іх знаходзіцца курганны могільнік

---

[1] Археологическая карта России. Смоленская область. – Ч. 1. – С. 72, 74, 113, 114, 118, 210, 217, 218; Археологическая карта России. Смоленская область. – Ч. 2. – С. 68, 72, 89.

[2] Археологическая карта России. Смоленская область. – Ч. 2. – С. 73, 99–100, 176–177, 181.

[3] Нефедов В. С. О времени возникновения культуры смоленско-полоцких длинных курганов // Археология и история Пскова и Псковской земли. Материалы науч. семинара 1996–1999 гг. – Псков, 2000. – С. 195–197; Яго ж. Салтовские древности в смоленских длинных курганах // ГАЗ. – Мінск, 2002. – № 17. – С. 137.

(7 падоўжаныя насыпы) каля в. Н. Заселле Шумяцкага раёна Смаленскай вобласці[4].

Курган падоўжанай формы, памерамі 19 × 6 м і вышынёй 1,25 м даследаваўся у 1893 г. на беразе р. Суроў у Клімавіцкім уездзе. З кароткага паведамлення вядома, што ў насыпе былі знойдзены сляды агню і перапаленыя косткі, а па ўзроўні дзённай паверхні выяўлена кастрышча, у якім былі сабраны некалькі фрагментаў гаршка[5]. Таксама тры курганы падоўжанай формы памерамі 11 × 6 м і вышынёй да 1 м вядомы на р. Іпуць каля в. Памазаўка Ершыцкага раёна Смаленскай вобласці[6].

На захад ад Сожа, на р. Віхра, курганны могільнік IX–X стст. з трупаспаленнем і са знаходкай ў кургане ляпнога гаршка вядомы каля в. Кісловічы Манастыршчынскага раёна[7]. Далей на захад падоўжаны курган вядомы на р. Быстрая, у курганнай групе каля в. Мядзведаўка Горацкага раёна – у басейне р. Проня.

На ўсходзе, на Падняпроўі, у раёнах, якія прылягаюць да вытокаў Дзясны, селішчы VIII–IX стст. вядомы каля вёсак Вішнякі, Варатніно, Ганіна, Дубосішча. У гэтым жа раёне, каля в. Баравая, вядомы і курганны могільнік культуры смаленскіх доўгіх курганоў[8]. Усе гэтыя селішчы і курганны могільнік размешчаны ў басейне р. Воласць, левага прытока Дняпра.

Такім чынам, носьбіты культуры смаленскіх доўгіх курганоў на Пасожжы і Падзясенні насялялі толькі самыя вярхоўі гэтых водных артэрый, і паўднёвая мяжа распаўсюджання носьбітаў гэтай культуры на левабярэжжы Дняпра, верагодна, праходзіць па лініі Глінка – Пачынкі – Хіславічы – Манастыршчына – Горы – Шклоў (мал. 1).

У апошняй чвэрці I тыс. н. э. на Пасожжа з поўдня пачынаюць актыўна пранікаць носьбіты роменскай культуры. Прасоўваючыся на поўнач, роменскае насельніцтва актыўна асвойвала ў першую чаргу ніжнюю плынь р. Сож. Тут вядомы буйныя па плошчы паселішчы гэтага часу – на тэрыторыі сучаснага Гомеля, каля в. Насовічы Добрушскага раёна, у Чачэрску, каля в. Нісімкавічы Чачэрскага раёна, у Слаўгарадзе і г. д.

На Сярэдняе Пасожжа роменскае насельніцтва пранікала як з поўдня, так, верагодна, і з паўднёвага ўсходу – праз правыя прытокі Дзясны. Іх шлях пранікнення на Сож маркіруюць паселішчы на р. Іпуць – каля вёсак Блінныя Кучы, Крастовая Ершыцкага раёна Смаленскай вобласці[9]. На тэрыторыі Бранскай вобласці, таксама ў басейне р. Іпуць, помнікі з матэрыяламі роменска-

[4] Археологическая карта России. Смоленская область. – Ч. 2. – С. 195.

[5] Дневник курганных раскопок. – С. 3.

[6] Археологическая карта России. Смоленская область. – Ч. 2. – С. 57.

[7] Тамсама. – Ч. 1. – С. 222.

[8] Тамсама. – Ч. 1. – С. 153–155, 157; Тамсама. – Ч. 2. – С. 211.

[9] Шмидт Е. А. Древнерусские археологические памятники Смоленской области. – Ч. 1. – С. 102, 106.



Мал. 1. Археалагічныя помнікі VIII–X стст.: *1* – Агаркава-1, 2; *2* – Агаркава-3; *3* – Антонаўка; *4* – Арэф'іна-1; *5* – Арэф'іна-2, 3; *6* – Асавік; *7* – Атраднае; *8* – Баршчэўшчына-1; *9* – Беларучча; *10* – Белкіна; *11* – Блінныя Кучы; *12* – Болатава; *13* – Борча; *14* – Буянава; *15* – Бярэзінка; *16* – Вішнякі; *17* – Варабейна; *18* – Варотніна; *19* – Вежкі; *20* – Вербаўка; *21* – Волжына-2; *22* – Выганічы; *23* – Вярхідава; *24* – Галубея; *25* – Ганіна; *26* – Ганіна; *27* – Ганіна-2; *28* – Гарадцы-1; *29* – Гарадцы-2; *30* – Гомель; *31* – Горыцы; *32* – Грышына Слабада; *33* – Дмітрава-2; *34* – Дубавец; *35* – Дубна; *36* – Дубосішча; *37* – Елаўцы; *38* – Загор'е-1; *39* – Загор'е-2; *40* – Зарэчнае; *41* – Знаніе; *42* – Іванікі; *43* – Кісловічы; *44* – Казарычы; *45* – Кветунь; *46* – Крастовая-1; *47* – Крастовая-2; *48* – Крычаў; *49* – Кушляншчына 2, 3; *50* – Кушляншчына-4; *51* – Лопазна-1; *52* – Лопазна-2; *53* – Лугавец; *54* – Макарава-4; *55* – Мглін; *56* – Мураўшчына; *57* – Ніжняе-5; *58* – Новый Дрокаў; *59* – Палужжа; *60* – Пасудзічы-5; *61* – Пасудзічы-6; *62* – Перагон; *63* – Пракопаўка-1; *64* – Рабчычы; *65* – Радуціна; *66* – Раманаўка; *67* – Рэкавічы; *68* – Рэкавічы-2; *69* – Рогава-3; *70* – Селішча; *71* – Слаўгарад; *72* – Слабада Глушыца; *73* – Случоўск-1; *74* – Случоўск-2; *75* – Случоўск-3; *76* – Смілава; *77* – Смяльч; *78* – Сож; *79* – Сопычы-1; *80* – Сопычы-2; *81* – Старадуб; *82* – Суворава; *83* – Сушкоўшчызна; *84* – Тварышчы; *85* – Трубчоўск; *86* – Уладзіміраўка; *87* – Уладзіміраўка-2; *88* – Усох; *89* – Фралова; *90* – Хатылёва-1; *91* – Хатылёва-5; *92* – Чавусы-1; *93* – Чавусы-2, 3, 4, 5; *94* – Чартанёва; *95* – Чачэрск; *96* – Шчарбакоўка; *97* – Юдзінава-9; *98* – Якаўлевічы-4

па тыпу вядомы каля вёсак Казарычы, Смяльч Гардзееўскага раёна, Знаніе Клімаўскага раёна, Закот, Лопазна, Н. Дрокаў Суражскага раёна, каля вёскі Пугаўка і ў г. Мглін Мглінскага раёна.

На Сярэднім Сожы роменскія паселішчы вядомы на паселішчы Баярскі Хутар каля в. Селішча Клімавіцкага раёна, на дзюне ў пойме левага берага р. Сож насупраць мікрараёна «Сож» у Крычаве, у саміх Клімавічах[10], на ўсходнім беразе воз. Святое каля в. Дубна Слаўгарадскага раёна Магілёўскай вобласці. Пахаванні па абрадзе трупаспалення з ляпнымі урнамі, упрыгожанымі арнаментам, выкананым палачкай, на якую быў наматаны шнур, знойдзены ў доўгіх курганах каля в. Елаўцы Хіславіцкага раёна Смаленскай вобласці[11]. На Падзясенні самыя паўночныя помнікі з роменскімі матэрыяламі вядомы каля в. Асавік і два селішчы каля в. Уладзіміраўка Рагнедзінскага раёна Брянскай вобласці[12].

Наогул роменская кераміка значна часцей сустракаецца на Ніжнім Пасожжы чым на Сярэднім Сожы. Кераміка з характэрным для гэтай культуры упрыгожаннем – штампам вяровачкі, наматанай на палачку, часцей сустракаецца на адкрытых паселішчах, размешчаных на поўдзень ад сучаснага Слаўгарада. На Дняпры курганны могільнік, у якім знойдзены посуд, што нагадвае па прафіліроўцы роменскую кераміку, вядомы каля в. Вараніно Быхаўскага раёна[13].

Аднак, у адрозненне ад паўднёвых паселішчаў роменскай культуры, паселішчы на Сярэднім Сожы невялікія па плошчы і вядомы пакуль толькі на левых прытоках Сожа. Левабярэжжа апошняга, верагодна, было своеасаблівай перыферыяй роменскага насельніцтва, куды дакатваліся толькі апошнія хвалі роменскай каланізацыі.

Такім чынам, мяжа на Пасожжы ў VIII–IX стст. паміж роменскім насельніцтвам і носьбітамі культуры смаленскіх доўгіх курганоў маркіруецца прыкладна па наступных апорных кропках: р. Дзясна (на поўнач ад в. Асавік) – уздоўж плыні р. Асцёр – Радамля – р. Дняпро.

Этнічная мяжа, якая склалася ў VIII–IX стст., захавалася на Пасожжы і ў больш позні час. Яна стала асновай для мяжы паміж радзімічамі і крывічамі ў IX–XIII стст., якая даволі добра маркіруецца з дапамогай курганных могільнікаў.

У міжрэччы Дняпра і Проні самы паўднёвы крывіцкі могільнік вядомы каля в. Прудок Шклоўскага раёна, дзе было знойдзена драцяное скроневае кольца[14]. Бліжэйшы ад яго курганны могільнік, у якім было знойдзена няпоўнае

---

[10] Поболь Л. Д. Археологические памятники Белоруссии. Железный век. – Минск: Наука и техника, 1983. – С. 404.

[11] Шмидт Е. А. Древнерусские археологические памятники Смоленской области. – Ч. 2. – С. 138, рис. 25.

[12] Археологическая карта России. Брянская область. – С. 197, 202.

[13] Соловьева Г. Ф. Памятники конца I тыс. н. э. в Верхнем Поднепровье // Древние славяне и их соседи. – МИА СССР, 1970. – № 176. – С. 98–102.

[14] Тамсама. – С. 99–100.

трупаспаленне, падобнае да летапіснага апісання радзіміцкага пахавальнага абраду, знойдзены Е. Р. Раманавым каля в. Гразівец Чавускага раёна[15].

На р. Проня крывіцка-радзіміцкае памежжа праходзіла недзе паміж сучаснай в. Карэбы Дрыбінскага раёна, дзе ў курганным могільніку І. А. Сербавым былі знойдзены крывіцкія дротазавязаныя скроневыя кольцы, і в. Радамля Чавускага раёна, дзе Я. Р. Раманавым у курганным могільніку былі знойдзены характэрныя для радзіміцкіх старажытнасцей языкападобныя прывескі і васьміпрамянёвая фібула[16].

Далей на ўсход крывіцка-радзіміцкая мяжа маркіруецца значна горш, што выклікана малой захаванасцю тут курганных могільнікаў альбо іх недаследаванасцю. Так, радзіміцкія курганы вядомы каля в. Бацвінаўка Крычаўскага раёна[17], дзе былі знойдзены сяміпрамянёвыя скроневыя кольцы, языкападобныя і петлепадобныя падвескі і інш.

Бліжэйшыя ад іх курганныя могільнікі з крывіцкімі этнавызначальнымі знаходкамі – скроневымі драцянымі кольцамі – знойдзены каля в. Дубейкава Мсціслаўскага раёна[18], каля в. Ст. Разанцы Мсціслаўскага раёна, прыкладна ў 7 км на паўночны ўсход ад Мсціслава, і каля в. Мазыкі Хіславіцкага раёна Смаленскай вобласці[19].

На поўдзень ад Мсціслава курганны могільнік са знаходкамі радзіміцкіх скроневых кольцаў вядомы каля былой в. Стракайлава Клімавіцкага ўезда на р. Асцёр[20]. Далей на ўсход у міжрэччы Сожа і Астра бясспрэчна радзіміцкія курганы не вядомы з-за слабай даследаванасці рэгіёна. Тут добра даследаваны толькі курганны могільнік каля в. Гнеўкава Шумяцкага раёна, але ён не даў бясспрэчных этнавызначальных артэфактаў. У той жа час у 12 з 36 даследаваных курганоў былі зафіксаваны магутныя зольныя праслойкі каля падэшвы, што набліжае іх да радзіміцкага пахавальнага абраду. Аднак сам В. В. Сядоў прызнаваў, што гэты рэгіён з'яўляецца кантактнай радзіміцка-крывіцкай зонай, і не змог даць вызначэнне этнасу, які пакінуў курганны могільнік[21].

---

[15] Романов Е. Р. Археологические разведки в Могилевской губернии // Записки Северо-Западного отделения Императорского русского географического общества. – 1912. – Кн. 3. – С. 29–30.

[16] Сербаў І. А. Археалагічныя абследаванні ў вадазборах рэк Проні – Ухлясьці. – С. 240; Романов Е. Р. Две археологические разведки // Могилевская старина. – Вып. 3. – Могилев, 1903. – С. 125.

[17] Мельникова Н. М. Курганы у дер. Ботвиновка Кричевского района Могилевской области // Материалы 5-й регион. археол. студ. конф. вузов Северо-Запада и центральных областей СССР. – Могилев, 1975. – С. 84–86.

[18] Романов Е. Р. Отчет о раскопках у д. Боровец, близ Костюкович, Дубейкове и Голеевке // Архіў ІГМК РАН. – Ф. 1. – Адз. зах. 33 (1890 г.). – Арк. 54–57.

[19] Фурсов М. В. Дневник курганных раскопок. – С. 30; Спицын А. А. Обозрение некоторых губерний и областей России в археологическом отношении. – С. 114.

[20] Фурсов М. В. Дневник курганных раскопок. – С. 27; Спицын А. А. Обозрение некоторых губерний и областей России в археологическом отношении. – С. 122.

[21] Седов В. В. Раскопки курганов в Верхнем Поднепровье // КСИА. – 1972. – Вып. 129. – С. 54–60.

Далей на паўночны ўсход могільнік са знаходкамі крывіцкіх скроневых кольцаў вядомы каля в. Калпеніца (Дзерабуж) на р. Асцёр[22]. Выходзячы з гэтага, усходнюю мяжу радзіміцкай тэрыторыі, верагодна, трэба шукаць на захад ад в. Калпеніца, прыкладна ўздоўж плыні сожскай Бярэзіны.

Вярхоўі Іпуці крывічы асвойвалі разам з радзімічамі. Тут курганныя могільнікі са змешаным інвентаром, як крывіцкім, так і радзіміцкім, вядомы каля вёсак Сукромля, Пільня, Кузьмічы. Самай усходняй кропкай, дзе сустракаюцца радзіміцкія этнавызначальныя знаходкі, у міжрэччы рр. Іпуці і Дзясны з'яўляецца курганны могільнік каля в. Пекліна на р. Бялізна (правы прыток р. Дзясна)[23]. Але, як і ў выпадку са знаходкамі з Калпеніцы, скроневыя кольцы з Пекліна па сваім тыпе бліжэй да вяціцкіх.

У вярхоўях р. Беседзь вядомы і курганныя могільнікі з крывіцкімі пахаваннямі. Так, драцяныя срэбраныя скроневыя кольцы знойдзены ў кургане № 34 пад Хоцімскам[24], а на ўсход ад яго, на р. Іпуць каля в. Слабада, вядомы чыста радзіміцкі могільнік[25]. Таму асноўны аб'ём радзіміцкай тэрыторыі трэба праводзіць на захад ад в. Пекліна, магчыма ў басейне р. Іпуць. Радзіміцка-сеняранскае памежжа даволі добра вызначана Е. А. Шынаковым[26], і нам застаецца толькі пагадзіцца з ім.

Такім чынам, Сярэдняе і Верхняе Пасожжа было ў IX–XIII стст. раёнам, які актыўна асвойвалі крывічы і радзімічы. Першыя засялялі Верхняе Пасожжа, што прылягала да Дняпра, а радзімічы – сярэднюю і ніжню плынь р. Сож.

Безумоўна, у XI–XIII стст. на гэтых землях ішоў працэс нівеліроўкі племянных адрозненняў, і ў XIII–XV стст. гэтыя працэсы ўжо завяршыліся. Аднак пахавальныя помнікі XIII–XV стст. у рэгіёне нашага даследавання пакуль не вядомыя і археалагічна гэта не пацвярджаецца.

2.2. Сістэма сельскага рассялення на Сярэднім Пасожжы ў X–XIII стст.

Сістэма сельскага рассялення ў Сярэднявеччы на тэрыторыі Пасожжа пакуль не з'яўлялася прадметам спецыяльнага даследавання, хаця абсалютная большасць сярэднявечнага насельніцтва гэтага рэгіёна, як і ўсёй Старажытнай Русі, пражывала ў сельскай мясцовасці.

Гісторыя сельскіх паселішчаў IX–XIII стст. на тэрыторыі Усходняй Еўропы пачала прыцягваць увагу даследчыкаў пасля серыі публікацый, прыс-

---

[22] Ляўданскі А. М. Археалагічныя досьледы у Смаленшчыне. – С. 11–13.

[23] Тамсама. – С. 19–24; Шинаков Е. А., Гурьянов В. Н. Русско-радимичское пограничье середины X – середины XII вв.: природно-географический аспект // ГАЗ. – Мінск, 1994. – № 3. – С. 261.

[24] Фурсов М. В. Дневник курганных раскопок. – С. 23.

[25] Равдина Т. В., Сабурова М. А. Исследования курганов в Смоленской области // АО 1971 года. – М.: Наука, 1972. – С. 98–99.

[26] Шинаков Е. А. Русско-радимичское пограничье. – С. 248–273.

вечаных сельскім паселішчам Смаленскай зямлі, В. В. Сядова, зробленай ім ў канцы 50-х – пачатку 60-х гадоў XX ст.[27]

На тэрыторыі Беларусі першыя даследаванні па гэтай праблематыцы былі зроблены ў 70-я гады XX ст. Я. Р. Рыерам[28], і хаця гэта тэматыка час ад часу прыцягвае ўвагу даследчыкаў[29], сістэмны падыход у даследаванні сельскіх паселішчаў X–XIII стст. на Беларусі пакуль адсутнічае. Выключэнне складаюць толькі наваколлі Мінска і Полацка, ніжняе Пасожжа, дзе ў апошнія гады работы па вывучэнні сельскіх паселішчаў актывізавалі Ю. А. Заяц, М. В. Клімаў і А. А. Макушнікаў[30].

Сельскія ж паселішчы Сярэдняга і Верхняга Пасожжа на сённяшні дзень амаль не вывучаны. Выключэнне складае толькі паселішча каля г. Чавусы, даследаванае ў канцы XX ст. Я. Р. Рыерам. Фактычна, на гэтай тэрыторыі

---

[27] Седов В. В. Археолог. разведки древнерусской деревни в Смоленской области // Краткие сообщ. ин-та материальной культуры Акад. наук СССР. – М.: Изд-во АН СССР, 1959. – № 68.– С. 104–116; Яго ж. Сельские поселения центральных районов Смоленской земли (VIII–XV вв.) // МИА СССР. – 1960. – № 92. – 156 с.; Яго ж. К исторической географии Смоленской области // МИСО. – Смоленск. – 1961. – Вып. 4. – С. 317–347.

[28] Риер Я. Г. Феодальная деревня в Могилевском Поднепровье в X–XIII вв.: автореф. дис. … канд. ист. наук. – Вильнюс, 1979. – 28 с.; Яго ж. Характер размещения сельского населения. – С. 107–118; Яго ж. Некоторые вопросы развития феодальной деревни. – С. 137–144; Яго ж. Природная среда и система сельского расселения. – С. 50–55; Яго ж. Вясковае паселішча. – С. 202–227.

[29] Иов О. В. Сельские поселения IX–XIII вв. западной части Белорусского Полесья: автореф. дис. … канд. ист. наук. – Минск, 1991. – 22 с.; Кошман В. І. Паселішчы міжрэчча Бярэзіны і Дняпра ў X–XIII стст. – Мінск: Беларус. навука, 2008. – 281 с.; Шаблюк В. У. Сельскія паселішчы Верхняга Панямоння XIV–XVIII стст. – Мінск: Навука і тэхніка, 1996. – 119 с.

[30] Заяц Ю. А. Сельские поселения IX—XIII вв. на р. Лошица // Древнерусская деревня. Археологическое исследование микрорегионов: тез. докл. – М.: 1991. – С. 20–21; Яго ж. К вопросу о сельском населении Изяславского удела Полоцкой земли X–XII вв. // Час, помнікі, людзі. Памяці рэпрасаваных археолагаў. Тэз. дакл. міжнар. канф. Мінск, 27–30 кастр. 1993 г. – Мінск, 1993. – С. 50–53; Яго ж. Паселішча X–XIII стст. каля в. Дружба (Рылаўшчына) // ГАЗ. – Мінск, 1994. – № 3. – С. 132–147; Яго ж. Эволюция системы расселения в центральной Белоруссии в X–XVIII вв. (на примере Лошицкого микрорегиона) // Проблемы археологии и древней истории Верхнего Поднепровья и соседних территорий. Междунар. науч. конф. 30 января – 1 февраля 2002 г. – Могилев: Изд-во Могил. ун-та, 2002. – С. 193–201; Макушников О. А. Поселение второй половины I тыс. н. э. близ д. Носовичи в нижнем Посожье // ГАЗ. – Мінск, 1994. – № 5. – С. 227–237; Яго ж. Восточнославянский горизонт селища Нисимковичи-2 в Посожье // ГАЗ. – Мінск, 2002. – № 17. – С. 165–174; Яго ж. Могільнік Нісімкавічы-1 каля Чачэрска (Археалагічны каментарый да летапісных звестак пра пахавальны абрад радзімічаў) // З глыбі вякоў. Наш край. Гіст.-культуралаг. зб. № 1. – Мінск: Навука і тэхніка, 1996. – С. 168–187; Яго ж. Средневековое поселение и могильник Нисимковичи-1 в Посожье // ГАЗ. – Мінск, 1999. – № 14. – С. 139–146; Клімаў М. В. Сярэднявечны культавы помнік Заскаркі ў наваколлях г. Полацка // ГАЗ. – Мінск, 2002. – № 17. – С. 218–224; Яго ж. Даследаванне курганоў каля в. Заскаркі на Полаччыне (асаблівасці пахавальнай абраднасці) // МАБ. – Мінск, 2003. – № 6. – С. 130–136; Яго ж. Вясковыя паселішчы ў акрузе Полацка X – сярэдзіны XVIII ст.: аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук. – Мінск, 2005. – 20 с.

толькі пачынаецца збор матэрыялаў для картаграфіі помнікаў і пошукі перспектыўных паселішчаў для даследаванняў, што знайшло адлюстраванне ў выдадзеных шматлікіх археалагічных картах. Тым не менш, карыстаючыся нават той невялікай інфармацыяй, якая ў нас ёсць, паспрабуем разгледзець сістэму засялення Сярэдняга Пасожжа і рассялення сельскага насельніцтва ў рэгіёне нашага даследавання ў IX–XIII стст.

Сельскія паселішчы прадстаўлены помнікамі рознага тыпу – курганнымі могільнікамі і паселішчамі. Апошнія, у сваю чаргу, падзяляюцца на два віды: паселішчы на гарадзішчах і адкрытыя селішчы.

На тэрыторыі даследавання вядомы 615 комплексаў помнікаў археалогіі, якія адносяцца да сельскіх паселішчаў. Яны прадстаўлены 41 гарадзішчам, якія маюць таксама 102 селішчы і 583 курганныя могільнікі (мал. 2). Каля гарадзішчаў знаходзяцца 10 селішчаў і 15 курганных могільнікаў. Акрамя таго, амаль каля 46 селішчаў знаходзяцца курганныя могільнікі. Астатнія селішчы і курганныя могільнікі складаюць самастойныя помнікі. Некаторыя даследчыкі выходзяць з гіпотэзы, што кожная курганная група адпавядае асобнаму паселішчу. Аднак на самай справе даволі часта сённяшнія курганныя групы, размешчаныя адна ад другой на адлегласці ў сто метраў, з'яўляюцца рэшткамі аднаго разарванага вялікага курганнага могільніка, які належаў аднаму селішчу. Таму такія курганныя могільнікі мы класіфікуем як адзін.

Суадносіны паміж паселішчамі і курганнымі могільнікамі ў рэгіёне даследавання складаюць 1:4. У Заходнім Палессі гэтыя суадносіны складаюць 1:1,4, у Маскоўскай зямлі – 1:3,4. Нашы суадносіны ў пэўнай ступені адпавядаюць «нормам» суседніх зямель, але не складаюць «раўнамернага каркаса» паміж паселішчамі і курганнымі могільнікамі на мясцовасці. Справа тут у тым, што колькасць выяўленых курганных могільнікаў і паселішчаў знаходзіцца ў прамой залежнасці ад ступені абследавання тэрыторыі і ўключэння зямель ў гаспадарчую дзейнасць.

Аналіз размяшчэння помнікаў археалогіі IX–XIII стст. у прасторы не дазваляе пакуль вылучыць тут асобныя мікрарэгіёны, для якіх былі б характэрны пэўныя рысы, якія адрозніваюць адзін рэгіён ад другога. Выключэннямі з'яўляюцца толькі поймы вялікіх рэк – Сожа, Іпуці, Проні, Астра і Беседзі, дзе ў асноўным сустракаюцца неўмацаваныя паселішчы: курганныя могільнікі і гарадзішчы тут не вядомы. Некалькі лепш назіраецца адрозненне сістэмы размяшчэння помнікаў археалогіі ў залежнасці ад часу іх узнікнення.

Найбольш раннія ўмацаваныя паселішчы, на якіх сустракаецца роменская кераміка, на Сярэднім Пасожжы вядомы ў гарадах Мглін, Слаўгарад, каля вёсак Лопазна (2 гарадзішчы), Новы Дрокаў. Яны невялікія па памерах. Іх плошча, як правіла, не перавышае 0,5 га, і размешчаны яны на высокіх, карэнных берагах рэк (мал. 1).



■ – гарадзішча; ▲ – курган; ✚ – гарадзішча і курган; ◆ – селішча; ● – гарадзішча і селішча

Мал. 2. Археалагічныя помнікі X–XIII стст. у паўднёва-заходніх раёнах Смаленскай зямлі: *1* – Абідавічы-1; *2* – Абідавічы-2; *3* – Агееўка; *4* – Ажогі; *5* – Акулічы-1; *6* – Акулічы-2; *7* – Алёнаўка; *8* – Алень-1, 2; *9* – Аляксандраўка-2; *10* – Аляксееўка; *11* – Анікавічы; *12* – Ардаць-1; *13* – Ардаць-2; *14* – Ардаць-3; *15* – Арлоўка; *16* – Арцюхаў; *17* – Асавік-1; *18* – Асавік-2, 3; *19* – Асецішча; *20* – Асмаловічы; *21* – Асталопава; *22* – Аўсянікі; *23* – Бабрынец-1; *24* – Бабрынец-2; *25* – Багданава; *26* – Баравая; *27* – Барадзіно; *28* – Бардзінічы Вялікія; *29* – Баркавічы-1; *30* – Баркавічы-2; *31* – Бароўка; *32* – Барсукоўка; *33* – Барысавічы; *34* – Барышэўка; *35* – Батаева; *36* – Батураўка-1; *37* – Батураўка-2; *38* – Батураўка-3; *39* – Бахава; *40* – Баханы-1; *41* – Баханы-2; *42* – Баханы-3; *43* – Бацвінаўка-1; *44* – Бацвінаўка-2; *45* – Бацвінаўка-3; *46* – Бацвінаўка-4; *47* – Бацвінаўка-5; *48* – Баяры; *49* – Бедня; *50* – Беліца; *51* – Белагорш; *52* – Белая Дуброва-1; *53* – Белая Дуброва-2; *54* – Бель; *55* – Берлявец; *56* – Бехава; *57* – Бірулі-1; *58* – Бірулі-2; *59* – Блінныя Кучы-1; *60* – Блінныя Кучы-2; *61* – Блудзімля-1; *62* – Блудзімля-2; *63* – Брацькавічы-1; *64* – Брацькавічы-2; *65* – Бруёўка; *66* – Брылі-1; *67* – Брылі-2; *68* – Буглаі-1; *69* – Буглаі-2; *70* – Будлаўка; *71* – Бухаўка; *72* – Буянава; *73* – Буянава-1; *74* – Буянава-2; *75* – Буянава-3; *76* – Бязуевічы; *77* – Бялынкавічы-1; *78* – Бялынкавічы-2; *79* – Бялынкавічы-3; *80* – Бярозаўка-1; *81* – Бярозаўка-2; *82* – Бярозкі-1; *83* – Бярозкі-2; *84* – Бярэзіна; *85* – Бяседавічы; *86* – Бяседка-1; *87* – Бяседка-2; *88* – В. Лызкі; *89* – В. Славені; *90* – Валынеж; *91* – Валькава; *92* – Варашылава; *93* – Вародзькаў-1; *94* – Ва-

родзькаў-2; *95* – Вародзькаў-3; *96* – Вародзькаў-4; *97* – Вароніна; *98* – Васілёўка; *99* – Васільева; *100* – Васькаўка; *101* – Васькавічы-1; *102* – Васькавічы-2; *103* – Васькава-1; *104* – Васькава-2; *105* – Вохар; *106* – Верхлічы; *107* – Ветранка-1; *108* – Ветранка-2; *109* – Вець-1; *110* – Вець-2; *111* – Відуйцы-1; *112* – Відуйцы-2; *113* – Вішанскі; *114* – Волкава; *115* – Волчкавічы; *116* – Воранаўка; *117* – Ворміна-1; *118* – Ворміна-2; *119* – Ворміна-3; *120* – Востраў; *121* – Воўчас-1; *122* – Воўчас-2; *123* – Вушакі-1; *124* – Вушакі-2; *125* – Вушакі-3; *126* – Вушакі-4; *127* – Выдранка-1; *128* – Выдранка-3; *129* – Высокі Барок; *130* – Высокае; *131* – Высокае; *132* – Высокаселішча; *133* – Высокая Буда; *134* – Высокая Слабада; *135* – Вядзернікі; *136* – Вязаўск; *137* – Вялікі Бор; *138* – Вялікія Хутары; *139* – Вярба; *140* – Гайшын-1; *141* – Гайшын-2; *142* – Галічы; *143* – Галуны; 144 – Гараватка; 145 – Гарадзішча; 146 – Гарадзішча; 147 – Гарадзішча-1; 148 – Гарадзішча-2; *149* – Гарадзец-1; *150* – Гарадзец-1, 2; *151* – Гарадзец-2; *152* – Гарадзец-3; *153* – Гарадок; *154* – Гарадок; *155* – Гарадок-1; *156* – Гарадок-2; *157* – Гараны; *158* – Гарэзна; *159* – Гарэнава; *160* – Гаравец; *161* – Гацішча; *162* – Гіжэнка; *163* – Глінькава; *164* – Глебава; *165* – Глухары; *166* – Глушнева; *167* – Гнеўкава; *168* – Горбава-1; *169* – Горбава-2; *170* – Горкі; *171* – Горкі; *172* – Горкі; *173* – Грабалава; *174* – Гразівец; *175* – Гразівец; *176* – Грамабой; *177* – Гронаў; *178* – Губеншчына-1; *179* – Губеншчына-2; *180* – Гулькі; *181* – Гуры; *182* – Гусарка; *183* – Дабранка 1, 2, 3; *184* – Дабраносавічы 2–5; *185* – Дабраносавічы-1; *186* – Далматава; *187* – Далотня; *188* – Дамарацкае; *189* – Данілаўка; *190* – Дарошкаўка; *191* – Дзягавічы-1; *192* – Дзягавічы-2; *193* – Дзягцяроўка-1; *194* – Дзягцяроўка-2; *195* – Дзяражня; *196* – Дзяремна; *197* – Дзярнава; *198* – Дмінічы; *199* – Добрая; *200* – Добрынь; *201* – Дравенава; *202* – Дубейкава; *203* – Дубна; *204* – Дубна; *205* – Дубовіца; *206* – Дубраўка; *207* – Дубраўка-2; *208* – Дубраўка-1; *209* – Дубраўка-2; *210* – Дубровіца; *211* – Дужаўка; *212* – Елізавеціна; *213* – Елаўцы-1; *214* – Елаўцы-2; *215* – Елавец; 216 – Епішава-1; *217* – Епішава-2; 218 – Ершычы; *219* – Еўдакімавічы; *220* – Жадунька; *221* – Жаліжжа; *222* – Жасткова; *223* – Жаўнец; *224* – Жудзілава-1; *225* – Жудзілава-2; *226* – Жукава; *227* – Журавель; *228* – Жытнёў; *229* – Забалацце; *230* – Забор'е-1; *231* – Забор'е-2; *232* – Забор'е-3; *233* – Забялышчын; *234* – Завад-Віравая; *235* – Завод-Карэцкі-3; *236* – Завод-Карэцкі-1, 2; *237* – Закот-1; *238* – Закот-2; *239* – Заплоскае; *240* – Зароўе; *241* – Зарэчча-1; *242* – Зарэчча-2; *243* – Заходы; *244* – Звяровічы; *245* – Зімніцы 1–4; *246* – Зімоніна; *247* – Зуі; *248* – Зубаўка; *249* – Іванаўка; *250* – Іванаўск; *251* – Івенская Струга; *252* – Ігнатаўка; *253* – Ілюхіна-1; *254* – Ілюхіна-2; *255* – Іскань; *256* – Казакоўка; *257* – Казарычы-1; *258* – Казарычы-2; *259* – Казарычы-3; *260* – Казлоўка; *261* – Казлова; *262* – Казлы; *263* – Калесішча; *264* – Калеснікі; *265* – Калодзецкая; *266* – Калодліва-1; *267* – Калодліва-2; *268* – Калодліва-3; *269* – Калпяніца-1; *270* – Калпяніца-2; *271* – Калышкіна-1; *272* – Калышкіна-2; *273* – Камаравічы; *274* – Камароўка; *275* – Каменка; *276* – Каменка; *277* – Каменск; *278* – Камянец-1, 2, 3, 4; *279* – Канічы; *280* – Канахоўка; *281* – Кандратаўск; *282* – Канчынка-1; *283* – Канчынка-2, 3; *284* – Канята; *285* – Каракавічы; *286* – Карасі; *287* – Карзова; *288* – Карма Доўгая; *289* – Карма-Пайкі; 290 – Каролішкі; 291 – Кароўчына-1; *292* – Кароўчына-2; *293* – Карэбы; *294* – Кастыры; *295* – Касцюкоўка; *296* – Касцюкоўка; *297* – Касцюковічы; *298* – Касцюшкава; *299* – Касцюшкава (Трыгубава); *300* – Каталіна-1; *301* – Каталіна-2; *302* – Каханаў; *303* – Каханы; *304* – Кашаны; *305* – Кашкаўка-1; *306* – Кашкаўка-2; *307* – Кісловічы; *308* – Кісялёўка; *309* – Кішчыцы; *310* – Клімавічы-1; *311* – Клімавічы-2; *312* – Клетня; *313* – Клеявічы-1; *314* – Клеявічы-2; *315* – Клюкіна; *316* – Клясіна; *317* – Княжычы; *318* – Княцёўка; *319* – Копысь; *320* – Корсікі-1; *321* – Корсікі-2; *322* – Корсікі-3; *323* – Косічы-1; *324* – Косічы-2; *325* – Коскі; *326* – Крамянка-1; *327* – Крамянка-2; *328* – Крапівенскі; *329* – Крапіўнае; *330* – Красавічы-1; *331* – Красавічы-2; *332* – Красавічы-3; *333* – Краснавічы; *334* – Краснае; *335* – Краснаполле-1; *336* – Краснаполле-2; *337* – Краснополле; *338* – Красны Бераг; *339* – Красны Бор-1; *340* – Красны Бор-2; *341* – Красны Бор-3; *342* – Крупец; *343* – Крупец; *344* – Крутая; *345* – Крывалес; *346* – Крыжовая-1; *347* – Крыжовая-2; *348* – Крыжовая-3; *349* – Крыксіна-1; *350* – Крыксіна-2; *351* – Крычаў-1; *352* – Крычаў-2; *353* – Крычаў-3; *354* – Крычаўскі-1; *355* – Крычаўскі-2; *356* – Крычаўскі-3; *357* – Кубракоўка; *358* – Кузькавічы; *359* – Кузьмічы-1; *360* – Кузьмічы-2; *361* – Куляшоўка; *362* – Курганаўка; *363* – Курганава; *364* – Курганне; *365* – Куршчына; *366* – Лабковічы; *367* – Ладыжына; *368* – Латавінава-1; *369* – Латавінава-2; *370* – Латакі; *371* – Леніна; *372* – Летошкіна-1, 2; *373* – Ліпаўка; *374* – Літоўні-1; *375* – Літоўні-2; *376* – Ломня; *377* – Лугаўка;

378 – Лукінічы; *379* – Лукавіца; *380* – Любаўка 1-3; *381* – Любошна-1, 2, 3, 4; *382* – Лютня; *383* – Ляды; *384* – Лялічы-1; *385* – Лялічы-2; *386* – Ляўки; *387* – Ляўкова; *388* – Ляцягі; *389* – Ляшчанка; *390* – М. Азобічы 1, 2; *391* – М. Крапіўна; *392* – М. Сліжы; *393* – Мазалава-1; *394* – Мазалава-2; *395* – Мазыкі; *396* – Макарава; *397* – Макеевічы; *398* – Малашкавічы-1; *399* – Малашкавічы-2; *400* – Маляцічы; *401* – Манькава; *402* – Мар'еўка; *403* – Маркаўка; *404* – Мартынаўка; *405* – Масліна; *406* – Маслакі; *407* – Махі; *408* – Машавое; *409* – Мглін; *410* – Мерліна; *411* – Мікіцічы; *412* – Мікалаеўка; *413* – Мікалаеўка-1; *414* – Мікалаеўка-2; *415* – Мікулічы; *416* – Мілейкава-1; *417* – Мілейкава-2; *418* – Міхалін; *419* – Мончына; *420* – Мсціслаў; *421* – Мужынава-1; *422* – Мужынава-2; *423* – Муравіль; *424* – Муравец-1; *425* – Муравец-2; *426* – Мхінічы-1; *427* – Мхінічы-2; *428* – Мхінічы-3; *429* – Мышкавічы; *430* – Мядзведаўка; *431* – Мядзведаўка; *432* – Мядзведаўка; *433* – Мялоўка; *434* – Н. Вараб'ёва; *435* – Н. Віхраны; *436* – Н. Гацькава; *437* – Н. Заселле; *438* – Н. Заселле-1; *439* – Н. Заселле-2; *440* – Н. Заселле-3; *441* – Н. Стайкі; *442* – Н. Харанёва-1; *443* – Н. Харанёва-2; *444* – Н. Харанёва-3; *445* – Набат-1, 2; *446* – Навасёлкі; *447* – Навасёлкі-1; *448* – Навасёлкі-2, 3; *449* – Надва-1; *450* – Надва-2; *451* – Наноскава-1; *452* – Наноскава-2; *453* – Наркіна; *454* – Нежкава; *455* – Ніўнае-1; *456* – Ніўнае-2; *457* – Ніўнае-3; *458* – Нівішчы; *459* – Ніжнія Каракавічы; *460* – Нічыпаравічы; *461* – Новарыгораўка; *462* – Новая Ельня; *463* – Новая Рудня; *464* – Новы Свет; 465 – Новыя Дамамерычы; *466* – Нядашава; *467* – Нярадаўка; *468* – Орша; *469* – Пагуляеўка; *470* – Падгарадок; *471* – Пожар; *472* – Паклады-1; *473* – Паклады-2; *474* – Паклады-3; *475* – Палавітня-1; *476* – Палавітня-2; *477* – Палом; *478* – Паломка; *479* – Палуж-1; *480* – Палуж-2; *481* – Палушкіна; *482* – Палянінавічы-1; *483* – Палянінавічы-2; *484* – Паляшчыцы; *485* – Памазоўка-1; *486* – Памазоўка-2; *487* – Памазоўка-3; *488* – Панябель; *489* – Папаратная; *490* – Папляціна; *491* – Паршына; *492* – Паўлаўка; *493* – Пачапы; *494* – Пачынічы; *495* – Пекліна; *496* – Перакладавічы; *497* – Перапечына-1; *498* – Перапечына-2; *499* – Перапечына-3; *500* – Першае Мая; *501* – Першамайскі; *502* – Печанеж; *503* – Пільня; *504* – Пільня; *505* – Плешчыцы; *506* – Пнева; *507* – Пнеўшчына; *508* – Полна-1, 2; *509* – Полна-3; *510* – Полшына; *511* – Прудок; 512 – Пруды-1; 513 – Пруды-2; 514 – Прыбярэжжа-1–3; 515 – Прыгоры; 516 – Прылепаўка; *517* – Прылепаўка; *518* – Прыселле; *519* – Прышча; *520* – Прэабражэнск-1; *521* – Прэабражэнск-2; *522* – Пудоўня; *523* – Пустасёл; *524* – Пусты Асавец-1, 2; *525* – Пясчанка-1; *526* – Пясчанка-2; *527* – Пятровічы; *528* – Пятухоўка; *529* – Пячары; *530* – Пячкоўка; *531* – Рабовічы; *532* – Рагайлава; *533* – Рагозінка; *534* – Радамля; *535* – Радзілева; *536* – Радзічы-1, 2; *537* – Радзічы-3; *538* – Радзькаў; *539* – Разанцы-1; *540* – Разанцы-2; *541* – Разрытая; *542* – Рай; *543* – Ракаўка; *544* – Раманаўка; *545* – Расна; *546* – Расуха-1; *547* – Расуха-2; *548* – Ржавец; *549* – Рогава; *550* – Рослаўль; *551* – Роськаў; *552* – Рудзіцы; *553* – Рудня-1; *554* – Рудня-2–5; *555* – Рухава-1; *556* – Рухава-2; *557* – Рухава-3; *558* – Рухань; *559* – Рыгор'ева; *560* – Рысін; *561* – Рэвут; *562* – Рэкавічы-1; *563* – Рэкавічы-2; *564* – Рэкта; *565* – Рэпішча; *566* – Сабалі; *567* – Сабалёва; *568* – Савінічы; *569* – Сакольнічы; *570* – Самалюбава; *571* – Саматэвічы; *572* – Саўгас; *573* – Сафіеўка; *574* – Свірыдаўка-1; *575* – Свірыдаўка-2; *576* – Свякроўшчына-1; *577* – Свякроўшчына-2; *578* – Селішча; *579* – Селішча; *580* – Селішча-1; *581* – Селішча-2; *582* – Серкаўка-1; *583* – Серкаўка-2; *584* – Сідараўка; *585* – Сідаравічы; *586* – Сілічы; *587* – Сінеж; *588* – Скалін; *589* – Скраплёва; *590* – Слабада; *591* – Слабодка; *592* – Слабодка; *593* – Слаўгарад-1; *594* – Слаўгарад-2; *595* – Слаўгарад-3; *596* – Слаўгарад-4; *597* – Смілава-1; *598* – Смілава-2; *599* – Смяльч-1; *600* – Смяльч-2; *601* – Смяльч-3; *602* – Смяльч-4; *603* – Смяльч-5; *604* – Смятанка; *605* – Снягіроўка; *606* – Ст. Дрокаў; *607* – Ст. Дрокаў-2; *608* – Ст. Каменка; *609* – Ст. Крупец; *610* – Ст. Курганне; *611* – Ст. Мілееўка; *612* – Ст. Сыракаренне; *613* – Ст. Трасна; *614* – Ст. Фамінічы; *615* – Ст. Чашуйкі; *616* – Стабаршчына-1; *617* – Стабаршчына-2; *618* – Стайкі; *619* – Стараселле; *620* – Стараселле; *621* – Стараселле; *622* – Стараселле-1; *623* – Стараселле-2; *624* – Старшэўка; *625* – Стары Дзедзін-1; *626* – Стары Дзедзін-2; *627* – Студзянец; *628* – Студзянец; *629* – Субараўка; *630* – Сукромля-1; *631* – Сукромля-2; *632* – Сцяпанкова; *633* – Сялілавічы; *634* – Сялец; *635* – Сялец; *636* – Сялец; *637* – Сялец-1; *638* – Сялец-2; *639* – Сялецкае; *640* – Сямёнаўка; *641* – Тарасаўка; *642* – Трасціно-1; *643* – Трасціно-2; *644* – Тросна-Івакі-1; *645* – Тросна-Івакі-2; *646* – Тросна-Ісаева-1; *647* – Тросна-Ісаева-2; *648* – Тупічын; *649* – Тур'е; *650* – Тур'я; *651* – Туравец-1, 2; *652* – Удзел; *653* – Ужжар; *654* – Уладзіміраўка-1; *655* – Уладзіміраўка-2; *656* – Усполле; *657* – Усход; *658* – Усцінавічы; *659* –

Фёдараўка; *660* – Фралова-1; *661* – Фралова-2; *662* – Фядотава Буда; *663* – Халмы; *664* – Хармынка; *665* – Харычы; *666* – Хатовіж-1; *667* – Хатовіж-2; *668* – Хатовіж-3; *669* – Хатовіж-4; *670* – Хацень; *671* – Хацяны; *672* – Хачынка-1; *673* – Хачынка-2; *674* – Хвойна; *675* – Хіславічы-1; *676* – Хіславічы-2; *677* – Ходунь-1; *678* – Ходунь-2; *679* – Хоцімск; *680* – Цілевічы; *681* – Цімманава-1; *682* – Цімманава-2; *683* – Цінькова; *684* – Цітаўка; *685* – Ціхая Прыстань-1, 2; *686* – Ціхіл; *687* – Цюніна; *688* – Чавусы; *689* – Чавусы-2, 3; *690* – Чавусы-4; *691* – Чавусы-5; *692* – Чальцава; *693* – Чарнілава; *694* – Чарнёўка; *695* – Чарнаўцы; *696* – Чарняўка; *697* – Чартаўшчына; *698* – Чарэпы; *699* – Чурылава; *700* – Чыжы; *701* – Чырвоная Гара; *702* – Чырвоная Слабада; *703* – Чырвоная Слабада; *704* – Чырвоная Слабада-1; *705* – Чырвоная Слабада-2; *706* – Чэпішчава 1–3; *707* – Шаўнева; *708* – Шпачча; *709* – Штаб-Загусіна; *710* – Шчаглоўка; *711* – Шчодрын; *712* – Шылаў Вугал; *713* – Шылы; *714* – Шыркі; *715* – Шэпет-1; *716* – Шэпет-2; *717* – Юны Пахар; *718* – Ягораўка-1; *719* – Ягораўка-2; *720* – Ярмоліна; *721* – Ярцаўка; *722* – Горы

Нешматлікасць неўмацаваных помнікаў з роменскай керамікай у рэгіёне даследавання і іх слабая вывучанасць (невялікія стацыянарныя даследаванні праводзіліся толькі ў Слаўгарадзе) не дазваляюць пакуль прасачыць іх узаемасувязь з умацаванымі паселішчамі. Аднак апошнія, верагодна, можна разглядаць у якасці абшчынных цэнтраў, апорных пунктаў каланізацыі рэгіёна, якія паступова пераўтвараліся ў нейкі канцэнтруючы вузел акругі[31].

Абследаваныя помнікі характарызуюцца адносна вялікай плошчай: звычайна кераміка сустракаецца на плошчы больш за 1 га, але магутнасць культурнага слоя на іх не перавышае 0,3–0,4 м. На асобных паселішчах прасочваюцца сляды паўзямлянак – паселішча каля в. Крастовая Ершыцкага раёна і на дзюне ў пойме р. Сож каля Крычава.

Падобная ж карціна прасочваецца і адносна паселішчаў носьбітаў культуры смаленскіх доўгіх курганоў на Пасожжы. Плошча найбольш ранніх паселішчаў гэтай культуры таксама дасягае 1,2–1,4 га пры магутнасці слоя да 0,4–0,5 м.

У размяшчэнні ўсіх гэтых неўмацаваных паселішчаў прасочваецца адзіная для іх заканамернасць. Усе яны размешчаны альбо на дзюне ў пойме ракі, альбо на першай надпойменнай тэрасе, звычайна на нізкім беразе вялікіх рэк, блізка да вады. Апошняе сведчыць пра тое, што ў IX–X стст. гідралагічны рэжым Пасожжа некалькі адрозніваўся ад сучаснага. Рэкі былі менш паўнаводнымі, і нават веснавыя паводкі не перашкаджалі размяшчэнню паселішчаў у сучасных поймах рэк. Разам з тым размяшчэнне найбольш ранніх помнікаў на буйных рэках рэгіёна сведчыць пра пэўную «лінейнасць» у сістэме рассялення, калі першапачатковая хваля роменскага насельніцтва перамяшчалася па Пасожжы па галоўных рэках – Сожы, Іпуці, магчыма Беседзі. У той жа час, улічваючы вялікую колькасць роменскіх паселішчаў на Падзясенні, нельга выключыць, што адтуль, з паўднёвага захаду, па малых рэках таксама ішла

[31] Риер Я. Г. Восточнославянские городища как источник по изучению становления средневекового общества // Проблемы археологии и древней истории Верхнего Поднепровья и соседних территорий. Междунар. конф., 30 января – 1 февраля 2002 г. Доклады и сообщения. – Могилев, 2002. – С. 136–144.

хваля пранікнення новага насельніцтва на Пасожжа. Невялікая колькасць выяўленых паселішчаў IX–X стст. на сярэднім Сожы ў цэлым адпавядае той прапорцыі сельскіх паселішчаў IX–XIV стст., якая была зафіксавана Я. Р. Рыерам на ўсёй тэрыторыі Магілёўскай вобласці. На ранні этап ён адводзіць не болей за 17,8% узнікшых паселішчаў[32].

Картаграфуючы паселішчы з раннеганчарнымі матэрыяламі другой паловы X–XI стст. і курганныя могільнікі з поўным і няпоўным трупаспаленнем на сярэднім Сожы, якія таксама можна датаваць гэтым часам, мы бачым тую ж самую карціну, якую назіралі падчас вывучэння тапаграфіі паселішчаў з роменскай керамікай. Усе яны размешчаны на першай надпойменнай тэрасе, звычайна на нізкім беразе ракі, блізка да вады.

Падобныя паселішчы знойдзены на дзюне ў наваколлях Слаўгарада, ва ўрочышчы Іванская Струга каля Слаўгарада[33]. Матэрыялы гэтага часу ёсць на селішчы на ўсходнім беразе воз. Святое каля в. Дубна і на селішчы каля в. Гайшын Слаўгарадскага раёна. Вакол Слаўгарада ёсць даволі вялікая колькасць курганных могільнікаў з поўным ці няпоўным трупаспаленнем, якія можна датаваць X–XI стст. Такія курганы вядомы каля вёсак Васькавічы, Карма-Пайкі, Карма Доўгая, Арцёхаў, Палуж, Князёўка, Чырвоная Слабада[34], якія размешчаны некалькі ў баку ад Сожа. Усё гэта, верагодна, сведчыць пра пачатак асваення тэрыторыі ўглыб ад вялікай воднай артэрыі Сожа, але аналіз тапаграфіі размяшчэння курганных могільнікаў і селішчаў X–XI стст. сведчыць, што і ў той час асваенне гэтых рэгіёнаў ішло ўздоўж невялікіх рэк і іх больш дробных прытокаў – сучасных ручаёў. Паселішчы і курганы X–XI стст. знаходзяцца на адлегласці не болей за 0,5 км ад рэчак, што сведчыць пра іх прывязку да натуральных крыніц вады.

Вышэй Слаўгарада на р. Проня ўмацаванае паселішча – гарадзішча «Царскія вароты», на якім сустракаецца кераміка X–XI стст., – вядома каля в. Высокае Чавускага раёна. Селішча з керамікай X–XI стст. вядома каля г. Чавусы[35]. Селішча гэтага ж часу – Зацішша-2, памерамі 300 × 150 м, знойдзена каля в. Сялец на р. Проня недалёка ад Радамлі. Побач з ім ёсць і недаследаваны курганны могільнік[36]. У вярхоўях р. Проня селішча з матэрыяламі X–XIII стст. плошчай каля 1 га вядома на паўночнай ўскраіне г. Горкі; сляды паселішча X–XI стст. прасочваюцца на гарадзішчы каля в. Горы Горацкага раёна.

Курганы з трупаспаленнем па р. Проня вядомы каля в. Радамля. На Беседзі радзіміцкія курганы з поўным і няпоўным трупаспаленнем вядомы каля в. Батураўка. У вярхоўях Іпуці курганы з трупаспаленнем вядомы каля Хоцімска.

---

[32] Риер Я. Г. Некоторые вопросы развития феодальной деревни. – С. 137–144.

[33] Копытин В. Ф. Свод памятников археологии Чернобыльской зоны. – С. 144; Артеменко И. И. Среднеднепровская экспедиция // АО 1969 года. – М.: Наука, 1970. – С. 299–300.

[34] Фурсов М. В. Дневник курганных раскопок. – С. 11–15; Алексеев Л. В., Сергеева З. М. Раскопки курганов в Восточной Белоруссии // КСИА. – 1973. – Вып. 135. – С. 45–50.

[35] Рыер Я. Р. Вясковае паселішча ў г. Чавусы. – С. 202–227.

[36] Ксензов В. П. Отчет об археологических исследованиях 2000 года // Архіў ІГ НАН Беларусі. – Адз. зах. 1883. – С. 20; Копытин В. Ф. Археологическая карта Чаусского района. – С. 44, № 33-2.

Вышэй Слаўгарада, на Сожы курганы з трупаспаленнем вядомы каля Крычава, на Астры – у курганным могільніку каля в. Іванаўск[37]. Курганныя могільнікі XI ст. з няпоўным трупаспаленнем вядомы і на прытоку Проні р. Рэкта, каля вёсак Гарбавічы і Гразівец[38].

Пра актыўнае асваенне ў X–XI стст. плыняў вялікіх рэк сведчаць і размешчаныя на іх грашовыя скарбы гэтых часоў. Так, на р. Проня грашовы скарб знойдзены каля в. Стараселле Чавускага раёна[39]. Далей шлях асваення рэгіёна маркіруе Собалеўскі манетны скарб X ст., знойдзены на волаку з р. Проня ў Дняпро[40]. На Сожы грашовы скарб X–XI стст. знойдзены каля в. Стайкі Хіславіцкага раёна, а на Астры – каля в. Ст. Дзедзін[41].

Слабая абследаванасць сельскіх паселішчаў не дазваляе сцвярджаць пра наяўнасць пэўнай сістэмы ў рассяленні і не паказвае наяўнасць нейкай сістэмы іерархічнасці паселішчаў. Гэта абумоўлена ў першую чаргу тым, што на тэрыторыі даследавання даволі мала ўмацаваных паселішчаў X–XI стст. і яны ў асноўным размяшчаюцца на паўночным усходзе рэгіёна – бліжэй да Смаленска і Рослаўля. У той жа час нельга выключыць, што на першапачатковым этапе развіцця феадальных адносін асобныя сядзібы феадалаў размяшчаліся непасрэдна на тэрыторыі вёсак, таму знайсці іх можна толькі падчас буйнамаштабных археалагічных даследаванняў. Прыкладам гэтага з'яўляецца неўмацаванае паселішча каля Чавусаў, дзе Я. Р. Рыерям на падставе археалагічных матэрыялаў прасочана наяўнасць прадстаўнікоў пануючых класаў[42].

Другім сведчаннем таго, што прадстаўнікі феадальных вярхоў маглі жыць і па-за межамі ўмацаваных паселішчаў, на нейкіх адкрытых селішчах, з'яўляюцца і курганныя пахаванні. Так, у курганным могільніку каля в. Анеліна сучаснага Слаўгарадскага раёна ў 1876–1877 гг. былі раскапаны некалькі курганоў, у якіх знойдзены пахаванні па абрадзе няпоўнага трупаспалення. У пахаваннях знойдзены сяміпрамянёвыя скроневыя кольцы, срэбраныя шарыкі, падвеска ў выглядзе рыбкі, бісер круглай і цыліндрычнай формы. У адным з курганоў знойдзена кальчуга, сплеценая з жалезных кольцаў[43]. Апошняя, безумоўна, належала прадстаўніку пануючых класаў, які жыў на размешчаным побач неўмацаваным паселішчы.

---

[37] Фурсов М. В. Дневник курганных раскопок. – С. 22, 24, 27; Романов Е. Р. Заметки о дополнительных археологических местонахождениях // Труды Виленского отделения Московского предварительного комитета по устройству в Вильни IX археологического съезда. – Вильна, 1893. – С. 124–125.

[38] Романов Е. Р. Археологические разведки в Могилевской губернии // Записки Северо-Западного отделения Императорского русского географического общества. – 1912. – Кн. 3. – С. 29–30; Сербаў І. А. Археалагічныя абследаванні ў вадазборах рэк Проні – Ухлясьці. – С. 240.

[39] Ляўданскі А. М. Хроніка. – С. 240.

[40] Кузняцоў К. В. Собалеўскі скарб // Вес. Акад. навук БССР. – 1949. – № 6. – С. 140–142.

[41] Мяцельскі А. Тапаграфія скарбаў куфіцкіх дырхемаў IX – пачатку XI ст. на Пасожжы. – С. 61–63.

[42] Рыер Я. Р. Вясковае паселішча ў г. Чавусы. – С. 202–227.

[43] Копытин В. Ф. Свод памятников археологии Чернобыльской зоны. – С. 151.

Яшчэ адно пахаванне мужчыны, дзе, магчыма, зафіксаваны сляды кальчугі, у якую быў апрануты нябожчык, знойдзена ў 1892 г. М. В. Фурсавым і С. Ю. Чалоўскім у кургане № 20 курганнага могільніка каля в. Карма-Пайкі. У гэтым жа пахаванні каля нябожчыка ляжала сякера і нож[44]. У гэтым раёне таксама адсутнічаюць умацаваныя паселішчы, і нябожчык, хутчэй за ўсё, быў жыхаром неўмацаванай вёскі.

Адкрытых паселішчаў і курганных могільнікаў XII–XIII стст. на тэрыторыі даследавання выяўлена значна больш. У цэлым для селішчаў Пасожжа, як і для ўсяго ўсходнеславянскага свету, характэрны прырэчны тып, арыентаваны на натуральныя крыніцы водазабеспячэння, пры якім паселішчы прымыкаюць да рэк, рачулак і ручаёў. Селішчаў, размешчаных на мысах, значна менш, а калі яны і знаходзяцца там, то гэта звычайна мысы, утвораныя берагамі рэк і яраў, што ўпадаюць у пойму[45]. Нельга выключыць, што і апошнія ў былыя часы былі рэчышчамі невялікіх рачулак. Матэрыялы XII–XIII стст. на паселішчах, што існавалі з X–XI стст., размяшчаюцца некалькі вышэй ад вады, чым матэрыялы больш ранняга часу. У той жа час паселішчы XII–XIII стст. цалкам адсутнічаюць на дзюнах, размешчаных у поймах рэк.

Апошняе сведчыць пра змену ў XI–XII стст. гідралагічнага рэжыму, што было выклікана агульнай зменай клімату. У выніку пад'ёму ўзроўню вады ў рэках паселішчы, размешчаныя на іх нізкіх берагах, пачалі губляць сваю прывабнасць, і насельніцтва пачало перабірацца вышэй. Акрамя таго, пераносу паселішчаў на больш высокія месцы спрыяў факт пашырэння культывавання азімага жыта і аўса, якія павінны былі пакутаваць ад замаразкаў на нізінных участках[46]. У выніку гэтага насельніцтва вымушана было сысці з нізінных мясцін і пачаць асвойваць землі, размешчаныя далей і вышэй ад рэк.

Усё гэта спрыяла таму, што ў XII–XIII стст. паступова пачыналі асвойвацца больш глыбінныя раёны. Але «стандартная» шырыня тэрыторыі інтэнсіўнага асваення і ў гэты час не перавышала 500–600 м. Толькі ў рэдкім выпадку мы знаходзім на сярэднім і верхнім Сожы курганныя могільнікі і селішчы, якія б знаходзіліся ад вады (ракі, рэчкі ці ручая) на большай адлегласці. Апошнія сведчаць толькі пра самы пачатак асваення водападзелаў, якое значна актывізуецца ў больш позні перыяд, і пра пачатак пераходу да калодзежнага забеспячэння вадой.

Мяркуючы па значнай колькасці селішчаў і курганных могільнікаў XII–XIII стст., берагі вялікіх і малых рэк у гэты час былі ўжо шчыльна заселены. Даволі часта курганныя групы і паселішчы размешчаны на адлегласці ў некалькі соцень метраў адзін ад аднаго, а частка помнікаў размяшчаецца сіметрычна адносна рэчышча. Аднак на нізкім беразе яны знаходзяцца на значнай адлегласці ад вады.

---

[44] Фурсов М. В. Дневник курганных раскопок. – С. 12.

[45] Риер Я. Г. Характер размещения сельского населения. – С. 114.

[46] Макаров Н. А., Захаров С. Д. Накануне перемен: сельские поселения на Кубенском озере в XII – начале XIII в. // Русь в XIII веке. Древности темного времени. – М.: Наука, 2003. – С. 150.

Часта падобную карціну мы назіраем на невялікіх рэчках. Так, напрыклад, у в. Бацвінаўка курганныя групы і паселішчы размяшчаюцца па розных берагах рэчкі Жукаўка. Улічваючы яе шырыню (2–4 м), яна не магла служыць нейкай перашкодай, аднак рэальна магла паказваць межы ўладанняў паселішчаў і абшчын, такім чынам, можна меркаваць, што рэкі і рэчкі паказвалі межы асноўнай гаспадарчай зоны кожнага такога паселішча, а сама асноўная гаспадарчая зона, на якой вялося ворыва і знаходзілася паша, верагодна, абапіралася на схілы аднаго берага ракі.

На такую думку наводзіць факт існавання даволі вялікай колькасці курганных могільнікаў у наваколлях в. Бацвінаўка – курганныя могільнікі каля самой Бацвінаўкі (3), так і каля бліжэйшых вёсак – Вародзькаў-2 і 3, Цінькава. Падобная ж карціна назіраецца і на Астры: шматлікія курганныя могільнікі ў наваколлях вёсак Хатовіж, Курганне, Дубовіца і г. д. На тэрыторыі в. Хатовіж Клімавіцкага раёна два курганныя могільнікі размешчаны на розных берагах р. Сасноўка і адзін – недалёка ад яе ўпадзення ў р. Асцёр. На р. Віхра ў наваколлях в. Ст. Разанцы і Н. Віхраны Мсціслаўскага раёна два курганныя могільнікі размешчаны па розныя бакі р. Віхра, хаця абодва бачны адзін з другога. Гэта таксама, верагодна, з'яўляецца сведчаннем таго, што р. Віхра ў гэтым канкрэтным месцы з'яўлялася мяжой паміж зямельнымі ўладаннямі розных паселішчаў.

Улічваючы даволі шчыльнае размяшчэнне помнікаў XII–XIII стст. уздоўж рэк і рэчак, калі яны даволі часта ідуць амаль суцэльным патокам праз некалькі соцень метраў, можна меркаваць, што асноўная гаспадарчая зона паселішчаў была даволі малой і цягнулася ўздоўж рэк. І гэта, улічваючы невялікую плошчу паселішчаў (самыя вялікія да 3–5 га), у якіх налічвалася да 20–25 двароў, было, верагодна, сапраўды так.

Паселішчы XII–XIII стст., вядомыя на Магілёўскім Падняпроўі, яшчэ толькі чакаюць свайго даследчыка. Аднак, па назіраннях Я. Р. Рыера, паселішчы гэтага часу па плошчы меншыя за паселішчы IX–XI стст.[47]

У XII–XIII стст. у сельскай мясцовасці з'яўляецца новы тып паселішчаў, які фактычна адсутнічаў у XI ст., – умацаваныя паселішчы. Апошняе было звязана з актывізацыяй феадалізацыі рэгіёна.

На сярэднім і верхнім Сожы ўмацаваныя паселішчы адносна нешматлікія. Гэта адзначаў яшчэ П. Н. Траццякоў, які пісаў, што ў Смаленскай зямлі найбольшая колькасць сельскіх умацаваных паселішчаў размяшчаецца непадалёку ад Смаленска. А ў раёнах, прылеглых да Сожа, іх колькасць рэзка скарачаецца. Гэта, на яго думку, тлумачыцца рознай ступенню развіцця феадалізму на гэтых землях[48].

---

[47] Риер Я. Г. Некоторые вопросы развития феодальной деревни. – С. 139.

[48] Третьяков В. П. Средневековые замчища Смоленщины // Историко-археологический сборник. К 60-летию со дня рождения и 35-летию науч., пед. и общественной деятельности А. В. Арциховского. – М.: Изд-во Моск. ун-та, 1962. – С. 237–242.

Тым не менш у паўднёва-заходніх раёнах Смаленскай зямлі вядомы 60 гарадзішчаў, з якіх на тэрыторыі будучага Мсціслаўскага княства па-за межамі гарадскіх цэнтраў XII–XIII стст. вядомы толькі 43 гарадзішчы, на якіх сустракаюцца матэрыялы XII–XIII стст. Гэта гарадзішчы каля вёсак Высокае, Перапечына, Рай, Хацяны (Манастыршчынскі р-н, Смаленская вобл.), Бяседка (Ершыцкі р-н, Смаленская вобл.), Васькава, Епішава, Костырава, Касцюшкава (Рослаўскі р-н, Смаленская вобл.), г. п. Хіславічы, вёсак Гараваткa, Гарадок (Хіславіцкі р-н, Смаленская вобл.), Н. Заселле, Пагарэлава, Пагуляеўка (Шумяцкі р-н, Смаленская вобл.), Рухава (Унецкі р-н, Бранская вобл.), Н. і Ст. Дрокаў, Лопазна (Суражскі р-н, Бранская вобл.), Паўлава, Буянава, Гарадзішча (Краснянскі р-н, Смаленская вобл.), Мглін (Мглінскі р-н, Бранская вобл.), Шаўнева, Паляшчыцы, Аршані, Саракапуды, Горы, Касцюшкава (Горацкі р-н), Хвойна (Магілёўскі р-н), Радамля, Чаранкі, Высокае (Чавускі р-н), Юдаўка (Чэрыкаўскі р-н), Горкі (Крычаўскі р-н), Ляўкі (Аршанскі р-н), Мазалава, Добрае, Падлужжа, Кандратаўск (Мсціслаўскі р-н), Ляды, Баброва, Карабанавічы (Дубровенскі р-н), Княжыцы (Шклоўскі р-н)[49] (мал. 3).

Большая частка ўмацаваных паселішчаў рэгіёна даследавання (36 помнікаў, 83%) адносяцца да тыпу мысавых. Астатнія гарадзішчы – Перапечына, Гарадок, Васькава, Хацяны, Юдаўка, Баброва – размяшчаюцца на ўзгоркавых астанцах (16%). Акрамя таго, гарадзішча ў в. Падлужжа размешчана на беразе ракі і мае сегментападобную форму.

Усе гарадзішчы XII–XIII стст. рэгіёна даследавання па сваёй плошчы падзяляюцца на тры катэгорыі. Плошчу да 0,1 га маюць круглые ў плане гарадзішчы Рай (дыям. 13 м) і Васькава (дыям. 47 м). Сюды ж адносіцца і мысавое гарадзішча каля в. Кандратаўск, якое таксама мае малую плошчу.

Археалагічныя даследаванні гэтых помнікаў не праводзіліся. Шурфоўка выявіла, што для іх характэрна наяўнасць магутнага культурнага слоя, які адносіцца да эпохі жалезнага веку, а сярэднявечны слой значна слабейшы і прадстаўлены нешматлікімі фрагментамі керамікі. Каля гэтых гарадзішчаў адсутнічаюць неўмацаваныя паселішчы. Верагодна, у XII–XIII стст. гэтыя былыя гарадзішчы жалезнага веку выкарыстоўваліся ў якасці пляцоўкі, на якой размяшчаўся невялікі двор феадала.

Да другой, самай шматлікай групы адносяцца гарадзішчы плошчай ад 0,1 да 0,2 га. Гэта помнікі каля вёсак Аршані, Высокае, Перапечына, Паляшчыцы, Хацяны, Бяседка, Епішава, Костырева, Касцюшкава (Горацкі р-н), у г. п. Хіславічы, вёсках Гараваткa, Н. Заселле, Пагарэлава (мал. 4), Шаўнева, Радамля, Юдаўка, Горкі, Ляўкі, Мазалава, Ляды, Баброва, Княжыцы.

---

[49] Археологическая карта России. Смоленская область. – Ч. 1. – С. 211, 225–227; Тамсама. – Ч. 2. – С. 50, 110, 112–113, 118, 174–176, 195, 197, 198; Археологическая карта России. Брянская область. – С. 144–149, 233–240, 256–260; Копытин В. Ф. Археологические памятники Чаусского района. – С. 42–43; Яго ж. Археологические памятники Шкловского района. – С. 29; Яго ж. Археологические памятники Чериковского района. – С. 30; Яго ж. Археологические памятники Кричевского района. – С. 63.



Мал. 3. Гарадзішчы X–XIII стст.: *1* – Агееўка; *2* – Асавік-1; *3* – Барадзіно; *4* – Буянава; *5* – Буянава-1; *6* – Бяседка; *7* – Васькава-1; *8* – Вярба; *9* – Волкава; *10* – Ворміна; *11* – Высокае; *12* – Высокае-1; *13* – Гараватка; *14* – Гарадзішча; *15* – Гарадзец; *16* – Гарадок; *17* – Горбава-2; *18* – Горкі; *19* – Горкі-1; *20* – Гараны; *21* – Гуры; *22* – Добрая; *23* – Епішава; *24* – Звяровічы; *25* – Карнакавічы; *26* – Кастыры; *27* – Касцюшкава; *28* – Княжычы; *29* – Калесішча; *30* – Копысь; *31* – Касцюшкава (Трыгубава); *32* – Крычаў-2; *33* – Крутая; *34* – Крычаў-1; *35* – Куршчына; *36* – Латавінава-1; *37* – Ляўкі; *38* – Леніна; *39* – Ляды; *40* – Мазалава; *41* – Мглін; *42* – Мсціслаў; *43* – Навасёлкі-1; *44* – Пагуляеўка; *45* – Паршына; *46* – Перапечына; *47* – Першамайскі; *48* – Пнеўшчына; *49* – Прышча; *50* – Радамля; *51* – Рай; *52* – Расуха; *53* – Рослаў; *54* – Рухава-1; *55* – Свірыдаўка; *56* – Селішча; *57* – Слаўгарад; *58* – Сметанка; *59* – Ст. Дрокаў; *60* – Хіславічы; *61* – Шаўнева; *62* – Ярцаўка

Стацыянарныя даследаванні помнікаў гэтай групы праводзіліся толькі на гарадзішчах Шаўнева і Радамля, а на астатніх вяліся шурфоўкі. Культурны слой на большасці з іх таксама складаецца з двух гарызонтаў: ніжні, магутны, з напластаваннямі днепра-дзвінскай культуры жалезнага веку, і верхні, больш тонкі, з напластаваннямі XII–XIII стст. Толькі на некаторых помніках гэтай групы (Шаўнева, Касцюшкава, Горкі) матэрыялы жалезнага веку адсутнічаюць.

Археалагічныя даследаванні паказалі, што гарадзішча Шаўнева з'яўляецца сядзібай буйнога феадала[50] (мал. 5–8). Верагодна, такі ж сацыяльны статус быў у гарадзішча каля в. Касцюшкава Горацкага раёна, на якім быў знойдзены рэчавы скарб XII–XIII стст.[51], і гарадзішча ў в. Радамля, якая яшчэ ў пачатку

[50] Мяцельскі А. А. Шаўнеўскае гарадзішча XII–XIII стст. – С. 63–65.

[51] Корзухина Г. Ф. Русские клады IX–XIII вв. – М. ; Л.: Изд-во Акад. наук СССР, 1954. – С. 149.



Мал. 4. План гарадзішча каля в. Пагарэлава

XVI ст. была замкам Мсціслаўскага княства і цэнтрам воласці. На ўсіх гэтых гарадзішчах знойдзены артэфакты (скарбы, упрыгожанні, зброя, рэчы імпарту і інш.), якія выразна сведчаць пра прыналежнасць іх уладальнікаў да феадальных вярхоў. Акрамя таго, іх усе аб'ядноўвае і наяўнасць побач з імі неўмацаванага паселішча і курганнага могільніка. Так, калі каля Шаўнеўскага і Касцюковіцкага гарадзішчаў адкрытыя неўмацаваныя паселішчы маюць плошчу каля 1 га, то каля Радамлянскага гарадзішча селішча з матэрыяламі XII–XIII стст. мае плошчу не менш за 2 га. Побач з усімі гэтымі паселішчамі раней былі і курганныя могільнікі.

Нельга выключыць, што падобную сацыяльную арыентацыю мела і гарадзішча ў сучасным г. п. Хіславічы. Яно хаця і малое па плошчы, аднак побач з ім у гарадскім пасёлку ёсць курганны могільнік. Ды і вуліца Замкавая, якая існавала ў пасёлку яшчэ ў канцы XVIII ст., сведчыць пра наяўнасць ў ім калісьці замка. Гэта падзея адносіцца, хутчэй за ўсё, да XII–XIII стст., бо ў больш позні перыяд, да пачатку XVIII ст. Хіславічы былі сельскім паселішчам, у якім не было замка. Акрамя таго, прыцягвае ўвагу існаванне тут як мінімум з першай паловы XVIII ст. царквы ў гонар Св. Барыса і Глеба. Храмы ў гонар гэтых святых даволі рэдкія, і звычайна яны будаваліся ў княскіх загарадных рэзідэн-



Мал. 5. Шаўнева. Жалезныя вырабы: *1–4* – ключы; *5* – пружыны ад замка; *6* – бранябойны наканечнік стралы; *7–8* – спражкі; *9* – зашчапка для замыкання вісячага замка; *10* – шпора; *11* – ігла з рухомым кальцом; *12* – вушка ад меднага катла; *13* – фрагмент ляза сякеры; *14* – пласціна ад засцярагальнага доспеха; *15*, *17* – прабой; *16* – жалезнае вушка ад вядра; *18–23* – нажы; *24* – цвік



Мал. 6. Шаўнева. Вырабы з косці, камня, гліны. Ювелірныя вырабы: *1–5* – грабеньчыкі; *6* – шашка; *7* – фрагмент сопла горна; *8–9* – тачыльныя брускі; *10–12* – праселкі; *13, 15* – медныя бранзалеты; *14* – медная булаўка; *16* – пярсцёнак; *17* – бразготка



Мал. 7. Шаўнева. Інкруставанае стрэмя

цыях, як, напрыклад, у Смаленску, Полацку, Гародні, Віцебску[52]. Безумоўна, Хіславічы размешчаны значна далей ад княскага двара, чым гэта мела месца ў сталіцах удзельных княстваў, але магчыма, у XII–XIII стст. у Хіславічах існавала нейкая княская рэзідэнцыя.

Трэцяя група прадстаўлена гарадзішчамі з плошчай ад 0,2 да 0,4 га. Гэта гарадзішчы каля вёсак Касцюшкава (Рослаўскага р-на), Гарадок, Пагарэлае, Добрае, Падлужжа і Ка-

[52] Баравы Р. Невядомы помнік старажытнабеларускай архітэктуры // Спадчына. – 1993. – № 1. – С. 64–68; Боровой Р. В., Булкин Вал. В. Из истории церкви Бориса и Глеба в Витебске // Проблемы изучения древнерусского зодчества (По материалам архитектурно-археологических чтений посвященных памяти П. А. Раппопорта 15–19 января 1990 г.). – СПб., 1996. – С. 67–72.



Мал. 8. Кераміка з гарадзішча каля в. Шаўнева

рабанавічы. З гэтага масіва ўмацаваных помнікаў вылучаюцца самыя вялікія сельскія ўмацаваныя паселішчы ў рэгіёне – плошчай больш за 0,5 га, гарадзішчы каля в. Пагуляеўка і Высокае.

Стацыянарныя даследаванні гэтай групы помнікаў праводзіліся толькі на гарадзішчы каля в. Карабанавічы Дубровенскага раёна. Астатнія падвяргаліся толькі абследаванням і невялікім разведачным шурфоўкам. Аднак, нягледзячы на гэта, у выніку археалагічных абследаванняў, а таксама аналізу плошчы помнікаў можна зрабіць пэўныя высновы пра час іх узнікнення і функцыянавання, пра сацыяльную тыпалогію гэтых паселішчаў. Магчыма, паселішчы гэтага тыпу таксама ёсць сэнс разглядаць у якасці сядзіб буйных феадалаў, якія былі цэнтрамі буйных гаспадарак. Пра апошняе сведчыць і той факт, што ўсе гэтыя помнікі размешчаны ў асяроддзі курганных могільнікаў і селішчаў.

Картаграфаванне гэтых умацаваных паселішчаў паказвае, што сапраўды яны вядуць да Смаленска альбо знаходзяцца ў наваколлях іншых буйных га-

радскіх цэнтраў – Мсціслава, Рослаўля, Красна. На Сярэднім Сожы, у навакольлях Крычава, Слаўгарада іх ужо значна менш. Тут фактычна сустракаюцца толькі адзінкавыя ўмацаваныя паселішчы XII–XIII стст.

Пэўнай заканамернасці ў размяшчэнні ўмацаваных паселішчаў XII–XIII стст. пакуль не назіраецца. Магчыма, нейкая сістэмнасць у іх месцазнаходжанні будзе прасочана толькі пасля буйнамасштабных даследаванняў сельскіх паселішчаў у гэтым рэгіёне.

2.3. Сярэдняе і Верхняе Пасожжа ў XI–XIII стст.: пачатак фарміравання адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак. Узнікненне гарадоў

Падзеленае паміж радзімічамі і крывічамі, у IX–X стст. Пасожжа мела два буйныя цэнтры – Гомель і Гнёздава, на поўдні і поўначы адпаведна, якія і кантралявалі плынь Сожа. Палітычная і тэрытарыяльная арганізацыя гэтых племянных аб'яднанняў невядомая з-за адсутнасці крыніц, адпаведна і гісторыя Пасожжа IX–X стст. застаецца амаль невядомай.

Зямля радзімічаў канчаткова ўвайшла ў склад Кіеўскай Русі ў 984 г. у выніку паходу ваяводы кіеўскага князя Уладзіміра Воўчага Хваста. Аднак пасля смерці Уладзіміра (1015 г.) успыхнула ўсобіца паміж яго сынамі Яраславам Мудрым і Мсціславам, якая прывяла ў 1024 г. да расколу Кіеўскай Русі на дзве часткі. Левабярэжжа Дняпра разам з зямлёю радзімічаў адышло ў сферу ўплыву Чарнігава, у якім сядзеў Мсціслаў Уладзіміравіч. Правабярэжжа разам з Кіевам і астатнімі землямі засталося за Яраславам. У такім стане Кіеўская Русь заставалася да 1036 г., калі пасля смерці Мсціслава яна была зноў аб'яднана Яраславам. Але землі радзімічаў і пасля гэтага, верагодна, заставаліся пад уплывам Чарнігава. Крывіцкая ж частка Пасожжа, што кантралявалася ўжо вялікакняскім Смаленскам, засталася пад уладай Кіева.

Адсутнасць стабільнасці ў дзяржаве, якая назіралася ў першай трэці XI ст., зразумела, не спрыяла ўмацаванню Кіеўскай Русі. І таму, хаця пісьмовыя крыніцы маўчаць пра падзеі, што адбываліся на Пасожжы ў XI ст., можна лічыць, што ўсё XI ст. – гэта гісторыя адзяржаўлення радзімічаў: замена суверэнітэта мясцовых князёў на суверэнітэт Рурыкавічаў, упарадкаванне падаткаабкладання і паступовае прасоўванне хрысціянства ў глыб зямлі радзімічаў.

Палітычная арганізацыя Сярэдняга і Верхняга Пасожжа ў XI–XIII стст. рэканструюецца як на падставе пісьмовых крыніц, так і улічваючы канцэнтрацыю помнікаў археалогіі, з улікам асаблівасці іх сацыяльнай дыферэнцыяцыі. Мяркуючы па пісьмовых крыніцах, у XII–XIII стст. на ўсіх усходнеславянскіх землях дзейнічала сістэма палітычнай арганізацыі, якая была пабудавана адпаведна структуры: старэйшыя гарады – прыгарады – воласці. Прычым пачатак фарміравання нізавых звенняў гэтай сістэмы прасочваецца ў X ст. у выглядзе канцэнтрацыі груп адкрытых паселішчаў вакол умацаванага паселішча.

Падобныя групы даволі часта атаясамліваюцца з абшчынамі. Магчыма, пэўныя родавыя традыцыі і захоўваліся ў такіх групах у X ст., але сувязь па-

між асобнымі пасёлкамі паступова ўсё больш прымала эканамічны характар, і ў першую чаргу гэта тычылася сувязі з цэнтральным паселішчам групы. Менавіта ў падобных цэнтрах ішла канцэнтрацыя і пераразмеркаванне прадукцыі акругі, збор даніны «по шелягу от рала». Адсюль ішло пранікненне ў акругу імпартных рэчаў, зброі і інш. У гэтых цэнтрах канцэнтравалася ўлада над акругай, і менавіта там пачынаецца будаўніцтва фартыфікацыйных збудаванняў.

Пра тое, што пачатак фарміравання сістэмы валасцей адносіцца да X ст., а часам і да больш ранняга часу, сведчыць тое, што звычайна ў цэнтры згусткаў помнікаў археалогіі X–XIII стст. знаходзіцца гарадзішча альбо вялікае неўмацаванае паселішча, на якім ёсць матэрыялы X–XI стст.

На сённяшні дзень у Сярэднім і Верхнім Пасожжы прасочваецца традыцыйнасць у тым, што структура паселішчаў X–XIII стст. абапіраецца на структуру не толькі VII–IX стст., але і больш ранняга часу. Так, у Мсціславе і Крычаве акрамя сярэдневяковых замкаў існуюць гарадзішчы ранняга жалезнага веку. На ўмацаваных помніках сярэдневяковых Радамлі, Гор, Слаўгарада паселішчы таксама існавалі і ў эпоху жалезнага веку. Падобныя параллелі ў захаванасці традыцыйнай сістэмы структур пасяленняў прасочваюцца і на Ніжнім Пасожжы[53].

У рэгіёне нашага даследавання першыя ўмацаваныя паселішчы, на якіх сустракаюцца матэрыялы IX–X стст., адносяцца да носьбітаў роменскай культуры і ўзнікаюць у паўднёвых рэгіёнах Сярэдняга Пасожжа. Гэтыя нешматлікія ўмацаваныя паселішчы адлюстроўваюць пранікненне новага насельніцтва на Пасожжа і першапачаткова, верагодна, з'яўляліся апорнымі пунктамі каланізацыі, з якіх ішло асваенне прылягаючай да іх акругі. На Сярэднім Пасожжы ўмацаваныя помнікі з роменскімі матэрыяламі вядомы ў Мгліне, каля вёсак Лопазна (2), Новы Дрокаў, у Слаўгарадзе.

Гарадзішча роменскага часу ў Мгліне размешчана на адлегласці ў 1 км на поўдзень ад сучаснага горада, на беразе р. Судынка і мае памеры пляцоўкі 61 × 43 м. З напольнага боку яно ўмацавана ярам глыбінёй да 3 м. Культурны слой на помніку мае магутнасць да 0,8 м, у ім сустракаецца юхнаўская і роменская кераміка[54].

Недалёка ад мглінскага гарадзішча роменскага часу размешчаны яшчэ два ўмацаваныя помнікі IX–X стст. – каля в. Лопазна Суражскага раёна Бранскай вобласці. Абодва яны размешчаны на берагах р. Лопазенка. Першае гарадзішча мае памеры 108 × 46 м і ўмацавана з напольнага боку двума валамі вышынёй адпаведна 4 і 2 м і ярамі глыбінёй 1–2 м. Культурны слой на гарадзішчы мае магутнасць да 0,6 м.

Другое гарадзішча размешчана прыкладна ў 1,5 км на паўночны захад ад першага і мае памеры 82 × 43 м. З паўночнага боку захаваліся рэшткі абарон-

---

[53] Макушников О. А. К вопросу о поселенческой структуре второй половины I тыс. н. э. – С. 73–76.

[54] Археологическая карта России. Брянская область. – С. 147.

чага вала вышынёй да 1 м, а з паўднёва-заходняга і паўднёва-ўсходняга бакоў прасочаюцца рэшткі яра. У культурным слоі знойдзены гліняныя праселкі, роменская кераміка[55].

Прыкладна ў 20–30 км на паўночны захад ад лопазненскіх помнікаў, каля в. Н. Дрокаў, на мысе правабярэжнай тэрасы ручая, што ўпадае з правага боку ў р. Іпуць, размешчана яшчэ адно гарадзішча, на якім сустракаецца кераміка роменскага часу. Яно мае авальную пляцоўку памерамі 85 × 50 м, умацаванні на ім не прасочваюцца. Культурны слой на помніку дасягае магутнасці 0,35 м[56].

На значнай адлегласці ад гэтых помнікаў знаходзіцца гарадзішча Замкавая гара ў Слаўгарадзе, на якім таксама сустракаецца роменская кераміка. Яно размешчана на стромкім беразе Сожа, недалёка ад упадзення ў яго р. Проня. Пляцоўка помніка авальнай формы і мае памеры 95 × 40 м. З паўночнага боку гарадзішча аддзелена ад берагавога плато абарончым ровам шырынёю 18 м і глыбінёю да 4,5 м. З напольнага, заходняга боку гарадзішча ўмацавана прыродным ярам глыбінёю каля 10 м і шырынёю да 30 м, па дне якога працякае ручай. З усходняга боку помнік умацаваны ракой Сож.

Археалагічныя даследаванні на помніку праводзілі Г. В. Штыхаў (1967 г.), М. А. Ткачоў (1973 г.)[57] і аўтар (1988 г.). Усяго на помніку ўскрыта каля 120 кв. м. Даследаванні паказалі наяўнасць на помніку матэрыялаў тыпу сярэдняга слоя гарадзішча Тушамля, керамікі роменскага тыпу і матэрыялаў X–XVIII стст.

Назіранні за тапаграфіяй размяшчэння помніка і наяўнасць на ім керамікі роменскага тыпу дазваляюць меркаваць, што першыя штучныя абарончыя збудаванні на беразе Сожа былі пабудаваны менавіта роменскім насельніцтвам. Гэту думку не аспрэчваюць і матэрыялы археалагічных даследаванняў, праведзеных М. А. Ткачовым: згодна з яго назіраннямі, першыя абарончыя збудаванні ў выглядзе драўлянага вастракола былі пабудаваны ў X ст.[58]

Большасць умацаваных помнікаў роменскага часу, за выключэннем гарадзішчаў у Лопазне, размешчаны на значнай адлегласці адзін ад аднаго, такім чынам, верагодна, з самага пачатку іх узнікнення на дзейнасць гэтых умацаваных паселішчаў накладваліся першасныя функцыі будучага гарадскога цэнтра – ваеннага і адміністрацыйнага цэнтра акругі.

Адначасовых адкрытых паселішчаў у навакольлях умацаваных помнікаў IX–X стст. у Мгліне, Н. Дрокаве, Лопазне пакуль вядома мала, таму цяжка што-небудзь казаць пра памеры іх акругі. Тым болей, што для вызначэння памераў акругі няма ніякіх геаграфічных межаў.

Частка гэтых паселішчаў, узнікшы ў IX–X стст., працягвала сваё існаванне і ў наступныя стагоддзі ў якасці цэнтра фарміравання сельскай акругі.

---

[55] Археологическая карта России. Брянская область. – С. 237.

[56] Тамсама. – С. 238.

[57] Штыхов Г. В. Разведочные раскопки в Славгороде в 1967 г. // Вопросы истории. Тез. докл. 12-й конф. молодых ученых БССР. Ноябрь 1969 г. – Минск, 1969. – С. 70–76; Ткачев М. А. Работы в Белорусском Посожье // АО 1975 года. – М.: Наука, 1976. – С. 428.

[58] Ткачев М. А. Работы в Белорусском Посожье. – С. 428.

Так, паселішча на Замкавай гары ў Слаўгарадзе развівалася ў X–XI стст.: вакол яго ішло фарміраванне акругі, што прасочваецца па колькасці новых помнікаў гэтага часу, якія ўзніклі ў яго наваколлях, пра што ішла размова вышэй.

Аднак калі паселішча ў Слаўгарадзе развівалася бесперапынна, то іншыя ўмацаваныя паселішчы з роменскай керамікай, размешчаныя ў басейне р. Іпуць, спыняюць сваё развіццё альбо пабач з імі будуюцца новыя ўмацаваныя цэнтры.

Так, у X ст. спыняецца жыццё на гарадзішчах у наваколлях в. Лопазна і на гарадзішчы каля в. Н. Дрокаў. Аднак калі ў першым выпадку не ўзнікаюць новыя ўмацаваныя паселішчы, то замест паселішча каля в. Н. Дрокаў, на адлегласці 8–10 км ад яго будуецца новае ўмацаванне – на беразе р. Іпуць, на тэрыторыі сучаснай в. Стары Дрокаў.

Паселішча X–XIII стст. у Ст. Дрокаве складалася з гарадзішча памерамі 50 × 40 м і селішча плошчай каля 0,5 га, якое прымыкала да яго[59]. У XI–XIII стст. гэта было адным з нешматлікіх умацаваных паселішчаў на сярэдняй Іпуці. Улічваючы, што яно ўзнікла побач з умацаваным паселішчам больш ранняга часу і фактычна замяніла яго, верагодна, з'яўленне апошняга дэманструе працэс «адзяржаўлення» новых зямель пад эгідай Кіева ці Чарнігава. Магчыма, гэтыя два цэнтры адлюстроўваюць працэс барацьбы старай племянной і новай вялікакняскай вярхушкі, калі новай ўладай быў пабудаваны новы адміністрацыйны цэнтр, што паступова перацягнуў на сабе ролю цэнтра воласці.

Нельга выключыць, што паселішча ў Ст. Дрокаве ў XII–XIII стст. было цэнтрам адной з невялікіх валасцей, размешчаных на сярэдняй Іпуці, якая стала асновай для Дрокаўскай воласці, добра вядомай па крыніцах XV–XVI стст.

Для вызначэння памераў воласці Дрокава XI–XIII стст. адсутнічаюць якія-небудзь аргументаваныя даныя. У той жа час нельга выключыць, што яе ўсходняя мяжа ў пэўнай ступені захавала сваю трасу і схематычна праходзіла на захад ад сучасных (мглінскіх у пачатку XV ст.) вёсак Лопазна, Красавічы і Рухава[60].

У Мгліне ў XI ст. замест умацаванага паселішча роменскага насельніцтва пачынае фарміравацца новы ўмацаваны цэнтр – у цэнтры сучаснага горада, ва ўрочышчы Узвіжанская горка, на мысе правага берага р. Судынка.

Гарадзішча старажытнага Мгліна складаецца з дзвюх пляцовак. Малая пляцоўка, паўднёвая, акруглай формы (55 × 50 м) займае кут мыса. Культурны слой на ёй дасягае магутнасці 3 м, з якіх верхнія 0,75 м адносяцца да позняга Сярэднявечча, а ніжні стратыграфічны слой адносіцца да старажытнасцей юхнаўскай культуры.

Большая, паўночная пляцоўка гарадзішча мае трапецападобную форму (50–100 × 90 м). З напольнага боку прасочваюцца рэшткі вала і рова з перамычкай ў сярэдняй частцы. Культурны слой пашкоджаны больш познімі мо-

[59] Археологическая карта России. Брянская область. – С. 239.

[60] ДМАМЮ. – Т. 1. – С. 23, № 18, 19.

гілкамі, дасягае магутнасці 2 м. У ім падчас шурфовак і збору пад'ёмнага матэрыялу былі знойдзены матэрыялы юхнаўскай культуры ранняга жалезнага веку, культуры Старажытнай Русі (сланцавыя праселкі, фрагменты шкляных бранзалетаў, нажніцы і інш.) і позняга Сярэднявечча[61].

Фарміраванне новага цэнтра побач з умацаваным цэнтрам больш ранняга часу, верагодна, таксама адлюстроўвае працэс «адзяржаўлення» зямель у навакольлях сучаснага Мгліна і барацьбу новай улады са старой племянной вярхушкай.

На пасожскіх землях радзімічаў самы паўночны гарадскі цэнтр XII–XIII стст. існуе на тэрыторыі сучаснага Крычава. Дакладная назва гэтага паселішча ў XII–XIII стст. невядомая. Аднак у Статуце смаленскага князя Расціслава Мсціславіча 1136 г. згадваецца «Кречют», які выплочваў князю даніну ў памеры 10 грыўняў[62].

У сярэдзіне XIX ст. І. Д. Бяляеў выказаў меркаванне, што пад назвай «Кречют» хаваецца сучасны Крычаў. Меркаванне І. Д. Бяляева знайшло маўклівую падтрымку наступных даследчыкаў, а некаторыя нават зрабілі спробу яе падмацаваць[63]. У той жа час у пісьмовых крыніцах пад сваёй назвай – Крычаў – горад упершыню з'яўляецца толькі ў «Списке русских городов дальних и ближних» разам з іншымі літоўскімі гарадамі[64].

Археалагічныя даследаванні, праведзеныя на тэрыторыі Крычава і ў яго бліжэйшым навакольлі, паказалі, што першае сярэднявечнае паселішча тут узнікла на дзюне, у пойме левага берага Сожа, прыкладна ў 1,2–1,5 км на паўночны ўсход ад гарадзішча XII–XVIII стст. «Замкавая гара». Тут выяўлены рэшткі пашкоджанага кар'ерам паселішча плошчай болей за 1 га, на якім сустракаецца як раннеганчарная кераміка X–XI стст., так і кераміка, ўпрыгожаная арнаментам у выглядзе штампа, выкананага шнуром, наматаным на палачку, што дазваляе датаваць паселішча X – пачаткам XI ст. Побач у лесе знаходзіцца і невялікі курганны могільнік, у якім знойдзены пахаванні з трупаспаленнем.

У навакольлях Крычава паселішчы з раннеганчарнай і роменскай керамікай вядомы таксама на беразе Сожа каля в. Селішча Клімавіцкага раёна і ў саміх Клімавічах[65]. У навакольлях Клімавічаў вядомы і курганныя могільнікі з трупаспаленнем, у якіх знаходзілі ляпныя гаршкі[66]. Курганы з трупаспаленнем

---

[61] Археологическая карта России. Брянская область. – С. 147, № 455.

[62] Древнерусские княжеские уставы XI–XV вв. – М.: Наука, 1976. – С. 143.

[63] Довнар-Запольский М. В. Очерк истории Кривичской и Дреговичской земель до конца XII столетия. – Киев, 1901; Алексеев Л. В. Периферийные центры домонгольской Смоленщины // СА. – 1979. – № 4. – С. 102; Голубовский П. В. История Смоленской земли. – С. 79, прим. 2; Седов В. В. Смоленская земля // Древнерусские княжества X–XIII вв. – М.: Наука, 1975. – С. 252.

[64] Тихомиров М. И. «Список русских городов дальних и ближних» // Исторические записки. – М., 1952. – Т. 40. – С. 237.

[65] Поболь Л. Д. Археологические памятники Белоруссии. – С. 404.

[66] Раскопки воспитанниками V кл. Климовичского мужского учебного заведения под руководством своих преподавателей (Ярославцева и Лопотя) // Записки Северо-Западного отделения РГО. – Вильна, 1910. – Кн. 1. – С. 240–241.

даследаваны таксама каля вёсак Гарадок, Іванаўск, Ст. Дзедзін, Пранічкі, Воўчас, Ціхіль. У в. Ст. Дзедзін знойдзены грашовы скарб канца X – пачатку XI ст.[67]

Як бачым, гэты радзіміцкі раён Пасожжа ў X ст. быў даволі шчыльна заселены і, безумоўна, павінен быў мець нейкі аб'яднальны цэнтр. Пакуль самым вялікім паселішчам X–XI стст., вядомым тут, з'яўляецца селішча ў пойме Сожа пад Крычавам. Верагодна, яно з самага пачатку свайго існавання ўзяло на сябе ролю цэнтра гэтага рэгіёна, што ў больш позні час прывяло да фарміравання на яго аснове цэнтра воласці, вядомай з пачатку XII ст. Магчыма, недалёка ад гэтага селішча, на былым гарадзішчы жалезнага веку «Гарадзец», існавала і паганскае капішча, звязанае з селішчам.

Ва ўсякім выпадку, пра існаванне на гарадзішчы «Гарадзец» паганскага капішча яшчэ ў XVIII ст. у Крычаве існавала паданне, а адзіны храналагічны перыяд, калі на паселішчы не было актыўнага жыцця і яно магло выкарыстоўвацца ў якасці капішча адносіцца менавіта да апошняй чвэрці 1 тыс. н. э.[68]

Паўночныя раёны Пасожжа, што засялялі крывічы, у IX–X стст. мелі свой буйны адміністрацыйны і гандлёва-рамесны цэнтр – Гнёздава на Дняпры, які стаяў на скрыжаванні міжнародных гандлёвых шляхоў, акрамя крывічоў у ім пражывалі і прадстаўнікі іншых этнасаў. Нават найбольш далёкія ад Гнёздава пасожскія землі крывічоў знаходзіліся на адлегласці 70–80 км ад яго, і на пачатковым этапе развіцця феадальнага грамадства, верагодна, хапала гэтага аднаго буйнога цэнтра.

У пачатку XI ст. на змену племянному Гнёздаву прыйшоў княскі Смаленск. Адначасова з заменай племянной вярхушкі на вялікакняскую працягвалася феадалізацыя грамадства і пранікненне феадальных узаемаадносін у аддаленыя ад Смаленска землі.

У XI ст. пачынаюць узнікаць першыя ўмацаваныя цэнтры і на пасожскіх землях крывічоў. Працэс іх узнікнення храналагічна супадае з працэсам уключэння гэтых зямель у склад Смаленскай воласці Кіеўскай Русі, і да XI ст. адносіцца пачатак фарміравання першых адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак на задняпроўскай, этнічна крывіцкай тэрыторыі.

Статут Расціслава Мсціславіча 1136 г. згадвае на крывіцкіх землях Пасожжа воласці Мірацічы, Копысь, Басея, землі якіх ўвайшлі ў склад Смаленскай воласці ў XI ст.

Воласць Мірацічы знаходзілася ўздоўж р. Мярэя, левага прытока Дняпра. Са Статута 1136 г. вядома, што воласць плаціла на карысць князя 10 грыўняў

---

[67] Археологическая карта России. Смоленская область. – Ч. 2. – С. 201; Калінінская старасветчына // Звезда. – 1926. – 8 июля. – С. 4; Археалагічныя раскопкі // Савецкая Беларусь. – 1926. – 22 ліп. – С. 4; Харламповіч П. Манэтныя скарбы, знойдзеныя ў Беларусі, у зборах Беларускага дзяржаўнага музею // Гістарычна-археалагічны зборнік (Даклады і рэфераты 1926–1927 гадоў). – Мінск: Інбелкульт, 1927. – № 1. – С. 303–343; Ляпушкин И. И. Славяне Восточной Европы накануне образования Древнерусского государства (VIII – первая половина IX в.) // МИА СССР. – М.: Наука, 1968. – № 152. – С. 100, № 358.

[68] Мейер А. Описание Кричевского графства или бывшего староства 1786 г. // Могилевская старина. – Могилев, 1901. – Вып. 2. – С. 114; Мяцельскі А. А. Старадаўны Крычаў. – С. 20, 26.

даніны[69]. Адміністрацыйны цэнтр гэтай воласці, як і яе памеры, дакладна не лакалізаваны. Мяркуючы па назве, воласць, перш за ўсё, ахоплівала басейн р. Мярэя – тэрыторыю плошчай каля 1200 кв. км, якая і дала назву адміністрацыйна-тэрытарыяльнай і гаспадарчай адзінцы.

Воласць Мірацічы трапіла пад кантроль Смаленска яшчэ ў другой палове XI ст., і таму пачатак фарміравання гэтай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, верагодна, адносіцца да гэтага часу. Басейн р. Мярэя і прымыкаючая да яе тэрыторыя даволі багатыя на помнікі культуры смаленскіх доўгіх курганоў і X ст. Паселішчы гэтага часу вядомы каля вёсак Буянава, Раманаўка, Смілава[70] і, безумоўна, нейкі цэнтр, што аб'ядноўваў іх, існаваў ужо ў гэты час. Таму фарміраванне адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі ў гэтым рэгіёне ў XI–XII стст. было абумоўлена самім яго гістарычным развіццём.

У гэтым раёне ёсць толькі адзін вялікі археалагічны комплекс – каля в. Звяровічы Краснянскага раёна Смаленскай вобласці, які можа рэальна прэтэндаваць на ролю цэнтра акругі. Комплекс уключае ў свой склад невялікае гарадзішча (памерамі 42 × 26 м), прымыкаючы да яго вакольны горад (памерамі 225 × 75 – 120 м) і размешчанае побач з імі селішча, на якіх ёсць матэрыялы XII–XIII стст.[71] (мал. 9). Гэты археалагічны комплекс атаясамліваецца з летапісным горадам Краснам, вядомым па паведамленні 1165 г., і, магчыма, менавіта ён у пачатку XII ст. выконваў ролю цэнтра воласці Мірацічы і быў аб'яднальным цэнтрам гэтага рэгіёна ў X–XI стст. Аднак археалагічна помнік яшчэ не даследаваны.



Мал. 9. План гарадзішча каля в. Звяровічы, летапіснага Красна

[69] Древнерусские княжеские уставы. – С. 143.

[70] Археологическая карта России. Смоленская область. – Ч. 1. – С. 210, 217, 218.

[71] Тамсама. – С. 213–214.

Другая пасожская воласць на землях крывічоў, што згадвалася ў Статуце Расціслава Мсціславіча, – Басея. З яе князь Расціслаў Мсціславіч атрымліваў даніну ў памеры 15 грыўняў[72]. Зыходзячы з назвы, воласць Басею лакалізуюць уздоўж сучаснай ракі Бася, правага прытока р. Проня, на тэрыторыі Горацкага і Шклоўскага раёнаў Магілёўскай вобласці.

Згодна з гістарычна-геаграфічнымі даследаваннямі, праведзенымі В. Л. Насевічам, воласць Басея ў XVI ст. займала землі, на якіх у пачатку XX ст. размяшчаліся Маслакоўская і Гарадзішчанская воласці Горацкага ўезду[73]. Улічваючы, што да XVI ст. нам не вядомы якія-небудзь адміністрацыйна-тэрытарыяльныя змены, што адбываліся на гэтых землях, нельга выключаць, што і ў больш ранні перыяд – XII–XIII стст. – воласць Басея ахоплівала тыя ж землі, што і ў XVI ст. Мяркуючы па тэрыторыі, якую займалі Маслаўская і Гарадзішчанская воласці ў пачатку XX ст., воласць Басея ў XII ст. размяшчалася ў вярхоўях р. Басея да ўпадзення ў яе р. Галубіка, на тэрыторыі памерамі прыкладна 35 × 20 км, што адпавядае плошчы 700 кв. км.

Адміністрацыйны цэнтр Басеі, верагодна, знаходзіўся на зараз знішчаным гарадзішчы на правым беразе р. Бася ў в. Гарадзішча Шклоўскага раёна, на рэштках якога сустракаюцца матэрыялы XIII ст.[74] Верагодна, гэты населены пункт і воласць, што прылягала да яго, пачалі фарміравацца з другой паловы XI – пачатку XII ст., калі гэтыя землі трапілі пад кантроль Смаленска[75].

Аднак адміністрацыйна-тэрытарыяльны і гаспадарчы цэнтр, які развіваўся тут у XII–XIII стст., так і не дасягнуў статуса горада і застаўся на ўзроўні сяла. Верагодна, гэта было выклікана наяўнасцю вакол Басеі іншых, больш магутных у эканамічным плане гарадскіх цэнтраў – Копысі, Оршы, Гор, Радамлі, Мсціслава, якія ўзялі на сабе галоўныя гарадскія функцыі – адміністрацыйнага, рамесна-гандлёвага і ваеннага цэнтра акругі. З больш позніх крыніц вядома, што воласць Басея ў XV–XVI стст. належала князям Друцкім, а ў XVII ст. – Сапегам[76].

Паміж басейнам рэк Мярэя і Бася, на р. Быстрая, каля в. Горы Горацкага раёна Магілёўскай вобласці размешчана вялікае гарадзішча, вядомае сярод мясцовага насельніцтва пад назвай «Курганне» (мал. 10).

На помніку сустракаюцца як матэрыялы жалезнага веку – днепра-дзвінская культура і культура сярэдняга слоя гарадзішча Тушамля, так і сярэднявечныя матэрыялы XII–XVI стст. Аднак у невялікай колькасці тут сустракаюцца і матэрыялы X–XI стст., што дазволіла выказаць меркаванне пра існаванне на

---

[72] Древнерусские княжеские уставы. – С. 142.

[73] Алексеев Л. В. Смоленская земля в IX–XIII вв. – С. 63; Насевіч В. Л. Басея // Энцыкл. гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск: Бел Эн, 1993. – Т. 1. – С. 328–329.

[74] Штыхов Г. В. Археологическая карта Белоруссии. – Вып. 2. Памятники железного века и эпохи феодализма. – Минск: Полымя, 1971. – С. 235; Копытин В. Ф. Археологические памятники Шкловского района. – С. 31.

[75] Алексеев Л. В. Устав Ростислава Смоленского. – С. 91.

[76] Насевіч В. Л. Басея. – С. 328.



Мал. 10. План гарадзішча каля в. Горы Горацкага раёна (паводле М. А. Ткачова). Стан на 1976 г.

помніку ў гэты час княскага пагоста. Магчыма, пэўны цэнтр акругі пачаў тут фарміравацца ў X–XI стст., аднак асноўны этап функцыянавання паселішча на гарадзішчы каля в. Горы адносіцца да XII–XVI стст.[77] Хаця нельга выключыць, што гэты помнік на першапачатковым этапе свайго развіцця ўваходзіў у склад воласці Мірацічы.

Акрамя Басеі і Мірацічаў, на паўднёвым захадзе Смаленскага княства Статут Расціслава Мсціславіча згадвае воласць Копысь, з якой бралося палюддзе ў памеры 4 грыўняў, столькі ж з перавоза праз Дняпро і з «торгового». «На корчмити неведомо, а что ся соидеть, из того десятина Святой Богородицы», – дапаўняе крыніца. Такім чынам, у 1136 г. Копысь разам з воласцю плаціла як мінімум 12 грыўняў даніны. Грамата «Аб пагароддзі і пачэсціі» другой паловы XII – пачатку XIII ст. паведамляе, што з Копысі епіскапія атрымлівала «6 гривен урока и 2 лисицы, а почестья 35 кун»[78].

Цэнтр воласці – горад Копысь – размешчаны на левым беразе Дняпра. Археалагічныя даследаванні паказалі, што першапачатковае неўмацаванае паселішча ўзнікла тут у XI ст., чаму не супярэчаць і пісьмовыя крыніцы. Копысь упер-

[77] Бектинеев Ш. И., Левко О. Н. Городище Горы // Сярэдневяковыя старажытнасці Беларусі. Новыя матэрыялы і даследаванні. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – С. 8–19; Мяцельскі А. А., Ткачоў М. А Гарадзішча каля в. Горы Горацкага раёна. – С. 187–197.

[78] Древнерусские княжеские уставы. – С. 143, 146.

шыню згадваецца ў 1059 г., калі тут памёр наўгародскі епіскап Лука Жыдзята, які ехаў з Ноўгарада ў Кіеў.

Аднак фартыфікацыйныя збудаванні былі ўзведзены ў самым канцы XI – пачатку XII ст.[79] Побач з дзядзінцам памерамі 80 × 60 м, выяўлены сляды пасада, археалагічныя даследаванні на ім толькі пачынаюцца. Аднак ужо зараз высветлена, што найстаражытнейшы пасад з матэрыяламі канца XI–XIII стст. быў абмежаваны з поўдня р. Сморкаўка, а з захаду – Дняпром і займаў плошчу каля 6–7 га[80].

Згадванне Копысі ў грамаце «Аб пагароддзі і пачэсціі» другой паловы XII ст. пацвярджае высокі сацыяльны статут гэтага паселішча, у якім названы толькі гарады Смаленскага княства. Копысь плаціла «пагароддзе» і «пачэсціе» ў суме 360 грыўняў, сярод гарадоў большую суму плацілі толькі княскія Таропец і Мсціслаў.

Безумоўна, горад павінен быў мець і адпаведную свайму статусу сельскую акругу. Аднак з усходу да яго прылягала воласць Басея, што ў пэўным сэнсе абмяжоўвала магчымасць пашырэння воласці Копысі на ўсход. За Дняпром даволі блізка праходзіла полацка-смаленскае памежжа, што таксама звужала межы воласці горада ў гэтым кірунку. Таму воласць Копысі, верагодна, была выцягнута ўздоўж Дняпра, па абодвух яго берагах. У яе складзе была пабудаваная ў пачатку XII ст. Орша, і далей тэрыторыя воласці ішла, верагодна, у бок іншых смаленскіх валасцей – Мірацічаў і размешчанай на правабярэжжы Дняпра воласці Вітрына[81].

Працэс фарміравання ўсіх гэтых адміністрацыйных цэнтраў на пасожскіх землях крывічоў аб'ядноўвае адна агульная рыса. Яны пачынаюць выкрышталізоўвацца сярод навакольных паселішчаў толькі пасля ўключэння іх у склад Смаленскай воласці Кіеўскай Русі, і ў гэтым выразна прасочваецца мэтанакіраваная дзейнасць княскай адміністрацыі па замацоўванні на гэтых землях феадальных адносін і ўпарадкаванні феадальнага фіска.

Значныя падзеі адбыліся на Пасожжы ў пачатку другой чвэрці XII ст. У 1125 г. былая Смаленская воласць Кіеўскай Русі вылучаецца ў самастойнае княства. У Смаленску пачынае княжыць Расціслаў Мсціславіч – родапачынальнік дынастыі смаленскіх князёў. Яго княжанне ў Смаленску (1125–1159) і Кіеве (1159–1167) было часам найбольшага росквіту і пашырэння Смаленскага княства, узрастання яго ролі ў агульных ўсходнеславянскіх справах. Мя-

---

[79] Археалогія Беларусі: у 4 т. – Мінск: Беларус. навука, 1997–2001. – Т. 3. – 2000. – С. 225; Левко О. Н. Новые исследования древней Копыси // Древняя история Восточной Европы. Сб. науч. статей, посвященных 80-летию профессора Э. М. Загорульского. – Мінск: БГУ, 2009. – С. 90.

[80] Коваленко Д. А. Историко-топографическое развитие городов Радзивиллов Копыси и Несвижа // Древности Белоруссии. – Мінск, 2003. – № 9. – С. 64–69; Яго ж. Изучение древнего посада Копыси // ГАЗ. – Мінск, 2007. – № 23. – С. 232–233.

[81] Мяцельскі А. А. Орша ў XII–XIII стст.: паміж Полацкам і Смаленскам // ГАЗ. – Мінск, 1995. – № 6. – С. 214–224.

жуючы на поўдні з Чарнігаўскай зямлёю, Смаленск уважліва сачыў за падзеямі, што адбываліся там, і чакаў зручнага моманту для таго, каб адарваць далёкія ад Чарнігава землі радзімічаў. І такая нагода хутка здарылася.

У 1127 г. Усевалад Ольгавіч чарнігаўскі распачаў усобіцу супраць Яраслава. За апошняга уступіўся Мсціслаў Уладзіміравіч кіеўскі – бацька Расціслава смаленскага. У бітве, што адбылася паміж Мсціславам і Усеваладам, апошні быў разбіты і уцёк. Усевалад пачаў прасіць міру ў Мсціслава, аднак той не пагаджаўся. Такое становішча працягвалася ўсё лета да зімы. Толькі пасля таго як у вырашэнні гэтай цяжбы прыняла ўдзел царква, Мсціслаў пагадзіўся на мір. Менавіта гэтым складаным становішчам Усевалада і скарыстаўся Расціслаў Мсціславіч, каб далучыць да свайго княства паўночныя землі радзімічаў[82]. Такім чынам адбыўся першы, аднак не апошні падзел Пасожжа і зямель радзімічаў паміж Смаленскім і Чарнігаўскім княствамі на карысць Смаленска.

Схематычны кірунак мяжы, што ўсталявалася паміж Чарнігавам і Смаленскам пасля 1127 г., дапамагае аднавіць Статут Расціслава Мсціславіча 1136 г. З яго мы даведваемся пра існаванне ў паўднёвых раёнах Смаленскай зямлі валасцей Заруб, Крэчут, Прупой.

Як паказалі даследаванні Статута Л. В. Аляксеевым, Заруб увайшоў у склад Смаленскага княства ў 1116 г., Крэчут і Прупой – у 1127 г. Сам Статут складзены ў 1136 г. і адлюстроўвае воласці Смаленскага княства, што выплочвалі даніну на карысць смаленскага епіскапа ў той час[83].

У міжрэччы Дзясны і Дняпра крайняй усходняй воласцю Смаленскай зямлі быў Заруб, які ў пісьмовых крыніцах XII–XIII стст. згадваецца двойчы. Першыя звесткі пра яго сустракаюцца ў Статуце Расціслава Мсціславіча, дзе Заруб названы сярод іншых валасцей, якія плацілі даніну князю: «... дани 30 гривен, а ис того епископу 3 гривны». Другі раз Зарубская воласць згадваецца ў сувязі са смерцю кіеўскага князя Расціслава Мсціславіча 14 сакавіка 1167 г. «в селе Рогнедине в Зарубе»[84]. Аналізуючы паходжанне назвы Заруб, Л. В. Алексееў выказаў меркаванне, што яна адлюстроўвае тэрыторыю, дзе праходзіла мяжа паміж чарнігаўскімі і смаленскімі землямі ў выглядзе драўляных умацаванняў[85], і таму яе трэба шукаць на памежжы Чарнігава і Смаленска.

Центр воласці Заруб вось ужо болей за сто гадоў шукаюць у падзясенскіх раёнах Смаленскай зямлі, дзе яго ўпершыню лакалізаваў Н. П. Барсаў[86]. І хаця з часам Н. П. Барсаў змяніў свой погляд і пачаў размяшчаць Заруб на Дняпры на поўдзень ад Оршы, што знайшло падтрымку П. В. Галубоўскага, погляды наступных даследчыкаў зноў вярнуліся да першапачатковай гіпотэзы

---

[82] Алексеев Л. В. Смоленская земля в IX–XIII вв. – С. 52.

[83] Алексеев Л. В. Устав Ростислава Смоленского. – С. 91.

[84] Древнерусские княжеские уставы. – С. 142; ПСРЛ. – Т. 7. – С. 80; Тамсама. – Т. 2. – Стб. 531.

[85] Алексеев Л. В. Западные земли домонгольской. Кн. 1. – С. 99.

[86] Барсов Н. П. Географический словарь Русской земли (IX–XIV ст.). – Вильна: Тип. А. Сыркина, 1865. – С. 78.

Н. П. Барсава[87]. Такое адзінадушша ў лакалізацыі летапіснага Заруба выклікана тым, што ў крыніцы згадваецца дадатковы арыенцір для яго пошукаў – сяло Рагнедзіна, у якім памёр Расціслаў.

Рагнедзіна – вельмі рэдкі тапонім і на тэрыторыі былога Смаленскага княства сустракаецца двойчы. Гэта сучасны аднайменны райцэнтр Бранскай вобласці Расіі і размешчанае ў гэтым жа раёне сяло Княгініна, якое мае і другую назву – Малое Рагнедзіна[88]. Гэты факт сапраўды звужае раён пошукаў летапіснага Заруба міжрэччам Дзясны і Іпуці ў межах іх плыні па тэрыторыі былой Смаленскай зямлі.

У пошуках летапіснага Заруба погляды даследчыкаў звычайна звяртаюцца ў бок археалагічнага комплекса ў в. Асавік Рагнедзінскага раёна Бранскай вобласці, размешчанага ў 19 км на поўнач ад сучаснага Рагнедзіна[89]. Гэта гіпотэза, упершыню выказаная П. А. Рапапортам, выклікала аргументаваныя пярэчанні Л. В. Алексеева, які адзначыў, што наяўнасць паміж Рагнедзінам і Асавіком тапоніма Пацынь, сугучнага назве другога летапіснага адміністрацыйнага цэнтра і горада Смаленскай зямлі XII–XIII стст., не дазваляе аб'яднаць іх у адну воласць і ідэнтыфікаваць Асавік з Зарубам[90]. Новыя аргументы, выдвінутыя Г. П. Паляковым для атаясамлення Асавіка з Зарубам, таксама не вытрымліваюць крытыкі[91].

Таму летапісны Заруб, як і прапанаваў Л. В. Аляксееў, трэба шукаць у міжрэччы Гоб'і і Бялізны, там дзе знахозяцца тапонімы Рагнедзіна, сугучныя назве летапіснага сяла, што было размешчана ў воласці Заруб[92].

У гэтай сувязі прыцягваюць увагу археалагічныя помнікі ў в. Навасёлкі Дубраўскага раёна Бранскай вобласці: гарадзішча XII–XIII стст. і прымыкаючае да яго селішча плошчай 4 га, на якім таксама ёсць матэрыялы XII–XIII стст.[93] Помнікі размешчаны на р. Агародня, правым прытоку р. Уса, якая з'яўляецца састаўной часткай басейна Іпуці і Сожа.

Навасёлкаўскі археалагічны комплекс, які па сваіх памерах саступае толькі паселішчу ў Асавіку, безумоўна, выконваў ролю адміністрацыйнага цэнтра воласці, размешчанай ў міжрэччы Гоб'і і Бялізны.

---

[87] Алексеев Л. В. Смоленская земля в IX–XIII вв. – С. 63; Барсов Н. П. Очерки русской исторической географии. География начальной (Несторовой) летописи. – 2-е изд. – Варшава: Тип. А. Ковалевского, 1885. – С. 315; Довнар-Запольский М. В. Очерк истории Кривичской и Дреговичской земель. – С. 98, прим. 78; Раппопорт П. А. О местонахождении смоленского города Заруба // КСИА. – 1971. – Вып. 129. – С. 21–23; Поляков Г. П. Село княжны Рогнеды // Песоченский историко-археологический сборник. – Вып. 2, ч. 2. – Киров, 1995. – С. 23–31; Голубовский П. В. История Смоленской земли. – С. 82.

[88] Алексеев Л. В. Смоленская земля в IX–XIII вв. – С. 128.

[89] Археологическая карта России. Брянская область. – С. 200–201, № 683–685.

[90] Алексеев Л. В. Домен Ростислава смоленского // Средневековая Русь. Сб. статей посвященный Н. Н. Воронину. – М.: Наука, 1976. – С. 58.

[91] Поляков Г. П. Село княжны Рогнеды. – С. 25–26; Метельский А. А. О местонахождении центра Зарубской волости Смоленской земли // ГАЗ. – Мінск, 1996. – № 10. – С. 62–64.

[92] Алексеев Л. В. Смоленская земля в IX–XIII вв. – С. 62.

[93] Археологическая карта России. Брянская область. – С. 64, № 147–148.

У гістарычнай літаратуры даўно замацавалася думка, упершыню выказаная П. В. Галубоўскім, пра лакалізацыю тут смаленскага горада Ізяслаўля, вядомага па грамаце «Аб пагароддзі і пачэсціі»[94]. Падставай для падобнай гіпотэзы стала наяўнасць у гэтым раёне сугучнага, як здавалася П. В. Галубоўскаму, тапоніма «Сеславль», каля якога размешчана гарадзішча. Але выказанае В. В. Сядовым сумненне пра лакалізацыю тут Ізяслаўля з-за малой плошчы гарадзішча прывяло да таго, што ў якасці рэшткаў Ізяслаўля пачалі разглядаць суседняе Навасёлкаўскае гарадзішча[95].

Аднак лакалізацыя тут Ізяслаўля, якая абапіраецца выключна на падабенства тапонімаў, не мае падстаў. Справа ў тым, што яшчэ ў пачатку XVI ст. гэта паселішча згадваецца пад іншай назвай – «Всеславль»[96]. Як бачым, паселішча насіла імя зусім іншага чалавека, чым Ізяслаў. Пад назвай «Сеславль» яно з'явілася пазней – у XVII ст.[97] Гэты факт аспрэчвае асноўны аргумент у спробах лакалізацыі Ізяслаўля ў дадзеным рэгіёне.

З іншага боку, размяшчэнне Навасёлкаўскага комплексу побач з тапонімам Рагнедзіна і яго тыпалагічнае падабенства (гарадзішча і размешчанае побач вялікае селішча) да іншых лакалізаваных адміністрацыйных цэнтраў Смаленскай зямлі дазваляе разглядаць Навасёлкаўскае паселішча як найбольш прыдатны помнік для атаясамлення яго з адміністрацыйным цэнтрам воласці, дзе знаходзілася сяло Рагнедзіна.

Адсутнасць у рэгіёне даследавання сугучных летапіснай воласці тапонімаў не павінна бянтэжыць, бо сама назва в. Навасёлкі сведчыць пра тое, што тут меў месца перапынак у існаванні паселішча. Верагодна, паселішча XII–XIII стст., першапачатковая назва якога да нас не дайшла, зноў адрадзілася пазней, але ўжо пад іншай назвай. Ва ўсякім выпадку, у пачатку XVII ст. Навасёлкі – новае паселішча – ужо існавалі[98].

Улічваючы факт наяўнасці побач з Навасёлкамі тапоніма Рагнедзіна, сугучнага назве летапіснага сяла, якое знаходзілася ў воласці Заруб, і тое, што цэнтры валасцей, як правіла, мелі аднолькавую назву з самой адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкай, можна меркаваць, што першапачатковае паселішча, што існавала каля в. Навасёлкі, называлася Зарубам і з'яўлялася цэнтрам Зарубскай воласці.

Археалагічныя даследаванні на Навасёлкаўскім гарадзішчы не праводзіліся, але даныя шурфовак датуюць найбольш раннія сярэдневяковыя матэрыялы XII ст.[99], што дазваляе меркаваць пра будаўніцтва сярэдневяковага паселішча

---

[94] Древнерусские княжеские уставы. – С. 146; Голубовский П. В. История Смоленской земли. – С. 78.

[95] Археологическая карта России. Брянская область. – С. 64; Седов В. В. Городища Смоленской земли // Древняя Русь и славяне. – М.: Наука, 1978. – С. 143–149; Поляков Г. П. Работы в Брянской области // АО 1983 года. – М.: Наука, 1985. – С. 76–77.

[96] АЗР. – Т. 1. – С. 55.

[97] Тамсама. – Т. 4. – С. 335, № 183–CXIII.

[98] Тамсама. – С. 333, № 183–XCVII.

[99] Археологическая карта России. Брянская область. – С. 64.

не раней за гэты час. Нельга выключыць, што, як і ў Копысі, фартыфікацыйныя збудаванні тут былі ўзведзены ў пачатку XII ст.

Воласць Заруб, верагодна, не была вялікай. Яна была абмежавана з поўначы і ўсходу валасцямі Пацыні і Рослаўля, ад якіх Навасёлкаўскае гарадзішча знаходзіцца на адлегласці адпаведна ў 40 і 35 км. З поўдня (прыкладна ў 40 км) яе падпірала мяжа з Чарнігаўскім княствам. На захадзе ўздоўж плыні р. Іпуць воласць Заруб межавала з воласцю Зарой. Тут насельніцтва, верагодна, жыло ўздоўж плыні р. Вароніца, на якой назіраецца канцэнтрацыя курганных могільнікаў і гарадзішчаў XII–XIII стст. Такім чынам, воласць Заруб ахоплівала тэрыторыю памерамі прыкладна 20 × 40 км, што адпавядае па плошчы прыкладна 800 кв. км.

Гістарычна-геаграфічныя даследаванні Л. В. Алексеева на тэрыторыі Полацкага і Смаленскага княстваў прадэманстравалі магчымасць выкарыстання для вызначэння межаў княстваў XII–XIII стст. тапонімаў з асновай «мяжа»[100].

Тамсама, у Зарубе, у міжрэччы Дзясны і Іпуці ёсць тапонім Межава, на поўдзень ад якога размешчаны чарнігаўскія гарады – Ушчыж і Варабейна. Сама ж мяжа паміж княствамі, верагодна, праходзіла ў лясістым масіве паміж рэкамі Бялізна і Угасць-Стаўбянка[101]. Апошняя з рэк, верагодна, адлюстроўвае мяжу з Чарнігаўскага боку.

Працягваючы нашы пошукі, мы бачым на захад ад Заруба, за Іпуццю, на поўдзень ад Крэчута, наступны тапонім з асновай «мяжа» – в. Мяжэнін у сучасным Клімавіцкім раёне Магілёўскай вобласці, якая вядома як мінімум з XVIII ст. А на поўнач ад яго, на тэрыторыі сучаснага Крычава, мы бачым умацаваны цэнтр XII–XVIII стст. Як адзначалася вышэй, першапачатковае неўмацаванае паселішча на тэрыторыі Крычава ўзнікла ў пойме Сожа. Аднак у выніку змены гідрарэжыму ў канцы XI ст. паселішча з поймы перайшло на былое гарадзішча жалезнага веку «Гарадзец», размешчанае на р. Крычаўка, у 300 м ад яе ўпадзення ў Сож, на якім сустракаюцца матэрыялы мяжы XI/XII–XIV стст.

Пачатак фарміравання аднаго з першых умацаваных паселішчаў на сярэднім Сожы на крычаўскім гарадзішчы «Гарадзец» можна растлумачыць не толькі наяўнасцю побач папярэдняга цэнтра, але і яго спрыяльным геаграфічным месцазнаходжаннем.

Прыкладна ў 10 км на поўнач ад гарадзішча «Гарадзец» з левага боку ў Сож упадае р. Асцёр, і такім чынам паселішча на Гарадцы кантралявала водны шлях па абедзвюм рэкам. Акрамя таго, крыху ніжэй Гарадца, таксама па левым прытоку Сожа – р. Лабжанка – пачынаўся волак на р. Беседзь.

---

[100] Алексеев Л. В. О распространении топонимов «Межа» и «Рубеж» в Восточной Европе // Славяне и Русь – М.: Наука, 1969. – С. 245–260.

[101] Списки населенных мест Российской империи составленные и изданные центральным статистическим комитетом Министерства внутренних дел. Т. XI. Смоленская губерния. – СПб.: 1868 – С. 362; Алексеев Л. В. Смоленская земля в IX–XIII вв. – С. 63; Шинаков Е. А. Русско-радимичское пограничье. – С. 262.

Менавіта праз сваё спрыяльнае геаграфічнае становішча паселішча на Гарадцы стала той кропкай, якая адначасова выдавала як цэнтрабежныя, так і цэнтраімклівыя імпульсы. Дзякуючы першым, пад прыкрыццём Гарадца ішло асваенне акругі; ад яго адгаліноўваліся новыя паселішчы, а астатнія, у сваю чаргу, пакідалі за ім ролю цэнтра акругі. Магчыма, першапачаткова гэта быў адзін з апорных пунктаў чарнігаўскай каланізацыі зямлі радзімічаў, а пасля ўваходу гэтых зямель у склад Смаленскага княства ён стаў апорным пунктам і адміністрацыйным цэнтрам апошняга на паўночных землях радзімічаў.

Паселішча на Гарадцы не было вялікім. Яно складалася з самога гарадзішча (плошчай 0,2–0,3 га) і прымыкаючага да яго селішча плошчай каля 1 га. Агульная плошча паселішча ў пачатку XII ст. складала каля 1,5 га (мал. 11, 12).

Адначасова з развіццём паселішча на Гарадцы з канца XI ст. фарміруецца нейкае неўмацаванае паселішча плошчай да 0,5 га і на беразе Сожа, прыкладна ў 0,5–0,7 км на паўднёвы ўсход ад Гарадца. Такім чынам, у пачатку XII ст. на тэрыторыі сучаснага Крычава, Крэчута 1136 г., існавала некалькі невялікіх паселішчаў агульнай плошчай каля 2 га. Гэта было адно з самых буйных паселішчаў свайго часу на Сярэднім Пасожжы, якое працягвала выконваць ролю адміністрацыйнага цэнтра акругі-воласці XII ст.



Мал. 11. Крычаў. План гарадзішча «Гарадзец» і селішча, што да яго прымыкае



Мал. 12. Гарадзішча «Гарадзец» у Крычаве

Дакладна вызначыць памеры воласці Крычава XII–XIII стст. немагчыма з прычыны адсутнасці пісьмовых крыніц. Толькі ўлічваючы размяшчэнне вакол Крычава іншых адміністрацыйных цэнтраў і помнікаў археалогіі XII–XIII стст., можна зрабіць спробу схематычна яе абмаляваць.

Кожны адміністрацыйны цэнтр меў адпаведную свайму статусу акругу. Вакол Крычава ў XII–XIII стст. знаходзіўся шэраг гарадскіх паселішчаў – Мсціслаў, Зарой, Прупой, Рослаўль – летапісны Расціслаўль. На захадзе, на р. Проня, магчыма, існавала яшчэ некалькі самастойных невялікіх валасцей. Адна вакол Радамлі, дзе ёсць гарадзішча і селішча з матэрыяламі XII–XIII стст., а другая – на Чавускім селішчы, дзе прасочваецца наяўнасць прадстаўнікоў феадальных вярхоў[102]. Улічваючы вышэйсказанае, паспрабуем, карыстаючыся метадам рэтраспекцыі, прыблізна акрэсліць межы воласці Крычава X–XIII стст.

Тут значную дапамогу аказвае нам копія абмежавання Крычаўскага старостваа, зробленая 7 лютага 1604 г. для караля Жыгімонта Вазы. Аднак само абмежаванне, як указана ў загалоўку крыніцы, было праведзена ў гады знаходжання Крычаўскай дзяржавы ў руках Андрэя Багданавіча Шалухі (1544–1563 гг.), хутчэй за ўсё ў 1560 г., калі на ўсходзе краіны праводзіліся рэвізіі дзяржаўных уладанняў. І такім чынам першакрыніца гэтага абмежавання адносіцца да 1560 г. Гэтым жа годам датуецца і інвентар размешчанага побач Магілёўскага староства, які таксама дазваляе вызначыць межы Крычаўскай дзяржавы.

Картаграфуючы вядомыя населеныя пункты, што цягнуліся да Мсціслава і Крычава ў XV–XVI стст., можна заўважыць, што яны падзяляюцца рэкамі Белая і Чорная Натапа. Супадзенне агульнага напрамку мяжы сярэдзіны XVI–XVII стст. з сучаснай мяжой паміж Мсціслаўскім і Крычаўскім раёнамі Магілёўскай вобласці дазваляе меркаваць, што яна вядзе сваё паходжанне з больш ранніх часоў і пачатак яе фарміравання трэба шукаць у XII–XIII стст., калі пачалі фарміравацца два размешчаныя побач гарадскія цэнтры.

На ўсход за Сожам картаграфія населеных пунктаў Крычаўскай воласці XVI ст. фіксуе даволі цікавую карціну. Па-першае, населеныя пункты Крычаўскай воласці XVI–XVII стст, размешчаныя за Астром, уваходзяць у скапленне курганных могільнікаў і селішчаў X–XIII стст., якія канцэнтруюцца каля Крычава ўздоўж р. Асцёр. Па-другое, ні адзін з іх не выходзіць за крывіцка-радзімічкае памежжа XI–XIII стст[103].

Такім чынам, за р. Асцёр мяжа воласці Крычава XII–XIII стст. у пэўнай ступені паддаецца рэканструкцыі. Яна адпавядала крывіцка-радзімічкаму памежжу і не выходзіла ў паўночным кірунку за плынь р. Сожанка, левага прытока р. Сож. Узнікшы ў XII–XIII стст., яна захоўвалася і ў больш познія часы. На Асцёр крычаўска-мсціслаўскае памежжа выходзіла, верагодна, у раёне су-

---

[102] Мельниковская О. П. Обследование древнего Радомля. – С. 60–62; Рыер Я. Р. Вясковае паселішча ў г. Чавусы. – С. 202–227.

[103] Шинаков Е. А., Гурьянов В. Н., Миненко В. В. Радимичи и вятичи на Десне // ГАЗ. – Мінск, 1998. – № 13. – С. 147, мал. 1.

часнай в. Мікуліна Шумяцкага раёна. На поўдзень ад яе крыніцы XVI–XVIII стст. адзначаюць крычаўскія вёскі. Верагодна, і крывіцка-радзіміцкае памежжа таксама выходзіла на р. Асцёр у гэтым раёне, бо на ўсход ад в. Мікуліна ў курганным могільніку каля в. Гнеўкава пачынаюць сустракацца крывіцкія пахаванні[104].

З заходняга боку ад Крычава згустак курганных могільнікаў, які цягнецца ўздоўж Сожа, даходзіць да вусця р. Воўчас і па ёй падымаецца ўверх. Прыкладна ў гэтым жа кірунку (паміж рэкамі Воўчас і Вудога) ішла мяжа 1560 г. паміж Крычаўскім і Магілёўскім староствамі. Такім чынам, можна таксама меркаваць, што заходняя мяжа воласці Крычава, вядомая з XVI ст., пачала функцыянаваць з XII–XIII стст.

Больш складана выглядае справа з лакалізацыяй усходняй і паўднёвай мяжы Крычаўскай воласці XII–XIII стст. На ўсход ад Крычава знаходзіўся летапісны Зарой, вядомы па падзеях 1154 г.[105], пра месца лакалізацыі якога гаворка будзе ісці ніжэй. На р. Асцёр знаходзіўся Рослаўль, згаданы ў грамаце «Аб пагароддзі і пачэсці» сярэдзіны XII – пачатку XIII ст. Яны, безумоўна, таксама мелі свае воласці, памеры якіх немагчыма дакладна рэканструяваць, бо на гэтых землях у XIV–XVI стст. адбыліся значныя адміністрацыйна-тэрытарыяльныя змены.

Адлегласць паміж Крычавам і летапісным Зароем складае прыкладна 55–60 км, Крычаў і Рослаўль размешчаны на адлегласці 90 км адзін ад аднаго. Канцэнтрацыя помнікаў археалогіі X–XIII стст., якія прылягаюць да Крычава з усходу, дасягае раёна сучасных вёсак Родня і Мілаславічы Клімавіцкага раёна, таму і ўсходнюю мяжу воласці Крычава XII–XIII стст., верагодна, трэба праводзіць каля гэтых вёсак.

На поўдзень ад Крычава бліжэйшым умацаваным паселішчам X–XIII стст. з'яўляецца гарадзішча ў в. Стары Дрокаў. Тут па крыніцах канца XV ст. вядома самастойная воласць Вялікага Княства Літоўскага – Дрокаўская. Але паміж Крычавам і Дрокавам у XV ст. існавала яшчэ адна воласць – Лучыцкая. Таму паўднёвую мяжу воласці Крычава XII–XIII стст., верагодна, трэба праводзіць па паўночнай мяжы Лучыцкай воласці-войтаўства XVII ст. Яна прыкладна маркіруецца па плыні р. Сянная, левага прытока Сожа. Потым яе працяг трэба шукаць каля сучасных вёсак Забялышын, Пячары, Ельня Касцюковіцкага і Хоцімскага раёнаў.

Акрамя таго, на карысць вызначэння паўднёвай мяжы воласці Крычава ў гэтым раёне сведчыць і той факт, што тут, у лясістым міжрэччы Сожа і Беседзі, праходзіла мяжа паміж юхнаўскімі і днепра-дзвінскімі плямёнамі ў эпоху ранняга жалезнага веку. У эпоху Сярэднявечча ў гэтым жа раёне праходзіла мяжа паміж Смаленскім і Чарнігаўскім княствамі, якая ўсталявалася ў 1127 г.[106]

---

[104] Седов В. В. Раскопки курганов в Верхнем Поднепровье. – С. 54–60.

[105] Мяцельскі А. Некаторыя пытанні гістарычнай геаграфіі Смаленскай зямлі. – С. 71–73.

[106] Алексеев Л. В. Смоленская земля в IX–XIII вв. – С. 52, мал. 5; Шадыра В. І. Аб паўднёвай мяжы днепра-дзвінскай культуры на Беларусі // ГАЗ. – Мінск, 1998. – № 13. – С. 90.

У гэтай сувязі цікавым з'яўляецца той факт, што прапанаваныя намі межы Крычаўскай воласці XII–XIII стст. цалкам ахопліваюць скапленне курганных могільнікаў у наваколлях Крычава[107], якое ўяўляе з сябе адзінае цэлае. Прапанаваныя намі межы воласці знаходзяцца на прыкладна аднолькавай адлегласці ва ўсе бакі ад Крычава – па 25–30 км. Такую адлегласць – 50–60 км у два бакі (выехаць з горада і вярнуцца дамоў) – мог пераадолець вершнік за дзень. Гэты факт таксама сведчыць пра магчымасць вызначэння менавіта такіх памераў акругі Крычава XII–XIII стст.

У межах вызначанай тэрыторыі курганныя могільнікі і паселішчы X–XIII стст. вядомы каля вёсак Вепрын, Вохар, Камаровічы і Гронаў Чэрыкаўскага раёна[108]; Ігнатаўка, Цітаўка, Савінічы, Рысін, Красавічы, Барысавічы, Сінеж, Гразівец, Вазнясенск, Дамамерычы, Хатовіж, Хадунь, Куляшоўка, Стары Дзедзін, Старыя Пранічкі, Іванаўск, Селішча, Бухаўка, Канахоўка, Рэкта, Асмолавічы, Патаронаўка, Мядзвёдаўка Клімавіцкага раёна. Курганныя могільнікі і рэшткі паселішча гэтага часу раней былі і ў саміх Клімавічах[109]. На землях крычаўскай воласці, што знаходзіліся на поўнач ад ракі Асцёр, археалагічныя помнікі X–XIII стст. вядомы каля вёсак Дарашкоўка, Дубраўка, Зімоніна, Каролішкі, Курганава, Ціхіль, Халмы Шумяцкага раёна Смаленскай вобласці[110]. На тэрыторыі сучаснага Крычаўскага раёна ў прапанаваных намі межах воласці Крычава XII–XIII стст. помнікі археалогіі X–XIII стст. вядомы каля вёсак Бель, Зарубец, Кашаны, Глушнеў, Зуі, Лабковічы, Паклады, пас. Крычаўскі-1, Бацвінаўка, Воўчас, Маляцічы, Стаборшчына, Вародзькаў-2, Ягораўка, Дзягавічы, Баяры і інш.[111]

Такім чынам, у склад воласці Крычава XII–XIII стст. уваходзіла рэчышча Сожа ад р. Белая Натапа да р. Воўчас з прытокамі Лабжанкай, Задабрасцю, ніжняй плынню р. Асцёр. З захаду яна была абмежаваная міжрэччам Воўчаса і Глінкі, з поўначы – рэкамі Белая Натапа і Сожанка. Паўднёвая мяжа ішла па лясістым міжрэччы Сожа і Беседзі. Усходняя мяжа воласці Крычава праходзіла, верагодна, па лініі Мілаславічы – Родня. Агульная плошча акругі-воласці Крычава XII–XIII стст. складала каля 2500 кв. км.

Далейшае сацыяльна-эканамічнае развіццё воласці Крэчута-Крычава прывяло да таго, што плошча гарадзішча «Гарадзец» ужо не задавальняла патрэбы цэнтра даволі вялікай воласці. Акрамя таго, яго знаходжанне некалькі ў баку ад гандлёвага шляху таксама не спрыяла яго развіццю. Усё гэта прывяло да таго, што ў другой палове XII – пачатку XIII ст. у Крычаве, на правым беразе Сожа пачынаецца будаўніцтва новага ўмацаванага цэнтра – гарадзішча «Замкавая гара».

---

[107] Риер Я. Г. Характер размещения сельского населения. – С. 109, рис. 1.

[108] Копытин В. Ф. Археологические памятники Чериковского района. – С. 29, 30, 32, 33.

[109] Копытин В. Ф. Археологические памятники Климовичского района. – С. 46–49, 51–64, 66–69, 71–75, 77–79, 81–87.

[110] Шмидт Е. А. Древнерусские археологические памятники Смоленской области. – Ч. 2. – С. 145–150, 155–156.

[111] Копытин В. Ф. Археологические памятники Кричевского района. – С. 22–45.

У гэтай сувязі цікавым з'яўляецца паданне, што існавала ў Крычаве яшчэ у XIX ст., у якім гаворыцца, што замак быў пабудаваны вялікім князем Мсціславам[112]. З вялікіх князёў, якія маглі мець адносіны да Крычава і насілі імя Мсціслаў, крыніцы ведаюць толькі двух – Мсціслава Уладзіміравіча і Мсціслава Раманавіча. Абодва былі вялікімі князямі ў Кіеве, аднак Мсціслаў Уладзіміравіч быў на кіеўскім стале ў пачатку XII ст., калі замка ў Крычаве яшчэ не было.

А вось Мсціслаў Раманавіч згадваецца як удзельны мсціслаўскі князь (1180 г.), а з 1197 па 1214 гг. займае смаленскі стол, пасля чаго князь Мсціслаў сеў на вялікае княжанне ў Кіеве[113].

Спалучэнне храналогій археалагічных крыніц і храналагічных дат жыцця і займання Мсціславам Раманавічам смаленскага стала дазваляе выказаць гіпотэзу, што менавіта па яго загадзе ў Крэчуце-Крычаве быў пабудаваны новы дзядзінец на беразе Сожа і менавіта яго імя захавалася ў паданні пра будаўніцтва замка.

Гарадзішча «Замкавая гара» ў Крычаве займала авальны холм памерамі 100 × 60 м. Яно ўзвышаецца на 10–15 м над узроўнем вады ў рацэ. З паўднёвага боку ад суседняга ўзвышша – Спаскай гары – Замкавая гара аддзелена натуральным ярам – Забялышчынскім, па дне якога працякае аднайменны ручай. З заходняга і паўночна-заходняга бакоў гарадзішча аддзелена ад берагавога плато шырокім, да 70 м ярам (мал. 13).

Штучныя земляныя абарончыя збудаванні – валы – прасочваюцца з паўночнага, заходняга і паўднёвага бакоў Замкавай гары. Яны маюць вышыню ад 1 м у паўднёвай частцы пляцоўкі гарадзішча да 7 м з заходняга боку. Найбольшая шырыня вала каля падэшвы дасягае 15 м. З усходняга боку абарончыя валы адсутнічаюць. Тут надзейнай абаронай замку служыла рака Сож.

Прарэзка вала, зробленая у 1974 г. М. А. Ткачовым з заходняга боку гарадзішча, паказала, што першапачатковы абарончы вал Замкавай гары быў насыпаны з жоўтай гліны, меў вышыню 1,5 м, шырыню падэшвы каля 8,5 м і круцізну знешняга схілу 40–45%. З унутранага боку вал меў ступеньчаты профіль (мал. 14).

Падчас прарэзкі ў ядры вала не былі зафіксаваны ніякія драўляныя канструкцыі. У той жа час у раскопе 7 (1999 г.), які прымыкаў да прарэзкі вала М. А. Ткачова, але быў разбіты з такой ўмовай, што прарэзваў толькі першапачатковы вал, у профілі вала былі прасочаны рэшткі драўляных канструкцый, заглыбленых у вяршыню першапачатковага вала на 0,6 м. На жаль, іх канструкцыйныя асаблівасці не удалося прасачыць – не было магчымасці пашырыць раскоп, а ад прасочаных канструкцый захавалася толькі вугальная праслойка.

---

[112] Сведения о городищах и курганах за 1873 год // Известия Императорской археологической комиссии. – СПб., 1903. – Вып. 5. – С. 62.

[113] Алексеев Л. В. Смоленская земля в IX–XIII вв. – С. 233.



Мал. 13. Тапаграфія Крычава XII–XIII стст.: *1* – Гарадзец; *2* – Замкавая гара; *3* – Спаская гара



Мал. 14. Крычаў. Гарадзішча Замкавая гара. Прарэзка вала паводле М. А. Ткачова: *1* – дзірван; *2* – культурны слой XII–XVIII стст.; *3* – праслойкі культурнага слоя ў ядры вала; *4* – пясок; *5* – бярвенні; *6* – гліна

Шырыня збудавання, мяркуючы па памерах вугальнай праслойкі, дасягала 3,8 м. На версе вала, безумоўна, былі драўляныя сцены. Улічваючы, што плоская пляцоўка на версе вала дасягала амаль 3 м у шырыню, можна меркаваць, што там стаялі сцены зрубнай канструкцыі. Самі сцены, магчыма, складаліся з дзвюх частак: ніжняй – апорнай, якая верагодна, складалася з чатырохсценных зрубаў-клецяў, і верхняй – паўадкрытай баявой пляцоўкі з брустверам,

крытым дахам, якія ў летапісах называюцца забароламі і шырока вядомы на археалагічных помніках XII–XIII стст. З мэтаю спынення апаўзання вала яго знешні схіл быў абкладзены дзірваном, пра што сведчыць гумусаваная паверхня схілу.

Першапачатковыя абарончыя збудаванні Крычава загінулі ў агні, пасля чаго вал быў падняты на вышыню да 3,2 м і меў шырыню каля падэшвы блізу 12 м. Дзеля захавання памераў пляцоўкі гарадзішча вал пашыраўся ў бок берагавога плато. Гэту рэканструкцыю М. А. Ткачоў датаваў XIII ст., бо ў падсыпцы ім была знойдзена кераміка, характэрная для гэтага часу. Новы вал быў насыпаны з буйназярністага пяску, а зверху умацаваны глінянай праслойкай магутнасцю да 0,3 м, якая, у сваю чаргу, была абкладзена дзірваном. Як і папярэдні, гэты вал з унутранага боку меў ступеньчаты профіль, прычым шырыня ступенькі па памерах засталася амаль роўнай папярэдняй. Са знешняга боку вала была зроблена берма шырынёю 1 м.

Абарончыя збудаванні гэтага перыяду таксама згарэлі ў агні, і іх канструкцыйныя асаблівасці прасачыць не ўдалося. Толькі на ўнутраным схіле вала і на краі верхняй пляцоўкі са знешняга боку захаваліся рэшткі згарэлых бярвенняў, што ляжалі ўздоўж яго трасы адно над адным. Верагодна, гэта альбо рэшткі бярвенняў накатаў рашотчатай канструкцыі, альбо астанцы зрубаў.

Пісьмовыя звесткі пра планіроўку і забудову дзядзінца Крычава XII – пачатку XVII ст. адсутнічаюць. Толькі падчас археалагічных даследванняў 1974 і 1976 гг. М. А. Ткачоў адзначае наяўнасць у слаях XII–XIII стст. у паўднёвай частцы Замкавай гары рэшткі 6 пабудоў зрубнай канструкцыі, размешчаных уздоўж трасы вала.

Адносна планіроўкі пасадаў Крычава XII–XIII стст. можна канстатаваць толькі тое, што ландшафтныя асаблівасці мясцовасці, у якой узнік Крычаў, акрэсленай з трох бакоў гідраграфічнай сеткай, абумовілі і яго тапаграфію. Горад узнік і развіваўся на працягу доўгага часу як горад паўкруглага тыпу, які размяшчаўся ўздоўж Сожа, меў крэпасць і пасады, месцаразмяшчэнне якіх было вызначана абарончымі магчымасцямі мясцовасці.

Крычаў ад самага пачатку сваёй гісторыі фарміраваўся па прынцыпах развіцця ўсходнеславянскага горада, які звычайна складаўся з дзядзінца (ядра горада) – Замкавай гары, гандлёвай плошчы і пасадаў.

Цэнтрам гарадской кампазіцыі з'яўляўся дзядзінец, вакол якога фарміраваліся пасады. Археалагічныя даследаванні, праведзеныя на плато, якое прылягала да Замкавай гары, паказалі, што найбольш ранні культурны слой магутнасцю ад 0,4 да 1,2 м сустракаецца на Спаскай гары, якая знаходзіцца на поўдзень ад замка.

Спаская гара пачала прыцягваць увагу людзей яшчэ ў эпоху жалезнага веку. Тут знойдзена ляпная кераміка, аналагічная кераміцы з другога стратыграфічнага слоя гарадзішча Гарадзец, якая адносіцца да эпохі II–IV стст. н. э.

Найбольш раннія сярэднявечныя матэрыялы, знойдзеныя тут, прадстаўлены асобнымі фрагментамі шкляных бранзалетаў, керамікай, якая дазваляе

меркаваць, што фарміраванне пасада пачалося тут недзе ў другой палове XII – пачатку XIII ст., але больш інтэнсіўна ён пачаў развівацца з XIV ст.

Мяркуючы па распаўсюджанні керамікі, пасад на Спаскай гары цягнуўся даволі вузкай паласою (шырынёй да 30–50 м) уздоўж цячэння Сожа на 70–100 м. Такім чынам, першапачаткова, у канцы XII – пачатку XIV ст., ён займаў плошчу каля 0,2–0,5 га. Акрамя таго, у гэты час яшчэ працягвала функцыянаваць неўмацаванае паселішча на Гарадцы, якое займала каля 0,7 га. Такім чынам, агульная плошча паселішчаў у Крычаве напрыканцы XIII ст, верагодна, складала каля 1,5 га[114].

На захад ад Крэчута Статут Расціслава Мсціславіча 1136 г. называе нам наступны цэнтр Смаленскага княства – Прупой, сучасны Слаўгарад.

Як адзначалася вышэй, цэнтр воласці пачаў фарміравацца тут яшчэ у X–XI стст., і ў XI ст. гэта, верагодна, быў адзін з пунктаў чарнігаўскай адміністрацыі на землях радзімічаў.

З уключэннем гэтых зямель у склад Смаленскага княства Прупой апынуўся на смаленска-чарнігаўскай мяжы, і гэта выклікала неабходнасць умацаваць яго фартыфікацыйныя збудаванні. Таму ў XII ст., як паказалі даследаванні М. А. Ткачова, на Замкавай гары Слаўгарада ўзводзяцца драўняна-земляныя абарончыя збудаванні вышынёю 2 м і шырынёю 8 м.

Адначасова з будаўніцтвам новых фартыфікацыйных збудаванняў у XII ст. на поўнач ад гарадзішча пачынае фарміравацца селішча, якое ў XIII ст. перасягнула яр, які знаходзіўся на захад ад гарадзішча. У XIII ст. яно займала плошчу каля 2 га.

У XII ст. працягваецца асваенне прылеглых да Замкавай гары Прупоя тэрыторый. Курганы XII ст. вядомы ў паднёвай частцы Слаўгарада, каля вёсак Васькавічы, Курганаўка, Чырвоная Слабада, Завад-Віравая, Дубна, на беразе воз. Узмутнае. Селішчы гэтага часу ўзнікаюць на дзюнах у пойме р. Проня. Два паселішчы і некалькі курганных могільнікаў вядомы каля в. Гайшын. Селішчы ўзнікаюць каля вёсак Аляксандраўка-2, Ушакі, Журавель. Працягваюць існаваць паселішчы каля вёсак Рудня, Дубна, Дубовіца[115].

Адсутнасць у бліжэйшым наваколлі ад Слаўгарада (ў радыусе 30–40 км) іншага археалагічнага помніка XII–XIII стст., які па сваіх тыпалагічных прыкметах прэтэндаваў бы на ролю адміністрацыйнага цэнтра, дазваляе разглядаць частку гэтых помнікаў як састаўную частку воласці Прупоя.

Нягледзячы на невялікі памер даніны, якую выплочваў Прупой, ён размяшчаўся на даволі значнай гандлёвай развілцы. З яго не толькі адкрываўся шлях па Сожы і Проні, але і паварочваў па р. Сянная (прыкладна ў 18 км на

---

[114] Мяцельскі А. А. Старадаўні Крычаў. – С. 33, 36, 39, 40.

[115] Фурсов М. В. Дневник курганных раскопок. – С. 35, 36; Поликарпович К. М. Стоянки среднего Посожья // Материалы по археологии БССР. – Минск: Изд-во Акад. наук БССР, 1957. – Т. 1. – С. 65, 66, 71, 83–86; Артеменко И. И. Среднеднепровская экспедиция // АО 1968 года. – М.: Наука, 1969. – С. 342; Алексеев Л. В. Раскопки курганов в Восточной Белоруссии. – С. 45–50; Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Магілёўская вобласць. – Мінск: БелСЭ, 1986. – С. 328–329.

ўсход ад Прупоя) ў глыбінныя раёны зямлі радзімічаў. Сведчаннем гэтага з'яўляецца вялікая колькасць курганных могільнікаў і рэшткаў паселішчаў XI–XIII стст. у вусці р. Сянная. Каля сучасных вёсак Ушакі, Абакумаўка, Крамянка, Аляксандраўка-2 нават у канцы XIX ст. налічвалася амаль 300 курганоў, а 246 недаследаванных курганных насыпаў існуюць і зараз на беразе воз. Узмутнае, былой старыцы Проні, каля яе ўпадзення ў Сож. Безумоўна гэтыя курганныя могільнікі з'яўляюцца сведкамі існаваўшых тут паселішчаў, якія кантралявалі і абслугоўвалі пачатак шляху з р. Сож на рэкі Проня і Сянная.

Магчыма, воласць Прупоя ў XII–XIII стст. на захадзе ахоплівала землі радзімічаў у міжрэччы Сожа і Дняпра, якія ўвайшлі ў склад Смаленскага княства. Усходнюю мяжу воласці Прупоя, верагодна, мэтазгодна шукаць уздоўж заходняй мяжы воласці Крычава – ўздоўж р. Глінка і Воўчас. А на левабярэжжы Сожа – уздоўж плыні р. Палуж. Паўночную мяжу воласці Прупоя, верагодна, трэба шукаць на Проні паміж Прупоем і Радамлей, у якой таксама ёсць умацаваны цэнтр XII–XIII стст.

Паўднёвую мяжу воласці Прупоя і адпаведна смаленска-чарнігаўскае памежжа звычайна на Сожы праводзяць паміж Прупоем і Чачэрскам, не ўдакладняючы канкрэтна яе месцапраходжанне. Між тым у Іпацьеўскім летапісе ёсць вельмі цікавае паведамленне, якое дазваляе больш дакладна правесці мяжу паміж княствамі.

У 1167 г. Расціслаў Мсціславіч едзе Сожам з Кіева ў Ноўгарад. За Чачэрскам яго сустракалі смаляне. Прычым у летапісе адзначана прыблізнае месца сустрэчы – за 300 вёрст ад Смаленска[116].

Л. В. Аляксееў не надаў увагі гэтаму паведамленню. На яго думку, як бы Расціслаў ні ехаў з Чачэрска ў Смаленск, такой адлегласці паміж імі няма[117]. Між тым нашы падлікі паказваюць, што 300 верст XII ст. – гэта сучасныя 372 км.

Калі ехаць са Смаленска ў Чачэрск менавіта Сожам, то гэта адлегласць прыводзіць нас у сучасны Кармянскі раён Гомельскай вобласці, размешчаны паміж Слаўгарадам і Чачэрскам, дзе звычайна і праводзяць мяжу паміж цікавымі для нас княствамі.

У гэтай сувязі цікавым з'яўляецца той факт, што ў пачатку XVI ст. мяжа паміж чачэрскай і прапойскай валасцямі таксама праходзіла ў гэтай мясцовасці. На Сожы самым паўночным чачэрскім сялом крыніцы называюць в. Струмень, а прапойскім – Валынцы[118], і яны размешчаны прыкладна ў 360–380 км ад Смаленска, калі плыць Сожам.

---

[116] ПСРЛ. – Т. 2. – Стб. 528.

[117] Алексеев Л. В. Смоленская земля в IX–XIII вв. – С. 214.

[118] НГАБ. – Ф. 694. – Воп. 4. – Адз. зах. 1556. – Арк. 36; СИРИО. – Т. 35. – Памятники дипломатических сношений древней России с державами иностранными по высочайшему повелению изданные Императорским Русским историческим обществом. Памятники дипломатических сношений Московского государства с Польско-Литовским государством. – Т. 1. (1487–1533). – Изд. 2. – СПб., 1892. – С. 751–752.

Улічваючы, што захаванне старажытных традыцый і мясцовага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу ў XIV–XVI стст. было адным з прынцыпаў дзейнасці вялікіх літоўскіх князёў у адносінах да «рускіх зямель», нельга выключыць, што мяжа XVI ст. паміж валасцямі адлюстроўвае мяжу больш ранняга часу. На карысць гэтай думкі, на наш погляд, сведчыць і той факт, што Валынцы замыкаюць сабою ланцужок помнікаў X–XIII стст., што цягнуцца сюды ад Прупоя.

Такім чынам, паўднёвую мяжу воласці Прупоя і смаленска-чарнігаўскую мяжу XII–XIII стст. на Сожы, верагодна, трэба праводзіць паміж вёскамі Струмень і Валынцы Кармянскага раёна Гомельскай вобласці і даводзіць яе да плыні р. Палуж.

Падзел зямель радзімічаў, які адбыўся ў 1127 г., на працягу ўсяго XII ст. заставаўся незагойнай ранай у адносінах паміж Смаленскам і Чарнігавам. Пра тое, што падзеі 1127 г. не былі забытыя яшчэ і напрыканцы XII ст., яскрава сведчыць летапіснае паведамленне 1190 г.

У гэты год Рурык Расціславіч едзе з Кіева ў Оўруч і пакідае ў апошнім для аховы ад полаўцаў паўднёвых раёнаў Русі свайго сына. Пра арганізацыю аховы паўднёвых раёнаў Русі ён прасіў і чарнігаўскага князя Святаслава Усеваладавіча. Той таксама збіраўся паслаць на рубяжы свайго сына, але не паслаў: «зане бышеть ему тяжа с Рюриком и с Давыдом и Смоленской землёю». Далей ў тэксце ёсць вельмі важнае ўдакладненне. Гэтая «тяжа» паміж Смаленскам і Чарнігавам цягнецца з часоў Расціслава – «пакы не паминеш давния тяжа которыи были при Ростиславе»[119].

Рурык нагадваў Святаславу, што гэта пытанне ўжо падымалася пры Рамане і што пры апошнім было заключана нейкае пагадненне: «... ти брате нам крест целовал на Романове ряде...», у выніку якога, за нейкія невядомыя нам саступкі, Святаслаў сеў на кіеўскі вялікакняскі стол. Рурык падкрэсліваў, што сысці з «Раманава ряду» ён не дазволіць і вяртаў Святаславу яго хросныя граматы, што азначала пачатак вайны[120].

Яшчэ П. В. Галубоўскі ў канцы XIX ст. адзначыў, што спрэчкі ішлі з-за памежных валасцей па берагах Іпуці і верхняй Дзясны[121]. Л. В. Аляксееў хоць і пагадзіўся з П. В. Галубоўскім аб прычынах спрэчак, аднак не звязаў гэта летапіснае паведамленне з прапанаванымі ім падзеямі, якія адбыліся паміж Чарнігавам і Смаленскам у 1127 г.[122]

Захоп у 1127 г. Смаленскам паўночных зямель радзімічаў не быў адзіным наступам Расціслава на Чарнігаўскую зямлю. Пра тое, што смаленска-чарнігаўскае парубежжа ў XII ст. не было стабільным, упершыню выказаў думку А. М. Насонаў. Ён браў для прыкладу летапіснае паведамленне 1195 г. Аднак узаемаадносіны, адлюстраваныя пад гэтым годам паміж Смаленскім і Чарні-

[119] ПСРЛ. – Т. 2. – Стб. 670.

[120] Тамсама.

[121] Голубовский П. В. История Смоленской земли. – С. 283.

[122] Алексеев Л. В. Смоленская земля в IX–XIII вв. – С. 225.

гаўскім княствамі, немагчыма лакалізаваць геаграфічна, і адносяцца яны ў асноўным да барацьбы за Віцебск[123].

Лепш за ўсё змяненні на смаленска-чарнігаўскім памежжы адлюстроўваюць падзеі 1142 г., калі Расціслаў Мсціславіч накіраваў свае дружыны супраць Ігара і Святаслава Ольгавічаў «и взя около Гомия волость их всю»[124]. Л. В. Аляксееў лічыў, што падзеі 1142 г. адлюстроўваюць часовы захоп Расціславам валасцей Ольгавічаў. Потым, на яго думку, Расціслаў быў вымушаны вярнуць гэтыя землі, але даследчык не прывёў ніякіх доказаў[125]. Паспрабуем разглядзець гэтае пытанне ў кантэксце ўсіх падзей, што адбываліся ў гэтым рэгіёне ў сярэдзіне XII ст.

Пасля смерці ў 1139 г. Яраслава Уладзіміравіча Усевалад Ольгавіч займае кіеўскі стол і адразу ж заключае пагадненне з Ізяславам Мсціславічам пра перадачу яму Кіева пасля сваёй смерці ў абыход Ольгавічаў, братоў Усевалада.

На гэты крок яго вымусіла патрэба засцерагчы сябе ад хаўруса смаленскіх Мсціславічаў з Юрыем Далгарукім: «Не токмо ныне надлежащими владениями все удовольствую, но и после смерти моеи Киева мимо тебя ни сыну моему не отдам. Токмо вы не сосочайтесь противо меня со стрыями вашими»[126].

Аднак адразу ж пасля гэтага Усевалад сам пачаў барацьбу дзеля выгнання Ізяслава з Валыні, а Расціслава са Смаленска[127]. У выніку азартнага гандлю гарадамі і валасцямі, які вёўся ў княжанне Усевалада, Мсціславічы неаднаразова аказваліся на баку Усевалада і нават выступалі разам з ім супраць яго братоў – Ольгавічаў. Так адбылося ў 1141–1142 гг., калі Мсціславічы выступілі супраць Ігара і Святаслава разам з Усеваладам[128].

У адрозненне ад Іпацьеўскага летапісу ў Лаўрэнцьеўскім і Радзівілаўскім летапісах адносна падзей 1142 г. гаворыцца, што Расціслаў узяў у Ольгавічаў 4 гарады, а пра Гомій няма ніякіх звестак[129]. В. М. Таціщаў дапаўняе гэтыя летапісы і дадае, што Расціслаў «пожег все села около Гомия»[130].

Некаторыя ўдакладненні пра падзеі гэтага года ёсць у Патрыяршым летапісе і Маскоўскім летапісным зборы канца XV ст. У іх гаворыцца, што Расціслаў узяў 4 гарады Ігара, а наконт страт Святаслава нічога не паведамляецца[131].

Пра тое, што страты Ольгавічаў (верагодна, толькі Ігара) былі значнымі, і захопленыя воласці назаўжды перайшлі ў склад Смаленскага княства, свед-

---

[123] ПСРЛ. – Т. 2. – Стб. 690–699; Насонов А. Н. «Русская земля» и образование территории древнерусского государства. Истор.-геогр. исследование. – М.: Изд-во Акад. наук СССР, 1951. – С. 66.

[124] ПСРЛ. – Т. 2. – Стб. 311.

[125] Алексеев Л. В. Смоленская земля в IX–XIII вв. – С. 52.

[126] Татищев В. М. История Российская: в 7 т. – М.; Л.: Изд-во Акад. наук СССР, 1963. – Т. 2. – С. 151.

[127] ПСРЛ. – Т. 1. – Стб. 307–308; Тамсама. – Т. 2. – Стб. 304–306; Татищев В. М. История Российская. – Т. 2. – С. 152.

[128] ПСРЛ. – Т. 2. – Стб. 310–313.

[129] Тамсама. – Т. 1. – Стб. 310; Тамсама. – Т. 38. – С. 111.

[130] Татищев В. М. История Российская. – Т. 2. – С. 153.

[131] ПСРЛ. – Т. 25. – С. 36; Тамсама. – Т. 29. – С. 166.

чыць, на наш погляд, артыкул пра пераход у спадчыну кіеўскага вялікакняскага стала. У поўным аб'ёме ён ёсць толькі ў В. М. Таціщава (1143 г.), а ў скарочаным выглядзе захаваўся ў Іпацьеўскім летапісе (1145 г.)[132].

На сходзе Усевалад абяцае аддаць Кіеў Ігару. Усе з гэтым пагадзіліся, акрамя Ізяслава. Ён нагадвае Усеваладу: «Отче! Ты прежде обещал мне Киев после себя отдать, а ныне отдаешь иному». На гэта Усевалад яму адказваў: «Я тебе с начала то обесчал, а ты обесчался меня как отца почитать и быть в воли моей. Но после согласяся со стрыями твоими на меня и моих братьев воевал, того ради тебе не достоит»[133].

Паміж 1139 г., калі Усевалад абяцаў Кіеў Ізяславу, і 1143 г., калі ён аддае яго Ігару, ёсць толькі адна дата, якая магла быць пераломнай у змене яго абяцанняў. Гэта захоп у 1142 г. Расціславам валасцей Ольгавічаў (Ігара). Не выпадкова, што пасля кароткачасовай барацьбы, якая, верагодна, пачалася з-за гэтых валасцей, Ігар пачынае перамовы з Ізяславам, а той адмаўляецца іх весці без ведама Усевалада і Расціслава. З'яўленне на перамовах Усевалада зразумела – вялікі князь і брат Ігара. А вось з'яўленне тут Расціслава можа быць растлумачана толькі захопам ім валасцей Ігара. Ад яго волі ў значнай ступені залежала, аддаць іх ці не. Верагодна, адмова Расціслава вярнуць Ігару захопленыя землі вымусіла Усевалада патаемна абяцяць Ігару Кіеў, каб нейкім чынам кампенсаваць яго страты і адначасова захаваць на сваім баку Ізяслава[134].

Гэтыя разважанні дазваляюць сцвярджаць, што воласці, захопленыя Расціславам ў 1142 г. у Ігара, назаўжды засталіся за Смаленскім княствам. Дзе яны маглі размяшчацца?

Гомій і пасля 1142 г. у летапісах згадваецца як чарнігаўскі горад, і яго прыналежнасць да Чарнігаўскай зямлі не выклікае сумненняў. На поўнач ад Гомія знаходзіўся Чачэрск, які таксама ўвесь час фігуруе як чарнігаўскі горад. На ўсход і паўночны усход ад Гомія размяшчаюцца чарнігаўскія гарады Старадуб, Сіні Мост (1155 г.), Расуха (1160 г.), Ворміна (1142 г.), Варабейна (1147 г.). Картаграфуючы гэтыя безумоўна чарнігаўскія гарады і смаленска-чарнігаўскае памежжа 1127 г., мы бачым паміж імі даволі шырокую «нейтральную» тэрыторыю, якая не згадваецца ў крыніцах XII ст. Ці не маглі воласці Ольгавічаў, захопленыя Расціславам у 1142 г., размяшчацца менавіта тут, у міжрэччы Беседзі і Іпуці?

Воласці Святаслава Ольгавіча прасочваюцца даволі добра. Напярэдадні 1142 г. ён валодаў Старадубам, Карачавым, Белгарадам і Ноўгарад-Северскім. Уладанні ж Ігара прасочваюцца дрэнна[135].

Зыходзячы з таго, што ў 1142 г. страты панёс адзін Ігар, а Гомій, Старадуб і Ворміна (не гаворачы пра больш паўднёвыя гарады) і пасля 1142 г. належалі Чарнігаўскай зямлі, гіпатэтычна можна выказаць думку, што ўладанні Ігара

---

[132] ПСРЛ. – Т. 2. – Стб. 317–318; Татищев В. М. История Российская. – Т. 2. – С. 156–157.

[133] Татищев В. М. История Российская. Т. 2. – С. 157.

[134] Тамсама. – С. 155–156.

[135] Рапов О. М. Княжеские владения на Руси в X – первой половине XIII веков. – М.: Изд-во Моск. ун-та, 1971. – С. 106–107.

размяшчаліся ў міжрэччы Іпуці і Сожа і што менавіта гэтыя землі былі захоплены Расціславам ў 1142 г. (мал. 15).

І падставы для такіх меркаванняў ёсць. Па-першае, у гэтым рэгіёне ў другой палове XII ст. згадваюцца некаторыя смаленскія населеныя пункты. Па-другое, у больш позні перыяд тут знаходзіліся воласці Мсціслаўскага ўдзельнага княства XIV–XV стст. Аднак археалагічныя назіранні паказваюць, што пачатак іх фарміравання адносіцца да больш ранняга часу.



Мал. 15. Паўднёва-заходнія раёны Смаленскай зямлі XII–XIII стст.

Адным з такіх населеных пунктаў, што згадваецца ў летапісах, з'яўляецца Зарой. Населены пункт з падобнай назвай ў пісьмовых крыніцах згадваецца аднойчы. У 1154 г., даведаўшыся пра смерць кіеўскага князя Ізяслава Мсціславіча, Юрый Далгарукі пайшоў на Кіеў, дзе сеў на стол ягоны брат Вячаслаў з Расціславам смаленскім. Каля Смаленска яго сустрэлі новыя звесткі: «... брат ти умерл Вячеслав, а Ростислав побежен, а Изяслав Давыдович седить Киеви». Даведаўшыся пра гэта, «... Гюрги поиде в волости Ростиславли. Ростислав же услыша тое и тако скупя вои своя многое множьство, исполця полкы своя и поиде противу ему к Зарою»[136].

Згодна з гэтым паведамленнем, Расціслаў, які збег з Кіева, павінен быў недзе сабраць войскі і толькі пасля гэтага ісці супраць Юрыя «к Зарою». Дзе знаходзіўся гэты Зарой і дзе Расціслаў мог сабраць войскі?

У сярэдзіне XIX ст. М. П. Барсаў, не знайшоўшы на тэрыторыі Смаленскага княства сугучныя летапіснаму пункту тапонімы, прапанаваў лакалізаваць яго ў в. Разрытая (суч. в. Корсікі) на р. Іпуць у сучасным Ершыцкім раёне Смаленскай вобласці[137]. Пазней І. І. Арлоўскі нават удакладніў месцазнаходжанне гарадзішча летапіснага Зароя: «на том месте где сейчас церковь и кладбище»[138]. Гэты пункт гледжання быў прыняты П. В. Галубоўскім, А. М. Насонавым, В. В. Сядовым і некаторымі іншымі даследчыкамі. Выключэннем з'яўлялася толькі думка А. В. Кузы, які, не патлумачыўшы на якой падставе, размясціў Зарой на гарадзішчы каля в. Уварава ля вытокаў р. Дзясна[139].

Л. В. Аляксееў, адзначыўшы, што погляд М. П. Барсава не можа быць прынятым з-за антытэзы сэнсу прапанаванай назвы, пагадзіўся з ім, што тапонім Зарой на тэрыторыі Смаленскага княства адсутнічае, і выказаў меркаванне, што летапісны Зарой – гэта «сапсаваны» пры перапісцы Заруб, вядомы па Статуце 1136 г.[140]

Між тым вывучэнне карт і спісаў населеных пунктаў Расійскай імперыі канца XVIII – пачатку XX ст. паказала, што на тэрыторыі былога Смаленскага княства такія тапонімы ёсць. Яны сустракаюцца ў Клімавіцкім уездзе Магілёўскай губерні. Два з іх, Зарой-1 і Зарой-2, яшчэ ў канцы XX ст. знаходзіліся на тэрыторыі Лазовіцкага сельсавета Клімавіцкага раёна Магілёўскай вобласці, а адзін знаходзіўся ў 15–20 км на паўночны ўсход на тэрыторыі Мілаславіцкага сельсавета гэтага ж раёна[141]. Найбольш ранні з Зарояў існаваў на тэрыторыі сучаснага Лазовіцкага сельсавета. Ён паказаны яшчэ на Генеральным плане Клімавіцкага ўезда 1784 г.[142]

---

[136] ПСРЛ. – Т. 2. – Стб. 476–477.

[137] Барсов Н. П. Географический словарь Русской земли. – С. 75.

[138] Орловский И. И. Краткая география Смоленской губернии. – Смоленск, 1907. – С. 172.

[139] Голубовский П. В. История Смоленской земли. – С. 56, 79; Насонов А. Н. «Русская земля» и образование территории... – Карта; Седов В. В. Смоленская земля. – С. 250–258; Куза А. В. Малые города Древней Руси. – М.: Наука, 1989. – Карта.

[140] Алексеев Л. В. Домен Ростислава смоленского. – С. 57.

[141] Список населенных мест Могилевской губернии. – Могилев: Могилев. стат. ком., 1910. – С. 74, 78.

[142] РДАСА. – Ф. 1356. – Воп. 1. – Адз. зах. 2113.

Аднак археалагічнае абследаванне тэрыторыі Клімавіцкага раёна паказала адсутнасць у яго межах умацаваных паселішчаў X–XIII стст. Гэта дазваляе выказаць меркаванне, што найбольш ранні тапонім Зарой быў калісьці заснаваны перасяленцамі з летапіснага Зароя і захаваў на працягу стагоддзяў яго назву. Падобную карціну, калі нанова ўзніклае паселішча захоўвае назву старога, археалагічныя помнікі якога размешчаны адносна недалёка ад першага, мы неаднаразова сустракаем на тэрыторыі былой Смаленскай зямлі[143].

Падобную сітуацыю мы назіраем ў адносінах да летапіснага Красна (археалагічны комплекс каля в. Звяровічы) і размешчанага прыкладна ў 18 км ад яго сучаснага горада Краснага. На Дзясне падобная карціна назіраецца ў адносінах да летапіснай Пацыні (археалагічны комплекс у в. Асавік) і сучаснай в. Пацынь Рагнедзінскага раёна. Ва ўсіх гэтых выпадках сельскае паселішча з назвай былога гарадскога цэнтра ўзнікае адносна недалёка ад яго – прыкладна ў 10–20 км.

У выпадку з Зароем адзіны ўмацаваны археалагічны помнік з матэрыяламі XII–XIII стст. размешчаны адносна недалёка ад сучаснага тапоніма Зарой (22–25 км). Гэта гарадзішча каля в. Бяседка Ершыцкага раёна Смаленскай вобласці. Прапанову І. І. Арлоўскага пра лакалізацыю Зароя ў в. Корсікі мы пакідаем па-за ўвагай з-за малой плошчы гэтага помніка – 27 × 14 м, якая не можа быць сярэднявечным умацаваным цэнтрам.

Нягледзячы на тое, што гарадзішча каля в. Бяседка Ершыцкага раёна неаднаразова згадваецца ў археалагічнай літаратуры, на жаль, ні ў адной са шматлікіх археалагічных картаў Смаленскай вобласці мы не знаходзім паведамленняў ні пра памеры помніка, ні пра магутнасць яго культурнага слоя[144]. У іх проста канстатуецца факт, што гарадзішча адносіцца да XII–XIII стст. З больш ранніх публікацый вядома толькі, што тут сустракаецца кераміка XI–XIII стст. і знойдзена сякера з апушчаным лязом, глыбокай выемкай і бакавымі шчакавінамі. Яна нагадвае сякеры VI тыпу па класіфікацыі А. М. Кірпічнікава, якія маюць аналогіі сярод старажытнасцей XI–XII стст.[145] Акрамя таго, у археалагічных картах падкрэсліваецца, што ў навакольлях вёскі Бяседка вядомы курганны могільнік[146].

У XV–XVI стст. у гэтым раёне існавала воласць ВКЛ, а потым і Рускай дзяржавы – Прыкладні. Яна была слаба заселенай і звесткі пра яе амаль адсутнічаюць. Няма ў крыніцах і звестак пра яе адміністрацыйны цэнтр. У XVII ст. воласць Прыкладні наогул была ліквідавана, і яе землі ўвайшлі ў склад іншых

---

[143] Седов В. В. К исторической географии Смоленской области // МИСО. – Смоленск, 1961. – Вып. 4. – С. 335; Метельский А. А. О местонахождении центра Зарубской волости. – С. 63.

[144] Археологическая карта России. Смоленская область. – Ч. 1. – С. 53.

[145] Ляўданскі А. М. Археалагічныя доследы у Смаленшчыне. – С. 55, табл. 18:6.; Кирпичников А. Н. Древнерусское оружие. Вып. 2. Копья, сулицы, боевые топоры, булавы, кистени IX–XIII вв. Свод археологических источников. – Вып. Е 1–36. – Л.: Наука, Ленинградское отдел., 1966. – С. 38.

[146] Археологическая карта России. Смоленская область. – Ч. 1. – С. 50.

адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак Рускага царства. Аднак нельга выключыць, што пачатак фарміравання воласці Прыкладні адносіцца да XII–XIII стст., і яе цэнтрам першапачаткова было гарадзішча каля в. Бяседка Ершыцкага раёна Смаленскай вобласці.

Для вызначэння межаў воласці Зароя неабходна ўлічваць, што на паўночны захад ад Зароя размяшчалася воласць Крычава, усходнюю мяжу якой мы картаграфуем ў раёне вёсак Родня і Мілаславічы. На поўнач ад Зароя, на адлегласці 40 км знаходзіўся Рослаўль са сваёй воласцю. На паўночным усходзе, на адлегласці 45–50 км знаходзіцца гарадзішча каля в. Навасёлкі – цэнтр смаленскай воласці Заруб. На паўднёвым усходзе ад гарадзішча Бяседка (на адлегласці 50–55 км) на тэрыторыі Мглінскага раёна каля в. Ворміна знаходзіцца археалагічны комплекс чарнігаўскага горада Ворміна (гарадзішча, селішча і курганны могільнік)[147], што згадваецца ў крыніцах пад 1140 г. Таму акруга воласці з цэнтрам на гарадзішчы каля в. Бяседка і з гэтага боку была абмежавана. З поўдня воласць Бяседкі – Зароя абмяжоўвалі воласці Мгліна і Дрокава. Ад гарадзішча каля в. Бяседка да гэтых населеных пунктаў ўсяго 60–65 км.

Такім чынам, для арганізацыі воласці Зароя ў сярэдзіне XII ст. заставалася свабоднай тэрыторыя шырынёй 30–40 км, абмежаваная з усходу, поўначы і поўдня плынню Іпуці, а з захаду – плынню левага прытока Беседзі – р. Суроў.

Тут вядома шмат курганных могільнікаў і селішчаў X–XIII стст. Найбольш раннія паселішчы, што ўзніклі ў гэтым рэгіёне, – гэта селішчы на правым беразе р. Іпуць каля вёсак Блінныя Кучы і Краставая, на якіх ёсць роменска-боршчаўская кераміка IX–X стст. і кераміка XI–XIII стст.[148], што сведчыць пра пачатак асваення гэтага рэгіёна. Бліжэй да Іпуці сустракаюцца і найбольш раннія курганныя могільнікі X–XI стст. Курганы з трупаспаленнем X – пачатку XI ст. вядомы на р. Беседзь у наваколлях Хоцімска (курганы № 33, 37, 38, 41)[149], каля в. Кузьмічы Ершыцкага раёна Смаленскай вобласці.

На поўдзень і паўднёвы захад ад Зароя XII ст. крыніцы XV ст. паведамляюць нам пра існаванне валасцей Мсціслаўскага ўдзельнага княства XIV–XV стст. – Мглін, Папова Гара – і вялікакняскай воласці Дрокаў.

У XI ст. у Мгліне замест умацаванага паселішча роменскага насельніцтва пачынае фарміравацца новы ўмацаваны цэнтр – у цэнтры сучаснага горада, ва ўрочышчы Узвіжанская горка, на мысе правага берага р. Судынка. Пра гэта гарадзішча мы ўжо пісалі вышэй. Археалагічныя даследаванні там не праводзіліся, але наяўнасць на помніку плошчай каля 1,5 га матэрыялаў XI–XIII стст. дазваляе разглядаць яго як буйны замак і цэнтр воласці.

Дрокаў упершыню згадваецца сярод кіеўскіх гарадоў у «Списке городов русских дальних и ближних» канца XIV ст. Археалагічныя помнікі старажытнага Дрокава знаходзіцца ў в. Старый Дрокаў Суражскага раёна Бранскай вобласці. Гарадзішча памерамі 50 × 40 м размешчана на мысе правабярэжнай тэ-

[147] Археологическая карта России. Брянская область. – С. 145, 147.

[148] Археологическая карта России. Смоленкая область. – Ч. 2. – С. 50, 54.

[149] Фурсов М. В. Дневник курганных раскопок. – С. 24, 25.

расы р. Іпуць. З паўднёвага боку пляцоўка гарадзішча ўмацавана двумя валамі і ровам. Вышыня ўнутранага вала – да 3 м, знешняга – 1 м, глыбіня рова ад вяршыні ўнутранага вала – 6 м. Культурны слой на помніку дасягае магутнасці 0,6 м, у ім сустракаюцца матэрыялы як юхнаўскай культуры ранняга жалезнага веку, так і старажытнарускага часу.

З паўднёва-заходняга боку да гарадзішча прымыкае селішча памерамі каля 0,5 га, культурны слой якога дасягае магутнасці 0,5 м, у якім сустракаецца кераміка старажытнарускага часу[150]. Археалагічныя даследаванні на помніках не праводзіліся.

Дрокаўская воласць у складзе Вялікага Княства Літоўскага згадваецца ў канцы XV ст. Улічваючы, што ўжо ў канцы XIV ст. сам Дрокаў адносіўся да гарадоў, а на тэрыторыі в. Ст. Дрокаў ёсць археалагічныя помнікі XII–XIII стст., нельга выключыць, што і аднайменная воласць існавала ўжо ў XII–XIII стст.

На Беседзі ў канцы XIV ст. у «Списке городов русских дальних и ближних» сярод кіеўскіх гарадоў упершыню згадваецца яшчэ адзін горад – Папова Гара. Гэта сучасны гарадскі пасёлак Чырвоная Гара, раённы цэнтр Бранскай вобласці.

Археалагічныя помнікі старажытнай Паповай Гары XII–XVII стст. не вядомы. У пачатку XX ст. ў цэнтры Паповай Гары было гарадзішча, на якім сустракалася кераміка ранняга жалезнага веку. Але да нашых дзён помнік не захаваўся[151]. Дэталёвае археалагічнае абследаванне тэрыторыі горада не праводзілася, таму больш дакладная інфармацыя пра яго археалагічныя помнікі адсутнічае.

У наваколлях Паповай Гары ў канцы XIX ст. праводзіў даследаванні курганных могільнікаў П. М. Яроменка[152]. Канцэнтрацыя вакол Паповай Гары помнікаў археалогіі X–XIII стст. дазваляе меркаваць пра існаванне тут пэўнага адміністрацыйнага цэнтра ўжо ў той час.

Акрамя таго, у крыніцах XV–XVI стст. паміж Крычавам і Дрокавам згадваецца воласць Лучыцы (Олучыцы, Алучыцы). Магчыма, пачатак яе фарміравання адносіцца да больш ранняга часу – XII–XIII стст. Аднак умацаваныя помнікі гэтага часу тут не вядомы. Дакладна невядома і паходжанне назвы самой воласці. Сугучны назве воласці тапонім сёння адсутнічае. Аднак у крыніцах XVI ст. (1579 г.) згадваецца в. Лучычы, якой за «службу шпегаўскую» быў узнагароджаны «старец алучыцкі» Селівон Скібіч[153]. Аднак потым гэтая вёска губляецца ў гісторыі, і дзе яна знаходзілася, невядома.

---

[150] Археологическая карта России. Брянская область. – С. 239, № 844, 845.

[151] Тамсама. – С. 139, № 426.

[152] Спицын А. Курганы раскопанные П. М. Еременко в Суражском уезде // Записки Императорского русского археологического общества. – Т. 8, вып. 1–2. – Новая сер. Труды отделения русской и славянской археологии. – СПб., 1896. – С. 86; Еременко П. М. Могильники и городища Глуховского и Суражского уездов // Труды Московского предварительного комитета по устройству XIV Археологического съезда. – М.: Тип. об-ва распростр. полез. книг аренд. В. И. Вороновым, 1906. – Вып. 1. – С. 102.

[153] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 74. – Арк. 419–420; Тамсама. – Ф. 694. – Воп. 4. – Адз. зах. 1155. – Арк. 49–50.

У складзеных у канцы XVIII ст. эканамічных заўвагах Клімавіцкага ўезда Магілёўскай губерні пры апісанні зямельных уладанняў в. Царковішча (суч. в. Пралетарская Касцюковіцкага р-на) згадваецца ручай «Лученец»[154], вельмі сугучны назве летапіснай воласці. Зыходзячы з гэтага, першапачатковы цэнтр Лучыцкай воласці, верагодна, неабходна шукаць недзе ў наваколлях суч. в. Пралетарская.

Магчыма, менавіта гэтыя воласці – Зарой (Бяседка), Лучыцы, Мглін, Дрокаў і Папова Гара – і былі тымі гарадамі і валасцямі, якія захапіў Расціслаў Мсціславіч у 1142 г. у Чарнігава. Захоп у 1142 г. валасцей Ігара на доўгі час стаў незагойнай ранай у адносінах паміж Смаленскам і Чарнігавам. Нават пасля смерці Ігара, які не пакінуў пасля сябе нашчадкаў, пытанне аб прыналежнасці гэтых зямель, верагодна, неаднаразова ўздымалася. Летапісы нічога нам не гавораць аб гэтым пры жыцці Ізяслава і Расціслава Мсціславічаў. Аднак пасля смерці апошняга Святаслаў Ольгавіч узняў яго нанова.

У 1174 г. быў заключаны «Раманов ряд», які згадваецца ў летапісах у 1177 і 1190 гг. і які нейкім чынам рэгуляваў спрэчкі паміж Смаленскам і Чарнігавам з-за гэтых валасцей. Аднак і пасля 1190 г. мяжа засталася стабільнай, спрэчныя воласці засталіся за Смаленскам, і Святаслаў быў вымушаны цалаваць Расціславічам крыж «на всей ихъ воле»[155].

Паходы Расціслава ў 1127 і 1142 гг. на землі радзімічаў значна пашырылі тэрыторыю Смаленскай зямлі. Новая мяжа, якая ўстанавілася ў паўднёвых раёнах Смаленскага княства, фактычна выйшла на этнічныя рубяжы паміж радзімічамі і севяранамі[156].

Акрамя перамен, што адбыліся ў сярэдзіне XII ст. на поўдні Смаленскай зямлі, у сярэдзіне XII ст. пэўныя адміністрацыйна-гаспадарчыя і тэрытарыяльныя змены здзейсніліся і ў левабярэжных падняпроўскіх і паўночна-заходніх пасожскіх раёнах Смаленскай зямлі, што знайшло адлюстраванне ў летапісах.

У 1165 г. смаленскі князь Расціслаў Мсціславіч перадае Раману Міхайлавічу – унуку смаленскага князя Вячаслава (памёр у 1063 г.) – гарады Красн і Васільеў[157]. Улічваючы, што Красн, верагодна, раней быў цэнтрам воласці Мірацічы, можна меркаваць, што яна цалкам увайшла ў склад новага арганізаванага дамена Рамана Міхайлавіча. Акрамя таго, у дамен князя Рамана ўвайшла і воласць горада Васільеў.

Калі лакалізацыя Красна ў даследчыкаў не выклікае сумненняў, то адносна лакалізацыі Васільева да сённяшняга часу існуюць спрэчкі. Большасць даследчыкаў схіляецца да яго пошукаў на гарадзішчы каля в. Васільева Ма-

---

[154] РДАСА. – Ф. 1355. – Воп. 1. – Адз. зах. 714. – Арк. 75, 77 адв., 168 адв.

[155] ПСРЛ. – Т. 2. – Стб. 670.

[156] Шинаков Е. А. Русско-радимичское пограничье. – С. 265–266.

[157] ПСРЛ. – Т. 2. – Стб. 525.

настыршчынскага раёна Смаленскай вобласці[158]. Дысанансам гучыць толькі голас Я. А. Шмідта, які лічыць, што гарадзішчы каля вёсак Васільева і Гарадок Манастыршчынскага раёна, якія спрабуюць атаясамліваць з летапісным Васільевым, вельмі малыя для гэтага[159]. І сапраўды, помнікі памерамі ў некалькі соцень квадратных метраў нельга атаясамліваць з дзядзінцамі гарадоў, тым болей што вакол іх адсутнічаюць іншыя тапаграфічныя структуры, характэрныя для горада (вакольны горад, пасады).

На думку Л. В. Аляксеева, улічваючы, што на поўдні Кіеўскай Русі летапісныя Красн і Васільеў размяшчаліся побач адзін ад аднаго, то і ў наш час яны павінны знаходзіцца побач[160].

У гэтай сувязі трэба адзначыць, што на паўднёвы захад (прыкладна ў 16 км) ад гарадзішча Звяровічы – летапіснага Красна – знаходзіцца тапонім Раманава (сучасная в. Леніна Горацкага раёна Магілёўскай вобласці), вядомы па пісьмовых крыніцах пачатку XVI ст. Тут ёсць невялікае гарадзішча і сумежнае з ім селішча з матэрыяламі XII–XIII стст. На помніку ў 1892–1893 гг. быў знойдзены скарб з двух срэбраных завушніц і срэбранага наруча. Скарб датуецца 70-мі гадамі XII – першай паловай XIII ст.[161] Акрамя таго, у самім сучасным населеным пункце, па словах мясцовых краязнаўцаў, яшчэ ў сярэдзіне 50-х гадоў XX ст. існавала і другое гарадзішча. Час яго існавання невядомы, яно не даследавана, і зараз на яго пляцоўцы знаходзіцца магіла воінаў Войска Польскага, якія загінулі тут у 1943 г.

Супадзенне назвы тапоніма, каля якога ёсць невялікае умацаванае паселішча XII–XIII стст., з імем уладальніка Красна і Васільева, размяшчэнне гарадзішча каля летапіснага Красна і наяўнасць на ім рэчаў, што належалі прадстаўнікам феадальнай знаці, дазваляе разглядаць гарадзішча каля в. Раманава як феадальную сядзібу князя Рамана і лакалізаваць яе ў адной воласці з горадам Краснам.

Працягваючы нашы назіранні за размяшчэннем помнікаў археалогіі XI–XIII стст. у наваколлях летапіснага Красна, мы бачым, што прыкладна ў 16 км на поўдзень ад Раманаўскага гарадзішча і ў 25–27 км на поўдзень ад Звяровічаў, каля в. Горы Горацкага раёна знаходзіцца вялікае гарадзішча з матэрыяламі ранняга жалезнага веку і XI–XVI стст.

Гарадзішча размешчана паміж вёскамі Горы, Слабада і Запруддзе і займае высокі выступ берагавога плато, каля сутокі рэк Быстрая і Карчаваха. Перша-

---

[158] Барсов Н. П. Географический словарь Русской земли. – С. 26; Голубовский П. В. История Смоленской земли. – С. 78; Довнар-Запольский М. В. Очерк истории Кривичской и Дреговичской земель. – С. 41; Рябков Г. Т. По памятным местам Монастырщины // Краеведческие походы и экскурсии по Смоленской области. – Смоленск, 1954. – С. 140–141; Седов В. В. К исторической географии Смоленской области. – С. 336; Алексеев Л.В. Смоленская земля в IX–XIII вв. – С. 128–129.

[159] Шмидт Е. А. Археологические памятники Смоленской области: (С древнейших времен до VIII века н. э.). – Смоленск, 1976. – С. 115–116; Яго ж. Древнерусские археологические памятники Смоленской области. – Ч. 2. – С. 131.

[160] Алексеев Л. В. Смоленская земля в IX–XIII вв. – С. 129–130.

[161] Корзухина Г. Ф. Русские клады IX–XIII вв. – С. 149.

пачатковыя памеры помніка былі каля 180 × 70 м, але ён быў моцна пашкоджаны ў канцы 60 – пачатку 80-х гадоў XX ст (мал. 10). Зараз ад яго захавалася пляцоўка памерамі 70 × 70 м. З паўночна-ўсходняга боку гарадзішча захаваўся адрэзак абарончага вала даўжынёй 30 м, вышынёй да 3 м, за якім прасочваецца роў. Раней рэшткі вала былі бачны ў паўднёвай частцы пляцоўкі помніка. Пад'езд да гарадзішча быў з паўночна-ўсходняга боку, дзе да яго вяла дамба шырынёй 20 м. Гарадзішча, якое мясцовае насельніцтва называе «Курганне», калісьці ўзвышалася на 8–10 м над узроўнем вады ў рэчках. Зараз жа яно адрэзана ад берагавога плато кар'ерам, які пашкодзіў яго паўночную частку, і знаходзіцца на востраве пасярод вадасховішча, утворанага водамі Быстрай і Карчавахі.

У археалагічнай літаратуры пад назвай «уніяцкія могілкі» гарадзішча згадваецца ў канцы XIX ст.[162], хаця як помнік археалогіі было выяўлена толькі ў 1936 г. А. Д. Каваленям. Гарадзішча ў 1963 г. абследаваў Л. Д. Побаль, у 1978 г. – У. І. Шадыра. У 1975–1976 гг. археалагічныя даследаванні на плошчы 200 м^2 тут праводзіў М. А. Ткачоў, у 1982–1983 гг. на плошчы 260 кв. м – Ш. І. Бекцінееў. У 1990–1991 гг. даследаванні на помніку, яго абарончых збудаваннях і абследаванні наваколляў праводзіў аўтар. За ўсе гады на гарадзішчы вывучана каля 600 м^2. Калісьці ў цэнтры вёсцы быў і курганны могільнік[163].

Культурны слой на гарадзішчы магутнасцю 0,4–1,2 м моцна пашкоджаны могілкамі XVI–XVIII стст. Датаваць могільнік гэтым часам дапамагаюць манеты, знойдзеныя ў магілах. Самая ранняя з іх датуецца 1520 г., найбольш познія – 1752–1758 гг.[164] Тым не менш на непашкоджаных участках была зафіксавана наступная стратыграфія. Верхні слой з шэрай гумусаванай глебы магутнасцю 0,2–0,35 м змяшчае матэрыялы XIV–XVI стст., пад ім ідзе слой інтэнсіўна чорнага колеру магутнасцю 0,8 м. У ім знойдзены шкляныя бранзалеты, шыферныя праселкі, кераміка характэрная для XII–XIII стст. Падсцілаў гэты слой мацерыковы шэры пясок. Непашкоджаных слаёў больш ранняга часу не выяўлена. Аднак у перамешаных пластах сустракалася кераміка ранняга жалезнага веку днепра-дзвінскай культуры і культуры сярэдняга слоя гарадзішча Тушамля. Наяўнасць керамікі жалезнага веку адзначаюць на помніку і папярэднія даследчыкі[165].

Прарэзка абарончага вала паказала адсутнасць пад ім культурнага слоя. Гэта сведчыць пра тое, што вал быў насыпаны ў адзін прыём, без якіх-небудзь дасыпак. Яго вышыня дасягала 2 м пры шырыні каля падэшвы 9 м. Навальныя

---

[162] Сведения о городищах и курганах за 1873 год // Известия Императорской археологической комиссии. – СПб., 1903. – Вып. 5. – С. 60.

[163] Ткачев М. А. Работы в Белорусском Посожье. – С. 428; Бектинеев Ш. И. Городище у д. Горы // АО 1982 года. – М.: Наука, 1984. – С. 348; Яго ж. Раскопки городища «Курганы» // АО 1983 года. – М.: Наука, 1985. – С. 381; Яго ж. Городище Горы. – С. 8–19; Ткачоў М. А. Замкі і людзі. – Мінск, 1991. – С. 101–105; Мяцельскі А. Гарадзішча каля в. Горы. – С. 187–197.

[164] Бектинеев Ш. И. Городище Горы. – С. 9

[165] Бектинеев Ш. И. Раскопки городища «Курганы». – С. 381; Яго ж. Городище Горы. – С. 11.

абарончыя канструкцыі былі, хутчэй за ўсё, у выглядзе вастракола. Перад валам быў выкапаны роў глыбінёй 1,2 м і шырынёй 5 м. На жаль, вал і пляцоўка помніка стратыграфічна не звязаны з-за таго, што паўночная частка гарадзішча была пашкоджана кар'ерам. У насыпе вала былі знойдзены фрагменты керамікі бронзавага веку і сценкі ганчарнага посуду. Наяўнасць ганчарнай керамікі як найбольш позняй дазваляе меркаваць, што да XII–XIII стст. адносіцца час будаўніцтва фартыфікацыйных збудаванняў, якія, мяркуючы па стратыграфіі, адносяцца да перыяда росквіту паселішча.

У цэнтральнай частцы гарадзішча захавалася невялікае ўзвышша дыяметрам 8 м і вышынёй 1,5 м. Наяўнасць аналогіі планавай кампазіцыі гэтага ўзвышша з сітуацыяй ў Камянцы, Алешкаве, Ратна, Горзвіне, Чартарыйску дазваляла меркаваць, што ўзвышша з'яўляецца рэшткамі назіральнай вежы, час існавання якой, ўлічваючы адсутнасць сувязі яе з іншымі фартыфікацыйнымі збудаваннямі паселішча, не выходзіць за канец XIII – пачатак XIV ст.[166]

Траншэя, з дапамогай якой вывучалася ўзвышша, дазволіла высветліць, што на мацерыку залягаў культурны слой магутнасцю 0,2 м светла-карычневага колеру, у якім сустракалася кераміка днепра-дзвінскай культуры ранняга жалезнага веку. Гэты слой перакрываў слой чырвонай гліны магутнасцю да 0,2 м. Зверху яе залягаў аднародны слой цёмна-карычневага колеру магутнасцю да 0,6 м у якім, акрамя керамікі XII–XIII стст., быў знойдзены ключ тыпу «Б» XII – першай паловы XIV ст. Тут жа знойдзены каменны абразок з надпісам, які па палеаграфічных асаблівасцях датуецца мяжой XII–XIII стст.[167] Слой з матэрыяламі XII – пачатку XIII ст. перакрываў суглінак жоўтага колеру сегментападобнай формы магутнасцю да 0,6 м. Гэты суглінак з усіх бакоў перакрывала гліняная праслойка магутнасцю 0,4 м. У абодвух гэтых стратыграфічных слаях знойдзена кераміка, характэрная для XII – першай паловы XIII ст.

Глініста-пясчаная падушка, верагодна, з'яўляецца падмуркам, на якім стаяла назіральная драўляная вежа. Мяркуючы па падмурку, вежа мела памеры 6 × 6 м. Падмурак вежы перакрываўся тонкім, да 0,2–0,3 м таўшчынёй культурным слоем, у якім знойдзена кераміка XIV–XVI стст. Таму мяркуючы па археалагічным матэрыяле, знойдзеным у падмурку вежы, час яе будаўніцтва адносіцца да мяжы XII–XIII стст.

Аналагічныя драўляныя вежы археалагічна на тэрыторыі Смаленскай зямлі зафіксаваны ў Мсціславе, Рослаўлі. Як і на гарадзішчы «Курганне», у Горах яны стаялі не каля краю пляцоўкі гарадзішча, дзе былі валы і сцены, а ў адрыве ад іх[168].

---

[166] Раппопорт П. А. Военное зодчество западно-русских земель X–XIV вв. // МИА СССР. – 1967. – № 140. – С. 149, рис. 13, 29, 48, 76.

[167] Мяцельскі А. І прашчур прасіў пра тое ж... Абразок з гарадзішча каля в. Горы // Мастацтва. – 1992. – № 6. – С. 32–33.

[168] Алексеев Л. В. Проблемы становления культово-оборонного зодчества Руси в свете раскопок в Мстиславле (Беларусь) // РА. – 1993. – № 4. – С. 227.

Дрэнная стратыграфічная захаванасць помніка не дала магчымасці прасачыць структуру і планіроўку яго забудовы. На мацерыку былі знойдзены толькі плямы чырвонай гліны з каменнем, якія, верагодна, з'яўляюцца рэшткамі глінабітных печаў. Але з-за таго, што тэрыторыя вакол іх была моцна пашкоджана магіламі, цяжка што-небудзь казаць пра тыпалогію пабудоў. Цікава адзначыць, што рэшткі пабудоў размяшчаліся па краю пляцоўкі помніка, што найбольш характэрна для феадальных сядзіб.

Самыя раннія сярэдневяковыя матэрыялы, знойдзеныя на гарадзішчы «Курганне» каля в. Горы, адносяцца да X–XI стст. Гэта скроневае кудравае кальцо, васьмігранныя візантыйскія пацеркі са шкла зялёнага, карычневага, сіняга, жоўтага колераў і ў невялікай колькасці кераміка[169].

Аднак значна лепш прадстаўлены матэрыялы, якія адносіцца да XII–XIII стст.: знойдзены рэчы штодзённага карыстання – ключы тыпу «Б» – XII – першай паловы XIV ст., тыпу «В» – сярэдзіны XII – першай паловы XIV ст., тыпу «В-1», тыпу «В-2» – канца XII – пачатку XV ст.; спружыны ад замкоў, шарнірныя нажніцы, фрагменты шкляных бранзалетаў, сланцавыя праселкі, калачападобнае крэсіва з язычком, якое датуецца X – першай паловай XII ст.; аднапрамянёвы свяцец, які па наўгародскай класіфікацыі датуецца не раней сярэдзіны XIII ст.; фібула з патаўшчэннем у сярэдняй частцы, характэрная для XI–XIII стст.[170]

Знаходкі інструментаў рамеснікаў нешматлікія. Знойдзена сякера з асіметрычным лязом і выступаючымі шчакавінамі. Такія сякеры мелі кароткі перыяд ужывання – з другой паловы XII ст. да пачатку XIII ст. З дрэваапрацоўчых інструментаў знойдзены струг, які па сваіх памерах адносіцца ды тыпу сярэдніх, характэрных для XII–XIII стст.[171]

Найбольш шматлікімі знаходкамі з'яўляюцца прадметы ўзбраення і рыштунак конніка і верхавога каня. Знойдзены ўтулкавы наканечнік дзіды лаўрападобнай формы, якія пачынаюць з'яўляцца з XII ст., касцяныя абкладкі складанага лука, арнаментаваныя абкладкі краёў калчана. Акрамя іх знойдзены фрагмент пятлі для падвешвання калчана, а таксама іншыя невялікія арнаментаваныя і апрацаваныя пласціны з адтулінамі, якія, верагодна, выкарыстоўваліся для ўпрыгожвання калчана.

З наканечнікаў стрэл, якія з'яўляюцца ў I ст. н. э. і шырока ўжываюцца да XIV ст., знойдзены шылападобны наканечнік квадратнага сячэння. Ромбапа-

---

[169] Бектинеев Ш. И. Городище Горы. – С. 11, 14–15.

[170] Мяцельскі А. Гарадзішча каля в. Горы. – С. 191; Колчин Б. А. Железоделательное ремесло Новгорода Великого // МИА СССР – 1959. – № 65: Труды Новгородской археологической экспедиции. – Т. 2. – С. 87, 100; Колчин Б. А. Хронология новгородских древностей // Новгородский сборник. 50 лет раскопок в Новгороде – М.: Наука, 1982. – С. 162; Мальм В. А. Подковообразные и кольцевидные застежки-фибулы // Очерки по истории руской деревни X–XIII вв. Труды ГИМ. – М., 1967. – Вып. 43. – С. 166; Бектинеев Ш. И. Городище Горы. – С. 12–14.

[171] Гурын М. Ф. Металаграфічныя даследаванні жалезных прадметаў з гарадзішча каля в. Горы Горацкага раёна // Вес. АН БССР. Сер. грамад. навук. – 1985. – № 4. – С. 66, мал. 1:17; Колчин Б. А. Железоделательное ремесло Новгорода Великого. – С. 39–40.

добны наканечнік з прамымі бакамі і плечукамі і найбольшым пашырэннем у верхняй частцы пяра характэрны для старажытнасцей VIII–XIII стст. Рамбічны наканечнік з упорам мае аналогіі ў матэрыялах XII–XIII стст. Ноўгарада і Старой Разані. Зрэзні ў выглядзе вузкай выцягнутай лапатачкі з'явіліся на ўсходнеславянскіх землях пасля нашэсця Батыя ў сярэдзіне XIII ст.[172]

З рыштунка конніка і верхавога каня знойдзены шпоры і цуглі. Шпора, нягледзячы на абламаны шып, па іншых сваіх прыкметах адносіцца да тыпу V – шпоры з шматпрамянёвай зоркай, якія з'явіліся не раней за сярэдзіну XIII ст. Знойдзеныя цуглі адносяцца да шырока распаўсюджанага тыпу – складаных, з двух рухомых кольцаў. Акрамя таго, знойдзены цуглі, у якіх сярэдзіна выканана ў выглядзе васьмёркі з перахватам. Цуглі такога тыпу ў асноўным сустракаюцца сярод старажытнасцей усходняй Прыбалтыкі X–XIV стст.[173] (мал. 16–18).

Паводле археалагічных матэрыялаў гарадзішча «Курганне» каля в. Горы з'яўляецца ваенна-феадальным паселішчам – замкам. Пра гэта сведчаць ваенная накіраванасць паселішча, слабое развіццё рамяства. Разам з тым яго значная плошча, каля 1,2 га, сведчыць, што гэта не быў звычайны замак дробнага феадала. У паўднёва-заходняй частцы Смаленскай зямлі гарадзішча па плошчы саступае толькі дзядзінцам Смаленска, Мсціслава і Расціслаўля і магло выконваць ролю невялікага горада ў гэтым рэгіёне.

Гэта тым болей верагодна, што пытанне пра адсутнасць каля яго сцен рамесна-гандлёвага пасаду канчаткова не вырашана. Па словах мясцовых краязнаўцаў, падчас будаўнічых работ на тэрыторыі размешчанага побач з гарадзішчам бастыённага замка XVI ст. «Вал» знаходзілі шыферныя праселкі. Нельга выключыць, што пасад XII–XIII стст. быў знішчаны падчас будаўніцтва больш позняй фартыфікацыі.

Таксама цікава адзначыць, што гарадзішча «Курганне» знаходзіцца ў паўднёва-заходняй частцы дамена смаленскіх князёў, размешчанага каля Смаленска[174] ў цэнтры багатай, плацёжаздольнай і густанаселенай воласці. У яго навакольлях, як адзначалася вышэй, знойдзены скарб каля в. Паляшчыцы, срэбраная грыўня з кляймом-надпісам на ей «князя Валод» знойдзена каля в. Студзянец. Падобныя грыўні ў свой час знаходзілі і ў Смаленску[175]. Скарб «великокняжеской эпохи (серьги, пряжки, браслеты и гривны византийской работы)» быў адшуканы на гарадзішчы каля в. Шаўнева. Скарб, які датуецца

---

[172] Медведев А. Ф. Оружие Новгорода Великого // МИА СССР. – 1959. – № 65: Труды Новгородской археологической экспедиции. – Т. 2. – рис. 13:22; Медведев А. Ф. Ручное метательное оружие (лук, стрелы и самострел) VIII–XIV вв. – М.: Наука, 1966. – С. 69, 75, 83; Монгайт А. Л. Старая Рязань // МИА СССР. – 1955. – № 49: Материалы и исследования по археологии древнерусских городов. – Т. IV, мал. 143:12.

[173] Кирпичников А. Н. Снаряжение всадника и верхового коня на Руси IX–XIII вв. – Л.: Наука, Ленинградское отдел., 1973. – С. 17, 66.

[174] Алексеев Л. В. Домен Ростислава смоленского. – С. 55, карта.

[175] Ильин И. И. Топография кладов серебрянных и золотых слитков. – Пг.: Тип ГАИМК, 1921. – С. 36, 46.



Мал. 16. Гарадзішча каля в. Горы. Знаходкі: *1–4* – наканечнікі стрэлаў; *5–10* – нажы; *11* – пяшня; *12* – струг; *13* – падкоўка пад абцас; *14* – шпора; *15–17* – цуглі

70-мі гадамі XII – першай паловай XIII ст., знойдзены на гарадзішчы каля в. Раманава.

Іншыя, больш дробныя ўмацаваныя паселішчы XII–XIII стст. вядомы каля вёсак Паляшчыцы, Аршані, у г. Горкі. Курганныя могільнікі вядомы каля вёсак Шаўнева, Мядзвёдаўка, раней курганны могільнік існаваў і на могілках у самой в. Горы. Селішча з матэрыяламі XI ст., як адзначалася вышэй, выяўлена на р. Проня, у 1 км на поўнач ад г. Горкі.



Мал. 17. Гарадзішча каля в. Горы. Касцяныя вырабы

Пра знаходжанне Горскага гарадзішча на тэрыторыі княскага дамена сведчаць і знаходкі на помніку і ў яго наваколлях донцаў гаршкоў з ганчарнымі клеймамі ў выглядзе княскіх знакаў.

Кляймо з гарадзішча каля в. Шаўнева, якое знаходзіцца ў 4 км на поўнач ад Гор, выканана ў выглядзе трохзубца без атрога ў аснаванні з адагнутымі вонкі бакавымі зубцамі.

Больш цікавымі з'яўляюцца клеймы (2) з самаго Горскага гарадзішча. Яны выкананы ў выглядзе двузубца прамакутнай формы, без атрога ў аснавання, з адагнутымі вонкі зубцамі. Ад правага зубца ў яго верхняй частцы адыходзіць унутр і ўверх адгалінаванне. Ніжэй на правым зубцы ёсць яшчэ адно адгалінаванне, што ідзе ўнутр двузубца, выкананае ў выглядзе лілії. Па сваёй форме (двузубец прамакутнай формы) гэтыя клеймы адпавядаюць тамгам смаленскіх князёў. Знешне яны маюць падабенства з тамгамі, якія А. А. Малчанаў адносіць да смаленскіх Мсціславічаў – Яраслава Уладзіміравіча ці Мсціслава Давыдавіча[176].

[176] Молчанов А. А. Об атрибуции лично-родовых знаков князей Рюриковичей XI–XIII вв. // Вспомогательные исторические дисциплины. – Т. XVI. – 1985. – С. 78.



Мал. 18. Гарадзішча каля в. Горы. Вырабы з жалеза: *1, 6, 9* – фрагменты замкоў; *2–5, 8* – ключы; *10* – фібулы; *11–12* – крэсівы

Перадача Расціславам Мсціславічам Красна і Васільева ў рукі князя Рамана дазваляе меркаваць, што абодва гэтыя гарады першапачаткова знаходзіліся ў княскім дамене і размяшчаліся недалёка адзін ад другога. Толькі гэта давала б магчымасць Раману стварыць адзіную ў тэрытарыяльных і гаспадарчых адносінах воласць.

І менавіта з гэтага пункта гледжання Горскае гарадзішча вельмі добра падыходзіць для атаясамлення яго з летапісным Васільевым. Перш за ўсё, яно размешчана побач з лакалізаваным летапісным Краснам – гарадзішчам Звяровічы. Паміж Горскім і Звяровіцкім гарадзішчамі знаходзіцца тапонім Рамана, дзё ёсць гарадзішча з матэрыяламі XII–XIII стст. Назва апошняга тапоніма ўскосна пацвярджае яго прыналежнасць нейкаму Раману.

Прыналежнасць Звяровіцкага і, магчыма, Раманаўскага гарадзішчаў унуку Вячаслава Раману і размяшчэнне іх побач з Горскім гарадзішчам дазваляе меркаваць, што і апошняе таксама знаходзілася ў яго уладаннях. Адпаведнасць

Горскага гарадзішча па сваіх параметрах невялікаму гарадскому цэнтру Смаленскай зямлі і яго размяшчэнне побач з уладаннямі Рамана дазваляюць разглядаць яго як не лакалізаваны Васільеў, які ў 1165 г. разам з Краснам быў перададены яму Расціславам Мсціславічам. Дарэчы, тапонім Васільеў, які звычайна атаясамліваюць з летапісным горадам, размешчаны ў 40–45 км на ўсход ад Горскага гарадзішча.

Акрамя таго, гістарычна-геаграфічныя даследаванні адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак XVI–XIX стст. у гэтым рэгіёне паказваюць, што адміністрацыйна-гаспадарчыя адзінкі з цэнтрамі ў Раманаве і Горах вельмі шчыльна прымыкаюць адзін да аднаго, таму раней яны маглі складаць адзінае цэлае. Больш таго, гэтыя адміністрацыйна-тэрытарыяльныя і гаспадарчыя адзінкі вельмі добра суадносяцца з іншымі тэрытарыяльнымі адзінкамі, вядомымі ў больш ранні перыяд – XII–XIII стст. Яны прылягаюць да валасцей Басея, Мірацічы, Мсціслаў, Копысь.

Гэта дазваляе меркаваць, што ў сярэдзіне XII ст. воласць Мірацічы і частка дамена смаленскіх князёў, размешчанага ў вярхоўях р. Проня, была перададзена Расціславам Мсціславічам ва ўладанне князю Раману, і тут быў сфарміраваны яго ўдзел з гарадамі Красн і Васільеў. Ён у паўночным напрамку прасціраўся ад Дняпра, ахопліваючы плынь р. Мярэя, вярхоўі Проні, прыкладна да месца ўпадзення ў апошнюю р. Рамяствянка. Яна займала тэрыторыю з поўначы на поўдзень прыкладна ў 60 км, а з захаду на ўсход – 30 км. Такім чынам, удзел князя Рамана ахопліваў тэрыторыю каля 1800–2000 кв. км.

Акрамя валасцей, што згадваліся ў Статуце 1136 г., на пасожскіх землях Смаленскага княства ў XII ст. існавалі і іншыя адміністрацыйна-тэрытарыяльныя і гаспадарчыя адзінкі, якія не трапілі ў склад Статута таму, што заставаліся ў руках вялікакняскай сям'і.

Адной з іх была воласць Мсціслава, сучаснага аднайменнага раённага цэнтра Магілёўскай вобласці, размешчанага на правым беразе р. Віхра, прыкладна ў 10 км ад яе ўпадзення ў р. Сож.

Першы раз горад згадваецца ў летапісах у 1156 г. у сувязі з тым, што каля яго сцен было заключана замірэнне паміж Расціславам Мсціславічам і Ізяславам Давыдавічам[177]. Да сярэдзіны XII ст. адносіцца згадванне Мсціслава ў зборніку XVI ст. кіеўскага Міхайлаўскага манастыра, з якога мы даведваемся, што горад быў пабудаваны князем Расціславам Мсціславічам– «Лъта 6642 (1135) Ростислав Мстиславич устрои град великыи Смоленесъкъ и церковъ созда с[вя]того Сп[а]са верху Смядыни и град Мстиславълъ на Вехре онъ же созда; и княжение его 60 летъ было»[178] (мал. 19).

Улічваючы, што большасць падзей, пра якія паведамляе крыніца, адносяцца да 1135 г., то і гэту, не датаваную дакладна частку граматы, таксама пачалі

[177] ПСРЛ. – Т. 2. – Стб. 485.

[178] Щапов Я. Н. Освящение смоленской церкви Богородицы в 1150 г. // Новое в археологии. – М.: Наука, 1972. – С. 282.

Мал. 19. Заснавальнік Мсціслава, благаверны князь Расціслаў Мсціславіч

адносіць да 1135 г., і гэта дата пакрысе стала лічыцца датай першага згадвання горада ў пісьмовых крыніцах. А ў апошнія часы нават з'явіліся прапановы лічыць датай заснавання Мсціслава 1134 г.[179], хаця згодна з пісьмовымі крыніцамі можна толькі сцвярджаць, што горад быў пабудаваны паміж 1127 і 1156 гг. Улічваючы, што горад адсутнічае ў Статуце Расціслава Мсціславіча 1136 г., Л. В. Аляксееў аднёс час будаўніцтва Мсціслава да перыяду паміж 1136 і 1156 гг.[180]

Трэці раз Мсціслаў згадваецца ў грамаце «Аб пагароддзі і пачэсціі», якая датуецца другой паловай XII – пачаткам XIII ст.[181] Згодна з гэтым паведамленнем, горад выплочваў епіскапіі «... 6 гривен урока, а поч(е)стия гривна и три лисицы»[182]. Пасля гэтага Мсціслаў да другой паловы XIV ст. знікае са старонак летапісаў, і яго гісторыя больш-менш узнаўляецца толькі дзякуючы археалагічным даным.

Гарадзішча летапіснага Мсціслава – «Замкавая гара» – размешчана ў цэнтры сучаснага горада. Яно займае авальны астанец памерамі каля 145 × 105 м, адзелены ад берагавога плато ярам глыбынёй да 20 м, і фактычна з'яўляецца непрыступным. Абарончыя збудаванні захаваліся з трох бакоў пляцоўкі помніка. Найбольшую магутнасць яны маюць ў паўднёва-ўсходняй частцы, дзе валы дасягаюць вышыні 5 м. Адзіны ўваход на пляцоўку гарадзішча знаходзіцца на яго паўднёвым баку, дзе яго звязвае з прылягаючым плато дамба шырынёй да 5 м.

Выбар месца для закладкі новага горада не быў выпадковым. Па-першае ён ставіўся ў цэнтры густанаселенай воласці, пра што сведчаць шматлікія курганныя могільнікі. А па-другое, гэта фактычна адзінае месца на плыні р. Віхра, дзе ёсць высокі карэнны бераг, разрэзаны глыбокімі ярамі, якія ўтвараюць самастойныя, адносна ізаляваныя пляцоўкі.

---

[179] Янин В. Л. Новгород и Литва. Пограничная ситуация XIII–XV вв. – М.: МГУ, 1998. – С. 43.

[180] Алексеев Л. В. Западные земли домонгольской. Кн. 1. – С. 215.

[181] Алексеев Л. В. Смоленская земля в IX–XIII вв. – С. 25; Янин В. Л. Заметки о комплексе документов Смоленской епархии XII века // Отечественная история. – 1994. – № 6. – С. 118.

[182] Древнерусские княжеские уставы. – С. 146.

У межах сучаснага Мсціслава існуюць тры такіх пляцоўкі. Гэта сучасныя Панівойская, Траецкая і Замкавая горы. Першая з іх хаця і большая па памерах за Замкавую гару, але ніжэйшая за яе і за Траецкую гару. Дзве другія маюць аднолькавую вышыню, але Траецкая мае вялікія памеры – каля 15 га, і для арганізацыі на ёй ўмацаванага цэнтра новага горада неабходна было прыкласці значныя намаганні для будаўніцтва фартыфікацыі – капання равоў і насыпкі валоў, якія б адрэзалі Траецкую гару ад берагавога плато.

Таму ў якасці дзядзінца новага горада і быў выбраны натуральны астанец плошчай каля 1,5 га, размешчаны прыблізна ў 300–400 м ад плыні р. Віхра паміж двума ярамі, схілы якога былі некалькі падрэзаны.

Археалагічныя даследаванні на дзядзінцы Мсціслава з 1959 па 1989 г. праводзіў Л. В. Аляксееў. За гэтыя гады ім даследавана каля 1200 кв. м плошчы помніка, што дазваляе некалькі рэканструяваць гісторыю горада ў «дапісьмовы» перыяд.

Даследаванні пацвердзілі сведчанне пісьмовай крыніцы, што горад быў пабудаваны ў сярэдзіне XII ст. Найбольш раннія матэрыялы, знойдзеныя на яго дзядзінцы, адносяцца да сярэдзіны XII ст. У той жа час на тэрыторыі гарадскога пасада ў невялікай колькасці былі знойдзены фрагменты керамікі X–XI стст., якія дазваляюць выказаць меркаванне пра тое, што да пабудовы горада князем Расціславам Мсціславічам тут ужо існавала нейкае невялікае паселішча.

Даволі хутка пасля заснавання Мсціслава горад згарэў, прычым, як паказваюць дэндрахраналагічныя даты, гэта адбылося раней за 1204 г. – першую мсціслаўскую дэндрадату[183]. Наогул, як паказалі археалагічныя даследаванні, на дзядзінцы горада зафіксаваны сляды трох моцных пажарышчаў, якія, верагодна, фіксуюць значныя падзеі ў гісторыі горада. Акрамя першага пажарышча канца XII ст., сляды моцнага пажару зафіксаваны ў слаях пачатку XIV ст. і сярэдзіны XIV ст.

Археалагічныя даследаванні паказалі, што дзядзінец Мсціслава меў сядзібную забудову, планіроўка якой была падпарадкавана агульнаму плану гарадзішча. Вуліцы ішлі да вала пад прамым вуглом, а тыя, што перасякалі іх, не абавязкова былі паралельнымі валу[184].

Падчас даследаванняў на дзядзінцы Мсціслава ў яго цэнтральнай частцы былі зафіксаваны рэшткі некалькіх пабудоў, якія змянялі адна другую, выконвалі ролю царквы і адначасова з'яўляліся абарончай вежай. Памеры першай пабудовы высвятліць не было магчымасці, таму што яна цалкам загінула ў пажарышчы. Другая пабудова, што змяніла яе, была пабудавана ў другой чвэрці XIII ст. і мела памеры 13 × 12,5 м. Гэту пабудову змяніла новая, квадратнай формы (памеры стараны 6,95 см). У яе паўночна-заходняй частцы была невялікая, прыпаднятая над зямлёю пляцоўка[185].

---

[183] Алексеев Л. В. Проблемы становления культово-оборонного зодчества Руси. – С. 219; Яго ж. Мстиславский детинец в XII–XIV веках. – С. 65.

[184] Алексеев Л. В. Смоленская земля в IX–XIII вв. – С. 192.

[185] Алексеев Л. В. Проблемы становления культово-оборонного зодчества Руси. – С. 218–223.

Чацвёртая пабудова была значна большай па памерах за папярэднія. Яна была пабудавана з некалькіх трохсценых зрубаў – у тэхніцы, характэрнай для драўляных сцен, што стаялі на валах крэпасцей[186]. Памеры гэтай пабудовы – 13,7 × 12 м. Час узвядзення чацвёртай пабудовы адносіцца да 60-х гадоў XIII ст. Яна загінула ў наступным вялікім пажары, які Л. В. Аляксееў датуе першымі гадамі XIV ст.[187] Пісьмовыя крыніцы не канкрэтызуюць, з якімі гістарычнымі падзеямі звязаны гэты пажар Мсціслава. Але улічваючы напружаныя ўзаемаадносіны напрыканцы XIII – у пачатку XIV ст. паміж Смаленскам і Бранскам, нельга выключыць, што перад намі сляды барацьбы за панаванне на Пасожжы.

На рэштках чацвёртай пабудовы даволі хутка быў пастаўлены будынак новай канструкцыі, пабудаваны ў іншых архітэктурных формах. Гэта было драўлянае збудаванне васьмікутнай формы, якое, на думку Л. В. Аляксеева, было пабудавана ў канцы першага – другім дзесяцігоддзі XIV ст. Згодна са стратыграфічнымі назіраннямі, гэта пабудова загінула ў вялікім пажары XIV ст., які, верагодна, трэба звязваць з захопам Мсціслава Альгердам у 1359 г. Але і пасля гэтага пажара пабудова была даволі хутка адноўлена і праіснавала да сярэдзіны XVII ст., калі яна загінула падчас штурма Мсціслава А. Н. Трубяцкім 22 чэрвеня 1654 г.[188]

Аналіз пісьмовых крыніц дазволіў Л. В. Аляксееву выказаць думку, што рэшткі даследаванай ім вежы, якая выкарыстоўвалася і як храм, адносяцца да Мікольскай царквы, што адзначалася ў мсціслаўскім замку ў XVII ст.

На думку Л. В. Аляксеева, у замку была яшчэ і царква Успення Багародзіцы, якая была мураванай і існавала з XIII ст. Да яе ён адносіць фрагменты плінфы без слядоў рошчыны, знойдзеныя ў паўночнай частцы замка. Магчыма, да яе адносіцца і керамічная плітка падлогі, знойдзеная ў гэтым жа раёне замка[189]. Храм Успення Багародзіцы сапраўды, згодна з пісьмовымі крыніцамі, існаваў менавіта ў мсціслаўскім замку адпаведна з традыцыяй ставіць Успенскія храмы ў цэнтры умацаванняў[190]. У той жа час, калі ў замку існаваў мураваны храм, то чаму пра яго няма ніякіх звестак у пісьмовых крыніцах XV – сярэдзіны XVII ст., і калі ён быў знішчаны падчас пагрома горада войскамі А. Н. Трубяцкога ў 1654 г., то чаму не быў адноўлены? Усё гэта выклікае сумненне пра існаванне ў XII–XVI ст. мураванага храма ў мсціслаўскім замку.

---

[186] Раппопорт П. А. Очерки по истории военного зодчества Северо-Восточной и Северо-Западной Руси X–XV вв. // МИА СССР. – 1961. – № 105. – С. 134.

[187] Алексеев Л. В. Проблемы становления культово-оборонного зодчества Руси. – С. 224.

[188] Тамсама. – С. 226.

[189] Раппопорт П. А. Русская архитектура. Каталог памятников. Археология СССР. Свод археологических источников: Вып. Е1-47. – Л.: Наука, Ленинградское отдел., 1982. – С. 93; Алексеев Л. В. Проблемы становления культово-оборонного зодчества Руси. – С. 234; Яго ж. Древний Мстиславль в свете археологии // ГАЗ. – Мінск, 1995. – № 6. – С. 165.

[190] Лихачев Д. С. Градозащитная семантика Успенских храмов на Руси // Успенский собор Московского кремля. Материалы и исследования. – М.: Наука, 1985. – С. 17–23.

Археалагічныя даследаванні на пасадзе Мсціслава, размешчаным на паўднёвы захад ад Замкавай гары, з 1981 па 1990 г. праводзіла археалагічная экспедыцыя Спецыяльных вытворчых навукова-рэстаўрацыйных майстэрань Міністэрства культуры БССР пад кіраўніцтва А. А. Трусава. За гэты перыяд на тэрыторыі пасада было закладзена дзевяць раскопаў і болей за 100 архітэктурна-археалагічных шурфоў, што дазволіла вызначыць межы пасада і акольнага горада, прасачыць дынаміку іх развіцця ў XII–XVIII стст.

Найбольшая магутнасць культурнага пласта была зафіксавана на падыходах да Замкавай гары, у раёне кармеліцкага касцёла, дзе яна дасягае 3 м. На асобных участках старажытнага пасада магутнасць культурных адкладанняў эпохі Кіеўскай Русі дасягае 80 см. У ім сустракаюцца традыцыйныя для таго часу рэчы: керамічны посуд, шкляныя бранзалеты, сланцавыя праселкі, ключы ад замкоў, крыж-энкалпіён, бронзавы абразок.

Дзякуючы археалагічным даследаванням і назіранням за земляными работамі, удалося акрэсліць межы пасада XII–XIII стст.: яго заходняя мяжа праходзіла па сучаснай вуліцы імя Леніна, дзе ў шурфах №№ 21 і 60 знойдзены шкляныя бранзалеты і керамічны посуд XII–XIII стст. Паўднёвая мяжа праходзіла паміж сучаснымі вуліцамі імя Кірава і Савецкай, і ішла да яра, які аддзяляе Замкавую і Панівойскую горы і адначасова з'яўляецца прыроднай мяжой горада.

Картаграфаванне знаходак XII–XIII стст. паказала, што пасад Мсціслава, які размяшчаўся на паўднёвы захад ад Замкавай гары, у той час займаў плошчу каля 5–5,5 га. Раней у межах горада адзначалі і курганны могільнік, але да сённяшніх дзён ён не захаваўся[191].

Планіровачную схему Мсціслава XII–XIII стст. прапанаваў Р. В. Баравы[192]. Распрацаваная ім схема адпавядае планіровачнай структуры старажытнарускіх гарадоў, якія складаліся з замка, пасада і размешчанага паміж імі рынку. Апошні з'яўляўся не толькі цэнтрам гарадскога жыцця, але выконваў і пэўную абарончую функцыю. Таму звычайна старадаўні рынак, размешчаны над абарончым ровам, меў міндалепадобную форму і шырыню, якая б разам з шырынёй абарончага рова прыкладна адпавядала палёту стралы.

Рынак з'яўляўся другім горадаўтваральным цэнтрам, да якога сцягваліся гарадскія вуліцы. У прапанаванай Р. В. Баравым планіровачнай схеме Мсціслава засталося адкрытым пытанне пра пачатак засялення Падола і другіх раёнаў горада, якія, згодна з пісьмовымі крыніцамі, былі ўжо заселеныя на мяжы XV–XVI стст. Не было вырашана гэта пытанне і А. А. Трусавым падчас археалагічных даследаванняў 1981–1990 гг., якія праводзіліся выключна каля архітэктурных помнікаў Мсціслава XVIII–XIX стст., што было абумоўлена мэтамі архітэктурна-археалагічных даследаванняў.

---

[191] Краснянский В. Г. Город Мстиславль. – С. 80.

[192] Боровой Р. В. Развитие планировочной структуры Мстиславля (XII–XIX вв.) // Строительство и архитектура Белоруссии. – 1989. – № 4. – С. 3, рис. 3.

Між тым тэрыторыя Падола павінна была ўяўляць цікавасць у першую чаргу як месца пасялення. Частка тэрыторыі Падола размяшчалася ў даліне шырынёй каля 75–120 м паміж Панівойскай, Замкавай і Траецкай гарамі. З-пад кожнай з гэтых гор выцякае ручай, яны зліваюцца ў адзін каля ўсходняга схілу Замкавай гары, і потым ужо ён пад сучаснай назвай «Здаравец», альбо, як ён аднойчы названы ў крыніцы XVI ст., «Мсціславец», нясе свае воды ў Віхру на працягу каля 200–300 м. Такім чынам, гэта была ідэальная пляцоўка для засялення, прыкрытая стромкімі схіламі пагоркаў, тым болей што яна была забяспечана вадой. З любога схілу да Здараўца было не болей за 50–60 м.

Археалагічныя даследаванні, праведзеныя ўздоўж Здараўца, паказалі, што найбольш раннія матэрыялы, знойдзеныя тут, адносяцца да XIII ст.: фрагменты керамікі гэтага часу, шкляныя бранзалеты. Матэрыялы XIII ст. ў шурфах уздоўж Здараўца нешматлікія. Асноўная маса матэрыялаў з даследаваных тут шурфоў адносіцца ўжо да XIV–XVII стст. Найбольш насычаны артэфактамі шурфы, размешчаныя на тэрасіраванай тэрыторыі даліны, у той час як на схілах, што вядуць да Здараўца, культурны слой некалькі танчэйшы і менеў багаты на знаходкі. Культурны слой з матэрыяламі XIII стст. сустракаецца на працягу 200–250 м уніз ад Замкавай гары і каля 100 м уверх ад яе. Такім чынам, гэты пасад Мсціслава, які толькі пачынаў свае развіццё ў XIII ст., меў плошчу не менеў за 2,5–3 га.

Больш за тое, падчас копкі катлавана для падмуркаў дома на вул. Заслонава, 18 (на паўночна-ўсходнім схіле Траецкай гары), які размешчаны ў 200 м вышэй ад упадзення р. Здаравец у р. Віхра, таксама была знойдзена кераміка XIII ст. Шырыня засялення тут і зараз не перавышае 100 м, а далей пачынаецца топкая даліна Віхры. Таму і раней тут была заселена тэрыторыя не шырэй за 100 м. Такім чынам, і ўздоўж Траецкай гары ў XIII ст. таксама існаваў пасад, які займаў плошчу каля 2 га, а агульная плошча пасада каля Траецкай гары і ўздоўж Здараўца дасягала 4,5–5 га.

Нельга выключыць, што і ніжэй упадзення Здараўца таксама быў раён Падола, заселены ў старажытнарускі час. Пакуль археалагічныя даследаванні тут не праводзіліся. Аднак па такім тыпе – выцягванне ўздоўж воднай артэрыі – ішло фарміраванне большай часткі пасадаў старажытных гарадоў Усходняй Еўропы[193].

Гэтаму не супярэчаць і матэрыялы пад'ёмных збораў. Асобныя фрагменты керамікі, характэрнай для XII–XIII стст., сустракаюцца ніжэй упадзення Здараўца на адлегласці 100 м і шырынёй не болей за 50 м – фактычна да завяршэння першай тэрасы на правым беразе р. Віхра. Вышэй у шурфах на мацерыку ўжо ішла кераміка XIV–XVII стст. Такім чынам, ніжэй Здараўца пасад XII–XIII стст. меў плошчу каля 1 га, а агульная плошча пасада на Падоле ў гэты час дасягала 5,5–6 га.

---

[193] Мокеев Г. Я. Типология древнерусских городов // Архитектурное наследство. Проблемы градостроительства IV–XIX вв. – 1976. – № 25. – С. 4.

Нейкае паселішча ў XII–XIII стст. існавала і на Панівойскай гары, якая знаходзілася насупраць Замкавай. Тут падчас шурфоўкі быў выяўлены культурны слой магутнасцю 0,3 м, у якім была знойдзена кераміка гэтага часу і матэрыялы XVI–XVIII стст. Сама Панівойская гара мае плошчу каля 2,5 га. Згодна са звесткамі В. Г. Краснянскага сваю назву яна атрымала ад таго, што тут некалі жыла аўдавелая княгіня Ульяна, жонка мсціслаўскага князя Івана Юр'евіча, гэта значыць у канцы XV ст.[194]

Аднак мяркуючы па назве, гара атрымала яе ў больш позні перыяд. «Панівойская» гара атрымала назву ад нейкай «пані войскай» – жонкі мсціслаўскага войскага. Войскія з'явіліся ў Мсціславе толькі пасля арганізацыі Мсціслаўскага ваяводства ў 1565–1566 гг., такім чынам, назва гары магла з'явіцца пасля гэтага часу, а не ў гады існавання Мсціслаўскага ўдзельнага княства.

Такім чынам, матэрыялы шурфовак дазволілі высветліць, што пасад Мсціслава XII–XIII стст. складаўся з некалькіх частак: на берагавым плато на паўднёвым усходзе ад замка, займаў плошчу каля 5–5,5 га і меў натуральныя межы, вызначаныя ярамі, што ахопліваюць гэта плато з усходу і поўначы; на Панівойскай гары існаваў пасад плошчай каля 1,5–2 га; пасад уздоўж ручая Здравец і на Падоле агульнай плошчай каля 5–5,5 га (мал. 20). Агульная плошча горада ў XII–XIII стст. складала каля 12–15 га (мал. 21).

Згодна з храналогіяй засялення, адначасова з будаўніцтвам замка, каля яго сцен на поўдзень ад замка пачаў фарміравацца пасад. Нейкае паселішча адначасова ўзнікла і на суседняй Панівойскай гары. Пачынаючы з XIII ст. горад пачынае спускацца ў пойму Віхры і асвойваць яе берагі.

Л. В. Аляксееў, аналізуючы інфармацыю пісьмовых крыніц, зрабіў выснову, што ў Мсціславе «вакольны горад быў узведзены (ці ўмацаваны) Расціславам, г. зн. паміж 1127 і 1159 гг.»[195]. Між тым падстаў для такога датавання вакольнага горада Мсціслава няма. Як паказалі даследаванні, пераўтварэнне пасада ў вакольны горад адбылося значна пазней, і пытанне пра гэта будзе разглядацца ніжэй. А ў XII–XIII стст. пасады Мсціслава не мелі штучных земляных умацаванняў.

Як і кожны сярэдневяковы горад, Мсціслаў меў адпаведную падпарадкаваную яму акругу, для якой ён з'яўляўся адміністрацыйным, рамесна-гандлёвым, культурным, ваенным і культавым цэнтрам.

Вызначыць тэрыторыю, якая першапачаткова надавалася новапабудаванаму гораду, дапамагае інфармацыя Статута 1136 г. пра наяўнасць ў яго навакольлях валасцей Крэчут, Басея. Першая з іх абмяжоўвала воласць Мсціслава з поўдня, і, як ужо адзначалася, паўночная мяжа Крэчута-Крычава і адпаведна паўднёвая мяжа Мсціслава ішлі па рэках Белая і Чорная Натапа, уздоўж плыні левага прытока Сожа р. Сожанка ў напрамку Астра. Другая паведамляе прыблізныя арыенціры, дзе трэба шукаць мяжу воласці Мсціслава на паўночным

[194] Краснянский В. Г. Город Мстиславль. – С. 45.

[195] Алексеев Л. В. Смоленская земля в IX–XIII вв. – С. 167.

Мал. 20. Мсціслаў. Від на горад з Замкавай гары

захадзе, – плынь р. Проня. На паўночны захад ад Мсціслава знаходзілася воласць Міpацічы, а ў другой палове XII ст. – удзел князя Рамана Міхайлавіча з гарадамі Красн і Васільеў.

На паўночны захад ад Мсціслава ў XV–XVI стст. знаходзілася воласць «Малаховский путь», размешчаная ўздоўж ракі Малохва. Яна добра вядома па крыніцах XV ст. і толькі пры Вітаўце была аднесена да Мсціслаўскага княства, а раней належала Смаленску[196]. Гэта сведчыць пра тое, што воласць Малохва існавала як мінімум з XIV ст., а магчыма, пачатак яе фарміравання адносіцца да больш ранняга перыяду – XII–XIII стст. Па другое, гэта дазваляе шукаць паўночна-заходнюю мяжу воласці Мсціслава XII–XIV стст., на поўдзень ад р. Малохва.

Больш дакладна вызначыць мяжу воласці Мсціслава з воласцю Малохва дапамагаюць крыніцы XV – пачатку XVII ст. На левым беразе р. Гародня мы сустракаем самыя паўднёвыя малахоўскія вёскі пачатку XVII ст., а на поўдзень ад яе мы бачым шматлікія пажалаванні «мстиславских удельных князей» XV ст. Улічваючы, што нам не вядомы пажалаванні мсціслаўскіх князёў у Малахоўскай воласці, можна выказаць думку, што гэта воласць не разгляда-

[196] АЗР. – Т. 1. – С. 361. – № 213.



Мал. 21. Тапаграфія Мсціслава XII–XIII стст.: *1* – Замкавая гара; *2* – Траецкая гара; *3* – Дзявочая гара; *4* – Панівойская гара

лася Лынгвеневічамі як іх бясспрэчнае ўладанне, тэрыторыю якой яны маглі разглядаць у якасці фонда да сваіх падараванняў. А саму р. Гародня можна разглядаць як паўднёвую мяжу воласці Малохва і адпаведна паўночную мяжу воласці Мсціслава XV ст. якая, магчыма склалася ў XII–XIII стст.

Значна горшая сітуацыя складваецца з вызначэннем мяжы воласці Мсціслава на ўсход ад ракі Малохвы. Тут тэрыторыя воласці Мсціслава ў XV ст. межавала са смаленскай воласцю «Максімаўскі пуць», звесткі пра населеныя пункты якой не дазваляюць дакладна вызначыць мяжу паміж гэтымі адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі адзінкамі. А інфармацыя пра больш раннія населеныя пункты цалкам адсутнічае. Таму вызначаючы мяжу паміж Мсціславам і воласцю «Максімаўскі пуць», мы маем магчымасць абапірацца толькі на памежнае размежаванне паміж Масквой і Вільняй 1522 г. і праводзіць мяжу воласці горада ўздоўж р. Лютая.

На ўсход ад Мсціслава знаходзіўся горад Расціслаўль, пабудаваны князем Расціславам Мсціславічам і названы ім у свой гонар, сучасны г. Рослаўль Смаленскай вобласці. Ён размяшчаўся ад Мсціслава на адлегласці ў 80 км і таксама меў падпарадкаваную акругу.

Мяжу воласці Мсціслава з воласцю Расціслаўля, верагодна, трэба шукаць у сярэднім цячэнні р. Стомяч, правага прытока р. Асцёр. Мерыдыяльная плынь р. Стомяч, што працякае праз вялікі дрыгвяны масіў, на наш погляд, была

ідэальным прыродным рубяжом шырынёю 10–15 км і даўжынёю з поўначы на поўдзень 30–35 км паміж Мсціславам і Рослаўлем.

Такім чынам, для арганізацыі воласці-акругі новапабудаванага ў 30-я гады XII ст. горада фактычна заставалася вольнай тэрыторыя, абмежаваная міжрэччам Проні і Стомячы, а таксама Чорнай Натапы, Сожанкі, Малохвы і сожскай Бярэзіны. Менавіта гэта тэрыторыя, што працягвалася з захаду на ўсход амаль на 100 км і з поўначы на поўдзень на 50 км, была выдзелена ў якасці воласці новапабудаванага Мсціслава. Такім чынам, плошча воласці Мсціслава складала каля 5000 кв. км (мал. 22).

Яшчэ адным з гарадоў Пасожжа Смаленскага княства, які не згадваецца ў Статуце Расціслава Мсціславіча 1136 г., быў Расціслаўль, сучасны Рослаўль



Мал. 22. Паўднёвыя раёны Смаленскай зямлі ў першай палове XII ст.: *1* – гарады і адміністрацыйныя цэнтры; *2* – воласці Смаленскай зямлі першай паловы XII ст.; *3* – мяжа Смаленскай зямлі ў 1127–1136 гг.; *4* – мяжа воласці Мсціслава

Смаленскай вобласці Расіі. Але ў пісьмовых крыніцах XII–XIII стст. ён згадваецца ў грамаце «Аб пагароддзі і пачэсціі» другой паловы XII – пачатку XIII ст.[197]

Згодна з ёю, з Расціслаўля на карысць смаленскага епіскапа бралася спецыяльная даніна з гарадоў – «пагароддзе» ў памеры 3 грыўняў. Адначасова за гонар епіскапскай службы ў горадзе, рослаўцы плацілі яму «пачэсціе» ў памеры адной грыўні і 4 лісіц[198]. Мяркуючы па памерах выплочваемага «пагароддзя і пачэсція», Расціслаўль па сваёй эканамічнай ролі значна саступаў у Смаленскай зямлі не толькі Таропцу, але і Копысі, Мсціславу, Жыжацу, і быў прыкладна роўным Лучыну і Ельні. Зыходзячы з першапачатковай назвы горада, ён быў пабудаваны Расціславам Мсціславічам і быў ім так названы ў свой гонар[199].

Хоць існаванне на тэрыторыі горада шматлікіх помнікаў археалогіі адзначалі яшчэ ў XIX ст., першыя археалагічныя даследаванні летапіснага Расціслаўля былі праведзены толькі ў 1969–1970 гг. Л. В. Аляксеевым[200]. У 1973 і ў 1975 гг. невялікія даследаванні помнікаў архітэктуры старажытнага Расціслаўля праводзіў П. А. Рапапорт[201].

Археалагічныя даследаванні Л. В. Аляксеева пацвердзілі думку, што горад быў пабудаваны ў сярэдзіне XII ст., аднак для больш дакладнай даціроўкі часу ўзнікнення яго дзядзінца не хапае матэрыялаў. Даследаванні ж на пасадзе горада пакуль не праводзіліся, таму для вызначэння яго памераў пакуль няма падстаў.

Даследаванні помнікаў архітэктуры Расціслаўля паказалі, што ў горадзе ў XII–XIII стст. існавалі як мінімум два каменныя храмы, пра што сведчаць знаходкі плінфы. Адзін з храмаў быў на дзядзінцы, а другі на пасадзе, на перакрыжаванні сучасных вуліц імя Леніна і Пралетарскай. Мяркуючы па памерах плінфы, храм на пасадзе быў пабудаваны ў першай трэці XIII ст, гэтым жа часам датуецца плінфа з дзядзінца[202].

Воласць Расціслаўля, верагодна, была невялікай. Гэта было абумоўлена размяшчэннем навакол яго іншых гарадскіх цэнтраў. З захаду да Расціслаўля прылягалі воласці Мсціслава і Крычава, мяжа з якімі ішла, адпаведна, па балоцістым рэчышчы Стомячы і ўздоўж лініі, якая звязвала сучаныя населеныя пунктаў Іванаўск – Мілаславічы – Родня Клімавіцкага раёна. На поўначы ад Расціслаўля размяшчалася воласць Смаленска. На ўсходзе, на Дзясне, размяшчалася воласць горада Пацынь (гарадзішча Асавік).

---

[197] Алексеев Л. В. Смоленская земля в IX–XIII вв. – С. 25; Янин В. Л. Заметки о комплексе документов Смоленской епархии. – С. 118.

[198] Древнерусские княжеские уставы XI–XV вв. – С. 146.

[199] Алексеев, Л. В. Древний Ростиславль // КСИА. – 1974. – Вып. 139. – С. 81.

[200] Тамсама. – С. 86.

[201] Раппопорт П. А., Шолохова Е. В. Раскопки в Рославле // АО 1975 года – М.: Наука, 1976. – С. 83; Воронин Н. Н., Раппопорт П. А. Зодчество Смоленска XII–XIII вв. – Л.: Наука, Ленинградское отдел., 1979. – С. 345–346; Раппопорт П. А. Русская архитектура. – С. 93.

[202] Воронин Н. Н. Зодчество Смоленска. – С. 346; Раппопорт П. А. Русская архитектура. – С. 93.

Пацынь і Расціслаўль размешчаны на адлегласці 40 км адзін ад другога, таму з гэтага боку воласць Расціслаўля была невялікай. На поўднёвым усходзе (32–35 км ад Расціслаўля) крыніцы згадваюць іншую смаленскую воласць – Заруб. А на паўднёвым захадзе (35–40 км) знаходзіўся іншы гарадскі центр Смаленскага княства – Зарой.

Такім чынам, пасля картаграфавання гэтых смаленскіх валасцей выразна бачна, што для арганізацыі воласці новапабудаванага ў сярэдзіне XII ст. Расціслаўля заставалася зусім невялікая тэрыторыя радыусам ў 20–35 км з Расціслаўлем у цэнтры. Магчыма, менавіта такая невялікая тэрыторыя воласці Расціслаўля і тлумачыць невялікія памеры даніны, якая выплочвалася горадам епіскапу.

Назіранні за станаўленнем і развіццём гарадскіх цэнтраў на Сярэднім і Верхнім Пасожжы дазваляюць выразна прасачыць некалькі этапаў у фарміраванні сярэдневяковых адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак рэгіёна нашага даследавання.

Першы этап адносіцца да X–XI стст. і даволі часта ён абапіраецца на цэнтр больш ранняга часу – жалезнага веку і ранняга Сярэднявечча. Па такім варыянце фарміраваліся адміністрацыйныя цэнтры ў Мгліне, Дрокаве, Крычаве, Прупоі.

На тэрыторыі гэтых цэнтраў альбо ў непасрэднай блізасці ад іх (паселішча ў пойме Сожа ў Крычаве) існавала буйное паселішча X–XI стст., якое стала тым ядром, на аснове якога і пачаў расці цэнтр воласці. З'яўляючыся першапачаткова апорнымі пунктамі ў севяранскай ці радзіміцкай каланізацыі Пасожжа, яны з самага пачатку свайго функцыянавання ўзялі на сябе ролю апорнай кропкі, ад якой «адпачкоўвываліся» новыя паселішчы і з якой ішло асваенне навакольля. Магчыма, на першапачатковым этапе свайго развіцця яны таксама выступалі і ў якасці рэлігійных цэнтраў акругі. Нельга выключыць, што такі шлях прайшоў і Расціслаўль, у якім раней было гарадзішча жалезнага веку (зараз знішчана)[203].

Паступова, з феадалізацыяй грамадства гэтыя паселішчы, верагодна, пачалі браць на сябе функцыю адміністрацыйных цэнтраў акругі. З уваходам гэтых зямель у склад Кіеўскай (993 г.) а потым і Чарнігаўскай зямлі (1036 г.) яны, верагодна, пачалі выконваць ролю апорнай кропкі ў «адзяржаўліванні» гэтых зямель цэнтральнай ўладай.

Пасля ўваходу зямель Сярэдняга і Верхняга Пасожжа ў склад Смаленскай воласці, а потым і самастойнага Смаленскага княства (другая палова XI – пачатак XII ст.) наступае другі этап у горадабудаўніцтве на гэтых землях.

На паўднёва-ўсходніх землях княства будуюцца новыя ўмацаваныя цэнтры – Звяровічы, Горы (канец XI – пачатак XII ст.), Копысь, Басея–Гарадзішча (пачатак XII ст.), Навасёлкі–Заруб, Асавік–Пацынь (пачатак XII ст.).

Супадзенне часу пачатку будаўніцтва горада з часам ўваходу прылеглай да яго тэрыторыі ў склад Смаленскай зямлі дазваляе сцвярджаць, што першас-

[203] Алексеев Л. В. Смоленская земля в IX–XIII вв. – С. 178–179.

ным штуршком ў будаўніцтве горада была наяўнасць у яго наваколлі шчыльнага сельскага насельніцтва і мэтанакіраваная дзейнасць смаленскага княскага дома. Гарады будаваліся як цэнтры феадальнага фіска і ваенныя крэпасці на новых землях. І першаснымі функцыямі, якія яны выконвалі, былі функцыі адміністрацыйнага цэнтра акругі і ваеннай крэпасці.

Пасля паходу Расціслава Мсціславіча на землі радзімічаў у 1127 г. на крывіцка-радзіміцкім памежжы княскай воляй будуецца шэраг новых гарадскіх цэнтраў – Мсціслаў, Рослаўль, Зарой (?) і ўмацоўваюцца больш раннія цэнтры валасцей – Прупой.

Акрамя таго, пачынаючы з сярэдзіны XII ст. набірае моц працэс унутранай каланізацыі. У гэты час атрымліваюць дадатковы штуршок у развіцці, таксама і дапамогай княскай ўлады, старыя гарадскія цэнтры на даўно ўжо асвоеных землях. На гэтым этапе пачынае будавацца новы ўмацаваны цэнтр ў Крычаве – гарадзішча Замкавая гара, а таксама, пасля стварэння дамена для князя Рамана, далейшы імпульс для развіцця атрымліваюць Звяровічы – Красны Горы – Васільеў.

Геаграфічнае размяшчэнне гарадоў Сярэдняга і Верхняга Пасожжа таксама выразна прасочвае адрозненні ў шляхах іх узнікнення. Калі на поўдні рэгіёна гарадскія цэнтры вырасталі на падставе першапачатковых племянных цэнтраў роменскага насельніцтва, то ў больш паўночных раёнах на працэсе горадабудаўніцтва ляжыць адзнака мэтанакіраванай дзейнасці вялікакняскай (смаленскай) адміністрацыі.

Такім чынам, на працягу XI–XII стст. на Сярэднім і Верхнім Пасожжы сфарміравалася ўстойлівая сістэма адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу тэрыторыі, што ўваходзіла ў склад Смаленскай зямлі. Далейшы гістарычны лёс регіёна паказаў, што большасць гэтых адміністрацыйных цэнтраў і іх валасцей працягвала функцыянаваць і ў пазнейшы час, і толькі нязначная іх частка ў далейшым спыніла свае развіццё.

Менавіта адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел, створаны на Сярэднім і Верхнім Пасожжы ў XI–XII стст., паслужыў асновай для арганізацыі Мсціслаўскага ўдзельнага княства.

МСЦІСЛАЎСКАЕ КНЯСТВА ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XII – ПАЧАТКУ XVI ст.

3.1. Узнікненне Мсціслаўскага княства і яго гісторыя ў другой палове XII – першай палове XIV ст.

Як ўжо адзначалася, гісторыя Мсціслаўскага княства вельмі цяжка паддаецца рэканструкцыі, што выклікана перш за ўсё малой захаванасцю крыніцазнаўчай базы. Якое б пытанне з гісторыі княства мы ні ўзнімалі, крыніцы дазваляюць нам зрабіць толькі агульны схематычны нарыс, а для дэтальнай прапрацоўкі малюнка не хапае дакументаў. Тым не менш, паспрабуем разглядзець гісторыю Мсціслаўскага княства пачынаючы з высвятлення пытання пра час яго ўзнікнення і вызначэння першапачатковай тэрыторыі.

Летапісныя паведамленні пра заснаванне ці дакладнае існаванне ўдзельнага стала ў Мсціславе ў XII–XIII стст. да нас не дайшлі. Найбольш раннюю дату пра заснаванне ўдзельнага Мсціслаўскага княства мы сустракаем у П. М. Раеўскага. Згодна з яго паведамленнем, Мсціслаўскае княства было заснавана ў 1151 г. Расціславам Мсціславічам[1]. Аднак ніякіх спасылак на першакрыніцу, з якой ідзе гэта дата, на вялікі жаль, аўтар не дае.

Другое паведамленне пра існаванне Мсціслаўскага ўдзела ў Смаленскай зямлі XII–XIII стст. захавалася ў В. М. Тацішчава. У «Гісторыі Расійскай», апавядаючы пра падзеі 1180 г., ён паведамляе, што паміраючы смаленскі князь Раман Расціславіч: «...оставил по себе сына Мстислава, которому построил город Мстиславль в области Смоленской и тамо велел ему под властию стрыя его быть»[2]. Але і ў дадзеным выпадку ў аўтара адсутнічаюць спасылкі на першакрыніцу.

Пакідаючы па-за ўвагай сцвярджэнне В. М. Тацішчава пра будаўніцтва ў 1180 г. горада Мсціслава, звернем увагу на другую частку гэтай крыніцы, у якой непасрэдна гаворыцца пра перадачу Раманам Расціславічам горада ў кіраванне свайму сыну Мсціславу, што паказвае значнасць горада сярод іншых гарадскіх цэнтраў Смаленскай зямлі.

Факт перадачы горада ў кіраванне прадстаўніку малодшай галіны смаленскіх Расціславічаў пры знаходжанні на цэнтральным, смаленскім стале прадстаўніка старэйшай галіны дазваляе сцвярджаць пра існаванне як мінімум з канца ў XII ст. падзелу адзінай Смаленскай зямлі на ўдзельныя сталы, адным з якіх быў мсціслаўскі.

---

[1] Раевский П. М. Род царя и царевен и князей Шуйских. – С. 21.

[2] Татищев В. Н. История Российская: в 7 т. – М.; Л.: Изд-во Акад. наук СССР, 1964. – Т. 3. – С. 123; Янин В. Л. Заметки о комплексе документов Смоленской епархии. – С. 118.

Акрамя звестак В. М. Таціщава і П. М. Раеўскага, вялікую ролю Мсціслава ў складзе Смаленскай зямлі XII–XIII стст., як аднаго з буйнейшых гарадоў, дзе сапраўды мог існаваць удзельны стол, падкрэслівае грамата «Аб пагародзі і пачэсці».

Аднак у гістарычнай навуцы застаецца агульнапрынятай думка, што Мсціслаўскае ўдзельнае княства было ўтворана ў канцы XIV ст. і існавала толькі ў складзе Вялікага Княства Літоўскага. Гэтаму спрыяе і той факт, што пасля паведамлення 1180 г. звесткі пра мсціслаўскіх князёў і пра ўдзельны стол у Мсціславе да канца XIV ст. цалкам адсутнічаюць.

У 1197 г. Мсціслаў Раманавіч, згодна з тэстаментам Давыда Расціславіча, займае смаленскі стол. Каму дастаўся Мсціслаў, у чыіх руках ён апынуўся, невядома. Сярод смаленскіх удзельных княстваў другой паловы XIII ст. згадваюцца Мажайскае і Вяземскае, а пра Мсціслаўскае княства няма ніякіх паведамленняў. Адсутнічаюць звесткі пра мсціслаўскіх князёў і Мсціслаўскі ўдзел і ў манаграфіі Д. Н. Аляксандрава, прысвечанай гісторыі Смаленскай зямлі XIII–XIV стст.[3] Толькі Л. Вайтовіч называе мсціслаўскіх князёў сярэдзіны XIII – першай паловы XIV ст. Праўда, і ён не называе першакрыніцы, адкуль бярэ гэту цікавую інфармацыю.

Так, на яго думку, у 1260–1278 гг. Мсціслаўскім княствам мог валодаць Міхаіл Расціславіч. У 1278–1281 гг. Мсціславам валодаў Аляксандр Глебавіч. Пасля яго горадам да 1301 г. валодаў ягоны брат Раман Глебавіч. Рамана на мсціслаўскім стале змяніў яго аднайменны брат, які княжыў тут да 1313 г. Апошнім вядомым Л. Вайтовічу валадаром Мсціслава быў Дзмітрый Раманавіч, які атрымаў Мсціслаў у 1313 г.[4] Як бачым, Л. Вайтовіч мсціслаўскімі князямі называе ўсіх вялікіх смаленскіх князёў другой паловы XIII – першай паловы XIV ст., такім чынам атрымліваецца, што мсціслаўскі ўдзельны стол увесь час заставаўся ў руках вялікіх смаленскіх князёў, што ізноў падкрэслівае вялікую эканамічную і палітычную ролю Мсціслава ў Смаленскай зямлі. Магчыма, так яно і было, што мсціслаўскі ўдзел увесь час заставаўся непасрэдна ў руках вялікіх смаленскіх князёў, якія разглядалі яго ў якасці свайго даменнага ўладання і перадавалі ў межах сям'і, што валодала Смаленскам.

Тым не менш, нягледзячы на адсутнасць дакладных звестак пра мсціслаўскіх удзельных князёў і пра існаванне ўдзельнага стала ў Мсціславе ў XIII – сярэдзіне XIV ст. факт яго існавання ў гэты час нельга выключаць, абапіраючыся выключна на адсутнасць пісьмовых крыніц. Тым болей, што крыніцы, якія асвятляюць гэты перыяд, фактычна адсутнічаюць.

Прыкладам існавання ўдзельнага княства ў больш ранні час, чым гэта агульна прынята лічыць, з'яўляецца сітуацыя са Слуцкам. Дынастыю слуцкіх князёў выводзяць прыкладна з 1395 г. ад князя Аляксандра Алелькі: «Володимир ... сплодил Александра албо Алелга сына, котрый збудовал Слуцко, освенцоных

[3] Александров Д. Н. Смоленская земля в XIII–XIV вв. – М.: Наука, 1998. – 145 с.

[4] Войтовіч Л. Удільні княства Рюриковичів і Гедеміновичів у XII–XVI ст. – Львів: Від. ОО Василіян «Місіонер», 1996. – Табл. 20, № 48, 52, 53, 59, 62.

княжат Слуцких, народ и фамилию славную Олелковичов размножил»[5]. У той жа час Е. Вольф адзначае, што князь Юрый слуцкі з роду пінскіх князёў згадваецца ў 1387 г. сярод асоб, якія пацвердзілі факт перадачы Галіча ваяводу Бенедыкту. На яго думку, ён мог быць з роду Нарымунтавічаў і, магчыма, распачаў новую дынастыю пасля згасання слуцкіх князёў з лініі Рурыкавічаў[6]. У выпадку ж з Мсціславам дынастыя смаленскіх князёў не перарывалася, і таму яны маглі на працягу ўсяго часу трымаць у сваіх руках уладанні вакол Мсціслава.

Адсутнасць непасрэдных пісьмовых паведамленняў XII–XIII стст. пра існаванне Мсціслаўскага ўдзельнага княства другой паловы XII – сярэдзіны XIV ст. вымушаюць нас для высвятлення гэтага пытання шукаць іншыя крыніцы.

Безумоўна, што для арганізацыі ўдзельнага стала ў Мсціславе перш за ўсё была неабходна адпаведная эканамічная база, для якой тэрыторыя першапачатковай воласці горада (1135 г.), абмежаваная рэкамі Проня і Стомяч, Чорная Натапа і Малохва, была малой.

Але, як адзначалася вышэй, у 1142 г. мяжа Смаленскай зямлі значна прасунулася на поўдзень. У выніку паходу Расціслава Мсціславіча на Чарнігаўскае княства да Смаленскай зямлі былі далучаны радзіміцкія землі ў міжрэччы Сожа і Іпуці[7]. Менавіта гэтыя землі разам з заселенымі радзімічамі валасцямі Крэчута і Прупоя і сталі тэрытарыяльнай базай, на якой было сфарміравана ўдзельнае Мсціслаўскае княства.

Пра тое, што далучаныя ў 1142 г. да Смаленскай зямлі радзіміцкія землі сталі базай для сфарміраванага Мсціслаўскага княства, сведчыць перш за ўсё супадзенне кірунку праходжання чарнігаўска-смаленскай мяжы XII–XIII стст. з паўднёва-заходняй і паўднёвай мяжой Мсціслаўскага княства, вядомай па крыніцах канца XIV–XV стст.

Мяжа паміж Смаленскам і Чарнігавам, якая ўсталявалася ў 1142 г., праходзіла на поўнач ад чарнігаўскіх гарадоў Старадуб, Сіні Мост, Расуха, Ворміна, Варабейна. З боку Смаленскай зямлі такой бясспрэчнай апорнай кропкай ў пошуках мяжы паміж княствамі з'яўляецца толькі населены пункт Зарой – гарадзішча каля в. Бяседка Ершыцкага раёна Смаленскай вобласці.

Смаленска-чарнігаўская мяжа праходзіла недалёка ад Старадуба, пра што сведчыць наяўнасць прыблізна ў 10 км на поўнач ад яго тапоніма Мяжэнікі, на поўнач ад якога размешчана гарадзішча каля в. Рухава, на якім ёсць матэрыялы X–XIII стст. На думку Е. А. Шынакова, гарадзішча Рухава разам з гарадзішчам каля в. Расуха былі памежнымі замкамі Чарнігаўскага княства, а за імі пачыналася даволі шырокая (40–50 км) «нейтральнай» тэрыторыя паміж Чарнігаўскім і Смаленскім княствамі[8].

---

[5] ПСРЛ. – Т. 32. – М. ; Наука, 1975. – С. 63, 214.

[6] Wolff J. Kniazowie litewsko-ruscy od konca czternastego wieku. – Warszawa: Gebethner, Wollf, 1895. – S. 366.

[7] Мяцельскі А. А. Смаленска-чарнігаўскае памежжа XII стагоддзя. – С. 140–160.

[8] Шинаков Е. А., Миненко В. В., Сафонов И. В. «Города» черниговско-северского пограничья: факторы и этапы развития // Роль ранніх міських центров в становленні Київськоі Русі. – Сумы, 1993. – С. 23–28.

Аднак думка пра наяўнасць шырокай «нейтральнай» тэрыторыі паміж княствамі, на наш погляд, не зусім слушная. Наяўнасць паміж Рухавам і Старадубам тапоніма Мяжэнікі сведчыць пра тое, што мяжа паміж Смаленскім і Чарнігаўскім княствамі праходзіла недзе тут. Да таго ж, калі разглядаць Рухава як чарнігаўскую крэпасць, то кідаецца ў вочы яе не зусім слушнае месцазнаходжанне – да яе можна скрытна падыйсці унецкімі лясамі.

Рухава, хутчэй за ўсё, было памежнай крэпасцю Смаленскай зямлі, адкуль вялося назіранне за Старадубам – буйным цэнтрам Чарнігаўскай зямлі. Пра прыналежнасць Рухава і Расухі да розных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак сведчаць і больш познія крыніцы. Так, у XV ст. Рухава ўваходзіла ў склад Мглінскага павета Мсціслаўскага княства, а Расуха ўваходзіла ў склад Старадубскага павета[9]. Улічваючы, што адміністрацыйна-гаспадарчы падзел ВКЛ вядзе сваё паходжанне з больш ранніх часоў[10], можна меркаваць, што і ў нашым выпадку крыніцы XV ст. адлюстроўваюць адміністрацыйна-гаспадарчы падзел, які склаўся ў XII–XIV стст. У падтрымку гэтай думкі сведчыць і супадзенне агульнага кірунку смаленска-чарнігаўскага памежжа на ўсход ад Расухі, прапанаванага Е. А. Шынаковым[11], з паўднёвай і паўднёва-ўсходняй мяжой Мглінскага павета[12].

Зыходзячы з гэтага, у якасці смаленскіх фарпостаў на поўдні княства можна разглядаць археалагічныя комплексы ў сучасным г. Мглін і в. Ст. Дрокаў, на якіх ёсць матэрыялы XII–XIII стст.[13] Само ж смаленска-чарнігаўскае памежжа праходзіла паміж Мглінам, Ст. Дрокавам і вышэйпералічанымі чарнігаўскімі гарадамі.

Мяжа Мсціслаўскага княства XIV–XV стст. добра лакалізуецца дзякуючы вядомаму памежнаму размежаванню 1522 г. паміж Масквой і Вільняй, якое абапіраецца на ўнутраныя межы Вялікага Княства Літоўскага больш ранняга часу.

Рубеж паміж Мглінам і Бранскам «реестр мглинский» акрэслівае такім чынам: «На памятъ, што рубежъ пришол из Гомгия (Гомия), Ипуть реки, из Ипутя к Ушаковичомъ – то Мглинска, а против того Салавняне брянская, а межи тыми селы рубеж мглински из Брянском – Ормина городищи брянское Окуличи село». У гэтым апісанні мглінска-бранскага памежжа ў склад маскоўскіх валасцей Мгліна і Бранска ўключаны воласці Прыкладні і Салаўянічы, але далей апісанне дазваляе больш дэтальна аддзяліць адну воласць ад другой і на гэтай падставе зрабіць рэканструкцыю паўднёвай мяжы Мсціслаўскага княства.

---

[9] Любавский М. К. Областное деление и местное управление Литовско-Русского государства ко времени издания Первого Литовского статута. – М.: Университетская тип., 1892. – С. 138, 290.

[10] Тамсама. – С. 60–62.

[11] Шинаков Е. А. «Города» черниговско-северского пограничья. – С. 24–25.

[12] Любавский М. К. Областное деление и местное управление... – С. 138.

[13] Археологическая карта России. Брянская область. – С. 147, 239.

Мглінска-бранскі рубеж на поўнач ад Ворміны праходзіў на ўсход ад мглінскай вёскі «Диваним» – суч. в. Дзіваўка Мглінскага раёна Бранскай вобласці. Верагодна, і мяжу Мсціслаўскага княства трэба шукаць у гэтым рэгіёне.

Далей мяжа Мсціслаўскага княства, верагодна, праходзіла на старадубска-мглінскім рубяжы, які добра вызначаецца па наступным апісанні: «А промежы тых сёл рубеж до Стародуба пошёл. Расуха стародубская, а Мезыревская – то мглинская. А промежи ними рубеж. А Наипутовичи стародубское, а Рухова мглинская. А промеж того рубеж от Рухова к Хвашню»[14]. Большая частка гэтых тапонімаў і сёння добра лакалізуецца і дае магчымасць вызначыць напрамак паўднёвай мяжы Мглінскай воласці Мсціслаўскага княства. Што датычыць Хвашня, С. Кучынскі прапанаваў лакалізаваць яго ў міжрэччы Іпуці і Беседзі на возеры Кажаны, размешчаным на адной лініі з Рухавам.

Ад Наіпутавіч, на думку С. Кучынскага, мяжа ішла левым берагам р. Унеча ў кірунку р. Іпуць. Далей мсціслаўская мяжа ішла ўніз па Іпуці да Баравіч старадубскіх, адкуль уздоўж гомельскай мяжы ішла на р. Беседзь і выходзіла на яе каля чачэрскага сяла Галодна[15].

Сумяшчаючы паўднёвае смаленска-чарнігаўскае памежжа XII–XIII стст. і мяжу Мсціслаўскага княства XIV–XVI стст. мы бачым іх пэўнае супадзенне, што дазваляе выказаць меркаванне пра іх адначасовае фарміраванне, альбо пра тое, што ў аснове больш позняй мяжы ляжыць папярэдняя (мал. 23).

Падобная карціна назіраецца і на значнай частцы заходняга смаленска-чарнігаўскага памежжа XII–XIII стст. і Мсціслаўскага княства XIV–XV стст. Тут С. Кучынскі вёў заходнюю мяжу Мсціслаўскага княства ўздоўж левага берага р. Беседзь да наваколляў «Хадимска» – сучаснай в. Хоцімск Касцюковіцкага раёна. Але ў той жа час ён лічыў, што хутчэй за ўсё мсціслаўская мяжа падымалася ўверх па р. Палуж[16].

Паўднёва-заходняя частка смаленска-чарнігаўскага памежжа XII–XIII стст. рассякала радзіміцкія землі, падзяляючы іх паміж Чарнігавам і Смаленскам, і супадала з кірункам паўночна-заходняй мяжы Мсціслаўскага княства другой паловы XIV – пачатку XVI ст.

На захад ад Старадуба мяжа паміж валасцямі Паповай Гары, Гомія і Чачэрска маркіруецца тапонімамі і гідронімамі з асновай «стоўп». На паўднёвым усходзе воласці Гомія XII–XIII стст. – в. Стаўпёнка і р. Стоўпня на сучасным Гомельска-Бранскім памежжы. На поўнач ад Гомія знаходзілася Чачэрская воласць, усходняя мяжа якой зноў-такі маркіруецца тапонімамі з асновай «стоўп» – в. Стаўбун, р. Стаўбунка і Стаўбынь, воз. Стаўбынь, якія вядомы па пісьмовых крыніцах XVI–XVIII стст.[17] На захад ад гэтых тапонімаў зна-

[14] ДМАМЮ. – Т. 1. – С. 65.

[15] Kuczyński S. Ziemie czernihowsko-siewierskie pod rządami Litwy // Prace ukraińskiego instytutu naukowego. – Warszawa, 1936. – T. 33. – S. 75, 89–90.

[16] Kuczyński S. Ziemie czernihowsko-siewierskie pod rządami Litwy. – S. 75, 89–90.

[17] Макушнікаў А. А. Рубяжы Гомійскай воласці XII–XIII стст. // ГАЗ. Памяці Міхася Ткачова: в 2 ч. – Мінск, 1993. – Ч. 2. – С. 42–59.



Мал. 23. Карта Мсціслаўскага княства XII – першай паловы XIV ст.: 1 – мяжа ядра курганаў X–XII стст. з радзіміцкім пахавальным абрадам і этнавызначальным комплексам; 2 – курганныя могільнікі з радзіміцкім этнавызначальным комплексам; 3 – курганныя могільнікі з радзіміцкім пахавальным абрадам; 4 – курганныя могільнікі з крывіцкімі ўпрыгожаннямі; 5 – мяжа Смаленскай зямлі XII–XIII стст.; 6 – летапісныя гарады Смаленскай зямлі XII–XIII стст.; 7 – летапісныя гарады Чарнігаўскай зямлі XII–XIII стст.; 8 – іншыя памежныя крэпасці XII–XIII стст.; 9 – заходняя, паўночная і ўсходняя мяжа Мсціслаўскага княства XII – першай паловы XIV стст.; 10 – мяжа Мсціслаўскага княства канца XIV – пачатку XVI ст.

Помнікі: *1* – Прудок; *2* – Карэбы; *3* – Дабраселле; *4* – Мазыкі; *5* – Радамля; *6* – Чавусы; *7* – Дубейкі; *8* – Бацвінаўка; *9* – Дзерабуж; *10* – Стракайлы; *11* – Гразівец; *12* – Н. Быхаў; *13* – Аніліна; *14* – Абідавічы; *15* – Юдзічы; *16* – Слабада; *17* – Сукромля; *18* – Пільня; *19* – Пекліна; *20* – Кузьмічы; *21* – Хоцімск; *22* – Лукавіца; *23* – Лугаўка; *24* – Антонаўка; *25* – Батураўка; *26* – Белагошча; *27* – Коржаўка; *28* – Чартовіцы; *29* – Людкова; *30* – В. Шчарынічы; *31* – Кархоўка; *32* – Каменка; *33* – Кардон; *34* – Чабатовічы; *35* – Орша; *36* – Копысь; *37* – Горы (Васільеў ?); *38* – Красн; *39* – Смаленск; *40* – Мсціслаў; *41* – Крэчут (Крычаў); *42* – Прупой (Слаўгарад); *43* – Расціслаўль (Рослаўль); *44* – Заруб (Навасёлкі); *45* – Пацынь (Асовік); *46* – Зарой (Бяседка); *47* – Рагачоў; *48* – Чачэрск; *49* – Ст. Дрокаў; *50* – Мглін; *51* – Варабейна; *52* – Вшчыж; *53* – Бранск; *54* – Ворміна (Орміна); *55* – Расуха; *56* – Рухава; *57* – Мядзведзева; *58* – Старадуб; *59* – Курбанава; *60* – Ропеск (Ст. Ропеск); *61* – Радагошч (Погар); *62* – Кветунь; *63* – Трубчоўск; *64* – Гомій; *65* – Гнеўкава

ходзілася Чарнігаўская воласць і горад Чачэрск, а на ўсход – воласць горада Папова Гара. Картаграфаванне тапонімаў з асновай «стоўп» паказвае іх у тых раёнах, дзе праходзіла мяжа Гомеля, Чачэрска з воласцю Паповай Гары, што ўваходзіла ў склад Мсціслаўскага княства XIV – пачатку XVI ст. Улічваючы агульнае супадзенне прыблізнага кірунку праходжання мяжы паміж валасцямі Паповай Гары, Гомеля і Чачэрска XVI–XVIII стст. з мяжой паміж гэтымі валасцямі XIV – пачатку XVI ст. і смаленска-чарнігаўскім памежжам XII–XIII стст. можна сцвярджаць пра пачатак яе фарміравання ў XII–XIII стст.

Далей смаленска-чарнігаўская мяжа XII–XIII стст. і мяжа Мсціслаўскага княства XIV–XVI стст. разыходзяцца. Першая вяла на захад у бок Сожа, на які яна выходзіла ў раёне вёсак Струмень і Валынцы[18]. У бок Дняпра ад Сожа смаленска-чарнігаўскую мяжу, верагодна, трэба праводзіць на поўнач ад чачэрскіх вёсак Свержань і Доўск. Мяжа ж Мсціслаўскага княства XIV–XVI стст. паварочвала ва ўнутраныя раёны Смаленскай зямлі XII–XIII стст. і так яскрава, як у паўднёва-ўсходніх, паўднёвых і паўднёва-заходніх раёнах, не прасочваецца.

Тым не менш пэўнае супадзенне чарнігаўска-смаленскага памежжа XII–XIII стст. з паўднёва-ўсходняй, паўднёвай і паўднёва-заходняй межамі Мсціслаўскага княства канца XIV – пачатку XVI ст. дазваляе выказаць меркаванне, што тэрытарыяльная аснова Мсціслаўскага княства канца XIV–XV стст. была закладзена ў больш ранні перыяд – XII–XIII стст.

Гэты факт пацвярджае і супадзенне паўднёва-ўсходняй часткі смаленска-чарнігаўскай мяжы XII–XIII стст. і паўднёва-усходняй мяжы Мсціслаўскага княства канца XIV–XV стст. з мяжой паміж радзімічамі і севяранамі, што склалася ў міжрэччы Іпуці і Дзясны ў X–XII стст.

Курганныя могільнікі з радзіміцкім пахавальным абрадам і інвентаром вядомы каля вёсак Лукавіца, Лугаўка, Белагошча, Коржаўка[19]. Яны не заходзяць за лінію размяшчэння чарнігаўскіх гарадоў XII–XIII стст. і адпавядаюць кірунку Мсціслаўскага княства канца XIV–XV стст. Чарнігаўскія ж гарады знаходзяцца ўжо на асноўнай севяранскай тэрыторыі.

Пэўнае супадзенне этнічнай мяжы X–XII стст. з мяжой Мсціслаўскага княства канца XIV–XV стст. назіраецца і з усходняга боку. Тут, як мы ўжо адзначалі вышэй, усходнюю мяжу радзіміцкай тэрыторыі трэба шукаць на захад ад в. Калпеніца, прыкладна ўздоўж плыні сожскай Бярэзіны, па якой ішла мяжа Мсціслаўскага княства XV ст. Больш таго, на ўсход ад сожскай Бярэзіны пачыналася дрыгвяная плынь р. Стомяч, што стварала пэўны прыродны рубеж паміж валасцямі Мсціслава і Рослаўля і паміж землямі крывічоў і радзімічаў.

---

[18] Мяцельскі А. А. Смаленска-чарнігаўскае памежжа. – С. 144.

[19] Спицын А. А. Отчет о раскопках, произведенных в 1907 г. в Черниговской губернии С. А. Гатцуком // Известия Императорской археологической комиссии. – СПб.: Тип. Главного управления уделов, 1909. – Вып. 29. – С. 167; Уварова П. С. Городища и курганы. Выборка из дел Черниговского Статистического Комитета исторического общества Нестора-летописца и архива гр. П. С. Уваровой // Труды Московского предварительного комитета по устройству XIV Археологического съезда. – М., 1906. – Вып. 1. – С. 81.

Вярхоўі р. Іпуць крывічы асвойвалі разам з радзімічамі, але і тут асноўны аб'ём радзіміцкай тэрыторыі супадае з мяжой Мсціслаўскага княства XV ст. Далей на поўдзень радзімічы межавалі з севяранамі, памежжа з якімі намі маркіравана вышэй.

Пэўнае супадзенне чарнігаўска-смаленскага памежжа XII–XIII стст. з радзіміцка-севяранскай мяжой X–XII стст. і паўднёва-ўсходняй, паўднёвай і паўднёва-заходняй мяжой Мсціслаўскага княства канца XIV–XV стст., крывіцка-радзіміцкага памежжа з ўсходняй мяжой Мсціслаўскага княства канца XIV–XV стст. пацвярджае нашу думку, што тэрытарыяльная аснова Мсціслаўскага княства канца XIV–XV стст. была закладзена ў больш ранні перыяд – XII–XIII стст., і дазваляе выказаць меркаванне, што ў аснове тэрыторыі княства ляжалі радзіміцкія землі, далучаныя да Смаленскай зямлі ў выніку паходаў Расціслава Мсціславіча 1127 і 1142 гг.

У гэтай сувязі цікавым з'яўляецца назіранне, што ў XII–XIII стст. тэрыторыя Смаленскай зямлі ў пэўным сэнсе была адзіным арганізмам як у палітычным, так і этнаграфічным плане, і вызначалася межамі рассялення смаленскіх крывічоў[20]. І толькі паўднёва-заходнія раёны Смаленскай зямлі выходзілі па-за межы крывіцкай тэрыторыі і захоплівалі землі радзімічаў.

Большая частка радзіміцкіх зямель, што ў XII–XIII стст. належалі Смаленску, у XV ст. знаходзіліся на тэрыторыі Мсціслаўскага княства. З былых радзіміцкіх зямель па-за межамі Мсціслаўскага княства канца XIV–XV ст. застаюцца толькі тыя, якія на той час ўваходзілі ў склад гаспадарскіх валасцей XIV–XVI стст. – Прапойска і часткова Магілёва.

Але Магілёў як гарадскі цэнтр у XV ст. толькі пачынае свае фарміраванне, а ў XII–XIII стст. ён быў невялікім феадальным замкам[21], які наўрад ці ўяўляў самастойны значны адміністрацыйны цэнтр і не мог мець такую вялікую акругу, якой ён карыстаўся ў XVI ст. Хутчэй за ўсё, акруга-воласць Магілёва XII–XIII стст. абмяжоўвалася яго бліжэйшым крывіцкім навакольлем.

Прапойск, размешчаны на радзіміцкіх землях у XII–XIII стст., таксама быў невялікім адміністрацыйным цэнтрам[22], які павінен быў знаходзіцца ў падпарадкаванні больш буйнога. Такім бліжэйшым цэнтрам быў Мсціслаў, і таму нельга выключыць, што радзіміцкія землі, размешчаныя на левабярэжжы Дняпра, да іх уключэння ў склад Вялікага Княства Літоўскага тэрытарыяльна падпарадкоўваліся Мсціславу.

На поўнач ад Прапойска знаходзілася Радамля, дзе Я. Р. Раманавым у курганным могільніку, былі знойдзены характэрныя для радзіміцкіх старажытнасцей языкападобныя прывескі і васьміпраменная фібула[23]. Нельга выключыць, што Радамля, дзе ёсць гарадзішча і прымыкаючае да яго адкрытае пасе-

[20] Седов В. В. Смоленская земля. – С. 240–256; Яго ж. Древнерусская народность. Историко-археологическое исследование. – М.: Языки русской культуры, 1999. – С. 240.

[21] Марзалюк І. Магілёў у XII–XVIII стст. Людзі і рэчы. – Мінск: Веды , 1998. – С. 15–20, 22.

[22] Ткачоў М. А., Мяцельскі А. А. Старажытны Прупой. – С. 60–65.

[23] Романов Е. Р. Две археологические разведки. – С. 125.

лішча плошчай не менеў за 2 га з матэрыяламі XII–XIII стст.[24], таксама была цэнтрам пэўнай адміністрацыйна-гаспадарчай адзінкі XII–XIII стст., якая ўваходзіла ў склад воласці Мсціслава, як гэта было ў XV – пачатку XVI ст.

На поўнач ад Радамлі на безумоўна крывіцкіх землях знаходзілася воласць Басея, якая згадвалася ў Статуце 1136 г. і ніколі не ўваходзіла ў склад Мсціслаўскага княства XIV – пачатку XVI ст. А крывіцка-радзіміцкае памежжа на р. Проня праходзіла недзе паміж Радамляй і сучаснай в. Карэбы Дрыбінскага раёна, дзе было знойдзена пахаванне з крывіцкімі ўпрыгожаннямі[25]. Далей на паўночны ўсход у зямлі крывічоў знаходзілася воласць XII ст. Звяровічаў-Гор (Мірацічы?), якая навісала над воласцю самога Мсціслава.

Значнае супадзенне тэрыторыі Мсціслаўскага княства XIV–XVI стст. з этнічнымі межамі, што склаліся ў X–XII стст., са смаленска-чарнігаўскім памежжам XII–XIII стст. і з межамі ўнутраных валасцей Смаленскай зямлі XII–XIII стст. дазваляе выказаць меркаванне, што ў аснове Мсціслаўскага княства XIV–XVI стст. ляжаў пэўны адміністрацыйна-гаспадарчы комплекс, які пачаў фарміравацца ў больш ранні перыяд, чым княства трапіла на старонкі пісьмовых крыніц. Гэта, на наш погляд, дазваляе сцвярджаць пра пачатак фарміравання і існавання Мсціслаўскага ўдзельнага княства з XII–XIII стст. Яго асновай была воласць Мсціслава, заселеная крывічамі, да якой былі далучаны радзіміцкія землі, захопленыя ў выніку паходаў смаленскага князя Расціслава Мсціславіча на Чарнігаў у 1127 і 1142 гг. У такіх памерах Мсціслаўскае ўдзельнае княства ў складзе Смаленскай зямлі праіснавала да 1359 г., калі Мсціслаў быў захоплены Альгердам і далучаны да Вялікага Княства Літоўскага.

3.2. Мсціслаўскае княства Лынгвеневічаў канца XIV–XV ст.

Захоплены ў 1359 г. Альгердам Мсціслаў застаўся ў непасрэдным падпарадкаванні вялікага князя і кіраваўся ягонымі намеснікамі: «наместники свои в нём посадил»[26].

Хто быў першым вялікакняскім намеснікам у Мсціславе – невядома, але, верагодна, гэта быў хтосьці з вялікакняскай сям'і. Па смерці вялікага князя Альгерда, на думку І. Вольфа, намеснікам у Мсціславе быў ягоны сын ад другой жонкі – цвярской княжны Ульяны, князь Карыгайла[27]. Ва ўсякім выпадку, ён быў у горадзе падчас паходу на Мсціслаў у 1386 г. смаленскага князя Святаслава Іванавіча.

Аднак нельга выключыць, што да Карыгайлы Мсціславам кіраваў другі намеснік – з роду Нарымунтавічаў. Пра гэта сведчыць фундушны запіс 1576 г. Гаўрылы Войны Курэніцкай царкве Раства Багародзіцы на землі. У ім адзначаецца, што гэту царкву фундаваў у 1355 г. Васіль Міхайлавіч Нарымунт, які

[24] Мельниковская О. П. Обследование древнего Радомля. – С. 60–62.

[25] Сербаў І. А. Археалагічныя абследаванні ў вадазборах рэк Проні. – С. 240–241.

[26] ПСРЛ. – Т. 29. – С. 231.

[27] Wolff J. Kniazowie litewsko-ruscy od konca czternastego wieku. – S. 263.

названы ў крыніцы «князем пинским и панам мстиславским»[28]. Князь Васіль Міхайлавіч Нарымунт быў жывы яшчэ ў 1387 г.[29] і таму сапраўды мог быць ў 60–70-я гады XIV ст. мсціслаўскім намеснікам.

У 1386 г. Мсціслаў трапляе на старонкі летапісаў, што было выклікана барацьбой, якая разгарнулася паміж вялікім князем Ягайлам, полацкім князем Андрэем Альгердавічам і прымкнуўшым да апошняга смаленскім князем Святаславам Іванавічам. У гэтай барацьбе кожны з князёў шукаў сваёй выгоды. Калі для Андрэя Альгердавіча гэта была спроба заняць вялікакняскі стол, то Святаслаў Іванавіч смаленскі марыў адваяваць захопленыя Альгердам смаленскія Падняпроўскія землі і ўзнавіць Смаленскае княства ў былых памерах. У сваёй барацьбе Андрэй Альгердавіч знайшоў паплечнікаў у Тэўтонскім ордэне, які, у сваю чаргу, быў незадаволены саюзам Вялікага Княства Літоўскага і Польшчы, што быў зацверджаны Крэўскай уніяй 1385 г.

У 1386 г. паміж крыжакамі, Андрэем Альгердавічам і Святаславам Іванавічам было заключана пагадненне. Другога лютага, калі вялікі князь Ягайла знаходзіўся на шляху ў Кракаў на сваё вяселле з польскай каралевай Ядвігай, на якое разам з ім ехалі амаль усе буйныя магнаты Вялікага Княства Літоўскага, князь Андрэй сумесна з крыжакамі-лівонцамі распачаў баявыя дзеянні. Крыжакі з поўначы нанеслі ўдары ў бок Вільні і Ашмян, а князь Андрэй нават захапіў Лукомль. У той жа час Святаслаў смаленскі ў сакавіку накіраваў свае дружыны на Оршу[30]. Не ўзяўшы Оршу, князь Святаслаў Іванавіч разам са стрыечным братам Іванам Васільевічам і сваімі сынамі – Глебам і Юрыем рушыў на Мсціслаў.

Падзеі, што адбываліся пад Мсціславам у 1386 г., добра адлюстраваны ў шматлікіх спісах «Аповесці пра аблогу Мсціслаўля», а таксама ў «Летапісцы вялікіх князёў літоўскіх» (гл. Дадатак № 1. Найбольш ранні варыянт у Наўгародскім чацвёртым летапісе). Аналіз таго, як аўтар крыніцы падае падзеі, дазваляе сцвярджаць, што ён сам быў іх сведкам і, хутчэй за ўсё, знаходзіўся падчас аблогі ў горадзе, пражыў яе і назіраў за бітвай, што разгарнулася на берагах р. Віхра, са сцен Мсціслаўскага замка. Пра знаходжанне аўтара крыніцы падчас аблогі ў горадзе сведчыць тое, што ён добра ведаў храналогію падзей і мясцовую геаграфію. Дэталь пра літоўскія сцягі, раптам заўважаныя на гарызонце смалянамі, таксама выдае ў аўтары абаронцу Мсціслава, які на працягу некалькіх дзён з адчаем і надзеяй чакаў дапамогу. Таксама несмаленскае паходжанне аўтара выдае і апісанне злачынстваў смаленскага князя Святаслава ў дачыненні да мірнага насельніцтва, інфармацыю для якога маглі даць уцекачы з навакольных мясцовасцей, якія знайшлі прытулак у Мсціславе.

---

[28] АВК. – Т. 11. – С. 42.

[29] Насевіч В. Генеалагічныя табліцы старадаўніх княжацкіх і магнацкіх беларускіх родаў XII–XVIII ст. – Мінск: БелЭн, 1993. – 25 с.

[30] Насевіч В. Пачаткі Вялікага княства Літоўскага. Падзеі і асобы. – Мінск: Полымя, 1993. – С. 126.

Летапісы паведамляюць, што шлях Святаслава Іванавіча на Мсціслаў быў шчодра паліты крывёю мясцовага насельніцтва. Самая простая смерць, з дапамогай якой знішчаліся мірныя жыхары, гэта было спальванне жыўцом у хатах. Усе летапісы, у якіх ёсць апавяданне пра паход на Мсціслаў 1386 г., гавораць, што Святаслаў Іванавіч і яго дружыны паводзілі сабе «яко свирепые звери»[31]. Безумоўна, летапісы, складзеныя на землях ВКЛ, у сваіх адзнаках дзеянняў смаленскага князя адлюстроўваюць пэўную палітычную і ідэалагічную накіраванасць. Але, верагодна, трэба прызнаць, што дзеянні князя Святаслава Іванавіча, які ішоў па чужых землях, сапраўды былі даволі жорсткімі.

18 красавіка смаленскія дружыны падышлі да Мсціслава. Верагодна, слых пра іх зверствы ужо дайшоў да горада, бо мсціслаўцы, якія менш як 20 гадоў таму яшчэ былі падданымі Святаслава Іванавіча, зачыніліся ў горадзе і не пусцілі яго. На працягу 11 дзён яны трымалі абарону, якой кіраваў вялікакняскі намеснік князь Карыгайла. Прычым мяркуючы па дапаўненні, якое можна знайсці ў М. Стрыйкоўскага, падчас неаднаразовых штурмаў таранамі і абстрэлаў сцены замка былі моцна парушаны[32].

Праз 11 дзён да Мсціслава на дапамогу нарэшце падыйшло асноўнае войска ВКЛ пад кіраўніцтвам князёў Скіргайлы, Лынгвена-Сямёна, Вітаўта, якія выехалі сюды з вяселля караля Ягайлы, з Кракава, 13 красавіка[33]. Ім на дапамогу падышлі яшчэ харугвы ноўгарад-северскага князя Карыбута Альгердавіча і чарнігаўскага князя Канстанціна[34].

Смаленцы вымушаны былі адысці ад замка і заняць пазіцыю на берагах р. Віхра. Таму калі 29 красавіка пачалася бітва пад гарадскімі сценамі, жыхары Мсціслава стаялі на «забаролах зряху, бысть имъ бой на долзе»[35]. Падчас гэтай бойкі, якая адбылася на берагах р. Віхра, смаленскі князь Святаслаў Іванавіч разам са сваім стрыечным братам Іванам Васільевічам загінуў, а яго сыны Юрый і Глеб былі захоплены ў палон. Прычым, мяркуючы па М. Стрыйкоўскаму, Святаслаў Іванавіч смаленскі загінуў яшчэ перад самым пачаткам бітвы, калі строіў сваі дружыны – быў наскрозь прабіты стралою[36].

Летапіснае паведамленне пра Мсціслаўскія падзеі 1386 г. цікавае яшчэ тым, што ў ім адзначаецца, што смаленскі князь Святаслаў быў забіты «нейким лях-хам». Апошняе сведчыць пра тое, што Польскае каралеўства адразу пасля заключэння Крэўскай уніі аказала ваенную дапамогу ВКЛ ужо ў 1386 г. Дарэчы, пра польскую дапамогу ВКЛ ў падзеях 1386 г. ёсць паведамленне і ў М. Стрыйкоўскага. Праўда ён сцвярджае, што князя Святаслава Іванавіча забіў «ліцвін»[37].

---

[31] ПСРЛ. – Т. 35. – С. 64.

[32] Stryjkowski M. Kronika Polska, Litewska, Żmudska i wszystkiej Rusi. – Warszawa: Naklad Gustawa Leona Gluksberga, 1846. – T. 2. – S. 77.

[33] Kolankowski L. Dzieje Wielkiego Księnstwa Litewskiego za Jagellonów. – T. 1. 1377–1499. – Warszawa: Sklad główny. Kasa im. Mianowskiego, 1930. – S. 42.

[34] ПСРЛ. – Т. 25. – С. 213; Тамсама. – Т. 35. – С. 100. 113, 136, 137, 184. 205. 226.

[35] Тамсама. – С. 213.

[36] Stryjkowski M. Kronika Polska, Litewska. – S. 77.

[37] Тамсама.

Дзякуючы гэтай перамозе, атрыманай супольнымі намаганнямі літоўскіх князёў, Мсціслаў застаўся ў Вялікім Княстве Літоўскім.

Далейшы лёс Мсціслава ў складзе ВКЛ напрыканцы XIV ст. не дазваляе нам рэканструяваць жыццё самога горада і яго воласці. Карыгайла працягваў трымаць у сваіх руках Мсціслаў і пасля 1386 г. Аднак у яго руках ён, верагодна, заставаўся нядоўга, бо ўжо ў 1390 г. князь Карыгайла загінуў падчас абароны Крывога замка Вільні ад сумеснага нападу крыжакоў і Вітаўта[38].

Мал. 24. Пячатка князя Сямёна Лынгвена (па: Цітоў А. Геральдыка Беларусі. Мінск, 2007)

Большасць даследчыкаў лічаць, што толькі пасля смерці Карыгайлы Мсціслаў перайшоў да другога брата караля Ягайлы Лынгвена Альгердавіча, які пры хрышчэнні атрымаў імя Сямён[39] (мал. 24). Менавіта гэты князь паклаў пачатак знаходжанню на мсціслаўскім стале князёў з дынастыі Лынгвеневічаў і лічыцца, што менавіта з гэтага часу адміністрацыйна-гаспадарчая адзінка Вялікага Княства Літоўскага з цэнтрам у Мсціславе, якая пачала перадавацца ў спадчыну, была ператворана ў княства. Як сцвярджае З. Удавішэўскі, Мсціслаўскае княства Лынгвен-Сямён атрымаў у якасці кампенсацыі за тое, што напрыканцы 1391 г. быў вымушаны пад націскам Масквы саступіць намесніцтва ў Вялікім Ноўгарадзе[40]. Звычайна час пераходу Мсціслава пад уладу Лынгвена датуюць 1392 г.

Л. Вайтовіч выказаў меркаванне, што Мсціслаўскае княства, на чале якога стаў Лынгвен-Сямён Альгердавіч, было арганізавана ўжо каля 1379 г., але не прывёў ніякіх аргументаў у падмацаванне сваёй думкі[41]. Яшчэ больш раннюю дату арганізацыі Мсціслаўскага княства ў складзе ВКЛ прыводзіць П. М. Раеўскі – 1377 г.,[42] але і яго сцвярджэнне не падмацоўваецца спасылкамі на першакрыніцу.

Новую дату арганізацыі Мсціслаўскага княства ў складзе ВКЛ прапанаваў М. А. Ткачоў, які адзначыў, што 25 красавіка 1389 г., прысягаючы на вернасць каралю Ягайлу і каралеве Ядвізе, князь Лынгвен-Сямён дзякаваў ім за Мсціслаўскі ўдзел[43]. Такім чынам, можна сцвярджаць, што Мсціслаўскае княства ў складзе ВКЛ было нанова арганізавана не пазней за канец 1388 – пачатак 1389 г.

---

[38] Kolankowski L. Dzieje Wielkiego Księnstwa Litewskiego. – S. 52

[39] Halecki O. Dzieje unii Jagiellońskiej. – Kraków. 1919. – T. 1. – S. 145.

[40] Krupska A. Udzielnie księstwo Mścislawskie pod rządami Litwy // Prace historiców Uniwersitetu Sląskego. – Katowice, 1971. – T. 2. – S. 42–43; Wdowiszewski Z. Genealogia Jagiellonów. – Warszawa: Wyd. PAN, 1960. – S. 16.

[41] Войтовіч Л. Удзельні княства Рюриковічаў і Гедзіміновічаў. – С. 196.

[42] Раевский П. М. Род царя и царевен и князей Шуйских. – С. 21.

[43] Ткачев М. А. Белорусский феодальный город XIV–XVIII вв. (структура и организация обороны): Дис. ... д-ра ист. наук. – Гродно: Гродн. гос. университет, 1985. – С. 220; Алексеев Л. В. Западные земли домонгольской Руси. Кн. 1. – С. 214.

Дзейнасць Лынгвена-Сямёна на пасадзе мсціслаўскага князя амаль не вядома з-за адсутнасці крыніц – захаваліся толькі асобныя звесткі пра наданні ім розных зямель шляхце і Ануфрыеўскаму манастыру. Вядома таксама, што, з'яўляючыся мсціслаўскім князем, Лынгвен адначасова выконваў абавязкі вялікакняскага намесніка у Вялікім Ноўгарадзе.

Князь Лынгвен-Сямён упершыню пачынае прэтэндаваць на пасаду наўгародскага служылага князя ў 1388 г.: «князь Лугвении Литовъскыи, нареченыи в крещении Семен, присла послы своя в Новгород Великыи, Онъгимонта и Братошу, хотя быти у них в Новгороде и сести на городех, чем владел Наримонт», а ў 1389 г. «приеха в Новъгород великы князь Семен Олгердович Лугвении на пригороды». Наўгародскія летапісы ўдакладняюць дату – «...на Успенье Святой Багародзіцы»[44]. Князь Нарымонт, а адпаведна і Лынгвен-Сямён валодалі ў Наўгародскай зямлі Ладагай, Арэхавам, Карэльскім гарадком, Карэльскай зямлёй і паловай Капор'я[45].

Лынгвен-Сямён карыстаўся сваёй воласцю ў Наўгародскай зямлі да 1392 г. Так, летапісы паведамляюць, што ў 1390 г. «ходиша новгородцы со князем Семеном Олгердовичем на Псков ратью», а ў 1392 г. «приходиша Немцы разбоем в Новгородцкиа власти, и внидоша в Неву и взяша власть и села по обе стороны реки на три версты до городка Орешка. И князь Семен, собрався с городчаны, погна вслед их, иных изби, а иных приведе во град, а инии утекоша. И поиде князь Семен в Литву, а град остави»[46]. Сямён-Лынгвен у 1392 г. быў вымушаны сысці з Ноўгарада пад націскам Масквы. Але вярнуўшыся ў ВКЛ ён і тут актыўна ўдзельнічаў у агульнадзяржаўных справах. Так, у 1396 г. ён пасрэднічаў у аднаўленні гандлёвага дагавору паміж Полацкам і Рыгай.

Актыўна ўдзельнічаў Сямён-Лынгвен і ў ваенных падзеях, якія апальвалі Вялікае Княства Літоўскае. У 1402 г. ён прымаў удзел у адбіванні паходу разанскага князя Расціслава Алегавіча на Бранск і, згодна з наўгародскімі летапісамі, менавіта ён стаяў на чале войскаў ВКЛ[47]. У 1403 г. па загадзе Вітаўта князь Сямён-Лынгвен кіраваў паходам на Вязьму, захапіў яе і вывеў адтуль князя Івана Святаславіча[48]. У 1404 г. ён прымаў удзел у няўдалым паходзе Вітаўта на Смаленск[49]. У 1407 г. Сямён-Лынгвен быў зноў запрошаны на княскі стол у Вялікі Ноўгарад, на якім і знаходзіўся з перапынкамі да 1412 г.[50], калі зноў, з-за інтрыг Масквы, быў вымушаны з'ехаць у Мсціслаў. Галоўнай прычынай ад'езду князя Сямёна-Лынгвена з Ноўгарада была барацьба за апошні,

---

[44] ПСРЛ. – Т. 25. – С. 214, 218; Новгородская первая летопись старшего и младшего изводов. – М.; Л.: Изд-во Акад. наук СССР, 1950. – С. 383.

[45] Янин В. Л. Новгород и Литва. Пограничные ситуации XIII–XV веков. – М.: Изд-во Моск. ун-та, 1998. – С. 92.

[46] ПСРЛ. – Т. 11–12. – С. 122–123.

[47] Новгородская первая летопись старшего и младшего изводов. – С. 397; ПСРЛ. – Т. 11–12. – С. 187.

[48] ПСРЛ. – Т. 11–12. – С. 188.

[49] Тамсама. – С. 189.

[50] Новгородская первая летопись старшего и младшего изводов. – С. 403–404.

у якой апанентам мсціслаўскаму князю увесь час выступаў брат вялікага маскоўскага князя Васіля I, Канстанцін Дзмітрыевіч.

Нягледзячы на даволі частае знаходжанне ў якасці намесніка ў Ноўгарадзе, князь Сямён-Лынгвен працягваў прымаць актыўны ўдзел у жыцці Вялікага Княства Літоўскага. Паміж 1408 і 1411 гг. ён адначасова быў вялікакняскім намеснікам у Смаленску.

У 1410 г. мсціслаўскі князь Лынгвен са сваёй харугвай прымаў удзел у Грунвальдскай бітве[51]. На думку некаторых даследчыкаў, менавіта ён кіраваў тымі смаленскім, мсціслаўскім і аршанскім палкамі, якія ў крытычны момант выгрымалі ўдар крыжакоў і выратавалі саюзнае войска ад пагрому. А ў 1411 г. ён прымаў удзел у падпісанні з ордэнам Тарунскага міру. У гэты ж год у якасці наўгародскага служылага князя Лынгвен-Сямён адбіў шведскі напад і арганізаваў у адказ паход на шведскія ўладанні, дайшоў да Выбарга[52]. Аднак у 1412 г. з-за новых маскоўскіх інтрыг ён быў вымушаны ў чарговы раз сысці з наўгародскага стала і вярнуўся ў Вялікае Княства Літоўскае.

У 1411 г. адбыўся аб'езд вялікім князем Вітаўтам усіх зямель ВКЛ. Верагодна, князь наведаў і Мсціслаў з Крычавам. Ва ўсякім выпадку, пра яго наведванне Крычава захаваліся згадкі яшчэ ў XIX ст., а ў крыніцах XVI ст. згадваецца на крычаўскім замку «Витовтов погреб»[53].

З прыватнага жыцця князя Лынгвена-Сямёна вядома, што ў 1394 г. ён узяў шлюб з Марыяй, дачкой вялікага маскоўскага князя Дзмітрыя Данскога, ад гэтага шлюбу ў яго нарадзіўся сын Юрый. З Марыяй Лынгвен быў у шлюбе да яе смерці 15 мая 1399 г.[54]

Другі раз князь Лынгвен узяў шлюб у 1406–1407 гг., але імя яго новай жонкі невядома. У той жа час ёсць звесткі, што яна таксама была з маскоўскага княскага дома. Ад гэтага шлюбу ў Лынгвена ў 1411 г. у наўгародскім прыгарадзе Капор'і нарадзіўся другі сын – Яраслаў[55].

Лынгвен-Сямён заставаўся мсціслаўскім князем да сваёй смерці ў 1431 г. Я. Тэнгадоўскі выказаў думку, што князь Лынгвен загінуў падчас бітвы пад Ашмянамі ў 1432 г.[56] На мсціслаўскім стале яго замяніў старэйшы сын – Юрый (мал. 24).

Гады знаходжання Юрыя Лынгвеневіча на мсціслаўскім стале прыпалі на перыяд грамадзянскай вайны, што распачалася ў Вялікім Княстве Літоўскім у 30-я гады XV ст. У віхуры падзей, што закруцілася на абшарах ВКЛ, актыўны

---

[51] Длугаш Ян. Грюнвальдская битва [Пер. с латин.]. – М.; Л.: Изд-во Акад. наук СССР, Ленинградское отдел., 1962. – С. 91.

[52] Новгородская первая летопись старшего и младшего изводов. – С. 402; ПСРЛ. – Т. 11–12. – С. 218.

[53] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 74. – Арк. 65–66.

[54] ПСРЛ. – Т. 24. – С. 167; Тамсама. – Т. 25. – С. 228–229.

[55] Wolff J. Kniazowie litewsko-ruscy od konca czternastego wieku. – S. 263.

[56] Tęgodowski J. Pierwsze pokolenia Giedyminowiczów // Biblioteka genealogiczna. – T. 2. – Poznań, Wrocław. – 1999. – S. 122.

Мал. 25. Партрэт мсціслаўскага князя Юрыя Лынгвеневіча

ўдзел прымалі і мсціслаўскія князі, таму гэты перыяд гісторыі Мсціслаўскага княства некалькі лепш паддаецца рэканструкцыі.

Па смерці вялікага князя Вітаўта на вялікакняскі стол у Вільні сеў малодшы брат Ягайлы князь Свідрыгайла, які выступаў праціўнікам пракаталіцкай палітыкі Вітаўта. На вялікае княжанне Свідрыгайла ўзышоў пры падтрымцы князёў і баяр усходніх – «рускіх» зямель Вялікага Княства Літоўскага. Таму ў сваёй дзейнасці ён абапіраўся ў першую чаргу на праваслаўную арыстакратыю. Узрастанне палітычнай ролі праваслаўных феадалаў, страта каталіцкай арыстакратыяй неабмежаванай улады прывялі да змовы апошняй супраць Свідрыгайлы Альгердавіча.

У ноч на 1 верасня 1432 г. адбыўся замах на яго жыццё. Змоўшчыкі пасадзілі на віленскі стол брата Вітаўта Жыгімонта, а Свідрыгайла ратаваўся ўцёкамі ў Полацк. Дзяржава, як паведамляе летапісец, фактычна аказалася расколатай на дзве часткі – Вялікае Княства Літоўскае і Вялікае Княства Рускае: «И Литва же посадиша великого князя Жигимонта Кесьтутевичь на великое княжение на Вилни и на Троцех месяца сентября 1 день. И приде Швитригаило на Полотескь и на Смоленскь и князи руськыи и бояре посадиша князя Швытригаила на великое княжение на Рускоe»[57]. Апошняя з прыгаданых дзяржаў стварылася і функцыянавала на падставе аўтаноміі Полацкай, Віцебскай, Смаленскай і іншых усходніх зямель Вялікага Княства Літоўскага. На бок Свідрыгайлы перайшлі і мсціслаўскія князі, пра што сведчыць не толькі згадванне Мсціслава сярод гарадоў і зямель, якія знаходзіліся ў залежнасці ад апошняга ў 1432 г.[58], але і той факт, што Юрый Лынгвеневіч у крыніцах выступае разам са Свідрыгайлам яшчэ ў 1431 г., калі ён разам з іншымі літоўскімі князямі падпісвае пагадненне з каралём Уладзіславам[59]. У распачатых баявых дзеяннях мсціслаўскія князі – браты Юрый і Яраслаў Лынгвеневічы – выступалі разам са Свідрыгайлам.

---

[57] ПСРЛ. – Т. 35. – С. 57.

[58] Коцебу А. Свидригайло, Великий князь Литовский, или дополнения к истории Литовской, Российской, Польской и Прусской. Пер. с немецкого. – СПб.: Тип. медиц. деп. Мин-ва внутр. дел, 1835. – Прибавление ССХ.

[59] Skarbiec dyplomatów / I. Danilowicz. – Wilno, 1862. – T. 2. – S. 126, № 1562.

8 снежня 1432 г. пад Ашмянамі адбылася бітва паміж Жыгімонтам Кейстутавічам і Свідрыгайлам, якога падтрымлівалі крыжакі і брат вялікага цвярскога князя Яраслаў Аляксандравіч. У гэтай бітве мсціслаўскі князь Юрый Лынгвеневіч быў захоплены ў палон. Але даволі хутка ён збег адтуль, бо гэтым ж годам датуецца ліст Свідрыгайлы да вялікага магістра Тэўтонскага ордэна Пауля Руссдорфа, у якім паведамляецца пра просьбу навагародцаў прызначыць ім князем Юрыя Лынгвеневіча, а ў 1433 г. князь Юрый ужо быў у Ноўгарадзе[60].

На працягу ўсяго 1433 г. Свідрыгайла не даваў спакою Жыгімонту Кейстутавічу, і восенню гэтага года вялікі князь Жыгімонт спрабаваў захапіць Мсціслаў. Трохтыднёвая аблога горада, распачатая Жыгімонтам 26 кастрычніка, была няўдалай: «и стояша под Мстиславом три недели не возма город и поиде в свои земли»[61]. Хто кіраваў гэтай абаронай Мсціслава, дакладна не вядома. Магчыма, тут першапачаткова хаваўся Юрый, які збег з палону, а магчыма, і яго малодшы брат Яраслаў.

Пра тое, што пасля ад'езду князя Юрыя ў Вялікі Ноўгарад у Мсціславе княжыў ягоны брат Яраслаў, які таксама падтрымліваў Свідрыгайлу, сведчыць той факт, што яго імя як сюзерэна, які раздаваў зямельныя наданні на тэрыторыі Мсціслаўскага княства, сустракаецца некалькі разоў у пацвярджэнні зямельных наданняў караля Казіміра. Пералом у барацьбе паміж Свідрыгайлам і Жыгімонтам адбыўся ў 1435 г., калі 8 верасня ў бітве пад Вількамірам Свідрыгайла быў разгромлены. У гэтай бітве загінуў Яраслаў Лынгвеневіч[62], малодшы сын Сямёна-Лынгвена.

Вайна скончылася ў 1436 г. паразай Свідрыгайлы. Пераможца, вялікі князь Жыгімонт Кейстутавіч канфіскаваў у Юрыя Лынгвеневіча Мсціслаўскае княства, а сам князь Юрый вымушаны быў шукаць сабе прытулак, пакуль 3 сакавіка 1438 г. зноў не прыбыў на княжанне ў Вялікі Ноўгарад[63].

У ноч на 1 сакавіка 1440 г. у выніку змовы быў забіты вялікі князь Жыгімонт Кейстутавіч[64]. Летапіс так характарызуе гэтага князя: «Сей бе князъ лютъ и немилостивъ, златолюбивъ и сребролюбивъ паче всехъ чоловекъ и многие князи Литовъскихъ изгубилъ и изсеклъ...». За бацькоўскія грахі быў вымушаны адказваць ягоны сын Міхаіл Жыгімонтавіч: «...темъ же и по убиенью его не яшася за сына его, за князя Михаила зновъ ради отца его Жидимонта»[65]. На вялікакняскі стол у Вільні, абышоўшы Міхаіла Жыгімонтавіча, быў пасаджаны Казімір Ягелончык, пляменнік Жыгімонта Кейстутавіча.

---

[60] Skarbiec dyplomatów. – S. 133–134, № 1606.

[61] Любавский М. К. Литовско-Русский сейм. Опыт по истории учреждений в связи с внутренним строем и внешней жизнью государства. – М.: Университетская тип., 1900. – С. 78, 80; ПСРЛ. – Т. 32. – С. 155; Тамсама. – Т. 35. – С. 35, 58, 77, 107.

[62] ПСРЛ. – Т. 32. – С. 155.

[63] Wolff J. Kniazowie litewsko-ruscy od konca czternastego wieku. – S. 263.

[64] ПСРЛ. – Т. 35. – С. 60, 109.

[65] Тамсама. – Т. 11–12. – С. 30.

Адразу пасля смерці Жыгімонта Кейстутавіча вяртаецца з Ноўгарада ў ВКЛ князь Юрый Лынгвеневіч. Вялікі князь Казімір, жадаючы прыцягнуць яго на свой бок, вярнуў князю Юрыю ягоную вотчыну – Мсціслаўскае княства: «... дал ему очину его всю, Мстиславъ и Кричевъ, иных градов и волостей не мало...»[66]. Аднак не паспеўшы вярнуцца ў Мсціслаў, князь Юрый Лынгвеневіч зноў апынуўся ў той віхуры, якая ўзнялася ў Вялікім Княстве пасля абрання на вялікакняскі стол малодшага сына Ягайлы Казіміра.

У Смаленску падчас прысягі на вернасць новаму вялікаму князю, якую праводзіў Андрэй Саковіч, успыхнула паўстанне, інспіраванае, верагодна, жыхарамі горада, якія падтрымлівалі Свідрыгайлу. Горад падзяліўся на дзве часткі. Частка жыхароў выгналі з горада Андрэя Саковіча і пасадзілі на смаленскі стол князя Андрэя Дарагабужскага. Другая ж частка баяр паехалі да вялікага князя Казіміра прасіць літасці. Тады, як паведамляе летапіс, простыя людзі пачалі шукаць «себе господара» і спынілі свой позірк на князі Юрыі Лынгвеневічы.

Князь Юрый прыйшоўшы ў Смаленск арыштаваў баяр, што ездзілі да Казіміра, канфіскаваў іх маёмасць, раздаў яе сваім паплечнікам і вырашыў не падначальвацца вялікаму князю Казіміру[67]. Як і ў 1432 г., ВКЛ апынулася на мяжы раскола на дзве дзяржавы. Вялікі князь Казімір рашучымі дзеяннямі вырашыў падавіць мяцеж. Але пасланыя ім войскі прастаялі тры тыдні пад Смаленскам і вярнуліся назад ні з чым. Адначасова і ў новага гаспадара «рускіх» зямель – Юрыя Лынгвеневіча – зараз было мала сіл. І калі ў лістападзе 1440 г. сам Казімір з усім войскам рушыў на Смаленск, князь Юрый быў вымушаны збегчы ў Маскву, а адтуль у Вялікі Ноўгарад[68].

Мсціслаўскае княства зноў было канфіскавана ў дзяржаўны скарб, а сам князь Юрый быў вымушаны заставацца ў Вялікім Ноўгарадзе. Адтуль ён распачаў перапіску з Янам Гаштольдам, каб той паклапаціўся перад вялікім князем і панамі-радай пра дараванне яго ўчынку. Заступніцтва Яна Гаштольда было вельмі ўплывовым, і, верагодна, вялікі князь Казімір дараваў Юрыю Лынгвеневічу[69] ягоны ўдзел у смаленскім мяцяжы. Ва ўсякім выпадку, у 1443 г. мы зноў бачым князя Юрыя Лынгвеневіча ў Мсціславе. Пра гэта сведчыць прывілей князя Юрыя, ягонай жонкі княгіні Сафіі і іх сына Івана пра пацвярджэнне наданняў князя Сямёна-Лынгвена Ануфрыеўскаму манастыру[70].

Як і яго бацька Сямён-Лынгвен, князь Юрый на працягу 40-х гадоў XV ст. даволі часта займаў пасаду служылага князя ў Вялікім Ноўгарадзе. У 1444 г. мы сустракаем Юрыя Лынгвеневіча ў Ноўгарадзе, адкуль ён быў вымушаны з'ехаць пад націскам Івана Уладзіміравіча Альгердавіча спачатку ў Тэўтонскі

---

[66] Новгородская первая летопись старшего и младшего изводов. – С. 420.

[67] ПСРЛ. – Т. 32. – С. 157.

[68] Тамсама. – С. 157; Тамсама. – Т. 35. – С. 60.

[69] Тамсама. – С. 159.

[70] АЗР. – Т. 1. – С. 57, № 43.

ордэн, а потым у Маскву[71]. Але ў 1445 г. Юрый Лынгвеневіч з Масквы зноў вяртаецца ў Ноўгарад.

Застаючыся па-за межамі ВКЛ князь Юрый не адышоў ад той барацьбы, што паціху працягвалася за вялікакняскі стол. У ёй Юрый Лынгвеневіч падтрымліваў Міхаіла Жыгімонтавіча, хоць, як вынікае з перапіскі 1445 г. паміж мемельскім комтурам і вялікім магістрам Тэўтонскага ордэна, ён сам разглядаўся ў якасці магчымага кандыдата на віленскі вялікакняскі стол[72]. Верагодна, за падтрымку Міхаіла Жыгімонтавіча Казімір Ягелонавіч зноў канфіскаваў у князя Юрыя Мсціслаўскае княства.

Менавіта гэтым можна растлумачыць той факт, што ў 1446 г., пасля асляплення ў Маскве вялікага маскоўскага князя Васіля II Дзмітрыем Шамякам, на ўсходзе сучаснай Беларусі была выдзелена на некаторы час «вотчына» ўцекачу ў Літву серпухаўскаму князю Васілю Яраславічу, якому кароль Казімір даў гарады Бранск, Старадуб, Гомель і Мсціслаў[73]. Акрамя таго і крыжакі ў 1446 г. хадайнічалі перад вялікім князем Казімірам пра вяртанне князю Юрыю яго «дзедзічыны». Барацьба паміж Казімірам Ягелончыкам і Міхаілам Жыгімонтавічам працягвалася да смерці апошняга, але Юрый Лынгвеневіч заставаўся ў Вялікім Ноўгарадзе яшчэ і ў 1447 г.[74]

На думку М. Любаўскага, Мсціслаўскае княства было адноўлена ў 1446 г.[75] Але ўлічваючы, што Юрый Лынгвеневіч заставаўся ў Ноўгарадзе ў 1447 г., верагодна, аднаўленне Мсціслаўскага княства адбылося не раней за гэты год. Ва ўсякім выпадку, у 1448 г. Юрый Лынгвеневіч быў ужо ў Вялікім Княстве Літоўскім. Ён прымаў удзел у працы Люблінскага сейма[76] і з гэтага года спакойна валодаў Мсціславам да сваёй смерці, якую напаткаў каля 1457 г.

З прыватнага жыцця князя Юрыя вядома, што ён, верагодна, напярэдадні 1432 г. ажаніўся з Сафіяй, але з якога яна была роду, невядома. З ёю, на думку Я. Тэнгадоўскага, князь Юрый пражыў прыкладна да 1450 г., калі аўдавеў[77].

Па смерці Юрыя мсціслаўскі стол заняў ягоны сын Іван. Гэта была поўная процілегласць актыўным дзеду і бацьку. Ён ціха княжыў да сваёй смерці ў 1483 г., якую напаткаў на службе ў Кіеве[78], і пра яго дзеянні мы ведаем толькі дзякуючы захаваным шматлікім наданням цэрквам і манастырам. Ні ў якіх ваенных агульнадзяржаўных справах ён не заўважаны. Выказваюцца меркаванні, што ён мог прымаць удзел у «кіеўскай змове» 1480–1481 гг. праваслаўных князёў, звязаных з Ноўгарадам, але гэта нічым не пацвярджаецца.

---

[71] Wolff J. Kniazowie litewsko-ruscy od konca czternastego wieku. – S. 264.

[72] Skarbiec dyplomatów. – S. 180, № 1806.

[73] Зимин А. А. Витязь на распутье. Феодальная война в России XV в. – М.: Мысль, 1991. – С. 98, 112.

[74] Skarbiec dyplomatów. – S. 181, № 1813; s. 185, № 1837.

[75] Любавский М. К. Областное деление и местное управление. – С. 136.

[76] Wolff J. Kniazowie litewsko-ruscy od konca czternastego wieku. – S. 264.

[77] Tęgodowski J. Pierwsze pokolenia Giedyminowiczów. – S. 123.

[78] Бычкова М. Е. Родословие Глинских из Румянцевского собрания // Записки отдела рукописей. – М., 1977. – Вып. 38. – С. 114.



Мал. 26. Уладальнікі Мсціслаўскага княства канца XIV – пачатку XVI ст. Род Лынгвеневічаў, Мсціслаўскіх

Іван Юр'евіч быў апошнім прадстаўніком па мужчынскай лініі рода Лынгвеневічаў. Па сябе ён пакінуў дзвюх дачок – Анастасію і Ульяну (мал. 26). Па смерці князя Івана Мсціслаў застаўся ў «дажывотным» валоданні ў яго ўдавы княгіні Ульяны. Пасля смерці апошняй ў 1495 г. вялікі князь Аляксандр забраў Мсціслаўскае княства ў скарб, дазволіўшы сіротам валодаць маёмасцю бацькі і дзеда, акрамя тых наданняў, што даў кароль Казімір. Вялікі князь Аляксандр, выступаючы ў якасці апекуна дачок мсціслаўскага князя Івана Юр'евіча дазваляў ім заставацца ў Мсціславе да таго часу, пакуль яны не возьмуць шлюб. Землі княства ў гэты час, верагодна, уваходзілі ў склад Віленскага ваяводства. Пра апошняе сведчыць той факт, што дазвол вялікага князя Аляксандра дочкам Івана Юр'евіча заставацца ў Мсціславе быў даведзены ім праз віленскага ваяводу Мікалая Радзівіла[79].

Стан пісьмовых крыніц дазваляе рабіць першыя спробы вызначэння прыблізных межаў Мсціслаўскага княства канца XIV–XV стст. для часоў не раней за пачатак-сярэдзіну XV ст. Да крыніц, якія адлюстроўваюць паселішчы, што ўваходзілі ў склад Мсціслаўскага княства, адносяцца перш за ўсё граматы розных наданняў князёў Сямёна-Лынгвена, Юрыя Лынгвеневіча, Івана Юр'евіча, і наданні «мсціслаўскіх удзельных князёў», пад якімі, верагодна, трэба бачыць дзеянні менавіта роду Лынгвеневічаў. Значную дапамогу ў вызначэнні межаў Мсціслаўскага княства сярэдзіны XV ст. аказвае «Спіс зямельных раздач караля Казіміра», у якім мы знаходзім шматлікія пацверджанні, выдадзеныя каралём Казімірам на розныя наданні князёў Лынгвена, Яраслава, Юрыя.

[79] АЗР. – Т. 2. – С. 152, № 131.

Пры вызначэнні тэрыторыі Мсціслаўскага княства канца XIV – сярэдзіны XV ст. вялікую ролю адыгрываюць пошукі тых апорных кропак, з якіх мы маем магчымасць пачаць нашу працу. Перш за ўсё гэта адносіцца да летапіснага паведамлення 1440 г., якое сведчыць, што адным з першых дзеянняў вялікага князя Казіміра было вяртанне Юрыю Лынгвеневічу ягонай вотчыны – Мсціслаўскага княства: «... дал ему очину его всю, Мстиславъ и Кричевъ, иных градов и волостей не мало...»[80]. З гэтага паведамлення мы даведваемся аб дзвюх валасцях, што належалі да вотчыны Юрыя Лынгвеневіча (Мсціслаў і Крычаў) і ўваходзілі ў склад Мсціслаўскага княства.

Лакалізацыя населеных пунктаў, вядомых па пісьмовых крыніцах XV ст., дазваляе схематычна акрэсліць межы валасцей Мсціслава і Крычава. Сярод прывілеяў караля Казіміра згадваюцца пацверджанні зямельных наданняў князя Лынгвена (1388–1431 гг.), якія лакалізуюцца ў наваколлях Мсціслава: вёскі «Березуйковичи» – суч. в. Беразуйкі, «Колтов» – суч. в. Колтава, «Ремество» – усе сучасныя вёскі Мсціслаўскага раёна. Згаданыя сярод наданняў караля Казіміра «Хоцлавичи» – гэта сучасны раёны цэнтр Хіславічы Смаленскай вобласці, якія выслужыў князь Андрэй Пархоўскі ў князя Сямёна-Лынгвена. Фёдка Пескіч выслужыў у князя Лынгвеня «Безковичи» – суч. в. Бяскоўка і «Безводичи» – аднайменная вёска Мсціслаўскага раёна. Грыц Гаўрылавіч валодаў сяльцом у «Сохони» і двумя бортнікамі ў «Бастенавичех» – сучасныя аднайменныя вёскі Мсціслаўскага раёна. Нейкаму «Вітеву» кароль Казімір пацвердзіў правы на «Ковшово» – сучасная аднайменная вёска Мсціслаўскага раёна і на «селцо на Городку» – суч. в. Гарадок Хіславіцкага раёна Смаленскай вобласці, якія ён трымаў пры Лынгвені і Жыгімонце. Івашка Мазалаў атрымаў пацвярджэнне сваіх правоў «у Старомъ селе», якое таксама трымаў ў часоў Лынгвена[81].

«Старое сяло» пачатку XV ст. – гэта, верагодна, сучасная аднайменная вёска Мсціслаўскага раёна. Магчыма, з прозвішчам уладара Старога сяла – Мазалаў – звязана назва сучаснай в. Мазалава Мсціслаўскага раёна, існаванне якой ускосна можна адносіць да XV ст. Гэты ж Івашка Мазалаў атрымаў пацверджанне і на в. Ляжыні ў Мсціславе, верагодна, сучасную в. Лызкі Хіславіцкага раёна Смаленскай вобласці[82].

У воласці князя Лынгвена, размешчанай каля Мсціслава, знаходзіліся в. «Селцо» – суч. в. Сялец Мсціслаўскага раёна і в. «Комаровичи» – суч. аднайменная вёска Шумяцкага раёна Смаленскай вобласці, якія князь Лынгвен надаў вядомаму ім у 1407 г. манастыру Св. Ануфрыя[83]. Пра тое, што менавіта гэтыя, а не іншыя аднайменныя вёскі трэба разглядаць у якасці княскіх наданняў, сведчыць іх размяшчэнне каля манастыра. Побач з Ануфрыеўскім манастыром

[80] Новгородская первая летопись старшего и младшего изводов. – С. 420.

[81] ДМАМЮ. – Т. 1. – С. 23, п. 7, 9, 10, 12.

[82] Литовская метрика. Книга записей № 1 (1380–1584) / parenge A. Baliulis, R. Firkovičius. – Vilnius: Zara, 1998. – С. 38.

[83] АЗР. – Т. 1. – С. 57–58, № 43 п.

яшчэ ў XIX ст. знаходзілася в. Галоўчын, якую пры вялікім князі Жыгімонце Кейстутавічы (1432–1440) трымаў нейкі Самойла[84].

Князь Юрый Лынгвеневіч у свой час зрабіў фундуш на царкву Св. Георгія ў в. Селішча. Улічваючы, што ў крыніцы пры апісанні межаў сенажаці, якую падарыў царкве князь Юрый, згадваецца в. Рай, сугучны назве якой тапонім мы знаходзім сёння толькі ў Манастыршчынскім раёне Смаленскай вобласці, то в. Селішча, якая нас цікавіць, гэта аднайменная сучасная вёска Мсціслаўскага раёна,[85] размешчаная недалёка ад в. Рай.

Для вызначэння межаў Мсціслаўскага княства канца XIV – сярэдзіны XV ст. цікавасць уяўляюць і іншыя тапонімы, што згадваюцца сярод наданняў караля Казіміра і якія мы знаходзім у наваколлях Мсціслава і Крычава. Так, Грышку Пашковічу Казімір надаў «двор Людагощи», сугучны якому тапонім в. Людагошча знаходзіцца ў Мсціслаўскім раёне на Сожы. Улічваючы, што наданне было здзейснена, калі Казімір яшчэ быў вялікім князем, і сярод асоб, якія падпісалі прывілей, значыцца прозвішча віленскага ваяводы Даўгірда, які памёр у 1443 г.[86], то гэта наданне трэба датаваць часам паміж 1440–1443 гг., калі Мсціслаўскае княства было ў другі раз канфіскавана за ўдзел князя Юрыя Лынгвеневіча ў «Смаленскай замятни» 1440 г.

Гэтым жа часам датуецца наданне князю Юрыю Міхайлавічу сяла Краснага – сучаснага аднайменнага населенага пункта Мсціслаўскага раёна. Не пазней 1440–1443 гг. датуецца наданне маёнтка ў сяле Красным і Плёсаў Еску Міковічу. У абодвух выпадках верхняя дата 1443 г. абапіраецца на год смерці пана Даўгірда, які падпісываў прывілей аб наданні маёмасці. Верагодна, у гэтыя ж гады было дадзена нейкаму Бабру сяло Добрае[87]. У часы Юрыя Лынгвеневіча ў Мсціслаўскім княстве была «маетнасць Шамовщизна при селе Пузырёве»[88] – сучасныя в. Шамаўшчына і Пузырова Мсціслаўскага р-на.

Саракавымі гадамі XV ст. датуецца наданне Міхаілу Міхалсукаву сяла «Колодязей». Улічваючы, што крыніца падпісана «панам Кгастовтам», у якім, верагодна, трэба бачыць віленскага ваяводу Яна Гаштольда[89], які згадваўся ў 1443 г., то і наданне трэба датаваць часам паміж 1440–1443 гг. альбо 1445–1447 гг., калі Мсціслаўскае княства было ў трэці раз канфіскавана ў князя Юрыя за падтрымку прэтэнзій Міхаіла Жыгімонтавіча на вялікакняскі стол. Сяло Калодзязі яшчэ напачатку XX ст. існавала ў раёне суч. в. Татарск Манастыршчынскага раёна Смаленскай вобласці, каля ўпадзення р. Гародня ў р. Віхра.

---

[84] Литовская метрика. Книга записей № 1 (1380–1584). – С. 36.

[85] ИЮМ. – Вып. 25. – С. 326–328.

[86] ДМАМЮ. – Т. 1. – С. 22, № 11; Urzędnicy centralni i dostojnicy Wielkiego księstwa Litewskiego XIV–XVIII wieku. Spisy // Urzędnicy dawnej Rzeczypospolitej XII–XVII wieku. Spisy. – Kórnik: Biblioteka Kórnicka, 1994. – T. XI. – S. 206.

[87] ДМАМЮ. – Т. 1. – С. 22, № 12–15.

[88] ИЮМ. – Вып. 25. – С. 473, 500.

[89] ДМАМЮ. – Т. 1. – С. 22, № 13; Urzędnicy centralni i dostojnicy Wielkiego księstwa Litewskiego. – S. 207.

Гэтым жа часам датуецца наданне нейкаму Санку Заселля[90], у якім трэба бачыць сучасную в. Старое Заселле Шумяцкага раёна Смаленскай вобласці.

Сярод наданняў пачатку 40-х гадоў XV ст. караля Казіміра ў воласці Крычава згадваецца наданне Глебку Крычаўскаму людзей каля сяльца «Волчосы»[91], якое з'яўляецца сучаснай в. Воўчас Крычаўскага раёна. Нейкаму Касцюшку былі дадзены Пятровічы, сучасная аднайменная вёска Шумяцкага раёна[92].

Сярод дакладна не датаваных наданняў караля Казіміра знаходзім і іншыя тапонімы, сугучныя назвам населеных пунктаў, якія мы зараз знаходзім у навакольлях Мсціслава. Так, нейкаму Етлю былі даны «Вехра а Саприничи», апошняя, верагодна, з'яўляецца сучаснай в. Сапрынавічы Мсціслаўскага раёна. А першая, магчыма, – сучасная вёска Ст. Віхраны гэтага ж раёна. Нейкі «Ринъда» атрымаў «двор Порадницкое»[93], сугучны тапонім якой – в. Парадзіна – размешчаны таксама ў Мсціслаўскім раёне. У другой палове XV ст. сяльцом Ходасавым (суч. в. Ходасы Мсціслаўскага р-на) валодаў Леў Глінскі, які быў служылым баярынам у князя Івана Юр'евіча. Служылым баярынам гэтага ж князя быў і нейкі Пацолт, з імем якога, верагодна, звязана і паходжанне сучаснай в. Пацолтава Мсціслаўскага раёна[94]. Улічваючы, што князь Іван Юр'евіч памёр у 1483 г., то існаванне гэтых вёсак адносіцца да больш ранняга часу.

У 1499 г. разбіралася справа аб прыналежнасці ў навакольлях Мсціслава маёнтка Хвастова, які існаваў як мінімум яшчэ з часоў князя Юрыя Лынгвеневіча. У яго склад ўваходзілі прысёлкі Віхтаровічы, Слаўнавічы, Дубасны Лог, сяло Бачынічы[95]. Улічваючы, што большасць гэтых тапонімаў існуе і сёння ў паўднёвай частцы Манастыршчынскага раёна Смаленскай вобласці, то межы Мсціслаўскага княства і воласці Мсціслава ўпэўнена можна шукаць на паўночны захад ад Мсціслава. У гэтай жа крыніцы згадваецца і двор Кокатава, сугучны якому населены пункт знаходзіцца і зараз на захад ад Мсціслава.

Для вызначэння межаў Мсціслаўскага княства XV ст. можна выкарыстоўваць і крыніцы больш позняга паходжання, хаця да іх трэба падыходзіць з вялікай асцярогай. Захавалася вялікая колькасць скаргаў, якія адносяцца да сярэдзіны XVII ст., аб прапажы дакументаў падчас падзей 1654 г. на «маетнасці», атрыманыя ад «мстиславских удельных князей», якія размешчаны ў воласці Мсціслава і Крычава.

У 1665 г. Ян Слунко скардзіўся на прапажу прывілеяў «мстиславских удзельных князей» на «маетнасці» ў маёнтку Будагошч і на маёнтках «Попелевка» і «Тухля»[96] над р. Віхра. Першы з гэтых тапонімаў існуе зараз на паўночным

---

[90] Литовская метрика. Книга записей № 1 (1380–1584). – С. 36.

[91] ДМАМЮ. – Т. 1. – С. 1, № 4.

[92] Литовская метрика. Книга записей № 1 (1380–1584). – С. 36.

[93] ДМАМЮ. – Т. 1. – С. 23, № 4, 19.

[94] Бычкова М. Е. Родословие Глинских из Румянцевского собрания. – С. 114, 119.

[95] Литовская метрика. Книга записей № 6 (1494–1506) / parenge A. Baliulis. – Vilnius: Mokslo ir enciklopediju leidybos institutes, 2007. – S. 229.

[96] ИЮМ. – Вып. 25. – С. 501.

захадзе ад Мсціслава, а абодва другія населеныя пункты і зараз існуюць ў Манастыршчынским раёне Смаленскай вобласці на р. Віхра.

У 1663 г. Пракоп, Рыгор, Зянон і Васілій Мішкоўскія скардзіліся каралю на тое, што падчас апошняй вайны загінула жалаваная грамата князя Лынгвена іх продку Афанасію Мішкоўскаму на «маетнасць Мішкоўскую» – верагодна, суч. в. Мышкавічы Мсціслаўскага раёна. У сучаснай в. Воўчас Крычаўскага раёна была «маетнасць» Я. Бацвінні, атрыманая яго продкамі па прывілеі мсціслаўскіх князёў: магчыма, і назва сучаснай в. Бацвінаўка Крычаўскага раёна вядзе сваё паходжанне ад гэтага часу. У тым жа 1663 г. аб прапажы прывілеяў на маёнтак Будагошч атрыманае ад «Лугвеневича» і «князей Мстиславских» заяўлялі Крываносы і Казлоўскія. Тады ж Андрэй Скуралапа скардзіўся на прапажу прывілеяў на маёнткі «Шеневічы», «Кошовічы» і «Кудрычы»[97]. Якаў Бочка скардзіўся на прапажу прывілея ад мсціслаўскіх князёў на частку маёмасці «Воловники»[98]. Сугучныя тапонімы мы бачым і сёння на поўдні Мсціслаўскага раёна.

З падобнай скаргай аб прапажы прывілея ад «князей удельных Мстиславских» на «Ратомль», у якой, верагодна, трэба бачыць сучасную в. Радамля Чавускага раёна, звяртаўся ў 1664 г. П. Кучук. Перад «уніяй» каралём былі пацверджаны прывілеі мсціслаўскіх удзельных князёў продкам Андрэя Кучука на маёмасць Ціманава (суч. аднайменная вёска Клімавіцкага р-на) і Глупікі (суч. в. Мірная Крычаўскага р-на). Гэтым жа часам датуецца і пацвярджэнне каралём прывілея мсціслаўскіх князёў продкам І. і В. Мішкоўскіх на маёмасць «Мішкоўскую»[99].

У 1665 г. са скаргай аб загінуўшых прывілеях ад князя «Лынгвеньева» на маёмасць «Сутоки» (суч. аднайменная вёска Мсціслаўскага раёна) і «Розаново»[100] (верагодна, суч. в. Рожава гэтага ж раёна) звярнуўся да караля пан Самуэль Маркавіч Сутоцкі. Аб прапажы прывілея ад князёў мсціслаўскіх на «слабаду Куровічскую» за р. Віхра скардзілася Матруна Іванаўна Куровіцкая[101]. Згаданая ў крыніцы слабада Куровіцкая – гэта сучасная в. Чырвоны Бераг Мсціслаўскага раёна.

Паны Самуэль і Аляксандр Дабрасельскія скардзіліся на прапажу прывілеяў мсціслаўскіх князёў на маёмасць у с. Добрае. Продкі П. Г. Улазоўскага атрымалі ад удзельных князёў мсціслаўскіх прывілей на «маетнасць Свінскую» – суч. в. Іванаўка Крычаўскага р-на. Стэфан Міснік і Самуэль Аляхновіч прасілі караля аб пацвярджэнні загінуўшага прывілея ад князёў мсціслаўскіх на сяло Дарлівае – аднайменная вёска Крычаўскага раёна. Апанас і Аляксандр Кабатавы прасілі пацвярджэння прывілея мсціслаўскіх князёў на «маетнасць Псковскую» ў Крычаўскім тракце[102], якой, верагодна, з'яўляецца сучасная

[97] ИЮМ. – Вып. 25. – С. 447, 449, 457.
[98] Тамсама. – Вып. 17. – С. 216–218.
[99] Тамсама. – Вып. 25. – С. 471, 484.
[100] Тамсама. – С. 496–497; АВК. – Т. 34. – С. 313.
[101] ИЮМ. – Вып. 25. – С. 495.
[102] Тамсама. – С. 466, 484–485.

в. Песькавічы Крычаўскага р-на. Вельмі сугучную па назве маёмасць – «Песковичи в тракте Кричевском» атрымалі ад мсціслаўскіх князёў продкі Філімона Арла[103]. Улічваючы, што ў гэтай крыніцы ўдакладняецца, што маёмасць размешчана за Сожам, то, верагодна, перад намі сучасная в. Пясчынікі Шумяцкага раёна Смаленскай вобласці. Стэфан Закалінскі прасіў пацвярджэння прывілея на сяло Цімошкава[104] – верагодна, сучасную в. Цімошкі Клімавіцкага раёна.

Вялікая колькасць дакументаў загінула і падчас Паўночнай вайны 1700–1721 гг., калі ў 1708 г. баявыя дзеянні адбываліся на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства. Так, у 1709 г. Мацей Яўніцкі скардзіўся на прапажу дакументаў ад князёў мсціслаўскіх на в. Свяцілавічы[105] – сучасны аднайменны населены пункт Манастыршчынскага раёна Смаленскай вобласці.

Такім чынам, вялікі комплекс пісьмовых крыніц, якія захаваліся да нашых дзён, упэўнена сведчыць пра даволі шчыльнае засяленне наваколляў Мсціслава і Крычава і пацвярджае, што гэтыя воласці ўваходзілі ў склад Мсціслаўскага княства.

Для вызначэння межаў Мсціслаўскага княства вялікае значэнне мае высвятленне, што гэта былі за «иные грады и воласти», якія належалі да вотчыны Юрыя Лынгвеневіча ў 1440 г. і не згадваюцца летапісцам.

На поўдзень ад Мсціслава ў воласць князя Лынгвена – Мсціслаўскае княства – уваходзіў горад Мглін з воласцю, пра што сведчыць наданне Лынгвена «князю Андрею во Мглине Волчина а Красновичи». Краснавічы – сучасная аднайменная вёска Унецкага раёна Бранскай вобласці, размешчаная на р. Ельня, левым прытоку р. Іпуць. Воласць Мгліна і надалей належала Лынгвеневічам. Так, пры князі Яраславе Лынгвеневічу было пажалавана «У Лояновех и во Мъглине Лопазно Фёдъку и з братомъ с Толчовымъ Белавинъское, а во Мглине Хомино ...»[106]. З гэтых населеных пунктаў сёння лакалізуецца толькі Лопазна – сучасная аднайменная вёска Суражскага раёна Бранскай вобласці.

Працягам у нашых пошуках апорных кропак у вызначэнні тэрыторыі Мсціслаўскага княства з'яўляецца другі запіс з 3-й кнігі запісаў Літоўскай метрыкі, у якім вялікі князь Казімір дае загад нейкаму Глебку крычаўскаму «на Прикладнех у Кричеве прикладненское серебро выбравъ къ великому князю принести Глебку, а ему его доходец»[107]. Як вынікае з гэтага запісу, воласць Прыкладні, размешчаная на левабярэжжы Іпуці і ўздоўж яе прытокаў Надвы і Опараці (вёскі Шыркоўка, Алень, Мужынава, Акулічы і інш.)[108], знаходзілася

---

[103] ИЮМ. – Вып. 28. – С. 150–151.

[104] Тамсама. – Вып. 25. – С. 445–446.

[105] НГАБ. – Ф. 1729. – Воп. 1. – Адз. зах. 11. – Арк. 17–17 адв.

[106] ДМАМЮ. – Т. 1. – С. 23, № 18, 19.

[107] Тамсама. – С. 1.

[108] Крашенинников В. В. Брянский уезд в XVI – первой половине XIX в. (историко-географический обзор) // Из истории Брянского края. Материалы юбилейной историко-краеведческой конференции, посвященной 50-летию образования Брянской области и 50-летия Победы в Великой Отечественной войне. – Брянск, 23 марта 1995 г. – Брянск: Изд-во Брянского гос. пед. ун-та им. акад. И. Г. Петровского, 1995. – С. 122.

ў пэўнай залежнасці ад Крычава. Яе месцаразмяшчэнне паміж Крычавам і Мглінам – валасцямі князя Лынгвена – дазваляе і воласць Прыкладні разглядаць як адміністрацыйна-тэрытарыяльную і гаспадарчую адзінку Мсціслаўскага княства XIV – сярэдзіны XV ст.

На захад ад Мгліна крыніцы называюць яшчэ адну мсціслаўскую воласць – Папову Гару. Пра тое, што яна ў XV ст. уваходзіла ў склад Мсціслаўскага княства, сведчыць запіс з памежнага размежавання 1522 г. паміж Масквою і Вільняю, што «... взял ви(е)л(и)ки кн(я)зъ Московский город Попову Гору взял повета Мстиславского з данми грошовыми и медовыми...»[109]. Ускосным сведчаннем таго, што горад і воласць Паповай Гары ўваходзілі ў склад Мсціслаўскага княства яшчэ пры князі Іване Юр'евічу сведчыць яго жалаваная грамата 1463 г. манастыру Св. Ануфрыя на возера «Гостынь, под Липкою, на Ветце», якая была напісана князем ў Паповай Гары[110].

Паміж валасцямі Мгліна і Паповай Гары крыніцы канца XV ст. (1496 г.) згадваюць вялікакняскую воласць Дрокаў, якая, улічваючы яе геаграфічнае размяшчэнне, раней таксама павінна была ўваходзіць у склад Мсціслаўскага княства[111].

Паміж Дрокавам, Мглінам, Паповай Гарой і Крычавам у канцы XV ст. (1498 г.) згадваецца вялікакняская Лучыцкая воласць[112], якая таксама, з-за яе геаграфічнага размяшчэння, павінна была ў XV ст. уваходзіць у склад Мсціслаўскага княства.

Пацверджаннем таго, што Лучыцкая воласць раней была адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкай Мсціслаўскага княства, з'яўляецца крыніца XVII ст., якая паведамляе аб прапажы прывілеяў удзельных мсціслаўскіх князёў панам Кучукам на вёскі «Бычане» (верагодна, суч. в. Забычанне) і «Тупищину»[113] (верагодна, суч. в. Тупічына Касцюковіцкага раёна), размешчаныя на тэрыторыі былой Лучыцкай воласці.

М. К. Любаўскі, а за ім і іншыя даследчыкі сцвярджаюць пра існаванне ў Мсціслаўскім княстве паміж валасцямі Мглінам і Мсціславам воласці «Хоцімль». Падставай для гэтага паслужыў факт знаходжання паміж сучаснымі Мглінам і Мсціславам населенага пункта Хоцімск, які даследчык атаясаміў з летапісным Хоцімлем[114]. Аднак летапісны Хоцімль і сучасны Хоцімск не маюць нічога агульнага. Сучасны гарадскі пасёлак Хоцімск сфарміраваўся ў XIX ст. на падставе заснаванай у канцы XVII – пачатку XVIII ст. слабады Малы Хоцімск у Лучыцкім войтаўстве Крычаўскага староства і заснаванага побач з вёскай

---

[109] ДМАМЮ. – 1897. – С. 65.

[110] АЗР. – Т. 1. – С. 84, № 69.

[111] Литовская метрика. Книга записей № 6. – С. 345; Любавский М. К. Областное деление и местное управление... – С. 136.

[112] Литовская метрика. Книга записей № 6. – С. 345.

[113] ИЮМ. – Вып. 25. – С. 484.

[114] Любавский М. К. Областное деление и местное управление... – С. 136.

ў 1714 г. мястэчка Радзівілаў. А летапісны Хоцімль трэба шукаць на паўднёвым усходзе Вялікага Княства Літоўскага[115].

Значныя цяжкасці ўзнікаюць пры вызначэнні заходняй мяжы Мсціслаўскага княства. М. К. Любаўскі выказаў думку, што ў яго склад ўваходзілі воласці Магілёва, Княжыц, Цяцерына. Гэта думка знайшла падтрымку наступных даследчыкаў Мсціслаўскага княства[116], хаця бясспрэчныя факты для абгрунтавання такой высновы адсутнічаюць. Асабліва гэта тычыцца прыналежнасці да Мсціслаўскага княства Магілёва. На сённяшні дзень адсутнічаюць якія-небудзь звесткі аб знаходжанні яго ў адзінай з Мсціславам адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінцы. Што ж тычыцца Цяцерына і Княжыц, то хаця яны ў XV ст. і знаходзіліся ў руках Лынгвеневічаў, а Цяцерынам на пачатку XVI ст. валодаў князь Міхаіл Іванавіч Мсціслаўскі, мы не маем ніякіх сведчанняў таго, што яны былі тэрытарыяльна звязаны з Мсціслаўскім княствам. Больш таго, як вынікае з пісьмовых крыніц, у воласці Цяцерына, акрамя ўладанняў мсціслаўскіх князёў, увесь час знаходзіліся і вялікакняскія ўладанні.

Ужо толькі гэты факт не дазваляе разглядаць Цяцерынскую воласць як адміністрацыйна-тэрытарыяльную і гаспадарчую адзінку Мсціслаўскага княства. Хутчэй за ўсё, двары Цяцерын і Княжычы, а таксама і некаторыя іншыя вёскі, якія належалі Лынгвеневічам у Цяцэрынскай воласці, трэба разглядаць як уладанні мсціслаўскіх князёў на тэрыторыі адміністрацыйных адзінак, якія не ўваходзілі ў склад Мсціслаўскага княства. Прыкладам таго, што ўладанні Лынгвеневічаў знаходзіліся і па-за межамі Мсціслаўскага княства, з'яўляецца наданне ў 1458 г. князем Іванам Юр'евічам Полацкаму Сафійскаму сабору сяльца на р. Марынка, прытоку р. Обаль[117].

З тых вёсак, якія ў XV ст. знаходзіліся ў складзе той часткі Цяцерынскай воласці, што была пад уладай Лынгвеневічаў, згадваюцца Шапялевічы, якія ў 1457 г. былі нададзены каралём Казімірам нейкаму Булгаку. Ва ўсякім выпадку, аднайменнае мястэчка ў пачатку XX ст. уваходзіла ў Цяцерынскую воласць[118]. Крыніцы пачатку XVI ст. згадваюць яшчэ тры былых сялы князя Міхаіла Іванавіча мсціслаўскага ў Цяцерынскай воласці, якія ён саступіў князю Васілію Андрэевічу Палубінскаму, на што апошні атрымаў прывілей ад караля ў 1524 г. Сярод іх значацца вёскі «Шепелевичы», «Бовсовичи», «Коновасово»[119]. Сугучны «Бовсовичам» сучасны тапонім Боўсевічы ўваходзіў у пачатку XX ст. у Цяцерынскую воласць Магілёўскай губерні і вядомы

---

[115] Мяцельскі А. А. Хоцімск: да пытання пра час узнікнення // Вес. НАН Беларусі. Сер. гуманітар. навук. – 1999. – № 4. – С. 20–24.

[116] Любавский М. К. Областное деление и местное управление... – С. 14; Kuczyński S. Ziemie czernihowsko-siewierskie pod rządami Litwy. – S. 54; Krupska A. Udzielnie księstwo Mścisławskie. – S. 36–37.

[117] АЗР. – Т. 1. – С. 77, № 62.

[118] РИБ. – Т. 27. – Литовская метрика. Отдел первый. Часть первая. Книги записей: Том первый. – СПб.: Сенатская типогр., 1910. – Стб. 44; Список населенных мест Могилевской губернии. – Могилев: Могилев. стат. ком., 1910. – С. 17.

[119] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 12. – Арк. 248.

зараз[120]. Разам з Шапялевічамі ён размяшчаецца на р. Асмоўка, прытоку р. Друць.

Аналізуючы пісьмовыя крыніцы, з упэўненасцю можна сцвярджаць, што менавіта з валасцей Мсціслава, Крычава, Мгліна, Дрокава, Лучыц, Паповай Гары і, верагодна, Прыкладней складаўся першапачатковы абшар Мсціслаўскага княства канца XIV – пачатку XV ст. Менавіта гэтымі валасцямі кіраваў мсціслаўскі намеснік Карыгайла, і на іх падставе было сфарміравана княства для Лынгвена (мал. 27).

Але ў даволі хуткім часе пасля свайго заснавання Мсціслаўскае княства павялічыла сваю тэрыторыю. Сярод запісаў раздач караля Казіміра ёсць па-

● – горад; — — — — – граніца Мсціслаўскага княства; ▪▪▪▪▪▪▪▪▪▪▪▪ – граніца валасцей Мсціслаўскага княства

Мал. 27. Мсціслаўскае княства ў XIV – пачатку XV ст.

[120] Список населенных мест Могилевской губернии. – С. 17.

ведамленне, што пры вялікім князі Вітаўце да Мсціслава была «прывернута» ад Смаленска воласць «Малаховский путь», размешчаная ўздоўж р. Малохва, правым прытоку р. Віхра: «...и што великий князъ Витовтъ обернулъ было къ Мстиславлю Смоленское волосци Молоховские люди...»[121]. Крыніца не ўдакладняе час далучэння Вітаўтам смаленскай воласці да Мсціслава, але хутчэй за ўсё гэта адбылося ў 1404 г., калі Вітаўт канчаткова падпарадкаваў Смаленск Вялікаму Княству Літоўскаму. Распачатую Вітаўтам акцыю па скарачэнні тэрыторыі, падначаленай Смаленску, верагодна, трэба разглядаць як мэтанакіраванае дзеянне вялікага князя па падрыве перш за ўсё эканамічнай моцы Смаленска. Сярод населеных пунктаў Малахоўскай воласці XV – пачатку XVI ст., якія лакалізуюцца сёння, мы сустракаем вёскі Даманца, Высокае, Балтуціна, Місанава, Ходнева[122].

Межы Мсціслаўскага княства пачатку – другой паловы XV ст., што ўключала ў свае абшары воласці самога Мсціслава, Малохву, Крычаў, Прыкладні, Мглін, Дрокаў, Лучыцы і Папову Гару (мал. 28), рэканструюцца толькі на асобных яе адрэзках, што выклікана станам крыніц. Для больш канкрэтнай прывязкі і вызначэння межаў княства пачатку – сярдзіны XV ст. выкарыстоўваліся крыніцы XVI–XVII стст.

На поўначы воласць «Малаховский путь» (Малохва) межавала са смаленскай воласцю «Дубровенский путь», цэнтр якой, верагодна, знаходзіўся на месцы в. Дубровенка на р. Дубраўка[123]. Паўднёвымі дубровенскімі вёскамі, якія межавалі з землямі Малохвы, у канцы XV – пачатку XVI ст. названы вёскі «Баева» (Дубровенскі р-н), «Вадава» – суч. в. Авадава, «Литвиново», «Великий Лес» – сучасныя аднайменныя вёскі Краснянскага р-на Смаленскай вобласці[124]. Насупраць іх у канцы XV – пачатку XVI ст. мы знаходзім малахоўскія сёлы «Болтутино», «Шилковичи»[125] (Краснянскі р-н Смаленскай вобласці). На ўсходзе воласць Малохва на пачатку XVII ст. дасягала р. Шалонь, правага прытока р. Віхра. Па яе берагах лакалізуюцца самыя ўсходнія малахоўскія сёлы – «Досугово», «Капустино», «Маслово», «Путятино»[126]. Ракою Шалонь усходняя мяжа воласці Малохва спускалася ў р. Руфа, на якой размешчана малахоўскае сяло «Носово» – верагодна, сучасная в. Носкава Манастыршчынскага раёна Смаленскай вобласці. З р. Руфа ўсходняя мяжа Малохвы вяла на р. Віхра. У раёне сучаснай в. Бурхава (Манастыршчынскі р-н) – былое «селище Бур-

---

[121] АЗР. – Т. 1. – С. 361, № 213.

[122] РИБ. – Т. 27. – Стб. 69, 869; Акты Литовской метрики. – Т. 1. – Вып. 1. 1413–1498 гг. Собранные заслуженным профессором Императорского Варшавского университета Ф. Н. Леонтовичем. – Варшава: Тип. Варшав. учеб. округа, 1896. – С. 36, 57.

[123] Кашпровский Е. И. Борьба Василия II и Сигизмунда I Казимировича из-за обладания Смоленском // Сборник историко-филологического общества при институте кн. Безбородко в Нежине. – Нежин, 1899. – Т. 2. – С. 277.

[124] ДМАМЮ. – Т. 1. – С. 23; Описание бумаг и документов хранящихся в Московском архиве министерства юстиции. – Кн. 21. – М.: Т-во скоропечатни А. А. Левинсона, 1915. – С. 177, 180.

[125] РИБ. – Т. 27. – Стб. 690.

[126] Кашпровский Е. И. Борьба Василия II и Сигизмунда I Казимировича. – С. 329–330.

●– горад; – – – – – граніца Мсціслаўскага княства; ▪▪▪▪▪▪▪▪▪▪▪▪ – граніца валасцей Мсціслаўскага княства

Мал. 28. Мсціслаўскае княства ў XV ст.

цево», воласць Малохва пераходзіла на левы бераг Віхры. Але потым усходняя мяжа Малахоўскай воласці зноў паварочвала на р. Віхра і ёю спускалася ўніз да ўпадзення ў р. Віхра р. Гародня. На левым беразе р. Гародня мы сустракаем самыя паўднёвыя малахоўскія вёскі пачатку XVII ст., а на пдудзень ад яе бачым шматлікія наданні «мстиславских удельных князей». Улічваючы, што нам не вядомы наданні мсціслаўскіх князёў у Малахоўскай воласці, можна выказаць думку, што гэта воласць не разглядалася Лынгвеневічамі як іх бяспрэчнае ўладанне. А саму раку Гародня можна разглядаць як паўднёвую мяжу воласці Малохва.

Улічваючы, што паўночная і ўсходняя мяжа Малахоўскай воласці на працягу стагоддзяў заставаліся ўнутранымі межамі Вялікага Княства Літоўскага, а потым Вялікага Княства Маскоўскага і Рускага царства, можна меркаваць,

што ў сваёй аснове яны былі стабільнымі, і сітуацыю, якая прасочваецца па крыніцах пачатку XVII ст., можна рэтраспекціраваць на XV ст. Выключэнне складае толькі невялікая тэрыторыя, на якой размешчаны вёскі Вялікі Лес і Авадава, якія час ад часу пераходзілі са склада воласці «Дубровенскі пуць» ў склад воласці «Малахоўскі пуць» і наадварот.

Значна горшая сітуацыя складваецца з вызначэннем мяжы Мсціслаўскага княства XV ст. на ўсход ад ракі Малохвы. Тут тэрыторыя Мсціслаўскага княства межавала са смаленскай воласцю «Максимовский путь», звесткі аб населеных пунктах якой не дазваляюць дакладна вызначыць мяжу паміж гэтымі адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі адзінкамі. Мсціслаўска-максімаўскі рубеж вызначаецца толькі на падставе памежнага размежавання 1522 г. паміж Вільняй і Масквой. Аднак адсутнасць якіх-небудзь звестак пра спрэчкі за населеныя пункты паміж валасцямі Мсціслава і «Максімаўскі пуць» у больш познія часы дазваляе выказаць меркаванне, што воласць «Максімаўскі пуць» перайшла ў склад Вялікага Княства Маскоўскага ў 1522 г. цалкам, з усімі населенымі пунктамі. Гэта дазваляе, на наш погляд, у пошуках мяжы XV ст. паміж воласцю Мсціслава і «Максімаўскі пуць» абапірацца на крыніцы XVI ст. і праводзіць яе прыкладна ўздоўж плыні р. Лютая.

Мяжу Мсціслаўскага княства на ўсход ад Сожа і на поўнач ад р. Асцёр, верагодна, трэба шукаць у міжрэччы сожскай Бярэзіны і сярэдняй плыні р. Стомяч, правага прытока р. Асцёр. Мерыдыяльная плынь р. Стомяч, што працякае праз вялікі дрыгвяны масіў, была ідэальным прыродным рубяжом шырынёю 10–15 км і даўжынёю з поўначы на поўдзень 30–35 км паміж Мсціславам і Рослаўлем. Сваім паўднёвым кутом гэты дрыгвяны масіў амаль дакладна выходзіў на мяжу паміж ВКЛ і Вялікім Княствам Маскоўскім, што ўстанавілася ў 1522 г. Да таго ж менавіта тут размяшчалася воласць Хаславічы, якая ў XVI – пачатку XVII ст. у памежным размежаванні паміж ВКЛ і Масквой называецца як самастойная воласць, але ў больш позніх крыніцах фігуруе як састаўная частка Мсціслаўскага ваяводства.

На поўдзень ад дрыгвянога масіву ўздоўж Стомячы мяжа, верагодна, ішла тым жа кірункам, як і ў размежаванні рослаўскага і мсціслаўскага рубяжоў 1522 г.: «промежи Словнева да Шибнева к Гневкову Доброю рекою в Водонос, от Водоноса Доброю рекою у Востръ через Великий Бор у речку Шумячу...»[127]. Гэты ўчастак дзяржаўнай мяжы (1522 г.) добра рэканструяваны Н. Шаламанавай[128] і амаль дакладна паўтарае мяжу паміж Магілёўскай і Смаленскай губернямі XIX – пачатку XX ст. У дадатак да падмацавання думкі пра магчымае праходжанне ўсходняй мяжы Мсціслаўскага княства XV ст. у гэтым раёне можна прывесці той факт, што на ўсход ад гэтай лініі мы не бачым населеных пунктаў, якія былі нададзены баярам мсціслаўскімі князямі ў XIV–XV стст., а на захад знаходзім ланцужок мсціслаўскіх паселішчаў.

---

[127] ДМАМЮ. – Т. 1. – С. 67.

[128] Шеломанова Н. В. Рославльский уезд в XVI в. (Историко-географический очерк) // МИСО. – 1974. – Вып. VIII. – С. 165–193.

Мяжа з р. Бярэзіна, левага прытока р. Сож, ішла паміж мсціслаўскім Слаўневам, якое не лакалізуецца, і рослаўскім сялом Шыбнева.

З мсціслаўскага боку маркіраваць напрамак дзяржаўнай мяжы дапамагае сяло Заселле, вядомае як па крыніцы сярэдзіны XV ст., так і па крыніцы 1505 г.[129], якое размешчана насупраць Шыбнева. Далей мяжа ішла ракою Добрая ў паўднёва-ўсходнім кірунку ў бок рослаўскага сяла Гнеўкава, якое і зараз лакалізуецца ў Шумяцкім раёне Смаленскай вобласці. Тут таксама нам дапамагаюць маркіраваць мяжу 1522 г. паміж ВКЛ і Маскоўскім княствам мсціслаўскія вёскі. На паўднёвы захад ад Заселля і Шыбнева, на левым беразе Астра знаходзім в. «Ожоги» – сучасная аднайменная вёска Шумяцкага р-на, якая была пажалавана продкам Яраша Пячкоўскага «мсціслаўскімі ўдзельнымі князямі»[130]. Насупраць яе размешчана рослаўскае сяло Гнеўкава.

Далей на поўдзень ад р. Асцёр усходняя мяжа Мсціслаўскага княства XV ст., верагодна, ішла «через Великий Бор у речку Шумячу...»[131].

Нельга выключыць, што тут мяжа ішла па р. Шумячы і выходзіла далей на р. Іпуць. Рака Іпуць, з багнамі ўздоўж яе плыні, з'яўляецца даволі прывабным месцам дзеля таго, каб разглядаць яе ў якасці магчымага ўсходняга рубяжа Мсціслаўскага княства XV ст. Акрамя таго ўздоўж р. Іпуць сустракаюцца радзіміцкія курганы.

На правым баку Іпуці размяшчаліся дзве воласці Вялікага Княства Літоўскага – Салаўянічы і Прыкладні. На сённяшні дзень мы не маем звестак аб сёлах гэтых валасцей XV ст. і іх непасрэднай прыналежнасці Мсціслаўскаму княству, але некаторыя ўскосныя факты дазваляюць не выключаць гэтай магчымасці.

Так, воласць Прыкладні ў 40-х гадах XV ст. была ў пэўнай залежнасці ад Крычава. Але 40-я гады XV ст. былі часам, калі Мсціслаўскае княства было канфіскавана ў дзяржаўны скарб, таму нельга выключыць, што раней Прыкладні, як і Крычаў, уваходзілі ў склад Мсціслаўскага княства. Воласць Салаўянічы, значна меншая па плошчы, размяшчалася на правабярэжжы р. Іпуць побач з валасцю Прыкладні. Таму нельга выключыць, што і яна ўваходзіла ў склад Мсціслаўскага княства XV ст.

У нашых пошуках усходняй мяжы Мсціслаўскага княства XV ст. на поўдзень ад р. Асцёр, верагодна, трэба пагадзіцца з прапановай С. Кучынскага, які вёў усходнюю мяжу Мсціслаўскага княства па р. Іпуць да Зароя, а потым паварочваў мяжу княства на ўсход[132], уключаючы ў яго склад землі, на якіх размешчаны воласці Салаўянічы і Прыкладні. Усходняя мяжа воласці Прыкладні праходзіла на ўсход ад лініі прыкладненскіх вёсак Шыркоўка, Алень, Мужынава, якія і зараз лакалізуюцца ў Клятнянскім раёне Бранскай вобласці[133].

---

[129] ДМАМЮ. – Т. 1. – С. 22–19; АЗР. – Т. 1. – С. 365, № 217.

[130] ИЮМ. – Вып. 25. – С. 452.

[131] ДМАМЮ. – Т. 1. – С. 67.

[132] Kuczyński S. Ziemie czernihowsko-siewierskie pod rządami Litwy. – Мара.

[133] Крашенинников В. В. Брянский уезд в XVI – первой половине XIX в. – С. 122.

Далей мяжа ішла на поўдзень у воласць Мгліна. Тут рэканструкцыю ўсходняй мяжы воласці Мгліна мы можам правесці, дзякуючы памежнаму размежаванню 1522 г. паміж Масквою і Вільняю, у якім мы знаходзім звесткі аб унутраных межах Вялікага Княства Літоўскага больш ранняга часу.

Рубеж паміж Мглінам і Бранскам «реестр мглінскі» акрэслівае такім чынам: «На памятъ, што рубежъ пришол из Гомгия, Ипуть реки, из Ипутя к Ушаковичомъ – то Мглинска, а против того Салавняне брянская, а межи тыми селы рубеж мглински из Брянском – Ормина городищи брянское Окуличи село». У гэтым апісанні мглінска-бранскага памежжа ў склад маскоўскіх валасцей Мгліна і Бранска ўключаны воласці Прыкладні і Салаўянічы, але далей апісанне дазваляе больш дэтальна аддзяліць адну воласць ад другой і на гэтай падставе зрабіць рэканструкцыю паўднёвай мяжы Мсціслаўскага княства.

Мглінска-бранскі рубеж на поўнач ад Ворміны праходзіў на ўсход ад мглінскай вёскі «Диваним» – суч. в. Дзіваўка Мглінскага раёна Бранскай вобласці. Верагодна, і мяжу Мсціслаўскага княства трэба шукаць у гэтым рэгіёне.

Далей мяжа Мсціслаўскага княства праходзіла на старадубска-мглінскім рубяжы, які добра вызначаецца па наступным апісанні: «А промежы тых сёл рубеж до Стародуба пошёл. Расуха стародубская, а Мезыревская – то мглинская. А промежі ними рубеж. А Наипутовичи стародубское, а Рухова мглинская. А промеж того рубеж от Рухова к Хвашню»[134]. Большая частка гэтых тапонімаў і сёння добра лакалізуецца і дае магчымасць вызначыць кірунак паўднёвай мяжы Мглінскай воласці Мсціслаўскага княства. Адносна Хвашня С. Кучынскі прапанаваў лакалізаваць яго ў міжрэччы Іпуці і Беседзі на возеры Кажаны, размешчаным на адной лініі з Рухавам.

Ад Наіпутавіч, на думку С. Кучынскага, мяжа ішла левым берагам р. Унеча ў напрамку р. Іпуць. Далей мсціслаўская мяжа ішла ўніз па Іпуці да Баравіч старадубскіх, адкуль уздоўж гомельскай мяжы ішла на р. Беседзь і выходзіла на яе каля чачэрскага сяла Галодна. Далей С. Кучыньскі вёў заходнюю мяжу Мсціслаўскага княства ўздоўж левага берага Беседзі да наваколляў «Хадимска» – сучаснай в. Хоцімск Касцюковіцкага раёна. Але ў той жа час ён лічыў, што хутчэй за ўсё мсціслаўская мяжа падымалася ўверх па р. Палуж[135]. З агульным кірункам мяжы Мсціслаўскага княства прапанаваным С. Кучынскім, трэба пагадзіцца, але неабходна ўнесці карэктывы.

Заходнюю мяжу Мсціслаўскага княства на поўдзень ад Сожа трэба шукаць ў міжрэччы Беседзі і Покаці, прыкладна ў тым месцы, дзе праходзіла мяжа паміж ВКЛ і Рускім царствам ў XVI–XVIII стст. – чачэрска-паповагорская мяжа.

Сапраўды, воласць Прапойска ніколі не была ў складзе Мсціслаўскага княства другой паловы XIV–XV ст. У 1387 г. яна была пажалавана князю Скіргайлу і на працягу XV – пачатку XVI ст. згадваецца як вялікакняская воласць. Мяжа

[134] ДМАМЮ. – Т. 1. – С. 65.

[135] Kuczyński S. Ziemie czernihowsko-siewierskie pod rządami Litwy. – S. 75, 89–90.

Крычаўскай воласці сярэдзіны XVI ст. (1560 г.) з Прапойскам ішла менавіта па р. Палуж, на якой знаходзілася аднайменная вёска Крычаўскага староства. Далей мяжа праходзіла некалькі на захад ад сучасных вёсак Лешчанка і Лешчанская Буда. Першая з іх узнікла ў Крычаўскім старостве ў XVIII ст. на «палужскіх кгрунтах». Далей мяжа выходзіла на р. Сянная, у нізоўях якой знаходзілася крычаўская вёска Вушакі, вядомая з сярэдзіны XVI ст.[136]

Уздоўж р. Сож Мсціслаўскае княства межавала з Прапойскім і Магілёўскім староствамі. Заходнюю мяжу Мсціслаўскага княства XV ст., верагодна, можна рэканструяваць на падставе крыніц XVI–XVIII стст. На такую думку наводзіць той факт, што тут княства ўвесь час межавала з Магілёўскім староствам, якое адносілася да «сталовых валасцей» – даходы з якіх ішлі на забеспячэнне вялікакняскага і каралеўскага двара. Наўрад ці нават пры агульнадзяржаўных адміністрацыйна-тэрытарыяльных і гаспадарчых пераменах межы Магілёўскага староства скарачаліся.

Крычаўска-магілёўскае памежжа сярэдзіны XVI ст., якое, верагодна, раней было часткай заходняй мяжы Мсціслаўскага княства, з Сожа зварочвала ў раку Турэя. Зараз ракі з назвай Турэя альбо Тур'я ў басейне Сожа няма[137]. У Чэрыкаўскім раёне існуе на р. Удога вёска Тур'я, якая ў XVI–XVIII стст. уваходзіла ў склад Магілёўскага староства. Нельга выключыць, што сучасная р. Удога – гэта вядомая па крыніцы XVI ст. р. Тур'я. Гэта думка пацвярджаецца размежаваннем Крычаўскага староства са шляхецкімі уладаннямі 1744 г. Яно сцвярджае, што «граніца даўняя» паміж Магілёўскай эканоміяй і Крычаўскім староствам у раёне магілёўскага мястэчка Чэрыкаў і крычаўскага сяла Зоры ішла па рацэ Вудога[138]. Недзе паміж магілёўскай вёскай Вудога і крычаўскай Зоры мяжа Мсціслаўскага княства зварочвала бліжэй да р. Воўчас, на якой ў XV–XVIII стст. стаялі крычаўскія сёлы Камаровічы (Чэрыкаўскі р-н), Воўчас, Бацвінаўка, Губеншчына (Крычаўскі р-н). Насупраць іх на ручаі Глінец знаходзіліся магілёўскія вёскі Глінь і Удога[139]. Вышэй в. Бацвінаўка мсціслаўская мяжа пераходзіла на левы бераг р. Воўчас, на правым беразе якой знаходзілася магілёўская вёска Вярхоўцы[140] (зараз Крычаўскі р-н), хаця ў некаторых крыніцах яна згадваецца як мсціслаўскае сяло.

Далей усходняя мяжа Мсціслаўскага княства XV ст., як і Крычаўскага староства сярэдзіны XVI ст., ішла ў кірунку Воўчага балота[141], якое, верагодна, трэба лакалізоўваць на поўдзень ад сучасных вёсак Волкаўка і Забалацце Мсціслаўскага раёна. Воўчае балота, верагодна, было той геаграфічнай кроп-

---

[136] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1936. – Арк. 97; Тамсама. – Ф. 694. – Воп. 1. – Адз. зах. 1155. – Арк. 69.

[137] Маштаков П. Л. Список рек Днепровского бассейна с картой и алфавитным указателем. Изданный при Императорской Академии наук комиссией по вопросу о географической номенкулатуре. – СПб.: Тип. Имп. АН, 1913. – 292 с.

[138] НГАБ. – Ф. 694. – Воп. 1. – Адз. зах. 3982. – Арк. 251.

[139] АЗР. – Т. 1. – С. 247, № 160.

[140] АЮЗР. – Т. 14. – С. 272, № 8-XVI.

[141] НГАБ. – Ф. 694. – Воп. 1. – Адз. зах. 1155. – Арк. 68.

кай, адкуль мяжа Мсціслаўскага княства паварочвала на захад у бок Проні. На захад ад Воўчага балота мы бачым існуючую пры князі Лынгвені в. «Безковичи»[142] – сучасную в. Бяскоўка Мсціслаўскага р-на. На паўднёвы-захад ад Бяскоўкі і на захад ад вёсак Забалаць і Волкаўка мы бачым згаданую ў Мсціслаўскім ваяводстве сярэдзіны XVII ст. «маетнасць Нішкаўскую»[143], тапонім, сугучны назве сучаснай в. Нежкаўка Чавускага р-на. Мяжа Мсціслаўскага княства, верагодна, выходзіла на р. Проня па яе правым прытоку р. Саладзец, на левым беразе якой знаходзілася магілёўская в. Бынава.

Басейн р. Проня толькі на невялікім адрэзку ўваходзіў у склад Мсціслаўскага княства і ваяводства. Тут знаходзілася Радамля, якую мы першы раз бачым у складзе Мсціслаўскага княства 20 студзеня 1499 г., калі мсціслаўскі князь Міхаіл Іванавіч Жаслаўскі пажалаваў багамольца радамльскага Дзіянісія на царкву Св. Багародзіцы[144], але ўскосныя звесткі пра яе прыналежнасць да Мсціслаўскага княства адносяцца да першай паловы XV ст.[145] Побач з ёю крыніца канца XV ст. (1499 г.) згадвае ў воласці Мсціслава «дварец» Расна[146]. На правым беразе Проні ў воласці Мсціслава, пад Радамляй, крыніцы XVII ст. згадваюць вёскі Скварск, Жаліўе, Барышоўку, Русінаўку[147].

На поўнач ад Радамлі па р. Проня Мсціслаўскае княства межавала з Аршанскім паветам, а потым мяжа зварочвала ў левы прыток Проні раку Быстрая, адкуль вяла ў левы прыток Быстрай р. Рамяствянка[148]. З Рамяствянкай мяжа Мсціслаўскага княства на поўнач ад мсціслаўскай вёскі Беразетня ішла ў кірунку р. Гародня, якая была мяжой Малахоўскай воласці з воласцю самаго Мсціслава.

Ад р. Гародня заходняй мяжой Мсціслаўскага княства была мяжа воласці Малохва, якая ішла на поўнач у бок в. Баева, што ўваходзіла ў воласць «Дубровенскі пуць»[149]. Такім чынам, мы вярнуліся на тую кропку, адкуль спрабавалі акрэсліць мяжу Мсціслаўскага княства пачатку–сярэдзіны XV ст.

Памежнае размежаванне 1522 г. паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай у сукупнасці з іншымі крыніцамі дазваляе рэканструяваць межы некаторых валасцей, якія ў XV ст. уваходзілі ў склад Мсціслаўскага княства. Гэта, у сваю чаргу, дазваляе зрабіць схематычную рэканструкцыю адміністрацыйна-тэрытарыяльнага і гаспадарчага падзелу княства.

Усходнюю і паўднёвую мяжу воласці Мгліна, якая межавала з Бранскам і Старадубам мы паказалі, калі вялі размову аб межах Мсціслаўскага княства. На захадзе воласць Мгліна межавала з воласцю Дрокава. Улічваючы, што пасля

---

[142] ДМАМЮ. – Т. 1. – С. 23, № 9.

[143] ИЮМ. – Вып. 25. – С. 487.

[144] НГАБ. – Ф. 1729. – Воп. 1. – Адз. зах. 33. – Арк. 360.

[145] ИЮМ. – Вып. 24. – С. 416–418.

[146] РИБ. – Т. 27. – Стб. 783–785.

[147] АЮЗР. – Т. 14. – С. 284, № 9-XVI.

[148] Спірыдонаў М. Ф. Карта Аршанскага павета ў канцы XVI ст. // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Т. 1. – С. 191.

[149] ДМАМЮ. – 1897. – С. 23.

ўваходу гэтых зямель у склад Маскоўскай дзяржавы дрокаўска-мглінская мяжа стала ўнутранай мяжой, можна меркаваць, што яна не мянялася і вяла свае паходжанне з больш ранніх часоў. Дрокаўска-мглінская мяжа праходзіла на захад ад мглінскіх вёсак Лопазна, Красавічы і Рухава[150].

Заходняя мяжа воласці Дрокава, верагодна, праходзіла на захад ад вядомай у пачатку XV ст. дрокаўскай вёскі «Влазовичи» – сучасная аднайменная вёска Суражскага раёна Бранскай вобласці. На захад ад яе пачыналася тэрыторыя воласці горада Папова Гара, памежным сялом якой была вёска Панкевічы, якая існавала ў Гардзееўскай воласці яшчэ напрыканцы XIX ст. Яшчэ адной вёскай дрокаўскай воласці была вёска Вяжарэба. Яна размяшчалася насупраць вёскі воласці Паповай Гары «Субочевичи». Даволі сугучны сучасны тапонім «Субовічы» існуе і цяпер у Суражскім раёне Бранскай вобласці Расіі[151].

На поўначы Дрокаўская воласць межавала са слабазаселенымі раёнамі Лучыцкай воласці. Улічваючы слабую заселенасць гэтых зямель, якая назіралася яшчэ ў канцы XVII ст., можна меркаваць, што Лучыцкая воласць, размешчаная ў міжрэччы Беседзі і Сожа, поўнасцю пераходзіла са складу адной дзяржавы ў склад другой. Таму, на наш погляд, у вызначэнні паўднёвай мяжы Лучыцкай воласці XV ст. можна выкарыстоўваць пісьмовыя крыніцы XV–XVIII стст. Згодна з імі, мяжа паміж Дрокаўскай і Лучыцкай валасцямі ВКЛ праходзіла прыкладна ўздоўж сучаснай расійска-беларускай мяжы[152]. Бліжэйшая да Дрокава лучыцкая вёска пачатку XVI ст. – гэта «земля пустовская Белыніцкая на р. Бесетю»[153] – сучасная в. Бялынкавічы Касцюковіцкага раёна. Сама Лучыцкая воласць размяшчалася на тэрыторыі, якую зараз займаюць сучасныя Касцюковіцкі, Хоцімскі і частка Краснапольскага раёна Магілёўскай вобласці Беларусі.

Усходняя мяжа воласці горада Папова Гара, як было паказана вышей, межавала з Дрокаўскай воласцю. На поўначы воласць Паповай Гары межавала з Лучыцкай воласцю. Тут насупраць нелакалізаванай паповагорскай вёскі «Кузнецовичы» знаходзілася лучыцкае сяло «Мокрае» – сучасная аднайменная вёска Касцюковіцкага раёна. У воласці Паповай Гары на лучыцкім памежжы знаходзілася другое нелакалізаванае сяло «Рагозичи». Насупраць яго размяшчалася лучыцкая вёска Слабада[154] – верагодна, сучасная в. Кісялёўка Касцюковіцкага раёна, якая раней мела іншую назву – Слабодка. Далей на захад паўночная мяжа воласці Паповай гары з Лучыцкай воласцю, верагодна, таксама супадала з агульным кірункам сучаснай беларуска-расійскай мяжы і ў раёне р. Палуж выводзіла на мяжу Паповай Гары з Прапойскам.

---

[150] ДМАМЮ. – Т. 1. – С. 23, № 18, 19.

[151] Тамсама. – С. 67; Список населенных мест Черниговской губернии имеющих не менее 10 жителей по данным на 1892 год // Календарь Черниговской губернии на 1893 год. – Чернигов: Изд. Черниг. губ. стат. ком., 1892. – С. 97.

[152] Мяцельскі А. А. Лучыцкая воласць XV–XVIII стагоддзяў // Вес. НАН Беларусі. Сер. гуманітар. навук. – 2000. – № 4. – С. 59–66.

[153] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 30. – Арк. 155.

[154] ДМАМЮ. – Т. 1. – С. 67.

На прапойскай мяжы крыніца згадвае паповагорскае сяло «Кибилщичи» – верагодна, сучасная в. Кібіршчына Краснагорскага раёна Бранскай вобласці. Насупраць яе размяшчалася нелакалізаваная прапойская вёска «Локичы»[155]. На захадзе мяжа воласці горада Папова Гара з воласцю Чачэрска, верагодна, праходзіла ў міжрэччы Дарагоўшы і Колпіты. Потым яна выходзіла на р. Беседзь і ішла ёю да чачэрскага сяла Галодна. Адсюль яна паварочвала на ўсход і ішла ў бок р. Іпуць, а потым уздоўж левага берага р. Унеча выходзіла на мглінскі рубеж.

Воласць Крычава XIV–XV стст. уключала ў свой склад плынь Сожа ад р. Белая Натапа да р. Воўчас з прытокамі Лабжанкай, Задабрасцю, ніжнім цячэннем Астра. На поўначы воласць Крычава межавала з воласцю Мсціслава.

Крычаўска-мсціслаўскі рубеж намі рэканструяваны ў папярэдняй главе і першапачаткова ён падзяляецца рэкамі Белая і Чорная Натапа, а за Сожам паўночная мяжа Крычаўскай воласці ішла па ручаю Каменнаму, на р. Асцёр крычаўска-мсціслаўскае памежжа выходзіла, верагодна, у раёне сучаснай в. Пажога Шумяцкага раёна Смаленскай вобласці.

Крыніцы XVI–XVII стст. дазваляюць зрабіць схематычную рэканструкцыю мяжы Крычаўскай воласці і з заходняга боку. Абмежаванне Крычаўскага староства 1560 г. вядзе заходнюю мяжу Крычаўскай дзяржавы па р. Воўчас і па ёй падымаецца ўверх да Воўчага балота[156].

Лакалізацыя населеных пунктаў пачатку – сярэдзіны XVII ст. Магілёўскага староства дазваляе больш дакладна правесці крычаўска-магілёўскі рубеж. У жалаванай грамаце вялікага князя Жыгімонта Вазы маскоўскім выхадцам Хрыпуновыым-Дубельскім згадваюцца 7 сёл ў Магілёўскім старостве, якія вялікі князь перадаваў ім у хлебакармленне «да ласкі гаспадарскіе»[157]. З іх сёння лакалізуюцца ў Чэрыкаўскім раёне аднайменныя вёскі «Глінь», «Паходавічы», «Вудога», «Череков» – сучасны раёны цэнтр Чэрыкаў. З крыніц сярэдзіны XVII ст. вядома, што в. «Верхавцы», размешчаная на р. Воўчас, таксама была ў Магілёўскім старостве[158].

Крычаўскія вёскі, якія вядомы па крыніцах XV–XVII стст. і размешчаны на ўсход ад вёсак магілёўскай воласці, гэта «Волчасы», «земля пустовская Хотиловъская» (суч. в. Хацілавічы, 1546 г.)[159]. У 50-я гады XV ст. сярод зямельных раздач караля Казіміра згадваецца крычаўская вёска «Хорево»[160], пад назвай якой, магчыма, хаваецца сучасная в. Вохар Чэрыкаўскага раёна.

Картаграфаванне населеных пунктаў крычаўскай і магілёўскай валасцей XV–XVII стст. дазваляе меркаваць, што крычаўска-магілёўскі рубеж на поўдзень ад в. Вярхоўцы ішоў паміж р. Воўчас, на якой размешчаны вёскі кры-

---

[155] ДМАМЮ. – Т. 1. – С. 66–67.

[156] НГАБ. – Ф. 694. – Воп. 1. – Адз. зах. 1155. – Арк. 68.

[157] АЗР. – Т. 4. – С. 247, № 160.

[158] АЮЗР. – Т. 14. – С. 272, № 8-XVI.

[159] ДМАМЮ. – Т. 1. – С. 1; НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 30. – Арк. 154 адв.

[160] РИБ. – Т. 27. – Стб. 44.

чаўскай воласці, і ручаём Глінец, на якім размешчаны магілеўскія вёскі. Паўднёвай вёскай Крычаўскага староства XVI–XVIII стст. на правабярэжжы Сожа была в. «Зоры» – сучасная аднайменная вёска Чэрыкаўскага раёна. Верагодна, тут мяжа паварочвала на захад, дзе выходзіла на р. Турэя.

Такім чынам, пісьмовыя крыніцы XV–XVIII стст. дазваляюць узнавіць заходнюю мяжу акругі Крычава. Пэўнае супадзенне заходняй мяжы воласці XVI–XVIII стст. з канцэнтрацыяй курганных могільнікаў X–XIII стст., што адносяцца да Крычава, дазваляе сцвярджаць, што заходняя мяжа акругі Крычава, якая ўзнікла ў X–XIII стст., існавала да канца XVIII ст.

Паўднёвая мяжа воласці Крычава ішла па лясістым міжрэччы Сожа і Беседзі, прыкладна ўздоўж плыні р. Ельня, левага прытока Сожа[161], а ўсходняя ішла па р. Шумячка і выходзіла далей на р. Іпуць. Верагодна, недзе ў раёне сучаснай в. Корсікі, размешчанай на р. Іпуць, усходняя мяжа Крычаўскай воласці сустракалася з паўночнай мяжой Лучыцкай воласці і з заходняй мяжой воласці Прыкладні.

Пасля смерці Івана Юр'евіча ў 1483 г. і скасавання Мсціслаўскага княства яго землі былі падзелены на асобныя адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі, якія самастойна ўваходзілі ў склад Віленскага ваяводства і якімі кіравалі вялікакняскія намеснікі.

Адным з першых крычаўскіх намеснікаў з'яўляецца «Андрэй Ковач», альбо «Анъдрэйкавич»[162]. Ён згадваецца сярод зямельных раздач караля Казіміра. Прывілей аб пажалаванні Крычава Андрэю Ковачу (Андрейкавічу) пісаў «Панъ Нацъ». Хто з прадстаўнікоў гэтага роду пісаў указ, невядома, ды і сам род Нацаў, вядомы па крыніцах сярэдзіны XV ст., паступова губляецца ў гісторыі. У той жа час нельга выключыць, што прозвішча «Нац» з'яўляецца скажоным прозвішчам вядомага роду Пац. Сярод прадстаўнікоў гэтага знатнага роду напрыканцы XV ст. пасаду маршалка гаспадарскага, які мог пісаць прывілей, у 1480–1492 гг. займаў Юрый Пац[163]. Таму намеснікам у Крычаў Андрэй Ковач мог быць прызначаны паміж 1483 і 1492 гг.

Дрокаў таксама быў вылучаны ў асобную адміністрацыйна-гаспадарчую адзінку, пра што сведчыць наяўнасць там вялікакняскага намесніка напрыканцы XV ст. (1496 г.). У запісе прыходу вялікакняскага скарба чытаем: «наместник Дроковский дал от наместничества 4 копы грошей». Асобны намеснік кіраваў і Лучыцкай воласцю ў першай трэці XVI ст. (да 1529 г.)[164].

Па смерці князя Івана Юр'евіча ў дзяржаўны скарб былі забраны замак і воласць Папова Гара, а таксама двары Княжычы і Цяцерын, якія ў 1501 г. вялікі князь Аляксандр пажалаваў сваёй жонцы Алене[165]. Знікае са старонак

---

[161] Мяцельскі А. А. Воласць Крычава ў XII–XVIII стст.: тэрыторыя, адміністрацыйна-гаспадарчы падзел, паселішчы // ГАЗ. – Мінск, 2000. – № 15. – С. 81–92.

[162] ДМАМЮ. – Т. 1. – С. 54–14; РИБ. – Т. 10. – Стб. 109.

[163] Urzędnicy centralni i dostojnicy. – S. 206.

[164] Любавский М. К. Областное деление и местное управление... – С. 136. Приложения. Документ № 46.

[165] Skarbiec dyplomatów. – S. 258, № 2136.

пісьмовых крыніц воласць Прыкладні, якая зноў з'яўляецца ў крыніцах толькі ў пачатку XVI ст., але ўжо ў складзе Рускай дзяржавы.

Ад Мсціслава ў гэты ж час была адарвана і воласць «Малахоўскі пуць». Пра гэта паведамляе запіс у 3-й кнізе Літоўскай метрыкі, што адносіцца да зямельных раздач караля Казіміра: «... и тые люди его милость опять привернул къ Молохве по старому: а тыхъ волостеи Смоленскихъ никому не держати, нижьли бояромъ Смоленскимъ же»[166]. Больш дакладную дату вяртання Малахоўскай воласці ў склад Смаленскага намесніцтва дазваляе назваць далейшае ўдакладненне; «Молоховские люди. Велели есмо тымъ людемъ къ Смоленску тягнути подавному. Сам карол: п(а)н Сенко правил и вси панове. Индикт 11»[167]. Удакладненне, што прывілей падпісаў кароль Казімір, а не вялікі князь, дазваляе сцвярджаць, што вяртанне Малохвы пад уладу Смаленска адбылося не раней за 1447 г., калі вялікі князь Казімір быў абраны на польскі каралеўскі трон. Адзінаццаты індыкт у гады праўлення караля Казіміра прыпадае на 1458–1459, 1472–1473 і 1486–1487 гг. Менавіта ў гэтыя гады магла адбыцца перадача зямель са складу Мсціслаўскага княства ў склад Смаленскага намесніцтва. На наш погляд, хутчэй за ўсё, вяртанне Малахоўскай воласці пад уладу Смаленска адбылося ў 1486–1487 гг., пасля смерці князя Івана Юр'евіча, і кароль сам распараджаўся былымі мсціслаўскімі валасцямі. Магчыма, тады стала самастойнай і воласць Хаславічы, якая самастойна фігуруе ў якасці памежнай воласці ў замірэннях з Рускім царствам XVI – пачатку XVII ст. Яе большая частка, верагодна, увайшла ў склад каралеўскіх уладанняў, якія на працягу XVII–XVIII стст. увесь час здаваліся ў дзяржанне.

У выніку гэтых перамен Мсціслаў захаваў пад сваёю юрысдыкцыяй толькі тыя землі, якія прылягалі да самога горада. Яго воласць на поўдні абмяжоўвалася плынню рэк Чорная і Белая Натапа, а на ўсход ад Сожа яна, магчыма, не заходзіла. На захадзе мяжа воласці Мсціслава ішла ўздоўж р. Проня, потым зварочвала ў яе левы прыток р. Быстрая, а адтуль ў левы прыток Быстрай р. Рамяствянка. З Рамяствянкі мяжа Мсціслаўскай воласці на поўнач ад мсціслаўскай вёскі Беразетня ішла ў кірунку р. Гародня, якая стала паўночна-заходняй мяжой Мсціслаўскай воласці. Паўночная мяжа воласці Мсціслава пачатку XVI ст. дакладна не лакалізуецца. Верагодна, яна, як і ў XII–XIII стст., маркіруецца ўздоўж рэчак Гародня, Лютая, Бярэзіна.

Такім чынам, у апошняй чвэрці XV ст. воласць Мсціслава скарацілася да тых памераў, якія яна мела ў пачатку свайго фарміравання ў сярэдзіне XII ст.

3.3. Мсціслаўскае княства першай чвэрці XVI ст.

Мсціслаўскае княства ў якасці самастойнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі Вялікага Княства Літоўскага з'явілася зноў напрыканцы XV ст. Яго адраджэнню паспрыяў шлюб другой дачкі князя Івана Юр'евіча княгіні Ульяны і князя Міхаіла Іванавіча Жаслаўскага, што адбыўся ў канцы 1498 г.

---

[166] АЗР. – Т. 1. – С. 361, № 213.

[167] ДМАМЮ. – Т. 1. – С. 24, № 13.

ці ў самым пачатку 1499 г. Старэйшая ж дачка Івана Юр'евіча Настасся каля 1496 г. узяла шлюб са слуцкім князем Сямёнам Міхайлавічам Алелькавічам і з'ехала ў Слуцк.

Датаваць шлюб княгіні Ульяны канцом 1498 г. ці самым пачаткам 1499 г. дазваляе той факт, што ўжо 20 студзеня 1499 г. князь Міхаіл Іванавіч Жаслаўскі надаў багамольцу радамльскаму Дыянісію царкву Св. Багародзіцы, і пры гэтым ён названы князем мсціслаўскім[168].

19 сакавіка 1499 г. вялікі князь Аляксандр за зычлівую службу каралю Казіміру і сабе надаў князю Міхаілу Іванавічу гарады Мсціслаў і Мглін з усімі прылеглымі да іх уладаннямі «у-въ отъчину, вечъно, на веки вечныи», ён даў іх не толкі аднаму князю, але «и его кн(е)гини»[169]. З гэтага прывілея відаць, што наданні Міхаіл Іванавіч атрымаў не толькі ў якасці шлюбнага пасагу, але і з улікам аказаных ім паслуг каралям і вялікім князям. Менавіта дзякуючы гэтаму Міхаіл Іванавіч здолеў захаваць за сабой Мсціслаўскае княства і пасля смерці сваёй жонкі з роду Мсціслаўскіх.

Гэтым жа прывілеем Міхаілу Іванавічу дазвалялася карыстацца усёй наданай маёмасцю «подлугъ того какъ тыи замъки деръжал князъ Юрей Лынкгеневеневич а потомъ сынъ его, князъ Иванъ»[170]. Князь Міхаіл Іванавіч Жаслаўскі атрымаў тытул князя Мсціслаўскага і распачаў новую лінію ў гісторыі роду ўдзельных князёў Мсціслаўскіх.

Але нанова адроджанае княства было па памерах значна меншым за папярэдняе. Згодна з граматай вялікага князя Аляксандра, князю Міхаілу Іванавічу Жаслаўскаму надаваліся толькі гарады Мсціслаў і Мглін (мал. 29) з усімі прылеглымі да іх дварцамі «у-въ отъчину, вечъно, на веки вечныи» – «Красное», «Расна», «Добрае», «Людагошъ», «Парадино», «Селище», «Будогошь», «Колодязи» – сугучныя ім тапонімы і сёння сустракаюцца ў Мсціслаўскім і Дрыбінскім раёнах Магілёўскай вобласці і ў Манастыршчынскім раёне Смаленскай вобласці. Акрамя таго, у гэтай жа крыніцы згадваецца двор «Михайловское»[171], які зараз даволі складана дакладна лакалізаваць, таму што сугучныя назве тапонімы існуюць як у Мсціслаўскім, так і Хіславіцкім раёне Смаленскай вобласці.

Міхайлаўск яшчэ ў пачатку XX ст. існаваў паміж в. Шамаўшчына і самім горадам. Ва ўсякім выпадку, тут мы яго бачым на картах 20–30-х гадоў XX ст., і яго месцаразмяшчэнне прыкладна адпавядае размяшчэнню сяла Міхайлаўскага, якое існавала ў «Сохонъне» і якое згадваецца ў крыніцы 1546 г.[172] У канцы XVI ст. пры «дварцы Міхайлаўскім» было тры службы сяльца Рожава[173], якое таксама сёння лакалізуецца ў гэтым жа рэгіёне. А другі двор Міхайлаўск

---

[168] НГАБ. – Ф. 1729. – Воп. 1. – Адз. зах. 33. – Арк. 360.

[169] РИБ. – Т. 10. – Стб. 783–785.

[170] Тамсама. – Стб. 764.

[171] Тамсама. – Стб. 783–785.

[172] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 30. – Арк. 185.

[173] Тамсама. – Адз. зах. 77. – Арк. 327.



◪ – цэнтр воласці Мсціслаўскага княства; ◉ – цэнтр валасцей-войтаўстваў; ● – горад;
⬚ – землі, якія адышлі ад Мсціслаўскага княства паміж 1527 і 1537 гг.;
– – – – – – граніца ВКЛ, усталяваная ў 1503 г.;
▪▪▪▪▪▪▪▪▪▪▪▪ – граніца валасцей Мсціслаўскага княства

Мал. 29. Мсціслаўскае княства ў пачатку XVI ст.

існаваў ў сярэдзіне XVI ст.[174] у раёне сучасных вёсак Лызкі і Міхайлаўская Буда Хіславіцкага раёна. Акрамя таго, на тэрыторыі Мсціслаўскага раёна і зараз існуе в. Міхайлава, якая таксама можа прэтэндаваць на лакалізацыю летапіснага двара, таму што размешчаны там курганны могільнік сведчыць пра даволі ранняе засяленне яе тэрыторыі. Канчаткова вызначыць гэта пытанне магчыма толькі пасля археалагічных даследаванняў.

[174] Материалы по истории Могилевской епархии // МЕВ. – 1890. – № 20–21. – С. 208; Там-сама. – № 25. – Часть неофициальная. – С. 308.

Мал. 30. Бітва пад Мсціславам 4 лістапада 1501 г. Мініяцюра з летапісу

Пачатак валодання Мсціслаўскім княствам Міхаілам Іванавічам супаў з новай вайной паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Вялікім Княствам Маскоўскім. Прычым баявыя дзеянні паміж дзвюма дзяржавамі на гэты раз наблізіліся да Пасожжа, і сцены Мсціслава апаліў гарачы подых вайны. Пасля няўдалых дзеянняў вясной 1501 г. пад Смаленскам рускія войскі пайшлі на Мсціслаў. Але і тут іх чакала параза. Яны былі разбіты войскамі І. Саламярэцкага[175].

Восенню (4 лістапада 1501 г.) рускія войскі пад кіраўніцтвам князя Сямёна Іванавіча Мажайскага, ваявод князёў Васіля Іванавіча Шамяціча, Аляксандра Уладзіміравіча Растоўскага, ваяводы Рыгора Фёдаравіча Давыдовіча зноў падышлі пад Мсціслаў. Ім насустрач выйшаў мсціслаўскі князь Міхаіл Іванавіч якому на дапамогу прыйшоў ваявода Юрый Дашковіч з «двором великого князя заставаю и з жолнеры». Бітва пад сценамі Мсціслава закончылася перамогай рускіх войск, а князь Міхаіл Іванавіч з Юрыем Дашковічам ледзь паспелі ўскочыць у горад (мал. 30). Згодна з рускімі паведамленнямі, вялікакняскае войска страціла ў гэтай бітве 7000 чалавек, але гэта, безумоўна, перабольшанне.

Гэта бітва, верагодна, адбылася на левым беразе р. Віхра, каля сучаснага Зарачанскага маста, там, дзе неаднаразова знаходзілі шлемы, якія храналагічна датуюцца канцом XV – пачаткам XVI ст.[176]

Арганізаваўшы надзейную абарону горада, князь Міхаіл Іванавіч у рэшце рэшт вымусіў маскоўскія войскі сысці. Але перад гэтым яны спалілі гарадскія пасады і «много злого около города вчинивши»[177]. Страты, панесеныя Мсціславам падчас гэай абароны, былі, верагодна, вельмі значнымі, бо нават праз тры гады (1504 г.) князь Міхаіл Іванавіч скардзіўся каралю

[175] Ластовский Г. Смоленск и Великое княжество Литовское в XIII–XVI веках // Край Смоленский. – 1993. – № 7. – С. 85.

[176] Бохан Ю. М. Мсціслаўская салада і верагоднасць ужывання падобных шлемаў у Вялікім Княстве Літоўскім // ГАЗ. – Мінск, 1996. – № 8. – С. 33–39; Яго ж. Новыя знаходкі сярэдневяковых шлемаў у Мсціславе // БГЧ. – 2006. – № 12. – С. 49–53.

[177] ПСРЛ. – Т. 26. Вологодско-Пермская летопись. – М.; Л.: Изд-во Акад. наук СССР, 1959. – С. 294; ПСРЛ. – Т. 32. – С. 168; Разрядная книга 1475–1606 гг. – М.: Ин-т истории СССР, 1977. – Т. 1. – Ч. 1. – С. 76–77.

Аляксандру, «штожъ тотъ замокъ его Мстиславль скажонъ от москвычъ и от татар»[178].

У выніку вайны 1500–1503 гг. Вялікае Княства Літоўскае страціла значную тэрыторыю. Рускія войскі захапілі і землі, што раней уваходзілі ў склад Мсціслаўскага княства – Дрокаў, Папову Гару, Мглін.

Па замірэнні, заключаным у 1503 г., Мглін з воласцю адышоў да Масквы, замест яго вялікі князь Аляксандр надаў у дзяржанне князю Міхаілу Іванавічу воласць Спятляне ў наваколлях Крэва: «до тыхъ же часовъ, поки тотъ замокъ Мглинъ зъ рук неприятельских вземши и имъ подадимъ»[179]. Такім чынам, не паспеўшы нанова адрадзіцца, Мсціслаўскае княства скараціласа да воласці аднаго Мсціслава.

Вайна 1500–1503 гг. распачала серыю войнаў, якія ў пачатку XVI ст. палыхалі на ўсходзе Вялікага Княства Літоўскага. Пасля чатырохгадовага перамір'я ў 1507 г. ўспыхнула новая вайна паміж ВКЛ і Масквой. Увосень 1507 г. (14 верасня) рускія войскі пад кіраўніцтвам ваявод князёў В. Д. Холмскага і Якава Захар'іча былі накіраваны пад Мсціслаў. У выніку гэтага паходу ў горадзе былі спалены пасады, але саму крэпасць рускія войскі узяць не змаглі[180]. Польскія хронікі XVI ст. адносна гэтага паходу на Мсціслаў дапаўняюць, што рускія войскі, пачуўшы пра прыбліжэнне да горада дапамогі, самі сышлі ў Масковію, а некаторыя звязваюць маскоўскі адыход з вялікімі маразамі[181].

Ваенныя дзеянні 1508 г. таксама не прынеслі ніякіх перамог Маскве. Як паказалі даследаванні, летапісныя паведамленні пра тое, што падчас мяцяжу М. Глінскага на бок апошняга перайшоў і мсціслаўскі князь Міхаіл Іванавіч, не маюць пад сабой ніякіх падстаў. Князь Міхаіл Іванавіч у гэтай барацьбе застаўся верным сваёй дзяржаве[182].

Падчас вайны 1512–1522 гг. Мсціслаў некалькі разоў быў на вастрыі ўдараў маскоўскіх войск. Так, ужо ў 1513 г. вялікі князь Жыгімонт I Стары ў сваім лісце лівонскаму магістру паведамляў, што вялікі князь маскоўскі асадзіў Смаленск і паслаў сваіх ваявод пад Оршу, Полацк, Мсціслаў «... желая огнём и мечом опустошить эти районы и завладеть названными со всеми их землями...»[183] Пра дзеянні рускіх ваявод пад Мсціславам у гэты год паведамляюць і рускія летапісы[184].

У 1514 г., пасля таго як маскоўскія войскі захапілі Смаленск, некаторая іх частка была накіравана ў бок Мсціслава. І калі яшчэ 26 ліпеня 1514 г. вялікі

---

[178] Литовская метрика. Книга записей № 25 (1387–1546) / parenge D. Antanavićus, A. Baliulis. – Vilnius: Mokslo ir enciklopediju leidybos institutes, 1998. – С. 92, № 26.

[179] АЗР. – Т. 1. – С. 353–354, № 205.

[180] ПСРЛ. – Т. 24. – С. 216; Тамсама. – Т. 28. – С. 341.

[181] Кром М. М. Меж Русью и Литвой. Западно-русские земли в системе русско-литовских отношений конца XV – первой трети XVI в. – М.: Археографический центр, 1995. – С. 186.

[182] Кром М. М. Меж Русью и Литвой. – С. 125.

[183] Русско-ливонские акты собранные К. Е. Напьерским. – СПб.: Археограф. комис., 1868. – С. 278, № 317.

[184] Кром М. М. Меж Русью и Литвой. – С. 189.

князь Жыгімонт паведамляў у сваім лісце пра перамогу князя мсціслаўскага над трохтысячным аддзелам «московитов», які пагражаў яго гораду[185], то пасланыя 7 жніўня ваяводы кн. М. Д. Шчаняцеў і кн. І. М. Варатынскі, падышоўшы з «многими людьми» да Мсціслава, не сустрэлі ніякага супраціўлення. Наадварот, князь Міхаіл Іванавіч сустрэў вялікакняскіх ваявод і «бил им челом, чтобы государь...взял его к себе на службу»[186].

Такія паводзіны Міхаіла Іванавіча былі выкліканы тым, што пасля падзення Смаленска, які быў галоўнай ваеннай базай ВКЛ на ўсходзе краіны, вызваліліся асноўныя сілы рускай арміі. Падняпроўскія раёны ВКЛ засталіся без надзейнага прыкрыцця. Супрацьстаяць усёй моцы рускага войска князь Міхаіл Іванавіч не мог яшчэ і таму, што не жадаючы бессэнсоўнага праліцця крыві, «... бояре его и люди мстиславские ему к обороне помочни быти не хотели»[187].

Аднак пад уладай Масквы Мсціслаў заставаўся нядоўга. 8 верасня пад Оршай князь Канстанцін Астрожскі разграміў рускія войскі, і літоўскія гарады ізноў пацягнуліся адзін за другім у ВКЛ. Ужо да снежня 1514 г. Мсціслаў, Крычаў і Дуброўна «отступиша к королю»[188]. Ва ўсякім выпадку, 23 лістапада з Вільні ў суседні з Мсціславам Крычаў былі адпраўлены дзежкі пораху вагой па «полтрети каменя» і 10 гакаўніц. Прычым крыніца паведамляе, што ў Вільню гакаўніцы былі дастаўлены з Кракава[189], таму можна меркаваць, што гэта было новае ўзбраенне.

Пасля кампаніі 1514 г. вайна млява цягнулася да 1522 г. Новы паход пад Мсціслаў адзначаны толькі пад 1515 г.[190], але звесткі аб ім вельмі сціплыя і нельга вызначыць, чым ён скончыўся.

На працягу ўсёй вайны з Масквой 1512–1522 гг. вялікі князь надаваў значную ўвагу стану мсціслаўскага замка. Так, каля 1517 г. на мсціслаўскі замак было выдзелена «три тарасницы: две одно в ложах без колес, а третье в ложи с колесы и з ланцухом, и два сердечники железные, и по мотыце и по лопате железной, а три куез, а дожки железная, а папери на мещки, што мел, а пороху две бочки полных, а в третьей немного..., а олова пять пудов с четвертью мстиславское ваги»[191]. Крыніцы адзначаюць і мужную дзейнасць самога князя

---

[185] Кром М. М. Меж Русью и Литвой. – С. 194.

[186] Разрядная книга 1475–1606 гг. – Т. 1. – Ч. 1. – С. 144; ПСРЛ. – Т. 26. – С. 304.

[187] Акты, относящиеся к истории Западной России собранные и изданные Археографической комиссией. В 5 т. – СПб., 1846–1853. – Т. 2. 1596–1547 гг. – СПБ.: Тип. 2-го отделения Е. И. В. Канцелярии, 1848. – С. 117, № 92; Литовская метрика. Книза записей № 9 (1511–1518) / parenge K. Pietkiewicz. – Vilnius : Źara, 2002. – С. 156.

[188] ПСРЛ. – Т. 11–12. – С. 23; Тамсама. – Т. 28. – С. 350.

[189] Бершадский С. А. Русско-еврейский архив. Документы и материалы для истории евреев в России. – Т. 3. Документы к истории польских и еврейских евреев (1364–1569). – СПб.: Тип. И. Лурье и К°, 1903. – С. 107–108.

[190] Разрядная книга 1475–1606 гг. – Т. 1. – Ч. 1. – С. 149.

[191] Русская историческая библиотека издаваемая Императорской археографической комиссией. – Т. 20. – Литовская метрика. Т. 1. – СПб.: Сенатская тип., 1903. – Стб. 1154–1155.

Міхаіла Іванавіча ў гэты час па абароне краіны ад захопнікаў[192]. Застаючыся памежнай крэпасцю, горад і ў мірныя часы прыцягваў да сабе ўвагу вялікага князя. Так, у 1523 г. воласць Мсціслава, згодна з вялікакняскім загадам, абавязана была выдзеліць 1200 злотых на ўтрыманне ў замку 600 драбаў[193].

Пасля завяршэння вайны 1512–1522 г. былі канчаткова сфарміраваны і межы Мсціслаўскага княства, усходняя і паўночная мяжа якога адначасова сталі дзяржаўнай мяжой паміж ВКЛ і Маскоўскім княствам 1512–1522 гг.

Размежаванне 1522 г. апісвае адрэзак дзяржаўнай мяжы, якая ішла на поўдзень ад Дняпра і супадала з паўночнай мяжой Мсціслаўскага княства: «... рекою Мереею вверх меж Пречистые Взрубы и Зверовичи в Иваку реку, а из Иваки на Еленский рубеж, да въ Городню, а Городнею въ Вехру въ Чёрной Мохъ, а из Вехры въ Прудилку, а изъ Прудилку въ Железницу, а Железницою подъ Дудено да въ Вехру, а изъ Вехры в Лютую Воду, а изъ Лютой Воды въ Вылино а изъ Вылина на Сожъ, а Сожомъ на низъ въ Березыню, а Березынёю вверхъ сухомъ промеж сёл Почина и Гладковичъ, по Холмомъ, а оттол к Пулневу»[194]. Гэта апісанне даволі дакладна лакалізуецца на сучаснай карце і адпавядае адміністрацыйнай мяжы XIX – пачатку XX ст. паміж Смаленскай і Магілёўскай губернямі Расійскай імперыі.

Па р. Мярэя і зараз праходзіць расійска-беларуская мяжа. Згаданыя Звяровічы – гэта сучасная аднайменная вёска Краснянскага раёна Смаленскай вобласці. Рака Івака – гэта сучасная р. Івата, правы прыток р. Мярэі. З яе мяжа ішла на «Еленский рубеж», які праходзіў па р. Еленка – правым прытоку р. Лупа[195]. Усе гэтыя гідронімы сёння знаходзяцца на тэрыторыі Краснянскага раёна Смаленскай вобласці. З р. Еленкі мяжа ішла на р. Гародню, якою спускалася ў р. Віхра. Падняўшыся ўверх па р. Віхра, мяжа вышэй сучаснай вёскі Туфля Манастыршчынскага раёна Смаленскай вобласці зварочвала ў бок р. Жалезніца. Апошняя, мінуючы сучасную в. Дудзіна Манастыршчынскага раёна – згаданае «Дудено», ізноў выводзіла на р. Віхра. Амаль ў гэтым жа месцы ў р. Віхра ўпадае р. Лютая – згаданая рака «Лютая Вада».

З Лютай Вады мяжа ішла сухім шляхам ў бок нейкага «Вылина». Адтуль мяжа выходзіла на р. Сож, з якога паварочвала ў яго левы прыток р. Бярэзіна, па якой і падымалася ўверх. З вярхоўяў р. Бярэзіна мяжа ішла ў напрамку р. Асцёр – «вверхъ сухомъ промеж сёл Почина и Гладковичъ, по Холмомъ, а оттол к Пулневу». Згодна з апісаннем мяжы, яе кірунак праходзіў паміж сёламі «Гладковичи» і «Почина». У апошнім, верагодна, трэба бачыць сучасную в. Пачынічы Шумяцкага раёна.

Далей на поўдзень пачынаўся рослаўска-мсціслаўскі рубеж, які першакрыніца апісвае такім чынам: «промежи Словнева да Шибнева к Гневкову Доброю

---

[192] Зимин А. А. Россия на пороге нового времени (Очерки политической истории России первой трети XVI в.). – М.: Мысль, 1972. – С. 200.

[193] Ткачев М. А. Замки Беларуси. – Минск: Беларусь, 2002. – С. 88.

[194] Кашпровский Е. И. Борьба Василия II и Сигизмунда I Казимировича. – С. 263.

[195] Маштаков П. Л. Список рек Днепровского бассейна. – С. 33.

рекою в Водонос, от Водоноса Доброю рекою у Востръ через Великий Бор у речку Шумячу...»[196].

Першую частку гэтага адрэзка дзяржаўнай мяжы (1522 г.) мы апісалі, калі разглядалі мяжу XV ст. У гэтым апісанні не лакалізуецца толькі «Великий Бор», з якога мяжа ішла на р. Шумячку, дзе пачынаўся крычаўска-рослаўскі адрэзак дзяржаўнай мяжы. А паўночную мяжу воласці Крычава, якая стала на гэты час паўднёвай мяжой Мсціслаўскага княства, мы вызначылі вышэй. Заходняя мяжа Мсціслаўскага княства не пацярпела ніякіх пераменаў і заставалася стабільнай. Яна, як і раней ішла ў асноўным па р. Проня і яе левым прытоку р. Быстрая, а адтуль ў р. Рамяствянка і далей паўз в. Беразетня выходзіла на р. Гародня.

У вызначаных межах Мсціслаўскае княства заставалася да свайго зліквідавання ў 1527 г. У гэтых жа межах заставалася і створаная на яго падстваe Мсціслаўская воласць (1527–1564 гг.).

Захаваліся сціплыя паведамленні крыніц пачатку XVI ст., якія дазваляюць вызначыць некаторыя адміністрацыйна-гаспадарчыя адзінкі, што існавалі на тэрыторыі Мсціслаўскага княства і воласці першай паловы XVI ст. Яны ў крыніцах праходзяць пад назвай воласць, хаця ў рэальнасці адпавядалі больш познім войтаўствам.

Адной з такой адзінак была воласць Хіславічы. Пра тое, што Хіславічы былі цэнтрам пэўнай адміністрацынай адзінкі ўжо ў самым пачатку XVI ст., сведчыць перамірная грамата 1522 г. паміж ВКЛ і Вялікім Княствам Маскоўскім. У ёй сярод літоўскіх памежных валасцей, побач з валасцямі Крычава і Мсціслава згадваецца «волость Хотславичи»[197], у якой трэба бачыць сучасны гарадскі пасёлак Хіславічы Смаленскай вобласці. Самастойная памежная воласць «Хотславичи», якая існавала побач з Мсціславам і Крычавам, згадваецца і ва ўсіх іншых перамірных граматах XVI – пачатку XVII ст. паміж ВКЛ і Рускім царствам[198].

Воласць Хіславічы у пісьмовых крыніцах, як адзначалася вышэй, упершыню згадваецца сярод зямельных раздач 1450 г. караля Казіміра. У крыніцы адзначаецца, што кароль Казімір пацвярджае правы князя Андрэя Порхаўскага на валоданне «Хацлавічамі», якія ён трымаў яшчэ пры князі Лынгвені[199].

---

[196] ДМАМЮ. – Т. 1. – С. 67.

[197] АЗР. – Т. 2. – С. 148, № 120.

[198] СИРИО. – Т. 59. Памятники дипломатических сношений Московского государства с Польско-Литовским по высочайшему повелению изданные Императорским Русским историческим обществом. – Т. 2. (1533–1560). – М., 1887. – С. 74, 309; СИРИО. – Т. 35. – С. 486, 725; Тамсама. – Т. 137. Памятники дипломатических сношений древней России с державами иностранными по высочайшему повелению изданные Императорским Русским историческим обществом. Памятники дипломатических сношений Московского государства с Польско-Литовским государством. – Т. IV. (1598–1608). – М., 1912. – С. 61, 68, 702, 712.

[199] Wolff J. Kniazowie litewsko-ruscy od konca czternastego wieku. – S. 392; ДМАМЮ. – Т. 1. – С. 23.

Археалагічныя помнікі сучасных Хіславічаў дазваляюць выказаць меркаванне, што населены пункт на гэтым месцы існаваў значна раней. У горадзе ёсць невялікае гарадзішча (мал. 31), на якім сустракаюцца матэрыялы «старажытнарускага часу», а раней на ўскрайку пасёлка адзначалі і наяўнасць курганнага могільніка[200]. Усё гэта сведчыць аб наяўнасці тут паселішча як мінімум з XII–XIII стст., аднак археалагічныя даследаванні ў Хіславічах пакуль не праводзіліся. Тым болей немагчыма вызначыць памеры воласці Хіславічаў XV–XVI стст. пры сённяшнім стане крыніц. Адзінае, што вынікае з крыніц XVI–XVIII стст., – вёскі Хіславіцкай воласці і староства не выходзілі на захад ад міжрэчча Лызкі і Лызы, правых прытокаў р. Сож. Магчыма, тут і праходзіла заходняя мяжа воласці Хіславічаў.



Мал. 31. План гарадзішча ў г. п. Хіславічы

Аднак улічваючы, што род князёў Порхаўскіх вядзе свае паходжанне ад смаленскіх вялікіх князёў – Івана Святаславіча, можна меркаваць, што яму быў вылучаны не толькі сам населены пункт, а ўся даволі значная па памерах воласць, якая да яго адносілася.

Цэнтрам пэўнай воласці было сяло Заселле. Засельская воласць згадваецца ў жалаванай грамаце мсціслаўскага князя Міхаіла Іванавіча ад 9 жніўня 1505 г. Пустынскаму манастыру на мядовую і грашовую даніны. У гэтай грамаце гаворыца, што на манастыр штогод «старец Засельской воласти» павінен даваць 40 грошай[201].

Цэнтр гэтай воласці – сяло Заселле, верагодна, трэба бачыць у сучаснай вёсцы Новае Заселле Балахонаўскага сельсавета Шумяцкага раёна Смаленскай вобласці, дзе ёсць цэлы комплекс недаследаванных археалагічных помнікаў; невялікае гарадзішча, на якім сустракаюцца матэрыялы «старажытнарускага часу», два неўмацаваных паселішчы XIII–XV стст. памерамі па 1,5 га, два курганных могільнікі[202]. Але, як і ў выпадку з Хіславічамі, памеры Засельскай воласці пачатку XVI ст. вызначыць немагчыма, а ў больш позні час яе тэрыторыя была падзелена паміж валасцямі Крычава і Мсціслава.

---

[200] Шмидт Е. А. Древнерусские археологические памятники Смоленской области. – Ч. 2. – С. 141.

[201] АЗР. – Т. 1. – С. 365, № 217.

[202] Шмидт Е. А. Древнерусские археологические памятники Смоленской области. – Ч. 2. – С. 149.

Але найбольш значнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай і гаспадарчай адзінкай Мсціслаўскага княства і воласці першай паловы XVI ст. была Радамля з прымыкаючай да яе воласцю.

Звесткі пра існаванне Радамлянскай воласці ў Мсціслаўскім княстве мы ўпершыню сустракаем у лісце вялікага князя Жыгімонта Старога да мсціслаўскага князя Міхаіла Іванавіча ад 3 жніўня 1525 г. Разбіраючы спрэчку паміж князем Міхаілам і яго сынам Фёдарам, вялікі князь пагадзіўся з прапановай князя Міхаіла аддаць сыну замак Радамля з умовай, што «ловы и дани медовые с волости Радамлянской» павінны дзяліцца папалам паміж ім і Фёдарам. Замак Радамля з воласцю перадаваўся Фёдару Міхайлавічу да таго часу, пакуль яму не будзе знойдзена іншая воласць[203].

Воласць Радамлянская ўскосна згадваецца і ў больш позні час. Так, 19 жніўня 1528 г. вялікі князь Жыгімонт даў замкі Мсціслаў і Радамль «со всими дворцы и фольварки и волостьми...» ў дзяржанне берасцейскаму старасцічу Яну Юр'евічу Іллінічу[204].

Захаваліся крыніцы XVI ст., якія дазваляюць прыблізна акрэсліць межы Радамлянскай воласці. У «повет радомский» ў 1560 г. уваходзіў «двор Расенский»[205] – сучасная аднайменная вёска Расна Дрыбінскага раёна. Да Расенскага двара ў 1574 г. належалі службы «Яковлевская», «Сопроновская», «Радковская»[206]. У 1520 г. князь Міхаіл Іванавіч надаў Андрэю Стрыжэвічу «село в Дрясне на имя Кожановского». Гэты прывілей быў пацверджаны ў 1596 г. каралём Жыгімонтам Вазай унукам Андрэя Стрыжэвіча Івану і Андрэю Цімафеевічам[207].

У Радамлянскую воласць у 1560 г. уваходзілі вёскі Ельнікі і Заполле. Апошняя – гэта сучасная аднайменная вёска Дрыбінскага раёна[208]. Пры замку «Радомском» у 1596 г. знаходзілася і в. Жаліўля[209] – сучасная вёска Жаліўе Чавускага раёна.

Некалькі больш асвятляюць межы воласці Радамлі крыніцы XVII ст. На правым беразе р. Проня ў Мсціслаўскім ваяводстве, «пад Радамляй», крыніцы XVII ст. згадваюць вёскі Скварск, Жаліўе, Барышоўка, Русінаўка[210] якія, безумоўна, уваходзілі ў воласць Радамлі. На поўначы ў «дзяржаву Радамльскую» уваходзіла в. Вярба[211]. Мяркуючы па крыніцах XVI–XVII стст., воласць Радамлі была невялікай і ахоплівала плынь р. Проня ў бліжэйшым наваколлі замка.

---

[203] Археографический сборник документов относящихся к истории Северо-Западной Руси (далей АСДОИСЗР), издаваемый при управлении Виленского учебного округа. В 14 т. – Вильна: Печатня губ. прав., 1867–1904. – Т. 1. – 1867. – С. 162–163, № 136.

[204] АЗР. – Т. 1. – С. 189–190, № 155.

[205] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 37. – Арк. 487 адв.–488.

[206] Тамсама. – Адз. зах. 70. – Арк. 80 адв.–81 адв.

[207] Тамсама. – Адз. зах. 83. – Арк. 22–22 адв.

[208] Тамсама. – Адз. зах. 66. – Арк. 27 адв.–28 адв.

[209] Тамсама. – Адз. зах. 83. – Арк. 26 адв.–27.

[210] АЮЗР. – Т. 14. – С. 289, № 9-XVI.

[211] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 96. – Арк. 133–133 адв.

Такім чынам, у адміністрацыйна-гаспадарчым плане Мсціслаўскае княства першай чвэрці XVI ст. падзялялася на воласць-войтаўства самаго Мсціслава і воласці Радамля, Заселле і, верагодна, Хіславічы.

Сумеснае жыццё князя Міхаіла Іванавіча і Ульяны Іванаўны не было доўгім. Верагодна, даволі хутка княгіня Ульяна памерла, бо ўжо ў 1507 г. мсціслаўскі князь Міхаіл Іванавіч меў новую жонку – Васілісу, якая мела і другое імя – Ульяна. Яна была дачкой князя Івана Юр'евіча Гальшанскага-Дубравецкага і княжны Ганны Чартарыйскай[212].

Пасля смерці Ульяны Іванаўны старэйшая сястра нябожчыцы, другая дачка князя Івана Юр'евіча Анастасія пачала прэтэндаваць на Мсціслаў.

Хаця кароль і вялікі князь Жыгімонт у 1507 г. пацвердзіў былыя наданні Міхаілу Іванавічу на Мсціслаў і Мглін[213], Анастасія Іванаўна ў гэтым жа годзе звярнулася да Жыгімонта з просьбай пра вяртанне ёй Мсціслава і іншых спадчынных маёмасцей. Аднак кароль адмовіўся разглядаць гэтую справу на той падставе, што ў той час у Вільні не было самога князя Міхаіла Іванавіча[214]. Але Анастасія Іванаўна і надалей не пакідала надзеі адсудзіць у Міхаіла Іванавіча не толькі Мсціслаў, але і ўсю «воласць повету Мстиславского». Захавалася некалькі скаргаў, датуемых 1518–1522 гг., у якіх яна ад свайго імя і ад імя свайго сына князя Юрыя, а потым і сам князь Юрый Сямёнавіч аспрэчвалі перад каралём правы Міхаіла Іванавіча на валоданне Мсціславам і яго воласцю. Верагодна, пэўную справядлівасць прэтэнзій княгіні Анастасіі Іванаўны і яе сына Юрыя на Мсціслаў прызнаваў і кароль, але не жадаючы крыўдзіць свайго вернага слугу, якім быў князь Міхаіл Іванавіч, ён ўвесь час адкладаў канчатковае вырашэнне гэтага пытання да лепшых часоў.

Сітуацыя, верагодна, складвалася не зусім добра для Міхаіла Іванавіча, бо хаця на Віленскім сейме 1522 г. гэта пытанне не было канчаткова разгледжана, кароль усё ж такі загадаў не выдаваць яму з канцылярыі ўжо выпісаны на яго імя новы пацвярджальны прывілей[215]. Але і праз два гады (1524 г.) спрэчкі за Мсціслаў паміж князем Міхаілам Іванавічам і Анастасіяй Іванаўнай і яе сынам Юрыем не былі вырашаны.

Міхаіл Іванавіч у 20-я гады XVI ст., верагодна, апынуўся ў даволі складанай сітуацыі з-за спадчыны на Мсціслаўскае княства. Акрамя таго, што правы на Мсціслаўскае княства аспрэчвала для свайго сына Юрыя княгіня Анастасія Слуцкая, і са старэйшым сынам Фёдарам ў Міхаіла Іванавіча таксама ўзніклі непаразуменні.

---

[212] Wolff J. Kniazowie litewsko-ruscy od konca czternastego wieku. – S. 265, 268.

[213] Wolff J. Senatarowie i dygnitarze Wielkiego księstwa Litewskiego. 1386–1795. – Kraków: Druk. Anczyca i spólki, 1885. – S. 29; Wolff J. Kniazowie litewsko-ruscy od konca czternastego wieku. – S. 266.

[214] РИБ. – Т. 20. – Литовская метрика. Т. 1. – СПб.: Сенатская тип., 1903. – Стб. 546, № 15.

[215] РИБ. – Т. 20. – Стб. 1020, № 300; стб. 1030, № 311; стб. 1071–1072, № 357; Литовская метрика. Книга записей № 1 (1380–1584) / parenge A. Baliulis, R. Firkovičius. – Vilnius: Zara, 1998. – S. 118, № 567.

М. І. Бычкова сцвярджае, што князь Фёдар быў сынам Міхаіла Іванавіча і Ульяны Іванаўны, і калі ён выехаў у Маскву, то там яго і называлі «мсціслаўскім князем па маці»[216]. Ён нарадзіўся прыкладна ў 1499 або 1500 г. і, безумоўна, пасля смерці сваёй маці і дасягнення паўналецця ён мог патрабаваць частку спадчынных уладанняў свайго дзеда, мсціслаўскага князя Івана Юр'евіча. І, верагодна, ён іх патрабаваў.

З ліста вялікага князя Жыгімонта Старога ад 3 жніўня 1525 г. князю Міхаілу мы даведваемся, што апошні не жадаў даць Фёдару ніякага маёнтка. Сам Жыгімонт, як відаць з ліста, ужо неаднаразова падымаў гэтае пытанне і для яго вырашэння пасылаў да князя Міхаіла яго брата князя Багдана Іванавіча Жаслаўскага. Урэшце вялікі князь загадаў даць Фёдару Міхайлавічу Цяцерынскую воласць.

Даведаўшыся пра гэта, Міхаіл Іванавіч паслаў да вялікага князя другога свайго сына – Васіля, з просьбаю не аддаваць Фёдару Цяцерынскую воласць. За гэта князь Міхаіл абяцаў аддаць Фёдару замак Радамль. У той жа час князь Міхаіл Іванавіч выстаўляў умовы, што «ловы и дани медовыя» з воласці Радамлянскай павінны былі дзяліцца папалам паміж ім і Фёдарам. Вялікі князь Жыгімонт пагадзіўся з прапановай Міхаіла Іванавіча і паслаў у Мсціслаў Сеньку Прызрына, які павінен быў здаць замак Радамль князю Фёдару да таго часу, пакуль яму не знойдуць іншае воласці[217].

Але ў наступным годзе князь Міхаіл Іванавіч страціў абодвух сыноў. Памёр малодшы сын Васіль, а Фёдар, так і не ўладкаваўшыся з бацькам, ад'ехаў на службу ў Маскву. Прычым, як відаць з яго прысягі на вернасць маскоўскаму князю Васілю III, сам князь Фёдар Міхайлавіч быў ініцыятарам гэтага ад'езду[218]. Магчыма, яго не задаволіла вырашэнне праблемы спадчыны, бо фактычна, калі ён сапраўды быў сынам Ульяны Іванаўны, то ён з'яўляўся крэўным спадкаемцам мсціслаўскага княства – унукам князя Івана Юр'евіча.

На думку К. Стадніцкага і Ф. І. Леантовіча, ад'езд Фёдара ў Маскву паслужыў прычынай таго, што вялікі князь забраў у князя Міхаіла Іванавіча Мсціслаўскае княства. Прычынай для такіх дзеянняў вялікага князя Жыгімонта быў той факт, што страціўшы Смаленск, ён баяўся страціць і Мсціслаў, які яшчэ кароль Аляксандр даў Міхаілу Іванавічу без якога-небудзь абмежавання[219]. Таму ўжо вясною 1527 г. ў Мсціславе згадваецца намеснік Мсціслаўскі і Радамльскі Ян Юрьевіч Глебовіч[220].

---

[216] Бычкова М. Е. Родословие Глинских из Румянцевского собрания. – С. 117.

[217] АЗР. – Т. 2. – С. 162–163, № 136.

[218] Древняя российская вивлиофика содержащая в себе собрание древностей российских, до истории, географии и генеалогии российских касающиеся: в 20 ч. / изд. Н. Новиков. – 2-е изд-е вновь исправленное, дополненное и в порядке хронологии по возможности приведенное. – М.: Тип. комп. Типографической, 1788. – Ч. 3. – С. 63–68, № 136.

[219] Stadnicki K. Synowie Gedymina. Wielko-wladcy Litwy. Monwid-Narymunt-Jewnuta-Koriat. – Wydanie nowe przerobione i powenkszone. – Lwów: Drukarnia narodowa W. Manickiego, 1881. – S. 98; Леонтович Ф. Очерки истории Литовско-русского права. Образование территории литовского государства. – С. 117.

[220] Wolff J. Kniazowie litewsko-ruscy od konca czternastego wieku. – S. 268.

Адсутнасць крыніц не дазваляе нам дакладна рэканструяваць падзеі, звязаныя з далейшым лёсам Мсціслаўскага княства. Ф. І. Леантовіч мяркуе, што пагроза Міхаіла Іванавіча ад'ехаць за сынам у Маскву вымусіла вялікага князя шукаць з ім паразумення[221]. Магчыма, гэтым было выклікана тое, што князь Міхаіл Іванавіч граматай ад 29 ліпеня 1527 г. добраахвотна адмаўляецца ад сваіх правоў на ўдзельнае княства і замкі Мсціслаў з Радамляй на карысць караля[222].

Дванаццатага верасня з вялікакняскай канцылярыі выходзіць грамата вялікага князя, якая канчаткова рэгулюе ўзаемаадносіны паміж вялікім князем Жыгімонтам і Міхаілам Іванавічам. З яе мы даведваемся, што князь Міхаіл Іванавіч прызнаў за свайго сына каралевіча Жыгімонта Аўгуста: «взялъ въ насъ собе за место сына нашого королевича Польского и великого князя Литовъского выбраного Жикгимонта...». Яму ж Міхаіл Іванавіч адпісаў «по своему животе» замкі Мсціслаў і Радамль. За гэта вялікі князь Жыгімонт даў яму Мсціслаў і Радамль «съ бояр и съ дворы, съ сёлы и со всимъ какъ онъ перво сего мелъ, дали есмо отъ насъ ему въ держание до его живота»[223].

Такім чынам, 12 верасня 1527 г. было канчаткова ліквідавана ўдзельнае Мсціслаўскае княства. Яно ператварылася ў звычайную дзяржаву, якою дэ-юрэ валодаў апошні прадстаўнік роду мсціслаўскіх князёў, а фактычна яно знаходзілася пад кіраўніцтвам іншых асоб – вялікакняскіх намеснікаў.

У падагульненне вышэйсказанага адзначым, што у працэсе тэрытарыяльнага фарміравання Мсціслаўскага княства выразна прасочваюцца тры этапы.

На першым этапе, у канцы XII – першай палове XIV ст., Мсціслаўскае княства, якое сфарміравалася на землях радзімічаў, далучаных да Смаленскай зямлі ў выніку паходаў Расціслава Мсціславіча 1127 і 1142 гг. на Чарнігаўскае княства, займала найбольшую тэрыторыю. Яно аб'ядноўвала воласці гарадоў Мсціслава, Крэчута-Крычава, Прупоя-Прапошаска і землі, размешчаныя ўздоўж плыні Іпуці і на левабярэжы Дняпра.

У сярэдзіне XIV ст. (1359 г.) тэрыторыя Мсціслаўскае княства была адарвана ад Смаленскай зямлі і далучана да ВКЛ, дзе яно пераўварылася ў намесніцтва.

На другім этапе – з канца XIV ст. (1389 г.) – Мсціслаўскае княства было адноўлена ў складзе ВКЛ, але ўжо ў меншых памерах – без воласці Прапойска і тэрыторыі, якая прылягала да Дняпра. На чале княства стала дынастыя Лынгвеневічаў. Да 1483 г. тэрыторыя княства заставалася стабільнай і нават некалькі павялічылася за кошт далучэння да яе ў 1404 г. смаленскай воласці Малохвы. Мсціслаўскае княства ў XV ст. складалася з валасцей Мсціслава, Крычава, Мгліна, Дрокава, Паповай Гары, Малохвы, Лучыцкай воласці і воласці Прыкладні. У 1483 г. пасля смерці Івана Юр'евіча Мсціслаўскае княства было

---

[221] Леонтович Ф. Очерки истории Литовско-русского права. – С. 117.

[222] Wolff J. Kniazowie litewsko-ruscy od konca czternastego wieku. – S. 267–268.

[223] АЗР. – Т. 2. – С. 181–182, № 148.

ліквідавана, і з 1483 па 1499 г. яго землі былі канфіскаваны ў скарб і ўваходзілі ў склад Віленскага ваяводства.

На трэцім этапе (з 1499 г.) нанова арганізаванае Мсціслаўскае княства складалася ўжо толькі з двух валасцей – Мсціслава і Мгліна. У выніку неспрыяльных для ВКЛ знешнепалітычных абставін памежнае княства несла тэрытарыяльныя страты. У выніку вайны 1500–1503 гг. тэрыторыя Мсціслаўскага княства скарацілася да воласці самога горада. У 1527 г. Мсціслаўскае княства было ліквідавана і на яго аснове было арганізавана Мсціслаўскае староства, якое ўваходзіла ў склад Віленскага ваяводства.

У адміністрацыйна-гаспадарчым плане тэрыторыя Мсціслаўскага княства пачатку XVI ст., верагодна, дзялілася на воласць самога горада, воласці Радамля, Хіславічы і Заселле.

3.4. Землі былога Мсціслаўскага княства ў сярэдзіне XVI ст.

Землі былога ўдзельнага Мсціслаўскага княства пасля яго ліквідацыі былі ўключаны ў якасці асобнай воласці ў склад Віленскага ваяводства Вялікага Княства Літоўскага. Хаця князь Міхаіл Іванавіч і працягваў жыць у Мсціславе, ён, улічваючы яго ўзрост, верагодна, цалкам быў адхілены ад кіравання Мсціслаўскай воласцю, якая здавалася ў дзяржанне арандатарам. У чыіх руках першапачаткова знаходзілася Мсціслаўская дзяржава, нам невядома, але былы гаспадар Мсціслаўскага княства, князь Міхаіл Іванавіч быў незадаволены яго дзейнасцю па захаванні ў добрым стане замка.

Князь Міхаіл Іванавіч скардзіўся на старасту каралю: «... который жъ до насъ писалъ, што жъ врядники его тыхъ замковъ нашыхъ отъ неприятеля нашого Московского не суть беспечные, абыхмо ихъ въ часъ осмотрели».

Верагодна, вялікі князь прыслухаўся да скаргаў Міхаіла Іванавіча і памяняў дзяржаўцу, бо 19 жніўня 1528 г. вялікі князь Жыгімонт даў замкі Мсціслаў і Радамль «со всими дворцы и фольварки и волостьми...» ў дзяржанне берасцейскаму старасцічу Яну Юр'евічу Іллінічу. Адначасова Жыгімонт ставіў яму ўмову, што Ян Юр'евіч павінен быў палову дані аддаваць князю Міхаілу Іванавічу[224].

Як яшчэ доўга жыў апошні мсціслаўскі князь Міхаіл Іванавіч, дакладна не вядома. Ён быў жывы падчас складання попісу войска 1528 г., згодна з якім Міхаіл Іванавіч павінен быў выстаўляць 32 кані[225]. Восенню 1528 г. вялікі князь Жыгімонт нагадваў князю Міхаілу аб неабходнасці ўступлення двум баярам некаторай маёмасці згодна з каралеўскім выракам. 12 снежня 1528 г. Міхаіл Іванавіч паведамляў цырынскаму намесніку, што саступіў Альбрэхту Марці-

[224] АЗР. – Т. 2. – С. 189–190, № 155.

[225] Русская историческая библиотека издаваемая Императорской археографической комиссией. – Т. 33. – Литовская метрика. Часть третья. Книги Публичных дел. Переписи Войска Литовского / под. С. А. Пташицкий. – Петроград: Тип. Глав. управ. уделов, 1915. – С. 16.

навічу Гаштольду, ваяводу віленскаму і канцлеру Вялікага Княства Літоўскага, сваю маёмасць Азеро ўзамен на частку поля пад Цяцерынскім замкам[226].

Хутчэй за ўсё, князь Міхаіл Іванавіч памёр у канцы 1530 – пачатку 1531 г. Ва ўсякім выпадку, 23 жніўня 1530 г. князь Фёдар Мсціслаўскі, прысягаючы на вернасць маскоўскаму вялікаму князю Васілю III, абяцае не мець ніякіх сувязей са сваім бацькам[227]. А яшчэ 18 жніўня 1530 г. з каралеўскай канцылярыі выйшлі лісты з патрабаваннем аб пакладанні лістоў данін і прывілеяў, і адзін з іх быў накіраваны князю Міхаілу Мсціслаўскаму. Апошняе сведчыць пра тое, што Міхаіл Іванавіч яшчэ быў жывы, ці пра тое, што звесткі пра яго смерць не паспелі дайсці ні да Вільні, ні да Масквы. А нябожчыкам ён у першы раз называецца ў крыніцы, датаванай 15 лістапада 1531 г.[228] Таму можна меркаваць, што ён памёр недзе паміж жніўнем 1530 г. і лістападам 1531 г.

Са смерцю Міхаіла Іванавіча спынілася мужчынская галіна роду князёў Мсціслаўскіх у Вялікім Княстве Літоўскім. Але ў князя Міхаіла Іванавіча, акрамя памёрлага сына Васілія і збеглага ў Маскву Фёдара, было яшчэ чатыры дачкі – Марына, Таміла, Настасся і Багдана.

Старэйшая з іх, Марына, першы раз была замужам за Юрыем Рыгоравічам Осцікам, ад якога мела двух сыноў – Юрыя і Рыгора[229]. Пасля смерці Юрыя Рыгоравіча Осціка (1547 г.) у 1555 г. Марына Міхайлаўна ўзяла новы шлюб з Мікалаем Пятровічам Кішкам, з якім і пражыла да сваёй смерці ў 1563 г. Лёс распарадзіўся так, што пасля смерці сваёй маці Юрый Юр'евіч Осцік на некаторы час змог вярнуцца ва ўладанні свайго дзеда князя Міхаіла Іванавіча Мсціслаўскага. Ён з 1566 па 1578 г., пасля арганізацыі Мсціслаўскага ваяводства, быў мсціслаўскім ваяводам[230].

Таміла Міхайлаўна першы раз была ў шлюбе з князем Мацвеем Мікітынічам, які быў дзяржаўцам біржанскім. Ад яго мела сына Астаф'я Мацвеевіча Мікітыніча. Аўдавела яна ў 1539 г., але ў 1540 г. ўзяла другі шлюб з князем Андрэем Васільевічам Саламарэцкім, які памёр у 1541 г. Трэці раз Таміла Міхайлаўна ўзяла шлюб, верагодна, у 1542 г. з Янам Янавічам Забржэзінскім, дзяржаўцам самілішскім. Узяўшы з ім шлюб, яна перайшла ў каталіцтва і прыняла новае імя – Барбара. Аўдавела ў трэці раз у 1543 ці 1544 г. Памерла Барбара Міхайлаўна ў 1555 г.

Настасся Міхайлаўна ўжо ў 1541 г. мела першы шлюб з князем Рыгорам Рыгоравічам Осцікам. Аўдавела ў 1557 г. У 1558 г. ўзяла другі шлюб з князем Стэ-

---

[226] Akta grodzkie i ziemskie z czasów Rzeczypospolitey Polskiej z Archiwuw tak zwanego bernerdyńskiego we Lwowie. – Lwów: Księgarnia Seyfartha i Czarkowskiego. Drukarnia Narodowa W. Manieckiego. – 1884. – T. X. – S. 28, № 417; Wolff J. Kniazowie litewsko-ruscy od konca czternastego wieku. – S. 268.

[227] АЗР. – Т. 2. – С. 206–207, № 163.

[228] Lietuvos Metrika = Lithuanian Metrika = Литовская метрика. Книга записей № 15 (1528–1538) / parenge A. Dudonis. – Vilnius: Žara, 2002. – С. 145, 290.

[229] Wolff J. Kniazowie litewsko-ruscy od konca czternastego wieku. – S. 270.

[230] Wolff J. Senatarowie i dygnitarze Wielkiego księstwa Litewskiego. – S. 29.



Мал. 32. Радаслоўная маскоўскай галіны роду князёў Мсціслаўскіх

фанам Андрэевічам Збаражскім. Памерла ў 1580 г., не пакінуўшы пасля сябе нашчадкаў.

Багдана Міхайлаўна пры жыцці князя Міхаіла Іванавіча выступае першы раз пад імем Аграфена. Пад імем Багдана згадваецца ў 1541 г., калі яшчэ не была ў шлюбе. У 1546 г. узяла шлюб з князем Андрэем Міхайлавічам Сангушкам-Кашырскім, з якім жыла да яго смерці ў 1561 г. Вясной 1562 г. яна ўзяла другі шлюб з Андрэем Нікадымавічам Цеханавецкім, з якім і жыла да сваёй смерці ў 1565 г.[231] Ад шлюбу з Андрэем Цеханавецкім Багдана Міхайлаўна мела сына Станіслава (1562/1565 – 20 VIII 1598 гг.) і дачку Рэгіну (1562/1565 – пасля 1632 гг.)[232] (мал. 32).

Як і ў выпадку з Юрыем Юр'евічам Осцікам, які змог вярнуцца на пэўны час у «дзедзічныя» ўладанні, род Цеханавецкіх, пачынаючы з часоў шлюбу Андрэя Цеханавецкага з Багданай Міхайлаўнай Мсціслаўскай, звязаў свой лёс з усходам краіны і ўжо пачынаючы з іх сына Станіслава, не кажучы ўжо пра ўнукаў Яна, Самуэля Зыгмунта і Крыштафа Станіслава, аказаўся надзейна звязаным з жыццём Мсціслаўскага ваяводства да апошніх дзён яго існавання. А ў 1659–1672 гг. прадстаўнік гэтага роду Мікалай Цеханавецкі нават займаў пасаду мсціслаўскага ваяводы[233]. У пэўным сэнсе кроў мсціслаўскіх князёў працягвала жыць на землях Мсціслаўшчыны.

Мсціслаўскі дзяржаўца Ян Юр'евіч Іллініч, верагодна, не зусім добра выконваў свае абавязкі дзяржаўцы памежнага староства і не звяртаў увагі на падтрымку замкаў Мсціслава і Радамлі ў добрым стане. Гэта вымусіла вялікага князя Жыгімонта шукаць яму замену.

Другога лістапада 1529 г. вялікі князь пажалаваў Юрыя Юр'евіча Зяновіча «до воли нашое» замкамі Мсціслаўлем і Радамлем «зъ месты и зъ дворы и волости и со всими людьми волостъми Мстиславскими и Радомльскими...». Прычым перадаючы староства ў дзяржанне Юрыю Зяновічу Жыгімонт ставіў

[231] Wolff J. Kniazowie litewsko-ruscy od konca czternastego wieku. – S. 271–273.

[232] Dumin S., Rachuba A., Sikorska-Kulesza J. Ciechanowieccy herby Dąbrowa. – Warszawa: Wyd. DiG., 1997. – S. 33.

[233] Wolff J. Senatarowie i dygnitarze Wielkiego księstwa Litewskiego. – S. 31.

умову, што ў першы год Юрый Юр'евіч павінен быў усе даходы пусціць на рамонт замкаў у Мсціславе і Радамлі. Толькі пасля гэтага ён меў права забіраць палову ўсіх даней «медовыхъ и грашовыхъ и бабровыхъ и куничныхъ и всихъ поборовъ и къ тому со всихъ дворовъ и фольварковъ нашихъ половину пашни, ему и слугомъ ему на пожитокъ...». А улічваючы размяшчэнне Мсціслава і Радамля на памежжы, другую палавіну данін ён павінен быў пускаць на падтрымку ў добрым стане замкаў, на аплату пушкароў і куплю неабходнага рыштунку для абаронцаў крэпасці[234].

Акрамя таго, вялікі князь і сам клапаціўся аб тым, каб мсціслаўскі замак быў у добрым стане. У тым жа 1529 г. Жыгімонт даў загад, каб для рамонту мсціслаўскага замка былі прыцягнуты жыхары іншых гарадоў і валасцей: «А въ Мстиславли казали волостей города заробити: зъ Могилёва 7 городень, а съ Крычова 4 городни, а съ Олучичь 3 городни, а съ Чычерска 3 городни, а съ Пропойска 3 городни, достоль лихое городни мстиславцы доробятъ»[235].

У 1532 г. на віленскім сейме вялікі князь Жыгімонт зноў звярнуў увагу на стан мсціслаўскага замка. Ён прапанаваў дзяржаўцам Мсціслава, Крычава і Оршы самім адрамантаваць замкі з дапамогаю мясцовых жыхароў і на грошы, якія былі выдзелены скарбам. Акрамя таго, Жыгімонт прапанаваў дзяржаўцам самім паклапаціцца пра забеспячэнне замкаў правіянтам і «там мешкати в добромъ осмотреньи и осторожи»[236]. Дзеянні па рамонце фартыфікацыйных збудаванняў Мсціслава, распачатыя каралём Жыгімонтам і дзяржаўцам Юрыем Зяновічам, даволі хутка апраўдаліся.

Пасля смерці маскоўскага вялікага князя Васіля III у 1534 г. палыхнула новая вайна – так званая Старадубская, паміж Масквой і Вільняй, якую распачалі Жыгімонт Стары і яго сын Жыгімонт Аўгуст. Мсціслаў і Крычаў былі базамі літоўскіх войск у барацьбе за Севяршчыну ў кампаніі 1534 г.[237] У жніўні 1534 г. мсціслаўскі дзяржаўца Юрый Зяновіч выслаў разведвальны атрад, які разбіў маскоўскі аддзел колькасцю 1100 чалавек[238].

Баявыя дзеянні працягваліся ўвесь 1534 г., таму на зіму ў Мсціславе быў пакінуты атрад колькасцю 600 коннікаў і 300 драбаў ротмістра Чарніна. У Крычаве быў пакінуты гарнізон колькасцю 200 коннікаў і 200 драбаў ротмістраў Пясецкага і Сухадольскага. Таксама гарнізоны былі пакінуты ў Прапойску, Чачэрску, Рагачове, Рэчыцы і Быхаве[239].

У наступным годзе баявыя дзеянні перамясціліся пад сцены Мсціслаўскага замка. Жыхары Мсціслава ў 1535 г. двойчы бачылі пад сваімі сценамі і на ву-

---

[234] АЗР. – Т. 2. – С. 216, № 167.

[235] АЛРГ. – Вып. 1. – С. 331.

[236] Любавский М. К. Литовско-Русский сейм. – С. 257–258.

[237] ПСРЛ. – Т. 35. – С. 236.

[238] Kolankowski L. Zygmunt August wielki książę Litwy do roku 1548. – Lwów: Wyd. tow-ta popier. nauki, 1913. – S. 125.

[239] Ткачев М. А. Замки Беларуси. – С. 89; Памятники истории Восточной Европы. – С. 121.

ліцах горада захопнікаў. У лістападзе іх прывёў сюды князь Васілій Іванавіч Шуйскі: «съ нарядомъ, съ пушками и съ пищалями»[240]. Летапіс паведамляе, што ў Мсціславе рускія войскі здолелі захапіць толькі пасад: «да посад изгонили и на посаде многихъ людей имали въ полонъ, а иныхъ секли, а посад сожгли, а городъ Мстиславлъ отстоялся». Акрамя таго, некаторыя летапісы паведамляюць, што ў Мсціславе рускія войскі змаглі захапіць і «астрог» – вакольны горад «и многыхъ людей Литовъскихъ побили и иныхъ переимавъ, къ великому князю на Москву прислали» [241].

Нягледзячы на тое, што пасады і вакольны горад Мсціслава былі захоплены, замак жыхары горада адстаялі. У лісце ў Вільню пра падзеі ў Мсціславе гаварыцца, што рускія войскі: «моцным способомъ з дел через немалый час з великимъ штурмомъ его добывали», аднак «ничего вчинити ему не могли и за тым добываннем жадного звытянства не одержали, одно вежу над вороты и неколко городен з дел збили»[242].

У сувязі з тым, што падчас абароны горада быў забіты мсціслаўскі пушкар, гаспадар распарадзіўся «обыскати и змовити четырех, а если найдутся то и более пушкарей и немедля отправить в Мстиславль». Акрамя таго, мсціслаўскі староста князь Васіль Андрэевіч Палубенскі прасіў, каб з суседніх валасцей тэрмінова адправілі сюды людзей для рамонту абарончых збудаванняў горада[243].

Горад быў моцна пашкоджаны – «немалую шкоду месту тамошьнему и острогу вчинили»[244], таму вялікі князь Жыгімонт Стары загадаў навакольным дзяржаўцам тэрмінова адправіць у Мсціслаў людзей, каб яны дапамаглі ўзнавіць абарончыя збудаванні горада. Усяго для гэтых патрэб вялікі князь загадаў адправіць па сто чалавек з Магілёва і Бабруйска, па пяцьдзясят чалавек з Любашанаў, Свіслачы і Барысава, па трыццаць чалавек з Прапойска, Крычава і Чачэрска[245].

Улічваючы тэрміновасць і адказнасць той працы, на якую збіраліся людзі, у сваім лісце да магілёўскага дзяржаўцы вялікі князь асабліва падкрэсліваў, каб у Мсціслаў ён пасылаў «сто чоловековъ с коньми и с топоры и выправилъ бы еси тамъ добрых молодцовъ а не робятъ, которые бы к тое роботы годни были». Адначасова, улічваючы, што гаспадарка Мсціслаўскай воласці моцна пацярпела ад нашэсця захопнікаў, вялікі князь абавязаў іншыя воласці, размешчаныя на захадзе Вялікага Княства Літоўскага, забяспечыць будаўнікоў харчаваннем: «и живностей велели им з собою набрати»[246]. Акрамя таго, мяса будаўнікам Мсціслава куплялася і за кошт дзяржаўнага скарбу. Усяго ў Мсці-

---

[240] ПСРЛ. – Т. 13. Патриаршая или Никоновская летопись. – М.: Наука, 1965. – С. 86; Тамсама. – Т. 26. – С. 316, 321–322.

[241] Тамсама. – Т. 13. – С. 87–88, 95, 424.

[242] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 19. – Арк. 54 адв.

[243] Малиновский И. А. Сборник материалов относящихся к истории Панов-Рады Великого княжества Литовского. – Томск: Паровая типолитография П. И. Макушина, 1901. – С. 224–226.

[244] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 19. – Арк. 58.

[245] Тамсама. – Арк. 59 адв.

[246] Тамсама. – Арк. 58–58 адв.

слаў павінны былі даставіць 800 дзежак жыта, па 45 дзежак гароху і круп, 200 «полтеи» мяса[247].

І гэта была даволі сваечасова. Бо праз два месяцы адбыўся новы паход маскоўскіх войскаў на Мсціслаў. У снежні ў наваколлях горада ваяваў князь Міхаіл Васільевіч Гарбаты-Кіслы[248]. Але мсціслаўцы і навакольная шляхта не толькі мужна абаранялі горад, але і прымалі ўдзел у баявых дзеяннях разам з дзеючым войскам. У лютым 1535 г. вялікі князь загадаў мсціслаўскаму дзяржаўцу, каб ён «замки людми осадивъши, а самъ съ конными людми до пана гетмана ехали»[249].

У той жа час трэба прызнаць, што горад быў моцна разбураны падчас гэтых нападаў. У пачатку лютага 1535 г. жыхары Мсціслава звярнуліся да вялікага князя Жыгімонта з просьбаю, каб той вызваліў іх на пэўны час ад выплаты падаткаў. Сваю просьбу яны тлумачылі вялікімі разбурэннямі ў горадзе і тым, што частка жыхароў Мсціслава разышлася ў іншыя гарады. Улічваючы стан горада, Жыгімонт вызваліў Мсціслаў ад выплаты ўсіх відаў падаткаў у дзяржаўны скарб на тры гады[250]. У 1535 г. подых вайны адчулі на сабе і жыхары Радамлі, якую таксама штурмавалі маскоўскія войскі.

У наступным 1536 г. рускае камандаванне планавала нанесці новы ўдар па Мсціславу. З Рослаўля вышаў атрад пад камандаваннем князя Міхаіла Юр'евіча Абаленскага. Перад ім ставілася задача пачаць штурм Мсціслава «от Могилёва с поля против Гегоргея св[я]того, а пушки ся ему беречи поземных у Чичерского сверна, в правой руце у города другое пушки отто Мстиславское стрелни в острозе против турмы. А з городовои на воротех две пушки, да на Чичерской стрелни пушки. ... А будет у них прямая весть, что у Крычова и Мстиславля людей мало, а прибылых людей нет, и им бы тамошних мест, Крычовских, да Мстиславских, повоевати гораздо»[251].

Аднак перахоп граматы з планамі рускага камандавання літоўскімі шпегамі прывёў да таго, што планы Абаленскага сталі вядомымі, і рускія войскі былі разгромлены пад Крычавам. У палон пад Крычавам трапіў і рускі князь Міхайла Іванавіч Крыванога[252].

Трэба адзначыць, што падчас гэтай вайны ВКЛ у чарговы раз страціла землі, якія раней ўваходзілі ў склад Мсціслаўскага княства. На гэты раз да Маскоўскага княства адышлі воласці Прыкладні і Салаўянічы.

Пра тое, што яны адышлі менавіта ў гэты час, сведчаць перамірныя граматы, якія заключаліся паміж ВКЛ і Рускім царствам. Так, адзначаецца, што

---

[247] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 19. – Арк. 61 адв.

[248] ПСРЛ. – Т. 26. – С. 316, 321–322.

[249] Любавский М. К. Литовско-Русский сейм. – С. 476.

[250] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 19. – Арк. 116–116 адв.

[251] Грали И., Эскин Ю. М. Литва и Русь в 1534–1536 гг. Новые документы // Вестн. Моск. ун-та. – Сер. 8. История. – № 4. – 1999. – С. 65–76.

[252] Kolankowski L. Zygmunt August wielki książę Litwy do roku 1548. – S. 141; Памятники истории Восточной Европы. – С. 198.

крычаўска-рослаўскі рубеж ідзе ад Забор'я па Іпуці толькі да Хмеля[253]. Далей пры апісанні памежжа ва ўсіх размежаваннях пачынаючы з 1537 г. ужо адсутнічае ўказанне, што «Іпуць рубеж крычаўскі», як гэта было ў апісанні рослаўска-крычаўскага размежавання 1522 г.[254] Верагодна, зараз мяжа ВКЛ у гэтым раёне з Іпуці паварочвала ў бок Беседзі і ішла па апошняй у кірунку сучаснага Хоцімска (гл. мал. 29).

Значная ўвага стану Мсціслаўскага замка надавалася і пасля заканчэння Старадубскай вайны. Адразу пасля яе заканчэння былі арганізаваны работы па рамонце памежных замкаў, у тым ліку і Мсціслаўскага. Для яго рамонту прыцягваліся жыхары і іншых воласцяў. Так, напрыклад, у снежні 1537 г. на рамонт Мсціслаўскага замка, згодна з вялікакняскім лістом, павінны былі выставіць 70 чалавек Магілёў і яго воласць. Са Свіслачы накіравалі ў Мсціслаў 30 чалавек, з Цяцерына – 40, з Княжыц – 60[255]. Але жыхары Магілёва звярнуліся да вялікага князя са зваротам, каб той іх вызваліў ад гэтага абавязку. Сваю просьбу яны падмацоўвалі тым, што на рамонт мсціслаўскага замка іх прыцягвалі у тыя часы, калі яшчэ ў самім Магілёве не было замка. А ў апошнія часы яны ніколі не прыцягваліся да прац па рамонце памежных замкаў. І нягледзячы на тое, што гэта было не зусім праўдзівым, зварот жыхароў Магілёва быў задаволены[256].

Стан памежных замкаў цікавіў вялікага князя і ў мірныя часы. Так, у верасні 1538 г. вялікі князь Жыкгімонт Стары даў загад, каб на лета былі арганізаваныя працы па рамонце памежных замкаў – Полацка, Віцебска, Кіева і Мсціслава[257].

У 1541 г. жыхары Мсціслава атрымалі дазвол ад вялікага князя Жыгімонта Старога на абранне са складу мсціслаўскай шляхты гараднічага мсціслаўскага і радамльскага, дабіліся вызвалення ад некаторых іншых падаткаў і абмежавалі правы старасты. Гэты ж прывілей потым быў пацверджаны і Жыгімонтам Аўгустам[258].

У пачатку 50-х гадоў XVI ст. вялікі князь Жыгімонт Аўгуст таксама звярнуў увагу на стан баяздольнасці Мсціслаўскага замка. У лісце да навагародскага ваяводы Івана Гарнастая ад 30 верасня 1552 г. ён пісаў «ты бы гаковницами и ручницами, салетрою, оловомъ посилилъ тотъ замокъ подле потребы и баченья своего, кгды жъ того въ скарбе нашомъ доситъ естъ. А што ся дотычитъ делъ кгды, дастъ Богъ, сами тамъ будемъ, на онъ часъ и делъ колико обровшы на тотъ замокъ пошлемъ. О будованью замку потреба намъ ведати, отколь може ратунекъ и помочь мети, и хто перед тымъ его робилъ»[259].

---

[253] СИРИО. – Т. 59. – С. 126, 190, 304; Тамсама. – Т. 35. – С. 726, 731; Тамсама. – Т. 137. – С. 61, 68

[254] ДМАМЮ. – Т. 1. – С. 66–67.

[255] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 21. – Арк. 93 адв.

[256] Тамсама. – Адз. зах. 20. – Арк. 100–101.

[257] АЗР. – Т. 2. – С. 347.

[258] Метрыка Вялікага Княства Літоўскага. Кн. 43 (1523–1560): Кн. запісаў 43 (Коп. канца XVI ст.). – Мінск: Беларус. навука, 2000. – С. 169–171.

[259] Любавский М. К. Литовско-Русский сейм. – Приложения. С. 63–64.

У 1555 г. з віленскага цэйхгаўза ў Мсціслаў быў прысланы фальканет сярэдняга калібру[260]. Акрамя пасылкі артылерыі і іншай агнястрэльнай зброі ў сярэдзіне 50-х гадоў XVI ст. у Мсціславе стаяў атрад драбаў колькасцю 100 чалавек пад кіраўніцтвам ротмістра Разбіцкага, да якіх потым далучыліся яшчэ 50 чалавек[261]. Драбы стаялі ў Мсціславе і ў пачатку 40-х гадоў XVI ст. і ў 1559 г.[262]

Стан мсціслаўскага замка вельмі цікавіў вялікага князя і падчас распачатай Інфлянцкай вайны. У 1559 г., калі шляхта спрабавала адмовіцца рамантаваць замкавы мост, сцвярджаючы, што згодна з даўнім звычаем яны павінны рамантаваць толькі палову замкавых гародзен, а мост і другую частку гародзен павінны рамантаваць людзі з гаспадарскіх двароў, Жыгімонт Аўгуст загадаў ім перадаць «ижъ замокъ и мостъ всимъ при тамошнемъ замку мешкаючимъ естъ потребенъ, такъ и ваши люди будутъ повинны замокъ и мостъ робити»[263].

У наступным годзе Жыгімонт Аўгуст вырашыў удакладніць узаемныя абавязкі з мсціслаўскімі пушкарамі. Ім быў выдадзены ліст да скарбных пісараў, у якім ён устанаўліваў «певний урочистий платъ пушкаромъ мстиславъскимъ Миколаю, Гришку, Павлу и Фёдору зъ скарбу нашого давати на службу их пушкарскую при томъ замъку нашомъ в кажъдый год на кожного десят копъ грошей и шесть локотъ сукна люньского а они зато маютъ пушкарскую службу на замъку служити и стрельбы дагледати и што бы невеликого слесарское работе належачого запсовано направовати. А они бы на кажъдый год по шести десятъ фунътовъ пороху зъ своее салетри маютъ давать оть собе каждый на оный замокъ. Вы бы тыхъ платъ зъ скарбу нашого имъ выдавати почавши отъ нового лету нине будучого, року шестидесятого. И потомъ завъжды хто отъ насъ будети, ажъ бы тимъ пушкаромъ тотъ датокъ зъ скарбу нашого на день нового лету выдавали и других пушкаровъ на тотъ замокъ нашъ шлючи на таковымъ же датку и повинъности и становили».

Акрамя пералічаных пушкароў, у Мсціславе, верагодна, былі яшчэ і іншыя, бо крыніца заканчваецца словамі: «Ивану Карнивичу, Клишку Геличову, Демиду и Ивану Герцыку в тое же слово листъ яко имети славнымъ пушкаромъ»[264]. Але становішча са зброяй і боепрыпасамі ў Мсціслаўскім замку напярэдадні Інфлянцкай вайны было даволі кепскім[265].

---

[260] Nowak T. Z dziejów techniki wojennej w dawnej Polsce. – Warszawa: Wyd. Min. Obrony Narod., 1965. – S. 112.

[261] Любавский М. К. Литовско-Русский сейм. – С. 596; НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 37. – Арк. 213 адв.

[262] Акты, относящиеся к истории Западной России собранные и изданные Археографической комиссией. В 5 т. – Т. 3. 1547–1587 гг. – 1848. – С. 106, № 24-V-2; НГАБ. – КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 37. – Арк. 360–360 адв.

[263] АЗР. – Т. 3. – С. 106, № 24-V-1.

[264] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 37. – Арк. 414–414 адв.

[265] Янушкевіч А. Арганізацыя абароны на тэрыторыі Верхняга Падняпроўя падчас Інфлянцкай вайны 1558–1570 гг. // Проблемы истории и культуры Верхнего Поднепровья.: Междунар. науч.-практ. конф. 25–26 октября 2001 г.: тез. докл. – Могилев: Изд-во МГУ им. А. Кулешова, 2001. – С. 49.

Баявыя дзеянні падчас Інфлянцкай вайны апалілі сваім подыхам і землі Мсціслаўшчыны. Асабліва актыўнымі на ўсходніх землях Вялікага Княства Літоўскага рускія войскі былі ў 1562–1565 гг. Так, вясною 1562 г. групоўка рускіх войскаў пад кіраўніцтвам татарскага царэвіча Ібака і Івана Шарамецьева ўчыніла шэраг набегаў на наваколлі Оршы, Дуброўны і Мсціслава, спаліўшы пасады гэтых гарадоў[266]. У адказ на гэты паход 5 красавіка пад Мсціслаў былі тэрмінова перакінуты войскі ВКЛ, а памежным дзяржаўцам дадзены загад нішчыць рускія землі ў якасці кары за набегі на землі ВКЛ[267].

У ліпені–жніўні гэтага ж года цар Іван IV паслаў сваіх ваявод на Мсціслаў. Пад Мсціславам дзейнічалі рускія войскі пад кіраўніцтвам ваяводы Пятра Сямёнавіча Сярэбранага, якія «у Мстиславля верхние посады пожгли, а которые люди Литовские из города выходили, они техъ людей побили, и прислали съ того дела пятдесятъ языков Литовскихъ»[268]. Вынікам гэтага паходу былі пастановы, прынятыя 23 чэрвеня 1563 г. вялікім князем Жыгімонтам Аўгустам па просьбе мсціслаўскай шляхты на вальным Віленскім сейме.

Па-першае, вялікі князь абяцаў шляхце забяспечыць патрэбы замка, прыслаўшы сюды служылых людзей і агнястрэльную зброю, «железа и солетра зъ скрабу ... подле потребы». У гэты год з віленскага цэйхгаўза ў Мсціслаў быў накіраваны фальканет сярэдняга калібру[269]. Для рамонту студні на мсціслаўскім замку з Магілёва спецыяльна накіроўваўся цясляр. Забяспечвацца ежай мсціслаўскі замак павінен быў коштам прылягаючых вялікакняскіх двароў, як гэта заўжды было раней. Адначасова Жыгімонт Аўгуст дазваляў мсціслаўцам на гэты раз узяць 200 бочак жыта з Магілёўскага замка.

Па-другое, мсціслаўская шляхта прасіла вялікага князя вызваліць яе ад выкананняў абавязкаў па рамонце замка. Вялікі князь Жыгімонт Аўгуст не пагадзіўся з гэтай просьбай і захаваў стары парадак: «яко передъ тымъ стародавна замокъ его милости ... в будованью и опатрованъ и зароблиранъ бывалъ». Адну палову замка павінны былі рамантаваць мсціслаўскі староста і гараднічы з прызначанымі для гэтага людзьмі, а другую палову – шляхта.

І надалей вялікі князь абавязваў мсціслаўскую шляхту прыкладаць намаганні па абароне мсціслаўскага замка разам са сваімі слугамі. Акрамя таго, ён даваў абяцанне абараніць шляхту ад самавольстваў мсціслаўскага ротмістра Пятра Курніцкага.

Апошняя просьба мсціслаўскай шляхты тычылася таго, каб вялікі князь выдзеліў для яе асобнае месца, дзе б яны маглі падчас вайны хаваць свае сем'і.

---

[266] Янушкевіч А. Ваенныя дзеянні паміж Вялікім княствам Літоўскім і Маскоўскай дзяржавай у 60-я гады XVI стагоддзя // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – Białystok, 2000. – № 14. – S. 35–36.

[267] Литовская метрика. Книга публичных дел № 7 (№ 564) (1553–1567) / parenge A. Baliulis. – Vilnius: Mokslo ir enciklopediju leidykla, 1996. – С. 93, 94.

[268] ПСРЛ. – Т. 13. – С. 340, 343.

[269] ДМАМЮ. – Т. 1. – С. 149–151; Nowak T. Z dziejów techniki wojennej w dawnej Polsce. – Warszawa: Wyd. Min. Obrony Narod., 1965. – S. 112.

На гэта вялікі князь прызначыў «жонамъ и детемъ нашымъ шляхетскимъ мешканье у Свислочи до часу слушного и до воли и ласки его королевское милости»[270]. Адначасова вялікі князь патрабаваў ад намеснікаў ускраінных замкаў не арганізоўваць самастойныя паходы на маскоўскія воласці[271].

У наступным 1564 г. рускія войскі двойчы штурмавалі Мсціслаў. У снежні іх прыводзіў ваявода Пётр Сярэбраны, які на гэты раз не толькі спрабаваў захапіць горад, але і паліў яго навакольлі: «и Литовские места воевали ... Могылёвские, Радомльские, Мстиславские, Кричевские и королевские сёла и деревни жгли и въ посылкахъ во многихъ заставы Литовскихъ людей побивали и языки имали и въ полонъ многыхъ людей и з живота поимали». Не паспелі загаіцца раны ад гэтага паходу, як летам на Мсціслаў абрушылася новая навала. 25 ліпеня ад Смаленска адышло рускае войска на чале з ваяводам Васіліем Андрэевічам Бутурліным «з детьми боярскими и съ Татары служилыми и съ Казанскими и з горными и съ Чебоксарскими и съ Остраханьскими и съ Ногайскими и съ Городецкими и съ Мордвою, а воевали Мстиславские места и Кричевские и Радомльские и Могилёвские и многих людей побили и в полон взяли. Взяли воинских людей шляхтычъ, и з жонами и з детми, и чорных людей всяких 4787 душ...»[272].

Акрамя Мсціслава падчас Інфлянцкай вайны дзяржаўная улада надавала ўвагу і меншым гарадскім цэнтрам староства. Так, мсціслаўская шляхта ў 1569 г. на Люблінскім сейме прасіла вялікага князя, «абы Радомльский замок оправить або его знову будовать расказать рачил». Вялікі князь адказаў, улічваючы той факт, што замак і раней рамантавалі «з скарбу его господарского, залаща ... и теперь то росказуешь опатровати, яко будеть магло быть»[273]. Адначасова улада сачыла, каб у арсенале замка мелася агнястрэльная зброя, якая цэнтралізавана пастаўлялася сюды з «пушкарскага Віленскага двара». Так, у 1552–1565 гг. сюды прысылаліся гакаўніцы, рушніцы, розная іншая амуніцыя[274].

Крыніцы сведчаць, што мсціслаўцы падчас Інфлянцкай вайны час ад часу самі арганізоўвалі прэвентыўныя паходы на рускія землі. Так, у 1565 г. «Литовские же люди приходили Июня в 10-й день в Ивановские станъ, Мстиславцы и Кричевцы, въ головехъ Мстиславской хоружый и иные ротмистры, а съ ними 1200 чоловек». Праўда гэты паход скончыўся для мсціслаўцаў паразай[275].

---

[270] ДМАМЮ. – Т. 1. – С. 149–151.

[271] Русская историческая библиотека издаваемая Императорской археографической комиссией. – Т. 30. – Литовская метрика. Отделы первый и второй. Часть третья: Книги публичных дел. Том первый. – Юрьев: Тип. К. Матисена, 1914. – С. 702.

[272] ПСРЛ. – Т. 13. – С. 377, 385.

[273] РИБ. – Т. 30. – С. 530.

[274] Nowak T. Z dziejów techniki wojennej. – S. 112.

[275] ПСРЛ. – Т. 13. – С. 397.

Хаця баявыя дзеянні ў другой палове 60-х гадоў XVI ст. адбываліся па-за межамі воласці Мсціслава, улада ўвесь час трымала ў горадзе даволі значны гарнізон. Так, у 1567–1679 гг. у горадзе стаялі роты драбаў пад кіраўніцтвам ротмістраў Д. Бабаеда (100 драбаў), П. Курніцкага (200) і Я. Серабрыцкага (90–100)[276].

3.5. Князі Мсціслаўскія на службе маскоўскай

Збеглы ў Маскву князь Фёдар Міхайлавіч у ліпені 1526 г. быў цёпла сустрэты маскоўскім вялікім князем Васілём III. Ён надаў Фёдару Міхайлавічу гарадкі: Яраславец, які ўжо двойчы быў ў валоданні ў другіх князёў – у Васіля Шамякіна і М. Л. Глінскага, горад Крамянец, воласці Сухадрэў, Мушае і горад Кашыру ў кармленне[277]. Магчыма гэтаму паспрыяў і той факт, што на паўгода раней Васіль III ажаніўся з Аленай Глінскай, якая прыходзілася сваячкай Фёдару Мсціслаўскаму[278].

Чым займаўся Фёдар Міхайлавіч у першыя гады свайго знаходжання ў Маскве, дакладна не вядома. Разрадныя кнігі паведамляюць, што ў 1527–1529 гг. ён быў адным з ваяводаў на Кашыры. А ў 1528 г. прымаў удзел у бітве з крымскімі татарамі на р. Вугра[279].

Даволі гладка складваўся лёс Фёдара Міхайлавіча на маскоўскай службе, але хутка быў перапынены царскай апалай. Верагодна, гэтым можна растлумачыць прынесеную ім 23 жніўня 1529 г. – пасля трохгадовага знаходжання ў Маскве – прысягу на вернасць вялікаму маскоўскаму князю Васілю III. У ёй князь Фёдар абяцаў Васілю III не мець ніякіх зносін з Літвой, як са сваім бацькам, так і з каралём, верна служыць маскоўскаму князю і г. д.[280] Чым была выклікана гэта апала, дакладна не вядома. Але хутчэй за ўсё, яна была вынікам агавору, што ён збіраецца збегчы назад у Літву. Намёк на гэта ёсць у другой грамаце на вернасць вялікаму князю Васілю III і яго дзецям, якую князь Фёдар Міхайлавіч Мсціслаўскі даў у 1531 г. У той жа час А. А. Зимин сцвярджае, што гэта прысяга была выклікана бяздзетнасцю вялікага князя Васіля III і яго спробай знайсці пераемніка на прастол: Фёдар Мсціслаўскі разглядаўся як магчымы прэтэндэнт на маскоўскі вялікакняскі стол[281].

Але Фёдару Міхайлавічу пашанцавала, апала не была доўгай. У 1530 г. у маскоўскага вялікага князя Васіля III нарэшце нарадзіўся нашчадак – будучы цар Іван IV. З гэтай нагоды князь Васіль III зрабіў агульную амністыю для апальных баяраў: «И на той радости князь великий пожаловал многих людей опальных: князя Феодора Михайловича Мстиславского...»[282]

---

[276] Янушкевіч А. Арганізацыя абароны на тэрыторыі Верхняга Падняпроўя. – С. 49.

[277] ПСРЛ. – Т. 26. – С. 313; Зимин А. А. Россия на пороге нового времени. – С. 305.

[278] Веселовский С. В. Последние уделы в северо-восточной Руси // Исторические записки. – 1947. – Т. 22. – С. 118.

[279] Разрядные книги 1475–1598 гг. – С. 70–73; ПСРЛ. – Т. 13. – С. 46.

[280] Skarbiec dyplomatów. – S. 303, № 2316.

[281] Зимин А. А. Россия на пороге нового времени. – С. 315.

[282] ПСРЛ. – Т. 28. – С. 161.

Акрамя таго, жадаючы надзейна звязаць далейшы лёс аднаго з Гедымінавічаў – князя Фёдара Міхайлавіча Мсціслаўскага – з Масквой, Васіль III ажаніў яго са сваёй пляменніцай Анастасіяй – дачкой сястры Еўдакіі і хрышчонага пад імем Пятра казанскага царэвіча Кудайкула[283]. На думку некаторых даследчыкаў, тады ж, у якасці царскага падарунка, князь Фёдар Міхайлавіч атрымаў Юхацкую воласць – вымарачнае ўладанне былых удзельных Юхацкіх князёў[284]. Адначасова з воласцю ён атрымаў і тытул удзельнага князя.

Магчыма толькі зараз, апынуўшыся пасля апалы ў больш вольных умовах і ведаючы пра смерць бацькі, князь Фёдар Міхайлавіч сапраўды вырашыў бегчы ў Літву. Але пабег быў няўдалым. Яго злавілі каля Мажайска[285].

Аднак і на гэты раз вялікі маскоўскі князь Васіль III даруе Мсціслаўскаму. Пятага лютага 1531 г. князь Фёдар Міхайлавіч у другі раз прыносіць прысягу на вернасць Васілю III і яго сыну Івану. Прычым на гэты раз да прысягі ён прыводзіўся пад пагрозай царкоўнага праклёну, калі ён зробіць яшчэ адну спробу здрадзіць Маскве[286].

У далейшым князь Фёдар Міхайлавіч Мсціслаўскі ўжо не спрабаваў пакінуць маскоўскі двор і вярнуцца ў Літву. Больш таго, як адзін з бліжэйшых сваякоў царскай сям'і ён увесь час знаходзіўся ў непасрэднай блізасці да вялікага князя.

Яшчэ пры жыцці слабеючы князь Васіль III утварыў рэгенцкі савет для свайго малалетняга сына Івана. У яго склад увайшоў і Фёдар Міхайлавіч Мсціслаўскі, хаця ён там і не выконваў галоўную ролю. Па словах ганца літоўскага пасла, «... на Москве старшими воеводами, которые з Москвы не мают николи зъехати – старшим князъ Василий Шуйский, Михайло Тучков, Михаил Юрьев сын Захарьина, Иван Шигона, а князь Михаило Глинский, тые вси землею справуют и мают спровать до леть (савершенналецця) великого князя». М. Глінскі ва ўсім прыслухоўваецца да сваіх паплечнікаў, «все с волею княгини великой справуют. А князь Дмитрий Бельский, князь Иван Овчина, князь Фёдор Мстиславский тыи таки суть старшими при них, але ничого не справуют»[287].

---

[283] Карамзин Н. М. История государства Российского. – 4-е изд. – СПб., 1834. – Т. 7. – С. 139; ПСРЛ. – Т. 8. – С. 271; Тамсама. – Т. 13. – С. 45; Соловьев С. М. Сочинения. В 18 кн. Кн. III. История России с древнейших времен. Т. 5–6. – М.: Мысль, 1989. – С. 298.

[284] Барсуков А. П. Сведения об Юхотской волости и ее прежних владельцах князьях Юхотских и Мстиславских. С приложением статьи об Юхотских сокольих повытчиках. – СПб., 1894. – С. 8; Веселовский С. В. Последние уделы в северо-восточной Руси. – С. 118; Юргалов А. Л. Удельно-вотчинная система и традиции наследования власти и собственности в средневековой России // Отечественная история. – 1996. – № 3. – С. 98.

[285] Зимин А. А. Формирование боярской аристократии в России во второй половине XV – первой трети XVI в. – М.: Наука, 1988. – С. 148, сноска 52.

[286] Собрание государственных грамот и договоров, хранящихся в государственной коллегии иностранных дел. – Ч. 1. Содержащая материалы охватывающие период с 1265 по 1613 гг. – М., 1813. – С. 433–435, № 157; с. 439–443, № 159.

[287] АЗР. – Т. 2. – С. 331; Скрынников Р. Г. Царство террора. Монография. – СПб.: Наука, Ленинград. отдел. – 1992. – С. 84.

Да канца свайго жыцця Фёдар Міхайлавіч заставаўся на маскоўскай службе, але нічым асабліва не вылучаўся. Хаця па сваёй радавітасці ён быў роўным вялікаму князю маскоўскаму, баярскі тытул яму не быў нададзены.

Яго імя ўвесь час сустракаецца ў рускіх разрадных кнігах за 30-я гады XVI ст. Так, у 1533 г. ён быў пасланы ў Каломну бараніць паўднёвыя землі ад кааліцыйнага паходу на Маскву казанскага хана Сафы-Гірея і крымскіх татараў[288].

Пасля смерці вялікага князя Васіля III жыццё князя Фёдара, верагодна, некалькі змянілася. Ён, на думку некаторых даследчыкаў, фактычна быў адхілены ад кіраўніцтва краінай, што было звязана з яго ўдзелам у змове супраць Міхаіла Глінскага[289].

Верагодна, па смерці Васіля III Фёдар Мсціслаўскі прэтэндаваў на ролю рэгента пры малалетнім цары Іване IV. Аднак у гэтай барацьбе ён прайграў Глінскім, і рэгентам стала маці цара Алена. У гэтай сітуацыі князь Фёдар актывізаваў сваю ўдзельную палітыку, аднак новае кіраўніцтва краіны, дзе значную ролю іграў Міхаіл Глінскі, пачало яго абмяжоўваць, і сам ён часта адсылаўся ў далёкую, але пачэсную ссылку[290].

У 1535 г. пачалася новая вайна паміж Масквой і Вільняй. Гэта была першая вайна для князя Фёдара Мсціслаўскага паміж радзімай і новым месцам жыхарства. Невядома, як бы павёў сябе Фёдар Міхайлавіч, калі б апыніўся ў гэты час сярод рускіх войскаў, якія дзейнічалі супраць Вялікага Княства Літоўскага. Але, верагодна, памятаючы пра яго спробу вярнуцца на Літву, князя Фёдара Міхайлавіча не дапускалі блізка да межаў радзімы. Ён увесь час бараніў рускія землі на паўднёвых альбо ўсходніх межах Маскоўскага царства.

Так, у 1535 г. ён быў адпраўлены супраць татараў на поўдзень. Разам з князем Д. Ф. Бельскім быў ваяводам «в большом полку» на Каломне[291]. У пачатку 1536 г. быў ваяводам «за горадам» Мурамам і ў сакавіку быў пасланы царом на абарону Ніжняга Ноўгарада ад казанскіх татараў[292].

І ў 1537–1538 гг. Фёдар Міхайлавіч згадваецца ў разрадных кнігах як ваявода на Каломне і за Мурамам[293]. Апошні раз у якасці ваяводы князя Фёдара Міхайлавіча Мсціслаўскага мы сустракаем у 1539 г., калі ён прымае ўдзел у абароне краіны ад казанскіх татараў[294].

У той жа час летапісы сведчаць, што нягледзячы на нацягнутыя адносіны з Глінскімі, яго сям'я ўвесь час была побач з царскай. Яго жонка – княгіня

---

[288] Разрядные книги 1475–1598 гг. – С. 82.

[289] Смирнов И. И. Очерки политической истории Русского государства 30–50-х гг. XVI века. – М.; Л.: Изд-во АН СССР, Ленингр. отд., 1958. – С. 38–44.

[290] Каштанов С. М. Социально-политическая история России конца XV – первой половины XVI в. – М.: Наука, 1967. – С. 277–278, 291.

[291] Разрядные книги 1475–1598 гг. – С. 88.

[292] ПСРЛ. – Т. 13. – С. 97, 107; Разрядные книги 1475–1598 гг. – С. 88–89.

[293] Разрядные книги 1475–1598 гг. – С. 92, 93, 95, 96.

[294] Соловьев С. М. Сочинения. Т. 5–6. – С. 430; Разрядные книги 1475–1598 гг. – С. 95, 96.

Анастасія – даволі часта згадваецца побач з рэгентшай Аленай Глінскай на ўрачыстасцях[295].

Князь Фёдар Міхайлавіч памёр 30 чэрвеня 1540 г. Летапіс нават паведамляе дакладны час, калі гэта адбылося – у ноч з серады на чацвер, а пятай гадзіне раніцы. Пахаваны ён у Маскве, у Сіманаўскім манастыры, могілкі якога ў далейшым сталі фамільнай усыпальніцай маскоўскай галіны роду Мсціслаўскіх[296]. Род Мсціслаўскіх на працягу другой паловы XVI – пачатку XVII ст. быў адным з галоўных фундатараў Сіманава манастыра. Так, толькі ад князя Івана Фёдаравіча ён атрымаў звыш 400 рублёў і некалькі соцень чвэртак зерня[297]. У гэтым жа годзе 17 снежня памерла і жонка Фёдара Іванавіча Анастасія, якая была пахавана каля храма Узнясення, побач са сваёй маці[298].

Пасля сябе Фёдар Міхайлавіч пакінуў толькі аднаго нашчадка – князя Івана Фёдаравіча, які нарадзіўся ў 1530 г.[299] Гэта была поўная процілегласць неспакойнаму бацьку. Усё пачалося ўжо з таго, што ён вырас і быў выхаваны ў зусім іншых умовах і іншым кірунку, чым князь Фёдар Міхайлавіч. Гэта быў чалавек, які з маленства быў выхаваны для службы сваёй радзіме – Маскве – і разглядаў Вялікае Княства Літоўскае і Рэч Паспалітую як ворагаў. Па-другое, ён хаця і займаў высокія пасады, але за ўсё сваё жыццё рэдка калі рабіў нейкія самастойныя крокі. У той жа час ён прыходзіўся сваяком цару Івану IV, што дазваляла займаць высокія пасады ў кіраўніцтве дзяржавы. Ролю Мсціслаўскіх у краіне падкрэсліваў і той факт, што ў сярэдзіне 50-х гадоў XVI ст. у маскоўскім Крамлі нават існаваў двор Мсціслаўскіх[300].

Першы раз князь Іван Фёдаравіч Мсціслаўскі трапіў на старонкі пісьмовых крыніц у 1547 г., калі ў якасці рынды ён суправаджаў цара Івана IV падчас яго паездкі ў Каломну. Рындам Іван Фёдаравіч быў яшчэ і ў снежні 1548 г., калі для вырашэння казанскіх спраў цар ездзіў ва Уладзімір і Ніжні Ноўгарад. Але ўжо ў ліпені 1549 г. князь Іван Фёдаравіч Мсціслаўскі ў разрадных кнігах значыцца як баярын[301]. Гэты паход на Казань, верагодна, быў першым удзелам Івана Фёдаравіча ў ваенных падзеях Рускай дзяржавы сярэдзіны – другой паловы XVI ст. Ён знаходзіўся каля цара і ўваходзіў у лік «дворовых воевод»[302].

---

[295] ПСРЛ. – Т. 29. – С. 22, 23.

[296] Тамсама. – Т. 13. – С. 132; Древняя российская вивлиофика содержащая в себе собрание древностей российских, до истории, географии и генеалогии российских касающиеся: в 20 ч. – М., 1791. – Ч. XIX. – С. 384.

[297] Ивина Л. И. Вкладные и кормовые книги Симонова монастыря // Вспомогательные исторические дисциплины. – 1969. – Т. 2. – С. 237.

[298] ПСРЛ. – Т. 29. – С. 38.

[299] Раевский П. М. Род царя и царевен и князей Шуйских. – С. 28.

[300] Рябцов Н. Н. История литейного производства в СССР. – 2-е изд. – М.: Гос. науч.-тех. из-во машиностр. лит-ры, 1962. – Ч. 1. – С. 224.

[301] Разрядные книги 1475–1598 гг. – С. 111–113, 120; Зимин А. А. Состав боярской Думы // Археографический ежегодник за 1957 год. – М.: Наука, 1958. – С. 61; Хорошкевич А. Н. Россия в системе международных отношениях середины XVI века. – М.: Древнехранилище, 2003. – С. 80.

[302] Разрядные книги 1475–1598 гг. – С. 122.

У наступныя гады князь Іван Фёдаравіч Мсціслаўскі ў якасці ваяводы з ранняй вясны заступаў на абарону краіны ад крымскіх татараў. Так, у 1550 г. ён быў ваяводам у Туле, у 1551 г. – у Пронску[303].

Князь Іван Фёдаравіч Мсціслаўскі прымаў актыўны ўдзел у баявых дзеяннях рускіх войскаў падчас Казанскай кампаніі 1552 г. Але хаця ён, нягледзячы на сваю моладасць і адсутнасць ваеннага вопыту, намінальна камандаваў «вялікім палком», сапраўдным кіраўніком войска быў яго цесць, баярын князь А. Б. Гарбаты[304].

У далейшы час князь Іван Фёдаравіч Мсціслаўскі ўвесь час прымаў актыўны ўдзел у абароне краіны ад нападаў крымскіх татараў і нагайцаў. Мы сустракаем яго амаль у кожным роспісе палкам, які рабіў цар і вялікі князь маскоўскі Іван IV. Прычым, як правіла, ён узначальваў «большой полк» і толькі зрэдку «полк правай рукі»[305]. У 1555 г. Іван Фёдаравіч Мсціслаўскі згадваецца ў якасці баярына і намесніка Вялікага Ноўгарада[306].

У гады Інфлянцкай вайны князь Іван Фёдаравіч прыняў актыўны ўдзел у гэтым тэатры баявых дзеянняў. Ужо зімой 1558 г. ён разам з П. Шуйскім змаглі захапіць «Наримборх». У 1560 г. па загадзе цара узначальваў «большой полк» у паходзе рускіх войскаў на горад Вільяна і ўжо 30 жніўня Іван Фёдаравіч паведамляў цару пра яго захоп. А пасля Вільяны аддзелы рускіх войскаў пайшлі ваяваць іншыя лівонскія гарады – Кесь, Тарвас, Пайду, Руй, Пернаву, Апслу. У наступным годзе, згодна з роспісам па палках, князь Іван Фёдаравіч быў ваяводам у Холме, разам з П. І. Шуйскім і В. С. Сярэбраным[307].

Але ўжо ў 1563 г. нашчадак роду князёў мсціслаўскіх у першы раз прыйшоў на радзіму сваіх прашчураў у якасці захопніка. Разам з царом ён удзельнічаў у паходзе на Полацк і, мяркуючы па роспісе па палках, быў у палку «правой рукі». Пасля вяртання з паходу на Полацк князь Іван Фёдаравіч, згодна з роспісам па палках, заставаўся ваяводам у Вялікіх Луках, дзе быў на чале «большого полка»[308].

На працягу 1565–1569 гг. Іван Фёдаравіч Мсціслаўскі ўвесь час бараніў сваю краіну ад нападаў крымскіх татараў[309]. І ў 1570 г., калі ўзнікла новая небяспека з боку крымскага хана, цар Іван IV адправіў Івана Фёдаравіча Мсціслаўскага ваяводам палка правай рукі на Кашыру[310].

Ва ўнутрыдзяржаўным жыцці князь І. Ф. Мсціслаўскі пасля падзелу царом Іванам IV краіны на апрычніну і земшчыну стаў на чале апошняй.

---

[303] Разрядные книги 1475–1598 гг. – С. 124, 131.

[304] ПСРЛ. – Т. 13. – С. 184; Скрынников Р. Г. Царство террора. – С. 120.

[305] Разрядные книги 1475–1598 гг. – С. 142, 143, 147, 148. 151, 153, 156, 158, 160, 162, 167, 178.

[306] Соловьев С. М. Сочинения. В 18 кн. Кн. IV. История России с древнейших времен. Т. 7–8. – М.: Мысль, 1989. – С. 11.

[307] Разрядные книги 1475–1598 гг. – С. 190–192, 196.

[308] Тамсама. – С. 198, 200, 204, 208.

[309] Тамсама. – С. 208, 222–224, 229.

[310] Разрядная книга 1475–1605 гг. – М.: Изд-во Ин-та истории АН СССР, 1982. – Т. 2. – Ч. 2. – С. 260, 261.

Цар Іван IV высока ацэньваў тую працу, якую рабіў князь Іван Фёдаравіч па ўмацаванні дзяржавы. Як сведчаць сучаснікі, цар Іван IV увесь час абвяргаў шматлікія даносы на І. Ф. Мсціслаўскага і І. Д. Бельскага, гаворачы пры гэтым: «я и эти двое составляем три Московские столпа. На нас троих вся держава». Іван IV шырока выкарыстоўваў аўтарытэт удзельных князёў для расправы з непатрэбнымі яму членамі Баярскай думы[311]. Аднак гладкі жыццёвы лёс князя Івана Фёдаравіча некалькі перапыніўся ў 1571 г., пасля майскага пагрому Масквы татарамі.

Першыя звесткі пра татарскую небяспеку пачалі паступаць у Маскву яшчэ восенню 1570 г. Цар адправіў на поўдзень войска, але яно вярнулася ні з чым. Татары, пачуўшы пра падыход рускіх войскаў, вярнуліся ў Крым.

Іван IV застаўся вельмі незадаволены такім «пустым» для яго паходам. Ён убачыў тут чарговыя баярскія проіскі і жадаў знайсці вінаватых. Таму вясной, калі на мяжы ізноў пачаўся актыўны рух татараў, ваяводы з памежжа вырашылі не адсылаць у Маскву ніякіх звестак. Калі ж татары рушылі ўсёй сваёй сілай на Маскву, было ўжо позна.

Па-першае, руская армія была дэмаралізавана паразай 1570 г. пад Рэвелем. Па-другое, армія моцна пацярпела ад мору, які перакінуўся на яе з асаджанага Рэвеля. Па-трэцяе, рускія войскі былі раскіданы па ўсёй Лівоніі. Усё гэта прывяло да таго, што супраць 40 000 татараў і іх хаўруснікаў Іван IV змог выставіць толькі каля 6000 чалавек. Але татары нават з такім невялікім рускім войскам не пажадалі змагацца. Рускія войскі пад началам Івана IV чакалі татараў на р. Ака каля Серпухава, але татары перайшлі Аку каля Калугі і рушылі прама на Маскву. Цар кінуў войска і, аб'ехаўшы Маскву з усходу, паехаў у Ярослаўль, пакінуў сталіцу на абарону баяраў.

23 мая татары падышлі да Масквы і ў наступны дзень запалілі гарадскія пасады ў 10 местах. Як сведчыць летапіс, з раніцы стаяла ціхае надвор'е, але як толькі запалалі гарадскія канцы, паднялася бура, якая раздзьмула агонь. Пажар быў такім моцным, што хаваючыся ад яго на сваім падворку ў пограбе, дымам захлынуўся цяжка паранены кіраўнік земскага войска князь І. Д. Бельскі. Выгараў увесь горад. Ад Масквы застаўся цэлым адзін Крэмль.

Пачаўся пошук вінаватых у гэтай трагедыі, у першую чаргу – сярод земскіх баяраў. Галоўным вінаватым ў спаленні татарамі Масквы быў названы князь Іван Фёдаравіч Мсціслаўскі. Яго агаварыў палонны служылы татарын. Падчас катавання ён даў паказанні, што дзейнічаў па загадзе кіраўніка Баярскай думы І. Ф. Мсціслаўскага і Ф. І. Салтыкова. Яны, як быццам бы, паслалі яго да хана: «...а приказали с ним, чтобы царь (Девлет-Гірей) воротился к Москве, и только придет к Москве, и Москва будет его»[312].

Цар выкарыстаў паказанні перабежчыка, каб ускласці ўсю адказнасць за гэту катастрофу на кіраўнікоў Баярскай думы. Пасля гібелі І. Д. Бельскага

---

[311] Скрынников Р. Г. Опричный террор // Ученые записки Ленинградского государственного педагогического института им. А. С. Герцена. – Л., 1969. – Т. 374. – С. 199.

[312] Скрынников Р. Г. Опричный террор. – С. 131.

Іван Фёдаравіч Мсціслаўскі фактычна ўзначаліў земскае войска і, як галоўнакамандуючы, адпаведна нёс найбольшую адказнасць за спаленне Масквы. Але ў ходзе следства Мсціслаўскага разглядалі не столькі як кіраўніка войска, а як палітычнага злачынцу і загаворшчыка. Справа дайшла нават да таго, што яго абвінавацілі ў вераадступніцтве.

Паплечнік Мсціслаўскага Ф. Салтыкоў быў асуджаны на пажыццёвае зняволенне. Але потым па загадзе Івана IV яго пакаралі смерцю. Самога ж князя Івана Фёдаравіча цар памілаваў. Мсціслаўскі быў вымушаны падпісаць спецыяльную грамату, у якой прызнаўся, што разам са сваімі паплечнікамі навёў татараў і загубіў Маскву. Таксама ён даў абяцанне «впредь будучи, вера кристианская держати твердо, в вере не соблажнятися и к иной вере не приставати». За Мсціслаўскага перад царом паручыліся апрычнікі баяры князь Н. Р. Адаеўскі, князь Д. І. Хварасцінін, земскі баярын М. Я. Марозаў, яшчэ 285 розных «княжат» і «дзяцей баярскіх» і Свяшчэнны Сінод. У выпадку здрады князя Івана Мсціслаўскага паручыцелі павінны былі выплаціць у казну 20 000 рублёў і адказаць за гэта сваім жыццём[313].

Але ўжо ў пачатку восені 1571 г. цар дараваў «здраду» І. Ф. Мсціслаўскага і ў верасні гэтага года паслаў яго ў Ноўгарад. Згодна з роспісам па палках, ён лічыўся за «сторожевым полком», а потым наогул згадваўся сярод іншых наўгародскіх намеснікаў[314]. У студзені 1572 г. князь Мсціслаўскі ўзначаліў Баярскую думу, якая была сазвана ў Ноўгарадзе для перамоў са шведскімі пасламі[315].

У выніку падзей 1571 г. Іван Мсціслаўскі страціў частку сваіх вялікіх уладанняў. Гэта перш за ўсё адносіцца да зямель на поўдні краіны, на мяжы з Крымам. Падчас следства, у чэрвені–ліпені 1571 г. у Епіфанеўскі і Гародненскі ўезды, дзе размяшчаліся ўладанні Мсціслаўскіх, прыбылі царскія пісцы, якія склалі падрабязны вопіс канфіскаванай вотчыны Мсціслаўскага.

У Епіфані, якую князь І. Ф. Мсціслаўскі атрымаў незадоўга да 1565–1567 гг., ён сваім коштам пабудаваў крэпасць з дубовымі сценамі і трыма вежамі. У крэпасці была артылерыя, і яна ахоўвалася моцным гарнізонам. Каля горада стаялі дзве слабады пешых і конных стральцоў (142 двары) і восем казачых слабод, у якіх было каля 700 двароў. Усяго ў Епіфанеўскім уездзе Мсціслаўскаму належала 16 тысяч чвэрцяў пашні і 40 тысяч чвэрцяў «дзікага поля»[316].

---

[313] Собрание государственных грамот и договоров, хранящихся в государственной коллегии иностранных дел. – Ч. 1. – С. 561–562, № 196; с. 565–581, № 197, № 198.

[314] Разрядные книги 1475–1598 гг. – С. 242, 244, 245.

[315] СИРИО. – Т. 129. Памятники дипломатических сношений древней России с державами иностранными. Памятники дипломатических сношений Московского государства с шведским государством по высочайшему повелению изданные Императорским Русским историческим обществом. – Т. 1. (1556–1586). – М., 1910. – С. 215, 216, 219.

[316] Писцовые книги Московского государства. – Ч. 1. Писцовые книги XVI века.; отд. 2: местности губерний Ярославской, Тверской, Витебской, Смоленской, Калужской, Орловской, Тульской. – СПб.: Изд-во Имп-го Русского географ. общ-ва, 1877. – Стб. 1588–1591, 1595.

У Венеўскім уездзе Мсціслаўскаму належаў замак Гарадзенск (Венеў). Яго заснавальнікам быў баярын І. В. Бальшой Шарамецьеў, аднак пасля таго як ён у 1564 г. трапіў у царскую апалу, Іван IV у 1569–1570 гг. перадаў Гарадзенск разам з дварцовай воласцю Мсціслаўскаму.

У ім удзельны князь меў 100 стральцоў і пушкароў з «нарядом». У склад вотчыны ўдзельнага князя ўваходзіў пасад Гарадзенска з 42 дварамі сялян і 54 лаўкамі. Каля горада князь меў невялікі парахавы завод, млын і завод па вырабе цэглы. Акрамя таго, тут І. Ф. Мсціслаўскі валодаў яшчэ 10 тысячамі чвэрцяў пашні[317].

Канфіскацыя, верагодна, не закранула асноўнай тэрыторыі Юхацкага ўдзельнага княства, якім валодаў І. Ф. Мсціслаўскі. Згодна з вопісам, складзеным у 1568–1569 гг., гэты ўдзел уключаў у свой склад горад Юхаць, 6 пагостаў, 41 сяло і 646 вёсак[318]. У дадзеным выпадку, верагодна, цар Іван IV выканаў параду свайго бацькі адносна Мсціслаўскага – «не вступаться» ва ўдзел, які надаў яшчэ Васіль III князю Фёдару Міхайлавічу Мсціслаўскаму, а таксама ў тую частку вотчыны, «что аз придал сыну его князю Ивану»[319].

Аднак і пасля апалы 1571 г. князь Іван Фёдаравіч Мсціслаўскі працягваў прымаць актыўны ўдзел ва ўсіх вайсковых аперацыях рускай арміі. Так, у 1573 г. ён разам з царом удзельнічаў у паходзе на лівонскі горад Пайду, а потым прымаў удзел у паходах на іншыя лівонскія гарады. У 1574 і 1576 гг. ён згадваецца ў роспісах па палках, якія планаваліся для адпору паходаў казанскіх і крымскіх татараў[320].

Хутка Мсціслаўскі зноў трапіў у царскую апалу. Падчас першай кампаніі (1579 г.) караля Стэфана Баторыя Іван Фёдаравіч Мсціслаўскі разам з Сімяонам Бекбулатавічам узначальваў вялікі полк – быў галоўнакамандуючым рускай арміі. Таму пасля захопу Полацка войскамі ВКЛ на князя Івана Фёдаравіча Мсціслаўскага абрушыўся царскі гнеў. Іван IV нагадаў галоўнаму земскаму ваяводу пра яго літоўскае паходжанне і абвінавацiў у здрадніцкіх помыслах: «Ты, старый пёс, – казаў цар Мсціслаўскаму – до сих пор насыщен литовским духом; ты мне говорил, чтобы я выслал тебя с моими сыновьями в Полоцк для противодействия польскому королю. Ясно мне твоё коварство, так как ты намеревался стать вероломным и подвергнуть крайней опасности моих сыновей». Пасля гэтага Іван IV пачаў біць першага баярына думы, пакуль у яго руцэ не зламалася палка[321]. Сведчаннем гэтай працяглай апалы з'яўляецца і той факт, што І. Ф. Мсціслаўскі ў 1580 г. не быў запрошаны на вяселле цара з Марыяй Нагой[322].

---

[317] Писцовые книги Московского государства. – Стб. 1538–1542.

[318] Тамсама. – Стб. 1530–1537.

[319] Духовные и договорныя грамоты великих и удельных князей XIV–XVI вв. – М.; Л.: Изд. Акад. наук СССР, 1950. – С. 443.

[320] Разрядные книги 1475–1598 гг. – С. 248, 249, 251, 265.

[321] Скрынников Р. Г. Россия после опричнины. Очерки социальной и политической истории. – Л.: Изд-во ЛГУ, 1975. – С. 83.

[322] Скрынников Р. Г. Россия после опричнины. – С. 67.

Новыя няўдачы рускіх войскаў у Інфлянцкай вайне зноў патрабавалі пошуку вінаватых. Пасля чарговай няўдалай кампаніі на захадзе, калі рускія войскі былі вымушаны здаць Вялікія Лукі, цар хутка знайшоў вінаватага і зноў назваў імя галоўнага кіраўніка земшчыны. Хмары згусціліся над галовамі Мсціслаўскіх.

Князь І. Ф. Мсціслаўскі і яго сыны баяры Фёдар і Васіль сазналіся ў тым, што перад царом «во многих винах проступили» і «за свои вины били челом преосвещенным Деонисьем митрополитом». Мсціслаўскія пад прысягаю абяцалі цару не ад'язджаць да караля Стэфана Баторыя, а таксама і «города никакого не здати», абяцалі быць вернымі цару і яго дзецям, «служить и их землям прямити во всем в правду, безо всякие хитрости» і «и лиха и измены никоторые не учинити»[323].

Пачынаючы з 1577 г. крыніцы фіксуюць удзел у вайсковых паходах разам з бацькам і сыноў Івана Фёдаравіча – Васіля і Фёдара. Акрамя іх у князя Івана было яшчэ тры сыны – Пётр і два Іваны, але яны памерлі яшчэ у маленстве.

Фёдар Іванавіч Мсціслаўскі першы раз згадваецца ў 1577 г., калі ён атрымаў тытул баярына[324]. Падчас паходаў на Калывань у красавіку гэтага года ён ужо лічыцца адным з ваяводаў «большого полка», а ў жніўні ён быў у перадавым палку[325].

Восенню наступнага года ўсе прадстаўнікі рода Мсціслаўскіх стаялі «по берегу» – баранілі краіну ад крымскіх татараў. Іван Фёдаравіч быў у «большом полку», а першы раз згаданы яго сын Васіль быў тады ў палку «правай рукі». Восенню гэтага ж года выдаецца другая «роспись по полкам», згодна з якой старэйшы з Мсціслаўскіх быў у Серпухаве ў вялікім палку, Фёдар Іванавіч – у палку правай рукі ў Тарусе, а Васіль Іванавіч – у перадавым палку[326].

У студзені гэтага ж года Мсціслаўскія ўсе разам удзельнічалі ў паходзе на нямецкія землі, у якім Іван Фёдаравіч камандаваў вялікім палком, Васіль Іванавіч лічыўся ваяводам перадавога палка, а Фёдар Іванавіч быў ваяводам у палку правай рукі[327].

У ліпені 1579 г., калі цар аб'явіў новы паход на Лівонію, у роспісе князь Васіль Іванавіч значыцца першым ваяводам старажавога палка, якім акрамя яго камандавалі князі В. Ю. Булгакаў і М. Ю. Лыкаў. Але па прыбыцці войскаў у Пскоў цар выдае новы роспіс ваяводаў, згодна з якім Васіль Мсціслаўскі быў пастаўлены першым ваяводам палка левай рукі. У гэтым жа паходзе прымалі ўдзел Іван Фёдаравіч у якасці ваяводы вялікага палка і Фёдар Іванавіч у якасці ваяводы перадавога палка[328].

---

[323] Собрание государственных грамот и договоров, хранящихся в государственной коллегии иностранных дел. – Ч. 1. – С. 588; Скрынников Р. Г. Россия после опричнины. – С. 84.

[324] Платонов С. Ф. Очерки по истории смуты в Московском государстве XVI–XVII вв. – М.: Соцэкгиз, 1937. – С. 152.

[325] Разрядные книги 1475–1598 гг. – С. 273, 274, 278.

[326] Тамсама. – С. 283, 285.

[327] Тамсама. – С. 285, 286.

[328] Тамсама. – С. 292–296.

У лютым 1580 г. Васіль Іванавіч значыцца першым ваяводам перадавога палка, што стаяў у Калузе і абараняў Маскву ад татараў. А праз некаторы час у гэтым жа годзе ён стаяў «на Волаку от Литвы» першым ваяводам старажавога палка[329].

Апошні раз князь Васіль Іванавіч Мсціслаўскі згадваецца ў разрадных кнігах у 1582 г. падчас паходу на Лівонію. Напярэдадні паходу ён стаяў са старажавым палком у Зубцове, але ў роспісе ад 31 снежня 1582 г. ён значыцца ў якасці ваяводы палка правай рукі. У лютым 1582 г. князь Васіль Іванавіч разам з братам Фёдарам Іванавічам Мсціслаўскім, які ў гэтым паходзе быў першым ваяводам вялікага палка, атрымалі царскі загад ісці на Вялікі Ноўгарад[330], дзе Васіль Іванавіч і памёр 21 сакавіка[331].

Князь Фёдар Іванавіч таксама актыўна прымаў удзел у абароне дзяржавы. На працягу 1580–1584 гг. ён увесь час згадваецца ў крыніцах як адзін з найбольш актыўных ваяводаў. Асноўным напрамкам баявых дзеянняў, на якім яго выкарыстоўвалі, была абарона краіны ад крымскіх нападаў, таксама даволі часта ён удзельнічаў у паходах на шведскія ўладанні. Наогул у вайсковым выкарыстанні роду Мсціслаўскіх рускімі царамі выразна прасочваецца тэндэнцыя не накіроўваць іх на тэатры вайсковых дзеянняў супраць войскаў ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Толькі ў рэдкіх выпадках яны пасылаліся на заходнія межы Маскоўскай Русі.

Паміраючы, цар Іван IV, які добра разумеў здольнасці свайго слабога на розум сына князя Фёдара ў кіраванні дзяржавай, даверыў яго на папячэнне рэгенцкага савета. Кіраўніком савета стаў удзельны князь і першы земскі баярын думы Іван Фёдаравіч Мсціслаўскі. Членамі савета былі «дваравы» баярын князь І. П. Шуйскі, земскі баярын Н. Р. Юр'еў і «дваровы» аружнічы Б. Я. Бельскі[332].

Акрамя слабасці розуму цара Фёдара перад царскім домам стаяла яшчэ і другая праблема. У цара Фёдара з-за бясплоднасці яго жонкі Ірыны Гадуновай не было нашчадкаў. Гэта пагражала спыненнем дынастыі, што непакоіла Баярскую думу і яе кіраўнікоў. Князь Іван Мсціслаўскі як галава рэгенцкага савета распачаў барацьбу з Барысам Гадуновым за тое, каб развесці цара Фёдара з Ірынай Гадуновай і ажаніць яго са сваёй дачкой Ірынай. Аднак гэта барацьба ў 1584 г. закончылася для князя Івана Фёдаравіча паразай. Па Маскве пачалі распаўсюджвацца плёткі, быццам бы рэгент збіраўся запрасіць Б. Ф. Гадунова да сябе ў дом і забіць яго там падчас піру[333]. Першы баярын краіны быў вымушаны скласці рэгенцкія паўнамоцтвы і з'ехаць у манастыр.

---

[329] Разрядные книги 1475–1598 гг. – С. 303, 306.

[330] Тамсама. – С. 318, 324.

[331] Древняя российская вивлиофика. – Ч. 3. – С. 385; Бычкова М. Е. Родословные книги. – С. 83, 85.

[332] Скрынников Р. Г. Россия накануне «Смутного времени». – М.: Мысль, 1980. – С. 10–11.

[333] Скрынников Р. Г. Борис Годунов. – М.: Наука, 1978. – С. 27.

Але ў адрозненне ад іншых баяр, якія трапілі тады ў апалу, улічваючы, што князь Іван Фёдаравіч Мсціслаўскі прыходзіўся цару Фёдару траюрадным братам, справа была вырашана па-сямейнаму, і перад пастрыжэннем у манахі яму дазволілі паехаць на багамолле ў Салавецкі манастыр (23 ліпеня 1585 г.). Толькі пасля гэтага ён паехаў на Белавозера ў Кірылаў манастыр, дзе і пастрыгся пад імем старца Іоны. У манастыры князь Іван Фёдаравіч пражыў яшчэ 7 гадоў і памёр 7 мая 1593 г.[334]

З прыватнага жыцця князя Івана Фёдаравіча вядома, што ў лютым 1547 г. ён ўзяў шлюб з Ірынай, дачкой князя Аляксандра Іванавіча Гарбатага-Шуйскага, з якой жыў да яе смерці 6 жніўня 1566 г.[335] Другой жонкай князя Івана была Анастасія Уладзіміраўна Варатынская.[336]

У князя Івана Фёдаравіча было шмат дзяцей, з якіх, як ужо адзначалася вышэй, пяцёра сыноў. Адносна колькасці дачок адзіная думка ў даследчыкаў адсутнічае. Згодна са звесткамі А. Б. Лабанава-Растоўскага і А. Барсукова, у Івана Фёдаравіча было трое дачок – Анастасія, Ірына і Марфа. Н. Мятлеў лічыць, што дачок у князя Івана Фёдаравіча было чатыры – Анастасія, Марфа і дзве Ірыны[337].

Анастасія была ў шлюбе з царэвічам Сімяонам Бекбулатавічам з 1573 г., а пасля яго смерці пайшла ў манастыр, дзе і памерла пад імем схімніцы Аляксандры 7 чэрвеня 1607 г. Пахавана яна ў сямейнай пахавальні князёў Мсціслаўскіх у Маскоўскім Сіманаўскім манастыры[338].

Адна з дачок Івана Фёдаравіча Ірына, на думку А. Б. Лабанава-Растоўскага, А. Барсукова і іншых даследчыкаў, была прэтэндэнткай на месца жонкі цара, у 1587 г. яна была пастрыжана ў манахіні і саслана ў манастыр, дзе і знаходзілася пад імем схімніцы Аляксандрыі да сваёй смерці, якую напаткала 15 лістапада 1639 г. Яе імя яшчэ трапляецца ў крыніцах у пачатку 90-х гадоў XVI ст., калі яна купіла землі ў князя В. П. Турэніна[339], але потым яе імя знікае са старонак крыніц.

Адносна малодшай з дачок Івана Фёдаравіча, Марфы, Н. Мятлеў і Е. Вольф сцвярджаюць, што яна была ў шлюбе з князем Васілём Чаркаскім[340]. Аднак Р. Скрыннікаў сцвярджае, што замуж за Васіля Чаркаскага была выдадзена

---

[334] Скрынников Р. Г. Россия накануне «Смутного времени». – С. 27–29.

[335] Древняя российская вивлиофика. – Ч. 3. – С. 384; Wolff J. Kniazowie litewsko-ruscy od konca czternastego wieku. – S. 269.

[336] Раевский П. М. Род царя и царевен и князей Шуйских. – С. 28.

[337] Русская родословная книга. – С. 42; Барсуков А. П. Сведения об Юхотской волости. – С. 18; Мятлев Н. К родословию князей Мстиславских. – С. 306.

[338] Раевский П. М. Род царя и царевен и князей Шуйских. – С. 28; Мятлев Н. К родословию князей Мстиславских. – С. 306.

[339] Акты феодального землевладения и хозяйства. Акты Московского Симонова монастыря (1505–1613 гг.). – Л.: Наука, Ленинградское отдел., 1983. – С. 250–251.

[340] Wolff J. Kniazowie litewsko-ruscy od konca czternastego wieku. – S. 269; Мятлев Н. К родословию князей Мстиславских. – С. 306–307.

прэтэндэнтка на царскі трон – княжна Ірына Мсціслаўская[341]. Акрамя таго, вядома, што адна з дачок Івана Фёдаравіча была замужам за І. Ю. Галіцыным[342].

Мал. 33. Князь Фёдар Іванавіч Мсціслаўскі

Найбольшыя пытанні выклікае наяўнасць у князя Івана Фёдаравіча яшчэ адной дачкі Ірыны. На думку Н. Мятлева, дакладна высветліць, хто быў мужам старэйшай з дзвюх Ірын, немагчыма з-за адсутнасці крыніц[343]. Іншыя даследчыкі наогул адмаўляюць факт яе існавання.

Згода князя Івана Фёдаравіча на добраахвотнае выгнанне выратавала ад апалы іншых членаў яго сям'і. Яго старэйшы сын баярын Фёдар Іванавіч (мал. 33) замяніў бацьку на пасадзе першага баярына думы. Пачынаючы з 1585 г. ён увесь час займаў пасаду галоўнага ваяводы ў войску і старшага баярына на ўрачыстых прыёмах. Ён увесь час служыў у Маскве, ні адна з буйных палацавых цырымоній не абыходзілася без яго ўдзелу. Прыгаворы Баярскай думы пачыналіся са слоў: «... и бояре, князь Фёдор Иванович Мстиславский приговорили...»[344].

Аднак яго палажэнне ў краіне не было бязвоблачным. Справа ў тым, што адстаўка яго бацькі абвастрыла барацьбу паміж Гадуновымі і знаццю. Гадуноў нават чакаў смуты і рыхтаваўся да ўцёкаў з Расіі. Крызіс улады абвастрыўся вясной 1586 г., калі памёр М. Р. Юр'еў. Барацьба вялася ў асноўным з прычыны бясплоднасці царыцы Ірыны Гадуновай і небяспекі спынення дынастыі. Частка членаў Баярскай думы спрабавалі развесці царя Фёдара з Ірынай і ажаніць яго з дачкой Івана Фёдаравіча Мсціслаўскага Ірынай, пра што мы ўжо пісалі вышэй. Аднак разлад паміж членамі думы не дазволіў давесці гэтую справу да канца.

Акрамя таго, у той час шукаліся і іншыя выхады з гэтай сітуацыі. Першы быў у тым, каб пасадзіць на царскі трон прадстаўніка мясцовага баярскага роду. А па-другое, была партыя прыхільнікаў запрашэння на рускі трон польскага караля. Кіраўніком апошняй партыі і быў князь І. Ф. Мсціслаўскі. Гэта

---

[341] Скрынников Р. Г. Россия накануне «Смутного времени». – С. 28; Русская родословная книга. – С. 42; Реляция Петра Петрея о России начала XVII в. – М.: Наука, 1976. – С. 78–79.

[342] Павлов А. П. Государев двор и политическая борьба при Борисе Годунове (1584–1605 гг.). – СПб.: Наука, СПб. отделение. 1992. – С. 84.

[343] Древняя российская вивлиофика. – Ч. 3. – С. 388; Мятлев Н. К родословию князей Мстиславских. – С. 306.

[344] Павлов А. П. Государев двор и политическая борьба... – С. 78.

партыя паступова набірала моц, аднак смерць караля Стэфана Баторыя ў канцы 1586 г. спыніла распрацоўку гэтага пытання і пазіцыя Гадунова некалькі ўмацавалася.

У астатнія гады царавання Фёдара Іванавіча князь Фёдар Мсціслаўскі нічым асабліва не вылучаўся. Ён увесь час знаходзіўся побач з царом. Так, у студзені 1590 г. Фёдар Іванавіч Мсціслаўскі ў якасці ваяводы вялікага палка разам з царом удзельнічаў у паходзе на Швецыю[345]. Летам 1591 г. галоўнакамандуючы рускай арміяй князь Фёдар Мсціслаўскі разам з баярынам Б. Ф. Гадуновым бараніў Маскву ад набегу крымскага хана Казы-Гірэя[346]. Прычым дзеянні іх былі такімі ўдалымі, што цар Фёдар Іванавіч кожнаму з іх выдаў у якасці ўзнагароды «залаты протуган», а таксама былі ўзнагароджаны «... шубами и кубками и вотчинами»[347]. І пазней, напрыканцы XVI ст., князь Фёдар Іванавіч Мсціслаўскі прымаў актыўны ўдзел у ваенным жыцці Рускай дзяржавы.

Пасля смерці цара Фёдара Іванавіча, які не пакінуў нашчадкаў, перад Рускай дзяржавай паўстала пытанне аб змене дынастыі. Са студзеня 1598 г. у Літву паступалі звесткі пра тое, што ў Маскве вызначыліся чатыры галоўныя прэтэндэнты: Ф. І. Мсціслаўскі, Ф. М. Раманаў, Б. Я. Бельскі і Б. Ф. Гадуноў.

Прозвішча Ф. І. Мсціслаўскага значылася першым, але яго рэальныя шансы на абранне на царскі трон былі мінімальнымі. Хоць у яго жылах і цякла каралеўская кроў, ён быў прапраўнукам Івана III і займаў пасаду галавы Баярскай думы, сярод карэннай рускай знаці выхадцы з Вялікага Княства Літоўскага Мсціслаўскія не мелі павагі[348]. Маскоўскія баяры невысока ацэньвалі паходжанне Мсціслаўскіх, сцвярджаючы, што «вялікімі» іх зрабіў Іван IV, улічваючы сваё з імі сваяцтва. І час ад часу баяры выказвалі гэта прама ў вочы Мсціслаўскім[349]. Акрамя таго, як адзначае С. М. Салаўёў, прадстаўнікі гэтага роду на маскоўскай службе не вылучаліся сваёй энергіяй і здольнасцямі[350].

У гэтай барацьбе на першае месца паступова выходзіць Б. Ф. Гадуноў. Яго поспехі ў барацьбе за маскоўскі трон прывялі да кансалідацыі баярскай арыстакратыі супраць яго. Апазіцыю ўзначаліў князь Іван Багданавіч Бельскі, які змог угаварыць прэтэндэнтаў на трон дзейнічаць разам і падтрымаць кандыдатуру царэвіча Сімяона Бекбулатавіча. Сярод ініцыятараў выступлення не было афіцыйнага галавы думы князя Ф. І. Мсціслаўскага але, верагодна, апазіцыя Б. Ф. Гадунову спадзявалася на яго спачуванне Сімяону, які прыходзіўся яму шурынам. Тым не менш, палітычныя гульні што цягнуліся амаль увесь 1598 г., закончыліся 3 верасня абраннем на маскоўскі трон Барыса Фёдаравіча Гадунова.

Князь Фёдар Іванавіч Мсціслаўскі па-ранейшаму стаяў першым у шэрагу знатных родаў, займаў першае месца ў думе. Але, як і яго бацька, па сваіх здо-

---

[345] Соловьев С. М. Сочинения. – Т. 7–8. – С. 225.

[346] Скрынников Р. Г. Россия накануне «Смутного времени». – С. 89–91.

[347] Разрядные книги 1475–1598 гг. – С. 448, 450–451.

[348] Скрынников Р. Г. Россия накануне «Смутного времени». – С. 129–130.

[349] Платонов С. Ф. Очерки по истории смуты. – С. 176, 206.

[350] Соловьев С. М. Сочинения. – Т. 7–8. – С. 183–184.

льнасцях і характары ён павінен быў саступіць гэта месца старэйшаму ў другім знакамітым родзе – князю Васілю Іванавічу Шуйскаму, які пераўзыходзіў Фёдара Іванавіча сваёй здольнасцю да пачынання новых спраў, колькасцю паплечнікаў.

Аднак Барыс Гадуноў баяўся абодвух і аднолькава праследаваў. Жадаючы спыніць гэтыя роды, якія па сваёй радавітасці пераўзыходзілі Гадуновых, цар Барыс абодвум забараняў браць шлюб[351].

Адносна ціхае і непрыкметнае жыццё Фёдара Іванавіча Мсціслаўскага працягвалася да з'яўлення першага ў гісторыі Ілжэдзмітрыя. Пасля яго першых поспехаў цар Барыс сабраў войска, якое ў лістападзе 1604 г. узначаліў Ф. І. Мсціслаўскі.

Адпраўляючы Ф. І. Мсціслаўскага ў паход, цар абнадзеіў яго ў чарговы раз, што выдасць за яго замуж сваю дачку і дасць у якасці пасагу Казань і Севярскую зямлю. Але князь Фёдар Іванавіч не апраўдаў спадзяванняў Гадунова. Нягледзячы на тое, што пад яго кіраўніцтвам было 50-тысячнае войска, а ў Ілжэдзмітрыя I толькі 15 тысяч, ён, сустрэўшы самазванца пад Ноўгарад-Северскім, цягнуў з пачаткам бітвы. 21 студзеня Ілжэдзмітрый сам пачаў бітву і даволі хутка выйграў яе. Мсціслаўскі быў паранены. Яго войскі страцілі 4000 забітымі, і толькі нявопытнаць Ілжэдзмітрыя ў вайсковай справе выратавала князя Фёдара ад поўнага разгрому[352].

На дапамогу параненаму Ф. І. Мсціслаўскаму цар Барыс паслаў князя Васіля Іванавіча Шуйскага, і барацьба з самазванцам пайшла больш актыўна. У новай бітве, якая адбылася паміж войскамі Ілжэдзмітрыя і цара, войскі самазванца былі разбіты, але тут Мсціслаўскі не праявіў напору і не праследаваў войскі самазванца, такім чынам даў яму магчымасць аправіцца ад паразы.

У далейшым усю вясну 1605 г. Мсціслаўскі як царскі ваявода не праяўляў актыўнасці і нават цярпеў няўдачы ў барацьбе з Ілжэдзмітрыем, чым выклікаў незадаволенасць цара Барыса[353]. Так працягвалася да красавіка 1605 г.

13 красавіка 1605 г. памёр цар Барыс Гадуноў. Масква спакойна прысягнула на вернасць яго сыну Фёдару, але не так спакойна было па-за яе межамі. На чале войска стаялі два радавітыя баярыны, якія раней прэтэндавалі на царскі трон – князі Фёдар Іванавіч Мсціслаўскі і Васілій Іванавіч Шуйскі. Іх бяздзейнасць прывяла да таго, што Фёдар Гадуноў адхіліў абодвух ад кіравання войскам. Але гэта ўжо не змагло выратаваць Гадуновых. Нежаданне большасці баяр бачыць Гадуновых на царскім троне прывяло да таго, што яны здрадзілі яму і прызналі самазванца сапраўдным царэвічам Дзмітрыем.

7 мая войску аб'явілі, што Ілжэдзмітрый I з'яўляецца сапраўдным царэвічам. Войска Ілжэдзмітрыя I рушыла на Маскву. Антыгадуноўскі пераварот

---

[351] Соловьев С. М. Сочинения. – Т. 7–8. – С. 387.

[352] Тамсама. – С. 406.

[353] Скрынников Р. Г. Царь Борис и Дмитрий Самозванец. – Смоленск: Русич, 1997. – С. 329–347.

узначальвалі кіраўнікі Баярскай думы. Князям Ф. І. Мсціслаўскаму і Д. І. Шуйскаму было даручана пасадзіць Гадуновых у турму.

Насамрэч экзекуцыяй над Гадуновымі кіравалі М. Малчанаў і А. Шэрафетцінаў – былыя апрычнікі. Пасля чаго яны аб'явілі, што царыца і царэвіч Фёдар Гадуноў нібыта самі атруціліся. Зыходзячы з гэтай афіцыйнай версіі, Баярская дума забараніла праводзіць традыцыйны абрад пахавання. Труп царыцы Марыі Гадуновай адвезлі ў жаночы Варсунафееўскі манастыр на Срэценцы і там закапалі па-за сценамі царквы. У адну з ёй яму былі скінуты целы Барыса і Фёдара Гадуновых[354].

20 чэрвеня 1605 г. самазванец урачыста ўехаў у Маскву. Ілжэдзмітрыя І ўрачыста сустракалі за 30 вёрст ад Масквы, прычым сярод тых, хто сустракаў яго, былі абодва былыя кіраўнікі войска – князі Ф. І. Мсціслаўскі і В. І. Шуйскі.

Самазванец, сеўшы на маскоўскі прастол, пачаў актыўна шукаць паплечнікаў. У гэтай сувязі ён падараваў князю Фёдару Іванавічу Мсціслаўскаму стары Цара-Барысаў, двор у Крамлі і ажаніў яго са сваёй уяўнай цёткай з роду Нагіх[355].

Аднак яго праўленне ў Маскве не было доўгім. Праз год, у ноч з 16 на 17 мая 1606 г. у выніку мяцяжу, арганізаванага князьмі Васілём Іванавічам Шуйскім і Васілём Галіцыным, Ілжэдзмітрый быў забіты.

Ці прымаў удзел у гэтай справе князь Фёдар Іванавіч Мсціслаўскі, дакладна не вядома. Але ўлічваючы, што ён не разглядаўся ў якасці кандыдата па царскі трон, хутчэй за ўсё, не. Ужо праз два дні пасля забойства Ілжэдзмітрыя князь Васіль Іванавіч Шуйскі быў абраны новым царом.

У гады знаходжання на маскоўскім прастоле Васіля Іванавіча Шуйскага (1606–1610) князь Фёдар Іванавіч Мсціслаўскі нічым асабліва не вылучыўся. Толькі ў самым пачатку праўлення Васіля Шуйскага была спроба арганізаваць дзяржаўны пераварот і пасадзіць на трон Ф. І. Мсціслаўскага. Але яго арганізоўваў не сам князь Фёдар, а яго сваяк П. Н. Шарамецьеў, за плячамі якога стаялі Раманавы[356].

Як і раней, Ф. І. Мсціслаўскі, хоць і быў прадстаўніком самага знакамітага роду, заставаўся ў цяні падчас тых палітычных гульняў, што разгортваліся ў краіне. Па сведчанні сучаснікаў, у яго цалкам адсутнічала славалюбства. Ён нават пагражаў сысці ў манастыр, калі яго абяруць на царскі трон[357]. Верагодна, яго ўзаемаадносіны з царом Васілём Шуйскім былі даволі роўныя, бо падчас царавання Шуйскага князь Ф. І. Мсціслаўскі атрымаў ад цара Васіля Яраполчанскую воласць[358], а ў 1607 г. Ф. І. Мсціслаўскі разам з Ів. Ів. Шуйскім кіраваў войскам падчас паўстання Балотнікава[359].

---

[354] Скрынников Р. Г. Царь Борис и Дмитрий Самозванец. – С. 329–347.

[355] Платонов С. Ф. Очерки по истории смуты. – С. 220; Скрынников Р. Г. Царь Борис и Дмитрий Самозванец. – С. 441.

[356] Платонов С. Ф. Очерки по истории смуты. – С. 234.

[357] Тамсама. – С. 231.

[358] Ивина Л. И. Внутреннее освоение земель России в XVI в. Историко-географическое исследование по материалам монастырей. – Л.: Наука, Ленинградское отдел., 1985. – С. 170.

[359] Платонов С. Ф. Очерки по истории смуты. – С. 258.

Аднак пасля звяржэння з маскоўскага прастола В. І. Шуйскага 17 ліпеня 1610 г. князь Фёдар Іванавіч апынуўся ў самым цэнтры палітычных гульняў, што пачаліся за вакантны прастол у перыяд міжцарствія.

Ф. І. Мсціслаўскі як першы баярын думы зараз стаў на чале дзяржавы і ўзначаліў так званую «Сямібаяршчыну». Да абрання новага цара кіраўніцтва краінай апынулася ў руках думы. Падчас распачатай барацьбы за маскоўскі трон Ф. І. Мсціслаўскі аб'явіў, што сам ён не жадае быць прэтэндэнтам на цараванне, але ў той жа час не жадае бачыць царом каго-небудзь з бараў. На яго думку, прэтэндэнт на царскі трон павінен паходзіць з іншаземнага каралеўскага роду. Таму ён быў прыхільнікам абрання на маскоўскі трон каралевіча Рэчы Паспалітай – Уладзіслава, сына караля Жыгімонта Вазы. Другі бок бачыў будучым рускім царом аднаго з двух кандыдатаў на прастол – князя Васіля Васільевіча Галіцына ці чатырнаццацігадовага Міхаіла Фёдаравіча Раманава.

У гэты час пад Масквой стаяла вайска Ілжэдзмітрыя II, якому хацеў здаць сталіцу баярын Захар Ляпуноў. Даведаўшыся пра гэта, князь Ф. І. Мсціслаўскі паслаў ганца да Гансеўскага, які стаяў пад Мажайскам, з тым каб той хутчэй ішоў пад Маскву. Войскі Гансеўскага і самазванца з двух бакоў падышлі да Масквы. Супраць Ілжэдзмітрыя II з войскам выступіў Фёдар Мсціслаўскі, які адначасова пачаў перамовы з Гансеўскім аб умовах яго дапамогі ў барацьбе з самазванцам. Гансеўскі абяцаў дапамогу ў выпадку абрання каралевіча Уладзіслава на маскоўскі трон. Кіраўніцтва «Сямібаяршчыны» ў гэты час спрабавала праводзіць палітыку па дапрацоўцы дамовы, якая была заключана 4 лютага 1610 г. у тушынскім лагеры, з прадстаўнікамі Рэчы Паспалітай пра абранне каралевіча Уладзіслава на рускі трон.

Але галоўным праціўнікам Уладзіслава быў патрыярх Гермаген, які не жадаў бачыць на маскоўскім троне каталіка. Першую ўмову – прыняцце Уладзіславам праваслаўя для выбрання яго на трон – падтрымалі і баяры. Гансеўскі не меў паўнамоцтваў самому вырашыць гэта пытанне. Таму на яго перамовах з Ф. І. Мсціслаўскім гэта пытанне было адкладзена, але па іншых пытаннях удалося дамовіцца, і 27 жніўня 1610 г. на паўдарозе ад польскага стана да Масквы адбылася ўрачыстая прысяга жыхароў Масквы на вернасць каралевічу Уладзіславу. На другі дзень прысяга адбылася ва Успенскім саборы ў прысутнасці патрыярха.

Аднак ужо напрыканцы 1610 г. часовы маскоўскі ўрад на чале з Мсціслаўскім фактычна страціў уладу, і апошняя фактычна аказалася ў руках караля Жыгімонта. Роля Баярскай думы і князя Мсціслаўскага стала чыста намінальнай.

Пасля смерці Ілжэдзмітрыя II у караля Жыгімонта і яго маскоўскіх прыхільнікаў не было больш падставы патрабаваць далейшага руху караля ў рускія воласці. Зараз маскоўскія баяры, якія раней прызнавалі царом Уладзіслава з-за боязні самазванца, маглі дзейнічаць больш вольна і не аглядацца на саюзнікаў з Рэчы Паспалітай. Барацьбу за вызваленне Масквы і Расіі ад войскаў Рэчы Паспалітай узначаліў патрыярх Гермаген. Ён адкрыта прызываў паству на ба-

Мал. 34. Пячатка князя Фёдара Іванавіча Мсціслаўскага 1611 г. (па: Цітоў А. Геральдыка Беларусі. Мінск, 2007)

рацьбу, рассылаючы ў розныя гарады граматы з прызывам да супраціву, і адначасова ён разарваў адносіны з урадам Сямібаяршчыны.

На працягу 1611 г. князь Фёдар Іванавіч Мсціслаўскі нічым асабліва не вылучаўся і яго актыўнасць у палітычнай барацьбе не была заўважана. У гэты ж год ён са згоды караля Жыгімонта Вазы змяніў свой фамільны герб. Калі раней фамільным гербам князёў Мсціслаўскіх была «Пагоня», то зараз гербам Мсціслаўскіх стаў каранаваны леў, павернуты ў левы бок, з надпісам «Fedor Dei Gratis Dux Mstislavis» (мал. 34). Верагодна, менавіта з гэтага герба вядзе свой пачатак пячатка Мсціслаўскага княства, пазначаная на вялікай пячатцы Расійскай імперыі[360].

Пасля ўваходу рускіх войскаў у Маскву зноў узнікла пытанне пра абранне новага цара. Падчас абрання ў лютым 1613 г. на маскоўскі трон прадстаўніка новай дынастыі князь Фёдар Міхайлавіч Мсціслаўскі і яго сябры, якім было нязручна знаходзіцца побач з ваяводамі, што прымалі ўдзел у барацьбе з Рэччу Паспалітай, з'ехалі з Масквы.

7 лютага 1613 г. папярэдне быў абраны на маскоўскі трон Міхаіл Фёдаравіч Раманаў. Але з-за адсутнасці ў Маскве на той час прадстаўнікоў знатных родаў і некаторых гарадоў сабор на працягу двух тыдняў не мог прыняць канчатковае рашэнне пра абранне цара. Толькі пасля таго як вярнуліся ў Маскву Ф. І. Мсціслаўскі са сваімі паплечнікамі, прыехалі прадстаўнікі іншых гарадоў, 21 лютага 1613 г. адзінагалосна рускім царом быў абраны Міхаіл Фёдаравіч Раманаў.

Ф. І. Мсціслаўскі пасля гэтага спакойна жыў да сваёй смерці, займаючы, як і раней, пасаду першага баярына думы. Пасля абрання Міхаіла Раманава на царскі стол князь Фёдар Іванавіч да мая 1613 г. працягваў узначальваць часовы урад Рускага царства. Нават падчас вянчання Міхаіла Раманава на царства князь Фёдар асыпаў цара грашыма, калі той выходзіў з крамлёўскага сабора[361].

Падчас першага дзесяцігоддзя царавання Раманавых князь Фёдар Іванавіч, як і раней, займаў першае месца ў Баярскай думе. Ён заставаўся прадстаўніком

[360] Раевский П. М. Род царя и царевен и князей Шуйских. – С. 22; Цітоў А. Геральдыка Беларусі. – Мінск: МФЦП, 2007. – С. 105.

[361] Преображенский А. А., Морозова Л. Е., Демидович Н. Ф. Первые Романовы на Российском престоле. – М.: Русское слово, 2000. – С. 45.

баяраў, і па-ранейшаму ў Рускім царстве звароты баяраў пачыналіся са слоў: «Бояре – князь Ф. И. Мстиславский с товарищами приговорили…»[362].

Акрамя таго, нягледзячы на пазіцыю, якую займаў Фёдар Мсціслаўскі падчас смуты, новы цар Міхаіл Раманаў неаднаразова надаваў яму новыя маёмасці, і напярэдадні сваёй смерці князь Фёдар Іванавіч быў адным з найбуйнейшых феадалаў Рускага царства. Так, толькі ў Галіцкім уездзе яму належалі 3 сялы, 6 прысёлкаў, 13 пагостаў, 446 вёсак, 50 пачынкаў, 24 пусташы, 16 займішчаў і звыш за 6500 дзесяцінаў зямлі. Валоданні князя Ф. І. Мсціслаўскага па р. Вятлуга і яе прытоках – рэках Фердаса, Хлышчоўка, Упамінка, Нужна і іншых на поўнач і на паўночны захад ад г. Вятлугі распасціраліся больш чым на 100 вёрстаў[363].

Памёр Фёдар Іванавіч Мсціслаўскі 19 лютага 1622 г.[364], і з яго смерцю спынілася мужчынская галіна роду князёў Мсціслаўскіх, і самому роду было наканавана згаснуць.

Пра жонак князя Фёдара Іванавіча вядома няшмат. Верагодна, першай з іх была княгіня Ульяна, пра якую вядома толькі, што яна памерла 6 красавіка 1586 г.[365] Другі раз князь Фёдар Іванавіч узяў шлюб ужо ў сталым узросце, бо, як ужо адзначалася вышэй, цар Барыс Гадуноў не дазваляў яму ажаніцца, спадзеючыся такім чынам спыніць род Мсціслаўскіх. У трэці раз князь Фёдар Іванавіч ажаніўся з дапамогай Ілжэдзмітрыя I, які выбраў для яго жонку сярод сваіх «сваякоў»: ёю стала Праскоўя Іванаўна Нагая[366].

Але і з ёю сямейнае жыццё князя Фёдара Іванавіча Мсціслаўскага, верагодна, не было доўгім і шчаслівым. Праскоўя Іванаўна даволі хутка памерла, але, магчыма, ад шлюбу з ёю ў Фёдара Іванавіча нарадзіліся сын Васіль і дачка Вольга.

Апошняй жонкай Фёдара Іванавіча была Дамініка Міхайлаўна з роду Цёмкіных-Растоўскіх, якая перажыла мужа на 8 гадоў і памерла 7 ліпеня 1630 г.[367] Ці былі дзеці ў Фёдара Іванавіча ад гэтага шлюбу, дакладна не вядома.

Згодна з П. М. Раеўскім, у Фёдара Іванавіча ад шлюбу з Праскоўяй Нагой былі чатыры дачкі – Марыя, Вольга, Еўдакія і Ірына. Ад шлюбу з Дамінікай Міхайлаўнай у яго было двое дзяцей – Васіль і яшчэ адна дачка Ірына – малодшая[368].

Адносна таго, калі памерлі ягоныя сын Васіль і тры дачкі – Еўдакія, Марыя, Ірына, нічога не вядома. Верагодна, гэта адбылося яшчэ ў маленстве. Дак-

---

[362] Соловьев С. М. Сочинения. – Т. 9–10. – М.: Мысль, 1990. – С. 248.

[363] Ивина Л. И. Внутреннее освоение земель России в XVI в. – С. 154.

[364] Древняя российская вивлиофика. – Ч. 3. – С. 388.

[365] Тамсама. – С. 385.

[366] Мятлев Н. К родословию князей Мстиславских. – С. 308–310.

[367] Древняя российская вивлиофика. – Ч. 3. – С. 385–386, 388; АЗР. – Т. 1. – Прибавления, с. 6; Барсуков А. П. Сведения об Юхотской волости. – С. 15, 21.

[368] Раевский П. М. Род царя и царевен и князей Шуйских. – С. 30.

ладна вядома дата смерці другой па старшынстве дачкі Вольгі Фёдараўны – 3 снежня 1609 г. Старэйшая дачка Ірына памерла 26 лістапада 1620 г.[369]

Са смерцю Фёдара Іванавіча Мсціслаўскага спыніла сваё існаванне маскоўская галіна роду князёў Мсціслаўскіх, якая служыла Маскве на працягу амаль 100 гадоў. Маскоўскую галіну роду Мсціслаўскіх напаткаў лёс усіх яго папярэднікаў. Як першапачынальнік роду мсціслаўскіх князёў – род Лынгвеневічаў – спыніў сваё існаванне з-за адсутнасці мужчын, так і іх спадкаемца князь Міхаіл Іванавіч Жаслаўскі не змог па сябе пакінуць у Мсціславе нашчадкаў па мужчынскай лініі. Зараз жа па смерці апошняга прадстаўніка маскоўскай галіны роду князі Мсціслаўскія канчаткова зніклі з гістарычнай арэны.

Пасля згасання маскоўскай галіны роду князёў Мсціслаўскіх тытул князёў мсціслаўскіх у той час, калі Мсціслаў уваходзіў у склад Рускага царства і Расійскай імперыі, насілі прадстаўнікі царскага роду Раманавых.

Так, князем мсціслаўскім тытулаваўся цар Аляксей Міхайлавіч (1654–1672 гг.). Мсціслаў быў захоплены рускімі войскамі 22 ліпеня 1654 г., а ўжо 28 ліпеня цар выдаў загад аб унясенні ў яго тытул назвы князя Полацкага і Мсціслаўскага. Прычым дапаўненне «князь Мсціслаўскі» павінна было згадвацца пасля тытула князя Кандынскага[370]. Мсціслаўскай княгіняй тытулавалася імператрыца Кацярына II (1772–1795 гг.), князямі – імператары Павел I (1796–1801 гг.), Аляксандр I (1801–1825 гг.), Мікалай I (1825–1854 гг.), Аляксандр II (1854–1881 гг.), Аляксандр III (1881–1894 гг.), Мікалай II (1894–1917 гг.).

Нават на пахаванні імператара Аляксандра III у працэсіі ішлі герольд з двума асістэнтамі, якія неслі мсціслаўскі сцяг і вялі коней, пакрытых траурнай доўгай папонай, упрыгожанай па баках гербамі Мсціслаўскага княства[371].

У гісторыі Мсціслаўскага княства, акрамя шлюбаў князя Сямёна-Лынгвена з прадстаўніцамі маскоўскага княскага дому і сваяцтва маскоўскай галіны князёў Мсціслаўскіх з рускім вялікакняскім домам, быў яшчэ адзін сюжэт, калі прадстаўнікі княскага роду, які паходзіў з тэрыторыі, прылеглай да Мсціслава, мелі сямейныя сувязі з маскоўскім вялікакняскім домам.

У другой палове XV ст. Леў Глінскі, які быў служылым баярынам мсціслаўскага князя Івана Юр'евіча і валодаў «сяльцом Ходасавым», ажаніўся з ўдавой Гаўрылы Мелешковіча, што парадніла яго з мсціслаўскім баярствам. Ад гэтага шлюбу нарадзіліся чатыры сыны, сярод якіх быў Васіль Львовіч, які другі шлюб узяў з Ганнай, сваячкай сербскага дэспата Іаана. У 1508 г. разам з братам Міхаілам Васіль Глінскі збег у Маскву[372]. Ад шлюбу Ганны і Васіля Глінскіх нарадзілася дачка Алена, якая ў снежні 1526 г.стала жонкай маскоўскага вялікага князя Васіля III, ад гэтага шлюбу нарадзіўся будучы рускі цар Іван IV.

---

[369] Древняя российская вивлиофика. – Ч. 3. – С. 385–387.

[370] Собрание государственных грамот и договоров, хранящихся в государственной коллегии иностранных дел. – Ч. 3. Содержащая материалы охватывающие период с 1613 по 1655 гг. – М., 1822. – № 177; Мальцев А. Н. Россия и Белоруссия в середине XVII века. – М.: Изд-во МГУ, 1974. – С. 52.

[371] Раевский П. М. Род царя и царевен и князей Шуйских. – С. 22.

[372] Тихомиров М. Н. Исторические связи России со славянскими странами и Византией. – М.: Наука, 1969. – С. 86.

МСЦІСЛАЎСКАЕ ВАЯВОДСТВА Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVI–XVIII СТ.

У 1564 г. у Вялікім Княстве Літоўскім была праведзена адміністрацыйна-тэрытарыяльная рэформа, у выніку якой ў краіне было арганізавана пяць новых ваяводстваў, у тым ліку і Мсціслаўскае. У 1565 г. рэформа была зацверджана пастановай Віленскага сейма. Новаўтворанае Мсціслаўскае ваяводства было створана на аснове валасцей Мсціслава і Крычава і складалася з аднаго павета. Але яшчэ даволі доўгі час традыцыйна крыніцы адзначалі існаванне ў мінулым самастойнай Крычаўскай воласці: час ад часу яны згадвалі размяшчэнне шляхецкіх уладанняў у «Крычаўскім тракце».

У «Спісанні граніц і паветаў», складзеным напярэдадні Віленскага сейма, межы новаўтворанага Мсціслаўскага ваяводства вызначаны так: «Почовши от границы Московской, шляхта вся зъ замкомъ Радомскимъ по границу Могилёвъскую, замокъ Кричовъский со всей шляхтою ажъ до границу Гомейскую». Новаўтворанае ваяводства артымала «харугв жолтую в чырвоном поле герб»[1].

4.1. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны і гаспадарчы падзел Мсціслаўскага ваяводства

4.1.1. Мсціслаўскае ваяводства на картах другой паловы XVI–XVIII ст.

У вызначэнні межаў Мсціслаўскага ваяводства другой паловы XVI–XVIII ст. ёсць пэўная блытаніна, выкліканая перш за ўсё інфармацыяй, якую мы атрымліваем з картаграфічных крыніц. На ўсіх картах Рэчы Паспалітай і Вялікага Княства Літоўскага, на якіх паказаны памеры ваяводстваў, у склад Мсціслаўскага ваяводства ўваходзіць значна большая тэрыторыя, чым гэта вынікае з пісьмовых крыніц.

Перш за ўсё гэта датычыцца Магілёўскага староства, якое на ўсіх картах адносіцца да Мсціслаўскага ваяводства. Такая картаграфічная традыцыя праходзіць праз усе карты Еўропы, Рэчы Паспалітай і Вялікага Княства Літоўскага другой паловы XVI–XVIII ст.

Горад Мсціслаў упершыню з'яўляецца на картах Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай у сярэдзіне XVI ст., але толькі з пачатку XVII ст. на картах пачынаюць адзначаць межы Мсціслаўскага ваяводства.

[1] РИБ. – Т. 30. – С. 895; Любавский М. К. Литовско-Русский сейм. – С. 166, 231.

Так, на карце Вялікага Княства Літоўскага, зробленай для Мікалая Крыштафа Радзівіла Т. Макоўскім у канцы XVI – пачатку XVII ст. і надрукаванай у другі раз у 1613 г., Мсціслаўскае ваяводства яшчэ не вылучана. І сам Мсціслаў абазначаны проста як горад – «oppidum», а не як ваяводскі ці павятовы цэнтр.

На думку С. Александровіча, Мсціслаў на гэтай карце выступае проста як цэнтр пэўнай акругі, у склад якой уваходзяць даўнія воласці (да рэформы 1565–1566 гг.) Мсціслаўскага, Радамскага паветаў і воласці Крычава[2]. Аднак уважлівае знаёмства з картай паказвае, што ў склад акругі Мсціслава, згодна з картай Т. Макоўскага, уваходзяць не толькі Мсціслаў, Крычаў і Радамля з валасцямі, але на поўначы мяжа акругі Мсціслава даходзіць да Дняпра, уключаючы ў свой склад Горы, Шышова, якія, згодна з пісьмовымі крыніцамі, уваходзілі ў склад Аршанскага павета Віцебскага ваяводства.

На захадзе акруга Мсціслава захоплівае Чавусы, якія, таксама згодна з пісьмовымі крыніцамі, уваходзілі ў склад Магілёўскай воласці Аршанскага павета. А ў складзе Магілёўскага павета (districtus) на карце Т. Макоўскага паказаны Прапойск, чаго на самой справе таксама не было. Прапойск на працягу ўсяго часу быў у складзе Рэчыцкага павета Менскага ваяводства.

Паўночна-заходняя мяжа адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі з цэнтрам у Мсціславе праходзіць на ўсход ад р. Крапіўна, левага прытока р. Дняпро, а ўсходняя мяжа ў памеры карты не змясцілася і таму адсутнічае (мал. 35). Такім чынам, нават на самай першай карце паказаныя памеры Мсціслаўскага ваяводства значна большыя за рэальныя.

На гэтай самай карце, выдадзенай Гандзівусам у 1633 г., мяжа акругі Мсціслава выходзіць на Дняпро на ўсход ад Дуброўны, а ўсходняя мяжа акругі ізноў на карце не адзначана[3].

З сярэдзіны XVII ст. пачынаецца новы этап у вызначэнні на картах тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства. Пачатак ёй паклала карта Польшчы і ВКЛ Г. де Баплана, выдадзеная ў 1651 г. Хаця ў сваёй працы Г. дэ Баплан абапіраўся на карту Т. Макоўскага, яго карта ў значнай ступені павялічыла блытаніну ў вызначэнні тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства. Менавіта з гэтай карты пачалася традыцыя паказваць Магілёўскі павет як састаўную частку Мсціслаўскага ваяводства (palatinatius). Абапіраючыся на карту Т. Макоўскага, Г. дэ Баплан таксама далучыў да Магілёўскага павета Прапойск.

Акрамя таго, на гэтай карце быў зроблены яшчэ адзін крок для далейшых памылак у вызначэнні межаў Мсціслаўскага ваяводства. На ёй упершыню паказаны Аршанскі павет як асобная адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка, праўда, без прывязкі для якога-небудзь ваяводства, але значна меншы па памерах, чым ён быў на самай справе. На захадзе ж тэрыторыя Мсціслаўскага ваяводства даходзіць амаль да Барысава. На гэтай карце Мсціслаў і Магілёў пазначаны рознымі значкамі, прычым Магілёў пазначаны сімвалам, які адсутнічае ў легендзе да карты.

---

[2] Alexandrowicz S. Rozwój kartografii Wielkiego księstwa Litewskiego. – S. 126.

[3] Кордт В. И. Материалы по истории русской картографии. – Табл. XV.



Мал. 35. Мсціслаўскае ваяводства на карце ВКЛ 1613 г. Т. Макоўскага

У такіх самых памерах паказана Мсціслаўскае ваяводства на карце Г. де Баплана і С. Старавольскага 1656 г.[4], якія паўтараюць адна другую, а Магілёў на ёй ізноў пазначаны сімвалам, які адсутнічае ў легендзе.

Блытаніна ў вызначэнні межаў Мсціслаўскага ваяводства, закладзеная Т. Макоўскім і павялічаная Г. дэ Бапланам, на доўгія гады стала асновай для наступных картографаў. На гэтыя карты абапіраўся ў сваёй працы М. Сансон, рыхтуючы да выдання ў 1655 г. сваю карту Польшчы.

Згодна з ёю ў склад Мсціслаўскага ваяводства ўваходзілі Магілёў, Прапойск, Быхаў, Баркалабава, Чавусы, Радамля, Крычаў, Горкі, Шышова, Орша, Дуброўна, Сянно, Лемніца, Обаль, Копысь, Друцк, Арэса, Бялынічы. Заходняя мяжа Мсціслаўскага ваяводства зараз некалькі скарацілася ў параўнанні з картай Г. дэ Баплана, і значная яе частка праходзіла па р. Друць. На гэтай карце Мсціслаў і Магілёў паказаны рознымі, не раўназначнымі сімваламі (мал. 36). У такім жа выглядзе выдаў гэтую ж карту і Г. Г. Россі ў 1688 г.[5]

[4] Кордт В. И. Материалы по истории русской картографии. – Табл. XXV, XXVI.

[5] Тамсама. – Табл. XLII, XLIII.



Мал. 36. Фрагмент карты Польшчы, Вялікага Княства Літоўскага і Украіны 1655 г. М. Сансона з тэрыторыяй Мсціслаўскага ваяводства

Межы Мсціслаўскага ваяводства добра прасочваюцца на карце «ВКЛ і Белай Русі», падрыхтаванай Я. Сандрартам ў 1687 г. на падставе карты Г. дэ Баплана. На ёй ўпершыню Аршанскі павет ужо паказаны як састаўная частка Мсціслаўскага ваяводства, але на карце ён меншы па памерах, чым быў на самай справе. Акруга Магілёва хаця і падпісана на карце «districtus», але ў адрозненне ад аршанскай яна тэрытарыяльна безумоўна належыць да Мсціслаўскага ваяводства, бо заходняя мяжа Мсціслаўскага ваяводства, згодна з картай Я. Сандрарта, ішла па р. Друць, захоплівала Друцк і на поўначы ад яго зварочвала на ўсход. Паўночная мяжа Мсціслаўскага ваяводства праходзіла ў міжрэччы Дняпра і Заходняй Дзвіны і выходзіла на дзяржаўную мяжу Рэчы Паспалітай у раёне Мікулінскіх азёр. Мсціслаў на гэтай карце паказаны як цэнтр ваяводства, а Магілёў – як старажытны хрысціянскі цэнтр – «urbu antiqua christiana»[6].

Потым Я. Сандрартр спалучыў усе свае карты і паміж 1697 і 1708 гг. выдаў новую карту Польшчы, у якой знайшлі адлюстраванне ўсе раней зробленыя памылкі. І на гэтай карце Аршанскі і Магілёўскія паветы паказаны ў складзе Мсціслаўскага ваяводства. На захадзе мяжа ваяводства заходзіць за р. Друць, а на ўсходзе – за Сож. Згодна з гэтай картай Я. Сандрарта ў складзе ваяводства былі Мсціслаў, Магілёў, Орша, Копысь, Прапойск, Радамля, Крычаў. Мсціслаў і Магілёў на ёй паказаны як нераўназначныя населеныя пункты. Гэта

[6] Кордт В. И. Материалы по истории русской картографии. – Табл. XXX.

карта стала асновай для наступных шматлікіх выданняў канца XVII – пачатку XVIII ст.[7]

Карты Рэчы Паспалітай XVIII ст. пачынаюць новую традыцыю ў вызначэнні тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства. Так, на карце Польшчы Вільгельма Дэліля 1702 г. у складзе Мсціслаўскага ваяводства ўжо адсутнічае Орша і яе павет. У раёне Оршы мяжа Мсціслаўскага ваяводства праходзіць па левым беразе Дняпра. Заходняя мяжа ваяводства праходзіць па р. Друць, а паўднёвая адсутнічае. У складзе Мсціслаўскага ваяводства адзначаны і Магілёў: надпіс «Palatinat de Mscislaw» напісаны па абодвух берагах Дняпра ў раёне Магілёва. Але на карце і Мсціслаў, і Магілёў упершыню паказаны ўжо раўназначнымі сімваламі[8].

На карце ВКЛ Яна Непрыцкага 1749 г. заходняя мяжа Мсціслаўскага ваяводства таксама праходзіць па Друці. На поўдзень ад Бялынічаў мяжа паварочвала на ўсход і выходзіла на р. Дняпро паміж Шкловам і Пячэрскам. Ізноў на Дняпро мяжа Мсціслаўскага ваяводства выходзіла на ўсход ад Дуброўны, а Аршанскі павет, у меншых памерах, чым быў на самай справе, паказаны ў складзе Віцебскага ваяводства.

Паўднёвая мяжа Мсціслаўскага ваяводства, згодна з картай Я. Непрыцкага, выходзіла на р. Дняпро на поўдзень ад Ст. Быхава і на поўнач ад нейкага «Tajona», верагодна, сучаснай в. Тайманава Быхаўскага раёна. У склад Мсціслаўскага ваяводства гэта карта ўключала Магілёў, Стары і Новы Быхаў, Стары і Новы Баркалабаў, Прапойск, Пячэрск, Чавусы, Горкі, Хвашчоўку, Радамлю, Горы, Мсціслаў, Дрыбін, воласць Басея і інш. Як і на карце В. Дэлітса, на карце Я. Непрыцкага Магілёў і Мсціслаў пазначаны аднолькавымі, раўназначнымі сімваламі[9].

У такіх самых памерах паказана Мсціслаўскае ваяводства на карце Рэчы Паспалітай 1770 г., састаўленай капітанам корпуса артылерыі В. Фоліным. Аршанскі павет паказаны на ёй у якасці асобнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі. Паўднёвая мяжа Мсціслаўскага ваяводства на Сожы праходзіла паміж Чачэрскам і Прапойскам, выходзіла на Дняпро на поўдзень ад Ст. Быхава і далей ішла на Друць. Па Друці заходняя мяжа ваяводства ішла амаль да Бялынічаў, адкуль паварочвала на ўсход і мінуючы Княжычы выходзіла да Дняпра на поўнач ад Пячэрска. Паўночная мяжа Мсціслаўскага ваяводства зноў выходзіла на Дняпро на ўсход ад Дуброўны. Магілёў зноў паказаны ў складзе ваяводства, але аднолькавым з Мсціславам знакам[10].

І наступныя карты Рэчы Паспалітай, выдадзеныя да яе першага падзелу, паказваюць Мсціслаўскае ваяводства, якое ўключала ў свой склад воласць Магілёва, – карты Я. Кантэра (1771 г.) і Бераліні (1771–1772 гг.)[11].

---

[7] Кордт В. И. Материалы по истории русской картографии. – Табл. XXXV–XXXVII.

[8] Buczek K. Dzieje kartografii Polskiej. – Tabl. XXXII.

[9] Alexandrowicz S. Rozwój kartografii Wielkiego księstwa Litewskiego. – Cz. 2.

[10] Rzeczpospolita Polska. Mapa 1770 r. – Wroclaw, 1997.

[11] Centralni katalog zbiorów kartograficznych w Polsce. Zeszyt 5. Wieloarkuszowe mapy topograficzne ziem Polskich 1576–1870. Cz. 1. – Wrocław-Warszawa-Kraków-Gdansk-Lódz, 1983. – Poz. 15–16, tabl. 25, 28.

Такім чынам, у вызначэнні на картах XVII–XVIII стст. тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства прасочваецца традыцыя захавання памылак, закладзеных Т. Макоўскім ў 1603–1613 гг. і значна павялічаных Г. дэ Бапланам у 1651 г., звязаных з уключэннем у склад Мсціслаўскага ваяводства тэрыторыі воласці Магілёва. У другой палове XVII ст. тэрыторыя Мсціслаўскага ваяводства на картах Рэчы Паспалітай значна павялічылася за кошт уключэння ў яе склад Аршанскага павета.

На картах пачатку XVIII ст. былі ўнесены пэўныя карэктыроўкі – са складу Мсціслаўскага ваяводства была выключана частка Аршанскага павета. Аднак воласці Магілёва і Прапойска на картах працягвалі паказваць як адміністрацыйна-тэрытарыяльныя і гаспадарчыя адзінкі Мсціслаўскага ваяводства, хаця на самай справе гэтага не было.

Гэта было зразумела і сучаснікам. Так, у канцы XVII ст. (1693 г.) магілёўскі лаўнік і стараста купецкі Т. Р. Сурта адзначаў, што Магілёў ніколі не ўваходзіў у склад Мсціслаўскага ваяводства, а быў горадам Аршанскага павета Віцебскага ваяводства. Згодна з паведамленнем Т. Р. Сурты, уся блытаніна з тэрытарыяльнай прыналежнасцю Магілёва Мсціслаўскаму ваяводству ідзе з апісання Вялікага Княства Літоўскага, складзенага яшчэ ў 1581 г. А. Гваньіні[12]. У ім, пералічваючы гарады ў ваяводствах, А. Гваньіні называе ў складзе Мсціслаўскага ваяводства Мсціслаў, Дуброўну, Копысь, Шклоў, Магілёў, Быхаў і нават Стрэшын, Рэчыцу, Любеч, Вышгарад[13].

Верагодна, абапіраючыся менавіта на звесткі А. Гваньіні, заходнееўрапейскія картографы XVII–XVIII стст. адзначалі знаходжанне Магілёва і яго акругі ў складзе Мсціслаўскага ваяводства. І нават у XVIII ст., калі карты Рэчы Паспалітай пачалі складваць самі жыхары дзяржавы, сіла традыцыі ўсё ж такі брала верх. Як і раней, Магілёў і Прапошаск на картах паказваліся ў складзе Мсціслаўскага ваяводства, што было вельмі далёкім ад рэальнага становішча.

4.1.2. Тэрыторыя Мсціслаўскага ваяводства другой паловы XVI–XVIII ст. паводле пісьмовых крыніц

Больш дакладныя межы новаўтворанага ваяводства рэканструююцца дзякуючы шматлікім захаваным размежаванням паміж Рэччу Паспалітай і Рускім царствам, а потым Рускай імперыяй, а таксама шматлікім інвентарным апісанням Крычаўскага староства, Магілёўскай эканоміі і асобных ўладанняў Аршанскага павета XVII–XVIII стст.

У цэлым Мсціслаўскае ваяводства другой паловы XVI–XVIII ст. займала тэрыторыю плошчай 11505 тыс. кв. км, што складала амаль 3,9% ад агульнай плошчы тэрыторыі ВКЛ[14], і было самым малым ваяводствам у ВКЛ і Рэчы Паспалітай.

---

[12] ПСРЛ. – Т. 35. – С. 239.

[13] Лаппо И. И. Великое княжество Литовское во второй половине XVI столетия. Литовско-Русский повет и его сеймики. – Юрьев: Тип. Маттисена, 1911. – С. 87–88.

[14] Morzy J. Kryzus demograficzny na Litwe i Białorusi w I połowie XVII w. // Uniw. Im. A. Mickiewica w Poznanju. Wydzial Filozoficzno-Historyczny. Seria Historia. – Poznań, 1965. – № 21. – Tabl. 15.

Мяжа новаўтворанага Мсціслаўскага ваяводства ў той частцы, якая праходзіла па мяжы былой Мсціслаўскай воласці, што сфарміравалася на падставе Мсціслаўскага княства пачатку XVI ст., заставалася стабільнай, не змянялася і намі ўжо разгледжана.

Але ў пачатку XVI ст. ў выніку войнаў з Рускім царствам 1500–1503, 1507–1508, 1512–1522, 1534–1537 гг. пэўныя перамены адбыліся з тэрыторыяй Крычаўскай воласці, якая ў выніку адміністрацыйна-тэрытарыяльнай рэформы 1565–1566 гг. стала састаўной часткай Мсціслаўскага ваяводства. Для вызначэння межаў новаўтворанага ваяводства неабходна разглядзець тэрытарыяльныя абшары воласці Крычава.

У пачатку XVI ст., акрамя захопу валасцей Прыкладней, Салаўянічаў, Мгліна, Дрокава, Паповай Гары, рускія войскі захапілі і частку Лучыцкай воласці. Крычаў застаўся адной з нешматлікіх крэпасцей на ўсходзе Сярэдняга Пасожжа, да якой пачала цягнуцца Лучыцкая воласць. Верагодна, ужо ў гэты час крычаўскія дзяржаўцы час ад часу прымалі ўдзел у кіраванні Лучыцкай воласцю. Ва ўсякім выпадку, у 1508 г. менавіта крычаўскаму баярыну Ивашку Гарбузу вялікі князь даручыў «увязаць» Сеньку Мсціслаўца ў Лучыцкае сяло «названое Костюково» – верагодна, сучасны горад Касцюковічы[15].

У гісторыі Лучыцкай воласці важная падзея адбылася 17 сакавіка 1529 г., калі вялікі князь Жыгімонт, спасылаючыся на скаргі, што паступілі яму ад жыхароў Лучыцкай воласці на дзяржаўцу Нікіфара Бабаедава, забраў яе ў яго і перадаў пад кіраванне дзяржаўцу Крычаўскай воласці князю Васілю Сямёнавічу Жылінскаму[16]. З гэтага часу і да першага падзелу Рэчы Паспалітай Лучыцкая воласць знаходзілася ў складзе Крычаўскай воласці. Яна страціла ролю самастойнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, і ў яе засталіся толькі функцыі адміністрацыйна-гаспадарчай адзінкі – войтаўства ў складзе Крычаўскага староства. У той жа час дзяржаўцы Крычаўскага староства працягвалі афіцыйна называцца «дзяржаўца Крычаўскі і Лучыцкі».

Спрэчкі з-за Лучыцкай воласці, якія цягнуліся паміж Масквой і Вільняй з пачатку XVI ст., працягваліся і ў 30-я гады, але ні адзін з бакоў не збіраўся паступіцца сваёй часткай і кожны прэтэндаваў на ўсю тэрыторыю воласці[17]. Нарэшце, у 1533 г. вялікі князь Жыгімонт пайшоў на сілавое вырашэнне гэтай праблемы. Па яго загадзе крычаўскі дзяржаўца Васіль Чыж пачаў прыводзіць жыхароў Лучыцкай воласці да прысягі ВКЛ і арыштаваў маскоўскую адміністрацыю, якая туды ўступіла[18].

Наступная вайна паміж Масквой і Вільняй (1534–1537 гг.) паказала пэўную раўнавагу сіл. Хаця ВКЛ адваявала Гомель, вярнуць Смаленск яно так і не змагло. Больш таго, ізноў узніклі пэўныя праблемы з Лучыцкай воласцю. Масква

---

[15] Литовская метрика. Книга записей № 8 (1499–1514) / parenge A. Baliulis, R. Firkovičius, D. Antanavičus. – Vilnius: Mokslo ir enciklopediju leidybos institutas, 1995. – С. 276.

[16] Любавский М. К. Областное деление и местное управление. – Документ № 46.

[17] СИРИО. – Т. 35. – С. 708–709, 716–717, 751, 789, 791.

[18] Тамсама. – С. 833, 837, 843, 860–861.

патрабавала прызнання Вільняй прыналежнасці ёй усёй воласці і іншых спрэчных тэрыторый. Але вялікі князь Жыгімонт не пагаджаўся з прэтэнзіямі Масквы. На перамовах літоўскія паслы прапанавалі перадачу Маскве за гэтыя воласці горада Завалочча з валасцямі Няведра і Істцо на паўночным усходзе ВКЛ. Першапачаткова маскоўскія баяры пагардліва адмаўлялі гэтыя прапановы, кажучы: «никакож государю нашаму тех волостей и сёл не поступитися, а королевы ему волости в тех волостех место к Заволочью ненадобно». Але праз некаторы час яны пайшлі на размен: за Себеж, Завалочча і прыпісаную да Завалочча Долыскую воласць пагадзіліся прызнаць пераход пад уладу ВКЛ Гомія з воласцю і не пералічаных ў грамаце нейкіх крычаўскіх і чачэрскіх сёлаў. У той жа час маскоўскія баяры адмаўляліся запісваць у бок ВКЛ Лучыцкую воласць, сцвярджаючы, што Вільня трымае яе сілай[19]. Урэшце пытанне па спрэчных валасцях у 1537 г. было вырашана па прынцыпе «хто сильнее, тот и держит»[20]. У выніку гэтага замірэння Лучыцкая воласць назаўжды засталася ў складзе ВКЛ, і пытанне аб яе прыналежнасці болей не ўзнімалася.

Падчас вайны 1534–1535 гг. воласць Крычава страціла некаторыя ўладанні на ўсходзе. Пра гэта сведчыць аналіз памежных размежаванняў 1522 г. і больш позніх часоў.

Дзяржаўная мяжа, якая ўсталявалася ў 1522 г. паміж Масквой і Вільняй, адначасова стала і ўсходняй мяжой воласці Крычава. Крычаўска-рослаўскі рубеж даволі падрабязна апісаны ў размежаванні 1522 г. Ён пачынаўся ад Стрэкулы: мсціслаўскі рубеж ішоў «к Стрекуле к рубежу Кричевскому». Стрэкула пачатку XVI ст. – гэта сучасная вёска Стракайлава Шумяцкага раёна Смаленскай вобласці Расіі. Ад Стрэкулы крычаўска-рослаўскі рубеж апісаны такім чынам: «от Кричева городу Рославлю рубеж река Шумяча, а Шумячею в р. Немелицу, а из Немилицы старым рубежом к Заборью в Ипуть реку, да на низ Ипути к Хмелю»[21].

Тое, што паўночная частка крычаўска-рослаўскага рубяжа ішла па р. Шумячка, пацвярджаюць і іншыя, больш познія крыніцы. Так, у 1569 г. у Крычаўскай воласці «при границы Московской», «до воли и ласки господарской» пустаўшчынамі Шумячы, Глушкава і Стракайлава (суч. аднайменны гарадскі пасёлак і вёскі Шумяцкага раёна) валодаў баярын крычаўскі Якуб Рыбеніскі[22]. Далей крычаўскі рубеж з р. Шумячкі зварочваў у яе правы прыток р. Нямыліца (Н. В. Шаламанава памылкова робіць яе левым прытокам Іпуці), а потым ішоў «старыми рубежами» да Забор'я і далей у Іпуць. Гэты «стары рубеж» на р. Іпуць у «агранічэнні Крычаўскага староства» 1560 г. ішоў у бок рэчкі Савенка, якой і выходзіў на р. Іпуць[23], дзе знаходзіўся Хмель.

---

[19] СИРИО. – Т. 59. – С. 102–103, 105.

[20] Памятники истории Восточной Европы. – С. 164.

[21] СИРИО. – Т. 35. – С. 638, 744, 746; Тамсама. – Т. 59. – С. 127–128, 190–191.

[22] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 56. – Арк. 76–77.

[23] Тамсама. – Ф. 694. – Воп. 4. – Адз. зах. 1155. – Арк. 68.

Дзе знаходзіўся Хмель першай паловы XVI ст., дакладна не вядома. Але ў інвентары Крычаўскага староства 1694 г. паведамляецца, што пад такой назвай праходзіць вёска Гулькі – «Hulki alias Chmel»[24]. Такім чынам, Хмель першай паловы XVI ст. – гэта сучасная вёска Гулькі Клімавіцкага раёна, а ў XVIII ст. старая назва вёскі Хмель забылася, і яна ўвесь час праходзіць пад назвай Гулькі.

Прыкладна ў гэтым жа месцы прапанавала лакалізаваць Хмель і Н. Шаламанава, абапіраючыся на рускія крыніцы пачатку XVII ст. Ніжэй Хмеля, насупраць ўпадзення ў Іпуць р. Баравіца лакалізуецца і Забор'е[25]. Аднак, улічваючы той факт, што ў крыніцы пачатку XVI ст. Хмель згадваецца ніжэй Забор'я, то, верагодна, населеных пунктаў пад назвай Хмель у гэтым раёне было некалькі, і размежаванне мела на ўвазе той, што быў на Іпуці ніжэй Забор'я. Аднак апісваючы рослаўска-крычаўскі рубеж ніжэй упадзення р. Вараніца ў Іпуць крыніца 1522 г. дадае, што «Ипуть рубеж кричевский»[26].

У больш позніх размежаваннях XVI – пачатку XVII ст. крычаўска-рослаўскі рубеж апісваецца толькі да Хмеля[27], што дазваляе меркаваць, што паміж 1522 і 1537 гг. у праходжанні мяжы ніжэй упадзення ў Іпуць р. Вараніца адбыліся пэўныя перамены. Магчыма, зараз яна з р. Іпуць зварочвала напрамую на вытокі р. Беседзь, па якой ішла да сучаснага Хоцімска. Ва ўсякім выпадку, у пачатку XVIII ст. вёскай Мсціслаўскага ваяводства было Краснаполле, якое ў 1708–1716 гг. набыў рускі князь А. Меншыкаў, а ў 1732 г. руская імператрыца Ганна Іаанаўна надала яе падстолію ВКЛ Міхалу Антонію Патоцкаму[28]. Гэта сучасны аднайменны населены пункт Шумяцкага раёна Смаленскай вобласці, размешчаны на р. Іпуць.

Прыкладна ў такім кірунку правёў крычаўска-бранскі рубеж Я. Натансон-Лескі, які з асцярогай сцвярджаў, што ад вярхоўяў Іпуці ў межах Мсціслаўскага княства мяжа ішла ўздоўж Беседзі, спачатку па яе левым беразе, потым па правым. Урэшце яна зварочвала на захад, даходзячы да Сожа. Не быў зразумелым крычаўска-бранскі рубеж і Н. Шаламанавай[29].

М. Ф. Спірыдонаў на сваёй карце «Землі Беларусі ў канцы XVI стагоддзя» правёў дзяржаўную мяжу Рэчы Паспалітай і, адпаведна, усходнюю мяжу воласці Крычава і Мсціслаўскага ваяводства на поўдзень ад р. Іпуць некалькі па-іншаму. На яго думку, мяжа на поўдзень ад р. Іпуць фактычна паўтарала сучасную беларуска-расійскую мяжу і ішла на р. Беседзь па р. Рэкта.

Аднак на карысць правядзення дзяржаўнай мяжы па Беседзі, на наш погляд, сведчаць і некаторыя іншыя крыніцы. Апісваючы гэты адрэзак дзяржаў-

---

[24] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1928. – Арк. 81.

[25] Шеломанова Н. В. Рославльский уезд в XVI в. – С. 178, 182.

[26] ДМАМЮ. – Т. 1. – С. 66.

[27] СИРИО. – Т. 137. – С. 68–69, 701–702, 713–714.

[28] АВК. – Т. 13. – С. 149–150.

[29] Natanson-Leski J. Dzieje granicy wschodniej Rzeczypospolitej. Cz. 1. Granica Moskiewska w epoce Jagiellonskiej. – Lwów; Warszawa, 1922. – T. 1. – Zesz. 3. – S. 94; Шеломанова Н. В. Рославльский уезд в XVI в. – С. 184.

най мяжы, «агранічэнне» Крычаўскага староства 1560 г. дае нам усходнія рубяжы староства, якія супадалі з дзяржаўнай мяжой. З р. Іпуць мяжа, згодна з «агранічэннем» сярэдзіны XVI ст., ішла «рубяжамі» да ручая «Бальшога», з яго да р. Арлоўка, адтуль да р. Крупня, а з Крупні ручаём Студзёвым ў р. Беседзь. Усе першыя гідронімы на сённяшні дзень не лакалізуюцца, і таму цяжка дакладна вызначыць дзяржаўную мяжу ВКЛ.

М. Ф. Спірыдонаў, як мы казалі вышэй, прапанаваў правесці дзяржаўную мяжу на поўдзень ад в. Макеевічы за Іпуццю ўздоўж сучаснай дзяржаўнай мяжы Беларусі[30]. Аднак у інвентары Крычаўскага староства 1747 г. пры апісанні «агранічэння» в. Макеевічы адзначаецца, што адзін бок зямельных уладанняў вёскі супадае з дзяржаўнай мяжой і ідзе па р. Маскоўка ў бок Клімава балота, а адтуль – у вярхоўі Беседзі[31]. Рака Маскоўка лакалізуецца і зараз – гэта правы прыток р. Іпуць, і таму, улічваючы супадзенне канчатковых кропак апісання мяжы – Іпуці і Беседзі, ёсць сэнс правесці дзяржаўную мяжу ВКЛ і ўсходнюю мяжу крычаўскай воласці сярэдзіны XVI ст. напрамую ад вытокаў р. Маскоўка ў бок вытокаў правага прытока Беседзі р. Смародзінка. Далей мяжа, верагодна, уздоўж р. Смародзінка выходзіла на Беседзь, на правым беразе якой размешчаны характэрныя палітонімы – «Ліцвінава» і «Ліцвінава Буда» – сучасныя вёскі Ершыцкага раёна Смаленскай вобласці, назвы якіх, магчыма, сведчаць аб іх былой прыналежнасці Літве.

Далей мяжа ішла па Беседзі, а потым, верагодна, зварочвала на ўсход у р. Альшоўка, якая двойчы фігуруе як апорная кропка ў нашых пошуках мяжы крычаўскай воласці ў «агранічэнні» сярэдзіны XVI ст.[32]

Другое, што не дазваляе пагадзіцца з прапановай М. Ф. Спірыдонава аб правядзенні дзяржаўнай мяжы па р. Рэкта, – той факт, што ў інвентарах Крычаўскага староства XVIII ст. пры апісанні зямельных уладанняў сучасных памежных вёсак – Фядотава Буда, Галічы – адсутнічаюць звесткі пра тое, што яны размешчаны менавіта на дзяржаўнай мяжы. Мы не знаходзім у інвентарах інфармацыі, што землі гэтых вёсак падыходзяць да дзяржаўнай мяжы, як гэта было з іншымі вёскамі староства, калі яны сапраўды размяшчаліся на памежжы. Нават калі ў інвентары гаворыцца, што ўсходняя мяжа зямельных уладанняў гэтых вёсак праходзіць па р. Рэкта, то тут мы не бачым паведамлення, што па Рэкце праходзіць дзяржаўная мяжа. Гэта дазваляе меркаваць, што на ўсход ад р. Рэкты яшчэ знаходзіліся землі, якія належалі Рэчы Паспалітай, і яе дзяржаўную мяжу трэба праводзіць, верагодна, як і прапанаваў Я. Натансон-Лескі, па р. Беседзь.

Дзяржаўная мяжа ВКЛ і воласці Крычава ішла па р. Беседзь да ўпадзення ў яе левага прытока р. Альшоўка. Тут мяжа зварочвала ў апошняю і падымалася ўверх. Дакладна правесці тут крычаўска-бранскі рубеж вельмі цяжка з-за не-

---

[30] Спиридонов М. Ф. Закрепощение крестьянства Беларуси (XV–XVI вв.). – Минск: Навука і тэхніка, 1993. – Карта «Беларусь в конце XVI века».

[31] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1936. – Арк. 189.

[32] Тамсама. – Ф. 694. – Воп. 4. – Адз. зах. 1155. – Арк. 68.

магчымасці зараз знайсці тыя апорныя кропкі, на якія абапіраецца апісанне праходжання мяжы як у XVI ст., так і ў XVIII ст. Але агульны напрамак праходжання мяжы ўзнавіць можна.

У апісанні абмежавання зямельных уладанняў в. Горня XVIII ст. (Хоцімскі р-н) мы сустракаем шэраг апорных кропак, дзякуючы якім маем магчымасць вызначыць усходнюю мяжу воласці Крычава і ВКЛ. Так, у інвентары 1747 г. гаворыцца, што мяжа в. Горня пачынаецца з р. Вітава, дзе на мяжы «з казакамі» насыпаны «капец». Адсюль мяжа цягнулася ў бок р. Асінка. Па р. Асінка мяжа спускалася ўніз да «гасцінца Боханаўскага». З «гасцінца Боханаўскага» мяжа зямель, што належалі да в. Горня, выводзіла да «балота Гарохаваго», на якім знаходзіўся другі памежны «капец»[33]. Усе пералічаныя «памежныя» тапонімы – рэкі Вітава, Асінка і урочышча «Гарохаўшчына» – і зараз лакалізуюцца на расійска-беларускім памежжы. Гэта дазваляе сцвярджаць, што сучаснае памежжа ў сваёй аснове абапіраецца на больш ранняе, якое пачало складвацца як мінімум з сярэдзіны XVI ст., калі ў адпаведнасці з замірэннем 1537 г. мяжа ў гэтым рэгіёне ўсталявалася.

У міжрэччы Іпуці і Беседзі мяжа XVI ст. таксама дрэнна паддаецца рэканструкцыі. Яе рэканструкцыю можна зрабіць толькі абапірачыся на больш познія крыніцы, якія паказваюць прыналежнасць населенага пункта той ці іншай дзяржаве.

Сярод вёсак першай паловы XVI ст., якія лакалізуюцца сёння, у размежаванні 1522 г. у Лучыцкай воласці ВКЛ згадваюцца вёскі «Мокрая», «Слабада», «Ходимско» (сучасная в. Хоцімск Касцюковіцкага раёна). Слабада – гэта, верагодна, сучасная в. Кісялёўка, якая мела раней іншую назву – Слабодка. Гэтыя ж вёскі згадваюцца ў крыніцах, прысвечаных новым перагаворам аб рубяжах паміж Масквой і Вільняй, што адбываліся ў канцы 1526 г. – пачатку 1527 г. Тут дадаткова ў Лучыцкай воласці названы вёскі Уклеевічы (сучасная в. Клеявічы), Ковынічы (сучасная в. Кавычыцы), Зеньковічы[34] (усходняя частка в. Саматэвічы). Усе гэтыя вёскі лакалізуюцца на поўдні Касцюковіцкага раёна.

З рускага боку крыніца называе памежную вёску ў воласці Дрокава «Влазовичи» – сучасная аднайменная вёска Суражскага раёна Бранскай вобласці. На захад ад «Влазович» знаходзілася воласць горада Папова Гара. У яго воласці крыніца называе наступныя памежныя вёскі – «Панкевичи», сугучны якой тапонім раней існаваў у Гардзееўскай воласці Чарнігаўскай губерні напрыканцы XIX ст.[35]

Насупраць нелакалізаванай паповагорскай вёскі «Кузнецовичы» знаходзілася лучыцкае сяло «Мокрае». У воласці Паповай Гары на лучыцкім памежжы знаходзілася другое нелакалізаванае сяло «Рагозичи». Насупраць яго знаходзілася лучыцкая вёска Слабада. Далей, на прапойскай мяжы крыніца згад-

[33] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1936. – Арк. 154.

[34] СИРИО. – Т. 35. – С. 750–751.

[35] ДМАМЮ. – Т. 1. – С. 67; Список населенных мест Черниговской губернии. – С. 97.

вае паповагорскае сяло «Кибилщичи» якім, верагодна, з'яўляецца сучасная в. Кібіршчына Краснагорскага раёна Бранскай вобласці. Насупраць яе размяшчалася нелакалізаваная прапойская вёска «Локичы»[36].

Сярод «сёл дзяржавы Крычаўскай», пералічаных у «агранічэнні» 1560 г., згадваюцца размешчаныя недалёка ад сучаснай расійска-беларускай мяжы вёскі Відуйцы, Панкі (суч. в. Зацішша Касцюковіцкага раёна); Баханы, Ганнаўка (Хоцімскі раён). Адна з крыніц 1546 г. згадвае ў Крычаўскай воласці сяльцо Бялынкавічы над р. Басея (Беседдзю)[37].

Таму для больш дакладнага, але ўсё ж такі схематычнага вызначэння кірунку праходжання паўднёвай дзяржаўнай мяжы і мяжы крычаўскай воласці XVI ст. паспрабуем картаграфаваць вёскі Крычаўскага староства, якія ўзніклі ў памежных раёнах у больш позні перыяд – XVII–XVIII стст.

Крыніцы першай паловы XVIII ст. сярод новых вёсак Крычаўскага староства, размешчаных уздоўж сучаснай расійска-беларускай мяжы, у Лучыцкім войтаўстве адзначаюць вёскі Баравая, Баронькі, Гаўрыленка (аднайменныя вёскі Касцюковіцкага раёна). У Бярозкаўскім войтаўстве згадваюцца вёскі Узлогі, Ліпаўка, Горня, Дубраўка, Негаў (сучасная в. Ветка, усе вёскі Хоцімскага раёна), Селецкая, Вішанкі (сучасная в. Вішні Касцюковіцкага раёна)[38]. Прычым у апісанні «агранічэння» некаторых з іх непасрэдна гаворыцца, што частка зямельных уладанняў гэтых вёсак знаходзіцца на мяжы з «Маскво й і казакамі». Памежным населеным пунктам крычаўскай воласці, у якім знаходзілася мытня, была в. Бяляны[39] (суч. аднайменная вёска Суражскага р-на Бранскай вобласці Расіі).

Картаграфаванне усіх пералічаных населеных пунктаў XVI–XVIII стст. сведчыць, што яны практычна не выходзяць за межы сучаснай беларуска-расійскай мяжы. Гэта дазваляе сцвярджаць, што сучасная расійска-беларуская мяжа прыблізна адпавядае паўднёвай мяжы Крычаўскай воласці, якая канчаткова сфарміравалася ў 1537 г. Таму можна прыняць думку М. Ф. Спірыдонава які правёў паўднёвую мяжу Рэчы Паспалітай, якая адначасова з'яўлялася паўднёвай мяжой і воласці Крычава у гэтым раёне, па сучаснай дзяржаўнай мяжы Беларусі.

На захад ад Беседзі «агранічэнне» сярэдзіны XVI ст. дае нам другую апорную кропку ў пошуках мяжы – р. Дзясёнка, па якой мяжа ішла ў бок р. Палуж[40]. Рака Дзясёнка з'яўляецца правым прытокам р. Алешня, і сучасная расійска-беларуская мяжа часткова праходзіць па ёй. Вытокі р. Дзясёнка зусім блізка падыходзяць да плыні Палужа, якім мяжа падымалася ўверх. Уздоўж плыні р. Палуж воласць Крычава межавала з Прапойскім староствам.

---

[36] ДМАМЮ. – Т. 1. – С. 66–67.

[37] НГАБ. – Ф. 694. – Воп. 4. – Адз. зах. 1155. – Арк. 69, 72 адв.

[38] Тамсама. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1936. – Арк. 121, 122, 125, 148, 150, 154, 159, 160, 162, 169.

[39] LVIA. SA. – Ap. 1. – Bib. 3810. – P. 71 v.

[40] НГАБ. – Ф. 694. – Воп. 4. – Адз. зах. 1155. – Арк. 68.

Вышэй в. Палуж (на левым беразе была аднайменная вёска Крычаўскага староства, а на правым – вёска Прапойскага староства) мяжа ішла ў кірунку р. Сянная. Апошняя таксама служыла мяжой з Прапойскім староствам. Мяжа на р. Сянная ішла на захад ад сучасных вёсак Лешчанка і Лешчанская Буда, першая з якіх узнікла ў Крычаўскім старостве ў XVIII ст. на палужскіх землях[41]. На р. Сянная мы сустракаем у XVI ст. крычаўскую вёску Ушакі. Ракой Сянной мяжа крычаўскай воласці выходзіла на Сож, якім падымалася ўверх да р. Удогі. Па р. Удога ішла ўжо вызначаная намі заходняя мяжа воласці Крычава.

Трэба адзначыць, што воласць Крычава ў прылягаючых да Сожа раёнах не ўяўляла адзінага цэлага. У другой чвэрці XVI ст. Крычаўская воласць страціла частку зямель у выніку ўнутрыдзяржаўных адміністрацыйна-тэрытарыяльных пераменаў. У пачатку 1526 г. крыніцы паведамляюць нам пра спрэчкі паміж дваранамі «Митком, Фёдарам и Сенкам Маскевичами» і крычаўскім мешчанінам панам Грынем Кулзуновым з-за сяла Галоўчыцы. Згодна з прысудам вялікага князя Жыгімонта, крычаўскі дзяржаўца В. С. Жылінскі павінен быў «увязать» Маскевічаў у село Галоўчыцы, якое трымаў іх бацька «Гринь Маскевич»[42]. Але ўжо ў канцы 1526 г. – пачатку 1527 г. у «разграничэнні» паміж Масквой і Вільняй мы бачым в. «Соловчицы» (верагодна скажонае «Головчицы») у складзе воласці Прапойска. Адначасова прапойскімі вёскамі называюцца «Чюдиновичи» і «Савиничи»[43] – сучасныя вёскі Чудзяны Чэрыкаўскага раёна і Савінічы Клімавіцкага раёна. Яны ўтварылі своеасаблівы Прапойскі анклаў паміж крычаўскімі вёскамі. На землях гэтага анклава ў XVIII ст. знаходзіліся як вёскі Засожскага войтаўства Прапойскага староства Рэчыцкага павета – Манастырок, Галоўчыцы, Чудзін (Чудзяны), Жабень, так і вёскі Чудзянскага і Галоўчынскага старостваў Рэчыцкага павета – Чудзяны, Лысоўка, Малінаўка, слабада Буда, вёскі Галоўчыцы, Жаліжжа, слабада Размыслоўка[44].

Заходняя мяжа новаўтворанага ваяводства заставалася нязменнай на працягу другой паловы XVI–XVIII ст. Яна паўтарала заходнюю мяжу паміж валасцямі Крычава і Магілёва больш ранняга перыяду, якія апісаны вышэй.

4.1.3. Дзяржаўныя ўладанні на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства

У XVI–XVIII стст. у склад Мсціслаўскага ваяводства ў якасці самастойных адміністрацыйна-гаспадарчых адзінак уваходзіў шэраг дзяржаўных уладанняў, буйнейшым з якіх было Крычаўскае староства.

Фарміраванне Крычаўскага староства пачалося яшчэ ў XV ст. Як сведчаць крыніцы, ужо ў гэты час адзіная ў адміністрацыйна-тэрытарыяльным плане Крычаўская воласць не была адзінай ў адміністрацыйна-гаспадарчых адно-

[41] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1936. – Арк. 97.

[42] Литовская метрика. Книга судный дел № 4 (1522–1550) / parenge A. Bumbalauskas ir et. – Vilnius: Zara, 1997. – P. 190.

[43] СИРИО. – Т. 35. – С. 751.

[44] LVIA. – F. SA. – Ap. 1. – Bib. 3803. – P. 9 v., 31–32.

сінах. Яна падзялялася на ўладанні вялікага князя, якія ён увесь час здаваў у дзяржанне розным дзяржаўцам, і шляхецкія. Гэтыя землі хаця і складалі адно цэлае ў адміністрацыйным сэнсе – падпарадкоўваліся аднаму цэнтру, але адрозніваліся па правах землеўласнікаў – землі гаспадарскія з аднаго боку і землі шляхецкія з другога. Першыя з іх крыніцы XVI ст. аб'ядноўваюць ў дзяржаўнае ўладанне – дзяржава, староства ці «воласць замка Крычаўскага».

Працэс падзелу воласці на дзве часткі, верагодна, распачаўся пасля смерці апошняга прадстаўніка роду мсціслаўскіх князёў князя Івана Юр'евіча ў 1486 г., калі Мсціслаўскае княства было забрана вялікім князем Казімірам у дзяржаўны скарб.

Як мсціслаўскія ўдзельныя князі, так і вялікія князі шырока выкарыстоўвалі землі Крычаўскай воласці для раздачы на пэўных умовах шляхце. Наданне зямель шляхце ішло як шляхам раздач бенефіцыяў, так і ленных уладанняў – перадачы зямель «на вечнасць». Прычым гэты працэс набраў такі размах, што ўжо ў 1522 г. вялікі князь Жыгімонт у лісце да крычаўскага дзяржаўцы князя Васіля Жылінскага падкрэслівае, што па тры вартавыя на замак воласць Крычаўская давала «коли ещо волость была целая, и не роздали были есмо дворан ном нашим»[45]. Такім чынам, з ліста вялікага князя вінікае, што ў канцы першай чвэрці XVI ст. раней адзіную воласць Крычава ўжо ахапіў працэс падзелу на ўладанні дзяржаўцы і шляхецкія.

З населеных пунктаў, што ўваходзілі ў Крычаўскае староства, крыніцы пачатку XVI ст. згадваюць в. Лабковічы (1508 г.), з якой вялікі князь Жыгімонт прызначыў даніну ў памеры 3 рублёў грошай на карысць мсціслаўскага Пустынскага манастыра[46]. Гаспадарскімі сёламі ў «агранічэнні» сярэдзіны XVI ст. названы сёлы Камаровічы (у якой было 23 службы), Вохар (20), Вепрын (35), Ушакі са слабадой Палуж (37) – (Чэрыкаўскі раён). Крычаўская вёска Палуж сярэдзіны XVI ст. – гэта сучасная в. Палуж-2 Краснапольскага раёна, размешчаная на левым беразе р. Палуж. Сярод сучасных вёсак Крычаўскага раёна гаспадарскімі сёламі былі вёскі Стараселле (17), Лабковічы (14), Міхеевічі (7), Варанёва – зараз у межах Крычава (1,5), «Свіна» – сучасная в. Іванаўка (1), Зуі (1,5), Дрышчава – сучасная в. Зарубец, Песькавічы (па 0,5). У Касцюковіцкім раёне мы знаходзім вёскі Відуйцы (30), Саматэвічы (40), Панкі – сучасная в. Заціша (30), Гарбавічы (15), Гібалы – сучасная Чырвоная Слабада (10), Мокрае (20), Брацькавічы (15), Хоцімск (10), Шарэйкі (10), Лешня (7), Крывая Ніва (2). Вёскі Жадунька (25), Галічы «alias Czyto Pole» (20), Мілаславічы (27), Цімошкі (15), Стары Стан (10), Тарасавічы (20), Макеевічы (7), Юр'евічы (12), Гулькі (5), Дамамерычы (20), Барысаўка (7), Царковішча (10), Ерашоўка (9), Лобжа (6), Лапатавічы (3) мы знаходзім на землях Клімавіцкага раёна; Баханы (40), Бярозкі (15) – Хоцімскага раёна; Ціхіль (4), Стракайлы (12)[47] –

[45] Литовская метрика. Книга судных дел № 4. – P. 64–65.

[46] Литовская метрика. Книга записей № 25 (1387–1546) / parenge D. Antanavičus, A. Baliulis. – Vilnius: Mokslo ir enciklopediju leidybos institutes, 1998. – P. 279.

[47] НГАБ. – Ф. 694. – Воп. 4. – Адз. зах. 1155. – Арк. 69.

ў Шумяцкім раёне Смаленскай вобласці. У Крычаўскім старостве знаходзіліся і іншыя вёскі, якія час ад часу здаваліся на пэўных правах шляхце. Так, крыніца 1591 г. паведамляе нам, што ў вёсках Зяленкавічы і Клеявічы Крычаўскага старостваз 1572 г. валодаў «да жывата» землямі Андрэй Міхайлавіч Гарбуз, які з дазволу Жыгімонта Вазы перадаў іх, пры ўмове нясення «службы земскай ваеннай», на тых жа правах – «да жывата» сыну Якаву[48].

Да 1569 г., калі на Люблінскім сейме была прынята пастанова аб забароне без згоды сейма надзяляць «правом вечным» уладаннямі, якія належалі вялікаму князю, пэўныя перамены адбываліся і ў Крычаўскім старостве. Так, верагодна, паміж 1560–1569 гг. са складу Крычаўскага старостваў фармальна назаўсёды выбылі вёскі Стараселле і Ерашоўка: яны былі аддадзены ў ленное валоданне, хаця час ад часу фігуруюць у якасці вёсак Крычаўскага старостваў. Картаграфія населеных пунктаў, што уваходзілі ў старостваў, паказвае, што іх значная частка лакалізуецца на левабярэжжы Сожа, у пэўнай аддаленасці ад горада.

Крычаўскае старостваў на пачатку XVI ст. у адміністрацыйна-гаспадарчым плане, верагодна, складалася з некалькіх валасцей-войтаўстваў. Акрамя далучанай ў 1529 г. Лучыцкай воласці, крыніцы другой паловы XVII–XVIII ст. называюць у «воласці замка Крычаўскага» (старостве) воласці Палявую і Зарэчную (Засожскую). Нельга выключыць, што падзел воласці Крычава на гэтыя больш дробныя воласці вядзе сваё паходжанне з больш ранняга часу, бо ў шматлікіх перамірных граматах XVI – пачатку XVII ст. паміж Масквой і Вільняй заўжды адзначаецца, што Крычаў адыходзіць да Літвы «з волостьми». Ужо ў перамірным размежаванні 1503 г. паведамляецца, што «городъ Кричев с волостьми» застаўся за Вялікім Княствам Літоўскім. Прыналежнасць «волостей Кричевских» ВКЛ адзначаюць і больш познія перамірныя граматы[49].

Найбольш ранні інвентар Крычаўскага старостваў 1676 г. пералічвае ў складзе старостваў чатыры воласці: Зарэчную, Міраславіцкую, Лучыцкую і Палявую. А ўсе больш познія інвентары – апошняй чвэрці XVII–XVIII ст. называюць у складзе Крычаўскага старостваў толькі две воласці – Палявую і Зарэчную (Засожскую). Астатнія адміністрацыйна-гаспадарчыя адзінкі ў інвентары пераведзены ў разрад войтаўстваў. Верагодна, гэта было звязана з пэўнай адміністрацыйна-гаспадарчай рэарганізацыяй старостваў, якая адбылася пры пераходзе Крычаўскага старостваў пад уладу Радзівілаў.

Згодна з інвентарамі Крычаўскага старостваў апошняй чвэрці XVII–XVIII ст. Палявая воласць складала адзіны гаспадарчы комплекс, размешчаны на правым беразе Сожа. У яго склад у 1676 г. уваходзілі вёскі Сакольнічы, Вусце, Вохар, Камаровічы, Зоры, Халоблін, Песькавічы – сучасныя вёскі Крычаўскага і Чэрыкаўскага раёнаў[50]. У 1686 г., пасля смерці удавы пана Гайко, да Крычаў-

[48] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 77. – Арк. 230–231.

[49] АЗР. – Т. 1. – С. 288; Тамсама. – Т. 2. – С. 134, 303, 314.

[50] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1924. – Арк. 37–43.

скага староства былі аднесены вёскі Варанёва, Зуі, Свіная, якія таксама ўвайшлі ў склад Палявога войтаўства[51].

Акрамя гэтых вёсак на правабярэжжы Сожа знаходзіліся і некаторыя іншыя вёскі Крычаўскага староства, якія ўвесь час здаваліся шляхце «до жывата», але фармальна ўваходзілі ў склад Палявога войтаўства.

Так, падваявода Полацкі пан Жаба ў 1694 г. валодаў у сяле Бель 30 дымамі, у Ананічах – 25 (Крычаўскі р-н). Акрамя таго ў в. Бель 20 дымамі валодаў пан Андрэй Гайко. Пан Кашанскі валодаў у сяле Стараселле 15 дымамі, а пан Іллініч валодаў у сёлах Дарагое і Воўчас адпаведна 30 і 20 дымамі. Пан Гедройц валодаў сялом Прусін, у якім было 10 дымоў. Пан Макавецкі валодаў 12 дымамі ў Лабковічах.

Акрамя таго, тут было некалькі вёсак, якімі хаця і валодаў пан Гансеўскі «ленным правам», але ў інвентары паведамляецца, што яны ўваходзяць у склад Крычаўскага староства. У іх ліку вёскі Палоніца – 30 дымоў, Камароўка – 30, Ермакоўка – 20, Луты – 5 і дакладна не лакалізаваныя вёскі Бярозы (магчыма, суч. в. Беражыстае Крычаўскага раёна) і Міарма, у якіх было па 4 дымы. Лакалізацыя гэтых вёсак на правабярэжжы Сожа дазваляе іх таксама разглядаць у якасці былых вёсак Палявой воласці[52].

Магчыма, з Палявой воласці Крычаўскага староства ў 1662 г. была выведзена слабада Жыдова Буда (суч. в. Красная Буда Крычаўскага раёна), якая «правам дажывотным» была перададзена Уладзіславу Сурыну[53].

Некаторыя перамены ў тэрытарыяльных памерах Палявой воласці адбыліся ў пачатку XVIII ст., калі яе ўладанні перайшлі на левый бераг Сожа. Так, у складзе Палявой воласці інвентары 1720 і 1723 гг. згадваюцца Лабжанскае і Барысаўскае войтаўства. У склад першага войтаўства ўваходзілі вёскі Лобжа і Лапатавічы, а памеры другога, Барысаўскага, дакладна не вызначаны[54].

Інвентар Крычаўскага староства 1727 г. сведчыць, што на левым беразе Сожа ў Палявой воласці акрамя вёсак Лапатавічы, Лобжа, Барысавічы, знаходзіліся вёскі Вепрын, Палуж, Ушакі, Жаркі, Высокае, слабада Гразівец і пабудаванае каля Вепрына мястэчка Геранімаў. Акрамя таго, у гэты час у склад Палявой воласці ўваходзілі размешчаныя на правым беразе Сожа вёскі Сакольнічы, Варанёва, Свіная, Пескавічы, Вохар, Вусце, Камаровічы, Халоблін, нелакалізаваная в. Губкі і размешчаная за р. Асцёр в. Ціхіль[55].

Апошні інвентар Крычаўскага староства 1747 г. не ведае падзелу староства на воласці. Усе адміністрацыйна-гаспадарчыя адзінкі староства названы ў ім войтаўствамі.

У склад Палявога войтаўства ў 1747 г. ўваходзіла мястэчка Геранімаў. На левым беразе Сожа знаходзіліся вёскі Палуж, Лешчанка, размешчаныя на тэ-

[51] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1928. – Арк. 64–67.

[52] Тамсама. – Арк. 114.

[53] Тамсама. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 133. – Арк. 247 адв.–248 адв.

[54] Тамсама. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1931/2. – Арк. 24–25; Тамсама. – Адз. зах. 1933/2. – Арк. 21–22.

[55] Тамсама. – Адз. зах. 1932. – Арк. 152–178.

рыторыі сучаснага Краснапольскага раёна. У Чэрыкаўскім раёне знаходзім вёскі Ушакі, Вепрын. Значная колькасць населеных пунктаў Палявога войтаўства зараз знаходзіцца на тэрыторыі Клімавіцкага раёна: в. Рудня на р. Лобжа, вёскі Гразівец, Лапатавічы, Лобжа, Дарагінь, Высокае, Жаркі (сучасная в. Ст. Жаркі), слабада Жаркоўская (суч. в. Н. Жаркі), Высокая Буда, Жадунька, Барысавічы.

На правым баку Сожа на тэрыторыі Чэрыкаўскага раёна мы бачым вёскі Зоры, Халоблін, Вусце, Вохар, Камаровічы, якія ўваходзілі ў Палявое войтаўства. З вёсак Крычаўскага раёна ў Палявое войтаўства ўваходзілі Сакольнічы, Пескавічы, Свіная, Лабковічы, Зуі, Варанёва. Акрамя таго, на левым беразе Сожа, за Астром размяшчалася в. Ціхіль[56].

Зарэчная, альбо Засожская воласць была значна большай па памерах за Палявую. Яна ў адпаведнасці са сваёй назвай размяшчалася за Сожам і складалася з некалькіх больш дробных войтаўстваў, сярод якіх крыніцы другой паловы XVII–XVIII ст. увесь час згадваюць Дамамеріцкае, Міласлаўіцкае і Лучыцкае.

У пачатку XVIII ст. у Засожскай воласці было сфарміравана Бярозкаўскае войтаўства. Час ад часу фарміраваліся і іншыя войтаўствы ў складзе Засожскай воласці, але гэта былі кароткачасовыя адміністрацыйна-гаспадарчыя фарміраванні, якія не ігралі вядучай ролі ў гісторыі воласці.

Адным з такіх часовых адміністрацыйна-гаспадарчых фарміраванняў было Ушакоўскае войтаўства. Яно згадваецца толькі ў інвентары Крычаўскага староства 1682 г., размяшчалася ўздоўж левага берага Сожа і акрамя в. Ушаковічы ў яго склад уваходзілі вёскі Палуж, Вепрын, Барысавічы, Лобжа, Лапатавічы[57]. У 80-я – пачатку 90-х гадоў XVII ст. цэнтр воласці перамясціўся ў в. Лобжа. У 1693 г. усе гэтыя вёскі згадваюцца ў складзе Лабжанскага войтаўства Засожскай воласці. Акрамя таго, паміж 1682 і 1693 гг. у гэтым войтаўстве ўзнікае слабада Высокая – сучасная аднайменная вёска Клімавіцкага раёна[58]. Гэтыя вёскі мы бачым у складзе Лабжанскага войтаўства і ў 1696 г.[59] Больш познія інвентары пачатку XVIII ст., у якіх згадваецца Лабжанскае войтаўства, лакалізуюць яго ў складзе Палявой воласці.

У інвентары Крычаўскага староства 1682 г. упершыню з'яўляецца Дамамерыцкае войтаўства. У яго склад уваходзілі вёскі Дзягавічы, Дрышчаў (суч. в. Зарубец Крычаўскага р-на), Стракайлы[60]. Інвентар 1693 г. згадвае ў складзе Дамамерыцкага войтаўства вёскі Міхеевічы, Дзягавічы, Дрышчаў (усе вёскі Крычаўскага р-на), Дамамерычы, Барысаўка, Царковішча, слабаду Канахоўку (вёскі Клімавіцкага р-на) і в. Стракайлы[61]. Тыя ж самыя населеныя пункты былі ў Дамамерыцкім войтаўстве і ў 1696 г.[62] Сюды ж, верагодна, раней ўва-

[56] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1936. – Арк. 62–97.
[57] Тамсама. – Адз. зах. 1926. – Арк. 15–21.
[58] Тамсама. – Адз. зах. 1927. – Арк. 25–30.
[59] Тамсама. – Адз. зах. 1928. – Арк. 83–93.
[60] Тамсама. – Адз. зах. 1926. – Арк. 33–34.
[61] Тамсама. – Адз. зах. 1927. – Арк. 14–19.
[62] Тамсама. – Адз. зах. 1928. – Арк. 67–75.

ходзілі вёскі Паўлавічы (Клімавіцкага раёна), у якой пан Жаба валодаў 5 дымамі, Клімавічы, у якой пан Бяляцкі трымаў 15 дымоў, Красавічы, дзе пан Гімбут валодаў 12 дымамі.

Акрамя вышэйпералічаных вёсак інвентар Крычаўскага староства 1712 г. упершыню называе ў складзе Дамамерыцкага войтаўства в. Палошкава – сучасная аднайменная вёска Клімавіцкага раёна. Не змяніўся склад населеных пунктаў Дамамерыцкага войтаўства і ў 1713 і 1714 гг.[63]

Наступны інвентар Крычаўскага староства, які дае ўяўленне пра склад населеных пунктаў Дамамерыцкага войтаўства, – гэта інвентар 1727 г. У складзе войтаўства знаходзіліся вёскі Дамамерычы, Канахоўка, Палошкаў (суч. в. Палошкава), Барысаўка, Царковішча, Дрышчаў, Міхеевічы, Стракайлы, Дзягавічы, слабоды Ерашоўка, Бухаўка, Зімніцы, Свірэль, Гусарка[64].

Апошні вядомы інвентар Крычаўскага староства 1747 г. дадаткова да вышэйпералічаных населеных пунктаў называе ў складзе Дамамерыцкага войтаўства новыя паселішчы: вёскі Хацень, Прахораўка, слабодку Дрышчаў, размешчаную насупраць аднайменнай вёскі, і в. Лядзешня[65].

Адміністрацыйна-гаспадарчая адзінка з цэнтрам ў Міласлявічах двойчы называецца воласцю (1676, 1682 гг.). Яна размяшчалася на ўсходзе сучаснага Клімавіцкага раёна, і ў 1676 г. ў яе склад ўваходзілі вёскі Міласлявічы, Тарасавічы, Галічы, Людковічы, Хмель, Макеевічы, Цімошкі, Юр'евічы. Інвентар 1682 г. дадаткова называе ў Міласлявіцкай воласці в. Якімавічы[66].

Больш познія інвентары называюць адміністрацыйна-гаспадарчую адзінку з цэнтрам у Міласлявічах войтаўствам у складзе Засожскай воласці.

Інвентар 1693 г. акрамя раней вядомых вёсак дадаткова згадвае ў складзе Міласлявіцкага войтаўства в. Стары Стан. Не змяніўся склад населеных пунктаў войтаўства і праз тры гады. Адзіная навіна, якую паведамляе інвентар 1696 г., гэта тое, што згаданая в. Гулькі раней мела другую назву – Хмель[67].

У пачатку XVIII ст. Міласлявіцкае войтаўства змяніла сваю назву. Інвентары 1712–1714 гг. згадваюць вышэйпералічаныя вёскі Міласлявіцкага войтаўства ў складзе Углянскага войтаўства[68].

Вызначыць склад населеных пунктаў Міласлявіцкага войтаўства сярэдзіны XVIII ст. дазваляюць інвентары Крычаўскага староства 1727 і 1747 гг.

Згодна з інвентаром староства 1747 г. у склад Міласлявіцкага войтаўства ўваходзіла мястэчка Ганна, якое мела і другую назву – Міласлявічы. У той жа час інвентар староства 1727 г. паведамляе, што назву Міласлявічы мае і дру-

---

[63] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1930. – Арк. 2, 3, 25, 46–48.

[64] Тамсама. – Адз. зах. 1932. – Арк. 118–131.

[65] Тамсама. – Адз. зах. 1936. – Арк. 205–221.

[66] Тамсама. – Адз. зах. 1924. – Арк. 28–30; Тамсама. – Адз. зах. 1928. – Арк. 36.

[67] Тамсама. – Адз. зах. 1927. – Арк. 20–24; Тамсама. – Адз. зах. 1928. – Арк. 76–82.

[68] Тамсама. – Адз. зах. 1930. – Арк. 4–6, 26–29, 48–50.

гое паселішча – в. Скрымінава, якая ўпершыню згадваецца ў складзе Мілаславіцкага войтаўства[69].

Сярод населеных пунктаў Мілаславіцкага войтаўства 1747 г. мы бачым даўно вядомыя вёскі Галічы, Юр'евічы, Макеевічы, Цімошкі, Якімавічы, Гулькі, Стары Стан, Тарасавічы[70]. Такім чынам, 20–40-я гады XVIII ст. былі часам актыўнага асваення зямель Мілаславіцкага войтаўства.

У 1719 г. была заснавана слабада Сабалёўка, у 1720 г. – слабада Фядотава Буда, Перавалочня, у 1722 г. – слабада Кавалёва, у 1723 г. – слабоды Сураў, Сакалоўка, Дудароўка, у 1724 г. – Шчамялёўка, Куларoўка, Цітаўка, Пуцівіл[71].

Апошні інвентар 1747 г. згадвае ў складзе Углянскага войтаўства мястэчка Ганна – Мілаславічы, вёскі Галічы, Дудароўка, Сабалёўка, Сакалоўка, Песляцін, Фядотава Буда, Шчамялёўка, Юр'евічы, Перавалочня, Макеевічы, Цімошкі, Якімавічы, Лядзешня, Ільюхіна, Гулькі, Соўна, Кавалёўка, Склімін, Цітаўка, Стары Стан, Пуцімель, Пожар, Тарасавічы, Карпачы[72]. Усе пералічаныя вёскі мы і зараз сустракаем на тэрыторыі Клімавіцкага раёна Магілёўскай вобласці.

Лучыцкая воласць была далучана да Крычаўскага староства ў 1529 г. і першапачаткова, верагодна, заставалася раўназначнай адміністрацыйна-гаспадарчай адзінкай староства сярод іншых валасцей. Ва ўсякім выпадку, яшчэ ў інвентары Крычаўскага староства 1676 г. яна названа воласцю. Але ва ўсіх наступных інвентарах XVII–XVIII стст. яна лічыцца войтаўствам Засожскай воласці.

Памеры Лучыцкай воласці XV–XVI стст. рэканструююцца дзякуючы інвентарам Крычаўскага староства другой паловы XVII ст. і наданням вялікіх князёў у «Алучыцах». Так, у інвентары Крычаўскага староства 1676 г. гаворыцца, што ў Лучыцкую воласць уваходзілі сёлы «Блудзімл» (суч. Блудзімля), «Брацкевіче» (Брацькавічы), «Горбовіче» (Гарбавічы), «Дубісці» (Дубіец), «Відуцы» (Відуйцы), «Панкі» (суч. в. Зацішша Макранскага с/с), «Ковычыце» (Кавычыцы), «Мокре» (Мокрае), «Хоцімск» (сучасная аднайменная вёска Касцюковіцкага раёна), «Самотевіче» (Саматэвічы), «Гібалы» (суч. в. Чырвоная Слабада), «Демідовіче» (Дзямідавічы), слабада «Кропівна» (Вялікая Крапіўня), слабада «Забычаніе» (Забычанне). Усе пералічаныя вёскі размешчаны на тэрыторыі сучаснага Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці.

Акрамя таго, у Лучыцкай воласці згадваюцца вёскі «Курбакі» (Краснапольскі раён), «Берозкі» (Бярозкі), слабада «Батніево» (Батаева) – Хоцімскі раён, в. Лешня і в. Жадунь, якую інвентар Крычаўскага староства 1747 г. лакалізуе на р. Жадунька насупраць мястэчка Студзянец[73], прыкладна на тым месцы, дзе зараз размешчана в. Мір'якоўка Касцюковіцкага раёна.

---

[69] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1932. – Арк. 108–109, 111–114; Тамсама. – Адз. зах. 1936. – Арк. 173–176, 198–199.

[70] Тамсама. – Адз. зах. 1936. – Арк.173 – 203.

[71] Тамсама. – Адз. зах. 1932. – Арк. 86–96, 97–99, 105–106, 115–117.

[72] Тамсама. – Адз. зах. 1936. – Арк. 173–204.

[73] Тамсама. – Адз. зах. 1924. – Арк. 31–37; Тамсама. – Адз. зах. 1936. – Арк. 110.

Інвентар Крычаўскага староства 1682 г., акрамя гэтых вёсак, у Лучыцкім войтаўстве дадаткова называе слабаду «Тупічына» (суч. в. Тупічын), вёскі «Крыва Ніва» (суч. в. Крывая Ніва Касцюковіцкага раёна) і «Бохоны»[74] (суч. в. Баханы Хоцімскага раёна). Інвентар староства 1693 г. дадае нам назву яшчэ адной вёскі, што уваходзіла ў склад Лучыцкага войтаўства – в. «Калодзесцы» (суч. в. Калодзецкая Касцюковіцкі р-н). Такімі ж звесткамі пра Лучыцкае войтаўства абмяжоўваецца і апошні вядомы нам інвентар Крычаўскага староства XVII ст. – інвентар 1694 г.[75] Акрамя таго, недзе ў 1695–1700 гг. на левым беразе р. Беседзь узнікае слабада Хоцімск на грунтах сяла Баханы – сучасная левабярэжная частка Хоцімска[76].

Аднак раней Лучыцкае войтаўства, калі яно існавала яшчэ як самастойная адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка – воласць, было значна большым па памерах. Гэтыя землі на працягу XV – першай паловы XVI ст. шырока выкарыстоўваліся дзяржаўнай уладай для зямельных раздач шляхце на пэўных умовах. У выніку гэтага колькасць дзяржаўных уладанняў у Лучыцкай воласці скарачалася, аднак самі шляхецкія ўладанні таксама ўяўляюць цікавасць для нас, бо дазваляюць больш дакладна акрэсліць першапачатковыя межы Лучыцкай воласці.

Адным з такіх першых наданняў, што зафіксаваны ў крыніцах з'яўляюцца пажалаванні Кучукам вёсак «Бычане» (суч. в. Забычанне) і «Тупищину» (суч. в. Тупічын) удзельнымі князямі Мсціслаўскімі[77]. У вёсцы Забычанне ў « Олучыцах» у 1591 г. Іван Раманавіч Каша валодаў «правам дажывотным», службай зямлі, якую ён на тых жа ўмовах, са згоды караля Жыгімонта III, перадаў сваіму сыну Міхаілу[78]. Тады ж Іван Каша перадаў сыну Міхаілу і «землю Евхимовскую при Мануйлавичах» ў «Алучыцкай» воласці[79] (суч. в. Мануілы Краснапольскага р-на).

Прывілей караля Жыгімонта Старога ад 27 жніўня 1508 г. паведамляе нам пра наданне Сеньку Мсціслаўцу сяла Касцюкова ў Лучыцкай воласці. Жыгімонт надаў сяло Сеньку пры ўмове выканання ім службы земскай ваеннай. Аднак недзе паміж 1508 і 1512 гг. Жыгімонт надаў вёску Касцюкова Сеньку Мсціслаўцу «на вечнасць», пра што сведчыць пацвярджальны прывілей 1512 г.[80]

У 1582 г. Ольша Ждановіч прасіў у Стэфана Баторыя пацвярджэння правоў на валоданне сяльцом пустым Печары (суч. в. Пячары Касцюковіцкага р-на)

---

[74] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1926. – Арк. 26, 27, 31.

[75] Тамсама. – Адз. зах. 1927. – Арк. 41; Тамсама. – Адз. зах. 1928. – Арк. 94–110.

[76] Мяцельскі А. А. Хоцімск: да пытання пра час узнікнення. – С. 20–24.

[77] ИЮМ. – Вып. 25. – С. 484.

[78] НГАБ. – Ф. 694. – Воп. 4. – Адз. зах. 1155. – Арк. 54–55.

[79] Тамсама. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 77. – Арк. 229 адв.–230.

[80] Литовская метрика. Книга записей № 8 (1499–1514). – Р. 276; Описание бумаг и документов. – С. 180, 202.

у Лучыцкай воласці, якое ён атрымаў «до воли и ласки» ад караля Жыгімонта Аўгуста. Стэфан Баторый пацвердзіў права на валоданне вёскай «до живота». У 1722 г. яго нашчадкі атрымалі пацвярджэнне правоў ад караля Аўгуста II[81].

Крыніцы XVI ст. згадваюць і іншыя вёскі Крычаўскага староства і Мсціслаўскага ваяводства, якія, мяркуючы па іх размяшчэнні, раней уваходзілі ў склад Лучыцкай воласці. У 1511 г. у Крычаўскім павеце згадваецца вёска «Конічы» (суч. в. Канічы Касцюковіцкага р-на), у якой Кірылу Залесаву была пажалавана пустаўшчына «Воистюйкова»[82]. 1546 годам датуюцца звесткі пра размежаванне шляхецкіх і каралеўскіх зямель сяла Бялынкавічы Крычаўскага староства, якое павінна было адносіцца да Лучыцкага войтаўства[83]. У лісце крычаўскага дзяржаўцы Андрэя Шалухі баярам Кашурам на зямлю ў навакольлях Брацькавічаў, які датуецца 1552 г.[84], пры апісанні межаў зямлі, якую яны атрымалі, згадваюцца дарога Блудзімская, дарога да Забычання, што сведчыць пра тое, што аднайменныя вёскі ўжо былі. Тут жа згадваюцца раўкі «Сколінскі» і «Хамінскі», якія ускосна сведчаць пра існаванне ўжо ў той час сучасных аднайменных вёсак. Размяшчэнне гэтых тапонімаў паміж Мануйлавічамі і Забычаннем сведчыць, што яны таксама раней уваходзілі ў Лучыцкую воласць.

Крыніца 1591 г. паведамляе нам, што ў вёсках Зяленкавічы і Клеявічы Крычаўскага староства з 1572 г. валодаў «да жывата» землямі Андрэй Міхайлавіч Гарбуз, які з дазволу Жыгімонта III перадаў іх, пры ўмове нясення «службы земскай ваеннай», на тых жа правах – «да жывата» сыну Якаву[85]. Адпаведна і гэтыя вёскі Зяленкавічы і Клеявічы таксама раней ўваходзілі ў склад Лучыцкай воласці.

І ў больш познія часы землі Лучыцкага войтаўства шырока выкарыстоўваліся для часовых пажалаванняў шляхце. Так, у 1663 г. Г. Асмалоўскі падаў каралю пратэстацыю аб тым, што пасля смерці Ц. Падабеда яго маці аспрэчвала правы на «маетнасць» Г. Падабеда – вёскі Крывую Ніву і Брацькавічы ў удавы апошняга – сястры Г. Асмалоўскага[86].

Інвентар Крычаўскага староства 1696 г. адзначае, што ў вёсках Зяленкавічы і Белая Дуброва валодаў адпаведна 20 і 40 дымамі пан Андрэй Гайко[87]. Фармальна гэтыя вёскі знаходзіліся на былой тэрыторыі Лучыцкай воласці і калісьці ўваходзілі ў яе склад. Гэтыя вёскі і надалей заставаліся ў валоданні роду Гайко, пакуль кароль Аўгуст II не забраў іх частку ў скарб па смерці Альбрэхта Гайко і не перадаў Каралю Станіславу Радзівілу, што было пацверджана

---

[81] НГАБ. – Ф. 694. – Воп. 4. – Адз. зах. 1155. – Арк. 34–35.
[82] Описание бумаг и документов. – С. 199.
[83] НГАБ. – Ф. 694. – Воп. 4. – Адз. зах. 1155. – Арк. 72 адв.
[84] АЮЗР. – Т. 2. – С. 147–148.
[85] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 77. – Арк. 230–231.
[86] ИЮМ. – Вып. 17. – С. 187–188.
[87] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1928. – Арк. 114.

каралём у 1718 г.[88] Але ў больш позні час гэтыя землі зноў належалі роду Гайко. Так, у 1727 г. у Зяленкавічах валодаў землямі Казімір Гайко[89], а на карце Крычаўскага графства 1786 г. пасярод Лучыцкага войтаўства ў раёне сучасных вёсак Белая Дуброва, Клеявічы, Клеткі і Рвенск паказаны ўладанні паноў Гайко. Раней у склад Лучыцкай воласці ўваходзіла і в. Асмолавічы (Хоцімскі р-н), але ў 1696 г. яна ўся была занята шляхецкімі ўладаннямі.

Такім чынам, крыніцы сведчаць, што Лучыцкая воласць, а потым і аднайменнае войтаўства на працягу XV–XVII стст. займала тэрыторыю сучасных Касцюковіцкага, Хоцімскага, усходнюю частку Краснапольскага раёна Магілёўскай вобласці.

Значныя перамены адбыліся ў адміністрацыйна-гаспадарчым падзеле Крычаўскага староства ў пачатку XVIII ст. У 1712 г. раней адзінае Лучыцкае войтаўства дзеліцца на два: Лучыцкае і новаўтворанае Бярозкаўскае, якое было сфарміравана на ўсходніх землях першага. Цэнтр Бярозкаўскага войтаўства размяшчаўся ў в. Бярозкі, якая і дала яму сваю назву. У склад войтаўства, акрамя в. Бярозкі, ўвайшлі вёскі «Хоцімск Вялікі» – былая слабада Хоцімск, «Бохоны», «Батаева», «Тупічына слабада», «Дзямідавічы», «Крапіўна», «Лешня». Як бачна з пералічаных вёсак, Бярозкаўскае войтаўства займала большую частку сучаснага Хоцімскага і ўсходнюю частку Касцюковіцкага раёна.

У складзе Лучыцкага войтаўства засталіся раней вядомыя вёскі Жадунь, Гарбавічы, Гібалы, Красніца, Дубіец, Панкі, Кавычыцы, Мокрае, Саматэвічы, Курбакі, Відуйцы, Калодзіск, Крывая Ніва, Забычанне, Брацкавічы, Блудзімль.

Скараціўшы сваю тэрыторыю на ўсходзе, Лучыцкае войтаўства ў той самы час пашырыла свае ўладанні за кошт паўночных і заходніх зямель. Так, у складзе Лучыцкага войтаўства зараз згадваюцца вёскі Палуж (суч. левабярэжная частка в. Палуж-2 Краснапольскага р-на), Ушакі, Вепрын (Чэрыкаўскі р-н), Высокая, Барысавічы, Лобжа і Лапатавічы (Клімавіцкі р-н). У такім стане Лучыцкае войтаўства знаходзілася і ў 1713 і 1714 гг.[90]

Але даволі хутка пачаўся новы працэс скарачэння тэрыторыі войтаўства. Так, інвентар Крычаўскага староства 1720 г. паведамляе што вёскі Лобжа, Лапатавічы і Барысавічы зараз перайшлі ў склад Палявой воласці.

У выніку далейшага росту колькасці населеных пунктаў у сярэдзіне XVIII ст. Лучыцкае войтаўства ўключала ў свой склад 2 мястэчкі – Міхалаў, Студзянец і 39 вёсак: Забычанне, Крупня, Галашоўка, Харовін, Гібайлы, Гумніцкая, Харашоўка, Жадунь, Баравая, Бароўка, Гарбавічы, Красніца, Гаўрыленка, Дубіец, Мялоўка, Вётухна, Доўгі Лог, Брацькавічы, Дубраўка, Дубровіца, Гольшаў, Крывая Ніва, Буда Брацькавіцкая, Калодліва, Кавычыцы, Баронькі, Буда Панькаўская, Белы Камень, Хоцімск, Саматэвічы, Сілічы, Гайдукоўка, Відуйцы, Казелле, Буда Казельская, Курбакі, Буда Курбацка, Калодзіск, Какойск. Акра-

[88] НГАБ. – Ф. 694. – Воп. 4. – Адз. зах. 1160. – Арк. 42.

[89] Тамсама. – Адз. зах. 5807. – Арк. 48.

[90] Тамсама. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1930. – Арк. 6–15, 32–38, 54–61.

мя таго, у войтаўстве на той час было 8 слабод – Поўсцін, Вялікі Бор, Пенеж, Колпіта, Бердніцкі Ручай, Дзеравец і Папротна Буда.

Праз 10 гадоў (1757 г.) у рэестры бірчым староства Крычаўскага ў Лучыцкім войтаўстве адзначаны амаль ўсе папярэднія населеныя пункты. Адсутнічаюць толькі мястэчка Студзянец, слабоды Колпіта і Бердніцкі Ручай. З новых населеных пунктаў адзначана вёска «Сяшнеўка» (суч. в. Сігееўка Касцюковіцкага р-на)[91].

У складзе Бярозкаўскага (Хоцімскага) войтаўства крыніцы сярэдзіны XVIII ст. называюць вёскі Ліпаўка, Узлогі, Хоцімск, Бесавіцкая, Горня, Баханы, Бярозкі, Ганнаўка, Дубраўка, Негава (суч. в. Ветка Хоцімскага р-на), Батаева, Селіцкая, Крапіўна, Тупічын, Дзямідавічы, Валынеж, Лешня, Вішанкі (суч. в. Вішні Касцюковіцкі р-н), Ліпавы Ручай, Прусін, Шарэйкі[92]. Большую частку гэтых вёсак мы і сёння бачым у паўднёвай частцы Хоцімскага і Касцюковіцкага раёнаў. Выключэнне складаюць толькі в. Ганнаўка, якая на карце Крычаўскага графства 1786 г. паказана побач з в. Бярозкі. Верагодна, гэтыя населеныя пункты даўно зліліся і зараз складаюць адно цэлае.

Не лакалізуецца в. Лешня, але на карце 1786 г. яна паказана на поўдзень ад в. Вішанькі. Згаданая ў інвентары в. Ліпавы Ручай, верагодна, трапіла сюды выпадкова. Населены пункт з сугучным гучаннем – «Філіпаў Ручай» быў заснаваны ў 1723 г. на «грунце Жадуньскім». У інвентары староства 1747 г. вёска пад блізкай назвай – «Ліпаў Ручай» згадваецца ў Бярозкаўскім войтаўстве, але на карце Крычаўскага графства 1786 г. яна паказана на тэрыторыі Лучыцкага войтаўства і размешчана прыкладна на месцы сучаснай в. Ліпаўка Касцюковіцкага раёна[93]. Мяркуючы па карце Крычаўскага графства 1786 г., Бярозкаўскае войтаўства не было адзіным. Яно складалася з дзвюх частак, разарваных паміж сабой шляхецкімі ўладаннямі.

Такім чынам, у сярэдзіне XVIII ст. Крычаўскае староства складалася з 5 войтаўстваў – Дамамерыцкага, Углянскага, Хоцімскага, Лучыцкага і Палявога, што зафіксавала і люстрацыя Мсціслаўскага ваяводства 1765 г.[94] Яно ў канцы XVIII ст. не стварала адзінага тэрытарыяльнага комплексу, а войтаўствы былі разарваны паміж сабой шляхецкімі ўладаннямі (мал. 37). У 1773 г. у яго складзе было 146 вёсак і 5 мястэчак.

Крычаўскае староства было адным з самых вялікіх дзяржаўных уладанняў на ўсходзе краіны. Таму ўвесь час яго трымалі прадстаўнікі найбольш уплывовых родаў ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Прыкладна з 1634–1635 і па 1670 г. ім валодалі Пацы, а з 1670 і па 1760 г. – Радзівілы. Пасля смерці Г. Ф. Радзівіла пачалася барацьба за Крычаўскае староства, якое давала некалькі сот тысяч злотых даходу, на якое прэтэндавалі гетман вялікі каронны і маршалак надворны

[91] НГАБ. – Ф. 694. – Воп. 2. – Адз. зах. 3983. – Арк. 86 адв.–87.

[92] Тамсама. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1936. – Арк. 141–172.

[93] Тамсама. – Адз. зах. 1932. – Арк. 44; Тамсама. – Адз. зах. 1936. – Арк. 169.

[94] LVIA. – F. SA. – Ap. 1. – Bib. 3806. – P. 2 v.



Мал. 37. Прамалёўка карты Крычаўскага графства, якое належала яго светласці князю Рыгору Аляксандравічу Пацёмкіну. «Сочинена в Дубровенской Его светлости межевой чертежне под смотрением оберъ-квартирмейстера барона Карла Маркловского 1786 года марта 15 дня»: **А – Дамамерыцкае войтаўства:** *1* – Барысавічы; *2* – Крычаў; *3* – Воранева; *4* – Зуі; *5* – Лабковічы; *6* – Ціхіль; *7* – Дзягавічы; *8* – Прохараўка; *9* – Міхеевічы; *10* – Рудня; *11* – Гразівец; *12* – Гута; *13* – Лобжа; *14* – Жаркі; *15* – Высокая Буда; *16* – Жадунь; *17* – Лапатавічы; *18* – Дарагінь; *19* – Дрышчава; *20* – Стракайлава; *21* – Палошкава; *22* – Барысаўка; *23* – Цэркавішча; *24* – Хацень; *25* – Дамамерычы; *26* – Ярашоўка; *27* – Свірэль; *28* – Зімніца; *29* – Гусарка; *30* – Бухоўка; *31* – Канахоўка; *32* – Высокае; *33* – Задабрасць; *34* – Бочкі; **В – Мілаславіцкае войтаўства:** *1* – Тарасавічы; *2* – Цітаўка; *3* – Скліміна; *4* – Пожар; *5* – Мілаславічы; *6* – Пуцімель; *7* – Сабалёўка; *8* – Сакалоўка; *9* – Кавалёўка; *10* – Якімавічы; *11* – Лядзешня; *12* – Дудараўка; *13* – Галічы; *14* – Післяціна; *15* – Юр'евічы; *16* – Перавалочня; *17* – Шчамялёўка; *18* – Фядотава Буда; *19* – Макеевичи; *20* – Асоўна; *21* – Ільюхіна; *22* – Цімошкі; *23* – Карпачы; **С – Хоцімскае войтаўства:** *1* – Прудок; *2* – Шарэйкі; *3* – Буда; *4* – Вішанькі; *5* – Вітунь; *6* – Лешня; *7* – Дзямідавічы; *8* – Валынеж; *9* – Тупічын; *10* – Крапіўнае; *11* – Селицкае; *12* – Бярозкі; *13* – Ганнаўка; *14* – Батаева; *15* – Нягоеў; *16* – Шаладонаўка; *17* – Баханы; *18* – Шышкова; *19* – Дуброўка; *20* – Прудок Усаўскі; *21* – в. Хоцімск; *22* – м. Хоцімск; *23* – Прудок; *24* – Бясовічы; *25* – Казлоўка; *26* –

Горнеў; *27* – Узлогі; *28* – Липаўка; **Д – Забычанскае войтаўства:** *1* – Гослеў; *2* – Какойск; *3* – Калодзецк; *4* – Курбацкая Буда; *5* – Казельская Буда; *6* – Казелле; *7* – Курбакі; *8* – Гаўрыленка; *9* – Відуйцы; *10* – Папаратная; *11* – Селічы; *12* – Харовін; *13* – Блудзімля; *14* – Брацькавічы; *15* – Доўгі Лог; *16* – Вётухна; *17* – Саматэвічы; *18* – Кісялёўка; *19* – Малы Хоцімск; *20* – Жукаўка; *21* – Мокрае; *22* – Шаблі; *23* – Забычанне; *24* – Крупня; *25* – Галашоўка; *26* – Крывая Нива; *27* – Дубеец; *28* – Сігееўка; *29* – Красніца; *30* – Горбавічы; *31* – Мелаўка; *32* – Гібалы; *33* – Гумніцкае; *34* – Харашоўка; *35* – Бароўка; *36* – Студзянец; *37* – Студзянецкая Гута; *38* – Калодліва; *39* – Вялікі Бор; *40* – Кавычыцы; *41* – Панкі; *42* – Дуброўка; *43* – Панкавіцкая Буда; *44* – Брочкава; **Е – Палявое войтаўства:** *1* – Ушакі; *2* – Рудня; *3* – Нівіцка; *4* – Халоблін; *5* – Камаровічы; *6* – Зоры; *7* – Гронаў; *8* – Вусце; *9* – Вепрын; *10* – Вохар; *11* – Лешчанка; *12* – Палуж; *13* – Высокі Барок; **h** – уладанні пана Гайко; **f** – уладанні пана Глінкі; **g** – уладанні пана Юрэвіча

каронны Е. Мнішак[95]. Апошні аказаўся больш хуткім і атрымаў Крычаўскае староства, якім і валодаў да 1776 г.

Акрамя Крычаўскага староства, на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства былі раскіданы і іншыя шматлікія дзяржаўныя ўладанні, якія канцэнтраваліся ў асноўным у наваколлях Мсціслава альбо набліжаліся да дзяржаўнай мяжы і былі меншымі па памерах за Крычаўскае староства.

Адным з такіх старостваў было **Мсціслаўскае**. Яно не было вялікім і тэрытарыяльна адзіным. Крыніцы XVI – пачатку XVII ст. згадваюць у складзе староства сам Мсціслаў, в. Беразетня і слабаду Бель, прысёлак Несцераў, якія да яе прымыкалі. Таксама ў Мсціслаўскім старостве былі вёскі Заполле, Красная, Калодзеская, Парадніна, Усполле[96], якія ўвесь час здаваліся ў пажыццёвае ўладанне ці ва ўладанне «до воли и ласки гаспадарскай». Пра тое, што Мсціслаўскае староства было адносна невялікім, сведчыць той факт, што разам з радамлянскім яно ў 1566 г. прыносіла штогадовы даход у памеры 573 коп грошаў літоўскіх, не лічачы іншых натуральных выплат[97].

Верагодна, першыя мсціслаўскія старасты XVI ст. даволі смела раздавалі вёскі староства мясцовай шляхце за пэўныя паслугі, у выніку чаго яго тэрыторыя значна скарацілася. Таму перад мсціслаўскім старастам Пятром Пацам каралём ужо ў канцы XVI ст. была пастаўлена задача сабраць разданыя землі. Аднак мяркуючы па спісе тых вёсак, якія ён змог вярнуць у староства, новымі з іх былі толькі Расна і Бабінавічы[98]. Але і яны потым вышлі са складу Мсціслаўскага староства і сталі цэнтрамі самастойных «дзяржаў». Час ад часу ў склад Мсціслаўскага староства ўваходзіла і Радамля, хаця большы час яна была цэнтрам самастойнай дзяржавы Мсціслаўскага ваяводства.

І ў больш познія часы Мсціслаўскае староства заставалася невялікім. Час ад часу яно павялічвалася за кошт вымарачных уладанняў, аднак фактычна адразу ж гэтыя вымарачныя вёскі здаваліся ў дзяржанне новым уладальнікам.

[95] Matuszewicz M. Diariusz życia mego. – T. 2. 1758–1764. – Warszawa, 1986. – S. 102.

[96] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 70. – Арк. 126 адв.–127; Тамсама. – Адз. зах. 83. – Арк. 206–206 адв.; Тамсама. – Адз. зах. 84. – Арк. 9 адв.–10.

[97] Kempa T. Sołomerecki Iwan Wasilewicz // Polski Słownik Biograficzny. – T. XL/3, – zeszyt 166. – Warszawa; Kraków, 2001. – S. 327–328.

[98] Wolff J. Pacowie. – Petersburg: W druk. Suszczynkiey, 1885. – S. 139–141.

Згодна з люстрацыяй Мсціслаўскага староства 1738 г., у яго складзе былі Мсціслаў, Радамля і вёскі Беразетня, Парадніна, Будзін, Лукавая і Слабодка. Гэтыя ж населеныя пункты былі ў складзе староства і ў 1765 г.[99] Астатнія населеныя пункты, што раней уваходзілі ў склад Мсціслаўскага староства, знаходзіліся ў «пацэсіі» ў рознай шляхты. У 1773 г. у склад Мсціслаўскага староства ўваходзілі 7 вёсак, дзе пражывалі 550 чалавек мужчынскага полу[100].

Вялікім па колькасці населеных пунктаў было **Хіславіцкае** староства, у аснове якога ляжала воласць Хастлавічы, якой яшчэ ў сярэдзіне XV ст. валодаў Андрэй Порхаўскі і якая ўваходзіла ў склад Мсціслаўскага княства XII–XV стст. Пасля ліквідацыі Мсціслаўскага княства ў канцы XV ст. яна, верагодна, у якасці самастойнай воласці ўвайшла ў склад Віленскага ваяводства ВКЛ і стала каралеўскім уладаннем, якое ўпершыню згадваецца разам з валасцямі Крычава і Мсціслава ў перамірнай грамаце 1522 г. з Вялікім Княствам Маскоўскім[101]. А пасля арганізацыі Мсціслаўскага ваяводства яно ўвашло ў яго склад у якасці самастойнай адміністрацыйна-гаспадарчай адзінкі, якая належала каралю.

Аднак да канца XVI ст. населеныя пункты, што ўваходзілі ў гэта каралеўскае ўладанне, не вядомы. Толькі крыніцы, якія датуюцца самым канцом XVI ст., утрымліваюць звесткі пра іх.

Князь Самуэль Пятровіч Друцкі-Горскі ўзяў шлюб з Аляксандрай Дубоўскай і 23 сакавіка 1596 г. атрымаў прывілей ад караля на 20 служб у вёсках Хатславічы (Хіславічы), Мікшына, Лызкі (Хіславіцкі р-н), Дудзіна (Манастыршчынскі р-н), Бабінічы (Шумяцкі р-н), якімі раней Аляксандра Дубоўская сумесна валодала са сваім мужам, мсціслаўскім падкаморым Мацеем Сухадольскім[102].

У 1622 г. пасля шлюбу Крыштафа Станіслава Цеханавецкага з Антанэляй Друцкай-Горскай гэта каралеўскае ўладанне перайшло ў рукі Цеханавецкіх, якія трымалі яго амаль без перапынкаў да першага падзелу Рэчы Паспалітай.

У 1622 г. сярод уладанняў Цеханавецкіх у складзе Хіславіцкага староства былі самі Хіславічы і вёскі Лызкі, Дудзіна, Мікшына[103]. У 1681 г. удава Марціна Вінцэнтыя Цеханавецкага Марыяна Катоўская атрымала ад караля па смерці мужа Хаславіцкае староства, у склад якога ўваходзілі Хіславічы і вёскі М. і В. Лызкі, Гупін (суч. Кпін Хіславіцкага р-на), Дудзіна, Крылова, Будзішча і Трыпуціна. А потым ужо самастойна набыла ў швагра Самуэля Казіміра Цеханавецкага другую частку Хіславічаў з вёскамі Елкаў, Хралоў, Селязёнкі і Каськоў (суч. в. Каськова Мсціслаўскага раёна). А потым дадаткова набыла ў Якубоўскіх Якубоўшчыну і вёскі Жучкі, Галалобаўка, Асінаўка, Буда, Лаба-

---

[99] LVIA. – F. SA. – Ap. 1. – Bib. 3806. – P. 21 v.–22.

[100] Мелешко В. И. Очерки аграрной истории Восточной Белоруссии. – Минск: Наука и техника, 1975. – С. 228.

[101] АЗР. – Т. 1 – С. 148, № 120.

[102] Wolff J. Kniazowie litewsko-ruscy. – S. 143–144.

[103] Dumin S., Rachuba A., Sikorska-Kulesza J. Ciechanowieccy herby Dąbrowa. – S. 39–40.

наўка, Чарнаручча, Прытыкіна і Цяцерын[104]. Усё гэта сведчыць, што першапачаткова воласць Хіславічаў (Хатславічаў) XV–XVII стст. размяшчалася па абодвух берагах Сожа. Яна ўключала ў свой склад не толькі тэрыторыю сучаснага Хіславіцкага раёна, але і захоплівала значную частку Манастыршчынскага раёна Смаленскай вобласці. Акрамя таго, на яе тэрыторыі знаходзіліся і іншыя населеныя пункты, якія размяшчаліся ў шляхецкіх уладаннях – Міхайлаўск, Гарадок, Мазыкі.

У пачатку XVIII ст. (15.X.1703 г.) Марыяна Цеханавецкая з Катоўскіх дабілася ў караля таго, каб Хіславіцкае староства перайшло да сына Марціна Вінцэнцыя Крыштафа Францішка, які і трымаў староства да сваёй смерці ў 1718 г.

Яго ўдава Эльжбета Козел-Паклеўская (13.X.1720 г.) дабілася згоды караля на перадачу Хіславіцкага старостваа свайму сыну Марціну Цеханавецкаму, які і трымаў яго да сваёй смерці, якую ён напаткаў не пазней за 09.V.1762 г.[105]

На працягу XVI–XVIII стст. некаторыя вёскі Хіславіцкага староства станавіліся цэнтрамі самастойных старостваў. А некаторыя згадваюцца ў якасці цэнтраў негарадавых старостваў. Так, у сярэдзіне XVI ст. (1569 г.) у якасці цэнтра негарадавога староства згадваецца Мікшына. У склад гэтага староства ўваходзілі вёскі Царковішча, Дудзіна, Лызкі[106]. Аднак ужо ў канцы XVI ст. Лызкі, Дудзіна і Мікшына былі ў складзе Хіславіцкага староства.

У сярэдзіне XVIII ст. са складу Хіславіцкага староства ў выніку спрэчак паміж Марцінам і яго малодшым братам Антоніем Тадэвушам (1737–1740 гг.) апошняму былі перададзены вёскі Мікшына і Дудзіна. Аднак потым гэтыя ўладанні зноў апынуліся ў адных руках, бо ў 1748 г. хіславіцкім старастам быў Антоній Тадэвуш Цеханавецкі[107].

У 1765 г. Мікшынскім староствам працягваў валодаць Антоній Тадэвуш Цеханавецкі, і ў яго складзе былі вёскі Пільнікі, Беліца, Галушкі, Галубцы, Зімніца, Машонкі, Пуцькі, якія і зараз знаходзяцца на левабярэжжы Сожа ў Хіславіцкім раёне Смаленскай вобласці. Староства было адносна невялікім па колькасці гаспадароў, іх тут налічвалася толькі 122[108].

Ды і Дудзінская дзяржава, што знаходзілася каля Манастыршчыны, на мяжы с Расіяй, таксама ў апісанні 1765 г. згадваецца як састаўная частка Хіславіцкага староства. Яна была ў пацэсіі ў Францішка Цеханавецкага, і ў ім налічвалася 18 гаспадароў, якія сядзелі на 3 валоках[109].

У сярэдзіне XVIII ст. (1765 г.) у склад Хіславіцкага староства Мсціслаўскага ваяводства ўваходзілі вёскі Елкаў, Гарбачоўка, Замошша, Асінаўка, Лабанаўка, Гакурына, Прытыкін, Чарнаручча, Галалобаўка, Лызкі, абруб Бовкін,

---

[104] Dumin S., Rachuba A., Sikorska-Kulesza J. Ciechanowieccy herby Dąbrowa. – S. 57.

[105] Тамсама. – S. 70, 81.

[106] Słownik geograficzny Królewstwa Polskiego i innych krajow słowianskich. – Warszawa: Wieku, 1885. – T. VI. – S. 410.

[107] Dumin S., Rachuba A., Sikorska-Kulesza J. Ciechanowieccy herby Dąbrowa. – S. 81.

[108] LVIA. – F. SA. – Ap. 1. – Bib. 3806. – P. 6–6 v.

[109] Тамсама. – P. 7 v.

Бiелга, Кабылiн Стан, Iванаў Стан, Гультаёўка, Упiн, Хралоў, Каржоў, Селязёнкi, у якiх разам налiчвалася 200 гаспадароў[110]. Аднак ужо ў 1773 г. яно налiчвала 25 паселiшчаў, дзе было 1416 душ мужчынскага полу[111].

Сёння з iх на правым беразе Сожа на тэрыторыi Хiслявiцкага раёна Смаленскай вобласцi лакалiзуюцца вёскi М. i В. Лызкi, Замошша, Селязёнкi, Лабанаўка, Iванаў Стан, Кабыліна, Упiна i Каржова.

У рэвiзскай сказцы Хiслявiцкага староства 1778 г. акрамя Хiслявiчаў згадваюцца вёскi Падолле, Фралова, Селязёнкi, Уцяна, Кабылiн Стан, Гультаеўка, Iванаў Стан, Белка, Казлова, Янава, Карзова, Галалобаўка, Чарнаручча, Прытыкiна, Кашурына Буда, Асiнаўка, Лызкi, Лабанаўка, Замошша, Гарбачова, Ускосы i Расцягаеўка[112].

У пачатку XVIII ст. на правабярэжжы Астра пачынае згадвацца **Бабыліцкае** староства, хаця сама в. Бабылiчы ўпершыню згадваецца ў 1568 г. як вёска воласцi замка крычаўскага[113], якая ўвесь час здавалася ў арэнду розным дзяржаўцам.

У верасні 1707 г. кароль Станiслаў Ляшчынскі надзяліў iм пажыццёва дзяржаўцу Крычаўскага староства Караля Станiслава Радзівіла[114]. Аднак яшчэ пры жыцці апошняга Бабыліцкае староства было перададзена мсціслаўскаму стольніку Яну Казiмiру Лiндарфу, i ў склад староства ў траўні 1715 г. уваходзілі вёскі Бабылiчы, Яўкiна Слабада, Снiгiроўка, Жукаўка, Струпаўка, Заселле, Iванаў Стан, Ст. Котаўка, Буда i дзве толькі што закладзеныя слабады, назвы якiх у крыніцы не даюцца. Акрамя таго, згадваюцца яшчэ «i innych wsi do tego starostwa należące», але зноў без удакладнення iх назваў[115].

У 1730 г. у склад Бабыліцкага староства ўваходзілі вёскі Бабылiчы, Заселле, Загусцiн, Яўкiна, Стараселле на правом беразе Сожа, Снiгiроўка, Котава Буда, Загоўкасачы i слабоды Надзейкавiчы i Касцюкоўка[116]. Амаль усе гэтыя населеныя пункты i сёння існуюць на тэрыторыi Шумяцкага раёна Смаленскай вобласцi.

Ужо ў 1739 г. Бабыліцкае староства ўключала ў свой склад вёскі Надзейкавiчы, Яўкiна, Казлоўка, Масцішча, Воранаўка, Катоўка, Касачоўка i Чартаўшчызна[117]. Акрамя таго, яно ў гэты час пачало падзяляцца на 3 войтаўствы – Бабыліцкае, Загусцінскае i Засельскае. Адпаведна, вёскі Загусцiн i Заселле ўваходзілі ў склад староства.

У 1765 г. Бабыліцкае староства было ў пацэсii ў троцкага кашталяна Тадэвуша Агінскага і, як і раней, складалася з 3 войтаўстваў, у якіх налічвалася

[110] LVIA. – F. SA. – Ap. 1. – Bib. 3806. – P. 5–6.
[111] Мелешко В. И. Очерки аграрной истории Восточной Белоруссии. – С. 228.
[112] НГАБ. – Ф. 2151. – Воп. 1. – Адз. зах. 135. – Арк. 1–74.
[113] Тамсама. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 266. – Арк. 342–343.
[114] Тамсама. – Ф. 694. – Воп. 1. – Адз. зах. 191. – Арк. 1.
[115] Тамсама. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 156. – Арк. 126–127.
[116] Тамсама. – Адз. зах. 162. – Арк. 268–269.
[117] Тамсама. – Ф. 1729. – Воп. 1. – Адз. зах. 44. – Арк. 1430.

372 гаспадары і 44 бабылі[118]. На момант уваходу ў склад Расійскай імперыі колькасць населеных пунктаў у Бабыліцкім старостве, якім валодаў ужо Комар, павялічылася да 19, у якіх у 1773 г. пражывалі 2013 чалавек мужчынскага полу[119].

На паўночны захад ад Хіславіцкага старостваразмяшчалася другое вялікае каралеўскае ўладанне – **Жукаўскае староства**, з цэнтрам у в. Жукава сучаснага Манастыршчынскага раёна Смаленскай вобласці. Калі пачало фарміравацца гэта каралеўскае ўладанне, дакладна не вядома. Па ўскосных даных, яно згадваецца ўжо ў сярэдзіне XVI ст.[120]

У сярэдзіне XVII ст., адразу пасля вызвалення Мсціслава ад Масквы ў 1660 г., быў складзены інвентар, які дайшоў да нас, на жаль, толькі ў вельмі пашкоджаным выглядзе. Згодна з ім у старостве на той час былі вёскі Жукава (8 дымоў), Касмынічы (1) і Жалезнякі (4), жыхары якіх знаходзіліся на слабадзе[121].

У пачатку XVIII ст. (1715 г.), калі Жукаўскае староства надавалася мсціслаўскаму харужаму Я. Ліндарфу, у яго склад уваходзілі вёскі Жукава, Касмачы, Дзербін, Жалезніца, Буда і яшчэ дзве нейкія слабады, назвы якіх не ўказаны[122]. Магчыма, адной з іх была Пасохля, якую ў 1718 г. Я. Ліндарф аддаў Хацкевічу[123]. А другой, магчыма, была в. Лызы. Ва ўсякім выпадку, у 1720 г. службы Лызы дзяржавы Жукаў былі Янам Ліндарфам здадзены мсціслаўскаму чашніку і падстаросту Ежы Казіміру Іллінічу[124].

У 1765 г. Жукаўскае староства было ў пацэсіі ў Матэуша Агінскага, і тут разам налічвалася 160 гаспадароў, якія сядзелі на 131 валоцы. У канцы XVIII ст. у склад Жукаўскага староства ўваходзілі вёскі Жукава (15 дымоў), Дзябіца (18), Барок (19), Буда (8), Чарналужжа (12), Ліпавы мост (9), Железнікі (18), Ігнатаўка (12), Касмачы (24), Расохля (45), Карчы (7), у якіх разам пражывалі 556 чалавек мужчынскага полу[125].

Апошнімі ўладарамі Жукаўскага староства ў складзе Рэчы Паспалітай, якое атрымалі 10 сакавіка 1772 г. пасля Алаіза Агінскага, былі Андрэй Агінскі і Паўліна з Шэмбекаў Агінская[126].

Яшчэ адным буйным старостваам Мсціслаўскага ваяводства было староства **Кашанскае, Бельскае і Паўлавіцкае**, у склад якога ўваходзілі аднайменныя вёскі – Кашаны, Бель, Паўлавічы сучаснага Крычаўскага раёна. У ім на-

[118] LVIA. – F. SA. – Ap. 1. – Bib. 3806. – P. 3 v.

[119] Мелешко В. И. Очерки аграрной истории Восточной Белоруссии. – С. 229.

[120] Alexandrowicz S. Geneza i rozwój sieci miasteczek Białorusi i Litwy do połowy XVII w. – S. 98, № 104.

[121] LVIA. – F. 1177. – Ap. 1. – Bib. 4603. – P. 1–3.

[122] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 156. – Арк. 224–224 адв.

[123] Тамсама. – Арк. 163–163 адв.

[124] Тамсама. – Арк. 223–223 адв.

[125] LVIA. – F. 1177. – Ap. 1. – Bib. 693. – P. 1–11; Тамсама. – F. SA. – Ap. 1. – Bib. 3806. – P. 7 v.–8; Мелешко В. И. Очерки аграрной истории Восточной Белоруссии. – С. 228.

[126] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 185. – Арк. 503–505.

лічвалася 147 гаспадароў, якія сядзелі на 85 валоках. Староства ў 1765 г. было ў пацэсіі ў Гераніма Жабы, менскага ваяводы[127].

Побач з Мсціславам знаходзілася і невялікае **Міхайлаўскае староства**, у склад якога акрамя вёскі Міхайлаўск уваходзілі вёскі Будзін і Рожава, якім у пачатку XVIII ст. валодаў М. Гедройц, а потым Мікалай Цеханавецкі[128].

Вялікую колькасць дзяржаў і старостваў, якія існавалі на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства, згадвае люстрацыя старостваў Мсціслаўскага ваяводства 1765 г. Акрамя вышэйпералічаных, на тэрыторыі ваяводства была таксама вялікая колькасць больш дробных дзяржаў і старостваў, у якіх налічвалася да 50 гаспадароў.

На левым беразе р. Лызы, на паўночны усход ад Мсціслава знаходзілася **Кажухоўскае** староства, якое было ў пацэсіі ў мсціслаўскага стольніка Мікалая Іллініча. У склад староства ўваходзілі вёскі Кажуховічы, Міхалаўка, Калабынікі. Тут налічвалася 55 гаспадароў, якія сядзелі на 196 валоках. Гэта староства межавала з землямі вёскі Лыза, Брагі, Лабанаўка, Чатнёўка, «Стекавай слабадой» і застенкам Горы[129].

У інвентарным апісанні старостваў і дзяржаў Мсціслаўскага ваяводства за 1765 г. адсутнічае **Трыпуцінскае** староства. Аднак ужо ў 1773 г. яно згадваецца і ўключае ў свой склад 12 населеных пунктаў, у якіх пражывалі 659 чалавек мужчынскага полу[130].

Астатнія старостві Мсціслаўскага ваяводства ў 1765 г. былі значна меншымі па колькасці гаспадароў. У Дудзінскім было толькі 18 гаспадароў, у Жыдовай Будзе – 25, у Краснянскім – 49, ва Усполлі – 12, у Копцеўцы – 30, у Клімавічах – 66, у Дарагой – 10, у Воўчаскім – 26, у Прусіне – 21, у Ражаеве – 14, у Белі – 22, у Мілютах – 11, у Каськове – 2, у Ларыёнаве (вёскі Ларыёнава, Дутчыцы, Тухолдава і Рабекі – разам 42 гаспадары), Шарае – 16, Віхраны (вёскі Віхраны і Панар) – 12, Соіна – 18 гаспадароў. Акрамя таго, на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства ў гэты год налічвалася яшчэ 16 дзяржаў ці старостваў, дзе ніхто не жыў і якія не былі забудаванымі.

У той жа час трэба ўлічваць, што тэрыторыя і колькасць населеных пунктаў, што ўваходзілі ў тую ці іншую дзяржаву, не былі аднолькавымі. Так, дзяржава Чарнавусы ў 1721 г. уключала ў свой склад вёскі Чарнавусы, Езловем (Елавец?), Вярба, Камёнка, Карпекі, Жаліўе, Равякі, Шэрае і Слезкі, а ў 1765 гг. – толькі вёскі Чарнавусы, Горлаў, Вярба і Пячонкі, у якіх налічваўся 31 дым[131].

Са шляхецкіх уладанняў трэба адзначыць размешчаную на паўночна-ўсходнім абшары Мсціслаўскага ваяводства велізарную **Кадзінскую воласць**.

---

[127] LVIA. – F. SA. – Ap. 1. – Bib. 3806. – P. 21–21 v.

[128] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 156. – Арк. 42–42 адв.

[129] LVIA. – F. SA. – Ap. 1. – Bib. 3806. – P. 8 v.–9.

[130] Мелешко В. И. Очерки аграрной истории Восточной Белоруссии. – С. 229.

[131] LVIA. – F. SA. – Ap. 1. – Bib. 3806. – P. 1–27; НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 159. – Арк. 691.

Кадзін ужо ў 1546 г. быў цэнтрам нейкай «маетнасці», якой валодаў Якуб Вяжэвіч[132]. Аднак улічваючы, што род Вяжэвічаў быў даволі шчыльна звязаны са Смаленскам і Мсціславам яшчэ ў XV ст.[133], нельга выключыць, што іх валоданне Кадзінам вядзе пачатак з гэтых часоў. Верагодна, у склад гэтай воласці тады ўваходзіла і в. Свяцілаўка, у якой яшчэ «князі мсціслаўскія» надалі маетнасць продкам М. Яўніцкага, пра што ён сцвярджаў у 1709 г.[134]

У 1667 г. Кадзінам валодаў крайчы ВКЛ Марцін Агінскі, які быў сынам Аляксандра Агінскага (1585–1667) і Кацярыны Палубінскай[135]. Аднак у 1683–1687 гг. ён прадаў Кадзін з воласцю Леанарду Габрыэлю Пацею. Гэтаму, магчыма, паспрыяў той факт, што жонка Л. Г. Пацея прыходзілася стрыечнай сястрой М. Агінскаму[136]. І з гэтага часу Кадзін і яго воласць ужо ўвесь час знаходзіліся ва ўладанні Пацеяў.

У пачатку XVIII ст. Кадзінская воласць лічылася графствам, якое «правам дзедзічным» належала сумесна братам Аляксандру, Антонію і Міхалу Пацеям. Згодна з інвентаром 1729 г., яна дзялілася на два войтаўствы: Крывельскае і Першынскае. У склад Крывельскага войтаўства ўваходзілі вёскі Крэтава (10 дымоў), Крывелі (28), Бохат (33), Старышкі (19), Свяцілаўка (14), Ст. Кадзін (42), Хацяны (41), Палом (25), Танцы (8), Палуляхі (25). У склад Першынскага войтаўства ўваходзілі вёскі Веразубы (30), Цішкоўка (26), Турэмск (13), Дзянісаўка (19) (усе сучасныя вёскі Манастыршчынскага р-на Смаленскай вобласці), Першына (23) (суч. в. Паршына), Ходараўка (21) Палішчына (16) (суч. в. Паляшчыцы), Гарадзец (28) (суч. в. Гарадок) (вёскі Горацкага р-на), і дакладна не лакалізаваныя вёскі Асталопава (20), Камароўка (5), Пяцінкава (15) і Пячкалаўка (7). Некаторыя з гэтых вёсак – Першына, Палішчына, Гарадзец – на карце М. Ф. Спірыдонава «Землі Беларусі ў XVI ст.» паказаны як населеныя пункты, што адносіліся да Аршанскага павета Віцебскага ваяводства[137]. Аднак, верагодна, на самай справе ў гэтых населеных пунктах былі землі, што належалі шляхце як Мсціслаўскага, так і Віцебскага ваяводстваў, і таму ў розных крыніцах часткі гэтых вёсак згадваюцца ў розных ваяводствах.

У складзе гэтай вялікай Кадзінскай воласці было 488 дымоў і дадаткова да яе адносіліся 20 дымоў у Татарску і 20 дымоў у в. Буда, якая была ў пацэсіі ў аршанскіх ксяндзоў-трынітарыяў[138].

---

[132] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 233. – Арк. 125–126 адв.

[133] ДМАМЮ. Т. 1. – С. 22, № 21, 26, № 13, 31, № 1; Semkowicz W. O litewskich rodach bojarskich zbratanych ze szlachta polska w Horodle roku 1413 // Lituano-Slavica Posnaensia. Studia Historia. – T. 3. – 1989. – S. 7–139.

[134] НГАБ. – Ф. 1729. – Воп. 1. – Адз. зах. 11. – Арк. 17–17 адв.

[135] LVIA. – SA. 3722. – P. 26.

[136] Rachuba A. Pociej Leonard Gabriel // Polski Słownik Biograficzny. – T. XXVII/1, zeszyt 112. – Wr.-War.-Krak.-Gdansk, 1987. – S. 35–37.

[137] Вялікі гістарычны атлас Беларусі [Карты]: у 3 т. – Мінск: Белкартаграфія, 2009. – Т. 1. – С. 64–65.

[138] Аддзел рукапісаў Львоўскай НБ ім. В. Стэфаніка НАН Украіны // Ф. 5. – Адз. зах. 5163/П. – Арк. 24–50.

Уладанні астатняй шляхты Мсціслаўскага ваяводства не ўтваралі такіх вялікіх «маетнасцей» і былі раскіданыя па ўсім ваяводстве. Выключэнне складалі толькі ўладанні паноў Свадкоўскіх, Іваноўскіх і Гайко, якія размяшчаліся пасярод зямель Крычаўскага староства, што паказана і на карце Крычаўскага староства А. Мейера.

Назіранні за размяшчэннем буйных старостваў на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства паказваюць, што большасць з іх і найбольш буйныя размяшчаліся на мяжы дзяржавы, ствараючы своеасаблівы ланцужок каралеўскіх уладанняў: Крычаўскае староства, да якога прымыкалі з поўначы Хіславіцкае і Жукаўскае старостваы. На захад ад апошняга размяшчалася вялікая Кадзінская воласць, прыналежнасць якой раней за сярэдзіну XVII ст. не вызначана, аднак якая ўяўляла сабой адзіны гаспадарчы комплекс. Магчыма, і яна да сярэдзіны XVII ст. была каралеўскім уладаннем.

Верагодна, размяшчэнне старостваў уздоўж дзяржаўнай мяжы адлюстроўвае гістарычную традыцыю, якая склалася ў XV–XVI стст., калі шляхта не жадала асвойваць памежныя землі, і адносна рэдкія населеныя пункты, што размяшчаліся тут, адносіліся да маёмасці вялікага князя і караля.

4.2. Гісторыя Мсціслаўскага ваяводства ў XVI–XVIII стст.

Гісторыя Мсціслаўскага ваяводства на працягу другой паловы XVI–XVIII ст. апалена тымі ваеннымі падзеямі, якія адбываліся на ўсходніх межах Вялікага Княства Літоўскага.

Нягледзячы на тое, што афіцыйна ваенныя дзеянні на ўсходзе ВКЛ падчас Інфлянцкай вайны ў другой палове 60-х гадоў XVII ст. не вяліся, маскоўскія войскі час ад часу спустошвалі наваколлі Мсціслава і Крычава. Так, восенню 1568 г. мяшчане Крычава звярнуліся да караля з просьбай вызваліць іх ад выплаты чыншу на некалькі год у сувязі з тым, што напярэдадні яго наваколлі спустошылі «московские татары». Яны захапілі ўсіх коней і іншае «упражное быдло», у выніку чаго крычаўцам вясной нават не было чым узараць зямлю і пасеяць хлеб. Аднак Жыгімонт Аўгуст даў ім згоду на вызваленне ад выплаты падаткаў толькі на адзін год[139].

Ды і ў ваяводскім цэнтры сітуацыя была не лепшай. У 1567 г. Жыгімонт Аўгуст, улічваючы занядбалы стан Мсціслава і воласці з-за вайны, даў мсціслаўскім гандлярам правы на вольны продаж тавараў тэрмінам на 3 гады па ўсёй дзяржаве, пры ўмове што кошт тавараў не будзе перавышаць 100 коп грошаў[140].

Падчас Інфлянцкай вайны урад ВКЛ, нягледзячы на тое, што асноўны тэатр баявых дзеянняў размяшчаўся далёка на паўночны захад ад Крычава і Мсціслава, вялікую ўвагу надаваў ахове ўсіх памежных замкаў. У 1567–1569 гг. у Крычаве размяшчалася рота пешых драбаў у колькасці 150 чалавек пад кі-

[139] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 267. – Арк. 220–220 адв.
[140] Тамсама. – Арк. 192.

раўніцтвам ротмістра С. Камяніцкага[141]. Акрамя таго, горад у гэты час абараняла конная рота, якую трымаў сваім коштам дзяржаўца Канстанцін Шалуха.

Падобная ж сітуацыя была і ў Мсціславе, дзе кароль абавязаў кашталяна І. В. Саламярецкага знаходзіцца ў замку і сачыць за падзеямі, што адбываліся за мяжой. Акрамя таго, сам кашталян дабіўся ад караля павялічэння ў Мсціславе колькасці войскаў у горадзе да 400 драбаў і 200 коннікаў[142].

У 1569 г. была заключана Люблінская ўнія паміж ВКЛ і Каронай Польскай, вынікам чаго стала ўтварэнне Рэчы Паспалітай. Гэта падзея ўзмацніла сілы ВКЛ у барацьбе з Масквой. І хаця баявыя дзеянні не вяліся, дыпламатычныя перамовы працягваліся ўвесь час. Нягледзячы на дасягнутае перамір'е, мірнае пагадненне ніяк не ўдавалася заключыць. Масква патрабавала прызнання яе правоў на ўсе землі, размешчаныя на ўсход ад Бярэзіны. Іван IV абгрунтоўваў свае правы на гэтыя землі тым, што калісьці гэта былі воласці Кіеўскай Русі, праваспадкаемцам якой ён сябе бачыў.

Пасля абрання на каралеўскі стол Стэфана Баторыя ваенныя дзеянні распачаліся з новай сілай, і фартуна была на баку Рэчы Паспалітай. Аслабленая шматгадовай вайной, даведзеная апрычнінай да галечы Расія сама шукала міру. У 1582 г. вайна скончылася Ям-Запольскім перамір'ем. Масква за шматгадовую вайну не змагла дабіцца жаданых мэт, і Падняпроўе з Падзвіннем засталіся за Рэччу Паспалітай.

З пісьмовых крыніц гэтага часу вядома, што нават да заключэння перамір'я мясцовая ўлада спрабавала наладзіць гандлёвыя сувязі з памежнымі расійскімі землямі. Так, у 1580 г. мсціслаўскі староста Б. І. Саламярэцкі паслаў да смаленскага ваяводы І. К. Курляцава-Абаленскага ліст з прапановай наладзіць былыя гандлёвыя сувязі[143].

Пасля Ям-Запольскага перамір'я да другой чвэрці XVII ст. Мсціслаўскае ваяводства засталося па-за ўвагай летапісцаў, што было выклікана адносна спакойнай сітуацыяй на ўсходніх межах Рэчы Паспалітай. У канцы XVI – пачатку XVII ст. Расія трапіла ў доўгую паласу «Смутного времени», і ёй было не да актыўнай знешняй палітыкі.

У канцы XVI ст. усходнія раёны Рэчы Паспалітай на некаторы час зноў трапілі ў цэнтр знешнепалітычнай дзейнасці Усходняй Еўропы. Пасля пачатку мяцяжу С. Налівайкі і яго першых поспехаў кіеўскі каталіцкі мітрапаліт І. Верашчынскі, бачачы жаданне Налівайкі завязаць адносіны з Масквой, прапанаваў стварыць на ўсход ад Дняпра своеасаблівую казацкую дзяржаву ад Оршы да Запарожжа. Планавалася тут размясціць 13 казацкіх палкоў, а адміністрацыйнымі цэнтрамі гэтай дзяржавы павінны былі стаць у тым ліку Крычаў,

---

[141] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 529. – Арк. 211адв.–213.

[142] Kempa T. Sołomerecki Iwan Wasilewicz. – S. 327–328.

[143] Русско-белорусские связи. Сборник документов 1570–1667 гг. – Минск: Высш. шк., 1963. – С. 12.

Мсціслаў, Радамля, Прапойск, Чачэрск[144]. Казацкія атрады ў навакольлях Крычава і Мсціслава дзейнічалі ў 1602–1603 гг.[145]

Але як толькі ў Расіі скончылася паласа Смутнага часу абраннем на рускі трон Міхаіла Раманава, адразу ж актывізавалася знешняя палітыка Рускага царства. Гэтаму спрыяў і той факт, што нягледзячы на абранне ў Маскве дынастыі Раманавых, кароль Жыгімонт Ваза працягваў аспрэчваць правы свайго сына Уладзіслава на рускі трон. Вайна паміж Рэччу Паспалітай і Рускім царствам, якая пачалася ў 1609 г., працягвалася да 1618 г. і закончылася Дэўлінскім замірэннем.

Падчас вайны тэрыторыя Мсціслаўскага ваяводства таксама станавілася зонай баявых дзеянняў. Так, у 1614 г. рускія войскі спалілі Крычаў і рабавалі яго воласць. Гэтыя падзеі не знайшлі адлюстравання ў летапісах. Толькі ў Метрыцы ВКЛ захаваўся прывілей караля Жыгімонта Вазы 1615 г. аб вызваленні горада і воласці ад выплаты любых падаткаў, пастояў войска тэрмінам на 4 гады ў сувязі з яго пагромам маскоўскімі войскамі 1614 г.[146]

Гэтыя баявыя дзеянні вымушалі і ў Мсціславе ўвесь час трымаць вайсковы гарнізон. У сакавіку 1614 г. рускія шпегі паведамлялі, што ў Мсціславе знаходзіўся гарнізон з 1000 шляхцічаў, 500 казакоў Налівайкі, акрамя таго, ім былі гатовы дапамагчы 700 мяшчан горада[147]. Апошняя лічба дазваляе выказаць меркаванне, што агульная колькасць жыхароў Мсціслава на той час дасягала не меней за 3–4 тысячы чалавек.

Згодна з Дэўлінскім замірэннем 1618 г. да Рэчы Паспалітай адышлі землі якія ў XIV – пачатку XVI ст. уваходзілі ў склад Мсціслаўскага княства – былыя воласці Паповай Гары, Дрокава, Мгліна, Салаўянічаў, Прыкладней, такім чынам з'явілася магчымасць зноў аб'яднаць гэтыя землі пад началам Мсціслава. Але зараз яны не былі ўключаны ў склад Мсціслаўскага ваяводства, а далучаны да Смаленскага ваяводства.

У 1632 г. пасля смерці караля Жыгімонта III Вазы у Рэчы Паспалітай пачаўся перыяд безуладдзя. Выкарыстаўшы гэты момант, рускі цар Міхаіл Фёдаравіч распачаў вайну за вяртанне Смаленска, Чарнігаўскай і Северскіх зямель, якія Масква страціла ў выніку Дэўлінскага замірэння. У верасні 1632 г. 40-тысячнае рускае войска пад кіраўніцтвам ваяводы М. Б. Шэіна накіравалася пад Смаленск. Адначасова ўдары наносіліся па іншых гарадах. У тым жа годзе Масква захапіла Себеж, Невель, Рослаўль, Ноўгарад-Северскі і іншыя гарады. У студзені 1633 г. войскі М. Б. Шэіна асадзілі Смаленск. Іншыя рускія аддзелы пайшлі далей. Вясною–летам гэтага года Крычаў і Мсціслаў неаднойчы абаранялі свае сцены ад захопнікаў. Трэба сказаць, што гэта давалася ім, вера-

---

[144] Сергійчук В. Козацтва і унія // Unia brzeska. Geneza, dzieje i konsekwencje w kulturze narodów słowiańskich. – Kraków: Wyd. UJ, 1994. – S. 455.

[145] Лочмель И. Ф. Очерки истории борьбы белорусского народа против польских панов. – М.: Воениздат, 1940. – С. 28.

[146] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 92. – Арк. 168 адв.–169.

[147] АМГ. – Т. 1. Разрядный приказ. Московский стол. (1632–1633). – С. 99.

годна, з цяжкасцю, бо мсціслаўскі замак яшчэ у 1632 г. быў не ў добрым стане. Пра гэта сведчаць прапановы, падрыхтаваныя дэпутатамі Мсціслаўскага ваяводства на Варшаўскі элекцыйны сейм. Дэпутаты прапаноўвалі аднавіць замак «wedlug dawnych przywileiów» за кошт іншых валасцей[148]. Невядома, у якім стане быў напярэдадні вайны і крычаўскі замак. Мяркуючы па універсале караля Жыгімонта Вазы 1624 г., ён пасля падзей першай чвэрці стагоддзя быў у дрэнным стане, патрабаваў рамонту, і невядома, ці было гэта распараджэнне караля выканана[149].

Яшчэ ў лютым 1633 г. рускія шпегі паведамлялі ў Рослаўль, што ў Крычаве шляхціч пан Бацвінка збірае добраахвотнікаў, каб ісці на «брянские и рославские места в Жарынь». Рускае камандаванне правяло прэвентыўны паход. У лютым 1633 г. пад вёскай Лапатавічы адбылася бойка з добраахвотнікамі Бацвінкі. Супраць 350 рускіх жаўнераў, як паведамляюць рускія крыніцы, выступілі 150 вершнікаў і 350 пешых добраахвотнікаў пана Бацвінкі. Нягледзячы на колькасную перавагу «літвы», перамога была за маскоўскімі войскамі, якія гналі крычаўцаў да сцен самаго горада[150].

Страшэннай навалай пракаціўся па Крычаве паход ваяводы Івана Тарбеева і атаманаў Івана Балаша і Сямёна Пірогі. Крыніцы паведамляюць, што Іван Тарбееў «а с ним донские казаки и солдаты и охочие люди, Ивашка Балаш с товарищи, ходили за рубеж для Языков и пришли под Кричев ночью и большой острог взяли и многих литовских людей побили, а в меньшим остроге литовские люди сели в осаде: и они приступали многожды до тех мест, покаместа пороху стало, и острог зажигали со многих мест, а в остроге взяли две пищали железных, знамена и барабан поимали, да языков взяли 4 человек шляхтичей, а иных де языков в те поры побивали, чаяли взять город; да из того же городу взяли полону мужескаго полу и жёнам с 2000 человек». Сямён Пірога дадаткова паведамляў, што падчас паходу пад Сураж і Крычаў яго аддзелам было захоплена 5 знамёнаў і «пушечка»[151].

Адпіска маскоўскіх ваяводаў і атаманаў малюе страшэнную карціну штурму і вынішчэння горада. Маскоўскія войскі здолелі ўварвацца ў пасады і, як відаць з іх рэляцыі, у нейкі момант нават змаглі прабрацца ў замак. Але жыхары Крычава яго ўсё ж такі адстаялі. І як вынік – амаль поўны вывад жыхароў горада ў маскоўскі палон, бо наўрад ці ў той час яго насельніцтва значна перавышала названую колькасць. Значная частка крычаўскага палону, магчыма, была адпраўлена на пасяленне ў Сібір. Ва ўсякім выпадку, у партыі са 150 чалавек, накіраванай ў Томск не раней за 1633 г., значыцца «Яска Петров сын кричевец»[152]. Тым часам некаторая частка жыхароў Крычава, якія, верагодна,

---

[148] АВК. – Т. 8. Акты Виленского гродского суда. – С. 589.

[149] Metryka Litewska. Księga Sigillat. 1709–1719 = Литовская метрика. Книга Сигиллат. 1709–1719. – Warszawa: PAW, 1987. – S. 124.

[150] АМГ. – Т. 1. – С. 472–473.

[151] Тамсама. – С. 446, 476, 479, 481.

[152] Лешчанка Р. Ф. Беларусы-перасяленцы ў Сібіры (канец XVI–XVII ст.) // Вес. АН БССР. Сер. грамад. навук. – 1982. – № 5. – С. 77.

добраахвотна перайшлі на бок Масквы, звярталіся ў гэтым годзе ў Разрадны прыказ з просьбай, каб іх пасялілі ў Пачэпе[153]. Вялікая колькасць выхадцаў з Мсціслаўскага ваяводства, крычаўцаў і мсціслаўцаў лічацца ў спісе палонных, якія былі дастаўлены з Ноўгарад-Северскага ў Маскву ў 1633 г.[154]

Не паспелі загаіцца раны ад гэтага паходу, як праз два тыдні з Рослаўля пад Крычаў быў адпраўлены новы маскоўскі аддзел пад кіраўніцтвам Івана Балаша, а разам з ім і аддзелы Пятра Гур'ева, Савелія Хітрова і Фёдара Тургенева. Яны пісалі цару, што пад Крычавым «они побили пана Красинского, а взяли в бою литовских людей 2 человек, а побили литовских людей 90 человек»[155]. Улічваючы такія страты Крычава, кароль ў гэты год неаднаразова выдаваў загады аб пастаўцы сюды ўзбраення з Магілёва[156].

У 1633 г. моцна пацярпеў і Мсціслаў. Як сведчаць паведамленні да рускага цара, пад яго сценамі ў студзені войска ВКЛ атрымала паразу ад войскаў Багдана Нагога: былі спалены гарадскія пасады і воласць Мсціслава. Акрамя таго, паведамлялася, што ў рускі палон было выведзена каля 3 тысяч чалавек[157].

У выніку баявых дзеянняў 1633–1634 гг. гарады Мсціслаўскага ваяводства былі амаль цалкам знішчаны, і для іх больш хуткага адраджэння Мсціславу і Крычаву кароль Уладзіслаў IV надаў прывілеі на Магдэбургскае права.

Першым яго атрымаў Крычаў. Прывілей на магдэбургскае права гораду быў дадзены 23 жніўня 1633 г. У прывілеі Уладзіслава IV падкрэслівалася, што надаецца яно з мэтаю паляпшэння ўмоў далейшага развіцця горада і ў якасці своеасаблівай міласці за вернасць гараджан як у папярэднія гады, так і за сёлетнюю мужную абарону. Згодна з прывілеем, горад атрымаў выбарнае гарадское самакіраванне, суд, у горадзе дазвалялася будаўніцтва ратушы, Крычаву надаваўся герб[158].

Праз год, 16 верасня 1634 г. атрымаў прывілей на магдэбургскае права і ваяводскі цэнтр Мсціслаў. Як і ў выпадку з Крычавам, надаючы магдэбургскае права гораду, кароль Уладзіслаў IV кіраваўся тым, што горад моцна пацярпеў падчас ваенных дзеянняў 1633 г., пры гэтым мяшчане мужна баранілі горад «ад людзей непрыяцельскіх» і «веры нам датрымалі». Магдэбургскае права надавалася для таго, каб горад хутчэй развіваўся і багацеў. У сувязі з чым, улічыўшы дабрахвотную саступку сваіх уладных прэрагатыў гораду мсціслаўскага старасты Ю. Корсака і згоду паноў-рады, кароль Уладзіслаў IV «места Мсціслаўскае з юрысдыкцыі замкавай выняўшы..., месту Мсціслаўскаму права нямецкае, то есць магдэбургскае» даў і ўфундаваў, па якому, «прыкладам іншых мест і мястэчак нашых упрывілеяваных, там жа у тых краях будучых прылеглых, маюць судзіцца і справаваццa вечнымі часамі».

---

[153] Русско-белорусские связи. Сб. документов 1570–1667 гг. – С. 116–117.

[154] Кулаковськiй П. Чернiгово-Сiверщина у складi Речi Посполитої. – С. 435.

[155] АМГ. – Т. 1. – С. 476.

[156] Беларускі архіў. – Т. 1. Працы і матэрыялы па гісторыі і археалогіі Беларусі (XVI–XVII ст.). – Мінск, коштам Інбелкульта, 1927. – С. 125, 126, 131.

[157] АМГ. – Т. 1. – С. 442–443, 462, 480, 629.

[158] ИЮМ. – Вып. 10. – С. 307–311.

Атрымаўшы магдэбургскае права, Мсціслаў і Крычаў ператварыліся ў самастойныя адміністрацыйныя адзінкі са сваёй тэрыторыяй, інстытутамі ўлады і суда, падатковай сістэмай і г. д. З увядзеннем магдэбургскага права мяшчане вызваляліся ад улады ваявод, цівуноў, дзяржаўцаў, уся улада ў горадзе пераходзіла да органаў гарадскога самакіравання. Мсціслаўцы і крычаўцы павінны былі судзіцца толькі ў гарадскім судзе па магдэбургскім праве. Яны не падпадалі пад кампетэнцыю земскіх, гродскіх судоў і Трыбунала ВКЛ. У Мсціславе зацвярджаўся парадак прыняцця гарадскога грамадзянства, за аснову якога быў прыняты прывілей на магдэбургскае гарадское права, выдадзены Кіеву: «усякі новы мешчанін, прымаючы аселасць і гарадское права ў горадзе, спачатку ў ратушы прысягу» павінен быў выканаць, «а па прысязе мушкет на публічную абарону да ратушы» даць. І пасля гэтага «да ўжывання гарадскіх вольнасцяў і гандляў мае прыходзіць»[159].

Згодна з прывілеем, у Мсціславе і Крычаве ўтваралася гарадская ўлада па магдэбургскім праве, у склад якой уваходзілі войт, бурмістры, радцы, лаўнікі, пісары.

Прывілей 1634 г. уводзіў у Мсціславе інстытут магдэбургскага войтаўства. Хто будзе займаць пасаду мсціслаўскага войта, вызначаў сам кароль. Ён прызначаў на гэту пасаду «па волі і ўпадабанню нашага правам дажывотным» – пажыццёва. Трэба адзначыць, што падобная сістэма прызначэння войта была зацверджана раней і ў Крычаве. І войтамі ў Крычаве і Мсціславе на працягу існавання Рэчы Паспалітай былі дзяржаўцы Крычаўскага і Мсціслаўскага старостваў, якія прызначаліся каралём.

У абавязкі войта ўваходзіла старшынстваваць і кіраваць на пасяджэннях магістрата, асабліва ў час судовых сесій, і кантраляваць дзейнасць гарадскіх улад. Нягледзячы на тое, што войта прызначаў кароль, пры ўступленні ў пасаду войт выконваў прысягу перад жыхарамі горада аб належным выкананні сваіх абавязкаў. Пасля гэтага ён меў права заступаць «на юрысдыкцыю сваю войтаўскую ў ратушы на судовае места». Улічыўшы, што мсціслаўскі староста Юзэф Корсак добраахвотна саступіў свае ранейшыя ўладныя паўнамоцтвы над Мсціславам самому гораду «і дазволіў гораду … старацца аб магдэбургскім праве», Уладзіслаў IV гэтым жа прывілеем 1634 г. надаў першае мсціслаўскае магдэбургскае войтаўства менавіта Ю. Корсаку. Падобная карціна была і ў Крычаве, дзе першым войтам горада быў прызначаны крычаўскі староста Крыштаф Весялоўскі (мал. 38).

У выпадку, калі войт не меў магчымасці прысутнічаць на паседжанні магістрата, ён мог прызначыць на сваё места лентвойта, «асобу шляхецкага ці мяшчанскага стану», «які модай і ўладай войта суды судзіць з магістратам супольным» мог бы. Пры гэтым лантвойт таксама павінен быў выканаць прысягу на выкананне гэтай пасады[160].

---

[159] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1, спр. 111. – Арк. 153, 153 адв., 155.

[160] Тамсама. – Арк. 153 адв.

Мал. 38. Крычаўскі стараста і перш войт Крыштаф Весялоўскі

Акрамя войта, асноўнае месца ў сістэме ўлады займалі бурмістры, радцы, лаўнікі, якія складалі гарадскі магістрат. Да другой трэці XVII ст. у ВКЛ склалася практыка арганізацыі працы гарадскіх улад, найперш суда, па магдэбургскім праве па дзвюх схемах: праца на агульных пасяджэннях войта, бурмістраў, радцаў, лаўнікаў і асобныя пасяджэнні войта з лаўнікамі і бурмістраў з радцамі. Прывілей 1633 г. Крычаву і прывілей 1634 г. Мсціславу даюць права выбару схемы працы гарадскіх улад самім гараджанам. Прычым незалежна ад рашэння гараджан найбольш важныя пытанні павінны былі вырашацца на агульных пасяджэннях войта «разам з бурмістрамі, гарадской радай па апісанню магдэбургскага права».

Прывілей прадугледжвае наяўнасць у Мсціславе двух бурмістраў, трох радцаў і чатырох лаўнікаў, якіх павінны былі выбіраць мсціслаўцы «як з рэлігіі рымскай каталіцкай, так і рускай» і якія б кіравалі горадам на працягу аднаго года. У Крычаве дазвалялася абраць двух бурмістраў, двух радцаў і шэсць лаўнікаў. Акрамя таго, мяшчане абодвух гарадоў, па прыкладу звычая, які ўзнік ў Магілёве, са свайго асяродка павінны былі абіраць дваццаць чатыры асобы прысяжных (паспалітых), якія б кантралявалі дзейнасць магістрата, і якія б са свайго складу абіралі бурмістраў, радцаў і лаўнікаў.

Выбары павінны былі адбывацца на новы год па грыгарыянскім календары. Прычым пасля выбараў мяшчане павінны былі прадставіць магістрату вынікі выбараў і даказаць, «што выбралі слушна і без парушэнняў права», а магістрат павінен быў вынікі выбараў зацвердзіць. Спачатку мсціслаўскія прысяжныя павінны былі выбраць чатырох бурмістраў, шэсць радцаў і восем лаўнікаў, палова якіх займала б свае пасады на працягу аднаго года, другая палова – на працягу наступнага года і так бы кіравалі горадам папераменна. Гэта значыць, што прадстаўнікі магістрата, ці, як называе іх мсціслаўскі прывілей, «радзецкія асобы», маглі займаць свае пасады па чарзе праз год, фактычна, пажыццёва. Пры першым уступленні на свае пасады як у Мсціславе так і ў Крычаве бурмістры, радцы, лаўнікі давалі прысягу аб належным выкананні сваіх абавязкаў. Калі хто-небудзь з прадстаўнікоў магістрата паміраў, на яго месца прысяжнымі са свайго складу выбіраўся другі мешчанін, а колькасць

прысяжных папаўнялася мяшчанамі. Штогод магістрат даваў справаздачу аб сваёй дзейнасці. І калі мяшчане былі не задаволены працай якога-небудзь яго прадстаўніка, то яны мелі права на яго месца выбраць па вышэйзгаданай схеме другога мешчаніна, г. зн. адазваць, пазбавіць свайго даверу нядбалага бурмістра, радцу, лаўніка[161]. Такім чынам, прывілеі Крычаву 1633 г. і Мсціславу 1634 г. уводзілі двухступеньчатую сістэму выбараў прадстаўнікоў магістрата: першая ступень – выбары мяшчанамі 24 прысяжных; другая ступень – выбары прысяжнымі бурмістраў, радцаў, лаўнікаў.

Мал. 39. Пячатка Мсціслаўскай магдэбургіі сярэдзіны XVIII ст. з выявай герба Мсціслава «Малая пагоня» (па: Цітоў А. Геральдыка Беларусі. Мінск, 2007)

Прывілей Мсціславу ўстанаўліваў, што апеляцыя на рашэнні гарадскіх судоў, ці агульнага суда, ці войтаўскага і радзецкага, павінны будуць паступаць у задворны суд караля польскага і вялікага князя літоўскага. Пры разглядзе такіх апеляцый задворны суд і гарадскія суды кіраваліся ў сваёй дзейнасці нормамі магдэбургскага права. Прычым гарадскія суды Мсціслава павінны былі судзіць па судовым уставе сталіцы ВКЛ – Вільні. Даход ад судовых выплат павінен быў размяркоўвацца паміж войтам і магістратам: на войта павінна была ісці адна трэць, а на «гарадскую раду» – дзве трэці судовых він[162].

Для нармальнага функцыянавання органаў улады, «для лепшай аздобы таго горада» Уладзіслаў IV надаў Мсціславу «герб, альбо пячаць: меч з шчытом па на верху» (мал. 39), які быў намаляваны ў арыгінале прывілея[163]. Вельмі падобную пячатку з ваеннай сімволікай атрымаў у 1633 г. і Крычаў – «крыж і меч каля яго» (мал. 40, 41)[164]. Гарадская пячатка прымянялася для зацвярджэння і надання юрыдычнай моцы дакументам, судовым рашэнням, пастановам і распараджэнням і іншай выходнай дакументацыі гарадскіх улад.

Для фінансавага забеспячэння дзейнасці органаў самакіравання ў горадзе ў мсціслаўскім прывілеі 1634 г. уводзіліся палажэнні эканамічнага характару. Найперш прывілей вызваляў мсціслаўцаў ад большасці павіннасцей, паслуг і падаткаў на карысць мсціслаўскага старасты і замка. Але на карысць старасты павінна была ісці плата за карыстанне гарадской зямлёй («чынш з валок, моргаў, прэнтаў, пляцаў, агародаў і засценкаў»). Землямі ж, на якіх мсціслаўцы здаўна пасвілі сваю жывёлу, мяшчане карысталіся бясплатна. Акрамя таго, мяшчане павінны былі аддаваць старасту паўтары тысячы польскіх злотых за

[161] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1, спр. 111. – Арк. 153 адв.
[162] Тамсама. – Арк. 153–154.
[163] Тамсама. – Арк. 153–153 адв.
[164] Мяцельскі А. А. Старадаўні Крычаў. – С. 154.

Мал. 40. Герб Крычава. Актыкацыі прывілея у кнігах Метрыкі ВКЛ. Малюнак пяром. Першая палова XVII ст. (па: Цітоў А. Геральдыка Беларусі. Мінск, 2007)

Мал. 41. Пячатка крычаўскай магдэбургіі 50-х гадоў XVIII ст. (па: Цітоў А. Геральдыка Беларусі. Мінск, 2007)

арэнду «напояў: гарэлкі, мёду, піва, віна». Пры гэтым падкрэслівалася, што шляхта і духавенства, якія жылі ў горадзе і на прадмесцях, не мелі права гандляваць у сваіх дамах алкагольнымі напоямі. Праўда, ім дазвалялася мець і ўжываць такія напоі для асабістых патрэб[165].

Такія падаткі, як «рогавае, воднае, тарговае ад усякіх людзей, купцоў і гасцей прыезжых; грудзіны і лой ад рэзнікаў», аддаваліся па прывілею караля Уладзіслава Вазы мяшчанам у гарадскі бюджэт. Прычым усе падаткі, як тыя, якія ішлі на карысць старасты ці на карысць горада, так і дзяржаўныя, якія ўстанаўліваліся соймам Рэчы Паспалітай, збіраліся самімі мяшчанамі, без умяшання старасты і яго намеснікаў. Неабходныя выплаты старасту павінны былі аддавацца раз на год у замку ў дзень святога Марціна па грыгарыянскім календары; а дзяржаўныя падаткі аддаваліся павятовым зборшчыкам падаткаў.

Улічваючы важнае стратэгічнае і абарончае значэнне Мсціслава і замка, за мсціслаўцамі заставаўся абавязак рамантаваць тую частку мсціслаўскага замка і «своіх городзен», за якія яны адказвалі і раней. Але за гэта яны мелі права ў гэтай частцы замка «сваё схаванне часу патрэбы мець». Акрамя таго, мсціслаўцы «вялікі мост... на рацэ Віхры павінны рабіць: мяшчане – свае ізбіцы, а шляхта свае. Астрог тожа ад башні Хослаўскай да башні Спаскай павінны рабіць мяшчане мсціслаўцы падчас небяспекі для абароны». Прывілеем асабліва падкрэслівалася, што мсціслаўцы вызваляюцца ад давання падвод на дзяржаўныя патрэбы і патрэбы старасты. У выпадку дзяржаўнай неабходнасці мяшчане абавязаны былі ўсё ж такі даваць падводы, але толькі па спецыяльным лісце-распараджэнні караля і за плату, памер якой вызначаўся рэвізорскімі ўставамі[166].

Прывілеем 1634 г. пад уладу горада перадаваліся «крамы і каморы для складанняў рэчаў і тавараў, ...яткі мясныя і лаўкі па продажу хлебны вырабаў і іншых прадуктаў харчавання, пастрыгальня сукнаў, гарадская лазня»[167]. За

[165] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1, спр. 111. – Арк. 154, 154 адв.

[166] Тамсама. – Арк. 154.

[167] Тамсама. – Арк. 154 адв.

гарадскімі органамі улады замацоўваліся гасцінны і шпітальны дамы. Гасцінны дом і да 1634 г. знаходзіўся ў руках мяшчан Мсціслава, кароль Уладзіслаў Ваза толькі пацвердзіў гэта іх права, як і ўсе іншыя правы на даходы на карысць горада, якія склаліся да надання магдэбургскага права.

У комплекс гасціннага двара ўваходзілі сам дом і двор, у якім абавязаны былі прыпыняцца прыязджаючыя купцы з таварамі. Неад'емнымі часткамі гасціннага двара былі «вага» і «васкабойня» – памяшканні, дзе ажыццяўлялася ўзважванне тавараў і тапленне воску. Горад павінен быў «шпітальны дом для убогіх пабудаваць», і на яго ўтрыманне павінна было ісці па адным бервяне дрэва з кожнага воза, якое прывозілі ў Мсціслаў на продаж[168]. За ўсе будынкі, якія замацоўваліся за горадам, адказвалі мсціслаўцы праз свой магістрат. Мяшчане павінны былі «па гарадскіх вуліцах, дзе калі б небудзь была патрэба, дарогі масціць і рамантаваць». Для аздобы горада мсціслаўцам дазвалялася пабудаваць ратушу «па сваёй заможнасці», але абавязкова з гадзіннікам. Прычым адзначалася, што мяшчане ўжо выкупілі пляцы ў горадзе пад ратушу, і ім дазвалялася працягваць выкупляць пляцы вакол яе.

Акрамя мсціслаўскіх мяшчан пад выкананне гарадскіх павіннасцей падпадалі шляхта, якая мела нерухомую маёмасць пад магдэбургскім правам, і ўсе жыхары Мсціслава, якія жылі ў межах горада на землях шляхты, духавенства, г. зн. знаходзіліся пад прыватнай юрысдыкцыяй, і якія займаліся рамяством і гандлям. Вызваленне ад гарадскіх павіннасцей прадугледжвалася па спецыяльным асобным лісце караля.

Акрамя таго, прывілей 1634 г. адзначаў, што яўрэі, якія жылі ў Мсціславе, належалі да замкавай юрысдыкцыі і мелі права займацца гандлем згодна са сваімі правамі і прывілеямі. Але ў выпадках, калі яўрэі мелі «свае грунты і аселасці пад гарадской юрысдыкцыяй», яны павінны былі выконваць гарадскія павіннасці разам з мяшчанамі. Праўда, з-за таго, што яны плацілі пагалоўшчыну, яўрэі былі вольныя ад выплаты купецкіх падаткаў [169].

У цэлым прывілей 1634 г. закранаў асноўныя пытанні ўвядзення і функцыянавання гарадскога самакіравання па магдэбурскім праве ў Мсціславе. Аналіз зместу прывілея дазваляе сцвярджаць, што пры выдачы прывілея Мсціславу яго стваральнікі кіраваліся і выкарыстоўвалі прывілей надання магдэбургскага права Оршы 1620 г., пры гэтым улічваліся спецыфіка і своеасаблівасць Мсціслава.

Калі ў 1634 г. Мсціславу быў дадзены прывілей на магдэбургскае права, які фактычна рэгуляваў усе бакі жыцця горада, то прывілей Крычаву 1633 г. насіў агульны характар і не быў такім падрабязным. Таму ў 1634 г. мяшчане Крычава звярнуліся да караля з просьбай пашырыць ім правы і вольнасці і ў некаторым плане ўрэгуляваць нормы грамадскага і эканамічнага жыцця горада. Кароль, улічваючы заслугі крычаўцаў, 24 лютага 1634 г. пацвярджае пры-

[168] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1, спр. 111. – Арк. 154 адв., 155.

[169] Тамсама. – Арк. 154 адв.

вілей ад 23 жніўня 1633 г. і ў новым прывілеі значную ўвагу надае эканамічнаму жыццю горада і вызначае абавязкі жыхароў:

– лентвойтам забаранялася судзіць без прысутнасці бурмістраў, радцаў і лаўнікаў;

– жыхары горада павінны былі выконваць гарадскія павіннасці;

– дазвалялася пабудаваць у горадзе два дамы гасцінныя: адзін над Сожам, а другі «за астрогам»;

– згодна з прывілеем, жыхары горада павінны былі пабудаваць ратушу і мець два кірмашы: адзін на Св. Троіцу, а другі на Св. Міколу «свята рымскага»;

– устанаўліваліся памеры падаткаў, якія плацілі крычаўцы. З валокаў і моргаў палявых і сенажатных, таксама як і з прэнтаў месцкіх па пяці пенязяў, а з моргаў палявых, сядзібных – па тры грошы, з кожнай валокі – па капе літоўскай. Вызначаўся і тэрмін выплаты падаткаў – ад Св. Міхала да Св. Марціна «свята рымскага». Жыхарам горада дазвалялася браць дрэва на гарадскую будоўлю і свае патрэбы з каралеўскай пушчы. Таксама прывілей вызначаў ім права вольнай рыбнай лоўлі «ад граніцы прапойскай да граніцы рослаўскай»;

– катэгарычна прадпісвалася ўсім прыезджым купцам гандляваць толькі ў горадзе і забаранялася ім гандляваць у воласці. У той жа час самі жыхары Крычава мелі права гандляваць па ўсёй воласці[170].

Пашырэнне магдэбургскага права і больш падрабязная яго рэгламентацыя адбывалася і ў Мсціславе. У 1644 г. мяшчане Мсціслава звярнуліся да караля з просьбай пацвердзіць ім прывілей 1634 г., а пацвердзіўшы, «адносна некаторых яго пунктаў» зрабіць удакладненні. Кароль Уладзіслаў Ваза задаволіў просьбу мяшчан і 4 лістапада 1644 г. пацвердзіў прывілей 1634 г. і ўдакладніў пэўныя пытанні адносна функцыянавання магдэбургскага права у горадзе[171]. Удакладненні сталі асноўным зместам прывілея і закраналі важнейшыя праблемы, якія існавалі ў той час ў жыхароў Мсціслава.

Прывілей устанаўліваў, што:

– гарадскія магдэбургскія суды не павінны былі быць «у іншыя дні, а толькі ў сераду і суботу». Пад гэту норму не павінны былі падпадаць крымінальныя справы, справы, якія датычыліся прыезджых людзей, справы, якія былі раскрыты па «гарачым учынку». Па вышэйадзначаных справах гарадскі суд павінен быў засядаць штодня, але і ў такіх выпадках паседжанні яго павінны былі адбывацца ў ратушы. Прычым суд не павінен быў адбывацца ноччу і ў святы;

– мсціслаўскі войт ці лентвойт павінны былі ўсе справы, якія належаць да іх юрысдыкцыі, разглядаць і судзіць «толькі разам з магістратам – супольным гарадскім урадам у ратушы». У выпадку калі суд адбываўся без удзела магістрата, то такі суд і яго рашэнні прызнаваліся нядзейснымі. Прычым войту на

[170] Мяцельскі А. А. Старадаўні Крычаў. – С. 154–155.

[171] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1, спр. 114. – Арк. 693.

вечныя часы забаранялася «ніякіх спраў і судоў ад гарадскога кіравання разрываць і аддзяляць» і прадпісвалася «разам як суды, так і ўсякія парадкі тамашняга места адпраўляць». Для гарантавання гэтага пункта прывілеем устанаўлівалася, што пасля заканчэння паўнамоцтваў дзеючага ў 1644 г. мсціслаўскага лентвойта, шляхціча Ваврынца Трычэўскага, мсціслаўскія мяшчане павінны былі выбіраць сабе лентвойта па сваім жаданні ці са свайго мяшчанскага, ці са шляхецкага асяродку. Выбранага лентвойта павінен быў зацвярджаць мсціслаўскі войт. Пры чым змена лентвойта была магчымай ці з нагоды адмовы самога лентвойта займаць сваю пасаду, ці ў сувязі з яго змяшчэннем мяшчанамі і выбарамі на яго месца іншага чалавека. Для забяспячэння матэрыяльнага дабрабыту лентвойта прывілей выдзяляў дзве валокі зямлі і засценкі за ракой Віхрай з фонду гарадской зямлі[172];

– гарадскія органы кіравання Мсціслава павінны былі пры зборы судовых пабораў і іншых даходаў на гарадскі урад, пры ўсталяванні іншых норм гарадскога жыцця кіравацца ўставам горада Оршы;

– улічыўшы цяжкасці па судовых справах паміж мсціслаўскімі мяшчанамі і жыхарамі гарадскіх пляцаў, дамоў шляхты, прывілей 1644 г. уводзіў норму, згодна з якой жыхары шляхецкіх юрыдык, якія займаюцца ажыццяўленнем гандлёвых аперацый, павінны судзіцца мсціслаўскім лентвойтам с правам апеляцыі да суда караля польскага і вялікага князя літоўскага. Прычым адзначалася, што займацца гандлем у Мсціславе было магчыма з дазволу гарадскіх улад[173].

Акрамя пытанняў арганізацыі і функцыянавання органаў кіравання, прывілей 1644 г. закранаў пытанні эканамічнага жыцця горада. Для папаўнення гарадскога бюджэту па просьбе мсціслаўскіх мяшчан кароль Уладзіслаў Ваза дазволіў ім мець штогадовыя мядовыя склады, калі яны мелі права рассыціць пэўную колькасць мёду без выплаты капшчызны. За продаж такіх мядовых напояў трэба было плаціць толькі чопавае. Акрамя таго, у гарадскі бюджэт прывілеем 1644 г. перадавалася паўтары тысячы польскіх злотых, якія горад плаціў з 1634 г. мсціслаўскаму старасту за арэнду корчмаў. Прычым прывілей 1644 г. у гэту суму ўключаў плату за тарговае, важчае, рагавое, воднае і іншыя даходы, якія прывілеем 1634 г. перадаваліся ў гарадскі бюджэт. Відаць, арэнда корчмаў не давала такіх прыбыткаў, якія б дазвалялі аддаваць старасту адзначаную суму грошай. У сувязі з гэтым гарадскія ўлады падключылі да выплаты тарговае і іншыя падаткі[174].

У сувязі з цяжкасцямі ў гандлі, якія цярпелі мсціслаўцы ад розных асоб, прывілеем 1644 г. катэгарычна прадпісвалася ўсім прыезджым купцам са сваімі таварамі спыняцца толькі ў гарадскім гасцінным двары і гандляваць толькі оптам і толькі з купцамі і мяшчанамі Мсціслава пад пагрозай канфіскацыі ўсіх

---

[172] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1, спр. 114. – Арк. 693 адв.

[173] Тамсама. – Арк. 694.

[174] Тамсама. – Арк. 695–695 адв.

тавараў. У выпадку калі купцы ігнаравалі гарадскі гасцінны двор і прыпыняліся са сваімі таварамі на гарадскіх дварах шляхты ці духоўных асоб, то гарадскія улады павінны былі канфіскоўваць іх тавары, а спрэчныя пытанні разглядаліся гродскім судом Мсціслаўскага ваяводства. У сувязі з тым, што навакольнае насельніцтва для ажыццяўлення гандлёвых аперацый не прыязджала ў Мсціслаў, і «мяса, соль, селядзец, салёную і вэнджаную рыбу» прадавалі па сёлах і мястэчках, то гарадскім і гродскім уладам Мсціслава прадпісвалася такія дзеянні «забараняць і не дазваляць»[175].

За мсціслаўскімі рэзнікамі замацоўваўся даўні звычай, згодна з якім яны мелі права свабодна ездзіць па ўсім Мсціслаўскім ваяводстве і купляць жывёлу па сёлах і мястэчках без выплаты гандлёвых мыт і пошлін. У сваю чаргу, улічваючы, што прывілей 1634 г. дазваляў яўрэям гандляваць у Мсціславе, кароль Уладзіслаў Ваза ў 1644 г. удакладніў, што такі дазвол павінен дзейнічаць адносна яўрэяў, якія мелі «свае аселаслі ў месце Мсціслаўскім, а не прыезжых». Прычым яны маглі гандляваць толькі ў адным месцы – на гарадскім рынку, які вызначалі гарадскія ўлады, і «толькі ў тарговыя дні і то не ў крамах, не сукнамі, і не шаўковымі рэчамі».

Прызнаючы законнасць існуючага становішча, калі ў Мсціславе існавала не толькі магдэбургская юрысдыкцыя на чале з войтам і магістратам, але і ўласнасць шляхты, касцёла і царквы (землі, дамы, крамы і г. д.), якая не падпадала пад уладу горада, з мэтай канцэнтрацыі і манапалізацыі ўлады ў руках магістрата на тэрыторыі горада прывілеем 1644 г. Уладзіслаў Ваза пацвердзіў усе акты куплі гарадскімі ўладамі зямель за р. Віхра, дамоў і пляцаў у Мсціславе ў шляхты і далучэнне іх да гарадской юрысдыкцыі і дазволіў ажыццяўляць аналагічныя аперацыі ў выпадку неабходнасці для горада. Акрамя таго ўстанаўлівалася, што ў выпадку прыняцця рашэння уласнікам аб продажы, заставе, арэндзе крамы, то незалежна ад таго, ці быў такі уласнік мешчанінам або шляхцічам, у любым выпадку права куплі, узяцця ў заставу ці арэнду заставалася ў мяшчан, якія падпарадкоўваліся магдэбургскаму праву.

Прывілеем 1644 г. прадпісвалася, што «перакупні, пірожнікі, шынкары», як яўрэі, так і хрысціяне, якія пражывалі ў гарадскіх дамах шляхты, духавенства, павінны былі адзін раз у квартал прадстаўляць на сваіх рабочых месцах кварты, гарнцы для рэвізіі гарадскім уладам. Калі хто не дапускаў прадстаўнікоў гарадскіх улад да адзначанай праверкі, то такому гандляру забаранялася займацца сваёй дзейнасцю[176].

Адной са своеасаблівасцей прывілея 1644 г. была наяўнасць палажэння, згодна з якім у выпадку нерэалізацыі па якой-небудзь прычыне пэўных пунктаў прывілеяў Мсціслава гараджанам давалася права іх рэалізацыі ў будучым. У сувязі з чым адзначалася, што ў гэтым «ім даўнасць шкодзіць» не будзе[177].

---

[175] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1, спр. 114. – Арк. 695 адв.

[176] Тамсама. – Арк. 695.

[177] Тамсама. – Арк. 695 адв.

Як бачна, прывілей 1644 г. пашырыў правы і вольнасці Мсціслава з мэтай умацавання гарадскога самакіравання гэтага парубежнага горада.

У далейшым мсціслаўцы і крычаўцы, імкнучыся захаваць свае правы пасля разбуральных войнаў сярэдзіны XVII ст., неаднаразова звярталіся да каралёў з просьбай аб пацвярджэнні гарадскіх прывілеяў і атрымоўвалі іх. Пацвярджальныя прывілеі Мсціслаў і Крычаў атрымалі ад каралёў польскіх і вялікіх князёў літоўскіх Яна III Сабескага, Аўгуста II, Аўгуста III.

Такім чынам, можна канстатаваць, што прывілеі 1633 і 1634 гг. уводзілі ў Крычаве і Мсціславе гарадское самакіраванне паводле магдэбургскага права і разам з прывілеямі 1634 г. і 1644 г. вызначалі асноўныя прынцыпы яго функцыянавання. Дадзеныя прывілеі рэгулявалі нормы грамадскага і эканамічнага жыцця гарадоў. Прывілеі занатоўвалі традыцыі магдэбурскага самакіравання, якія склаліся ў ВКЛ, і ўлічвалі спецыфіку Мсціслава (ваяводскі цэнтр) і Крычава (невялікі правінцыяльны горад).

У той жа час наяўнасць гарадскога самакіравання не была навіной для ўсходнеславянскіх зямель. Яно існавала як у старажытнарускія часы, так і ў XIV–XVI стст. у выглядзе вечавога самакіравання, а таксама яго заканадаўчай і выканаўчай улады ў выглядзе згаданых у крыніцах таго часу «дзясятніцаў», «мужей» і «старцаў».

У грамаце князя Юрыя Лынгвеневіча мсціслаўскага за 1443 г., выданай Ануфрыеўскаму манастыру, згадваецца забарона «владычным и городским десятникам» судзіць людзей, якія належалі манастыру. Да часоў караля Аляксандра адносіцца грамата аб перадачы ў арэнду мыта з Крычава і іншых гарадоў, якая адрасуецца да старцаў і ўсіх «мужаў» гэтых гарадоў[178].

Мсціслаўскі войт, які падаваў ліст каралю, згадваецца ў 1591 г. У Мсціславе у 1594–1595 гг. войтам быў Васіль Рамановіч[179]. Крычаўскі войт Фёдар Хадаровіч згадваецца ўжо ў 1592 г.[180] У абодвух выпадках войты ў Мсціславе і Крычаве згадваюцца значна раней, чым гарадам было зацверджана магдэбургскае права.

Перыяд 1633–1648 гг. быў адносна спакойным у жыцці як усёй Рэчы Паспалітай, так і яе састаўных частак, у тым ліку Мсціслаўскага ваяводства. Аднак падзеі 1648–1653 гг. закранулі і Мсціслаўскае ваяводства.

Падчас антыфеадальнай вайны 1648–1654 гг. Крычаў неаднаразова выкарыстоўваўся ў якасці апорнай базы для войска Рэчы Паспалітай і як месца, адкуль арганізоўваліся напады на рускія ўладанні. Крычаў у 1648 і 1651 гг. вытрымаў штурмы казакаў і паўстаўшых сялян, калі казакі, адышоўшы ад Рослаўля, беспаспяхова асаджалі горад[181]. Арганізатарам абароны Крычава быў

---

[178] Копысский Э. Ю. Социально-политическое развитие городов Белоруссии в XVI – первой половине XVII вв. – Минск: Наука и техника, 1975. – С. 77–78.

[179] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 76. – Арк. 176–176 адв.; Тамсама. – Адз. зах. 77. – Арк. 488 адв.–489, 582–582 адв.

[180] АЗР. – Т. 4. – С. 56.

[181] АВК. – Т. 34. – С. 329.

крычаўскі дзяржаўца Мікалай Стэфан Пац. Ён, як сведчыць пастанова Берасцейскага сейма 1653 г., не толькі паказаў асабістую мужнасць падчас абароны горада, але і ўклаў на рамонт замка і ўтрыманне абаронцаў свае грошы. Берасцейскі сейм пастанавіў, каб патрачаныя ім 20 000 злотых на арганізацыю абароны горада яму вярнулі[182].

Горад і яго воласць вельмі пацярпелі ад казацкай навалы, і калі ў 1649 г. сейм зацвердзіў новы падатак на вядзенне вайны ў памеры «10 пабораў», то, напрыклад, для Мсціслаўскага павета ён быў паменшаны да 7. Аднак і з гэтага Мсціслаў змог выплаціць толькі 3 паборы. А ў наступным годзе Мсціслаўскі і Старадубскі паветы наогул былі вызвалены ад выплаты падаткаў. Крычаў жа быў вызвалены ад выплаты падаткаў на 6 гадоў яшчэ ў 1649 г.[183] Пра стан зямель пасля гэтай навалы сведчаць крыніцы, якія называюць спустошанымі вёскамі Крычаўскага тракта Бель, Ціхіль, Лабковічы, Паўлавічы, Ананічы і слабаду Ціхіль[184].

Крыніцы фіксуюць прысутнасць атрадаў казакоў у 1650 г. у наваколлях Мсціслава, Крычава, Чавусаў, Прапойска, пра захоп Рослаўля, Мгліна, Дрокава, Старадуба. Мсціслаўскі староста Януш Радзівіл (мал. 42) арганізаваў адпор казакам пад Крычавам і Мсціславам, аднак пацярпеў паразу. Згодна з паведамленнем, «побили казаков человек с 200, а казаки у них побили человек с 600»[185].

У наступным годзе Крычаў быў цэнтрам, дзе збіралася шляхта Мсціслаўскага, Віцебскага ваяводстваў (48 чалавек) і паветаў Лідскага (100), Стародубскага, Віленскага (100), Троцкага (72), Мінскага (120). Шляхта Мсціслаўскага ваяводства сабралася пад Чэрыкавам і збіралася абараняцца ад казакоў з чарнігаўскага кірунку[186].

Сітуацыя не змянілася і пазней. У 1652 г. за мужнасць, праяўленую падчас абароны ад паўстанцаў, Мсціслаў і Крычаў былі вызвалены ад выплаты падаткаў і пастою жаўнераў на 6 гадоў, за выключэннем мытных збораў[187]. У гэтыя ж гады Крычаў і войска, якое знаходзілася ў ім, неаднаразова згадваюцца ў данясеннях маскоўскіх шпегаў. У 1652 г. на ўмацаванне гарнізонаў Мсціслава і Крычава сюды былі высланы «немцы» – наёмнае войска[188].

Не паспела сціхнуць «казаччына», як пасля амаль дваццацігадовага міру паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай у пачатку 50-х гадоў XVII ст. адносіны паміж дзяржавамі зноў сталі напружанымі, і краіны стаялі перад пачаткам новай вайны.

---

[182] Volumina legum. Przedruk zbioru praw staraniem xx. pijarów w Warszawe od roku 1737 do roku 1782 wydanego. – Peterburg, 1859. – T. 3. – S. 174, 192.

[183] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 124. – Арк. 207 адв.–208.

[184] Тамсама. – Адз. зах. 130. – Арк. 362 адв.–364.

[185] Лочмель И. Ф. Очерки истории борьбы. – С. 55–57.

[186] Wisner S. Działalność wojskowa Janusza Radziwiłła 1648–1655 // Rocznik Białostocki. – T. XIII. – Warszawa, 1978. – S. 83.

[187] Volumina legum. – T. 4. – S. 176; Morzy J. Kryzus demograficzny na Litwe i w Białorusi. – S. 32, 143.

[188] АМГ. – Т. 2. Разрядный приказ. Московский стол (1635–1659). – С. 302, 316, 372.

Пытанне аб пачатку вайны было вырашана рускім бокам яшчэ ў 1653 г. і пачынаючы з вясны 1654 г. рускіе шпегі ўважліва сачылі за тым, што робіцца ў памежных гарнізонах. Так, у сакавіку 1654 г. яны паведамлялі, што з Крычава ў невядомым кірунку вышла войска ў колькасці 700 чалавек[189].

Да траўня 1654 г. падрыхтоўка рускіх войскаў да баявых дзеянняў была завершана. Насупраць Мсціслаўскага ваяводства ў Бранску была сканцэнтравана 15-тысячная паўднёва-заходняя армія пад кіраўніцтвам князя Аляксея Трубяцкога, якому было загадана рухацца на Рослаўль – Мсціслаў – Барысаў. Супраць Рэчы Паспалітай 17 траўня выступіла і казацкая конніца Багдана Хмяльніцкага.

25 чэрвеня галоўныя рускія сілы ўжо былі пад Смаленскам, а 18 ліпеня войскі А. Трубяцкога падышлі да Мсціслава. Пад кіраўніцтвам А. Трубяцкога было 18 тыс. чалавек.

Мал. 42. Партрэт Януша Радзівіла, мсціслаўскага старасты ў 1643–1650 гг.

Пасады і акольны горад Мсціслава рускімі войскамі былі ўзяты даволі хутка. Мсціслаўскі ж замак паў 22 ліпеня пасля чатырох штурмаў. Па сведчанні крыніц «...боярин и воевода князь Алексей Никитич Трубецкой с товарищи город Мстиславль взял и высек и выжег, а пробил в нем больши пятина-десяти (15. – *А. М.*) тысяч...»[190]. Вялікая колькасць загінуўшых пад час абароны Мсціслава жыхароў сведчыць пра тое, што ў ім хавалася значная колькасць насельніцтва са ўсяго ваяводства. А пра падзеі, што адбываліся ў гэтыя часы, яскрава сведчаць фрэскі мсціслаўскага кармеліцкага касцёла «Забойства ксяндзоў» і «Штурм Мсціслава войскамі Трубяцкога». Мяшчане, якія засталіся ў жывых, прысягнулі на вернасць рускаму цару, а частка жыхароў была вывезена ў палон ў Расію.

30 ліпеня цар Аляксей Міхайлавіч паслаў пад Крычаў свае войскі пад кіраўніцтвам стольнікаў і ваявод яртаўльнага палка П. В. Шарамецьева і князя Т. І. Шчарбатава, якія паведамлялі цару: «Город Кричев крепок, стоит на осыпи высокой, и ров глубок и въезд и выезд один, а пищалей затинных и винтовочных (гакаўніц і мушкетаў) в городе много». На іх думку, з тымі сіламі, што

[189] АМГ. – Т. 2. – С. 372.

[190] Акты, собранные в библиотеках и архивах Российской империи археографической экспедицией Императорской Академией наук. – СПб.: Тип. Имп. Акад. наук, 1836. – Т. 4. – С. 128.

яны мелі, штурмаваць горад было немагчыма, на што атрымалі загад адысці ад горада, стаць у аблогу, а «над городом промышлять» – «зажогом, изождав ветру» і іншымі спосабамі[191]. Акрамя яртаўльнага палка, пад Крычаў былі адпраўлены татары, стральцы, «жылецкія сотні». Але аблога нічога не дала, і ў жніўні цар быў вымушаны перакінуць з-пад Дуброўны да Шарамецьева вызваленыя «жилецкие и татарские сотни»[192].

Крычаўцы мужна абараняліся, і цар Аляксей Міхайлавіч, які так і не змог паслаць сюды вялікае войска, быў вымушаны шукаць іншыя шляхі для ўзяцця горада. Па яго загадзе здраднік палкоўнік К. Паклонскі паслаў у Крычаў для вядзення перамоў аб здачы горада і яго прысязе на вернасць маскоўскаму цару шляхціча Іваноўскага. Неаднаразова і сам К. Паклонскі прымаў удзел у перамовах з крычаўцамі, прычым аднойчы яго ледзь не забілі[193], але горад не здаваўся. Не дапамагаў і ўдзел у перамовах застаўшыхся ў жывых жыхароў Мсціслава[194]. Для паскарэння здачы горада К. Паклонскі прасіў цара, каб ён напісаў гараджанам даравальную грамату з абяцаннем захавання іх маёмасці і прывілеяў.

Адначасова з перамовамі аб здачы горада маскоўскія войскі двойчы спрабавалі ўзяць яго штурмам: «извоевал, только одними душами остались есми»[195]. Аднак крычаўцы, добра ведаючы, што здарылася з мсціслаўцамі, знаходзілі ў сябе сілы не толькі абараняцца, але і самім рабіць вылазкі: «...з немалым крыви своей пролитьем... у голоде и великой нэнде отпор давали, у ноч на неприятеля, школы чынечи, выходили». І толькі ў канцы верасня, калі да абаронцаў дайшлі весткі пра тое, што ўжо палі Горы, Орша, Дуброўна, Смаленск, Мсціслаў, Магілёў, што ім няма адкуль чакаць дапамогі, а ў горадзе пачаўся голад, мяшчане Крычава здалі яго рускім вайскам. Прычым у горадзе цару прысягалі як самі крычаўцы, так і частка мсціслаўскай і смаленскай шляхты, якая хавалася тут ад рускіх войскаў[196].

У падзяку за гэта 9 кастрычніка цар Аляксей Міхайлавіч выдаў крычаўскай шляхце, мяшчанам і манастырам Крычава жалаваныя граматы, у якіх пацвярджаў захаванне ўсёй іх маёмасці, правоў, прывілеяў[197].

Мсціслаў і Крычаў на працягу чатырох гадоў знаходзіліся пад уладай Масквы. На акупаваных землях была створана руская адміністрацыя. Кіраўніцтва акупаванымі землямі ажыццяўлялася праз арганізаваныя Мсціслаўскую і Крычаў-

---

[191] Дворцовые разряды по высочайшему повелению издаваемые 2-м отделением собственной его Императорского величества канцелярии. – СПб.: Тип. 2-го отдел. Собств. Е. И. В. Канцелярии, 1852. – Т. 3 (с 1645 по 1676 г.). – С. 437; Мальцев А. Н. Россия и Белоруссия в середине XVII века. – С. 51.

[192] Дворцовые разряды. – С. 443.

[193] АЮЗР. – Т. 14. – С. 241–246, 399–400.

[194] Русско-белорусские связи. Сб. документов 1570–1667 гг. – С. 341–342.

[195] АЮЗР. – Т. 14. – С. 400.

[196] РГАДА. – Ф. 145. – Воп. 1. – Адз. зах. 3. – Арк. 517–527.

[197] БЭФ. – Т. 2. – С. 95–97.

скую прыказныя ізбы, якія падпарадкоўваліся спецыяльна створанаму Прыказу Смаленскага княства. Аднак як толькі восенню 1658 г. рускія войскі трапілі ў складаную сітуацыю, Мсціслаў і Крычаў вышлі з-пад улады рускага цара.

Спробы рускіх войскаў вярнуць іх пад сваю ўладу доўгі час заставаліся безвыніковымі. У лістападзе 1658 г. Мсціслаў быў асаджаны войскамі рускага ваяводы Лабанава-Растоўскага, і асада прыняла зацяжны характар да самай вясны. Жыхары горада вытрымалі ўсе штурмы. Прычым сілы маскоўскіх войскаў былі дастатковымі для таго, каб не толькі асаджаць Мсціслаў, але і рабіць набегі на Крычаў, Чэрыкаў, Чавусы[198].

Усё вырашылася 11 сакавіка 1659 г., калі ў бітве пад Мсціславам рускія войскі разбілі войскі палкоўнікаў С. Кміціча, С. Аскіркі, што падышлі на дапамогу мсціслаўцам з-пад Ляхавічаў, і казакоў Нячая і Выганоўскага, што падышлі з-пад Крычава. У пачатку красавіка яны зноў паспрабавалі дапамагчы Мсціславу, але з тым жа поспехам. У гэтай бітве маскоўскае войска «...побили 3000 ч. да в языцехъ взято 121 ч., да наряду взято 4 пушки да гоковница, 4 литавры, 32 знамени, 114 древок гусарских, 4 барабана и обоз взяли...»[199]. Пасля гэтага Мсціслаў, які застаўся без дапамогі, паддаўся маскоўскаму войску. Хутка, верагодна, і Крычаў быў вымушаны зноў падначаліцца ўладзе рускага цара.

Аднак пакінуты Лабанавым-Растоўскім у Мсціславе гарнізон колькасцю 266, а ў Крычаве – колькасцю 188 чалавек утрымацца не змаглі, бо, як паведамляў цару ваявода Б. Рэпнін, гарады гэтыя былі ненадзейныя.

Цар Аляксей Міхайлавіч у адказ на гэта паведамленне: «...Мстиславль, Кричев, Рославль, Чичерск велел укрепить гораздо и осадным людем сидеть с великим бережением»[200]. Ён як быццам прадбачыў небяспечнасць сітуацыі, што склалася на захопленых землях. Ужо ў канцы жніўня, калі пад Мсціслаў падышлі аддзелы палкоўніка Ліпскага, яго жыхары самі адчынілі ім гарадскую браму[201]. Сюды ж, у Мсціслаў, прыбегла дэпутацыя з Крычава, якая прасіла Ліпскага як мага хутчэй ісці пад Крычаў «а чаять де кричевцы город польским людем сдадут вскоре»[202].

Недзе ў канцы жніўня – пачатку верасня крычаўцы зноў прысягнулі на вернасць Рэчы Паспалітай. Спробы маскоўскага ваяводы князя Ю. А. Далгарукага сілай вярнуць горад пад царскую руку толькі выклікалі ў мяшчан і шляхты Крычава абурэнне. Гарадскія ўлады да восені вялі перамовы з царскімі ўладамі, падкрэсліваючы, што калі яны падвядуць да горада войскі, то кры-

---

[198] Малов А. В. Московские выборные полки солдатского строя в начальный период своей истории 1656–1671 гг. – М.: Древнехранилище, 2006. – С. 429, 430, 434.

[199] Малов А. В. Московские выборные полки... – С. 432; АМГ. – Т. 3. Разрядный приказ. Московский стол. (1660–1664). – С. 150.

[200] АМГ. – Т. 3. – С. 106, 108.

[201] Ткачев М. А. Замки Беларуси. – С. 94.

[202] АМГ. – Т. 3. – С. 147–148.

чаўцы будуць з імі біцца. Урэшце 23 лістапада мяшчане і шляхта здалі горад, але не маскоўскаму войску, а запарожскаму палкоўніку П. І. Раслаўчэнку[203].

У кастрычніку 1660 г. Мсціслаў зноў апынуўся ў руках рускіх войскаў, аднак агульная ваенная сітуацыя ўжо складвалася не на карысць Расіі. Ваявода Б. Рэпнін, які стаяў з гарнізонам ў горадзе, атрымаў царскі загад адступаць, а «остроги старой и новой... выжечъ и разорить без остатку, заказ учинить крепкой под смертью казнью, чтоб в том месте впредь бы никакие люди не селились». Жыхары Мсціслава атрымалі загад 26 снежня адправіцца ў Яраслаў[204]. Рускія войскі пакінулі пасля шасцігадовага панавання фактычна пусты горад.

У канцы лютага – пачатку сакавіка 1661 г. Крычаў зноў выйшаў з-пад улады Масквы. Прычым, як адзначалі маскоўскія крыніцы, у горадзе было шмат людзей, якія даўно жадалі вярнуцца пад уладу Рэчы Паспалітай. Гэта партыя атрымала перавагу, і гараджане зноў прысягнулі на вернасць каралю[205].

У 1661 г. Мсціслаў і Крычаў канчаткова апынуліся ў складзе Рэчы Паспалітай і ў гэтым жа годзе для іх хутчэйшага адраджэння гарады спецыяльнай пастановай сейма былі вызвалены на 4 гады ад выплаты падаткаў[206].

Вясной 1664 г. усходнія, разбураныя вайной раёны Рэчы Паспалітай аб'язджаў кароль Ян II Казімір. 23 сакавіка ён быў у Крычаве. Вынікам яго знаёмства са станам горада стала тое, што Крычаў для хутчэйшага адраджэння на 10 год быў вызвалены ад пастояў войскаў, былі пацверджаны ўсе былыя вольнасці і прывілеі, акрамя таго, у рукі месцічаў перадавалася карчма, якая раней была ў арэндзе ў яўрэяў[207]. 6 красавіка 1664 г. кароль аглядаў Мсціслаў, які пачынаў адраджацца.

Другім вынікам гэтай паездкі стала тое, што адразу ж пачалося ўпарадкаванне дзеянняў войскаў Рэчы Паспалітай на гэтай тэрыторыі. Вайскам забаранялася браць лішкі харчоў і ад іх патрабавалася, каб яны выплацілі ўсе раней не аплачаныя кантракты[208].

Тым не менш, хаця актыўныя баявыя дзеянні на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства ў гэты час ужо не вяліся, восенню 1664 г. рускія войскі спалілі і высеклі Радамлю і Расну, дзейнічалі іх аддзелы і на поўдні ваяводства. Ва ўсякім выпадку, рух рускіх войскаў у бок Крычава адзначаўся ў 1665 г.[209]

І ў наступныя гады Мсціслаў і Крычаў неаднаразова бачылі пад сваімі сценамі рускія войскі. У 1667 г. рускія войскі былі «на боях и на приступех» пад Мсціславам, Быхавам і Крычавам. У наступным годзе рускія крыніцы адзна-

---

[203] АМГ. – Т. 3. – С. 243–244; Русско-белорусские связи. Сб. документов 1570–1667 гг. – С. 441–442.

[204] Ткачев М. А. Замки Беларуси. – С. 94.

[205] АМГ. – Т. 3. – С. 323–324, 334.

[206] Volumina legum. – T. 3. – S. 385.

[207] ИЮМ. – Вып. 25. – С. 314–316.

[208] Тамсама. – С. 307–310.

[209] Летопись Самовидца о войнах Богдана Хмельницкого и о междуусобицах бывших в Малой Руси по его смерти – М.: Универ. тип., 1846. – С. 44; АВК. – Т. 35. Инвентари староств, имений, фольварков и деревень за вторую половину XVIII в. (1757–1789). – С. 407–408, 422, 432.

чаюць, што маскоўскія войскі былі «на многих боях и в посылках и на приступех под Чеусами и подо Мстиславом»[210].

Цэнтр Мсціслаўскага ваяводства ў 60–70-я гады XVII ст. хаця паціху і адраджаўся, але як крэпасць на ўсходзе краіны ён страціў сваё значэнне. Толькі праз 15 гадоў пасля вызвалення Мсціслава яго жыхары змаглі ўзяцца за адраджэнне разбуранай фартыфікацыі. У 1676 г. сейм Рэчы Паспалітай нарэшце падтрымаў прапанову паслоў Мсціслаўскага ваяводства па адбудове ў Мсціславе замка. У астатнім другая палова XVII ст. была часам паступовага загойвання ранаў, нанесеных вайной 1654–1667 гг.

Сярод важных падзей, што адбываліся на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства ў канцы XVII ст., трэба адзначыць неаднаразовыя выступленні сялян Крычаўскага староства.

Так, у 1690 г. сяляне вёсак Дубейцы и Крывая Ніва выступілі супраць харугвы віленскага кашталяна і гетмана польнага ВКЛ, якая была сюды прыслана на пастой. Аднак ведаючы «славу» гэтай харугвы, сяляне не толькі не пусцілі яе ў вёскі, але і аказалі ўзброенае супраціўленне.

Другі раз у 1696 г. супраць бясчынстваў харугвы Рыгора Агінскага выступілі не толькі жыхары староства, але і самога Крычава. Прычым на гэты раз справа дайшла нават да выкарыстання ў горадзе гарматаў падчас узброенай барацьбы гараджан супраць вайскоўцаў, якія грабілі воласць і горад[211].

У пачатку XVIII ст. усходнія раёны Рэчы Паспалітай апынуліся ў зоне дзеянняў рускіх і шведскіх войскаў падчас Паўночнай вайны 1700–1721 гг. Баявыя дзеянні на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства вяліся ў жніўні–верасні 1708 г.

У жніўні рускія войскі прыкрывалі тут сваю мяжу ад войскаў Карла XII, які рухаўся з поўдня ў бок Смаленска. Дзеянні як шведскіх, так і рускіх войскаў нанеслі вялікія страты Мсціслаўскаму ваяводству і яго насельніцтву. Прычым знаёмства з кнігамі мсціслаўскага гродскага суда за 1708–1709 гг. паказвае наяўнасць у іх вялікай колькасці скаргаў шляхты на дзеянні як рускіх, так і шведскіх войскаў.

Аднак апавядаючы пра грабяжы, што адбываліся ў ваяводстве, крыніцы ўвесь час адзначаюць у гэтым плане дзеянні рускіх войскаў. Прычым канстатуецца цікавы факт, што рускія салдаты, казакі і калмыкі забіралі пісьмовыя крыніцы, якія пацвярджалі правы на тыя ці іншыя «маетнасці»[212]. Фактычна дзякуючы гэтаму быў знішчаны корпус крыніц па гісторыі Мсціслаўскага ваяводства больш ранняга перыяду.

Моцна пацярпеў падчас гэтай вайны Крычаў і яго староства. Адступаючыя рускія войскі знішчылі замак Крычава: былі пашкоджаны яго валы, спалены цэйхгаўз і іншыя пабудовы, што былі на яго дзядзінцы[213].

---

[210] Малов А. В. Московские выборные полки... – С. 438.

[211] Мелешко В. И. Классовая борьба в белорусской деревне во второй половине XVII–XVIII ст. – Минск: Наука и техника, 1982. – С. 152–165.

[212] НГАБ. – Ф. 1729. – Воп. 1. – Адз. зах. 10. – Арк. 173–174, 291–291 адв., 294–294 адв., 335–335 адв.

[213] Тамсама. – Арк. 294–294 адв.

Падобным чынам рускія войскі павялі сябе і ў Мсціславе. У канцы жніўня 1708 г. адступаючым у бок Смаленска рускі цар Пётр I даў загад узарваць ў Мсціславе «укрепления фортеции, дабы не оставлять неприятелю»[214]. Больш таго, мяркуючы па шматлікіх скаргах шляхты, якія захаваліся ў кнігах мсціслаўскага гродскага суда за 1708 г., і сам горад быў спалены. Адначасова адыходзячыя рускія войскі захапілі з сабою дакументы, што захоўваліся ў мсціслаўскім гродскім судзе і ратушы.

Падобныя дзеянні рускіх войскаў былі ініцыяваны царскім указам, які даў загад войскам паліць перад наступаючымі шведамі ўсё, каб нічога ім не пакідаць[215]. Рускаму цару не было справы да жыхароў чужой дзяржавы. Таму Мсціслаўскае ваяводства перад зімой 1708–1709 гг. было ў вельмі цяжкім стане.

Шведы ўвайшлі ў разбураны Мсціслаў 29 жніўня 1708 г. Але ўжо на наступны дзень недалёка ад горада адбылася бітва шведскіх войскаў з войскамі рускага авангарда пад Добрым (30 жніўня), якая скончылася для шведаў паразай. Праз дзесяць дзён (9 верасня) пад в. Раеўка, на рускай мяжы адбылася новая бітва, якая зноў была няўдалай для шведаў. Баі адбываліся і ў наваколлях в. Бель і горада Кадзіна, пасля чаго шведскі кароль Карл XII 25 верасня 1708 г. вымушаны быў накіраваць свае войскі на поўдзень, ва Украіну[216].

Маўклівымі сведкамі падзей гэтай вайны на землях былога Мсціслаўскага ваяводства, што захаваліся да нашых дзён, з'яўляюцца Пятроў луг на левым беразе Сожа каля Крычава, на якім стаялі рускія войскі, і Каралёў луг каля Клімавічаў, на якім стаялі войскі шведскага караля Карла XII у 1708 г.

Фактычна, наступныя 20 год у гісторыі Мсціслаўскага ваяводства былі перыядам чарговага адраджэння краю пасля вайны. Яно зацягнулася да 40-х гадоў стагоддзя, пакуль у паўднёвых раёнах ваяводства – у Крычаўскім старостве – не ўспыхнула паўстанне сялян.

Паўстанне сялян у Крычаўскім старостве 1740 г. было выклікана тым цяжарам падаткаў, якімі было абкладзена насельніцтва. Аналіз інвентароў Крычаўскага староства 1727 і 1747 гг. паказвае, што за апошнія 20 год сума падаткаў, якія выплочваліся сялянамі, выросла ў 2 разы[217]. Апошняе даволі часта выклікала пабегі сялян у суседнюю Расію, хаця і там сялян нічога добрага не чакала.

Падставай да паўстання паслужыў маніфест крычаўскага дзяржаўцы Гераніма Фларыяна Радзівіла, згодна з якім праводзілася рэвізія ўсіх зямель староства, і зыходзячы з яе вынікаў праводзіўся новы расклад падаткаў. Гэты ўніверсал закрануў не толькі сялян, але і значную частку найбольш магутнай шляхты Мсціслаўскага ваяводства.

---

[214] Ткачев М. А. Замки Беларуси. – С. 94.

[215] Шутой В. Е. Борьба народных масс против нашествия армии Карла XII в 1700–1709 гг. – М.: Изд-во соц.-экон. лит., 1958. – С. 238.

[216] Шутой В. Е. Борьба народных масс... – С. 236, 238–239; История Северной войны 1700–1721 гг. – М.: Наука, 1982. – С. 73.

[217] Lech M. Powstanie chłopów białoruskich w starostwie krzyczewskim (1740 r.) // Pregląd historyczny. – 1960. – T. 51. – Zesz. 2. – S. 323.

Справа ў тым, што за апошнія 15 год Валовічы, Цеханавецкія, Францковічы самавольна захапілі даволі вялікія кавалкі старасцінскай зямлі і зараз, падчас рэвізіі, усё гэта выявілася. Радзівілаўскі ўпраўляючы Крычаўскага староства Гдаль Іцкавіч даволі жорстка стаў наводзіць парадак і вяртаць землі законнаму гаспадару. Гэта, безумоўна, не магло не выклікаць незадавальнення як дробнай, так і больш магутнай шляхты ваяводства. Справа атрымала такі паварот, што менавіта шляхта пачала падбухторваць сялян на выступленне супраць дзеянняў Г. Іцкавіча.

Такім чынам, дзякуючы намаганням шляхты, выступленне сялян атрымала выразны антысеміцкі настрой, хаця на самай справе галоўным фактарам гэтага паўстання была эксплуатацыя насельніцтва Крычаўскага староства, якая ўсё больш узмацнялася.

Першапачаткова ў пачатку 1740 г. у старостве адбываўся толькі збор скаргаў з мэтаю падачы іх Г. Ф. Радзівілу на цяжары ад казначэя староства. Скаргі ўвесь час пасылаліся да Г. Ф. Радзівіла і яго маці з надзеяй на дапамогу. Потым пачалася арганізацыя ўзброеных груп, якія не давалі працаваць у будах і іншых лясных прадпрыемствах староства.

У красавіку 1740 г. у Крычаўскае староства, у абыход Г. Ф. Радзівіла, была накіравана з Вільні спецыяльная камісія для разгляду сітуацыі, якая тут склалася. Прыезд гэтай камісіі, як пісаў радзівілаўскі камісар староства Пржулецкі, толькі абудзіў у сялян нездаровыя тэндэнцыі. Камісія выехала з Крычава, нічога не вырашыўшы, але з траўня пачаліся ўжо адкрытыя ўзброеныя выступленні сялян.

У гэтым месяцы Пржулецкі быў вымушаны звярнуцца да Г. Ф. Радзівіла, каб той прыслаў у староства войскі, бо першапачаткова справу не ўдалося вырашыць сіламі таго вайсковага аддзелу, які стаяў у крычаўскім замку. Таму на дапамогу была паслана гусарская харугва ВКЛ пад кіраўніцтвам Валадковіча. Першыя крокі харугвы былі паспяховымі, і даволі хутка Валадкевіч пісаў Г. Ф. Радзівілу, што выступленні сялян спынены.

Каб супакоіць сялян, Г. Ф. Радзівіл пайшоў на замену арандатараў староства. У канцы чэрвеня 1741 г., калі зноў пачало пашырацца хваляванне сялян, староства было перададзена ў двухгадовую арэнду М. Л. Храптовічу. Такім чынам Г. Ф. Радзівіл спадзяваўся супакоіць сялян.

Першапачаткова надзеі Г. Ф. Радзівіла апраўдаліся, і новы арандатар спрытна манеўраваў паміж сялянамі і больш дробнымі арандатарамі. Аднак хутка М. Л. Храптовіч пачаў паводзіць сябе, як і папярэднія арандатары, – рабаваць сялян, павялічыў чынш і іншыя павіннасці. Асабліва гэта ўзмацнілася на другі год арэнды, у выніку чаго сяляне адмовіліся ад выплаты павялічанай сумы пабору. Сяляне прасілі Г. Ф. Радзівіла, каб той не здаваў больш староства ў арэнду, абавязуючыся самастойна выплочваць у касу ўладальніка ўсю суму, якая была б роўнай штогадовай арэнднай плаце[218].

---

[218] Мелешко В. И. Классовая борьба в белорусской деревне... – С. 195–198.

Геранім Фларыян Радзівіл вымушаны быў пайсці на задавальненне патрабаванняў сялян і ў чэрвені 1743 г. накіраваў у староства ўніверсал, згодна з якім абяцаў не здаваць больш староства ў пацэсію. Адначасова ў староства былі накіраваны камісары, якія павінны былі правесці рэвізію перад завяршэннем арэнды. З гэтай мэтай Г. Ф. Радзівіл прызначыў у староства генеральнага адміністратара.

Аднак сітуацыя ў старостве заставалася вельмі напружанай, сяляне ўжо нікому не давяралі. Гэта ўзмацнялася тым, што ў староства быў прысланы камісарам М. Ганіцкі, які ў 1740 г. займаў пасаду лентвойта ў Крычаве і быў шчыльна звязаны з былым арандатарам Іцкавічам.

Менавіта зараз, калі сяляне пачалі аказваць супраціўленне не толькі дробным арандатарам, але і прадстаўніку Г. Ф. Радзівіла, апошні і вырашыў накіраваць у староства войска, каб спыніць выступленні сялян.

У пачатку студзеня 1744 г. Г. Ф. Радзівіл накіраваў у Крычаў са Слуцка сваё надворнае войска колькасцю ў некалькі соцень салдат і кавалерыі з гарматамі. Адначасова 200 салдат і гарматы накіроўваліся сюды з Невеля і Себежа. Агульнае кіраванне войскамі даручалася палкоўніку Пестжэцкаму.

Звесткі пра падыход войскаў з'явіліся сігналам да масавага ўзброенага выступу сялян. Асноўная маса паўстанцаў сабралася каля мястэчка Міхалава, у сярэдзіне студзеня там сабралося каля 2 тыс. сялян.

Войскі Г. Ф. Радзівіла ўвайшлі ў Крычаў 15 студзеня 1744 г. адкуль Пестжэцкі разаслаў універсал князя з патрабаваннем падпарадкавацца яму і спыніць бунты. Аднак гэта не дало ніякага выніку. Наадварот, 18 студзеня паўстаўшыя сяляне падышлі да Крычава, акружылі з усіх бакоў замак і пачалі яго штурм. Нягледзячы на жорсткі бой на вуліцах горада, лепш узброеныя і арганізаваныя радзівілаўскія войскі змаглі выціснуць сялян з Крычава. У выніку на полі бітвы засталося звыш 100 забітых і 500 параненых. Акрамя таго, 77 чалавек былі ўзяты ў палон, з іх у жывых засталіся толькі трое: два бурмістры і старац Палявой воласці[219].

Сяляне, якія адступілі ад горада, сабраліся ў наваколлях в. Царковішчы. Па некаторых звестках, ў дваццатых лічбах студзеня іх налічвалася каля 4 тыс. Першапачаткова яны планавалі ажыццявіць новы напад на Крычаў 26 студзеня. Аднак пра гэта стала вядома Пестжэцкаму.

Ён вырашыў апярэдзіць сялян нападам на іх лагер, тым болей што ў гэты час да яго падышлі войскі з Себежа і Невеля. Зараз у Пестжэцкага было 400 добра абучаных салдат, гарматы крычаўскага замка і 4 гарматы, дастаўленыя Цялецкім.

Раніцай 27 студзеня 1744 г. войска пад кіраўніцтвам Пестжэцкага атакавала лагер сялян, якія не змаглі аказаць супраціўленне і былі вымушаны пакінуць лагер. У выніку гэтай бітвы былі забіты каля 200 сялян, а яшчэ 176 трапілі ў палон[220]. Бітва каля Царковішчаў вырашыла лёс паўстання. Пасля яе ся-

[219] Мелешко В. И. Классовая борьба в белорусской деревне... – С. 205–207.

[220] Тамсама. – С. 209.

ляне ўжо не змаглі больш аказваць супраціўленне і, пераследуемыя конніцай, разбегліся па усіх канцах староства і нават за яго межы. З мэтаю запалохвання сялян адразу пасля бітвы пад Царковішчамі былі павешаны 30 чалавек, а яшчэ 30 былі пасаджаны на кол і падвешаны на крукаў. На пачатак лютага 1744 г. паўстанне было падаўлена.

Геранім Фларыян Радзівіл прыехаў у Крычаў ужо ў першай палове лютага на чале аддзела конніцы колькасцю ў 300 чалавек. Да гэтага часу ўжо і ў горадзе ўсё было спакойна.

22 лютага 1744 г. адбыўся суд над кіраўніцтвам паўстання. Згодна з прысудам, 16 кіраўнікоў паўстання былі асуджаны да пакарання смерцю. Яшчэ 15 кіраўнікоў паўстання былі прысуджаны да біцця бізунамі каля ганебнага слупа перад будынкам ратушы. Акрамя таго, сыну Стэся Бочка, які быў сакратаром паўстання, Г. Ф. Радзівіл загадаў адрэзаць вушы і выпаліць на лбе шыбеніцу[221].

У астатнім палітычныя падзеі, што адбываліся ў Рэчы Паспалітай ў сярэдзіне XVIII ст., знаходзілі сваё адлюстраванне і ў жыцці Мсціслаўскага ваяводства. Так, пасля смерці караля Аўгуста II у час бескаралеўя большая частка мсціслаўскай шляхты падтрымлівала кандыдатуру Аўгуста III, аднак калі ў 1733 г. адбываўся павятовы сеймік, то па звароце самой шляхты ў Мсціслаў увайшлі рускія войскі ў колькасці 4000 чалавек пад камандай Каросы, каб захаваць у горадзе спакой.

На той час на Мсціслаў і Мсціслаўскае староства пачынаючы з 1730 г. прэтэндавалі дзве партыі на чале з Феліксам Нікадымам Цеханавецкім і Аляксандрам Валовічам. Падчас абрання новага караля Рэчы Паспалітай яны таксама выступалі за розных кандыдатаў: Ф. Н. Цеханавецкі падтрымліваў кандыдатуру Станіслава Ляшчынскага, а А. Валовіч быў на баку Аўгуста III. Спрэчкі мелі такі характар, што падчас сейміка, што адбываўся ў кармеліцкім касцёле ў 1733 г., справа дайшла нават да ўзброеных сутычак паміж прыхільнікамі розных партый[222].

Пасля абрання каралём Аўгуста III мсціслаўскім старастам стаў А. Валовіч, а мсціслаўская шляхта пад наглядам расійскіх войскаў прысягнула на вернасць новаму каралю[223].

Аднак і надалей расійская адміністрацыя ўсё больш актыўна пачала ўмешвацца ў лёс памежнага Мсціслаўскага ваяводства. Пасля смерці А. Валовіча зноў разгарнулася барацьба за Мсціслаўскае гарадавое староства. Стражнік вялікі літоўскі Л. Пацей у 1757 г. за 2000 злотых чырвоных, выплачаных каралеўскаму міністру фінансаў Брулю, выкупіў яго. Аднак гетман вялікі літоўскі М. Радзівіл Рыбанька даў Брулю большую суму і, заручыўшыся падтрымкай расійскай імператрыцы Елізаветы, атрымаў мсціслаўскае гарадавое староства

---

[221] Мелешко В. И. Классовая борьба в белорусской деревне... – С. 215.

[222] Dyaryusz życia Ignacego Lopacińskiego, pisarza skarbowego WKL, brata rodzonego wojewody brzeskiego // Biblioteka Warszawska. – T. 3. – Warszawa, 1855. – S. 395–397.

[223] Dyaryusz życia Ignacego Lopacińskiego. – S. 397–398.

для свайго зяця, падканцлера літоўскага М. Сапегі, які, у сваю чаргу, саступіў мсціслаўскае староства М. Лапацінскаму[224].

Палітычныя падзеі, што адбываліся ў знешнепалітычным жыцці Рэчы Паспалітай у гэты час былі вельмі складанымі. Карыстаючыся барацьбой магнатаў за ўладу і выкарыстоўваючы яе ў сваіх мэтах, Расія ўжо ў пачатку 60-х гадоў XVIII ст. разглядала магчымасць анексавання ўсходніх раёнаў Рэчы Паспалітай да Дняпра і Дзвіны, і толькі нечаканая смерць караля Аўгуста III 27 верасня 1763 г. схіліла Пецярбург да іншага сцэнарыя[225].

Для абрання новага караля, які быў бы пад расійскім кантролем, з ліку ўплывовых арыстакратаў дзяржавы была створана канфедэрацыя, куды ўвайшоў і мсціслаўскі ваявода І. Сапега. І хаця 6 кастрычніка 1763 г. на паседжанні імператарскага савета пры Кацярыне II зноў узнікла пытанне аб анексіі ўсходніх зямель Рэчы Паспалітай, гэты план зноў быў адхілены.

Нарэшце 3–20 лістапада 1764 г. на трон Рэчы Паспалітай быў абраны расійскі стаўленік Станіслаў Панятоўскі, апошні кароль Рэчы Паспалітай. На працягу наступных трох гадоў уся Рэч Паспалітая была ўцягнута ў палітычную віхуру, звязаную з паглыбленнем расійскага ўплыву на дзяржаву, аднак канкрэтныя падзеі, што адбываліся ў Мсціслаўскім ваяводстве, не знайшлі свайго адлюстравання ў крыніцах.

У лютым 1767 г. руская імператрыцы Кацярына II накіравала ў Рэч Паспалітую корпус пад камандай І. Нумерса з абвяшчэннем, што ён уводзіцца туды «без всякого неприятного намерения, но по причине доказанной в сей республике нашей к ней дружбы и попечения о сохранении ея конституции и вольности». У Мсціславе быў пакінуты атрад у 150 казакоў[226].

Унутрыпалітычная сітуацыя ў Рэчы Паспалітай складвалася не зусім добра для Расіі, бо нават у памежным Мсціслаўскім ваяводстве склалася канфедэрацыя супраць яе палітыкі і яе стаўленіка караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Таму напярэдадні правядзення павятовых сеймікаў для абрання дэпутатаў на агульнадзяржаўны сейм у Рэч Паспалітую былі ўведзены рускія войскі з мэтаю кантроля за іх правядзеннем.

11 верасня 1768 г. рускі капітан Сямён Злобін паведамляў, што ў Мсціслаўскім ваяводстве сабралася каля 5 тыс. узброенных канфедэратаў, якія не пусцілі яго ў Мсціслаў, схапілі і забілі яго кур'ера. Генерал-майор Д. Лыкошын неадкладна размясціў на мігнавіцкім фарпосце эскадрон з 2 гарматамі, а 21 верасня паведаміў у ваенную калегію, што рускія войскі ўварваліся ў Мсціслаў, адкуль выгналі маршалка мсціслаўскай канфедэрацыі М. Цеханавецкага, яго саветнікаў Фадзея Ігнацыя Кіркора, Яна Чудоўскага з 1500 жаўнерамі і 6 гарматамі[227].

---

[224] Matuszewicz M. Diariusz życia mego. T. I. 1714–1757. – Warszawa, 1986. – S. 742–743.

[225] Анішчанка Я. К. Палітычная гісторыя ў часы падзелу Рэчы Паспалітай. Доктарская дысертацыя. – Мінск: Выдавец В. Хурсік, 2006. – С. 63.

[226] Анішчанка Я. К. Народжаны рабалепнічаць. – С. 118.

[227] Тамсама. – С. 146.

Аднак і надалей сітуацыя ў Мсціслаўскім ваяводстве складвалася даволі крытычна для Расіі. Ужо 3 кастрычніка агульная трывога расійскага генералітэта ўзрасла, пасля таго як Д. Лакошын паведаміў аб прыбыцці ў Мсціслаўскае ваяводства ўніяцкага мітрапаліта Феліцыяна Філіпа Валадкевіча з лістом ад кракаўскага епіскапа К. Солтана «для возмущения всех народов». Да гэтага ж стражнік мсціслаўскага ваяводства Франц Жыркевіч даносіў пра прыбыццё сюды С. Цеханавецкага, які прывёз абяцанне Караля Радзівіла (Пане Каханку) прыслаць 2 тыс. вайсковай дапамогі на канфедэрацыю, і што натхнёныя гэтым мсціслаўскія паўстанцы захапілі гродскую канцылярыю, сабралі 3 харугвы і разабралі паміж сабой чыны.

3 кастрычніка ў Маляцічах пад маршалствам М. Цеханавецкага быў абвешчаны акт канфедэрацыі Мсціслаўскага ваяводства, сакратаром якога аказаўся С. Цеханавецкі. Там жа былі абраны і 3 дэлегаты ў раду Генеральнай канфедэрацыі ВКЛ. Акт агучыў сваю падтрымку Барскай справы, пратэставаў супраць прымусу «да рабства маскоўскай дзяржавай апошняга сейма» і да падпісання на ім трактата, вінаваціў расійскае войска ў крыўдах каталіцкага духавенства і рабунках манастыроў, але заявіў, што падпісанты не збіраюцца самі крыўдзіць дысідэнтаў і праваслаўных.

Згодна з рапартамі Д. Лакошына, канфедэраты акапаліся ў Маляцічах шанцамі, сталі чыніць наезды на праціўнікаў, выбіраць лепшых сялян і, называючы іх стральцамі, навучаць вайсковай справе. Яны прыгразілі захапіць праваслаўны Тупічэўскі манастыр з дапамогай 20 гармат, адкуль манахі са страху паўцякалі ў Рослаўль і ў Крычаўскае староства.

Верагодна, у гэты момант канфедэрацыя раскалолася або разлучылася, бо каля 200 канфедэратаў на чале са смаленскім гродскім суддзёй Янам Чудоўскім і Ф. Кіркорам захапілі мсціслаўскага бурмістра, а частка канфедэратаў 14 кастрычніка рушылі ў бок Крычава. Секунд-маёр рускіх войскаў А. Бандрэ разам з 60 драгунамі і гарматай пагнаўся за апошнімі і паведамляў у сваіх данясеннях, што «всякие сутки происходили мелкие стычки». Пагоня вялася пад самы Крычаў, але паўстанцы паспелі пераправіцца праз Сож і рассыпаліся, нібы дым[228].

Акрамя гэтых дзеянняў, 9 кастрычніка адбылася бойка паміж рускімі войскамі і канфедэратамі пад Раснай. Рускія войскі былі напалоханы чуткамі, што пад Раснай сабралася 3 тыс. чалавек пяхоты, 5 тыс. коннікаў і 1 тыс. мужыкоў пры 18 гарматах. Але на самай справе, згодна з данясеннем А. Бандрэ, у баі пад Раснай ён змагаўся з 300 коннымі і пешымі канфедэратамі. Бойка пад Раснай завяршыла разгром першых сполахаў канфедэрацкага руху ў падтрымку Бара на ўсходнім памежжы ВКЛ.

У той жа час падзеі 1768 г., калі прыхільнікі Барскай канфедэрацыі фактычна сарвалі выбары на лістападаўскі сейм, у краіне ўзнікла сітуацыя грамадзянскай вайны, якую распальвалі абодва бакі. Аднак падзеі, што адбыва-

[228] Анішчанка Я. К. Народжаны рабалепнічаць. – С. 146–148.

ліся ў Мсціслаўскім ваяводстве ў 1769 – пачатку 1770 г., амаль не адлюстраваны ў пісьмовых крыніцах.

Прыкладна паміж ліпенем і кастрычнікам 1770 г. ў атачэнні Кацярыны II было прынята рашэнне пачаць дыпламатычную падрыхоўку падзелу Рэчы Паспалітай разам з прускім манархам. Руская імператрыца адвяла год сваім дыпламатам на заспакаенне Рэчы Паспалітай перад канчатковым пагадненнем з Прусіяй.

Ужо 19 студзеня 1771 г. прускі пасол у Пецярбургу Віктар Сольме прапанаваў рускаму міністру замежных спраў М. Паніну акрэсліць расійскую долю набыцця па Дзвіне і Дняпры. Прускі імператар Фрыдрых II настойліва раіў у імя раўнавагі інтарэсаў заявіць «старинные права» на любыя часткі Рэчы Паспалітай па прыкладзе Аўстрыі.

Панін, які дбаў пра адзінаўладнае гаспадараннe ў Рэчы Паспалітай, назваў прапанаваны альянс «краснейшей и счастливой идеей», бо ён удала маскіраваў персанальную адказнасць Расіі за тэрытарыяльную цэласнасць дзяржавы і, галоўнае, неабходнасць яе збройнай абароны па сіле ўзятых на сейме 1768 г. абавязацельстваў. Пры гэтым ён гаварыў В. Сольмсу, што паколькі большасць акружэння Кацярыны II даўно гатовы расчляніць Рэч Паспалітую, то і ён не застанецца ў адзіноцтве і падпарадкуецца калегіяльнаму рашэнню. 20 лютага Фрыдрых II прапанаваў яму вызначыць канкрэтныя сферы ўзаемных набыццяў з захаваннем прынцыпаў раўнавагі[229].

Шматлікія выступленні супраць расійскага ўплыву на Рэч Паспалітую, што адбываліся па ўсёй тэрыторыі ВКЛ на працягу лета 1771 г., трапілі ў Пецярбургу на падрыхтаваную партыяй вайны глебу, і ўжо 14 жніўня дзеючая ў Крыме руская армія падзялялася на 4 дывізіі. З ўсіх яе 50 573 штыкоў «на закрытие границ против польских возмутителей по Двине от Лифляндии до Орши и далее по Днепру» вылучаўся корпус у 9133 штыкоў з 14 гарматамі ў складзе 4 пяхотных і 4 кавалерыйскіх палкоў і 1000 казакоў. Штаб корпуса планавалася размясціць у Рагачове, а камандаваць ім прызначаўся Аўрам Раманіус. Згодна з планамі рускага камандавання ў Мсціславе планавалася паставіць эскадрон кавалерыі і роту салдат[230].

Адсутнасць адзінства сярод канфедэратаў нават у іх барацьбе супраць рускіх войскаў толькі садзейнічала перамозе апошніх. Крыніцы фіксуюць шматлікія ваенныя сутычкі на працягу ўсяго 1771 г., але ва ўсіх іх канфедэраты выступалі невялікімі атрадамі. Падобны бой крыніцы фіксуюць і ў верасні ў наваколлях Крычава, калі рускі атрад колькасцю больш за 700 штыкоў разграміў атрад канфедэратаў пад кіраўніцтвам Ш. Касакоўскага колькасцю 400 чалавек: 90–100 былі забіты, у палон захоплены 22 чалавекі, 2 гарматы, 23 ружжы і інш. Пасля рэцірады Ш. Касакоўскага ў перапісцы рускіх вайскоўцаў знікаюць паведамленні пра ўзброены канфедэрацыйны рух на ўсходзе ВКЛ, але ён актыўна ішоў на тэрыторыі астатніх рэгіёнаў краіны.

---

[229] Анішчанка Я. К. Народжаны рабалепнічаць. – С. 218–219.

[230] Тамсама. – С. 237, 238.

Рускія войскі паступова пачалі асвойваць пакуль яшчэ чужыя для іх тэрыторыі. Ужо ў канцы 1771 г. было прынята рашэнне пра арганізацыю на тэрыторыі ВКЛ вайсковых складоў для рускіх войскаў, у тым ліку і ў Мсціславе. Такім чынам, фактычна з кастрычніка 1771 г. пачалася папярэдняя акупацыя ўсходніх раёнаў ВКЛ. Пасля напаўнення складоў планавалася ў лютым 1772 г. увесці сюды дадатковы армейскі корпус, і нават быў падрыхтаваны роспіс авангардам, адзін з якіх быў запланаваны і ў Мсціславе.

17 лютага 1772 г. Расія і Прусія нарэшце заключылі паміж сабой сакрэтную канвенцыю аб падзеле Рэчы Паспалітай, паводле якой дамовіліся апанаваць вызначанымі паміж сабой долямі тэрыторыі краіны без Аўстрыі. Міністр замежных спраў Расіі Панін раіў ажыццявіць захоп гэтых зямель у траўні.

Аднак справа зацягнулася з-за пазіцыі Аўстрыі, якая, даведаўшыся пра пагадненне паміж Расіяй і Прусіяй, таксама пачала патрабаваць сваёй долі для раўнавагі і ўвяла ў Люблінскае, Хелмскае і Уладзімір-Валынскае ваяводствы Рэчы Паспалітай на працягу красавіка–чэрвеня 20-тысячнае войска. Пачаўся дзялёж Рэчы Паспалітай.

У выніку гэтых абставін Расія, Аўстрыя і Прусія 17 сакавіка дамовіліся па згодзе і без кравапраліцця ўраўнаважыць свае захопы. Ужо ў красавіку на тэрыторыі ВКЛ знаходзіўся 13-тысячны расійскі корпус.

7 траўня Панін дакладаў аб гатоўнасці маніфеста трох імператараў пра падзел Рэчы Паспалітай, аднак дзяржаўны савет адклаў яго абвяшчэнне да ліпеня ў сувязі з упартым жаданнем Аўстрыі ўтрымаць за сабой Хелмскае і Люблінскае ваяводствы.

5 жніўня была падпісана канчатковая дамова аб падзеле Рэчы Паспалітай. Тры манархі пагадзіліся не ваяваць паміж сабой, а «взять из Речи Посполитой некоторые провинции яко эквивалент имеющихся своих на Польше справедливых и неоспоримых прав и претензий, по коим они от республики никакого удовлетворения не получили ещё, да инако едва ли когда получить могли б». Такім чынам, у цэнтры абгрунтаванняў стаяла звычайная рэпарацыя з тэрыторыі праціўніка. Згодна з пагадненнем Прусія захапіла 36 тыс. кв. км, Аўстрыя – 83 тыс. кв. км, Расія прыхапіла больш за ўсіх – 92 тыс. кв. км[231].

24 жніўня Кацярына II загадала публічна авалодаць усходняй часткай Рэчы Паспалітай паміж 1 і 7 верасня 1772 г.[232] і абвясціць яе жыхарам «Плакат пра вечнае далучэнне іх да Расійскай імперыі». Сумесную дэкларацыю пра падзел Рэчы Паспалітай усе тры манархі абвясцілі толькі 28 верасня.

Пасля ўваходу рускіх войскаў у Рэч Паспалітую Мсціслаўскае ваяводства ў складзе Расіі было скасавана, яго тэрыторыя была ўключана ў склад Мсціслаўскай правінцыі, хаця намінальна Мсціслаўскае ваяводства працягвала існаваць у складзе Рэчы Паспалітай да апошняга, трэцяга яе падзелу, які адбыўся ў 1795 г.

---

[231] Анішчанка Я. К. Народжаны рабалепнічаць. – С. 278.

[232] Полное собрание законов Российской империи повелением государя императора Николая Павловича составленное. Собр. 1-е. – 1830. – Т. XIX – № 13850, с. 553

ДЫНАМІКА АСВАЕННЯ СЕЛЬСКІХ АБШАРАЎ МСЦІСЛАЎСКАГА КНЯСТВА І ВАЯВОДСТВА Ў XIV–XVIII стст.

5.1. Тыпы сельскіх паселішчаў

У XIV–XVIII стст. асноўным тыпам сельскіх паселішчаў на землях сучаснай Беларусі, у тым ліку і на тэрыторыі Мсціслаўскага княства і ваяводства, былі вёскі. Самай распаўсюджанай назвай сельскіх паселішчаў у XIV–XVIII стст. было «сяло». Тэрмін «сяло» ўвесь час сустракаецца як ў беларускамоўных, так і польскамоўных пісьмовых крыніцах, якія тычацца Пасожжа перыяду даследавання. Акрамя таго, у некаторых беларускамоўных крыніцах для вызначэння сельскага паселішча ў XV–XVI стст. ужываецца тэрмін «сялко». Тэрмін «вёска», «весь» пачынае выкарыстоўвацца ў польскамоўных крыніцах толькі з другой паловы XVII ст.

Сёлы XIV–XVIII стст. складаліся з асобных двароў – «дымоў». Двары ў сёлах аб'ядноўваліся ў «службы», якія з'яўляліся адзінкай падаткаабкладання сялян і звычайна складаліся з двух-трох дымоў[1].

У чым розніца паміж тэрмінамі «сяло» і «сялко», дакладна не зразумела. Аналіз колькасці «дымоў» ці «службаў» у тым ці іншым населеным пункце не дае адказу на гэтае пытанне. У катэгорыі «сяло» сустракаюцца населеныя пункты, у якіх налічваецца як 40, так і 4 службы. Тэрмін «сялко» адносіцца выключна да невялікіх населеных пунктаў, у якіх налічваецца ад 3 да 8 дымоў.

У той жа час назіранні за суадносінамі паміж населенымі пунктамі з тэрмінам «сяло» і «сялко» ў Расіі XVII–XVIII стст. паказваюць, што «сяло» звычайна выступае ў якасці цэнтра пэўнай акругі, а «сялко» – у якасці падначаленага населенага пункта, які ўваходзіць у акругу сяла. Акрамя таго, крыніцы адзначаюць абавязковую наяўнасць у расійскім сяле храма. Падобная ж карціна назіраецца і сярод населеных пунктаў ВКЛ. Сяло заўсёды выступае ў якасці альбо цэнтра маёнтка, да якога прылягаюць іншыя, альбо населенага пункта, у якім размешчаны храм.

Зрэдку для вызначэння сельскага населенага пункта выкарыстоўваецца тэрмін «прысёлак», які звычайна ўжываецца ў адносінах да паселішчаў, якія ўваходзяць у склад якой-небудзь «маетнасці». Так, прысёлкі Несцерава і Самава згадваюцца сярод населеных пунктаў, прылеглых да сяла Беразетня Мсціслаўскага староства[2]. Такім чынам, прасочваецца аднолькавасць тыпаў населеных пунктаў, якія называюцца «сялко» і «прысёлак».

---

[1] Спиридонов М. Ф. Закрепощение крестьянства Беларуси. – С. 64–65.

[2] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 96. – Арк. 133 адв.–133.

У крыніцах XV–XVIII стст. даволі часта ў адносінах да сельскіх паселішчаў Мсціслаўскага княства і ваяводства ўжываецца тэрмін «пустаўшчына». Ён выкарыстоўваецца ў адносінах да «неаселага» паселішча, якое па нейкіх прычынах было пакінута. Блізкі «пустаўшчыне» па сэнсе і тэрмін «селішча», які часта таксама характарызуе «неаселае» паселішча. Але ў той жа час гэтым тэрмінам называлі і невялікія сельскія пасёлкі. Даволі распаўсюджанае ўжыванне тэрміна «пустаўшчына» на тэрыторыі даследавання тлумачыцца амаль няспыннымі на працягу першай паловы XVI – сярэдзіны XVII ст. войнамі, у выніку якіх гінулі шматлікія сельскія паселішчы.

На захадзе ВКЛ быў шырока распаўсюджаны і такі тып сельскага паселішча, як засценак[3]. На тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства ў XVI–XVIII стст. такі тып паселішчаў таксама сустракаецца, але не так часта, як на захадзе краіны. Тут крыніцы называюць толькі адзінкавыя населеныя пункты, якія адносяцца да гэтага тыпу. Так, у 1563 г. згадваецца засценак за р. Добрасць каля Крычава, а ў 1606 г. – засценак Перапечына каля сяла Халоблін, у 1721 г. – два засценкі каля сяла Гразь[4]. У той жа час наяўнасць вялікай колькасці такіх населеных пунктаў у суседнім Магілёўскім старостве[5] сведчыць пра тое, што і на ўсходзе краіны такі тып паселішча не быў навіной. А іх невялікая колькасць ў Мсціслаўскім ваяводстве, верагодна, тлумачыцца якасцю захаванай крыніцазнаўчай базы.

Даволі мала былі распаўсюджаны на ўсходзе краіны фальваркі, што было выклікана асаблівасцямі эканамічнага і палітычнага развіцця рэгіёна. Шматлікія войны з Расіяй XVI–XVII стст. спусташалі гэтыя землі, і сельскую гаспадарку на іх немагчыма было адрадзіць за кошт паншчыны, якая прымянялася ў фальварках. Пад'ём гаспадаркі на гэтых землях адбываўся за кошт пераводу сялян на грашовы чынш і надання розных ільготаў[6]. Большасць фальваркаў з'яўляецца тут толькі ў другой палове XVIII ст., калі на ўсходзе краіны нарэшце ўсталяваўся мір. Тым не менш, у сярэдзіне XVII ст. час ад часу існаванне фальваркаў згадваецца каля некаторых вёсак, і згодна з сэнсам крыніц гэты тып паселішчаў не быў вялікай навіной на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства.

Некаторыя назвы сельскіх паселішчаў характарызуюць абставіны і характар іх узнікнення. Так, паселішчы, якія ўзнікалі на толькі што засвоеных землях і насельніцтва якіх часова было вызвалена ад выплаты падаткаў, атрымлівалі назву «слабада». Але для рэгіёна даследавання ўзнікненне паселішчаў з падобнай назвай ў большасці сваёй адносіцца толькі да сярэдзіны XVII – першай паловы XVIII ст.

---

[3] Шаблюк В. У. Сельскія паселішчы Верхняга Панямоння XIV–XVIII стст. – Мінск: Навука і тэхніка, 1996. – С. 20.

[4] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 88. – Арк. 241–241 адв.; Тамсама. – Ф. 1729. – Воп. 1. – Адз. зах. 23. – Арк. 533 адв.; ИЮМ. – Вып. 28. – С. 115.

[5] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 2504.

[6] Мелешко В. И. Из истории аграрных отношений в Восточной Белоруссии в период упадка Речи Посполитой (с середины XVII в. до 1772 г.) // Acta baltiko-slavika. – Białystok, 1967. № 5. – S. 48–99.

Другім тыпам сельскіх паселішчаў XIV–XVIII стст. на Пасожжы з'яўляліся буйныя цэнтры феадальных маёнткаў – двары. Верагодна, яны пачалі ўзнікаць яшчэ у XI–XIII стст., а ў пачатку XV ст. ужо трапілі і на старонкі пісьмовых крыніц. Мяркуючы па пісьмовых крыніцах, двор звычайна складаўся з некалькіх вёсак, «маетнасцей», а часам і воласці, пра што сведчыць, напрыклад, згадванне старца Парадніцкага[7]. Акрамя сваёй гаспадарчай функцыі, тэрмін «двор» адначасова ўжываўся і для вызначэння ўмацаваных сядзіб, умацаваннямі якіх зараз ужо з'яўляліся не столькі фартыфікацыйныя збудаванні, што ўключалі ў свой склад гліняныя валы з драўлянымі ўмацаваннымі на іх, але ў большай ступені выключна драўляныя ўмацаванні. Пра апошняе сведчыць той факт, што значная частка згаданых у крыніцах двароў размяшчаецца ў мясцінах, дзе адсутнічаюць гарадзішчы.

Першыя двары, якія існавалі на тэрыторыі Мсціслаўскага княства, згадваюцца ў запісе зямельных наданняў караля Казіміра. Так, паміж 1440 і 1443 гг. згадваецца двор Людагошч, які быў дадзены «да вялікага князя волі» Грышку Пашковічу[8]. Сярод наданняў караля Казіміра на тэрыторыі Мсціслаўскага княства згадваюцца (праўда, без дакладнай даты) наданні двароў Краснага і Парадніцкага[9]. Апошнія – гэта сучасныя вёскі Краснае і Парадзіна Мсціслаўскага раёна.

Падчас надання вялікім князем Аляксандрам Міхаілу Жаслаўскаму Мсціслаўскага княства ў 1499 г. адначасова з наданнем гарадоў Мсціслава і Мгліна згадваецца і новы тып паселішчаў – перададзеныя яму княскія дварцы «Красное», «Расна», «Добрае», «Людагошъ», «Параднино», «Селище», «Будогошь», «Михайловское» і «Колодязи»[10].

Тэрмін «двор» і «дварэц» хаця і часта выкарыстоўваюцца ў адносінах да аднаго і таго ж паселішча, маюць некалькі розны сэнс. Пад тэрмінам «дварэц» звычайна згадваецца не столькі цэнтр воласці, колькі сядзіба феадала, тое, што на захадзе ВКЛ адносілася ў XV–XVI стст. да паняцця «фальварак»[11].

Феадальныя дварцы звычайна ствараліся ў непасрэднай блізкасці да існуючых сёлаў і, у сваю чаргу, феадальныя дварцы і двары часам станавіліся перадумовай для ўтварэння сёл і мястэчак.

Нягледзячы на тое, што «дварцы» і «двары» ў пісьмовых крыніцах з'яўляюцца толькі ў XV ст. і археалагічныя даследаванні іх тэрыторый пакуль не праводзіліся, абследаванне тэрыторый сучасных аднайменных ім населеных пунктаў пацвярджае, што пачатак фарміравання гэтых двароў адносіцца да значна больш ранняга часу, як гэта было добра бачна падчас даследаванняў вясковага паселішча X–XVI стст. каля г. Чавусы.

---

[7] Леонтович Ф. И. К истории административного строя Литовского государства. I. Сословный тип территориально-административного состава Литовского государства. II. Панский двор Литовского государства. – Варшава : Тип. Варшавского ун-та, 1899. – С. 64.

[8] ДМАМЮ. – Т. 1. – С. 22, № 11.

[9] Тамсама. – С. 23, № 19, 24, № 2.

[10] РИБ. – Т. 27. – С. 783–785.

[11] Леонтович Ф. И. К истории административного строя Литовского государства. – С. 75.

Так, на тэрыторыі сучаснай в. Красная (двор Красны) Мсціслаўскага раёна вядомы рэшткі двух адкрытых паселішчаў, на якіх ёсць матэрыялы XII–XIII стст. Побач, каля в. Усполле вядомы і два курганныя могільнікі. Двор Красны, мяркуючы па пісьмовых крыніцах, у XV–XVI стст. быў не толькі цэнтрам сельскагаспадарчай акругі, але, верагодна, выконваў і функцыі цэнтра княскай паляўнічай гаспадаркі. Ва ўсякім выпадку, яшчэ ў канцы XVI ст. тут згадваецца псарня князёў мсціслаўскіх[12].

Вёска Калодзязі ў пачатку XX ст. яшчэ існавала ў раёне сучаснай в. Татарск Манастыршчынскага раёна Смаленскай вобласці, наваколлі якой багатыя на курганныя могільнікі X–XII стст., што сведчыць пра заселенасць краю і магчымасць існавання ў цэнтры густазаселенай воласці цэнтра падаткаабкладання – феадальнага двара. Ва ўсякім выпадку, каля сучаснай в. Свякроўшчына захавалася селішча, на якім ёсць матэрыялы XI–XVII стст.[13]

На тэрыторыі сучаснай в. Парадзіна (двара Парадніцкага) вядомы рэшткі селішча XII–XVII стст., што сведчыць пра існаванне паселішча ў той час. У наваколлях сучаснай в. Расна (двор Расна) напрыканцы XIX ст. былі два курганныя могільнікі[14], што таксама пацвярджае існаванне тут у XI–XIII стст. паселішча. Акрамя таго, калі прыняць за аснову паданне пра перанос Расны на сучаснае месца з навакольляў в. Вярба[15], то і там яшчэ ў пачатку XX ст. існавалі курганныя могільнікі, а побач размешчана вялікае недаследаванае селішча (плошчай каля 3 га) з сярэдневяковымі матэрыяламі.

Пра даволі ранняе засяленне навакольляў в. Людагошча сведчыць наяўнасць побач з ёю курганных могільнікаў па абодвух берагах Сожа – каля вёсак Сялец, Лабковічы, Халмы і інш. Акрамя таго, даволі вялікі ўмацаваны цэнтр XII–XIII стст. (гарадзішча памерамі 60 × 60 м) вядомы прыкладна ў 2 км на поўнач ад в. Людагошча ў в. Падлужжа. Тут жа ў в. Падлужжа, ўздоўж р. Маластоўка ёсць і сляды селішча з матэрыяламі XII–XIII стст. Пра даволі ранняе заснаванне двара Будагошч сведчыць існуючы тут курганны могільнік.

Двор Добрае (1499 г.) таксама меў пад сабой больш раннюю аснову. Яго фарміраванне пачалося значна раней, бо ў наваколлях в. Добрая, на беразе р. Белая Натапа, вядома гарадзішча XII–XIII стст. і прымыкаючае да яго з паўночнага ўсходу селішча плошчай больш за 1 га. Акрамя таго, згодна са звесткамі Е. Р. Раманава, тут у канцы XIX ст. была вялікая колькасць курганоў[16].

---

[12] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 77. – Арк. 546 адв.–547.

[13] АКР. – 1997. – С. 236.

[14] Копытин В. Ф. Археологические памятники Дрибинского района Могилевской области. – Могилев, 1994. – С. 46.

[15] Метельский А. А. О местонахождении местечка Рясна XV–XVII в. Мстиславского повета // Час, помнікі, людзі. Памяці рэпрасаваных археолагаў. Тэз. дакл. міжнар. канф. Мінск, 27–30 кастрычніка 1993 г. – Мінск, 1993. – С. 82–83.

[16] Невядомая спадчына Еўдакіма Раманава. Матэрыялы да археалагічнай карты Магілёўскай губерніі. Археаграфічны зборнік. Аўтар-складальнік І. А. Марзалюк. – Магілёў: Маг. ун-т, 2001. – С. 21.

У XVI ст. крыніцы згадваюць дварцы і ў шляхецкіх уладаннях. Аднак калі на Панямонні гэты тып паселішча ўзнікаў побач з дваром і ў іх жылі дваравыя людзі[17], то на Пасожжы такая накіраванасць дварцоў не прасочваецца. Наадварот, згодна з пісьмовымі крыніцамі, яны выступаюць як месца жыхарства шляхты і фактычна атаясамліваюцца з паселішчам, якое хаваецца пад тэрмінам «двор». Магчыма, раней існавала нейкая розніца паміж дваром і дварцом у іх эканамічным стане, але па пісьмовых крыніцах яна не прасочваецца.

Так, у 1589 г. «дварец» Добрае быў дадзены ротмістру мсціслаўскага замка Андрэю Длукранеўскаму[18]. Але нельга выключаць, што гэта былы дварэц мсціслаўскіх князёў.

У 1563 г. згадваецца і «дворец Ботьвинъевский у Волчосе» Мікалая Івініцкага. Аднак наяўнасць у Воўчасе курганнага могільніка і слядоў недаследаванага селішча X–XIII стст., а таксама вялікай колькасці курганных могільнікаў у навакольлях сучаснай в. Бацвінаўка[19] і слядоў селішча XII–XIII стст. на тэрыторыі самой вёскі, таксама дазваляе меркаваць пра пачатак фарміравання тут цэнтра феадальнага землеўладання ў даволі ранні перыяд.

Назіранні за распаўсюджваннем тэрміна «дварэц» у XVI ст. у крыніцах паказваюць, што яны згадваюцца толькі ў тых паселішчах, якія выступаюць у якасці цэнтра падаткаабкладання невялікай акругі альбо цэнтра пэўнай маёмасці, і, хутчэй за ўсё, ён характарызуе наяўнасць у населеным пункце панскага дома ці ўмацаванай сядзібы феадала.

На карысць апошняга сведчыць і тое, што ў больш позні час (XVI ст.) дварцы згадваюцца толькі сярод уладанняў шляхты. Так «дварец Корманова», які ў 1546 г. «заставіў» Якім Каспар, існаваў яшчэ ў часы князя Міхаіла Іванавіча мсціслаўскага[20]. У XVIII ст. (1721 г.) згадваецца дварэц у в. Смолькі Сямёна Бруёнка[21].

Характэрнай прыкметай сельскага краявіду, безумоўна, з'яўляліся корчмы. Вызначыць час іх з'яўлення на тэрыторыі вёсак Мсціслаўскага княства і ваяводства даволі складана з-за адсутнасці крыніц. Корчмы, размешчаныя ў Мсціславе і Крычаве, згадваюцца на мяжы XV – пачатку XVI ст.

У гэты ж час пачынае трапляцца інфармацыя пра існаванне корчмаў і ў сельскай мясцовасці. Так, у 1560 г. берасцейскі жыд Ен Шломіч за штогадовую выплату па «500 коп грошей лічбы літоўскай» на 3 гады арандаваў корчмы мсціслаўскія, радамлянскія, расенскія і краснасельскія[22] – апошнія размяшчаліся ў вёсках Расна і Краснае. У 1589 г. Ен Шломіч і іншыя берасцейскія жыды арандавалі тыя ж самыя корчмы, але ўжо на 2 гады за 740 коп грошай.

---

[17] Шаблюк В. У. Сельскія паселішчы Верхняга Панямоння XIV–XVIII стст. – С. 19.

[18] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 76. – Арк. 65.

[19] Копытин В. Ф. Археологические памятники Кричевского района. – С. 60–62.

[20] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 234. – Арк. 179.

[21] Тамсама. – Адз. зах. 41. – Арк. 333; Тамсама. – Адз. зах. 266. – Арк. 343–343 адв.; Тамсама. – Ф. 1729. – Воп. 1. – Адз. зах. 23. – Арк. 478.

[22] Тамсама. – Адз. зах. 37. – Арк. 436 адв.–437 адз.

Крыніцы паведамляюць, што гэтыя корчмы былі мядовыя, піўныя і гарэлачныя[23]. У сярэдзіне XVII ст. згадваецца карчма і ў в. Беразетня[24], якая з'яўлялася буйной гаспадарчай адзінкай Мсціслаўскага староства. Безумоўна, корчмаў, размешчаных у вёсках, было значна больш, і, верагодна, яны існавалі ва ўсіх буйных населеных пунктах Мсціслаўскага ваяводства. Пра гэта сведчыць згадванне сельскіх корчмаў у буйных вёсках суседняга Магілёўскага староства.

Крыніцы не захавалі апісанняў корчмаў Мсціслаўскага ваяводства XVI–XVII стст. Агульны выгляд корчмаў можна знайсці толькі ў падарожных апісаннях замежнікаў. Згодна з іх паведамленнямі, у адрозненне ад заходнееўрапейскіх заезных дамоў, у заходніх раёнах Рэчы Паспалітай корчмы ўяўлялі сабой звычайны драўляны будынак, у адным крыле якога месцілася некалькі раздзеленых калідорам пакояў з печамі; калідор вёў у памяшканне, што знаходзілася ў другой палове будынка, – там была стайня, якая ўзімку служыла хлявом і для іншай свойскай жывёлы, і стаялі вазы[25]. Верагодна, і на ўсходзе Рэчы Паспалітай стан корчмаў быў не лепшым, пацвярджанне чаму мы знаходзім і ў шматлікай мемуарнай літаратуры XVI–XVIII стст.[26]

Значна больш захавалася інфармацыі пра корчмы Мсціслаўскага ваяводства XVIII ст., і крыніцы сведчаць пра тое, што іх колькасць увесь час павялічвалася. Так, калі ў інвентары Крычаўскага староства 1682 г. згадваецца толькі 4 карчмы ў вёсках, то ў 1709 г. корчмы згадваюцца ўжо ў 7 вёсках[27], у 1714 г. – у 10, у 1720 г. – у 16, у 1723 г. – у 15[28]. Значна павялічылася колькасць корчмаў у сярэдзіне XVIII ст. Так, у інвентары Крычаўскага староства 1747 г. іх было ўжо больш за 50. У некаторых вёсках (Барысавічы) іх было нават дзве. Акрамя корчмаў у вёсках таксама згадваюцца і «ізбы шынковыя»[29].

Інвентар Кадзінскай воласці 1727 г. называе корчмы ў 5 вёсках: Бахоце, Ст. Кадзіне, Веразубах, Першыне і Гарадцы[30].

Корчмы былі рознага тыпу. Гэта былі як простыя хаты з сенцамі і жылымі памяшканнямі – карчма «не ўязная», так і больш складаныя комплексы, якія ўключалі ў свой склад не толькі «ўязную карчму» (вёскі Камаровічы, Зуі, Гразівец, Барысавічы, Дамамерычы, Мілаславічы, Сілічы, Юравічы), куды можна было заехаць на возе, але і стайню, асобную пякарню, свірны, абозню, піўніцу, пуню, абору, лядоўню. Даволі часта пры корчмах існавалі бровары[31]. У ад-

[23] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 253. – Арк. 12 адв.

[24] Тамсама. – Адз. зах. 130. – Арк. 358–359.

[25] Камунтавічус Р. Падарожжы па Літве ў XVI–XVII ст.; досвед італьянцаў і французаў // Беларус. гіст. агляд. – 2003. – Т. 10, сшытак 18–19. – С. 64.

[26] Грыцкевіч В., Мальдзіс А. Шляхі вялі праз Беларусь: Нарыс. – Мінск: Маст. літ., 1980. – 272 с.

[27] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1926. – Арк. 5; Тамсама. – Адз. зах. 1929. – Арк. 43.

[28] Тамсама. – Адз. зах. 1930. – Арк. 67; Тамсама. – Адз. зах. 1931/2. – Арк. 22; Тамсама. – Адз. зах. 1933/2. – Арк. 63.

[29] Тамсама. – Адз. зах. 1936. – Арк. 70–221.

[30] Львоўская навуковая бібліятэка ім. В. Стэфаніка НАН Украіны. Аддзел рукапісаў. Інвентар маёнтка Кадзін 1729 г. // Ф. 5. – Адз. зах. 5163/П. – Арк. 26–28.

[31] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1936. – Арк. 83, 86–87, 109, 111, 113 і інш.

розненне ад больш ранніх корчмаў у XVIII ст. корчмы ўяўлялі з сябе будынак, падзелены на некалькі жылых памяшканняў з кафлянымі печамі, шклянымі вокнамі і неабходнай для нармальнага адпачынку мэбляю[32].

Мяркуючы па некаторых інвентарах, корчмы звычайна размяшчаліся на ўскрайку вёскі, побач з млынам[33]. Падобная карціна ў размяшчэнні корчмаў назіраецца і ў заходніх раёнах ВКЛ[34]. Калі крыніцы XVI–XVII стст. згадваюць выключна корчмы, размешчаныя ў дзяржаўных уладаннях, то крыніцы XVIII ст. даволі часта згадваюць і корчмы, якія існавалі ў прыватных уладаннях[35]. Не адставала ад шляхты і духавенства: у канцы XVIII ст. фактычна каля кожнага базыльянскага кляштара быў фальварак, неад'емным элементам якога з'яўлялася карчма.

5.2. Дынаміка асваення сельскіх абшараў у XIV–XVIII стст.

Калі падчас вывучэння сістэмы сельскага рассялення X–XIII стст. мы абапіраліся выключна на нешматлікія пакуль археалагічныя крыніцы, то вывучэнне працэсаў дынамікі асваення тэрыторыі Мсціслаўскага княства і ваяводства XIV–XVIII стст. абапіраецца на даволі значны корпус пісьмовых крыніц.

У спецыфіцы размяшчэння кожнага сельскага паселішча вылучаюцца два іерархічныя ўзроўні наяўнасці гаспадарчых зон, у якіх вядзецца гаспадарка паселішча. Першы з іх лічыцца асноўнай гаспадарчай зонай, альбо тэрыторыяй, прыгоднай для вядзення ворыўнага земляробства. Яе памеры звычайна абмежаваны натуральна-прыродным фактарам: якасцю глебы, лясамі, балотамі і г. д.

Прыродны ландшафт у гэтай зоне ў пэўнай ступені, падвяргаўся зменам – натуральнае асяроддзе ператваралася ў аграцэнозы (апрацаваныя палі, агароды і г. д.). Паколькі плошча апрацаваных зямель была невялікай, блізкае навакольле пасялішча ўяўляла сабой мазаіку ператвораных і практычна натуральных ландшафтаў[36].

Улічваючы даволі шчыльнае размяшчэнне помнікаў XII–XIII стст. уздоўж рэк і рэчак, калі яны ідуць амаль суцэльным патокам праз некалькі соцень метраў, можна меркаваць, што асноўная гаспадарчая зона паселішчаў была даволі малой, цягнулася ўздоўж рэк і толькі нязначна заходзіла ў глыб тэрыторыі.

Патрэба ў зямлі сярэдняга сялянскага двара ў XIII–XIV стст. адпавядала прыкладна 15 дзесяцінам у трох палях[37] і магла задавальняцца цалкам. Вакол

---

[32] Львоўская навуковая бібліятэка ім. В. Стэфаніка НАН Украіны. Аддзел рукапісаў. Інвентар маёнтка Кадзін 1729 г. // Ф. 5. – Адз. зах. 5163/П. – Арк. 26–28.

[33] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1936. – Арк. 116, 182, 183, 188–190 і інш.

[34] Шаблюк В. У. Сельскія паселішчы Верхняга Панямоння. – С. 21.

[35] АВК. – Т. 35. – С. 64, 249, 516, 523.

[36] Владимиров В. В. Расселение и окружающая среда. – М.: Стройиздат, 1982. – С. 25.

[37] Чернов С. З. Археологические данные о внутренней колонизации Московского княжества XIII–XIV вв. и происхождение волостной общины // СА. – 1991. – № 1. – С. 126.

невялікіх селішчаў было дастаткова месца для функцыянавання такой колькасці палёў, якія апрацоўваліся.

Натуральны прырост насельніцтва з яго пастаяннай патрэбай у новых землях абумоўліваў вырубку лясных масіваў і засваенне новых зямель. У размяшчэнні паселішчаў на берагах рэчак бачыцца не толькі імкненне мець выхад да вады, але і да лясных масіваў, да поймы і лугоў.

Другі ўзровень – так званая рэсурсная зона, абумоўліваецца патрэбай вядзення вартаснай гаспадаркі. Гэта тэрыторыя, з якой звязаны ўвесь спектр гаспадарчай дзейнасці чалавека, які дапаўняе земляробства: жывёлагадоўля, паляванне, рыбалоўства, бортніцтва, лясныя промыслы і г. д. Для насельніцтва асобнага мікрарэгіёна яе радыус вызначаецца ў 4–8 км. Даследаванні сельскіх паселішчаў на Чарнігаўшчыне паказалі, што кожнае гняздо помнікаў з гарадзішчам у цэнтры або сялом-пагостам займала плошчу ў радыусе 5–8 км. Колькасць паселішчаў і людзей на кожнай храналагічнай фазе рэгулявалася магчымасцю забяспечыць харчаваннем насельніцтва і атрымаць дадатковы прадукт. Для Маскоўскай зямлі плошча мікрарэгіёна, які складаўся з абшчыннага цэнтра (буйное селішча або гарадзішча), селішчаў і курганных могільнікаў, вызначаеца ад 20–30 да 85 кв. км[38], для Украінскага Прыкарпацця і Чарнігаўшчыны – 70–80 кв. км[39].

Унутранняя каланізацыя, якая ахапіла землі Пасожжа ў XIII–XV стст., да сённяшняга часу не даследавана ні гісторыкамі, ні археолагамі. Падобная сітуацыя абумоўлена як станам пісьмовых крыніц, якія не асвятляюць пачатковыя этапы каланізацыйнага працэсу, так і тым, што археалагічныя даследаванні помнікаў гэтага часу не праводзіліся.

Нягледзячы на недастатковасць пісьмовых крыніц XIV–XVI стст., яны ўсё ж такі дазваляюць прасачыць працэс узнікнення паселішчаў на тэрыторыі Мсціслаўскага княства і ваяводства ў розныя стагоддзі і зрабіць спробу рэканструкцыі дынамікі асваення іх тэрыторый.

У гісторыі Мсціслаўскага княства XIV–XV стст. былі часам адносна спакойнага развіцця, калі гэтыя землі не ведалі буйных ваенных падзей, якія б значна паўплывалі на дынаміку асваення рэгіёна. Калі для X–XIII стст. на паўднёва-заходніх землях Смаленскага княства налічваецца каля 615 археалагічных комплексаў, якія можна атаясамліваць з асобнымі паселішчамі, то і ў XIV–XV стст. іх павінна было быць не менш.

На тэрыторыі ж, якая ўваходзіла ў склад Мсціслаўскага княства XII–XIV стст., налічваецца 256 археалагічных комплексаў, якія адпавядаюць асобным паселішчам. Аднак пісьмовыя крыніцы XV ст. паведамляюць нам пра існаванне на тэрыторыі Мсціслаўскага княства 125 паселішчаў, з якіх зараз лакалізуецца 101 (мал. 43). Такім чынам, на сённяшні дзень колькасць паселішчаў

---

[38] Юшко А. А. Московская земля IX–XV вв. – М.: Наука, 1991. – С. 33–35, 46.

[39] Тимощук Б. А. Восточнославянская община VI—X вв. н.э. = The community among the eastern slavs. – М.: Наука, 1990. – С. 5, 63; Шекун О. В., Веремейчик Е. М. Давньоруське поселення Лискове. – Чернігів: Северяньска думка, 1999. – С. 79.



● – вёска; ■ – горад

Мал. 43. Населеныя пункты Мсціслаўскага княства XV ст.: *1* – Ажогі; *2* – Алексінскае; *3* – Ануфрыева; *4* – Арлоўка; *5* – Бабынкі; *6* – Баранаўка; *7* – Басценавічы; *8* – Бацвінаўка; *9* – Бачэнкі; *10* – Беразуйкі; *11* – Бяскоўка; *12* – Будагошч; *13* – Бязводзічы; *14* – Бялішчына; *15* – Валоўнікі; *16* – Вароніна; *17* – Воўчас; *18* – Галкавічы; *19* – Галоўчын (Сялец); *20* – Гарадок; *21* – Глупікі (Мірная); *22* – Данілаўка; *23* – Дарлівае; *24* – Добрае; *25* – Добрынскае; *26* – Дубасна; *27* – Дуброўка; *28* – Забычанне; *29* – Залесавічы; *30* – Заньковічы; *31* – Зуі; *32* – Зяціца; *33* – Іванаўка; *34* – Каўшова; *35* – Какотава; *36* – Калеснікі; *37* – Калодзезі; *38* – Камаровічы; *39* – Касмынічы; *40* – Князішчава; *41* – Колтава; *42* – Краснавічы; *43* – Краснае; *44* – Крутая; *45* – Халхла (Крутая); *46* – Крываносава; *47* – Крычаў; *48* – Кудрычы; *49* – Куроўшчына; *50* – Куровіцкая Слабада; *51* – Лопазна; *52* – Лыза; *53* – Людагошч; *54* – Міхайлаўскае; *55* – Мазалава; *56* – Мглін; *57* – Мсціслаў; *58* – Мышкавічы; *59* – Новае Сяло; *60* – Пірагова; *61* – Пажога; *62* – Парадзіна; *63* – Пацолтава; *64* – Папялёўка; *65* – Пескавічы; *66* – Пнеўшчына; *67* – Пузырова; *68* – Пустынкі; *69* – Пясчанка; *70* – Пясчынікі; *71* – Пяськевічы; *72* – Пятровічы; *73* – Пячковічы; *74* – Радамля; *75* – Рай; *76* – Рамяство; *77* – Расна; *78* – Рожава; *79* – Сапрынавічы; *102* – Свяцілавічы; *80* – Селішча; *81* – Слаўновічы; *103* – Слабада (Зарэчча); *82* – Сохань; *83* – Ст. Разанцы; *84* – Старае Сяло; *85* – Ст. Віхраны; *86* – Сутокі; *87* – Сялец; *88* – Тупічына; *89* – Тухля; *90* – Хіславічы; *91* – Хачымча; *92* – Хвастова; *93* – Ходасы; *94* – Ціманава; *95* – Цімошкі; *96* – Цімошкава; *97* – Цяцерынскае (Сялец); *98* – Чапляеўка; *99* – Рылаўшчына (Чырвоная Гара); *100* – Шамаўшчызна; *101* – Шумянічы

XI–XIII стст. і XIV–XV стст. суадносіцца як 2,01:1, а вядомых і лакалізуемых – як 1,26:1.

Значная колькасць паселішчаў, якія згадваюцца ў крыніцах XV ст., маюць побач з сабою курганныя могільнікі, што сведчыць пра іх няспыннае існаванне пачынаючы з XI–XIII стст. Асабліва яскрава гэта праяўляецца сярод тых паселішчаў, якія ў XV–XVIII стст. выступаюць у якасці адміністрацыйных цэнтраў валасцей.

Так, побач з в. Н. Заселле Шумяцкага раёна, якая ў пачатку XVI ст. згадваецца як цэнтр асобнай воласці Мсціслаўскага княства, існуе цэлы комплекс археалагічных помнікаў: рэшткі гарадзішча з матэрыяламі XI–XIII стст., два неўмацаваныя паселішчы XI–XV стст. і курганныя могільнікі. Помнікі археалогіі XI–XIII стст. існуюць побач з вёскамі Ушакі, Дамамерычы, Лобжа, Міласлявічы, Бярозкі, якія ў розныя часы былі цэнтрамі войтаўстваў Крычаўскага староства. Ды і як адзначалася вышэй, звычайна побач з княскім дваром ці шляхецкім дварцом XVI–XVI стст. знаходзяцца археалагічныя помнікі XI–XIII стст., што дазваляе сцвярджаць пра няспыннасць існавання паселішча з XI па XVI ст.

Аднак з самага пачатку XVI ст. тэрыторыя Мсціслаўскага княства апынулася на неспакойным памежжы з Маскоўскім княствам, і на працягу першай паловы гэтага стагоддзя яго землі былі на вастрыі ўдараў маскоўскіх войскаў.

Вынікам гэтага стала знішчэнне сёлаў і скарачэнне колькасці насельніцтва, што знайшло свае адлюстраванне ў пісьмовых крыніцах. Калі ў першай палове XVI ст. мы сустракаем яшчэ 57 (46 лакалізуюцца) новых тапонімаў (дадаткова да 125, вядомых у XV ст.) на тэрыторыі Мсціслаўскага княства, то зараз з іх 22 (10 лакалізуюцца) адносяцца да катэгорыі «пустаўшчын», «зямель пустаўскіх» ці селішчаў пустых – пакінутых паселішчаў ці зямель, што не апрацоўваюцца. Усё гэта прыводзіла да скарачэння колькасці насельніцтва і абязлюдзення краю.

Пра цяжкі стан зямель княства ў гэты час сведчаць і пісьмовыя крыніцы. Так, у 1524 г. жыхары крычаўскай воласці скардзіліся вялікаму князю на вялікія падаткі і прасілі іх знізіць, апялюючы тым, што «большая де половица тое волости нашое крычовъское отошло в сторону моско(вс)кую и к тому з Божъего допущения поветрие великое в набыло. На ко(л)ко де тисячъ ихъ померло»[40].

Гэты зварот пра цяжкі стан крычаўскай воласці знаходзіць і іншыя дакументальныя пацверджанні. Так, у лісце да крычаўскага дзяржаўцы князя В. С. Жылінскага (1523 г.) пра наданне Васілю Кіпрыянавічу 3 селішчаў кунічных у воласці Крычава – Арэшкава, Ачукава і Бабісава – падкрэсліваецца, што гэтыя селішчы ўжо 23 гады стаяць пустыя. Агульнае запусценне ў першай чвэрці XVI ст. на землях былога Мсціслаўскага княства было настолькі істотным, што нават селішчы каля самога Крычава стаялі пустымі[41].

---

[40] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 14. – Арк. 251 адв.–252.

[41] Тамсама. – Адз. зах. 12. – Арк. 229 адв.–230 адв.

Ды і сярод зямельных наданняў на манастыры і храмы мсціслаўскага князя Міхаіла Іванавіча ў першай чвэрці XVI ст. выразна прасочваецца тэндэнцыя надання «пустаўшчын» – зямель закінутых, а не заселеных вёсак, што таксама падкрэслівае факт спустошанасці рэгіёна. Так, у 1509 і 1529 гг. мсціслаўскаму Спаскаму храму былі падараваны «пустошина села Никоновского, неподалёку монастыря Пустынского» і «пустошину Климовскую в Хославичех». Ануфрыеўскаму манастыру ў 1515 г. быў падараваны закінуты рыбалоўны ўчастак «язъ пустовский на Холтюковским на Сожы»[42].

Новае спусташэнне воласці Крычава адбылося ў пачатку 30-х гадоў XVI ст. Так, у 1531 г. у лісце да вялікага князя Жыгімонта гаворыцца, што: «Приходили к Кричеву несколько тысяч московских войск вместе с предателем Иваном Ботвином… той волости нашой и инъшымъ шкоды великие поделали»[43].

Падобная карціна назіралася і ў суседніх валасцях. Так, у выніку маскоўскага пагрому воласці Мсціслава 1535 г. значная частка яе жыхароў разышлася, і таму вялікі князь быў вымушаны вызваліць яе на 3 гады ад выплаты падаткаў у скарб[44].

У цэлым першая палова XVI ст. была часам неаднаразовых спустошванняў рэгіёна і скарачэння колькасці яго насельніцтва. Акрамя пісьмовых крыніц пра гэта добра сведчаць знаходкі грашова-рэчавых скарбаў таго часу.

Скарб з малодшымі манетамі 60-х гадоў XVI ст. знойдзены ў самім Мсціславе. У Крычаве знойдзены тры грашовыя скарбы першай паловы XVI ст. Акрамя таго, скарбы XVI ст. у межах Мсціслаўскага ваяводства і прылеглых да яго раёнаў знойдзены ў г. Горкі, у вёсках Шышова Горацкага раёна, Дамамерічы Клімавіцкага раёна, Бярозкі Касцюковіцкага раёна, Кокатава, Пячкавічы Мсціслаўскага раёна, Зімніца і Ржаўка Слаўгарадскага раёна, Удога і Вохар Чэрыкаўскага раёна[45]. Усе яны сведчаць пра катаклізмы, што адбываліся на цікавай для нас тэрыторыі, якія гаспадары скарбаў не перажылі, і пра існаванне ўжо ў гэты час паселішчаў, у наваколлях якіх былі знойдзены скарбы.

Вынікам гэтых падзей стаў заняпад Мсціслава і яго воласці, што пацвярджае прывілей вялікага князя Жыгімонта Аўгуста 1567 г., які вызваляў жыхароў Мсціслава і яго воласці ад выплаты паборaў з тавараў па ўсім ВКЛ на 3 гады. У наступным 1568 г. і жыхары Крычава былі вызвалены на год ад выплаты падаткаў з-за цяжкага стану воласці[46].

Тым не менш, нягледзячы на ваенныя пагромы, паступова працягвалася далейшае асваенне тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства. Асноўным шляхам

---

[42] АЗР. – Т. 2. – С. 119, 128.

[43] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 15. – Арк. 126 адв.–127.

[44] Тамсама. – Адз. зах. 19. – Арк. 116–116 адв.

[45] Рябцевич В. Денежные депозиты XIV–XVI вв. на территории Могилевской области // Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць. Зб. навук. прац удзельнікаў Трэцяй Міжнар. навук. канф. «Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць». 22–23 мая 2003 г.: у 2 ч. – Магілёў: Маг. дзярж. ун-т харчавання, 2003. – Ч. 1. – С. 14–18.

[46] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 267. – Арк. 192, 220–220 адв.

асваення новых тэрыторый была арганізацыя слабод на землях вёсак, якія ўжо існавалі. Так, у інвентары Крычаўскага староства згадваецца слабада Палуж на землях в. Ушакі, а ў 1598 г. Павел Копць атрымаў прывілей з дазволам на арганізацыю слабод на землях сяла Беразетня Мсціслаўскага ваяводства[47].

Пісьмовыя крыніцы не дазваляюць нам падлічыць колькасць насельніцтва ў Мсціслаўскім ваяводстве ў XVI ст. Аднак па асобных яго састаўных частках гэта зрабіць магчыма. Упершыню пэўную пісьмовую інфармацыю пра колькасць жыхароў Крычава і яго староства мы атрымліваем з «Агранічэння Крычаўскай воласці», складзенага ў 1560 г., калі ў воласці праводзілася аграрная рэформа[48].

Згодна з гэтай крыніцай, у самім Крычаве на той час было толькі 20 старасцінскіх службаў. Улічваючы, што ў XVI ст. адна служба ў сярэднім складала 2–3 дымы, то старасцінскіх дымоў ў горадзе было 40–60. Аднак нам невядома колькасць дымоў вольных жыхароў, месцічаў, якія жылі на шляхецкіх і духоўных юрыдыках.

У 43 старасцінскіх вёсках у 1560 г. у Крычаўскай воласці налічвалася 614,5 службаў, ці, калі прыняць сярэднюю колькасць дымоў у службе за 2,5, каля 1536 дымоў. Калі прыняць сярэднюю колькасць насельніцтва аднаго дыма за 6,5 чалавек, то мы атрымліваем, што ў Крычаўскім старостве на той час пражывала прыкладна 8–9 тыс. чалавек.

У цэлым у канцы XVI ст. на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства лакалізуюцца 227 населеныя пункты, якія згадваюцца ў крыніцах XV–XVI стст. Акрамя таго, некалькі дзясяткаў тапонімаў, што згадваюцца на гэты час, не лакалізуюцца. Таму рэальна колькасць населеных пунктаў, якія існавалі ў гэты час, была не меней за 250, і ў параўнанні з вядомымі населенымі пунктамі XV ст. іх колькасць павялічылася ў два разы (мал. 44).

Дакладная колькасць дымоў у лакалізуемых населеных пунктах невядома. Можна зрабіць іх падлік толькі гіпатэтычна, абапіраючыся на аналогіі з Крычаўскім староствам. Калі там сярэдняя колькасць дымоў у вёсцы раўнялася 35, то можна меркаваць, што і на астатняй тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства яна была не меншай. Таму агульная колькасць дымоў ў Мсціслаўскім ваяводства была не менш за 8000–8700, а агульная колькасць жыхароў магла дасягаць 50 000–57 000 чалавек.

Картаграфаванне лакалізуемых сёння населеных пунктаў Мсціслаўскага княства і ваяводства XV–XVI стст. паказвае, што большасць з іх існавала на правабярэжжы Сожа ў наваколлях Мсціслава і Крычава. Тут размяшчаецца асноўная колькасць населеных пунктаў і тут, адпаведна, рэсурсная зона першапачатковых паселішчаў пачала значна раней скарачацца за кошт таго, што на ёй ўзнікалі новыя паселішчы, якія цягнуліся пад ахову бліжэйшых крэпасцей.

---

[47] НГАБ. – Ф. 694. – Воп. 4. – Адз. зах. 1155. – Арк. 68 ; Тамсама. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 83. – Арк. 333 адв.

[48] Тамсама. – Адз. зах. 155. – Арк. 68–69 адв.



☎ – горад; ● – вёска; — — — — — граніца Мсціслаўскага ваяводства; ▪▪▪▪▪▪▪▪▪▪▪ – дзяржаўная граніца

Мал. 44. Населеныя пункты Мсціслаўскага ваяводства XVI ст.: *1* – Ажогі; *2* – Алексінскае; *3* – Андраны; *4* – Андрэеўскі хутар; *5* – Ануфрыева; *6* – Арлоўка; *7* – Аслянка; *8* – Асмолавічы; *9* – Асмолава; *10* – Бабічоўка; *11* – Баброва; *12* – Бабынкі; *13* – Балотнае; *14* – Баравая; *15* – Баранаўка; *16* – Барысаўка; *17* – Барысавічы; *18* – Басценавічы; *19* – Батаева; *20* – Баханы; *21* – Бацвінаўка; *22* – Бачэнкі; *23* – Бель; *24* – Беразуйкі; *25* – Бяскоўка; *26* – Блудзімля; *27* – Бра-

цьковічы; *28* – Будагошч; *29* – Быковічі; *30* – Бязводзічы; *31* – Бялішчына; *32* – Бялынкавічы; *33* – Бярозкі; *34* – Беразетня; *35* – В. Лешчынка; *36* – Валоўнікі; *37* – Валымер; *38* – Варанёва; *39* – Варнавіна; *40* – Вароніна; *41* – Вепрын; *42* – Верхаўцы; *43* – Відуйцы; *44* – Воўчас; *45* – Вохар; *46* – Вушакі; *47* – Вярба; *48* – Галічы; *49* – Галавічы; *50* – Галковічы; *51* – Галоўчын; *52* – Гарадок; *53* – Гарбавічы; *54* – Глупікі (Мірная); *55* – Глушкава; *56* – Глушнева; *57* – Горлава; *58* – Гулькі; *59* – Даўгавічы; *60* – Дамамерычы; *61* – Данілаўка; *62* – Дарлівае; *63* – Дзеснакіта; *64* – Дзедзін Ст.; *65* – Дзягавічы; *66* – Добрае; *67* – Добрынскае; *68* – Дражджынічы; *69* – Дрыбін; *70* – Дубасна; *71* – Дуброўка; *72* – Дудзіна; *73* – Дудчычы; *74* – Ельня; *75* – Жадунька; *76* – Жаліўе; *77* – Жалязняк; *78* – Жарэціна; *79* – Жукава; *80* – Забычанне; *81* – Залесавічы; *82* – Залессе; *83* – Заньковічы; *84* – Заполле; *85* – Зарубец; *86* – Заселле; *87* – Зацішша; *88* – Зуі; *89* – Зубаўка; *90* – Зяціца; *91* – Іванаўка; *92* – Каўшова; *93* – Кавечын; *94* – Кавычыцы; *95* – Кадзіна; *96* – Кокатава; *97* – Калатовіна; *98* – Калеснікі; *99* – Калодзезі; *100* – Камаровічы; *101* – Камаровічы; *102* – Канічы; *103* – Канюхова; *104* – Караблёва; *105* – Касмынічы; *106* – Касцюковічы; *107* – Касцюшкавічы; *108* – Кашаны; *109* – Клімавічы; *110* – Клеявічы 1-я; *111* – Князішчава; 112 – Князева; *113* – Колтава; *114* – Красавічы; *115* – Краснае; *116* – Красная Слабада; *117* – Крутая; *118* – Крутая (Халхла); *119* – Крываносава; *120* – Крывая Ніва; *121* – Крычаў; *122* – Кудрычы; *123* – Курбакі; *124* – Курманава; *125* – Куроўшчына; *126* – Куровіцкая Слабада; *127* – Лабкавічы; *128* – Лапатавічы; *129* – Лапаціна; *130* – Лар'янава; *131* – Лешня; *132* – Лобжа; *133* – Лыза; *134* – Лыжкі; *135* – Людагошч; *136* – Лютня; *137* – Міхайлаўскае; *138* – Мазалава; *139* – Макевічы; *140* – Малееўка; *141* – Маляцічы; *142* – Мануйлы; *143* – Мікшына; *144* – Міласлаўічы; *145* – Мілейкава; *146* – Міхайлаўскае; *147* – Міхеевічы; *148* – Міцькаўшчына; *149* – Мішні; *150* – Мокрая; *151* – Мсціслаў; *152* – Мышкавічы; *153* – Надзейкавічы; *154* – Несцерава; *155* – Ніканаўскае; *156* – Новае Сяло; *157* – Паўлавічы; *158* – Падзерня; *159* – Пажога; *160* – Паланіца; *161* – Палон; *162* – Палуж-2; *163* – Парадзіна; *164* – Паташня; *165* – Пацкава; *166* – Пацолтава; *167* – Пепелеўка; *168* – Пескавічы; *169* – Пірагова; *170* – Пнеўшчына; *171* – Пузырова; *172* – Пустынкі; *173* – Пуцяціна; *174* – Пясчанка; *175* – Пясчынікі; *176* – Пяськевічы; *177* – Пятровічы; *178* – Пячары; *179* – Пячкоўка; *180* – Пячковічы; *181* – Радамля; *182* – Рай; *183* – Рамяство; *184* – Расна; *185* – Рэчыца; *186* – Рожава; *187* – Рудодзіна; *188* – Русінаўка; *189* – Сакольнічы; *190* – Саматэвічы; *191* – Саматэвічы; *192* – Сапрынавічы; *193* – Свяцілавічы; *194* – Селішча; *195* – Серы Камень; *196* – Сколін; *197* – Слаўновічы; *198* – Слабада; *199* – Сохань; *200* – Ст. Разанцы; *201* – Старае Сяло; *202* – Стараселле; *203* – Стары Стан; *204* – Старыя Віхраны; *205* – Стракайлава; *206* – Стракайлы; *207* – Судзілавічы; *208* – Сутокі; *209* – Сялец; *210* – Сяргеяўка; *211* – Тарасавічы; *212* – Татарск; *213* – Тупічына; *214* – Тухля; *215* – Усполле; *216* – Фількаўшчына; *217* – Халмы; *218* – Хамінка; *219* – Харанёва; *220* – Хатавіжы; *221* – Хацілавічы; *222* – Хацімча; *223* – Хвастова; *224* – Хіславічы; *225* – Ходасы; *226* – Хоцімск; *227* – Царковішча; *228* – Цяцерынскае; *229* – Ціманава; *230* – Цімошкі; *231* – Цімошкава; *232* – Ціхіль; *233* – Цяляткава; *234* – Чапляеўка; *235* – Чарнілава; *236* – Чырвоная Гара; *237* – Шамаўшчызна; *238* – Шамава; *239* – Шарапкі (Шарэйкі); *240* – Шумянічы; *241* – Шумячы; *242* – Шыбнева; *243* – Юрэвічы; *244* – Юшкевічы; *245* – Ярошаўка

Безумоўна, вёскі, якія ўзніклі першымі, мелі вялікую першапачатковую рэсурсную зону, што з цягам часу станавілася тэрыторыяй, на якой ўзнікалі новыя населеныя пункты.

Прыкладам існавання такой вялікай першапачатковай рэсурснай зоны можа быць той факт, што ў XVII ст. «добра» Беразетненскія ўключалі ў свой склад само сяло Беразетня с прылеглымі вёскамі Бель, Несцераў, Бычына, слабодамі Кацельнікі і Атокі[49]. Апошнія, верагодна, у свой час узніклі на землях

[49] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 130. – Арк. 358–359.

в. Беразетня. У складзе сяла Беразетня ў 1581 г. знаходзілася і служба Шамаўскіх – сучасная в. Шамава Мсціслаўскага раёна[50]. Пра вялікую першапачатковую зямельную тэрыторыю (рэсурсную зону) в. Беразетня нават у пачатку XVII ст. сведчыць тое, што землі сяла Беразетня нават у той час дасягалі рэчышча р. Рамяство, на якой знаходзіліся беразетненскія службы Лявонаўская і Зелянінаўская[51].

У XV–XVI стст. на р. Рамяство крыніцы згадваюць толькі «дварэц» Карманава (суч. в. Курманава) і вёскі Рамяство і Копцеўка. Улічваючы адлегласць ад іх да бліжэйшых вёсак, што ўключалі ў свой склад «добра Бярэзатнянскія», радыус тэрыторыі першапачатковай рэсурснай зоны в. Беразетня складаў прыкладна 4–5 км.

Другім прыкладам паступовага скарачэння тэрыторыі рэсурснай зоны з'яўляюцца ўзаемаадносіны паміж вёскамі Палуж і Ушакі Крычаўскага старостваў. У сярэдзіне XVI ст. слабада Палуж згадваецца разам з в. Ушакі, што дазваляе меркаваць пра тое, што першая ўзнікла на «грунтах» апошняй[52]. Сучасная вёска Палуж знаходзіцца на адлегласці 20–22 км ад в. Ушакі і, адпаведна, рэсурсная зона апошняй, якая цягнулася, верагодна, па правым беразе р. Сянна, была не меншай. На левым жа беразе у вусці р. Сянна знаходзілася прапойскае сяло Абакумавічы са сваімі землямі. У выніку заснавання ў Крычаўскім старостве ў сярэдзіне XVI ст. слабады Палуж рэсурсная і гаспадарчая зона в. Ушакі скараціліся на карысць Палужа.

Назіраючы за размяшчэннем сельскіх паселішчаў XIV–XVI стст. Мсціслаўскага княства і ваяводства выразна прасочваецца тэндэнцыя працягвання заснавання паселішчаў на месцы паселішчаў XI–XIII стст. Большасць з вядомых вёсак XVI стст. існуе на тых жа месцах, дзе размяшчаюцца курганныя могільнікі XI–XIII стст. Адзіная розніца, што прасочваецца ў іх тапаграфіі, гэта паступовы адыход больш позніх паселішчаў ад вады. Матэрыялы XIV–XVI стст. сустракаюцца на большай адлегласці ад вады, што сведчыць пра больш інтэнсіўнае асваенне водападзелаў і паступовы пераход да калодзежнага забеспячэння вадой. Аднак і ў дадзеным выпадку паселішчы ўсё роўна працягвалі існаваць на вялікіх ці малых рэчках.

Наступным храналагічным этапам, які дазваляе прасачыць колькасць населеных пунктаў, дымоў і прыкладную колькасць насельніцтва Мсціслаўскага ваяводства, з'яўляецца вайна 1654–1667 гг. У скаргах шляхты, што захаваліся пасля вайны, згадваюцца загінуўшыя прывілеі, у якіх фігуруюць населеныя пункты, якія існавалі як мінімум з даваенных часоў. Іх дапаўняе падымны тарыф Мсціслаўскага ваяводства 1667 г., які таксама называе населеныя пункты, якія існавалі да вайны. Згодна з гэтымі крыніцамі, на тэрыторыі былога Мсціслаўскага ваяводства перад вайной існавала каля 430 населеных пунктаў, з якіх сёння лакалізуюцца 379. Такім чынам, колькасць вядомых паселішчаў павялічваецца як мінімум на 150 адзінак Усё гэта сведчыць пра далейшае пасту-

[50] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Спр. 67. – Арк. 43–43 адв.

[51] Тамсама. – Воп. 1. – Адз. зах. 88. – Арк. 182–183.

[52] Тамсама. – Ф. 694. – Воп. 4. – Адз. зах. 1155. – Арк. 68–69 адв.

повае асваенне рэгіёна і ў канцы XVI–XVII ст., нягледзячы на падзеі войн першай паловы – сярэдзіны XVII ст.

Згодна з даследаваннямі Е. Можы, у Мсціслаўскім ваяводстве перад вайной было 13 730 дымоў. Калі падзяліць іх колькасць на колькасць вядомых населеных пунтаў, то атрымліваецца, што ў сярэднім на адно паселішча прыпадае каля 30,5 дыма, што нязначна адрозніваецца ад сярэдняй колькасці дымоў у вёсцы ў сярэдзіне XVI ст. А ўсяго ў Мсціслаўскім ваяводстве колькасць жыхароў перад вайной 1654–1667 гг. магла дасягаць 90 000. Такім чынам, за 90 год пасля рэвізіі 1560 г. колькасць жыхароў ў Мсціслаўскім ваяводстве павялічылася прыкладна на 50 %, што, улічваючы яго памежнае размяшчэнне і шматлікія ваенныя канфлікты і войны, было не малым. І тым не менш трэба прызнаць, што памежнае Мсціслаўскае ваяводства было не толькі самым малым па плошчы з ваяводстваў Рэчы Паспалітай, але і самым маланаселеным. Так, напрыклад, перад вайной 1654–1667 гг. на Падоллі і Валыні пражывала каля 400 000 чалавек, у Кіеўскім і Брацлаўскім ваяводствах – больш за 500 000 чалавек.

Пасля вайны 1654–1667 гг. колькасць дымоў у Мсціслаўскім ваяводстве была толькі 4119[53], а колькасць насельніцтва ваяводства, калі зноў прымяніць каэфіцыент 6,5 жыхароў на адзін дым, магла скарацiцца з 90 000 да 27 000 чалавек.

Улічваючы невялікую тэрыторыю Мсціслаўскага ваяводства – 11 505 кв. км, то шчыльнасць насельніцтва пасля вайны тут была ўсяго каля 2,35 чалавекі на 1 кв. км, у той час як на Кіеўшчыне і Чарнігаўшчыне шчыльнасць дасягала 10–12 чалавек на 1 кв. км[54]. Пасля вайны 1654–1667 гг. Мсціслаўскае ваяводства было самым абязлюдзелым ваяводствам Рэчы Паспалітай.

Значна паменшылася і сярэдняя колькасць дымоў у вёсцы. Так, праз 4 гады (1671 г.) пасля заканчэння баявых дзеянняў на тэрыторыі Крычаўскага староства яшчэ 60% гаспадарак стаялі пустымі. Сярэдняя колькасць дымоў у вёсцы складала толькі каля 7–8 на паселішча, хаця былі і вёскі, у якіх было больш за 25 дымоў. Падобная карціна – невялікая колькасць дымоў і адпаведна жыхароў у вёсках пасля вайны – прасочваецца і ў шляхецкіх уладаннях. Так, згодна з інвентаром Жукаўскага староства (1667 г.), якое было ў пацэсіі ў Агінскіх, яго вёскі Жукава, Касмынічы і Жалезнякі налічвалі адпаведна 8, 1 і 4 дымы, ці ў сярэднім каля 4 дымоў на паселішча[55], таму для адраджэння вёсак ім была нададзена слабада ад выплаты падаткаў. Да і падымны тарыф Мсціслаўскага ваяводства 1667 г., пералічваючы ўладанні шляхты, часта удакладняе, што ў таго ці іншага гаспадара застаўся толькі яго дом, а ўся астатняя маёмасць знішчана падчас вайны.

Праз перавод паселішчаў на слабоды адраджаліся не толькі былыя дзяржаўныя ўладанні, але і шляхецкія вёскі. У 1685 г. у наваколлях Мсціслава ся-

---

[53] Morzy J. Kryzus demograficzny na Litwe i w Białorusi. – S. 107, 337.

[54] Компан О. С. Міста України в другій половине XVII ст. – Київ: Від-во АН УРСР. – 1963. – С. 46, 50.

[55] LVIA. – F. 1177. – Ap. 1. – Bib. 4603. – P. 1–3.

род уладанняў пана Шпілеўскага згадваецца в. Вельня, якая была на слабадзе. Слабаджане былі і ў в. Баравая гэтага ж пана. Інвентары пяці іншых вёсак пана Шпілеўскага Шышкова – 22 гаспадары, Бачонкі – 6, Кодрына – 14, Баравец – 7 (усе вёскі Манастыршчынскага р-на Смаленскай вобласці), Чортаў – 5 (суч. в. Рассвет Мсціслаўскага раёна) і нелакалізаванай в. Вельня – 4 гаспадары сведчаць пра іх маланаселенасць. Усяго ў іх налічвалася 58 гаспадароў, ці ў сярэднім каля 9,5 гаспадаркі на кожную вёску[56].

Раны, нанесеныя вайной 1654–1667 гг., загойваліся даволі доўга. Так, яшчэ ў 1693 г. у Крычаўскім старостве з 210,5 валокаў яшчэ стаялі неапрацаванымі 51,3 валокі[57], альбо каля 24% ад агульнай колькасці зямлі. У наступным годзе ў старостве ўжо лічылася 265,7 валокаў зямлі, з якіх не апрацоўвалася 59,3 валокі[58], альбо 22,3%. Як бачым, колькасць зямлі, якая не апрацоўвалася, у старостве паступова скарачалася і адначасова павялічвалася колькасць той, што апрацоўвалася. Усё гэта сведчыць пра паступовае адраджэнне краю, і ў канцы XVII ст. у Крычаўскім старостве пражывала каля 8 тыс. чалавек[59].

Гэты працэс адраджэння Крычаўскага старостваадбываўся, у першую чаргу, дзякуючы пераводу сялян на слабаду. Яны згадваюцца ў кожнай вёсцы старостваПадобным шляхам ішло адраджэнне і шляхецкіх маетнасцей. Акрамя таго, у інвентарах Крычаўскага старостваканца XVII ст. даволі часта згадваюцца «навікі» – прышлыя жыхары ў вёскі, частка з якіх прыйшлі сюды з-за мяжы – з Расіі. Гэты працэс – асяданне на ўсходніх землях Рэчы Паспалітай беглых з Расіі, які толькі пачынае фіксавацца ў пісьмовых крыніцах канца XVII ст., стаў больш магутным у XVIII ст.

Працэс адраджэння краю добра прасочваецца не толькі па аднаўленні старых вёсак, але і па ўзнікненні новых. Гэта стала магчымым, у першую чаргу, дзякуючы заключэнню ў 1686 г. Вечнага міра з Расіяй, у выніку чаго на памежжы дзяржаў стала адносна спакойна. Асабліва добра працэс узнікнення новых паселішчаў прасочваецца на тэрыторыі Крычаўскага старостваПрычым гэты працэс набіраў тэмп на працягу ўсёй першай паловы XVIII ст. і ён распаўсюджваўся па ўсёй памежнай зоне Мсціслаўскага ваяводства, якая раней была найменш заселенай. Усяго на канец XVII ст. на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства існавала каля 450 паселішчаў, з якіх сёння надзейна лакалізуюцца 379 (мал. 45).

Калі ў інвентарах Крычаўскага старостваапошняй трэці XVII ст. адзначаюцца выключна старыя вёскі, якія пачалі адраджацца, то пачынаючы з рубяжа XVII–XVIII стст. згадваюцца новыя населеныя пункты, якія ўзніклі на землях старых, выкарыстоўваючы іх рэсурсную зону. Прычым, улічваючы, што побач з узнікаючымі вёскамі аказваюцца курганныя могільнікі XI–XIII стст.,

---

[56] Бібліятэка ПАН у Кракаве. Dział rękopisów. Signaturza 5825. – Kartka 110–112.

[57] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1927. – Арк. 44.

[58] Тамсама. – Адз. зах. 1928. – Арк. 111.

[59] Мелешко В. И. Положение и классовая борьба крестьян в Кричевском старостве в конце XVII – первой половине XVIII вв. // Acta baltiko-slavika. – Białystok, 1970. – T. VII. – S. 113.



🏛 – горад; ● – вёска; — — — — — граніца Мсціслаўскага ваяводства; ▪▪▪▪▪▪▪▪▪▪▪ – дзяржаўная граніца

Мал. 45. Населеныя пункты Мсціслаўскага ваяводства XVII ст.: *1* – Ажогі; *2* – Алексінскае; *3* – Ананічы; *4* – Андраны; *5* – Андрэевічы; *6* – Ануфрыева; *7* – Арлоўка; *8* – Асінаўка; *9* – Асе-

цішча; *10* – Аслянка; *11* – Асмолавічы; *12* – Асмолава; *13* – Астрэйкавічі; *14* – Бабічоўка; 15 – Баброва; *16* – Бабылічы; *17* – Бабынкі; *18* – Баеўка; *19* – Балабоўшчына Ст.; *20* – Балотнае; *21* – Баравая; *22* – Баранаўка; *23* – Барысаўка; *24* – Барысавічы; *25* – Басценавічы; *26* – Батаева; *27* – Баханы; *28* – Бацвінаўка; *29* – Бачэнкі; *30* – Башары; *31* – Беліца; *32* – Белая Дуброва; *33* – Бель; *34* – Бель; *35* – Беражыстае; *36* – Беразуйкі; *37* – Бескаўка; *38* – Бізюкі (Майская); *39* – Блудзімля; *40* – Бохота; *41* – Брацьковічы; *42* – Будагошч; *43* – Буліна; *44* – Быковічі; *45* – Бязводзічы; *46* – Бялішчына; *47* – Бялынкавічы; *48* – Бярозкі; *49* – Беразетня; *50* – Валоўнікі; *51* – Валымер; *52* – Варадзькова; *53* – Варанёва; *54* – Варнавіна; *55* – Вароніна; *56* – Вельня; *57* – Вепрын; *58* – Веразубы; *59* – Верхаўцы; *60* – Відуйцы; *61* – Віраўня; *62* – Воўчас; *63* – Вохар; *64* – Вусце; *65* – Вушакі; *66* – Высокае; *67* – Вярба; *68* – Галічы; *69* – Галавічы; *70* – Галалобаўка; *71* – Галковічы; *72* – Галоўчын; *73* – Гарадок; *74* – Гарбавічы; *75* – Гарбатка; *76* – Гібалы (Красная Слабада); *77* – Гліная; *78* – Глупікі (Мірная); *79* – Глушкава; *80* – Глушнева; *81* – Горлава; *82* – Граз; *83* – Грозы; *84* – Губіншчына; *85* – Гулькі; *86* – Гута; *87* – Даленшчызна; *88* – Дамамерычы; *89* – Данілаўка; *90* – Дарлівае; *91* – Даўгавічы; *92* – Дзеснакіта; 93 – Дзедзін Ст.; 94 – Дзеткавічы; 95 – Дзягавічы; 96 – Дзямідавічы; 97 – Добрае; 98 – Добрынскае; *99* – Дражджынічы; *100* – Дроздаўка; *101* – Дрыбін; *102* – Дубіец; *103* – Дубасна; *104* – Дубейкава; *105* – Дуброўка; *106* – Дудзіна; *107* – Дудчычы; *108* – Ельня; *109* – Ермакоўка; *110* – Жадунька; *111* – Жаліўе; *112* – Жалязняк; *113* – Жарэціна; *114* – Жукава; *115* – Жыдова (Красная) Буда; *116* – Забалоцце; *117* – Забычанне; *118* – Зайцава слабада; *119* – Залесавічы; *120* – Залессе; *121* – Заньковічы; *122* – Заполле; *123* – Зарубец (Дрышчаў); *124* – Заселле; *125* – Затоны; *126* – Затоны-2; *127* – Заходы; *128* – Зімніца; *129* – Зоры; *130* – Зуі; *131* – Зубаўшчына; *132* – Зяціца; *133* – Іванаўка; *134* – Ірцішчава; *135* – Ісакаўскі; *136* – Кавечын; *137* – Кавычыцы; *138* – Кадзіна; *139* – Кажуховічы; *140* – Казелле; *141* – Казлоўка; *142* – Кокатава; *143* – Калатовіна; *144* – Калеснікі; *145* – Калодзезі; *146* – Калодзеская; *147* – Калясянка; *148* – Камаровічы; *149* – Камаровічы; *150* – Каменка; *151* – Канічы; *152* – Канюхова; *153* – Караблёва; *154* – Каробчына; *155* – Касмынічы; *156* – Касцюковічы; *157* – Касцюшкавічы; *158* – Каськоў; *159* – Каўпіта; *160* – Каўшова; *161* – Кашаны; *162* – Кісловічы; *163* – Клімавічы; *164* – Клін; *165* – Клеявічы-1; *166* – Клюкіна; *167* – Клясінка; *168* – Князішчава; *169* – Князева; *170* – Колтава; *171* – Копцеўка; *172* – Космач; *173* – Кош; *174* – Крапіўна Вялікая; *175* – Красавічы; *176* – Краснае; *177* – Краснаручча; *178* – Крутая; *179* – Круты Бераг; *180* – Крываносава; *181* – Крывая Ніва; *182* – Крычаў; *183* – Ксавераўшчына; *184* – Кудрычы; *185* – Кулікова; *186* – Курбакі; *187* – Курманава; *188* – Куроўшчына; *189* – Куровіцкая Слабада; *190* – Лабанаўка; *191* – Лабкавічы; *192* – Лазовіца; *193* – Лапатавічы; *194* – Лапаціна; *195* – Лар'янава; *196* – Лешня; *197* – Лешчанка Мал.; *198* – Лешчынка Вял.; *199* – Лобжа; *200* – Лужкі; *201* – Луты; *202* – Лыза; *203* – Лызкі; *204* – Лыкінка; *205* – Людагошча; *206* – Лютня; *207* – Ляхавічы; *208* – Мазалава; *209* – Мазыкі; *210* – Макаўё; *211* – Макевічы; *212* – Малашкавічы; *213* – Малееўка; *214* – Маляцічы; *215* – Мануйлы; *216* – Манькаўская; *217* – Мардалысава (Свярдлоў); *218* – Маркаўка; *219* – Мікшына; *220* – Мілаславічы; *221* – Мілейкава; *222* – Мілюты; *223* – Міхайлаўскае; *224* – Міхайлаўскае; *225* – Міхеевічы; *226* – Міцькаўшчына; *227* – Мішні; *228* – Мокрая; *229* – Мсціслаў; *230* – Мурын Бор; *231* – Мышкавічы; *232* – Навасёлкі; *233* – Надзейкавічы; *234* – Несцерава; *235* – Нешкаўка; *236* – Ніканаўскае; *237* – Новае Сяло; *239* – Падзерня; *240* – Падказелле; *241* – Падлужжа; *242* – Пажога; *243* – Пакуціе; *244* – Паланіца; *245* – Палон; *246* – Палуж-2; *247* – Панкі; *248* – Панятоўка; *249* – Папехінка; *250* – Парадзіна; *251* – Пастарнакі; *252* – Паташня; *253* – Паўлавічы; *254* – Паўлавічы; *255* – Пацкава; *256* – Пацолтава; *257* – Пепелеўка; *258* – Пескавічы; *259* – Пірагова; *260* – Пнеўшчына; *261* – Прудок-Палянка; *262* – Прусіна; *263* – Прылепаўка; *264* – Пузырова; *265* – Пустынкі; *266* – Пуцяціна; *267* – Пясчанка; *268* – Пясчынікі; *269* – Пяськевічы; *270* – Пятровічы; *271* – Пячары; *272* – Пячкоўка; *273* – Пячковічы; 274 – Пячэрск; *275* – Радамля; *276* – Рай; *277* – Ракшына; *278* – Рамяство; *279* – Расна; *280* – Робцы; *281* – Рожава; *282* – Роскаў; *283* – Рубанаўка В.; *284* – Рудня; *285* – Рудодзіна; *286* – Русінаўка; *287* – Рыкі; *288* – Рэчыца; *289* – Сакольнічы; *290* – Саматэвічы; *291* – Саматэвічы; *292* – Саполава (Пабеда); *293* – Сапрынавічы; *294* – Свадкавічы; *295* – Свяцілавічы; *296* – Селішча; *297* – Селязёнкі; *298* – Серы Камень; *299* – Скварск; *300* – Скварэта; *301* – Сколін; *302* – Слабада; *303* – Слаўнае;

304 – Слаўновічы; *305* – Сойна; *306* – Сохань; *307* – Ст. Буда; *308* – Ст. Разанцы; *309* – Стабаршчына; *310* – Старае Сяло; *311* – Стараселле; *312* – Стары Стан; *313* – Старыя Віхраны; *314* – Стракайлава; *315* – Стракайлы; *316* – Студзянец; *317* – Судзілавічы; *318* – Сутокі; *319* – Сялец; *320* – Сялюты; *321* – Сяргеяўка; *322* – Тарасавічы; *323* – Татарск; *324* – Теклеўка; *325* – Трыпуціна; *326* – Тупічына; *327* – Туроўка; *328* – Тухля; *329* – Тышча; *330* – Упін; *331* – Усполле; *332* – Фастаў; *333* – Фількаўшчына; *334* – Фядотаўка; *335* – Халмы; *336* – Халоблін; *337* – Халхла (Крутая); *338* – Хамінка; *339* – Харанёва; *340* – Хатовіж; *341* – Хацілавічы; *342* – Хацімча; *343* – Хвастова; *344* – Хіславічы; *345* – Хлышчова; *346* – Ходасы; *347* – Хоцімск; *348* – Хоцімск; *349* – Царковішча; *350* – Царковішча (Пралетарск); *351* – Цімanава; *352* – Цімошкі; *353* – Цімошкава; *354* – Ціхіль; *355* – Цыганаў; *356* – Цяляткава; *357* – Цярені; *358* – Цяцерынскае; *359* – Чапляеўка; *360* – Чарнілава; *361* – Чарнавусы; *362* – Чортава (Рассвет); *363* – Чыжы; *364* – Чырвоная Гара; *365* – Шамаўшчызна; *366* – Шамава; *367* – Шарэйкі; *368* – Шумянічы; *369* – Шумячы; *370* – Шыбнева; *371* – Шыпы; *372* – Шышкова; *373* – Шэйкі; *374* – Юрэвічы; *375* – Юшкевічы; *376* – Якімавічы; *377* – Ярашоўка; *378* – Ястмінава; *379* – Яўкіна

можна сцвярджаць, што нанова асвойваліся небяспечныя ў былыя часы з-за частых войнаў раёны і што падчас выбару месца для нанова заснаванага паселішча ў XVII–XVIII стст. выкарыстоўваліся тыя ж самыя крытэрыі, што і ў XI–XIII стст. Падобная кансерватыўнасць у выбары месца для пасялення ў розныя гістарычныя эпохі характэрна і для іншых рэгіёнаў Беларусі[60].

Так, на землях памежнай в. Баханы, вядомай з сярэдзіны XVI ст., у 1695–1700 гг. была заснавана слабада Хоцімск (правабярэжная частка сучаснага аднайменнага гарадскога пасёлка), у 1712 г. – слабада «Бесовіцкая» (суч. в. Бяседавічы). У 1714 г. на «грунце» Боханскім было заснавана і мястэчка Радзівілаў[61].

І ў больш познія часы на землях в. Баханы працягвалі «асаджаць» новыя населеныя пункты. Так, у 1725–1726 гг. тут былі заснаваны вёскі Узлогі і Ліпаўка і слабада Горня[62]. Фактычна побач з кожным з гэтых населеных пунктаў, якія ўзніклі ў XVIII ст., да сённяшніх дзён захаваліся курганныя могільнікі XI–XIII стст., што сведчыць пра існаванне тут паселішчаў у гэты час. Улічваючы размяшчэнне згаданых вёсак, першапачатковая рэсурсная зона в. Баханы распаўсюджвалася прыкладна на 25 км на ўсход ад цэнтральнай сядзібы. Улічваючы незаселенасць памежных тэрыторый ў XVI–XVII стст., рэсурсная тэрыторыя в. Баханы магла дасягаць каля 75 кв. км.

Падобная ж вялікая рэсурсная зона была і на іншых памежных вёсках. Так, «на грунце» Галіцкім (в. Галічы Клімавіцкага р-на) у першай палове XVIII ст. засноўваецца Фядотава слабада – сучасная в. Фядотава Буда[63]. Тады ж на «грунце Галіцкім» былі заснаваны вёскі Сабалёўка (1719 г.), Дудараўка, Сакалоўка (1723 г.), Шчамялёўка (1724 г.)[64]. І тут побач з некаторымі вёскамі

[60] Археалогія Беларусі. – Т. 4. Помнікі XIV–XVIII стст. – С. 87.

[61] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1929. – Арк. 22; Тамсама. – Адз. зах. 1931/2. – Арк. 44–47.

[62] Тамсама. – Адз. зах. 1932. – Арк. 79–81; Тамсама. – Адз. зах. 1933/2. – Арк. 63.

[63] Тамсама. – Адз. зах. 1931/2. – Арк. 49.

[64] Тамсама. – Адз. зах. 1932. – Арк. 90–97.

мы сустракаем курганныя могільнікі, што сведчыць пра заселенасць у мінулым іх наваколляў і пра тое, што першапачатковая рэсурсная зона сяла Галічы ахоплівала даволі вялікую тэрыторыю, якая ад свайго ядра распаўсюджвалася больш як на 10 км.

Вялікай была і рэсурсная зона в. Кавычыцы. Так, у 1747 г. у «абрубе Кавычыцкім» былі заснаваны слабоды Вялікі Бор і Баравая[65]. Гэта дазваляе меркаваць, што першапачатковая рэсурсная зона Кавычыцаў у розныя бакі была не аднолькавай і вагалася ад 2 да 7 км ад Кавычыцаў, бо бліжэйшыя вёскі, вядомыя з XVI ст., – Бялынкавічы, Мокрая, Хоцімск, Клеявічы, Зяленкавічы – размяшчаліся ад Кавычыцаў на адлегласці 5–10 км. Такім чынам, рэсурсная зона в. Кавычыцы ў XVI ст. магла дасягаць 40–45 кв. км.

Некалькі меншымі былі рэсурсныя зоны паселішчаў, размешчаных на адлегласці ад дзяржаўнай мяжы. У сярэдзіне XVIII ст. в. Палуж, што ўзнікла на землях в. Ушакі, сама выступае ў якасці «донара» для заснавання на яе землях новых паселішчаў. Так, у 1747 г. на «грунтах Палужскіх» згадваецца в. Лешчанка[66], размешчаная ў 8 км на поўнач ад Палужа, а крыху пазней ад в. Лешчанка «адпачкавалася» новае паселішча – в. Лешчынская Гута, якая адстаяла ад Лешчанкі на адлегласці 2–3 км. Як бачым, на працягу XVI–XVIII стст. першапачатковая рэсурсная зона в. Ушакі ўвесь час скарачалася, і на ёй узнікалі ўсё новыя і новыя паселішчы.

Падобную карціну мы бачым і пры разглядзе сітуацыі з землямі в. Вепрын. Так, у XVI ст. у яе наваколлях згадваюцца вёскі Чудзінавічы (суч. Чудзяны), Аборавая (суч. Баравая), Барысавічы. Бліжэйшыя з іх размяшчаюцца ад Вепрына на адлегласці 5–11 км, такім чынам, рэсурсная зона в. Вепрын магла вагацца ў розныя бакі на 3–6 км ад цэнтра і агульная яе плошча магла дасягаць 20 кв. км.

Працэс скарачэння рэсурсных зон адбываўся за кошт засваення тэрыторыі лясных масіваў, пра што сведчаць назвы нанова заснаваных паселішчаў. Так, «на грунце» Гарбавіцкім ў 1723 г. засноўваецца слабада Баравая. На «грунце» Бярозкаўскім засноўваецца ў 1725 г. слабада Дубраўка. На грунтах в. Відуйцы ў 1723 г. – слабада Казелле, ад якой з цягам часу «адпачкавалася» новае паселішча – у першай палове XVIII ст. была заснавана в. Казельская Буда[67]. На «грунтах» в. Брацькавічы засноўваецца ў 1725 г. слабада Дубровіца[68].

Рэсурсную зону таго ці іншага паселішча адзначаюць і населеныя пункты, назвы якіх фіксуюць заняткі іх жыхароў. Так, у наваколлях в. Пячэрск, размешчанай на мяжы з Расіяй, у першай палове XVIII ст. узнікае в. Пячэрская Буда. У наваколлях вёсак Казелле, Брацькавічы і Курбакі Крычаўскага ста-

[65] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1936. – Арк. 121.

[66] Тамсама. – Арк. 97.

[67] Тамсама. – Адз. зах. 1932. – Арк. 62–63, 133–134, 141–142; Тамсама. – Адз. зах. 1936. – Арк. 132–133.

[68] Тамсама. – Адз. зах. 1932. – Арк. 146–147.

роства ўзнікаюць адпаведныя вёскі Казельская Буда, Брацькавіцкая Буда і Курбацкая Буда. Іх назвы сведчаць, што жыхары першапачатковых населеных пунктаў пачыналі займацца будным промыслам і засноўваць новыя паселішчы на землях, якія ўваходзілі ў рэсурсную зону першапачатковых паселішчаў.

У пачатку XVIII ст. у выніку баявых дзеянняў на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства ў 1708–1709 гг. падчас Паўночнай вайны колькасць дымоў у Крычаўскім старостве ў параўнанні з 1694 г. скарацілася з 767 да 501, ці на 26,8%. Інвентар 1714 г. адзначае, што з амаль з 280 валокаў староства 195, ці 70% стаялі неапрацаванымі. У старостве налічвалася на той час 543 дымы[69]. Не ў лепшым стане быў і горад. Калі, згодна з інвентарнымі паведамленнямі, у Крычаве ў 1682 г. было 456 дымоў, то нават у 1720 г. пустымі ў горадзе былі 244 дымы з 477[70].

Тым не менш інвентар Крычаўскага староства 1720 г. фіксуе пачатак яго новага адраджэння. У межах ранейшага Лучыцкага войтаўства 14 сакавіка 1714 г. было заснавана мястэчка Міхалаў, а ў кастрычніку таго ж года на р. Беседзь – мястэчка Радзівілаў. З вёсак на тэрыторыі Крычаўскага староства ў 1710 г. былі заснаваныя в. Ганнаўка на землях в. Бярозаўка і в. Бясовіцкая на землях в. Баханы. У 1716 г. над р. Крупня на землях вёсак Лешня, Жадунька і Тупічын была заснавана слабада Прусін. У 1717 г. на землях в. Гулькі засноўваецца слабада Асоўна.

Калі ў пачатку другога дзясяцігоддзя XVIII ст. працэс заснавання новых паселішчаў толькі пачынаўся, то бліжэй да дваццатых гадоў ён актывізаваўся. Так, у 1719 г. на землях в. Галічы засноўваюцца слабоды Фядотава і Сабалёўка, а на землях в. Юр'евічы – слабада Баравая. На землях апошняй ў гэты ж год засноўваецца слабада Лядзешня[71].

У 1719 г. над р. Зубр узнікае не лакалізаваная зараз слабада «Ганнаўка» (слабада 12 гадоў); у 1720 г. над р. Лешня на землях в. Саматэвічы ўзнікае слабада Сіліч – сучасная в. Сілічы Касцюковіцкага р-на) (слабада 10 гадоў). У 1720 г. на землях в. Галічы была заснавана слабада Перавалочня[72]. Усяго на працягу другога дзясяцігоддзя XVIII ст. у Крычаўскім старостве было заснавана 12 новых паселішчаў.

Аднак адраджэнне Крычаўскага староства і заснаванне новых вёсак першапачаткова таксама ішло вельмі марудна. У 1720 г. з 270,25 валокаў староства 127,5, ці 47% яшчэ стаялі неапрацаванымі, хаця ў старостве ў гэты час налічвалася ўжо 945 дымоў[73].

---

[69] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1930. – Арк. 41.

[70] Мяцельскі А. А. Старадаўні Крычаў. – С. 56.

[71] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1931/2. – Арк. 33, 38, 42, 44, 49; Тамсама. – Адз. зах. 1932. – Арк. 46–47, 91–94.

[72] Тамсама. – Адз. зах. 1932. – Арк. 97–99.

[73] Тамсама. – Адз. зах. 1931/2. – Арк. 69.

Значна паскорыўся гэты працэс ў трэцім дзесяцігоддзі XVIII ст. Ужо праз тры гады, у 1723 г., колькасць дымоў у старостве дасягнула 1050[74], а праз 7 год (1727 г.) інвентар адзначае ў старостве ўжо 2464 дымы[75], а колькасць насельніцтва, верагодна, дасягала 16 000 чалавек. Хаця, як і раней, у Крычаўскім старостве нават у 1727 г. не апрацоўвалася 38% раллі[76]. Верагодна, падобная карціна была і ў іншых раёнах Мсціслаўскага ваяводства якія апынуліся на шляхах рускіх і шведскіх войскаў у 1708–1709 гг.

Згодна з інвентаром Крычаўскага староства 1727 г., за апошні час тут былі заснаваны новыя мястэчкі Ганна і Геранімаў і шэраг новых вёсак.

У 20-х гадах XVIII ст. на тэрыторыі Бярозкаўскага войтаўства Крычаўскага староства на землях в. Тупічын узнікла слабада Валынеж (1723 г.). І на землях іншых вёсак працягвался актыўнае асваенне іх рэсурснай тэрыторыі і заснаванне новых населеных пунктаў. Так, на землях в. Батаева ў 1724 г. засноўваецца слабада Негава, на землях в. Бярозкі ў 1725 г. – слабада Дубраўка, на землях в. Баханы ў 1725 г. – слабоды Узлогі і Горня, а ў 1726 г. – слабада Ліпаўка[77].

Працягвалася актыўнае асваенне зямель в. Галічы. У 1723 г. на яе землях засноўваюцца слабоды Сураў і Сакалоўка, а ў наступны год – слабада Шчамялёўка[78]. На землях вёсак Тарасавічы і Стары Стан у 1724 г. былі заснаваны слабоды Пуцімель і Цітоўка[79]. На паўночным усходзе Вуглянскага войтаўства на землях в. Якімавічы ў 1722 г. была заснавана слабада Кавалёўка, а ў 1724 г. на землях в. Гулькі – слабада Куларoўка[80].

Працягвалі актыўна асвойвацца і землі Дамамерыцкага войтаўства. На землях в. Дамамерычы ў інвентары 1727 г. упершыню згадваецца в. Каняхоўка, а ў 1727 г. засноўваецца слабада Гусарка. На землях, якія належалі вёскам Дамамерычы і Палошкава, у 1722 г. засноўваецца слабада Свірэль, а ў 1724 г. – Бухаўка. У 1723 г. на землях в. Палошкава была заснавана слабада Гусарка[81].

Значная колькасць населеных пунктаў была заснавана і на тэрыторыі Лучыцкага войтаўства. Так, на яго тэрыторыі ў 1722 г. на землях в. Крывая Ніва ўзнікае нелакалізаваная слабада «Селіцкая», у гэтым жа годзе над р. Жадунька, на Забычанскіх землях узнікае в. «Галашоўка» (суч. Галачоўка Касцюковіцкага р-на), а над р. Крупня была адроджана в. Шарэйкі, вядомая з XVI ст.[82]

---

[74] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1933/2. – Арк. 62.

[75] Тамсама. – Адз. зах. 1932. – Арк. 43–178.

[76] Мелешко В. И. Из истории аграрных отношений в Восточной Белоруссии... – S. 59.

[77] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1932. – Арк. 52–53, 57, 59–63, 79–81.

[78] Тамсама. – Арк. 86, 90–92.

[79] Тамсама. – Арк. 115–116.

[80] Тамсама. – Арк. 104–105, 110–111.

[81] Тамсама. – Арк. 119, 123–125.

[82] Тамсама. – Арк. 57, 148; Тамсама. – Адз. зах. 1936. – Арк. 103.

Вялікая колькасць населеных пунктаў была заснавана і ў паўднёвых раёнах Лучыцкага войтаўства. У 1723 г. на землях в. Гарбавічы заснавана слабада Баравая (суч. Бароўка) і Казелье на землях в. Відуйцы (в. Казелле Краснапольскага р-на). Акрамя таго, у інвентары 1727 г. упершыню згадваюцца вёскі Прусінская Буда, Філіпаў Ручай. У інвентары Крычаўскага староства 1747 г. вёска пад блізкай назвай – «Ліпаў Ручай» згадваецца ў Бярозкаўскім войтаўстве[83], але на карце Крычаўскага графства 1786 г. яна паказана на тэрыторыі Лучыцкага войтаўства і размешчана прыкладна на месцы сучаснай в. Ліпаўка Касцюковіцкага раёна.

У 1726 г. над р. Зубар узнікае слабада Баронькава, у інвентары Крычаўскага староства 1727 г. упершыню згадваецца в. Крупня. Калі ў канцы XVII ст. (1694 г.) на землях в. Лобжа была заснавана в. Гута[84] , то ў 1724 г. была заснавана в. Гразівец[85].

Слабаджане дапамагалі адраджаць і іншыя вёскі. Так, у вёсках Кадзінскай воласці ў 1727 г. згадваюцца шматлікія слабаджане, якія павінны былі быць вызвалены ад выплаты падаткаў да 1732–1735 гг.[86] Усяго на працягу трэцяга дзесяцігоддзя XVIII ст. на тэрыторыі Крычаўскага староства былі заснаваны 35 новых населеных пунктаў. Гэты працэс актыўнага асваення памежнай тэрыторыі Крычаўскага староства, верагодна, трэба звязваць з мэтанакіраванай дзейнасцю ўдавы дзяржаўцы Крычаўскага староства Караля Станіслава Радзівіла Ганны Сангушкавай Радзівіл, якая пасля смерці мужа пачала актыўна займацца гаспадаркай.

Працэс заснавання новых паселішчаў і асваення тэрыторыі не спыніўся і ў 30–40-я гады XVIII ст. На тэрыторыі Лучыцкага войтаўства ў 1738 г. засноўваецца мястэчка Студзянец[87], а недзе паміж 1727 і 1747 гг. узнікае в. Гумніцкая, у 1747 г., згодна з інвентаром, заканчваўся тэрмін слабады ў в. Мялоўка (Касцюковіцкі р-н), а ў 1748 г. – для в. Харашоўка[88], што дазваляе лічыць, што яны ўзніклі ў канцы 30-х гадоў XVIII ст.

Вялікая колькасць населеных пунктаў Лучыцкага войтаўства была заснавана ў другой палове 40-х гадоў XVIII ст. Так, у 1745 г. на мяжы «з казакамі», на ручаі Пеняжэц была заснавана нелакалізаваная слабада Пенеж[89]. 21 студзеня 1747 г. заснавана слабада Вялікі Бор, 7 сакавіка – слабада Баравая[90] (Касцюковіцкі р-н), 22 сакавіка над р. Дубіец заснавана не лакалізаваная зараз слаба-

---

[83] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1932. – Арк. 44, 133–135, 139–143, 146–147; Тамсама. – Адз. зах. 1936. – Арк. 169.

[84] Тамсама. – Адз. зах. 1928. – Арк. 11, 86.

[85] Тамсама. – Адз. зах. 1932. – Арк. 168–169.

[86] Львоўская навуковая бібліятэка ім. В. Стэфаніка НАН Украіны. Аддзел рукапісаў. Інвентар маёнтка Кадзін 1729 г. // Ф. 5. – Адз. зах. 5163/П. – Арк. 32–50.

[87] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1936. – Арк. 98, 106.

[88] Тамсама. – Арк. 105–106, 114.

[89] Тамсама. – Арк. 123.

[90] Тамсама. – Арк. 121.

да Поўсцін. У гэтым жа годзе былі заснаваны слабада Папротная Буда (у раёне суч. в. Папаратная Касцюковіцкага р-на) і нелакалізаваныя слабоды Бердніцкі Ручай, Коўпіта[91]. Апошнюю, верагодна, трэба шукаць паміж сучаснымі вёскамі Траякоўка і Жукаўка Касцюковіцкага раёна, дзе знаходзяцца вытокі р. Коўпіта і на якой, мяркуючы па назве, і знаходзілася аднайменная слабада.

Інвентар 1747 г. згадвае, без даты заснавання, і іншыя новыя вёскі Лучыцкага войтаўства: Вётухна, Доўгі Лог, Дубровіца (суч. в. Дубраўка Брацькавіцкага с/с) (усе вёскі суч. Касцюковіцкага р-на), Казельская Буда (Краснапольскі р-н), Гослеў (Касцюковіцкі р-н), Буда Курбацкая, нелакалізаваныя вёскі Буда Брацькаўская, Гайдукоўка[92]. Апошняя на карце Крычаўскага графства 1786 г. размешчана на поўдзень ад в. Саматэвічы, прыкладна ў раёне сучаснай в. Хоцімск Касцюковіцкага раёна.

Згадваецца в. Какойск (суч. Краснапольскі р-н), адносна якой гаворыцца, што яе заснавалі перасяленцы з в. Блудзімля[93]. За р. Беседзь згадваецца в. Калодліва, якая была заснавана перасяленцамі з в. Панкі (суч. в. Зацішша). Згадваюцца новыя вёскі Панькаўская Буда, Белы Камень, Гаўрыленка (усе сучасныя вёскі Касцюковіцкага р-на), слабада Дзеравец[94]. Адносна апошняй інвентар удакладняе, што яна была перанесена з нейкай вёскі Свінёўкі. Даволі сугучную назву – Свінка – мае рэчка, што працякае недалёка ад сучаснай в. Азярэц Касцюковіцкага раёна, размешчанай на расійска-беларускай мяжы. У сувязі з гэтым, на наш погляд, магчыма атаясамленне слабады XVIII ст. Дзеравец і сучаснай в. Азярэц.

Назіранні за тэмпамі ўзнікнення новых паселішчаў у Крычаўскім старостве на працягу першай паловы XVIII ст. выразна сведчаць пра тое, што гэтыя раёны, размешчаныя за Сожам, у больш ранні час былі даволі слаба заселеныя. Акрамя старасцінскіх вёсак, што існавалі тут як мінімум з сярэдзіны XVI ст., тут да пачатку XVIII ст. налічваліся адносна нешматлікія шляхецкія ўладанні, і тыя, у асноўным, знаходзіліся бліжэй да цэнтральный і заходняй частак ваяводства. У цэлым у Крычаўскім старостве, згодна з інвентаром 1747 г., налічвалася 3018 дымоў і магло пражываць каля 18,5 тыс. чалавек.

Як ужо адзначалася вышэй, асаблівасцю засваення тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства ў другой палове XVII–XVIII стст. з'яўлялася тое, што колькасць насельніцтва ваяводства расла не толькі дзякуючы унутранаму прыросту але і, у значнай ступені, дзякуючы таму, што менавіта на ўсход Рэчы Паспалітай уцякалі шматлікія рускія падданыя. Згодна з афіцыйнымі рускімі данымі, у сярэдзіне XVIII ст. на ўсходзе Рэчы Паспалітай налічвалася больш за 1 млн былых расіян[95], якія жылі ў памежных ваяводствах – Полацкім, Віцебскім, Мсціслаўскім і Рэчыцкім павеце Менскага ваяводства.

---

[91] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1936. – Арк. 125, 135.

[92] Тамсама. – Арк. 117, 119, 129, 133.

[93] Тамсама. – Арк. 137.

[94] Тамсама. – Арк. 120, 123–127.

[95] Анішчанка Я. К. Народжаны рабалепнічаць. – С. 37.

У 1754 г. рускі пасол у Варшаве Г. Грос сярод мясцовасцей, дзе хаваюцца рускія падданыя, называў і Бабыліцкае староства Мсціслаўскага ваяводства[96]. Святар Бясовіцкай царквы Бярозкаўскага войтаўства Крычаўскага староства П. Чалоўскі, складаючы рэестр свайго прыхода 1745 г., адзначаў, што ў прыходзе (в. Бясовічы і слабада Горная) лічылася 105 двароў беглых рускіх падданых і толькі 26 двароў сталых жыхароў Рэчы Паспалітай[97].

А праз 10 год (1764 г.), згодна з рускімі данымі, больш за палову паселішчаў Крычаўскага староства (1961 двор) былі населены яшчэ з часоў Паўночнай вайны расійскімі уцекачамі, якія прыносілі іх уладарам ад 100 да 130 тыс. рублёў гадавога даходу. А адносна ўсяго Мсціслаўскага ваяводства сцвярджалася, што тут 6056 двароў населены пераважна беглымі расійскімі сялянамі, дваравымі і салдатамі[98].

У пачатку панавання імператрыцы Кацярыны II расійскае кіраўніцтва пачало ажыццяўляць вайсковыя аперацыі па вывадзе рускіх уцекачоў з усходніх раёнаў Рэчы Паспалітай. У выніку такіх дзеянняў у верасні 1763 г. у Шумячах і Бабыліцкім старостве Мсціслаўскага ваяводства была спустошана амаль палова хат[99]. Тым не менш, на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства на час яго ўключэння ў склад Мсціслаўскага ваяводства існавала каля 600 паселішчаў з якіх сёння лакалізуецца 532 (мал. 46).

Такім чынам, назіранні за дынамікай асваення сельскай прасторы на тэрыторыі Мсціслаўскага княства і ваяводства ў XIV–XVIII стст. паказваюць, што яно ішло адносна дынамічна і паспяхова, аднак увесь час перапынялася ў выніку ваенных дзеянняў. Асабліва гэта было характэрна для XVI – пачатку XVIII ст. Картаграфаванне вядомых населеных пунктаў гэтага перыяду выразна паказвае, што большая частка сельскіх паселішчаў размяшчаецца на правым беразе Сожа і набліжаецца да крэпасцей – Мсціслава і Крычава.

Толькі са спыненем амаль двухсотгадовай паласы войнаў з Рускім царствам пачаўся перыяд мірнага жыцця, які адразу даў свой плён у выглядзе заснавання новых шматлікіх паселішчаў, якія пачалі ўзнікаць на раней не асвоеных памежных землях.

У цэлым па падобнай схеме ішло асваенне памежнай тэрыторыі і з рускага боку. Тут памежная Краснагорская воласць Бранскага уезда пачала актыўна засяляцца толькі пасля першага дзесяцігоддзя XVIII ст., што расійскімі гісторыкамі таксама звязваецца са спыненнем паласы войнаў з Рэччу Паспалітай.

---

[96] Анішчанка Я. К. Народжаны рабалепнічаць. – С. 25.

[97] Мелешко В. И. Классовая борьба в белорусской деревне во второй половине XVII–XVIII вв. – С. 217.

[98] Анішчанка Я. К. Народжаны рабалепнічаць. – С. 112.

[99] Тамсама. – С. 61.



☎ – горад; ● – вёска; — — — — граніца Мсціслаўскага ваяводства; ▪▪▪▪▪▪▪▪▪▪▪ – дзяржаўная граніца

Мал. 46. Населеныя пункты Мсціслаўскага ваяводства XVIII ст.: *1* – Ажогі; *2* – Алексінскае; *3* – Ананічы; *4* – Андраны; *5* – Андрэевічы; *6* – Ануфрыева; *7* – Арлоўка; *8* – Асавец; *9* – Асе-

цішча; *10* – Асінаўка; *11* – Аслянка; *12* – Асмолавічы; *13* – Асмолава; *14* – Асоўна (Соўна); *15* – Астрэйкавічі; *16* – Бабічоўка; *17* – Баброва; *18* – Бабылічы; *19* – Бабынкі; *20* – Баеўка; *21* – Балабоўшчына Ст.; *22* – Балванаўка (Навікі); *23* – Балотнае; *24* – Банькаўшчына; *25* – Баравая; *26* – Баравая; *27* – Баранаўка; *28* – Барок; *29* – Баронькі; *30* – Барсукі; *31* – Барысаўка; *32* – Барысавічы; *33* – Басценавічы; *34* – Батаева; *35* – Баханы; *36* – Бацвінаўка; *37* – Бачэнкі; *38* – Башары; *40* – Беліца; *41* – Белая Дуброва; *42* – Белы Камень; *43* – Белы Мех (Белы Мох); *44* – Бель; *45* – Бель; *46* – Беражыстае; *47* – Беразуйкі; *48* – Бескаўка; *49* – Бізюкі (Майская); *50* – Блудзімля; *51* – Бахота; *52* – Брагі; *53* – Брадок; *54* – Брацькавічы; *55* – Буда; *56* – Будагошч; *57* – Буліна; *58* – Бухоўка; *59* – Быковічі; *60* – Быстрыца (Бестрань); *61* – Бязводзічы; *62* – Бязгачова; *63* – Бялішчына; *64* – Бялынец; *65* – Бялынкавічы; *66* – Беразетня; *67* – Бясовіцкая (Бяседавічы); *68* – Валоўнікі; *69* – Валымер; *70* – Валынеж; *71* – Вародзькаў; *72* – Варанёва; *73* – Варнавіна; *74* – Вароніна; *75* – Вельня; *76* – Вепрын; *77* – Веразубы; *78* – Верхаўцы; *79* – Відуйцы; *80* – Віраўня; *81* – Вішанкі; *82* – Воўчас; *83* – Вохар; *84* – Вусце; *85* – Вушакі; *86* – Высокае; *87* – Высоцкая Буда; *88* – Вялікі Бор; *89* – Вярба; *90* – Галічы; *91* – Галавічы; *92* – Галалобаўка; *93* – Галашчоўка; *94* – Галковічы; *95* – Галоўчын; *96* – Галубцы; *97* – Галушкі; *98* – Ганна (Мілаславічы); *99* – Ганнаўка (Бярозкі); *100* – Гарадзец; *101* – Гарадзечня (Гарадзешня-*1*); *102* – Гарадок; *103* – Гарбавічы; *104* – Гарбатка; *105* – Гаўрыленка; *106* – Геранімаў (Гронаў); *107* – Гібалы (Красная Слабада); *108* – Гліная; *109* – Глупікі (Мірная); *110* – Глушкава; *111* – Глушнева; *112* – Горлава; *113* – Горня; *114* – Горы; *115* – Граз; *116* – Грозы; *117* – Гразівец; *118* – Губіншчына; *119* – Гулькі; *120* – Гумніцкая; *121* – Гусарка; *122* – Гута; *123* – Даленшчызна; *124* – Дамамерычы; *125* – Данілаўка; *126* – Дарагінь; *127* – Дарлівае; *128* – Даўгавічы; *129* – Дзеснакіта; *130* – Дзедзін Ст.; *131* – Дзежнік; *132* – Дзеткавічы; *133* – Дзягавічы; *134* – Дзямідавічы; *135* – Дзянісаўка; *136* – Днесін; *137* – Добрае; *138* – Добрынскае; *139* – Дражджынічы; *140* – Дроздаўка; *141* – Дрыбін; *142* – Дрышчаў (Зарубец); *143* – Дубіец; *144* – Дубаўка; *145* – Дубасна; *146* – Дубейкава; *147* – Дубраўка; *148* – Дубраўка; *149* – Дуброўка; *150* – Дудароўка; *151* – Дудзіна; *152* – Дудчычы; *153* – Ельня; *154* – Ерашоўка; *155* – Ермакоўка; *156* – Есьманаўка; *157* – Жадунька; *158* – Жаліўе; *159* – Жалязняк; *160* – Жарэціна; *161* – Жукава; *162* – Журбін; *163* – Жыдова (Красная) Буда; *164* – Забалоцце; *165* – Забычанне; *166* – Забялышчын; *167* – Загусціна; *168* – Задабрасць; *169* – Зайцава слабада; *170* – Залесавічы; *171* – Залессе; *172* – Замошша; *173* – Заньковічы; *174* – Заполле; *175* – Заселле; *176* – Затоны; *177* – Затоны-*2*; *178* – Заходы; *179* – Зімніца; *180* – Зімніцы; *181* – Зоры; *182* – Зуі; *183* – Зубаўшчына; *184* – Зяціца; *185* – Іванаў Стан (Іванава); *186* – Іванаўка; *187* – Івоны; *188* – Ілюхіна; *189* – Ірцішчава; *190* – Ісакаўскі; *191* – Кісялёўка; *192* – Кабылін Стан (Кабыліна); *193* – Кавалева-*1*; *194* – Кавечын; *195* – Кавычыцы; *196* – Кадзін Стары; *197* – Кадзіна; *198* – Кажуховічы; *199* – Казелле; *200* – Казімірава; *201* – Казлоўка; *202* – Казлова; *203* – Казлова Буда; *204* – Кокатава; *205* – Калатовіна; *206* – Калеснікі; *207* – Калодзезі; *208* – Калодзеская; *209* – Калодліва; *210* – Каляснка; *211* – Камаровічы; *212* – Камаровічы; *213* – Каменка; *214* – Канічы; *215* – Канюхова; *216* – Караблёва; *217* – Каратышкі; *218* – Каржоў (Карзоў); *219* – Каробчына; *220* – Каровіна; *221* – Карчы (Кархі); *222* – Касмынічы; *223* – Касцюкоўка; *224* – Касцюковічы; *225* – Касцюшкавічы; *226* – Каські; *227* – Каськоў; *228* – Каўпіта; *229* – Каўшова; *230* – Кашаны; *231* – Кісловічы; *232* – Клімавічы; *233* – Клін; *234* – Клеявічы-*1*; *235* – Клюкіна; *236* – Клясінка; *237* – Князішчава; *238* – Князева; *239* – Колтава; *240* – Копцеўка; *241* – Космач; *242* – Котава Буда (Котаўка); *243* – Кош; *244* – Крапіўна Вялікая; *245* – Красавічы; *246* – Красніца; *247* – Краснае; *248* – Краснаполле; *249* – Краснаручча; *250* – Крэтава; *251* – Крупня; *252* – Крупня; *253* – Крутая; *254* – Круты Бераг; *255* – Крываносава; *256* – Крывая Ніва; *257* – Крывелі; *258* – Крычаў; *259* – Ксавераўшчына; *260* – Кудрычы; *261* – Кулікова; *262* – Курбакі; *263* – Курманава; *264* – Куроўшчына; *265* – Куровіцкая Слабада; *266* – Лабанаўка; *267* – Лабкавічы; *268* – Лазовіца; *269* – Лапатавічы; *270* – Лапаціна; *271* – Ларьянава; *272* – Лешня; *273* – Лешчанка; *274* – Лешчанка Мал.; *275* – Лешчынка Вял.; *276* – Ліпаўка; *277* – Ліпавы мост; *278* – Лобжа; *279* – Лужкі; *280* – Луты; *281* – Лыза; *282* – Лызкі; *283* – Лыкінка; *284* – Любавічы; *285* – Людагошча; *286* – Лютня; *287* – Лядзешня; *288* – Ляхавічы; *289* – Мазалава; *290* – Мазыкі; *291* – Макаўё; *292* – Макеевічы; *293* – Малашкавічы; *294* – Малееўка; *295* – Малькаўка; *296* – Маляцічы; *297* – Манастыршчына; *298* – Мануйлы; *299* – Манькаўская; *300* – Мардалысава (Свярдлоў); *301* – Маркаўка; *302* – Марцінаўка; *303* – Масціцкая слабада; *304* – Машонкі; *305* – Мелоўка; *306* – Мікшына; *307* – Мілейкава;

308 – Мілюты; *309* – Міхайлаўскае; *310* – Міхайлаўскае; *311* – Міхалаў (Забычанне); *312* – Міхеевічы; *313* – Міцькаўшчына; *314* – Мішні; *315* – Мокрая; *316* – Мсціслаў; *317* – Мурын Бор; *318* – Мышкіна; *319* – Мышкавічы; *320* – Навасёлкі; *321* – Надзейкавічы; *322* – Негін; *323* – Недзведзь; *324* – Несцерава; *325* – Нешкаўка; *326* – Ніегва (Ветка); *327* – Нізкі; *328* – Ніканаўскае; *329* – Новае Сяло; *330* – Няміры; *331* – Падзерня; *332* – Падказелле; *333* – Падлужжа; *334* – Пажога; *335* – Паклады; *336* – Пакуціе; *337* – Палішына (Паляшчыцы); *338* – Паланіца; *339* – Палон; *340* – Палошкава; *341* – Палуж-2; *342* – Панкі; *343* – Панькаўская Буда; *344* – Панятоўка; *345* – Папаратная; *346* – Папехінка; *347* – Парадзіна; *348* – Паршына; *349* – Пастарнакі; *350* – Паташня; *351* – Паўлавічы; *352* – Паўлавічы; *353* – Пацкава; *354* – Пацолтава; *355* – Пачынічы; *356* – Пепелеўка; *357* – Перавалочня; *358* – Пескавічы; *359* – Печышча; *360* – Пільнікі; *361* – Пірагова; *362* – Післяцін; *363* – Плешчына; *364* – Пнева; *365* – Пнеўшчына; *366* – Пожар; *367* – Понар; *368* – Прохараўка; *369* – Прудок-Палянка; *370* – Прусіна; *371* – Прусінская Буда; *372* – Прылепаўка; *373* – Пузырова; *374* – Пустынкі; *375* – Пуцімель; *376* – Пуцяціна; *377* – Пыцькі; *378* – Пясчанка; *379* – Пясчынікі; *380* – Пяськевічы; *381* – Пятровічы; *382* – Пячары; *383* – Пячкоўка; *384* – Пячковічы; *385* – Пячэрск; *386* – Радамля; *387* – Радзівілаў; *388* – Рай; *389* – Ракшына; *390* – Рамяство; *391* – Расна; *392* – Расохля (Пасохля); *393* – Ратная; *394* – Робцы; *395* – Родня; *396* – Рожава; *397* – Роскаў; *398* – Рубанаўка В.; *399* – Рудня; *400* – Рудоліна; *401* – Русінаўка; *402* – Рыкі; *403* – Рысін; *404* – Рэчыца; *405* – Савінічы; *406* – Сакалоўка; *407* – Сакалова; *408* – Сакольнічы; *409* – Саматэвічы; *410* – Саполава (Пабеда); *411* – Сапрынавічы; *412* – Сарочына; *413* – Свадкавічы; *414* – Свірэль; *415* – Свяцілавічы; *416* – Селіцкае; *417* – Селішча; *418* – Селязёнкі; *419* – Серы Камень; *420* – Сілічы; *421* – Скварск; *422* – Скварэта; *423* – Сколін; *424* – Скрымінава (Склімін); *425* – Слабада; *426* – Слабада Жаркоўская (Н. Жаркі); *427* – Слаўнае; *428* – Слаўновічы; *429* – Собалеўка; *430* – Сойна; *431* – Сохань; *432* – Ст. Буда; *433* – Ст. Жаркі; *434* – Ст. Разанцы; *435* – Стабаршчына; *436* – Старае Сяло; *437* – Стараселле; *438* – Стары Стан; *439* – Старынка; *440* – Старышкі; *441* – Старыя Віхраны; *442* – Стракайлава; *443* – Стракайлы; *444* – Студзянец; *445* – Студзянец; *446* – Судаўшчына; *447* – Судзілавічы; *448* – Суроў; *449* – Сутокі; *450* – Сычыха; *451* – Сялец; *452* – Сялюты; *453* – Сяргееўка; *454* – Танцы; *455* – Тарасавічы; *456* – Татарск; *457* – Тэклеўка; *458* – Точна; *459* – Трасціно; *460* – Тросціна (Боркі); *461* – Трыпуціна; *462* – Тупічына; *463* – Туроўка; *464* – Турэмск; *465* – Тухля; *466* – Тышча; *467* – Узлогі; *468* – Упін; *469* – Ускосы; *470* – Усполле; *471* – Фастаў; *472* – Федотава Слабада; *473* – Фількаўшчына; *474* – Фядотаўка; *475* – Халдзееўка; *476* – Халмы; *477* – Халоблін; *478* – Халхла (Крутая); *479* – Хамінка; *480* – Харанёва; *481* – Харашоўка; *482* – Хатовіж; *483* – Хацілавічы; *484* – Хацімча (Хацінічы); *485* – Хацяны; *486* – Хвастова; *487* – Хіславічы; *488* – Хлышчова; *489* – Ходараўка; *490* – Ходасы; *491* – Хоцімск; *492* – Хоцімск; *493* – Хоцень; *494* – Царковішча; *495* – Царковішча (Пралетарск); *496* – Ціманава; *497* – Цімошкі; *498* – Цімошкава; *499* – Цітоўка; *500* – Ціхіль; *501* – Цішкоўка; *502* – Цыганаў; *503* – Цяляткава; *504* – Цярэні; *505* – Цяцерынскае; *506* – Чапляеўка; *507* – Чарнілава; *508* – Чарнавусы; *509* – Чарналужжа; *510* – Чарнарэчча; *511* – Чарняўка; *512* – Чортава (Рассвет); *513* – Чыжы; *514* – Чырвоная Гара; *515* – Шамаўшчызна; *516* – Шамава; *517* – Шарэйкі; *518* – Шумянічы; *519* – Шумячы; *520* – Шчактоўка (Шчаглоўка); *521* – Шчамялёўка; *522* – Шыбнева; *523* – Шыпы; *524* – Шышкова; *525* – Шэйкі; *526* – Юзафоўка; *527* – Юркаўка; *528* – Юркаўшчына; *529* – Юрэвічы; *530* – Юшкевічы; *531* – Якімавічы; *532* – Яўкіна

5.3. Памеры і планіроўка паселішчаў

Планіровачная структура вёсак XIV–XVII стст. пакуль яшчэ не даследавана. Высновы пра планіроўку, якія робяцца на падставе распаўсюджання культурнага слоя і сцвярджаюць, што планіроўка сельскіх паселішчаў XIV–XV стст. была бессістэмнай і насіла кучавую форму[100], даволі спрэчныя, бо абапіраюцца на вельмі малы канкрэтны матэрыял.

[100] Археалогія Беларусі. – Т. 4. Помнікі XIV–XVIII стст. – С. 85.

Назіранні за зонамі распаўсюджання культурнага слоя з матэрыяламі XII–XVIII стст. на тэрыторыі сучасных населеных пунктаў паказваюць, што ў сваёй большасці культурны слой уяўляе сабой суцэльны масіў выцягнутай формы памерамі ад 1 да 3 га. Сама ж магутнасць культурнага слоя на сельскіх паселішчах вагаецца ад 0,4 да 1 м.

Вёскі XIV–XVIII стст. узнікалі на карэнным беразе буйных рэк альбо на першай надпойменнай тэрасе, на высокіх поплавах малых рэчак. Пры гэтым культурны слой большасці паселішчаў гэтага часу непасрэдна прымыкае да рэк альбо да краю надпойменнай тэрасы і знаходзіцца на агародах сучасных аднайменных населеных пунктаў. Вялікая колькасць вялікіх і малых рэчак у рэгіёне даследавання выключыла магчымасць існавання тут водападзельнага (не звязанага з вадаёмамі) тыпу сельскіх паселішчаў.

Планіроўка вёсак добра прасочваецца на планах Генеральнага межавання, праведзенага ў Расійскай імперыі ў 1782–1784 гг. На складзеных планах выразна бачна, што большая частка вёсак складалася з адной вуліцы, якая была выцягнута ўздоўж дарогі. Звычайна вуліца была забудавана з абодвух бакоў, але даволі часта сустракаецца і забудова вуліцы толькі з аднаго боку. Магчыма, такі тып вулічнай планіроўкі сельскіх населеных пунктаў вядзе сваё паходжанне з часоў аграрнай рэформы сярэдзіны XVI ст., як гэта мела месца ў заходніх і цэнтральных рэгіёнах ВКЛ.

Толькі нязначная частка вёсак (1782–1784 гг.), якія раней, у часы Рэчы Паспалітай адносіліся да катэгорыі мястэчак, мелі квартальную забудову. У гэтых паселішчах было некалькі паралельных вуліц, якія перасякалі адна адну, з цэнтральнай гандлёвай плошчай, на якой звычайна стаяў храм.

Таксама зрэдку ў вёсках існавала і радыяльная сістэма планіроўкі, калі цэнтрам вясковага жыцця была плошча з храмам, ад якой ў розныя бакі адыходзілі вуліцы. Напрыклад, па такім плане развівалася вёска Клімавічы, побач з якой ў канцы XVIII ст. быў пабудаваны горад[101].

Што тычыцца планіроўкі шляхецкіх двароў і фальваркаў, то першакрыніцы XVII–XVIII стст., якія захаваліся да нашых дзён, не дазваляюць з упэўненасцю адказаць на гэта пытанне. Крыніцы паведамляюць у асноўным пра знешні выгляд двара і даюць апісанне інтэр'ера яго памяшканняў.

Звычайна феадальныя двары размяшчаліся пасярод сялянскіх двароў альбо асобна, але побач з вёскай. Але часам і сам феадальны двор станавіўся асновай для развіцця вёскі. Забудова двароў залежала, у першую чаргу, ад ўзроўню эканамічнага развіцця той ці іншай гаспадаркі, аднак агульнай рысай планіроўкі феадальных двароў XVII–XVIII стст. была іх замкнёная форма.

Трапіць у фальварак можна было толькі праз браму-вароты, у якіх былі невялікія форткі для праходу людзей, а сам фальварак звычайна быў агарод-

[101] Чантурия Ю. В. Градостроительное искусство Беларуси второй половины XVI – первой половины XIX в. Средневековое наследие, ренессанс, барокко, классицизм. – Минск: Белорус. наука, 2005. – С. 195, рис. 136.

жаны бярвеннямі[102]. Наяўнасць уязной брамы-варотаў была абавязковым элементам феадальнай сядзібы і, улічваючы даволі распаўсюджаныя феадальныя міжусобіцы, апраўданым фартыфікацыйным элементам маёнтка. Брамы на феадальных дварах былі характэрнымі і для заходніх раёнаў ВКЛ[103], прычым і для больш ранніх часоў – XVI–XVII стст. У XVIII ст. яны ўжо страцілі сваю абарончую ролю, і крыніцы даволі часта згадваюць простыя вароты паміж двума слупамі, над якімі, верагодна, як гэта месцамі сустракаецца і зараз, быў дах[104]. У той жа час яшчэ у сярэдзіне XVIII ст., каб трапіць у феадальны двор, у некаторых маёнтках трэба было праехаць па пад'ёмным мосце праз стаў[105].

Час ад часу сустракаюцца паведамленні і пра існаванне камбінаванай агароджы вакол маёнтка, калі адна частка фальварка была агароджана «парканам», «каламі», а другая – «звычайным плотам»[106]. Прычым даволі часта ўнутраная частка фальварка-двара ў крыніцах праходзіць пад назвай «дзядзінец»[107], што сведчыць пра існаванне нават у тыя часы старых назваў цэнтраў былых сядзіб. Няўнасць агароджы вакол двара феадала была абавязковай з'явай у XV–XVIII стст. Аднак у канцы XVIII ст. ужо сустракаюцца фальваркі, якія не мелі знешняй агароджы[108].

Пра забудову феадальных двароў можна меркаваць па асобных пісьмовых крыніцах XVII–XVIII стст. Так, у двары фальварка Германы (1758 г.) акрамя дома гаспадара былі лазня, дзве пуні, пякарня, гумно, амбар, спіжарня[109]. У двары Пнеўскім (1771 г.) акрамя жылога будынка была шасцісценная стайня і яшчэ дзве невялікія стаенкі. Таксама ў двары былі пуня, свіран, лядоўня, пякарня, сырніца, абора[110]. Падобныя пабудовы згадваюцца і ў інвентары двароў Палоніца і Атоцкага[111]. У некаторых дварах былі мураваныя каплічкі (Вярба) і бровары (Вярба, Палоніца)[112]. Даволі цікавым пражыткам ранейшых элементаў гаспадарчых пабудоў была наяўнасць нават у другой палове XVII–XVIII стст. земляных ям для захоўвання збожжа ў в. Сапронавічы і ў Бязводзіцкім базыльянскім кляштары[113]. Аднак гэта было ўласціва ў асноўным для уладанняў дробнай шляхты.

Уладанні ж магнатаў даволі значна адрозніваліся. Так, напрыклад, пры апісанні двара Кадзінскага 1729 г., які належаў братам Антону, Аляксандру і

---

[102] АВК. – Т. 35. – С. 63, 249.

[103] Шаблюк В. У. Сельскія паселішчы Верхняга Панямоння. – С. 38.

[104] ИЮМ. – Вып. 28. – С. 121; АВК. – Т. 35. – С. 63, 193, 517.

[105] НГАБ. – Ф. 1729. – Воп. 1. – Адз. зах. 44. – Арк. 233 адв.

[106] Тамсама. – Арк. 233; АВАК. – Т. 35. – С. 523.

[107] АВК. – Т. 35. – С. 194.

[108] Тамсама. – С. 516.

[109] Тамсама. – С. 63–64.

[110] Тамсама. – С. 193–195.

[111] НГАБ. – Ф. 1729. – Воп. 1. – Адз. зах. 27. – Арк. 398–398 адв.; Тамсама. – Адз. зах. 44. – Арк. 232–237 адв.

[112] Тамсама. – Ф. 1812. – Воп. 1. – Адз. зах. 1. – Арк. 100 адв.

[113] Тамсама. – Ф. 3421. – Воп. 1. – Адз. зах. 10. – Арк. 7; ИЮМ. – Вып. 24. – С. 456.

Міхалу Пацеям, згадваецца не толькі тое, што значная частка яго будынкаў была пафарбаваная, але і тое, што за палацам існаваў «влоскі агарод» – парк, разбіты па правілах італьянскай паркавай культуры. Ён складаўся з 12 «кватэраў» – секцый, альбо баскетаў. У парк можна было трапіць праз альтанку, якая была ўпрыгожана фігурамі. «Кватэры» парка былі засаджаны рознымі духмянымі травамі і, акрамя таго, тут раслі фруктовыя дрэвы і кусты: яблыні, грушы, слівы, вішні, парэчкі, агрэст. Сам парк з усіх бакоў быў агароджаны парканам і плеценым плотам[114].

Трэба адзначыць, што парк у Кадзіне быў арганізаваны па ўсіх правілах паркавага мастацтва таго часу. Нават у радзівілаўскай Альбе пад Нясвіжам у пачатку XVII ст. быў агароджаны дылямі вялікі фруктовы сад, у якім раслі вішні, грушы, яблыні, а своеасаблівыя «зялёныя кватэры» з пладовых дрэваў таксама былі характэрнымі для рэнесансных садоў і паркаў. У сярэдзіне XVIII ст. італьянскі парк у Альбе быў засаджаны грушамі, яблынямі, слівамі розных сартоў, вішнямі, каштанамі, арэхамі, ядлоўцам, букам, бузіной розных сартоў і вінаградам, які рос вакол піўніцы[115]. У Слуцку, згодна з інвентаром горада 1793 г., італьянскі парк складаўся з кватэр, частка якіх была засаджана фруктовымі дрэвамі і кустарнікам: яблынямі, грушамі, слівамі, вішнямі, вінаградам, агрэстам была засаджана цэлая «вуліца» – алея. Акрамя таго, другую частку парка займалі кватэры, засаджаныя звычайнай для нашых мясцін агародніной: фасоляй, бульбай, капустай, морквай, пятрушкай[116].

Сады час ад часу згадваюцца ў крыніцах пачынаючы з XVII ст. Нейкі сад згадваецца пры апісанні сяла Каменка ў пачатку XVII ст., двара Кандратаўск у сярэдзіне XVII ст[117]. Невялікі парк з разарыем існаваў у двары Жукава ў 1753 г., які належаў Агінскім[118]. Цікавым з'яўляецца існаванне спецыяльнага агарода для вырошчвання хмеля ў «маетнасці Краснае» пад Мсціславам[119].

Інвентары даюць нам апісанні толькі шляхецкіх дамоў. У XVIII ст. яны звычайна мелі шкляныя вокны, устаўленыя ў драўляныя рамы. У жылых памяшканнях крыніцы згадваюць існаванне кафляных печаў, звычайна пакрытых зялёнай палівай. У кадзінскім жа палацы ў цэнтральных памяшканнях былі печы, зробленыя з белай кафлі[120]. Звесткі пра ўнутранае аздабленне сялянскіх хат адсутнічаюць.

Назіранні за дынамікай асваення сельскай прасторы на тэрыторыі Мсціслаўскага княства і ваяводства XIV–XVIII стст. паказваюць, што аснова пасяленчаскай структуры была закладзена ў XII–XV стст. У гэты час узнікла знач-

---

[114] Львоўская навуковая бібліятэка ім. В. Стэфаніка НАН Украіны. Аддзел рукапісаў. Інвентар маёнтка Кадзін 1729 г. // Ф. 5. – Адз. зах. 5163/П. – Арк. 24.

[115] AGAD, AR. Dział XXV. Sign. 2691/1, k. 28–29.

[116] НГАБ. – Ф. 694. – Воп. 2. – Адз. зах. 7560. – Арк. 3 адв.

[117] Тамсама. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 100. – Арк. 327–327 адв.; ИЮМ. – Вып. 24. – С. 421.

[118] LVIA. – F. 1177. – Ap. 1. – Bib. 693. – P. 1 v.

[119] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 161. – Арк. 157 адв.–158.

[120] Тамсама. – Ф. 1812. – Воп. 1. – Адз. зах. 2. – Арк. 347 адв.–348, 389–396 адв.

ная частка паселішчаў, пра што сведчаць помнікі археалогіі X–XIII стст., якія знаходзяцца каля населеных пунктаў, што згадваюцца ў пісьмовых крыніцах XV–XVI стст.

На працягу XVI–XVII стст., нягледзячы на паласу войнаў паміж Рэччу Паспалітай і Рускім царствам, адбываўся паступовы рост колькасці сельскіх паселішчаў, якія ў першую чаргу ўзнікалі ў раёнах Мсціслаўскага ваяводства, аддаленых ад мяжы. Прычым многія новыя паселішчы ўзнікалі на тых жа месцах, дзе раней, ў X–XIII стст., ужо існавалі сельскія паселішчы. І толькі пачынаючы з XVIII ст. пачалося актыўнае асваенне прылеглых да мяжы раёнаў ваяводства, што было абумоўлена заключэннем у 1686 г. «Вечнага міру» паміж дзяржавамі і спыненнем войнаў. Структура сельскіх паселішчаў на тэрыторыі былога Мсціслаўскага ваяводства, якая існуе да сённяшняга дня, сфарміравалася ў асноўным да сярэдзіны XVIII ст. Толькі нязначныя перамены, такія як узнікненне новых паселішчаў, адбыліся ў XIX–XX стст.

УРБАНІЗАЦЫЙНЫЯ ПРАЦЭСЫ Ў МСЦІСЛАЎСКІМ КНЯСТВЕ І ВАЯВОДСТВЕ Ў XIV–XVIII СТСТ.

Урбанізацыйны працэс з'яўляецца своеасаблівай візітнай карткай наступу цывілізацыі. Гарады былі вынікам развіцця прадукцыйных сіл грамадства, а іх эканоміка, у сваю чаргу, аказвала ўплыў на фарміраванне і развіццё мясцовых, а з часам і міжнародных рынкаў. Адначасова гарады першымі выпрабоўвалі на сабе лёс гісторыі, і генезіс гарадоў, іх стан, жыццё, развіццё сапраўды можна параўнаць са своеасаблівай нервовай сістэмай, што адлюстроўвае грамадскае жыццё[1]. Урбанізацыйныя працэсы, што адбываліся на Сярэднім Пасожжы ў XIV–XVIII стст., сапраўды яскрава дэманструюць той складаны лёс, які прайшоў рэгіён за гэтыя пяць стагоддзяў.

Корпус пісьмовых крыніц XIV–XVII стст., якія адлюстроўваюць урбанізацыйныя працэсы, што адбываліся на Пасожжы, адносна нешматлікі, таму на першым этапе (XIV–XV стст.) у асвятленні гэтай праблематыкі вялікую ролю адыгрываюць даныя археалогіі і агульныя разважанні зыходзячы з тых працэсаў, якія мы прасочваем тут.

У рэгіёне даследавання ў XII–XIII стст. у параўнанні з раёнамі, што прылягаюць да буйных гарадскіх цэнтраў – Смаленска, Старадуба, Гомія, назіраецца адносна малая колькасць невялікіх умацаваных паселішчаў, якія былі сядзібамі буйных феадалаў. Гэта тэндэнцыя, верагодна, была выклікана тым, што большая частка Пасожскіх зямель была пакінута смаленскімі князямі ў якасці свайго дамена, а на астатніх, прылеглых да дамена землях, вялікакняская сямья таксама не садзейнічала фарміраванню буйной зямельнай уласнасці.

На гэтых землях на працягу XII–XIII стст. гарадскімі цэнтрамі з'яўляліся, як адзначалася вышэй, Мсціслаў, Рослаўль, Пацынь, Мглін, Заруб-Навасёлкі, Крэчут, Прупой, Красн, Васільеў-Горы, Дрокаў, Басея, магчыма Радамля і дакладна не лакалізаваны Зарой.

Структура гарадскіх цэнтраў, якая склалася на Сярэднім Пасожжы ў XII–XIII стст., уключала ў свой склад як буйныя гарады – цэнтры рамяства і гандлю (Мсціслаў, Рослаўль, Пацынь, Мглін), так і буйныя княскія замкі – Красн, Васільеў, Заруб, і невялікія адміністрацыйна-гаспадарчыя цэнтры асобных валасцей, што толькі станавіліся на шлях гарадскога развіцця – Басея, Крэчут, Прупой, Дрокаў.

---

[1] Gieysztor A. Glos w diskusji na sympozium sieci miejskiej w 1979 r. // KHKM. – 1980. – № 3. – S. 429.

Паступовае развіццё гарадскіх цэнтраў у сярэдзіне XIII – пачатку XIV ст. было прыпынена пэўным крызісам, які выразна прасочваецца па археалагічных даных. Менавіта ў гэты час спыняецца жыццё на невялікіх па плошчы ўмацаваных паселішчах, прычым на значнай іх колькасці гэта адбываецца пасля ваеннага пагрому[2].

Сляды ваенных пагромаў у гэты час прасочваюцца і на іншых помніках, прычым не абмінулі яны і буйныя гарадскія цэнтры ўсяго Пасожжа. У летапісным Гоміі пагром сярэдзіны XIII ст., які на доўгі час спыніў актыўнае жыццё ў горадзе, звязваецца з мангольскім нашэсцем на Чарнігаўскую зямлю ў 1239 г. У Мсціславе моцны пажар, па даных дэндрахраналогіі, адбыўся паміж 1296 і 1307 гг. У канцы XIII ст. пасля моцнага пажару спыняе сваё існаванне Пацынь. У Крычаве існуе вершаванае паданне пра мангольскі пагром горада, а рэшткі буйнога пажару, які адбыўся ў канцы XIII ст., зафіксаваны на гарадзішчы Замкавая гара. У Магілёве падчас археалагічных даследаванняў умацаванняў замка XIII ст. у яго абгарэлых драўляных канструкцыях знойдзены мангольскія наканечнікі стрэл. Падчас мангольскага пагрому другой паловы XIII ст. загінула паселішча ў Свіслачы на Бярэзіне[3].

У гэты час спыняецца жыццё ў летапісным Зарубе (гарадзішча Навасёлкі), знікае са старонак пісьмовых крыніц Зарой (гарадзішча Бяседка?). Спыняюць сваё функцыянаванне ўмацаваныя паселішчы ў Заселлі, Хіславічах, Гарадку, Каўшараве, Шаўневе, Мазалаве, Епішаве, Пагуляеўцы, Пагарэлаве і інш.

Такім чынам, амаль на ўсёй гэтай тэрыторыі прасочваюцца сляды нейкага катаклізму, у выніку якога значная частка гарадскіх цэнтраў прыйшла ў заняпад, а сядзібы буйных зямельных уласнікаў – замкі – аказаліся закінутымі.

Нельга выключыць, што ўсе гэтыя пажары, што прасочваюцца на пасожскіх гарадах былі вынікам паходаў асобных аддзелаў мангола-татараў, якія не

---

[2] Лявданский А. Н. Некоторые данные о городищах Смоленской губернии. – С. 225–252; Седов В. В. Сельские поселения. – С. 92; Загорульский Э. М. Исследования Вищинского замка // Древнерусское государство и славяне. – Минск: Наука и техника, 1983. – С. 86–90; Вагонава А. М. Вішчынскі грошава-рэчавы скарб // Энцыклапедыя археалогіі і нумізматыкі Беларусі. – Мінск: БелЭн, 1993. – С. 139–140; Мяцельскі А. А. Шаўнеўскае гарадзішча. – С. 65–71; Яго ж. Гарадзішча Карабанавічы. – С. 78–101; Загорульский Э. М. Вищинский замок XII–XIII вв. – Минск: БГУ, 2004. – 160 с.

[3] Павлова К. В., Раппопорт П. А. Городище Осовик // СА. – 1973. – № 1. – С. 200–216; Павлова К. В. Оборонительные сооружения городища Осовик // СА. – 1981. – № 3. – С. 73–84; Алексеев Л. В. Мстиславский детинец в XII–XIV веках. – С. 75; Макушников О. А. Древнерусская оружейная мастерская из Гомия // Старожитності Південної Руси. Матеріали іст.-археол. семінару «Чернігів і його округа в IX–XIII ст.», Чернігів, 15–18 травня 1990 р. – Чернігів: Сіверянська думка, 1993. – С. 128; Яго ж. В поисках древнего Гомия. – Гомель: Белорус. агенство науч.-техн. и деловой информации, 1994. – С. 54; Марзалюк І. Да пытання аб адміністрацыйна-тэрытарыяльнай прыналежнасці і сацыяльнага статуса Магілёва ў XII–XIII стст. // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі (Матэрыялы III Міжнар. навук. канф. 21–23 красавіка 1997 г.). – Полацк: Изд-во Полоцк. гос. ун-та, 1998. – С. 181–182; Мяцельскі А. А. Старадаўні Крычаў. – С. 33, 105; Кошман В. Прадмет ўзбраення з гарадзішча Свіслач (па матэрыялах раскопак 2000, 2005–2007 гадоў). Да пытання аб мангольскіх нападах на тэрыторыю Беларусі ў сярэдзіне XIII ст. // Acta Archaeologica Albaruthenica. – Vol. IV. – 2008. – С. 85–110.

знайшлі свайго адлюстравання ў паўднёварускіх летапісах, а помнікі мясцовага (смаленскага) летапісання, не захаваліся.

Аднак і без гэтых магчымых паходаў на Пасожскія землі ў выніку мангольскага пагрому паўднёварускіх зямель спыніліся шырокія гандлёвыя сувязі паміж гэтымі землямі. Усё гэта не магло не прывесці да крызісу гаспадаркі і, у сваю чаргу, да крызісу ў развіцці гарадскога жыцця ў рэгіёне даследавання.

Аднак урбаністычны крызіс, што прасочваецца ў сярэдзіне XIII – пачатку XIV ст. быў даволі хутка пераадолены. Пра гэта сведчыць як далейшае развіццё старых гарадскіх цэнтраў – Мсціслава, Рослаўля, Крычава, Мгліна, Прапошаска, Дрокава, Гораў, так і тое, што ўжо ў канцы XIV ст. на тэрыторыі даследавання з'яўляюцца новыя гарады. Так, у канцы XIV ст. у «Спісе гарадоў рускіх бліжніх і далёкіх» упершыню з'яўляецца горад Папова Гара – сучасны гарадскі пасёлак Чырвоная Гара, раённы цэнтр Бранскай вобласці[4].

Адначасова з развіццём старых буйных гарадскіх цэнтраў у XIV–XV стст. паступова павялічвалася колькасць насельніцтва, у выніку чаго асвойваліся новыя землі. Апошні факт асабліва добра прасочваецца на падставе назіранняў за распаўсюджваннем помнікаў археалогіі X–XIII стст. і месцамі ўзнікнення новых вёсак канца XIV–XVI стст.

Так, калі помнікі археалогіі X–XIII стст. (селішчы і курганныя могільнікі) размяшчаюцца ў асноўным па берагах буйных рэк, то значная колькасць новых селішчаў, якія узніклі ў XIV–XVI стст., пачынае фарміравацца на пэўнай адлегласці ад рэк. І нават на помніках, якія маюць культурныя адкладанні шырокага храналагічнага перыяду – XII–XVIII стст., матэрыялы XV–XVIII стст. знаходзяцца на большай адлегласці ад вады, чым больш раннія.

Паступова ўзрастанне колькасці насельніцтва і асваенне новых тэрыторый прывялі да неабходнасці з'яўлення новых, больш дробных адміністрацыйна-гаспадарчых цэнтраў, якія былі б больш тэрытарыяльна прыбліжанымі да рэгіёнаў, чым буйныя, але ўсё яшчэ даволі рэдкія гарады. Такія адміністрацыйна-гаспадарчыя цэнтры ў пэўнай ступені павінны былі запоўніць тую нішу, што ўтварылася пасля знішчэння цэнтраў буйнога землеўладання, якімі з'яўляліся феадальныя замкі.

Як адзначалася вышэй, Мсціслаўскае княства XIV – пачатку XVI ст. складалася з валасцей самога Мсціслава, Крычава, Мгліна, Дрокава, Паповай Гары, Радамлі, воласці Малахоўскі пуць, Лучыцкай, магчыма, валасцей Хіславічы, Салаўянічы, Прыкладні, Заселле. Калі цэнтры першых пяці з іх у канцы XIV ст. названы гарадамі ў «Спісе гарадоў рускіх бліжніх і далёкіх», то цэнтры апошніх валасцей, верагодна, уяўлялі з сябе вялікакняскія двары, арганізаваныя цэнтральнай уладай для збору даніны з пэўнай тэрыторыі.

Магчыма, з арганізацыяй гэтых двароў цэнтральная ўлада разлічвала, што паступова яны ператворацца ў гарадскія цэнтры, але большасць з іх на працягу XIV–XVI стст. так і не змагла дасягнуць гарадскога статуса і заставалася

[4] Тихомиров М. И. «Список русских городов далеких и близких». – С. 223–224.

на ўзроўні вясковых паселішчаў, а цэнтры некаторых валасцей на сённяшні дзень нават не лакалізаваныя.

Так, невядома, дзе знаходзіўся цэнтр воласці «Малахоўскі пуць», альбо Малохва, якая існавала як у складзе ВКЛ, так потым і ў складзе Смаленскага намесніцтва Рускай дзяржавы па берагах аднайменнай ракі – Малохвы, правага прытока Віхры.

Такі ж лёс і з пошукамі цэнтра Лучыцкай воласці, размешчанай ў міжрэчы Сожа і Іпуці. У крыніцах XVI ст. згадваецца сугучны назве воласці населены пункт – вёска Лучынічы (1579 г.), якая і магла быць першапачатковым цэнтрам воласці, ад якой апошняя і атрымала сваю назву, але да сённяшняга дня гэты населены пункт не захаваўся[5]. Не лакалізаваны і цэнтр воласці Прыкладні, якая знаходзілася на левабярэжжы Іпуці.

Цэнтры ж астатніх валасцей знаходзіліся ў вёсках. Так цэнтр воласці Салаўянічы знаходзіўся на тэрыторыі сучаснага сяла Салаўянаўка Клятнянскага раёна Бранскай вобласці, і да пачатку XVII ст., калі ён быў цалкам спустошаны, гэты населены пункт заставаўся звычайным сялом[6]. Цэнтр воласці Хіславічы, якая згадвалася ў пачатку XVI ст., верагодна, знаходзіўся на тэрыторыі сучаснага аднайменнага населенага пункта, які да пачатку XVIII ст. таксама заставаўся звычайнай вёскай.

Цэнтр Засельскай воласці, якая таксама ўпершыню згадваецца ў пачатку XVI ст., верагодна, трэба шукаць у сучаснай в. Новае Заселле Балахонаўскага сельсавета Шумяцкага раёна Смаленскай вобласці, дзе захаваліся рэшткі гарадзішча з матэрыяламі XII–XIII стст. і сляды двух неўмацаваных паселішчаў XIII–XV стст. памерамі па 1,5 га[7].

Як бачым, у адрозненне ад заходніх раёнаў ВКЛ, дзе пачынаючы з XV ст. актыўна фарміруюцца як дзяржаўныя, так і прыватнаўласніцкія гарады і мястэчкі, на ўсходзе краіны гэты працэс не быў такім актыўным і ролю гарадскіх цэнтраў фактычна працягвалі выконваць старыя цэнтры, сфарміраваныя яшчэ у папярэдні час. У чым была прычына такой розніцы ў развіцці рэгіёнаў адной краіны, для якой XIV–XV стст. былі часам пастаяннага тэрытарыяльнага і эканамічнага росту?

Верагодна, асноўная прычына розніцы тэмпаў урбанізацыі розных раёнаў краіны хаваецца ў розных тэмпах агульнага эканамічнага развіцця рэгіёнаў ВКЛ. Заходнія і падзвінскія воласці, звязаныя старымі гандлёвымі сувязямі з Заходняй Еўропай, больш хутка знаходзілі рынкі збыту для сваёй сельскагаспадарчай вытворчасці, футраў, мёду, воску і іншых тавараў. Усходнія ж раёны краіны з-за сваёй адлегласці ад Заходняй Еўропы і першапачатковага мерыдыяльнага накіравання (на пагромлены мангола-татарамі поўдзень) іх асноўных

[5] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 74. – Арк. 419–420; Тамсама. – Ф. 694. – Воп. 4. – Адз. зах. 1155. – Арк. 49–50; Мяцельскі А. А. Лучыцкая воласць. – С. 59.

[6] Крашенинников В. В. Брянский уезд в XVI – первой половине XIX в. – С. 122.

[7] Шмидт Е. А. Древнерусские археологические памятники Смоленской области. – Ч. 2. – С. 149.

галоўных шляхоў (рэк) не мелі такога магутнага рынку збыту сваёй прадукцыі. Усё гэта прыводзіла да таго, што ў параўнанні з заходнімі раёнамі краіны тут было значна менш развіта буйное землеўладанне, а менавіта адсутнасць апошняга, без якога быў немагчымым буйнамаштабны ўрбаністычны працэс, верагодна, і была той прычынай, з-за якой на тэрыторыі Мсціслаўскага княства, а потым і ваяводства працэс фарміравання гарадскіх цэнтраў ішоў вельмі павольна.

Падобная карціна назіраецца і на іншых землях Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай у XIII–XIV стст. І толькі з фарміраваннем буйнога землеўладання пачынаецца новы імпульс у развіцці гарадоў[8].

Тое, што працэсс фарміравання буйнога землеўладання, а разам з тым і ўрбанізацыі краю ў значнай ступені зацягнуўся на ўсходніх землях Вялікага Княства Літоўскага[9], добра прасочваецца па попісе войска 1528 г. Мяркуючы па колькасці коней, выстаўляемых мсціслаўскай шляхтай у параўнанні са шляхтай іншых ваяводстваў, працэс фарміравання буйных землеўладальнікаў тут толькі пачынаўся.

Нават былы мсціслаўскі князь Міхаіл Іванавіч у 1528 г. выстаўляў у войска толькі 32 кані. З астатніх 98 коней, што выстаўляла мсціслаўская і радамлянская шляхта, 33 (ці амаль 33%) выстаўлялі Багдан (15) і Андрэй Карсаковічы (18). Астатняя шляхта была дробнай і выстаўляла ў асноўным па адным кані[10]. Падобная карціна назіраецца і ў іншых памежных землях ВКЛ (віцебскай) і ў наваколлях Рагачова. У той жа час у размешчанай на захад ад іх Полацкай зямлі ўжо было значна больш заможнай шляхты, якая выстаўляла па 5–7 і болей коней.

У такім стане – з наяўнасцю старых гарадскіх цэнтраў, якія сфарміраваліся яшчэ ў X–XIII стст., і зачаткамі новых урбаністычных цэнтраў, у якасці якіх выступалі цэнтры новых валасцей, што размяшчаліся ў вясковых паселішчах, – і падышло Сярэдняе Пасожжа да XVI ст., якое вельмі істотна змяніла гістарычны лёс і эканамічнае развіццё рэгіёна і з якога, фактычна, пачынаецца другі этап (XVI – сярэдзіна XVII ст.) у развіцці гарадскіх цэнтраў Сярэдняга Пасожжа.

У пачатку XVI ст. у выніку барацьбы Вялікага Княства Маскоўскага з ВКЛ тэрыторыя апошняга скараціласа і дзяржаўная мяжа ВКЛ наблізілася па Пасожжа. У выніку войнаў першай чвэрці XVI ст. тэрыторыя Мсціслаўскага княства скараціласа да воласці аднаго Мсціслава, а амаль няспынны двухсотгадовы перыяд войнаў ВКЛ з Вялікім Княствам Маскоўскім, а потым і Рускім

---

[8] Wyrozunski J. Dzieje Polski piastowskiej (VIII wiek – 1379) // Wielka historia Polski. – Kraków: Wyd. UJ, 1996. – T. 2. – S. 275; Заяць А. Урбанізаційний процес на Волині в XVI – першій половині XVII століття. – Львів: Добра Справа, 2003. – С. 30.

[9] Lowmiański H. Studia nad dziejami Wielkiego księstwa Litewskiego // Uniw-t im. Adama Mickiewicza w Poznaniu: seria Historia. – № 108. – Poznań, 1983. – S. 429.

[10] Перапіс войска Вялікага Княства Літоўскага 1528 года. Метрыка Вялікага княства Літоўскага. Кн. 523. Кн. Публічных спраў 1. – Мінск: Беларус. навука, 2003. – С. 54–56, 157–158.

царствам не спрыяў далейшаму развіццю гарадоў, і больш за тое, фактычна прыпыніў распачатыя ўрбаністычныя працэсы. На гэтым этапе дзяржава надавала першапачатковую ўвагу падтрымцы старых гарадскіх цэнтраў, якія сталі зараз яго ваеннымі фарпостамі на ўсходняй мяжы (Мсціслаў, Крычаў, Прапошаск, Чачэрск, Рагачоў, Гомель), і будаўніцтву новых, перш за ўсё ў якасці цэнтра абароны ўсяго Падняпроўя (Магілёў).

Апошняя роля гарадскіх цэнтраў добра прасочваецца і па гербах, якія выдаваліся гарадам з нагоды атрымання імі магдэбургскага права. Фактычна ўсе яны адлюстроўваюць ваенную значнасць горада: на іх шчытах мы бачым выявы мячоў і шчытоў (Мсціслаў, Крычаў), адчыненыя брамы ці вежы (Магілёў).

І нават у прыватнаўласніцкіх пасожскіх і падняпроўскіх гарадах, размешчаных на ўсходзе ВКЛ (Дуброўна, Горы, Шклоў), менавіта ў гэты час, у канцы XVI ст., пачынаецца будаўніцтва новых умацаваных цэнтраў[11]. Апошняе, улічваючы шматлікія войны з Маскоўскай дзяржавай на працягу гэтага стагоддзя, а таксама іх размяшчэнне ўздоўж мяжы з гэтай дзяржавай, падкрэслівала іх ролю ў якасці перадавых фарпостаў краіны.

Аднак гэтыя гарады былі тады ва ўласнасці ў наймагутнейшых родаў ВКЛ, якія маглі сабе дазволіць будаваць новыя фартэцыі ў гарадах, што належалі ім: Горамі на той час валодаў канцлер ВКЛ Леў Сапега, Дуброўна было прыватным горадам і замкам роду Глябовічаў, Шклоў з сярэдзіны XVI ст. належаў Хадкевічам.

6.1. Гарады Мсціслаўскага княства і ваяводства ў другой палове XIV–XVIII ст.

Пісьмовыя крыніцы згадваюць на тэрыторыі Мсціслаўскага княства XIV – пачатку XVI ст. пяць гарадоў. Гэта сам цэнтр княства – Мсціслаў, а таксама Крычаў, Мглін, Дрокаў, Папова Гара, большасць з якіх вядзе сваё паходжанне з X–XIII стст. Акрамя таго, у крыніцах XVI–XVII стст. Радамля ўвесь час называецца замкам, які меў сваю воласць. Больш таго, некаторыя крыніцы непасрэдна гавораць, што пад Радамлянскім замкам знаходзілася «места». Усё гэта дазваляе разглядаць і яе ў якасці невялікага горада Мсціслаўскага княства.

Цэнтрам княства, а з 1566 г. ваяводства, быў **Мсціслаў**. Гістарычная тапаграфія горада XIV–XVIII стст., калі не лічыць артыкула Р. Баравога і некалькіх старонак у манаграфіі І. Слюньковай, амаль не даследавана[12]. Гэта тлумачыцца слабай крыніцазнаўчай базай – цалкам адсутнічаюць інвентары і планы горада XVII – сярэдзіны XVIII ст. Самы ж ранні вядомы план горада, калі

[11] Ткачоў М. А. Замкі і людзі. – С. 103, 139; Левко О. Н. Археологическое изучение Дубровенского замка // Гісторыя і археалогія Полацкай зямлі. – Полацк: Изд-во Полоцк. гос. ун-та, 1998. – С. 164–169.

[12] Боровой Р. В. Развитие планировочной структуры Мстиславля. – С. 2–4; Слюнькова И. Н. Архитектура городов Верхнего Приднепровья XVII – середины XIX в. – Минск: Наука и техника, 1992. – С. 24.

не лічыць выявы горада на карце ВКЛ Т. Макоўскага (мал. 47), – гэта праектны план, складзены ўжо расійскімі праекціроўшчыкамі, які датуецца 1778 г.[13] (мал. 48).

Мал. 47. Выява Мсціслава на карце ВКЛ 1613 г. Т. Макоўскага

У той жа час гэты план канца XVIII ст. цікавы тым, што ён запраектаваны на больш раннім плане горада, які адлюстроўвае ўжо існуючую гарадскую тапаграфію на 1778 г., якая, у сваю чаргу, вядзе свой пачатак як мінімум з пачатку XVIII ст. Справа ў тым, што ў 1708 г. горад у апошні раз быў спалены і ўжо пасля гэтага развіваўся, не ведаючы ніякіх катаклізмаў. Таму на падаснове праектнага плана 1778 г. зафіксавана планіровачная структура горада, якая склалася ў XVIII ст. (мал. 49). Аднак нельга выключыць, што ў пачатку XVIII ст. мсціслаўцы проста аднавілі тую планіровачную структуру горада, якая пачала фарміравацца ў Мсціславе пасля яго перапланіроўкі першай паловы XVII ст. (1634 г.), калі гораду было нададзена магдэбургскае права.



Мал. 48. Праектны план Мсціслава 1778 г.

[13] РДВГА. – Ф. 845. – Воп. 16. – Адз. зах. 21564. – Арк. 6.



Мал. 49. План Мсціслава канца XVIII ст. Прасочваецца на плане горада 1778 г.

У той жа час пра гістарычную тапаграфію горада XIV – першай паловы XVII ст. можна весці размову толькі на падставе археалагічных даследаванняў, аналізу пісьмовых крыніц і некаторых агульных разважанняў, якія абапіраюцца на аналогіі.

Інвентарныя апісанні замка Мсціслава і самога горада XIV–XVI стст. не захаваліся, а ўлічваючы, што горад не быў ва ўладаннях буйных магнацкіх родаў, магчыма, іх нават і не рабілі. Таму пры вывучэнні Мсціслава гэтага часу на першы план выходзяць даныя археалогіі і сціплыя пісьмовыя крыніцы, што захаваліся да нашых дзён.

Ядром горада заставаўся дзядзінец – Замкавая гара. Улічваючы размяшчэнне Мсціслаўскага замка на памежжы, у XVI–XVII стст. каралеўская ўлада і мясцовая шляхта надавалі значную ўвагу наяўнасці там зброі і агульнаму стану фартыфікацыі. Вядома, што яго фартыфікацыйныя збудаванні ўяўлялі з сабе гліняныя валы, на версе якіх стаялі драўляныя гародні, вежы і ўязная брама. Колькасць вежаў на мсціслаўскім замку дакладна не вядома, а улічваючы памеры замка, М. А. Ткачоў выказаў думку, што іх было не менеў за дзесяць[14].

Аднак з такой колькасцю вежаў на мсціслаўскім замку цяжка пагадзіцца. У суседнім з Мсціславам Крычаве на замку было толькі 5 вежаў, а ён, хаця

[14] Ткачев М. А. Замки Беларуси. – С. 92.

і меншы па памерах, пабудаваны на падобным жа ўзвышшы, г. зн. па адной планавай схеме. Ва Уладзіміры Валынскім, сярэдневяковы замак якога быў узведзены на старажытнарускім дзядзінцы і меў плошчу, як і мсціслаўскі, 1,5 га (150 × 100 м), таксама налічвалася толькі 5 вежаў, уязная вежа-брама, квадратная ў плане, і чатыры круглыя вежы, якія стаялі па дыяганалі[15].

Верагодна, і мсціслаўскі замак XIV – пачатку XVII ст. быў прыкладам тыповай фартэцыі, якая атрымала далейшае развіццё на старажытнарускім падмурку. Яна стаяла на высокім пагорку, вакол якога ішлі яры глыбінёй да 20 м, што павялічвала яе магутнасць і стварала ўражанне непрыступнасці. Надбрамная вежа, верагодна, была чатырохвугольнай, а астатнія чатыры – круглымі. Такія круглыя ў плане вежы атрымалі распаўсюджанне ў фартыфікацыі з XV ст. таму, што яны лепш забяспечвалі флангавы абстрэл нападаючых у параўнанні з квадратнымі вежамі.

Люстрацыі Уладзіміра-Валынскага замка сярэдзіны XVI ст. сведчаць, што ўмацаванні замка былі з дубу. Хутчэй за ўсё, з дубу былі ўмацаванні і ў Мсціславе. Паміж вежамі Уладзімір-Валынскага замка стаялі зрубныя клеці-гародні, на якіх былі ўзведзены баявыя галерэі. Каб пазбегнуць пажараў, драўляныя часткі фартыфікацыі «до бланкования» абмазваліся глінай і бяліліся.

У двухпавярховай надбрамнай вежы звычайна знаходзіўся механізм, які падымаў герсу – рашотку, што замыкала вароты ў замкавай браме і памяшканні для вартавых. Замак Уладзіміра Валынскага меў па перыметры 70 гародняў. Верагодна, такая ж колькасць гародняў была і на Замкавай гары Мсціслава. Шырыня гародняў, верагодна, не перавышала 3 сажняў – каля 5,7 м. Ва ўсякім выпадку, гародні менавіта такой шырыні былі на Мажайскім замку канца XVI ст., ды і на паўднёвых замках ВКЛ лічылася, што гародні, большыя за 4–5 аршынаў, ужо былі ненадзейнымі[16].

Акрамя фартыфікацыйных збудаванняў, што стаялі на валу, у цэнтры замка на рэштках пабудовы, што загінула ў пажарышчы пачатку XIV ст., даволі хутка быў пастаўлены будынак новай канструкцыі, пабудаваны ў іншых архітэктурных формах (мал. 50). Гэта было драўлянае збудаванне васьміграннай формы, якое, на думку Л. В. Аляксеева, было пабудавана ў канцы першага – другім дзесяцігоддзі XIV ст.[17] Згодна са стратыграфічнымі назіраннямі, гэта і іншыя пабудовы, размешчаныя на мсціслаўскім замку, загінулі ў вялікім па-

---

[15] Кучинко М. М. Древнерусский город Владимир на Волыни // Древнерусский город (Материалы Всесоюзной археол. конф., посвященной 1500 летию города Киева). – Киев: Наук. думка, 1984. – С. 67; Яго ж. З історії середньовічних замків Володимира-Волинського // Zamojsko-Wolyńskie zeszyty muzealne. – T. 2. Numer specjalny. Twierdze kresowe Rzeczypospolitej. – Zamość, 2004. – S. 64–66.

[16] Косточкин В. В. Русское оборонное зодчество конца XIII – начала XVI веков. – М.: Изд-во Акад. наук СССР, 1962. – С. 192; Сергеева-Козина Т. Н. Можайский кремль 1624–1626 гг. (опыт реконструкции) // Крепостные сооружения Древней Руси. – МИА СССР. – № 31. – Т. 2. – 1952. – С. 353; Сас П. М. Феодальные города Украины в конце XV – 60-х годах XVI в. – Киев: Наук. думка, 1989. – С. 44.

[17] Алексеев Л. В. Древний Мстиславль. – С. 154.



Мал. 50. Цэрквы-данжоны (*1*, *3–6*) і часоўня (*2*), знойдзеныя Л. В. Аляксеевым на мсціслаўскім дзядзінцы. Варыянты рэканструкцыі: *1–4* – Л. В. Аляксеева (у перспектыве); *5–6* – Г. В. Барысевіча (аксанаметрыя). *1* – пабудова 2 (другая чвэрць XIII ст.); *2* – пабудова 3 (30–40-я гады XIII ст.); *3* – пабудова 4 (другая палова XIII ст. – каля 1260 г.); *4* – пабудова 5 (канец першага – другое дзесяцігоддзе XIV ст.); *5* – пабудова 4; *6* – пабудова 5 (па: Алексеев Л. В. Проблема становления культово-оборонного зодчества. С. 235)

жары XIV ст., які Л. В. Аляксееў не без падстаў звязвае з захопам Мсціслава Альгердам у 1359 г.

Але і пасля гэтага пажару пабудова была даволі хутка адноўлена і праіснавала да сярэдзіны XVII ст., калі яна загінула падчас штурма Мсціслава войскамі А. Н. Трубяцкога 22 чэрвеня 1654 г.[18]

У над'ярусных напластаваннях дзядзінца Мсціслава адзначаецца вялікая колькасць знаходак узбраення, што, безумоўна, адлюстроўвае ваенную гісторыю горада. Аднак адсутнасць сувязі індывідуальных знаходак з масавым матэрыялам (керамікай) у публікацыях Л.В. Аляксеева зніжае інфарматыўнасць яго даных і не дае магчымасці больш дакладна храналагічна датаваць верхнія стратыграфічныя слаі мсціслаўскага дзядзінца.

Улічваючы, што двор мсціслаўскіх князёў знаходзіўся на тэрыторыі вакольнага горада, пра што гаворка будзе ісці ніжэй, то функцыянальна замак Мсціслава выконваў ролю ваеннай крэпасці і месца захоўвання запасаў і каштоўнасцей яго жыхароў. Пра апошняе сведчаць як пісьмовыя крыніцы, так і прасочаныя Л. В. Аляксеевым падчас археалагічных даследаванняў шматлікія фрагменты невялікіх клецяў[19]. Акрамя таго, шматлікія пацверджанні традыцыі размяшчэння на замках клецяў, або, як яны называюцца ў крыніцах, «кватэр», мы знаходзім у інвентарах суседняга Крычава.

З пісьмовых крыніц XV – першай паловы XVII ст. вядома, што на замку ўвесь час знаходзіўся Мікольскі храм[20]. Л. В. Аляксееў выказаў меркаванне, што Мікольскі храм Мсціслаўскага замка – гэта даследаваная ім драўляная васьмігранная царква. Гэта вежа добра бачна і на фрэсцы кармеліцкага касцёла Мсціслава, якая паказвае штурм замка войскамі Трубяцкога ў 1654 г.

Такім чынам, фартыфікацыйныя збудаванні мсціслаўскага замка XV – першай паловы XVII ст. складаліся з 5 вежаў, што стаялі на валах, і назіральнай вежы, якая стаяла асобна і адначасова выконвала функцыі храма, пры якім існаваў і невялікі манастыр, які сціпла згадваецца ў крыніцах XV – першай паловы XVII ст.[21]

Само размяшчэнне рэшткаў драўлянай царквы, якую Л. В. Аляксееў атаясамлівае з Мікольскім храмам, пры якім быў манастыр, у цэлым адпавядае прынцыпам размяшчэння праваслаўных манастыроў на дзядзінцах гарадоў, што падмацоўвае гіпотэзу даследчыка. Звычайна манастыры, размешчаныя на дзядзінцах, ставіліся ў баку ад замкавых варотаў і ад галоўнай вуліцы і даволі часта прымыкалі да гарадскіх умацаванняў[22]. Падобная схема размяшчэння Мікольскага храма прасочваецца і на Мсціслаўскім дзядзінцы. Сам жа манастыр складаўся не толькі з аднаго храма. Ён абавязкова павінен быў мець келы

---

[18] Алексеев Л. В. Проблемы становления культово-оборонного зодчества Руси. – С. 226.

[19] Алексеев Л. В. Древний Мстиславль. – С. 45.

[20] ИЮМ. – Вып. 24. – С. 420.

[21] АЗР. – Т. 3. – С. 226–227.

[22] Бусева-Давыдова И. Л. Монастырские комплексы // Древнерусское градостроительство X–XV веков. – М.: Стройиздат, 1993. – С. 303.

і трапезную для манахаў і, такім чынам, стварaў бы пэўны комплекс на паўночным ускрайку гарадскога дзядзінца. Акрамя Мікольскага храма на замку была яшчэ і царква Успення Багародзіцы, якая ўвесь час згадваецца ў крыніцах XVI–XVI стст.

З гісторыі абароны Мсціслава захаваўся толькі невялікі пералік зброі, што пастаўлялася ў мсціслаўскі замак падчас вайны 1512–1522 гг. і акты аглядаў зброі, якая мелася ў замку ў 1604 і 1614 гг. А ў 1632 г. адной з прапаноў мясцовай шляхты, якія яна выстаўляла для дэпутатаў на Варшаўскі элекцыйны сейм, было тое, каб замак «згодна даўніх прывілеяў быў адрамантаваны». Пры гэтым да рамонта павінны былі быць прыцягнуты жыхары іншых памежных валасцей[23].

У 1604 г. у мсціслаўскім замку мелася наступная зброя: 7 «дел вялікіх», 3 серпенцыны, 140 целых і 8 разарваных гакаўніц, 10 кіёў, 20 бочак пораху, 2 бочкі сялітры. Акрамя таго, было 157 «куль для дел» – ядраў, 916 куль для гакаўніц і значныя запасы волава і серы, формы для адліўкі куль для гакаўніц.

У 1614 г. колькасць зброі ў мсціслаўскім замку нязначна змянілася, але якасць яе некалькі пагоршылася. Так, з 7 дзел спраўнымі былі толькі 5, з 147 гакаўніц у 7 былі разарваныя ствалы, колькасць кіёў і серпенцын заставалася былой – 10 і 3 адпаведна. Паменшылася колькасць і іншых запасаў. Усё гэта сведчыць пра тое, што ўлічваючы «смуту» ў Рускай дзяржаве пачатку XVII ст. каралеўская ўлада надавала асноўную ўвагу войскам, што дзейнічалі менавіта там, а стану памежных замкаў надавалася значна меншая ўвага. Гакаўніцы яшчэ былі ў мсціслаўскім замку ў 1637 г.[24]

Другой тапаграфічнай структурай Мсціслава з'яўляўся вакольны горад, які размяшчаўся на паўднёвым ад замка пасадзе і пачаў сваё развіцце ў XII–XIII стст. Вакольны горад увесь час згадваецца ў пісьмовых крыніцах XVI–XVII стст., праходзіць то пад назвай «астрог», то пад назвай «паркан», «баркан», у якім для праезду былі вежы-брамы.

Археалагічныя даследаванні і назіранні за распаўсюджаннем культурнага слоя на паўднёвым пасадзе Мсціслава паказалі, што ён у XIV–XV стст. фактычна заставаўся ў тых жа памерах, што і ў XII–XIII стст. – і не выходзіў на поўдні за сучасную вуліцу Савецкую. Адзінае значнае, што ў гэты ж час адбылося ў фарміраванні тапаграфічнай структуры Мсціслава, – умацаванне бліжэй да сярэдзіны XIV ст. гэтага пасада абарончым валам, што пераўтварыла яго ў вакольны горад.

Даследаванні, праведзеныя на схіле прылягаючага да замка плато, у двары кармеліцкага касцёла, выявілі тут першапачатковы абарончы вал вышынёй 1 м і шырынёй 4 м, насыпаны з гліны. Наяўнасць навальных канструкцый не была зафіксвана, але непасрэдна перад валам уздоўж яго трасы стаяў дубовы

[23] РИБ. – Т. 20. – Стб. 1154–1155; НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 222. – Арк. 402 адв.; АСДОИСЗР. – Т. 3. – С. 64, 65, 73, 74; АВК. – Т. 8. – С. 589.

[24] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 316. – Арк. 143–144.

вастракол з бярвенняў дыяметрам 20 см, ад якога захавалася яма са згарэлым бярвеннем (мал. 51).

Датаваць вал сярэдзінай XIV ст. дапамагае знойдзеная ў яго ядры і пад ім кераміка XII–XIII ст. Акрамя таго, пад трасай вала была выяўлена паглыбленая ў мацярык пабудова (мал. 52), у запаўненні якой таксама знойдзена кераміка XII–XIII стст., састаўны касцяны грабеньчык тыпу «О» XII–XIII стст.

Побач з пабудовай, пад трасай вала была расчышчана мацерыковая яма, запоўненая керамікай. У профілі яна нагадвае лацінскую літару «S», венца мае некалькі падрэзаны край. Для некаторай часткі керамікі характэрна наяўнасць слаба выражанага рабра ў месцы пераходу тулава ў шыйку. Падобная кераміка ў Полацку з'яўляецца ў другой палове XIII ст. і бытуе ў больш позні час. У Віцебску яна з'яўляецца ў другой трэці XIV ст., што пацвярджаюць надзейныя дэндрадаты Верхняга замка Віцебска[25].

Такім чынам, фартыфікацыйныя збудаванні вакольнага горада Мсціслава з поўначы і ўсходу былі абумоўлены глыбокімі ярамі, па краю якіх былі насыпаны абарончыя валы, а з боку поля ён быў умацаваны не раней за другую трэць XIV ст. валам з парканам наверсе і ровам.



Мал. 51. Мсціслаў. Прарэзка вала вакольнага горада: *1* – гліна жоўтага колеру; *2* – гліна чырвонага колеру; *3* – гліна цёмна-карычневага колеру; *4* – гліна светла-карычневага колеру; *5* – гліна белага колеру; *6* – гліна светла-жоўтага колеру; *7* – перакоп; *8* – мацярык; *9* – гумус; *10* – вугаль; *11* – пясок; *12* – дрэва

[25] Штыхов Г. В. Древний Полоцк IX–XIII вв. – Минск: Наука и техника, 1975. – С. 82–83, рис. 40, тип. V-Б; Левко О. Н. Профилировка и орнаментика керамики XII–XV вв. северо-восточной Белоруссии // Древнерусское государство и славяне. – Минск: Наука и техника, 1983. – С. 79–81, рис. 18; Бубенько Т. Нижний замок – экономический центр Витебска XIV–XVII в. // Castrum, urbis et bellum. Зб. навук. прац. – Баранавічы: РУУП Баранавіцкая ўзбуйн. друк., 2002. – С. 98. Ветлівае ўдакладненне Л. У. Калядзінскага.



Мал. 52. Мсціслаў. План пабудовы XII–XIII стст. пад валам на вакольным гарадзе

Траса вала з напольнага боку не даследавана, але яго фрагмент быў зафіксаваны падчас назіранняў за земляными працамі каля кацельнай будаўнічага каледжа, побач са скрыжаваннем вуліц Першамайскай і Савецкай. Вал быў зроблены з чырвонай гліны і меў шырыню падэшвы каля 10 м і вышыню 1,5 м. Траса зафіксаванага тут вала з аднаго боку ішла ў напрамку скрыжавання сучасных вуліц Юрчанкі і Савецкай, а з другога – у кірунку вул. Леніна і, мяркуючы па агульным кірунку трасы вала і распаўсюджанні знаходак, што не выходзяць за XIV ст., павінна была выводзіць да яра, які аддзяляе Траецую і Замкавую горы некалькі на ўсход ад сядзібы па вул. Леніна, 8, прыкладна ў тым месцы, дзе каля яра заканчваецца сучасная вул. Камсамольская.

Такім чынам, першапачатковы вакольны горад Мсціслава ахопліваў плошчу каля 5,5–6 га. Час яго узвядзення адносіцца да першай паловы XIV ст. і, магчыма, ён быў пабудаваны адначасова з узвядзеннем на мсціслаўскім дзядзінцы васьміграннай вежы-царквы. Апошняе сведчыць пра тое, што ў першай палове XIV ст. Мсціслаў атрымаў новую фартыфікацыйную сістэму і трохчасткавую тапаграфічную структуру: замак – вакольны горад – пасад. У гэтай сувязі цікавым з'яўляецца той факт, што і Ніжні замак Віцебска толькі ў XIV ст. атрымаў самастойны комплекс фартыфікацыйных збудаванняў[26]. Па сваёй плошчы вакольны горад Мсціслава некалькі саступаў такім гарадам, як Клецк (7,7 га), аднак фактычна адпавядаў умацаванням Пінска (6 га)[27]. Мяркуючы па распаўсюджанні керамікі XIV–XV стст. вакольны горад Мсціслава заставаўся ў адных і тых жа межах на працягу гэтых стагоддзяў.

У фартыфікацыйных збудаваннях вакольнага горада існавалі брамы для выезда па-за яго межы. Дакладная колькасць іх у XIV–XV стст. невядома. У прапанаваным плане рэканструкцыі Мсціслава XII–XIII стст. Р. Баравы выказаўся, што на першапачатковым этапе развіцця вакольнага горада тут была толькі адна вежа-брама, з якой пачыналіся дарогі ў розныя бакі[28]. Магчыма, яно і было

[26] Бубенько Т. С. Средневековый Витебск. Посад – Нижной замок (X – первая половина XIV в.): Монография. – Витебск: Изд-во УО «ВГУ им. П. М. Машерова», 2004. – С. 30–31.

[27] Пазднякоў В. С. Клецк X–XVIII стст. Матэрыяльная і духоўная культура беларускага феадальнага горада. – Мінск: БелНДІДАС, 2008. – С. 27.

[28] Боровой Р. В. Развитие планировочной структуры Мстиславля. – С. 2, рис. 3.

так на пачатковым этапе функцыянавання вакольнага горада Мсціслава, аднак даволі хутка ад гэтай схемы адмовіліся. Пра тое, што вакольны горад Мсціслава ўжо ў XV стст. меў некалькі брам, сведчаць, на наш погляд, наступныя факты.

Па-першае, мяркуючы па плане Мсціслава 1778 г., горад меў выразную радыяльна кальцавую сістэму планіроўкі, якая з'яўляецца найбольш старажытным тыпам і, хутчэй за ўсё, вядзе сваё паходжанне ад самага пачатку забудовы вакольнага горада.

Акрамя замка, другім цэнтрам горада з'яўляўся рынак, які размяшчаўся побач з замкам. На плане Мсціслава 1778 г. на поўдзень ад замка выразна прасочваецца плошча міндалепадобнай формы – найбольш старажытны тып гандлёвых плошчаў, які адным бокам прымыкае да яра[29]. Гэта і ёсць рэшткі старой гандлёвай плошчы, якая існавала тут яшчэ ў пачатку XVII ст. Пра тое, што першапачаткова рынак знаходзіўся тут, сведчаць і пісьмовыя крыніцы.

Так, у 1614 г. Валерыян Дэмбавецкі ахвяраваў мсціслаўскім кармелітам дом, які стаяў на замкавым пляцы, на рынку, пад замкам. Прычым у ахвяраванні ўдакладняецца, што гэты пляц прымыкаў адным бокам да касцёла, а другім – да рынкавых крамаў[30].

Пра тое, што старажытны рынак існаваў недзе каля сучаснага касцёла і над замкавым ярам, сведчыць і другая крыніца пачатку XVII ст., якая згадвае пра існаванне ў 1602 г. побач з гарадскім торгам – «торговище в Мстиславском острозе» – царквы Св. Міколы[31]. Апошняя была пабудавана ў гонар Св. Міколы Мірлікійскага – апекуна гандляроў і вандроўнікаў і на падаснове плана Мсціслава 1778 г. знаходзілася на паўднёва-заходнім ускрайку плошчы, размешчанай каля замка.

Ад гэтай старажытнай гандлёвай плошчы нават на плане 1778 г. адыходзяць чатыры прамяні, якія адлюстроўваюць напрамкі найбольш старажытных і градаўтваральных вуліц горада і дазваляюць меркаваць, што ўжо на даволі раннім этапе функцыянавання фартыфікацыйных збудаванняў вакольнага горада ён меў некалькі брам.

Па-другое, пра тое, што брам на вакольным горадзе Мсціслава было некалькі, сведчыць той факт, што ўжо самая першая згаданая ў крыніцах XV ст. брама вакольнага горада названа па назве саборнага храма Мсціслава – Траецкая. Гэта ўдакладнне крыніцы пра назву брамы – Траецкая, а не проста гарадская брама – таксама дазваляе сцвярджаць, што іх у горадзе было некалькі.

Галоўная вуліца горада ішла, верагодна, паблізу саборнага Траецкага храма, мела адпаведную назву Траецкая і выходзіла праз Траецкую браму, на дарогу, якая вяла, верагодна, у паўднёва-ўсходнім кірунку – у бок Сожа, на Крычаў і далей у паўднёвыя раёны княства. Гэта пацвярджае і крыніца канца XVI ст.:

---

[29] Боровой Р. В. Развитие планировочной структуры Мстиславля. – С. 3.

[30] Smora. Kilka słow o karmelitach a.r.oh. w Mścisławiu . – S. 187.

[31] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 85. – Арк. 176–176 адв.

у 1592 г. двор мсціслаўскага мяшчаніна Мацея Яновіча стаяў за вуліцы «вялікай Крычаўскай», што была за Траецкай брамай[32].

Другі шлях з горада павінен быў выводзіць на гарадскі Падол і за р. Віхра, адкуль адкрываўся самы кароткі шлях у Смаленск. На гэты шлях выводзіла Спаская брама-вежа, што згадваецца ў крыніцах XVI–XVIII стст. Гэты кірунак маркіруе прамы прамень вуліцы на плане 1778 г. ад старажытнага рынку, што пацвярджае існаванне гэтай вуліцы з даўніх часоў.

Як і Траецкая, Спаская брама атрымала сваю назву ад назвы храма, які, згодна з планам Мсціслава канца XVIII – пачатку XIX ст., знаходзіўся на скрыжаванні сучасных вуліц Савецкай і Юрчанкі, каля езуіцкага калегіума, над замкавым ярам.

Месцаразмяшчэнню Спаскай вежы на гэтым месцы не пярэчаць і іншыя крыніцы. Згодна з пісьмовай крыніцай сярэдзіны XVI ст., Спаская вежа стаяла «над замкавым ровам». А адгалінаванне замкавага рова якраз заканчваецца насупраць езуіцкага калегіума, у тым месцы, дзе і стаяла Спаская царква канца XVIII – пачатку XIX ст. Гэта яшчэ раз падкрэслівае існаванне Спаскай брамы-вежы менавіта тут. Нават зараз у гэтым месцы існуе сцежка, якая вядзе з цэнтральнай часткі горада на Панівойскую гару і ў бок Падола. Улічваючы, што Спаская царква згадваецца ў самым пачатку XVI ст., можна сцвярджаць пра яе існаванне, а адпаведна і існаванне аднайменнай вежы-брамы як мінімум з XV ст.

У пачатку XVI ст. у горадзе ўжо існавала Афанасьеўская брама. Яе стан, верагодна, падтрымлівала мсціслаўская шляхта, таму яна мела і іншую назву Шляхецкая[33]. Сучасны мсціслаўскі храм А. Неўскага стаіць на месцы былога бернардзінскага кляштара, а той, у сваю чаргу, згодна з паданнем, быў заснаваны на месцы былой Афанасьеўскай царквы. Адпаведна і згаданую Афанасьеўскую браму-вежу вакольнага горада неабходна шукаць недзе ў гэтым месцы.

На думку І. М. Слюньковай і Р. Баравога, з Афанасьеўскай брамы адкрываўся шлях на Крычаў[34]. Аднак пісьмовыя крыніцы сведчаць, што за Афанасьеўскай брамай вакольнага горада Мсціслава, за гарадскімі прадмесцямі, была развілка дарог на Магілёў і Смаленск[35]. Акрамя таго, неўмацаваны пасад, які існаваў за Афанасьеўскай брамай, у 1664 г. меў адпаведную назву – Магілёўскае прадмесце, якое развівалася ў бок воз. Святое[36].

З горада павінен быў існаваць выезд на захад у бок Радамлі і на паўночны захад у бок Гор і Оршы. На нашу думку, брама таксама існавала недзе тут з XIV–XV стст., і падставай для такой высновы з'яўляюцца наступныя факты.

---

[32] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 77. – Арк. 346.

[33] Тамсама. – Адз. зах. 110. – Арк. 77–77 адв.

[34] Боровой Р. В. Развитие планировочной структуры Мстиславля. – С. 4; Слюнькова И. П. Архитектура городов Верхнего Приднепровья. – С. 24.

[35] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 78. – Арк. 170–170 адв.; ИЮМ. – Вып. 25. С. 482; АВК. – Т. 34. – С. 288.

[36] ИЮМ. – Вып. 25. – С. 443.

У фартыфікацыі Мсціслава XVII ст. аднойчы згадваецца Папоўская вежа, без удакладнення, дзе яна знаходзілася[37]. Між тым на падаснове праектнага плана горада 1778 г. на заходнім ускрайку Мсціслава знаходзіцца праваслаўны храм, у бок якога вяла вуліца ад старажытнага рынку.

Захаваліся два планы Мсціслава канца XVIII – пачатку XIX ст., на адным з якіх размешчаны тут храм называецца ў гонар Св. Афанасія і Кірылы, а на другім – храм Прасвятой Багародзіцы[38]. Ва ўсякім выпадку, мяркуючы па гэтых планах, тут у канцы XVIII ст. стаяла праваслаўная царква, побач з якой на падаснове плана горада XVIII ст. прасочваецца плошча, а за ёй – гарадская забудова. Магчыма, Папоўская брама існавала менавіта тут і, улічваючы змену назвы храма, называлася проста па канфесійнай прыкмеце – Папоўская.

Магчыма, гэта ж Папоўская брама згадваецца яшчэ ў даваенныя часы пад назвай Уваскрасенская. У крыніцы 1638 г., у якой разбіраецца судовая справа паміж падданымі Пустынскага манастыра і жыхарамі горада, гаворыцца, што на першых напалі, калі яны ішлі «ад паркана да маста Вихранскага, на подходе к браме Воскресенской, врочищомъ подъ замкомъ, против дороги узводное в месте Мстиславском, у паркане»[39]. Гэта толькі адзінкавая згадка мсціслаўскай Уваскрасенскай вежы ў крыніцах. Ні раней, ні пазней яна ніколі больш не сустракаецца.

Аналіз гэтага паведамлення дазваляе прыкладна акрэсліць месца размяшчэння гэтай брамы. Па-першае, дарога да яе вяла «подъ замкомъ». Атрымліваецца, што да брамы ішлі ад Віхры пад замкам – уздоўж ручая Здаравец. Другой апорнай кропкай з'яўляецца паведамленне, што яна знаходзілася недзе каля «дороги узводной». Узводную дарогу, верагодна, трэба разумець як дарогу, якая вядзе ў гару. І на гэты раз мы маем супадзенне сучаснага рэльефу мясцовасці з апісанымі ў крыніцы падзеямі. Дарога ўздоўж ручая Здаравец у горад увесь час вядзе ў гару.

Такім чынам, Уваскрасенская брама сапраўды магла быць недзе тут, на заходнім ускрайку Мсціслава, а ўлічваючы існаванне царквы Уваскрасення Гасподня ў горадзе ўжо ў сярэдзіне XV ст., можна сцвярджаць і пра існаванне аднайменнай брамы ў гэты ж час. Аналізуючы пісьмовыя крыніцы, можна сцвярджаць пра існаванне на вакольным горадзе Мсціслава канца XV – пачатку XVI ст. Спаскай, Траецкай, Афанасьеўскай і Папоўскай вежаў.

Калі вызначыць месца размяшчэння Спаскай брамы Мсціслава XV – пачатку XVI ст. не ўяўляе складанасці, то астатнія брамы можна лакалізаваць толькі прыкладна. Месца іх размяшчэння, верагодна, можна вызначыць ізноў дзякуючы аналізу падасновы плана горада 1778 г. На ім прасочваюцца асобныя ўчасткі некалькіх радыусаў раней існаваўшых вуліц, якія звязвалі карот-

---

[37] Трусаў А. Некаторыя вынікі археалагічнага вывучэння акольнага горада Мсціслава. – С. 84; Ткачев М. А. Замки Беларуси. – С. 92; АВК. – Т. 34. – С. 317.

[38] РДАСА. – Ф. 1356. – Воп. 1. – Адз. зах. 2172, 2173.

[39] Материалы по истории Могилевской епархии // МЕВ. – 1890. – № 31–32. – Часть неофициальная. – С. 478.



Мал. 53. Тапаграфія Мсціслава XV–XVI стст.: *1* – Замкавая гара; 2 – Пятніцкая гара; 3 – Дзявочая гара; 4 – Панівойская гара; 5 – рынак. *Храмы і грамадзянскія пабудовы*: *I* – Кафедральны сабор Св. Троіцы; *II* – Св. Міколы; *III* – Успення Прачыстай Багародзіцы; *IV* – Св. Іллі; *V* – Св. Параскевы Пятніцы; *VI* – Св. Міколы; *VII* – Св. Спаса; *VIII* – Св. Афанасія; *IX* – Уваскрасення Гасподня; *X* – Св. Астафія; *XI* – фарны касцёл Узнясення Дзевы Марыі; *XII* – Спаская брама; *XIII* – Афанасьеўская брама; *XIV* – Траецкая брама; *XV* – Папоўская (Уваскрасенская) брама

кім шляхам паміж сабой процілеглыя рагі замкавага яра. Верагодна, ёсць сэнс вызначыць праходжанне трасы вала вакольнага горада ўздоўж другога ад старажытнай гандлёвай плошчы прасочанага радыуса вуліц. А месца размяшчэння Траецкай, Афанасьеўскай і Папоўскай брам шукаць у месцы перасячэння радыусаў гэтых вуліц з прамянямі вуліц, якія шлі ад старажытнага рынку (мал. 53).

З забудовы вакольнага горада Мсціслава XIV–XV стст. вядома, што ўжо ў першай палове XV ст. тут існаваў храм Уваскрасення Гасподня, а ў 1463 г. князем Іванам Юр'евічам і ягонай жонкай княгіней Ульянай на «двары», верагодна, княскім быў закладзены саборны Св. Троіцкі храм. У пачатку XVI ст. (1511 г.) у Мсціславе на вакольным горадзе знаходзілася і Спаская царква, што сведчыць пра яе існаванне ў XV ст.[40] Такім чынам, акрамя двух храмаў на замкавай гары, у Мсціславе XIV–XV стст. існавала як мінімум тры храмы на вакольным горадзе. Пра наяўнасць храмаў на Падоле ў гэты час нічога не вядома.

Недзе на вакольным горадзе Мсціслава існаваў і княскі двор, хаця В. Г. Краснянскі прапанаваў лакалізаваць яго на суседняй з Замкавай Траецкай гары[41]. Час ад часу гэта меркаванне і сёння знаходзіць падтрымку ў іншых даследчыкаў, праўда без якой-небудзь аргументацыі[42]. Аднак неаднаразовае абследаванне Траецкай гары паказала, што сёння яе ўсходняя частка знішчана кар'ерам, а на частцы, якая прылягала да Замкавай гары, культурны слой адсутнічае. Асобныя знаходкі сустракаюцца на размешчаных тут агародах і адносяцца да XIX–XX стст.

Між тым знаёмства з архіўнымі матэрыяламі паказвае, што сваю назву Траецкая гара атрымала дзякуючы таму, што тут знаходзіліся землі, якія ра-

[40] АЗР. – Т. 1. – С. 79–80; НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 83. – Арк. 1 адв.–2.

[41] Краснянский В. Г. Город Мстиславль. – С. 16.

[42] Боровой Р. В. Развитие планировочной структуры Мстиславля. – С. 2; Слюнькова И. Н. Архитектура городов Верхнего Приднепровья. – С. 24.

ней належалі Траецкаму храму. Акрамя таго на Траецкай гары знаходзіліся і землі Пустынскага і былога Мікольскага манастыроў, што калісьці былі на замку[43]. Магчыма, адсюль ідзе і другая назва гары – Троіцка-Мікольская – і сцвярджэнне, што тут некалі існаваў Мікольскі манастыр. Болей таго, у XVII–XVIII стст. тут існавалі ворныя і сенажатныя пляцы мяшчан, але якія-небудзь звесткі пра княскі двор ці нават пра якую-небудзь забудову адсутнічаюць[44]. Таму няма ніякіх падстаў шукаць двор мсціслаўскіх князёў, царкву Св. Троіцы і царкву Св. Міколы на Траецкай гары.

На гэту думку таксама наводзіць паведамленне 1537 г. пра наданне ўдавы князя Міхаіла Іванавіча мсціслаўскага княгіні Ульяны Траецкаму храму. Крыніца паведамляе, што Траецкі сабор у свой час быў спалены маскоўскімі войскамі і князь Міхаіл Іванавіч вымушаны быў не толькі яго аднавіць, але і пабудаваў у ім два новыя прытворы – Св. Арцемія і Св. пакутніцы Васілісы[45]. Крыніцы пачатку XVI ст. нічога не паведамляюць нам пра захопы маскоўскімі войскамі мсціслаўскага замка, а вось яго пасады і вакольны замак – «астрог», яны палілі ў 1502, 1508 і ў 1514 гг.

Гэта дазваляе сцвярджаць, што храм Св. Троіцы XIV – першай паловы XVII ст. размяшчаўся на тэрыторыі вакольнага горада, а ўлічваючы традыцыю будаўніцтва храмаў на старым месцы, можна выказаць гіпотэзу, што княскі двор і размешчаны на ім галоўны саборны храм горада размяшчаўся прыкладна на тым месцы, дзе ён паказаны на падаснове плана горада 1778 г. – у квартале, абмежаваным сучаснымі вуліцамі Леніна, Першамайскай, Калініна, Савецкай.

Традыцыя ж размяшчэння княскіх двароў па-за межамі дзядзінцаў гарадоў даўно вядома і прасочваецца ў Смаленску, Полацку, Галічы, Ноўгарадзе, Пскове, Ст. Разані, Уладзіміры[46]. Падобная сітуацыя прасочвалася і ў больш познія часы. Так, напрыклад, князі Радзівілы, акрамя палаца ў замку, мелі свой дом і на гарадской тэрыторыі Нясвіжа нават у XVIII ст. Магчыма, сама наяўнасць княскага двара па-за межамі дзядзінца горада адлюстроўвае існаванне пэўнай аўтаноміі гарадоў ад княскай улады, што знаходзіць пацвярджэнне ў складанні «рядоў» паміж горадам і князем[47].

У XIV–XV стст. у Мсціславе працягнулі сваё далейшае развіццё неўмацаваныя пасады, што ўзніклі ў XII–XIII стст. Сляды неўмацаванага пасада XIV–XV стст. на поўдзень ад сучаснай Савецкай вуліцы археалагічна прасочваюцца вельмі слаба. Ды і пісьмовыя крыніцы гэтага часу таксама не сведчаць пра яго існаванне.

---

[43] РДАСА. – Ф. 1356. – Воп. 2. – Адз. зах. С-18, С-22.

[44] Тамсама. – Ф. 1319. – Воп. 2. – Адз. зах. 234. – Арк. 2 адв. – 3 адв.; НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 100. – Арк. 301–301 адв.

[45] АСДОИСЗР. – Т. 2. – С. 11–12.

[46] Мокеев Г. Я., Щенков А. С. Планировочная структура города // Древнерусское градостроительство XII–XV веков. – М.: Стройиздат, 1993. – С. 44.

[47] Черепнин В. В. К вопросу о характере и форме древнерусского государства // Исторические записки. – 1972. – № 89. – С. 390–392.

Больш значна развіваўся пасад на Падоле. Прычым калі ў папярэдні час, улічваючы колькасць керамікі, гэта былі паселішчы, якія яшчэ толькі пачыналі сваё развіццё, то ў новы час інтэнсіўнасць жыцця тут значна актывізавалася.

На тэрыторыі Падола кераміка XIV–XV стст. сустракаецца як уздоўж ручая Здаравец, так і ўздоўж р. Віхра. Шырыня распаўсюджання керамікі зараз некалькі пашыраецца. Падол пачынае асвойваць схіл Пятніцкай гары, што нахілены ў бок р. Віхра, яго шырыня дасягае амаль 100 м ад русла ракі і ахоплівае тэрыторыю паміж сучаснымі вуліцамі Пушкіна і Рэспубліканскай. Была актыўна заселена і тэрыторыя на ўсходнім схіле Траецкай гары вышэй вусця ручая Здаравец. Агульная плошча гэтага пасада на Падоле дасягала не меней за 7–8 га.

Акрамя археалагічных крыніц пра засяленне тэрыторыі Падола (ва ўсякім выпадку, з канца XV – пачатку XVI ст., з часоў князя Міхаіла Іванавіча) сведчаць і пісьмовыя крыніцы[48]. Больш таго, верагодна, ужо ў канцы XV ст. пачало засяляцца і ўзвышша на левым беразе р. Віхра насупраць горада. У наданні на Пустынскі манастыр ад 14 верасня 1500 г. кароннага пісара Аляксандра Богуша Багавітовіча згадваецца в. Слабодка[49]. Пра тое, што гэта, магчыма, быў менавіта сённяшні гарадскі раён Зарэчча (Слабада) сведчыць другое наданне Пустынскаму манастыру ад 1511 г., у якім пры апісанні абмежаванняў манастырскай сенажаці, што размяшчалася за гарадскім мастом праз Віхру, згадваецца і «слабадская дарога»[50]. Ну а ў 1581 г. мсціслаўскі стараста Павел Пац забраў выпасы мсціслаўскага манастыра, размешчаныя на левым беразе Віхры, і аддаў іх месцічам, а ў канцы 1593 г. на слабадзе за р. Віхра ён жа надаў пляц для будавання дома мсціслаўскага пратапопа[51].

У той жа час кераміка XIV–XV стст. цалкам адсутнічае на Панівойскай гары. Магчыма, у гэты час насельніцтва па нейкіх прычынах пакінула Панівойскую гару і перасялілася бліжэй да вады, на бераг Віхры, а магчыма, гэта толькі вынік слабай даследаванасці гэтага раёна горада.

Адсутнасць інвентарных апісанняў Мсціслава XV ст. не дазваляе дакладна высветліць колькасць дымоў у горадзе і жыхароў, якія пражывалі ў ім. Аднак улічваючы, што нават ў падначаленых яму Мгліну і Паповай Гары ў 1500 г. было больш чым па 500 дымоў у кожным[52], можна сцвярджаць, што і ў Мсціславе, цэнтры ўдзельнага княства, іх было не менш, а колькасць жыхароў, калі прыняць сярэднюю колькасць чалавек у сям'і за 6, была не меней за 3500–4000 чалавек, што адпавядала колькасці жыхароў сярэдняга горада Вялікага Княства Літоўскага. Пра значнасць Мсціслава як гарадскога цэнтра сведчаць і знаходкі ў апошні час у яго навакольлях скарбаў раней невядомых манет,

[48] ИЮМ. – Вып. 25. – С. 466; АВК. – Т. 34. – С. 322.
[49] НГАБ. – Ф. 2311. – Воп. 1. – Адз. зах. 7. – Арк. 17.
[50] АЗР. – Т. 2. – С. 80.
[51] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 76. – Арк. 176 адв., 395 адв.–395.
[52] ДМАМЮ. – Т. 1. – С. 65, 67.

якія дазволілі некаторым даследчыкам выказаць меркаванне пра магчымасць існавання тут невялікага манетнага двара[53].

Першая трэць XVI ст. у гісторыі Мсціслава была часам, не зусім спрыяльным для развіцця горада. У гэты час горад пяць разоў – у 1500, 1502 (двойчы), 1508, 1514 і 1535 гг. – асаджалі рускія войскі, знішчаліся пасады і вакольны горад, штурмаваўся замак.

Тым не менш у гісторыі Мсціслава менавіта XVI ст. і пачатку XVII ст. трэба вылучыць асобны перыяд, калі горад, згодна з археалагічнымі данымі, вырас амаль у два разы. Фактычна XVI і пачатак XVII ст. адносяцца да перыяду росквіту горада.

Па-першае, на поўдзень ад замка культурны слой гэтага часу сустракаецца ўжо ў межах сучасных вуліц Калініна і Пралетарскай, што ў абодва бакі ад Замкавай гары дасягае 500 м. Фактычна толькі на гэтай тэрыторыі горад ахопліваў плошчу каля 20–25 га.

Тут за вакольным горадам пачалі фарміравацца пасады. Пра забудову пасадаў за вакольным горадам сведчыць прывілей продкам Яна Сутоцкага ад князя Міхаіла Іванавіча на пляц «в месце Мсціслаўскім» «за брамай Афанасеўскай, за валам», прывілей мсціслаўскаму пушкару Сямёну Станіслававічу «на пляц для будованья дому на предместье, за острогом лежачый». Нейкая вуліца, як адзначалася вышэй, ішла ад замка ў бок р. Віхра паблізу царквы Узнясення Хрыстова. На вуліцы, што вяла з горада на Падол, каля ручая Здаравец, у пачатку XVII ст. (1603 г.) ужо стаяла царква Св. Іллі[54], што сведчыць пра яе існаванне як мінімум з канца XVI ст. Магчыма, гэта была Іллінская вуліца, што існавала ў Мсціславе ўжо ў 1592 г.)[55]. У 1565 г. згадваецца «на месте Мстиславском за острогом» царква «святого Остафья»[56].

Згодна з пісьмовымі данымі, у канцы XVI – пачатку XVII ст. ужо была заселена большая частка Падола. Пра гэта сведчыць існаванне на розных яго баках цэркваў Св. Іллі і Св. Параскевы Пятніцы. Апошняя стаяла на вядомай і зараз Пятніцкай горцы, на скрыжаванні вуліц Рэспубліканскай і Пушкіна – насупраць Панівойскай гары. Акрамя таго, спрэчкі, што распачаліся ў пачатку XVII ст. за маёмасць Пустынскага манастыра, таксама сведчаць, што на тэрыторыі Падола, якая прылягала да Траецкай гары, размяшчаліся слабоды Пустынскага манастыра[57].

Нельга выключыць, што ў горадзе ў XVI ст. акрамя рынку пад замкам існавала яшчэ адна гандлёвая плошча, якая размяшчалася на гарадскім Падоле. На карысць гэтага гавораць як пісьмовыя звесткі, так і наяўнасць царквы

---

[53] Борейша Ю., Иванаускас Э. «Мстиславские монеты»: монеты заговора Михаила Олельковича 1481 г. – Минск: Тесей, 2009. – 20 с.

[54] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 85. – Арк. 219 адв.

[55] Тамсама. – Адз. зах. 77. – Арк. 337 адв.–338.

[56] АЗР. – Т. 3. – С. 97, № 23.

[57] Копысский Э. Ю. Экономическое развитие городов Белоруссии во второй половине XVII–XVIII вв. – Минск: Наука и техника. – 1966. – С. 65; ИЮМ. – Вып. 24. – С. 448, 451.

Св. Параскевы Пятніцы[58]. Апошняя, разам са Святым Мікалаем Мірлікійскім, была заступніцай гандлёвай справы, апякункай купцоў і вандроўнікаў, і будаўніцтва цэркваў у іх гонар на рынку было даволі распаўсюджанай з'явай. Так, цэрквы ў гонар Св. Параскевы Пятніцы стаялі на рынках Крычава, Віцебска[59]. У цэлым спалучэнне гістарычных і археалагічных крыніц паказвае, што ў канцы XVI – пачатку XVII ст. Мсціслаў займаў плошчу каля 35 га.

Падчас вайны 1632–1634 гг. Мсціслаў моцна пацярпеў. Згодна з паведамленнямі рускіх ваяводаў да рускага цара, пад яго сценамі ў студзені 1633 г. войска ВКЛ было разбіта войскамі Багдана Нагога: былі спалены гарадскія пасады і воласць Мсціслава. Акрамя таго паведамлялася, што ў рускі палон выведзена каля 3 тыс. чалавек[60].

Менавіта пасля гэтага пагрому для хутчэйшага адраджэння горада яму было нададзена магдэбургскае права. І, магчыма, менавіта тады ў горадзе была праведзена карэнная перапланіроўка вакольнага горада, у выніку чаго ён не толькі пашырыў сваю тэрыторыю, але ў лініі яго фартыфікацыі з'явілася новая брама, а ў цэнтры вакольнага горада быў арганізаваны новы рынак, які стаў не толькі новым рамесна-гандлёвым цэнтрам, але і планіровачным цэнтрам горада.

Гэта плошча, амаль квадратнай ці прамакутнай формы, добра прасочваецца на падаснове плана Мсціслава 1788 г., і менавіта ад яе адыходзіць большая частка вуліц горада, што вядуць за яго межы.

Новая брама-вежа вакольнага горада – Хіславіцкая – упершыню згадваецца ў прывілеі кароля Уладзіслава IV на магдэбургскае права Мсціславу і ў канфірмацыйным прывілеі правоў і вольнасцей Мсціслава 1738 г., дзе паведамляецца, што мсціслаўскія мяшчане павінны рамантаваць астрог – ад «башни Хославской до башни Спаской»[61]. З гэтага паведамлення вынікае, што башня «Хославская» стаяла ў адным радзе са Спаскай брамай, і менавіта адсюль пачынаўся выезд на Хіславічы.

Хутчэй за ўсё, Хіславіцкую вежу трэба шукаць на поўдзень ад сучаснага езуіцкага калегіума, там, дзе на падаснове плана горада 1778 г. прасочваецца разгалінаванне вуліц. Адна з іх з'яўлялася пачаткам новага радыуса і ішла ўздоўж трасы новага вала ад Спаскай брамы. Другая вуліца, што прыводзіць нас сюды, вядзе ад новага рынку. Спалучаюцца гэтыя вуліцы прыкладна ў раёне скрыжавання сучасных вуліц Юрчанкі і Пралетарскай.

---

[58] Копысский Э. Ю. Экономическое развитие городов Белоруссии... – С. 65; ИЮМ. – Вып. 24. – С. 448, 451.

[59] Мокеев Г. Я. Черты своеобразия в структуре городов восточных и западных славян // Архитектурное наследство. – 1975. – № 23: Национальные своеобразия и взаимовлияния архитектуры народов СССР. – С. 9; Бубенько Т. С. Торговые и культурные связи Витебска (по материалам Нижнего замка) // ГАЗ. – Мінск, 1994. – № 3. – С. 115–121; Мяцельскі А. А. Старадаўні Крычаў. – С. 45.

[60] АМГ. – Т. 1. – С. 442–443, 462, 480, 629.

[61] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 111. – Арк. 154; Тамсама. – Адз. зах. 138. – Арк. 185; Тамсама. – Адз. зах. 170. – Арк. 189.

Мяркуючы па назве, з гэтай Хіславіцкай брамы адкрываўся шлях на Хіславічы і Тупічэўскі манастыр. Акрамя таго, мяркуючы па падаснове плана Мсціслава 1778 г., менавіта тут пачыналася дарога на Крычаў. Ва ўсякім выпадку, на плане менавіта адсюль паказана дарога на Казіміраву слабаду, адкуль адкрывалася дарога на в. Парадніна і далей на Крычаў. Такім чынам, атрымліваецца, што горад павялічыўся ў паўднёва-ўсходнім кірунку, а новая Хіславіцкая брама ўзяла на сябе абслугоўванне напрамку, які раней адносіўся да Траецкай брамы.

Верагодна, тады былі ўзведзены на новых месцах і астатнія брамы-вежы – Траецкая, Афанасьеўская і Папоўская, месца размяшчэння якіх трэба шукаць, верагодна, у месцы спалучэння прамянёў вуліц, якія ішлі ад новай гандлёвай плошчы, з чацвёртым радыусам вуліц (мал. 54). Улічваючы сучасную планавую сітуацыю і магчымую схему размяшчэння мсціслаўскіх брам-вежаў, можна меркаваць, што яны стаялі ў лініі гарадскіх умацаванняў прыкладна праз кожныя 300–350 м. Выключэнне складалі толькі Траецкая і Афанасьеўская вежы, якія, верагодна, стаялі побач.



Мал. 54. Тапаграфія Мсціслава XVII ст.: *1* – Замкавая гара; *2* – Пятніцкая гара; *3* – Дзявочая гара; *4* – Панівойская гара; *5* – стары рынак; *6* – новы рынак. *Храмы і грамадзянскія пабудовы: I* – Кафедральны сабор Св. Троіцы; *II* – Св. Міколы; *III* – Успення Прачыстай Багародзіцы; *IV* – Св. Іллі; *V* – Св. Параскевы Пятніцы; *VI* – Св. Міколы; *VII* – Св. Спаса; *VIII* – Св. Афанасія; *IX* – Уваскрасення Гасподня; *X* – Св. Астафія; *XI* – першапачатковы фарны касцёл Узнясення Дзевы Марыі; *XII* – касцёл і кляштар айцоў-кармелітаў; *XIII* – Сашэсця Св. Духа Тупічэўскага манастыра; *XIV* – Спаская брама; *XV* – Хіславіцкая брама; *XVI* – Афанасьеўская брама; *XVII* – Траецкая брама; *XVIII* – Папоўская (Уваскрасенская) брама; *XIX* – ратуша

Прапанаваныя Р. Баравым і І. Слюньковай варыянты размяшчэння брам Мсціслава, якія абапіраюцца выключна на разгалінаванне вуліц, што фіксуецца на ўскрайку горада, на наш погляд, не зусім слушнае, таму што яны не ўлічваюць існаванне па-за межамі вакольнага горада неўмацаваных пасадаў[62]. Яны таксама мелі сваю планіроўку, якая і завяршалася разгалінаваннем дарог, што паказаны на плане горада 1778 г.

Тым не менш з прапанаванай папярэднікамі рэканструкцыяй планіроўкі і забудовы Мсціслава XVI–XVII стст. у цэлым можна пагадзіцца, але неабходна дадаць некаторыя ўдакладненні, у першую чаргу – наяўнасць Хіславіцкай вежы-брамы, пра якую яны не згадваюць наогул.

У горадзе акрамя новага рынку, які стаў новым планіровачным цэнтрам з ратушай пасярэдзіне і крамамі, працягвала існаваць і старая рынкавая плошча з касцёлам і царквой Св. Мікалая на ёй. Акрамя таго, што на гэтым рынку былі крамы, вядома, што побач з рынкам існавала і «местская тюрма»[63], якая згадваецца ў крыніцах канца XVI – першай паловы XVII ст. Магчыма, тут, у старым цэнтры горада, знаходзіўся і «дом гасцінны», што згадваецца ў крыніцы пачатку XVII ст. (1611 г.), які пабудаваў сваім коштам суддзя земскі Геранім Валовіч[64]. А ў 1634 г. ён ужо знаходзіўся ў руках месцічаў, што пацвердзіў кароль сваім прывілеем на магдэбургскае права.

Новы рынак быў з ратушай ў цэнтры, якая, згодна з прывілеем на магдэбургскае права, павінна была мець гадзіннік. Прычым у прывілеі адзначалася, што мяшчане ўжо выкупілі пляцы ў горадзе пад ратушу і ім дазвалялася працягваць выкупляць пляцы вакол яе. Таму ў пэўным сэнсе наданне гораду магдэбургскага права не было нечаканасцю для яго жыхароў, а месцічы свядома дабіваліся гэтага права яшчэ да падзей вайны 1632–1634 гг.

Паступова, верагодна, на новы рынак пераносіліся і іншыя ўстановы, неабходныя для функцыянавання рамесна-гандлёвага цэнтра – «крамы і каморы для складанняў рэчаў і тавараў, ...яткі мясныя і лаўкі па продажу хлебных вырабаў і іншых прадуктаў харчавання, пастрыгальня сукнаў, гарадская лазня»[65], гасцінны двор. Неад'емнымі часткамі гасціннага двара былі «вага» і «васкабойня» – памяшканні, дзе ажыццяўлялася ўзважванне тавараў і тапленне воску. Горад павінен быў «шпітальны дом для убогіх пабудаваць», і на яго ўтрыманне павінна было ісці па адным бервяне з кожнага воза дрэва, якое прывозілі ў Мсціслаў на продаж[66].

Вулічная планіровачная структура ў гэты час усё больш актыўна развіваецца на Падоле. Гэта пацвярджаюць як археалагічныя, так і пісьмовыя кры-

---

[62] Боровой Р. В. Развитие планировочной структуры Мстиславля. – С. 2; Слюнькова И. Н. Архитектура городов Верхнего Приднепровья. – С. 24.

[63] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 76. – Арк. 474; Тамсама. – Адз. зах. 316. – Арк. 143–144.

[64] Тамсама. – Адз. зах. 86. – Арк. 863 адв.

[65] Тамсама. – Спр. 111. – Арк. 154 адв.

[66] Тамсама. – Арк. 154 адв., 155.

ніцы. Матэрыялы XVI–XVII стст. сустракаюцца па ўсёй тэрыторыі Падола, ад Віхры да Пятніцкай горкі і Дзявочай гары.

Акрамя таго, гэта пацвярджаюць і пісьмовыя крыніцы. Ад Пятніцкай гары, верагодна, у бок р. Віхра ішла Пятніцкая вуліца, якая згадваецца ў XVII–XVIII стст. Як яна ішла, дакладна не зразумела. У той жа час у гэты самы год (1664 г.) у другой крыніцы згадваецца «пляц в месте за барканом улицей идучей до Девичого городка»[67]. Зараз у горадзе існуе адна вуліца, па якой можна падысці да Дзявочай гары з двух бакоў і якую можна атаясаміць са згаданай у сярэдзіне XVII ст. вуліцай. Гэта сучасная вуліца Пушкіна, якая адной сваёй часткай ідзе з левага боку ад Пятніцкай гары ўніз да Віхры і, магчыма, менавіта яна раней называлася Пятніцкай вуліцай, якая магла існаваць як мінімум з XVI ст., калі ўпершыню згадваецца Пятніцкая царква. Другі фрагмент сучаснай вуліцы Пушкіна вядзе на Дзявочую гару над Віхрой, магчыма, гэта тая безыменная вуліца, што згадваецца ў крыніцы 1664 г. Матэрыялы пад'ёмных збораў з агародаў мясцовых жыхароў пацвярджаюць, што гэты схіл, які вядзе ад Пятніцкай гары да р. Віхра, быў заселены як мінімум з XIV ст., але асабліва актыўна пачаў засяляцца з XVI ст.

Ад Пятніцкай царквы нейкая вуліца вяла да Спаскага храма[68]. Верагодна, яна праходзіла па трасе сцежкі, якая і зараз ідзе над ярам, што аддзяляе Панівойскую гару і плато, якое прылягае да замка. Недалёка ад Спаскага храма ў 1579 г. была вуліца Вялікая[69], пра месцаразмяшчэнне якой гаворка будзе ісці ніжэй.

З іншых вуліц Мсціслава ў XVII ст. (1645 г.) згадваюцца Рынкавая і Пірагоўская[70]. Першая з іх існавала, верагодна, на вакольным горадзе і, хутчэй за ўсё, вяла з замка на рынак. Яна праходзіць у крыніцах і пад іншай назвай – Базарная. А другая вуліца, мяркуючы па назве, размяшчалася ў паўднёва-заходняй частцы пасада і выводзіла на дарогу, што вяла ў бок сучаснай вёскі Пірагова.

У цэлым назіранне за распаўсюджаннем культурнага слоя Мсціслава паказвае, што да сярэдзіны XVII ст. горад значна павялічыў свае памеры. Калі на тэрыторыі вакольнага горада напластаванні культурнага слоя з матэрыяламі, не старэйшымі за сярэдзіну XVII ст., амаль не выходзяць за межы сучаснай Першамайскай вуліцы, то ў бок Віхры ўся сучасная гарадская тэрыторыя была занята. Акрамя таго, паселішча існавала за Віхрой на Слабадзе, і пачалося жыццё недалёка ад горада, у Тупічэскім манастыры. Агульная плошча Мсціслава ў сярэдзіне XVII ст. была не меней за 45–50 га.

У пачатку XVII ст. сустракаюцца і першыя ўскосныя звесткі, якія дазваляюць зрабіць пэўныя высновы аб колькасці жыхароў Мсціслава. Так, у 1614 г.

---

[67] ИЮМ. – Вып. 24. – С. 447–451.

[68] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 76. – Арк. 493 адв.; Тамсама. – Ф. 1729. – Воп. 1. – Адз. зах. 62. – Арк. 306.

[69] Тамсама. – Адз. зах. 77. – Арк. 46–47.

[70] Тамсама. – Адз. зах. 330. – Арк. 146 адв., 270.

Мсціслаў выстаўляў апалчэнне ў колькасці 700 чалавек[71]. Апошняе дазваляе выказаць меркаванне, што ў горадзе на той час жыло не менеў за 5–6 тыс. чалавек. Такім чынам, у параўнанні з рубяжом XV–XVI стст. колькасць насельніцтва ў Мсціславе павялічылася нязначна, што, верагодна, было выклікана шматлікімі войнамі паміж ВКЛ і Рускім царствам на працягу XVI ст. У той самы час колькасць насельніцтва Мсціслава ў 5–6 тыс. чалавек у пачатку XVII ст. сведчыць, што гэта быў даволі значны горад ВКЛ. Бо нават у радзівілаўскім Нясвіжы ў пачатку XVII ст. налічвалася ненашмат болей за 2 тыс. жыхароў, а ў другім радзівілаўскім горадзе, Белай, было толькі 130 дымоў[72] – каля 700–800 жыхароў.

Аднак, верагодна, на самай справе колькасць насельніцтва Мсціслава была значна большай. Ва ўсякім выпадку, у 1646 г., калі адбылося выступленне жыхароў Мсціслава супраць мсціслаўскага Пустынскага базыльянскага кляштара, то на яго чале стаяў двухтысячны натоўп мужчын «не считая женщин»[73]. Такая колькасць у горадзе толькі мужчынскага (праваслаўнага) насельніцтва дазваляе выказаць меркаванне, што ў Мсціславе на той час пражывалі разам з каталікамі і прадстаўнікамі іншых веравызнанняў, жанчынамі, дзецьмі каля 7–8 тыс. чалавек. Ды і наступная бліжэйшая дата, якая дае некаторае ўяўленне пра колькасць жыхароў горада, ускосна падводзіць нас таксама да гэтай лічбы.

22 ліпеня 1654 г. Мсціслаў быў амаль цалкам знішчаны рускімі войскамі пад кіраўніцтвам князя А. М. Трубяцкога: «...боярин и воевода князь Алексей Никитич Трубецкой с товарищи город Мстиславль взял и высек и выжег, а пробил в нем больши пятина-десяти (15. – *А. М.*) тысяч...»[74]. Безумоўна, у Мсціславе падчас аблогі знаходзіліся не толькі жыхары горада, не толькі навакольная, але і смаленская, і крычаўская шляхта, што збегла сюды, хаваючыся ад рускіх войскаў. Калі нават мы будзем лічыць, што толькі палова са згадваемай колькасці былі жыхарамі горада, а астатняя палова – гэта беглая шляхта і члены іх сямей, то і тады мы атрымліваем колькасць жыхароў Мсціслаўля не менеў за 7–8 тыс. чалавек. Аднак, безумоўна большасць загінуўшых былі жыхарамі самога Мсціслава, таму колькасць яго жыхароў можна падняць да 10 тыс. чалавек.

У выніку маскоўскага пагрому Мсціслаў быў знішчаны, і пасля вайны горад фактычна нанова адраджаўся. Звесткі пра забудову і стан горада другой паловы XVII – першай паловы XVIII ст. адсутнічаюць. Аднак, верагодна, стан горада быў вельмі дрэнным, бо ў 1667 г. у Мсціславе налічваўся толькі 121 дым «на праве магдэбургскім»[75]. Калі ў горадзе ў той час была такая ж колькасць

---

[71] АМГ. – Т. 2. – С. 99.

[72] Kempa T. Mikołaj Krzysztof Radziwiłł Sierotka (1549–1616). Wojewoda wileński. – Warszawa: Wyd. naukowe Semper, 2000. – S. 235–236.

[73] Копысский Э. Ю. Экономическое развитие городов Белоруссии... – С. 32, 115.

[74] Акты, собранные в библиотеках и архивах Российской империи археографической экспедицией Императорской Академией наук.– СПб.: Тип. Имп. Акад. наук , 1836. – Т. 4. 1645 1700. – С. 128.

[75] Metryka Litewska. Rejestry podymnego. – 2008. – S. 63.

шляхецкіх, замкавых і духоўных дымоў, то агульная іх колькасць дасягала не болей за 250, а колькасць жыхароў набліжалася да 1500–1800 чалавек. І сапраўды, горад толькі пачынаў адраджацца, і першапачаткова яму было нават не да аднаўлення фартыфікацыі, бо толькі ў 1676 г. сейм Рэчы Паспалітай падтрымаў прапанову паслоў Мсціслаўскага ваяводства пра аднаўленне мсціслаўскага замка[76]. У такім жа занядбалым стане знаходзілася і фартыфікацыя вакольнага горада. У 1665 г. Спаская брама-вежа яшчэ не была адрамантавана і згадваецца ў крыніцы як «бывшая»[77]. Горад пасля вайны яшчэ доўгі час не мог дасягнуць даваеннай колькасці насельніцтва, бо ў 1682 г. у горадзе разам са староствам налічвалася толькі 378 дымоў[78].

Другая палова XVII–XVIII ст. былі часам паступовага яго адраджэння і росту, хаця і тут у 1708 г. горад быў цалкам спалены рускімі войскамі і яму давялося нанова адраджацца. Аднак гэта была аднамомантная падзея, якую Мсціслаў змог даволі хутка перажыць.

Мяркуючы па насычанасці знаходкамі ў культурным слоі, горад у той час жыў актыўным жыццём і меў развітую рамесную вытворчасць: ганчарства, кафлярства, шкларобства і інш. Менавіта да гэтага часу (XVIII ст.) адносіцца будаўніцтва ў Мсціславе трох мураваных каталіцкіх храмаў і кляштараў (бернардзінскі, кармеліцкі і езуіцкі), што таксама падцвярджае інтэнсіўнасць жыцця горада. Таму, нягледзячы на ваенны пагром, другая палова XVII–XVIII стст. была часам далейшага паступовага развіцця Мсціслава.

Уяўленне пра Мсціслаў сярэдзіны – другой паловы XVIII ст. дае праектны план горада 1778 г., на якім прасочваецца больш ранняя падаснова. Згодна з ім Замкавая гара не мела ніякіх пабудоў, што дазваляе сцвярджаць, што замак ужо страціў сваё ваеннае значэнне. Мяркуючы па плане 1778 г., у горадзе працягвалася захоўвацца тапаграфічная структура, якая склалася ў сярэдзіне XVII ст. Пра апошняе сведчыць тое, што знойдзеная ў 1986 г. А. А. Трусавым касцярэзная майстэрня XIV–XVI стст. па сваім месцаразмяшчэнні супадае з трасай сучаснай вуліцы Першамайскай. Майстэрня ўяўляла з сябе паўзямлянку, паглыбленую ў мацярык на 1,5 м, і была знішчана пажарам, які, мяркуючы па знаходках керамікі, адбыўся ў першай палове XVI ст.[79]

Недзе ў цэнтры горада знаходзілася Афанасьеўская вуліца. На ёй, насупраць езуіцкага кляштара размяшчаліся забудаваныя пляцы езуітаў, на адным з якіх з часоў Жыгімонта Вазы стаяла крама, у якой гандлявалі лікёрамі і іншымі рэчамі[80]. З Падола на рынак вяла вуліца «Дужая» (магчыма, Вялікая), на якой у пачатку XVIII ст. (1731 г.) згадваецца царква Св. Пятніцы[81]. Верагодна, гэта ніжняя частка сучаснай Рэспубліканскай вуліцы ад р. Віхра да Пятніц-

[76] Ткачев М. А. Замки Беларуси. – С. 94.
[77] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп 1. – Адз. зах. 50. – Арк. 244–244 адв.; ИЮМ. – Вып. 24. – С. 494.
[78] Morzy J. Kryzus demograficzny na Litwe i Białorusi w 1 połowie XVII w. – S. 336.
[79] Трусаў А. Мсціслаўская касцярэзная майстэрня // ПГКБ. – 1989. – № 1. – С. 18–19.
[80] ИЮМ. – Вып. 30. – С. 78.
[81] НГАБ. – Ф. 1729. – Воп. 1. – Адз. зах. 35. – Арк. 418.

кай горкі, на якой і стаяла Пятніцкая царква. Згаданы рынак, верагодна, знаходзіўся насупраць Пятніцкага храма – на Панівойскай гары. Ва ўсякім разе, менавіта на гэтым месцы на падаснове плана Мсціслава 1778 г. паказана нейкая плошча. Гэта Вялікая вуліца не толькі вяла з вакольнага горада на Падол, але далей выводзіла на Зарачанскі мост, на гарадскую слабаду Зарэчча, і далей адкрывалася дарога на Пустынскі манастыр, на Любавічы, Манастыршчыну, Смаленск. Крыніца 1685 г. згадвае існаванне ў Мсціславе Мікольскай вуліцы[82], якая размяшчалася недзе каля Мікольскага храма.

У цэлым, мяркуючы па падаснове плана горада 1778 г., Мсціслаў у XVIII ст. меў галінападобную планіровачную структуру, аснову якой складалі вуліцы-прамяні, якія ішлі ад новай гандлёвай плошчы, размешчанай у цэнтры горада. Акрамя таго, захоўваліся традыцыі, закладзеныя ў папярэднія часы, калі гандлёвая плошча была каля Замкавай гары.

Мураваныя культавыя пабудовы, якія пачалі актыўна будаваць у горадзе ў XVIII ст., займалі сваё месца ў лініі планіровачнай структуры горада. Невядома, ці была ў гэты час адроджана фартыфікацыя вакольнага горада. Аднак мураваныя храмы, што былі ўзведзены ў XVIII ст. занялі свае месцы каля былых брамаў. Так, езуіцкі калегіум заняў сваё месца побач з Хаславіцкай брамай. Пабудаваны на месцы Афанасьеўскай царквы бернардзінскі кляштар заняў месца каля Афанасьеўскай брамы. Мураваны кармеліцкі кляштар фланкіраваў падыходы да замка. Фактычна, з трох бакоў падыходы да замка былі прыкрыты мураванымі касцёламі.

Згодна з планам Мсціслава 1778 г., горад у канцы XVIII ст. на ўсходзе амаль не выходзіў за межы сучаснай вул. Калініна. Яго паўднёвыя межы праходзілі паміж сучаснымі вуліцамі К. Маркса і Камунарскай. У той жа час на плане выразна бачна, што раён Падола, які прылягае да Панівойскай і Дзявочай гор, слаба забудаваны. Асноўны аб'ём забудовы Падола паказаны толькі ў раёне Траецкай гары. Адсутнічае забудова і на левым беразе Віхры, на месцы былой слабады Зарэчча. Слабую заселенасць гэтых раёнаў Мсціслава ў XVIII ст. пацвярджаюць і археалагічныя матэрыялы. Кераміка гэтага часу тут даволі нешматлікая.

Аналіз пісьмовых і археалагічных матэрыялаў сведчыць, што на працягу XVIII ст. Мсціслаў хаця і паспяхова пераадольваў наступствы пагрому сярэдзіны XVII ст., аднак да канца адрадзіцца яшчэ не змог. Даволі хутка аднавіўся раён, які прылягаў да Замкавай гары, дзе былі пабудаваны ўсе архітэктурныя дамінанты горада, а вось адраджэнне тэрыторыі Падола зацягнулася, і хаця па агульнай плошчы горад дасягнуў аб'ёмаў сярэдзіны XVII ст., інтэнсіўнасць жыцця тут запаволілася.

Адсутнічаюць матэрыялы XVIII ст. і на тэрыторыі слабады Зарэчча, што сведчыць пра некаторае прыпыненне існавання тут паселішча. Назіранні за

[82] Akta procesowe Lendorfow i Konstantynowiczów z Szpilowskimi i Zapolskimi z lat 1600–1701 // Dział rękopisów Biblioteki PAN i PAU w Krakowie. – Signaturza 5826. – Kartka 110–112.

распаўсюджаннем культурнага слоя на тэрыторыі ўсіх пасадаў Мсціслава XII–XVIII стст. паказваюць, што горад у другой палове XVII–XVIII стст., нягледзячы на два пагромы, тэрытарыяльна змог адрадзіцца і ў канцы XVIII ст. займаў плошчу каля 45–47 га.

Пасля інкарпарацыі ўсходніх зямель Рэчы Паспалітай у склад Расійскай імперыі Мсціслаў страціў ролю ваяводскага цэнтра і першапачаткова (у 1772–1776 гг.) быў цэнтрам Мсціслаўскай правінцыі, а пасля 1776 г. стаў цэнтрам аднайменнага ўезда Магілёўскай губерні. У 1783–1785 гг. у Мсціславе налічвалася 525 дымоў, а агульная колькасць жыхароў вагалася ад 2850 да 3043 чалавек[83]. У той жа час, згодна з данымі А. М. Карпачова, у Мсціславе ў 70–90-я гады XVIII ст. налічвалася 680 дымоў, у якіх пражывалі 4680 чалавек, і па колькасці насельніцтва ён у ВКЛ саступаў Вільні, Магілёву, Віцебску, Горадні, Мінску, Бешанковічам, Слуцку, Слоніму і Полацку[84]. Рускай адміністрацыяй для горада быў распрацаваны новы план, па якім ён і быў перабудаваны на працягу XIX ст. і які знішчыў яго старую планіроўку.

Крычаў, атрымаўшы новы ўмацаваны цэнтр ў канцы XII – пачатку XIII ст. на Замкавай гары над р. Сож, працягваў свае далейшае развіццё. Калі ў XII–XIII стст. ён быў вядомы пад назвай Крэчут, то ў новы перыяд мы ўпершыню сустракаем яго пад сучаснай назвай – Крычаў – на старонках складзенага ў канцы XIV – пачатку XV ст. «Спіска гарадоў рускіх бліжніх і далёкіх», дзе ён згадваецца сярод літоўскіх гарадоў[85]. У XV ст. горад двойчы згадваецца ў летапісах: у 1432 г. як горад, які падтрымаў князя Свідрыгайлу, і ў 1440 г. сярод гарадоў, што належалі мсціслаўскаму князю Юрыю Лынгвеневічу[86]. А з пачатку XVI ст. Крычаў увесь час знаходзіцца ў полі зроку як летапісцаў, так і іншых складальнікаў пісьмовых крыніц.

Менавіта да XIV–XVIII стст. адносіцца развіццё і фарміраванне Крычава як горада – адміністрацыйнага, рамесна-гандлёвага, ваеннага, культавага і культурнага цэнтра воласці.

Пра Крычаў як буйны гандлёвы цэнтр XV–XVII стст. сведчаць як неаднаразовыя згадванні ў ім корчмаў, так і наяўнасць тут прыкаморка, збіранне з торгу спецыяльных падаткаў «тарговага» і «важнага»[87]. Пра значнасць горада сведчыць наяўнасць яго на карце ВКЛ Т. Макоўскага (мал. 55) і план горада 1778 г. (мал. 56).

---

[83] Анішчанка Я. К. Генеральнае межаванне ў Беларусі. Дапаўненне да кнігі «Генеральнае межаванне ў Беларусі». – Горкі-Магілёў, 2002. – С. 104; АР БАН Літвы. – F-16. – Адз. зах. 127. – Арк. 170.

[84] Карпачев А. М. Социально-экономическое развитие городов Белоруссии во второй половине XVII–XVIII в.: автореф. дис. …д-ра ист. наук: 571 – История СССР. – Минск, 1970. – С. 22, 23.

[85] Тихомиров М. И. «Список русских городов далёких и близких». – С. 237.

[86] Даўгяла З. І. Аршанскі замак // Запіскі аддзелу гуманітарных навук. Кн. 11. Працы археалагічнай камісіі. – Мінск: Бел. Акад. навук, 1930. – Т. 2. – С. 51; Новгородская первая летопись старшего и младшего изводов. – С. 420.

[87] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 119. – Арк. 708 адв.–709.

Мал. 55. Выява Крычава на карце ВКЛ 1613 г. Т. Макоўскага

Тапаграфія горада XIV–XV стст. паддаецца рэканструкцыі толькі дзякуючы археалагічным крыніцам. У XIV ст. абарончы вал Замкавай гары зноў быў павялічаны. Ён быў падсыпаны пяском да вышыні 4,3 м. Што ўяўлялі з сябе наземныя фартыфікацыйныя збудаванні крычаўскага замка таго часу, цяжка сказаць, бо рэшткі іх прасачыць не ўдалося. Інфармацыя аб забудове Замкавай гары ў гэты перыяд таксама адсутнічае.

У XIV–XV стст. пачалося і больш актыўнае фарміраванне пасадаў горада. Пасад на Спаскай гары, які пачаў развівацца ў XII–XIII стст. і вядомы па больш позніх пісьмовых крыніцах як Забялышчынскі, атрымаў сваё далейшае развіццё. Мяркуючы па распаўсюджанні керамікі XIV – пачатку XVI ст., ён развіваўся ўздоўж Забялышчынскага яра і, у меншай ступені, уздоўж Сожа. Матэрыялы XIV – пачатку XVI ст. знойдзены на тэрыторыі прыкладна 60 × 120 м. Гэта сведчыць пра тое, што Забялышчынскі пасад у пачатку XVI ст. займаў плошчу каля 0,8 га. Тут у канцы XV ст. была ўзведзена царква Св. Спаса.



Мал. 56. План Крычава 1778 г.

Гэты раён горада – Забялышчын, улічваючы яго размяшчэнне над Сожам, быў месцам, дзе кампактна сяліліся гарбары і рымары. Яны згадваюцца тут і ў пачатку XVII ст., і ў сярэдзіне XVIII ст.[88]

Наяўнасць на процілеглых канцах Крычава сярэдзіны XV – пачатку XVI ст. – на Забялышчыне і каля Гарадца – дзвюх цэркваў дазваляе сцвярджаць, што існавалі храмы і ў цэнтральнай частцы горада. Як мінімум, у гэты час была царква на дзядзінцы – Замкавай гары і, верагодна, 1–2 царквы былі на пасадзе, размешчаным паміж Забялышчынскім ручаём і Крычаўцам. Такім чынам, у Крычаве ў пачатку XVI ст. было не меней 5–6 цэркваў.

У XIV ст. пачынаецца асваенне тэрыторыі берагавога плато, што знаходзілася на захад ад Замкавай гары і было абмежавана гідраграфічнай сеткай ручаёў Крычавец і Забялышчынскі. Праведзеная тут шурфоўка паказала, што культурны слой чорнага колеру ў гэтым раёне дасягае магутнасці 1,2 м. Верхняя яго частка (да 0,3 м) значна пашкоджана познімі перакопамі. Але ў ніжнім запаўненні слоя, які па сваёй кансістэнцыі аднародны, сустракаюцца шматлікія тонкія лінзы пажарышчаў.

Назіранні за распаўсюджаннем керамікі ў міжрэччы Забялышчынскага ручая і р. Крычаўка сведчаць, што найбольш раннія матэрыялы, знойдзеныя тут, адносяцца да XIV – пачатку XVI ст. І выяўлены толькі ў прылеглых да замка дварах вуліц Гіндзінай, Студэнцкай, Пралятарскай. Зона распаўсюджання культурнага слоя з керамікай XIV – пачатку XVI ст. цягнецца ўздоўж берагавога плато на працягу 300 м пры шырыні не болей за 50 м. Плошча гэтага пасада ў XIV – пачатку XVI ст. не перавышала 1,5–2 га, а агульная плошча Крычава складала каля 3,5–4 га[89] (мал. 57).

Пачатак XVI–XVIII ст. прыносіць нам комплекс пісьмовых крыніц, якія ў спалучэнні з данымі археалогіі дазваляюць рэканструяваць гісторыю развіцця горада.

У XV–XVI стст., мяркуючы па археалагічных даных, абарончыя збудаванні крычаўскага замка рэканструяваліся двойчы. Першы раз вал з гліны і пяску быў павялічаны да вышыні 5 м, а потым адбылося яшчэ адно павелічэнне яго памераў да вышыні 6 м. На гэты раз вал дасыпаўся з пяску і абодва разы ён са знешняга боку быў абкладзены дзірваном. Дакладных звестак пра гэтыя наземныя абарончыя збудаванні не захавалася, але трэба ўлічваць, што з XVI ст. на ўсходнеславянскіх землях стала распаўсюджанай з'явай забіваць абарончыя сцены крэпасцей зямлёй. Магчыма, менавіта да гэтага часу адносяцца звесткі А. Меера, што калісьці, «до Радзивиллов» – да 70-х гадоў XVII ст., сцены замка былі запоўнены «дзікім» каменнем[90].

---

[88] НГАБ. – Ф. 694. – Воп. 1. – Адз. зах. 1155. – Арк. 84–86; Мяцельскі А. А. Старадаўні Крычаў. – С. 40, 49, 65.

[89] Мяцельскі А. А. Старадаўні Крычаў. – С. 33, 40.

[90] Мейер А. Описание Кричевского графства или бывшего староства 1786 г. // Могилевская старина. – Могилев, 1901. – Вып. 2. – С. 91.



Мал. 57. Тапаграфія Крычава XIV–XVIII стст.

З пісьмовых крыніц, якія сведчаць пра клопат вялікага князя пра стан крычаўскага замка, захавалася грамата Жыгімонта I ад 1524 г. пра неабходнасць умацавання крычаўскага замка.

У XVII–XVIII стст. вал сярэднявечнага Крычава тройчы падсыпаўся, пры гэтым ён дасягнуў вышыні 7 м і шырыні 15 м каля падэшвы. Трэба адзначыць, што найбольш магутны вал быў насыпаны з напольнага, найбольш небяспечнага боку. Па меры набліжэння вала да Сожа яго памеры памяншаліся, а ўздоўж Сожа вал не прасочваецца. Археалагічныя даследаванні, праведзеныя на схіле Замкавай гары з боку Сожа, паказалі адсутнасць тут штучных земляных умацаванняў.

У другой палове XVII ст. з'яўляюцца пісьмовыя крыніцы, якія даюць магчымасць асвятліць стан і сістэму абарончых збудаванняў познесярэднявечнага Крычава.

Згодна з інвентарнымі апісаннямі крычаўскага замка 1673, 1679, 1682, 1747 гг., ён быў умацаваны парканам, накрытым драніцамі. Канструкцыйна паркан уяўляў з сябе сцены з гарызантальных бярвенняў, канцы якіх заганяліся ў вертыкальныя стаякі. У бярвеннях праразаліся вокны-байніцы, з якіх вялі агонь па абложнікам. З горада ў замак вёў высокі мост на ізбіцах. Перад уязной вежай-брамай меў ён пад'ёмнае звяно на жалезных ланцугах. Інвентары 1679 і 1682 гг. сведчаць, што частка паркана была новай, а другая палова патрабавала рамонту[91].

[91] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1923. – Арк. 3; Тамсама. – Адз. зах. 1925. – Арк. 1; Тамсама. – Адз. зах. 1926. – Арк. 3.

Інвентар горада 1694 г. паведамляе, што замак меў 5 вежаў – вежу над брамай і 4 іншыя, якія ішлі па перыметры гары (мал. 58). Уязная вежа-брама была двухпавярховай, мела падвоеныя дубовыя вароты на «бегунах» – драўлянай восі з зашчэпкамі, прабоямі і замком «прывесістым». Унізе ў браме стаяла «шмыгаўніца», 2 бронзавыя палявыя гарматы. На другім паверсе мелася пашкоджаная гармата, 6 мушкетаў і 6 бердышаў. Уваход на другі паверх быў зроблены з боку замкавага двара – «усхода с ганком, покрытым драницами».

Замкавая вежа-брама знаходзілася прыблізна на тым месцы, дзе і зараз размяшчаецца ўваход на Замкавую гору – толькі тут прасочваецца разрыў у абарончым вале. Злева ад брамы ў бок Сожа ішлі сцены з «вывадамі» – бастыёнамі, за якімі наглядалі гараджане. Інвентар горада 1694 г. адзначае, што «кватэра меская новая ...драніцамі пакрыта, а трэба, штобы была глінаю абмуравана аж да бакшты Рогавай к Сожу». Ад сучаснага ўваходу на гарадзішча да кута, на якім стаяла Рагавая вежа, прыблізна 35–40 м. Гэту частку замка, верагодна, і абаранялі мяшчане Крычава – тут знаходзілася «кватэра меская».



Мал. 58. План Крычаўскага замка з рэканструкцыяй месцаразмяшчэння вежаў паводле інвентара замка 1694 г.: *1* – Уязная брама; *2* – Рагавая вежа; *3* – Сярэдняя вежа; *4* – Рагавая вежа з патаемнікам да вады; *5* – Рагавая вежа

Далей уздоўж Сожа знаходзіліся два адрэзкі «кватэры волостной», якая ўключала ў сябе сцены і 2 вежы – Сярэднюю і яшчэ адну Рагавую. Першая была зроблена ў 2 бервяны і мела дах з драніц. У другой размяшчаўся «патаемнік», адкуль вёў ход да Сожа. Сцены і вежы замка з боку Сожа былі ў добрым стане, але патаемнік быў разбураны і патрабаваў рамонту. Гэты ўчастак абароны даглядалі воласці Палявая і Зарэцкая, што зафіксавана ў інвентарах горада і воласці яшчэ ў першай палове XVIII ст.

Як ужо адзначалася, уздоўж Сожа на гарадзішчы абарончыя валы не прасочваюцца. Верагодна, на канцавых кропках захаваных валоў, якія сапраўды размешчаны на кутавых кропках замка, і трэба лакалізоўваць Рагавыя вежы. А паміж імі стаяла Сярэдняя вежа. Улічваючы, што прыблізная адлегласць паміж дзвюма Рагавымі вежамі дасягае 70–80 м, можна меркаваць, што Палявая і Зарэцкая воласці даглядалі прыкладна каля 35–40 м абароны замкавых сцен, што адпавядае памерам абароны замка мяшчанамі.

Ад Рагавой вежы з «патаемнікам да вады», да трэцяй Рагавой вежы ішла «кватэра воласці Кашанскай», якая ў гэты час «вніве́ч зруйнавалася», хоць кутняя вежа з боку горада, рубленая ў 2 бервяны, была цэлая, крытая драніцамі. Месцазнаходжанне трэцяй Рагавой вежы, на наш погляд, трэба шукаць у тым месцы на замкавым вале, дзе і сёння мы бачым даволі рэзкае яго пашырэнне і дзе пачынаюць супрацьстаяць адзін аднаму Замкавая гара і плато, на якім размяшчаліся гарадскія пасады. Участак абароны Кашанскай воласці цягнуўся прыкладна на 40–45 м.

Ад трэцяй Рагавой вежы і да брамы-вежы ішла «кватэра шляхецкая», якая абараняла замак з самога небяспечнага боку. Яна была ў дрэнным стане, «пагніла», а «насупраць самога места ужо паруйнавалася». Інвентар адзначае, што шляхцічы разбуранае будаваць не жадаюць, а з прычыны гэтага і астатнія ўмацаванні «за нішто застаюцца»[92]. Крычаўская шляхта таксама была павінна абараняць прыблізна 40–45 м сцен замка. Такім чынам, можна меркаваць, што тэрыторыя замка была падзелена паміж шляхцічамі, мяшчанамі і сялянамі крычаўскіх валасцей, і ім выпадала даглядаць і абараняць прыкладна па 40–45 м сцен замка.

З 1694 па 1709 г. у інвентарах Крычава назіраецца перапынак, што тлумачыцца падзеямі Паўночнай вайны і спусташэннем горада, хаця яшчэ 28 верасня 1708 г., праязджаючы праз Крычаў, Даніэль Крман адзначаў яго як даволі вялікі горад[93].

Аднак інвентары 1709, 1720, 1723, 1727 гг. паказваюць нам спустошаны, разрабаваны горад, у якім пустых дамоў болей, чым жылых. У занядбалым стане быў і замак: «башты і ізбіцы напалову разбураны» – 1709 г.[94]; «брама старая, з падворка глінай аблеплена» – 1720 г.[95]

Верагодна, менавіта такі дрэнны стан замка выклікаў у 1709 г. патрэбу ў канфірмацыі прывілея кара́ля Жыгімонта Вазы ад 1624 г., у якім крычаўскім дзяржаўцам прадпісвалася для рамонту замка прыцягваць жыхароў крычаўскай воласці[96]. Памежны замак быў патрэбны дзяржаве і дзяржаўцу старостава, таму пасля завяршэння баявых дзеянняў пачалося яго паступовае адраджэнне, і як ваенная крэпасць крычаўскі замак існаваў да інкарпарацыі ў склад Расійскай імперыі.

Ужо ў інвентары 1723 г. у замку адзначаецца «брама новабудаваная, на адным баку якой размешчана кардэгардыя з печчу і комінам, а на другім баку турма». Жылыя памяшканні размяшчаліся на другім паверсе. Праўда, у гэтым жа інвентары згадваецца і вежа, што стаяла на вале і была без догляду – «ападла і пагніла на ніц не згодна»[97]. У 1727 г. адзначаецца «на валу бакшта ста

---

[92] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1928. – Арк. 1–2.

[93] Шутой В. Е. Малоизвестный источник по истории Северной войны // Вопросы истории. – 1976. – № 12. – С. 93.

[94] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1929. – Арк. 3.

[95] Тамсама. – Адз. зах. 1931/2. – Арк. 3.

[96] Metryka Litewska. Księga Sigillat. 1709–1719. – S. 124, № 794.

[97] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1933/2. – Арк. 1–2.

рая, якая нахілілася, абвальваецца і развальваецца, ...ізбіцы, інакш абламы – на валу ад месца стаячыя, старыя і цалкам зруйнаваныя і ад зямлі рэстаўрацыі патрабуюць»[98].

Даволі дрэнны стан замка вымусіў Радзівілаў даць інструкцыю адміністратару Крычаўскага староства «замак Крычаўскі, паколькі ён абсыпаецца, ...із расходов прызначаных ...нанава зрабіць, прычым не са скарба панскага, а прыгонам» – сіламі мяшчан і жыхароў воласці.

Верагодна, распараджэнні камісара былі выкананы. Ва ўсякім выпадку, падчас Крычаўскага паўстання 1744 г. паўстанцы не змаглі ўзяць штурмам замак, адкуль вёўся па іх агонь з гармат і іншай агнястрэльнай зброі. Пасля гэтых падзей замкавыя ўмацаванні былі яшчэ больш ўзмоцнены.

Апошні інвентар Крычаўскага замка, які датуецца 1747 г., дае нам апісанне даволі моцнага комплексу абарончых збудаванняў. Усе, хто ехаў сюды з горада, траплялі на новы мост. На яго пачатку стаяла будка фельдвахты, меўся шлагбаўм. На сярэдзіне маста быў «узвод» – пад'ёмны мост на 4 жалезных ланцугах і 2 вялікіх завесах на круках. Далей ішла сістэма з 2 «фортак» – невялікіх брам, зробленых паміж поручняў. Толькі пасля гэтага можна было трапіць у замкавую браму. Пабудаваная з брусу, яна мела падвоеную браму, злева размяшчалася кардэгардыя, справа – турма. Верхні паверх займала зала. Над гонтавым дахам брамы, на жалезным стрыжні, узвышаўся бляшаны флюгер у выглядзе радзівілаўскага арла. Інвентар 1747 г. паведамляе пра яшчэ адну цікавую рэч у фартыфікацыйных збудаваннях Замкавай гары. З боку Забялышчынскага пасада ў сістэме крапасных сценаў была «форта»[99].

На Замкавай гары ўвесь час знаходзілася царква Св. Мікалая, цэйхгаўз, будынак дзяржаўцы і іншыя гаспадарчыя пабудовы, неабходныя для нармальнага функцыянавання крэпасці.

Акрамя замка, гарадскія ўмацаванні ўключалі ў свой склад і фартыфікацыйныя збудаванні пасадаў. Іх наяўнасць пацвярджаюць некаторыя крыніцы, што захоўваюцца ў фондзе Літоўскай метрыкі, шматлікія летапісныя паведамленні пра штурмы горада, інвентарныя апісанні горада XVI – сярэдзіны XVII ст.

Пра тое, што ў горадзе мелася другая лінія ўмацаванняў, згадваецца ўжо ў дазволе караля Жыгімонта Старога на будаўніцтва дома крычаўскаму ротмістру Левіцкаму «в паркане» – вакольным горадзе. Аб тым, што горад акрамя замка меў і другую лінію ўмацаванняў у пачатку XVI ст., сведчыць і наяўнасць на пасадзе Астрожных варотаў, размешчаных насупраць замка[100]. Пра гэта ж сведчаць данясенні цару маскоўскіх стральцоў, якія бралі ўдзел у штурме горада ў 1633 г.

---

[98] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1932. – Арк. 15.

[99] Тамсама. – Адз. зах. 1936. – Арк. 1–3.

[100] Литовская метрика. Книга записей № 12 (1522–1529) / parenge D. Antanavićus, A. Baliulis. – Vilnius: Źara, 2001. – С. 266, 273.

У іх яны адзначаюць, што стральцы і казакі «въ Кричеве городъ большой взяли ...а остальные де литовские люди въ малом городке отсиделисъ»[101]. Малы горад у паведамленнях 1633 г. – гэта, безумоўна, Замкавая гара, якую маскоўскія войскі так і не змаглі ўзяць. А «большой город» – другая ўмацаваная частка Крычава – размяшчаўся на захад ад Замкавай гары, на берагавым плато, абмежаваным прыроднымі ўмацаваннямі – Забялышчынскім ярам з поўдня, і поймай рэчкі Крычаўкі з поўначы. Верагодна, гэтыя натуральныя ўмацаванні былі звязаны земляным валам і такім чынам утваралі замкнёную сістэму ўмацаванняў – вакольны, альбо «большой», горад. З усходняга боку надзейнай абаронай гораду служыў Сож.

Пра існаванне другой лініі гарадскіх умацаванняў сведчаць і інвентары горада другой паловы XVII ст., якія згадваюць наяўнасць на пасадзе «астрога» і дадатковага нейкага «астражэння».

Звесткі пра астрог, у якім размяшчалася 30 гарадскіх пляцаў і тры царквы – Уваскрасенская, Пятніцкая і Раства Багародзіцы – знаходзім у інвентары Крычава 1671 г. На Астрожнай вуліцы, якая знаходзілася побач, у гэты год было 9 дымоў. Тыя ж самыя звесткі падае нам пра гарадскі астрог і размешчанае побач «астражэнне» і інвентар горада 1673 г. У «астражэнні», як адзначае інвентар, у гэты час існавала царква Святога Юрыя[102].

Аднак ужо праз 6 гадоў сітуацыя з гарадскімі ўмацаваннямі мяняецца. Інвентар горада 1682 г. называе ўжо толькі невялікі астрог з 14 пляцамі і замкавым агародам. Тая ж тэрыторыя, якая, верагодна, раней аб'ядноўвалася пад назвай «астражэнне», зараз называецца «Ратуш». На такую думку наводзіць размяшчэнне ў гэтым раёне царквы Святога Юрыя[103].

Больш познія інвентары горада XVII–XVIII стст. ужо не згадваюць ў Крычаве іншых умацаванняў акрамя замка. Верагодна, паступова з развіццём артылерыі яны страцілі сваю ролю, а паколькі не рамантаваліся, то прыйшлі ў заняпад. Ва ўсякім выпадку, у інвентары Крычава 1747 г. ужо адзначаецца, што новая вуліца Юр'еўскі перакоп была так названа таму, што падчас «давней масковскай войны тут быў заложаны шанец»[104]. Гэта ўдакладненне аб шанцы таксама сведчыць пра тое, што калісьці на пасадзе была самастойная лінія ўмацаванняў. А размяшчэнне царквы Св. Юрыя на плане горада 1778 г., толькі пацвярджае папярэдне выказаную думку, што вал вакольнага горада звязваў у адзіны фартыфікацыйны комплекс Забялышчынскі яр і яр, па якім працякаў ручай Крычавец.

Безумоўна, у лініі ўмацаванняў пасада павінны былі стаяць вежы-брамы з варотамі, праз якія выязджалі з горада. Аднак пісьмовыя крыніцы не згадваюць іх, і дзе дакладна яны размяшчаліся, невядома. Толькі на плане горада

---

[101] АМГ. – Т. 1. – С. 445–446, 476, 481.

[102] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 2669/1. – Арк. 169 адв.–170; Тамсама. – Адз. зах. 1923. – Арк. 9–10.

[103] Тамсама. – Адз. зах. 1926. – Арк. 10.

[104] Тамсама. – Адз. зах. 1936. – Арк. 33.

1778 г. у некаторых месцах назіраюцца разгалінаванні вуліц і, верагодна, паблізу ад гэтых разгалінаванняў і неабходна шукаць былыя брамы.

На Забялышчынскім пасадзе такое месца назіраецца на поўдзень ад Спаскай царквы. На поўначы брама існавала, верагодна, насупраць гарадзішча «Гарадзец», на выездзе на Мсціслаў. Аднак на ўсход ад гарадской забудовы на плане горада 1778 г. такія разгалінаванні не прасочваюцца, і дзе тут знаходзілася брама, дакладна невядома.

Такім чынам, з упэўненасцю можна сцвярджаць, што другая лінія гарадскіх умацаванняў у Крычаве існавала да апошняй чвэрці XVII ст. Магчыма, яна была канчаткова знішчана падчас Паўночнай вайны са Швецыяй (1700–1721 гг.), калі нават замак быў разбураны рускімі войскамі, і болей не ўзнаўлялася.

Даныя археалагічных даследаванняў паказваюць, што ў XVI–XVIII стст., нягледзячы на шматлікія войны, горад значна павялічыў сваю тэрыторыю. Ён паступова асвойваў тэрыторыю паміж Сожам і Забялышчынскім ярам. Распаўсюджанне керамікі дазваляе сцвярджаць, што ў XVII–XVIII стст. Забялышчынскі пасад займаў тэрыторыю прыкладна 100–150 × 200 м, што адпавядае 2–2,5 га.

У цэнтральнай частцы горада, размешчанай паміж Забялышчынскім ручаём і рэчкай Крычаўкай, заходняя мяжа горада ў канцы XVI ст., пэўна, праходзіла ў раёне сучасных вуліц Ленінскай і Камсамольскай, і тэрыторыя гэтага пасада дасягнула плошчы каля 10 га, а ўся плошча горада складала каля 15 га.

У XVII–XVIII стст. горад, нягледзячы на шматлікія беды, што абрушваліся на яго, пашырыў сваю тэрыторыю. Акрамя далейшага развіцця Забялышчынскага пасада і пасада, які знаходзіўся паміж Забялышчынскім ручаём і рэчкай Крычаўка, пачаў фарміравацца новы пасад, размешчаны на поўнач ад Крычаўкі.

Забялышчынскі пасад у канцы XVIII ст. ахапіў плошчу каля 3–3,5 га, цэнтральны пасад асвоіў тэрыторыю на захад ад сучасных вуліц Ленінскай і Камсамольскай. Кераміка, характэрная для XVII–XVIII стст., знойдзена ў зачыстцы сценак будаўнічага катлавана пад сховішча агародніны ў двары СШ № 1, у шурфе, размешчаным у двары дома № 2 па вул. імя Луначарскага. Магутнасць культурнага слоя ў гэтым раёне не перавышае 0,3–0,4 м.

Самы заходні раён горада, дзе падчас назіранняў за земляными працамі быў зафіксаваны культурны слой, – раён вуліц імя Губеніна і К. Маркса. Тут знойдзены асобныя фрагменты керамікі, характэрнай для канца XVII–XVIII ст. Такім чынам, агульная плошча цэнтральнага пасада Крычава ў гэты час складала каля 30 га.

Пасад горада, размешчаны за ручаём Крычавец, мяркуючы па зборах пад'ёмнага матэрыялу і нешматлікіх шурфах, пачаў засяляцца не раней за пачатак XVII ст., бо яшчэ ў канцы XVI ст. тут знаходзіліся гарадскія агароды[105]. Культурны слой магутнасцю ад 0,2 да 0,7 м, выяўлены ў гэтым раёне горада, цягнецца ад гарадзішча «Гарадзец» уздоўж цячэння Крычаўца ў накірунку

[105] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 77. – Арк. 412 адв.–413 адв.

Сожа. Асноўны матэрыял, што сустракаецца ў культурным слоі, – кераміка, фрагменты аконнага шкла і шкляного посуду, зрэдку трапляюцца соліды Яна Казіміра і манеты Расійскай імперыі XVIII ст.

Шырыня распаўсюджання культурнага слоя не перавышае 70 м. Ён прасочваецца на працягу 250–300 м. Такім чынам, агульная плошча пасада, размешчанага за ручаём Крычаевц, згодна з археалагічнымі данымі, не перавышае 1,5 га. У той жа час на плане горада 1774 г. паказана, што тут была заселена толькі тэрыторыя блізу Гарадца.

Назіранні за распаўсюджаннем культурнага слоя з матэрыяламі XVII–XVIII стст. сведчаць, што горад у канцы XVIII ст. складаўся з дзядзінца плошчай каля 0,6 га, Забялышчынскага пасада плошчай 2–2,5 га, цэнтральнага пасада плошчай 30 га і пасада за рэчкай Крычаўка – 1,5 га. Агульная плошча горада ў апошняй трэці XVIII ст. складала каля 35 га.

Прыкладна з сярэдзіны XVII ст. яшчэ больш цікавую інфармацыю па гісторыі фарміравання планіровачнай структуры горада пачынаюць даваць і пісьмовыя крыніцы.

Безумоўна, цэнтрам гарадской планіроўкі, як і раней, з'яўляўся замак, ад якога адыходзілі вуліцы. Пісьмовыя крыніцы паведамляюць нам пра існаванне ў горадзе ў XVI ст. вуліцы Пачэпскай[106], якая, верагодна, выводзіла на поўдзень, на дарогу, што вяла ў бок горада Пачэп. Хутчэй за ўсё, яна размяшчалася на Забялышчынскім пасадзе; ніжэй знаходзіўся Лучыцкі перавоз праз Сож. Адсюль пачынаўся Лучыцкі шлях, што вёў у паўднёвыя раёны воласці.

На Забялышчыне ўжо ў гэты час існавала вуліца Спаская, якая згадвалася ў 1579 г. У пачатку XVII ст. (1609 г.) ў астрогу – вакольным горадзе – была вуліца Вялікая. У бок вёскі Касцюшкавічы ў 1653 г. вяла вуліца Шумлівая[107].

Пэўнае ўяўленне аб тапаграфічнай структуры горада даюць і пісьмовыя крыніцы другой паловы XVII–XVII стст. Так, інвентары горада гэтага часу звычайна выдзяляюць тры раёны Крычава. Згодна з інвентаром 1671 г., горад складаўся з цэнтральная часткі, размешчанай паміж Забялышчынскім ручаём і рэчкай Крычаўка. Другі гарадскі раён – Крычавец, знаходзіўся за рэчкай Крычаўкай, каля гарадзішча «Гарадзец». Трэцім раёнам горада, які згадваецца ў інвентары, быў Забялышчын. Тое, што Крычаў быў вялікім горадам і складаўся з трох частак, адзначаў і славацкі вандроўнік Даніель Крман, які праязджаў праз горад у 1708 г.[108] Трохчасткавая планіровачная структура Крычава адзначаецца і ў самым апошнім захаваным інвентары горада 1747 г.

Планіровачная структура горада другой паловы XVII ст. яшчэ дрэнна прасочваецца ў пісьмовых крыніцах. Верагодна, яна, як і ў большасці гарадоў таго часу, была радыяльнай. Яе вызначалі дарогі, якія разыходзіліся ў розныя бакі ад цэнтра горада. Гэта ў цэлым адпавядала традыцыям сістэмы забудовы

---

[106] НГАБ. – Ф. 694. – Воп. 4. – Адз. зах. 1155. – Арк. 38–39.

[107] Тамсама. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 74. – Арк. 419–420; Адз. зах. 86. – Арк. 738 адв.; Ф. 694. – Воп. 4. – Адз. зах. 1155. – Арк. 47.

[108] Шутой В. Е. Малоизвестный источник по истории Северной войны. – С. 97.

ўсходнеславянскага горада. Крыніцы згадваюць гарадскі рынак, размешчаны ў другой палове XVII ст. каля замка, што сведчыць пра захаванне традыцый, якія сягаюць у больш раннія часы, калі «торг» размяшчаўся паміж пасадам і ядром горада – «градам»[109]. Рэшткі гэтага рынку прасочваюцца на плане горада 1778 г. у выглядзе забудаванай на палову плошчы эліпсападобнай формы непасрэдна каля замка, ад якой адыходзяць прамыя прамяні вуліцы ў бок Забялышчынскага пасада і ў цэнтральную частку горада. Акрамя таго, сведкай існавання тут рынку з'яўляецца важніца, якая існавала тут, на тэрыторыі замкавага фальварка, у 1746 г., у той час як яшчэ адна важніца знаходзілася на гарадскім рынку[110].

Інвентары горада 80–90-х гадоў XVII ст. сцвярджаюць, што ў горадзе было каля 470–480 дымоў. Горад паступова адраджаўся пасля вайны з Расіяй сярэдзіны XVII ст. Інвентар 1694 г. паведамляе, што ў Крычаве было 8 праваслаўных храмаў. На замку стаяў храм Св. Міколы, на Забялышчыне – царква Св. Спаса, у самім горадзе – храмы Св. Юрыя, Св. Параскевы Пятніцы, Уваскрасенская царква, царква Раства Багародзіцы, Узнясенская царква і царква Св. Іллі. Пры апошняй «з даўніх часоў» існаваў невялікі манастыр, які меў шпіталь. У Крычаве ў той час ужо адрадзілася дзейнасць касцёла ў гонар Узнясення Дзевы Марыі[111], які быў закладзены ў пачатку XVII ст.

Інвентар Крычава 1747 г. сведчыць, што ў першай палове XVIII ст. адбыліся значныя змены ў яго тапаграфіі. Цэнтр горада, як і раней, размяшчаўся паміж Забялышчынскім ручаём і рэчкай Крычаўкай. У гэтай частцы знаходзіўся замак, які заставаўся ваенным цэнтрам горада. Ад замка вялі дзве вуліцы – Замкавая і Чэрыкаўская.

Замкавая вуліца выводзіла на рынак. На ёй, акрамя жылых дамоў, у значнай частцы якіх размяшчаліся шынкі, з правага боку знаходзіліся 8 крамаў. Шырыня вуліцы дасягала 5 прэнтаў (24,35 м). Гэта было выклікана тым, што вуліца мела трохрадавую забудову. Акрамя звычайнай забудовы з двух бакоў вуліцы, Замкавая мела яшчэ адну лінію, якая ішла паміж яе правым і левым бокам. Яна выконвала ролю своеасаблівага склада, бо на ёй у тры рады былі месціліся 28 амбараў і крамаў, адзін жылы дом і некалькі пустых пляцаў. Акрамя гэтага на Замкавай вуліцы знаходзілася і замкавая вазоўня[112]. Згодна з планам горада 1778 г. на Замкавай вуліцы знаходзілася і ратуша, якая стаяла ў адным радзе з крамамі і лаўкамі.

Чэрыкаўская вуліца, мяркуючы па назве, вяла ў бок горада Чэрыкава. Яна, верагодна, ішла ўздоўж рова, па якім працякаў Забялышчынскі ручай, і ў канцы злучалася са Слабадской вуліцай. На плане горада 1778 г. у гэтым месцы паказаны мост праз стаў на Забялышчынскім яры. Акрамя Слабадской, на

---

[109] ИЮМ. – Вып. 13. – С. 255; Мокеев Г. Я. Типология древнерусских городов. – С. 5–6.
[110] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1935. – Арк. 4.
[111] Тамсама. – Адз. зах. 1928. – Арк. 31–32; Мяцельскі А. А. Старадаўні Крычаў. – С. 49, 51–52.
[112] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах 1936. – Арк. 19–20.

Чэрыкаўскую вуліцу выходзіла Латынская вуліца; тры невялікія завулкі выводзілі з Чэрыкаўскай вуліцы ў бок Забялышчынскага яра.

Згодна з інвентаром, у горадзе ў гэты час сфармаваўся і другі цэнтр, які стаў не толькі яго новым адміністрацыйным, але і другім планіровачным ядром. У яго ролі выступіла рынкавая плошча памерам 12 × 13 прэнтаў – 63,3 × 58,4 м – 3696 кв. м[113]. Менавіта яна стала тым ядром, ад якога адыходзілі ў розныя бакі шматлікія вуліцы.

На плане Крычава 1778 г. рынак размешчаны па-над Сожам, на паўночны захад ад Замкавай гары, у раёне сучасных вуліц імя Леніна, Пралетарскай, Каператыўнай. Улічваючы адсутнасць якіх-небудзь значных падзей у гісторыі горада паміж 1744 і 1778 гг., якія б маглі прывесці да перапланіроўкі Крычава, верагодна, гэты раён трэба разглядаць і як цэнтр горада ў сярэдзіне XVIII ст.

Сама рынкавая плошча была вольнай ад забудовы і складалася з чатырох частак (кватэр). Заходнюю «кватэру» рынка, згодна з інвентаром горада, займаў комплекс царквы Св. Параскевы Пятніцы з могілкамі і шпіталем. На паўночным баку рынку інвентар адзначае недабудаваную карчму і 6 дамоў. З астатніх бакоў рынку стаялі толькі жылыя дамы. Амаль ва ўсіх былі шынкі.

Акрамя Замкавай, ад рынку адыходзілі яшчэ 7 вуліц: Броварная, Бочкава, Пятніцкая, Рыжкова, Дрыбінская, Юр'еўскі Перакоп, Жыдоўская. У Крычаве было яшчэ некалькі вуліц, якія немагчыма зараз дакладна лакалізаваць: Лычова, што перасякала Пятніцкую і вяла да Сожа, Парасятнікаў, Сіманаўская, Ганчарная. Інвентар згадвае таксама некалькі безыменных завулкаў і папярэчных вуліц. Па-над Сожам, пад рынкам, ад замка ў напрамку рэчкі Крычаўка ішла Падбярэжная вуліца. Гэты раён горада яшчэ ў XVII ст. быў вядомы пад назвай «падол».

У цэнтральнай частцы Крычава ў 1747 г. размяшчаўся 501 пляц, з якіх 319 былі забудаванымі. Астатнія стаялі пустымі альбо былі заняты агародамі. Акрамя таго, звесткі пра характар выкарыстання некаторых пляцаў адсутнічаюць.

Другой значнай часткай горада быў Забялышчын. У сярэдзіне XVIII ст. гэта быў ужо даволі вялікі раён Крычава, у якім пачала фарміравацца свая планіровачная структура. Планіровачная аснова раёна – Спаская вуліца (сучасная вул. імя Сірацініна), якая ішла праз увесь раён. На яе пачатку з левага боку размяшчаліся могілкі. На плане горада 1778 г. бачна, што своеасаблівым планіровачным цэнтрам Забялышчынскага пасада была Спаская царква, якая стаяла на левым баку вуліцы, прыкладна ў 80 м ад яе пачатку. Ад яе ў розныя бакі разыходзіліся вуліцы.

Галінападобная планіроўка, што прасочваецца на плане, верагодна, існавала ўжо і ў сярэдзіне XVIII ст. Ва ўсякім выпадку, менавіта такая планіровачная структура Забялышчынскага пасада пададзена ў інвентары горада 1747 г. У бок Сожа ад Спаскай вуліцы адыходзілі чатыры невялікія безыменныя завулкі, у правы бок – таксама два безыменныя завулкі і дзве вуліцы – Росіна

[113] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1936. – Арк. 21–22.

і Карэцкага. Усяго ў 1747 г. на Забялышчыне было 154 пляцы, з якіх 89 – забудаваныя[114]. Як адзначана на плане Крычава 1778 г., на Забялышчыне было 7 вуліц і завулкаў.

Трэці гарадскі раён – Загарадзішча – размяшчаўся за рэчкай Крычаўка, на гары, з левага боку ад уезду з боку Мсціслава – раён сучасных вуліц Камсамольскай, Каінава. Яго планіровачная структура лінейная. Тут мелася 69 пляцаў (21 быў забудаваны дамамі), падзеленых на тры лініі. Першая, разам з царквой Прачыстай Багародзіцы, размяшчалася каля гарадзішча Гарадзец. Другая лінія разам з царквой Св. Іллі, ішла ад става на р. Крычаўка. Трэцяя цягнулася ад млына на Крычаўцы ў бок Сожа[115]. На плане горада 1778 г. у гэтым раёне Крычава выразна відаць адна вялікая вуліца, якая ішла прыблізна па трасе сучаснай вул. Каінава. На астатняй частцы гэтага раёна сістэма забудовы не прасочваецца. Як і раней, тут функцыянавалі дзве царквы – уніяцкая Св. Іллі, якая стаяла над Сожам, і праваслаўная Прачыстай Багародзіцы каля Гарадца (мал. 59).

Падобная планіроўка зафіксавана і на акварэлі М. Іванова з выявай Крычава канца XVIII ст. (мал. 60). На ёй на дальнім плане паказана Спаская царква на Забялышчынскім пасадзе. Некалькі бліжэй асобным раёнам паказаны сам замак. Але як і ў інвентарах, так і на акварэлі галоўны аб'ём горада размяшчецца ў яго цэнтральнай частцы паміж Забялышчынскім ручаём і Крычаўцам. Менавіта ў гэтым раёне паказаны галоўныя культавыя пабудовы горада. Мяркуючы па акварэлі, шчыльна быў забудаваны і раён, што прылягаў да рэчышча Крычаўца.

Вывучэнне планавай кампазіцыі цэнтральнай часткі Крычава сярэдзіны XVIII ст. паказвае, што планіроўка горада ў гэты час была галінападобнай. Ад двух апорных цэнтраў – замка і рынка – адыходзілі ў розныя бакі вуліцы-радыусы. Складванню радыяльнай сістэмы планіроўкі горада садзейнічала патрэбнасць захавання ў межах горада дарог, якія адыходзілі ў розныя бакі з яго цэнтраў. У той жа час інвентар 1747 г. сведчыць, што планавая структура горада ўжо выйшла за рамкі проста радыяльнай. У горадзе ўсё больш актыўна пачынае фарміравацца галінападобная структура забудовы, узнікненню якой садзейнічала функцыянальная патрэбнасць прайсці кароткім шляхам з ваколіц горада да гандлёвай плошчы і адміністрацыйнага цэнтра. Галінападобную планіроўку пачалі атрымліваць і другія гарадскія раёны – Забялышчын і Загарадзішча.

Як і ў выпадку з Мсціславам, мы амаль не маем ніякіх звестак пра колькасць жыхароў у Крычаве. Толькі «Агранічэнне Крычаўскай воласці», складзенае ў 1560 г., калі ў воласці праводзілася аграрная рэформа, паведамляе, што ў самім Крычаве на той час было толькі 20 старасцінскіх службаў[116]. Улічваючы,

---

[114] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1936. – Арк. 36–40.

[115] Тамсама. – Арк. 40–42.

[116] Тамсама. – Ф. 694. – Воп. 4. – Адз. зах. 1155. – Арк. 68–69 адв.



Мал. 59. Крычаў. Рэканструкцыя горада паводле інвентара 1747 г.

што ў XVI ст. адна служба ў сярэднім складала 2–3 дымы, то старасцінскіх дымоў ў горадзе было як мінімум 40–60. Аднак з улікам насельніцтва вольных жыхароў, месцічаў, якія жылі на шляхецкіх і духоўных юрыдыках, колькасць дымоў у горадзе, верагодна, можна падняць як мінімум у 2 разы – прыкладна да 100. Але дакладная іх колькасць невядомая. У той жа час, улічваючы, што нават Папова Гара, якая мела значна меншае значэнне як фартыфікацыйны цэнтр, мела ў пачатку XVI ст. 500 дымоў[117], можна меркаваць, што і ў Крычаве на той час было ненашмат менш дымоў і колькасць насельніцтва дасягала 2500–3000 жыхароў.

Аднак падзеі войнаў 1633–1634 гг. і асабліва вайны 1654–1667 гг. катастрафічна адбіліся і на стане Крычава. Так, згодна з падымным тарыфам Мсціс-

[117] ДМАМЮ. – Т. 1. – С. 65.



Мал. 60. Акварэль М. Іванова «Вид на Кричев с реки Сож». Канец XVIII ст.

лаўскага ваяводства, у Крычаве, без уліку шляхецкіх, духоўных і замкавых, налічвалася толькі 82 дымы[118]. Нават калі падвоіць гэту лічбу з улікам гараджан, што жылі на замкавых, духоўных і шляхецкіх пляцах, то атрымаем у Крычаве толькі каля 160 дымоў.

Аднак горад даволі хутка адраджаўся, бо ўжо праз дзевяць гадоў, у 1676 г., у Крычаве налічвалася 375 дымоў, у якіх пражывалі 907 чалавек[119]. Факт такога хуткага адраджэння, верагодна, быў звязаны не толькі з унутраным развіццём горада, але і са свядомым перасяленнем сюды новага насельніцтва[120].

Адраджэнне горада, якое пачалося ў другой палове XVII ст., зноў спыніла вайна. Калі ў канцы XVII ст. ў горадзе налічвалася каля 500 дымоў, то нават у 1720 г. з 477 дымоў 244 стаялі пустымі. І праз 20 гадоў, у 1747 г. у горадзе з 724 пляцаў толькі 429 былі жылымі.

Згодна са статыстычнымі данымі, у канцы XVIII ст. (1779 г.) у горадзе налічвалася 470 дымоў, а колькасць насельніцтва дасягала 2820 чалавек, і горад па колькасці насельніцтва знаходзіўся на 17-м месцы ў ВКЛ[121]. Развіццю Крычава ў канцы XVIII ст. спрыяў і той факт, што горад стаў значным гандлёвым цэнтрам на ўсходзе Рэчы Паспалітай.

Новы крычаўскі староста Е. Мнішак ўжо праз два месяцы (18 ліпеня 1760 г.) пасля таго як атрымаў Крычаў і староства, дабіўся ў караля прывілея на тры новыя таргі ў горадзе, дадаткова да тых, што ўжо меліся. Новыя таргі прызначаліся на дзень Св. Дзевы Марыі Пячэрскай, на Хрышчэнне рускае (праваслаўнае) і на Св. Мікалая ўвесну. Тэрмін таргоў быў вызначаны тыднем[122].

---

[118] Metryka Litewska. Rejestry podymnego. – 2008. – S. 63–64.

[119] LVIA. – F. 1280. – Ap. 2. – Dyla 533. – P. 19 v.; НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 2669/2. – Арк. 172; Тамсама. – Адз. зах. 1926. – Арк. 18.

[120] Мяцельскі А. А. Старадаўні Крычаў. – С. 56.

[121] Тамсама; Карпачев А. М. Социально-экономическое развитие городов Белоруссии. – С. 22, 23.

[122] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 183. – Арк. 772–773.

Такім чынам, атрымліваецца, што ў гісторыі Крычава, як і Мсціслава, XVI–XVIII стст. фактычна былі часам, калі горад увесь час праходзіў праз чараду войнаў. Не паспявалі канчаткова загаіцца раны адной вайны, як пачыналася чарговая. Тым не менш горад паступова рос, і трэба прызнаць, што нягледзячы на войны, гэты перыяд у гісторыі Крычава быў перыядам яго паспяховага развіцця. Асновай для гэтага служыла эканамічнае развіццё краіны.

Пра тое, што і другая палова XVII–XVIII ст. ў гісторыі Крычава былі перыядам развіцця горада, сведчаць як шматлікія археалагічныя матэрыялы гэтага часу, так і рост яго тэрыторыі. Будаўніцтва ў ім каталіцкага касцёла і запланаванае будаўніцтва яшчэ аднаго касцёла ў канцы XVII ст. сведчыць пра тое, што горад у гэты час быў на піку свайго развіцця і меў дастатковыя эканамічныя сілы для далейшага росту.

Планіровачная структура Крычава, якая сфарміравалася ў XVII–XVIII стст., захавалася ў цэнтральнай частцы горада да сённяшняга часу.

Мглін на старонках пісьмовых крыніц з'явіўся адносна позна. Ён згадваецца сярод кіеўскіх гарадоў у «Списке городов русских дальних и ближних» канца XIV – пачатку XV ст., а ў пачатку XVI ст. горад быў захоплены Масквой.

У памежным размежаванні 1522 г. паведамляецца, што «Мглин город Мстиславского повету за Московским, а всим тому есть 20 и 3 лета зо всимъ, а подымей были тогды во Мглине пятсот, а дани хаживало 50 кадей мёду, а поголовщины 50 коп грошей широкое личбы»[123]. Гэта адзіныя звесткі, якія даюць нейкае уяўленне пра Мглін як пра даволі вялікі горад, у якім было 500 дымоў, калі ён уваходзіў у склад Мсціслаўскага княства. Археалагічныя даследаванні Мгліна яшчэ не праводзіліся.

Пасля вайны 1500–1503 гг. горад назаўсёды выйшаў са складу Мсціслаўскага княства, і нават калі ў XVII ст. гэтыя землі зноў на некаторы час увайшлі ў склад Рэчы Паспалітай, яны былі далучаны не да Мсціслаўскага, а да Смаленскага ваяводства.

Папова Гара упершыню згадваецца сярод кіеўскіх гарадоў у «Списке городов русских дальних и ближних» канца XIV – пачатку XV ст.

У пачатку XX ст. у яе цэнтры было гарадзішча, на якім сустракалася кераміка ранняга жалезнага веку. Але да нашых дзён помнік не захаваўся[124].

Дэталёвае археалагічнае абследаванне тэрыторыі сучаснага горада не праводзілася, таму больш дакладная інфармацыя аб яго археалагічных помніках адсутнічае. У наваколлях Паповай Гары ў канцы XIX ст. праводзіў даследаванні курганных могільнікаў П. М. Яроменка[125].

Пісьмовыя крыніцы нічога нам не паведамляюць аб жыцці Паповай Гары раней за пачатак XVI ст., калі горад быў захоплены Масквой. Толькі ў памежным размежаванні 1522 г. паведамляецца, што «...взял ви(е)л(и)ки князъ Мос-

---

[123] ДМАМЮ. –. Т. 1. – С. 67.

[124] Археологическая карта России. Брянская область. – С. 139, № 426.

[125] Еременко П. М. Могильники и городища Глуховского и Суражского уездов. – С. 96–106.

ковский город Попову Гору взял повета Мстиславского з данми грошовыми и медовыми и со всимъ, а подымей было пят сот у Поповой Горе, а дани хаживало 60 кадей, а сто рублёв грошей широкой личбы»[126].

У далейшым Папова Гара, як і Мглін, болей ніколі не ўваходзіла ў склад ні Мсціслаўскага княства, ні Мсціслаўскага ваяводства. У XVII ст. горад на некаторы час зноў апынуўся ў ВКЛ, аднак быў далучаны да Смаленскага ваяводства.

Дрокаў, як і Папова Гара, упершыню таксама згадваецца сярод кіеўскіх гарадоў у «Списке городов русских дальних и ближних» канца XIV ст.

Пісьмовыя крыніцы нічога не паведамляюць нам аб жыцці горада ў складзе ВКЛ. Вядома толькі, што ў канцы XV ст., пасля ліквідавання Мсціслаўскага княства, ён быў цэнтрам самастойнай воласці, з якой ў 1496 г., згодна з запісам прыходу вялікакняскага скарба «наместник дроковский дал от наместничества 4 копы грошей»[127]. Археалагічныя даследаванні на тэрыторыі былога горада не праводзіліся.

Аднак пасля таго як Дрокаў апынуўся ў складзе Маскоўскай дзяржавы ў выніку вайны 1500–1503 гг., ён аднойчы меў магчымасць зноў вярнуцца ў склад Вялікага Княства Літоўскага. Падчас перамоў 1542 г. разглядалася магчымасць вяртання яго ў склад ВКЛ ў абмен на рускіх палонных, што знаходзіліся ў Літве[128]. У XVII ст. Дрокаў на некаторы час зноў апынуўся ў складзе ВКЛ, аднак быў далучаны да Смаленскага ваяводства.

Радамля. Першыя звесткі аб існаванні Радамлянскай воласці ў Мсціслаўскім княстве мы ўпершыню сустракаем у лісце вялікага князя Жыгімонта Старога да Міхаіла Іванавіча ад 3 жніўня 1525 г. Разбіраючы спрэчку паміж князем Міхаілам і ягоным сынам Фёдарам, вялікі князь пагадзіўся з прапановай князя Фёдара аддаць сыну замак Радамль з умовай, што «ловы и дани медовые с волости Радамлянской» павінны дзяліцца напалам паміж князем Міхаілам Іванавічам і Фёдарам[129].

Воласць Радамлянская ўскосна згадваецца і ў больш позні час. Так, 19 жніўня 1528 г. вялікі князь Жыгімонт даў замкі Мсціслаў і Радамль «со всими дворцы и фольварки и волостьми...» ў дзяржанне берасцейскаму старасцічу Яну Юр'евічу Іллінічу[130].

Што з сябе ўяўляў Радамлянскі замак, цяжка сказаць, бо яго інвентары не захаваліся. Мяркуючы па плане Радамлянскага гарадзішча, у замку было не менеў за 4 вежы. Першая – уязная вежа-брама, другая вежа стаяла на грэбнепадобным вале з поўначы, а астатнія вежы стаялі па перыметры сцен (мал. 61).

---

[126] ДМАМЮ. – Т. 1. – С. 65.

[127] Любавский М. К. Областное деление и местное управление. – С. 136. Приложения: Документ № 46.

[128] СИРИО. – Т. 59. – С. 160–161.

[129] АСДОИСЗР. – Т. 1. – С. 162–163, № 136.

[130] АЗР. – Т. 1. – С. 189–190, № 155.



Мал. 61. План гарадзішча Замкавая гара ў Радамлі

Цікавым элементам Радамлянскага замка з'яўляецца калодзеж, які размяшчаўся ў паўднёвай частцы помніка. Ад яго захавалася варонкападобная западзіна дыяметрам каля 8 м і глыбінёй болей за 4,5 м[131].

У лісце-даніне на Мсціслаў і Радамлю, які быў дадзены Ю. Зяновічу, сцвярджаецца, што апошнія даюцца разам «з месты»[132]. Усё гэта падкрэслівае, што ў пачатку XVI ст. Радамля ўжо была невялікім горадам Мсціслаўскага княства. У Радамлі ў 1579–1580 гг. згадваецца наяўнасць гарадскога ўрада – гараднічага радамлянскага Еські, што таксама дазваляе разглядаць яе ў якасці гарадско-

[131] Ткачев М. А. Работы Посожского отряда // АО 1976 г. – М.: Наука, 1977. – С. 417.
[132] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 226. – Арк. 7 адв.–8.

га населенага пункта[133]. У горадзе ў XVI ст. былі дзве царквы. Адна існавала з часоў Юрыя Лынгвеневіча, а другая – з 1558 г.[134]

Мал. 62. Выява Радамлі на карце ВКЛ 1613 г. Т. Макоўскага

Аднак паступова Радамля, верагодна, усё больш саступала ў сваім развіцці Магілёву, Мсціславу і Крычаву, і ў пачатку XVII ст. у крыніцах яна ўжо не фігуруе ў якасці горада, а паступова пераходзіць у ранг меншых гарадскіх паселішчаў – мястэчак. Апошняму паспрыяў і той факт, што побач (прыкладна ў 20 км), у каралеўскай магілёўскай эканоміі, вырастаў з вёскі новы горад – Чавусы. У сярэдзіне XVII ст. Радамля страціла сваю ролю і як ваенны цэнтр; са старонак пісьмовых крыніц назаўсёды знікае яе замак, хаця ў 1600 г. у замку яшчэ згадваюцца пушкары, якім былі пацверджаны былыя правы[135]. Тым не менш на карце Т. Макоўскага ён паказаны проста як нейкі грамадзянскі будынак (мал. 62) без якой-небудзь вежы, што, верагодна, ужо адпавядала рэальнаму становішчу.

Такім чынам, паводле нашых даных, на тэрыторыі Мсціслаўскага княства XIV–XV стст. існавалі гарады Мсціслаў, Крычаў, Мглін, Папова Гара, Дрокаў, Радамля. Улічваючы, што па пісьмовых звестках у Паповай Гары і Мгліне было больш за 500 дымоў, то і ў цэнтры княства – Мсціславе – колькасць дымоў была не меншай за 500. Верагодна, не менш за 500 дымоў было і ў Крычаве, які ў пачатку XVI ст. выступае ў якасці фарпоста на ўсходзе краіны. На тэрыторыі сучаснай Украіны гарады XVI ст. з колькасцю дымоў ад 200 за 700 адносяцца да катэгорыі сярэдніх[136], таму і гэтыя чатыры гарады таксама можна аднесці да катэгорыі сярэдніх па колькасці дымоў і жыхароў гарадоў ВКЛ[137]. Дрокаў і Радамля мелі меншую колькасць жыхароў і заставаліся цэнтрамі сельскагаспадарчай акругі.

У Мсціслаўскім ваяводстве другой паловы XVI – пачатку XVII ст. заставалася толькі тры гарадскія цэнтры – Мсціслаў, Крычаў і Радамля. Прычым Мсціслаў, з'яўляючыся цэнтрам адміністрацыйна-тэрытарыяльнай і гаспадарчай адзінкі – ваяводства і староства, у крыніцах увесь час праходзіць пад тэрмінамі «горад», «места». Пасля падзей вайны 1654–1667 гг. у Мсціслаўскім ваяводстве засталося толькі два гарады – Мсціслаў і Крычаў, а Радамля паступова прыходзіла ў заняпад і ператваралася ў звычайную вёску.

Для Мсціслава і Крычава XVI – пачатак XVIII ст. былі часам, калі яны толькі паспявалі некалькі аднавіца пасля чарговай вайны, як пачыналася другая, якая нішчыла парасткі адраджэння. Тым не менш перыяд XVII–XVIII стст.

---

[133] НГАБ. – Ф. 1817. – Воп. 1. – Адз. зах. 2. – Арк. 136–139 адв, 142 адв.–143.

[134] Тамсама. – Ф. 1729. – Адз. зах. 33. – Арк. 360–360 адв.; АЗР. – Т. 3. – С. 97.

[135] Тамсама. – Ф. КМФ-18. – Адз. зах. 86. – Арк. 429 адв.

[136] Сас П. М. Феодальные города Украины в конце XV – 60-х годах XVI в. – С. 22.

[137] Копысский Э. Ю. Экономическое развитие городов Белоруссии... – С. 32.

у гісторыі гарадоў Мсціслаўскага ваяводства – гэта перыяд іх паспяховага развіцця, нягледзячы на шматлікія і разбуральныя войны.

Гэта пацвярджаецца і ўзроўнем развіцця рамяства ў гэтых гарадах. Безумоўна, галоўным паказчыкам канцэнтрацыі рамяства ў кожным горадзе была колькасць прафесій і рамеснікаў. Аднак, на вялікі жаль, захаваліся вельмі сціплыя даныя па Мсціславу і Крычаву, якія не даюць магчымасці падрабязна асвятліць гэта пытанне.

Аднак некаторыя даныя дазваляюць зрабіць пэўныя назіранні. Так, у Мсціславе ў сярэдзіне XVII ст. было два цэхі, якія аб'ядналі рамеснікаў дзвюх спецыяльнасцей[138], аднак што гэта былі за цэхі, не паведамляецца. Падчас археалагічных даследаванняў у Мсціславе быў знойдзены толькі адзін вытворчы комплекс – майстэрня касцярэза XIV–XV стст.[139], што сведчыць пра існаванне ў горадзе рамеснікаў гэтай спецыяльнасці.

Мсціслаўскі цэх залатых, срэбраных, бляхарных і гадзіннікавых спраў у канцы XIX ст. аб'яднаў рамеснікаў гэтых спецыяльнасцей не толькі Мсціслава, але і ўсёй тэрыторыі былога Мсціслаўскага ваяводства[140]. Нельга выключыць, што гэты цэх існаваў значна раней і ў яго ўваходзілі майстры не толькі Мсціслава, а і Крычава, Хіславічаў, Шумячаў, Манастыршчыны і іншых навакольных мястэчак.

Усход Рэчы Паспалітай ў XVII – пачатку XVIII ст. быў адным з цэнтраў шкларобства краіны. Ужо ў пачатку XVII ст. (1621–1622 гг.) рускія крыніцы фіксуюць будаўніцтва ў памежных лясах на рускай тэрыторыі паташных буд літоўскімі людзьмі і вываз імі паташа ў Літву – Мсціслаў. Прычым літоўскія людзі рабілі гэта па распараджэнні пана Зяновіча, а гэты род у адзначаныя гады займаў пасаду харунжага Мсціслаўскага ваяводства[141].

У Крычаўскім старостве былі як мінімум дзве шкляныя гуты – у сучасных Клімавіцкім і Хоцімскім раёнах, каля вёсак Гута (1694 г.) і Узлогі (1727 г.). Шкло варылася і ў самім Мсціславе, пра што сведчаць знаходкі бракаваных шкляных нарыхтовак рознага тыпу посуду, шкляных шлакаў, а таксама тапонімы Гута, Гутка, Гатароўшчына, якія існавалі ў бліжэйшым наваколлі Мсціслава яшчэ ў пачатку XX ст. [142]

Безумоўна, у горадзе жылі і майстры-рамеснікі, якія займаліся металаапрацоўкай. Яскравым сведчаннем гэтага з'яўляюцца не толькі розныя металічныя прадметы, знойдзеныя падчас археалагічных даследаванняў, але і выяўлены

---

[138] Копысский Э. Ю. Экономическое развитие городов Белоруссии... – С. 89.

[139] Трусаў А. Мсціслаўская касцярэзная майстэрня. – С. 18–19.

[140] Цітоў А. Зэгармістры Беларусі // Архіварыус: зб. навук. паведамл. і арт. – Вып. 4. – Мінск: НГАБ, 2006. – С. 141–158; Яго ж. Спіс майстраў-зэгармістраў, што працавалі ў Беларусі з XVI да пачатку XX ст. // Архіварыус: зб. навук. паведамл. і арт. – Вып. 5. – Мінск: НГАБ, 2007. – С. 159–174.

[141] Русско-белорусские связи. Сб. документов 1570–1667 гг. – С. 75–77.

[142] Яніцкая М. М. Мсціслаўскае шкло XVI–XIX стст. – С. 83–93; Сташкевіч А. Шкляны посуд Пасожскіх гарадоў (XVII–XVIII стст.). – С. 16–21; Яго ж. Развіццё шкларобства на Магілёўшчыне. – С. 89–109.

каля кармеліцкага касцёла, на ўскрайку горада, развал печы-домніцы канца XIII–XIV стст.[143]

Багацце знойдзенага археалагічнага матэрыялу сведчыць, што Мсціслаў у XVII – першай палове XVIII ст. з'яўляўся буйным цэнтрам кафлярства на ўсходзе Рэчы Паспалітай[144]. Развіццю кафлярства, цагельнай вытворчасці ў горадзе спрыяў і факт будаўніцтва тут у пачатку XVIII ст. некалькіх мураваных комплексаў каталіцкіх кляштараў і касцёлаў.

Крыніцы не захавалі назвы цэхаў рамеснікаў, што былі ў Крычаве. Аднак аналіз спецыяльнасцей рамеснікаў, што згадвае інвентар горада 1747 г., паказвае, што гаспадарчая функцыя гэтага цэнтра ў пэўнай ступені мела аграрна-рамесна-гандлёвую спецыялізацыю. Нягледзячы на наяўнасць у горадзе рамеснікаў, дзейнасць якіх была вызначальнай – у першую чаргу розныя віды металаапрацоўкі, ад узроўню развіцця якіх залежаў агульны стан развіцця рамеснай вытворчасці ў горадзе, – кавалі, слесары, кацельнікі[145], трэба прызнаць, што значная частка яго насельніцтва была звязана з вытворчасцю і перапрацоўкай сельскагаспадарчай прадукцыі. Гэта ў першую чаргу жыхары горада, якія займаліся сельскагаспадарчай справай як асноўным відам працы, і рамеснікі, звязаныя з вытворчасцю прадуктаў харчавання і вопраткі: піваўары, алейнікі, рэзнікі, пекары, рыбакі, гарбары, кушняры, шаўцы, краўцы. Такая аграрная накіраванасць гаспадарчага жыцця сярэднявечнага Крычава не была чымсьці спецыфічным менавіта для гэтага горада. Сярэднявечны горад ніколі не парываў з агракультурай, і аграрна-рамесная арыентацыя была характэрнай рысай для ўсіх малых гарадоў Еўропы[146].

Аналіз прозвішчаў жыхароў Крычава і даныя яго інвентара за 1747 г. пацвярджаюць наяўнасць тут і ганчароў, якія займаліся не толькі вырабам посуду і кафлі. У сярэдзіне XVIII ст. у горадзе існавала дзяржаўная (скарбовая) цагельня, што яскрава сведчыць пра патрэбы горада ў будаўнічых матэрыялах і пра яго паступовае і паспяховае развіццё.

6.2. Мястэчкі Мсціслаўскага ваяводства XVI–XVIII стст.

6.2.1. Прыватнаўласніцкія мястэчкі

Узнікненне мястэчак у Вялікім Княстве Літоўскім было заканамерным вынікам развіцця феадальнай гаспадаркі краіны XIV–XVIII стст. Павелічэнне колькасці насельніцтва і, як вынік гэтага, актыўны каланізацыйны працэс, узнікненне новых вёсак і двароў, развіццё ўнутранага рынку краіны выклікалі неабходнасць узнікнення новага тыпу паселішчаў, якія запоўнілі той тэрытарыяльна-эканамічны вакуум, што стварыўся паміж горадам і вёскай.

---

[143] Сагановіч Г. М. Кавальскія вырабы сярэднявечнага Мсціслава. – С. 183–189.

[144] Трусов О. А. Мстиславльские изразцы. – С. 334–340.

[145] Русско-белорусские связи. – С. 50.

[146] Ястребицкая А. А. О специфике средневековой европейской урбанизации: малые города // Древности славян и Руси. – М.: Наука, 1988. – С. 190–196.

Першыя мястэчкі на тэрыторыі ВКЛ пачалі фарміравацца ў XV ст. Але большая частка іх узнікла ў XV – першай палове XVII ст. у заходніх і цэнтральных раёнах краіны. Аб гісторыі мястэчак гэтых рэгіёнаў краіны захавалася шмат пісьмовых крыніц, і яны даўно прыцягваюць увагу даследчыкаў[147]. Значна горшая сітуацыя з вывучэннем мястэчак, якія знаходзіліся на ўсходзе ВКЛ. Фактычна, толькі асобныя абагульняльныя звесткі па гэтай праблематыцы можна знайсці ў артыкулах С. Александровіча, а больш дэталёвае вывучэнне працэсу фарміравання гэтай катэгорыі паселішчаў гарадскога тыпу, размешчаных на ўсходзе краіны, пакуль яшчэ чакае свайго даследчыка.

Усход дзяржавы да канца XVII ст. у значнай частцы заставаўся вольным ад фарміравання мястэчак. Асабліва гэта тычылася памежнага Мсціслаўскага ваяводства. Тут да сярэдзіны XVII ст. дакладна вядомы толькі старыя адміністрацыйныя цэнтры, якія ўзніклі на Пасожжы яшчэ ў XII–XV стст., – Мсціслаў, Крычаў, Радамля, магчыма, Хіславічы. Даволі вялікая колькасць мястэчак Мсціслаўскага ваяводства прыводзіцца ў артыкуле С. Александровіча[148]. Але больш дэталёвае знаёмства з іх размяшчэннем паказвае, што ўсе мястэчкі, якія прыпісваюцца С. Александровічам да Мсціслаўскага ваяводства, на самай справе размешчаны на тэрыторыі Аршанскага павета Віцебскага ваяводства і не маюць ніякага дачынення да Мсціслаўскага ваяводства. І нават тыя мястэчкі Аршанскага павета, якія ўзніклі да сярэдзіны XVII ст., у асноўным лакалізуюцца як мага далей ад дзяржаўнай мяжы. Уздоўж дзяржаўнай мяжы ў Аршанскім павеце стаяў толькі ланцужок дзяржаўных і прыватнаўласніцкіх гарадоў-крэпасцей – Орша, Копысь, Дуброўна, Горы Вялікія.

Такое маруднае ў параўнанні з заходнімі раёнамі краіны фарміраванне мястэчак было выклікана, у першую чаргу, неспрыяльнымі знешнепалітычнымі фактарамі. На працягу XVI – першай паловы XVII ст. землі Мсціслаўскага ва-

---

[147] Alexandrowicz S. Kierunki produkcji rzemieślniczej i przemysłowej w miasteczkach Białorusi i Litwy (XVI – do połowy XVII w.) // Zeszyty naukowe Uniwersytetu im. Adama Mickiewicza w Poznaniu. – Poznań. 1964. – Nr. 47. – Historia. – № 6 – S. 23–54; Яго ж. Zaludnienie miasteczek Litwy i Białorusi w XVI – pierwszej połowie XVII wieku // Rocznik dziejów społecznych i gospodarczych. – Poznań, 1966. – T. 27. – S. 35–68; Яго ж. Geneza i rozwój sieci miasteczek Białorusi i Litwy do połowy XVII w. // Acta Baltico-Slavica. – Byałystok, 1970 – T. VII. – S. 47–108; Бохан Ю. М. Аб месцы мястэчка ў структуры гарадскіх пасяленняў XV–XVIII стст. (па матэрыялах мястэчак вярхоўяў Віліі і нёманскай Бярэзіны) // Гістарычна-археалагічны зборнік. Памяці Міхася Ткачова. – Мінск, 1993. – Ч. 1. – С. 18–31; Яго ж. Асноўныя заканамернасці планіровачнага развіцця мястэчак паўночна-заходняй Беларусі ў XV–XVIII стст. (па матэрыялах мястэчак вярхоўяў Віліі і нёманскай Бярэзіны) // ГАЗ. – Мінск, 1994. – № 3. – С. 108–114; Шаблюк В. Гістарычная тапаграфія і планіроўка мястэчак верхнага Панямоння // ГАЗ. – Мінск, 1994. – № 3. – С. 237–247; Яго ж. Да пытання фарміравання мястэчак Беларускага Панямоння // ГАЗ. – Мінск, 1996. – № 10. – С. 157–163; Яго ж. Забудова прынёманскіх мястэчак у XVI–XVIII стст. // ГАЗ. – Мінск, 1996. – № 6. – С. 242–256; Бохан Ю. М., Шаблюк В. У. Агульная характарыстыка мястэчак. Тыпы планіроўкі // Археалогія Беларусі: у 4 т. – Т. 4. Помнікі XIV–XVIII стст. – Мінск, 2001. – С. 54–62; Мяцельскі А. А. Мястэчкі Крычаўскага староства // Castrum, urbis et bellum. – С. 286–295.

[148] Alexandrowicz S. Geneza i rozwój sieci miasteczek Białorusi i Litwy do połowy XVII w. – S. 47–72.

яводства знаходзіліся на вастрыі ўдараў рускіх войскаў падчас шматлікіх войнаў з Вялікім Княствам Літоўскім і Рэччу Паспалітай. Акрамя таго, калі на захадзе актыўнаму працэсу фарміравання мястэчак спрыяў знешнеэканамічны фактар – вываз прадукцыі на захад, то на ўсходзе мястэчкі ўзнікалі ў першую чаргу ў выніку ўцягвання феадальнай і сялянскай гаспадаркі ва ўнутраны рынак[149]. Знешні рынак тут быў дадатковым фактарам, што, безумоўна некалькі запавольвала працэс фарміравання местэчак.

Аднак парасткі новага, хоць і вельмі марудна, пранікалі і на землі Мсціслаўскага ваяводства. Ужо ў 1597 г. наяўнасць тут мястэчак адзначаецца ў каралеўскім лісце да рэвізораў Мсціслаўскага і Радамлянскага старостваў Яна Чыжа і Цімафея Сяліцкага. Аднак канкрэтна назвы населеных пунктаў, што адносіліся да катэгорыі мястэчак, у крыніцы не названы[150]. Улічваючы, што заўжды гаворка пра іх ідзе ў множным ліку, можна меркаваць, што на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства ўжо існавала некалькі мястэчак.

Але трэба ўлічваць, што тады тэрміны «места» і «мястэчка» даволі часта падмянялі адзін аднаго, і таму нельга выключыць, што пад тэрмінам «мястэчка» ў гэты час праходзіў і Крычаў, які сапраўды ў крыніцах канца XVI – пачатку XVII ст. называецца то горадам, то мястэчкам. Акрамя таго, да сённяшняга часу няма дакладных крытэрыяў, па якіх вызначаюцца гарады і мястэчкі. Гэта пытанне і ў XVI–XVIII стст. не было дакладна акрэслена. І толькі пастановай Варшаўскага сейма 1773 г. было вызначана, што мястэчкам лічыцца населены пункт, у якім налічваецца менш за 300 дымоў і большасць насельніцтва займаецца сельскай гаспадаркай[151]. Але гэта пастанова адносілася да Польскай Кароны. Што ж тычыцца мястэчак ВКЛ, то тут адзінага падыходу няма і сярод сённяшніх даследчыкаў.

Так, С. Александровіч населеныя пункты гарадскога тыпу падзяляў на некалькі катэгорый. Мястэчкамі ён лічыў паселішчы ад 80 да 150 дымоў. Вялікія мястэчкі налічвалі ад 151 да 250 дымоў. А населеныя пункты, дзе было больш за 250 дымоў, ён адносіць да гарадоў[152].

Акрамя Мсціслава і Крычава, безумоўна гарадскіх цэнтраў, на тэрыторыі ваяводства існавалі іншыя адміністрацыйныя і рамесна-гандлёвыя цэнтры, што сфарміраваліся ў больш ранні перыяд. Яны займалі прамежкавае становішча паміж горадам і вёскай і выконвалі ролю мястэчак, хоць тэрміналагічнае вызначэнне іх як мястэчак сустракаецца ў больш позні час.

Адным з такіх ранніх адміністрацыйна-гаспадарчых цэнтраў Мсціслаўскага ваяводства была Радамля – цэнтр воласці і негарадавога староства ў складзе Мсціслаўскага княства і ваяводства з пачатку XVI ст. да 1772 г., якое мястэчкам упершыню названа ў 1605 г.[153]

---

[149] Копысский Э. Ю. Экономическое развитие городов Белоруссии... – С. 26.

[150] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 83. – Арк. 185 адв.–187.

[151] Volumina legum. – T. 4. – S. 88.

[152] Alexandrowicz S. Zaludnienie miasteczek Litwy i Białorusi... – S. 38.

[153] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 85. – Арк. 314 адв.–315 адв.

Паводле С. Александровіча, адным з першых сведчанняў аб пачатку фарміравання прыватнаўласніцкіх мястэчак на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства з'яўляецца прывілей (1562–1566 гг.) Жыгімонта Аўгуста Тэадоры Трэбухоўскай на заснаванне мястэчка **Жукава**, арганізацыю ў ім торгу і адкрыццё карчмы[154]. Аднак наша знаёмства з копіяй Літоўскай метрыкі, якая захоўваецца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі, не выявіла той дакумент, на які спасылаецца С. Александровіч. Таму пытанне пра заснаванне мястэчка Жукава на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства ў сярэдзіне XVI ст. застаецца адкрытым. Больш таго, у другой палове XVII–XVIII ст. Жукава ўвесь час праходзіць як вёска, цэнтр аднайменнага староства, а мястэчкам не называецца.

Да сярэдзіны XVII ст. крыніцы вельмі сціпла называюць іншыя мястэчкі на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства, акрамя Радамлі. Аднак ужо ў першай палове XVII ст. тут пачынаецца фарміраванне мястэчак на аснове былых вёсак.

Так, у 1639 г. мсціслаўскаму падсудку Войне Ясенецкаму быў выдадзены прывілей на заснаванне мястэчка ў Мсціслаўскім ваяводстве ў «маетнасці» **Фастава**. Вёска з сугучнай назвай існавала на тэрыторыі Лютнянскага сельсавета Мсціслаўскага раёна да 1973 г.[155] Для арганізацыі мястэчка надаваліся правы на правядзенне ў Фаставе кірмашоў (на свята Св. Іллі і на дзень Узнясення Багародзіцы) і на штотыднёвыя таргі ў сераду[156].

Аднак ці было заснавана мястэчка, ці не, ці яно загінула падчас вайны 1654–1667 гг., дакладна невядома: мястэчка з падобнай назвай ў Мсціслаўскім ваяводстве больш ніколі не згадваецца. У той жа час нельга выключыць, што ў крыніцы памылкова сказана, што мястэчка засноўваецца ў Мсціслаўскім ваяводстве, а на самай справе гэты прывілей адносіцца да добра вядомага мястэчка Фастава Аршанскага павета Віцебскага ваяводства.

У сярэдзіне XVII ст. згадваецца мястэчка Расна, якое ў 1654 і ў 1665 гг. палілі рускія войскі. Значна больш захавалася пасляваенных крыніц, якія паказваюць нам Расна як адміністрацыйна-гандлёвы цэнтр, хаця ў якасці цэнтра невялікай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай акругі яно згадваецца ўжо ў крыніцах XVI ст.[157]

У сярэдзіне XVII ст. у Расне згадваецца рынак, на якім праводзіліся кірмашы, а ў склад яе воласці ўваходзілі вёскі Каменка, Гурсёнка і Пятухоўка. Крыніцы таксама згадваюць пра наяўнасць ў Расне прадстаўнікоў гарадскога кіравання – войтаў, старога і новага[158].

Магчыма, бліжэй да сярэдзіны XVII ст. мястэчкам былі **Маляцічы**, якія стаялі на прамым шляху з Крычава ў Оршу. Маляцічы ўпершыню ўскосна згадваюцца ў сярэдзіне XVI ст. – «ніўка малячыцкая», аднак яшчэ у 1646 г.

---

[154] Alexandrowicz S. Geneza i rozwój sieci miasteczek Białorusi i Litwy... – S. 98, № 104.

[155] Рапановіч Я. Н. Слоўнік назваў населеных пунктаў Магілёўскай вобласці. – Мінск: Навука і тэхніка, 1986. – С. 179.

[156] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 113. – Арк. 177–177 адв.

[157] ИЮМ. – Вып. 17. – С. 177; Тамсама. – Вып. 25. – С. 439; АСДОИСЗР. Т. 2. – С. 7.

[158] ИЮМ. – Вып. 25. – С. 319–325, 481, 502.

Маляцічы названы ў крыніцы «весью»[159]. Але цікавую інфармацыю пра Маляцічы даюць нам закладная 1645 г. Уладзіміра Каменскага сваёй жонцы Марцыбелі Друцкай-Сакалінскай і яе пацвярджэнне 1647 г. Атрымаўшы ад жонкі 50 000 злотых, ён здаваў ёй у арэнду на 3 гады «маетнасць» Маляцічы «...z wolnym jarmarkow uźywaniem...»[160], а выкананне паселішчам функцыі гандлёвага цэнтра сведчыць пра паступовае пераўтварэнне яго ў паселішча гарадскога тыпу і першай яго стадыі – мястэчка. У другой палове XVII ст. тут ужо існавала царква, пра што сведчыць згадванне маляціцкага святара[161], акрамя таго ў гэты ж час тут былі заснаваны кляштар і касцёл. Усё гэта гаворыць пра значнасць Маляцічаў і пацвярджае, што яны маглі быць мястэчкам ужо ў XVII ст.

Пасля вайны 1654–1667 гг. Радамля і Расна адрадзіліся даволі хутка. У 1699 г. яны згадваюцца ва ўніверсале караля Аўгуста II Моцнага сярод гарадоў і мястэчак, з якіх бралася падводная павіннасць. І, мяркуючы па памерах гэтай даніны (20 і 15 злотых адпаведна), яны стаялі на адным узроўні з іншымі мястэчкамі краіны[162]. У той жа час пасля вайны 1654–1667 гг. радамлянскі замак, верагодна, канчаткова прыйшоў у заняпад і болей не адраджаўся. Ва ўсякім выпадку, ён не згадваецца ў крыніцах.

У сярэдзіне XVII ст. (1654 г.) невялікім горадам альбо мястэчкам Мсціслаўскага ваяводства на скрыжаванні 8 шляхоў было **Кадзіна** – сучасная вёска Манастыршчынскага раёна Смаленскай вобласці Расіі, якая ўпершыню згадваецца ў 1546 г. як цэнтр «маетнасці» Якуба Вяжэвіча[163]. Род Вяжэвічаў ужо ў XV ст. валодаў маетнасцямі ў наваколлях Смаленска і Мсціслава, таму нельга выключаць, што Кадзіна было іх даўнім уладаннем[164].

Кадзіна адносна няблага перанесла падзеі вайны 1654–1667 гг. У 1667 г. гэта было невялікае места, якім валодаў крайчы ВКЛ М. Агінскі і ў якім налічвалася 136 дымы. Пра яго выгляд у 1678 г. захавалася кароткае паведамленне пасла ў Расію Б. Танера, які адзначаў, што яго насельніцтва складаюць «схизматики и жиды» і што «город ни насыпью, ни стенами не огорожен». Акрамя таго, пра Кадзіна канца XVII ст. вядома, што там у 1686 г. была арганізавана езуіцкая місія з аршанскага езуіцкага калегіума[165].

У 1690 г. на падставе вёскі **Дрыбін** Караль Цеханавецкі заснаваў аднайменнае мястэчка і для яго развіцця надаў жыхарам «слабаду» на 30 год[166]. Даклад-

---

[159] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 234. – Арк. 198–200 адв.; Тамсама. – Адз. зах. 330. – Арк. 146 адв.–147 адв.

[160] ИЮМ. – Вып. 25. – С. 417–418.

[161] Тамсама. – Вып. 24. – С. 469–470.

[162] АВК. – Т. 8. – С. 291–292.

[163] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 223. – Арк. 125–125 адв.; АЮЗР. – Т. 14. – С. 481.

[164] ДМАМЮ. – Т. 1. – С. 22, № 21, 31, № 1.

[165] Metryka Litewska. Rejestry podymnego Wielkiego Księsta Litewskiego. Województwo mścisławskie 1667 r. – Warszawa: Wyd. DiG, 2008. – S. 72; Таннер Б. Описание путешествия польского посольства в Москву в 1678 г. // ЧИОИДР. – 1891. – Кн. 3. – С. 28.; Encyklopedie wiedzy o jezuitach na ziemiach Polski i Litwy. 1564–1996. – Kraków: Wyd. WAM. 1996. – S. 259.

[166] Dumin S., Rachuba A., Sikorska-Kulesza J. Ciechanowieccy herby Dąbrowa. – S. 62.

ная дата ўзнікнення Дрыбіна невядома, аднак у першай палове XVII ст. (1632 г.) згадваюцца дрыбінскія сёлы, якімі валодалі Сапегі[167], што дазваляе сцвярджаць пра існаванне Дрыбіна як мінімум з пачатку гэтага стагоддзя і пра тое, што ўжо ў гэты час ён з'яўляўся адміністрацыйна-гаспадарчым цэнтрам пэўнай акругі. Таму новае мястэчка было заснавана на добра падрыхтаванай глебе.

У самым пачатку XVIII ст. (1701 г.) падчас разбору спрэчкі з-за спадчыны паміж Францішкам і Антоніем Казімірам Цеханавецкімі першы атрымаў у свае уладанні, як гаворыць крыніца, частку **Пацкава** разам з мястэчкам і вёскамі Старына, Ракаўшчызна, Башары, Белы меч (суч. Белы Мох), Волкава, Навачызна і Валшчызна[168]. Аднак ніколі болей, ні да 1701 г., ні пазней Пацкава не згадваецца ў якасці мястэчка. Магчыма, гэта звычайная памылка, альбо мястэчка не перажыло падзеі 1708 г. і засталося звычайным дваром і вёскай, якім і надалей валодалі Цеханавецкія.

На мяжы з Расіяй у месцы перасячэння 10 вялікіх і малых дарог у 1719 г. стаяла мястэчка **Татарск**[169] – сучасная аднайменная вёска Манастыршчынскага раёна Смаленскай вобласці, размешчаная каля ўпадзення р. Гародня ў р. Віхра. Аднак на самай справе мястэчкам яно стала значна раней. Ва ўсякім выпадку, у 1710 г. тут згадваецца торг, «тарговае» і «важнае», з якога, згодна з прывілеем караля Яна III Сабескага (1676–1694 гг.), браў на сябе ўладальнік Татарска Ежы Караль Паплаўскі[170]. Апошняе дазваляе сцвярджаць пра існаванне мястэчка ўжо ў апошняй чвэрці XVII ст.

Аднак акрамя гэтых мястэчак (Радамлі, Расны, Кадзіна, Дрыбіна, Татарска), крыніцы XVII ст. не згадваюць пра іншыя паселішчы падобнага статуса. І гэта сітуацыя добра тлумачыцца тым спусташэннем, якое пацярпелі землі Мсціслаўскага ваяводства падчас вайны 1654–1667 гг. з Рускім царствам.

Спустошаныя вайной 1654–1667 гг. раёны і абязлюдзелыя землі не маглі быць урадлівай глебай, на якой мог ісці актыўны працэс фарміравання мястэчак. І толькі спыненне вайнаў з Масквой, завяршэнне вайны 1700–1721 гг. са Швецыяй, падчас якой землі Мсціслаўскага ваяводства ў 1708–1709 гг. былі раёнам актыўных баявых дзеянняў, прывяло да ўстанаўлення міру на гэтых землях, пачатку актыўнага асваення памежных тэрыторый і больш актыўнага ўцягвання рэгіёна ў фарміраванне ўнутранага рынку краіны.

Усё гэта не магло прывесці да далейшага развіцця старых мястэчак і пачатку актыўнага росту новых, як прыватнаўласніцкіх, так і дзяржаўных мястэчак у канцы XVII – пачатку XVIII ст.

Працягвала сваё далейшае развіццё мястэчка Расна, хаця яно і адсутнічае ў спісе 1719 г. мястэчак і гарадоў Мсціслаўскага ваяводства, якія выплочвалі

---

[167] Sapiehowie. Materjały historyczno-genealogiczne i majątkowe. Wydanie nakladem rodziny. – Petersburg: Druc. Trenka i Fusno. – T. 1. – 1890. – S. 403.

[168] Dumin S., Rachuba A., Sikorska-Kulesza J. Ciechanowieccy herby Dąbrowa. – S. 68.

[169] НГАБ. – Ф. 1729. – Воп. 1. – Адз. зах. 21. – Арк. 397; Тамсама. – Адз. зах. 33. – Арк. 591–591 адв.

[170] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 155. – Арк. 377.

«чопавае», аднак у рэестры 1721 г. яно згадваецца як мястэчка[171]. Дакладная колькасць дымоў ў Расне невядома. Звычайна крыніцы падаюць яе разам з іншымі вёскамі, што ўваходзілі ў склад яе воласці. Дакладна вядома толькі колькасць дымоў ў 1784 г., калі тут налічвалася 65 двароў (218 жыхароў), касцёл, царква[172]. Згодна з планам 1785 г. мястэчка мела квартальную вулічную забудову, аднак рынкавая плошча на ім не прасочваецца[173] (мал. 63).

Далейшае развіццё атрымала мястэчка Кадзіна. Як вядома, у 1686 г. тут была арганізавана езуіцкая місія аршанскага езуіцкага калегіума, пры якой быў касцёл, але першы самастойны касцёл тут быў пабудаваны толькі ў 1751 г.[174] У пачатку XVIII ст. гэта было вялікае паселішча. У 1719 г. Кадзіна выплочвала чацвёртае па памерах «чопавае» – 600 злотых, саступаючы толькі Мсціславу, Крычаву і Дрыбіну[175].

Мал. 63. План мястэчка Расна згодна з Генеральным межаваннем 1783–1784 гг.

[171] НГАБ. – Ф. 1729. – Воп. 1. – Адз. зах. 23. – Арк. 324–325 адв.

[172] Князева В. Расна // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Т. 6, ч. 1. – С. 110.

[173] РДАСА. – Ф. 1354. – Воп. 244/1. – Адз. зах. Р-7 – галка чырвоная.

[174] ЛНБ ім. В. Стэфаніка НАН Украіны. Аддзел рукапісаў // Ф. 5. – Адз. зах. 5163/П. – Арк. 24; Encyklopedie wiedzy o jezuitach. – S. 259.

[175] НГАБ. – Ф. 1729. – Воп. 1. – Адз. зах. 21. – Арк. 397.

Аснову планіроўкі мястэчка першай трэці XVIII ст. складала рынкавая плошча з крамамі, важніцай і царквой са званіцай ў цэнтры. З рынка адыходзілі ў розныя бакі вуліцы: Мсціслаўская, Аршанская, Смаленская, Гуменная, Новая, Дворная і некалькі безыменных завулкаў. З культавых пабудоў акрамя праваслаўнай царквы на Смаленскай вуліцы была сінагога, а касцёл з плябанню ўжо ў 1729 г. стаяў на вуліцы што вяла са двара ўладароў мястэчка ў горад. У 1729 г. у Кадзіне быў 201 сялянскі дым, сярод якіх 139 хрысціянскіх і 62 яўрэйскіх[176].

Аднак напрыканцы XVIII ст. (1783–1785 гг.) колькасць насельніцтва ў мястэчку Кадзіна рэзка скарацілася. Тут налічвалася ў тыя гады толькі 63 дымы, у якіх пражывалі 527 жыхароў[177]. На той час Кадзіна працягвала захоўваць устойлівую квартальную планіроўку, аснову кампазіцыі якой складала рынкавая плошча[178]. У Кадзіне працягваў сваю дзейнасць езуіцкі касцёл Прасвятой Багародзіцы і дзейнічала праваслаўная царква Жываначальнай Тройцы[179] (мал. 64).

Мал. 64. План мястэчка Кадзіна згодна з Генеральным межаваннем 1783–1784 гг.

[176] ЛНБ ім. В. Стэфаніка НАН Украіны. Аддзел рукапісаў // Ф. 5. – Адз. зах. 5163/П. – Арк. 19–33; Козловский П. Г. Крестьяне Белоруссии во второй половине XVII–XVIII вв. (по материалам магнатских владений). – Минск: Наука и техника, 1969. – С. 179.

[177] Анішчанка Я. К. Генеральнае межаванне ў Беларусі. Дапаўненне. – С. 103.

[178] РДАСА. – Ф. 1354. – Воп. 239/1. – Адз. зах. К-36 – галка чырвоная.

[179] Тамсама. – Ф. 1355. – Воп. 1. – Адз. зах. 721. – Арк. 219

Слабада, дадзеная Дрыбіну Каралем Цеханавецкім у 1690 г., дала свой плён. У «рэестры на чопавае» 1719 г. Дрыбін названы «miastom» і, мяркуючы па памерах выплочваннага «чопавага» (1500 злотых), гэта было адно з наймагутнейшых у эканамічным плане паселішчаў Мсціслаўскага ваяводства, якое саступала толькі Мсціславу і Крычаву[180]. Нездарма яшчэ ў XIX ст. існавала прымаўка – «kto ma Drybin i Kurmanów, ten jest pan nad panów»[181].

У 1783–1785 гг. у мястэчку было 99 дымоў, у якіх пражывалі 573 жыхары. У мястэчку была царква Міколы Цудатворца, налічвалася 25 лавак, на рынку па нядзелях праводзіўся торг. У Дрыбіне былі чатыры млыны: тры знаходзіліся на р. Радуч. А яшчэ адзін, разам з фолюшам, на р. Проня[182].

Побач з мястэчкам знаходзілася вёска Стары Дрыбін, у якой пражывалі 132 жыхары і налічвалася 34 дамы[183]. Гэтыя два населеныя пункты ўяўлялі з сябе адно з буйнейшых сельскіх паселішчаў (133 дамы) рэгіёна (мал. 65).



Мал. 65. План мястэчка Дрыбін згодна з Генеральным межаваннем 1783–1784 гг.

[180] НГАБ. – Ф. 1729. – Воп. 1. – Адз. зах. 21. – Арк. 397.

[181] Aftanazy R. Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej. – Wrocław; Warszawa; Kraków: Ossolenium, 1991. – T. 1. – S. 192.

[182] РДАСА. – Ф. 1355. – Воп. 1. – Адз. зах. 732. – Арк. 131–132.

[183] Анішчанка Я. К. Генеральнае межаванне ў Беларусі. Дапаўненне. – С. 108.

Значна горшая сітуацыя склалася з Радамляй, якая да 1784 г. ператварылася ў звычайную вёску, дзе налічвалася толькі 25 двароў і 69 жыхароў[184]. Яе заняпад пачаўся, верагодна, падчас Паўночнай вайны 1700–1721 гг. Ва ўсякім выпадку, яна адсутнічае сярод гарадоў і мястэчак Мсціслаўскага ваяводства, з якіх у 1719 і 1721 гг. збіралася «чопавае». Ды і план вёскі 1784 г. сведчыць пра адсутнасць тут планавай кампазіцыі і арганізуючага цэнтра (мал. 66)[185]. Фактычна, цэнтр воласці, які існаваў тут у XV–XVII стст., ператварыўся ў звычайную вёску. Магчыма, прычынай гэтага сталі не толькі падзеі войнаў 1654–1667 і 1700–1721 гг., але і арганізацыя побач у пачатку XVII ст. мястэчка Чавусаў. Тым не менш, яшчэ у 1755 г. крыніцы згадваюць тут наяўнасць гараднічага[186].

Усяго, згодна з актыкацыяй падаткаў на выплату «чопавага» у 1719 г., у Мсціслаўскім ваяводстве, за выключэннем тэрыторыі Крычаўскага староства, было 4 гарады – Мсціслаў, Крычаў, Дрыбін, Кадзіна і 9 прыватнаўласніцкіх мястэчак – Татарск, Манастыршчына, Шамава, Пятровічы, Пячэрск, Маляцічы, Хаславічы, Шумячы і Казіміра Слабада.



Мал. 66. План мястэчка Радамлі згодна з Генеральным межаваннем 1783–1783 гг.

[184] Анішчанка Я. К. Генеральнае межаванне ў Беларусі. Дапаўненне. – С. 109.
[185] РДАСА. – Ф. 1354. – Воп. 244/1. – Адз. зах. Р-6 – галка сіняя.
[186] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 181. – Арк. 143, 217–219.

Новыя мястэчкі, якія пачалі ўзнікаць на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства ў канцы XVII – пачатку XVIII ст., як правіла, вырасталі на аснове больш ранніх паселішчаў, якія стаялі на гандлёвых шляхах. Так, значная частка новых мястэчак узнікла на аснове памежных паселішчаў, якія стаялі на гасцінцах, што вялі за межы дзяржавы.

У 1710 г. мястэчкам упершыню называюцца **Хаславічы** (сучасны райцэнтр Хіславічы Смаленскай вобласці), якімі ў 1710 г. валодаў Крыштаф Цеханавецкі[187]. Яно стаяла на мяжы дзяржавы, на дарозе з Мсціслава ў Расію.

Хоць у якасці цэнтра воласці Хіславічы згадваюцца яшчэ у 1523 г., яны доўгі час заставаліся сельскім паселішчам. Так, яшчэ у 1589 г. яны названы сялом[188], і ў першай палове XVII ст. Хіславічы заставаліся сельскім паселішчам.

Звесткі пра Хіславічы вельмі сціплыя. У пачатку XVII ст. аднойчы згадваецца «поп хаславіцкі», без удакладнення, у якой царкве ён служыў[189]. У 1719 г. Хіславічы выплачвалі даволі вялікае «чопавае» – 800 злотых, што сведчыць пра значнасць паселішча[190].

Аднак нават у сярэдзіне XVIII ст. пра мястэчка мала што вядома. У 1765 г. тут згадваюцца толькі уніяцкая Барысаглебская царква, што была пераведзена ў унію ў 1710 г., і кагальная лазня[191]. Рэвізская сказка Хаславічаў (1778 г.) некалькі асвятляе планіровачную структуру паселішча.

Згодна з ёю, у мястэчку некалі існаваў замак, пра што сведчыць назва вуліцы Замкавая. Акрамя гэтага старога цэнтра, у мястэчку ў той час ужо сфарміравалася новае ядро – рынкавая плошча, забудаваная з усіх бакоў. Верагодна, ад яе адыходзілі вуліцы, частка якіх, мяркуючы па назве, вяла ў бок розных населеных пунктаў. Крыніца паведамляе наяўнасць вуліц Мсціслаўскай, Смаленскай, Лызковай (вяла ў бок в. Лызкі), Чавускай, Козарэўскай, Падалянскай[192]. Аднак на плане мястэчка 1784 г. гэта карціна не прасочваецца. Згодна з планам, мястэчка фактычна мела адну вуліцу, што вяла ўздоўж р. Сож. Рынкавая плошча не прасочваецца, замак таксама. Уздоўж р. Сож паказана вёска Падольная, верагодна, згаданая ў рэвізскай сказцы вуліца Падалянская. Акрамя таго, на ім паказаны два хрысціянскія храмы, а не адзін, які згадваюць пісьмовыя крыніцы.

У канцы стагоддзя (1783–1785 гг.) гэта было даволі значнае паселішча, у якім налічвалася 143 дамы, дзе пражывалі 770 чалавек, сярод жыхароў былі як шынкары, так і рамеснікі – ганчары, кавалі, слесары, краўцы, шаўцы, кушняры, кухары, сталяры[193].

---

[187] Бантыш-Каменский Н. Н. Исторические известия о возникшей в Польше унии. – С. 435.

[188] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 77. – Арк. 52–52 адв.

[189] Тамсама. – Адз. зах. 91. – Арк. 329–329 адв.

[190] Тамсама. – Ф. 1729. – Воп. 1. – Адз. зах. 21. – Арк. 397.

[191] Бантыш-Каменский Н. Н. Исторические известия о возникшей в Польше унии. – С. 431; VIAL. – F. SA. – Ap. 1. – Bib. 3806. – P. 5–6.

[192] НГАБ. – Ф. 2151. – Воп. 1. – Адз. зах. 177. – Арк. 1–13.

[193] Анішчанка Я. К. Генеральнае межаванне ў Беларусі. Дапаўненне. – С. 105; НГАБ. – Ф. 2151. – Воп. 1. – Адз. зах. 135. – Арк. 1–13.

У 1714 г. мястэчкам, якім валодаў мсціслаўскі чашнічы Ян Якуб Галынскі, была **Манастыршчына** – сучасны аднайменны райцэнтр Смаленскай вобласці[194]. Згодна з падаткам 1719 г. на «чопавае», Манастыршчына разам з воласцю выплачвала 400 злотых[195]. У 1729 г. мястэчкам валодаў мсціслаўскі войскі Казімір Галынскі. У 1783–1785 гг. у мястэчку налічвалася толькі 32 дымы, у якіх пражывалі 182 жыхары, тут згадваецца уніяцкая Петрапаўлаўская царква, сінагога і 3 гандлёвыя лаўкі[196].

У 1716 г. стараста судовы мсціслаўскі Крыштаф Францішак Цеханавецкі заснаваў у Мсціслаўскім ваяводстве мястэчка **Цеханавец**, альбо Гуры. Яно існавала і ў ліпені 1718 г., калі удава Крыштафа Францішка Эльжбета за 23 000 злотых «заставіла» яго разам з Хаславічамі Станіславу Лытукіну[197]. Аднак дзе яно знаходзілася, з крыніц зразумець немагчыма. Зараз тапонім Цеханавец на землях былога Мсціслаўскага ваяводства адсутнічае. Няма такога тапоніма і на картах Мсціслаўскага, Чэрыкаўскага і Клімавіцкага ўездаў канца XVIII ст.

Тапонім Гуры сустракаўся ў спісе землеўладальнікаў Чэрыкаўскага ўезда 1882 г.[198], аднак дзе ён знаходзіўся, таксама не зразумела. Але ў спісе населеных месц Магілёўскай губерні 1910 г. ён ужо адсутнічае. А вось тапонім Горы і паказаны на картах Чэрыкаўскага ўезда канца XVIII ст., і вядомы зараз у Краснапольскім раёне Магілёўскай вобласці. Ён размяшчаецца на левым беразе р. Палуж, па якой ішла мяжа паміж Мсціслаўскім і Менскім ваяводствамі, у той частцы Мсціслаўскага ваяводства, якая пачала актыўна асвойвацца толькі з пачатку XVIII ст.

У сувязі з гэтым нельга выключыць, што мястэчка Цеханавец-Горы было заснавана менавіта тут, але Эльжбета Цеханавецкая і яе нашчадкі па нейкіх прычынах не выкупілі застаўленае мястэчка. Назва Цеханавец свядома не ўжывалася новымі гаспадарамі і, такім чынам, за паселішчам замацавалася толькі назва Горы, альбо па-польску Гуры. Гуры-Горы так і не сталі сапраўдным мястэчкам, пра што сведчыць той факт, што нават у 1783–1784 гг. яны адносіліся да вясковых паселішчаў. У Гарах на гэты час налічвалася 48 дамоў, у якіх пражывалі 438 чалавек[199].

Казіміру Галынскаму належаў і другі сучасны раённы цэнтр Смаленскай вобласці – **Шумячы**, якія названы мястэчкам у падатку на «чопавае» (600 злотых) 1719 г.[200], хаця ўпершыню Шумячы згадваюцца як «земля пустовская во-

---

[194] НГАБ. – Ф. 1729. – Воп. 1. – Адз. зах. 33. – Арк. 308 адв.

[195] Тамсама. – Адз. зах. 21. – Арк. 397.

[196] Анішчанка Я. К. Генеральнае межаванне ў Беларусі. Дапаўненне. – С. 104; РДАСА. – Ф. 1355. – Воп. 1. – Адз. зах. 721. – Арк. 187.

[197] Dumin S., Rachuba A., Sikorska-Kulesza J. Ciechanowieccy herby Dąbrowa. – S. 71, 72.

[198] Дембовецкий А. С. Опыт описания Могилевской губернии в историческом, физико-географическом, этнографическом, промышленном, сельскохозяйственном, лесном, учебном, медицинском и статистическом отношении. – Могилев: Тип. Губернского правления, 1884. – Кн. 3. – С. 242.

[199] Анішчанка Я. К. Генеральнае межаванне ў Беларусі. Дапаўненне. – С. 110.

[200] НГАБ. – Ф. 1729. – Воп. 1. – Адз. зах. 21. – Арк. 397.

лости замку Крычевского» ў 1569 г. Сялом Шумячы заставаліся і ў сярэдзіне XVII ст., калі падчас вайны 1654–1667 гг. згадваецца пушча ў наваколлях сяла Шумячы[201].

У 1757 г. Шумячамі валодаў мсціслаўскі падстараста Ежы Галынскі. З мэтаю паляпшэння ўмоў для развіцця мястэчка ў гэты год каралеўскім прывілеем Шумячам былі дадзены правы на два таргі ў тыдзень – у пятніцу і нядзелю. Адначасова ў Шумячах дазвалялася штогод праводзіць два кірмашы: на свята Св. Юрыя восенню і ўвесну[202].

Мяркуючы па атласе Клімавіцкага ўезда 1783 г., Шумячы мелі квартальную планіроўку, аснову якой складала рынкавая плошча з храмам у цэнтры. Гэта планіроўка ў Шумячах захавалася і да сённяшняга дня, дзе цэнтральная плошча мае памеры 0,5 × 0,5 км. Ад рынку, згодна з планам, у розныя бакі адыходзілі шэсць вуліц[203]. У мястэчку ў 1784 г. згадваецца наяўнасць млына на два колы, віннага завода, праваслаўнай каплічкі, уніяцкага храма Св. Духа і касцёла, у якім на той час не было святара[204].

Пасля ўваходу ў склад Расійскай імперыі Шумячы былі пераведзены ў ранг сельскіх паселішчаў, хаця яны заставаліся адным з буйнейшых паселішчаў Клімавіцкага ўезда. Тут у 1783 г. налічвалася 130 двароў, у якіх пражывалі 736 чалавек[205].

Мястэчкі Манастыршчызна і Шумячы таксама стаялі на мяжы з Расіяй. З першага адкрываўся шлях у Смаленск, а з другога прамая дарога вяла ў Рослаўль. І абодва паселішчы мелі квартальную планіроўку, асабліва развітую ў Шумячах[206].

На мяжы з Расіяй ў 1708 г. на падставе в. Пячэрск мсціслаўскім гродскім суддзёй Міхалам Чудоўскім было заснавана мястэчка **Пячэрск** – сучасная аднайменная вёска Хіславіцкага раёна Смаленскай вобласці. Сама ж вёска Пячэрск існавала як мінімум з сярэдзіны XVII ст., калі ёю валодаў мсціслаўскі стольнік Самуэль Ісідар Сухадольскі[207].

Звесткі аб ім амаль не захаваліся. Згодна з падаткам на «чопавае» 1719 г., гэта было невялікае паселішча, якое выплачвала толькі 30 злотых падатку, якім у 1724 г. працягваў валодаць мсціслаўскі гродскі суддзя Міхал Чудоўскі, які ў гэты год перавёў існуючую тут праваслаўную царкву ў падпарадкаванне ўніяцім епіскапам. Інвентар 1739 г. толькі згадвае пра наяўнасць у Пячэрску

---

[201] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 56. – Арк. 76–77.

[202] Тамсама. – Адз. зах. 179. – Арк. 863.

[203] РДАСА. – Ф. 1356. – Воп. 1, № 2114.

[204] РА БАН Літвы. – Ф. 16. – Адз. зах. 127. – Арк. 215

[205] Анішчанка Я. К. Генеральнае межаванне ў Беларусі. Дапаўненне. – С. 115.

[206] РДАСА. – Ф. 1354. – Воп. 239/1. – Адз. зах. М-11 – галка сіняя; Тамсама. – Воп. 236/1. – Адз. зах. Ш-2 – галка чырвоная.

[207] НГАБ. – Ф. 1729. – Воп. 1. – Адз. зах. 10. – Арк. 21–24; Metryka Litewska. Rejestry podymnego Wielkiego Księstwa Litewskiego. Województwo mścisławskie 1667 r. – Warszawa: Wydawnictwo DiG, 2008. – S. 15; Haratym A. Suchodolski Samuel (Symon) Izydor // Polski Słownik Biograficzny. – T. XLV/2, zeszyt 185. – Warszawa; Kraków, 2008. – S. 298–299.

15 хрысціянскіх, 12 жыдоўскіх, 2 царкоўных і 15 пустых пляцаў. Мястэчка было вельмі малое і нязначнае, таму ў другой крыніцы, што датуецца гэтым жа годам, яно названа «весью Пячерскам пад дваром Хамініцкім»[208].

У 1783–1785 гг. гэта паселішча ўжо фігуруе сярод вёсак. У ім тады налічвалася 67 дамоў, дзе пражывала 434 чалавекі[209]. Яно мела лінейную забудову, і ў ім існавала царква Раства Прасвятой Багародзіцы[210].

Працягвала сваё далейшае развіццё мястэчка **Татарск**. У 1719 г. яно ўваходзіла ў лік паселішчаў, што выплачвалі найбольшае «чопавае» у ваяводстве – 400 злотых[211]. І гэта не дзіўна. Бо насупраць яго на расійскім баку знаходзіліся Мігнавічы, якія таксама названы мястэчкам яшчэ ў сярэдзіне XVII ст. Такім чынам, тут быў пэўны цэнтр рэгіёна як з рускага боку, так і з боку Рэчы Паспалітай.

Аднак на працягу XVIII ст. Татарск паступова прыходзіць у заняпад, і ў канцы стагоддзя ён ужо быў невялікім паселішчам, бо ў 1783–1785 гг. тут налічваўся толькі 21 дым, дзе пражывалі 110 жыхароў[212]. Акрамя таго, у мястэчку згадваюцца драўляная жыдоўская школа і 3 гандлёвыя лаўкі[213]. А ролю цэнтра рэгіёна на сябе ўзялі Мігнавічы.

Побач з Татарскам знаходзілася і мястэчка **Бахота**, сучасная вёска Бохаць Манастыршчынскага раёна Смаленскай вобласці. Яно было ў пацэсіі ў падчашага ВКЛ Аляксандра Пацея, і 17 кастрычніка 1732 г. для больш паспяховага развіцця мястэчка атрымала прывілей на штотыднёвы торг па нядзелях і на 4 кірмашы ў год. Аднак і далей яно заставалася невялікім паселішчам, дзе ў канцы XVIII ст. налічваўся 31 дым, у якіх пражывалі 256 чалавек[214]. Усе тры вышэйпералічаныя мястэчкі мелі па адной вуліцы і былі выцягнуты ўздоўж шляхоў, на якіх узнікалі.

На шляху з Мсціслава ў Оршу ў 1709 г. знаходзілася мястэчка **Шамава**, дзе ўжо ў гэты час праводзіліся кірмашы, ім валодаў мсціслаўскі земскі суддзя Антоній Шпілеўскі[215]. У 1719 г. яно выплачвала «чопавае» ў памеры 100 злотых і, мяркуючы па яго памерах, было невялікім паселішчам. У 1736 г. Шамава атрымала прывілей на тыднёвы кірмаш у дні свята Трох рускіх каралёў[216] (Хрышчэнне).

---

[208] НГАБ. – Ф. 1729. – Воп. 1. – Адз. зах. 21. – Арк. 397; Тамсама. – Адз. зах. 44. – Арк. 756–757, 1150–1151; Mironowicz A. Rejestr monasterów i cerkwi grecko-ruskich różnemi czasy na unię gwałtownie odjętych // Białoruskii Zeszyty Historyczne. – 2008. – № 30. – S. 205.

[209] Анішчанка Я. К. Генеральнае межаванне ў Беларусі. Дапаўненне. – С. 104.

[210] РДАСА. – Ф. 1355. – Воп. 1. – Адз. зах. 721. – Арк. 176.

[211] НГАБ. – Ф. 1729. – Воп. 1. – Адз. зах. 21. – Арк. 397.

[212] Анішчанка Я. К. Генеральнае межаванне ў Беларусі. Дапаўненне. – С. 105.

[213] РДАСА. – Ф. 1355. – Воп. 1. – Адз. зах. 721. – Арк. 217 адв.–218.

[214] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 162. – Арк. 578; РДАСА. – Ф. 1355. – Воп. 1. – Адз. зах. 721. – Арк. 220.

[215] НГАБ. – Ф. 1729. – Воп. 1. – Адз. зах. 11. – Арк. 652–655 адв.

[216] Тамсама. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. адз. зах. 168. – Арк. 359–361.

Невялікім паселішчам Шамава заставалася і напрыканцы XVIII ст., калі тут налічвалася толькі 42 дамы, у якіх пражывалі 226 чалавек[217]. Акрамя таго, тут былі ўніяцкая царква Св. Міхаіла і 16 гандлёвых лавак[218]. Тым не менш яно мела квартальную забудову, арганізуючым цэнтрам якой была рынкавая плошча.

У 1719 г. як мястэчка упершыню згадваюцца **Маляцічы**. Мяркуючы па памерах падатку – 30 злотых[219], гэта было невялікае паселішча, якім у 1733 г. валодаў Валерыян Макавецкі. Гаспадары спрабавалі ўвесь час узмацніць яго ролю, і ў 1766 г. Маляцічы атрымалі прывілей на 2 ярмаркі ў год – на праваслаўнае Раство Хрыстова і на 12-ю пятніцу пасля праваслаўнага Вялікадня. Гэтым жа прывілеем былі вызначаны і штотыднёвыя гандлёвыя дні для мястэчка – чацвер і нядзеля. Мяляцічамі ў той час валодаў Мікалай Тадэвуш Лапацінскі[220].

Маляцічы засталіся мястэчкам і пасля ўваходу гэтых зямель у склад Расійскай імперыі і выконвалі ролю невялікага адміністрацыйнага цэнтра акругі да пачатку XX ст. Мяркуючы па плане, складзеным у 1783–1784 гг., мястэчка размяшчалася па абодвух берагах рэчкі Чорная Натапа, аднак яго большая частка знаходзілася на правым беразе. Аснову планіроўкі Маляцічаў складала цэнтральная плошча, ад якой адыходзілі тры вуліцы. Адна вяла ў бок в. Антонаўка, на якой стаяла уніяцкая царква Пакрава Багародзіцы. Другая вуліца вяла за рэчку Чорная Натапа і далей ў в. Валоўнікі. Трэцяя вуліца выводзіла ў бок Крычава. На ўсход ад цэнтральнай плошчы знаходзіўся пляц новапабудаванага каталіцкага касцёла[221].

У 1785 г. тут налічвалася ўсяго 47 дамоў, у якіх пражывалі 285 чалавек[222], існаваў касцёл, уніяцкая царква Успення Прасвятой Багародзіцы, якая ў 1795 г. была выведзена з уніі, і жыдоўская школа[223] (мал. 67).

Значная колькасць мястэчак у гэты час узнікла ў паўднёвых раёнах ваяводства, і ўсе яны былі прывязаны да шляхоў, якія вялі альбо з Мсціслава, альбо з Крычава ў Расію.

Так, на гэтым шляху ў 1730 г. стаяла мястэчка **Царковішча** (суч. в. Пралятарскае Касцюковіцкага раёна), якім валодаў стараста менскі Георгі Іваноўскі[224]. Яно размяшчалася на дарозе, што вяла з поўдня краіны ў бок Крычава і Мсціслава. Аднак пасля інкарпарацыі гэтых зямель у склад Расійскай імперыі

---

[217] Анішчанка Я. К. Генеральнае межаванне ў Беларусі. Дапаўненне. – С. 105.

[218] РДАСА. – Ф. 1355. – Воп. 1. – Адз. зах. 721. – Арк. 225 адв.

[219] НГАБ. – Ф. 1729. – Воп. 1. – Адз. зах. 21. – Арк. 397 адв.

[220] Тамсама. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 185. – Арк. 130–131;

[221] РДАСА. – Ф. 1354. – Воп. 245/1. – Адз. зах. М-4 – галка чырвоная.

[222] Анішчанка Я. К. Генеральнае межаванне ў Беларусі. Дапаўненне. – С. 111.

[223] РДАСА. – Ф. 1355. – Воп. 1. – Адз. зах. 735. – Арк. 179.

[224] Бантыш-Каменский Н. Н. Исторические известия о возникшей в Польше унии с показанием начала и важнейших, в продолжении оной через два века приключений, паче же о бывшем от Римлян и Униатов на благочестивых тамошних жителей гонений. – М.: Синодальная типография, 1805. – С. 439.



Мал. 67. План мястэчка Маляцічы згодна з планам Генеральнага межавання 1783–1784 гг.

мястэчка было пераведзена ў ранг вёсак, хаця ў Царковішчах на той час налічвалася 70 двароў, у якіх пражывалі 413 чалавек[225].

На шляху з Мсціслава на поўдзень ваяводства ў 1724 г. стаяла мястэчка **Лазовіца** – уладанне палкоўніка Мсціслаўскага ваяводства Івана Кіркора[226]. Гэта было невялікае паселішча, якое пасля ўваходу ў склад Расіі было пераведзена ў ранг сельскіх. У ім было толькі 33 двары, у якіх пражывалі 176 чалавек[227]. Планіровачную аснову Лазовіцы складала вуліца над берагам р. Рэкта, якая была забудавана жылымі дамамі толькі з аднаго боку, а агароды яе сядзіб спускаліся да рэчкі.

Нягледзячы на дэмаграфічную нязначнасць Лазовіцы, тут дзейнічаў езуіцкі місіянерскі дом і драўляны касцёл Св. Тройцы, які стаяў на другім баку вуліцы. Акрамя таго, тут была ўніяцкая царква Пакрова Святой Багародзіцы[228].

На развілцы шляхоў з Касцюковічаў на Мсціслаў і з Касцюковічаў на Шумячы размяшчалася **в. Родня**, што ў пачатку XVIII ст. (1709 г.) была толькі

[225] РДАСА. – Ф. 1355. – Воп. 1. – Адз. зах. 714. – Арк. 75.

[226] Бантыш-Каменский Н. Н. Исторические известия о возникшей в Польше унии... – С. 437–438; РДАСА. – Ф. 1354. – Воп. 236/1. – Адз. зах. Л-2.

[227] Анішчанка Я. К. Генеральнае межаванне ў Беларусі. Дапаўненне. – С. 114.

[228] Encyklopedie. – S. 391; РДАСА. – Ф. 1355. – Воп. 1. – Адз. зах. 714. – Арк. 11 адв.–12 адв.

«маетнасцю» сяла Судзівалічы, а ў 1747 г. названа мястэчкам, якім валодаў мсціслаўскі канюшы Казімір Свадкоўскі[229]. Гэта было даволі буйное паселішча, у якім у 1783–1785 гг. налічвалася 76 двароў і пражывалі 322 жыхары, была ўніяцкая царква, аднак пасля ўваходу ў склад Расіі мястэчка было пераведзена ў ранг вёскі[230]. Мяркуючы па плане Генеральнага межавання 1783–1784 гг., мястэчка мела квартальную забудову, цэнтрам якой з'яўлялася рынкавая плошча, на якой стаяла царква[231].

Размешчаная на поўдзень ад в. Родня **в. Касцюковічы** бліжэй да сярэдзіны XVIII ст. таксама пачала згадвацца як мястэчка, хаця яшчэ у 1708 г. гэта была звычайная невялікая вёска[232]. Аднак ужо ў 1721 г. яна значыцца як мястэчка, з якога бралася «чопавае». У пачатку 30-х гадоў XVIII ст. тут было толькі 35 дымоў, і яшчэ крыніца адзначае, што ў вёсцы пражывалі 7 бабылёў[233].

Аднак потым мястэчка пачало даволі хутка развівацца, бо ўжо ў 1739 г. у Касцюковічах быў торг[234], і ў ім адзначаецца наяўнасць вулічнай планіроўкі і некалькіх храмаў. Ва ўсякім выпадку, у 1743 г. менскі гараднічы Ю. Іваноўскі даў фундуш на пляц, размешчаны на вуліцы Шумяцкай, для будаўніцтва на ім царквы Св. Крыжа[235]. Акрамя таго, у гэты год у Касцюковічах згадваецца і другі храм – у гонар Св. Міколы, якому Ю. Іваноўскі таксама ахвяраваў пэўныя грунты[236]. Касцюковічы даволі хутка раслі, і ў 1783–1785 гг. тут налічвалася 89 дымоў, у якіх пражывалі 413 чалавек[237].

Мяркуючы па плане мястэчка 1782–1783 гг., Касцюковічы, якімі на гэты час валодаў І. Ф. Іваноўскі, размяшчаліся на абодвух берагах р. Жадунька, аднак яго галоўная частка – на правым беразе. Менавіта тут прасочваецца гандлёвая плошча, на якой знаходзіцца храм. Ад плошчы адыходзілі ў розныя бакі 7 вуліц, у тым ліку дзве ў бок става на р. Жадунька. Другі местачковы храм размяшчаўся на яго галоўнай вуліцы, якая над р. Жадунька вяла ў бок в. Васілеўка, па трасе сучаснай вуліцы Камунарскай. У цэлым забудова гэтай часткі мястэчка мела даволі рэгулярны квартальны характар[238] і абмяжоўвалася раёнам сучасных вуліц Камунарскай, ім. Мічурына, Студзянецкай.

Другая частка мястэчка, што размяшчалася на левым беразе р. Жадунька, была меншай па плошчы, і яе забудова не была так абумоўлена плынню ракі,

---

[229] НГАБ. – Ф. 1729. – Воп. 1. – Адз. зах. 11. – Арк. 64–65; Бантыш-Каменский Н. Н. Исторические известия о возникшей в Польше унии... – С. 442.

[230] Анішчанка Я. К. Генеральнае межаванне ў Беларусі. Дапаўненне. – С. 114; РДАСА. – Ф. 1355. – Воп. 1. – Адз. зах. 714. – Арк. 69 адв.

[231] РДАСА. – Ф. 1354. – Воп. 236/1. – Адз. зах. Р-1 – галка чырвоная.

[232] Шутой В. Е. Малоизвестный источник по истории Северной войны. – С. 97.

[233] НГАБ. – Ф. 1729. – Воп. 1. – Адз. зах. 23. – Арк. 324–325 адв.; НГАБ у Гародні. – Ф. 525. – Воп. 1. – Адз. зах. 3. – Арк. 39.

[234] НГАБ. – Ф. 694. – Воп. 2. – Адз. зах. 3982. – Арк. 6, 8, 12.

[235] Тамсама. – Ф. 1729. – Воп. 1. – Адз. зах. 72. – Арк. 388–389.

[236] НГАБ у Гародне. – Ф. 525. – Воп. 1. – Адз. зах. 3. – Арк. 9 адв.

[237] Анішчанка Я. К. Генеральнае межаванне ў Беларусі. Дапаўненне. – С. 113.

[238] РДАСА. – Ф. 1354. – Воп. 245/1. – Адз. зах. К-17 – галка чырвоная.

як правабярэжная частка. Яе забудова больш ішла ў бок поля і мела хутчэй радыяльны характар, яе цэнтрам была дамба на р. Жадунька[239], і абапіралася на трохкутнік, абмежаваны пачаткам сучасных вуліц Ленінскай, Юнацкай і ім. Зіньковіча, прычым іх планіровачная аснова захавалася да сённяшняга дня (мал. 68, 69).

Далей на шляху на поўдзень дзяржавы згадваецца (1765 г.) мястэчка **Канічы**, якое ўпершыню згадваецца як Конічы ў 1511 г.[240] і яшчэ ў пачатку XVIII ст.

Мал. 68. План мястэчка Касцюковічы (правабярэжная частка) згодна з Генеральным межаваннем 1783–1784 гг.

[239] РДАСА. – Ф. 1354. – Воп. 236/1. – Адз. зах. К-7 – галка чырвоная.

[240] Описание бумаг и документов хранящихся в Московском архиве министерства юстиции. – Кн. 21. – 1915. – С. 199.



Мал. 69. План мястэчка Касцюковічы (левабярэжная частка) згодна з Генеральным межаваннем 1783–1784 гг.

(1708 г.), паводле звестак Д. Крмана, было звычайнай невялікай вёскай[241]. На карце Клімавіцкага ўезда 1783 г. яно паказана ў паўднёвай частцы сучаснай аднайменнай вёскі і мела вулічную забудову, у якой дамы стаялі па абодвух баках вуліцы. А вёска Канічы канца XVIII ст. знаходзілася ў паўночнай частцы сучаснага аднайменнага населенага пункта[242]. Мястэчка было амаль у два разы меншае за сяло. У першым у 1783–1785 гг. налічвалася 16 дамоў і пражывалі 86 чалавек, а ў вёсцы налічвалася 37 дамоў і 266 жыхароў[243]. У мястэчку была драўляная ўніяцкая царква, аднак з-за яе старасці службы ў ёй не вяліся, і таму жыхары мястэчка вымушаны былі хадзіць у суседнюю аднайменную вёску, дзе існаваў уніяцкі храм у гонар Раства Багародзіцы[244].

Ва ўладаннях Свадкоўскіх знаходзілася і яшчэ адно мястэчка – **Негін**, сучасная аднайменная вёска Касцюковіцкага раёна, якое ўпершыню згадваец-

[241] Шутой В. Е. Малоизвестный источник по истории Северной войны. – С. 97.

[242] РДАСА. – Ф. 1356. – Воп. 1. – Адз. зах. 2114; Тамсама. – Ф. 1354. – Воп. 236/1. – Адз. зах. К-11 – галка чырвоная.

[243] Анішчанка Я. К. Генеральнае межаванне ў Беларусі. Дапаўненне. – С. 113.

[244] РДАСА. – Ф. 1355. – Воп. 1. – Адз. зах. 714. – Арк. 103 адв.

ца ў 1765 г.[245] Яно ўзнікла на падставе аднайменнай вёсцы на разгалінаванні дарог з Касцюковічаў на Крычаў і Чэрыкаў. Гэта было невялікае паселішча: у 1785 г. у ім было 11 двароў і 49 жыхароў[246], фактычна была адна вуліца над р. Жадунька, без якой-небудзь цэнтральнай плошчы. Толькі на поўдні вёскі, каля развілкі дарог на вёскі Гібалы і Дубейцы ў той час пачалося фарміраванне невялікай квартальнай забудовы[247]. Пасля ўваходу гэтых зямель у склад Расійскай імперыі мястэчка Негін было пераведзена ў разрад звычайных паселішчаў, якім і застаецца і цяпер.

У адной з крыніц 1735 г. ва ўладаннях мсціслаўскага канюшага Уладзіслава Свадкоўскага згадваецца мястэчка **Уладзіславава**. Мяркуючы па кантэксце крыніцы, яно размяшчалася на «Крычаўскім тракце» – землях былой Крычаўскай воласці. Ды і ўсе астатнія пералічаныя ў крыніцы «маетнасці» Свадкоўскіх таксама размяшчаліся каля Крычава[248]. Аднак пазней гэтае мястэчка нідзе і ніколі болей не згадваецца. Няма пра яго звестак і ў крыніцах, якія тычацца Генеральнага межавання 1784–1785 гг.

Толькі ў Спісе населеных пунктаў Магілёўскай губерніі за 1910 г. у Бохацкай воласці Мсціслаўскага ўезда згадваецца аднайменны фальварак[249]. Аднак яно яшчэ адсутнічае ў спісе землеўладальнікаў Мсціслаўскага ўезда 1882 г., таму можна сцвярджаць, што ён узнік у канцы XIX ст. Ды і ўладанні Свадкоўскіх на той час таксама былі толькі ў Чэрыкаўскім уездзе Магілёўскай воласці[250]. Такім чынам, гэты фальварак не мае ніякіх адносін да былога мястэчка.

Само ж мястэчка, заснаванае, верагодна, у першай палове XVIII ст. і названае гаспадаром сваім імем, у гэты час толькі пачынала зараджацца, аднак працэс яго развіцця па невядомых прычынах спыніўся. Магчыма, што яно існуе і зараз пад другой назвай, але памяць пра першапачатковую назву мястэчка паступова знікла са старонак пісьмовых крыніц, і дзе яно размяшчалася, зараз невядома.

У размяшчэнні прыватнаўласніцкага мястэчка **Пятровічы** (1710 г.), якое ўпершыню згадваецца яшчэ ў спісе зямельных раздач караля Казіміра сярэдзіны XV ст., калі яно было пажалавана Расцішку Пракудзіну[251], прасочваецца некалькі іншая заканамернасць. Яно хоць і стаяла ў баку ад буйных гандлёвых шляхоў, але ў той жа час было ў аддаленасці ад іншых, як дзяржаўных, так і прыватнаўласніцкіх мястэчак. І ў пэўнай ступені трансфармацыя паселішча ў мястэчка, верагодна, была выклікана неабходнасцю мець у міжрэччы Астра і Сожа пэўны гандлёва-рамесны цэнтр. Тым болей, што раней такі цэнтр тут існаваў. Зыходзячы з археалагічных і пісьмовых крыніц, у XVI ст. цэнтр во-

[245] VIAL. – F. SA. – Ap. 1. – Bib. 3810. – P. 75.
[246] Анішчанка Я. К. Генеральнае межаванне ў Беларусі. Дапаўненне. – С. 114.
[247] РДАСА. – Ф. 1354. – Воп. 245/2. – Адз. зах. Н-3 – галка сіняя.
[248] ИЮМ. – Вып. 17. – С. 242–244.
[249] Список населенных мест Могилевской губернии. – С. 87–62.
[250] Дембовецкий А. С. Опыт описания Могилевской губернии... – Кн. 3. – 329 с.
[251] ДМАМЮ. – Т. 1. – С. 23.

ласці, якая размяшчалася ў міжрэччы гэтых рэк, існаваў на паселішчы каля в. Новае Заселле, пра што гаворка ішла вышэй.

Мястэчка Пятровічы, якім на пачатку XVIII ст. валодалі Валовічы, было невялікім. Ва ўсякім выпадку, у 1719 г. яно выплочвала «чопавае» ў памеры 190 злотых[252]. Жадаючы падняць ролю свайго дзедзічнага мястэчка, у 1767 г. Ігнацій Валовіч атрымаў ад караля прывілей на арганізацыю ў Пятровічах двух чатырохтыднёвых кірмашоў штогод. Першы кірмаш дазволена было праводзіць на свята «Трох рускіх каралёў» (Багаяўленне–Вадохрышча, з 18–19 студзеня), а другі – на «Запусты» рускія (Піліпаўскі пост, з 27 лістапада)[253].

Пасля ўваходу гэтых зямель у склад Расійскай імперыі яно было пераведзена ў ранг звычайных вёсак, але ў XIX ст. зноў стала мястэчкам і працягвала выконваць ролю гандлёва-рамеснага цэнтра рэгіёна. У 1783–1785 гг. тут налічвалася 60 двароў, у якіх пражывалі 288 жыхароў[254]. Яно мела квартальную забудову, аснову якой складала рынкавая плошча з храмам Першаапосталаў



Мал. 70. План мястэчка Пятровічы згодна з Генеральным межаваннем 1783–1784 гг.

[252] НГАБ. – Ф. 1729. – Воп. 1. – Адз. зах. 21. – Арк. 397 адв.
[253] Тамсама. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 189. – Арк. 137–138
[254] Анішчанка Я. К. Генеральнае межаванне ў Беларусі. Дапаўненне. – С. 114.

Пятра і Паўла[255] (мал. 70). Гэта планіровачная аснова захавалася ў Пятровічах і да сённяшняга дня.

У 1719 г. мястэчкам лічылася **Казімірава** – уладанне мсціслаўскага падкаморага Крыштафа Валовіча. Яно мела і другую назву – Казімірава Слабада. Мястэчка знаходзилася побач з Мсціславам, і ўжо ў сярэдзіне XIX ст. яго тэрыторыя ўвайшла ў склад сучаснага горада. Сярод жыхароў Мсціслава гэты раён і зараз вядомы пад назвай Слабада.

Дакладная дата ўзнікнення гэтага паселішча невядома. Аднак ужо ў 1705 г. падчас разборкі спрэчкі паміж мсціслаўскімі мяшчанамі і обальскім старастам Валовічам, згадваюцца «грунты Казіміраўскія», якія ляжалі каля дарогі на Крычаў[256], што ўскосна сведчыць пра існаванне гэтага паселішча ў пачатку XVIII ст. Згодна з падаткам на «чопавае» 1719 г. – 150 злотых[257], паселішча было невялікім.

Размяшчэнне мястэчка побач з цэнтрам ваяводства стварала пэўныя цяжкасці для яго развіцця, і таму ў 1757 г. яго ўладальнік Ежы Галынскі атрымаў каралеўскі прывілей на дазваленне арганізацыі тут штотыднёвых таргоў – у пятніцу і нядзелю. Акрамя таго, уладальнік мястэчка дабіўся дазволу на правядзенне ў ім чатырох кірмашоў у год: трохдзённыя кірмашы на «святы рускія» – Хрышчэнне, на Св. Іллю, у 12-ю пятніцу пасля Вялікадня і, акрамя таго, яшчэ адну ярмарку дазвалялася праводзіць на свята Узвіжання Св. Крыжа[258].

Мяркуючы па плане Мсціслава 1778 г., на якім мястэчка Казімірава добра прасочваецца, яно мела лінейную забудову. Яго дамы размяшчаліся ўздоўж дарогі з Мсціслава ў Крычаў, а на паўночным краі мястэчка, бліжэй да горада, стаяў уніяцкі храм, які згадваўся яшчэ ў сярэдзіне XVIII ст.[259] Мястэчка было невялікім. Тут у канцы XVIII ст. (1783–1785 гг.) налічвалася ўсяго 29 дамоў, у якіх пражывалі 125 чалавек, а ў першай трэці XIX ст. у ім налічвалася 15 будынкаў хрысціянскіх і 36 жыдоўскіх[260].

Прыкладна ў 1737–1738 гг. крайчы і ротмістр Мсціслаўскага ваяводства Фларыян Маркоўскі-Францковіч заснаваў «у тракце Крычаўскім, за ракой Сожам, над Ракой Бесяццю на новым месцы мястэчка», якому даў назву ў гонар свайго другога імені – **Маркава**. Гэта сучасная вёска Маркаўка Хоцімскага раёна.

Для лепшага развіцця мястэчка і прываблівання сюды насельніцтва 30 студзеня 1738 г. кароль Аўгуст II Моцны даў мястэчку прывілей на два таргі ў тыдзень – у пятніцу і нядзелю. Акрамя таго, гэтым жа прывілеем кароль

---

[255] РДАСА. – Ф. 1354. – Воп. 236/1. – Адз. зах. П-1 – галка сіняя.

[256] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 153. – Арк. 393–394.

[257] Тамсама. – Ф. 1729. – Воп. 1. адз. зах. 21. – Арк. 397 адв.

[258] Тамсама. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 179. – Арк. 863.

[259] Тамсама. – Ф. 1729. – Воп. 1. – Адз. зах. 66. – Арк. 530 адв.

[260] Анішчанка Я. К. Генеральнае межаванне ў Беларусі. Дапаўненне. – С. 103; Ткачоў М. А., Трусаў А. А. Старажытны Мсціслаў. – Мінск: Полымя, 1992. – С. 55–56.

надаў мястэчку правы на чатыры кірмашы ў год – на Св. Іллю, Св. Яна, на свята Узвіжання Крыжа і на Новы год «свята рускага»[261].

Аднак наяўнасць побач дзяржаўнага мястэчка Радзівілаў, верагодна, не давала магчымасці развівацца гэтаму прыватнаўласніцкаму мястэчку, і яно не змагло стаць рамесна-гандлёвым цэнтрам акругі. Ва ўсякім выпадку, калі гэтыя землі ўвайшлі ў склад Расійскай імперыі, згодна з Генеральным межаваннем 1784 г., у в. Маркава налічвалася толькі 3 дымы, у якіх пражывалі 17 мужчын і 15 жанчын[262].

У раскладзе чопавага 1721 г. сярод гарадоў і мястэчак Мсціслаўскага ваяводства, на шляху з Мсціслава на Манастыршчыну згадваюцца **Любавічы.** Згодна з памерамі падаткаў – 8 злотых[263], якія яны выплачвалі, гэта было, разам з Маляцічамі, самае малое паселішча такога тыпу ў ваяводстве. Сапраўдным мястэчкам, нягледзячы на размяшчэнне на развілцы дарог, Любавічы так і не сталі. Бо нават у канцы XVIII ст. тут было ўсяго 9 дымоў, у якіх пражываў 101 жыхар[264].

6.2.2. Мястэчкі Крычаўскага староства

У пачатку XVIII ст. актывізаваўся працэс фарміравання мястэчак і ў дзяржаўных уладаннях на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства. Як вядома, самым буйным дзяржаўным уладаннем на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства было Крычаўскае староства, якое з 1670 г. і да 1760 г. знаходзілася ў дзяржанні ў Радзівілаў. З дзейнасцю гэтага славутага княжацкага роду звязаны працэс заснавання мястэчак на тэрыторыі Крычаўскага староста, ініцыятарам якога быў канцлер Вялікага Княства Літоўскага і крычаўскі дзяржаўца Караль Станіслаў Радзівіл (мал. 71). Менавіта ён ў пачатку другога дзесяцігоддзя XVIII ст. заснаваў першыя мястэчкі на тэрыторыі староства, а пасля яго смерці з 1719 і да 1746 г. гэтую справу яшчэ больш рашуча праводзіла яго ўдава Ганна Катажына Сангушкава Радзівіл (мал. 72).

Дзейнасць Радзівілаў па заснаванні мястэчак на тэрыторыі староства была падпарадкавана адзінаму плану, згодна з якім кожная адміністрацыйна-гаспадарчая адзінка староства – войтаўства – павінна была мець свой невялікі адміністрацыйны і гандлёва-рамесны цэнтр.

Самым першым на тэрыторыі Крычаўскага староства было заснавана мястэчка **Міхалаў**. Яно было заснавана згодна з універсалам канцлера ВКЛ Караля Станіслава Радзівіла ад 14 сакавіка 1714 г. на землях в. Забычанне ў Лучыцкім войтаўстве. У гэтай сувязі трэба адзначыць, што звычайна апісанні Лучыцкага войтаўства другой паловы XVII – пачатку XVIII ст. пачыналіся з в. Забычанне. Гэта дазваляе выказаць меркаванне, што в. Забычанне раней

[261] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 171. – Арк. 775–778.
[262] Анішчанка Я. К. Генеральнае межаванне ў Беларусі. Дапаўненне. – С. 114.
[263] НГАБ. – Ф. 1729. – Воп. 1. – Адз. зах. 23. – Арк. 324–325 адв.
[264] Анішчанка Я. К. Генеральнае межаванне ў Беларусі. Дапаўненне. – С. 104.

Мал. 71. Кароль Станіслаў Радзівіл

была цэнтрам гэтага войтаўства, і новаўтворанае мястэчка засноўвалася на ўжо падрыхтаванай глебе.

Новаўтворанае мястэчка размяшчалася на левым беразе р. Жадунька, а старая вёска, вядомая з другой паловы XVI ст., – на правым, фактычна яны размяшчаліся насупраць адзін аднаго, па розных баках Жадунькі[265], і такім чынам цэнтр войтаўства застаўся на старым месцы. Сваю назву мястэчка атрымала, верагодна, у гонар бацькі Караля Станіслава Радзівіла – Міхала Казіміра, першага дзяржаўцы Крычаўскага староства з роду Радзівілаў.

Тэрмін слабады новаўтворанаму мястэчку быў вызначаны на 15 гадоў[266]. У 1727 г. Міхалаў быў яшчэ невялікім паселішчам, у якім, акрамя рынку, было толькі дзве вуліцы – Крычаўская і Касцюкоўская, на якіх разам было 37 дымоў. Станаўленне мястэчка ішло вельмі марудна, і таму ў інвентары староства 1727 г. прапаноўвалася падоўжыць тэрмін слабады яшчэ на тры гады і даць магчымасць людзям самім выбіраць бурмістраў і радцаў.

З гаспадарчых пабудоў у інвентары адзначалася наяўнасць агульнага з вёскай Забычанне млына і гараджанам прапаноўвалася пабудаваць свой млын альбо паставіць на старым млыне яшчэ адно кола[267].

Нязначна змянілася мястэчка і праз 20 гадоў. Інвентар 1747 г. паказвае, што ядром мястэчка быў невялікі рынак памерам каля 315 кв. м, ад якога ў розныя бакі адыходзілі вуліцы Забычанская, Крычаўская, Касцюковіцкая. Улічваючы, што вуліцы Крычаўская і Касцюковіцкая фактычна знаходзіліся на адной восі, яны, па сутнасці, уяўлялі адну вуліцу, якая выходзіла ў розныя бакі з рынку. Такім выглядае мястэчка Забычанне і на плане, складзеным у 1784 г. падчас Генеральнага межавання[268]. Гэты так званы рынак, які на плане амаль не прасочваецца, верагодна, быў у паўднёвай частцы мястэчка, дзе прасочваецца нейкае перакрыжаванне.

---

[265] РДАСА. – Ф. 1356. – Воп. 1. – Адз. зах. 2160.

[266] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1931/2. – Арк. 33; Тамсама. – Адз. зах. 1933/2. – Арк. 28; Тамсама. – Адз. зах. 1932. – Арк. 149; Тамсама. – Адз. зах. 1936. – Арк. 98, 101.

[267] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1932. – Арк. 149–151.

[268] РДАСА. – Ф. 1354. – Воп. 236/2. – Адз. зах. 3-26 – галка чырвоная.

Самай кароткай была Забычанская вуліца. Яна адным бокам прымыкала да рынку, а на другім баку, які вёў у бок става, стаялі тры дамы, свіран і «школа жыдоўская». На Крычаўскай вуліцы стаялі царква, 21 жылы дом, пляц з гумном і адзін незабудаваны пляц. На Касцюковіцкай вуліцы было 13 жылых дамоў.

З гаспадарчых пабудоў інвентар, як і раней, адзначае наяўнасць агульнага з вёскай Забычанне млына, на якім было адно кола. Адзінае новае, што з'явілася ў мястэчку за апошні час, – гэта два бровары. Адзін з іх быў скарбовы – дзяржаўны, а другі пабудаваў сабе арандатар мястэчка Гірш Фамішовіч[269].

Інвентар Крычаўскага староства 1747 г. дае некаторае ўяўленне аб занятках жыхароў гэтага мястэчка. У Міхалаве жылі адзін шынкар, 3 купцы, каваль, шавец, 3 краўцы, пекар, 2 бондары, вінік, 2 пастухі і нават 2 пушкары.

Мал. 72. Партрэт Ганны Катажыны Сангушкавай Радзівіл

Далейшы лёс мястэчка да пачатку 80-х гадоў XVIII ст. не прасочваецца, і пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай у складзе Расійскай імперыі яно не згадваецца. Верагодна, пасля далучэння Крычаўскага староства да Расійскай імперыі новаму ўраду было непрыемна бачыць тапонімы, якія б нагадвалі пра былую гісторыю краю. Тым болей, што мястэчка насіла прозвішча аднаго з магнацкіх родаў Рэчы Паспалітай. Мабыць, менавіта тады мястэчка было перайменавана ў Забычанне – па назве размешчанай побач вёскі. Ва ўсякім выпадку, у статыстычным апісанні Магілёўскай губерні 1784 г. мястэчкам названа Забычанне, а аб Міхалаве няма ніякіх звестак. І на генеральным плане Чэрыкаўскага ўезда, складзеным у 80-я гады XVIII ст. паказаны як вёска, так і мястэчка Забычанне, а Міхалаў адсутнічае[270]. У 1786 г. А. Меер у сваім апісанні Крычаўскага староства таксама згадваў мястэчка Забычанне, а пра Міхалаў у яго няма ніякіх звестак[271]. Такім чынам, першапачатковая назва мястэчка была выкінута з яго гісторыі.

---

[269] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1936. – Арк. 98–99.

[270] Дембовецкий А. С. Опыт описания Могилевской губернии... – Кн. 2. – С. 78; РДАСА. – Ф. 1356. – Воп. 1. – Адз. зах. 2160.

[271] Мейер А. Описание Кричевского графства. – С. 109.

У 1779 г. ў мястэчку налічвалася 55 дымоў, у якіх пражывалі 111 хрысціян і 97 жыдоў, была праваслаўная царква і сінагога[272]. У 1783–1785 гг. у абодвух населеных пунктах – мястэчку і вёсцы Забычанне было адпаведна 45 і 40 дамоў і пражывалі 256 і 202 жыхары[273].

Другім мястэчкам, якое заснавалі ў Крычаўскім старостве Радзівілы, было **Радзівілаў** – сучасны гарадскі пасёлак Хоцімск, цэнтр раёна Магілёўскай вобласці. Мястэчка Радзівілаў было заснавана згодна з прывілеем канцлера ВКЛ і дзяржаўцы Крычаўскага старостваКараля Станіслава Радзівіла ад 18 кастрычніка 1714 г. на тэрыторыі Бярозкаўскага войтаўства. Згодна з прывілеем, для заснавання новага мястэчка на беразе Беседзі на «сырым корані» і яго паспяховага развіцця Радзівілы давалі мястэчку «слабаду» на 15 гадоў ад усялякіх падаткаў, пастояў войскаў, выплаты гіберны. Жыхарам новаўтворанага горада дазвалялася на працягу гэтага часу без выплаты падаткаў займацца рамяством, гандлем, шынкарствам, распрацоўваць зямлю. Акрамя таго, у прывілеі адзначалася, што для арганізацыі жыцця горада месцічам Радзівілава дазвалялася абраць самім сабе бурмістра і «мейскага» пісара. Гэтым жа прывілеем жыхарам мястэчка дазвалялася будаваць царкву, побач з якой павінны былі быць могілкі[274].

На старонкі інвентароў Крычаўскага староства Радзівілаў трапляе толькі ў 1720 г. У крыніцы адзначаецца, што мястэчка з такой назвай было заснавана «на грунтах Бохонскіх» – размешчанай недалёка адсюль в. Баханы, якая вядома з сярэдзіны XVI ст.

У мястэчку на час складання інвентара налічвалася 60 дымоў, у 1723 г. іх ужо было 70 і зноў адзначалася, што яно заснавана на грунтах «Бохонскіх»[275]. У 1727 г. у мястэчку было ўжо 3 вуліцы: «прабойная Крычаўская», на якой было 43 дымы і жыў гарадскі бурмістр Андрэй Смарчок. Альшоўская вуліца налічвала 86 дымоў, а Глухая – 19 дымоў. Усяго ў горадзе ў 1727 г. было 148 дымоў. Дадаткова інвентар адзначае наяўнасць у Радзівілаве млына на два колы[276].

Найбольш поўнае уяўленне аб Радзівілаве дае інвентар мястэчка 1747 г. У ім на той час было 156 пляцаў, з якіх 102 былі забудаванымі. Аснову планіроўкі мястэчка складаў чатырохвугольны рынак. Ён меў плошчу 43,2 прэнта – трохі больш за 1000 кв. м. У яго цэнтры ў два рады стаяла 18 крамаў і 2 шпіхлеры. Тут жа стаяла царква са званіцай, побач з якімі месціліся могілкі. На рынку знаходзіўся і дом святара царквы Раства Багародзіцы – айца Пятра Гратавіцкага. Акрамя царквы на рынку стаялі важніца, вялікая ўязная карчма, клеці для збожжа[277].

---

[272] НГАБ. – Ф. 2151. – Воп. 1, адз. зах. 135. – Арк. 14–15 адв.

[273] Анішчанка Я. К. Генеральнае межаванне ў Беларусі. Дапаўненне. – С. 111.

[274] НГАБ. – Ф. 1729. – Воп. 1. – Адз. зах 62. – Арк. 775–776 адв.

[275] Тамсама. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1931/2. – Арк. 44; Тамсама.– Адз. зах. 1933/2. – Арк. 41.

[276] Тамсама. – Адз. зах. 1932. – Арк. 63–68.

[277] Тамсама. – Адз. зах. 1936. – Арк. 138–142.

З рынку ў розныя бакі адыходзілі вуліцы: Крычаўская, Альшоўская, Старэцкая, Бясовіцкая. Акрамя таго, у бок р. Альшоўка з рынку вяла яшчэ адна безыменная вулачка. Уздоўж Альшоўкі ішла Лаговая вуліца.

Бясовіцкая вуліца, верагодна, вяла на поўдзень, у бок сучаснай в. Бяседавічы, якая раней мела назву Бясовіцкая. Альшоўская вуліца выводзіла на бераг р. Альшоўка, якая служыла не толькі паўночнай мяжой мястэчка, але і была дзяржаўнай мяжой паміж Рэччу Паспалітай і Расіяй. Крычаўская вуліца вяла ў бок р. Беседзь, на беразе якой стаяў Радзівілаўскі фальварак, і далей за Беседдзю пачынаўся шлях на Крычаў.

На захад ад рынку пачынала фарміравацца разгалінаваная планіровачная структура мястэчка. Тут, у канцы вуліцы Крычаўскай пачыналася вуліца Дворная, а ў сярэдзіне гэтай вуліцы, ад яе левага боку, адыходзіла вуліца Глухая, якая, у сваю чаргу, сустракалася з вуліцай Дворнай. З правага боку ад Крычаўскай вуліцы у бок р. Альшоўка, адыходзіла безыменная вулачка. На Крычаўскай вуліцы знаходзілася і «школа жыдоўская», якой належалі два дамы. Самымі вялікімі вуліцамі мястэчка былі Крычаўская, Альшоўская, Дворная, Глухая і Лаговая, на якіх было ад 11 да 28 дамоў.

Інвентар Крычаўскага староства 1747 г. паказвае некаторыя цікавыя нюансы ў гісторыі Радзівілава. Ужо пры апісанні «фальварка Радзівілаўскага», які быў перад уездам у мястэчка, інвентар адзначае, што ён адначасова мае і другую назву – «фальварак Хоцімскі». Тое ж самае інвентар гаворыць і пра само мястэчка: акрамя назвы Радзівілаў, інвентар падае нам і другую яго назву – Хоцімск. Больш за тое, калі раней інвентары размяшчалі Радзівілаў у Бярозкаўскім войтаўстве, то зараз цэнтр войтаўства перамясціўся на ўсход адміністрацыйна-гаспадарчай адзінкі. У 1747 г. Радзівілаў размяшчаецца ў войтаўстве Бярозкаўскім і ў той жа час крыніца дае і другую назву войтаўства – Хоцімскае[278]. Апошняе сведчыць пра тое, што цэнтр войтаўства ўжо пачаў перамяшчацца ў мястэчка.

Падобная дваістасць у назве мястэчка назіралася і ў 50-я гады XVIII ст. У адной з крыніц, што датуецца 1753 г., адзін і той жа аб'ект – фальварак – называецца і як двор Радзівілаўскі, і як замак Хоцімскі[279].

Па нейкіх прычынах назва мястэчка Радзівілаў дрэнна прыжывалася і ўвесь час збівалася на назву размешчанай паблізу вёскі – Хоцімск. Апошняя была заснавана паміж 1695–1700 гг. на правым беразе Беседзі, размяшчалася насупраць мястэчка і ў 1747 г. была звязана з ім мостам.

Магчыма, пры заснаванні Радзівілава ў яго была пераселена частка жыхароў з в. Хоцімск, адсюль і змяншэнне колькасці дымоў у вёсцы, што назіраецца ў інвентары 1747 г. у параўнанні з інвентаром 1727 г. У сваю чаргу былыя жыхары в. Хоцімск у паўсядзённым жыцці, верагодна, называлі Радзівілаў назвай сваёй вёскі, і паступова такая дваістасць стала адлюстроўвацца нават у афіцыйных крыніцах – інвентарах і судовых справах[280].

---

[278] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1936. – Арк. 16, 138.

[279] ИЮМ. – Т. 17. – С. 336–342.

[280] Мяцельскі А. А. Хоцімск: да пытання пра час узнікнення. – С. 23.

У 1760 г. Крычаўскае староства перайшло ад Радзівілаў пад уладу Мнішкаў. Але афіцыйная назва мястэчка засталася ранейшай – Радзівілаў. Ва ўсякім выпадку, на карце Польшчы, Вялікага Княства Літоўскага і суседніх краін 1770 г. складзенай Б. Фоліным, на ўсходніх межах Крычаўскага староства адзначаны абодва населеныя пункты, як вёска Хоцімск, так і мястэчка Радзівілаў. І хоць подпісы назваў населеных пунктаў на карце зроблены на правым беразе Беседзі, адзін з іх паказаны на правым баку ракі, а другі – на левым, на поўнач ад упадзення невялікай рэчкі Жадунька ў Беседзь.

У адрозненне ад папярэдніх мястэчак, Радзівілаў меў значна большую рамесна-гандлёвую накіраванасць і быў не толькі адміністрацыйным, але і сапраўдным рамесна-гандлёвым цэнтрам войтаўства. Тут жылі 7 купцоў і адзін перакупшчык. 14 жыхароў займаліся шынкарствам, 3 былі пекарамі. Акрамя таго, у мястэчку былі 3 «слосары» – слесары, каваль, 2 шкляры, 2 краўцы, ганчар, шапавал, аўчыннік, кушнер, дзягцяр і пушкар.

Як і ў выпадку з Міхалавам, уваход Радзівілава ў склад Расійскай імперыі прывёў да афіцыйнай змены яго назвы. Ужо ў ведамасці аб староствах у беларускіх правінцыях, складзенай для беларускага генерал-губернатара графа З. Р. Чарнышова ў 1774 г., у складзе Крычаўскага староства згадваецца мястэчка Хоцімск[281], а пра Радзівілаў няма паведамлення. Мястэчка Хоцімск згадваецца і ў статыстычным апісанні Магілёўскай губерні 1784 г[282]. У 1786 г. А. Меер у сваім апісанні Крычаўскага староства таксама згадвае толькі мястэчка Хоцімск, а пра Радзівілаў у яго няма ніякіх звестак[283]. На карце Крычаўскага графства 1786 г., што ёсць у рукапісы гэтай працы, у Хоцімскім войтаўстве адзначаны два населеныя пункты з падобнай назвай – вёска Хоцімск і мястэчка Хоцімск, размешчаныя на процілеглых берагах р. Беседзь, адзін насупраць другога[284].

Паступова час вынішчыў з памяці людзей першапачатковую назву мястэчка. Яшчэ ў сярэдзіне XIX ст. М. Балінскі і Ц. Ліпінскі адзначалі існаванне ў Мсціслаўскім ваяводстве Вялікага Княства Літоўскага «места Радзівілаў». Але ўжо «Слоўнік географічны ...» яго не ведае. Апавядаючы пра гісторыю населеных пунктаў з назвай Радзівілаў, ён нічога не гаворыць нам пра крычаўскі Радзівілаў. Няма ніякіх звестак пра Радзівілаў і ў раздзеле, прысвечаным Хоцімску[285].

---

[281] Жукович И. Сословный состав населения Западной России в царствование Екатерины II // Журнал Министерства народного просвещения. – 1915. – Январь – С. 86.

[282] Памятная книжка Могилевской губернии на 1861 год. – Могилев: Могил. губ. стат. ком-т, 1861. – С. 41.

[283] Мейер А. Описание Кричевского графства. – С. 109.

[284] Мейер А. Описание Кричевского графства или бывшего староства 1786 года. Фотакопія рукапісу, які захоўваецца ў Аддзеле рэдкай кнігі Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа НАН Беларусі.

[285] Balinski M., Lipinski C. Starozytna Polska pod wzglendem historycznym, geograficznym i starozytnym. – Warszawa: Nakladem i drukiem S. Orgelbrunda, 1846. – T. 3. – S. 810; Slownik geograficzny Królewstwa Polskiego i innych krajów słowianskich. – T. 1. – S. 601; Тамсама. – T. IX. – S. 475–476.

Да 1778 г. належыць план мястэчка Хоцімск, складзены для ягонага тагачаснага ўладальніка графа Р. А. Пацёмкіна, які захоўваецца ў РДВГА[286] і дае ўяўленне пра планіроўку мястэчка канца XVIII ст.

Аналізуючы яго і інвентар Радзівілава 1747 г., можна выказаць меркаванне, што паміж 1747 г. і 1778 г. у мястэчку адбылася пэўная перапланіроўка паселішча. Зараз яго аснову складала адна цэнтральная вуліца, што ішла перпендыкулярна Беседзі (верагодна, згаданая ў інвентары 1747 г. «прабойная» Крычаўская вуліца) – сучасная вул. Камсамольская. На яе пачатку, каля моста праз Беседзь, месціўся «господский дом» – былы фальварак Хоцімскі. А амаль у канцы вуліцы знаходзілася гандлёвая плошча з лаўкамі і крамамі, царквой Пакрова Прасвятой Багародзіцы. На гэтай жа вуліцы знаходзіліся і іншыя мястачковыя храмы – каталіцкая капліца і жыдоўская школа.

Ад гэтай вуліцы ў паўднёвым кірунку адыходзілі невялікія перпендыкулярныя вуліцы, якія існуюць і сёння і разам з Крычаўскай вуліцай складаюць аснову цэнтральнай часткі сучаснага гарадскога пасёлка. Невялікі разгалінаваны куток мястэчка пачынаў фарміравацца над р. Альшоўка, на паўночны ўсход ад асноўнага аб'ёму паселішча. Квартальная планіроўка Хоцімска, закладзеная пры Р. Пацёмкіне, была працягнута надалей ў XIX ст. і захоўваецца да сённяшняга часу.

У рэвізскай сказцы Крычаўскага графства 1779 г. адзначаецца, што ў мястэчку налічвалася 63 хрысціянскія і 42 жыдоўскія дымы, у якіх адпаведна пражывалі 339 і 239 жыхароў. У мястэчку была царква ў гонар Праабражэння Гасподня, дзве капліцы, уніяцкая капліца і сінагога. У размешчанай насупраць аднайменнай вёсцы налічваліся 62 двары і была царква Пакрова Прачыстай Багародзіцы[287].

У 1783–1785 гг. Колькасць жыхароў у мястэчку скарацілася, але гэтыя два размешчаныя побач аднайменныя паселішчы – мястэчка і сяло Хоцімск – стваралі адзін з буйнейшых цэнтраў у Клімавіцкім уездзе, дзе налічвалася адпаведна 65 і 66 двароў (усяго 131 двор) у якіх пражывалі 358 і 441 (799) чалавек[288].

Наступным заснаваным Радзівіламі мястэчкам было **Ганна**, якое было ўтворана ў 1725 г. на тэрыторыі Углянскага войтаўства, на землях в. Мілаславічы. Як і ў выпадку з в. Забычанне, в. Мілаславічы ў канцы XVII – пачатку XVIII ст. была цэнтрам аднайменнага войтаўства. Такім чынам, новаўтворанае мястэчка было заснавана побач з ранейшым адміністрацыйна-гаспадарчым цэнтрам. Тэрмін слабады мястэчку быў вызначаны на 15 гадоў. Улічваючы сугучнасць назвы мястэчка з імем тагачаснай уладальніцы Крычаўскага староства – Ганны Катажыны Сангушкавай Радзівіл можна меркаваць, што менавіта яна заснавала мястэчка і дала яму сваё імя.

---

[286] РДВГА. – Ф. 846. – Адз. зах. 22753.

[287] НГАБ. – Ф. 2151. – Воп. 1, адз. зах. 135. – Арк. 47 адв.–50 адв., 60–62 адв.

[288] Анішчанка Я. К. Генеральнае межаванне ў Беларусі. Дапаўненне. – С. 115.

З вызначэннем месцазнаходжання мястэчка Ганна існуюць пэўныя цяжкасці. Яны выкліканы тым, што пачынаючы з сярэдзіны XVIII ст. мястэчка Ганна, як і ў выпадку з Радзівілавам, пачынае згадвацца пад дадатковай назвай – Міласлявічы. Аднак вёска Міласлявічы Крычаўскага староства вядома па пісьмовых крыніцах з сярэдзіны XVI ст. У гэтай сувязі ўзнікае пытанне, дзе размяшчаліся першапачатковая вёска Міласлявічы і новаўтворанае мястэчка Ганна?

Як адзначалася вышэй, в. Міласлявічы вядома пачынаючы з сярэдзіны XVI ст. Аднак у інвентары Крычаўскага староства 1727 г. з'яўляецца новая вёска – «Скруминово», якая мае і дадатковую назву «alias Miloslawicze» – альбо Міласлявічы. Адносна «слабады Ганна» ў гэтым інвентары адзначаецца, што яна размешчана «в грунце Мілославіцкім»[289]. Згаданая ў 1727 г. в. Скрумінава вельмі сугучная з назвай сучаснай в. Склімін Клімавіцкага раёна, размешчанай каля в. Міласлявічы.

Наступны інвентар Крычаўскага староства (1747 г.) дае нам новую інфармацыю. Цяпер ужо мястэчка Ганна мае дадатковую назву – «alias Miloslawicze», а в. Скрумінава ў інвентары адсутнічае. Замест яе з'яўляецца в. Склімін[290].

У больш позні час мястэчка ўжо стала мела назву Міласлявічы. Само мястэчка на Генеральным плане Клімавіцкага ўезда 1783 г. паказана на правым беразе р. Іпуць на тэрыторыі сучаснай в. Міласлявічы Клімавіцкага раёна. На левым беразе Іпуці амаль няма забудовы. Побач размяшчалася вёска Склімін, па сваіх памерах – адна з самых вялікіх у Клімавіцкім уездзе[291]. І зараз гэтыя населеныя пункты існуюць пад сваімі назвамі. У гэтай сувязі нам уяўляецца, што новаўтворанае мястэчка Ганна, заснаванае ў пачатку XVIII ст. «на грунтах» Міласлявіцкіх, было ўтворана на новым месцы – на правым беразе р. Іпуць на тэрыторыі сучаснай аднайменнай вёскі. А вёска Міласлявічы XVI – пачатку XVIII ст. – сучасная в. Склімін.

Гэтаму не супярэчаць і археалагічныя матэрыялы. Абследаванне тэрыторыі сучаснай в. Міласлявічы паказала, што найбольш ранняя кераміка, якая сустракаецца тут, датуецца не раней за канец XVII – пачатак XVIII ст.

Верагодна, назва старога адміністрацыйна-гаспадарчага цэнтра войтаўства – в. Міласлявічы была больш даспадобы мясцовым жыхарам, і таму паступова яго назва пачала пераходзіць на мястэчка. Гэтаму спрыяў і факт размяшчэння мястэчка на «грунтах» Міласлявіцкіх. Фактычна, тут прасочваецца той жа варыянт, што і ў выпадку з Радзівілавам – Хоцімскам.

Як адзначана ў інвентары Крычаўскага староства 1727 г., у мястэчку было 87 дымоў, на р. Іпуць стаяў млын і фолюш. Мястэчка было добра забудавана, але ў той жа час адзначалася, што яму вельмі патрэбен чалавек, «да дыспазыцыі спасобны»[292].

---

[289] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1932. – Арк. 108–109, 111.

[290] Тамсама. – Адз. зах. 1936. – Арк. 173, 198–199.

[291] РДАСА. – Ф. 1356. – Воп. 1. – Адз. зах. 2111, 2113.

[292] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1932. – Арк. 111–114.

Інвентар Крычаўскага староства 1747 г. дазваляе зрабіць рэканструкцыю планіровачнай кампазіцыі мястэчка Ганна, якое ў той час мела і другую назву – Мілаславічы. Ядром мястэчка быў рынак плошчай каля 1500 кв. м. Але фактычна забудаваны ён быў толькі з аднаго боку. Тут стаялі 5 жылых дамоў і карчма. Два другія бакі рынку былі наогул незабудаванымі, а на чацвёртым баку, акрамя двух пустых пляцаў, былі два агароды і два дамы.

З рынку выходзілі 4 вуліцы: Шумяцкая, якая, верагодна, вяла ў бок мястэчка Шумячы, Ганчарная, Старэцкая і Ладзяшанская, што выводзіла ў бок сучаснай вёскі Лядзешня. Акрамя таго, над Іпуццю ішла вуліца Лаговая. Вуліцы не былі вялікімі. На Шумяцкай было толькі 10 дамоў, агарод і адзін незабудаваны пляц. На Ганчарнай вуліцы, якая пачыналася каля левага боку Шумяцкай вуліцы, было 10 дамоў, 2 агароды, 2 пляцы, на якіх аралі, і 4 «голыя» пляцы. Улічваючы яе месцаразмяшчэнне ў адносінах да Шумяцкай вуліцы, можна меркаваць, што яна вяла на захад ад рынку. На Старэцкай вуліцы было толькі 4 дамы. На Ладзяшанскай вуліцы месціліся сінагога, 10 дамоў, 2 агароды, 2 пустыя пляцы і 3 «пашных». На Лаговай вуліцы было 5 жылых дамоў і адзін «голы» пляц[293]. Усяго ў мястэчку ў 1747 г. налічвалася 44 жылыя дамы. У параўнанні з колькасцю дымоў у мястэчку ў 1727 г. іх колькасць зменшылася ў два разы. Інвентар Крычаўскага староства 1747 г. вельмі сціпла паведамляе пра заняткі месцічаў. Тут было 8 шынкароў, 2 краўцы, млынар, пастух. Аб занятках астатніх жыхароў нічога невядома.

Апісанне мястэчка Ганна згодна з інвентаром 1747 г. вельмі добра ілюструецца планам мястэчка Мілаславічы 1784 г.[294], што сведчыць пра захаванне традыцыі яго забудовы. Ды і сёння правабярэжная частка Мілаславічаў захавала гэту структуру забудовы, што пачала фарміравацца ў XVIII ст.

У 1779 г. у Мілаславічах налічваўся 51 двор, дзе пражывалі 382 жыхары, а ў 1783–1785 гг. колькасць двароў павялічылася да 54, аднак колькасць жыхароў скарацілася да 355[295].

Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай мястэчка Ганна паўтарыла гісторыю Міхалава і Радзівілава і змяніла сваю назву. Ва ўсякім выпадку, ужо ў 1773 г. уездным горадам Мсціслаўскай правінцыі былі прызначаны Мілаславічы[296], а пра мястэчка Ганна няма ніякіх паведамленняў. Падчас новага размеркавання ўездаў у 1777 г. Мілаславічы ў ліку гарадоў ужо не значацца, а ў статыстычным апісанні Магілёўскай губерні 1784 г. яны зноў названы мястэчкам[297]. Першапачатковая ж назва – Ганна – паступова забылася і не сустракаецца ў даведачных і навуковых выданнях XIX–XX стст.

---

[293] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1936. – Арк. 173–176.

[294] РДАСА. – Ф. 1354. – Воп. 236/2. – Адз. зах. М-11 – галка чырвоная.

[295] Бянько У. Мілаславічы // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Т. 5. – С. 142; Анішчанка Я. К. Генеральнае межаванне ў Беларусі. Дапаўненне. – С. 114.

[296] Полное собрание законов Российской империи повелением государя императора Николая Павловича составленное. Собр. 1-е. – 1830. – XIX т. – С. 798–799, № 14014.

[297] Дембовецкий А. С. Опыт описания Могилевской губернии... – Кн. 2. – С. 79.

Згодна з рэвізскай сказкай Крычаўскага графства 1779 г. у мястэчку Мілаславічы налічваўся 51 хрысцыянскі (291 жыхар) і 19 жыдоўскіх (91 жыхар) двароў. У мястэчку, акрамя гаспадскага дома і іншых гаспадарчых пабудоў пры ім, была праваслаўная царква ў гонар Пакрова Прачыстай Багародзіцы і ўніяцкая царква Св. Іосіфа[298] (мал. 73).

Геранімаў. Першыя звесткі пра мястэчка з такой назвай сустракаюцца ў інвентары Крычаўскага староства 1727 г. Пры апісанні в. Вепрын адзначаецца, што на «вепрынскіх грунтах» асаджаецца мястэчка «Геранімаў». Месца для яго было вызначана паміж «грунтамі» вёсак Ушакі і Палуж, ва ўрочышчы Камень над р. Сож. Акрамя таго, у інвентары адзначаецца неабходнасць надання прывілеяў для найлепшага развіцця мястэчка[299].

Верагодна, мястэчка было заснавана ў 1726–1727 гг., і, улічваючы, што тэрмін слабады для яго закончыўся ў 1746 г., можна меркаваць, што слабада надавалася новаўтворанаму мястэчку тэрмінам на 20 гадоў[300]. Сугучнасць назвы паселішча з імем Гераніма Фларыяна Радзівіла, дзяржаўцы Крычаўскага ста-



Мал. 73. План мястэчка Ганна (Мілаславічы) згодна з планам Генеральнага межавання 1783–1784 гг.

[298] НГАБ. – Ф. 2151. – Воп. 1. – Адз. зах. 135. – Арк. 69 адв.–71 адв.
[299] Тамсама. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1932. – Арк. 155.
[300] Тамсама. – Адз. зах. 1936. – Арк. 90.

роства ў 1746–1759 гг., дазваляе выказаць думку, што мястэчка было заснавана яго маці Ганнай Катажынай Сангушкавай Радзівіл і названа ў гонар сына.

Зараз населены пункт з такой назвай адсутнічае, але ў апісанні Крычаўскага графства А. Меера 1786 г. захавалася паведамленне, што тагачасная вёска «Гронавая» мае і другую назву – «Геронімовая», сугучная назве мястэчка Геранімаў[301]. Яшчэ не так даўно в. Гронава існавала ў Чэрыкаўскім раёне Магілёўскай вобласці, яе, верагодна, і трэба атаясняць з мястэчкам XVIII ст. Калі адбылося перайменаванне паселішча, дакладна невядома, але ўжо ў 1762 г. мястэчка «Гроново» адносілася да прыхода крычаўскай грэка-каталіцкай царквы Раства Багародзіцы[302]. У той самы час яшчэ ў 1770 г. крычаўскі дзяржаўца Юры Мнішак звярнуўся з прашэннем да караля Станіслава Аўгуста аб дазволе гандляваць у мястэчку Геранімаў у сераду[303].

Згодна з інвентаром Крычаўскага староства 1747 г., аснову планавай кампазіцыі мястэчка складаў рынак, адзін з бакоў якога выходзіў на р. Сож. З астатніх бакоў рынку адыходзілі вуліцы Манастырская, Ушакоўская і Вепрынская, якія, верагодна, выводзілі на дарогі ў бок аднайменных вёсак. Акрамя таго, інвентар згадвае незабудаваныя завулкі Крычаўскі і Зорскі, якія вялі з рынку ў бок р. Сож.

Развіццё мястэчка ішло вельмі марудна. Так, у 1747 г. у ім налічвалася толькі 18 жылых дамоў, з якіх 6 стаялі на рынку; 8 пабудоў у мястэчку стаялі пустымі, акрамя таго ў Геранімаве налічваліся яшчэ 34 пустыя пляцы.

Інвентар мястэчка 1747 г. дае некаторыя звесткі аб занятках яго жыхароў. Значная іх колькасць займаліся вырабам алею – былі алейнікамі (5). Адначасова тры з іх былі купцамі. Акрамя таго, у Геранімаве ў гэты год былі яшчэ два купцы, два кушняры, ганчар, пастух. Адзін жыхар меў прозвішча Калеснік, якое, магчыма, паказвае на яго прафесійны занятак[304]. Выраб алею і надалей быў адным з галоўных заняткаў жыхароў Геранімава. Так, у 1753 г. тут пражывала 6 алейнікаў[305].

Аднак у цэлым знаёмства з узроўнем развіцця рамяства ў Геранімаве паказвае, што яно было вельмі нязначным. Геранімаў так і не змог стаць значным рамесна-гандлёвым цэнтрам з-за таго, што амаль насупраць яго, на другім баку Сожа, стаяў горад Чэрыкаў Магілёўскага староства.

У якасці мястэчка Крычаўскага староства Геранімаў яшчэ згадваецца ў ведамасці аб старостве, складзенай для беларускага генерал-губернатара графа З. Г. Чарнышова у 1774 г. і ў рэвізскай сказцы Крычаўскага староства 1778 г.[306]

---

[301] Мейер А. Описание Кричевского графства. – С. 88.

[302] ИЮМ. – Вып. 18. – С. 147.

[303] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 189. – Арк. 316.

[304] Тамсама. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1936. – Арк. 90–92.

[305] Мелешко В. И. Очерки аграрной истории Восточной Белоруссии... – Минск: Наука и техника, 1975. – С. 133.

[306] Жукович И. Сословный состав населения Западной России. – С. 86; Мейер А. Описание Кричевского графства. – С. 88; НГАБ. – Ф. 2151. – Воп. 1. – Адз. зах. 135. – Арк. 100.

Але пасля гэтага яно, верагодна, даволі хутка было афіцыйна пераведзена ў ранг звычайных сельскіх паселішчаў. Ва ўсякім выпадку, у апісанні Магілёўскай губерні 1784 г. мястэчка Геранімаў ужо адсутнічае, а ў 1786 г. А. Меер адзначае, што гэта вёска.

Як і ў папярэдных выпадках, працэс змены назвы населенага пункта адбываўся менавіта пасля ўваходу гэтых зямель у склад Расійскай імперыі. Першапачатковая назва мястэчка Геранімаў была хутка забыта. Так, на карце Чэрыкаўскага ўезда 80-х гадоў XVIII ст. гэта вёска ўжо праходзіць пад назвай Ераново[307], а ў 1786 г. – пад назвай Гронавая[308], адкуль недалёка да сучаснай назвы – Гронава.

Звесткі аб развіцці мястэчка ў другой палове XVIII ст. амаль адсутнічаюць. Вядома толькі, што ў 1778 г. тут налічваліся 15 хрысціянскія і 1 жыдоўскя дымы, ў якіх разам жылі 97 чалавек. Вёска развівалася вельмі паступова і марудна. У 1783–1785 гг. тут налічваліся толькі 23 дымы, у якіх пражывалі амаль 140 чалавек[309].

Студзянец – сучасная аднайменная вёска Касцюковіцкага раёна. Мястэчка Студзянец было заснавана над р. Жадунька у Лучыцкім войтаўстве Крычаўскага староства ў 1738 г. Першапачаткова тэрмін слабады для мястэчка быў вызначаны 15 гадамі і павінен быў скончыцца ў 1753 г. Але ў 1745 г. сваім універсалам Геранім Фларыян Радзівіл павялічыў тэрмін слабады на 10 гадоў – да 1755 г.[310]

Адзіны захаваны інвентар мястэчка 1747 г. малюе нам паселішча, ядром якога быў рынак плошчай каля 1900 кв. м. На рынку фактычна быў забудаваны адзін бок, які прымыкаў да вуліцы Старадубскай, дзе было 8 жылых дамоў і адзін пусты. Астатнія бакі рынку таксама былі забудаванымі, але колькасць дамоў у іх вагалася ад 3 да 5, і дамы стаялі пустыя, альбо іх будаўніцтва не было завершана. З рынку выводзілі дзве вуліцы – Касцюковіцкая і Старадубская. Улічваючы, што абедзве вуліцы размяшчаліся на адной восі ўздоўж гасцінца з Крычава на Украіну, можна сцвярджаць, што па сваёй планавй кампазіцыі Студзянец набліжаўся да аднавулічных мястэчак.

Старадубская вуліца была вельмі кароткая. На ёй быў толькі адзін жылы дом – мясцовага святара, але дзе знаходзіўся сам храм, інвентар не паведамляе.

Большая частка мястэчка размяшчалася на поўнач ад рынку. У гэты бок вяла Касцюковіцкая вуліца, на якой знаходзіліся 20 дамоў і 4 незабудаваныя пляцы. З левага боку ад Касцюковіцкай вуліцы адыходзіў незабудаваны завулак, што выводзіў у бок в. Белая Дуброва. У канцы Касцюковіцкай вуліцы, таксама з левага боку, адыходзіла Руднянская вуліца. На яе правым баку было

---

[307] РДАСА. – Ф. 1356. – Воп. 1. – Адз. зах. 2158.

[308] Мейер А. Описание Кричевского графства. – С. 88.

[309] Анішчанка Я. К. Генеральнае межаванне ў Беларусі. – С. 110; НГАБ. – Ф. 2151. – Воп. 1. – Адз. зах. 135. – Арк. 100 адв.

[310] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1936. – Арк. 106.

17 дамоў і 5 пустых пляцаў. Левы бок ішоў над ручаём Студзянцом і быў незабудаваны.

З гаспадарчых пабудоў у мястэчку на той час быў стары млын на два колы, фолюш, карчма. Акрамя таго, быў пабудаваны новы млын, але ён пакуль стаяў без жорнаў[311]. Усяго ў мястэчку ў 1747 г. было 48 жылых дамоў. Заняткі жыхароў у інвентары прасочваюцца дрэнна. Вядома, што з 48 гаспадароў Студзянца было 8 шынкароў, 1 купец, цясляр, шавец і пастух. Насупраць прозвішча аднаго жыхара адзначана, што ён «пахар». Што датычыць астатніх, звесткі аб іх занятках адсутнічаюць.

Напрыканцы XVIII ст. мястэчка паступова прыходзіць у заняпад. Пасля ўваходу гэтых зямель у склад Расійскай імперыі згодна з рэвізскай сказкай Крычаўскага графства 1779 г. тут была праваслаўная царква Св. Пятра і Паўла, а ў мястэчку налічвалася 30 хрысціянскіх і 5 жыдоўскіх дамоў, у якіх пражывалі адпаведна 149 і 19 жыхароў[312].

Заснаванне ў Лучыцкім войтаўстве яшчэ аднаго мястэчка акрамя Міхалава, верагодна, было выклікана тым, што ў гэтым раёне Мсціслаўскага ваяводства ў першай палове XVIII ст. пачаўся актыўны працэс фарміравання прыватнаўласніцкіх мястэчак.

Акрамя таго, у пэўным сэнсе асаджэнню мястэчка ў гэтым раёне спрыяў і той факт, што тут пачыналася разгалінаванне шляхоў. У Студзянцы шлях, які вёў з Мсціслава на Украіну, раздвойваўся. Адзін шлях праз вуліцу Старадубскую вёў далей на поўдзень, а другі, праз безыменную вуліцу, выводзіў на дарогу на в. Белая Дуброва[313].

Дарога «гасціна», з «Украіны» праз Касцюковічы, якая «здаўна ідзе», згадваецца ў крыніцах сярэдзіны XVIII ст. Яна з Касцюковіч ішла праз Студзянец, на в. Белая Дуброва, далей праз в. Кавычыцы шла на в. Мокрая[314] і таксама выводзіла на мяжу з Расіяй.

Акрамя заснаваных паселішчаў, Радзівілы ўвесь час шукалі месцы, прыдатныя для арганізацыі новых мястэчак на тэрыторыі Крычаўскага староства. Так, у інвентары староства 1727 г. пры апісанні в. Панкі Лучыцкага войтаўства (сучасная в. Зацішша Мокраўскага сельсавета Касцюковіцкага раёна) падкрэсліваецца, што ў яе наваколлях было б добра «засадзіць» новае мястэчка[315]. Але гэта думка па нейкіх прычынах так і не была рэалізаваная.

Такім чынам, у першай палове XVIII ст. на тэрыторыі Крычаўскага староства было арганізавана 5 мястэчак, якія ў сваёй большасці былі задуманы як цэнтры войтаўстваў і на працягу бліжэйшых ста пяцідзесяці гадоў выконвалі

---

[311] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1936. – Арк. 106–109.
[312] Тамсама. – Ф. 2151. – Воп. 1. – Адз. зах. 177. – Арк. 31–32.
[313] Тамсама. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1936. – Арк. 107, 108.
[314] Тамсама. – Ф. 694. – Воп. 2. – Адз. зах. 3982. – Арк. 6, 256.
[315] Тамсама. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1932. – Арк. 140–141.

ролю адміністрацыйнага і, верагодна, невялікага гандлёвага цэнтра пэўнай акругі. Выключэннем з'яўляецца толькі мястэчка Геранімаў, якое, верагодна, было заснавана з мэтаю супрацьстаяць гораду Чэрыкаву Магілёўскай воласці ў паўднёва-заходніх раёнах староства, аднак не змагло скласці яму канкурэнцыю і заняпала.

Мястэчкі, заснаваныя ў войтаўствах-валасцях, якія існавалі яшчэ ў XVI–XVII стст., утвараліся, як правіла, побач са старымі цэнтрамі гэтых адміністрацыйна-гаспадарчых адзінак. Мястэчка Міхалаў было пабудавана побач з в. Забычанне, мястэчка Ганна – побач з в. Мілаславічы.

Аб тым, што мястэчкі староства былі гандлёвымі цэнтрамі, сведчыць і ўпарадкаванне гандлёвых дзён, праведзенае ў 1770 г. крычаўскім дзяржаўцам Юрыем Мнішкам. Згодна з прывілеем караля Станіслава Аўгуста, у мястэчку Забычанне (Міхалаў) дазвалялася гандляваць па аўторках; у мястэчках Геранімаў, Мілаславічы, Студзянец – у сераду; у мястэчку Хоцімск (Радзівілаў) – у чацвер[316]. Акрамя таго, у Радзівілаве з 1760 г. існавалі і спецыяльныя дні, у якія дазвалялася праводзіць кірмашы, – «у першую нядзелю па Адвенту (на Новы год) і на рускае Стрэчанне (Грамніцы)»[317].

З ўсіх мястэчак Крычаўскага староства, згодна з інвентаром 1747 г., толькі ў Радзівілаве акрамя функцыі адміністрацыйнага і гандлёвага цэнтра акругі выразна прасочваецца і пачатак рамеснай накіраванасці паселішча. Астатнія цэнтры войтаўстваў не з'яўляліся рамеснымі цэнтрамі сваёй акругі. Гэту функцыю за іх выконвалі размешчаныя побач гарадскія цэнтры – Крычаў і Чэрыкаў. Усяго ў 1774 г. у 6 мястэчках Крычаўскага староства (Крычаў, Мілаславічы, Хоцімск, Геранімаў, Студзянец, Забычанне) пражывала 2600 чалавек[318].

Назіранні за ўрбаністычнымі працэсамі, што адбываліся на тэрыторыі Мсціслаўскага княства і ваяводства ў XIV–XVIII стст. паказваюць, што на першым этапе (XIV–XV стст.) працягвалі свае далейшае развіццё старыя адміністрацыйныя цэнтры, што ўзніклі яшчэ ў XII–XIII стст., – Мсціслаў, Крычаў, Мглін, Папова Гара і Дрокаў. Па колькасці насельніцтва яны адпавядалі статусу сярэдніх гарадоў ВКЛ.

З XVI ст. на тэрыторыі Мсціслаўскага княства і ваяводства засталіся толькі два гарады – Мсціслаў і Крычаў. Яны паступова раслі і, нягледзячы нават на пагромы, што перанеслі ў XVI – сярэдзіне XVII ст. у выніку шматлікіх войнаў ВКЛ і Рэчы Паспалітай з Рускай дзяржавай, заставаліся буйнейшымі рамесна-гандлёвымі, ваеннымі, культавымі і культурнымі цэнтрамі рэгіёна.

Пачынаючы з XVI–XVII стст. узнікаюць адзінкавыя дзяржаўныя мястэчкі на падставе старых адміністрацыйных цэнтраў, феадальных замкаў – Радамля, магчыма, Хіславічы. У пачатку XVII ст. пачынаюць фарміравацца і прыватнаўласніцкія мястэчкі на падставе буйных прыватнаўласніцкіх паселішчаў –

[316] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 189. – Арк. 315–321, № 229–233.

[317] Тамсама. – Адз. зах. 181. – Арк. 771–772.

[318] Жукович И. Сословный состав населения Западной России. – С. 86.

Расна, Кадзіна, Фастава. Гэты працэс быў прыпынены падзеямі вайны 1654–1667 гг., а потым Паўночнай вайны 1701–1721 гг.

І толькі з сярэдзіны другога дзесяцігоддзя XVIII ст. працэс фарміравання мястэчак ахоплівае ўсю тэрыторыю ваяводства і яны ўзнікаюць як на прыватнаўласніцкіх, так і на дзяржаўных землях (мал. 74). Прычым зараз выразна прасочваецца мэтанакіраваная дзейнасць роду князёў Радзівілаў, арандатараў буйнейшага старостваа на ўсходзе краіны – Крычаўскага. Мястэчкі, як правіла, узнікаюць на гандлёвых шляхах і абапіраюцца на больш раннія паселішчы. Толькі ў рэдкіх выпадках мястэчкі засноўваліся на «сырым корані» – Радзівілаў-Хоцімск, Студзянец, Маркава. Мястэчкі засноўваліся як адміністрацыйна-тэрытарыяльныя і гандлёва-рамесныя цэнтры пэўнай акругі, але насілі больш аграрны, чым рамесны характар.

▲ — мястэчкі Крычаўскага староства
● — прыватныя мястэчкі

Мал. 74. Гарады і мястэчкі Мсціслаўскага ваяводства ў XVIII ст.

Па колькасці жыхароў і развіцці рамяства яны значна саступалі мястэчкам на захадзе і ў цэнтры краіны. Апошняе тлумачыцца адносна познім іх узнікненнем і ўцягваннем у знешні і ўнутранны гандаль.

У выніку тых урбанізацыйных працэсаў, што паступова адбываліся на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства на працягу другой паловы XVII–XVIII ст., у Мсціслаўскім ваяводстве, згодна з данымі рускіх крыніц, у 1773 г. быў адзін горад (Мсціслаў) і 22 прыватнаўласніцкія і дзяржаўныя мястэчкі[319]. Улічваючы, што тэрыторыя Мсціслаўскай правінцыі была роўнай 790 тыс. дзесяцін (7181 тыс. кв. км), то адно мястэчка прыпадала на 326,4 кв. км.

[319] Закаменская Е. П. Вотчинные хозяйства Могилевской губернии во второй половине XVIII века. – Могилев: Изд-во Могил. обл. краев. музея, 1958. – С. 46.

КАНФЕСІЙНАЕ ЖЫЦЦЁ Ў МСЦІСЛАЎСКІМ КНЯСТВЕ І ВАЯВОДСТВЕ Ў XII–XVIII СТСТ.

7.1. Пачатак распаўсюджвання хрысцыянства на землях Сярэдняга і Верхняга Пасожжа ў XI–XIV стст.

Сярэднявечча нельга ўявіць сабе без рэлігійнага жыцця, якое з'яўлялася арганічнай часткай паўсядзённай дзейнасці чалавека. Цэрквы, касцёлы, сінагогі былі своеасаблівай візітнай карткай гэтай эпохі, якая застаецца амаль недаследаванай галіной культурнай спадчыны. Рэлігія ў Сярэднявеччы прасякала ўсе сферы жыцця чалавека і апасродкавана мела вялікі ўплыў на ўзаемадачыненні і жыццё людзей.

Прыняцце ў 988 г. кіеўскім князем Уладзімірам хрысціянства ў якасці афіцыйнай рэлігіі Кіеўскай Русі паклала пачатак яго шырокаму распаўсюджванню па абшарах Усходняй Еўропы. Аднак прыняцце хрысціянства не было аднаактавай падзеяй, яно расцягнулася на некалькі стагоддзяў. Змена ідэалогіі, якая закранала асноўныя моманты духоўнага жыцця, быта і гаспадарчай дзейнасці, магла працякаць вельмі павольна, на працягу жыцця некалькіх пакаленняў.

У 988 г. фактычна адбыўся афіцыйны хрост толькі жыхароў сталіцы дзяржавы – Кіева. А пасланы ў наступным годзе у Ноўгарад для хрысціянізацыі ваявода Дабрыня сустрэў супраціў мясцовага насельніцтва. Падобная карціна, верагодна, адбывалася і на іншых землях усходніх славян.

Фактычна адразу пасля хрышчэння жыхароў Кіева пачалася адміністрацыйна-тэрытарыяльная арганізацыя новаахрышчанай тэрыторыі: была арганізавана Кіеўская мітраполія, шасцідзясятая па чарзе мітраполія Канстанцінопальскага патрыярхату. Разам са стварэннем Кіеўскай мітраполіі былі ўстаноўлены вікарныя епархіі: у Чарнігаве, Белгарадзе, Ноўгарадзе, Пераяслаўлі, Юр'еве, Полацку. Прыблізна пачаткам XI ст. (1013 г.) датуецца хрост Смаленскай зямлі[1]. Але трэба прызнаць, што дзейнасць гэтых епархій на першапачатковым этапе фактычна абмяжоўвалася тэрыторыямі буйных адміністрацыйных і культавых цэнтраў – Чарнігава, Старадуба, Гомія, Смаленска. Асноўная маса сельскага насельніцтва яшчэ доўгі час заставалася вернай паганству, і ў сельскае асяроддзе хрысціянства, безумоўна, пранікала са значным спазненнем.

Паступовае пранікненне хрысціянства і змена ідэалагічных поглядаў добра прасочваюцца па змене пахавальнага абраду на працягу X–XIII стст. Гэта адбылося таму, што царква ўспрыняла ветхазапаветную іудзейскую традыцыю пахавання нябожчыкаў у зямлі, ці ў «грабах» – пячарах. Звычай паха-

[1] Алексеев Л. В. Смоленская земля в IX–XIII вв. – С. 239.

вання нябожчыка ў зямлі ў іудзеяў з'явіўся ў старажытнасці, а спальванне нябожчыкаў прымянялася выключна як ганебнае пакаранне[2], таму царква на працягу сваёй гісторыі паступова перайшла да інгумацыі. Апошняму спрыяў і тэзіс пра наступнае ўваскрашэнне, для якога і неабходна была адмова ад трупаспалення.

У апошняй чвэрці 1 тыс. н. э. ў насельніцтва Ніжняга і Сярэдняга Пасожжа існаваў звычай трупаспалення нябожчыка ў грунтовых ямах. На Ніжнім Пасожжы А. А. Макушнікавым зафіксавана радзіміцкае трупаспаленне канца IX–X стст. у грунтовых ямах[3]. Магчыма і на Сярэднім Пасожжы вядомы такі помнік, але адсутнасць дакладнага стратыграфічнага апісання не дазваляе з упэўненасцю яго так інтэрпрэтаваць.

Так, У. П. Траццяковым каля в. Гронаў Чэрыкаўскага раёна, у 30 м ад курганнага могільніка пры даследаванні стаянкі эпохі неаліту была знойдзена авальная вуглістая пляма дыяметрам да 8 м. Падчас выбаркі з яе культурнага слоя былі знойдзены фрагменты ганчарнай керамікі X–XI стст., шматлікія кальцыніраваныя косткі, у тым ліку і косткі чалавечага чэрапа[4]. Магчыма, гэта вуглістая пляма адносіцца да рэшткаў кастра, на якім спальвалі нябожчыкаў радзімічы ў X–XI стст.

У самым канцы 1 тыс. н. э. адбываюцца змены ў ідэалагічных поглядах насельніцтва Пасожжа, пра што сведчыць пачатак актыўнага распаўсюджвання пахаванняў у курганах, прычым першапачаткова гэта таксама было трупаспаленне.

Найбольш раннім тыпам такога пахавання, што адносіцца да канца 1 тыс. н. э., зафіксаваным сёння на Сярэднім і Верхнім Пасожжы, з'яўляецца пахаванне па абрадзе трупаспалення, зробленае на старане ў падкурганнай яме.

Такое пахаванне прасочана ў кургане каля в. Іванаўск Клімавіцкага ўезда, раскапаным ў 1892 г. С. Ю. Чалоўскім. Падобная ж карціна прасочвалася і ў кургане каля в. Палуж-1 Чэрыкаўскага ўезда, раскапаным ім жа ў 1893 г.[5] Улічваючы, што з'яўленне радзіміцкіх курганоў з трупаспаленнем на Ніжнім Пасожжы адносіцца да самага канца 1 тыс. н. э., можна меркаваць, што і ў нашым выпадку іх трэба датаваць не раней за гэты час.

Аналіз пахаванняў у курганных могільніках сведчыць, што ў пачатку XI ст. у курганных могільніках Пасожжа яшчэ панаваў паганскі абрад трупаспалення нябожчыкаў. Радзіміцкія курганныя могільнікі з поўнымі ці няпоўнымі трупаспаленнямі, якія, верагодна, можна аднесці да канца X – пачатку XI ст., сустракаюцца ў шматлікіх месцах: каля паселішча X–XI стст., размешчанага

---

[2] Карпов А. В. Язычество, христианство, двоеверие. Религиозная жизнь Древней Руси в IX–XI веках. – СПб.: Алетея, 2008. – С. 150.

[3] Макушнікаў А. А. Могільнік Нісімкавічы-1 каля Чачэрска. – С. 168–187.

[4] Третьяков В. П. Разведки в Посожье в Могилевской области // АО 1974 года. – М.: Наука, 1975. – С. 397.

[5] Фурсов М. В. Дневник курганных раскопок... – С. 27; Дневник курганных раскопок... – С. 14–15.

ў пойме Сожа ў Крычаве, у наваколлях г. Клімавічы, каля вёсак Радамля, Гарбавічы, Гразівец, Іванаўск і інш[6]. Прычым даследаванне курганоў дазваляе прасачыць паступовую змену пахавальнага абраду і паступовае пранікненне хрысціянства.

Пра існаванне абрада трупаспалення нябожчыка на месцы пахавання сведчаць знаходкі ў курганных могільніках слядоў вялікага пажарышча і дробных фрагментаў чалавечых костак. Такі абрад пахавання зафіксаваны ў курганным могільніку каля в. Валынеж Клімавіцкага ўезда.

Пранікненне хрысціянства, верагодна, ішло вельмі марудна, бо ў курганах радзімічаў XI–XII стст. працягваюць прасочвацца перажыткі паганства ў выглядзе вуглістых плямін на падэшве радзіміцкіх курганоў: перад тым як пахаваць нябожчыка, на падэшве кургана распальваўся ачышчальны касцёр.

Ды інакш і не магло быць. Пісьмовыя крыніцы неаднаразова фіксуюць, як ішло гэта «знаёмства» з хрысціянствам. І як князь Уладзімір скідваў у воды Дняпра паганскіх багоў, і як на дапамогу полацкім князям адпраўляліся місіянеры, і паданне пра тое, як Дабрыня ажыццяўляў хрост Ноўгарада. Нешта падобнае адбывалася і на зямлі радзімічаў, вось толькі падзеі, што адбываліся тут, не знайшлі свайго адлюстравання ў пісьмовых крыніцах.

У той жа час барацьба паганства з хрысціянствам, асабліва на вёсках, адлюстравалася ў паданнях і фальклоры. Гэта даволі распаўсюджаныя паданні пра цэрквы, якія раней стаялі на сучасных гарадзішчах і праваліліся пад зямлю; пра царкву, якая сышла пад ваду і званы якой ў ціхае надвор'е можна пачуць і зараз. Безумоўна, усе гэтыя паданні адлюстроўваюць барацьбу паганства і хрысціянства і знішчэнне старых куміраў.

Звычайна цэрквы што, згодна з паданнямі праваліліся пад ваду, знаходзяцца на «святых азёрах», якія ў цікавым для нас рэгіёне ёсць на ўскрайку Мсціслава, каля в. Дубна Слаўгарадскага раёна, каля в. Хоцімск Касцюковіцкага раёна, каля в. Баханы Хоцімскага раёна на р. Беседзь. Таксама, магчыма, з месцам даўняга хросту насельніцтва звязана назва рэчкі Свяцілаўка, якая згадвалася яшчэ ў сярэдзіне XVII ст. у наваколлях в. Пузырова[7] сучаснага Манастыршчынскага раёна Смаленскай вобласці. Зараз гэты гідронім не існуе, але тапонімы Ст. і Н. Свяцілавічы, як памяць пра былую рэчку, у гэтым раёне ёсць.

Маўклівым сведкам існавання паганства на Пасожжы з'яўляецца знойдзены каля в. Янаўка Шумяцкага раёна Смаленскай вобласці, прыкладна ў 500 м ад берага Сожа, камень з высечанай на ім выявай чалавечага твару (мал. 75). На версе камня над тварам ёсць апрацаваная гарызантальная пляцоўка, з якой на твар ідзе прасечаны ў камні канал. Магчыма, на гэтым камені адбываліся ахвярапрынашэнні, кроў з якіх сцякала на твар ідала. Вакол гэтага цэнтраль-

---

[6] Раскопки воспитанниками V кл. Климовичского мужского... – С. 239–243; Романов Е. Р. Заметки о дополнительных археологических местонахождениях. – С. 124–125; Сербаў І. А. Археалагічныя абследаванні ў вадазборах рэк Проні – Ухлясьці. – С. 241.

[7] ИЮМ. – Вып. 25. – С. 479.

Мал. 75. Валун з высечанай выявай твара чалавека (каля в. Яноўка Шумяцкага раёна Смаленскай вобласці)

нага каменя бессістэмна размешчаны больш дробныя камяні, якія ўтвараюць круг няправільнай формы радыусам прыкладна 8–10 м.

Пра даволі доўгае захаванне паганскіх перажыткаў на Пасожжы сведчаць і сляды трызны, якія прасочваюцца ў курганах XII ст. Пасля пахавання нябожчыка і насыпкі кургана на яго вяршыні адбывалася трызна, сляды якой ў выглядзе пажара зафіксаваны ў кургане № 17 курганнай группы 24 каля в. Сукромля; кургане № 1 каля в. Кузьмічы; курганах № 1 і 14 курганнай групы № 75 каля лясной дачы Пільня, кургане № 41 каля Хатовіжа[8].

Гэты перажытак паганства ў сельскіх мясцовасцях Пасожжа захоўваўся даволі доўга. Так, яшчэ ў канцы XIX ст. у Клімавіцкім уездзе фіксаваўся абрад распальвання вогнішча на магіле і скідвання ў магілу місак, з якіх абмывалі нябожчыкаў[9]. Магчыма, фрагменты і цэлыя гаршкі, з якіх абывалі нябожчыкаў перад пахаваннем, мы сёння сустракаем у даследуемых курганах XI–XIII стст.

Знойдзеныя ў курганах радзімічаў крыжыкі-падвескі нельга адназначна разглядаць у якасці індыкатара паспяховага распаўсюджвання хрысціянства. Гэта выклікана тым, што даволі часта на нябожчыку сустракаюцца некалькі крыжыкаў разам з іншымі ўпрыгожаннямі, што ў пэўнай ступені сведчыць пра іх выкарыстоўванне, у першую чаргу, у якасці звычайных упрыгожанняў.

[8] Ляўданскі А. М. Археалагічныя досьледы у Смаленшчыне. – С. 21–23.

[9] Дневник курганных раскопок... – С. 5.

Так, у кургане № 8 каля в. Сукромля разам з каралямі на нябожчыцы было 5 літых бронзавых крыжападобных і 3 лодкападобных падвесак. У кургане № 3 каля лясной дачы Пільня на нябожчыцы былі 3 бронзавыя крыжыкі-падвескі. Некалькі крыжападобных падвесак было і на жанчыне з кургана № 11 у курганнай групе каля в. Крастовая[10].

Аналіз матэрыялаў з іншых зямель таксама сведчыць, што пахаванні з крыжыкамі і абразкамі былі распаўсюджаны сярод неафітаў на самым пачатковым этапе распаўсюджвання хрысціянства. З пранікненнем жа хрысціянства неабходнасць паказваць сваю прыналежнасць да новай рэлігіі адпала, і таму крыжыкі і абразкі сталі лішнімі элементамі ў пахаваннях[11]. Абрад пахавання з крыжыкамі канчаткова сфарміраваўся толькі ў XVI–XVII стст.

Паступовае пранікненне хрысціянства, верагодна, прасочваецца і па тым, як ляжыць у пахаванні нябожчык. У паганскіх пахаваннях у нябожчыкаў рукі выцягнуты ўздоўж тулава. Верагодна, тыя пахаванні, у якіх адна рука ляжыць на грудзях, а другая выцягнута, можна разглядаць ужо як пачатак пранікнення хрысціянства, бо хрысціянская традыцыя патрабуе, каб нябожчык ляжаў з рукамі, складзенымі на грудзях. Такія пахаваннні звычайна сустракаюцца ў пахаваннях у падкурганных ямах альбо пры пахаваннях на мацерыку, але зараз у кургане ўжо альбо цалкам адсутнічае вугольная праслойка, альбо гэта рэлікт – праслойка таўшчынёй 1–3 см, якая, верагодна, з'явілася ў выніку таго, што перад пахаваннем выпальвалася трава на месцы будучага пахавання. Звычайна такія курганы бедныя на інвентар, альбо ён наогул адсутнічае, што таксама сведчыць пра пранікненне хрысціянства і змену ідэалогіі, бо згодна з хрысціянскай традыцыяй, як прыйшоў на гэты свет ні з чым, так і сысці павінен ні з чым.

Падобныя курганы, верагодна, можна датаваць XII–XIII стст. і яны даволі шматлікія ў вярхоўях Іпуці – курганныя групы каля вёсак Сукромля, Крастовая, Дзяражня, Пільня, Слабада[12]. І ў іншых раёнах як зямлі радзімічаў, так і іншых усходнеславянскіх плямёнаў толькі пачынаючы з XII ст. з'яўляецца ўсё больш пахаванняў, дзе ў нябожчыкаў рукі складзены альбо на грудзях, альбо на жываце[13], якія можна разглядаць у якасці індыкатараў распаўсюджвання хрысціянства.

Назіранні за інвентаром пахавальнага абраду таксама сведчаць пра захаванне пережыткаў паганства сярод мясцовага насельніцтва. Яскравым пацвярджаннем гэтага з'яўляюцца знойдзеныя ў курганах падвескі, якія сведчаць пра захаванне паганскага веравызнання. Асабліва шматлікія яны ў глыбінных раёнах зямлі радзімічаў.

---

[10] Ляўданскі А. М. Археалагічныя досьледы у Смаленшчыне. – С. 17, 20, табл. V:9, VII:14, С. 22, табл. VIII:8.

[11] Макаров Н. А. К оценке христианизации древнерусской деревни в X–XIII вв. (Погребения с крестиками и образками в могильниках Белозерья и Каргополья) // КСИА. – 1991. – Вып. 205. – С. 19.

[12] Ляўданскі А. М. Археалагічныя досьледы у Смаленшчыне. – С. 8, 9, 11, 14, 17, 19, 20, 22.

[13] Богомольников В. В. Радимичи. – С. 37–38; Седов В. В. Распространение христианства в Древней Руси // КСИА. – 1993. – Вып. 208. – С. 8.

Так, падвескі ў выглядзе канькоў знойдзены ў курганах каля вёсак Улазавічы, Сукромля, Ціманава, Куляшоўка-1. У кургане каля в. Улазавічы таксама знойдзена касцяная падвеска ў выглядзе качкі. Клыкі мядзведзя знойдзены ў курганах каля вёсак Улазавічы, Сукромля, Крастовая. Касцяныя лыжачкі знойдзены ва Улазавічах і Сукромлі, падвескі ў выглядзе грабяшкоў – ва Улазавічах. Даволі часта сустракаюцца ў курганах радзімічаў і вочкавыя пацеркі, якія ў многіх культурах звычайна насілі, каб адхіліць «дурное вока» і нейтралізаваць яго уплыў. Вочкавыя пацеркі ўяўляліся вачыма, якія маглі бачыць ва ўсіх кірунках і такім чынам былі своеасаблівым ахоўным элементам ад сурокаў. Такія вочкавыя пацеркі ў цікавым для нас рэгіёне знойдзены ў курганных могільніках каля вёсак Улазавічы, Дубейкава. Туровічы, Баравіна, Чавусы, Антонаўка, Батураўка, Бацвінаўка, Казарычы[14].

У XII ст. адбываюцца далейшыя змены ў пахавальным абрадзе, якія сведчаць пра далейшае распаўсюджванне хрысціянства. У гэты час з'яўляюцца пахаванні ў падкурганных ямах. Гэта новы, пераходны тып пахавання ад пахаванняў у кургане да грунтовага могільніка. У гэтых пахаваннях прасочваецца ўсё больш хрысціянскіх элементаў. Нябожчыкі звычайна ляжаць без інвентара, тут адсутнічаюць сляды ачышчальнага агню, знікае звычай ставіць гліняны посуд каля ног альбо галавы нябожчыка.

Падобныя пахаванні ў асноўным сустракаюцца ў наваколлях гарадоў, цэнтраў распаўсюджвання хрысціянства – каля Прупоя на воз. Узмутным, недалёка ад Мсціслава каля в. Мазыкі, у наваколлях Рослаўля.

На Пасожжы даволі часта сустракаюцца парныя пахаванні. Падобнае пахаванне вядома ў курганным могільніку каля в. Карма-Пайкі сучаснага Краснапольскага раёна. Тут у 1888 г. у кургане № 18 было знойдзена парнае пахаванне ў падкурганнай яме. Пахаванні былі аддзелены адно ад другога паласою мацерыка шырынёю 1,3 аршына (95 см) і абодва былі арыентаваны галовамі на захад. Паўночная магіла мела памеры 213 × 71 см, а паўднёвая – 196 × 53 см. У паўночнай магіле быў пахаваны мужчына без пахавальнага інвентару, а ў паўднёвай – жанчына. Нябожчыца мела багаты пахавальны інвентар – драцяныя скроневыя кольцы, срэбраныя вітыя пярсцёнкі, віты бранзалет са срэбра, шкляныя, паставыя і бурштынавыя каралі[15].

Парнае пахаванне было знойдзена і ў 1892 г. у курганным могільніку каля в. Сідараўка сучаснага Краснапольскага раёна. У кургане № 28 было знойдзена мужчынскае і жаночае пахаванне, якія ляжалі галавамі ў супрацьлеглыя бакі. Жанчына была пахавана на дошцы, галавой на паўночны захад. Каля нябожчыцы былі знойдзены завушніцы з падвескамі ў выглядзе рыбак, каралі, пласцінка ў выглядзе «паўзоркі», фрагмент пярсцёнка. Мужчынскае пахаванне было безінвентарным[16].

---

[14] Богомольников В. В. Радимичи. – С. 78; Мошеева О. Н. Глазчатые бусы // РА. – 2008. – № 4. – С. 24.

[15] Романов Е. Р. Раскопки в Могилевской губернии в 1888 году // Древности. Труды Императорского Московского археологического общества. – М., 1889. – Т. XIII, вып. 1. – С. 141–143.

[16] Фурсов М. В. Дневник курганных раскопок. – С. 16.

Парнае пахаванне было знойдзена і каля в. Клясін Краснапольскага раёна. У кургане былі пахаваны мужчына і жанчына. Нябожчыкі ляжалі галовамі на паўднёвы ўсход. Пахавальны інвентар каля жанчыны прадстаўлены срэбранымі скроневымі драцянымі кольцамі і каралямі. Каля мужчыны быў знойдзены нож[17].

Ва ўсіх парных пахаваннях выразна прасочваецца тэндэнцыя сумеснага пахавання мужчыны і жанчыны. Прычым пахаванні ў падкурганных ямах адносяцца да XII–XIII стст. Цяжка з упэўненасцю сцвярджаць, якую сэнсавую нагрузку нясуць падобныя пахаванні. Магчыма, гэта сямейныя пахаванні, якія падкрэсліваюць цёплыя ўзаемаадносіны ў сям'і, таму памерлых мужа і жонку хавалі ў адной магіле, каб не разлучаць іх і пасля смерці. Падобныя пахаванні былі шырока распаўсюджаны і на іншых усходнеславянскіх землях[18].

Такім чынам, аналіз археалагічнага матэрыяла паказвае, што на працягу XI – пачатку XIII ст. на Пасожжы паступова ішло распаўсюджванне хрысціянства, аднак паганства яшчэ доўгі час упэўнена тут трымалася. І толькі са знікненнем абраду пахавання пад курганамі, які сам па сабе з'яўляецца перажыткам паганства, можна сцвярджаць пра перамогу хрысціянства. Фактычна, археалагічны матэрыял Пасожжа пацвярджае выснову Б. А. Рыбакова, што «русская деревня стала христианизироваться только после татарского нашествия»[19].

Да пачатку XII ст. адносяцца першыя пісьмовыя крыніцы, якія даюць нам уяўленне пра тэмпы хрысціянізацыі насельніцтва ў Смаленскім княстве ў цэлым і ў прыватнасці на Пасожскіх землях.

У 1136 г. Смаленскае княства было выведзена з-пад юрысдыкцыі пераяслаўскага епіскапа, і ў Смаленску была арганізавана самастойная епархія. Яна падпарадкоўвалася кіеўскаму мітрапаліту, а главой царквы быў патрыярх у Канстанцінопалі.

З нагоды арганізацыі епіскапіі смаленскі князь Расціслаў Мсціславіч надаў ёй пэўныя ўладанні і дзясятую частку (дзесяціну) са сваіх даходаў, якія знайшлі адлюстраванне ў Статуце 1136 г. З гэтага года і да пачатку XVI ст. землі Верхняга і часткова Сярэдняга Пасожжа знаходзіліся пад юрысдыкцыяй Смаленскай епіскапіі. На поўдзень жа ад Сожа і Іпуці, верагодна, знаходзіліся воласці, якія ў царкоўным плане падпарадкоўваліся Кіеўскай епіскапіі. На такую

---

[17] Дневник курганных раскопок... – С. 12, 13.

[18] Макаров Н. На могильном ложе. Существовала ли в Древней Руси настоящая любовь // Родина. – 2002. – № 11–12. – С. 118–122; Марзалюк І. А. Людзі даўняй Беларусі: этнаканфесійныя і сацыякультурныя стэрэатыпы (X–XVII стст.). – Магілёў: МДУ ім. А. А. Куляшова, 2003. – С. 262; Зверуго Я. Г. Верхнее Понемонье в IX–XIII вв. – Минск: Навука і тэхніка, 1998. – С. 102; Лысенко П. Ф. Дреговичи. – Минск: Навука і тэхніка, 1991. – С. 30–31; Штыхаў Г. В. Крывічы. Па матэрыялах раскопак курганоў у Паўночнай Беларусі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – С. 134, 137, 168.

[19] Рыбаков Б. А. О двух культурах русского феодализма // Ленинские идеи в изучении истории первобытного общества, рабовладения и феодализма. – М.: Наука, 1970. – С. 31.

думку наводзіць «Спіс рускіх гарадоў далёкіх і блізкіх» канца XIV – пачатку XV ст., у якім Папова Гара, Дрокаў і Прапошаск адносіліся да кіеўскіх гарадоў[20].

На тэрыторыі Пасожжа і прылеглых да яго землях у Статуце Расціслава Мсціславіча 1136 г. згадваюцца воласці Крэчут, Прупой, Мірацічы, Басея, Заруб, Копысь, з якіх на карысць смаленскай епіскапіі князь дабрахвотна аддаваў па адной (Крэчут, Мірацічы і Прупой), паўтары (Басея) і тры грыўні даніны (Заруб). Сума даніны, якая выплочвалася Копыссю, у крыніцы не чытаецца. Акрамя таго, з корчмаў, што існавалі ў Прупоі, Копысі і Зарубе, на карысць епіскапіі таксама ішла дзесяціна[21]. Невысокая сума даніны, якую атрымліваў смаленскі епіскап з пасожскіх зямель, верагодна, адлюстроўвае слабасць княскай ўлады на толькі што далучаных землях і, як следства гэтага, слабасць хрысціянізацыі мясцовага насельніцтва.

У той жа час гэтыя апорныя цэнтры княскай адміністрацыі адначасова служылі і цэнтрамі распаўсюджвання хрысцыянства ў падпарадкаванай ім акрузе, своеасаблівымі цэнтрамі яшчэ вялікіх першапачатковых прыходаў – благачыній[22], ці пратапопій. У крыніцах XII–XV стст. амаль няма звестак пра штодзённую практыку кліра на ўзроўні прыхода, аднак трэба прызнаць, што гэта была перш за ўсё дзейнасць па распаўсюджванні хрысціянства сярод сельскага насельніцтва.

Другая палова XII ст. прыносіць новую крыніцу, якая сведчыць пра актыўнасць кліра ў распаўсюджванні хрысціянства. У першую чаргу гэты працэс ахапіў гарады. Яскравым сведчаннем гэтага з'яўляецца грамата «Аб пагароддзі і пачэсціі», складзеная ў другой палове XII – пачатку XIII ст. У ёй згадваюцца гарадскія цэнтры, у якіх праводзіў службу смаленскі епіскап і з якіх ён атрымліваў асаблівую даніну – «пагароддзе» і «пачэсціе» – за гонар епіскапскай службы. Сярод гарадскіх цэнтраў Пасожжа, дзе служыў епіскап, у другой палове XII ст. згадваюцца Мсціслаў і Рослаўль – даменіяльныя цэнтры смаленскіх князёў. Па суме «пагароддзя» і «пачэсція», якое выплачвалі Мсціслаў і Рослаўль, – адпаведна 387,5 і 250 грыўняў[23], сярод гарадскіх цэнтраў Смаленскай зямлі яны адпаведна займалі 2-е і 5-е месца. Размешчаная побач гандлёвая Копысь плаціла 360 грыўняў і па суме займала 3-е месца. Аднак з пяці гарадскіх цэнтраў, акрамя Смаленска, дзе служыў епіскап, на першым месцы стаялі Дарагабуж (112,5 грыўняў), Рослаў (100) і Мсціслаў (87,5). А гандлёвая Копысь плаціла найменшае «пачэсціе» (35 грыўняў).

Цэнтры княскай адміністрацыі даволі шчыльна пакрываюць ўсё Верхняе і Сярэдняе Пасожжа, і калі да іх дадаць яшчэ ў якасці цэнтраў хрысціянізацыі Красн, Радамлю, гарадзішча ў Горах і размешчаны на поўдні Смаленскага княства Зарой, то атрымліваецца, што ўся гэта паўднёва-заходняя тэрыторыя дзеліцца прыкладна на акругі з радыусам каля 20–25 км.

---

[20] Тихомиров М. И. «Список русских городов далеких и близких». – С. 218, 223.

[21] Древнерусские княжеские уставы... – С. 142, 143.

[22] Баравы Р. Храсцыянізацыя тэрыторыі Полацкай і Тураўскіх епархій X–XIV ст. (Гістарычна-геаграфічны аспект) // Беларускі гістарычны агляд – 2003. – Т. 10, сшытак 18–19. – С. 4–27.

[23] Алексеев Л. В. Смоленская земля в IX–XIII вв. – С. 157.

Безумоўна, з самага пачатку ўнутры гэтых вялікіх прыходаў – сучасных «благачыній» – існавалі і меншыя прыходы, цэнтры якіх неабходна шукаць на ўмацаваных і неўмацаваных феадальных сядзібах – гарадзішчах і селішчах. У якасці прыходскіх храмаў маглі выступаць не толькі спецыяльна пабудаваныя цэрквы, але і малельныя пакоі ў жылых будынках, а таксама маглі выкарыстоўвацца і абарончыя збудаванні – драўляныя вежы, што стаялі асобна ад лініі фартыфікацыі ў Мсціславе і, магчыма, у Горах. На сённяшні дзень на Сярэднім і Верхнім Пасожжы вядомы 40 гарадзішчаў і селішча каля г. Чавусы, на якім прасочваюцца сляды наяўнасці пануючых вярхоў і дзе павінны былі знаходзіцца храмы альбо, як мінімум, малельныя пакоі.

Распаўсюджванне хрысціянства перш за ўсё ішло з буйных гарадскіх цэнтраў Пасожжа – фарпостаў княжацкай і царкоўнай адміністрацыі. Аднак і тут насельніцтва, верагодна, яшчэ доўгі час падвяргалася дуалізму. Гэта добра прасочваецца на падставе археалагічных крыніц. Нават у Мсціславе знаходкі хрысціянскіх рэчаў ў слаях XII–XIII стст. адносна нешматлікія, а іх колькасць значна ўзрастае толькі ў XIV–XV стст.

У Мсціславе ў слаях XII–XIII стст. падчас археалагічных даследаванняў знойдзены крыжы-энкалпіёны, абразкі, лампадка, дыск ад бронзавага кадзіла[24]. У той жа час нельга выключыць, што частка насельніцтва Мсціслава працягвала захоўваць паганскія погляды. Сведкай гэтаму можа служыць знаходка на дзядзінцы касцяной рытуальнай сякеркі, якая, магчыма, выкарыстоўвалася падчас паганскіх абрадаў[25]. Сведкамі захавання паганскай традыцыі ў хрысціяназаваным горадзе з'яўляюцца і знаходкі ў Мсціславе яек-пісанак, якія былі звязаны з культам пладароддзя, былі сімвалам раства сонца і ўсёй прыроды. Яны выконвалі ролю абярэгаў, пра што сведчаць размешчаныя ў іх гліняныя шарыкі, якія гучалі, калі яйкі падтрэсвалі. Акрамя яек-пісанак, паганскім сімвалам, безумоўна, з'яўлялася гліняная фігурка качкі, якая таксама знойдзена ў Мсціславе[26].

Пра адначасовае існаванне паганства і пачатак распаўсюджвання хрысціянства ў Крычаве, верагодна, сведчыць і вядомае яшчэ ў XIX ст. паданне пра тое, што крычаўская царква Св. Міколы на замку была пабудавана на месцы паганскага капішча[27]. Калі новая крэпасць у Крычаве будавалася на Замкавай гары на мяжы XII–XIII стст. і, безумоўна, адначасова ў крэпасці будаваўся і хрысціянскі храм, то і апошнія часы існавання гэтага паганскага капішча бы-

---

[24] Алексеев Л. В. Мелкое художественное литье из некоторых западнорусских земель // СА. – 1974. – № 3. – С. 212–216; Яго ж. Проблемы становления культово-оборонного зодчества. – С. 221, рис. 4.

[25] Алексеев Л. В. Мстиславский детинец в XII–XIV веках. – С. 60–76, рис. 6:1.

[26] Макарова Т. И. Поливная посуда. Из истории керамического импорта и производства Древней Руси. Свод археологических источников Е 1–38. – М.: Наука, 1967. – С. 67, табл. 14:12, 18.

[27] Живописная Россия: отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении. Литовское и Белорусское. – Репринт. воспроиз. изд. 1882. – Т. 3. – Мінск: БелЭн, 1993. – С. 421.

лі яшчэ перад вачыма будаўнікоў новага замка, і гэта падзея адлюстравалася ў іх памяці і такім чынам дайшла да нас.

Акрамя гарадоў, найбольш раннія рэчы хрысціянскага культа сустракаюцца і на тых адкрытых паселішчах, на якіх прасочваюцца сляды наяўнасці прадстаўнікоў феадальнай знаці, што падкрэслівае ролю пануючай эліты ў замацаванні хрысціянства.

Сведкамі распаўсюджвання хрысціянства перш за ўсё з'яўляюцца рэшткі храмаў XII–XIII стст., знойдзеныя падчас археалагічных даследаванняў. Мураваныя храмы на Сярэднім Пасожжы існавалі ў гэты час у Рослаўлі і, магчыма, у Мсціславе.

У Рослаўлі развал плінфы і старажытнага раствора знойдзены падчас шурфоўкі на пасадзе, на тэрыторыі сучаснага гарадскога сквера. Мяркуючы па тыпе і памерах плінфы, час пабудовы мураванага храма адносіцца да першай трэці XIII ст. Акрамя таго, фрагменты плінфы знойдзены на дзядзінцы Рослаўля, што, магчыма, сведчыць пра існаванне мураванага храма і тут.

Верагодна, на дзядзінцы Мсціслава збіраліся пабудаваць мураваны храм у XII–XIII стст. Пра гэта гавораць фрагменты плінфы без слядоў рошчыны і пліткі падлогі, знойдзеныя падчас даследаванняў у заходняй частцы Замкавай гары[28].

Безумоўна, культавых пабудоў XII–XIII стст. было значна больш, але іх асноўная маса была зроблена з дрэва, якое дрэнна захоўваецца, таму знайсці рэшткі драўляных культавых пабудоў вельмі цяжка. Колькі было храмаў у Мсціславе XII–XIV стст., цяжка сказаць, бо звесткі адсутнічаюць. Аднак, безумоўна, храм быў на замку, і некалькі храмаў павінна было быць на Падоле і пасадах. Падобная ж карціна павінна была быць і ў Крычаве – храм на замку і адзін-два храмы на пасадах.

Падчас даследавання мсціслаўскага дзядзінца Л. В. Аляксеевым быў знойдзены могільнік першых жыхароў горада. Нябожчыкі былі пахаваныя ў трунах, ляжалі на спіне і былі арыентаваны галавой на паўднёвы захад. Рэчаў каля нябожчыкаў не было. Толькі аднойчы каля мацерыка быў знойдзены абразок-падвеска з выявай Багародзіцы, якая мае некаторыя аналогіі сярод кіеўскіх старажытнасцей і датуецца канцом XII ст.[29]

Адсутнасць інвентару ў пахаваннях канца XII ст. ужо яскрава сведчыць пра даволі глыбокае пранікненне хрысціянскіх каштоўнасцей у асяроддзе насельнікаў дзядзінца Мсціслава. Аднак, улічваючы існаванне, згодна з пісьмовымі крыніцамі XVI – пачатку XVII ст. тут Мікольскага манастыра, нельга выключыць існаванне манастыра з больш ранніх часоў і прыналежнасць знойдзенных пахаванняў канца XII ст. менавіта манахам гэтай абіцелі.

Акрамя таго, у гэтым жа месцы былі знойдзены рэшткі драўлянай царквы-часоўні, якая існавала тут у 30–50-я гады XIII ст. Ёй папярэднічалі пабудовы

---

[28] Воронин Н. Н. Зодчество Смоленска XII–XIII вв. – С. 345–346; Раппопорт П. А. Русская архитектура. – С. 93.

[29] Алексеев Л. В. Проблемы становления культово-оборонного зодчества. – С. 218–219.

(№ 1–2) і больш позняя (№ 4), якія, акрамя таго, што выконвалі абавязкі старажавой вежы, выкарыстоўваліся і ў якасці культавай пабудовы[30].

Культавыя рэчы, якія сведчаць пра распаўсюджванне хрысцыянства, выяўлены і на іншых помніках. На гарадзішчы каля в. Горы Горацкага раёна знойдзены каменны абразок з выявай крыжа. На бакавой паверхні абразка пракрэслены надпіс, які на падставе палеаграфічных асаблівасцей датуецца мяжой XII–XIII стст.[31] (мал. 76, 77). Пра пранікненне хрысціянства ў шырокія колы насельніцтва сведчыць фрагмент глінянага гаршка з пракрэсленым крыжом, знойдзены на феадальнай сядзібе XII–XIII стст. каля в. Шаўнева Горацкага раёна, і гаршчок з пракрэсленым крыжом, знойдзены ў курганным могільніку ва ўрочышчы Іспуды пад Крычавам[32]. Безумоўна, нанясенне сімвала крыжа на



Мал. 76. Абразок з гарадзішча каля в. Горы

[30] Алексеев Л. В. Проблемы становления культово-оборонного зодчества. – С. 231–232.

[31] Мяцельскі А. І прашчур прасіў пра тое ж. – С. 32–33.

[32] Приложения // Древности. Труды Императорского Московского археологического общества. – М., 1894. – Т. 15, вып. 2. – С. 142; Мяцельскі А. А. Шаўнеўскае гарадзішча. – С. 71, мал. 4:4.



Мал. 77. Прамалёўка абразка з гарадзішча каля в. Горы

сталовы посуд, якое магло мець і апатрапічнае значэнне, гаворыць пра прысвячэнне паўсядзённай культуры Богу[33]. На селішчы і ў кургане, які датуецца XI ст., курганнага могільніка каля г. Чавусы знойдзены два крыжыкі з закругленымі пашыранымі канцамі[34]. Да XII–XIII стст. адносіцца касцяны крыжык, знойдзены на Каўшараўскім гарадзішчы[35]. Крыжыкі знойдзены ў курганным могільніку каля в. Куляшоўка-1 Слаўгарадскага раёна, у курганным могільніку каля в. Бацвінаўка Крычаўскага раёна.

У той жа час нельга адназначна сцвярджаць, што пераход ад трупаспалення да пахавання па абрадзе інгумацыі бясспрэчна сведчыць пра завяршэнне хрысціянізацыі насельніцтва. Для славян на працягу XII–XIII стст. быў характэрны бірытуалізм, калі адначасова выкарыстоўваліся старыя – паганскія – традыцыі і пашыралі свой ўплыў новыя – хрысціянскія ў праваслаўным варыянце. Прычым гэты працэс не быў завершаны ў XIII ст., а захоўваўся ў сельскім асяроддзі яшчэ даволі доўга. І гэтаму ёсць дакументальныя пацверджанні.

Так, Мікола Гусоўскі, які быў выхадцам з усходніх раёнаў ВКЛ, яшчэ ў пачатку XVI ст. адзначаў, што для мясцовага насельніцтва было характэрна захаванне старых абрадаў і што яно ў пэўным сэнсе яшчэ было недастаткова хрысціяназаваным[36]. Ды і асобныя, пакуль яшчэ нешматлікія археалагічныя даныя таксама сведчаць пра захаванне перажыткаў паганства нават у гарадах у эпоху Новага часу.

Так, у Крычаве падчас даследаванняў могільніка XVI – пачатку XVI ст. у нагах аднаго з нябожчыкаў быў знойдзены вісячы замок трохкутнай формы і ключ ад яго[37]. Верагодна, факт знаходжання замка і ключа ў нагах нябожчыка адлюстроўвае «замыканне» нябожчыка на тым свеце, што павінна было забяспечыць спакой для жывых. Больш за тое, пакіданне разам з замком пры нябожчыку і ключа сведчыць пра жаданне надзейна абараніць сябе ад гэтага ча-

[33] Мусин А. Е. Milites Christi Древней Руси. Воинская культура русского средневековья в контексте религиозного менталитета. – СПб.: Изд-во Петербургское Востоковедение, 2005. – С. 301.

[34] Рыер Я. Р. Вясковае паселішча ў г. Чавусы. – С. 220, мал. 7:20.

[35] Лявданский А. Н. Некоторые данные о городищах Смоленской губернии. – С. 228, табл. XI:10

[36] Гусоўскі М. Песня пра зубра. – Мінск: Полымя, 2007. – С. 26–27.

[37] Мяцельскі А. А. Старадаўні Крычаў. – С. 24, мал. 28:8, с. 54.

лавека, каб нават не было магчымасці «адамкнуць» яго і такім чынам даць яму магчымасць вярнуцца на гэты свет. Безумоўна, такая традыцыя «замыкання» нябожчыкаў ідзе з паганскіх часоў і, магчыма, у дадзеным выпадку, фіксуе пахаванне нейкага незвычайнага «ведзьмака» з жыхароў Крычава. Замкі як рэчы, якімі «закрываюць» магілу, сустракаюцца ў курганным могільніку старажытнага Плёсу[38].

Тым не менш праваслаўе на тэрыторыі Мсціслаўскага княства і ўсяго Пасожжа заставалася галоўным варыянтам, у якім распаўсюджвалася хрысціянства і заставалася такім і пасля ўваходу гэтых зямель у склад Вялікага Княства Літоўскага.

7.2. Развіццё праваслаўнай царквы на тэрыторыі Мсціслаўскага княства і ваяводства ў XIV–XVI стст.

Пасля ўваходу Пасожскіх зямель у склад ВКЛ першапачаткова канфесійная палітыка пануючых колаў ВКЛ была накіравана на нейтральныя адносіны да канфесійнай сітуацыі, што гістарычна склалася тут. Улічваючы, што на большасці тагачаснай тэрыторыі ВКЛ праваслаўе было пануючай формай хрысціянства, то дзяржава адносна яго праводзіла нейтральную палітыку, а пры неабходнасці і падтрымлівала. Хаця большасць тагачасных вялікіх князёў літоўскіх заставаліся ў паганстве альбо прымалі хрысціянства, улічваючы палітычную патрэбу гэтага ў канкрэтны момант, тым не менш, як і раней, праваслаўныя землі ВКЛ заставаліся сферай ўплыву канстанцінопальскага патрыярха. І такая традыцыя – прызнанне главой праваслаўнай царквы ВКЛ і падпарадкаванне канстанцінопальскаму патрыярху – працягвалася да чэрвеня 1686 г., калі кіеўская мітраполія Канстанцінопальскага патрыярхата перайшла пад уладу Маскоўскага патрыярха.

Аднак пасля афіцыйнага хрышчэння Літвы па каталіцкім абрадзе і замацавання сталых адносін з каталіцкай Польшчай у Вільні пачалі распаўсюджвацца ідэі царкоўнай уніі паміж Рымам і Канстанцінопалем. Гэта разглядалася ў русле стварэння аднаканфесійнай дзяржавы, і першым крокам на гэтым шляху быў перавод праваслаўных у падпарадкаванне папе рымскаму.

Першыя крокі па рэалізацыі ідэі ўніі былі прадпрынятыя ўжо ў 1396 г. мітрапалітам Кіпрыянам, а потым гэту палітыку актыўна падтрымліваў і яго пераемнік мітрапаліт Рыгор Цамблак. Асабліва гэты працэс паскорыўся пасля прыняцця Гарадзельскіх прывілеяў 1413 г., у якіх было запісана, што кіруючыя пасады ў дзяржаве мелі права займаць выключна каталікі. Гэта не магло не выклікаць пачатку пераходу раней праваслаўных магнатаў ВКЛ у каталіцтва.

Ужо ў лютым 1418 г. святочнае пасольства ВКЛ на чале з епіскапамі, рускімі князямі, прадстаўнікамі буйных гарадоў з усходу і паўднёвага захаду ВКЛ – Галіча, Кіева, Луцка, Віцебска, Смаленка, Полацка – прыняло ўдзел у працы Канстанцкага сабору, дзе выступала з ідэяй паскарэння рэалізацыі планаў уніі.

---

[38] Травкин П. Н. Язычество древнерусской провинции. – С. 200.

Невядома, як да гэтай ідэі адносіўся просты люд таго часу і ці былі на гэтым саборы прадстаўнікі з Пасожжа, аднак на наступны Базельскі сабор (1431–1449 гг.), які зноў разглядаў пытанні царкоўнай уніі, у 1433 г. быў напраўлены ліст вялікага князя Свідрыгайлы з падтрымкай ідэі царкоўнай уніі, які падпісаў і сын мсціслаўскага князя Сямёна-Лынгвена Яраслаў Лынгвеневіч[39]. Так што, верагодна, падвіжкі ў магчымай змене канфесійнай прыналежнасці магнатэрыі ВКЛ бліжэй да сярэдзіны XV ст. закранулі і мсціслаўскіх князёў. Тым не менш, Мсціслаў з'яўляўся даволі значным цэнтрам праваслаўя, пра што сведчыць прыезд сюды ў 1421 г. кіеўскага мітрапаліта Фоція: «...и во Мстиславли был у князя Семена Лынквеня»[40].

Мсціслаўскія князі з роду Лынгвеневічаў і надалей заставаліся праваслаўнымі, чаму спрыяў і той факт, што яны амаль няспынна былі служылымі князямі ў Вялікім Ноўгарадзе, а адным з патрабаванняў наўгародцаў падчас абрання служылага князя была яго канфесійная прыналежнасць праваслаўнай царкве.

Ідэя царкоўнай уніі была зацверджана на Фларэнційскім саборы 1439 г., аднак яна не была прызнана Масквой і, хаця яшчэ актыўна падтрымліваліся ў ВКЛ у 40-я гады XV ст., аднак потым з-за супрацьдзеяння каталіцкага духавенства і, у першую чаргу, віленскага біскупа, паступова забылася на пэўны час.

У другой палове XV ст. адбыліся значныя перамены і ў царкоўнай арганізацыі раней адзінай Кіеўскай мітраполіі. У выніку барацьбы паміж Вільняй і Масквой раней адзіная Кіеўская мітраполія была расколата на дзве незалежныя правінцыі – Кіеўскую і Маскоўскую. Аднак у астатнім царкоўнае жыццё Верхняга і Сярэдняга Пасожжа характарызавалася далейшым распаўсюджваннем хрысціянства.

У XV ст. крыніцы прыносяць нам першыя пісьмовыя звесткі пра існаваўшыя на Сярэднім Пасожжы царквы. Апошняе перш за ўсё адносіцца да гарадоў – Мсціслава і Крычава.

З пісьмовых крыніц XV–XVII стст. вядома, што на замку Мсціслава ўвесь час знаходзіўся Мікольскі храм і невялікі манастыр пры ім, які сціпла згадваецца ў крыніцах XV – першай паловы XVII ст.[41] І гэта было не выпадкова, бо Св. Мікалай лічыўся абаронцам Вялікага Княства Літоўскага[42], і таму цэрквы ў яго гонар у ВКЛ звычайна ставіліся менавіта на замках. У першай палове XV ст. у горадзе ўжо існаваў храм Уваскрасення Гасподня, на які пры князі Юрыі Лынгвеневічу была нададзена «земля пашная сялка Резанец», а потым яго сын Іван надаў бортныя і пашныя землі каля Пустынскага манастыра пры

---

[39] Галенчанка Г. Я. Царква і канфесіі // Гісторыя Беларусі: у 6 т. – Т. 2. – Мінск: Экаперспектыва, 2008. – С. 240–245.

[40] ПСРЛ. – Т. 35. – С. 33, 56, 78.

[41] АЗР. – Т. 2. – С. 226–227; Материалы по истории Могилевской епархии // МЕВ. – 1890. – № 20–21. – Часть неофициальная. – С. 200.

[42] Kempa T. Mikołaj Krzysztof Radziwiłł Sierotka. – S. 25.

сяле Смаленікі. Гэтыя наданні былі пацверджаны і каралём Жыгімонтам Вазай ў 1596 г.[43]

Галоўным гарадскім храмам Мсціслава – саборным – была Траецкая царква. Яна была ўфундавана князем Іванам Юр'евічам і яго жонкай княгінею Ульянай у 1463 г.[44] Па звестках, на той час у царкве было 7 алтароў: галоўны і шэсць меншых – у гонар Уваскрасення Гасподня, Благавешчання Прачыстай Дзевы, Успення Прасвятой Багародзіцы, Усекнавення галавы Іаана Святога, Святых Іспаведнікаў і Святых Кіпрыяна і Усцінні[45].

У пачатку XVI ст. Траецкі сабор быў спалены маскоўскімі войскамі, і князь Міхаіл Іванавіч вымушаны быў не толькі яго аднавіць, але і пабудаваў у ім два новыя прытворы – Св. Арцемія і Св. пакутніцы Васілісы[46].

Князь Іван Юр'евіч рабіў фундуш і на мсціслаўскую царкву Успення Прачыстай Багародзіцы, што сведчыць пра яе існаванне ў сярэдзіне – другой палове XV ст.[47] Царква стаяла на Замкавай гары, таксама выконваючы функцыю абаронцы горада. Вялікі зямельны фундуш «грунта Валюжынічоўскага» на яе зрабіў князь Міхаіл Іванавіч мсціслаўскі, які надаў ёй землі на поўдзень ад Мсціслава, абмежаваны Шчамялёўскім логам, р. Лешчанка, Пацатуковым балотам і дарогай на в. Кудрычы. Гэтыя землі належалі ёй і ў пачатку XVIII ст.[48]

Крыніцы згадваюць і іншыя мсціслаўскія цэрквы. Так, у пачатку XVI ст. (1511 г.) у горадзе згадваецца Спаская царква. Да часоў гаспадарання князя Міхаіла Іванавіча адносіцца існаванне ў горадзе царквы Святога Афанасія[49]. У сярэдзіне XVI ст. (1565 г.) «на месте Мстиславском за острогом» згадваецца царква «святого Остафья», якая таксама існавала яшчэ пры князю Міхаіле Іванавічу[50]. У 1536 г. згадваецца мсціслаўская царква Св. Георгія, якая стаяла на вуліцы, што вяла ў бок Магілёва[51]. У 1589 г. у горадзе згадваецца Барысаглебскі храм[52]. Звычайна такія храмы размяшчаліся ў княскіх рэзідэнцыях. Аднак дзе ён быў, з крыніцы не зразумела, і больш гэты храм у горадзе ніколі не згадваецца. Магчыма, ён загінуў падчас ваенных падзей першай паловы – сярэдзіны XVII ст. і потым не адрадзіўся. У той жа час, магчыма, гэта былі толькі прытворы Барыса і Глеба Уваскрасенскай царквы, зыходзячы з таго, што там быў адзін і той жа святар.

---

[43] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 83. – Арк. 1 адв.–2.

[44] АЗР. – Т. 1. – С. 79–80.

[45] АСДОИСЗР. – Т. 2. – С. 3.

[46] Тамсама. – С. 11–12.

[47] Материалы по истории Могилевской епархии // МЕВ. – 1890. – № 20–21. – С. 209; НГАБ. – Ф. 1729. – Адз. зах. 25. – Арк. 621а адв.–622 адв.

[48] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 161. – Арк. 33 адв.

[49] АЗР. – Т. 3. – С. 97.

[50] АЮЗР. – Т. 1. – С. 154; АЗР. – Т. 3. – С. 97.

[51] Грали И. Литва и Русь в 1534–1536 гг. – С. 75.

[52] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 77. – Арк. 30–31.

Мал. 78. Крычаў. Энкалпіён

На гарадскім Падоле ўжо ў XVI ст. былі цэрквы Св. Параскевы Пятніцы і Св. Іллі[53]. На гарадскім рынку стаяў другі мсціслаўскі храм, пабудаваны ў гонар Св. Міколы[54]. Такім чынам, пісьмовыя крыніцы бясспрэчна сведчаць пра існаванне ў горадзе напрыканцы XVI ст. як мінімум 10 праваслаўных храмаў і манастыра, што сведчыць пра значнасць Мсціслава як хрысцыянскага цэнтра.

Першыя бясспрэчныя сведчанні хрысціянізацыі насельніцтва Крычава адносяцца толькі да XIV–XV стст. У культурным слоі дзядзінца разам з керамікай XV ст. і гаршковападобнай кафляй з квадрыфольным вусцем быў знойдзены крыж-энкалпіён (мал. 78). Ён мае памеры 6,5 × 5,5 см і, верагодна, з'яўляецца паўторнай адліўкай ў глінянай форме, адціснутай з гатовага крыжа. Пра гэта сведчыць той факт, што выявы святых і распяцце на вонкавой паверхні недастаткова выразныя. Адваротны бок крыжа моцна пашкоджаны карозіяй, таму ідэнтыфікаваць яе немагчыма. Па сваёй форме і сюжэту вонкавой паверхні крычаўскі крыж-энкалпіён вельмі падобны на крыжы з надпісамі, шырока распаўсюджаныяі з 40-х гадоў XIII ст.[55]

Другім артэфактам, які пацвярджае факт распаўсюджання хрысціянства сярод жыхароў Крычава, з'яўляецца фрагмент меднага двухбаковага крыжа з абламанымі верхняй і ніжняй часткамі (мал. 79). На пярэдняй частцы крыжа, у сярэдзіне, – распяцце Хрыста, па баках – выявы Маці Боскай з надпісам (Мр), Іаана Багаслова (Iwa) і, магчыма, Марыі Магдалены і Логіна-сотніка. На адваротным баку ў сярэдзіне – прарок Ілля, а на канцах – па два святых з неразборлівымі надпісамі. Крычаўскі крыж вельмі падобны на крыж, апублікаваны Б. І. і В. І. Ханенка, і на энкалпіён з Княжай гары[56]. М. А. Ткачоў стратыграфічна датаваў крыж XII–XIII стст., але В. Р. Пуцко лічыць, што крыж, мяркуючы па стылістыцы выканання, датуецца XIV–XV стст.

---

[53] ИЮМ. – Вып. 24. – С. 448, 451; НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 77. – Арк. 337 адв.–338.

[54] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 85. – Арк. 176–176 адв.

[55] Алексеев Л. В. Мелкое художественное литье из некоторых западнорусских земель. – С. 212, рис. 2:4,5.

[56] Ханенко Б. И., Ханенко В. И. Древности русские. Кресты и образки. – Киев, 1899. – Вып. 1. – Табл. XII, 140.; Древняя Русь. Быт и культура. / Д. А. Беленькая [и др.]. – М.: Наука, 1997. – С. 350, табл. 104:19.

Першы храм горада, безумоўна, быў пабудаваны на замку і, хутчэй за ўсё, ён быў асвечаны ў гонар Св. Міколы. На карысць гэтага гаворыць тое, што храм у гонар гэтага святога згадваецца на крычаўскім замку ў XVI–XVIII стст. і функцыянуе на Замкавай гары Крычава да сённяшняга дня. Да канца XV – пачатку XVI ст. адносіцца першае згадванне крычаўскіх храмаў на старонках пісьмовых крыніц.

На сённяшні дзень агульнапрынята думка, што найбольш ранняй крычаўскай царквой з'яўляецца Іллінская. Згодна з паданнем яе будаўніцтва звязана з цудоўным выратаваннем ад тапельства вялікай княгіні Алены. Гэта адбылося на дзень Св. Іллі і таму вялікі князь Казімір Ягелончык загадаў пабудаваць па берагах розных рэк у Вялікім Княстве Літоўскім шэсць цэрваў у гонар Св. Іллі. Адзін такі храм узвялі ў Крычаве. Традыцыйна гэту падзею адносяць да 1447 г.[57]

Мал. 79. Крычаў. Нацельны крыж. Від з абодвух бакоў

Аднак у гэта паданне ўкраліся храналагічная і гістарычная памылкі. Вялікая княгіня Алена Іванаўна была жонкай вялікага князя Аляксандра (1495–1506 гг.), а не Казіміра Ягелончыка. Таму і Іллінская цэрква Крычава была пабудавана не раней за гэтыя гады. Як выглядала царква ў той час, невядома. Пра яе выгляд у сярэдзіне XIX ст. мы ведаем толькі дзякуючы акварэлі Д. М. Струкава (мал. 80).

Мал. 80. Выява крычаўскай царквы Св. Іллі на акварэлі Д. М. Струкава сярэдзіны XIX ст.

Іллінская царква Крычава ўвесь час атрымлівала падтрымку з боку крычаўскіх дзяржаўцаў. У сярэдзіне XVI ст. Канстанцін Шалуха, дзяржаўца Крычаўскі і Лучыцкі, надаў святарам гэтай царквы бортныя землі, названыя «Окуловщизна» і «Козаковщизна». Таксама ім былі падараваны Іллінскай царкве два перавозы праз Сож; адзін размяшчаўся непасрэдна каля царквы і выводзіў на дарогу ў бок Рослаўля, а другі знаходзіўся на Забялышчынскім па-

[57] АСДОИСЗР. – Т. 2. – С. II.

садзе горада і выводзіў на Лучыцкую дарогу. Акрамя таго, ад яго ж Іллінская царква атрымала сенажаці і месцы для рыбнай лоўлі.

І ў далейшым вялікія князі і крычаўскія дзяржаўцы таксама час ад часу давалі Іллінскай царкве розныя наданні. Так, у 1569 г. Стэфан Баторый надаў царкве «отчыну» Карабановскую, два возеры і пацвердзіў правы на перавозы. Усё гэта было пацверджана каралём і вялікім князем Жыгімонтам Вазам у 1628 г.[58]

Найбольш ранняя вядомая з пісьмовых крыніц крычаўская царква – Спаская. Яна згадваецца ў крыніцах XVI–XVIII стст. на Забялышчынскім пасадзе горада. Аднак у прывілеі, дадзеным 6 лютага 1587 г. Раману Стратановічу, гаворыцца, што крычаўская царква Св. Спаса была пабудавана дзякуючы кіеўскаму мітрапаліту Ісідору[59]. Мітрапаліт кіеўскі і ўсяе Русі Ісідор вядомы ў сярэдзіне XV ст. (1437–1441 гг.) і знаходзіўся ў ВКЛ толькі на працягу шасці месяцаў, са жніўня 1440 г.[60] Таму і дату ўзвядзення Спаскай царквы ў Крычаве можна абмежаваць жніўнем 1440 – лютым 1441 г.

Пасля гэтага інфармацыя пра Спаскую царкву на доўгі час знікае. Толькі ў сярэдзіне 60-х гадоў XVI ст. у Крычаве згадваецца «спаскі поп Сиваконъ Длатовичъ»[61]. Потым царква згадваецца з лютага 1576 г., калі згодна з прывілеем караля Стэфана Баторыя ў ёй служыў Раман Стратановіч. Тады ж ён атрымаў пацвярджэнне на зямлю пры сяле Міхеевічы, якая здаўна належала царкве Св. Спаса, і на царкоўны пляц у горадзе[62]. Акрамя таго, прывілеем ад 6 лютага 1587 г. кароль Стэфан Баторый надаў пацвярджэнне на царкоўную пустаўшчыну Ляскоўшчыну пры сяле Міхеевічах і надаў на Спаскую царкву склад воску кожны год на свята Св. Спаса 12 пудоў мёду[63].

Наяўнасць на процілеглых канцах Крычава канца XV – пачатку XVI ст. – на Забялышчыне і каля Гарадца – дзвюх цэркваў дазваляе сцвярджаць, што існавалі храмы і ў цэнтральнай частцы горада. Як мінімум, у гэты час была царква на дзядзінцы – Замкавай гары і 2–3 царквы на пасадзе, размешчаным паміж Забялышчынскім ручаём і Крычаўцам. Верагодна, у пачатку XVI ст. у горадзе было не менеў за 5–6 цэркваў.

У сярэдзіне 60-х гадоў XVI ст. у Крычаве, у яго цэнтральнай частцы згадваецца царква Св. Юрыя, выява якой вядома таксама толькі дзякуючы акварэлі Д. М. Струкава (мал. 81). Захаваўся ліст вялікага князя да крычаўскага дзяржаўцы А. Б. Шалухі пра выдзяленне «на выхованне» папу царквы Св. Юрыя ў Крычаве Саве Кандратовічу 2 валок зямлі. Сава Кандратовіч адначасова служыў у двух крычаўскіх храмах – Юр'еўскім і Іллінскім[64]. Іллінскую царкву С. Кандратовіч, верагодна, атрымаў у 1568 г.

---

[58] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1928. – Арк. 14.

[59] Тамсама. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 72. – Арк. 15–16.

[60] Галенчанка Г. Я. Ісідор // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Т. 3. – С. 504–505.

[61] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 37. – Арк. 524 адв.–525.

[62] Тамсама. – Адз. зах. 74. – Арк. 56 адв.–57.

[63] Тамсама. – Адз. зах. 72. – Арк. 15–16.

[64] Тамсама. – Адз. зах. 37. – Арк. 524 адв–525.

Ва ўсякім выпадку, 10 лістапада 1568 г. вялікі князь Жыгімонт Аўгуст пагадзіўся даць па просьбе крычаўскага дзяржаўцы К. А. Шалухі нейкаму крычаўскаму папу Саве Іллінскую царкву, якая «в пусте стоит». У пачатку 1587 г. С. Кандратовіч звярнуўся да вялікага князя Стэфана Баторыя з лістом, у якім паведамляў, што з-за старасці не можа больш служыць службу і таму прасіў, каб вялікі князь аддаў тыя цэрквы яго сыну Нікіфару. Стэфан Баторый задаволіў просьбу Савы Кандратовіча і аддаў абедзве царквы Нікіфару Кандратовічу «до живота, со всими кгрунтами»[65].

Мал. 81. Выява крычаўскай царквы Св. Юрыя на акварэлі Д. М. Струкава сярэдзіны XIX ст.

У другой палове XVI ст. у горадзе ўжо была і царква Св. Пакутніцы Пятніцы, на якую даніны давалі крычаўскія дзяржаўцы Мікалай Служка і Багдан Саламярэцкі[66]. У гэты ж час існавала і царква Раства Хрыстова, на якую ў 1566 г. давалі фундуш Дзядзеркі-Тураўскія. Святаром ў ёй на той час служыў Васіль Сямёнавіч Цітовіч[67].

Такім чынам, напрыканцы XVI ст. у горадзе ўжо існавалі храмы Св. Міколы, Св. Юрыя, Св. Іллі, Св. Спаса, Раства Хрыстова, Св. Параскевы Пятніцы. Усе гэтыя храмы вядомы ў горадзе і ў XVII–XVIII стст. Апошняе дазваляе сцвярджаць, што царкоўная арганізацыя горада да канца XVI ст. ужо склалася.

У траўні 1577 г. кароль Жыгімонт Ваза надаў крычаўскім мяшчанам права на «две склади мёду» па дзесяць пудоў у год. Адну «складь» дазвалялася «разсыціць» на Раство Хрыстова, а другую – на свята Св. Міхаіла. Грошы, атрыманыя ад продажу «разсычанага» мёду, павінны былі ісці на аздабленне крычаўскіх цэркваў, воск з мёду – на царкоўныя патрэбы[68]. Гэтыя ж правы былі пацверджаны каралём Жыгімонтам Вазам у 1588 і ў 1592 гг.[69] Мсціслаў як ваяводскі цэнтр меў права (1579 г.) на «тры склади мёду» па дзесяць пудоў: на свята Св. Троіцы і на вясенняга і восеньскага Міколу[70]. Спробы ж некаторых дзяржаўцаў (І. В. Палубенскага) абмежаваць наданні мсціслаўскага князя Міхаіла Іванавіча мсціслаўскага царквам і манастырам рашуча прыпыняліся (1558 г.) вялікім князем[71].

---

[65] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 72. – Арк. 24.
[66] Тамсама. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1928. – Арк. 15.
[67] ИЮМ. – Вып. 28. – С. 123–126.
[68] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 74. – Арк. 277 адв.
[69] АЗР. – Т. 4. – С. 56–57.
[70] Тамсама. – Т. 3. – С. 240.
[71] Тамсама. – Т. 3. – С. 97.

Безумоўна, храмы існавалі і ў іншых гарадскіх цэнтрах Мсціслаўскага княства XV ст. – Мгліне, Дрокаве, Паповай Гаре, Радамлі, і ў цэнтрах валасцей Прыкладнях, Салаўянічах, Хіславічах, аднак пісьмовыя крыніцы пра іх адсутнічаюць.

Толькі адносна Радамлі ёсць паведамленне 1499 г. пра існаванне тут царквы Св. Прачыстай Багародзіцы, якая была заснавана яшчэ пры мсціслаўскім князі Юрыі Лынгвеневічы[72]. На Данілаўскім пагосце (в. Данілаўка Мсціслаўскага р-на) у 1461 г. быў Мікольскі храм, наданні якому зрабіла княгіня Ульяна, жонка князя Івана Юр'евіча[73].

Адначасова з актыўным рэлігійным жыццём у гарадскіх цэнтрах хрысціянства актыўна пранікае і у сельскія раёны. Цэнтрамі сельскіх прыходаў, безумоўна, як і ў XII–XIII стст. з'яўляліся княжацкія двары-дварцы, што згадваюцца ў крыніцах першай паловы XV ст. – «Какотава», «Чепялёва», «Красное», «Расна», «Добрае», «Людагошъ», «Параднино», «Селище», «Будогошь», «Михайловское» і «Колодязи»[74], і сёлы. Тэрмін «сяло», згодна з крыніцамі больш позняга часу, звычайна адносіцца да населенага пункта, у якім быў храм, таму нельга выключаць, што гэта традыцыя вядзе пачатак з больш ранніх часоў.

Да часоў Лынгвена адносіца згадванне «Старога села»[75]. Князь Юрый Лынгвеневіч у свой час зрабіў фундуш на царкву Св. Георгія ў в. Селішча[76]. Не пазней за 1440–1443 гг. датуецца наданне сяла Краснага Еску Міковічу, у якім у 1474 г. ужо існавала царква Узнясення Гасподня[77]. У 40-х гадах XV ст. згадваецца сяло «Колодязі», у якім з часоў Юрыя Лынвеневіча была царква Св. Мікалая[78]. Да гэтага ж часу адносіцца згадванне сёл Дарлівае, Цімошкава, «Бычане», «Тупищина», Заселье, «Головчино», «Колесниково»[79], у якіх, верагодна, таксама існавалі храмы. Храм Вялікамучаніка Фёдара Цірона ў пачатку XVI ст. (1508 г.) быў і ў Расне[80]. У сярэдзіне XVI ст. (1551 г.) ужо існавала царква ў в. Вярба (суч. Дрыбінскі р-н)[81], у 1563 г. пачынаецца будаўніцтва царквы Св. Яўхіма і Алены ў в. Міхайлаўскае (былым двары Міхайлаўскім), на якую ішлі даходы з в. Лызы[82] (суч. в. Лызкі Хіславіцкага раёна). У канцы XVI ст. (1579 г.)

---

[72] НГАБ. – Ф. 1729. – Адз. зах. 33. – Арк. 360–360 адв.

[73] Археографический сборник документов относящихся к истории Северо-Западной Руси, издаваемый при управлении Виленского учебного округа. В 14 т. – Вильна, 1867–1904. – Т. 7. – 1870. – С. 7.

[74] АЗР. – Т. 1. – С. 200–201; РИБ. – Т. 27. – С. 783–785; ДМАМЮ. – Т. 1. – С. 22, № 11, 22, № 13.

[75] ДМАМЮ. – Т. 1. – С. 23, № 7, 9, 10, 12.

[76] ИЮМ. – Вып. 25. – С. 326–329.

[77] ДМАМЮ. – Т. 1. – С. 22, № 12, 15; НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 85. – Арк. 274–274 адв.

[78] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 155. – Арк. 564–566.

[79] ДМАМЮ. – Т. 1. – С. 22, № 13, 19; ИЮМ. – Вып. 25. – С. 445–446, 466, 484–485, 488–489; Urzędnicy... – S. 207; АЗР. – Т. 1. – С. 57–58, 365.

[80] АСДОИСЗР. – Т. 2. – С. 7.

[81] Материалы по истории Могилевской епархии // МЕВ. – 1890. – № 20–21. – С. 204.

[82] Тамсама. – С. 208; Тамсама. – № 25. – Часть неофициальная. – С. 308.

згадваеца святар в. Сохань, што сведчыць пра існаванне і там храма[83]. У 1585 г. ужо была царква Св. Юрыя ў в. Людагошча[84].

Картаграфаванне гэтых населеных пунктаў паказвае (мал. 82), што яны даволі шчыльна пакрываюць усю тэрыторыю Мсціслаўскага княства і размешчаны адзін ад другога на адлегласці не болей за 15–20 км. Апошняе стварала даволі густую сетку населеных пунктаў, у якіх маглі размяшчацца храмы і да якіх адносна проста маглі дабрацца вернікі. Адлегласць да храма ад любога населенага пункта была не болей за 10–12 км.

Аб пранікненні хрысціянства ў шырокія колы насельніцтва на мяжы XV–XVI стст. сведчыць не толькі існаванне храмаў у вёсках, але і пачатак арганізацыі на Пасожжы манастыроў.

Першы манастыр, як адзначалася вышэй, быў арганізаваны на гэтых землях у XII–XIII стст. пры мсціслаўскім замкавым храме Св. Міколы. Аднак



● – храм; ✝● – манастыр

Мал. 82. Храмы XV–XVI стст. на тэрыторыі Мсціслаўскага княства і ваяводства: *1* – Ануфрыева; *2* – Воўчас; *3* – Вярба; *4* – Добрае; *5* – Калодзезькі; *6* – Краснае; *7* – Крычаў; *8* – Людагошч; *9* – Міхайлаўскае; *10* – Мсціслаў; *11* – Падлужжа; *12* – Паланіца; *13* – Пустынкі; *14* – Радамля; *15* – Расна; *16* – Сахан; *17* – Селішча

[83] АВК. – Т. 39. – С. 406, 426.

[84] Материалы по истории Могилевской епархии // МЕВ. – 1890. – № 25. – С. 306, 308.

упершыню ён згадваецца ў крыніцах толькі ў 1507 г., калі мсціслаўскі князь Міхаіл Іванавіч надаў ігумену гэтага манастыра Ніфанту ў наваколлях Расны чатырох людзей даннікаў на зямлі «Ярыковщизне», кадзь мёду ў пяць пудоў і 10 грошай[85]. Пра гэты манастыр захаваліся вельмі сціплыя звесткі, вядома, што ён быў знішчаны падчас штурму мсціслаўскага замка рускімі войскамі ў 1654 г.[86] і болей не адрадзіўся.

Наступным манастыром, заснаваным на гэтых землях, быў Ануфрыеўскі, які заснаваў у 1407 г. князь Лынгвен-Сямён. Згодна з паданнем, заснаванне манастыра звязана з падзеяй, што здарылася з яго сынам Юрыем.

Княжыч Юрый аднойчы заблудзіў у лесе. Ён сем дзён блукаў па ім і, знясілены, упаў на зямлю і пачаў маліць Бога аб выратаванні. У гэты час перад ім з'явіўся старац з доўгай, да зямлі, барадой і звярнуўся да Юрыя са словамі: «Не бойся, чада, я Ануфры і пасланы Богам указаць табе дарогу». Пад кіраўніцтвам Ануфрыя Юрый знайшоў дарогу з лесу і выратаваўся. Абрадаваны цудоўным выратаваннем сына, князь Лынгвен на месцы з'яўлення княжычу Св. Ануфрыя заснаваў манастыр у гонар гэтага святога[87]. У крыніцах XV – першай паловы XVIII ст. у манастыру згадваецца толькі адзін драўляны храм у гонар Св. Ануфрыя. Ніякіх іншых звестак пра манастырскі комплекс гэтага часу не захавалася.

Адначасова з заснаваннем манастыра князь Лынгвен зрабіў першыя крокі па арганізацыі яго гаспадаркі, з тым каб стварыць эканамічную базу для яго функцыянавання. З гэтай мэтай князь Лынгвен надаў манастыру людзей у вёсках: «у Селцу», «Комаровичах», «людей съ пашнями и сеножатми, и данники зъ данею медовое и зъ серебряною и зъ бобровыми гоны и зо всимим приходы, што къ тымъ землямъ и пашнямъ прислухает».

Манастыр заставаўся пад пільнай увагай і яго сына князя Юрыя Лынгвеневіча, які ў 1443 г. пацвердзіў старыя наданні свайго бацькі і надаў яму новыя сёлы – «Головчино», «Колесниково», дадаў манастыру мядовыя і грашовыя дані. Ён вызваляў манастырскіх сялян ад падсуднасці сваім намеснікам, ўсялякіх прац на карысць князя, абавязкаў выплаты даніны[88].

Для наданняў манастыру князі шукалі, перш за ўсё, землі, размешчаныя недалёка ад яго. Так, адносна людзей «у Селку» гаворыцца, што гэты населены пункт размяшчаўся каля манастыра, што дазваляе атаясамліваць «Селко» з сучаснай вёскай Сялец Мсціслаўскага раёна, з якой зараз фактычна зліліся в. Ануфрыева. Верагодна, і іншыя княскія наданні манастыру трэба шукаць у гэтым жа рэгіёне. Ва ўсякім выпадку, большасць вёсак, якія належалі ў XVII ст. Ануфрыеўскаму манастыру, – «Скверета», Асецішча, Сялюты[89] – лакалізуюц-

[85] АЗР. – Т. 2. – С. 29.

[86] Пустынский Успенский монастырь Могилевской епархии. Краткий исторический очерк. – СПб.: Тип. П. П. Сойкина, 1901. – С. 8.

[87] Краснянский В. Г. Город Мстиславль. – С. 48.

[88] АЗР. – Т. 1. – С. 57–58.

[89] АЮЗР. – Т. 14. – С. 226, № 8-Х-2.

ца на тэрыторыі Шумяцкага раёна, недалёка ад манастыра. Недалёка ад Ануфрыева знаходзіцца і в. Міцькаўшчына Мсціслаўскага раёна, якая ў XVII ст. таксама належала Ануфрыеўскаму манастыру.

Вёска «Комаровичы» – гэта, хутчэй за ўсё, сучасная аднайменная вёска Шумяцкага раёна Смаленскай вобласці. На такую думку наводзіць той факт, што в. Камаровічы Чэрыкаўскага раёна ўвесь час заставалася дзяржаўным уладаннем і згадваецца сярод населеных пунктаў Крычаўскага староства XVI–XVIII стст.

Тапонім, даволі сугучны назве яшчэ адной вёскі, пажалаванай Ануфрыеўскаму манастыру, – в. «Головчино» – в. Галоўчыцы ў пачатку XX ст. размяшчалася ў 2 км на захад ад Ануфрыева[90], а зараз злілася з в. Сялец Мсціслаўсага раёна. Село «Колесниково» мае сучасны сугучны тапонім – Калеснікі – у Хіславіцкім раёне Смаленскай вобласці.

Акрамя гэтых фундушных наданняў, князь Юрый, верагодна, рабіў некаторыя крокі і адносна аздаблення манастыра, заснаванага ў гонар святога, які выратаваў яго. Верагодна, у часы свайго гаспадарання ў Мсціславе ён ажыццявіў пілігрымку ў Грэцыю адкуль прывёз ў манастыр з Афона ікону Св. Ануфрыя[91].

Усе наданні князёў Лынгвена і Юрыя пацвердзіў Ануфрыеўскаму манастыру ў 1483 г. і князь Іван Юр'евіч[92]. Акрамя таго, ён яшчэ ў 1463 г. надаў манастыру возера «Гостынь, под Ліпкою, на Ветце»[93]. Улічваючы, што прывілей быў падпісаны ў Паповай Гары, то згаданае возера, верагодна, трэба шукаць на поўдні княства, у воласці горада Папова Гара.

Княскія наданні Ануфрыеўскаму манастыру не спыніліся і пасля сыходу з мсціслаўскага стала дынастыі Лынгвеневічаў. У 1515 г. да князя Міхаіла Іванавіча звярнуўся Ануфрыеўскі архімандрыт Філарэт з просьбай надаць манастыру рыбалоўныя месцы на Сожы. Князь задаволіў просьбу і запісаў на манастыр «язъ пустовский на имя Холтюковское» для рыбнай лоўлі. У 1525 г. Міхаіл Іванавіч надаў манастыру «гоны бобровые, почовши отъ Молотомли по Лобковский рубежъ на Сожу», якія размяшчаліся на Сажы вышэй і ніжэй манастыра Св. Ануфрыя. А летам 1529 г., пасля смерці князя Міхаіла Іванавіча, вялікі князь Жыгімонт Стары па просьбе Ануфрыеўскага архімандрыта Філарэта пацвердзіў сваёй граматай ўсе папярэднія наданні манастыру, пачынаючы ад князя Лынгвена-Сямёна[94].

Наступным манастыром арганізаваным на тэрыторыі Мсціслаўскага княства, быў Пустынскі. У гісторыі Пустынскай абіцелі самым складаным пытаннем з'яўляецца час яе ўзнікнення. Існуе паданне, згодна з якім мсціслаўскі князь, імя якога паданне не захавала, быў хворы на вочы і ніхто не мог дапа-

[90] Список населенных мест Могилевской губернии. – С. 89.
[91] Краснянский В. Г. Город Мстиславль. – С. 48.
[92] АЗР. – Т. 1. – С. 102–104.
[93] Тамсама. – С. 83–84.
[94] Тамсама. – Т. 2. – С. 119, 158, 206–207.

Мал. 83. Абраз Пустынскай Божай Маці

магчы яму. Аднойчы ў сне князь убачыў старца, які параіў знайсці яму «у пустыні» крыніцу і абмыць у ёй вочы. Калі князь знайшоў крыніцу і абмыў вочы, у яго адразу ж аднавіўся зрок, а побач на дрэве князь убачыў абраз з выявай Багародзіцы (мал. 83). У падзяку за свае збаўленне ён загадаў збудаваць над крыніцай часоўню, а потым і абіцель.

Агульнапрынята думка, што абіцель заснаваў у 1380 г. мсціслаўскі князь Лынгвен-Сямён[95]. Аднак калі мы ўважліва прааналізуем паданне і падзеі найбольш ранняй гісторыі Пустынскай абіцелі, то ўбачым тут шмат недарэчнасцей, якія ставяць пад сумненне легендарную дату заснавання Пустынскай абіцелі і імя яе заснавальніка.

Так, дата заснавання манастыра 1380 г. і атаясамленне імя яго заснавальніка з князем Лынгвенам-Сямёнам выклікае недавер ужо таму, што ў 1380 г. князь Сямён яшчэ не быў мсціслаўскім князем. Таму калі манастыр і быў заснаваны у 1380 г., то не Лынгвенам, а вялікакняскім намеснікам, які кіраваў Мсціславам. У 80-х гадах XIV ст. ім быў князь Карыгайла.

Па-другое, трэба адзначыць, што захавалася вялікая колькасць прывілеяў пра наданні Ануфрыеўскаму манастыру і іншым цэрквам, размешчаным вакол Мсціслава, як самога мсціслаўскага князя Лынгвена-Сямёна, так і яго сына Юрыя і ўнука Івана Юр'евіча. А вось вялікая колькасць крыніц пра наданні Пустынскаму манастыру захавалася толькі ад часоў гаспадарання мсціслаўскага князя Міхаіла Іванавіча (1499–1528 гг.). Чым можна растлумачыць факт, што адносна аднаго манастыра і некаторых цэркваў захавалася шмат фундушаў і пацвярджальных грамат, а адносна другога манастыра мы амаль не сустракаем звестак? Наўрад ці гэта выпадкова.

У 1529 г. пустынскі архімандрыт скардзіўся вялікаму князю на прыцясненні мсціслаўскага намесніка, апелюючы тым, што наданні храму Пустынскага манастыра давала яшчэ княгіня Ульяна, жонка князя Івана Юр'евіча. Толькі гэта адзіная ўскосная згадка сцвярджае пра існаванне Пустынкаўскага манастыра ў другой палове XV ст., але не раней. Аднак зноў узнікае пытанне, чаму пустынскі архімандрыт, які жыў у першай трэці XVI ст. і, безумоўна, добра ведаў рэальную гісторыю ўзнікнення манастыра, не спаслаўся ні на прывілеі князя Лынгвена-Сямёна, ні на прывілеі яго сыноў, а толькі на наданні жонкі князя Івана Юр'евіча, якія храналагічна могут датавацца не раней за другую палову XV ст.?

[95] Пустынский Успенский монастырь. – С. 3; Краснянский В. Г. Город Мстиславль. – С. 46.

Выпадкова? На наш погляд, не. Пустынкаўскі архімандрыт добра ведаў гісторыю свайго манастыра і ведаў, чым рэальна можна апеляваць да вялікага князя, адстойваючы правы абіцелі.

Усе вышэйпералічаныя факты схіляюць да думкі, што Пустынскі манастыр быў заснаваны значна пазней, чым у канцы XIV ст., і яго заснавальнікам быў не мсціслаўскі князь Лынгвен-Сямён, а нехта з іншых удзельных мсціслаўскіх князёў.

Хто ім мог быць? На наш погляд, заснавальнікам Пустынскага манастыра быў апошні мсціслаўскі ўдзельны князь з роду Лынгвеневічаў, унук Лынгвена-Сямёна Іван Юр'евіч. Яго асоба найбольш падыходзіць да ролі заснавальніка Пустынскага манастыра па некалькіх пазіцыях.

Па-першае, асоба мсціслаўскага князя Івана Юр'евіча вядома нам, у асноўным, толькі дзякуючы захаваўшымся шматлікім яго наданням цэрквам і Ануфрыеўскаму манастыру, што сведчыць пра набажнасць князя, таму магчымасць арганізацыі ім у сваіх ўладаннях новага манастыра не павінна выклікаць сумненняў. Па-другое, пра тое, што манастыр існаваў ці быў заснаваны толькі ў другой палове XVI ст., гаворыць ускоснае першае сведчанне пра наданне царкве Пустынскага манастыра жонкай Івана Юр'евіча. Па-трэцяе, ён быў прадстаўніком рода Лынгвеневічаў, адсюль магла узнікнуць, свядома ці не, блытаніна, звязаная з заснаваннем манастыра князем Лынгвенам.

Верагодна, князь Іван Юр'евіч заснаваў манастыр незадоўга да сваёй смерці (1483 г.) і не паспеў даць яму значнага фундуша, адсюль і адсутнасць фундушных запісаў гэтага багабаязнага князя. Тым болей, што апошнія гады свайго жыцця ён служыў далёка ад свайго мсціслаўскага ўдзела, у Кіеве, і не мог шмат увагі надаваць новазаснаванаму манастыру. Магчыма, князь Іван Юр'евіч заснаваў манастыр і надаў яму пэўныя землі, але яны яшчэ былі слаба населеныя людзьмі. Пра гэта сведчыць і згадванне адзінага недатаванага прывілея князя Івана Юр'евіча, згодна з якім манастыр атрымаў фундуш «...на бортную землю с пашънями и зъ селищами называемыми Макаровъскимъ, Ватовскимъ пры манастыри светое Пречистое Пустынской»[96].

Нешта паспела надаць манастырскай царкве да сваёй смерці (1495 г.) і яго жонка, княгіня Ульяна, што знайшло ўскоснае пацверджанне ў крыніцах пачатку XVI ст. Аднак пасля смерці мужа яна хаця і працягвала жыць у Мсціславе, але ўжо не мела магчымасці значна дапамагчы манастыру. Пасля смерці князя Івана Юр'евіча землі Мсціслаўскага княства былі ўключаны ў склад Віленскага ваяводства і, безумоўна, віленскаму ваяводу не было справы да далёкага, толькі што заснаванага невялікага манастыра.

Таму першыя гады існавання Пустынскага манастыра, верагодна, былі даволі цяжкімі: князь-заснавальнік спачатку быў у Кіеве, а потым заўчасна памёр. А ахвяраванняў, што паспела даць яго сям'я, для арганізацыі паўнавартаснага манастырскага жыцця, не хапала.

---

[96] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 83. – Арк. 1 адв.–2.

У канцы 1498 – пачатку 1499 г. вялікі князь Аляксандр выдаў дачку мсціслаўскага князя Івана Юр'евіча Ульяну замуж за князя Міхаіла Іванавіча Жаслаўскага, і апошні атрымаў тытул князя Мсціслаўскага.

Магчыма, пад уплывам сваёй жонкі, якая вырашыла давесці справу бацькі па агранізацыі новага манастыра да ладу, князь Міхаіл Іванавіч пачаў актыўна дапамагаць Пустынскаму манастыру і даваць яму шматлікія фундушы, а следам за князем пацягнуліся і іншыя асобы, што жадалі дапамагчы манастыру.

Аднак, верагодна, у гэты час у наваколях Мсціслава не заставалася свабодных вёсак, і таму, фактычна, князь Міхаіл Іванавіч сутыкнуўся з праблемай эканамічнага забяспячэння функцыянавання манастыра. Князь не змог вылучыць манастыру вёскі з людзьмі, а каб выправіць сітуацыю, дазволіў пустынскаму архімандрыту зазываць і сяліць на манастырскіх землях людзей і вызваліў іх ад павіннасцей і судзебнай адказнасці перад княскай уладай[97]. Ды і ўсе наступныя наданні Пустынскаму манастыру з боку князя Міхаіла Іванавіча былі толькі наданнямі зямель без людзей. Гэты першы дакумент фактычна сведчыць пра самы пачатак арганізацыі маёмасці манастыра.

У красавіку 1505 г. князь Міхаіл Іванавіч надаў «на вечна» манастыру «бортную Измайловскую землю» на р. Осліна. А праз некалькі дзён дадаткова надаў манастыру памеснае Мсціслаўскае – «3 пуда мёду, а 40 грошей зъ старца нашой Засельское волости, серебряное наших дани»[98].

І надалей князь Міхаіл Іванавіч шчыра надаваў манастыру землі і дапамагаў яму матэрыяльна. У 1511 г. надаў манастыру сенажаць насупраць горада, а ў 1526 г. – пусташ «Радивоновскую» – верагодна, былую в. Радзівонаўка Мсціслаўскага раёна, з правам зазываць сюды людзей і вызваленнем іх ад суда і кіравання княскіх намеснікаў. А з заселеных вёсак толькі аднойчы, у 1507 г. Пустынскаму манастыру ім была пажалавана в. «Овдейкова» на р. Осліна «зъ пашнями и сеножатъми»[99].

Ды і сам вялікі князь Жыгімонт не змог знайсці для манастыра тут свабодных вёсак і даць населены людзьмі зямельны надзел. Ён у 1508 г. даў загад крычаўскаму намесніку В. Ашушыскіну «навечна» выбіраць для Пустынскага манастыра даніну ў памеры 3 рублёў у год з крычаўскага сяла Лабковічы[100].

Фактычна, князь Міхаіл Іванавіч пачаў ствараць эканамічную базу для нармальнага функцыянавання Пустынскай абіцелі і давёў справу, распачатую Іванам Юр'евічам, да лагічнага завяршэння. Пустынскі манастыр нарэшце атрымаў магчымасць нармальна функцыянаваць.

У адрозненне ад Ануфрыеўскага, на першапачатковым этапе развіцця Пустынскага манастыра вялікі уклад зрабіла шляхта. Самай першай крыніцай,

---

[97] АЗР. – Т. 1. – С. 201.

[98] Тамсама. – С. 364, 365.

[99] АЗР. – Т. 2. – С. 24, 21, 80, 169.

[100] Акты Литовско-русского государства. – Вып. 1. – 1390–1529 // Чтения в императорском обществе истории древностей Российских при Московском университете. – М., 1899. – Кн. 4. – С. 137.

якая значылася ў спісе фундушных дакументаў на Пустынскі манастыр, які захоўваўся ў ім яшчэ у 1841 г., значыцца дакумент ад 14 верасня 1500 г. пра наданне манастыру каронным пісарам Аляксандрам Богушам Багавітовічам зямель над р. Аслянка і пра наданне абіцелі вёсак Пустынкі, Яўлішчана (суч. в. Бялішчына Мсціслаўскага р-на), Слабодка[101].

Гэта было фактычна першае наданне шляхтай населеных вёсак манастыру. Толькі амаль праз трыццаць год, у 1528 г. Пустынскаму манастыру «навечна» ахвяравалі сяло Пераседзіну Анісімаўскую Багдан Баршчэвіч з жонкай. А ў 1537 г. яны пацвердзілі сваё наданне[102]. Гэтыя вёскі – Пустынкі, Яўлішчава, Слабодка, Аўдзейкава, Радзівонаўская – і надалей складалі маёмасць Пустынскага манастыра.

Застаецца яшчэ адно нявызначанае пытанне: калі ж князь Іван Юр'евіч заснаваў Пустынскі манастыр? Нельга выключыць, што падзеі, адлюстраваныя ў паданні пра заснаванне манастыра, адбыліся ў 1480 г., у канцы жыццёвага шляху Івана Юр'евіча, а не ў 1380 г. Адкуль жа ўзялася дата 1380 г.?

Магчыма, пры чарговай перапісцы гісторыі манастыра, якая, безумоўна, вялася ў яго сценах, была дапушчана памылка ў даціроўцы часу заснавання манастыра, а потым адбылася ўжо свядомая падгонка імя заснавальніка манастыра пад імя мсціслаўскага князя Лынгвена. Так з'явілася дата 1380 г. і заснавальнікам стаў князь Лынгвен-Сямён. А імя сапраўднага заснавальніка Пустынскага манастыра, князя Івана Юр'евіча, засталося забытым.

Верагодна, гэта адбылося недзе пасля сярэдзіны XVI ст., бо яшчэ ў 1529 г. пустынкаўскі архімандрыт не ведаў, што манастыр заснаваў князь Лынгвен-Сямён і спасылаўся толькі на наданні княгіні Ульяны, жонкі Івана Юр'евіча.

Крыніцы паведамляюць нам толькі пра адзін храм ў Пустынскім манастыры – Прасвятой Багародзіцы. Ён згадваецца як адзіны ў крыніцах XVI ст.[103] Паведамленні ж пра будаўніцтва ў манастыры ў 80-х гадах XVI ст. другога храма[104] не маюць пад сабой ніякай крыніцазнаўчай базы і могуць тлумачыцца памылковай трактоўкай крыніцы.

Гісторыя праваслаўнай царквы на тэрыторыі Мсціслаўскай воласці ў сярэдзіне XVI ст. даволі слаба адлюстравана ў крыніцах. Захавалася толькі некалькі прывілеяў (1551, 1562 гг.) караля Жыгімонта Аўгуста, што рэгулявалі адносіны паміж царквой і мсціслаўскімі старастамі, якія спрабавалі парушыць былыя наданні і правы царквы. Акрамя таго, захавалася некалькі лістоў мсціслаўскіх стараст да вясковых святароў, якімі яны забаранялі ў сваіх прыходскіх храмах выконваць некаторыя царкоўныя таінствы, якія, згодна з прывілеямі мсціслаўскіх князёў, мелі права выконваць толькі святары мсціслаўскага Св. Троіцкага сабора[105].

---

[101] НГАБ. – Ф. 2311. – Воп. 1. – Адз. зах. 7. – Арк. 17.

[102] АСДОИСЗР. – Т. 2. – С. 10, 12.

[103] АЗР. – Т. 2. – С. 207; Тамсама. – Т. 3. – С. 97; Тамсама. – Т. 4. – С. 87.

[104] Пустынский Успенский монастырь. – С. 8; Слюнькова И. Н. Монастыри восточной и западной традиции. Наследие архитектуры Беларуси. – М.: Прогресс-Традиция, 2002. – С. 40.

[105] Материалы по истории Могилевской епархии // МЕВ. – 1890. – № 20–21. – С. 203, 204, 208.

Усё XVI ст. тры манастыры, размешчаныя ў горадзе і пад Мсціславам, - Мікольскі, Пустынскі і Ануфрыеўскі – заставаліся аплотам праваслаўнай царквы на гэтых землях, аднак крыніцы паведамляюць нам толькі асобныя звесткі пра іх існаванне.

Манастыры не былі закранутыя першымі войнамі паміж ВКЛ і Рускім царствам першай паловы XVI ст. Аднак падчас Інфлянцкай вайны яны моцна пацярпелі і ў другой палове стагоддзя стаялі ў запусценні[106]. Толькі ў 80-х гадах XVI ст. пачалося адраджэнне манастырскага жыцця, што было звязана з прывілеямі караля Стэфана Баторыя.

У 1581 г. кароль надаў Ануфрыеўскі манастыр пад кіраванне Полацкага архіепіскапа Феафана Богдана «да жывата …со всими людми, землями и съ данми медовыми и грошовыми съ бобровыми гоны и со всякими доходы и пожитки»[107].

У 1585 г. кароль Стэфан Баторый аддаў Пустынскі і Мсціслаўскі Мікольскі манастыры таксама полацкаму архіепіскапу Феафану. Аднак потым высветлілася, што раней на кіраванне Пустынскім манастыром мсціслаўскім старастам Іванам Саламарэцкім быў выдадзены ліст Мацвею Іпацевічу «до воли и ласки» гаспадарскай. Кароль Стэфан Баторый пацвердзіў былое наданне, і полацкі архіепіскап быў вымушаны саступіць Пустынскі манастыр Матвею Іпацевічу[108].

Дваццатага лютага 1595 г. Матвей Іпацевіч звярнуўся да караля і вялікага князя Жыгімонта III з просьбай перадаць манастыр на тых жа ўмовах свайму сыну Канстанціну. Просьба была задаволена каралём пры ўмове, што «…Бога за насъ господаровъ просити, а съ пильностью се о то старати, абы се хвала Божая, и наука веры хрестиянская, водлуг порядку закону Греческого, в тое церкви и парафии манастыра того помножати»[109].

У 1585 г. Ануфрыеўскі манастыр пасля смерці архіепіскапа Полацкага, Віцебскага і Мсціслаўскага Феафана Богдана быў пажалаваны ў пажыццёвае кіраўніцтва князю Багдану Азярэцкаму-Друцкаму, які вырашыў прыняць царкоўны сан[110].

У верасні 1588 г. архімандрыт Пінскага Ляшчынскага манастыра Афанасій Тарлецкі быў прызначаны архіепіскапам Полацкім, Віцебскім і Мсціслаўскім. У жалаванай грамаце караля Жыгімонта III з гэтай нагоды гаворыцца, што ён атрымаў епіскапства «да жывата» з усімі манастырамі і царквамі епіскапства, у тым ліку і тымі манастырамі, жыццём у якіх кіраваў сам былы епіскап Феафан Богдан, – Мікольскім манастыром у Мсціславе і Пустынскім каля горада[111].

Подых рэфармацыі, ахапіўшы ў першай палове – сярэдзіне XVI ст. заходнія і цэнтральныя землі ВКЛ, верагодна, ніяк не адбіўся на канфесійным жыц-

---

[106] Пустынский Успенский монастырь. – С. 8–9.
[107] АЗР. – Т. 3. – С. 267.
[108] Тамсама. – С. 299.
[109] Тамсама. – Т. 4. – С. 87–88.
[110] Тамсама. – С. 10.
[111] Тамсама. – С. 8–10.

ці Мсціслаўскага княства і ваяводства. Ва ўсякім выпадку, да сённяшняга дня адсутнічаюць звесткі пра існаванне тут кальвінісцкіх ці іншых рэфармацкіх зборaў. А калі час ад часу ў гістарычнай літаратуры і сустракаюцца такія згадкі, то ўважлівае вывучэнне месцаразмяшчэння кальвінісцкіх зборaў паказвае, што яны не маюць нічога агульнага з землямі Мсціслаўскага ваяводства і з'яўляюцца вынікам гісторыка-геаграфічнай блытаніны.

Адначасова з пранікненнем праваслаўя ў сельскае асяроддзе ў XIV–XVI стст. і пашырэннем яго ўплыву на паўсядзённае жыццё, верагодна, у XIV ст. адбыліся і пэўныя спробы адміністрацыйных перамен у арганізацыі царкоўнага жыцця Мсціслаўскага княства. На такую думку наводзіць згадванне мсціслаўскіх епіскапаў ужо ў 1443 г.[112], што падкрэслівае ролю апошняга як рэлігійнага цэнтра. Аднак гэта толькі адзіная згадка пра мсціслаўскіх епіскапаў у XV ст., і наколькі яна адпавядае рэальнасці, цяжка сказаць. Бо ніводнага мсціслаўскага епіскапа гэтага часу крыніцы канкрэтна не называюць. Магчыма, гэта было нейкае часовае ўтварэнне, магчыма, толькі жаданне князя Юрыя Лынгвеневіча арганізаваць у Мсціславе епіскапію, а магчыма, і звычайная блытаніна крыніцы, калі па нейкіх прычынах мсціслаўскі пратапоп быў названы епіскапам.

В. Варонін выказаў думку, што недзе паміж 1359 і 1404 гг. Мсціслаў увайшоў у падпарадкаванне Полацкай епархіі. Аднак для XV ст. ён не змог прывесці ніводнай згадкі пра існаванне адзінай епархіі для Полацка і Мсціслава. Таму гэта думка застаецца гіпатэтычнай[113]. На наш погляд, сітуацыя з прыналежнасцю зямель Мсціслаўскага ваяводства была некалькі больш складанай.

Верагодна, да 1500 г. тэрыторыя Мсціслаўскага княства была падзелена ў царкоўным плане на дзве часткі. Паўночныя землі былі гістарычна звязаныя са Смаленскай епархіяй, а паўднёвыя землі Мсціслаўскага княства былі сферай уплыву Кіеўскай епархіі. Юрысдыкцыя апошняй распаўсюджвалася на паўднёвыя воласці Мсціслаўскага княства – Мглін, Дрокаў, Папову Гару, якія былі далучаны да Смаленскай зямлі ў 1142 г., ужо пасля арганізацыі ў Смаленску самастойнай епархіі. Ускосным сведчаннем гэтага можа быць той факт, што усе яны, акрамя Мгліна, адносяцца да кіеўскіх гарадоў у «Спісе рускіх гарадоў далёкіх і блізкіх».

Аднак пасля захопу Масквой ў 1500 г. гэтых валасцей і пераходу Бранскай епархіі ў склад Рускай дзяржавы і Маскоўскай мітраполіі, астатняя тэрыторыя Мсціслаўскага княства і прылеглыя да яго з поўдня вялікакняскія воласці – Крычаў, Алучыцы, Салаўянічы і Прыкладні – засталіся пад юрысдыкцыяй Смаленскай епархіі.

Аднак пасля падзей вайны 1534–1537 гг. і Салаўянічы з Прыкладнямі апынуліся ў складзе Рускай дзяржавы і, адпаведна, у царкоўным плане пачалі падпарадкоўвацца Маскоўскай мітраполіі.

---

[112] Литовская метрика. Книга судных дел. № 8 (1533–1535) / parenge I. Valikonite, S. Lazutka ir. et. – Vilnius: Zara, 1999. – S. 329.

[113] Варонін В. Полацкія епіскапы першай паловы XVI стагоддзя // Silva rerum nova: Штудыі ў гонар 70-годдзя Г. Я. Галенчанкі. – Вільня; Мінск: AIDAI – ATHENAEUM, 2009. – С. 61.

У 1514 г. Смаленск быў захоплены Масквой, і асноўная тэрыторыя Смаленскай епархіі была далучана да Маскоўскай мітраполіі, а землі Сярэдняга Пасожжа, што засталіся ў ВКЛ, у царкоўным плане былі падпарадкаваны Полацкай епархіі Кіеўскай мітраполіі. Новаўтвораная епархія стала называцца епіскапіяй Полацкай, Віцебскай і Мсціслаўскай, што працягвала падкрэсліваць роль Мсціслава ў якасці буйнога рэлігійнага цэнтра дзяржавы. Першым епіскапам новаўтворанай епархіі быў Сімяон V (1535–1549 гг.).

Адносна ціхае міжканфесійнае жыццё ў ВКЛ на працягу XIV – сярэдзіны XVI ст. спынілася ў апошняй трэці XVI ст. Гэта было звязана не толькі з аб'яднаннем краін у адзіную канфедэратыўную дзяржаву – Рэч Паспалітую, але і з пачаткам дзейнасці на яе тэрыторыі з апошняй трэці XVI ст. ордэна езуітаў, і з распачатай контррэфармацыяй.

Апошняя рашуча адмаўляла прынцып рэлігійнай цярпімасці. Пад уплывам дзейнасці езуітаў ужо ў 70–80-я гады XVI ст. у каталіцызм пераходзяць некаторыя буйныя паны-пратэстанты – Ян Хадкевіч, дзеці Мікалая Радзівіла Чорнага, Леў Сапега.

Першыя поспехі на ніве рэлігійнай інтэграцыі з Захадам адрадзілі і ідэю царкоўнай уніі. Абгрунтаванне ідэі належыць Пятру Скарге, аўтару твора «Аб адзінстве касцёла Божага», які быў выдадзены ў 1577 г. у Вільні. У ім Скарга заклікаў праваслаўных вярнуцца да рашэнняў Фларэнційскага сабора. Ён акрэслівае шырокую праграму дзейнасці на «усходніх крэсах», раіць наладжваць супольныя сустрэчы каталіцкага і праваслаўнага духавенства, шляхты, браць пад апеку друкарні, школы, перакладаць на «рускую» мову карысныя кнігі. Асобную ролю ён адводзіў каталіцкім вучоным, прафесарам, якія павінны былі займацца апрацоўкай грамадскай думкі, растлумачваць неабходнасць рэлігійнай згоды, шкоднасць «схізмы» – усходняга праваслаўя[114].

Твор П. Скаргі ў праваслаўным асяроддзі быў успрыняты як выклік і падштурхнуў праваслаўных да аб'яднання. Па ўсёй краіне пачалося стварэнне брацтваў праваслаўных рамеснікаў і купцоў. Мсціслаўскае праваслаўнае брацтва ўзнікла недзе ў другой палове XVI ст. пры Мікольскім храме на замку. У 1588–1592 гг. ужо існавала брацтва ў Крычаве, арганізатарам якога быў крычаўскі стараста Багдан Іванавіч Саламярэцкі[115]. У канцы XVI ст. існавалі праваслаўныя брацтвы ў Оршы і ў Магілёве пры Спаскай царкве[116].

12 снежня 1586 г. памёр кароль Стэфан Баторый. У Рэчы Паспалітай ізноў паўстала пытанне абрання караля. З трох прэтэндэнтаў – рускага цара Фёдара

---

[114] Падокшын С. А. Унія. Дзяржаўнасць. Культура. (філасофска-гістарычны аналіз). – Мінск: Беларус. навука, 1998. – С. 52.

[115] Батюшков И. Н. Белоруссия и Литва. Исторические судьбы северо-западного края. – СПб.: Тип. тов. «Общественная польза», 1890. – С. 167; АЗР. – Т. 4. – С. 56; Медынцев Е. Н. Братские школы Украины и Белоруссии в XVI–XVII вв. и их роль в воссоединении Украины с Россией. – М.: Изд-во АПН РСФСР, 1954. – С. 22; Kempa T. Sołomerecki Bogdan Iwanowicz // PSB. – T. XL/3. – Zeszyt 166. – Warszawa; Kraków. – 2001. – S. 326.

[116] Архимандрит Сергий. Из истории православия и братской школы в г. Могилеве // МЕВ. – 1885. – № 3. – Часть неофициальная. – С. 47–58.

Іванавіча, аўстрыйскага эрцгерцага Максіміліяна і шведскага прынца Жыгімонта, – дзякуючы падтрымцы праваслаўнай партыі, перамог шведскі прынц, які стаў каралём Рэчы Паспалітай Жыгімонтам III Вазай.

На канвакацыйным сойме 1587 г. па прапанове пратэстанцкіх магнатаў і шляхты была ўнесена прапанова, каб новы кароль выдаў закон, згодна з якім кожны меў права ў судовым парадку абараняць свабоду веравызнання. Гэта падтрымала як праваслаўная, так і каталіцкая шляхта. І першапачаткова гэта вытрымлівалася.

Усход Рэчы Паспалітай напрыканцы XVI ст. быў аплотам праваслаўя ў краіне, і Мсціслаў з яго манастырамі (Ануфрыеўскім, Пустынскім і Мікольскім на замку) і 10 гарадскімі цэрквамі[117] быў яго састаўной часткай.

7.3. Распаўсюджванне царкоўнай уніі і ўзаемаадносіны ўніяцтва з праваслаўем ў канцы XVI–XVIII ст.

Праваслаўе заставалася галоўнай галіной хрысціянства на землях Мсціслаўскага ваяводства да канца XVI ст. Крыніцы не паведамляюць нам пра значнае распаўсюджванне на гэтых землях каталіцызму і пратэстантызму ў XVI ст., як гэта мела месца ў іншых раёнах ВКЛ. Хаця, магчыма, гэта тлумачыцца толькі невялікім комплексам крыніц, якія захаваліся да нашага часу.

У 1596 г. у Рэчы Паспалітай адбылася Берасцейская царкоўная ўнія, якая неадназначна была ўспрынята праваслаўным насельніцтвам. З амбона берасцейскага Св. Мікольскага сабора папскую булу пра спалучэнне каталіцкай і праваслаўнай цэркваў зачытаў епіскап полацкі, віцебскі і мсціслаўскі Рыгор Герман Загорскі. Акт Берасцейскай уніі падпісалі 6 з 8 праваслаўных епархій, што ўваходзілі ў склад Кіеўскай мітраполіі. Адмовіліся падпісаць гэты акт толькі львоўскі і пшэмысльскі епіскапы.

У краіне склалася парадаксальная сітуацыя. Большасць праваслаўных іерархаў прынялі ўнію, у той час як большасць праваслаўнага насельніцтва аднесліся да ўніі варожа і пачалі актыўна супрацьстаяць яе распаўсюджванню. Паства аказалася без пастыраў і наадварот. Дзяржава фактычна адразу апынулася на парозе грамадзянскай вайны з яўным канфесійным кірункам.

Усё гэта ўзмацнялася тым, што кароль Жыгімонт Ваза не проста быў ярым прыхільнікам каталіцызму, а актыўна садзейнічаў прымусоваму распаўсюджванню ўніі на землях Вялікага Княства Літоўскага. Гэтаму спрыяў той факт, што яшчэ ў маленстве ён разам са сваёй сям'ёй пацярпеў ад пратэстантаў у Швецыі і таму лічыў, што распаўсюджваць унію можна прымусова. Ён не прызнаваў той талерантнасці, што склалася на працягу XV–XVI стст. у ВКЛ. У выніку Берасцейскай уніі праваслаўная царква, падначаленая Канстанцінопальскаму патрыярху, юрыдычна ў Рэчы Паспалітай спыняла сваё існаванне.

---

[117] Жудро Ф. Из истории взаимоотношений между православными и униатами во «Мстиславщине» в конце XVI и первой половине XVII в. // МЕВ. – 1890. – № 13–15. – Часть неофициальная. – С. 229.

Адразу пачалася праца па адміністрацыйна-тэрытарыяльнай рэарганізацыі былой праваслаўнай Кіеўскай мітраполіі Канстанцінопальскага патрыярхату. Яна была ліквідавана, а на яе месцы была ўтворана ўніяцкая Кіеўская мітраполія, мітрапаліты якой пачалі тытулавацца мітрапалітамі кіеўскімі, галіцкімі і ўсяе Русі. Полацкі ўніяцкі епіскап пачаў іменавацца архіепіскапам полацкім, епіскапам віцебскім, мсціслаўскім, аршанскім, магілеўскім і ўсяе Беларусі.

Перавод ва ўніяцтва адбываўся прымусова як у цэнтры, так і на ўсходзе краіны. У Мсціслаўскім ваяводстве гэта ўскладнялася яшчэ і тым, што мсціслаўскі староста Пётр Пац быў ярым каталіком і, па сведчанні сучаснікаў, нядобразычліва адносіўся да іншаверцаў[118]. Некалькі лепшай была сітуацыя ў Крычаўскім старостве, якое было ў руках у Багдана Іванавіча Саламярэцкага. Прадстаўнікі гэтага роду заставаліся прыхільнікамі праваслаўя, а князь Багдан Іванавіч разам з братам Іванам прымалі ўдзел у працы Віленскага з'езда 1599 г. пратэстантаў і праваслаўных, накіраванага супраць узмацнення царкоўнай уніі і пашырэння каталіцкага ўціску на рэлігійнае жыццё краіны. Яшчэ ў верасні 1600 г. ён пісаў львоўскаму праваслаўнаму брацтву пра трываласць, цвёрдасць у праваслаўнай веры, бо павялічвалася колькасць людзей, якія ненавідзяць праваслаўе[119].

Аднак распачаты ціск на праваслаўе паступова набіраў моц. Усё гэта прывяло да таго, што пачалася жорсткая барацьба ўладаў з насельніцтвам з-за спробы прымусовага пераводу ў унію. Крыніцы захавалі шматлікія прыклады таго, як насельніцтва адмаўлялася падтрымліваць уніяцкіх святароў і выплочваць падаткі, якія раней плацілі на карысць праваслаўнай царквы.

Распаўсюджванне ўніі ішло такімі хуткімі тэмпамі, што нават у Магілёве ў пачатку XVII ст. былі зачынены ўсе праваслаўныя цэрквы[120]. Аднак, улічваючы, што ўсход краіны быў аплотам праваслаўя, першы ўніяцкі архіепіскап Герман Загорскі адразу сустрэў тут супраціў мясцовага праваслаўнага насельніцтва і кліра.

Святары Мсціслава і навакольных сельскіх прыходаў адмовіліся выплочваць яму даніну – «куніцу», якую, згодна са старадаўнім звычаем, яны павінны былі аддаваць новаму епіскапу, калі ён першы раз прыязджаў у епархію. Архіепіскап Герман патрабаваў аддаць «куніцу» сваёй упаўнаважанай асобе, пагражаючы пакараннем, аднак сам у Мсціслаў не прыязджаў, баючыся, што і тут ён, як і ў Магілёве, будзе збіты. Справа гэта так і зацягнулася да самай смерці архіепіскапа Германа, і жыхары як Магілёва, так і Мсціслава не прызнавалі яго як законнага душпастыра.

Справа распаўсюджвання царкоўнай уніі на землях Мсціслаўскага ваяводства некалькі паскорылася пры наступным уніяцкім архіепіскапе, Гедэоне Бральніцкім. У канцы XVI ст. Ануфрыеўскі манастыр, пасля таго як князь

---

[118] Lulewicz H. Pac Piotr // PSB. – T. XXIII/4. – zeszyt 103. – Wrocław; Warszawa; Kraków; Gdańsk, 1979. – S. 743–744.

[119] Wolff J. Kniazowie litewsko-rusci. – S. 498; АСДОИСЗР. – Т. 4. – С. 241.

[120] АСДОИСЗР. – Т. 2. – С. VII.

Багдан Азярэцкі-Друцкі адмовіўся прыняць манаскі пострыг, апынуўся пад уладай канцлера ВКЛ Льва Сапегі. Апошні, з'яўляючыся прыхільнікам уніі, паспрыяў таму, каб і Ануфрыеўскі манастыр перайшоў у ўнію. Першым крокам для гэтага было спалучэнне яго з уніяцкім Чарэйскім манастыром. Так, ужо 4 мая 1601 г. па прапанове Льва Сапегі кароль надаў ігумену Чарэйскага манастыра Ісаі Ануфрыеўскі манастыр пры ўмове, што гэты манастыр будзе «во единстве с Рымской церковью»[121].

У жніўні гэтага ж года такі ж лёс напаткаў і другую праваслаўную святыню – Пустынскі манастыр. Па прапанове уніяцкага мітрапаліта Пацея і полацкага ўладыкі Гедэона ён быў адданы Афанасію Васільевічу Валчанскаму пры ўмове, каб ўсе манахі і папы былі ў «едности святой» з касцёлам Рымскім, і падначальваўся Полацкаму архіепіскапу. Канчаткова манастыр быў перададзены ўніятам 21 верасня 1601 г.[122] Верагодна, тады ж да ўніятаў перайшоў і мсціслаўскі Мікольскі манастыр, які быў у падпарадкаванні Пустынскага манастыра.

Аднак перадача праваслаўнага манастыра ўніятам выклікала хваляванні ў Мсціславе. Пад кіраўніцтвам праваслаўных мсціслаўскіх шляхцічаў Маскевічаў 10 ліпеня 1601 г. народ напаў на Пустынскі манастыр, быў збіты ўніяцкі настаяцель манастыра Афанасій Валчанскі, і ўдзельнікі нападу забралі адтуль усе дакументы[123]. Гэты напад праваслаўных і, верагодна, іншыя акты супраціву падзейнічалі, і ў 1605 г. Пустынскі манастыр на некаторы час зноў стаў праваслаўным і яго ўзначаліў Канстанцін Іпацьевіч Маскевіч[124]. Аднак уніяты падалі скаргу першапачаткова ў Мсціслаўскі гродскі суд, і Маскевіч быў прызнаны вінаватым. У сваю чаргу К. І. Маскевіч падаў апеляцыйную скаргу ў Трыбунал, аднак, верагодна, і там ён яе прайграў, і манастыр зноў стаў уніяцкім.

Такі ж лёс напаткаў і шматлікія прыходскія цэрквы – пачаўся прымусовы перавод іх у падпарадкаванне ўніяцкім епіскапам. У 1604 г. ў Крычаве згадваецца царква «Светой Пречистой» Багародзіцы, права на вядзенне службы ў якой у караля прасіў крычаўскі святар Наум Лук'янавіч. Ён спасылаўся на той факт, што раней ў гэтай царкве служыў яго бацька Лук'ян. Кароль Жыгімонт Ваза дазволіў яму служыць у царкве «да жывата» і браць сабе даходы з царквы. Дазваляючы служыць у царкве «водлуг веры рускае», кароль загадваў Науму Лук'янавічу падпарадкавацца тым царкоўным іерархам, якія «во единоцтве с костолом католицкимъ под звирхностию столицы найвызшое апостолское рымское были»[125].

У 1610 г. крычаўскай Уваскрасенскай царквой апекаваўся Полацкі (уніяцкі) мітрапаліт[126]. У 1623 г. згадваюцца ўніяцкія крычаўскія цэрквы Узнясення

---

[121] АЗР. – Т. 4. – С. 189–191.

[122] Тамсама. – С. 241–242; Жудро Ф. Из истории взаимоотношений между православными и униатами. – С. 231.

[123] Пустынский Успенский монастырь. – С. 12.

[124] АЗР. – Т. 4. – С. 87–88.

[125] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 88. – Арк. 97 адв.

[126] Тамсама. – Адз. зах. 176. – Арк. 870.

Хрыстова і Святой Прачыстай Багародзіцы. У першай было два прытворы: адзін у гонар Св. Кузьмы і Дзям'яна, а другі – у гонар Св. Афанасія. Прывілей на гэтыя цэрквы быў атрыманы Мікітам Андрэевічам Стратаповічам ад мітрапаліта кіеўскага, галіцкага і усяе Русі І. Руцкага[127].

У пачатку 1609 г. уніяцкай была і крычаўская царква Св. Мікалая. З-за сваёй старасці святар храма Іона Бенедзіктовіч ўжо не мог весці службу. Таму ён прасіў караля Жыгімонта III дазволіць перадаць права на службу свайму сыну Васілю. Кароль задаволіў яго просьбу пры ўмове, што Васіль будзе знаходзіцца «под послушенством велебного митрополита киевского, пастыря своего». Царква заставалася ўніяцкай і ў 1633 г.[128]

Падобная сітуацыя, верагодна, адбывалася і ў Мсціславе. Ва ўсякім выпадку, у 1618 г. уніяцкімі тут былі як мінімум Спаская царква і Мікольскі храм, што стаяў на замку[129]. У апошні ужо ў 1614 г. быў прызначаны прыхільнік уніі, святар царквы в. Калодзеская, а праваслаўны святар Мікольскага храма Максім Іванавіч, нібыта па прычыне яго малапісьменнасці, першапачаткова быў пакінуты ў храме на палове даходаў, а праз тры гады, за тое што ён быццам бы ў храме збіў уніяцкага святара Ісакія Жарковіча, быў наогул пазбаўлены сану. А у самім Мсціславе ўнія да гэтага часу набрала ўжо такія памеры, што ў горадзе была ўніяцкая капітула[130].

У 1617 г. уніяцкі мітрапаліт Іосіф Руцкі пачынае рэформу ў сваёй царкве і стварае ордэн св. Васіля Вялікага, куды перайшлі ўсе праваслаўныя манастыры, якія прынялі ўніяцтва – на той час усяго 5 манастыроў са 100 манахамі[131]. Такім чынам, Мсціслаўшчына з яе трымя манастырамі (Ануфрыеўскім, Пустынскім і прыпісаным да яго Мікольскім), якія былі пераведзены ў унію, стала своеасаблівым апорным цэнтрам для распаўсюджвання ўніі па ўсходзе краіны.

Тым не менш, супраціў прымусоваму пераводу ў унію крыніцы фіксуюць увесь час па ўсім Вялікім Княстве Літоўскім. Нягледзячы на нешматлікасць захаваных крыніц, што тычацца тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства, верагодна, падобныя з'явы адбываліся і тут. Так, у 1622 г. адбылася спроба забойства ўніяцкага епіскапа Іасафата Кунцэвіча ў Мсціславе[132].

Гэтаму садзейнічаў і той факт, што ў 1620 г. у краіне пачалося адраджэнне праваслаўных епархій. Прызначэнне новых праваслаўных епіскапаў ажыццявіў восенню 1621 г. іерусалімскі патрыярх Феафан, які, вяртаючыся з Масквы, у Кіеве, у Пячэрскім манастыры правёў з'езд праваслаўнага духавенства і свец-

---

[127] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 100. – Арк. 8 адв.–9 адв.

[128] Тамсама. – Адз. зах. 86. – Арк. 738 адв.; Тамсама. – Ф. 694. – Воп. 1. – Адз. зах. 169. – Арк. 4.

[129] Материалы по истории Могилевской епархии // МЕВ. – 1890. – № 29–30. – Часть неофициальная. – С. 434–437.

[130] Жудро Ф. Из истории взаимоотношений между православными и униатами. – С. 267–268.

[131] Harasym I. Geneza i rola monastyczyzmu bazyliańskiego w historii Cerkwi Grekokatolickiej od XVI do XX wieku // Warszawskie zeszytu ukrainoznawcze. – 1997. – T. 4–5. – S. 227.

[132] Макарий. История русской церкви. – Кн. 6, отд. 1. – М.: Изд-во Спасо-Преображенского Валаамского мон-ря, 1996. – С. 428.

кіх прадстаўнікоў, на якім былі вылучаны кандыдаты на Кіеўскую праваслаўную мітраполію і епіскапіі. Пад аховай казакоў Запарожскага войска і гетмана П. Сагайдачнага на Кіеўскую мітраполію быў прызначаны ігумен манастыра Св. Міхала Іоў Барэцкі, а праваслаўным архіепіскапам полацкім, віцебскім і мсціслаўскім быў прызначаны Мялецій Сматрыцкі. Аднак у 1621 г. кароль Жыгімонт Ваза аб'явіў усіх новапрызначаных мітрапаліта і епіскапаў па-за законам, і сваю працу яны фактычна не змаглі выконваць. Мялецій Сматрыцкі намінальна ажыццяўляў кіраванне епіскапіяй да 1628 г., калі пакінуў праваслаўе і афіцыйна перайшоў да ўніятаў.

У напружаную сітуацыю паміж уніяцкім архіепіскапам і праваслаўным клірам і жыхарамі Мсціслава вымушаны былі ўмешвацца і мсціслаўскія старасты. Так, у 1624 г. староста К. Сапега сваім лістом загадаў усім святарам Мсціслава перайсці ў падпарадкаванне полацкаму ўніяцкаму епіскапу А. Сяляве[133].

Аб тагачасных умовах рэлігійнага жыцця праваслаўных сведчаць іх скаргі на сойм 1632 г., у якіх сцвярджаецца, што ў Оршы, Магілёве, Мсціславе і ў іншых гарадах усе праваслаўныя цэрквы былі зачынены і праваслаўным забаранялі маліцца Богу нават у шалашах[134].

Улічваючы складаную міжканфесійную сітуацыю, якая склалася ў краіне, кароль Жыгімонт Ваза пайшоў на ўступкі, і ў 1632 г. на ўсходняй частцы Полацкай уніяцкай епіскапіі нарэшце была адноўлена праваслаўная епіскапія, якая атрымала назву епіскапіі Магілёўскай, Мсціслаўскай і Аршанскай. Першым епіскапам новаўтворанай епіскапіі стаў Іосіф Бабарыкоўскі.

Са стварэннем праваслаўнай епіскапіі пачалося вывядзенне храмаў з-пад уплыву ўніі і вяртанне іх праваслаўным. Так, ужо ў 1633 г. у Мсціславе было два праваслаўных храмы – Св. Троіцы і Спаская царква[135]. Магчыма, праваслаўным заставаўся і Мікольскі храм на замчышчы, бо яшчэ ў лютым 1631 г. святар гэтага храма Ісакій Жарковіч, які вярнуўся з уніі ў праваслаўе, не дапусціў уводу туды прызначанага ўніяцкім архіепіскапам А. Сялявам Феафіла Альшаніцу[136]. Верагодна, пасля 1633 г. і крычаўскія цэрквы вярнуліся ў праваслаўную епархію, і сам перавод цэркваў з падпарадкавання ўніятам у праваслаўе адбываўся масава і хутка.

Асабліва паскорыўся пераход цэркваў у праваслаўе дзякуючы намаганням епіскапа Сільвестра Косава. Так, у сакавіку 1636 г. святары Радамлянскай царквы прызналі яго сваім пастырам і перашлі ў праваслаўе[137]. Дзейнасць С. Косава па вяртанні ў праваслаўе набрала такі размах, што ў 1641 г. ігумен магілёўскага ўніяцкага Спаскага манастыра Гервасій Гасцілоўскі пісаў полацкаму

---

[133] Материалы по истории Могилевской епархии // МЕВ. – 1890. – № 29–30. – С. 439.

[134] АЮЗР. – Т. 2. – № 43, 44.

[135] Бантыш-Каменский Н. Н. Исторические известия о возникшей в Польше унии. – С. 100.

[136] Материалы по истории Могилевской епархии // МЕВ. – 1890. – № 29–30. – С. 474–477.

[137] Жудро Ф. История Могилевского Богоявленского братства // МЕВ. – 1890. – № 5. – Часть неофициальная. – С. 58.

ўніяцкаму мітрапаліту Антонію Сяляве: «... Косов так много будок своих с попами схизматицкими и тепер по волости Могилевской так много набудовал и насветил, же наши бедные свещеници толко при щекгульных церквах зостали, а все прафияне... до их безбожества пошли и удалилися»[138].

Тым не менш, напружанне паміж праваслаўным насельніцтвам Мсціслава і манахамі-базыльянамі працягвала існаваць, і гэта знайшло сваё адлюстраванне ў крыніцах. У 1637 г. кароль быў вымушаны ўмешвацца ў судовую справу паміж магістратам Мсціслава і базыльянскім архімандрытам Ануфрыеўскага і Пустынскага кляштараў з-за таго, што горад адмаўляўся выплочваць Пустынскаму кляштару «памернае», «тарговае» і 3 кадзі мёду, якія ахвяраваў манастыру яшчэ князь Міхаіл Іванавіч Мсціслаўскі[139].

Асабліва разгарэлася барацьба паміж праваслаўнымі і ўніятамі паміж 1644 і 1654 гг. Гэтаму спрыяў той факт, што энергічны і адданы ўніі Пустынскі архімандрыт Варлаам Казінскі атрымаў у 1644 г. ад уніяцкага мітрапаліта Антонія Сялявы дэкрэт, згодна з якім усе цэрквы Мсціслаўскага ваяводства павінны былі падпарадкоўвацца яму. Верагодна, тады мсціслаўскія храмы Св. Троіцы і Св. Спаса зноў перайшлі да ўніятаў.

Пра апошняе сведчыць той факт, што ў пачатку 1650 г. праваслаўны кіеўскі мітрапаліт Сільвестр Косаў скардзіўся каралю, што ў Мсціславе праваслаўным не былі вернуты саборны Св. Троіцкі храм і Спаская царква. І нават пасля таго як кароль вырашыў супакоіць праваслаўных, у Мсціславе ім быў вернуты толькі саборны храм, а адносна Спаскай царквы паведамленні адсутнічаюць[140].

Праваслаўнае насельніцтва як магло супраціўлялася гэтаму, і пачалася барацьба за храмы. Казінскі амаль штомесяц пісаў скаргі на мсціслаўскі магістрат, праваслаўную шляхту, простых людзей у розныя суды. Так, у 1645 г. ён скардзіўся, што мяшчане горада, атрымліваючы магдэбургскія правы, абяцалі прыняць унію, а зараз яны не ходзяць ні ў саборны, ні ў іншыя прыходскія храмы, а ў 1643 г. нават пабудавалі сабе за горадам новую царкву, асвяцілі яе ў 1644 г. і ходзяць усе разам туды.

Восенню гэтага ж года мсціслаўцы проста не пусцілі Казінскага ў горад. Стрэлам з ратушы быў узняты ўвесь горад, і людзі са зброяй выйшлі за гарадскі мост, у выніку чаго Казінскі вымушаны быў вярнуцца ў манастыр. Мсціслаўцы крычалі ад'язджаючаму архімандрыту, што раней чым ён дакажа ім, што яны павінны быць у ўніі, ён атрымае тое, што адбылося ў Віцебску[141], намякаючы на віцебскіе падзеі 1623 г., звязаныя з забойствам Іасафата Кунцэвіча.

---

[138] Марзалюк І. А. Людзі даўняй Беларусі: этнаканфесійныя і сацыякультурныя стэрэатыпы (X–XVII стст.). – Магілёў: МДУ ім. А. А. Куляшова, 2003. – С. 123.

[139] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 316. – Арк. 309–311.

[140] Заборовский Л. В. Католики, православные, униаты. Проблемы религии в русско-польско-украинских отношениях конца 40-х – 80-х гг. XVII в. Документы. Исследования. – М.: Памятники исторической мысли, 1988. – Ч. 1. – С. 63, 68.

[141] Жудро Ф. Из истории взаимоотношений между православными и униатами. – С. 270.

Неаднаразова адбываліся спрэчкі паміж Пустынскім кляштарам і мясцовым насельніцтвам за зямельныя грунты, якія зараз месцічы горада не жадалі аддаваць манастыру. У 1646 г. з-за гэтага адбыўся выступ жыхароў Мсціслава супраць мсціслаўскага Пустынскага базыльянскага кляштара двухтысячным натоўпам мужчын «не считая женщин»[142]. Барацьба гэта ўвесь час набірала ход, і, магчыма, Казінскі пры падтрымцы шляхты выйграў бы яе, але распачаліся падзеі, звязаныя з казацкім рухам 1648–1653 гг.

Згодна са Збароўскім мірам 1650 г., кароль Ян Казімір абяцаў вынішчыць унію і супакоіць праваслаўных. Некаторыя падзеі, што адбываліся ў Мсціславе, сведчаць пра тое, што сапраўды стан уніятаў ў горадзе тады быў не зусім добрым. Так, у 1650 г. намеснік Казінскага Іоў Зарэцкі скардзіўся на тое, што народ не пусціў яго ў храм і ён выратаваўся толькі дзякуючы шляхце. Мсціслаўскія мяшчане казалі яму: «нам панове бурмистры, райцы и весь магистрат росказали и послали нас абы тебе на смерть забили, бо мы все местом здужаем заплатить хоть и самого архимандрита и васъ чернцовъ его позабиваемъ и напотомъ где колвекъ потрафифши, будемъ бити васъ юниятовъ яко пъсовъ».

Больш за тое, у 1650 г., калі на Мсціслаўскую праваслаўную епіскапію ўступіў Іосіф Кананоўіч-Горбацкі, ён прыслаў сюды свайго ўпаўнаважанага Канстанціна Неграбіцкага, які з дапамогай мясцовага святара Андрэя Вяроўкі і праваслаўных месцічаў пазабіраў у ўніятаў усе былыя праваслаўныя храмы: Св. Троіцы, Св. Міколы Горнага ў замку, Св. Міколы на таргавішчы, Уваскрасення Гасподня, Св. Пятніцы, Св. Івана, Св. Іллі і пляцы храмаў Св. Афанасія і Св. Спаса, якія згарэлі некалькі раней[143].

Аднак калі ўнутрыпалітычная сітуацыя ў краіне змянілася і войскі Рэчы Паспалітай зноў пачалі атрымліваць перамогі над казакамі, то кароль адразу адмовіўся ад сваіх былых абавязацельстваў па вяртанні праваслаўным цэрквам.

У кастрычніку 1653 г. была прызначана камісія па вяртанні Казінскаму цэрквам, якімі ўніяты валодалі згодна з прывілеямі караля Уладзіслава. Аднак калі 21 сакавіка 1654 г. каралеўскія камісары прыехалі, каб ажыццявіць каралеўскае распараджэнне, і запрасілі для гэтага намесніка Пустынскага архімандрыта Клімента Крукоўскага, то мяшчане і праваслаўны клір сілай не дазволілі гэта зрабіць.

Па словах Крукоўскага, нягледзячы на тое, што быў зачытаны каралеўскі загад, камісары не былі дапушчаны ні ў саборны Троіцкі храм, ні ў іншыя храмы. Справа набыла вялікі размах, асабліва пасля таго, як па распараджэнні магістрата пачалі біць ў гарадскі звон.

Сабраўся вялікі ўзброены натоўп, і, па словах Крукоўскага, яго самога ледзь не забілі, гаворачы, што «будетъ тебе такъ какъ вашему душехвату в Витебске». Месцічы пагражалі ўніятам «скорее сабля наша па каркахъ техъ поповъ униатовъ постанетъ, чемъ наши церкви возъмутъ». Ну а калі камісары пайшлі

---

[142] Копысский Э. Ю. Экономическое развитие городов Белоруссии... – С. 32, 115.

[143] Жудро Ф. Из истории взаимоотношений между православными и униатами. – С. 271.

па іншых храмах, то людзі крычалі ім: «не отваживайтесь дальше идти, ибо до горла нашего ни водной церкви и добръ церковныхъ не уступимъ»[144].

Безумоўна, распачаты ў Мсціславе канфлікт, калі месцічы адмовіліся выканаць каралеўскі рэскрыпт, скончыўся б для яго жыхароў вельмі дрэнна, аднак пачалася вайна з Рускім царствам і, у некаторым сэнсе, выратавала іх ад каралеўскага гневу.

Калі гарадскія цэрквы былі прадметам барацьбы паміж праваслаўнымі і ўніятамі, то Пустынскі і Ануфрыеўскі кляштары заставаліся ўніяцкімі. Апошні ў 1632 г. з фундушнымі маёнткамі быў перададзены каралём Жыгімонтам III у пажыццёвае кіраўніцтва епіскапу П. Корсаку. У 1650-х гг. Ануфрыеўскі кляштар з'яўляецца ў крыніцах як архімандрыя – прэлатура базыльянскай іерархіі. Кляштар адносіўся да ўніяцкай Смаленскай архіепіскапіі, архіепіскапы якой па чарзе атрымлівалі забеспячэнне з Ануфрыеўскага кляштара. У гэтых адносінах з кляштарам былі цесна звязаны першыя чатыры смаленскія ўніяцкія архіепіскапы: Леў Крэўза, Андрэй Квасінскі-Злоты, Варлаам Казінскі і Міхаіл Пашкоўскі.

Стан размешчанага побач з рускай мяжой кляштара ў XVII ст. не заўсёды быў добрым. Кангрэгацыя айцоў-базыльян, якая адбылася ў 1652 г. у Менску, дакарала Ануфрыеўскага архімандрыта ў тым, што кляштар знаходзіцца ў запусценні і без законнікаў[145]. Хаця ён у сярэдзіне XVII ст. з'яўляўся даволі буйным зямельным уласнікам. Акрамя старых вёсак, якімі ён валодаў з часоў мсціслаўскіх князёў (Ануфрыева, Сялко, Камаровічы, Галоўчын, Пясчынічы), у XVII ст. крыніцы згадваюць у яго ўладаннях вёскі Міцькаўшчына, Асецішча, «Скверета», Палянка, Сялюты, Студзянец[146].

Адносна канфесійнай прыналежнасці трэцяга манастыра – Мікольскага – у пачатку XVII ст. звестак не захавалася. Аднак улічваючы, што ён падпарадкоўваўся Пустынскаму манастыру, можна меркаваць, што ён таксама быў захоплены ўніятамі.

Паступова, з адраджэннем жыцця праваслаўнай царквы, бліжэй да сярэдзіны XVII ст. пачалося будаўніцтва новых праваслаўных манастыроў на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства.

Так, у гэты час замест адабраных базыльянамі Пустынскага і Ануфрыеўскага праваслаўных манастыроў узнікае новы праваслаўны манастыр – Тупічэўскі, які, згодна з паданнем, быў заснаваны каля Мсціслава, ва ўрочышчы Тупічэўшчына, на месцы з'яўлення іконы Божай маці (мал. 84, 85). Фундатарамі манастыра былі крайчы Мсціслаўскага ваяводства Казімір Маскевіч і яго жонка, якім належала ўрочышча. Яны на месцы з'яўлення іконы пабудавалі царкву Св. Духа, але сам манастыр пабудаваць не паспелі. Паміраючы, яны ў тэстаментах загадалі сваім сынам Філімону, Самуілу і Марціну выканаць іх волю і пабудаваць манастыр.

---

[144] Жудро Ф. Из истории взаимоотношений между православными и униатами. – С. 272–273.

[145] АСДОИСЗР. – Т. 12. – С. 50.

[146] ИЮМ. – Вып. 25. – С. 317; АЮЗР. – Т. 14. – С. 225–226.

Будаўніцтва галоўнага храма Тупічэўскага манастыра, храма Сашэсця Святога Духа, пачалося ў 1641 г. А першага кастрычніка 1645 г. ён быў асвечаны мітрапалітам Мсціслаўскім, Аршанскім і Магілёўскім Сільвестрам Косавым. Адразу ж з будаўніцтвам храма ў горадзе была заснавана праваслаўная школа, якая знаходзілася ў падпарадкаванні Тупічэўскага манастыра да 1771 г. У канцы XVII ст. манастыру «закладным правам» былі перададзены дзве вёскі – Вялікая і Малая Лешчанка[147]. Манастыр заставаўся праваслаўным на працягу ўсёй сваёй гісторыі і ніколі не быў у падпарадкаванні ўніяцкіх епіскапаў.

Абіцель першапачаткова мела адзін храм на сваім падворку. Самы старажытны храм манастыра, які існаваў да 30-х гадоў XX ст., – халодная, драўляная на каменным падмурку царква Сашэсця Святога Духа знаходзілася ў сярэдняй частцы манастырскага комплексу, мела памеры 24,1 × 23,4 м, адзін цэнтральны купал і чатыры бакавых (мал. 86).

Купал абапіраўся на высокі васьмівугольны барабан, у якім былі прарэзаны вокны, і завяршаўся светлавым ліхтаром і размешчанай на ім вежачкай. Да храма, па яго перыметры, была прыбудавана крытая галерэя, сцены якой былі ўпрыгожаны сюжэтамі з ваеннай гісторыі Мсціслава. У 1870 г. балкон і засень былі знішчаны, а сама царква абшыта дошкамі і зафарбавана алейнымі фарбамі.

Жывапісам былі ўпрыгожаны ўсе унутраныя сцены і скляпенні храма, а таксама сцены звонку. Усяго ў царкве

Мал. 84. Абраз Тупічэўскай іконы Божай Маці. Фота пачатку XX ст.

Мал. 85. Абраз Тупічэўскай іконы Божай Маці. Спіс пачатку XXI ст.

[147] Пятницкий И. Тупичевский монастырь Могилевской епархии. Исторический очерк. – 2-е изд. с изобр. Тупичевской иконы Божьей матери. – Могилев на Днепре: Губ. типогр., 1907. – С. 30; Горючко П. С. Материалы по истории архиерейского дома и монастырей Могилевской епархии конца XVIII и начала XIX столетий // МЕВ. – 1902. – № 24. – Часть неофициальная. – С. 329.

Мал. 86. Мсціслаў. Малюнак пачатку XX ст. з выявай старажытнага храма Тупічэўскага Св. Духава манастыра. Від з захаду

налічвалася больш за 70 мастацкіх кампазіцый на біблейскія тэмы. У верхняй частцы барабана купала знаходзіўся цыкл роспісаў «Сем чыноў ангельскіх», пад імі – выявы юродзівых і пустыннікаў, лікі мучанікаў, апосталаў і прарокаў. У ніжнім ярусе – выявы евангелістаў.

Па перыметры сцен храм быў распісаны на евангелічныя тэмы. Сцэны з жыцця Хрыста займалі алтар і паўднёвую сцяну, з жыцця Багародзіцы – паўночную сцяну. У прытворы былі размешчаны сцэны пакут першых хрысціян[148].

Роспіс Святадухаўскай царквы Тупічэўскага манастыра па стылявых прыкметах і манеры рысунка неаднолькавы. Тут адчуваюцца два ўплывы. Адзін з іх відавочна імкнецца да народнага густу і рэалізму, з'яўляецца прыкладам таго самабытнага мастацтва, якое дасягнула росквіту ў Беларусі ў XVII ст. Другім вытокам з'яўляецца ўстойлівая іканапісная традыцыя, але павевы часу і стылю таксама наклалі на яе свой адбітак. У некаторых кампазіцыях выразна адчуваецца стыль барока. У мастацкім почырку роспісаў адчуваецца розніца, што сведчыць пра тое, што, як і заўсёды, роспіс рабіўся галоўным майстрам і чаляднікамі[149].

Храм меў два прытворы: галоўны – Сашэсця Святога Духа і левы бакавы, у гонар Вялікамучаніка Георгія. Перадалтарны іканастас – разны, залачоны,

[148] Церашчатава В. В. Старажытна-беларускі жывапіс XI–XVIII стст. – Мінск: Навука і тэхніка, 1986. – С. 100–102.

[149] Тамсама. – С. 106–107.

меў пяць ярусаў. Цудатворная ікона знаходзілася ў ніжнім ярусе, з левага боку ад Царскіх варотаў.

Цёплы, драўляны на каменным падмурку храм Уводзінаў у храм Прасвятой Багародзіцы памерамі 12,1 × 6,4 м быў пабудаваны ў 1771 г. Да яго прымыкалі келлі настаяцеляў. Трэцяя царква – Свяціцеля Мікалая – была пабудавана раней XVIII ст. і знаходзілася на верхнім ярусе званіцы[150] (мал. 87).

З самага пачатку Тупічэўскі манастыр адносіўся да групы праваслаўных манастыроў, якія аб'ядналіся вакол Аршанскага Куцеінскага манастыра, і ўжо ў першай палове XVII ст. быў цэнтрам дзе хаваліся манахі, што збягалі з манастыроў, якія перайшлі ў унію.

Тупічэўская ікона Божай Маці была вельмі паважанай не толькі на Мсціслаўшчыне, але яна карысталася павагай і ў наваколлях Магілёва і Смаленска, і сюды ішлі паломнікі за выратаваннем. Пераняўшы каталіцкую традыцыю, побач з іконай ў знак падзякі пакідалі срэбраныя муляжы (воты) органаў, якія яна вылечыла: пяць рук, дзевяць ног, восем вушэй, тры сэрцы, дзесяць таблічак з выявай чалавека ў поўны рост[151] (мал. 88).

Магчыма, тады ж, у другой чвэрці XVII ст. быў арганізаваны невялікі праваслаўны манастыр пры крычаўскай царкве Св. Іллі. Ён сціпла згадваецца



Мал. 87. План Тупічэўскага манастыра згодна з Генеральным межаваннем 1783–1784 гг.

[150] Пятницкий И. Тупичевский монастырь Могилевской епархии. – С. 34.
[151] Тамсама. – С. 11, заўвага 1.

Мал. 88. Пячатка Тупічэўскага манастыра 1736 г. (па: Цітоў А. Геральдыка Беларусі. Мінск, 2007)

ў жалаванай грамаце жыхарам Крычава і воласці цара Аляксея Міхайлавіча ў 1654 г.[152] Аднак потым ён ніколі болей не згадваўся ў пісьмовых крыніцах, і што з ім стала, невядома. Магчыма, ён загінуў у віхуры падзей вайны 1654–1667 гг., болей не адрадзіўся, а сама царква заставалася прыходскім храмам да 1940 г.

У 1654 г. на царкоўнае жыццё праваслаўных Мсціслаўскага ваяводства пачала аказваць уплыў Маскоўская патрыярхія. Гэта было выклікана заключэннем Пераяслаўскай рады, у выніку якой левабярэжная Украіна і сталіца мітраполіі Кіеў апынуліся ў складзе Рускага царства. Склалася парадаксальная сітуацыя, калі цэнтр мітраполіі і яе меншая частка апынуліся ў дзяржаве, з якой праз паўгода пачалася вайна, а большая частка Кіеўскай мітраполіі засталася ў Рэчы Паспалітай. Тым не менш, з самага пачатку Масква пачала выстаўляць прэтэнзіі на кіраванне ўсёй кананічнай тэрыторыяй Кіеўскай мітраполіі Канстанцінопальскага патрыярхату і пераход яе ў склад Маскоўскага патрыярхату.

Аднак гэтым намаганням Масквы супрацьстаяў кіеўскі мітрапаліт С. Косаў і нават Багдан Хмяльніцкі, якія бачылі Кіеўскую мітраполію выключна ў падпарадкаванні Канстанцінопальскага патрыярха[153].

Падзеі вайны 1654–1667 гг. для Мсціслаўскага ваяводства былі асабліва жудаснымі. У яе выніку насельніцтва ваяводства, як адзначалася вышэй, скарацілася на 70%. Безумоўна, гэта не магло не адлюстравацца і на жыцці царквы, тым болей, што захопнікі не шкадавалі не толькі каталіцкія і ўніяцкія храмы, але і праваслаўныя святыні.

У выніку маскоўскага пагрому Мсціслава 22 ліпеня 1654 г. войскамі рускага князя А. Н. Трубяцкога былі знішчаны ўсе храмы. Таму ўжо восенню 1654 г. мсціслаўскія святары прасілі рускага цара аб дапамозе іх адраджэння. На будаўніцтва храмаў яны атрымалі царскі дазвол, а вось бласлаўленне мітрапаліта цар прызначыў прасіць у мітрапаліта казанскага і свірскага Карнілія, таму што іх новы епіскап хаця і быў ужо нарачоны, але не быў пастаўлены на епіскапію. А кіеўскі мітрапаліт С. Косаў адмаўляўся прызнаць главенства маскоўскага патрыярха над мітраполіяй Канстанцінопальскага патрыярхату.

Тым не менш, у выніку спусташэння воласці Мсціслава гарадскія святары не мелі магчымасці адбудаваць храмы. І нават для таго, каб адбудаваць мсціс-

[152] БЭФ. – Т. 2. – С. 96–97.

[153] Mironowicz A. Silwester Kossow władyka białoruski metropolita kijowski. – Białystok, 1999. – S. 87–100; Bendza M. Inkorporacija metropolii kijowskiej do patriarchatu moskowskiego // Autokefalia kościoła prawosławnego w Polsce. – Białystok, 2006. – S. 69–72.

лаўскі саборны Троіцкі храм, яго будаўнічы Яўсей і дыякан Філарэт вымушаны былі двойчы звяртацца да цара за дапамогай. Яны прасілі ў Аляксея Міхайлавіча вярнуць храму млын, якім раней карысталіся траецкія святары і, улічваючы той факт, што базыльянскі Пустынскі кляштар пасля прыходу рускіх войскаў стаяў пустым і яго вёскі засталіся без гаспадара, прасілі цара даць ім хаця б адну вёску, размешчаную каля кляштара, у якой было 15 гаспадароў.

Цар даў згоду на вяртанне млына, але адносна пустынскай вёскі будаўнікі Троіцкага храма атрымалі правы толькі на часовае карыстанне ёю, да таго часу, пакуль не адродзяцца вёскі, што належалі Траецкай царкве[154].

Трэба адзначыць, што Пустынскі манастыр пасля прыходу сюды рускай адміністрацыі адразу стаў аб'ектам намераў праваслаўнага кліра. Акрамя святароў Траецкага храма, на яго ўладанні прэтэндаваў і Дарафей, архімандрыт Тупічэўскага манастыра. Ён таксама прасіў у цара дапамогі ў адраджэнні свайго знішчанага манастыра, аднак атрымаў ад Аляксея Міхайлавіча толькі 50 рублёў, а пытанне пра надзяленне землямі цар вырашыў адкласці[155]. Пустым у 1655 г. стаяў і Ануфрыеўскі манастыр. Дазвол на яго адраджэнне ў гэты год атрымаў ад цара Аляксея Міхайлавіча святар магілёўскай Спаскай царквы Ярэмій[156].

Тым не менш, нягледзячы на цяжкасці, ужо ў 1658 г. на Замкавай гары Мсціслава былі адбудаваны Мікольскі храм і брацкая царква, ролю якой выконвала царква Успення Прасвятой Багародзіцы. А да 1664 г. у горадзе была адбудавана і царква Уваскрасення Хрыстова[157].

Трэба прызнаць, што праваслаўная паства Мсціслаўскай епіскапіі, як і само царкоўнае жыццё на Мсціслаўшчыне, былі ў пэўнай ступені ў загане падчас вайны 1654–1667 гг. Справа ў тым, што пасля смерці ў першай чвэрці 1653 г. мсціслаўскага епіскапа Іосіфа Гарбацкага да пачатку вайны сюды так і не быў прызначаны новы епіскап.

Пасля захопу гэтых зямель Масквой рускі патрыарх Нікан таксама не спяшаўся прызначыць сюды новага епіскапа і сам кіраваў справамі Мсціслаўскай епархіі, як і справамі іншых епархій, якія перайшлі пад уладу Маскоўскай дзяржавы.

Так, у 1655 г. ён пасылаў сюды намесніка Іверскай Свята-Азерскай абіцелі Філафея з братам Серапіёнам «...для ради всякого церковного исправления монастырей». Ён увесь час марыў падначаліць сабе Кіеўскую мітраполію.

Пасля смерці кіеўскага мітрапаліта С. Косава (красавік 1657 г.) і Б. Хмяльніцкага (жнівень 1657 г.) руская адміністрацыя зноў пачала справу па падначаленні сабе Кіеўскай мітраполіі. Аднак абраны новы гетман Іван Выганоўскі працягнуў лінію свецкай улады па захаванні Кіеўскай мітраполіі пад верха-

---

[154] АЮЗР. – Т. 14. – С. 225–226, 315, 319.

[155] Тамсама. – С. 224.

[156] Тамсама. – С. 477–479.

[157] ИЮМ. – Вып. 24. – С. 419–423, 443; АВК. – Т. 34. – С. 311, 312; НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 330. – Арк. 146 адв.

венствам Канстанцінопальскага патрыярхату. На саборы па выбарах новага кіеўскага мітрапаліта ён падтрымаў кандыдатуру Дыянісія Балабана, які таксама быў прыхільнікам захавання мітраполіі ў складзе Канстанцінапальскага патрыярхату.

Яго абранне на мітрапаліцкую кафедру 16 снежня 1657 г. было зацверджана ў сакавіку 1658 г. у Канстанцінопалі. Адначасова, не жадаючы знаходзіцца пад пільным рускім наглядам, мітрапаліт Дыянісій пакідае Кіеў і першапачаткова пераязджае ў Слуцк, а потым у Луцк.

Масква апынулася ў складанай сітуацыі, калі сталіца мітраполіі засталася без пастыра, а абранне новага, паслухмянага ёй мітрапаліта прывяло б да ўскладнення адносін з усяленскім Канстанцінопальскім патрыярхам, на што Масква не была гатова пайсці. У гэтых умовах адзінае, на што рускі ўрад змог пайсці, гэта прызначыць адміністратара на Кіеўскую мітраполію – нежынскага пратапопа Максіма Філімановіча[158]. Аднак фактычна пад яго верхавенствам была толькі адна Чарнігаўская епархія Кіеўскай мітраполіі Канстанцінопальскага патрыярхату.

Падобная сітуацыя, калі сам патрыярх кіраваў Мсціслаўскай епархіяй, цягнулася да 4 траўня 1661 г., калі ў Маскве пад імем Мефодзія на вакантную Мсціслаўскую епархію быў прызначаны адміністратар Кіеўскай мітраполіі Максім Філімановіч. Аднак даволі хутка Мсціслаў быў вызвалены з-пад улады Масквы, і новапаложаны епіскап Мсціслаўскі і Аршанскі Максім так ніколі і не змог пабываць у прызначанай яму епіскапіі[159]. У гэтым жа годзе у Рэчы Паспалітай быў прызначаны свой новы праваслаўны епіскап Мсціслаўскі, Аршанскі і Магілёўскі – Іосіф Нелюбовіч-Тукальскі, які і пачаў сваю дзейнасць на вызваленых землях.

Больш за тое, прызначэнне на Кіеўскую мітраполію і Мсціслаўскую епархію Максіма Філімановіча выклікала рашучы пратэст Канстанцінопаля. Канстанцінопальскі патрыярх Парфеній IV на Вялікі пост 1662 г. за гэтыя дзеянні – умяшанне Масквы ў справы Канстанцінопальскага патрыярхату – праклаў маскоўскага патрыярха Піцірыма[160].

Пачатак мірнага жыцця Рэчы Паспалітай паспрыяў аднаўленню царкоўнага жыцця, вяртанню манастыроў былым гаспадарам і арганізацыі новых манастыроў. Да 1663 г. базыльянскімі зноў сталі Пустынскі і Ануфрыеўскі кляштары[161], а ў 1664 г. згадваецца Пацолтаўскі манастыр, у якім на той час было дзве царквы – Успення Прасвятой Багародзіцы і Мікольскі храм. Улічваючы, што ў крыніцы згадваецца пра існаванне ў Пацолтаве яшчэ нейкага «старога царковішча», то гэты манастыр, верагодна, меў пад сабой нейкую аснову, маг-

[158] Bendza M. Inkorporacija metropolii kijowskiej do patriarchatu moskowskiego. – S. 78.
[159] Макарий. История русской церкви. – Кн. 7, отд. 2. – С. 58, 273.
[160] Bendza M. Inkorporacija metropolii kijowskiej do patriarchatu moskowskiego. – S. 79.
[161] ИЮМ. – Вып. 24. – С. 453–454.

чыма, у выглядзе звычайнага прыходскага храма[162]. Аднак, акрамя гэтай адзінай згадкі 1664 г., ніякіх іншых даных пра Пацолтаўскі манастыр няма.

У 1665 г. у в. Мазалава быў заснаваны жаночы Спаса-Праабражэнскі Успенскі праваслаўны манастыр. У манастыры павінна было быць дзве царквы – Св. Спаса і Праабражэння Гасподня. На заснаванне манастыра фундуш дала Марыяна, дачка мсціслаўскага стольніка Мікалая Сухадольскага: млын з фолюшам на р. Белая Натапа і тры вёскі – Мазалаўшчына (11 гаспадароў), Балакараўшчына (17 гаспадароў) і Малахава (Зубаўшчына – 1 гаспадар). У 1678 г. гэты фундуш быў зацверджаны пастановай сейма[163].

Пісьмовых крыніц па гісторыі манастыра захавалася вельмі мала. Вядома толькі, што перад 1727 г. Мазалаўскаму праваслаўнаму манастыру рускай графіняй Чарнышовай была падаравана копія Балыкінскай цудатворнай іконы Божай маці, якая карысталася павагай ў навакольлях Мсціслава[164].

Манастыр заставаўся праваслаўным да 1727 г., калі манахі-базыльяне Пустынскага манастыра сілай выгналі праваслаўных манахінь з Мазалава і ўвялі ў манастыр сясцёр-базыльянак. Пад верхавенствам базыльянак манастыр заставаўся да 1788 г., калі зноў быў вернуты праваслаўнай царкве[165].

У 1669 г. на тэрыторыі ваяводства ўжо існаваў Вохарскі (суч. в. Вохар Чэрыкаўскага раёна) Праабражэнскі мужчынскі манастыр, ігуменам у якім быў Фёдар Круглік. Калі ён быў заснаваны і да якой канфесіі першапачаткова адносіўся, дакладна невядома. Згодна з некаторымі данымі, ён быў заснаваны ў пачатку XVII ст.[166] У пачатку XIX ст. існавала паданне, што манастыр быў заснаваны згодна з воляй князя Радзівіла, канцлера ВКЛ, крычаўскага старасты, і першым яго насельнікам быў нейкі Аркадзь. У апошнія часы нават з'явілася ўдакладненне, што фундатарам манастыра быў крычаўскі староста Міхал Казімір Радзівіл[167]. Між тым той факт, што манастыр існаваў ужо ў 1669 г., а Радзівілы сталі крычаўскімі дзяржаўцамі толькі ў 1670 г., сведчыць пра тое, што ў паданне ўкралася нейкая блытаніна.

Хутчэй за ўсё, манастыр быў заснаваны ў пачатку другой паловы XVII ст. і яго заснавальнікам быў хтосьці з роду Пацаў, якія з другой трэці XVII ст.

---

[162] ИЮМ. – Вып. 24. – С. 466–467.

[163] Тамсама. – Вып. 14. – С. 512, 520; Зверинский В. В. Материал для историко-топографического исследования о православных монастырях в Российской империи. – СПб.: Тип. В. Безбородько и К°, 1890. – Т. 1. – С. 174. № 276; Горючко П. С. Материалы по истории архиерейского дома. – С. 331; Грыгаровіч І. І. Беларуская іерархія. Да тысячагоддзя хрысціянства на Беларусі. – Мінск: БелЭн, 1992. – С. 51.

[164] Chomik P. Kult ikon Matki Boskiej w Wielkim Księstwie Litewskim w XVI–XVIII wieku. – S. 104.

[165] Горючко П. С. Материалы по истории архиерейского дома. – С. 331.

[166] Путевые заметки при обозрении церквей Могилевской епархии преосвященным Мисаилом, епископом Могилевским и Мстиславским в текущем 1898 г. // МЕВ. – 1898. – № 36. Часть неофициальная. – С. 577.

[167] Грыгаровіч І. І. Беларуская іерархія. – С. 85–86; Mironowicz A. Monastery diecezji białoruskiej // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – T. 29. – Białystok, 2008. – S. 5.

трымалі Крычаўскае староства ў дзяржанні. Пра апошняе ўскосна сведчыць і самае першае згадванне Вохарскага манастыра ў крыніцах.

Так, у 1669 г. манастыр упершыню згадваецца ў сувязі з запісам фундуша на яго Мікалая Стэфана Паца ў кнігі мсціслаўскага гродскага суда. Аднак калі быў нададзены сам фундуш, крыніца не ўдакладняе. Але ў любым выпадку гэта магло здарыцца не раней за 1642 г., калі Мікалай Стэфан Пац атрымаў ад сваёй маці Крычаўскае староства ў дзяржанне.

1669 год – гэта самая ранняя на сённяшні дзень згадка пра Вохарскі манастыр. Нават у пачатку XIX ст., калі на працягу амаль 40 гадоў разбіраліся спрэчкі з-за зямельных уладанняў паміж панамі Галынскімі і Вохарскім манастыром ў Чэрыкаўскім павятовым земскім архіве, больш раннія крыніцы па гісторыі манастыра не былі выяўлены[168].

Таму можна сцвярджаць, што Вохарскі манастыр быў заснаваны ў той час, калі Крычаўскае староства было ў дзяржанні ў Пацаў, прадстаўнік роду якіх Крыштаф Зыгмунд Пац у сярэдзіне XVII ст. быў канцлерам ВКЛ, а яго брат і паплечнік ва ўсіх справах Мікалай Стэфан Пац быў крычаўскім дзяржаўцам у 1642–1670 гг. У гэтай сувязі прыцягвае ўвагу 1652 г., калі Мікалай Стэфан Пац заснаваў на землях Крычаўскага староства некалькі храмаў – у Камаровічах, Саматэвічах. Магчыма, у гэту дзейнасць укладваецца і заснаванне Вохарскага манастыра. А Радзівілы трапілі ў паданне выпадкова альбо ў выніку таго, што яны дапамагалі адрадзіць манастыр, пасля таго як шведы спалілі яго ў 1708 г.

Манастыр быў праваслаўным у пачатку XVIII ст., бо згадваецца сярод праваслаўных манастыроў у грамаце караля Аўгуста II ад 1720 г., якая пацвярджала правы праваслаўных манастыроў на вечныя часы[169]. Аднак у крыніцы канца XVIII ст. адзначаецца, што ён «zdawna ufundawany zakony bazylego» – ад самага пачатку свайго існавання быў базыльянскім[170]. Акрамя таго, у 1669 г. згадваецца «ксёндз» вохарскі, што дае права сцвярджаць, што манастыр у сярэдзіне XVII ст. сапраўды быў базыльянскім. Магчыма, манастыр хаця і быў першапачаткова заснаваны базыльянамі, але з-за адсутнасці ксяндзоў і паствы хутка быў зачынены як базыльянскі кляштар і ў канцы XVII – пачатку XVIII ст. дзейнічаў як праваслаўны манастыр.

У 1708 г. манастыр быў спалены шведскімі войскамі, але ўжо ў 1711 г. зноў быў адноўлены[171]. У XVIII ст. у ім была адна драўляная царква Св. Праабражэння Гасподня. У пачатку другога дзесяцігоддзя XVIII ст. манастыр становіцца аб'ектам намераў базыльян, што вымусіла манахаў у 1718 г. звярнуцца да рускага цара Пятра I, каб той абараніў іх ад уніятаў[172]. Аднак гэта калі іх

[168] НГАБ. – Ф. 2310. – Воп. 1. – Адз. зах. 75. – Арк. 68.
[169] АрЮЗР. – Т. 4. – С. 404.
[170] НГАБ. – Ф. 2310. – Воп. 1. – Адз. зах. 5. – Арк. 1.
[171] Тамсама.
[172] АЗР. – Т. 5. – С. 120.

і выратавала, то толькі часова. У 30-я гады XVIII ст. манастыр быў абернуты ў унію і заставаўся пад юрысдыкцыяй уніяцкіх мітрапалітаў да 1795 г.[173]

Пра Вохарскі кляштар захавалася вельмі мала звестак. Вядома толькі, што ён знаходзіўся на левым беразе р. Сож, насупраць сучасных вёсак Вохар і Вусце Чэрыкаўскага раёна. Падыход да манастыра быў толькі з боку Сожа. З астатніх бакоў падыходы да яго былі перакрыты азёрамі Карась і Велье, а з поўдня – балотам[174]. Падчас яго заснавання ў якасці фундуша манастыру былі «наданы грунты на 0,5 мілі ў тры бакі і на 50 асьмін хлеба і 88 фунтаў»[175].

Манастыр быў даволі бедным, акрамя таго яго неаднарозова абрабоўвалі ў сярэдзіне XVIII ст. Захавалася некалькі скаргаў яго насельнікаў пра рабаўніцтва. Так, першы раз аго абрабавалі ў 1761 г., а ў 1767 г. ён быў абрабаваны цыганамі па загадзе пана Гедройца. У гэтыя гады настаяцелем манастыра з'яўляўся Давыд Латашынскі[176].

У пачатку XIX ст. (1821 г.) у ім была старая драўляная крыжовакупальная царква Св. Праабражэння Гасподня памерамі 6 сажняў і 1 аршын на 3 аршына (13,5 × 6,4 м), пабудаваная яшчэ у 1711 г., якая стаяла на мураваным падмурку, была крыта гонтам, мела пяць купалоў. Побач з ёю стаяў драўляны дом ігумена, флігелі для манахаў, у манастыры быў цэлы комплекс гаспадарчых пабудоў[177] (мал. 89). Вохарскі абраз Божай Маці ўвесь час існавання манастыра карыстаўся павагай вернікаў[178].

У другой палове XVII ст. адначасова з існаваннем праваслаўнага мсціслаўскага Св. Духавага манастыра пачалося заснаванне новых праваслаўных манастыроў. Так, у грамаце караля Аўгуста II 1720 г. аб пацвярджэнні правоў праваслаўных манастыроў, акрамя мсціслаўскага Св. Духавага манастыра, згадваецца Касцюкоўскі мужчынскі манастыр, які В. В. Звярынскі лакалізуе ў сучасных Касцюковічах[179]. Аднак ні калі ён узнік, ні да якога часу існаваў, невядома. Пасля гэтага адзінай згадкі звесткі пра гэты манастыр губляюцца.

Тады ж згадваецца пра існаванне праваслаўнага Селіцкага жаночага манастыра, які верагодна, трэба шукаць на тэрыторыі сучаснай в. Манастырок Касцюковіцкага раёна побач з сялом Селіцкім гэтага ж раёна. Існаваў жаночы праваслаўны манастыр і ў в. Царковішча суч. Касцюковіцкага раёна. У пачатку XVIII ст. згадваецца праваслаўны манастыр у Стракайлах, размешчаны

---

[173] Горючко П. С. Материалы по истории архиерейского дома. – С. 310.

[174] Сабинин В. Охорьский Преображенский монастырь // МЕВ. – 1889. – № 21. – Часть неофициальная. – С. 309.

[175] ИЮМ. – Вып. 17. – С. 225–226.

[176] АСДОИСЗР. – Т. 2. – С. LXX; ИЮМ. – Вып. 18. – С. 145–146.

[177] НГАБ. – Ф. 2310. – Воп. 1. – Адз. зах. 62. – Арк. 6–6 адв.

[178] Chomik P. Kult ikon Matki Boskiej w Wielkim Księstwie Litewskim w XVI–XVIII wieku. – S. 154.

[179] АрЮЗР. – Т. 4. – С. 404; Зверинский В. В. Материалы для историко-топографического исследования о православных монастырях в Российской империи. – Т. 3. – С. 82.



Мал. 89. План Вохарскага манастыра згодна з Генеральным межаваннем 1783–1784 гг.

ў Крычаўскай пратапопіі, і нейкі сугучны яму Страйкулаўскі манастыр Мсціслаўскай пратапопіі[180]. Калі першы манастыр, верагодна, існаваў на р. Асцёр на месцы былой в. Стракайлы Шумяцкага раёна, то дзе размяшчаўся апошні манастыр, дакладна не зразумела.

У сярэдзіне XVII ст. пачынаецца адраджэнне і праваслаўных храмаў у гарадах. Так, у Крычаве ў 1667 г. дзейнічалі ўсе праваслаўныя храмы, што згадваюцца ў крыніцах XVI ст., – Св. Мікалая ў замку, Св. Спаса на Забялышчыне, Св. Іллі, Св. Юрыя, Св. Пятніцы, Раства Хрыстова, Уваскрасенская царква. Яны ж згадваюцца і ў інвентары горада 1694 г.[181] Крыніца сярэдзіны XVIII ст. паведамляе, што саборнай крычаўскай царквой быў храм Уваскрасення Хрыстова, а Пятніцкі храм лічыўся брацкім[182].

Верагодна, у гэты ж час адраджаюцца цэрквы і ў іншых буйных сельскіх паселішчах і былых княскіх дварах. Дзве царквы ў 1667 г. згадваюцца ў в. Краснае, храмы былі ў вёсках Падлужжа, Парадніна, Маляцічы, Воўчас, Паланая, Манычы, Ходасы, Сохань, Добрае, Верхаўцы, Вараткова, Колтава, Пірагова, Людагошч, Камень град, Селішча, Пацолтава, Гарадзец. Радамлянская царква

[180] НГАБ. – Ф. 2308. – Воп. 1. – Адз. зах. 317. – Арк. 118–119.

[181] LVIA. – F. SA. – Ap. 1. – Bib. 3806. – P. 13 v.; НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1928. – Арк. 31–32.

[182] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 176. – Арк. 861–863.

Св. Багародзіцы, якая ў 1637 г. адзначалася як уніяцкая, у 1663 г. дзейнічала і была ўжо праваслаўнай[183].

У некаторых буйных вёсках было па некалькі храмаў. Так, акрамя в. Краснае, два храмы (Св. Мікалая і Св. Іллі Прарока) у канцы XVII ст. былі ў в. Камаровічы Палявой воласці Крычаўскага старостава[184] (мал. 90).

У той жа час трэба прызнаць, што пасля вайны 1654–1667 гг. каралеўская ўлада разглядала праваслаўную царкву на тэрыторыі Рэчы Паспалітай у якасці хаўрусніка рускай дзяржавы і адносілася да яе даволі варожа. Асабліва ўскладніўся яе стан пасля паразы Рэчы Паспалітай у кампаніі 1664–1665 гг. ва Украіне.

Анархія, якая пачала панаваць ва Украіне ў грамадскім жыцці, распаўсюдзілася і на царкву. Акрамя адміністратара Кіеўскай епархіі, навязанага Маскоўскім патрыярхатам, у Рэчы Паспалітай пачалася барацьба паміж епіскапамі А. Вініцкім і І. Нелюбовіч-Тукальскім, якія абодва атрымалі прывілеі ад караля на Кіеўскую мітраполію.



● – храм; ✝ – манастыр

Мал. 90. Храмы, што згадваюцца на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства ў XVII ст.: *1* – Ануфрыева; *2* – Батаева; *3* – Баханы; *4* – Бязводзічы; *5* – Вародзькаў; *6* – Вохар; *7* – Верхаўцы; *8* – Воўчас; *9* – Вярба; *10* – Гарадзец (Гарадок); *11* – Добрае; *12* – Дубовіца; *13* – Жаліўе; *14* – Заселле; *15* – Калодзезькі; *16* – Камаровічы; *17* – Камень Грод; *18* – Колтава; *19* – Краснае; *20, 21* – Крычаў; *22* – Людагошча; *23* – Міласлявічы; *24* – Міхайлаўскае; *25* – Мазалава; *26* – Мазыкі; *27* – Маляцічы; *28, 29* – Мсціслаў; *30* – Новае Сяло; *31, 32* – Падсолтава (Пацолтава); *33* – Паланіца; *34* – Парадніна; *35* – Пірагова; *36* – Пустынкі; *37* – Радамля; *38* – Расна; *39* – Рыбынкі; *40* – Саматэвічы; *41* – Сохань; *42* – Селішча; *43* – Слаўнае; *44* – Стракайлава; 45 – Сялец; *46* – Хіславічы; *47* – Ходасы; *48* – Царковішча

Гэта ўнутрыцаркоўная барацьба ўскладнялася яшчэ і мэтанакіраванай дзейнасцю па дыскрэдытацыі і дыскрымінацыі некаталіцкага насельніцтва краіны свецкай уладай у часы панавання караля Яна III Сабескага.

---

[183] LVIA. – F. SA. – Ap. 1. – Bib. 3806. – P. 13 v.–14; РДАСА. – Ф. 145. – Воп. 1. – Адз. зах. 3. – Арк. 524; ИЮМ. – Вып. 24. – С. 414; Тамсама. – Вып. 25. – С. 326–327.

[184] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1928. – Арк. 58–61.

Так, у 1673 г. на сейме была прынята пастанова пра наданне шляхецтва толькі каталікам і ўніятам, у 1678 г. былі забаронены праваслаўныя брацтвы і праваслаўным быў забаронены выезд за мяжу краіны. У 1699 г. праваслаўным было забаронена займаць магістрацкія ўрады[185]. У 1696 г. ВКЛ афіцыйна перайшло на польскую мову ў дзяржаўным справаводстве. Усё гэта прывяло да таго, што шляхта, каб захаваць свае даходы і прывілеі, паступова пераходзіла ў каталіцызм і, адпаведна, з пачатку XVIII ст. пачала пераводзіць у сваіх уладаннях сялян ва ўніяцтва.

З мэтай спыніць усялякія сувязі праваслаўных епіскапаў з замежнымі цэнтрамі ў 1676 г. згодна з канстытуцыяй сейма Кіеўская мітраполія была выведзена з падпарадкавання Канстанцінопальскаму патрыярхату[186]. Паколькі гэта зрабіла свецкая ўлада самастойна, то гэты акт не з'яўляўся кананічным, аднак ён толькі развязаў рукі Маскоўскаму патрыярхату па падпарадкаванні сваёй уладзе Кіеўскай мітраполіі.

Акрамя таго, кароль Ян III Сабескі пачаў актыўна прасоўваць на Кіеўскую мітраполію львоўскага епіскапа І. Шыўлонскага, які схіляўся да ўніі, замест ужо старога, але ўпартага ў праваслаўі і вернага канстанцінопальскаму патрыярхату мітрапаліта І. Нелюбовіч-Тукальскага.

Гэтым скарыстаўся Маскоўскі патрыярхат, які распачаў мэтанакіраваную дзейнасць на карысць таго, каб канстанцінопальскі патрыярх дазволіў правесці выбары, зацвердзіў новага мітрапаліта і кананічна перадаў яму Кіеўскую мітраполію. У чэрвені 1684 г. кіеўскім мітрапалітам быў абраны Гедэон Чацвярцінскі, які разам з гетманам Запарожскага войска звярнуўся да маскоўскага патрыярха, каб той кананічна вырашыў перадачу Кіеўскай мітраполіі са складу Канстанцінопальскага патрыярхату ў Маскоўскі патрыярхат.

Вясною 1686 г. маскоўскае пасольства прыехала ў Канстанцінопаль з мэтаю афіцыйнага зацвярджання абрання Гедэона Чацвярцінскага на Кіеўскую мітраполію і яе перадачы ў склад Маскоўскага патрыярхату. Турцыя, якая ў гэты час вяла вайну са Святой Лігай, каб захаваць нейтралітэт Рускага царства, прымусіла іерусалімскага патрыярха Дасіфея II ухваліць зварот маскоўскіх паслоў. Таксама новы канстанцінопальскі патрыярх Дыянісій IV, пад прэсінгам турэцкіх візіраў, у красавіку 1686 г. выказаў згоду на перавод Кіеўскай мітраполіі пад юрысдыкцыю Маскоўскага патрыярхату. Рашэнне патрыярха Дыянісія IV ухваліў сабор грэчаскай Царквы 6 чэрвеня 1686 г. Такім чынам, у 1686 г. было спынена падпарадкаванне Кіеўскай мітраполіі канстанцінопальскім патрыярхам, якое існавала з моманту хрышчэння Кіеўскай Русі

---

[185] Сагановіч Г. Становішча Праваслаўнай царквы ў другой палове XVII ст. // Тэз. навук. канф. прысвечанай 1000-годдзю Полацкай епархіі і Праваслаўнай царкве на Беларусі. 25 верасня 1992 г. – Мінск, 1992. – С. 52–53.

[186] Мірановіч А. Палітыка Канстанцінопальскага патрыярхату да Кіеўскай мітраполіі ў 988–1686 г. // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – T. 30. – Białystok, 2008. – S. 23.

ў 988 г.[187] Вынік гэтай вялікай палітычнай гульні быў зафіксаваны ў артыкулах Вечнага міру 1686 г. паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай, згодна з якімі Кіеўская мітраполія кананічна стала часткай Маскоўскага патрыярхату.

Адносна дзейнасці ўніяцкай царквы ў сярэдзіне XVII ст. трэба прызнаць, што ў гады акупацыі ўсходніх раёнаў Рэчы Паспалітай рускімі войскамі падчас вайны 1654–1667 гг. руская адміністрацыя зачыняла ўніяцкія царквы і базыльянскія кляштары. Землі кляштараў канфіскоўваліся на карысць праваслаўных манастыроў і цэркваў[188]. Так, адразу пасля захопу рускімі войскамі Мсціслава, ігумен мсціслаўскага Св. Духавага (Тупічэўскага) манастыра Дарафей звярнуўся да цара Аляксея Міхайлавіча з просьбаю забраць у Ануфрыеўскага базыльянскага кляштара вёскі Асецішча, «Скверета», Палянка, Сялюты, Студзянец, Сялко. У Пустынскага базыльянскага кляштара Дарафей прасіў канфіскаваць в. Пустынкі, а ў мсціслаўскіх ксянзоў – в. Прылепава[189].

Пасля вызвалення тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства прыходскія цэрквы ў сваёй большасці заставаліся праваслаўнымі. І ў цэлым трэба прызнаць, што пачынаючы з паўстання Б. Хмяльніцкага і ў часы вайны 1654–1667 гг. стан уніяцкай царквы на ўсходзе краіны значна пагоршыўся. Апошняе было бачна не толькі па скарачэнні колькасці храмаў, але і ў падзеях, што адбываліся сярод яе кіраўніцтва.

Пасля смерці ў 1655 г. уніяцкага мітрапаліта А. Сялявы кіраўніцтва мітраполіяй перайшло да полацкага архіепіскапа Гаўрыіла. Аднак для пацвярджэння яго паўнамоцтваў неабходна было правесці выбары, што ва ўмовах вайны было немагчымым. Таму з 1655 па 1665 г. уніяцкая Полацкая мітраполія заставалася без мітрапаліта. А ў Мсціслаў новы ўніяцкі епіскап Кіпрыян Жахоўскі быў прызначаны толькі ў 1670 г.[190]

У гэты ж час узніклі пытанні і з кіраваннем базыльянскім ордэнам. Рознагалоссі пра тое, хто мае права займаць пасаду протаархімандрыта ордэна – толькі манахі ці і мітрапаліт, – былі пераадолены толькі ў 1686 г., калі было прынята рашэнне, што пасаду протаархімандрыта мог займаць толькі манах ордэна, аднак мітрапаліт захоўваў права склікання кангрэгацый і ўдзелу ў іх. Важнай падзеяй ў развіцці ўніяцкай царквы стала і пацверджанне каралём Янам Сабескім у 1676 г. усіх правоў і прывілеяў уніятаў.

---

[187] Архив Юго-Западной России изданный временною комиссиею для разбора древних актов высочайше учрежденной при Киевском, Подольском и Волынском генерал-губернаторе. – Ч. 1, т. 5. – Акты относящиеся к делу о подчинении киевской митрополии Московскому патриархату (1620–1694). – Киев: Губерн. тип., 1872. – С. 169–171; Мірановіч А. Палітыка Канстанцінопальскага патрыярхату... – S. 24.

[188] Мараш Я. Н. Из истоии борьбы народных масс Белоруссии против экспансии католической церкви. – Минск: Вышэйш. шк., 1969. – С. 103–104.

[189] АЮЗР. – Т. 14. – С. 225–226.

[190] Архіў уніяцкіх мітрапалітаў. Дакументы да гісторыі царквы ў Беларусі XV–XIX стст. у фондзе «Канцылярыя мітрапаліта грэка-уніяцкіх цэркваў у Расіі». Даведнік. – Мінск-Полацк, 1999. – С. 57.

Пасля вайны 1654–1667 гг. пачалося паступовае адраджэнне ўніяцкіх кляштараў. Першапачаткова былі вернуты братам-базыльянам старыя ўніяцкія, былыя праваслаўныя святыні – Пустынскі іАнуфрыеўскі кляштары.

Ануфрыеўскі кляштар ужо ў 1650 г. быў прыпісаны да Смаленскай уніяцкай архіепіскапіі, а пасля вайны 1654–1667 гг., калі Смаленская архіепіскапская кафедра існавала выключна тытулярна,Ануфрыеўскі кляштар стаў рэзідэнцыяй смаленскіх уніяцкіх епіскапаў. Адначасова ў Пустынскім кляштары рашэннем Замойскага сабора 1720 г. быў арганізаваны кафедральны храм для тытулярнай архіепіскапіі[191].

Першапачаткова ў абодвух кляштарах працягвалі існаваць па адным драўляным храме, аднак у канцы XVIII ст. адбываецца далейшае развіццё кляштараў і ў манастырскіх комплексах пачынаецца будаўніцтва новых храмаў.

Згодна з планам 1784 г., комплексАнуфрыеўскага манастыра размяшчаўся ўздоўж дарогі з Мсціслава на Крычаў. Ён меў два карпусы, адкрытыя на дарогу, паміж якімі размяшчалася брама. Паўночны корпус меў форму літары «Г», да яго прымыкаў манастырскі сад. Па цэнтры комплекса размяшчаўся храм. А за храмам, у бок Сожа, размяшчаліся нейкія гаспадарчыя пабудовы (мал. 91).

Мал. 91. ПланАнуфрыеўскага манастыра згодна з Генеральным межаваннем 1783–1784 гг.

[191] Климов С. Онуфрея. – Львов: Изд-во ОО Василиан, 1996. – С. 3.

У Ануфрыеўскім кляштары, акрамя старой прыходскай царквы Св. Ануфрыя, згодна з аднымі данымі, у сярэдзіне XVIII ст. будуецца мураваны Св. Мікольскі храм. Царква была бясстоўпная, зальная, мела трохчасткавую структуру. Да асноўнага аб'ёму храма з усходняга боку была прыбудавана алтарная частка з паўкруглай аспідай. А з захаду да асноўнага аб'ёму храма прымыкаў прытвор з пяціяруснай чацверыковай званіцай. Памеры асноўнага аб'ёму храма – 10 × 24 м[192] (мал. 92).

Мал. 92. Мураваны храм Ануфрыеўскага манастыра пачатку XIX ст.

У той жа час С. Клімаў сцвярджае, што будаўніцтва мураванага храма ў Ануфрыеўскім кляштары пачалося ў пачатку XIX ст. і асвечаны ён быў толькі 29 жніўня 1825 г.[193] Нельга выключыць, што так яно і было на самай справе, і да канца XVIII ст. у кляштары існавала толькі старая драўляная царква. Ва ўсякім выпадку, на плане Ануфрыеўскага кляштара 1784 г. паказаны толькі адзін храм, а на плане 1820 г. іх ужо два – новый мураваны і размешчаная побач старая драўляная царква[194].

Мяркуючы па плане 1820 г., старая царква Св. Ануфрыя была невялікая, з дзвюма вежамі (мал. 93). Дата яе пабудовы невядомая, але ў пачатку XIX ст. яна была ў вельмі дрэнным стане, патрабавала замены даху і вялікага рамонту. Царква мела крыжовакупальную схему з двума бабінцамі. Памеры царквы, мяркуючы па плане 1820 г., былі прыблізна 10 × 16 м.

Старая драўляная царква Св. Ануфрыя да нашых дзён не захавалася. Зараз праз яе падмуркі праходзіць дарога, а побач, у царкоўныя скляпенні, дзе пахаваны манахі, убіты бетонныя слупы, на якіх вісіць трансфарматар.

Згодна з «Инвентаром монастыря Опатства Онуфриевского» за 1823 г., у гэтай старой царкве знаходзілася 5 алтароў. Першы, самы вялікі алтар, быў

[192] Слюнькова И. Н. Монастыри восточной и западной традиции. – С. 438–443.

[193] Климов С. Онуфрея. – С. 7.

[194] Тамсама. – С. 20; РДАСА. – Ф. 1354. – Воп. 245/1. – Адз. зах. А-2, галка сіняя.



Мал. 93. План Ануфрыеўскага манастыра 1823 г. і размешчанай побач слабодкі. (прамалёўка па: Климов С. Онуфрея. Львов, 1996).

Тлумачэнне літар на плане: *A* – каменны недабудаваны манастыр; *B* – драўляная царква Св. Ануфрыя; *C* – цёплая царква; *D* – келлі для архімандрыта; *E* – келлі для манахаў; *F* – трапезная; *G* – канцылярыя; *H* – пакой для штата; *K* – кладавая; *L* – сенцы; *M* – кухня; *N* – стары будынак для экіпажаў і канюшні; *O* – млын; *P* – ветхая сукнавальня «казне принадлежит»; *Q* – карчма; *R* – жылыя хаты, «занимаемые крестьянами поступившими в казенное ведомство»; *S* – «при них сараи и амбары»

у гонар Божай Маці. У ім была драўляная ікона Божай Маці з Назарэта з датай 4052 г. і ўказаннем на фундуш князя Лынгвена-Сямёна ў 6915 г. (1407 г.). Другі алтар быў у гонар Св. Ануфрыя. Драўляная ікона ў ім была з выяваю старца з доўгай сівой барадой – Св. Ануфрыя – і падлетка, які моліцца каля яго ног, верагодна, княжыча Юрыя Лынгвеневіча.

Трэці алтар у гонар Св. Дзевы Марыі не быў апісаны ў інвентары, як і два астатніх – алтары Св. Міколы і Св. Васіля. Вядома толькі, што ў пэўныя часы ікона Св. Васіля ў апошнім алтары мянялася на ікону Бласлаўенага Іасафата. Усе алтары былі разныя[195].

У Пустынскім кляштары ўвесь час быў толькі адзін храм. Ён паказаны і на плане Пустынскага манастыра 1784 г. разам з жылым комплексам і некалькімі драўлянымі пабудовамі (мал. 94). У ім было пяць алтароў: Найсвятой Багамацеры, Св. Ануфрыя, Св. Васілія, Св. Іосіфа і Св. Антонія[196]. Гэты драўляны храм да сярэдзіны XIX ст. ужо не захаваўся. Згодна з апісаннем манастыра 1841 г., у той час ужо ў манастыры стаяў мураваны храм Успення Прасвятой Багародзіцы і яшчэ адзін драўляны храм быў над цудатворнай крыніцай. Акрамя гэтых храмаў крыніца згадвае наяўнасць жылога драўлянага флігеля на мураваным падмурку, у якім жыў настаяцель манастыра.

На адной лініі з гэтым флігелем стаяў двухпавярховы мураваны флігель, у якім размяшчаліся як келлі манахаў, так і памяшканне для трапезы. Побач жа размяшчалася драўляная старая кухня. На поўнач ад флігеля, каля манастырскага сада, знаходзіліся стайня і амбар. Згодна з апісаннем, усе гэтыя пабу-

[195] Климов С. Онуфрея. – С. 7.

[196] НГАБ. – Ф. 3421. – Воп. 1. – Адз. зах. 12. – Арк. 1 адв.–2.



Мал. 94. План Пустынскага манастыра згодна з Генеральным межаваннем 1783–1784 гг.

довы былі старыя і, верагодна, гэты комплекс, апісаны ў 1841 г., прасочваецца на плане манастыра 1784 г.[197]

Аднак недзе паміж 1783 і 1786 гг. у Пустынскім манастыры пачалося будаўніцтва мураванага храма. Ва ўсякім выпадку, у інвентары манастыра 1786 г. ужо адзначаецца, што пачаліся працы па яго будаўніцтве (мал. 95).

Над крыніцай у 1786 г. стаяў новы драўляны храм, які быў складзены са старых бярвенняў. У ім было тры алтары, прысвечаныя Божай Маці Пустынскай, Св. Іосіфу Кунцэвічу і Св. Ануфрыю. Побач стаяла званіца з двума званамі[198].

Верагодна, недзе ў XVIII ст. у гісторыі Пустынскага манастыра і яго святыні іконы Божай Маці адбылася значная падзея. Ікона была каранавана, але калі гэта дакладна адбылося, невядома. Не памятаюць пра гэту падзею і сённяшнія насельнікі манастыра.

Адносна наяўнасці ўніяцкіх храмаў у гарадах і вёсках Мсціслаўскага ваяводства пасля вайны 1654–1667 гг. трэба прызнаць, што даволі доўгі час звестак пра іх наяўнасць не было.

Пасля пераходу Кіеўскай мітраполіі ў склад Маскоўскага патрыярхату адносіны да праваслаўя пагоршыліся. Кароль разглядаў праваслаўных як су-

[197] НГАБ. – Ф. 2311. – Воп. 1. – Адз. зах. 6. – Арк. 1–2 адв.; РДАСА. – Ф. 1354. – Воп. 239/1. – Адз. зах. П-36, галка чырвоная.

[198] НГАБ. – Ф. 3421. – Воп. 1. – Адз. зах. 12. – Арк. 1–5 адв.

Мал. 95. Успенскі касцёл Пустынскага манастыра, пабудаваны ў канцы XVIII ст. Сучасны стан

працоўнікаў з ворагамі дзяржавы – ці то з маскоўскім царом, ці то з Асманскай імперыяй – і рабіў стаўку на каталікоў і ўніятаў, абмяжоўваючы правы праваслаўных.

У выніку за апошнія 20 гадоў XVIII ст. уніяцтва пашырылася ў Рэчы Паспалітай больш чым за ўсё папярэдняе стагоддзе. На мяжы XVII–XVIII стст. з праваслаўя ва ўніяцтва перайшлі тры епархіі (Перамышльская – 1791 г., Львоўская – 1700 г., Луцкая – 1702 г.), а праваслаўнай ў Рэчы Паспалітай засталася толькі адна Беларуская епархія, у склад якой ўваходзіў і Мсціслаў[199].

Таму з пачатку XVIII ст. крыніцы фіксуюць новыя спробы актыўнага распаўсюджвання ўніі на ўсходзе Рэчы Паспалітай. Прычым гэты працэс набіраў моц і насіў гвалтоўны характар, у ім актыўны ўдзел прымала шляхта – гаспадары вёсак. За першыя два дзесяцігодзі крыніцы фіксуюць 16 пераведзеных ва ўніяцтва цэркваў на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства.

З другой чвэрці XVIII ст. пачаўся і новы этап пераводу праваслаўных манастыроў і цэркваў у падпарадкаванне ўніяцкім епіскапам. Прычым гэта таксама адбывалася гвалтоўна і бліжэй да сярэдзіны XVIII ст. большасць праваслаўных манастыроў была пераведзена ў унію. Гэтаму садзейнічалі рашэнні Замойскага сабора 1720 г., які ўмацаваў пазіцыі ўніяцкай царквы і прыняў рашэнні па фактычным правядзенні ў ёй буйной царкоўнай рэформы, накіраванай на ўпарадкаванне нормаў царкоўнага жыцця, умацаванне дысцыпліны,

[199] Марозава С. Міжканфесійныя адносіны // Гісторыя Беларусі: у 6 т. – Т. 2. – С. 165.

уніфікацыю абраднасці з мэтай набліжэння яе да каталіцкай, паляпшэнне духоўнай адукацыі. Наступныя дзесяцігоддзі да ўключэння зямель Усходняй Беларусі ў склад Расійскай імперыі прайшлі пад знакам рэалізацыі саборных пастаноў, што практычна выявілася ў адкрытай лацінізацыі ўніі.

Тым не менш, расійскі урад з XVIII ст. распачынае актыўную дзейнасць па ўмяшанні ў канфесійныя справы Рэчы Паспалітай, матывуючы гэта тым, што абараняе праваслаўных. Асабліва яскрава гэта праявілася ў дачыненні да мсціслаўскага Тупічэўскага манастыра, якому рускі цар Пётр I у 1706 і 1708 гг., а потым і царыца Ганна Іаанаўна выдалі ахоўныя граматы ад пабораў і пастояў рускіх войскаў, калі яны знаходзіліся ў Рэчы Паспалітай. Болей за тое, Пётр I, калі быў у Мсціславе ў 1708 г., наведаў манастыр, падараваў яму царкоўныя кнігі і царкоўнае адзенне[200].

Пасля Замойскага сабора фактычна пачаўся працэс гвалтоўнага і масавага пераводу сялян з праваслаўя ва ўніяцтва. Адначасова з боку каталіцкага кліра даволі частымі былі праявы знявагі ўніятаў: яны сцвярджалі, што ўнія – гэта вера людзей прыніжаных, што яна, як і праваслаўе, – «chłopska wiara».

Вынікам такога гвалту стаў ліст праваслаўных манастыроў да цара Пятра I, у якім яны прасілі апошняга дапамагчы адстаяць праваслаўе. Сярод падпісантаў быў і ігумен Тупічэўскага манастыра. Цар Пётр I вымусіў у 1720 г. караля Аўгуста II выдаць ахоўны прывілей праваслаўным манастырам.

Прыклады гвалтоўнага пераводу праваслаўных цэркваў у ўнію з 20-х гадоў XVIII ст. фіксуюцца нават у ваяводскім цэнтры – Мсціславе. Так, у 1720 г. адбылася спроба захопу царквы Св. Міколы на замку[201]. У 1723 г. мсціслаўскі стольнік Іллініч разам са смаленскім уніяцкім епіскапам Сакалінскім, пры падтрымцы каталіцкай шляхты, ноччу захапілі царкву Св. Іллі і нават пачалі «рубіць шаблямі і страляць» у праваслаўных абаронцаў храма. Раніцай наступнага дня хваляванні ахапілі ўвесь горад: пачаліся сутыкненні паміж праваслаўным насельніцтвам горада і студэнтамі езуіцкага калегіума, якія потым выліліся ў крывавую бойку паміж жыхарамі горада[202]. Трэцяя спроба захапіць праваслаўныя цэрквы была здзейснена ў 1725 г. і тычылася яна цэркваў Св. Спаса і Св. Успення Багародзіцы. Але і яны скончыліся няўдала[203].

Тым не менш, у 1737 г. у Мсціславе ўніяцкімі былі тры храмы: Св. Іллі, Мікольскі, што стаяў у горадзе, і Узвіжання Сумленнага Крыжа. А цэрквы Брацкая (Траецкая), Спаская, Узнясення Багародзіцы, Параскевы Пятніцы, Св. Міколы ў замку, Афанасьеўская і Уваскрасенская заставаліся праваслаўнымі[204].

У 20-я гады XVIII ст. крыніцы змяшчаюць факты прымусовага пераводу і крычаўскіх цэркваў і манастыроў ва ўніяцва. Так, у 1725–1727 гг. у Крычаў-

---

[200] Грыгаровіч І. І. Беларуская іерархія. – С. 69.

[201] Бантыш-Каменский Н. Н. Исторические известия о возникшей в Польше унии. – С. 178, 185.

[202] БЭФ. – Т. 1. – С. 367.

[203] Бантыш-Каменский Н. Н. Исторические известия о возникшей в Польше унии. – С. 242–243, 259.

[204] НГАБ. – Ф. 2308. – Воп. 1. – Адз. зах. 317. – Арк. 118 адв.–119.

скага (Вахорскага) манастыра сілаю адабралі цэрквы. За тое, што праваслаўныя святары адмаўляліся пераходзіць у ўнію, іх збівалі, саджалі ў турмы[205].

Асабліва ўзмацніўся працэс гвалтоўнага пераводу храмаў з праваслаўя ва ўніяцтва ў 30–50-я гады XVIII ст. Так, ужо ў канцы 30-х гадоў XVIII ст. большасць праваслаўных цэркваў Мсціслаўскай пратапопіі была пераведзена ў унію. З 79 былых праваслаўных цэркваў, якія налічваліся ў Мсціслаўскай пратапопіі, 64 сталі ўніяцкімі. У Мсціслаўскай пратапопіі праваслаўнымі заставаліся толькі цэрквы ў вёсках Пацолтава, Добрае, Еленцы, Кош, Валынцы, Гарадзішча, Папялёўка, Сохань, Бязводзічы, Кудрычы, Варанкова і адзін храм ў в. Краснае, а таксама храмы ў мястэчках Расна, Шумячы, Дрыбін, Кадзіна[206].

Некалькі лепшай была сітуацыя ў Крычаўскай пратапопіі. Тут працэс пераводу ў унію пачаў набіраць моц толькі з сярэдзіны XVIII ст., а ў 1737 г. уніяцкімі былі толькі пяць храмаў на перыферыі – у Асмаловічах, Судзілавічах, Задабрасці, Пячарах, Царковішчах[207].

Аднак праваслаўныя манастыры зачыняліся і тут. У 1730 г. быў зачынены праваслаўны манастыр у Стракайлах, размешчаны ў Крычаўскай пратапопіі, і Страйкулаўскі манастыр Мсціслаўскай пратапопіі[208]. У 1734 г. былі забраны ва ўніяцтва Царкавішчанскі і Мазалаўскі жаночыя манастыры[209]. Прыкладна ў гэты час знікаюць звесткі і пра Селіцкі жаночы манастыр. У 1750 г. згадваецца, што быў забраны на ўнію нейкі брацкавіцкі манастыр клімавіцкім старастам Фабіянам Бяляцкім[210]. Аднак ніякіх іншых звестак пра гэты манастыр не захавалася. Праваслаўным у Мсціслаўскім ваяводстве зноў заставаўся толькі Тупічэўскі Св. Духаў манастыр у Мсціславе, ігумен якога Антоній Таміла-Дзянісавіч у 1729 г. атрымаў дазвол ад расійскага ўрада на збор ахвяраванняў на тэрыторыі Расійскай імперыі[211].

У цэлым у 1755 г. у Магілёўскай (Беларускай) праваслаўнай епархіі заставалася толькі 130 цэркваў[212], а ўсяго з 1686 па 1765 г. у Беларускай праваслаўнай епархіі ва ўніяцтва было забрана каля 200 храмаў[213].

Прычым спробы пераводу гарадскіх храмаў на ўнію часам мелі выключна палітычны характар і не мелі ніякіх адносін да веры. Так, святар крычаўскай

---

[205] Бантыш-Каменский Н. Н. Исторические известия о возникшей в Польше унии. – С. 426–427, 430.

[206] НГАБ. – Ф. 2308. – Воп. 1. – Адз. зах. 317. – Арк. 118–119.

[207] Бантыш-Каменский Н. Н. Исторические известия о возникшей в Польше унии. – С. 275; НГАБ. – Ф. 2308. – Воп. 1. – Адз. зах. 317. – Арк. 118 адв.–119.

[208] НГАБ. – Ф. 2308. – Воп. 1. – Адз. зах. 317. – Арк. 118–119.

[209] АрЮЗР. – Т. 4. – С. 448–450.

[210] Mironowicz A. Rejestr monasterów i cerkwi Greko-ruskich różnemi czasy na unię gwałtownie odjętych // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – T. 30. – Białystok, 2008. – S. 208.

[211] Пятницкий Н. Тупичевский монастырь. – С. 15.

[212] Філатава А. М. Белорусская православная епархия в 60–70 годы XVIII вв. // Тэз. навук. канф. прысвечанай 1000-годдзю Полацкай епархіі і Праваслаўнай царкве на Беларусі. 25 верасня 1992 г. – Мінск, 1992. – С. 53.

[213] Анішчанка Я. К. Народжаны рабалепнічаць. – С. 108.

царквы Св. Параскевы Пятніцы Аляксандр Цітовіч, які першапачаткова падтрымаў паўстанне пад кіраўніцтвам Вашчылы, жадаючы пазбегнуць пакарання, паехаў да смаленскага ўніяцкага епіскапа і там прыняў унію. Вярнуўшыся ў Крычаў, пачаў прымушаць сваю паству да пераходу ва ўніяцтва. Яго намаганням садзейнічаў упраўляючы староствам, які прымушаў прыхаджан наведваць багаслужэнне ва ўніяцкім храме. Арандатар Крычаўскага замка забраў з Мікольскай праваслаўнай царквы царкоўнае начынне[214]. Акрамя таго, актыўны ўдзел у пераводзе крычаўскіх цэркваў пад кіраўніцтва ўніяцкага епіскапа прымаў і крычаўскі ксёндз Іллініч.

Захаваліся шматлікія скаргі праваслаўнага беларускага епіскапа І. Ваўчанскага на імя дзяржаўцы Крычаўскага староства Г. Радзівіла пра гвалтоўны пераход праваслаўных храмаў у ўнію на працягу 1745–1750 гг.[215]

У 1745 г. крычаўскія цэрквы Раства Хрыстова і Іллінская былі пераведзены на ўнію[216], але заставаліся пад юрысдыкцыяй уніяцкіх святароў нядоўга. Пратэст, з якім звярнуўся да караля магілёўскі праваслаўны архіепіскап І. Ваўчанскі, меў свой уплыў, і крычаўскі дзяржаўца Геранім Фларыян Радзівіл быў вымушаны спецыяльным лістом забараніць упраўляючаму староствам гвалтоўна пераводзіць людзей у ўнію.

Новы этап пераводу крычаўскіх праваслаўных храмаў у ўнію пачаўся ў пачатку 50-х гадоў XVIII ст. і зноў быў звязаны з дзейнасцю крычаўскага ксяндза Іллініча. Як піша М. М. Бантыш-Каменскі, у верасні 1751 г. ён звярнуўся з лістом да караля, у якім тэндэнцыйна падаў канфесійную сітуацыю ў Крычаўскім старостве. У выніку гэтага кароль выдаў прывілей, якім перадаваў уніяцім епіскапам усе крычаўскія праваслаўныя храмы і астатнія 20 праваслаўных храмаў, якія на той час заставаліся ў старостве[217]. Але, верагодна, гэтыя падзеі адбыліся некалькі раней, бо ўжо ў траўні 1751 г. кароль Аўгуст III пацвердзіў усе наданні крычаўскім царквам, якія яны атрымалі на працягу XVI–XVIII стст., пры ўмове, што яны будуць знаходзіцца пад старшынствам полацкага ўніяцкага мітрапаліта і Рымскага касцёла[218].

Гэты гвалтоўны акт выклікаў вялікі міжнародны скандал. У абарону крычаўскіх праваслаўных вернікаў выступіў рускі пасол у Варшаве Кейзерлінг, у выніку чаго кароль даручыў разбірацца з гэтай справай падканцлеру ВКЛ князю Чартарыйскаму[219].

Скандал выратаваў крычаўскія праваслаўныя храмы ад пераводу на унію, пра што сведчыць ліст І. Ваўчанскага, датаваны 1753 г., у якім ён дзякаваў

---

[214] Мараш Я. Н. Очерки истории экспансии католической церкви в Белоруссии. – Мінск: Вышэйш. шк., 1974. – С. 227–228.

[215] АСДОИСЗР. – Т. 7. –С. 195–199, 217, 224.

[216] Бантыш-Каменский Н. Н. Исторические известия о возникшей в Польше унии. – С. 440.

[217] Тамсама. – С. 321.

[218] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 176. – Арк. 862–872.

[219] Бантыш-Каменский Н. Н. Исторические известия о возникшей в Польше унии. – С. 321–323.

Г. Ф. Радзівілу за вяртанне ў праваслаўе храмаў Крычава і прасіў дазволу на адбудову на старым месцы ў горадзе згарэўшага Пятніцкага храма і царквы Раства Багародзіцы, прасіў, каб вярнулі праваслаўным Саматэвіцкі храм і каб крычаўскі ксёндз Іллініч вярнуў адабраныя ім званы царквы Раства Багародзіцы[220].

Верагодна, забарона Г. Ф. Радзівіла прымусова пераводзіць храмы ў унію[221] дазволіла адстаяць гэтыя цэрквы – Св. Параскевы Пятніцы, Раства Хрыстова і Іллінскую. Ва ўсякім выпадку, царква Св. Параскевы Пятніцы адзначана як праваслаўная на плане горада 1778 г., а цэрквы Раства Хрыстова і Іллінская былі пераведзены ў унію толькі ў другой палове XVIII ст. Згодна з данымі А. Мірановіча, крычаўская Іллінская царква была перавадзена ва ўніяцтва толькі ў 1763 г.[222] На плане горада 1778 г. яна адзначана яшчэ як уніяцкая.

Крычаўская царква Раства Хрыстова была пераведзена ў унію ў 1762 г., да яе прыхода адносіўся не толькі горад, але і мястэчка Гронаў (Геранімаў), вёскі Міхеевічы, Вепрын, Ушакі, Вохар, Сакольнічы, Хацілавічы, Рэчыца, Макаўё, Цыганава, Дарлівае, Горбатка, Свіная, Глушкава, Зуі, слабодкі Прохараўка, Лешчынка, Гарадная і Вохарскі мужчынскі манастыр[223]. Пад юрысдыкцыяй уніяцкага мітрапаліта яна заставалася да 1781 г., потым зноў стала праваслаўнай[224].

Мяркуючы па мемарыяле Г. Каніскага да рускай імператрыцы Кацярыны II аб бедствах праваслаўных Беларускай епархіі у Рэчы Паспалітай, які датуецца 1762 г., стан праваслаўя на тэрыторыі Крычаўскага староства быў вельмі цяжкім. Аўтар мемарыяла неаднаразова адзначае гвалтоўны перавод праваслаўных цэркваў у ўнію – у Касцюковічах, у весках Крычаўскага староства, той гвалт і знявагу, што церпяць праваслаўныя святары[225].

Акрамя гвалтоўнага пераводу праваслаўных цэркваў у ўнію ў другой чвэрці XVIII ст. пачаўся працэс будаўніцтва новых базыльянскіх кляштараў, прычым магнаты і шляхта стараліся замацаваць пазіцыі базыльян перш за ўсё на тэрыторыі, памежнай з Рускай дзяржавай.

У 1728 г. быў заснаваны Малашкавіцкі базыльянскі кляштар[226]. Але потым ён спыніў сваё існаванне, бо ў жніўні 1764 г. Іван Пракопавіч Падабед зрабіў фундушны запіс на нанова заснаваны Малашкавіцкі базыльянскі кляштар, які замяняў прыходскую ўніяцкую царкву. Ён запісаў на кляштар зямлю – урочышча Падгароддзе каля самога кляштара, а першым прыёрам у ім быў

---

[220] АСДОИСЗР. – Т. 7. –С. 238–239.

[221] ИЮМ. – Вып. 17. – С. 370–373.

[222] Mironowicz A. Rejestr monasterów i cerkwi Greko-ruskich różnemi czasy na unię gwałtownie odjętych. – S. 208; Мейер А. Описание Кричевского графства или бывшего староства 1786 г. // Могилевская старина. – Могилев, 1901. – Вып. 2. – С. 103.

[223] ИЮМ. – Вып. 17. – С. 146–149.

[224] Горючко П. Материалы для истории воссоединения униатов в Белоруссии 1780–1795 гг. Списки воссоединенных церквей // МЕВ. – 1903. – № 1–2. – Часть неофициальная. – С. 13.

[225] Анішчанка Я. К. Народжаны рабалепнічаць. – С. 286–294.

[226] ИЮМ. – Вып. 17 – С. 270; НГАБ. – Ф. 1729. – Воп. 1. – Адз. зах. 55. – Арк. 614 адв.

Стэфан Рылевіч[227]. Кляштар функцыянаваў і пасля інкарпарацыі гэтых зямель у 1772 г. у склад Расійскай імперыі, аднак у 1795 г. яго царква была перададзена пад юрысдыкцыю праваслаўных епіскапаў, кляштар быў ліквідаваны, а былая царква кляштара стала прыходскай[228].

У 1728 г. у маёнтку Барэйкі «за реками Сожом и Бесетью» «в маетности под названием Городок», якое належала мсціслаўскаму канюшаму Уладзіславу Свадкоўскаму і яго жонцы Клары, пры царкве Успення Прасвятой Багародзіцы быў заснаваны жаночы манастыр у гонар Святога Васіля Блажэннага, на які ў траўні 1739 г. імі быў дадзены фундуш – зямля і млын[229].

Побач з в. Барэйкі Касцюковіцкага раёна сапраўды ёсць гарадзішча[230], але культурны слой на ім амаль адсутнічае. У той жа час царква з аднайменнай назвай знаходзіцца і зараз у вёсцы побач з гарадзішчам, а на раце Зубар старыя людзі яшчэ напрыканцы XX ст. паказвалі месцаразмяшчэнне млына.

Магчыма, кляштар некаторы час быў праваслаўным, але ў 1751 г. мсціслаўскі канюшы Францішак Свадкоўскі перавёў яго ў унію[231]. Што потым стала з кляштарам, невядома. Ва ўсякім выпадку, ён не згадваецца ў дакументах, звязаных з Генеральным межаваннем, праведзеным у 1783–1784 гг. у Магілёўскім намесніцтве. Магчыма, ён па нейкіх прычынах не змог працягнуць сваю дзейнасць і застаўся на ўзроўні прыходскага храма, якім з'яўляецца і сёння.

У 1749 г. быў заснаваны Марыінвільскі (Муравільскі) уніяцкі кляштар ў гонар Раства Прасвятой Багародзіцы, які таксама павінен быў стаць місіянерскім пунктам на ўсходніх межах Рэчы Паспалітай. У сувязі з гэтым па просьбе мсціслаўскага падстолія Антона Арэшкі-Астрэйкі – заснавальніка Засожскай місіі – нанова заснаванаму кляштару быў зроблены фундуш – слабада Точная ў Мсціслаўскім ваяводстве з усімі сялянамі. У гэтым жа годзе ад імя смаленскага харунжага Вікенція Арэшкі-Астрэйкі гэтаму ж місіянерскаму кляштару была перададзена ў якасці фундуша маёмасць Халдзееўка[232] – сучасная аднайменная вёска Клімавіцкага раёна.

Гэты кляштар не быў заснаваны на пустым месцы. Яго папярэднікам быў жаночы праваслаўны манастыр, зачынены ў 1734 г. менскім гараднічым панам Іваноўскім[233]. Аднак адкрыты базыльянскі кляштар развіваўся вельмі марудна. Напрыканцы XVIII ст. ён яшчэ меў недабудаваныя карпусы, ніжнія паверхі якіх былі мураваныя, а верхнія – драўляныя[234]. Згодна з інвентарным апісаннем 1786 г., у ім будавалася новая царква з дзвюма вежамі, якая яшчэ не бы-

---

[227] ИЮМ. – Вып. 18. – С. 157–161.

[228] Горючко П. Материалы для истории воссоединения униатов... – С. 14.

[229] ИЮМ. – Вып. 17 – С. 269.

[230] Копытин В. Ф. Археологические памятники Костюковичского района. – С. 78.

[231] Mironowicz A. Rejestr monasterów i cerkwi Greko-ruskich różnemi czasy na unię gwałtownie odjętych. – S. 208.

[232] ИЮМ. – Вып. 17 – С. 303–304, 306–307.

[233] АрЮЗР. – Т. 4. – С. 448.

[234] РДАСА. – Ф. 1355. – Воп. 1. – Адз. зах. 713. – Арк. 109; Тамсама. – Адз. зах. 714. – Арк. 77–77 адв.



Мал. 96. План Царковішчанскага (Муравільскага) манастыра згодна з Генеральным межаваннем 1783–1784 гг.

ла завершана і таму набажэнства адбывалася ў размешчанай на цэнтральнай частцы падворка капліцы Св. Ануфрыя (мал. 96). У ёй быў стары разны алтар у гонар Дзевы Марыі, узяты са старой царквы. Побач з кляштарам знаходзіўся невялікі шпітальны дом і фальварак, у якім была карчма, бровар, вазоўня[235]. Сам кляштар знаходзіўся паміж мястэчкам Царковішча і вёскай Муравілле: ад назвы апошняй ён і меў сваё найменне.

11 траўня 1758 г. быў заснаваны базыльянскі кляштар каля в. Бязводзічы сучаснага Мсціслаўскага раёна, фундуш на які першапачаткова даў пан Пячкоўскі, а потым да яго далучыліся пані Буяльская і пан Талатоцкі.

Згодна з візітай кляштара за 1786 г., на ўваходзе ў манастырскую драўляную царкву на дзвярах быў намаляваны абраз Св. Міхаіла. Сам храм меў вялікі цэнтральны купал і два невялікіх купалы па баках, тры вялікія алтары, стары арган на сем галасоў. Кляштар быў драўляны і ў той час патрабаваў рамонту. Акрамя таго побач быў манастырскі фальварак з гумнамі, свірнам, броварам, пякарняй, лядоўняй, вазоўняй[236].

Аднак нягледзячы на адраджэнне жыцця базыльянскіх кляштараў і заснаванне новых, яны не былі шматлікімі. Мяркуючы па крыніцах вельмі, малым быў Вохарскі Праабражэнскі мужчынскі кляштар. Калі яшчэ ў 1761 г. разглядалася справа пра крадзеж у ім маёмасці і ён выступаў як самастойная юрыдычная адзінка, то ўжо ў наступным годзе кляштар быў прыпісаны да крычаўскай царквы Раства Багародзіцы[237].

І ў больш буйных базыльянскіх кляштарах сітуацыя была не лепшай. У другой палове XVII ст. ва ўніяцкіх кляштарах звычайна знаходзіліся па 2–3 манахі. Нязначна змянілася сітуацыя і ў больш позні перыяд. Так, нават у Пустынскім кляштары пад Мсціславам у 1773 г. было толькі 9 манахаў[238]. У Ануфрыеўскім кляштары, згодна з эканамічным апісаннем 1783 г., таксама налічвалася 9 манахаў.

---

[235] НГАБ. – Ф. 3421. – Воп. 1. – Адз. зах. 5. – Арк. 1–6.

[236] Тамсама. – Адз. зах. 10. – Арк. 1–9.

[237] ИЮМ. – Вып. 18. – С. 146–149.

[238] Pidlipczak-Majerowicz. Bazylianie w Koronie i Litwie. Szkoły i książki w działalności zakonu // Acta Uniwersitatis Wratislaviensis – Warzsawa; Wrocław, 1986. – № 779. – S. 19; Пустынский Успенский монастырь. – С. 14.

У цэлым у Рэчы Паспалітай у 1772 г. налічвалася 155 базыльянскіх кляштараў, у якіх было 1235 манахаў, а ў межах ВКЛ на той час налічвалася 73 орлянскія дамы і місіі з 612 манахамі. Такім чынам, нават у канцы XVIII ст. у базыльянскіх кляштарах ВКЛ у сярэднім налічвалася трохі болей за 8 манахаў. Гэту сярэднюю лічбу пацвярджае і колькасць манахаў у Пустынскім і Ануфрыеўскім манастырах у 1784 г.: адпаведна 8 і 11.

З прыходам на рускі прастол імператрыцы Кацярыны II рэзка актывізавалася палітыка Расіі ў адносінах да Рэчы Паспалітай, і адным з актуальных пытанняў было пытанне пра стан праваслаўных у ВКЛ.

Справа ўсё больш атрымлівала выключна палітычны характар, у якім абодва бакі лічылі сябе справядлівымі. Так, у 1765 г. беларускі епіскап Г. Канісскі скардзіўся, што ў яго епархіі ёсць 130 храмаў, паства якіх жадае перайсці ў праваслаўе, але іх не пускаюць гаспадары. З гэтых храмаў 12 адносіліся да Мсціслаўскага ваяводства[239].

Адносна распаўсюджанасці храмаў на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства картаграфаванне вядомых праваслаўных храмаў на канец XVII ст. паказвае, што яны размяшчалася ў паўночных і цэнтральных раёнах ваяводства, а на поўдні іх было значна менш. Апошняе тлумачыцца тым, што з-за невялікай колькасці насельніцтва ў гэтых раёнах тэрыторыя парафій была даволі вялікай. Так, у склад парафіі саматэвіцкай царквы Св. Іллі ў канцы XVII ст. уваходзілі вёскі Гарбавічы, Панкі, Кавычыцы, Мокрая, Блудзімля, Брацькавічы, Хоцімск (вёска Касцюковіцкага раёна)[240]. Такім чынам, саматэвіцкая парафія распаўсюджвалася ад свайго цэнтра на 8–16 км і ахоплівала плошчу прыкладна ў 100 кв. км.

У той жа час у сярэдзіне XVIII ст. тэрыторыя парафій пачала скарачацца, што было выклікана павелічэннем колькасці насельніцтва, населеных пунктаў і, адпаведна, храмаў. Так, у склад парафіі бярозкаўскай уніяцкай царквы ўваходзілі вёскі Бярозкі, Ганнаўка, Валынеж, Крапіўна, Дзямідавічы і слабада Тупічын. Вёскі Дубраўка, Ніегва, Селіцкая, Батаева ўваходзілі ў склад парафіі Баханаўскай царквы Св. Міхаіла Архангела. У парафію Дамамерыцкай царквы Св. Мікалая ўваходзілі вёскі Дамамерычы, Палошкава, Свірэль, Зімніца, Канахоўка, Баброўка, Лядзешня[241]. Такім чынам, у сярэднім памеры парафій, размешчаных на поўдні ваяводства, ахоплівалі землі ў радыусе да 5–7 км ад цэнтра.

Падобны працэс фіксуецца і ў адносінах да Хоцімскай царквы, калі яе першапачатковая вялікая епархія пачала скарачацца. Спачатку ў яе прыход уваходзілі вёскі Горня, Ліпаўка, Узлогі і палова Бясовіч (Бяседавіч). Аднак потым гэтыя вёскі забраў сабе святар храма з мястэчка Радзівілаў, пра што святар Хоцімскай царквы скардзіўся камісару староства[242].

Назіранні за распаўсюджваннем праваслаўных і ўніяцкіх храмаў на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства ў канцы XVIII ст. прыводзяць да высновы, што ўніяцтва атрымала распаўсюджанне ў асноўным у сельскім асяроддзі (мал. 97).

---

[239] Анішчанка Я. К. Народжаны рабалепнічаць.–С. 144.

[240] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1928. – Арк. 106.

[241] НГАБ у Гродна. – Ф. 525. – Воп. 1. – Адз. зах. 3. – Арк. 2, 33–34.

[242] НГАБ. – Ф. 694. – Воп. 4. – Адз. зах. 1159. – Арк. 11 адв.



● – храм; ✝ – манастыр

Мал. 97. Уніяцкія храмы на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства ў XVIII ст.: *1* – Ануфрыева; *2* – Аслянка; *3* – Асмолавічы; *4* – Асмолава; *5* – Бабылічы; *6* – Барэйкі; *7* – Басценавічы; *8* – Бацвінаўка; *9* – Белая Дуброва; *10* – Бель; *11* – Брацькавічы; *12* – Бязводзічы; *13* – Бялынкавічы; *14* – Валымер; *15* – Вародзькаў; *16* – Варанёва; *17* – Варанёва; *18* – Віраўня; *19* – Віхраны; *20* – Воўчас; *21* – Войніна; *22* – Вохар; *23* – Вярба; *24* – Вярхоўцы; *25* – Галкавічы; *26* – Гарадзішча; *27* – Гарадзец; *28* – Гарадок; *29* – Глушкава; *30* – Гняўкова; *31* – Дамамерычы; *32* – Днесіна; *33* – Добрае; *34* – Дубавіцы; *35* – Ельня; *36* – Жаліўе; *37* – Жукава; *38* – Забялышчын; *39* – Задабрасць; *40* – Заложжа; *41* – Заселле; *42* – Зяціца Вял.; *43* – Ініоў; *44*– Каўшова; *45* – Кажуховічы; *46* – Казімірава; *47* – Калеснікі; *48* – Калодзезькі; *49* – Каменка; *50* – Каменны Брод; *51* – Камень Грод; *52* – Канічы; *53* – Канцы; *54* – Карнілаўка; *55* – Касішчава; *56* – Касцюковічы; *57* – Кашаны; *58* – Клімавічы; *59* – Колтава; *60* – Копцеўка; *61* – Кош; *62* – Красавічы; *63* – Краснае; *64* – Крывелі; *65* – Крычаў; *66* – Кудрычы; *67* – Кулікова; *68* – Куляшоўка; *69* – Лазовіца; *70* – Ліпічыцы; *71* – Лужкі; *72* – Лукашыцы; *73* – Луковічы; *74* – Лурышчава; *75* – Лыкінка; *76* –

Любавічы; *77* – Людагошч; *78* – Мазалава; *79* – Мазыкі; *80* – Малашкавічы; *81* – Маляцічы; *82* – Манастыршчына; *83* – Мацкава; *84* – Мілаславічы; *85* – Мохавая Слабада; *86* – Мсціслаў; *87* – Мужычок; *88* – Негіна; *89* – Новае Сяло; *90* – Новы Студзянец; *91* – Падлужжа; *92* – Палаліца; *93* – Панятоўка; *94* – Папялёўка; *95* – Пацкава; *96* – Пацолтава; *97* – Пачынічы; *98* – Пераны; *99* – Пірагова; *100* – Пнілава; *101* – Пнеўшчына; *102* – Пустынкі; *103* – Пятровічы; *104* – Пячары; *105* – Пячэрск; *106* – Радамля; *107* – Рай; *108* – Родня; *109* – Сапрынавічы; *110* – Сахан; *111* – Селіцкі жаночы манастыр; *112* – Скварэта; *113* – Слаўнае; *114* – Слабада; *115* – Сойна; *116* – Старое Сяло; *117* – Стахаўская Буда; *118* – Стракайлы; *119* – Стракайлы; *120* – Студзянец; *121* – Студзянец; *122* – Судзілавічы; *123* – Судзілавічы; *124* – Точна; *125* – Харанёва; *126* – Харашкова; *127* – Хатавіж; *128* – Хаціма; *129* – Хвастова; *130* – Хвошчава; *131* – Хіславічы; *132* – Ходасы; *133* – Хоцімск; *134* – Царковішча; *135* – Шамава; *136* – Шумячы; *137* – Шышкава; *138* – Юркаўшчына; *139* – Юркавічы; *140* – Юшкевічы

У гарадах Мсціславе і Крычаве ўніятаў былі адзінкі. Так, у Мсціславе ў 1784 г. быў толькі 21 прыхільнік гэтага кірунку хрысціянства, якім належаў адзін храм у горадзе (у 1737 г. – тры), што быў на гарадскіх могілках, а праваслаўных было 1717 чалавек з агульнай колькасці жыхароў горада 3043 чалавек[243]. У той жа час тут скарацілася колькасць праваслаўных храмаў. Так, у канцы XVIII ст. у горадзе адсутнічаюць праваслаўныя храмы Св. Міколы і Св. Іллі, якія ў першай палове стагоддзя былі пераведзены ў унію і з цягам часу, верагодна, былі зачынены. У канцы XVIII ст. у Мсціславе згадваюцца толькі праваслаўныя Траецкая, Спаская, Св. Афанасія і Кірыла, Пятніцкая і Багародзіцкая цэрквы[244].

Падобная сітуацыя назіраецца і ў Крычаве, дзе з васьмі храмаў толькі два (Св. Іллі і Раства Багародзіцы) ў другой палове XVIII ст. былі пераведзены ў унію, аднак ужо ў 1781 г. апошні зноў вярнуўся пад апеку праваслаўя. У цэлым праваслаўныя гарадскія абшчыны аказвалі больш-менш арганізаваны супраціў захопу храмаў і іх пераводу ў унію. Па падліках даследчыкаў, у цэлым па краіне ўніятамі было каля 39% насельніцтва ВКЛ[245]. У той жа час сітуацыя залежала ад кожнага канкрэтнага горада. Так, у Прапойску ў 1786 г. не было ніводнага праваслаўнага храма, а ўсе тры належалі ўніятам[246]. Уніяцкімі былі і храмы, размешчаныя ў мястэчках Мсціслаўскага ваяводства – у Хіславічах, Шамаве, Шумячах, Мілаславічах, Хоцімску, Касцюковічах[247].

Больш складаная сітуацыя была ў сельскай мясцовасці. Тут пачынаючы з другога дзесяцігоддзя XVIII ст. уніяцтва, якое прымусова насаджалася гаспа-

[243] АР БАН Літвы. Ф-16. – Адз. зах. 127. – Арк. 170.

[244] РДАСА. – Ф. 1356. – Воп. 1. – Адз. зах. 2172, 2173.

[245] Філатава А. М. Хрысціянскія канфесіі пасля далучэння Беларусі да Расійскай імперыі (1772–1860) // Канфесіі на Беларусі (канец XVIII–XX ст.). – Мінск: Беларус. навука, 1998. – С. 5.

[246] Путешествие Ее императорского величества в полуденный край России предприемлимое в 1786 году. – СПб.: Печ. при Горном училище, 1787. – С. 23; Морозов В. Ф. Церковь Рождества в Славгороде: гипотеза об авторе // Архитектура и строительство Беларуси. – 1991. – № 1. – С. 43–44.

[247] Грицкевич А. П. Социальная борьба горожан Белоруссии (XVI–XVIII вв.). – Минск: Наука и техника, 1979. – С. 115.

дарамі маёнткаў, атрымала шырокае распаўсюджанне. Напрыканцы стагоддзя большая частка вясковых храмаў была ўніяцкай і ў цэлым каля 80% сельскага насельніцтва былі ўніятамі[248]. Трэба прызнаць, што у апошняй трэці XVIII ст. стан Магілёўскай праваслаўнай епархіі быў незайздросным. Фактычна яна заставалася невялікім канфесійным анклавам у Рэчы Паспалітай і практычна ўжо спыняла сваё існаванне.

Першы падзел Рэчы Паспалітай фактычна выратаваў праваслаўную царкву на Беларусі, і з ганімай яна сама стала формай дзяржаўнага веравызнання і пачала аказваць ціск на іншыя канфесіі. Аднак і гэты працэс адбываўся вельмі марудна і паступова, што было свядомай дзейнасцю царскага ўрада на першапачатковам этапе асваення новых зямель[249].

Згодна з данымі 1777 г. «Атласа Магілёўскай губерніі», складзенага рускімі афіцерамі, ў Магілёўскай губерні было 10 праваслаўных манастыроў і 124 царквы, каталіцкіх касцёлаў і кляштараў – 62, уніяцкіх манастыроў – 4, уніяцкіх цэркваў – 419. Такім чынам, каталіцкімі ў Магілёўскай губерні праз 5 гадоў пасля ўваходу гэтых зямель у склад Расійскай імперыі былі 10% устаноў, праваслаўнымі – толькі 21,6%, а ўніяцкімі – 68,4%[250].

Распачаты працэс пераходу ўніяцкіх храмаў пад юрысдыкцыю праваслаўных епіскапаў быў вельмі кволым. Так, за першыя дзесяць год (1772–1781 гг.) пасля інкарпарацыі зямель Усходняй Беларусі ў Расійскую імперыю на тэрыторыі былога Мсціслаўскага ваяводства ў праваслаўе вярнулася толькі 12 храмаў, а ў наступныя чатырнаццаць год (1782–1795 гг.) іх колькасць павялічылася толькі на 32 храмы[251]. Прычым такі няспешны тэмп пераходу ўніяцкіх храмаў у праваслаўе назіраўся нават на фоне дазволу прызначэння праваслаўных святароў на вакантныя ўніяцкія цэрквы.

Такім чынам, нават праз 23 гады пасля далучэння зямель былога Мсціслаўскага ваяводства ў склад Расіі толькі 45 храмаў са 149 вядомых перайшлі ў праваслаўе, а большасць заставалася ўніяцкімі. Трэба прызнаць, што фактычна за час спакойнага жыцця двух пакаленняў (50–60 год) уніяцтва пусціла глыбокія карані сярод сельскага насельніцтва і стала ў пэўным сэнсе народнай рэлігіяй.

Больш хутка гэты працэс ішоў у дзяржаўных уладаннях ці ва ўладаннях расійскай магнатэрыі. Так, у былым Крычаўскім старостве ў 1778 г. з 24 цэркваў 21 была праваслаўнай і толькі 3 – уніяцкімі[252]. Але, як і ў папярэднім выпадку, такі высокі тэмп пераходу ў праваслаўе тлумачыўся выключна канфесійнай арыентацыяй гаспадара ўладання.

---

[248] Філатава А. М. Хрысціянскія канфесіі... – С. 5.

[249] Сосна У. Уніяцкае пытанне ў беларускай вёсцы ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. // З гісторыі уніяцтва ў Беларусі (да 400-годдзя Брэсцкай уніі). – Мінск: НКФ «Экаперспектыва», 1996. – С. 90.

[250] Грицкевич А. П. Социальная борьба горожан Белоруссии... – С. 111.

[251] Горючко П. Материалы для истории воссоединения униатов. – С. 10–11, 14–15.

[252] НГАБ. – Ф. 2151. – Адз. зах. 135. – Арк. 34.

7.4. Пранікненне і распаўсюджванне каталіцкага касцёла

Пранікненне каталіцкага касцёла на землі ўсходняй Беларусі, у тым ліку і на тэрыторыю Мсціслаўскага ваяводства, пачынае фіксавацца ў пісьмовых крыніцах толькі з пачатку XVII ст., хаця, безумоўна, знаходжанне каталікоў у адзінай шматканфесійнай дзяржаве дазваляе меркаваць пра наяўнасць іх пэўнай колькасці на ўсходніх землях ВКЛ і ў папярэднія часы. Ускосным сведчаннем гэтага з'яўляецца наяўнасць у Смаленску XII–XIII стст. «нямецкай бажніцы» – ратонды, пабудаванай у другой палове XII ст.[253]

Ды і сама назва каталіцкага касцёла, якая паходзіць ад грэчаскага слова «katholikos» – усяленскі, бясспрэчна сведчыць пра пастаўленыя мэты яшчэ пры самым пачатку арганізацыі каталіцкай царквы – распаўсюджванне каталіцкага догмата веры па ўсім свеце.

Тым не менш, да канца XVI ст. на ўсходзе ВКЛ фактычна не было каталіцкіх храмаў. У 1592 г. яшчэ толькі абмяркоўвалася магчымасць будаўніцтва касцёла ў Оршы[254]. Пра невялікую колькасць каталіцкага насельніцтва ў краіне нават напрыканцы XVI ст. сведчыць ліст Мікалая Крыштафа Радзівіла Сіроткі да Папы Рымскага, у якім ён скардзіцца, што не можа ва ўсёй Літве знайсці жонку-каталічку, якая адпавядала б яго статусу. А ў лісце да караля ён пісаў, што наогул у Літве мала каталікоў[255]. Што ж тут казаць пра ўсход краіны.

У той жа час некаторая колькасць каталікоў на тэрыторыі будучага Мсціслаўскага ваяводства была ўжо ў першай палове XVI ст. Ускосным сведчаннем гэтага з'яўляецца прызначэнне ў 1541 г. мсціслаўскім гараднічым «тамашняга баярына» Войцеха Стахоўскага[256], імя якога адносіцца да каталіцкага пантэона святых і які, хутчэй за ўсё, быў каталіком. Безумоўна, нават для невялікай колькасці каталікоў быў патрэбны храм, у якасці якога магла выступаць невялікая каплічка, размешчаная ў ваяводскім цэнтры. Таму напаўлегендарныя звесткі пра існаванне ў Мсціславе ў пачатку XVII ст. некалькіх касцёлаў павінны былі мець пад сабой нейкае абгрунтаванне.

Так, В. Р. Краснянскі паведамляе пра будаўніцтва мсціслаўскім старастам Пятром Пацам мураванага касцёла Св. Мікалая з шасцю алтарамі і калегіума ордэна езуітаў ўжо ў 1614 г. ці ў 1616 г.[257] Другія выданні інфармуюць пра будаўніцтва Пятром Пацам ў Мсціславе ў 1626 г. касцёла «Bogu zwyczięcy»[258]. Е. Обст адзначае, што мсціслаўскі касцёл «Bogu zwyczięcy» быў пабудаваны Мікалаем Пацам[259].

---

[253] Воронин Н. Н. Зодчество Смоленска XII–XIII вв. – С. 140–150.

[254] АЗР. – Т. 4. – С. 57.

[255] Kempa T. Mikołaj Krzysztof Radziwiłł Sierotka. – S. 133.

[256] Любавский М. В. Литовско-Русский сейм. – С. 500–501.

[257] Краснянский В. Г. Город Мстиславль. – С. 64, 69.

[258] Nasze kościoły. – T. 1, cz.1. Archidiecezja Mohilewska. Mohilewszczyzna. – Warszawa: Bibl. Narodowa, 2001. – S. 90.

[259] Obst J. Freski w kościele Mścisławskim // Litwa i Ruś. – 1912. – T. 2, Zesz. 1. – S. 30.

Аднак у дадзеным выпадку мы маем справу з нейкай гістарычнай блытанінай. Пра мсціслаўскі касцёл Св. Мікалая няма ніякіх звестак і факт яго існавання нічым не пацвярджаецца. У Мсціславе былі дзве царквы Св. Мікалая ў XV–XVII стст., а ў XIX ст. у праваслаўны сабор Св. Мікалая быў перароблены былы езуіцкі касцёл, у якім сапраўды было 6 алтароў. Акрамя таго, езуіцкі ордэн пачаў сваю дзейнасць на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства толькі ў самым канцы XVII ст., а Пётр Пац быў мсціслаўскім старастам у 1592–1613 гг. Таму гэта паведамленне В. Р. Краснянскага пра касцёл Св. Мікалая пачатку XVII ст. памылковае.

Адносна мсціслаўскага касцёла «Bogu zwyczięcy» таксама звесткі адсутнічаюць у крыніцах XVII–XVIII стст. Аднак факт яго існавання ў Мсціславе ў сярэдзіне XVII ст. – пачатку XVIII ст. застаецца адкрытым, пра што гаворка будзе ісці ніжэй.

У той жа час, улічваючы, што Пётр Пац быў вельмі рэлігійным чалавекам, нельга выключыць, што нейкі касцёл у Мсціславе быў пабудаваны менавіта пры ім. Пра фундуш касцёла ў Мсціслаўле П. Пацам у пачатку XVII ст. паведамляе і Г. Люлевіч[260].

Але нельга выключыць, што першы касцёл у Мсціславе быў пабудаваны яшчэ пры бацьку Пятра Паца, Паўлу, які быў мсціслаўскім ваяводам і старастам з 1579 па 1593 г., у якога была ў руках не толькі ўлада над горадам і староствам, але і над усім ваяводствам, што пашырала яго эканамічныя магчымасці, і які таксама быў заўзятым каталіком[261].

Існаванне парафіяльнага, «фарнага» касцёла ў Мсціславе ўжо ў канцы XVI ст. і тое, што мсціслаўскія каталікі былі аб'яднаныя вакол яго, пацвярджаюць і пісьмовыя крыніцы. Так, ужо да сакавіка 1602 г. мсціслаўскі ротмістр Андрэй Длукранеўскі прадаў у горадзе харунжаму мсціслаўскаму Уладзіміру Каменскаму «пляц вечысты» «до костела в небо взнесения Панны Марии прылеглы»[262]. Існаванне, а не будаўніцтва фарнага касцёла ў Мсціславе ў пачатку XVII ст. пацвярджае і фундуш на ўтрымліванне прыходскіх ксяндзоў у мсціслаўскім фарным касцёле, дадзены каралём Жыгімонтам Вазай ад 29 красавіка 1614 г.[263], які ў апошнія часы, не зразумела на якой падставе, называюць фундушам на заснаванне кармеліцкага касцёла.

Як бачым, сённяшні стан крыніц не дае магчымасці даць дакладны адказ пра час будаўніцтва першага касцёла ў Мсціславе, але ўсё ж трэба прызнаць, што першы касцёл тут быў пабудаваны ў канцы XVI – самым пачатку XVII ст. і названы ў гонар Узнясення Дзевы Марыі. Магчыма, штуршком для яго будаўніцтва з'явіўся факт, як сцвярджаецца ў гісторыі мсціслаўскага езуіцкага калегіума, мэтанакіраванага перасялення пры каралі Жыгімонце Вазе на

---

[260] Lulewicz H. Pac Piotr // PSB. – T. XXIII/4, Zeszyt 103. – Wrocław; Warszawa; Kraków; Gdańsk, 1979. – S. 743–744.

[261] Wiśniewski J. Paweł Pac. // PSB. – T. XXIII/4, Zeszyt 103. – S. 741–743.

[262] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 85. – Арк. 176–176 адв.

[263] Краснянский В. Г. Город Мстиславль. – С. 16.

ўсход Рэчы Паспалітай 20000 шляхцічаў з заходніх ваяводстваў краіны[264]. Верагодна, гэта паведамленне мае пад сабой нейкую падставу, бо менавіта да сярэдзіны XVII ст. адносіцца акаталічванне праваслаўнай шляхты, прычынай якога была выключна магчымасць кар'ернага росту[265].

Касцёл стаяў на рынку, пра што сведчыць ахвяраванне 1614 г. Валерыянам Дэмбавецкім мсціслаўскім кармелітам дома, які стаяў на замкавым пляцы, на рынку, пад замкам. Прычым у ахвяраванні ўдакладняецца, што гэты пляц з домам прымыкаў адным бокам да касцёла, а другім – да рынкавых крамаў[266].

На мсціслаўскі фарны касцёл яшчэ ў пачатку XVII ст. (1619 г.) былі дадзены ў якасці фундуша 4 валокі зямлі: службы Дарастоўская і Нямчынаўская ў в. Жарэцы (Жарэцыне), служба Лунёўская ў в. Марфеева, служба Казлоўская ў в. Аслянка. У гэты ж год Карл Мадалінскі і Георгі Багдановіч далі на «фару» мсціслаўскую – прыходскі касцёл – 3 валокі зямлі Налівайкаўскіх каля в. Рудамічы і гарадскія сенажаці[267].

Знаходжанне Мсціслаўскага ваяводства на ўсходняй мяжы дзяржавы і безумоўная канфесійная перавага тут праваслаўнага насельніцтва выклікалі патрэбу прыняцця ўдзелу ў распаўсюджванні каталіцкага догмата веры не толькі прыходскіх ксяндзоў, але і манаскіх ордэнаў.

Адным з першых каталіцкіх манаскіх ордэнаў, які пачаў дзейнічаць на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства, быў ордэн кармелітаў – вайсковых капеланаў. Дакладная дата з'яўлення тут манахаў ордэна кармелітаў і будаўніцтва імі касцёла невядома. Згодна з паданнем, зафіксаваным у гісторыі кармеліцкіх касцёлаў Рэчы Паспалітай, кармеліты, вяртаючыся з вайны з Расіяй 1609–1618 гг., былі запрошаны мясцовай шляхтай і першапачаткова размяшчаліся ў мясцовым парафіяльнам касцёле. У 1618 г. плябан мсціслаўскага парафіяльнага касцёла «Дзевы Марыі» Міхал Арлоўскі даў згоду на перадачу кармелітам свайго касцёла[268]. Магчыма, менавіта вось гэты забыты факт перадачы фарнага касцёла манаскаму ордэну і прывёў да блытаніны ў даціроўцы наданняў на «фарны» і кармеліцкі касцёл у розных аўтараў. Калі яны проста не звяртаюць увагу, што у першакрыніцы ідзе гаворка пра «фарны» касцёл (1614 г.), то аўтаматычна пераводзяць гэтыя наданні на кармеліцкі.

Такім чынам, можна з упэўненасцю канстатаваць, што ў канцы XVI – першай палове XVII ст. у Мсціславе быў адзін касцёл – фарны «Узнясення Дзевы Марыі», які ў 1618 г. быў перададзены кармеліцкаму ордэну.

---

[264] Archiwum Towarystwa Jezusa w Krakowie. Signaturza 515. Historia residentio Mscislavensis Societatis Jesu ad Anno 1688 ad Annun 1738. – S. 4.

[265] Лойка П. А. Незалежнасць пасля Люблінa, або магнацка-шляхецкая «беларусізацыя» // Спадчына. – 1991. – № 5. – С. 11; Флоря Б. Н. Осмысление конфликтов вызванных Брестской унии 1596 г. верхами православного белорусского и украинского общества // Брестская уния 1596 г. и общественно-политическая борьба на Украине и в Белоруссии в конце XVI – первой половине XVII в. – М.: Изд. Идрис, 1999. – Ч. 2. – С. 81.

[266] Smora. Kilka słow o karmelitach a.r.oh. w Mścisławiu. – S. 187.

[267] ИЮМ. – Вып. 25. – С. 378–384.

[268] Smora. Kilka słow o karmelitach... – S. 186.

Магчыма, перад тым як мсціслаўскі плябан даў згоду на перадачу касцёла ордэну, самі кармеліты спрабавалі пабудаваць самастойную святыню. І менавіта на яе, згодна са звесткамі Шмора, другую па ліку ў ВКЛ пасля віленскага касцёла Св. Юрыя, ахвяраваў у 1614 г. пляц зямлі ў горадзе мсціслаўскі шляхціч Валерыян Дэнбавецкі. Аднак само будаўніцтва касцёла кармеліты не змаглі адразу ажыццявіць, таму яны ўгаварылі парафіяльнага ксяндза перадаць ім храм. Ва ўсякім выпадку, у 1619 г. у Мсціславе згадваецца кармеліт Станіслаў Гратоўскі (Граткоўскі)[269].

Верагодна, ксяндзы-кармеліты даволі доўга знаходзіліся ў былым фарным касцёле, а потым толькі ў 1637–1638 гг. паспрабавалі пабудаваць свой новы касцёл і кляштар, вось адкуль і ідуць вядомыя сёння дзве даты будаўніцтва мсціслаўскага кармеліцкага касцёла – 1614–1618 гг. і 1638 г.[270]

Згодна з данымі А. Ярашэвіча, мсціслаўскія кармеліты ў 1622 г. ужо мелі касцёл Успення Дзевы Марыі, парафію якому ў 1623 г. прызначыў Яўстафій Валовіч. Згодна з больш познімі матэрыяламі, фундатарам касцёла і кляштара быў мсціслаўскі войскі Я. К. Мадалінскі[271]. Так, у 1638 г. ён надаў на кляштар 100 валок зямлі ў «маетнасці» Прылепава Смаленскага ваяводства[272].

Акрамя таго, Я. К. Мадалінскі надаў кармелітам пляц на будаўніцтва касцёла, які размяшчаўся недзе паміж Траецкай і Афанасьеўскай брамамі. Аднак кармелітам, верагодна, па нейкіх прычынах магчымае месцаразмяшчэнне касцёла не спадабаліся, і яны размянялі пляц, ахвяраваны Я. К. Мадалінскім, на пляц Якава Філімановіча, які размяшчаўся недзе бліжэй да замка. Улічваючы, што крыніца пра замену пляцаў датуецца 7 снежня 1639 г.[273], можна з упэўненасцю сцвярджаць, што да пачатку 1640 г. кармеліты яшчэ месціліся ў былым фарным касцёле Мсціслава.

Магчыма, пасля атрымання ў 1614 г. ад Валерыяна Дэмбавецкага дома на рынку кармеліты доўгі час не маглі атрымаць пляц для будаўніцтва кляштара і касцёла, што і вымушала іх дзейнічаць у былым фарным касцёле і толькі пасля надання пляца Я. К. Мадалінскім і размена яго на пляц Якава Філімановіча, размешчаны, верагодна, каля замка, пачалося будаўніцтва касцёла і кляштара ксяндзоў-кармелітаў на тым месцы, дзе ён стаіць і сёння.

Як бы там ні было, мсціслаўскі кляштар кармелітаў паступова рос і ў 1632 г. тут было 7 законнікаў, у 1640 г. іх колькасць узрасла да 9, а ў 1644 г. было ўжо 11 законнікаў на чале з прыёрам Серапіёнам Каблашэвічам. Дзякуючы шматлікім фундушам кляштар даволі хутка стаў эканамічна магутнай арга-

---

[269] Smora. Kilka słow o karmelitach... – S. 187–188.

[270] Друшчыц С. А., Церашчатава В. В. Мсціслаўскі касцёл і кляштар кармелітаў // Архітэктура Беларусі. Энцыклапедычны даведнік. – Мінск: БелЭн, 1993. – С. 352; Габрусь Т. В. Мураваныя харалы. Сакральная архітэктура беларускага барока. – Мінск: Ураджай, 2001. – С. 157.

[271] Ярашэвіч А. Мсціслаўскі кляштар кармелітаў // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Т. 5. – С. 228.

[272] Volumina legume. – T. 3. – S. 457.

[273] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 113. – Арк. 460.

нізацыяй, і калі ў 1632 г. ён выплочваў 30 злотых на карысць кангрэгацыі, то з 1650 г. гэта сума была павялічана да 100[274]. Магчыма, менавіта ў яго сценах адбылося першае тэатральнае прадстаўленне ў Мсціславе ў 1630 г.[275]

Касцёл і кляштар былі пабудаваны на ўскрайку гандлёвай плошчы, якая знаходзілася перад уездам на замак, над замкавым ровам. Што з сябе ўяўлялі першапачатковыя мсціслаўскія касцёл і кляштар кармелітаў, невядома. Да нас не дайшлі ні яго малюнкі, ні візіты. Аднак думка, што мураваны кармеліцкі касцёл быў пабудаваны ўжо ў сярэдзіне XVII ст., з'яўляецца памылковай. Першапачатковыя касцёл і кляштар былі драўлянымі і такімі яны заставаліся амаль да сярэдзіны XVIII ст.

Пра гэта мы знаходзім паведамленне ў дыярыушы падскарбія ВКЛ І. Лапацінскага, які, апісваючы падзеі сейміка мсціслаўскай шляхты 1733 г., паведамляе, што ён назіраў за сеймікам з хораў кармеліцкага касцёла «na ten czas jescze drzewianego»[276]. Дыярыуш І. Лапацінскага быў завершаны ў 60-я гады XVIII ст. і, верагодна, менавіта таму, што адносна нядаўна завяршылася будаўніцтва мураванага касцёла, аўтар і падкрэсліў у сваіх успамінах, што яшчэ у 1733 г. кармеліцкі касцёл быў драўляным.

Мсціслаўскі драўляны касцёл і кляштар кармелітаў былі знішчаны, а законнікі забітыя падчас штурму горада рускімі войскамі летам 1654 г. Падзеі 1654 г. адлюстраваны ў інтэр'ерах мураванага касцёла на фрэскавым роспісе, дзе мы бачым карціны «Узяцце Мсціслава маскоўскім войскам у 1654 г.» і «Забойства ксяндзоў» (мал. 98, 99).

Акрамя кармеліцкага касцёла і кляштара, у першай палове XVII ст. у Мсціславе, верагодна, быў адноўлены яшчэ і фарны касцёл, але звесткі пра гэта вельмі сціплыя, адносяцца да XVIII ст., і гаворка пра гэтыя магчымыя падзеі будзе ісці ніжэй.

Мсціслаўскі кармеліцкі кляштар не быў адзіным каталіцкім храмам на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства ў пачатку XVII ст. У 1619 г. кармеліты адчынілі рэзідэнцыю і ў Радамлі, а ў 1743 г. яна была рэарганізавана ў кляштар[277]. Згодна з візітай 1805 г. Радамлянскага касцёла, фундатарам першапачатковага касцёла Дзевы Марыі быў Ян Мадалінскі. Аднак да 1805 г. стары касцёл ўжо не існаваў і, як адзначае візіта Радамлянскага касцёла за гэты год, нядаўна ў Радамлі быў пабудаваны новы[278]. Таму даныя пра першапачатковы Радамлянскі касцёл адсутнічаюць.

Дакладныя звесткі пра час будаўніцтва каталіцкага храма ў Крычаве адсутнічаюць. Звычайна сустракаецца інфармацыя, што першы касцёл тут быў

---

[274] Smora. Kilka słow o karmelitach... – S. 188.

[275] Дадиомова О. В. Музыкальная культура городов Белоруссии в XVIII веке. – Минск: Навука і тэхніка, 1992. – С. 114.

[276] Dyaryusz życia Ignacego Lopacińskiego pisarza skarbowego WKL, brata rodzonego wojewody brzeskiego // Biblioteka Warszawska. – T. 3. – Warszawa, 1855. – S. 397.

[277] Ярашевіч А. Кармеліты // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Т. 4. – С. 117.

[278] НГАБ. – Ф. 1781. – Воп. 26. – Адз. зах. 1387. – Арк. 107–112.



Мал. 98. Фрэска «Забойства ксяндзоў» у мсціслаўскім кармеліцкім касцёле. Фота пачатку XX ст.

пабудаваны па загадзе каралевы Боны ў 1620 г.[279] Толькі ў А. С. Дэмбавецкага ёсць звесткі, што касцёл у Крычаве пабудаваны каралевай Бонай ў 1628 г.[280] Але каралева Бона жыла ў першай палове XVI ст., таму гэта інфармацыя выклікае недавер, тым болей што візіты крычаўскага касцёла за 1805, 1841, 1842 гг. вядуць гісторыю гарадской каталіцкай святыні толькі ад 1745 г.[281]

Між тым некаторыя назіранні сведчаць пра ўзвядзенне крычаўскага касцёла менавіта ў першай палове XVII ст. Прывязка будаўніцтва крычаўскага касцёла да дзейнасці каралевы Боны, як адзначалася, не мае ніякіх падстаў.

[279] НГАБ. – Ф. 2387. – Воп. 1. – Адз. зах. 8. – Арк. 1; Słownik geograficzny Królewstwa Polskiego i innych krajow słowianskich. – T. IV. – S. 793–794; Nasze kościoły, Archidiecezja Mohilewska. Mohilewszczyzna. – SPb., 1913. – S. 94–96.

[280] Дембовецкий А. С. Опыт описания Могилевской губернии... – Кн. 2. – С. 144.

[281] НГАБ. – Ф. 1781. – Воп. 26. – Адз. зах. 1387. – Арк. 92.

Мал. 99. Фрэска «Трубяцкая разня» ў мсціслаўскім кармеліцкім касцёле. Фота пачатку XX ст.

Саму ж дату будаўніцтва каталіцкага храма ў Крычаве ў 1620–1628 гг., можна прыняць – гэта пацвярджаюць шматлікія ўскосныя даныя.

Першы з іх – дазвол крычаўскім мяшчанам на два кірмашы ў год, на якіх яны мелі права сычэння мёду. Згодна з прывілеем на наданне гораду магдэбургскага права (1633 г.), воск, атрыманы пры сычэнні мёду, павінны былі дзяліць напалам. Адна палова ішла на карысць касцёла, а другая – на карысць царквы[282]. Гэта першы факт, які ўскосна сведчыць, што ў горадзе ў той час (жнівень 1633 г.) ужо існавала каталіцкая святыня.

Па-другое, у прывілеі пра наданне гораду магдэбургскага права падкрэсліваецца, што члены магістрата павінны выбірацца як з каталікоў, так і з праваслаўных[283].

---

[282] ИЮМ. – Вып. 10. – С. 309.

[283] Мяцельскі А. А. Старадаўні Крычаў. – С. 153.

І нарэшце, пры пераходзе Крычава пад уладу рускага цара ў 1654 г. цар Аляксей Міхайлавіч загадаў прывесці да прысягі на вернасць усіх жыхароў горада – як праваслаўных, так і каталікоў[284], што яшчэ раз падкрэслівае наяўнасць у Крычаве ў першай палове XVII ст. жыхароў каталіцкага веравызнання, якія павінны былі мець сваю культавую святыню. Аднак звесткі пра яе адсутнічаюць.

Традыцыйна лічыцца, што другім каталіцкім манаскім ордэнам, які распачаў сваю актыўную дзейнасць на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства, быў ордэн дамініканцаў. Захаваліся асобныя звесткі пра заснаванне ў Клімавічах напярэдадні 1626 г. ксяндзамі-дамініканцамі кляштара[285].

Аднак у дадзеным выпадку мы апынуліся перад звычайнай геаграфічнай блытанінай, якая трывала ўвайшла ў гісторыю сучаснага горада Клімавічы. Сапраўды, у Клімавічах у пачатку XVII ст. быў заснаваны дамініканскі кляштар, які існаваў там і ў XIX ст. Але гэта вёска Клімавічы, размешчаная ў навакольлях Беластока, на тэрыторыі сучаснай Польшчы.

Справа ў тым, што беластоцкія дамініканцы ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. падпарадкоўваліся Магілёўскай рымска-каталіцкай кансісторыі, і таму візіты Клімавіцкага кляштара захоўваюцца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі сярод візітаў дамініканскіх кляштараў Віцебскай і Магілёўскай губерні[286], адсюль пайшла блытаніна, хаця ў загалоўку некаторых візітаў дакладна ўказана, што кляштар знаходзіцца ў в. Клімавічы Сакольскага павета Беластоцкага абвода.

Такім чынам, у канцы XVI – пачатку XVII ст. касцёлы на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства былі заснаваны толькі ў старых гарадскіх цэнтрах – Мсціславе, Крычаве, Радамлі, а сельская тэрыторыя заставалася пакуль свабоднай ад актыўнай дзейнасці касцёла.

Аднак да сярэдзіны XVII ст. колькасць каталікоў на землях Мсціслаўскага ваяводства значна ўзрасла, яны зараз не толькі былі раскіданы па ўсёй тэрыторыі ваяводства, але і стваралі асобныя кампактныя паселішчы. Пра апошняе сведчыць не толькі наяўнасць каталіцкіх храмаў у гарадах Мсціславе, Крычаве і Радамлі, але і наяўнасць напярэдадні вайны 1654–1667 гг. тут паселішчаў з характэрнымі назвамі, якія сведчылі пра заходняе і, адпаведна, каталіцкае паходжанне яе жыхароў – Ляхавічы[287] (сучасная аднайменная вёска Шумяцкага раёна). Акрамя таго, у крыніцах згадваецца і вёска Паўляхавічы (зараз не лакалізуецца), якая адразу пасля вайны 1654–1667 гг. стаяла пустой[288]. Але магчыма менавіта яна згадваецца ў інвентары Кадзінскай воласці 1729 г. пад

---

[284] БЭФ. – Т. 2. – С. 96–97.

[285] Biskupstwo Wileńskie od jego założenia aż do dnia obecnych, zawierające dzicje i prace biskupow i duchowienstwa diecezji wileńskiej oraz wyroc kościołow, klasztorów, szkoł i zakładów dobroczynnych i społecznych. – Wilno, 1912. – S. 470.

[286] НГАБ. – Ф. 1781. – Воп. 26. – Адз. зах. 1396. – Арк. 15–18 адв.

[287] АВК. – Т. 34. – С. 275.

[288] LVIA. – SA. – Bib. 3722. – P. 10 v.

назвай Полуляхі і існавала яшчэ ў пачатку XX ст. у Бохацкай воласці Мсціслаўскага ўезда Магілёўскай губерні[289].

Пасля вайны Рэчы Паспалітай з Расіяй 1654–1667 гг. на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства распаўсюджванне каталіцкага касцёла фактычна пачалося нанова, прычым трэба прызнаць, што адраджэнне касцёла ў Мсціславе пачалося яшчэ падчас рускай акупацыі горада. Ужо ў 1659 г. тут зноў згадваецца кармеліт Серапіён Каблашэвіч, а ў 1667 г. – Спірыдон Штагер. Колькасць законнікаў-кармелітаў у Мсціславе доўгі час заставалася невялікай – адзін, два. І толькі ў апошняй трэці XVII ст. іх колькасць паступова пачала ўзрастаць і дасягала 6–8 законнікаў[290]. А ў 1690 г. пры кляштары быў і шпіталь[291].

Мсціслаўскі касцёл кармелітаў зноў моцна пацярпеў падчас пажару 1691 г. Ён даволі хутка быў адроджаны, але ў 1712 г. зноў згарэў. Праўда і на гэты раз ён хутка аднавіўся, бо ўжо ў гэтым самым годзе былі закладзены яго новыя падмуркі, і прыёр кармеліцкага канвента Бенедыкт Казловіч наняў цесляроў для будаўніцтва новага касцёла[292].

У 1669 г. акрамя мсціслаўскага кармеліцкага касцёла на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства не было іншых каталіцкіх святынь – толькі ён адзін згадваецца ў сінодзе біскупа Сапегі 1669 г.[293] Аднак менавіта з 1669 г. пачаўся працэс будаўніцтва новых і аднаўлення старых касцёлаў на землях Мсціслаўскага ваяводства.

У 1669 г. быў пабудаваны касцёл у в. Вародзькаў сучаснага Крычаўскага раёна, хаця ёсць звесткі пра тое, што ён быў заснаваны ў 1619 г.[294] У той жа час нельга выключыць, што апошняя дата – гэта звычайная памылка, звязаная з недакладнай перапіскай крыніцы.

Справа ў тым, што фундуш на будаўніцтва касцёла ў Вародзькаве даў толькі ў 1664 г. ксёндз-кармеліт Алексей Панятоўскі. У 1669 г. на касцёл даў фундуш і яго брат, дэкан і плябан віленскі Аляксандр Панятоўскі, а ў 1670 г. да фундушаў братоў далучылася і іх сястра Барбара. Касцёл быў пабудаваны ў гонар Узнясення Дзевы Марыі. Яшчэ ў пачатку XIX ст. ён стаяў на мураваным падмурку, меў памеры 18,5 × 8 сажняў, быў аднавежавы і крыты гонтам[295].

Наступным касцёлам, што ўзнік на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства пасля вайны, магчыма, быў маляціцкі. Дакладныя звесткі пра час заснавання касцёла ў Маляцічах адсутнічаюць. Яго самыя старажытныя метрычныя кнігі

---

[289] Аддзел рукапісаў Львоўскай НБ ім. В. Стэфаніка НАН Украіны // Ф. 5 – Адз. зах. 5163/П. – Арк. 33; Список населенных мест Могилевской губернии. – Могилев: Могилев. губ. стат. ком., 1910. – С. 86.

[290] Smora. Kilka słow o karmelitach... – S. 189; Wolyniak Z. Z przeszłośći karmelitów na Litwie i Rusi. Część 1. – Kraków: Nakładem oo. Karmelitów na Piasku, 1918. – S. 352, 353; Metryka Litewska. Rejestry podymnego. – S. 19.

[291] НГАБ. – Ф. 1729. – Воп. 1. – Адз. зах. 2. – Арк. 293.

[292] Тамсама. – Адз. зах. 14. – Арк. 394–396 адв.

[293] Biskupstwo Wileńskie. – S. 129–130, 468.

[294] Nasze kościoły. – T. 1, Cz.1. – S. 97.

[295] НГАБ. – Ф. 1781. – Воп. 26. – Адз. зах. 1387. – Арк. 96, 99.

адносяцца да 1742 г., і ён згадваецца сярод касцёлаў у сінодзе біскупа Зянькевіча 1744 г. Але ў той жа час ёсць звесткі, што касцёл у Маляцічах быў заснаваны айцамі-дамініканцамі і ўфундаваны мсціслаўскім падкаморым Уладзімірам Камінскім у 1671 г.[296] Першапачаткова ў Маляцічах існаваў драўляны касцёл, які ў канцы XVIII ст. быў заменены мураваным Петрапаўлаўскім касцёлам. Апошняя дата заснавання маляцкага касцёла (1671 г.) знаходзіць іншыя ўскосныя пацверджанні.

Так, ужо ў 1694 г. дзяржаўца Крычаўскага староства Караль Станіслаў Радзівіл надаў маляцкім дамініканцам прывілей на два пляцы ў Крычаве з мэтаю пабудовы там касцёла і кляштара пры ім[297]. Акрамя таго, захаваліся тэстаменты Сафіі Астрожскай (1725 г.) і Мікалая Стружэўскага (1739 г.), у якіх яны ахвяруюць грошы маляцкім дамініканцам[298]. Аднак звесткі пра гэты першапачатковы драўляны касцёл у Маляцічах не захаваліся.

Мураваны ж касцёл у Маляцічах быў пабудаваны Станіславам Богуш-Сестранцэвічам, мітрапалітам і архібіскупам магілёўскім ў 1787 г. у гонар свайго апекуна Св. Станіслава[299]. Архітэктурнае рашэнне касцёла даволі незвычайнае. Гэта паменшаная ў 32 разы, але не зусім дакладная копія сабора Св. Пятра ў Рыме, што, верагодна, было прадыктавана заказчыкам – прызначаным у 1784 г. каталіцкім мітрапалітам усёй Расіі (мал. 100). Трохнефавую крыжова-купальную базіліку з трыма купаламі (на сярэднякрыжжы і рамёнах трансепта) закрываў надзвычай шырокі і грувасткі фасад, завершаны атыкам і трохвугольным франтонам, які адсутнічае на фасадзе рымскага сабора[300]. Побач з касцёлам былі пабудаваны кляштар, школа, шпіталь, амбар. Даходы на кляштар ішлі з фальварка Людагошч[301]. Пасля паўстання 1830–1831 гг. кляштар дамініканцаў у Маляцічах быў зачынены, касцёл перароблены пад праваслаўную царкву, а ў 1934 г. цалкам зруйнаваны.

У 1676 г. згадвасцца фундуш мсціслаўскага падкаморага Уладзіміра Камінскага на арганізацыю ў Мсціславе дамініканскага касцёла і кляштара[302]. У. Краснянскі наогул адносіў заснаванне дамініканскага касцёла ў горадзе яшчэ да 1654 г.[303] Аднак нельга выключыць, што гэта нейкая памылка. На такую думку наводзіць тое, што не захаваўся ні сам кляштар, ні якіясьці звесткі пра яго[304]. Гэта вельмі дзіўная сітуацыя, бо пасля вайны сярэдзіны XVII ст.

---

[296] Biskupstwo Wileńskie. – S. 181, 470.

[297] НГАБ. – Ф. 694. – Воп. 4. – Адз. зах. 1157. – Арк. 4.

[298] Тамсама. – Ф. 1729. – Воп. 1. – Адз. зах. 27. – Арк. 457 адв.; Тамсама. – Адз. зах. 44. – Арк. 1400.

[299] Тамсама. – Ф. 1781. – Воп. 26. – Адз. зах. 1387. – Арк. 117, 120 адв.; Морозов В. Ф. Работы зодчих виленской и варшавской архитектурных школ в Белоруссии в конце XVIII – первой половины XIX в. // Архитектурное наследство. – 1985. – № 33. – С. 182–183.

[300] Габрусь Т. В. Мураваныя харалы. – С. 234.

[301] Морозов В. Ф. Работы зодчих виленской и варшавской архитектурных школ... – С. 183; НГАБ. – Ф. 1781. – Воп. 2. – Адз. зах. 249. – Арк. 59–60.

[302] Biskupstwo Wileńskie. – S. 471.

[303] Краснянский В. Г. Город Мстиславль. – С. 65.

[304] Wolyniak Z. Z przeszłości karmelitów na Litwie i Rusi. – S. 340.



Мал. 100. Маляцічы. Касцёл Св. Станіслава. Малюнак XVIII ст.

з Рускай дзяржавай Рэч Паспалітая не ведала якіх-небудзь жудасных падзей, калі б зачыняліся каталіцкія святыні і памяць пра іх не захоўвалася.

У той жа час, улічваючы, што фундуш на мсціслаўскі дамініканскі касцёл і кляштар даваў той самы Уладзімір Камінскі, які толькі пяць гадоў назад даў фундуш на арганізацію касцёла і кляштара ў Маляцічах, нельга выключыць, што выдзеленых ім сродкаў на заснаванне касцёла і кляштара ў Мсціславе не хапіла. Верагодна, ніхто з мясцовай шляхты не падтрымаў яго фундуш, і ідэя аб арганізацыі ў Мсціславе дамініканскага кляштара так і не была рэалізавана.

Тым не менш, і надалей айцы-дамініканцы працягвалі актыўна працаваць над адкрыццём новых касцёлаў ў Мсціслаўскім ваяводстве. Так, у в. Пацкава сучаснага Мсціслаўскага раёна імі быў пабудаваны касцёл Раства Дзевы Марыі. Фундуш на яго – «добра» у памеры 50000 злотых – 13 чэрвеня 1685 г. даў віцебскі падкаморы Самуэль Казімір Цеханавецкі і яго жонка Тэкля. 10 кастрычніка фундуш быў актыкаваны ў горадзе, а ў наступным годзе – у земстве[305].

Аднак фундуш на кляштар быў дадзены з парушэннем, таму адразу па смерці С. К. Цеханавецкага яго спадкаемцы пачалі аспрэчваць правы дамініканцаў на маёмасць у Пацкаве. Гэту праблему добра разумелі і самі законнікі і спрабавалі яе вырашыць, аднак справа ўвесь час не знаходзіла завяршэння. У 1695 г. гэты фундуш на заснаванне кляштара ў Пацкаве не быў пацверджаны і на сейме Рэчы Паспалітай.

[305] НГАБ. – Ф. 1781. – Воп. 26. – Адз. зах. 1387. – Арк. 309, 312; Dumin S., Rachuba A., Sikorska-Kulesza J. Ciechanowieccy herby Dąbrowa. – S. 49.

Нарэшце ў 1785 г. мсціслаўскі харунжы Міхал Цеханавецкі змог вырашыць на сваю карысць гэту спрэчку і пазбавіць дамініканцаў маёмасці ў Пацкаве[306]. Магчыма, гэта спрэчка, што цягнулася амаль стагоддзе, паўплывала на тое, што самі законнікі адчувалі сябе тут «гасцямі», а не гаспадарамі, і мала ўвагі надавалі стану касцёла.

Першапачатковы касцёл у Пацкаве быў драўляным, але ўжо ў 1699 г. на яго месцы быў пабудаваны мураваны[307]. Звестак пра драўляны касцёл наогул не захавалася, а пра мураваны касцёл звестак захавалася вельмі мала, і таму немагчыма нават уявіць яго архітэктурны стыль.

Верагодна, мураваны храм быў дрэнна пабудаваны, бо ўжо праз стагоддзе ў візіце касцёла 1805 г. адзначаецца, што ў Пацкаве быў новы драўляны касцёл, а ў старога, мураванага, сцены далі трэшчыны. У такім самым занядбалым стане знаходзіўся і драўляны кляштар, адносна якога гаворыцца што жыць ў ім немагчыма. У кляштары на той час заставаліся толькі 2 законнікі, і ён паступова прыходзіў у заняпад[308], а канчаткова Пацкаўскі кляштар і касцёл былі зачынены пасля паўстання 1830–1831 гг.

Е. Вольф паведамляе пра фундуш у 1681 г. кляштара і касцёла Св. Варвары ў Хіславічах другой жонкай Самуэля Пятровіча Друцкага-Горскага Барбарай Канстанцыяй Кавечынскай[309]. Аднак знаёмства з крыніцай, на якую спасылаецца аўтар, паказвае, што там гаворка ідзе пра Хатаевічы, а не Хіславічы. Згодна са Слоўнікам геаграфічным, Хатаевічы размяшчаліся каля Плешчаніц пад Лагойскам (суч. в. Акцябр), і там сапраўды існавалі дамініканскі кляштар і касцёл, пабудаваныя Барбарай Канстанцыяй Кавечынскай[310]. Такім чынам, сцвярджэнне Е. Вольфа пра будаўніцтва ў Хіславічах касцёла і кляштара з'яўляецца памылковым.

Падчас вайны 1654–1667 гг. быў знішчаны і крычаўскі касцёл, пра што сведчыць яго адсутнасць у сінодзе біскупа Сапегі 1669 г.[311] Тым не менш, ужо ў інвентары Крычава 1673 г. згадваецца слабада «Латынь», а ў інвентары 1679 г. – «Латынская вуліца». Інвентары горада 1682 г. і больш позніх часоў згадваюць як «Латынскую вуліцу», так і «сотню Латынскую» пры апісанні вайсковай арганізацыі горада згадваюць[312]. Усё гэта сведчыць пра наяўнасць у горадзе адразу пасля вайны каталіцкага (лацінскага) насельніцтва, якое кампактна сялілася ў горадзе (раён паміж сучаснай вуліцай ім. К. Лібкнехта і Забялышчынскім ярам і сёння ў Крычаве завецца Латынь) і павінна было мець сваю святыню – як мінімум каплічку.

---

[306] Dumin S., Rachuba A., Sikorska-Kulesza J. Ciechanowieccy herby Dąbrowa. – S. 49–50.

[307] НГАБ. – Ф. 1781. – Воп. 26. – Адз. зах. 1404. – Арк. 1.

[308] Тамсама. – Адз. зах. 1387. – Арк. 309–312.

[309] Wolff J. Kniazowie litewsko-ruscy. – S. 144.

[310] Słownik geograficzny Królewstwa Polskiego i innych krajow słowianskich. – T. 1. – S. 337, 637.

[311] Biskupstwo Wileńskie. – S. 129–130, 467–469.

[312] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 2669/1. – Арк. 170 адв.–171; Тамсама. – Адз. зах. 1923. – Арк. 13–14; Тамсама. – Адз. зах. 1925. – Арк. 13–14; Тамсама. – Адз. зах. 1926. – Арк. 11; Тамсама. – Адз. зах. 1928. – Арк. 21–23, 34–35.

Дакладная колькасць каталікоў у Крычаве першай паловы – сярэдзіны XVII ст. невядома. Колькасць каталікоў ў горадзе ў другой палове XVII ст. можна прыблізна падлічыць, абапіраючыся на колькасць дымоў на Латынскай вуліцы і слабадзе Латынь. Калі лічыць, што жыхары гэтых «канфесійных» вуліцы і слабады былі выключна каталікамі, то ў горадзе ў 1673 г. налічвалася 55 каталіцкіх дымоў[313], у якіх адпаведна маглі пражываць каля 300 каталікоў. Такая ж колькасць дымоў на Латынскай вуліцы і слабадзе Латынь адзначаецца і ў інвентары горада 1679 г.[314] Улічваючы, што ў горадзе на гэты час налічвалася толькі 375 дымоў, то каталікі складалі прыкладна 14–15% яго насельніцтва. Безумоўна, ім была патрэбна свая святыня.

Верагодна, першапачаткова пасля вайны ў Крычаве існавала каплічка, а сам касцёл быў адроджаны толькі ў апошняй чвэрці XVII ст. Калі ў інвентары горада 1682 г. на Замкавай гары, за царквой Св. Міколы яшчэ згадваецца «зруб на касцёл», то ў інвентары горада 1694 г. ён адсутнічае пры апісанні Замкавай гары, а ў горадзе згадваецца царква Узнясення Дзевы Марыі[315]. Але царкоўны догмат пра узнясенне Дзевы Марыі існуе толькі ў каталіцкай царкве, таму перад намі безумоўна касцёл, а не царква, як сказана ў інвентары.

Калі ў 1679 г. каталікоў у Крычаве было каля 15%, для якіх у 1682–1683 гг. быў пабудаваны драўляны касцёл, то да 1694 г. іх колькасць, верагодна, значна павялічылася. Так, інвентар горада 1694 г. адзначае, што Латынская сотня Крычава налічвала 89 дымоў (прыкладна 450–500 жыхароў)[316]. З агульнай колькасці гарадскіх дымоў на той час – каля 500 – гэта складае прыкладна 18%.

Безумоўна, для такой колькасці каталіцкіх вернікаў ўжо было мала аднаго храма і, верагодна, менавіта таму ў 1694 г. дзяржаўца Крычаўскага староства Караль Станіслаў Радзівіл надаў маляціцкім дамініканцам прывілей на два пляцы ў Крычаве з мэтаю пабудовы там касцёла і кляштара пры ім[317].

Аднак потым колькасць каталікоў у горадзе значна паменшылася, што, верагодна, было звязана з падзеямі Паўночнай вайны і агульным заняпадам горада, староства і ваяводства. Так, у 1720–1727 гг. Латынская сотня Крычава ўключала ў свой склад ужо толькі 43 дымы (прыкладна 200–250 жыхароў)[318].

Нягледзячы на фундуш К. С. Радзівіла на дамініканскі кляштар і касцёл у Крычаве, верагодна, першапачаткова, маляціцкія дамініканцы не мелі дастатковых сродкаў для будаўніцтва новага касцёла і кляштара, і гэта справа замарудзілася, а потым падзеі Паўночнай вайны і рэзкае змяншэнне колькасці каталікоў у горадзе вымусілі маляціцкіх дамініканцаў наогул адмовіцца ад

---

[313] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1923. – Арк. 13–14.

[314] Тамсама. – Адз. зах. 1925. – Арк. 13–14.

[315] Тамсама. – Адз. зах. 1926. – Арк. 3; Тамсама. – Адз. зах. 1928. – Арк. 31–32.

[316] Тамсама. – Адз. зах. 21–23, 34–35.

[317] Тамсама. – Ф. 694. – Воп. 4. – Адз. зах. 1157. – Арк. 4.

[318] Тамсама. – Ф. КМФ-5. – Адз. зах. 1931/2. – Арк. 8–9; Тамсама. – Адз. зах. 1933/2. – Арк. 8; Тамсама. – Адз. зах. 1932. – Арк. 23–25, 32–37.

ідэі будаўніцтва ў горадзе новага касцёла і кляштара. І ў Крычаве працягваў дзейнічаць толькі адзін парафіяльны каталіцкі храм.

Тым не менш, дамініканцы ў горадзе з'явіліся ў пачатку XIX ст., калі ў 1824 г. на заснаванне дамініканскага кляштара пры касцёле Св. Ганны даў фундуш Вікенцій Іванавіч Галынскі. Але кляштар праіснаваў нядоўга і ўжо ў 1832 г. быў зачынены за ўдзел законнікаў у падзеях паўстання 1830–1831 гг., а самі яны былі адпраўлены ў аршанскі дамініканскі кляштар[319].

Яшчэ адным каталіцкім ордэнам, які актыўна дзейнічаў на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства, былі езуіты. Яны пачалі пранікаць на тэрыторыю Мсціслаўскага ваяводства толькі ў канцы XVII ст. Самая ранняя з езуіцкіх місій на тэрыторыі ваяводства адкрылася ў мястэчку Кадзіна. Яна пачала дзейнічаць у 1686 г., і агульнапрынята, што першапачаткова яна была місіяй Аршанскага езуіцкага калегіума. Для яе арганізацыі ўладар Кадзіна Марцін Агінскі пабудаваў дом і капліцу і ўстанавіў штогадовы фундуш ў памеры 300 злотых на аднаго місіянера. Да 1689 г. ім быў Міхал Якановіч.

Аднак у гісторыі мсціслаўскага езуіцкага калегіума адзначана, што місія ў Кадзіне хаця і сапраўды належала Аршанскаму калегіуму, аднак першапачаткова была заснавана для падтрымкі новай рэзідэнцыі езуітаў у Смаленску[320].

Наступная езуіцкая місія і школа на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства была адкрыта ў 1690 г. ужо ў Мсціславе са згоды шляхты, хаця І. М. Слюнькова сцвярджае, што езуіцкі касцёл у Мсціславе быў пабудаваны ўжо ў 1616 г.[321]

Згодна з запісамі ў гісторыі Мсціслаўскага езуіцкага калегіума, у пачатку яе дзейнасці на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства было даволі шмат каталікоў, але яны жылі ў асноўным у гарадах, у той час як мястэчкі і вёскі заставаліся праваслаўнымі. У той жа час езуіты адзначалі, што значная частка мсціслаўскіх каталікоў не хадзілі на споведзь і фактычна былі каталікамі чыста намінальна. За тры гады дзейнасці кадзінскай місіі ордэна езуітаў ўдалося перавесці з праваслаўя ў каталіцызм толькі 8 чалавек. Таму езуіты вырашылі перанесці цэнтр сваёй дзейнасці з невялікага мястэчка ў цэнтр ваяводства[322].

Дазвол на арганізацыю рэзідэнцыі ў Мсціславе і працу на тэрыторыі ваяводства езуіты атрымалі дзякуючы пастанове павятовага сейміка. Для арганізацыі рэзідэнцыі мсціслаўскі падстарасцій Іосіф Галынскі саступіў езуітам за палову кошту свой двор, у якім Міхал Якановіч, разам з двума іншымі кадзінскімі езуітамі адчыніў капліцу і 19 сакавіка 1690 г. правёў першае набажэнства. На рэзідэнцыю і школу былі выкуплены дамы ў Базыля Іллініча і Станіслава Зуба.

Першы езуіцкі невялікі драўляны касцёл у Мсціславе быў адчынены ўжо ў 1693 г. Яго ў 1707 г. замяніў новы, які быў пабудаваны Уладзіславам Дзягілевічам дзякуючы ахвяраванням Люцыі Іллінічавай і братоў Вінцэнція і Крыш-

[319] НГАБ. – Ф. 2001. – Воп. 1. – Адз. зах. 135.

[320] ATJK. – Signaturza 515. – S. 1–2.

[321] Слюнькова И. Н. Монастыри восточной и западной традиции. – С. 338.

[322] ATJK. – Signaturza 515. – S. 1–4.

тафа Валовічаў. У 1708 г. шведамі езуіцкая місія ў Мсціславе была спалена і знішчана, але ўжо ў 1711 г. яна была адбудавана і нават ператворана ў рэзідэнцыю. І зноў усю працу па адраджэнні езуіцкай місіі правёў У. Дзягілевіч, які і памёр у Мсціславе ў 1711 г.[323]

Уладанні мсціслаўскіх езуітаў сфарміраваліся за кошт наданняў шляхты. Так, у 1706 г. Казімір і Канстанцыя Гнаінскія надалі ім «маетнасці» Граз (вёскі Граз, Гарадок і Драздоўка) у Мсціслаўскім ваяводстве і Гразін у Віцебскім ваяводстве. Таксама яны надалі кляштару два пляцы ў самім Мсціславе на вуліцы Афанасьеўскай, прама насупраць калегіума[324]. У 1709 г. Марыяна Івянецкая надала мсціслаўскім езуітам 1500 тынфаў, у 1726 г. Лындорфы – 2000 злотых. У больш познія часы ўладаннямі мсціслаўскіх езуітаў сталі Будагошч, Смянкоўшчына, Точна, Дзеснакіта, Крутая, Чортава[325].

Мсціслаўская езуіцкая місія з самага пачатку стала адукацыйным цэнтрам рэгіёна. Першапачатковая езуіцкая школа пры місіі была адчынена ўжо ў 1691 г. у доме, атрыманым ад Станіслава Зуба. У наступныя гады школа атрымала новы будынак з 4 заламі[326], хаця Т. Б. Блінова лічыць, што школа была адчынена толькі ў 1697 г. і працавала да выгнання езуітаў з Расіі ў 1820 г. Выключэннем з'яўляліся толькі 1708–1709 і 1710–1711 гг., калі з-за падзей Паўночнай вайны заняткі ў школе не праводзіліся.

Ужо ў 1697 г. тут працаваў прафесар інфімы Лаўрэнцій Маслькоўскі, прафесар граматыкі, сінтаксісу і грэчаскай мовы Томаш Мажайкоўскі і прафесар паэзіі і рыторыкі Вінцэнцій Шыпіла. І надалей прафесарскі склад мсціслаўскай школы заўсёды складаўся з 3–4 выкладчакаў, што адпавядала ўзроўню сярэдняй навучальнай ўстановы ордэна[327].

Пры мсціслаўскім езуіцкім кляштары дзейнічаў тэатр. Яго спектаклі адбываліся ў школьным будынку, дзе была вялікая зала для публічных выступленняў. У 1729 г. мсціслаўская вучні паказвалі ў гонар Кшыштафа Валовіча лацінскую панегірычную драму[328].

У канцы XVII ст. на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства паспрабавалі распачаць сваю дзейнасць і браты-бернардзінцы. Першы кляштар айцоў-бернардзінцаў на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства паспрабаваў закласці яшчэ ў 1690 г. у Дрыбіне Караль Цеханавецкі. Ён зрабіў фундуш на невялікі кляштар (на 3 законнікі), аднак па нейкіх прычынах ён не быў пабудаваны нават яшчэ у 1722 г.[329]

---

[323] Encyklopedie wiedzy o jezuitach na ziemiach Polski i Litwy. 1564–1996. – Kraków: Wyd. WAM. 1996. – S. 259; Poplatek J., Paszenda J. Słownik jezuitów artystów. – Kraków: Wyd. Apostolstwa modlitwy, 1972. – S. 108.

[324] ИЮМ. – Вып. 30. – С. 76–82.

[325] Блинова Т. Б. Иезуиты в Белоруссии. – Минск: Беларусь, 1990. – С. 60.

[326] Encyklopedie wiedzy o jezuitach. – S. 259.

[327] Блинова Т. Б. Иезуиты в Беларуси. Роль иезуитов в организации образования и просвещения. – Гродно: Гродн. гос. ун-т им. Я. Купалы, 2002. – С. 72.

[328] Мальдзіс А. І. На скрыжаванні славянскіх традыцый. Літаратура Беларусі пераходнага перыяду (другая палова XVII–XVIII ст.). – Мінск: Навука і тэхніка, 1980. – С. 154.

[329] Dumin S. Ciechanowieccy herby Dąbrowa. – S. 62.

Пасля падзей Паўночнай вайны пачалося далейшае распаўсюджванне каталіцкага касцёла. Наступным касцёлам, пабудаваным у Мсціслаўскім ваяводстве кармелітамі, быў Св. Троіцкі касцёл у в. Мазыкі. Ён быў пабудаваны ў 1714 г. мсціслаўскім старастам Міхалам Станіславам Катлом[330]. Аднак звесткі пра яго выгляд ў XVIII ст. не захаваліся.

У канцы XVIII ст. у Мазыках заснавалі кляштар і ксяндзы-бернардзінцы. Фундуш ў памеры 1000 залатых рускіх рублёў, якія ішлі з маёнтка Глінье, даў 30 жніўня 1771 г. Пётр Кабылінскі. 7 студзеня 1772 г. фундуш у памеры 100 рублёў срэбрам, якія шлі з маёнтка Калеснікі, даў мсціслаўскі падчашы Міхал Іллініч. У чэрвені 1773 г. да іх далучыліся браты Іосіф, Іван і Фадзей Хадкевічы, якія ахвяравалі на кляштар 500 рублёў. Кляштару з самага пачатку існавання належала і размешчаная побач карчма. Бернардзінцы жылі тут да 1832 г., калі кляштар быў зачынены за ўдзел манахаў у паўстанні 1830–1831 гг.[331]

Але найбольш актыўна дзейнічалі ў пасляваенны час езуіты. Так, у 1715 г. уладальнікі Кадзіна Пацеі ўзнавілі тут фундацыю Марціна Агінскага на езуіцкую місію і з 1730 г. пачалі выплочваць стыпендыю. Лічыцца, што касцёл у Кадзіне быў пабудаваны Пацеямі ў 1751 г., і імша ў ім праводзілася па нядзелях і святах айцамі-езуітамі, якія прыязджалі з Мсціслава[332].

Аднак невялікі касцёл з плябанню на самай справе дзейнічаў ужо ў 1729 г. І гэта зразумела, бо для дзейнасці місіі неабходна была святыня. Інвентар Кадзіна 1729 г. згадвае ўжо старую плябань і невялікі касцёл з трыма алтарамі. Галоўны алтар кадзінскага касцёла быў прысвечаны Дзеве Марыі, абраз якой быў упрыгожаны срэбраным акладам і залатой каронай. Сам алтар быў упрыгожаны золатам і срэбрам, а ў верхняй яго частцы быў абраз Св. Ваўжынца. Два другія алтары былі прысвечаныя Ісусу Хрысту і Св. Антонію[333].

Езуіцкія місіі ў XVIII ст. дзейнічалі і ў іншых месцах Мсціслаўскага ваяводства. У 1717 г. была адкрыта езуіцкая місія пры капліцы ў в. Гарадок. На яе арганізацыю Люцыя з Гнаінскіх Іллінічаў запісала «добра Будагошч і Слінкоўшчызну»[334].

У 1743 г. езуіцкая місія была арганізавана ў в. Кулікоў каля маскоўскай граніцы. Для яе забяспячэння Адамам Глінскім былі вылучаны «добра» з 5 падданымі. Гэта місія не мела самастойнага касцёла. Сваю дзейнасць мсціслаўскія езуіты ажыццяўлялі тут у спецыяльна прызначаныя дні ў уніяцкай царкве[335].

Езуітам належаў і драўляны касцёл Св. Казіміра у Расне, які быў пабудаваны дзякуючы фундушу графа Міхала Пацея ў 1751 г.[336] У той жа час ёсць

---

[330] НГАБ. – Ф. 1781. – Воп. 26. – Адз. зах. 1387. – Арк. 323 адв.

[331] Тамсама. – Воп. 2. – Адз. зах. 156. – Арк. 6, 9, 60 адв.–61, 65а, 65б, 65в, 65г.

[332] Encyklopedie wiedzy o jezuitach. – S. 259.

[333] Львоўская навуковая бібліятэка ім. В. Стэфаніка НАН Украіны. Аддзел рукапісаў // Ф. 5 – Адз. зах. 5163/П. – Арк. 24–25.

[334] Encyklopedie wiedzy o jezuitach. – S. 221.

[335] Encyklopedie wiedzy o jezuitach. – S. 344.

[336] НГАБ. – Ф. 1781. – Воп. 26. – Адз. зах. 1387. – Арк. 113.

звесткі, што першапачаткова ён з'яўляўся філіяй дамініканскага касцёла, размешчанага ў в. Пацкава. Але ў руках дамініканцаў касцёл знаходзіўся нядоўга. Ва ўсякім выпадку, ужо ў 1754 г. рагачоўскі староста Міхал Пацей надаў на арганізацыю езуіцкай місіі ў Расне в. Слабада, а Ян Ваяводскі – в. Ласкоўка. Драўляны касцёл Св. Казіміра праіснаваў да пажару 1794 г.[337] З 1812 па 1818 г. на грошы Л. К. Парчэўскага ў Расне быў пабудаваны мураваны касцёл.

Езуіцкая місія ў Лазовіцах была арганізавана ў 1752 г. дзякуючы фундацыі Яна Кіркора, які надаў мсціслаўскаму калегіуму ва ўладанне вёскі Стайкі і Сямёнаўка, пабудаваў місійны дом і драўляны касцёл Св. Тройцы[338]. Касцёл у канцы XVIII – пачатку XIX ст. уяўляў сабой прамакутны аб'ём памерамі 32,5 × 17,5 аршыны (23,1 × 12,4 м). Галоўны фасад, да якога далучаўся невялікі прытвор з крыжамі наверсе, быў упрыгожаны дзвюма вежамі, у адной з якіх былі тры невялікія званы. Над дахам мясціўся купал. Езуіцкая місія ў Лазовіцах дзейнічала да 1820 г., а потым касцёл і рэзідэнцыя былі перададзены бернардзінскаму ордэну[339].

Езуіцкія місіі на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства дзейнічалі таксама ў Халобліне, Клімавічах, Шумячах. За межамі ваяводства мсціслаўская езуіцкая рэзідэнцыя кіравала місіяй ў Старадубе.

Пасля няўдалай спробы заснавання бернардзінскага касцёла ў канцы XVII ст. у Дрыбіне новая спроба бернардзінцаў замацавацца ў Мсціслаўскім ваяводстве адбылася толькі ў XVIII ст.

Першы канвент бернардзінцаў у Мсціслаўскім ваяводстве, магчыма, пачаў сваю дзейнасць толькі ў 1707 г. у Мсціславе[340], але звесткі пра гэта вельмі сціплыя. Дакладна арганізаваць бернардзінскі кляштар у Мсціславе было вырашана толькі на кангрэгацыі бернардзінцаў у Гародні 25 кастрычніка 1725 г.

Аднак фундушны запіс на пляц зямлі ў Мсціславе пад касцёл, кляштар і 15 тыс. польскіх злотых на ўтрыманне манахаў быў зроблены яшчэ пазней, толькі 15 жніўня 1727 г. Янам Іосіфам Гуркам, віцебскім харунжым, і яго жонкай Хрысцінай з роду Галынскіх. Праз месяц, 14 верасня 1727 г., да іх далучыўся мсціслаўскі падкаморы Крыштаф Казімір Валовіч, які даў на гэту справу яшчэ 12 тыс. злотых. Акрамя таго, фундатары абавязваліся на свае ўласныя сродкі выбудаваць драўляны касцёл і кляштар, што і было зроблена да 1729 г.[341]

Першапачатковы драўляны касцёл у імя Найсвяцейшай Панны Марыі ўяўляў з сябе прамавугольны ў плане будынак з двухсхільным дахам, з трохвугольным франтонам у цэнтры і дзвюма трох'ярусным купальнымі вежамі па

---

[337] НГАБ. – Ф. 1781. – Воп. 2. – Адз. зах. 182. – Арк. 4; Encyklopedie wiedzy o jezuitach. – S. 561.

[338] Encyklopedie wiedzy o jezuitach. – S. 391.

[339] Яцкевіч З. Л. Лазовіцкая рэзідэнцыя іезуітаў // Архіварыус. – Мінск, 2001. – Вып. 1. – С. 67–70.

[340] Kantak K. Bernardzyni polscy. – Lwów, 1933. – T. 2. – S. 411.

[341] Klasztory bernardyńskie w Polsce w jej granicach historycznych. Dzieło zbiorowie pod redakcja ks. Hieronima Eug. Wyczawskiego OFM. Dodatek ks. Hieronim Eug. Wyczawski OFM. Krótka historia zakonu braci mniejszych. – Kalwaria Zebzydowska, 1985. – S. 228.

Мал. 101. Выява Мсціслаўскага бернардзінскага манастыра на карце XVIII ст. (па: Баравы Р. В., Якімовіч Ю. А. Каштоўны дакумент па гісторыі беларускай графікі і архітэктуры XVIII ст. // Помнікі культуры. Новыя адкрыцці. Мінск, 1985)

баках галоўнага фасада. Над алтаром узвышалася невялічкая вежачка-сігнатурка. Дах і ўсе вежы былі накрытыя гонтамі. Даўжыня храма складала 12,3 сажняў (каля 25,3 м), шырыня – 6 сажняў (каля 12,8 м) (мал. 101). У касцёле налічвалася пяць алтароў драўляных «зніцерскай работы». З правага боку ад галоўнага алтара размяшчаўся скарбец, а на процілеглым ад яго баку – сакрыстыя. Падлога ў прасвітэрыуме была драўляная, у самім касцёле – цагляная[342]. Драўляны касцёл праіснаваў да 1823 г., аднак у 1775 г. пабудавалі новы цагляны храм.

Новы храм у значнай ступені паўтараў стары, але зараз гэта была трохнефавая, двухвежавая зальная базіліка, у якой алтарная частка была арыентавана на паўднёвы захад[343]. Археалагічныя даследаванні з мэтаю пошуку бернардзінскага касцёла, праведзеныя ў 1988 г. А. А. Трусавым, вызначылі яго месцазнаходжанне, выявілі фрагменты яго падмуркаў, што дазволіла вызначыць памеры і некаторыя канструкцыйныя элементы касцёла.

Касцёл стаяў паралельна трасе сучаснай вуліцы Савецкай. Падмуркі паўночна-заходняй агароджы пляца храма А. Неўскага стаяць непасрэдна на сцяне касцёла. Даўжыня касцёла разам з апсідай складала 42 м, без апсіды – 36 м, шырыня касцёла была каля 23 м. Таўшчыня сцен касцёла дасягала 2 м. Касцёл быў складзены з цэглы памерамі 25 × 13 × 5 см, 27,5 × 12 × 6 см, 27 × 13,5 × 6 см. Апсіда касцёла мела ўнутраны радыус каля 7 м. Падобную ж шырыню меў і цэнтральны неф касцёла. Перад уваходам у апсіду былі зафіксаваны рэшткі чатырох прыступак. Шырыня бакавых нефаў храма была каля 4 м. У паўночна-ўсходняй частцы касцёла былі зафіксаваны рэшткі пяці апорных слупоў памерамі каля 2,5 × 2 м (мал. 102)[344].

Першапачатковы аднапавярховы драўляны жылы кляштарны корпус прымыкаў да будынка драўлянага касцёла з левага боку ад галоўнага фасада і з тарца фланкіраваўся вежай[345].

Мураваны жылы кляштарны комплекс вядомы з 1783–1784 гг., аднак дакладная дата яго пабудовы не захавалася[346]. Кляштар спалучаў цагляныя і драў-

[342] Пятровіч Н. Мсціслаўскі кляштар бернардзінцаў // ГАЗ. – Мінск, 1996. – № 8. – С. 189, 190.

[343] Слюнькова И. Н. Монастыри восточной и западной традиции. – С. 260.

[344] Трусаў А. А. Справаздача аб правядзенні археалагічных даследаванняў у ліпені 1989 г. на помніку архітэктуры XIX ст. былой царквы А. Неўскага ў горадзе Мсціславе // Архіў ІГ НАН Беларусі. – Адз. зах. 1245. – Спр. 11, 12, 19, арк. 2, 4.

[345] Баравы Р. В., Якімовіч Ю. А. Каштоўны дакумент па гісторыі беларускай графікі і архітэктуры XVIII ст. / // Помнікі культуры. Новыя адкрыцці. – Мінск: Навука і тэхніка, 1985. – С. 119, мал. 3,б.

[346] Пятровіч Н. Мсціслаўскі кляштар бернардзінцаў. – С. 189, 190.



Мал. 102. План размяшчэння комплекса бернардзінскага касцёла і кляштара канца XVIII ст.

ляныя аднапавярховыя будынкі, быў чатырохвугольнай формы, з унутраным дваром, і прымыкаў да касцёла з паўночнага боку[347].

Археалагічныя даследаванні, праведзеныя ў 1988 г. А. А. Трусавым, дазволілі акрэсліць месцазнаходжанне кляштара. Будынак кляштара даследаваны фрагментарна: на яго падмурку ў XIX ст. быў пастаўлены храм у імя А. Неўскага. Даследаванні выявілі фрагменты мураванага кляштара на поўдзень і на поўнач ад дзейснага храма (мал. 102), але на поўдзень ад касцёла, а не на поўнач, як сцвярджала І. М. Слюнькова. Шырыня корпуса кляштара была 11 м, даўжыня – каля 42–45 м. У паўночнай частцы быў прасочаны падзел корпуса на асобныя секцыі, магчыма келлі, памерамі 2,7–2,85 × 3,5–3,65 м, якія мелі выкладзеную з цэглы падлогу на пясчанай падсыпцы. Корпус меў добра захаваныя крыжовыя скляпенні, у якія вяла прасочаная вінтавая мураваная лесвіца[348]. З заходняга боку кляштара ў бок касцёла ішоў яшчэ нейкі будынак складанай планіроўкі, але ён да канца не быў даследаваны з-за таго, што яго рэшткі хаваліся пад сучаснай пабудовай і таму яго планіроўка і прызначэнне да канца не высветлены.

[347] Слюнькова И. Н. Монастыри восточной и западной традиции. – С. 260.

[348] Трусаў А.А. Справаздача аб правядзенні археалагічных даследаванняў... – Адз. зах. 1077. – Спр. 12, 19, 36.

Мсціслаўскі касцёл і кляштар бернардзінцаў праіснавалі да 1832 гг., калі былі скасаваны за ўдзел у паўстанні 1830–1831 гг. З цягам часу ён быў разабраны, і ў другой палове XIX ст. на яго месцы быў пабудаваны праваслаўны храм Аляксандра Неўскага.

Адначасова з арганізацыяй бернардзінскага кляштара ў Мсціславе фундатары паставілі ўмову, каб па нядзелях і на святы законнікі-бернардзінцы праводзілі імшу ў Шумячах, на той час уладанні Гурко. І гэта адбывалася амаль да пачатку XIX ст., пакуль там не была арганізавана самастойная бернардзінская рэзідэнцыя і пабудаваны ў 1808 г. касцёл Св. Архангела Міхаіла, фундатарам якога быў Міхал Галынскі[349].

У другой трэці XVIII ст. пачаўся новы этап у будаўніцтве касцёлаў на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства – у Мсціславе пачынаюць будавацца мураваныя храмы.

У 1730 г. нарэшце быў закладзены першы камень у падмурак мураванага езуіцкага касцёла Св. Міхала Архангела, які быў завершаны ў 1739 г.[350] (мал. 103–106). Згодна з іншымі данымі, мураваны касцёл быў закладзены ў 1738 г. і завершаны ў 1757 г., аднак толькі што завершаныя хоры абваліліся, і будаўніцтва касцёла было адноўлена пад кіраўніцтвам архітэктара Мезмера[351].

Мал. 103. Мсціслаў. Езуіцкі касцёл. Сучасны стан

[349] Klasztory bernardyńskie w Polsce. – S. 228; НГАБ. – Ф. 1781. – Воп. 2. – Адз. зах. 1763. – Арк. 2.

[350] Габрусь Т. В. Мураваныя харалы. – С. 158.

[351] Слюнькова И. Н. Монастыри восточной и западной традиции. – С. 339.

У той самы час іншыя даследчыкі сцвярджаюць, што імя будаўніка-архітэктара дакладна невядома, а Мезмер працаваў у Мсціславе толькі два гады (1746–1748). Акрамя таго, у 1754–1755 гг. тут працаваў архітэктарам І. Алендскі[352].

Сярод іншых майстроў-езуітаў, якія ўпрыгожвалі мсціслаўскі езуіцкі касцёл і калегіум, быў сталяр Ф. Берман, які не толькі кіраваў тут сталярнай майстэрняй, але і да будаўніцтва мураванага касцёла рамантаваў стары драўляны і ажыццяўляў дагляд за будаўніцтвам мураванага. Тут жа, у мураваным кляштары і касцёле працаваў сталяр Ф. Лакцінскі[353].



Мал. 104. Мсціслаў. Касцёл Міхаіла Архангела ордэна іезуітаў. План

Гэта была трохнефавая трохчасткавая базіліка з двухвежавымі фасадамі-нартэксамі. Апсіда прасвітэрыя мае паўкруглае завяршэнне, па баках размеш-

Мал. 105. Мсціслаў. Езуіцкі касцёл і калегіум. Сучасны стан

[352] Poplatek J. Słownik jezuitów artystów. – S. 244; Габрусь Т. В. Мураваныя харалы. – С. 158.
[353] Poplatek J. Słownik jezuitów artystów. – S. 85, 152.

Мал. 106. Мсціслаўскі езуіцкі касцёл. Сучасны стан

чаны сакрыстыі[354]. Да касцёла прылягяюць з поўначы з боку галоўнага фасада аднапавярховы мураваны будынак аптэкі, з поўдня каля апсіды – двухпавярховы прамавугольны ў плане корпус калегіума.

У XVIII ст. у мсціслаўскай езуіцкай школе выкладалі для свецкіх слухачоў філасофію (1729–1741), тэалогію для клірыкаў (1736–1737), а таксама матэматыку і гісторыю (1750–1751). Пачынаючы з сярэдзіны XVIII ст. у мсціслаўскай школе пачалі выкладаць геаметрыю, навучанне якой мела практычны характар. Таксама выкладалі французскую, нямецкую, рускую мовы, архітэктуру. Акрамя школы, пры рэзідэнцыі з 1725 г. дзейнічаў аркестр. З 1740 г. пры рэзідэнцыі пачала дзейнічаць аптэка, двухпавярховы будынак якой захаваўся да сённяшняга дня. Мсціслаўская езуіцкая рэзідэнцыя існавала да 1779 г., калі была ператворана ў калегіум[355].

[354] Габрусь Т. В. Мураваныя харалы. – С. 158.

[355] Блинова Т. Б. Иезуиты в Беларуси. Роль иезуитов в организации образования и просвещения. – С. 127.

Для падтрымкі дзейнасці мсціслаўскай рэзідэнцыі ішлі даходы з маёнткаў Будагошч, Ходун, Холаўшчызна, Чарэне, Чортова, Дзеснакіта, Гразь, Гразін, Казлоўск, Крутая, Кулікоў, Ласкоўка, Пятровічы, Пірчоў, Пацейкаўкі, Роханічы, Слінкоўшчызна, Стайкі, Точна, Засекі, Жукаў[356].

Як адзначалася вышэй, згодна са звесткамі І. Лапацінскага, да 1733 г. мсціслаўскі кармеліцкі касцёл і кляштар былі драўлянымі. Між тым у навуковай літаратуры замацавалася думка, што ў 1746–1750 гг. мсціслаўскі мураваны касцёл кармелітаў быў рэканструяваны архітэктарам Я. К. Глаўбіцам. Аднак, улічваючы звесткі І. Лапацінскага, трэба прызнаць, што Я. К. Глаўбіц, верагодна, пабудаваў мураваны касцёл і кляштар на месцы драўляных, а не рэканструяваў іх.

Мсціслаўскі касцёл кармелітаў уяўляе сабой мураваную двухвежавую шасцістоўпавую базіліку з двума вежавымі фасадамі і пяціграннай алтарнай апсідай, да якой з поўначы прымыкае двухпавярховы, прамавугольны ў плане будынак кляштара (мал. 107–109).

Архітэктурны аналіз мсціслаўскага кармеліцкага і езуіцкага касцёлаў паказвае, што архітэктура першага, больш ранняга, паўплывала на фарміраванне

Мал. 107. Мсціслаў. Від на кармеліцкі касцёл з Замкавай гары

[356] Encyklopedie wiedzy o jezuitach. – S. 445.

Мал. 108. Мсціслаў. Кармеліцкі касцёл

структуры апошняга, але з пэўнымі мадыфікацыямі[357]. Магчыма, гэта ўскосна сведчыць пра тое, што мы маем справу з адным і тым жа архітэктарам, які развіваў сваю архітэктурную школу. І магчыма, што адзін і другі касцёл будаваў Я. К. Глаўбіц, і сваю дзейнасць ён распачаў тут значна раней за 1746 г.

Сярэдзіна XVIII ст. фактычна магла стаць перыядам найбольшага пашырэння ўплыву каталіцкага касцёла ў Мсціслаўскім ваяводстве. Акрамя будаўніцтва мураваных храмаў, у Мсціславе ў сярэдзіне XVIII ст. у горадзе планавалася заснаваць яшчэ і кляштар сясцёр-бернардзінак. Фундуш на яго дала оўруцкая падстолія Сурынава, якая была ўраджэнкай Мсціслаўскага ваяводства. У склад яе фундуша на кляштар сясцёр-бернардзінак уваходзілі пляцы ў самім Мсціславе і «маетнасць» Лызкі з ўсімі да яе прыналежнасцямі. Прычым ў сваім тэстаменце яна падкрэслівала, што кляштар павінен быць заснаваны толькі ў Мсціславе, а не ў якім-небудзь іншым месцы.

[357] Габрусь Т. В. Мураваныя харалы. – С. 158.

Аднак пасля смерці фундатаркі (1746 г.) яе душапрыказчыкі – мсціслаўскі гродскі суддзя Парчэўскі і гродскі староста Шпілеўскі – парушылі тэстамент нябожчыцы. Яны спачатку самі карысталіся даходамі з маетнасці Лызкі, а потым перадалі іх мінскім бернардзінкам.

Карыстаючыся сваім службовым становішчам, яны, калі пытанне пра выкананне тэстамента Сурынавай узняла мясцовая шляхта (1752 г.), не дапусцілі разгляду гэтай справы ў мсціслаўскім гродскім судзе, і толькі запіс пра гэтыя падзеі ў гродскай кнізе крычаўскай магдэбургіі знаёміць нас з гісторыяй няўдалага заснавання мсціслаўскага кляштара бернардзінак[358]. У той жа час К. Кантак сцвярджае, што кляштар у Мсціславе не ўдалося заснаваць з-за недахопу сродкаў, і таму грошы сама фундатарка аддала на карысць мінскага кляштара бернардзінак[359].



Мал. 109. Мсціслаў. План кармеліцкага касцёла

Такім чынам, у першай палове XVIII ст. у Мсціславе існавалі касцёлы і кляштары ордэнаў кармелітаў, езуітаў і бернардзінцаў. Акрамя таго, захаваліся сціплыя звесткі пра наяўнасць у горадзе яшчэ і фарнага касцёла.

Так, у 1746 г. каралём быў выдадзены прывілей на прызначэнне крычаўскага плябана Рэгінальда Іллініча на мсціслаўскі фарны касцёл. У прывілеі адзначаецца, што мсціслаўская «фара» стаіць пустая і амаль знішчаная са дня смерці айца Міхаіла Арлоўскага. Зараз жа мясцовыя жыхары самі звярнуліся да караля, каб той дапамог ім адрадзіць святыню, што кароль і пачаў рабіць, прызначыўшы ім новага ксяндза[360].

З гэтага паведамлення вынікае, што яшчэ у першай палове XVIII ст. у горадзе захоўваўся нейкі прыходскі касцёл, якім кіраваў у свой час ксёндз Міхаіл Арлоўскі, той, што ў 1618 г. перадаў кармелітам касцёл Дзевы Марыі. У сувязі з гэтым узнікае пытанне, а ці не быў гэты прыходскі касцёл тым таямнічым касцёлам «Bogu zwyczięcu», пра які захаваліся толькі сціплыя звесткі?

Магчыма, пасля таго як першы мсціслаўскі фарны касцёл быў перададзены кармелітам, жыхары горада па нейкіх прычынах вырашылі адрадзіць прыходскі касцёл, ксяндзом якога зноў стаў Міхаіл Арлоўскі. Нельга выключыць, што быў пабудаваны новы касцёл, але адрадзіць паўнавартаснае рэлігійнае жыццё ў ім не змаглі да вайны 1654–1667 г., а пасля вайны ў выніку скарачэн-

[358] ИЮМ. – Вып. 17. – С. 310–314.
[359] Kantak K. Bernardzyni polscy. – S. 375.
[360] ИЮМ. – Вып. 17. – С. 373.

ня колькасці каталікоў ў горадзе хапала аднаго кармеліцкага касцёла, і справа па адраджэнні мсціслаўскага фарнага касцёла зацягнулася. З цягам часу, калі ў горадзе і з'яўляліся законнікі новых ордэнаў, яны будавалі свае асабістыя святыні, а на пусты прыходскі касцёл не звярталі ўвагі.

Аднак і зараз справа па адраджэнні мсціслаўскай «фары», распачатая ў сярэдзіне XVIII ст., таксама ішла вельмі марудна, пра што сведчыць новы прывілей, выдадзены каралём у 1756 г. У ім зноў згадваецца існаванне раней у Мсціславе фарнага касцёла і пералічваюцца ўсе фундушы на яго, адзначаецца, што ўсе яны разрабаваныя і разабраныя па іншых каталіцкіх храмах і кляштарах. Зноў ставілася пытанне пра адраджэнне мсціслаўскага фарнага касцёла і далучэнне да яго крычаўскага касцёла[361].

Аднак і надалей справа па адраджэнні мсціслаўскай фары не прасунулася. Пра апошняе сведчыць новы рэскрыпт караля Аўгуста III (1760 г.) да мсціслаўскага старасты М. Лапацінскага і падстарасты і войта Е. Галынскага з патрабаваннем вылучыць пляцы па просьбе ксяндза Рэгінальда Іллініча на будаўніцтва ў Мсціславе новага фарнага касцёла і плябані[362]. Але і гэта не дапамагло. Пра мсціслаўскі фарны касцёл нічога не вядома ні ў канцы XVIII ст., ні ў XIX ст.

Апошняе, верагодна, тлумачыцца тым, што ў горадзе на той час ужо былі 3 ордэнскія касцёлы і кляштары і для арганізацыі новага фарнага касцёла ў Мсціславе не хапала ні сродкаў, ні (а магчыма, гэта самае галоўнае) паствы. Бо навакольнае насельніцтва ў асноўным было праваслаўнымі і ўніятамі, а каталікі – адносна нешматлікая шляхта.

Нельга выключыць, што будаўніцтву новага фарнага касцёла ў Мсціславе актыўна супраціўляліся і каталіцкія ордэны, што мелі тут свае святыні. Супрацьстаянне ордэнскіх і фарных касцёлаў было даволі распаўсюджанай з'явай ў тагачаснай Рэчы Паспалітай.

Толькі ў самым канцы XVIII ст. (1794 г.) у Мсціславе быў пастаўлены новы невялікі філіяльны касцёл на могілках пры Смаленскім тракце. Ён быў драўляным, невялікіх памераў – 9 × 4 аршыны, з дзвюма вежамі і стаяў на мураваным падмурку[363].

Крычаўскі фарны касцёл, пабудаваны ў 1682 г., пражыў падзеі Паўночнай вайны і згадваецца ў тэстаменце Эльжбеты Навасельскай 1743 г. і ў рэестры касцёлаў Віленскай дыяцэзіі паводле сінода біскупа Зянькевіча 1744 г., сярод іншых каталіцкіх храмаў Аршанскага дэканата[364].

Верагодна, месца, дзе размяшчаўся гэты касцёл, было не зусім спрыяльнае, і таму ў сярэдзіне XVIII ст. у горадзе пачалося будаўніцтва новага каталіцкага храма. Менавіта гэта падзея адлюстравалася ў візітах крычаўскага касцёла, якія захаваліся да нашых дзён.

Першыя дакладныя пісьмовыя звесткі пра арганізацыю і будаўніцтва касцёла ў Крычаве адносяцца да 1745 г. Дваццатага ліпеня гэтага года крычаўскі

[361] ИЮМ. – Вып. 17. – С. 380.

[362] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 181. – Арк. 795.

[363] Тамсама. – Ф. 1781. – Воп. 26. – Адз. зах. 1387. – Арк. 300–300 адв.

[364] Тамсама. – Ф. 1729. – Воп. 1. – Адз. зах. 50. – Арк. 821; Biskupstwo Wileńskie. – S. 181.

стараста Геранім Фларыян Радзівіл аддаў загад упраўляючаму крычаўскім староствам Паўлу Цялецкаму выдзяліць пляцы пад будаўніцтва фарнага касцёла і плябані. Прычым Геранім Радзівіл падкрэсліваў, што «земельный участок должен быть однакожъ не в близком положени от замка, чтобы, в случае сохрани Бог, возникновения бунтов не было еще большей измены от костёла. Притом строго предупреждаю, чтобы самый участок никак не находился на которой либо горе, тем более на такой, которая образует другой угол Замковой горы». Гэты загад быў выкананы ўжо да 26 жніўня. Пад фарны касцёл крычаўскаму ксяндзу Рэгінальду Іллінічу былі выдзелены 5 пляцаў агульным памерам 28,5 прэнта[365].

18 верасня 1745 г. у працэс арганізацыі новага крычаўскага касцёла актыўна ўключылася і каралева Марыя Юзэфа. Магчыма, адсюль і ідзе блытаніна з удзелам ў арганізацыі касцёла каралевы Боны. Каралева Марыя Юзэфа асобым фундушам для забеспячэння каталіцкага касцёла і плябані ў Крычаве паклала ў Дрэздэнскі банк 4000 талераў з дазволам штогод 8 снежня на свята «непарочнага зачацця Дзевы Марыі», у гонар якой і быў узведзены крычаўскі касцёл, браць з гэтай сумы 1000 талераў. Трэба адзначыць, што працэнты з гэтага фундуша крычаўскі касцёл ад Саксонскага банка атрымліваў яшчэ ў пачатку XX ст.

Наданні на касцёл князя Радзівіла і каралевы Марыі Юзэфы былі пацверджаны каралём Аўгустам III, які акрамя гэтага ў верасні 1746 г. дазволіў крычаўскаму плябану выбіраць з сялян Магілёўскай эканоміі добраахвотныя ахвяраванні на касцёл хлебам і воскам[366]. Прычым ва ўсіх прывілеях падкрэсліваецца, што наданні даюцца на «нанова» заснаваную плябанію і касцёл.

Усё гэта падкрэслівае, што каталіцкая святыня ў Крычаве не была навіной ў сярэдзіне XVIII ст. Прывілеі князя Радзівіла і каралевы Марыі Юзэфы толькі далі дадатковы штуршок для далейшай арганізацыі духоўнага жыцця каталікоў горада і яго наваколля.

Ва ўсякім выпадку, у інвентары 1747 г. у Крычаве згадваецца касцёл, размешчаны ў канцы Пятніцкай вуліцы. Касцёл і яго плябань займалі пляц зямлі ў 9 прэнтаў[367]. Верагодна, гэта і быў стары касцёл, пазначаны ў сінодзе біскупа Зянькевіча 1744 г. і пабудаваны ў канцы XVII ст.

Адначасова ў інвентары адзначаецца, што на рагу рынка і вуліцы «Ражэственскай» у 1747 г. будуецца новы фарны касцёл. Пад касцёл і плябань адводзіліся 5 гарадскіх пляцаў агульным памерам 23 прэнта. Гэта і ёсць тая самая каталіцкая святыня, на якую далі фундушы каралеўская сям'я і князь Геранім Фларыян Радзівіл.

Новы касцёл быў пабудаваны з дрэва, стаяў на каменным падмурку, меў дзве вежы і дах, крыты гонтам[368]. Што потым стала са старым касцёлам, кры-

[365] ИЮМ. – Вып. 17. – С. 390–395.

[366] Тамсама. – С. 356–361.

[367] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1936. – Арк. 24.

[368] Тамсама. – Арк. 24, 27; Тамсама. – Ф. 1781. – Воп. 26. – Адз. зах. 1387. – Арк. 94.

ніцы не паведамляюць. Магчыма, ён быў разабраны. Ва ўсякім выпадку, на плане Крычава 1778 г. у горадзе паказаны толькі адзін каталіцкі храм.

Акрамя гэтых касцёлаў у сярэдзіне – канцы XVIII ст. будуюцца касцёлы і каплічкі ў мястэчках, дзе была невялікая колькасць каталікоў. Так, на плане Хоцімска 1779 г. паказана каталіцкая капліца. Верагодна, менавіта яна згадваецца ўжо ў інвентары Радзівілава 1746 г. Згодна з інвентарным апісаннем, капліца была зроблена з брусоў, крыта драніцамі, мела дашчатыя дзверы. Унутры капліцы знаходзіўся вялікі драўляны крыж, каля якога былі тры вялікія абразы і адзін малы[369]. У 1784 г. ужо быў касцёл у Шумячах, у якім на той час не было святара.

У цэлым назіранні за распаўджваннем каталіцкага догмата веры на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства ў XVI–XVIII стст. паказваюць, што на працягу гэтых стагоддзяў вылучыліся тры этапы ў распаўсюджванні каталіцкага касцёла.

Калі ў пачатку XVII ст. тут былі лічаныя касцёлы, размешчаныя ў старых гарадскіх цэнтрах – Мсціславе, Крычаеў і Радамлі (мал. 110), то пачынаючы



● – касцёл; ✝ – кляштар

Мал. 110. Каталіцкія храмы на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства

[369] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1935. – Арк. 10.

ў другой паловы гэтага стагоддзя пачалося іх будаўніцтва і на перыферыі ваяводства. З сярэдзіны XVIII ст. пачалося будаўніцтва тут мураваных храмаў, што ў цэлым да канца XVIII ст. дазволіла стварыць густую сетку касцёлаў, раскіданых па ўсім Мсціслаўскім ваяводстве.

7.5. Іудаізм

Яшчэ адной даволі значнай канфессійнай групай насельніцтва Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай былі іудзеі. Калі яны праніклі на ўсходнія землі ВКЛ, дакладна невядома, але ўжо ў сярэдзіне – другой палове XV ст. у спісе зямельных раздач караля Казіміра, якія ён надаваў у наваколлях Мсціслава і Крычава, згадваецца сяло «Жидовинцева», назва якога, магчыма, ускосна сведчыць як мінімум пра цікавасць гэтай этнаканфесійнай групы да ўсходніх раёнаў ВКЛ, а магчыма, і пра наяўнасць яўрэяў на гэтых землях[370]. У самым канцы XV ст. крыніцы неаднаразова фіксуюць цікавасць брэсцкіх яўрэяў як арандатараў крычаўскіх і мсціслаўскіх корчмаў, а да крычаўскай каморы цікавасць праяўлялі троцкія яўрэі[371]. Але непасрэдныя звесткі пра наяўнасць прадстаўнікоў гэтай этнаканфесійнай групы на ўсходніх землях ВКЛ адсутнічаюць.

Тым не менш, нельга выключыць, што ўжо ў канцы XV ст. у Крычаве і Мсціславе была невялікая колькасць яўрэяў, якія павінны былі мець свае культавыя святыні. Аднак самыя першыя звесткі пра мсціслаўскую сінагогу адносяцца толькі да першай паловы XVII ст. і звязаны яны з канфірмацыяй прывілея мсціслаўскім яўрэям ад 30 красавіка 1635 г. У ім адзначаецца, што яны паказалі сябе вернымі дзяржаве падчас апошняй кампаніі і яшчэ у сакавіку 1633 г. атрымалі асобны прывілей ад караля за мужную абарону горада. У прывілеі адзначаецца, што мсціслаўскія яўрэі ўжо тады мелі ў горадзе сваю «бажніцу» і асобную лазню[372]. Яны мужна паводзілі сябе падчас абароны горада і ўзятыя ў іх у 1633 г. гакаўніцы яшчэ былі на замку ў 1637 г.[373]

Дзе размяшчалася першапачатковая сінагога Мсціслава, дакладна невядома. Яшчэ ў пачатку XX ст. у горадзе існавала паданне, што самая першая сінагога Мсціслава размяшчалася па-за межамі горада і стаяла на тым месцы, дзе і драўляная сінагога, пабудаваная ў XVIII ст., – на тэрыторыі сучаснай Казіміравай слабады[374]. Аднак гэта паведамленне адлюстроўвае даволі позняе месцаразмяшчэнне сінагогі, бо ў прывілеі дакладна гаворыцца пра сінагогу ў горадзе, а тэрыторыя Казіміравай слабады ў XVII ст. размяшчалася па-за межамі Мсціслава таго часу.

---

[370] ДМАМЮ. – Т. 1. – С. 22-18.

[371] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 37. – Арк. 436 адв.–437 адв.; Тамсама. – Адз. зах. 253. – Арк. 12 адв.; Акты Литовской метрики. – Т. 1, вып. 1. – С. 70.

[372] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 111. – Арк. 406 адв.–407.

[373] Тамсама. – Адз. зах. 316. – Арк. 143–144.

[374] Краснянский В. Г. Город Мстиславль. – С. 18; Цыпин В. Евреи в Мстиславле: материалы к истории города. – Иерусалим: Скопус, 2006. – С. 21.

Згодна з пацвярджальным прывілеем караля Яна II Казіміра крычаўскім яўрэям ад 1664 г., яны мелі правы на будаўніцтва сінагогі яшчэ ад яго папярэднікаў – раней за 1648 г.[375] Нельга выключыць, што, як і мсціслаўскія яўрэі, яны атрымалі асобны прывілей на правы за абарону горада падчас кампаніі 1633 г.

Ускосным пацверджаннем гэтага можа быць тое, што іудзеі Крычава, як і Мсціслава, таксама прымалі актыўны ўдзел у абароне горада падчас войнаў, і гэта знайшло сваё адлюстраванне ў каралеўскіх прывілеях. Так, у 1646 г. кароль, улічваючы іх адвагу падчас апошняй «экспедыцыи масковской» (1633 г.) і жадаючы, каб яны і надалей актыўна ўдзельнічалі ў абароне Крычава, даў ім дазвол на будаванне асобных «клетак» у замку, каб захоўваць там свае рэчы і хавацца ад ворага падчас асады[376].

Мы не ведаем колькасць яўрэяў у Мсціславе і Крычаве ў даваенны перыяд. Аднак улічваючы звесткі пра амаль поўнае іх знішчэнне ў навакольных гарадах – Гомелі, Быхаве, Старадубе падчас «хмельніччыны»[377], нельга выключыць, што і тут іх большая частка была знішчана падчас захопу гарадоў рускімі войскамі ў 1654 г.

Вызначыць дакладную колькасць яўрэйскага насельніцтва на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства даволі складана, таму што яны ўвесь час стараліся схаваць дакладную колькасць свайго насельніцтва, каб зменшыць сумму выплочваемага падатку. Так, згодна з інвентаром Крычава 1676 г., у горадзе іх пражывала ўсяго 48 чалавек – каля 5% ад агульнай колькасці насельніцтва горада[378].

Крыніцы фіксуюць невялікую колькасць яўрэяў у Крычаве і пасля падзей Паўночнай вайны. Так, у інвентарах Крычава за 1720 і 1723 гг. адзначаюцца толькі 24 «жыдоўскія» дымы, а ў інвентары 1727 г. – 40 «жыдоўскіх» дамоў. У Кадзіне ў 1729 г. з агульнай колькасці ў мястэчку 201 дыма, 139 былі хрысціянскімі і 62 – яўрэйскімі. Такім чынам, у Кадзіне яўрэйскае насельніцтва на той час складала каля 31% ад агульнай колькасці жыхароў мястэчка.

Некалькі лепш асвятляе колькасць іудзеяў і іх арганізацыю на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства «Інвентар і тарыф пагалоўны жыдоў Мсціслаўскага ваяводства 1765 г.». Згодна з ім кагалы існавалі ў Мсціславе (279 чалавек у горадзе + 273 яўрэі жылі па вёсках у воласці Мсціслава), Крычаве (343+81), Казіміраве (52), Маляцічах (28), Шумячах (223+36), Хіславічах (216+21), Касцюковічах (126+13), Дрыбіне (241+14), Расне (170+30), Татарску (29+7), Кадзіне (54+6), Родне (28+16), Лазовіцах (23+45), Пятровічах (88), Шамаве (54+40), Манастыршчыне (47+29). Усяго за 1765 г. у Мсціслаўскім ваяводстве было зафіксавана 2616 яўрэяў, якім патрэбны былі свае культавыя святыні[379].

---

[375] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1932. – Арк. 10.

[376] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 119. – Арк. 708 адв.–709.

[377] Еврейские хроники XVII столетия. Эпоха «хмельничины». – М.; Иерусалим: Гешарим, 1997. – С. 112–113, 163, 164, 172.

[378] LVIA. – F. 1280. – Ap. 2. – Bib. 533. – P. 19v.

[379] LVIA. – F. SA. – Ap. 1. – Bib. 3806. – P. 1–26.

Акрамя таго, у інвентары Крычаўскага староства 1747 г. адзначаецца наяўнасць сінагог у мястэчках Міхалаў, Радзівілаў, што таксама пацвярджае наяўнасць там яўрэяў і кагальнай арганізацыі. У апошнім да сінагогі яшчэ належалі два дамы і пляц на 34 прэнты. Сінагога была і ў мястэчку Міласлявічы на вуліцы, што вяла ў бок в. Лядзешня[380] (мал. 111).

Аднак у духоўным плане не кожны кагал меў свайго рабіна, што абумоўлівалася, верагодна, матэрыяльнымі магчымасцямі кагала. Так, напрыклад, мсціслаўскі рабін ажыццяўляў сваю дзейнасць не толькі ў самім Мсціславе і суседнім Казіміраве, але і ў Маляцічах. Адзін і той жа рабін служыў у Кадзіне, Шамаве і Татарску.

Мяркуючы па «Інвентару і тарыфу пагалоўнаму жыдоў Мсціслаўскага ваяводства 1765 г.», большая частка яўрэяў ў гарадах і мястэчках пражывалі ў асобных яўрэйскіх кварталах, сведкамі чаго з'яўляюцца згаданыя тут пасады квартальных ва ўсіх гарадах і мястэчках, якія адказвалі за чысціню і парадак у яўрэйскіх кварталах.



Мал. 111. Сінагогі ў Мсціслаўскім ваяводстве ў XVIII ст.: *1* – Дрыбін; *2* – Забычанне; *3* – Кадзіна; *4* – Касцюковічы; *5* – Крычаў; *6* – Лазовіца; *7* – Манастыршчына; *8* – Міласлявічы; *9* – Мсціслаў; *10* – Пятровічы; *11* – Расна; *12* – Родня; *13* – Татарск; *14* – Хіславічы; *15* – Хоцімск; *16* – Шамава; *17* – Шумячы

[380] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1936. – Арк. 98, 141, 175.

Гэта падцвярджае і наяўнасць ў Крычаве ўжо ў першай палове XVIII ст. асобнай Жыдоўскай вуліцы, на якой кампактна пражывала большасць іудзеяў. У іудзеяў былі свае асобныя могілкі, а сінагога – «школа жыдоўская» – увесь час згадваецца ў інвентарах Крычава другой паловы XVII – першай паловы XVIII ст.[381] Так, у 1679 г. яна была на Галкавай вуліцы, а ў 1747 г. – на Жыдоўскай вуліцы[382].

Новыя даныя пра колькасць іудзеяў у былым Мсціслаўскім ваяводстве даюць крыніцы, што адносяцца ўжо да Расійскай імперыі. Калі ў Мсціславе ў 1772 г. налічвалася каля 4680 жыхароў[383], то яўрэі (279 чалавек) складалі каля 6% насельніцтва.

У ведамасцях пра староствы Беларускага намесніцтва 1774 г. адзначаецца, што ў Крычаўскім старостве пражывалі 872 яўрэі: у тым ліку ў гарадах і мястэчках – 544, а ў вёсках – 328. У самім Крычаве ў 1779 г. з 470 дамоў (2820 чалавек) 86 былі яўрэйскімі, у якіх пражывалі 703 яўрэі, што складала каля 25% ад агульнай колькасці насельніцтва горада. У гэтым самым годзе ва ўсім былым Крычаўскім старостве налічваўся толькі 161 жыдоўскі дым, у якіх пражывала 1590 чалавек, што складала каля 7% ад агульнай колькасці насельніцтва староства[384].

Згодна з рэвізскай сказкай Крычаўскага графства 1779 г., шмат яўрэяў пражывалі ў мястэчку Хоцімск – 222 чалавекі з агульнай колькасці 651 гарадскіх жыхароў, альбо 34% насельніцтва. У Мілаславічах іх было 91 з 382 чалавек, альбо 23%. У Забычанні іх была амаль палова – 97 чалавек з 208 (47%). У Студзянцы – толькі 19 чалавек са 149 (13%)[385]. Безумоўна, у гэтых населеных пунктах павінны былі быць сінагогі. Інвентар Крычаўскага староства 1747 г. і рэвізская сказка 1779 г. адзначаюць наяўнасць яўрэяў і ў некаторых вёсках староства і графства, але спецыяльных малельных пабудоў у гэтых вёсках не было, ці яны проста не указаны ў крыніцы.

Згодна з данымі рэвізскай сказкі 1778 г., у Хіславічах пражывалі 396 яўрэяў з 1124 агульнай колькасці[386] насельніцтва, альбо 35%.

Нягледзячы на невялікую колькасць яўрэйскага насельніцтва, на ўсходніх землях ВКЛ, як і паўсюль у краіне і па ўсёй Еўропе, адносіны да іх былі вельмі напружанымі, што было выклікана пануючым у Сярэднявеччы і Новым часе антысемітызмам. Час ад часу гэта вылівалася ў амаль непрыкрытую барацьбу. У мірныя часы гэта мела адносна спакойны характар і насіла форму эканамічнай барацьбы, а падчас ваенных канфліктаў вылівалася ў праліццё крыві. Сведкам антысемітызму жыхароў Мсціслава з'яўляецца так званы кагальны калодзеж, які захаваўся да сённяшніх дзён, з якога брала ваду выключна іудзейскае насельніцтва горада (мал. 112).

---

[381] Мяцельскі А. А. Старадаўні Крычаў. – С. 53.

[382] НГАБ. – Ф. КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1925. – Арк. 11; Тамсама. – Адз. зах. 1936. – Арк. 34.

[383] Карпачев А. М. Социально-экономическое развитие городов Белоруссии... – С. 22, 23.

[384] НГАБ. – Ф. 2151. – Воп. 1. – Адз. зах. 177. – Арк. 14, 134.

[385] Тамсама. – Арк. 15–15, 31–32, 47 адв.–50, 69 адв.–71 адв.

[386] Тамсама. – Адз. зах. 135. – Арк. 15–21 адв.

Мал. 112. Мсціслаў. Кагальны калодзеж. Сучасны стан

Барацьба за эканамічнае панаванне ў разбураным вайной 1654–1667 гг. Мсціслаўскім ваяводстве паміж яўрэямі і хрысціянамі прасочваецца нават у тым, што хрысціяне Крычава ў 1664 г. дабіліся ад караля Яна II Казіміра перадачы ім карчмы, якая раней была ў арэндзе ў яўрэяў[387].

Крыніцы пачатку XVIII ст. неаднаразова фіксуюць напружаныя адносіны паміж хрысціянамі і іудзеямі Крычава, якія закраналі ў першую чаргу эканамічныя пытанні. У выніку гэтага апошніх нават пагражалі выгнаць з горада ва Украіну[388].

А вось падчас падзей паўстання 1740–1744 гг. у Крычаўскім старостве антысемітызм паказаў сябе ва ўсёй сваёй «красе». Але тут галоўную ролю ў яго распаўсюджванні сыграла не столькі спрадвечная нелюбоў да яўрэяў, не столькі антысемітызм, які быў у крыві народа, але мэтанакіраваная дзейнасць мясцовай шляхты, якую таксама закранулі дзеянні новага радзівілаўскага ўпраўляючага па навядзенні ў Крычаўскім старостве элементарнага эканамічнага парадку.

Менавіта цяжкі эканамічны стан сялянства ў выніку пераводу эканомікі Крычаўскага староства на прамысловыя рэйкі прывёў тут да выступлення сялянства, а антысеміцкі яго акрас быў выкліканы выключны тым, што радзі-

[387] ИЮМ. – Вып. 25. – С. 314–316.
[388] НГАБ. – Ф. 694. – Воп. 4. – Адз. зах. 1159. – Арк. 30–30 адв., 299–300 адв.

вілаўскім упраўляючым і былымі арандатарамі Крычаўскага староства былі яўрэі. Але пры тым рэзкім развароце на прамысловыя рэйкі, які адбываўся ў Крычаўскім старостве на працягу 20–40-х гадоў XVIII ст., гэты выбух усё роўна адбыўся б. Радыкальныя эканамічныя змены і ўвесь іх цяжар выпалі на долю простага люду, што і выклікала паўстанне сялян.

Сярод мсціслаўскай шляхты былі і мусульмане – татары, што аселі ў розныя часы на гэтых землях. Тапонім, які бясспрэчна сведчыць пра наяўнасць на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства татараў – служба Татарская (суч. в. Татарск Манастыршчынскага раёна), згадваецца толькі ў пачатку XVII ст. у сяле Калодзязі[389].

Аднак выхадцы з татараў на землях Мсціслаўскага княства былі ўжо ў XV ст. Так, татарскі род Глінскіх прадстаўляў служылых баяр мсціслаўскага князя Івана Юр'евіча ўжо ў другой палове XV ст.[390] Прадстаўнік другога татарскага роду – Мурза Маскевіч – займаў пасаду мсціслаўскага харунжага ужо ў сярэдзіне XVI ст.[391] Гэты род потым прыняў хрысціянства ў праваслаўным варыянце і ўжо ў пачатку XVII ст. яны былі сярод галоўных абаронцаў праваслаўя ад уніятаў. Верагодна, ад татарскага імя Курман[392] вядзе сваё паходжанне сучасная в. Курманава – стары двор Курманаў, вядомы з сярэдзіны XVI ст. Усё гэта сведчыць пра даволі даўняе пражыванне татараў на землях Мсціслаўскага княства і ваяводства і, магчыма, іх асяданне тут адносіцца да пачатку XV ст. Вёска Дзеткавічы атрымала сваю назву ад татарскага роду Дзеткавічаў, в. Гарадзецкай на мяжы XV–XVI стст. валодаў татарскі род Мангут, які паклаў род Гарадзецкі. Вёску Гутаровічы заклаў татарскі род Гутар. Татарскімі былі роды Салтановічаў герба Ястржэбец, Сутоцкіх герба Даленга[393]. Хутчэй за ўсё, татары пачалі асядаць тут на мяжы XIV–XV стст., калі ў часы Вітаўта значная частка залатаардынскіх татараў перайшлі на службу ў ВКЛ і аселі на гэтых землях.

Агульная колькасць татараў на тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства была нязначнай: у другой палове XVII ст. іх налічвалася каля 20 сем'яў і яны адносна кампактна пражывалі ў вёсках Камаровічы (9 гаспадароў), Сутокі (3), Дзедкавічы (5). Асобныя татары пражывалі і мелі маёмасць у вёсках Русінава і Дзедкавічы[394]. Пражываючы ў атачэнні хрысціянскай большасці асноўная маса татараў паступова прымала хрысцыянства. Тыя, хто працягваў выспавядаць іслам, верагодна, спраўлялі сваі рэлігійныя абрады ў хатніх мячэцях, бо зве-

[389] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 92. – Арк. 132 адв. – 133 адв.

[390] Бычкова М. Е. Родословие Глинских из Румянцевского собрания. – С. 104–125.

[391] НГАБ. – Ф. КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 21. – Арк. 243, 250; Тамсама. – Адз. зах. 248. – Арк. 45.

[392] Тамсама. – Адз. зах. 238. – Арк. 110–111.

[393] Dziadulewicz S. Herbarz rodzin tatarskich w Polsce. – Wilno, 1929 – S. 102, 402, 403, 437, 439–440.

[394] LVIA. – F. 11. – Ap. 1. – Dyla 748. – P. 1381; Metryka Litewska. Rejestry podymnego Wielkiego Księstwa Litewskiego. Województwo Mścislawskie 1667 r. – S. 25–26.

сткі пра існаванне спецыяльных пабудоў для мячэцей на тэрыторыі Мсціслаўскага княства і ваяводства адсутнічаюць.

Такім чынам, назіранні за развіццём хрысціянства на тэрыторыі Мсціслаўскага княства і ваяводства паказваюць, што першапачаткова, з XI ст. на Пасожжы распаўсюджвалася праваслаўе.

Пачынаючы з канца XVI – пачатку XVII ст. адбываецца актыўнае пранікненне каталіцызму і насаджэнне ўніяцтва. Калі каталіцызм распаўсюджваўся ў першую чаргу сярод вышэйшых слаёў грамадства і фактычна стаў рэлігіяй пануючых класаў, то унія прымусова насаджалася сярод простага люду.

У яе распаўсюджванні выразна прасочваюцца два этапы. Першы этап – ад прыняцця Брэсцкай уніі і да смерці караля Жыгімонта Вазы. Потым наступіла паласа «адлігі», якую працягнулі падзеі вайны 1654–1667 гг., падчас якой унія на ўсходніх землях ВКЛ была ліквідавана.

Другі этап пачаўся з XVIII ст. і працягваўся да ўваходу ўсходніх зямель Рэчы Паспалітай у склад Расійскай імперыі. Нягледзячы на тое, што і на гэты раз уніяцтва распаўсюджвалася прымусова, шляхам пераводу цэркваў пад юрысдыкцыю уніяцкіх епіскапаў, за жыццё аднаго-двух пакаленняў (50–60 гадоў) уніяцтва змагло замацавацца сярод сельскага насельніцтва і фактычна стала народнай рэлігіяй. Перавод назад з уніяцтва ў праваслаўе таксама адбываўся прымусова і канчаткова быў завершаны толькі пасля афіцыйнага скасавання ў 1839 г. уніяцкай царквы ў Расійскай імперыі.

На працягу XVII–XVIII стст. каталіцызм і ўніяцтва ўвесь час знаходзілі падтрымку сярод улады, у той час як праваслаўе заставалася рэлігіяй простага люду і не знаходзіла актыўнай падтрымкі сярод свецкай ўлады, а сярод кліра іншых хрысціянскіх канфесій праваслаўнае духавенства ўвесь час сустракала варожыя адносіны. Праваслаўнымі заставаліся большасць жыхароў Мсціслава і Крычава.

ЗАКЛЮЧЭННЕ

Шаноўныя чытачы! Перад вамі прайшла гісторыя Мсціслаўскага княства і ваяводства на працягу больш як 500 гадоў існавання гэтых адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак. Мы разглядзелі пытанні гісторыі іх утварэння, тэрытарыяльнага развіцця, адміністрацыйна-гаспадарчага падзелу, прасачылі дынаміку асваення тэрыторыі, урбанізацыйныя працэсы, канфесіянальнае жыццё на гэтых землях, вывучылі гандлёвыя шляхі, што праходзілі праз гэты рэгіён на розных этапах. Многія пытанні, што ставіліся перад пачаткам працы над гэтым даследаваннем, не ўдалося асвятліць з-за недахопу крыніц, аднак у цэлым мы змаглі прасачыць агульны кірунак развіцця і месца Мсціслаўскага княства і ваяводства ў складзе Смаленскага княства, Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай.

Мсціслаўскае княства як сталая адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка Смаленскай зямлі ўтварылася прыкладна ў адзін час, калі на тэрыторыі вялікага Смаленскага княства пачалася феадальная раздробленасць і сфарміраваліся ўдзельныя Мажайскае і Вяземскае княствы.

Яно было сфарміравана на падставе паўднёвых зямель крывічоў, што жылі ў міжрэччы Дняпра і Дзясны, і паўночных зямель радзімічаў, якія былі далучаны да Смаленскага княства ў выніку паходаў 1128 і 1142 гг. На захадзе землі Мсціслаўскага княства дасягалі плыні р. Проня, на ўсходзе – басейна Стомячы і Іпуці. Паўночная мяжа праходзіла па рэках Рамяство, Гародня, Лютая, а на поўдні заходзіла за р. Іпуць і фактычна выходзіла на старую мяжу паміж радзімічамі і севяранамі.

Мсціслаўскае ўдзельнае княства пачынаючы з сярэдзіны XII ст. і да сярэдзіны XIV ст. знаходзілася ў сталым дынастычным уладанні вялікіх смаленскіх князёў, пераходзячы ў якасці ўдзелу да чарговага князя, які займаў старшы стол у Смаленску.

У пісьмовых крыніцах палітычная гісторыя Мсціслаўскага ўдзельнага княства сярэдзіны XII–XIV ст. амаль не прасочваецца, што выклікана адсутнасцю смаленскіх летапісаў, а ў кола зроку летапісацаў агульнарускіх летапісных зводаў гэты рэгіён трапляў рэдка. Тым не менш, археалагічны матэрыял сведчыць пра даволі актыўны урбаністычны працэс на гэтых землях менавіта ў той час. Будуецца Мсціслаў, новая крэпасць у Крычаве, фарміруюцца гарадскія цэнтры ў Мгліне, Прапойску, Ст. Дрокаве, Радамлі.

Пісьмовыя крыніцы не данеслі звестак пра падзеі, звязаныя з мангольскімі нападамі на гэты рэгіён, як і на Смаленскае княства ў цэлым. Аднак ускосныя даныя сведчаць пра магчымасць паходаў невялікіх мангольскіх атрадаў па Пасожжы ў другой палове XIII ст.

З уваходам гэтых зямель у склад Вялікага Княства Літоўскага ў сярэдзіне XIV ст. пачынаецца новы этап у гісторыі Мсціслаўскага княства, які працягваўся да пачатку XVI ст., калі княства было ліквідавана. На першапачатковым этапе гэтага перыяду ў Мсціслаўскім княстве замацавалася дынастыя князёў Лынгвеневічаў, якія кіравалі княствам да канца XV ст. У гэты час адбыўся невялікі тэрытарыяльны рост княства за кошт далучэння да яго смаленскай воласці Малохва. У канцы XV ст. пасля смерці Івана Юр'евіча (1483 г.) Мсціслаўскае княства было ліквідавана, а яго былыя адміністрацыйна-гаспадарчыя адзінкі былі далучаны да Віленскага ваяводства ў якасці самастойных валасцей, а само княства было ліквідавана.

Нанова Мсціслаўскае княства было арганізавана толькі ў самым канцы XV ст. і заснавальнікам новай дынастыі мсціслаўскіх князёў стаў князь Міхаіл Жаслаўскі. Адроджанае княства было значна меншым па плошчы і складалася толькі з дзвюх былых валасцей – Мсціслава і Мгліна.

Аднак у выніку вайны 1500–1503 гг. паміж Вільняй і Масквой тэрыторыя Мсціслаўскага княства скарацілася да воласці аднаго Мсціслава, і ў такім выглядзе княства існавала да 1527 г., калі князь Міхаіл Іванавіч, застаўшыся без нашчадкаў па мужчынскай лініі, усынавіў каралевіча Жыгімонта Аўгуста і перадаў яму княства. Такім чынам Мсціслаўскае княства перайшло ў склад дзяржаўных уладанняў і канчаткова спыніла сваё існаванне.

Новаўтворанае ў выніку адміністрацыйна-тэрытарыяльнай рэформы ВКЛ 1664–1665 гг. Мсціслаўскае ваяводства было самым малым ваяводствам ВКЛ, а потым і Рэчы Паспалітай. Яно ўтварылася з тэрыторый былых валасцей Мсціслава, Крычава, Хіславічаў, Радамлі, Лучыц і заставалася у гэтых межах да першага падзелу Рэчы Паспалітай 1772 г.

Гісторыя Мсціслаўскага княства, воласці Мсціслава і Мсціслаўскага ваяводства XVI – пачатку XVIII ст. неад'емна звязана з амаль бесперапыннымі войнамі з Рускай дзяржавай. У сярэдзіне XVII ст. Мсціслаў фактычна быў цалкам знішчаны і яму давялося нанова адраджацца.

Безумоўна, гэта не спрыяла эканамічнаму развіццю рэгіёна. Акрамя таго, і далёкая адлегласць тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства ад асноўных гадлёвых шляхоў, арыентаваных на пастаўку прадукцыі ў Еўропу, прыводзіла да некаторага адставання эканамічнага развіцця рэгіёна ў параўнанні з заходнімі і цэнтральнымі раёнамі краіны.

Тым не менш, у гэты час працягвалася далейшае асваенне тэрыторыі – узнікалі новыя сельскія паселішчы, працягвалася далейшае развіццё старых гарадскіх цэнтраў і з канца XVI ст. пачалося фарміраванне новага пераходнага ад вёскі да горада тыпу населенага пункта – мястэчак.

Адносна спакойны этап у развіцці Мсціслаўскага ваяводства пачаўся з апошняй трэці XVII ст., пасля заключэння Вечнага міру з Расіяй, які на кароткі тэрмін быў перарваны падзеямі 1708–1709 гг., звязанымі з удзелам Рэчы Паспалітай ў Паўночнай вайне. З гэтага часу мяжа паміж Рэччу Паспалітай і Рускім царствам, а потым і Расійскай імперыяй стала адносна спакойнай, што пачало садзейнічаць развіццю памежных валасцей з абодвух бакоў.

Менавіта з канца XVII ст. пачаўся бурны этап фарміравання мястэчак на падставе больш ранніх паселішчаў, будаўніцтва новых адміністрацыйна-гаспадарчых цэнтраў, а з пачатку XVIII ст. – актыўнае асваенне памежных тэрыторый. У гэтым плане асаблівасцю рэгіёна было тое, што значная частка новых паселішчаў была заснавана беглымі сялянамі з Расіі, што, у сваю чаргу, выклікала незадавальненне памежнай дзяржавы.

Знаходзячыся ў складзе шматканфесійнай дзяржавы, але на кананічна праваслаўнай тэрыторыі, землі Мсціслаўскага княства і ваяводства на працягу ўсёй гісторыі свойго існавання былі аплотам праваслаўя. Нават пасля распаўсюджвання ўніяцтва яго пашырэнне адбывалася сярод сельскага насельніцтва прымусова, а гарады заставаліся вернымі праваслаўю. Аднак на працягу жыцця двух-трох пакаленняў уніяцтва стала той галіной хрысціянства, што распаўсюджвалася пасярод простага люду і стала своеасабліай народнай рэлігіяй, якая працягвала існаваць да свайго афіцыйнага скасавання ў 1839 г. Каталіцызм, які пачаў тут распаўсюджвацца з сярэдзіны XVII ст., знайшоў прыхільнікаў толькі сярод шляхты і часткі гараджан. У плане канфесійнай гісторыі землі Мсціслаўскага ваяводства нічым не адрозніваліся ад іншых зямель Рэчы Паспалітай. Як і паўсюль, праваслаўе было дамінуючай плынню хрысціянства, у гэтым плане Мсціслаўскае ваяводства развівалася ў адным русле з іншымі землямі дзяржавы.

Гандлёвыя шляхі Мсціслаўскага княства ў XII – сярэдзіне XIV ст. абапіраліся на развітую сетку рэк і былі скіраванымі ў мерыдыянальнім кірунку – з поўначы на поўдзень. Гэты напрамак і водная сістэма існавалі на працягу ўсёй гісторыі існавання Мсціслаўскага княства і вояводства. Аднак пачынаючы з XV ст. адзначаецца развіццё і шыротнага кірунку гандлёвых сувязей, які з-за напрамку рэк, што цяклі ў рэгіёне, абапіраўся на сухапутныя шляхі. Супастаўленне кірунку сучасных транспартных камунікацый з гандлёвымі шляхамі XV–XVI стст. паказвае, што яны фактычна супадаюць. Апошняе сведчыць пра даволі ранняе фарміраванне кірунку сучасных гандлёвых шляхоў.

Гэта даследаванне не завяршае, а толькі падводзіць пэўныя вынікі ў вывучэнні гісторыі Мсціслава і яго рэгіёна. Далейшая праца археолагаў і гісторыкаў дазволіць больш поўна асвятліць гісторыю Мсціслаўскага княства і ваяводства.

БІБЛІЯГРАФІЯ

Рукапісныя крыніцы

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі

1. Адаму Глебу Кошанскому село Кашаны после урожоного Себестияна и Криштофа Мирских // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 130. – Арк. 362 адв.–364.

2. Актавая кніга Мсціслаўскага гродскага суда за 1687 г. // Ф. 1729. – Воп. 1. – Адз. зах. 1. – 488 арк.

3. Актавая кніга Мсціслаўскага гродскага суда за 1690 г. // Ф. 1729. – Воп. 1. – Адз. зах. 2. – 483 арк.

4. Актавая кніга Мсціслаўскага гродскага суда за 1726 г. // Ф. 1729. – Воп. 1. – Адз. зах. 28. – 984 арк.

5. Богдану Погоръскому на 2 служъбы правом ленным // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 88. – Арк. 116 адв.–117.

6. Боярину кричовскому Якубу Рибенискому на некоторые земли пустовские при границы московской до воли и ласки господаръское // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 56. – Арк. 76–77.

7. Боярыну мстиславскому Андрею Рогойловскому на службу земли в селе Горянове // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 76. – Арк. 153 адв.

8. Бояром мстиславским потвержене на дом в месте // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 76. – Арк. 493 адв.

9. В справе боярина мстиславского Редка Щолкановича с хоружим мстиславским Мурзою Москевичом оба его и жоны его и о примовку на шляхетство // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 21. – Арк. 243–244.

10. Вольность мещанам мстиславским от давания поборов по всемъ ВКЛ с товаровъ их на 3 года // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 267. – Арк. 192.

11. Вызволене мещан могилевских от роботы замков пограничных посполу з людми волостными окромя замку Могилевъского // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 20. – Арк. 100–101.

12. Вызволане на Ждана Парцевского и жону его за переводом права Василя Акаленицкого Путять // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 283. – Арк. 248–248 адв.

13. Вызнанье листовъ отчызныхъ з одное стороны Федоровое Лопатинъское и сыну ее а зъ другое стороны Федоровое мстиславцовое и сыновъ ее о именье Лопатинъское // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 247. – Арк. 163–166 адв.

14. Вырокъ Анъдрею Алабышу зъ Анъдреемъ Маскевичомъ Мурзой о некоторые розные крывды именья Лупешычъ по увезаню через заруку поделанные // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 234. – Арк. 57 адв.–61.

15. Вырокъ Василью Мызкъгайлу // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 234. – Арк. 177 адв.–179 адв.

16. Вырокъ бояром крычовъским Мартину Кучуку и вчатником его с паном Бобоедом Васильевичомъ о некоторые земли пустовские // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 234. – Арк. 198–200 адв.

17. Вырокъ боярина мстиславъского Радка Шолкановича с хорунжим мстиславъскимъ Мурзою Маскевичомъ обо его и жоны его и примавку на шляхетство // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 21. – Арк. 243.

18. Вырокъ Войны Федковича с татарыномъ Курманомъ Васковичомъ о побите свиней его // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 238. – Арк. 110–111.

19. Вырокъ его милости пана Яна Радивила з Богданом Селянкою о дворец Корманово // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 234. – Арк. 179 адв.–180 адв.

20. Выркъ земяномъ мстиславъскимъ Федку а Митку Порденичомъ зъ Алексеемъ Редчечынъ о имене их материстое на имя Грыщывщыну // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 233. Арк. 1–3.

21. Выркъ Ивану Борысовичу Микуличу з Михайловою Микуличовою о именье дядка его а мужа ее Осмоловичи // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 247. – Арк. 639–640 адв.

22. Выркъ Опанасу Хведоровичу з Борысомъ а Богушомъ Королъковичомъ о именье на имя Бобровое // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 247. – Арк. 849 адв.–850 адв.

23. Выркъ священънику мстиславъскому Ивану с Ходкомъ Ожыжъкою о помовене на нем якобы // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 244. – Арк. 187–188 адв.

24. Выркъ Яцку Мацъковичу зъ Анъдреем Грыгоревичом о отнятье некоторых землъ // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 247. – Арк. 850 адв.–851.

25. Григорыю Зубару на огород и селище Фурсовъское в старостве Мстиславском, в селе Красном до животье // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 83. – Арк. 206–206 адв.

26. Григорю Кулазе и потомкомъ его потвержене купли на пляцъ в месте Мстиславском лежачы // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 76. – Арк. 46–47

27. Данина Володымеру Каменьскому на сельцо при границы московъское в которомъ пустошей шесть // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 73. – Арк. 37 адв.

28. Данина Ивану Захаричу на сельцо Павловичи при границы московской ленъным правомъ даное // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 70. – Арк. 160–161.

29. Данина Ивану Каши на 3 службы людней в волости Кричевской и на домъ в месте Кричовском ленънымъ правомъ даное // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 70. – Арк. 161–161 адв.

30. Данина Михаилу Ивановичу Каши на 3 службы в волости Кричевской и Олучицкой // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 77. – Арк. 229 адв.–230.

31. Данина пану Юрю Псарскому на некоторые служъбы под Мстиславлемъ правом дожывотным // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 67. – Арк. 43–43 адв.

32. Данина урожоному Миколаю Хрщоному двора по Немире в старостве Мстиславском, в селе Красном // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 86. – Арк. 46 адв.–47.

33. Данина Якову Гарабурде на 6 землиц при границе московской у волости Кричевской лежащих, правом доживотным // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 77. – Арк. 230–231.

34. Декрет Елозовичов з Кузмою Романовичом // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 246. – Арк. 462–463 адв.

35. Декрет земяномъ мстиславскимъ Андрею Садовскому а Ждану Гутору, Семёну Подлезе, Богдану Казленичу и иншымъ зъ Яномъ Миколаевичомъ Каспоровичомъ о розные шкоды и крывъды от него сталые // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 264. – Арк. 99–103 адв.

36. Дела относящиеся к имуществу Малятичского доминиканского кляштора // Ф. 1781. – Воп. 2. – Адз. зах. 249. – Арк. 1–82.

37. Дела связанные с постройкой костёла в Рясне // Ф. 1781. – Воп. 2. – Адз. зах. 182. – Арк. 1–10.

38. Дело о разных суммах принадлежащих Мазыкинскому кармелитскому монастырю. Дела за 1816–1832 гг. // Ф. 1781. – Воп. 2. – Адз. зах. 156. – Арк. 1–96.

39. Дело об упразднении Кричевского доминиканского монастыря // Ф. 2001. – Воп. 1. – Адз. зах. 135. – Арк. 1–71 адв.

40. Длугоканьскому на 4 службы и на 11 моркговъ у воеводстве Мстиславскомъ // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 76. – Арк. 151–151 адв.

41. Его милости пану Соколу Войне, старосте ожскому, на кашталянею мстиславскую // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 88. – Арк. 68 адв.

42. Записанье пильности старосты мстиславского князя Ивана Полубенского о нестанье хоружого мстиславского Андрея Мурзы на року ку праву за позвы осаженье его Мурзы до везенья о отнятье хоружства и о иншые кривды его от его старосты сталые // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 248. – Арк. 45.

43. Земенину мстиславъскому Юрю Михайловичу потвержене на 4 пустовщины // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 51. – Арк. 212 адв.

44. Земяном мстиславским Адамовичом на селищо Дроздовское // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 76. – Арк. 577–578 адв.

45. Земянце мстиславской Василевой Мызгкайловой на земли Дудчицы в повете Мстиславском // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 49. – Арк. 37 адв.–38.

46. Ивану Топичевскому на 3 службы в Мстиславле // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 86. – Арк. 31 адв.

47. Инвентарь Кричевского староства 1673 года // КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1923. – Арк. 3–45.

48. Инвентарь Кричевской волости 1676 года // КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1924. – Арк. 1–45.

49. Инвентарь Кричевского староства 1679 года // КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1925. – Арк. 1–45.

50. Инвентарь Кричева и Кричевского староства 1682 года // КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1926. – Арк. 5–55.

51. Инвентарь Кричевского староства 1693 года //КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1927. – Арк. 3–46.

52. Инвентарь Кричева и волости 1696 года // КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1928. – Арк. 2–114.

53. Инвентарь староства Кричевского 1709 года // КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1929. – Арк. 3–42.

54. Инвентарь Кричева и волости 1720 года // КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1931/2. – Арк. 3–71.

55. Инвентарь Кричевского староства 1727 года // КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1932. – Арк. 3–150.

56. Инвентарь Кричевского староства 1723 года // КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1933/2. – Арк. 1–63.

57. Инвентарь Кричевского староства 1746 года // КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1936. – Арк. 1–210.

58. Инвентарь Кричевского староства 1747 года // КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1936. – Арк. 1–202.

59. Инвентарь Кричевского староства 1757 года // КМФ-5. – Воп. 1. – Адз. зах. 1937. – Арк. 1–113.

60. Инвентарь Безводичского монастыря Чериковского повета Могилевского наместництва за 1786 г. // Ф. 3421. – Воп. 1. – Адз. Зах. 10. – Арк. 1–9.

61. Инвентарь Маривильского монастыря Климовичского повета Могилевского наместництва за 1786 г. // Ф. 3421. – Воп. 1. – Адз. Зах. 5. – Арк. 1–7.

62. Инвентарь Пустынского монастыря Мстиславского повета Могилевского наместництва за 1786 г. // Ф. 3421. – Воп. 1. – Адз. Зах. 12. – Арк. 1–12 адз.

63. Инвентарная опись имущества Кричевского костёла за 1899 год // Ф. 2387. – Воп. 1. – Адз. зах. 8. – Арк. 1–12.

64. Квіт Андрея Гарбачэўскага // Ф. 694. – Воп. 4. – Адз. зах. 1155. – Арк. 47.

65. Квіт Сымона Іпацьевіча Маскевіча // Ф. 1729. – Воп. 1. – Адз. Зах. 14. – Арк. 63.

66. Консенс мещаном мстиславским аб заставе 4 застенков грунту под Мстиславлем в пусте лежащих // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 153. – Арк. 593–594.

67. Консенс судьи мстиславскому на пущение села Милуты в повете Мстиславском лежачое // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 92. – Арк. 134 адв.–135.

68. Консенс судьи мстиславскому на пущение 3 сел в воеводстве Мстиславском лежачем. Сынови его // КМФ-18.–Воп 1. – Адз. Зах 92. – Арк. 136 адв.–137.

69. Канфирмацыйны прывилей караля Аўгуста-2-га на добра Бель, Белая Дуброва, Зеленкавічы Крычаўскага староства Каралю Станіславу Радзівілу правам дажывотным // Ф. 694. – Воп. 4. – Адз. зах. 1160. – Арк. 42.

70. Конфирмацыя мешчанину мстиславскому Матею Яновичу на куплю дому его и на вызволене его с того отъ работы замъку / КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 77. – Арк. 346–346 адв.

71. Конфирмация на село Волчасы службъ оселых у волости Кричовъской урожоному Мартыну Юрьевичу Кгимбурту правомъ доживотнымъ // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 77. – Арк. 412 адв.–413 адв.

72. Конфирмация прав на добра ленные Олферковичи, Попелевка, Тухле, Мстиславскому чашнику Антонию Трансецкому // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. Зах. 170. – Арк. 194.

73. Конъфирмацыя на церъков въ Крычеве // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 88. – Арк. 97 адв.

74. Копия зъ листу данины на замок Мстиславский // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 226. – Арк. 7 адв.–8.

75. Ліст аб прадажы Ярмолы Хадыні рымару крычаўскаму пляца зямлі на Забялышчыне свайму брату рымару Грышке Хадыне // Ф. 694. – Воп. 4. – Адз. зах. 1155. – Арк. 86.

76. Лист аренъдованья корчомъ Мстиславских жиду Ену Шломичу // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 37. – Арк. 436 адв.–437 адв.

77. Лист Гарясиму Куровичу на пляц в месте мстиславком и на службу одну // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 73. – Арк. 692 адв–693.

78. Листъ данина маршалку господарскому, державцы жолудскому, князю Василию Андреевичу Полубенскому на три селе, за поступленьем ему князю Михаилу Ивановичу Мъстиславскому, в Тетеринскомъ повете, до воли господаръское // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 12. – Арк. 248.

79. Листъ до дворанина Михайла Тишкевича щ увезанье Миколая Служки в замокъ Кричовъский // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 58. – Арк. 30 адв.–31.

80. Лист до державцы кричовского Андрея Шолухи абы землю пустовскую боярину кричевскому Прокопу Ярцову далъ // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 37. – Арк. 524–524 адв.

81. Лист до державцы кричовского Андрея Богдановича Шолухи на 2 волоки земли на выхованье попу церкви святого Юрия в Кричове Савве Кондратовичу // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 37. – Арк. 524 адв.–525.

82. Лист до державцы кричовского подданых. Мещаномъ кричовскимъ на отпущение чыншу кождый годъ // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 267. – Арк. 220–220 адв.

83. Лист до державъцы крычовъского Василя Чижа // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 15. – Арк. 126 адв.–127.

84. Лист до державъцы мстиславского о посланье 70 чоловековъ з Могилева для роботы замку Мстиславского // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 19. – Арк. 57 адв.–58 адв.

85. Лист до намесника кричевского князя Василия Семеновича Жылинского абы боярину кричовскому Василию Киприяновичу на 3 селищи и сеножати в Кричевском повете увезанье дал // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 12. – Арк. 229 адв.–230.

86. Лист до намесника кричовского князя Василия Семеновича Жылинского абы боярину кричовскому Василию Киприяновичу з братаничом его на половицу дворища и на 2 селищи пустые в Кричеве до воли господаръское увезанье далъ // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 12. – Арк. 230–230 адв.

87. Лист до писаровъ скарбных и до скарбного земского пушкаромъ Мстиславъским // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 37. – Арк. 414–414 адв.

88. Листъ до старосты Мстиславского абы не заборонял увезати земянина Мстиславского Савинского Юрьевича в 3 службы людей // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 37. – Арк. 487 адв.–488.

89. Листъ до старосты Мстиславского князя Соломерецкого // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 37. – Арк. 360–360 адв.

90. Лист до Яна Чижа и Тимофея Селицкого засылаючы их ревизорами и комиссарами до староства Мстиславского и Радомского // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 83. – Арк. 185 адв.–187.

91. Лист земянину мстиславскому Федору Тимофеевичу на 3 службы // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 70. – Арк. 80 адв.–81 адв.

92. Листъ мещанам кричевъским на торгованье без мыта в Великом Княстве Литовскомъ // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 49. – Арк. 31 адв.–32.

93. Ліст Кароля Радзівіла крычаўскаму дзяржаўцы Гдалю Іцкавічу // Ф. 694. – Воп. 2. – Адз. зах. 3982. – Арк. 6.

94. Ліст Кароля Станіслава Радзівіла дазваляючы аа. Дамініканам малятыцкім будаваць у Крычаве касцёл і кляштар // Ф. 694. – Воп. 4. – Адз. зах. 1157. – Арк. 4.

95. Ліст караля Аўгуста-III да Караля Радзівіла // Ф. 694. – Воп. 2. – Адз. зах. 3982. – Арк. 8–10 адв.

96. Лист Михайлу Костенътиновичу Визгуре на землю пустовскую Хотовижъ в повете Кричовскомъ до воли господара // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 31. – Арк. 117.

97. Лист на подсудство мстиславское Юрью Мокгиникскому до живота его // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 59. – Арк. 146.

98. Лист Павлу Копцю позволяючый ему на кгрунтах, лесах и проробках села Березенянского в воеводстве Мстиславском организовывать слободы и ползоваться ими правомъ дожывотънымъ // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 83. – Арк. 333 адв.

99. Лист писаный до всих вобец, ознаймуючы всимъ мытникомъ о потверженью прывилея короля его милости Жыкгимонта Августа мешчаномъ места Кричевское на безмытное торговане данного и росказуючы абы се купли водлуг того привилею во всемъ заховали // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 74. – Арк. 273–274 адв.

100. Лист писаный до державцы Кричевского пана Шолухи, абы именецо Полоницу Петру Робицкому подал // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 37. – Арк. 359 адв.

101. Лист писаный до пана Миколая Нарбута, наместника земли Жомоитское и до тивуна тамошнего, жебы монету гроши плоские литовское везде брать казали // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 19. – Арк. 54–55.

102. Листъ писаный до подскарбего земъского пана Миколая Нарушевича абыхмо ротмистромъ пенези жолънеръские наново были даваны // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 532. – Арк. 93 адв.–95.

103. Лист подданных господарских мешан и волощан пропойских // Ф. 694. – Воп. 1. – Адз. зах. 1556. – Арк. 35–37 адв.

104. Лист Селивону Скибичу на служобъ две и пустовщчын тры у волости Олучицкой и на пляц в месте Крычовскомъ правомъ дожывотнымъ // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 74. – Арк. 419–420.

105. Ліст Стефана Баторыя да крычаўскага старасты Багдана Саламарецкага // Ф. 694. – Воп. 4. – Адз. зах. 1155. – Арк. 32–33.

106. Ліст Фредерыка Лукомскага рымару Грышку Хадылінічу на пляц у Крычаве на Забялышчыне Саламарецкага // Ф. 694. – Воп. 4. – Адз. зах. 1155. – Арк. 84–85.

107. Лист Юрю Михайловичу на 4 земли пустовских у волости Мстиславской, то есть дедовщину Миковскую, Ужювлин и Кукиловъскую и на дворище в месте Мстиславскомъ противъ замъку и вежы Спасской до воли и ласки // КМФ–18. – Воп. 1. – Адз. зах. 50. – Арк. 244–244 адв.

108. Лист Яну Павловичу Токолевскому на 6 волок у волости Радомской в Ельной и въ Заполье данное // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 66. – Арк. 27 адв. – 28 адв.

109. Листы бояромъ кричовъскимъ отъ короля его милости суть даные у водъно слово на земъли пустовъские, которые земъли меновите нижей суть объражоны, в которыхъ жо листехъ жадъное вечъности имъ не описаны // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 30. – Арк. 154 адв.–155.

110. Лист короля Августа – 3-го кричевскому арендатору Гдалю Мовшевичу // Ф. 694. – Воп. 2. – Адз. зах. 3982. – Арк. 15–16.

111. Мещанину мстиславъскому Игнату Мелеховичу и сыномъ его на 2 пляцы и на 2 влоце лесу и сеножать з огородомъ на службе путной // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 76. – Арк. 397–398.

112. Мещаномъ кричовъскимъ листъ безмытный до воли господаръское // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 58. – Арк. 254–255 адв.

113. Миколаю Служке на державу Кричевскую // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 58. – Арк. 145–145 адв.

114. На городництво мстиславское Келпшу // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 86. – Арк. 947.

115. На памет списане волостей которые мают замокъ Мстиславский робити и живности якъ много и с которых дворов до того замку послати // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 19. – Арк. 60–60 адв.

116. На подсудство мстиславское // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 59. – Арк. 146.

117. На церковъ в Колодезях попу Николскому в старостве Крычевском лежачую // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 84. – Арк. 9 адв.–10.

118. О будоване замку Мстиславского // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 21. – Арк. 93 адв.

119. О вызволенье Кричева и волости на год от податков // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 14. – Арк. 251 адв.–252.

120. О томъ же листъ до кашталяна мстиславского // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 73. – Арк. 100 адв.–101.

121. Описание разграничение королевских владений с границами села Ельна // Ф. 694. – Воп. 4. – Адз. зах. 1155. – Арк. 74–75.

122. Опись имущества Охорьского монастыря за 1821 год // Ф. 2310. – Воп. 1. – Адз. зах. 62. – Арк. 1–10.

123. Опись экономического состояния Пустынского монастыря за 1841 год // Ф. 2311. – Воп. 1. – Адз. зах. 6. – Арк. 1–78.

124. Опись Пустынского монастыря за 1841 год // Ф. 2311. – Воп. 1. – Адз. зах. 7. – Арк. 1–78.

125. Отпущение мещаном мстиславским всех плат до скарбу господарского належачых до 3-х лет для зубоженя от Москвы // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 19. – Арк. 116–116 адв.

126. Павлу Овсеевичу на селцо Осмоловичи при замку Крычовскомъ // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 84. – Арк. 186 адв.–187.

127. Пану Олеше на стольчковство мстиславское // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 86. – Арк. 442 адв.

128. Пану Воловичу суди земскому мстиславскому позволене шинку вшэляких трунков в дому его в месте Мстиславском // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 86. – Арк. 863 адв.

129. Пану Карачону, подстолему мстиславскому на тры службы и пляц въ Мстиславлю // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 76 – Арк. 238–238 адв.

130. Пану Карачону, подстолему мстиславскому, потверженье // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 76 – Арк. 546–546 адв.

131. Пану Семену Андреевичу Золочевскому на судейство мстиславское // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 72. – Арк. 6–6 адв.

132. Перечень расходов смольской комиссии // Ф. 2544. – Воп. 1. – Адз. зах. 1. – Арк. 1–80.

133. Петру Каминскому на выроб товаров лесных в воеводстве Мстиславском // КМФ-18. – Воп. – Адз. Зах. 121. – Арк. 248–248 адв.

134. Писаные листы до пана подскарьбего земъского пана Миколая Нарушевича ротмистромъ его королевъское милости драбъскимъ абы им заслужоное их платити и наново давалъ // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 529. – Арк. 211 адв.–213.

135. Писару кгродскому мстиславскому пану Григорю Лазару на кадукъ во Мстиславлю // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 76. – Арк. 474.

136. Письмо Давида Летошинского настоятелю Охорьского монастыря с братиею о фундушных правах монастыря // Ф. 2310. – Воп. 1. – Адз. зах. 5. – Арк. 1.

137. Попови мстиславскому привилю на земълю пустую въ Костровичахъ за ценею Или Костровского // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 89. – Арк. 273.

138. Потверженье бояром Крычевскимъ // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 88. – Арк. 241–241 адв.

139. Потверженье бояром мстиславским Власу Буйку, Семену Ваврынцом купли их села Михалевъского у Богдана Корсаковича на вечъность // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 30. – Арк. 185.

140. Потверженье бояромъ мстиславским Кариводомъ на землю пустовскую Митюковъшину Садовъскую водлугъ листу короля его милости Стефана // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. Зах. 77. – Арк. 193–194.

141. Потверженье Владиславу Пимловъскому на две селца воеводства Мстиславском правом доживотнымъ // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. Зах. 77. – Арк. 427 адв.–428.

142. Потверженье войту мстиславъскому Василю Романовичу на певные кгрунъты // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 77. – Арк. 582–582 адв.

143. Потверженье Григорю Ленковъскому и жоне его на селцо Колесницкое во Мъстиславлю правом доживотнымъ // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. Зах. 77. – Арк. 615–616.

144. Потверженье десятнику роты драбской на замку мстиславском Станиславу Ясенскому на некоторые земли у волости замку Мстиславского до воли господарской // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. Зах. 39. – Арк. 326 адв.–328.

145. Потверждение земяном мстиславским Парцевским некоторых кгрунтов и сел от ревизоров в отмене даных // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 85. – Арк. 314 адв.–315 адв.

146. Потверженье Ивану Мелешку кашталяну мстиславскому, купли его дому с пляцомъ в Слониме // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 89. – Арк. 57 адв.

147. Потверженье Ивану и Андрею Тимофеевичам Стражевичам некоторых кгрунтов в селе Расном водлуг листу князя Мстиславского // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 83. – Арк. 22–22 адв.

148. Потверженье Ивану Соломерецкому на село Бабинавичи у волости замку крычовъского до воли и и ласки господарское // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 266. – Арк. 342 адв.–343.

149. Повтержене купли Анъдросу Борысовичу двухъ служоб во Мьстиславлю // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 76. – Арк. 293 адв.–296.

150. Потверженье Матысу Суходолскому и малжонце его на 12 службъ у воеводстве Мстиславъскомъ // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 73. – Арк. 660 адв.

151. Потвержене месту Мстиславъскому на выгонъ // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 76. – Арк. 176–176 адв.

152. Потверженье Миколаю Ивиницкому на дворец у Волчосе в державе Крычовской правомъ ленънымъ а до воли и ласки господарское // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 266. – Арк. 343–343 адв.

153. Потверженье на две церкви Кричевские Св. Юрия и Св. Ильи // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 72. – Арк. 24.

154. Потвержене Лянъпыцкому на дом в месте Мстиславском // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 76. – Арк. 587.

155. Потверженье паном Каменским на пляц з домом в месте Мстиславском // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 85. – Арк. 176–176 адв.

156. Потвержене пану Эрониму Воловичу и малжонке его на добра у воеводстве Мстиславскомъ // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 88. – Арк. 64–64 адв.

157. Потвержене попу Воскресенскому зо Мстиславля Петру Костентиновичу и напотом будучим наступником его певных земль кгрунтов и пляцов в той церкви здавна наданыхъ // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 83. – Арк. 1 адв.–2.

158. Потверженье попу зъ воеводства Мстиславъского з села Красного некоторых земель на тую церковь в селе Красном здавна наданыхъ // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. – 85. – Арк. 274–274 адв.

159. Потверженье попу Мстиславскому церкви Св. Георгия на пляц с садом в месте Мстиславском, за острогом, на Троицкой улице // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 76. – Арк. 765.

160. Потверженье права ленного Миколаю Малицкому // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 88. – Арк. 23.

161. Потверженье урожоному Андрею Длукгонентскому и жоне его на дворецъ и певные службы в воеводстве Мстиславъскомъ // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 76. – Арк. 64–65.

162. Потверженье Якубу Рибенскому на некоторые земли у волости Кричевской до воли и ласки // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 58. – Арк. 96 адв.–97 адв.

163. Преложенье справы Богдану Бабце зъ Анъдреемъ Мурзою о именье Русиновичи а Куможычы // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 247. – Арк. 638 адв.

164. Преслуханье жалоб и отпоровъ в справе земянъ всее шляхъты замку Мстиславского и Радомльсого зъ старостом мстиславским княземъ Иваномъ Полубиньским в некоторых великих присудехъ // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 250. – Арк. 96 адв.–114.

165. Привилей Александру Котлу и малжонце его на 10 службъ в воеводстве мстиславском // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 89. – Арк. 53.

166. Привилей Анъдрею Тарану на городництво мстиславское // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 67. – Арк. 83 адв.–84.

167. Привилей Анъдрею Тарану на службу одну земли у воеводстве Мстиславъском // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 77. – Арк. 3.

168. Привилей Анъдрею Тарану на хоружство мстиславское // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 89. – Арк. 18.

169. Привилей Андрею Золочевскому на войское мстиславское // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 89. – Арк. 18 адв.

170. Привилей боярину кричевскому Артему Василевичу на 3 пустовъщины подле границы московской лежачие до воли и ласки господаръской даные // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 37. – Арк. 228–228 адв.

171. Привилей боярину кричовскому Миколаю Ивиницкому на дворецъ Ботьвиневский у Волчосе и на землю бортную Холмъ за рекою Сожом в повете Кричовъскомъ до воли и ласки господарское // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 41. – Арк. 333–333 адв.

172. Привилей боярину мстиславскому Михайле Винчуре на землю пустовскую въ волости кричовъское ленънымъ правомъ // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 37. – Арк. 512 адв.–513.

173. Привилей войту мстиславъскому потверженя сеножати урочыщомъ Встаях над рекою Сожом // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 77. – Арк. 488 адв.–489.

174. Прывилей Володымеру Каменьскому на войское мстиславъское // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 77. – Арк. 32 адв.

175. Привилей Героними Воловичу на судейство земское мстиславское // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 89. – Арк. 82 адв.

176. Привилей Ждану Семеновичу Голинскому на 8 служобъ земли под Мстиславомъ правом доживотным // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 67. – Арк. 84–85.

177. Привилей Ивану Ивановичу попу Мстиславскому на село Костровичи // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 91. – Арк. 291–291 адв.

178. Привилей короля Августа 2-го кричевским пушкарям // Ф. 694. – Воп. 4. – Адз. зах. 1155. – Арк. 38–39.

179. Привилей короля Владислава IV на церковь Св. Николы в замке Кричовском // Ф. 694. – Воп. 1. – Адз. зах. 169. – Арк. 4.

180. Прывілей караля Жыгімонта на 2 пусташы Абушкаўскіх у сяле Барысавічах і Сакольнічах у старостве Крычаўскім за р. Сажам Якаву Осыповічу наданых // Ф. 694. – Воп. 4. – Адз. зах. 1160. – Арк. 44.

181. Прывилей Ивану Войниловичу на полтрети службы в повете Мстиславъскомъ при замъку Радомском в селе Заливъю до живота его // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 63. – Арк. 200–200 адв.

182. Привилей короля Станислава 1-го Каролю Радзивилу, канцлеру ВКЛ на сёла Заселье, Бабиничи и Староселье Кричевского староства правом дожывотным // Ф. 694. – Воп. 1. – Адз. зах. 191. – Арк. 1.

183. Прывілей караля Стэфана Баторыя на землі ў Мсціслаўскім ваяводстве // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 61. – Арк. 113–113 адв.

184. Привилей короля Стефана Батория кричевскому пушкарю Семёну Ивановичу Герчику на земли за службу пушкарскую при замке кричевском // Ф. 694. – Воп. 4. – Адз. зах. 1155. – Арк. 45–46.

185. Привилей Уонстантину Шолухе на староство Кричовское // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 49. – Арк. 3–3 адв.

186. Привилей Криштофу Лукомскому на каштялянею мстиславскую // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 89. – Арк. 198.

187. Привилей купцови Сильвестру на 13 служб в воеводстве Мстиславском // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 96. – Арк. 133–133 адв.

188. Привилей Лукашу Стаховскому на судейство земъское мстиславское // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. Зах. 67. – Арк. 79–79 адв.

189. Привилей Миколаю Соколу Черпиловъскому на генеральство мстиславское // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. Зах. 89. – Арк. 82.

190. Прывилей Матею Райковскому на два пляцы в месте мстиславъскомъ с огородами ему самому правомъ дожывотнымъ // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. Зах. 77. – Арк. 337 адв.–338.

191. Привилей Матысу Кголемскому на службы в волости кричевской // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. Зах. 76. – Арк. 109–109 адв.

192. Привилей малжонке князя Фридриха Лукомского старостине кричевской на державу 5 сел от староства кричевского // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. Зах. 89. – Арк. 41–41 адв.

193. Привилей Меделянскому на 24 службы в старостве Мстиславъскомъ // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 92. – Арк. 132 адв.–133 адв.

194. Привилей мещаномъ Кричевскимъ на два склады урочистые // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 74. – Арк. 277 адв.

195. Привилей Миките Ануфриевичу Стратоповичу, священнику Кричевскому, на 2 церкви // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 100. – Арк. 8 адв.–9 адв.

196. Привилей Миколаю Малицкому на стольниковство мстиславское // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 85. – Арк. 185 адв.

197. Привилей Миколаю Суходольского на стольниковство Мстиславское // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 96. – Арк. 133 адв.–134.

198. Привилей Миколаю Соколовскому на маршалство мстиславское // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 89. – Арк. 26 адв.

199. Привилей на данину двум пушъкаромъ у воеводстве Мстиславскомъ // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 88. – Арк. 182–183.

200. Привилей на некоторые добра в тракте Крычовскимъ // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 121. – Арк. 155 адв.–156 адв.

201. Привилей Миколаю Служъце на державу кричовъскую // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 63. – Арк. 104 адв.–105 адв.

202. Привилей Павлу Якимовичу Головне на дворец и сельцо Дмиковщину в воеводстве Мстиславскомъ правом доживотнымъ // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 83. – Арк. 137–137 адв.

203. Привилей Павлу Якимовичу на ленные добра в воеводстве Мстиславском в селе Красномъ // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 77. – Арк. 546 адв.–547.

204. Протопопе Мстиславскому на пляцъ во Мъстиславлю // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 76. – Арк. 395 адв.–396.

205. Потверженье пану Ивану Мелешку каштеляну мстиславскому купли его дом с пляцом в месте слонимском // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 89. – Арк. 59 адв.

206. Привилей пану Матвею Суходольскому на подкоморство мстиславское // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 67. – Арк. 17–17 адв.

207. Привилей пану Миколаю Суходольскому на подкоморство мстиславъское // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 267. – Арк. 45.

208. Привилей пану подкоморому Оршанскому Кфридриху Лукомскому на кашталяниюмстиславскому // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 84. – Арк. 198.

209. Привилей пану Семену Войне на кашталяню мстиславскую // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 173. – Арк. 526 адв.

210. Привилей подкоморому мстиславскому Миколаю Суходолъскому на село Горбовичи в волости Могилевской до ласки господарской // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 50. – Арк. 46–46 адв.

211. Привилей подъкоморому мстиславскому урожоному Матвею Суходольскому на 12 служб людей у воеводстве Мстиславъском правом доживотным ему и жоне его // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 77. – Арк. 52–52 адв.

212. Привилей потверженье попу мстиславскому Св. Воскресенья и Бориса Глеба Петру Костентиновичу на складки в месте Мстиславле и на некоторые земли до тех церкви // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 77. – Арк. 30–31.

213. Привилей пушкару замку мстиславскому Семену Станиславоввичу и брату его Богдану на полъ службы земли Омельянинское и на пляцъ в месте мстиславъскомъ // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 73. – Арк. 128–128 адв.

214. Привилей ротмистру Левицкому на будавництва дома в паркане кричовском // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 12. – Арк. 236.

215. Привилей Самуелю Валовичу и малжонке его на село Залесье в воеводстве мстиславском // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 89. – Арк. 32–32 адв.

216. Привилей свещенику Спасской [церкви] в месте Кричевскомъ Роману Стратоповичу на церковъ заложенья Святого Спаса и на землю до тое церкви належачию, такъже наданья складу волност // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 74. – Арк. 56 адв.–57.

217. Привилей Семёну Герчику, пушкару крычовскому на земли и на дом его пушкарский в месте Кричовском // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 74. – Арк. 65–66.

218. Привилей Семёну Горбацъкому на полторы службы у волости крычевъское правомъ дожывотнымъ // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 77. – Арк. 244 адв.

219. Привилей Семену Золочевскому на судейство земъское мстиславское // КМФ-18. - Воп. 1. – Адз. зах. 70. – Арк. 208–208 адв.

220. Привилей Семену Золочевскому на судейство мстиславское // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 72. – Арк. 6–6 адв.

221. Привилей старцу олучицкому Селивону Скибичу на службы и пляц в месте Кричовском // Ф. 694. – Воп. 4. – Адз. зах. 1155. – Арк. 49–50.

222. Привилей старцу олучицкому Селивону Скибичу на службы и пляц в месте Кричовском // КМФ- 18. – Воп. 1. – Адз. зах. 74. – Арк. 419–420.

223. Привилей сыновцам Яна Запольскому на име Ивану и Григори Заполскому на полшостку волоки в Заполи в старостве мстиславском // КМФ- 18. – Воп. 1. – Адз. зах. 70. – Арк. 126 адв.–127.

224. Привилей тому ж хорунжому дворному пану Дмитру Рогозе на именице Полоницу в воеводстве Мстиславском лежочом правом ленным данное // КМФ- 18. – Воп. 1. – Адз. зах. 73. – Арк. 155 адв.–157.

225. Прывилей урожоному Василью Белицкому на врад стольництва Мстиславъского // КМФ- 18. – Воп. 1. – Адз. зах. 77. – Арк. 186–186 адв.

226. Привилей урожоному князю Богдану Соломерицкому, старосте кричовскому и малжонце его на некоторые добра в державе кричовской в селе Пескевичах, в селе Деяовичах и в Андреевичах // КМФ- 18. – Воп. 1. – Адз. зах. 83. – Арк. 20 адв.–21.

227. Привилей урожоному князю Самуэлю Горсъкому на 12 службъ в воеводстве Мстиславскомъ и до того на селе Бобыничи служобъ 4 // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 83. – Арк. 24 адв.–25 адв.

228. Прывилей урожоному князю Ярошу Масальскому на писаръство земъское воеводъства Мстиславъского // КМФ-18/ – Воп. 1. – Адз. зах. 77. – Арк. 53 адв.–54

229. Привлей урожоному Миколаю Стаховъскому на войское мстиславъское // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 77. – Арк. 621– 621 адв.

230. Привилей урожоному Симону Сцетевичу на службу у селцу на име Жуковскую // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 77. – Арк. 327 адв.–328 адв.

231. Прывилей урожоному Сымону Каменскому на маршалковъство воеводства мстиславъского //КМФ-18/ – Воп. 1. – Адз. зах. 77. – Арк. 19 адв.

232. Привилей урожоному Тимофею Селицкому на подкоморство Мстиславъское // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 77. – Арк. 641 адв.–642.

233. Прывилей хоружему воеводства мстиславъского урожоному Тимофею Селицкому на дворецъ Михайловъский служеб осмъ у воеводстве Мстиславъскомъ правомъ дожывотнымъ // КМФ-18.– Воп. 1. – Адз. зах. 77. – Арк. 327–327 адв.

234. Привилей Шимону Каменскому на войское повету мстиславского // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 67. – Арк. 79 адв.–80.

235. Привилей Федку Васковичу, пушкару замъку Мстиславъского на домъ Логвиновъ и земълю Козининъскую // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 85. – Арк. 219 адв.

236. Привилей Яну Баталькеру Олизаровскому на шляхетство // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 98. – Арк. 10–15.

237. Привилей Яну Вониловичу на 1,5 службы земли в воеводстве Мстиславском, в селе Желивле правом доживотным // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 83. – Арк. 26 адв.–27.

238. Привилей Яну Техановецъкому на подстольство мстиславское // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 93. – Арк. 25.

239. Привилей Ярошу Стаховскому на столництво мстиславское // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 89. – Арк. 103–103 адв.

240. Прывилей князю Фрыдриху Лукомскому на староство Кричовское // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 85. – Арк. 206.

241. Протопопу мстиславскому на пляць во Мъстиславълюк // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 76. – Арк. 395–395 адв.

242. Пушкару радомскому потверженье кгрунтов на службе пушкарской // КМФ-18. – Воп. 1. – Адз. зах. 86. – Арк. 429 адв.

